К. АКУЛА

ГАРАВАТКА



КНІГА І-Я

ДЗЯРЛІВАЯ ПТУШКА

ТАРОНТА-1965

КНІГА І. ДЗЯРЛІВАЯ ПТУШКА

Ад Аўтара

Сёлета мінае трыццаць гадоў ад часу масавага нішчэньня беларускіх кніжкаў у БССР. Зьнішчана каля 2000 назоваў накладам звыш за 10 мільёнаў. Сказаў-бы хто, што чужак-калянізатар, высяляючы беларускі творчы й кіруючы элемэнт у Сібір, разбураючы культурныя асновы паняволенага народу, пераняў прыклад ад свайго блізьняка-пачвары 20-га стагодзьдзя - гітлераўскае Нямеччыны. Гэта не зусім так. Беларускі навуковец С.Брага ў сваёй працы «Доктар Скарына ў Маскве» грунтоўна даводзіць, што Маскалі спалілі Скарынавы кнігі ў Маскве, калі слаўны сын зямлі беларускае, выдатны навуковец і першадрукар завёз іх туды для пашырэньня.

Улада маскоўскіх цароў, баяраў і царкоўнікаў абапіралася тады на гвалце й народнай цемнаце. Яны пільна сьцераглі, каб ніякі сьветач звонку не разагнаў цемры - асновы іхнага панаваньня. Усё, што бязь іхнага дабраславенства пранікала ў Маскоўшчыну, падганялі пад агульны назоўнік «хулы» і «ерасі». Баяліся, каб сьвятло навукі й праўды не дайшло да простых людзей. А Скарына-ж якраз і перакладаў на беларускую мову й друкаваў кнігі Сьвятога Пісаньня «для пажытку й дабра люду паспалітага».

Ёсьць выразная паралель між лёсам Скарынавых кнігаў у Маскве й тых, што амаль чатыры стагодзьдзі пазьней маскоўскія калянізатары спалілі ў Менску. Тут і там Маскалі нішчылі беларускія навуковыя й культурныя каштоўнасьці, бо баяліся, каб народ не пазнаў праўды й ня стаўся вольным.

Што-ж супольнага маюць гэтта прыгаданыя барбарскія ўчынкі Маскалёў із творам «Гараватка»?

Канкрэтную творчую працу над «Гараваткай» папярэдзілі доўгія роздумы. Творчая йдэя мусіла дасьпець, трэба было яе вынасіць у сэрцы. Падчас гэтага выношваньня ці раз даводзілася шкадаваць, што няма пад рукою сырца - значыцца, розных гістарычных і мэмуарных матар'ялаў, што памаглі-б зазірнуць у народную мінуўшчыну. Чужакі-акупанты стагодзьдзямі забаранялі народу тварыць свае культурна-

навуковыя скарбы, нішчылі ў цяжкіх умовах створанае, заціралі-замяталі сьляды нашых продкаў, каб нашчадкі былі сьляпыя.

І на зьмену прыходзілі іншыя думкі. Як-жа гэта сталася, што народ нашы, доўга прыгнятаны-ганьбаваны, пазбаўлены сваёй царквы, навуковых і культурных інстытуцыяў, арганізацыяў, даведзены да жахлівае рабскае галіты, зусім бязпраўны, так заняволены, што ўжо пазьней, каб выплысьці з гэтага жахлівага бяздоньня, мусіў насамперш дамагацца «людзьмі звацца»; як-жа народ гэты ня толькі ператрываў, але й захаваў сваю чыстую, багатую самабытнай культурай, народную душу? Дзе й у чым сакрэт народнае ўстойлівасьці?

Адказу давялося шукаць між жывых, намі знаных людзей. Гэтыя людзі жылі з намі й побач нас. Трэба было адно ўмець іх бачыць, да іх прыслухоўвацца. У безпрасьветнай цемры яны выглядалі простымі, звычайнымі. Адылі яны розьніліся ад іншых тым, што тварылі, вялі як умелі, ды безаглядна змагаліся з чужнікамі за свой быт і правы. Прыгадайце непісьменных, можна сказаць, вусных паэтаў і казачнікаў, вясковых мудрацоў, таленавітых мастакоў-самародкаў, сьпевакоў, якім чужнікамі былі пазачыняныя ўсе дарогі ў людзі. Народны фальклёр гэта-ж ня што іншае, як вялікі багаж народнага мастацтва й мудрасьці, якраз во створаны гэтымі людзьмі. У вольнай сваёй дзяржаве, здабыўшы навуку, гэтыя людзі вялі-б за сабой народ, былі-б ягонай славай. Колькі-ж нашых талентаў змарнела, або, выхапленых з народнае гушчы чужнікамі-калянізатарамі, пасьля сталася красой і славай чужых дзяжаваў і культураў!

Гэтыя народныя мудрацы й самабытныя творцы якраз і былі тымі жыцьцядайнымі клеткамі, празь якія ў чужой няволі пульсавала беларуская нацыянальная кроў. Гэта ў найбольшай меры былі тыя ўстойлівыя карані, якіх ня мог падсячы чужы барбар-прыблуда. Падчас народных паўстаньняў яны выходзілі на перадавыя пазыцыі, вялі за сабою народныя масы.

Народныя асілкі-волаты, трывалкія й устойлівыя ў штодзённай злыбядзе, сьціплыя й гэройскія ў змаганьні, мудрыя й непрыміральныя да народных ворагаў, ёсьць славай і натхненьнем наступных пакаленьняў. Ці-ж ня варты яны таго, каб знайсьці ў нашай літаратуры другое нараджэньне?

Працэс падсяканьня чужнікамі нашых народных карэньняў, устойлівасьць і рост гэтых карэньняў, цяжкое змаганьне з чужой

навалой - тэма вялікая, удзячная й цікавая. Яна даўно кліча да працоўнага варштату тварцоў беларускае культуры.

«Гараваткa» - гэта сьціплая спроба адлюстраваньня кароткага, але як-жа бурліва-жахлівага адрэзку нашае гісторыі. Твор разплянаваны на тры кнігі. У «Дзярлівай птушцы» мо дарма нехта спадзяваўся-б знайсьці поўнае мастацкае й жыцьцёвае завяршэньне асобаў і дзеяў.

Дарэчы, колькі словаў аб адмоўных пэрсанажах.

Выродкі, што ёсьць у кожным грамадзтве й народзе, быццам тая буза на чыстай крынічнай вадзе, засьмечваюць народны арганізм. Калі-ж чужая ўлада намагаецца падпарадкаваць гэты арганізм шляхам разкладаньня, нікчэмнікі гэтыя стаюцца шкоднымі й ненажэрнымі бацыламі - упіваюцца ў жывы мякіш народнага цела, ідуць на здраду сваім і на службу ворагам. Калі прыгадаеш, што за панаваньне над нашым народам вось ужо даўно змагаліся дзьве ці тры варожыя сілы, усьведаміш латва, чаму гэтыя выродкі-нікчэмнікі былі ў вялікім попыце.

У «Дзярлівай птушцы» яны адно пачынаюць расьці. Выплывуць яны наверх і ўзбуйнеюць ці, як кажа народ - вырастуць ім рогі - калі працавітыя й богалюбівыя нашыя людзі апынуцца пад «роднапартыйнай» уладай ці пазьней яшчэ пад ботам «гэрэнфольку».

Наапошку, ад імя выдавецкае супалкі «Пагоня» я многа забавязаны тым нашым суродзічам на выгнаньні, каторыя фінанасава памаглі выдаць гэтую кнігу. Усіх гэтта не магу прыгадаць, дый некаторыя з розных меркаваньняў не жадаюць публічнае падзякі.

У першую чаргу выданьне кнігі грашова падтрымалі наступныя асобы, каторым належыцца вялікая ўдзячнасьць: А.Протас, інж. В.Станкевіч, С.Карніловіч, К.Каранеўскі, ген. Ф.Кушал:, д-р Б.Рагуля, А.Субота, Б.Даніловіч, В.Стома, Н.Сільвановіч, д-р Я.Сажыч, інж. Ч.Ханяўка, мгр. П.Манькоўскі, А.Монід, А.Маркевіч, д-р Л.Трусэвіч, В.Касьцюкевіч, М.Нікан, д-р В.Васілеўскі, д-р Ул.Бакуновіч, Ч.Будзька, мгр. В.Навіцкі, С.Гутырчык, Л.Стагановіч, П.Кажура і Ўл.Курыла. Вельмі дзякую Брату ў Хрысьце а.Яну Пятроўскаму, каторы сходнай цаной за друк, зычлівымі парадамі дый борздым і добрым выкананьнем друкарскае працы ці не найбольш спрычыніўся да хуткага выхаду першае кнігі «Гараваткі» ў сьвет.

К.Акула

Сьвятой памяці бацькоў

О, БЕЛАРУСЬ!

Тваё мінулае ў мармурах не застыла
І медзьдзю-бронзай не зьвініць.
Яно ня знае готыкі, антычных стыляў,
Ня знае колераў сузорчатых зарніц.

Яно пахавана ў глыбокія курганы, -
Крывёй-бальзамам гоіць сны.
Твой гэній, у мінулым паруганы,
Да славы ўзьнімуць вольныя сыны.

Ты сілы траціла свае дазваньня;
Цябе абплакаў на кургане клён.
Штогод тваё спраўлялі ўкрыжаваньне,
Штогод гісторыі праклён.

Таму й мінулае ў мармурах не застыла
І медзьдзю-бронзай не зьвініць.
Яно ня знае готыкі, антычных стыляў,
Ня знае колераў сузорчатых зарніц.

Язэп Пушча

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

І

Янук раз-пораз спыняўся й ляскаў пугай. Сярэдняга росту калматы руды сабака Тапсік, сьцяміўшы, што павесялеў пастух, з уцехай падскокваў уверх на ляскат пугі й зьвягліва, быццам

сьмяючыся, брахаў. А хлопчык, - як і належыцца такому ўсяўладнаму сабачаму гаспадару, - то пагражаў сабаку пальцам, то, прыкідываючыся, касавурыўся на яго, быццам за тое, што той замнога дазваляў сабе панібрацтва. Яшчэ ямчэй размахваўся прадаўгаватым і гнуткім вішнёвым пугаўём, маніпуляваў ім так, каб вуж пугі, асабліва той цяненькі, зьвіты з адборнае пянькі кончык яе, з тонкім посьвістам гвалтоўна рэзаў паветра. Ляскат войстрым рэхам трывожыў суседні бор, а пастушок пільна надслухоўваў ягонае водгульле.

Калі-б хлопчык ведаў модныя словы, то мог-бы сказаць, што той цянюсенькі кончык пугі, па-майстэрску зьвіты бацькам з пазычанай ці купленай у кагось пянькі, меў дэмаралізуючыя для статку ўласьцівасьці. Вядома-ж, выяўляліся яны адно пры ўмелым карыстаньні пугай Януком. Бо што, - мяркаваў Янук, - варта была пуга безь ягонае спрытнае рукі? Нейкі, званы пугаўём, вішнёвы прут з даўгой вяроўкай ды й годзе. Трэба было ўзяць яго спрактыкаванай руцэ, ёмка закінуць і пасьля гвалтоўна тузануць - адно тады нараджаўся любы ягонаму вуху рэзкі сьвіст-ляскат. Пуга трымала кароваў у послуху. Праўда, быў і верны сябра-памочнік Тапсік, цану якому добра ведаў Янук. Ды ўсяроўна, пуга сама сабой. Лясьні ёй раз-другі, і глядзі, як стрыжэ вушамі статак, ведаючы, што малы гаспадар на воку яго трымае. Таму сьвіст-ляскат і быў для Янука прыемнай і карыснай мэлёдыяй.

Было ўсяго ў статку, старых і маладых, хвастоў зь пятнаццаць. Панаядаўшыся, быццам нехаця, ацярэбліваліся яны ў ценях вялікіх вольхаў над канавай. Сонца падкрадалася ўжо за чуб суседняга бору. І не агледзісься, як вечар на носе.

Янук сачыў, ці пакажацца ў падворку ля хаты шыракаплечая постаць гаспадара ягонага - асадніка Лазоўскага, ці ня рыпне каля калодзезя журавель. Чуткае вуха ягонае скваплівa лавіла гукі перадвячорнага руху ў падворку, каб угадаць, калі можна рухацца із статкам пад дом.

Лёганькі ветрык прынёс з-пад балота абрыўкі вясёлае полькі й галасы прыпеўкаў. Янук ведаў, што так рыпела трохрадка ў руках вясковага музыкі Тадэўкі, што сам безьперапынна сыпаў прыпеўкамі й падахвочваў іншых, адно ходырам хадзіла поле. Там дзесь грамадою польнымі межамі з Тадэўкавага хутару йшлі ў вёску ладзіць ігрышча. Як магніт, ствараючы навокал весялосьць і падганяючы адсталых,

прыцягвала трохрадка да сябе моладзь. Вялікай грамадой уваліцца яна ў раней дамоўленую хату ды кінецца ў скокі. Тымчасам ішлі, гарлапанілі, склікалі іншых, задыхаўся-рыпеў гармонік. Перакінуўшы цераз плячо цымбалы, клыпаў ля Тадэўкі невялікага росту цымбалісты Язэпаў Пецька.

Жвавей захадзілі босыя закарэлыя Януковы ногі, і карціла яму ўжо бегчы туды, дзе, як ведаў добра, у хвасьце старэйшых цягнуліся ўвішныя падшыванцы-жэўжыкі, што пасьля цэлы вечар будуць шнырыць каля йгрышча, займаючыся сваімі зусім непразаічнымі справамі.

Запавядалася шумнае й людnае купальскае йгрышча. Сяньня было Яна. Людзей зь кірмашу налезе процьма, папрыходзяць із суседніх вёскаў і засьценкаў. Ці пусьціць яго гаспадар? - мяркаваў Янук.

Калі прыгадаў, што сталася, вялікі жаль ахапіў ізноў Янука ды п'яўкай смактаў у грудзі. Дзень сьвятога Яна - той самы дзень, калі быў вялікі рэлігійны фэст пры царкве ў Гацях, - гэта-ж па праву было ягонае сьвята, ягоныя ймяніны. Цярпліва чакаў яго хлопчык ад пачатку вясны - значыцца, ад часу, калі пачаў ганяць на поле статак. Абяцаў яму сёлета Лазоўскі вольны дзень ды шчэ й пяцьдзясят грошаў, каб забавіўся на фэсьце - з тэй умовай, што добра пільнаваць статак і сёе-тое ля гаспадаркі паможа. Гэнае «сёе-тое» складалі дробныя працы й паслугі, што не належалі да ягоных штодзённых абавязкаў.

Падахвочаны абяцанкаю, хлопчык пасабляў асадніку, як роднаму бацьку. Летась-жа на фэст пусьціў, хоць адно пяць грошаў даў. Кагадзе прыабяцаная пяцьдзясятка здалася Януку прост-напраст невядома якім вялізным капіталам. Ніколі ў жыцьці ня меў так многа ў сваёй часта дзіравай кішэні, хоць і даводзілася бачыць у чужых руках. Колькі-ж гэта марозіва, шакаляду, ляманяды й цукеркаў спажываў ужо ў сваім уяўленьні Янук. Мроілася часамі, што палову тавараў у Жыдоў-крамнікаў за тыя грошы адкупіць. Вось дзе паласуецца! - цешыўся пастушок. Ды й ласавацца-ж будзе не абы як, але абавязкова на воку ў сваіх сяброў - канечне, каб бачылі, зайздросьцілі й аблізваліся, асабліва-ж доктаравы Ўладзік і Стась. Ці раз ім ужо ім пра тое хваліўся.

Ажно чорту нямытаму нешта ў галаве перакулілася. Насупіўшыся, швэндаўся ўчора, не дазволіў нават на купальскую ноч у сяло да бацькоў зьбегаць, ды потым із моладзьдзю ля вогнішчаў і вады

пазабаўляцца, папараці кветкі пашукаць. Варажыла на нядобрае. Сяньня на досьвітку, быццам і гаворкі пра тое сьвята й абяцанкаў ніякіх не было, устрэў яго асаднік і загадаў статак выганяць. Аб падмене й грашох - ні слуху, ні духу. Ледзь асьмеліўся хлопец адчыніць рот, як пан накінуўся на яго з лаянкай і пагрозамі. Нават тое марнае сьнеданьне камяком у горле засела. Колькі-ж паплакаў хлопчык на полі. Жалем разьпіралі ягоныя грудзі царкоўныя званы, што клікалі да сябе. Заплыўшымі слязьмі вачыма сачыў ён моладзь і старэйшых, што праз Гараватку й празь лес ішлі ў Гаці. Спачатку нават наважыўся быў кінуць статак, плюнуць на асадніка й увесь яго нялюбы род ды пабегчы дадому. Адно як прыгадаў хатнюю галечу ды й тую магчымасьць, што бацька можа вылупцаваць і назад за руку прывесьці (было ўжо раз і гэтак), тады й думкі з галавы вытурыў.

Трэці ўжо год пасьвіў Янук Бахмач Лазоўскага статак. Мог-бы ўжо й кінуць, калі-б ня тая прага да навукі. Кончыўшы пачатковую вясковую школу, мог-бы, як некаторыя іншыя вясковыя падлёткі, бацьку пры гаспадарцы памагаць. Працы хапала. Дык дзе-ж там. Вучыцца яму далей карціла.

Летась пад вясну тое было. Спытаў бацьку, ці пусьціць яго наступнай восеньню ў пятую клясу гацкай сямігодкі. Бацька ня супраць-бы далей сына вучыць, калі-б ня тая вечная нішчымніца ў хаце. Хадзіць штодзень за чатыры кілямэтры ў школу - гэта ня жартачкі, вунь колькі абутку трэба. Дый зь ежай праблема. Дома з аднэй міскі капусты пасёрбае, а ў школу дык скварку якую трэба. А дзе яе браць?

- Іздзі, сынок, калі цябе да навукі цягніць, - казаў Пракоп Бахмач Януку. - Толькі помні, што з абуткам у мяне коратка. От, калі ў лапцёх будзіш хадзіць, дык лыка хваціць. Сам памяркуй...

Бацька казаў праўду. Той малаўраджайны клінок зямлі з трох гактараў - ня выкарміць, не апране й не абуе, нават калі летам і ў ліпавіцкага пана крыху пазаробіш. Асабліва цяжка было з вопраткай і абуткам - хоць ты гвалт крычы. Меў Янук аднаго, на тры гады старэйшага, брата Міколу. Кульгавы на левую нагу быў. Не памятаў Янук, калі брат калекам стаў. Разказвалі, што, будучы яшчэ малым, гадоў ці не каля сямі маючы, пасьлізнуўся й упаў хлапец на мокрадзі ля памыйнага цэбра. Скардзіўся на боль у левым суставе. Бязь лекарскае помачы костка пачала загнівацца, і мусілі паслаць Міколу ў

шпіталь. Таму, што на большае не ставала грошы, дык адно спынілі загной. Ад таго часу запаволіўся рост Міколавай нагі. Была яна цяпер карацейшая за правую на цэлай поўпядзі. Бацька мяркаваў калеку на шаўца вывучыць. Сам Мікола нянадта на кнігі налягаў, а калі-б і стараўся вучыцца, дык навошта? Не было нікуды дарогі вясковаму, асабліва яшчэ праваслаўнаму, чалавеку. Як мухі-ліпучкі, абсаджвалі паны ўсё й усюды сваймі ўраднікамі. Заставалася Міколу брацца за малаток і капыл, ці йголку з ножвіцамі, каб свой кавалак хлеба мець. Так пастанавіў Пракоп Бахмач, перш із жонкай Аленай гэтую справу добра ператросшы.

Янука цягнула да навукі, як п'яніцу да гарэлкі, хоць, каб хто спытаў, навошта яму школа, дык мо й не адказаў-бы. Проста няўрымсьлівая прагнасьць ведаў не давала супакою. А як ты ў лапцёх у местачковую школу пакажасься? Засьмяюць, праходу не дадуць. Як сьвет сьветам, ня чуў ніхто, каб хто ў гацкую школу ў лапцёх хадзіў.

Лазоўскі суліў на гэты год восем пудоў жыта й новыя боты. Тут-то й была найлепшая разьвязка. Была яшчэ адна нявыгада: як быць з тымі пачаткамі й канчаткамі? Гэта-ж вясною ды ўвосень, каб пасьвіць статак, трэба школьны год абразаць. Можа, як-небудзь дасца надрабіць, - мяркаваў Янук. Зь ягонымі добрымі ацэнкамі гэта-ж быць ня можа, каб яму не паспагадалі.

Выбраўся аднойчы хлапец у гацкую школу, каб самаму разпытаць-разьведаць. Напрыканцы школьнага году тое было. Ад вясковае настаўніцы нёс ліст да дырэктара. Добра прыгадвае цяпер Янук, зь якім вялікім хваляваньнем пастукаў у дзьверы дырэктаравага бюра мураванае двухпавярховае школы, якімі млявымі й непаслухмянымі былі ягоныя ногі, як разгубіўся, убачыўшы за сталом буйную чупрыну й рудыя вусікі, што належалі дырэктару Марыноўскаму. Вядома-ж, Янук не ў сьляпую прыйшоў. Пра тога «дзірэктара», - які ён і што ён, - яшчэ раней каго мог распытаў. Адзін спытаны Лёнька, што некалі цэлы год у местачковую школу хадзіў, трымаючы задзірліва-важнецкую міну, скупымі словамі даў малому Бахмачу зразумець, што ў гацкую школу ня так латва трапіць (самога за нявуцтва прагналі), што «дзірэктар» - чалавек ніякаваты, нават і зусім благі; наагул даклаў шмат выдуманага, што ў Янука ледзь першы палымяны энтузіязм да навукі не замарыла. Адылі перадумаўшы, папытаўшыся яшчэ зычлівую вясковую настаўніцу, атрымаўшы ейны

ліст да «дзірэктара», які, паводля ейных словаў, напэўна-ж паможа, Янук канчаткова адважыўся й наважыўся.

Даўшы «дзень добры», хлапец лыпаў вачыма, нясьмела паглядаючы на гладкага, як кормны парсюк, рудаватага пана, што выгадна сядзеў за сталом і з даўгое піпкі цадзіў радзенькі водарны дымок з-пад роўна падстрыжаных вусікаў.

- Ці не язык мне тады авечкі адкусілі?! - сьмяяўся пасьля пастух, прыгадваючы той момант, - ні знаў што сказаць, як заняло...

Пан Марыноўскі ўважна агледзеў апранутага ў саматканае, з палатанымі старымі ботамі, падлетка й сказаў - ні то строга, ні то лагодна:

- Ну, што скажаш?

Янук із натугай паклікаў на помач непаслухмяны язык:

- Пане дырэктар, я хачу ў пятую клясу...

І тут зацяўся.

- Што, што? Ня чую.

Янук загаманіў галасьней і аддаў Марыноўскаму настаўнічын ліст. Калі дырэктар чытаў, хлапец пасьмялеў. Павярнуў галаву направа, пасьля налева й абглядаў канцылярыю. Па куткох стаялі шафы, школьныя дапаможнікі, на сьценах віселі нейкія табэлі, а на франтавой сьцяне над вакном - крыж ізь фігурай Збавіцеля; пад нізом - белы арол, а пад ім - сам маршалак Рыдз. Паколькі ўсё гэта для Янука было няновае, ён ізноў утаропіўся ў твар із рудымі вусікамі.

- Гм, - сказаў гладкі дырэктар, устаўшы з-за столу й пазіраючы ў вакно з такой мінай і помпай, быццам разважаў над плянамі бою зь небясьпечным супраціўнікам, што вось-вось мае адбыцца. - Добра, вельмі добра.

Янук намагаўся разгадаць, што было «вельмі добра», - ці тое, што ён сюды зьявіўся, ці гэнае, што напісала ў лісьце настаўніца. Пасьля ўсё пайшло гладка. Дырэктар накіраваў яго ў вагульную настаўніцкую, дзе запісалі ў пятую клясу.

Сяньня з усьмешкаю на твары прыгадваў хлапец той момант, хочучы, мусіць, у думках падкрэсьліць, што цяпер ён не абы-што, што ўжо гэную пятую клясу за сабою меў.

Латва з навукай даў рады ды пасьля й у перадавікі выскачыў, хоць боты за зіму цалкам дабіў. Гэта-ж ня жарты - па чатыры кілямэтры туды й назад дзень-у-дзень у пагоду й непагадзь. За зіму падрос,

пасьмялеў, спаважнеў. Як-ні-як, яму ўжо ня ўсе вясковыя аднагодкі раўнёй былі, насамперш тыя, што па чатыры клясы пачатковае скончылі ды ля дому бібікі зьбівалі.

Скончыў Янук пятую клясу з добрымі ацэнкамі, дый ізноў у праблему ботаў упёрся. Яшчэ каб адно ботаў! Восем пудоў жыта гэта таксама «ні хаханькі» ў сям'і, дзе вечна даводзілая куртатыя канцы з канцамі зьвязваць. Ці раз так кароткімі яны былі, што нават той самы Аляксандра, які так умела патрапіў Гардыёнаў вузёл разьвязаць, усю мудрасьць сваю на помач паклікаўшы, рады ім ня даў-бы.

Дык не пра самыя боты ўжо йшло. Бацьку вунь якіх пераконлівых словаў шукаць давялося, каб ізноў хлопца на лета да Лазоўскага паслаць. Януку-ж гэная местачковая навука ці не якія йнакшыя норавы ў галаве нарадзіла. Сарамнавата-ж перад вясковымі хлапцамі, у такую навуку дарогу знайшоўшы, ізноў на лета да Лазоўскага «каровам загаркі закручваць» вяртацца. Раз Янук так зрэзаўся з бацькам, што той ажно ў каршэнь таўхялёў мусіў надаваць, каб адумаўся сын.

Усё гэта прыгадваючы, рыхтаваўся цяпер Янук кароваў дадому гнаць. Жаль з прычыны таго сьвінства, што зрабіў пан Лазоўскі, душыў грудзі. Як на тое ліха, спасьцярог хлапец дзьве фігуры хлапчукоў, што выйшлі зь лесу й, перасёкшы гасьцінец, кіраваліся проста на яго. Быў гэта ня хто іншы, як доктаравы Ўладзік са Стасем. Нацянькі празь лес з Гацяў беглі - наўмысьля, мусіць, каб перад ім пахваліцца, як гулялі на фэсьце.

Хлопцы былі тупымі ў навуцы. Стась у вясковай чацьвёртай клясе ўжо другі год сядзеў. Як ні намагаўся бацька, ня мог няздольнага сына разам ізь Януком у гацкую школу паслаць.

І навошта-ж іх сюды якое ліха гоніць? Што цяпер скажа ім Янук, як гэта ў вочы зірне, калі кпіць, падтруньваць зь яго пачнуць? Набягалі сьлёзы. Стрымаўшы іх у пару, завэдзганым сінім кужэльным рукавом выцер нос і сачыў хлапцоў, што ўжо былі зусім блізка.

- Ну, што ты дома робіш, Янук? - яшчэ здалёк нахаду адазваўся Стась. Затрымаліся. У Стася, як заўсёды, пад носам вісела маленькая бурбалка. Невядома, ці мыў ён сяньня абсыпаны рабаціньнем твар. Шэрыя й няхітрыя вочы глядзелі Януку проста ў твар. Апрануты быў у новыя крамныя чорныя нагавіцы й новую кашулю-матроску. Пасьпеў абнавіць ужо й брызэнтавыя чаравікі. Янук прысягнуў-бы, што пад сінімі шкарпэткамі на нагах «піялі пітухі». Цэлае-ж лета, як і ўся

вясковая дзятва, бегаў басанож, а каравыя ногі рэдка сябравалі з мылам ці вадою. Уладзік быў апрануты ў зялёныя галіфэ-порткі, боты зь бліскучымі хромавымі халяўкамі, шэры пінжак і белую кашулю із гальштукам.

Стась быў Януковым аднагодкам, а Ўладзік на два гады старэйшым. Жылі пасуседзку. Кароваў у чужых ня мелі патрэбы пасьвіць. Бацька - мясцовы фэльчар-самавук (казалі, што ў войску таго рамёства наламаўся) меў ладны кавалак сваёй зямлі, ды й ад людзей, што ніколі ў хаце ня зводзіліся, добра падзарабляў. На полі хапала наймітаў, у хаце быў дастатак. Дзеці лекаравы ня ведалі, як шмуляе-коліць цела кастраватая зрэбная бялізна. Крамнага ўволю было. Каму-ж, калі ня ім, па фэстах валачыцца, ды зь бяднейшых пакепліваць? Любілі бацькавы грошы ў ход пускаць.

- Ні глядзі ты на доктаравых, - ці раз раіў Януку бацька, - яны ні твайго носа-палоса. У іх вуньдзіка высахніць ці вымакніць, дык і бяды вялікай: людзі дабра панавозяць.

- Што табе! Можа, я хачу дома быць! - задзёрыста адказаў Стасю Янук, сілком змагаючы крыўду, што напірала ў грудзёх.

- Каб ты гэдак жыў, як праўду кажаш! - не ўступаў Стась.

Асабліва ня мог цярпець Янук Стасевай брыдкай грымасы, што паказвала кпіны.

Уладзік трымаўся збоку. Ён, як казалі, ужо пад дзяцюкі падбіраўся. Доказам такога падбіраньня былі хаця-б тыя самыя зіхатлівыя хромавыя боцікі, што нядаўна справіў бацька. Уладзік прабаваў танцаваць, піць гарэлку, а часам нават ласаваўся, хаця ўпотайку ад някурачага бацькі, крамнымі папяросамі. Ці раз бачылі іншыя, як каторую старэйшую дзеўку ўжо за грудзі сьмела ўшчыпнуў - мусіць, гэтым даводзячы сваю сьпеласьць. Ростам вялікі быў не па сваіх гадох. Тое, што некалі ў школе ў кожнай клясе па два гады сядзеў і што бацька часта, як казалі, салам «падмазваў», каб сын як-небудзь элемэнтарнай пісьменнасьці навучыўся, - зусім не перашкаджала Ўладзікаваму росту ў дзяцюкі. Ганарыстым стаў і задзёрыстым. На гэтых двох сынох і сухой, як нядошлы бабовы струк, жонцы Марылі, канчалася лекарава сям'я.

- Як фэст быў? - буркнуў Янук.

- Каб ты толькі відзіў! Ядры т-тваю палку, народу дык народу! - забубніў у нос Стась, рад пахваліцца. - Такога кірмашу я ў сваім

жыцьці ня відзіў!

- Дзіва вялікае, такоя-ж жыцьцё во, сто гадоў пражыў! - кпіў пастух.

- Ну няхай сабе, алі пагулялі на ўсю йванаўскую! - гугнявіў цалкам незьбянтэжаны Стась. - Елі й пілі што хацелі, аж пуп трашчэў. Хочаш во? Выбірай.

Стась выцягнуў зь кішэняў дзьве жмені цукеркаў. Былі там малыя круглыя ў паперках і падўжныя, і даўгія махрыстыя. Прынадна ўпрыгожылі яны рознымі колерамі Стасевы нязграбныя далоні. Зазьзялі ад прагнасьці Януковы вочы. Цукеркай мог ласавацца раз ці два на год, ня болей. Нясьмела, быццам баючыся, каб Стась не паклаў іх назад у кішэні, выцягнуў руку і ўзяў найменшую з чырвоным ракам на празрыстай абгортцы.

- Бяры яшчэ адзін, - спанукаў Стась.

Янук разгубіўся. Лекараў сын паглыбляў ягоную крыўду. Сам меўся быць сяньня панам, за свае грошы раскашэліцца й перад іншымі хваліцца, а сталася, што гэты смаркач дэманстраваў цяпер, які ён ласкавы й добры. Выбраў ён найдаўжэйшую махрыстую цукерку й сунуў у Янукову руку.

- Дык што, ні пусьціў цябе? - пытаўся яшчэ раз пастуха.

- Ні пусьціў - пшэк пракляты! - із крыўдай прызнаўся Янук.

- І грошы ні даў?

- І грошы ні даў.

- Каб яму скула ў бок за гэта! - прыабяцаў Стась.

- Каб яму дзьве, дый у такое мейсца, што сесьці ня мог! - паправіў Янук.

Памаўчалі. Уладзік выцягнуў зь кішэні папяросу й запаліў.

- А сягоньніка на вечарыну прыйдзіш? - пытаў Стась.

- А будзіць?

- Пэўна-ж што будзіць.

- У каго?

- Мусіць, ці ня ў Тодара Кмітавага. Дык што?

- Можа й прыйду.

Надта-ж хацелася Януку на вечарыну. Ведаў, якія гучныя й забаўныя бываюць купальскія йгрышчы, ды й дома тыдні із тры, мусіць, ня быў, хоць дахаты, нават абыходзячы вакол Гараватку, было недалёка. Але што на гэта скажа Лазоўскі?

- Ты яго ня бойся, халеры гэдакай, - як-бы вычытаўшы на йлбе пастуховы думкі, ды абціраючы тую бурбалку пад носам, сказаў Стась. - Ноч твая, пагуляць можаш.

- Падумаю - можа й прыйду.

Стасевы словы падбадзёрылі яго.

- Глядзі-ж, пастарайся.

- А хто йграць будзіць?

- Сьцяпанаў Тадэўка, хто-ж...

- Добра, пагляджу там.

Хлопцы пайшлі. Янук глядзеў, як накіраваліся праз шырокае пасма лугу, перабраліся праз канаву, мецячы проста на Гараватку.

- Тапсік! - клікнуў пастух сабаку. Той паставіў вушы, пільна гледзячы малому гаспадару ў вочы, стараючыся наперад згадаць, што ён хоча. - Гані іх дамоў! Там! - паказаў пальцам на статак Янук.

Тапсік паволі забег каровам з другога боку й памалу пачаў ціснуць іх на папар у кірунку двара Лазоўскага, што стаяў у самым цэнтры хутару.

Пан Лазоўскі, русавалосы мужчына гадоў пад пяцьдзесят, прытуліўся да паркану на вялікім дзядзінцы, пагладжваючы свой бэбах ды паглядаючы на сваю багатую калёнію. Вока ягонае любавалася абшарам і ўраджаем. Збажына вунь парасла сёлета, як на лес гледзячы, канюшына тоўстым дываном заслала вялізную ніву, гародніна, садовіна - усё, дзякуй Матцы Боскай Чэнстахоўскай, у гэтым годзе спорыла. Лазоўскаму ніколі й у галаву не прыйшло, што ён найбольш сакавітыя сокі, як ненажэрны паразіт, з добрых працавітых людзей тутэйшых смактаў. То-ж яны, як найміты, за безцан апрацоўвалі ягоную вялізную гаспадарку.

Тое, што яго зь «Велькапольскі» прыслалі сюды, ды, абрэзаўшы малазямельным, далі яму гэты вялікі кавалак першакляснае зямлі, гэта ўсё належалася за тое, што памагаў адваёўваць і будаваць «Жэчпаспалітую». Гэта-ж ня дзе ў іншым якім мейсцы, а якраз тутака, на гэтых «крэсах» кроў праліваў, бальшавікоў босых, голых і галодных гонячы. Цяперака ён тут праўны пан і гаспадар. Урад прызнаў ягоныя заслугі, ацаніў «пралітую кроў» і пасадзіў ваяку між бедных малазямельных людзей, каб спажываў плёны іхнае працы.

Сяньня-ж і настрой Лазоўскага выдатна паправіўся, бо ў воласьці з панам войтам удалося зусім хлёскі гяшэфцік наконт падаткаў

абцяпаць. Адно вось цяпер, вярнуўшыся дахаты, прыгадаў ён, што раніцою, будучы ня ў гумары, пакрыўдзіў пастуха.

Каровы ўваходзілі ў вялікі, абгароджаны высокім частаколам, двор. У самым хвасьце цягнуўся Янук із сабакам. Асаднік гукнуў хлопчыка.

- Хочаш схадзіць дамоў? - спытаў ён пабеларуску.

- Хачу, - зірнуў Янук гаспадару сьмела ў вочы.

Лазоўскі быў пад гальштукам, у прыгожых выглянцаваных боціках, сініх галіфэ-портках, шэрым пінжаку. Правай рукой палез ён у кішэню порткаў і выцягнуў адтуль вялікую жменю манэтаў. Перасыпаў іх з аднэй далані на другую, любуючыся грашмі, быццам наўмысьля, каб пазводзіць пастушка. Аж пабольшалі Януковы вочы. Так многа грошы ніколі ня бачыў. Былі там і малыя ніклёвыя, і медзякі, былі й срэбныя залатоўкі.

Асаднік выбраў із жмені тры найменшыя манэты й выцягнуў калматую руку да пастушка: - Маеш тут дваццаць пяць грошаў і можаш ісьці.

Янук узяў грошы й забыўся нават падзякаваць.

- Кароў мы самі спарадкуем, - працягваў шурпаты голас Лазоўскага. - Ідзі ў кухню, памыся, паеш і бяжы.

Януку ня трэба было паўтараць. Нахаду памыўся, хапіў нешта ўкусіць і выскачыў з хаты.

- А ўсё-ж абяцаных пяцьдзесят грошы ня даў, пшэк паршывы! - прабурчэў пад носам, клічучы Тапсіка й кіруючыся на выган.

II

Калі-б із птушынага лёту кінуць вокам на ваколіцу, паказаўся-б вам такі краявід: зь левага боку, гледзячы на захад, як зрокам абняць, зялянелі вялізныя скарбовыя лясы. Дзесь зь нетраў іх, з паўдзённага ўсходу, выбягаў шырокі гасьцінец - побач хутару Лазоўскага апярэзваў лес, лагчынай прабягаў уздоўж земляў маёнтку Ліпавічы, пераскокваў чыгунку і ўжо з паўночнага боку яе сьпяшаўся ў Гаці. Раўнінны хутар Лазоўскага адасобнены быў ад суседняе вёскі Літоўцы, дзе жылі Януковы бацькі, даўгім сугром, званым Гараваткай. Сама-ж вёска

ляжэла быццам у падоўжаных начоўках. Паўночным брыжам начоўкаў была двукаляінная чыгунка, што з аднаго боку бегла ў Полацак, а з другога - у Маладэчна й на захад. За чыгункай прытуліўся ля дубровы шляхоцкі засьценак Галавачы. Па суседзтву - у зелені бярозаў, ліпаў, клёнаў, хвояў і садовых дрэваў - прытаіліся гаспадарскія й жытловыя будынкі маёнтку Ліпавічы.

Абкружаная з трох бакоў асадніцкімі й шляхоцкімі землямі, з усходу ўпіралася вёска Літоўцы ў балоты. Калі-б які жартаўлівец сіліўся схарактарызаваць мейсцазнаходжаньне Літоўцаў, мог-бы трапна сказаць гэтак: загналі літоўскіх паны, шляхта й асаднікі ў казіны ражок. Наўкол найлепшую зямлю й лясы пазабіралі, а ззаду, як на зьдзек, кавалак нікчэмнага балота прырэзалі.

З балота гэнага запраўды невялікая пацеха была. Апроч дробных сасонак ці карлаватых бярозак, здатных на хвораст, ані дрэва там людзкага, ані нават ягадаў уволю. На мокрых купінах улетку ў лапцёх касілі сяляне рэдкую траву, а сена вывозілі ўзімку, як замярзала.

Найбольш характэрным і дамінуючым мейсцам у цэлай ваколіцы была Гараваткa. Як падоўжаны, мейсцамі з упадзінамі, добра падыйшоўшы бохан хлеба, лягла яна між хутарам Лазоўскага й вёскай Літоўцы. Калі-б той бохан удаўжкі памерыць, то, пэўна, кілямэтар з гакам перацягнуў-бы, дый ушыркі мо чвэрць яго. Сугор належаў маёнтку Ліпавічы, але гэта, казалі, адно пазьнейшым часам. Даўно-даўненька, казалі, Гараваткa была літоўскай.

Ды й не аб фармальную ўласнасьць ішло. Гараваткa жыла ў мяйсцовых казках і лягэндах, глыбака ўрасла ў народную гісторыю. Зірніце, хаця-б, на гэты дуб-гігант, што так глыбака ўкараніўся ў Гараваткі грудзі з усходняга боку. Такіх, як ён, ізь сьвечкаю ўдзень у ваколіцы ня знойдзеш. Старэйшыя цьвердзяць, што яму больш за паўтысячы гадоў. Дай ці ня дай таму веры, а вядома, што ён стары й каштоўны сьведка няпамятных мяйсцовым людзям эпохаў.

Як горда й валадарна ўзвышаецца ягоная крона! Аб магутныя грудзі гэтага волата разьбіваліся вятры й непагадзі цэлых стагодзьдзяў. Казалі, што памятае Баторага й Івана Жахлівага, што сачыў ён за Швэдамі й Напалеонам. Народ празваў яго Архіпам. Тут на Гараваткі ля Архіпа сустракаліся ганцы з паўстанцкіх аддзелаў сялянаў, узьнятых супраць дэспата-цара Каліноўскім. Імя Архіпа служыла як пароль беларускім жаўнерам у часе апошняй і найбольш жахлівай

вайны. Некаторыя цьвердзілі, што Архіп быў пасаджаны даўным-даўно тым князем, што на гэтым сугры быў замак пабудаваў і самую Гараватку ахрысьціў.

Як моцна мясцовы народ шанаваў і цаніў Архіпа, сьведчыць адзін факт, за праўдзівасьць якога кожны вакольны чалавек, божачыся, могбы разьбіць свае грудзі. Гадоў дзясяткі таму із тры назад задумалі ліпавіцкія ўладныя вяльможы Архіпа на будаўляны матар'ял сьпілаваць. Вестка гэтая, мусіць, праз парабкоў і іншых наймітаў, з маёнтку Ліпавічы маланкай па ваколіцы разьбеглася. Пачуўся ціхі й зьдзіўлены гоман, пасьля перамешаны з абурэньнем: «Як-то? Няхай толькі асьмеляцца, ну!»

І найбольшая пагроза была ў тым «ну». Гэта-ж як без Архіпа ўявіць Гараватку?! Поўнай хваляй вылілася з народных грудзей любасьць да старога заслужанага волата. І калі прыйшлі панскія людзі зь піламі й сякерамі, абглядаючы, з каторага боку пачаць грызьці месіва гістарычнага гіганта, заварушыліся навакольныя палі, загулі сялібы, як з-пад зямлі пачаў расьці на Гараватцы натоўп народу. На гэткую незвычайную катавасію зьявіўся ля Архіпа й сам ліпавіцкі пан. Найстарэйшыя зь Літоўцаў, ветліва пакланіўшыся, прасілі, каб паслаў сваіх людзей дамоў і не чапаў Архіпа. У галасох гэтых чуў ліпавіцкі пан ня толькі прозьбу, а й пагрозу, а дападлівае вока ягонае хутка ацаніла патэнцыяльную сілу народу, што навокал гусьцеў, рос і гудзеў. Адклікаў ліпавіцкі пан сваіх людзей ізь сякерамі й піламі, а сяляне навакольныя з удзячнасьцю й пашанай паглядалі на Архіпа, што хаця-нехаця стаўся мабілізатарам народнае салідарнасьці й сілы. Гэтак пра Архіпа разпавядалі мяйсцовыя старажылы.

Ня ведалі літоўскія людзі, ці дзякаваць Творцу за тое, што пасуседзтву зь імі разьмясьціў Гараватку. Цяжка гадаць, ці каму зь іх прыходзіла думка ставіць пытаньне Гараваткі ў такой прызьме - зьвязваючы зь ейным існаваньнем Творцу. Вось яна, гэтая Гараватка была побач - так, як заўсёды за днём прыходзіў вечар ці ноч, або як тое, што на сьвет сьвяціла сонца. Гараватка была рэчаісная, пасуседзтву, і нерэчаісная, мітычная - тая, што, зьвязаная з рознымі казкамі й лягендамі, існавала ўжо ў гісторыі ваколіцы. Здавалася некаторым практычным і галодным зямлі людзям, што, каб гэных дваццаць ці больш гактараў (а хто-ж яе калі, папраўдзе кажучы, мерыў?) сугра ды было пакрытае, скажам, ураджайнай глебай, вунь

колькі можна было-б дабра выгадаваць. З другога боку - ці належыла-б тады Гараваткa літоўскім? Хіба не.

Якая-ж была практычная карысьць з Гараваткчынага суседзтва?

У ясны дзень, калі на ейны горб узыйдзеш, вунь як добра ўсё навакольле можна пабачыць: ня толькі маёнтак Ліпавічы ці засьценак Галавачы, але добра бачныя былі гацкіх сьвятыняў ды іншыя большыя будынкі; як на далоні гэт! Як далёка выпрастаўся шлях чыгункі, выкрыўляўся вуж гасьцінца ды вялізарны дыван сумежнага скарбовага лесу аж да грывы ягонай на небакраі. Сьмялейшыя яшчэ ўзьбіраліся аж на вяршаліну шырока-пышнае разложыстае кароны старога Архіпа, каб сягнуць вокам яшчэ шырэй. Ня дзіва, што падчас вайны Гараваткa была стратэгічным пунктам.

Хто ведае, ці не прабавалі калі людзі з Гараваткі ўжыткоўную зямлю зрабіць. Мо сьлядамі гэных спробаў былі крушні каменьняў, што й цяпер мейсцамі на сугры ляжэлі. А мо камяністасьць Гараваткі была прычынай, што сквапныя на зямлю пачынальнікі, апусьціўшы рукі, разьвітацца мусілі з добрымі намерамі.

Кажуць, што некалі з Гараваткі, як з тэй перадойкі ўзімку, была людзям нейкая малая карысьць: гэта як чыгунку будавалі побач, адсюль каменьне, жвір і пясок цягалі, каб выраўнаць западзіны цімала якіх мяйсьцінаў на чыгуначным шляху. Апавядальнікі аб страхалецьцях настойвалі, што якраз гэным часам, заглыбака сугор рыючы, чарцей ды іншую нечысьць у Гараваткцы зачапілі, дык ад таго часу здані й іншае ліха пачатак бярэ.

Ведама, што на працягу стагодзьдзяў Гараваткa дала прытулак цімала якім напасьнікам на нашую бацькаўшчыну; казалі, што ляжалі тут косткі Швэдаў і Французаў, Палякаў ды Маскалёў, Немцаў ды іншых. Некаторыя цьвердзілі, што якраз таму такім буйным і ўстойлівым рос Архіп, бо попеламі чужнікоў жывіўся. Што-ж да чарцей, то, калі й былі яны, дык ладна патрывожылі іх Першай Сьветавай Вайною.

Кацілася гэная вайна, кацілася, дый у ваколіцы Літоўцаў прыкацілася. Грымела дзесь воддаль дый да Гараваткі дагрымелася.

Прыйшлі зноў чужнікі ды аблюбавалі Гараваткy ці не за тое, што над ваколіцай панавала. Як краты, пачалі рыць-тачыць грудзі ейныя, пасьля-ж у гэныя вытачаныя норы й канавы зашывацца. Пачало вухкаць з Гараваткі па ўзьлесьсі й гасьцінцы, што ля лесу бег, а гэныя

другія зь лесу, каб у даўгу не застацца, ды гэтым гаравацкім у вадказ. І пражыліся, курыліся, смылелі агнём, травіліся літоўскія гаспадаркі, бацькаўшчыны і дзедаўшчыны працавітых і нічым тут не вінаватых літоўскіх сялянаў. Літоўскія-ж мужчыны й жанкі, па сваіх меншых норах хаваючыся, на тое вуханьне ў вадказ: мала тут свае было нечысьці, дык яшчэ другіх іншых рагатых з-за паўсьвету папрыганяла.

Адзін Архіп, як і раней, горда й непарушна стаяў на горбе і як-бы ўсёй тэй галасьлівай вакольнай мітусьні абыякава сваім старэчым чубам прыглядаўся. Што яму! Адзін ці другі кавалак зялеза-асколка, або якая куля ў камель пападзе, кару адшчэпіць. Пападалі-ж і раней. Адно каб пачаў лічыць, колькі гэта на працягу свайго даўгога веку ранаў перанесьці давялося. Гэта-ж не навіна. Пережыў тых, сплывуць і гэтыя. Яны, бы той вецер, што аб ягоную карону й магутны камель разьбіваюцца: павухкаюць, за чубы патузаюцца дый пойдуць. Ён-жа быў, ёсьць і будзе: устойлівы, трывалкі й непарушны.

Цягнулася гэная перапалка доўга й не давала жыць людзям літоўскім. Калі-ж нарэшце адгрымела і адвухкала, калі адплыла чужая хваля, павылазілі літоўскія з нораў сваіх, ды пайшлі мужчыны на Гараватку парадак рабіць. Трэба-ж было тым, што за «гаймат» дужаліся й тым, што «за веру, цара і ацечаства» ходаліся, у Гараватчыных грудзёх прытулак даць. І апошняе слова зноў было за літоўскімі: «Лезьце, - казалі яны, - у вадну яму! Мы вас от цяпер памірым. Гэта-ж нявідана-няслыхана, пазганяў вас сюды чорт на галовы нашы з-за паўсьвету!»

На парытых-паточаных, ваенным хламам засьмечаных грудзёх Гараваткі, вырас падоўжны, быццам той сьціртаваты капец бульбы, сьвежы курган. Побач ранейшых прыблудаў, што тут вечны супачын сабе знайшлі, трухлець ляглі косьці новых ахвяраў, што не за свае звадкі Бог ведае адкуль ходацца сюды прыйшлі. Швэды ці Французы, Маскалі, Немцы ці Палякі - усім роўны прытулак дала беларуская зямля.

Літоўскія-ж людзі ў бальшыні богабоязныя, пабожныя былі. Мала калі было, каб каторы йдучы ці едучы, пры дарозе капліцу ці крыж вялікі драўляны зь фігурай Збавіцеля або й безь яе сустрэўшы, крыж на сваім перадзе не зрабіў і «міца і сына» не сказаў. Вось чаму цяпер ля гэтага сьвежага кургана вырас вялізны, з тоўстай роўнай бярозы змайстраваны крыж, а на ім - самародкам-мастаком выструганая

фігура Збаўцы. Цяперака ці адзін шашаль ужо крыж той патачыў, дый сам ён пад цяжарам аднаго ці двох дзясяткаў гадоў спаважнеў і на бок пахіліўся. Іншымі мейсцамі на сугры ў западзінах вырасьлі сосны й хвоі, а ў ніжэйшых мяйсцох, дзе на гліне трымалася вада, нават і кустаўё.

Бадай ці ня ў кожнай вёсцы беларускай была аблюбаваная мясьціна, што на языкох апавядальнікаў аб розных жахах і злыбядзе пакутавала. Такой мясьцінай, што па сваёй маляўнічасьці не паддалася-б многім іншым, Бог ведае як даўно была Гараваткa. Дзеткі літоўскія, што толкам бабчыны ці матчыны апавяданьні цяміць маглі, пабажыліся-б, пэўна, што ў Гараватцы водзяцца чэрці, паказваюцца здані, што бадай калі каму й у пекла трапіць давядзецца, дык дарога туды будзе ці не праз Гараваткy весьці. Калі, бывае, усходзіцца ў вёсцы з плачам каторае малое, так і пачуеш з матчыных вуснаў: маўчы, а то чорт гаравацкі пачуе! Мала таго: калі хто з суседніх каторага літоўскага, завёўшы звадку, за жывое стараўся скубануць, дык чортам гаравацкім называў. Дзеяла, як на быка чырвоны рызман.

Папраўдзе кажучы, каб усяму веры даць, дык, мусіць, у Гараватцы ад чарцей, чарцянят і іншай нечысьці аж кішэла. Узімку пад Піліпаўку вадзілі тут свае карагоды ваўчыцы, страхотным выцьцём ваколіцу поўнячы. Гараватка была маляўнічая й таямнічая, страшная й прынадная. Дзіва няма, што малеча нагой ступіць у Гараватцы пабойвалася, а старэйшыя ўпоцемку ад яе стараніліся.

Хцівыя да выдумкаў апавядальнікі заўсёды непрыкметна на баку пакідалі адно не апошняй важнасьці: калі й як гэтая цікавая мясьціна дастала хрышчэньне. Адныя парознаму тлумачылі, іншыя згадкамі таямніцу гэтую раскрыць намагаліся. Калі-б хто й хацеў аб тым назове з усіх бакоў памяркаваць, дык ці не дайшоў-бы ў сваёй галаве, што Гараватка нейкім чынам параднілася з «горам», «гараваць» і іншымі з гэтага выводнымі абазначэньнямі. А калі так, то ці трэба яшчэ гаварыць, аб чыім горы была мова...

III

Тыдні тры ня быў удома Янук. Карціла яму бегчы. Пакуль да бацькі забяжыцца, словам-другім із старымі перакінецца, пакуль на вечарыну зайдзе, дык вунь як позна будзе. А ноч-жа цяпер кароткая, яе не надточыш. Босыя Януковы ногі, што за дзень за каровамі набегаліся, вунь якімі нецярплівымі цяпер сталі і ўжо якнайхутчэй маніліся з асаднікавага двара пад бацькаў дом панесьці. Адылі перш вырашыць трэба было пытаньне: куды йсьці? Ці гасьцінцам, ды зрабіць лішні кусок дарогі, ці кроіць нацянькі праз Гараватку? Калі-б асьмеліўся нацянькі, можа было-б скараціць ці не ўтрая дарогу. І трэба-ж было, каб гэтая Гараватка, як на злосьць Януку, упоперак дарогі да бацькоў лягла. Калі-б гэта быў дзень, дык ніякае загваздкі: смарганўў-бы нацянькі й квіта. Цяперака-ж пакуль перабяжыш поле Лазоўскага, там праз мокрадзь ля канавы перабярэсься, зарасьнікі мінеш, што з гэным вялікім борам лучыліся, ды на Гараватку ўзьлезеш, дык глядзі колькі часу міне.

Янук кінуў вокам на захад. Сонца закулілася ўжо за зубата-кашлатую карону бору, зьнізу ярка пазалочваючы пер'е рэдзенька расьцярушаных па небе хмарынак. Ужо шарэла. Марудзіць няма калі. Потная левая рука сьціскала тры малыя манэты ў кішэні даматканых зрэбных портак. Тапсік, зьеўшы страву й вылізаўшы старанна чарапок, аблізваўся й пазіраў на хлопца, трымаючыся напагатове, каб спадарожнічаць. Пастух зірнуў на сабаку й наважыўся. «Маючы такога добрага таварыша, - думаў ён, - дык хто там будзе чарцей баяцца, калі яны й ёсьцека».

Калі Янук, выбегшы за вароты двору, рушыў у кірунку Гараваткі, Тапсік, як ёмкі мяч, кульнуў раптоўна наперад, апісаў навокал хлопца вялікае кола ды, радасна брэшучы, скочыў яму на грудзі, намагаючыся лізнуць у твар. Сабака, відаць, здагадаўся, куды сьпяшаўся ягоны гаспадар. Яму таксама карціла зьбегаць у родную вёску, старыя куты абшнарыць, із знаёмымі й даўно нябачанымі сябрамі пацяўкаць ці панюхацца.

Любіў Янук свайго Тапсіка. Шчанюком узяў яго ад маткі, што надта заядлая й крутая была. Тапсіку цяпер пад тры гады было. Разумны й паслужлівы ўдаўся - мала дзе такога знойдзеш. Хлопчык муштраваў яго, часу не шкадаваў, уцеха з таго вялікая была. Цяперака за тое меў добрага памочніка вартаваць статак. Зімою сабака паквапіўся нават зь Януком у школу пайсьці. Калі аднойчы надакучыў

у школе вартаўніку, а раз падчас заняткаў асьмеліўся нават клясныя дзьверы лапамі скрэбсьці, каб да свайго гаспадара дабрацца, давялося пакідаць ягу ўдома.

Крокаў ці не на дзесяць шырокая канава была напалову напоўненая вадой. Янук знайшоў тое мейсца, дзе з аднаго боку на другі перакінутыя былі дзьве жардзіны, ды асьцярожна, растапырыўшы рукі, каб атрымаць раўнавагу, пераходзіў на другі бок. Тапсік скочыў праз ваду, і, калі Янук ступіў на бераг, сабака абтрасаўся ўжо й ветліва віляў хвастом.

Сьцежка вяла праз густы зарасьнік. Калі Янук упёрся ў Гараватку, ужо цямнела й на небе паказаліся першыя зоркі. Ведаў хлапец Гараватку як сваю пяцярню. Ці раз ізь сябрамі лазіў тут па старых акопах, заглядаў у часткова засыпаныя ўжо бліндажы, цешыўся, калі знаходзіў пайржавелую амуніцыю, зь якой любіў забаўляцца на пасьце ля вогнішча. Вандроўкі тыя адбываліся ўдзень, калі Гараватка не была небясьпечная й зусім інакш выглядала, чымся цяпер. У цемры яна камплетна зьмянялася, набірала нейкай страхотнай таямнічасьці. Здавалася, што сваёй шырокай каронай падпіраў Архіп усеяны залатымі зоркамі купал неба. Інакш, чым удзень, дрыжэла, наводзячы нейкую жуду, лісьцё асінаў, а ззамоладу створаныя ўва ўяўленьні розныя чэрці, што тутака, быццам, свае гулянкі начамі ладзілі, цяпер маглі таіцца за кожным кустом ці крушняй каменьняў. Завялікі ўжо быў Янук, каб у чарцей верыць, але-ж тут, папраўдзе кажучы, цімала людзей у нетрах Гараваткі ляжала. Хто ведае, ці каторыя зь іх не ўстаюць начамі, каб полем бою палюбавацца.

Янук асьцярожна ступаў знаёмай сьцяжынай. Вушы ягоныя злавілі водгульле літоўскай вечарыны. Хлапец падбадзёрыўся й барзьдзей усьпінаўся ўверх. Набліжаючыся да самага небясьпечнага мейсца - побач з тым самым курганам і крыжам - ён спыніўся таму, бо раптам стануў, як укопаны, Тапсік. Сабака бурчэў. З правага боку былі тут ямы й акопы. У цемрадзі мала што можна было разгледзець.

- Ціха, Тапсік, ці-і-і-і..., - зашышыкаў ён на сабаку, абшчаперыў яго аберуч ды пачаў прыслухоўвацца. Здалося, што непадалёк направа пачуў галасы. Мо здалося? Ахапіў яго страх. Як не натужваў слых, усё навакол стала таямніча ціха, адно шпарчэй пачало біцца пастухова сэрца. Здалёк чуваць быў гул цягніка, дзесьці зь вёскі даляталі водгукі

йгрышча, зьвяганьне сабак, а ў недалёкім бары адазвалася позная птушка.

Ізноў наёжыўся, пачаў бурчэць і вырывацца з рук Тапсік. Янук не на жартачкі спалохаўся, баяўся рушыць зь мейсца, быццам у зямлю ўліп. Калі яму здалося, што зноў злавіў вухам нейчую гаворку, сабака гвалтоўна йрвануў направа і заліўся гулкім брэхам. Амаль у наступную хвіліну з голасным енкам ён адскочыў назад. Янук кінуўся да Тапсіка, і ў гэны-ж момант убачыў сьвятло ручнога ліхтарыка. Робячы малыя зыгзакі ў паветры, сьвятло набліжалася да хлопца. Сабака ціха скавытаў і лізаў нагу.

- Гэта ты, Янук? - загудзеў лагодны бас Лявона Шпунта. Хлапец стаяў, як адубелы, ня могучы паварушыць языком. Намагаўся нешта сказаць, ды ня мог адолець пярэпалаху.

- Што ты тут робіш? - хацеў ведаць Лявон. Янук разгледзеў дзяцюка. Апрануты быў пасьвяточнаму, у гарнітуры й пад гальштукам.

- Дамоў іду, - адважыўся нарэшце малы Бахмач. - А ты што тут робіш? - спытаў ён з чаргі. - Але-ж ты мяне напужаў, каб ты згарэў!

- Дык ідзі, калі йдзеш! - сказаў Шпунт загадным тонам.

- А што ты тут робіш? - спытаў яшчэ раз Янук.

- Тваё якое дзела! - адрэзаў той непрыязным тонам. - Можа, я ізь дзяўчынай тутака. Кажу йдзі!

Януку здалося, што воддаль каля дрэва нехта зварухнуўся. Хто-ж мог тут быць зь Лявонам у такую пару, калі сам ён мусіў-бы быць на вечарыне? І што яны тут рабілі? Адылі Янук больш не марудзіў, бо чаго добрага, возьме гэты рослы дзяцюк, яму ў каршэнь надае. Рушыў сьцежкай, а за ім, пакульгіваючы, сабака.

- Мой ты добранькі Тапсічак, - пяшчотна прамовіў, гладзячы сабаку, - ударыў цабе гэты паскудны хлыст...

Як толькі хлапец выбраўся з Гараваткі на чыстае поле, нацянькі праз збажыну бегма кінуўся ў кірунку Літоўцаў. Мала дзе каторая хата сьвяцілася вокнамі. Летам ашчаджалі людзі газу, завідна намагаліся дагледзець гаспадаркі. Сяньня-ж тым больш не было патрэбы, бо шмат хто быў на йгрышчы.

Шпарка бягучы, Янук нічога ня думаў. Ды калі-б і думаў, то невядома ці прыйшло-б яму ў галаву, што ўночы жывы чалавек у Гараватцы ёсьць больш небясьпечным, чымся якая ўяўная нечысьць. Хлапец быў паглынуты ймкненьнем, каб якнайхутчэй забегчы дадому.

Па пахілай лекаравай ніве борзда ймчаў ён уніз. Ледзь пасьпяваў за ім кульгавы Тапсік.

Калі дабег да лекаравага двара й адчыніў скрыпучыя вароты, голасным брэхам заліўся доктараў Мурза. Тапсік падскочыў да яго, сабакі пачалі нюхацца. Янук адчыніў другія вароты й ужо быў ля свае хаты. На вулічнай лаўцы ў цемені разпазнаў сваіх бацькоў. Яны гаманілі паўголасам.

- Гэта ты, Янучок? - спытала маці.

- Так, мама. А што?

- Ды мы ні спадзяваліся. Ждалі ўчорака, ажно як ні было...

- Ні пусьціў, - сказаў Янук з крыўдай у голасе.

- Іж ты яго, - буркнуў бацька. - Чаму-ж гэта?

- А чорт яго знаіць, - адказаў хлапец. - Ну, што тут у вас?

- Нічога такога. Ты вячэраў?

- Так, на хаду. Ну дык я пайду, - памкнуўся ўжо адыходзіць Янук.

У гэты час падбег Тапсік.

- А чаму-ж сабака кульгаіць? - заўважыў бацька.

- Ды гэты хлыст ударыў яго, ні знаю, камянём ці чым.

- Хлыст? Калі гэта?

- Ну от цяперака.

- А дзе-ж ты яго відзіў?

- У Гараватцы, дзе-ж...

- Ён цяперака ў Гараватцы? Ты ні маніш?

- Чаго буду маніць... кажу, што на свае вочы відзіў.

- Дык гэта ён, мусіць, тамака із Косьцікам Сабакевічам, - сказала маці.

- Ты яго самога толькі спаткаў ці яшчэ каго? - перапытаў бацька.

- Самога. Але мне выдалася, што чуў гаворку. Быў нехта другі, мусіць.

- Дык пэўна Косьцік там зь ім, - сказала тонам, што не пакідаў ніякага сумлеву, маці.

- Чаму гэта ікраз Косьцік? Адкуль там ён? - дамагаўся пастух.

- А ты ня чуў?

- Што чуў?

- Што сягоньніка на фэсьця ў Гацях нехта бальшавіцкія ахвішкі параскідаў...

- Так? - зьдзівіўся Янук. - А мне-ж гэтыя, каб іх халера, доктаравы нічога не сказалі.

- Так і ведай, што гэта Сабакевічавых рук ні мінула.

- Глядзі ты што. Дзіва, што Лявон так на мяне сыкнуў. Ну, ды я пабягу, бо ўжо позна.

- Янучок!

- Чаго?

- Ідзі, хоць штаны й кашулю пірадзень, а то як ты ў латаных на людзкое вока...

- Адзе-ж яны?

- Я табе зараз дам.

Пайшлі з маткай у хату. Было там душна й цёмна. Упоцемку ўміг зьмяніў Янук вопратку й вышмыкнуў на вуліцу.

- Янук! - гукнуў бацька.

- А што, тата?

- Ты-ж глядзі тамака ні кажы нікому, што ў Гараватцы хлыста відзіў. Чаго добрага, бяда прычэпіцца, - папярэдзіў Пракоп Бахмач на дарогу сына.

- Што я дурны?! - адгукнуўся хлапец і шыбнуў у глыб вёскі.

IV

Косьцік Бурак, пазьней празваны Сабакевічам, быў сынам гаспадарлівага серадняка. Бацька Паўлюк меў ладны кавалак урадлівае зямлі, прыдзелены ў часе выхаду вёскі на хутары пры самым літоўскім балоце.

- Гэта каб на добрае, - мяркаваў ці раз Паўлюк, - дык жыць-бы, пажываць ды песенкі піяць...

Адылі немач у ягоную хату панадзіла. Кволае жончына здароўе яшчэ больш шванкавала пасьля таго, як Кастусь на сьвет зьявіўся. Хацеў, казалі, Паўлюк абавязкова, каб і другое, ды слабая Паўлючыха вынасіць не магла. Спачатку прабаваў Бурак кпіць з кабеты, пасьля дакараць, а наапошку й зусім узлаваўся.

Калі-б пацягнулі вы за язык (хоць ці патрэбна гэта было) найбольшую вясковую пахатуху, дзябёлую Кмітаву Аўдолю, яна зусім-

бы йнакш і пасвойму ўсе прычыны Паўлючышынай немачы, як на стол, для яснасьці перад вамі магла-б выкласьці.

- А ягодка-ж мая, а любая - барабаніла ці раз Аўдоля на вуха каторай кабеце, што слухаць хацела, - гэта-ж загнаў-зацягаў Бурак саўсім сваю Матрону. Глядзіш і ні аглядзісься, як у магілу загоніць. Ні жартачкі-ж гэта: дзе ні глянеш, дык усюды яна ў тры пагібелі скорчыўшыся - яна й на полі, і пры печы, і за прасьніцай, і зь сярпом, яна й за кроснамі, і пры малатарні, і з траплом, і пры мяліцы. Яно-ж сабе й другія бабы лынды ня б'юць і цяжка працуюць, алі-ж ёй, дык ужо піразь сілы прыходзіцца. Можа й ня грэх быў-бы Паўлюку, каб аж чатурох кароў, сьвіней поўны хлеў ні гадаваў, кабаноў вялікіх, як горы, ні выкармліваў. А ты-ж ім навары, намішай, ды націгай у карыты - дух зь цябе вон! А хто-ж гэта, ягодка родненькая, за ўсім даглідаіць? Га? Сам нябось ні пірапрацуецца, рыла вунь якое адпасьвіў! А Божа-ж мой, які гэта прагавіты й нінасытны чалавек. Ці раз казала я ўжо, што для яго скаціна жонкі даражэй. Гэта-ж нявідана-няслыхана. Такі жадны-прагавіты й такі скупіньдзя, што, каб ён на каліва наняў, а ўсю працу на жончын карак толька. Сам, дык, нябось, улегцы. Дзіва, што Матрона занімагаіць часта. Зялезнае здароўе, ягодка, трэба мець, каб із усім, як іна, справіцца. Бедная ў горы вочы выплакала, як шчэпка высахла, у тры пагібелі скорчылася, сухоты нажыла. А ці-ж гэта ёйныя гады так зараньня ў магілу лезьці, га?

Па засвоенай практыцы, перасольваць і размалёўваць Аўдоля любіла, але ў гаворцы пра Буракоў вялікая доля праўды была. Хітры й прагавіты быў Паўлюк. Хоць ростам здаравенны гаргарына быў, але ня з тых, што ў працы панатужацца. Сам зь сям'і беднай і шматдзетнай, ад бацькі пару лысых неўрадлівых гактараў зямлі пры дзяльбе атрымаў. Адно й меціў, як на людзкую гаспадарку ўзьбіцца. Прыцюцькаўся быў да Матроны, што ў суседняй вёсцы ў бацькі адзіночкай расла. Паўлюк на пасагу вока трымаў. Казалі, што прыляпіўся да дзяўчыны, як тая смала, дый шмат іншых заляцанцаў, што на Матроніна дабро, як мухі на ліпкае ляцелі, ад яе адбіў. Калі-ж Матрона за яго выйшла, купу багацьця ў сямейную супалку прынёсшы, не на жартачкі ўзяўся гаспадарыць Паўлюк. Нельга сказаць, каб лішняй увагай ці любасьцяй да жонкі грашыў. У ягоных вачох жонка на тое была, каб дзяцей на сьвет вадзіла, гаспадаркі глядзела ды наагул у працы пасабляла.

Калі Паўлюк Бурак ужо цьвёрда на ногі стаў ды не апошняй маркі багатыром зрабіўся, калі можна было ўжо вальней і лякчэй у працы хадзіць, ён барзьдзей яшчэ разганяўся. Зайздрасьць да багацейшых, а поруч і прагавітасьць расьлі без супынку. Горшаў і Буракоў характар. Раней мала каму ў дарозе спуску даваў, а цяпер і пагатоў. Жончын пасаг да рук прыбраўшы, і самую кабету пачаў, часта із папругай у руках, да сваіх нораваў прывучаць.

Ад цямна да цямна летам пры працы Паўлючыха кешкалася, а зімой і зусім сьвету божага ня бачыла. Нават на жніво шкадаваў скупіньдзя Бурак паднаняць. Калі Матрона зусім занемагаць пачала, тады лекаваць прабаваў, ды сказалі лекары, што заавансаваным сухотам рады ўжо не дадуць. На дзявятым Косьцікавым годзе скончылася матка.

Мінуў няцэлы год, і Бурак, лішне не марудзячы, ажно ў трэцяй дзесь вёсцы прыгожую й здаровую, ды - як хваліўся - выносьлівую нагледзеў. Хоць і ня першай маладосьці, адылі зусім ні ў гадох яшчэ была. Спадзяваўся Паўлюк, што трывалкая й дужая да працы будзе кабета. Ужо цешыўся, што ня горшы гяшэфт, чымся першы раз, із Матронай пры жаніцьбе зрабіў.

Ды апёкся гэтым разам стары Бурак. Ня з тых, што іх лёкка ашукаеш, Косьцікава мачыха выводзілася. Зусім ня менш кемлівай за Паўлюка яна ўдалася, дык і няшмат часу заняло, пакуль у мужавых хітрасьцях і штучках троп знайшла. Вочы працёршы, разгледзелася, ды зусім інакш да Паўлюка, чымся пакойная Матрона, паставілася. Працавала адно ўмеру, а калі й на язык дзела пайшло, дык за словам у кішэнь ня лазіла. Новая жонка кругом Паўлюку ў даўгу не заставалася. І пачалося ў прылюднай і добра дагледжанай багатырскай Паўлюковай хаце зусім адменнае й цікавае жыцьцё: калатня й звада найчысьцейшае вады.

З малых гадоў Косьцік уволю матчынай ласкі й добрага догляду ня меў. Калі-ж прыйшла мачыха ды хлапец спанатрыў, што робіцца, амаль зусім самапасам пайшоў. І з росту ён не да малышоў належаў, і ў навуцы спрытны быў, але ўжо ў пачатковых клясах сябе вялікім гультаём і абібокай выявіў. Ззамоладу іншых панадзіў зводзіць, ці ня бацькавы элемантарныя хітрасьці пераняўшы.

Вясковая настаўніца рана Косьцікаву нягнуткую натуру ацаніла й пасвойму яе напраўляць узялася. Спасьцерагла, што хлапец ня зломак.

Ці ня больш за іншых вучняў давялося Косьціку ў клясным кутку на каленях адпакутваць ды й карных гэтак званых лапаў зарабляць. Колькі ні карала яго настаўніца, Косьцік аніяк у лепшы бок ня хіліўся. Наадварот: яшчэ цьвярдзеў у благіх норавах. Глядзіш - здаецца, паправіўся, сядзіць вунь за адкладной лаўкай з анёльскай мінай, няйнакш як сьвяты. Не пасьпееш вока ў іншы бок адвесьці, як ён ужо некаму ці то таўхяля пад бок заедзе, ці якую іншую штуку прыдумае.

Як рэдзька агорклі былі Косьціку настаўнічыны муштры. Аднойчы наважыўся ён плюнуць на чатырохклясную. Колькі дзён запар, зранку бацькаў дом пакінуўшы, па аднаму яму вядомых сьцежках лундаў і ў школу носа не паказваў. Дайшло тое да бацькавых вушэй. Добра ўляцела тады Косьціку з двох бакоў: ад бацькі за чмуту, а ад настаўніцы ў сваю чаргу, калі бацька ледзь не за руку ў школу сына прыцягнуў.

Пастанавіў Косьцік настаўніцы за такую вялікую крыўду адпомсьціць. Думаў, думаў і выдумаў. Даўно даспадобы яму настаўнічын ручны гадзіньнік прыйшоўся. Падчас лекцыі заўсёды на стале перад сабой трымала, каб за стрэлкай у меры патрэбы сачыць. Пускаючы на перапынак дзяцей, надзявала гадзіньнік на руку й сама на сьвежае паветра выходзіла, калі пагода дазваляла. Аднойчы неяк, маючы галаву навучальнымі турботамі да берагоў перапоўненую, забылася гадзіньнік на руку начапіць і ўжо, калі хлопцы на дварэ ў пікара мурцавалі, а дзяўчаткі ў лапту забаўляліся, спахвацілася, што гадзіньніка на стале няма. Яна й туды, яна й сюды, і пад стол, і ў «тарэбку», ды трывожныя пошукі дарэмнымі былі. Дарагі залаты гадзіньнік быццам у ваду кануў.

Цяпер ужо не на жартачкі настаўніца турбавалася й рэшту таго дня, навучаньне ў бок адклаўшы, усіх пачарзе ператрасала. Гадзіньніка не было. Адумаўшыся, пані настаўніца бальшыню вучняў дамоў паслала, а найгоршых і ў ейных вачох падазроных трымала й муштравала яшчэ больш гадзіны. Як ня дзіва, а здавалася ёй у той час пошукаў гадзіньніка, што амаль усе пагалоўна вучні ейныя, а ў іх ліку насампершы Паўлюкоў Косьцік, проста ці не сьвятыя былі. Ты іх хоць да раны прыкладзі. Ты перад імі найбольшыя скарбы тут на воку пакладзі, адыдзіся й у гэны бок не глядзі, дык і то не зачэпяць.

Добра ведаючы сваіх вучняў, шляхам элімінацыі да двух найбольш западозраных - Кучынскага й Бурака - свае допыты-пошукі

настаўніца звузіла. Наступнага дня ў школу іхных бацькоў і местачковага паліцыянта паклікала. Косьцікавага сябру Кучынскага ў прысутнасьці бацькоўскай і «жандовай» улады апрацавала першага. Зь ягоных вуснаў выйшла, што залаты гадзіньнік Косьцікавых рук ня мінуў. Ужо Паўлюкова выпрактыкаваная раней на сынавай скуры папружка ды й «жандовы» паліцыянтаў твар канчаткова памаглі Косьціку прыгадаць, дзе схаваў настаўнічын гадзіньнік.

Мала з таго было пацехі. У міжчасе Косьцік няўмелую экскурсію ў залатое гадзіньнікава нутро зрабіў. Вядома-ж, што гэтак падарожнічаючы, гадзіньнік на часткі мусіў разабраць і кожнай зь іх палюбавацца. Калі ўзяўся складаць, дык часьцей гэных аднекуль набралася больш, чым было патрэбна. Наапошку, як і трэба было прадугледзець, у залатым чарапку застаўся зусім непрыдатны механізм, бо Косьцік тыя лішнія часткі павыкідаў.

Круці не круці, Паўлюку загадалі поўную вартасьць настаўнічынага залатога ручнога гадзіньніка самымі запраўднымі «жандовымі» грашмі пакрыць. Гэтым, хіба, тлумачылася, што тымі часамі старога Бурака гнуткая ёмкая папружка ніяк не жадала разьвітацца з Косьцікавымі наймякчэйшымі й найбольш кволымі часткамі цела. Найгорш за ўсё, што вясковыя кабеты, а найперш Аўдоля й іншыя пахатухі-сакатухі, гадзіньнікаву гісторыю на языкі паднялі ды на розныя лады яе із смакам пераказвалі й размалёўвалі. Дзякуючы тым увішным і нязмораным кабечым языком, Косьцік цяпер найбольш папулярным у Літоўцах стаўся.

Калі, маючы чатырнаццаць гадоў, Косьцік нейкім фокусам чатырохгодку скончыў, ня ведаў Паўлюк, куды далей накіраваць сына. Па завугольлямі гадзіньнікавы злодзей пачаў сноўдацца й ніколі дома не стыкацца. Якіх сродкаў ні ўжываў бацька, усяроўна да працы ня мог сына наламаць. Зьбярэ, бывала, Косьцік гурт падлеткаў, па вуліцах ізь імі псотнічае-гэйсае, сады чужыя латоша, агародніну поліць - ці ў каго вялікая морква або бручка парасла глядзіць. І скардзіліся людзі, кажучы: «Але-ж і бамбіза, зладзюга паганы! Няўжоў-ж на яго паганякі ніхто ня знойдзе!» А іншыя проста: «Вырас Паўлюкоў Кастусь пад неба, а злодзей і дурань як трэба.»

Хто мог тады мяркаваць, што ў недурной Косьцікавай галаве ўжо ў той час былі парасткі, якія мелі некалі прынесьці плён, што аднавяскоўцам бакамі вылезе.

Надакучыла Паўлюкову гіцлю з «жабянятамі» яблыкі й грушы латашыць, агародніну чужую лічыць. Пастанавіў на сабачае перакінуцца дзела. Меў аднагадовага сабаку-ваўчара, ад якога ледзь ня лопаў на прывязі ланцуг. Пару месяцаў, калі ня болей, сабаку школіў, розным штукам муштраваў. Так яго выпрактыкаваў, што той наперад гаспадаровы думкі згадваў. Гэткую добрую Косьцікаву навучальную ўстанову пасьпяхова скончыўшы, ільга было цяпер у людзі ці ў іншыя сабакі паказацца. Адно стаяла на дарозе: ня меў вучань імя адпаведнага.

Чуў раз Косьцік як настаўніца, у каторай гадзіньнік быў украўшы, мужа свайго Ромка клікала. Ахватней даў-бы настаўнічына ймя, але яно адно для сучкі пасавала.

- Ро-о-мак! На цю-на! - гукнуў хлапец, а сабака пачаў стрыгчы вушамі. Гэткім чынам адбылося хрышчэньне.

Прыйдзе Косьцік цяперака пад самае вакно настаўнічынай кватэры, ды ўладзіць так, каб мужа ейнага паблізу не было. Сьвісьне ёмка на свайго кемлівага гадунца, ды гукне: Ро-о-мэк, офяра едэн, хоць ту! На цю-на!

Паўторыць так раз ці два. Адкуль ні вазьміся настаўніца, тыц! - праз вакно выгляне, а калі сьцяміць, у чым справа, то ажно ёй кроў у галаву хлыне.

- Ро-о-мэк! Ты, пся крэв, хаме едэн! - паправіць падрастаючы басяк ды аж яму на сэрцы палякчэе.

Ад таго часу для літоўскіх людзей, а перадусім сабакаў, новае ўтрапеньне пачалося. Чуеш - нехта сьві-і-ісь! Гэта Косьцік із Ромкам ідуць. Памаленьку, ледзь ногі валочаць, забаўляючыся, нікуды-ж ім ня рупіць. От ідуць, абы на мейсцы не стаяць, навокал разглядаюцца. Спыніліся ля гарбатай Захаруковай хаты, што напрыканцы вёскі ля дарогі ад балота. У Захарука вялікі сабака ў дварэ. Косьцік да справы падыходзіць мэтадычна, майстэрства ведаючы, сабакаў зводзіць умела. Калі ўжо добра зрэжуцца, ды да крыві кусацца пачнуць, хаваецца тады хлапец дзесь за паркан ці вугал, каб усё бачыць да на людзкім воку не тарчэць.

Старая Захаручыха з памялом ці качаргой надвор выскоквае, лямантуе: «А каб цябе пранцы, а каб ты занагліўся! Вон адсюль, паршывец!» Сабакі кусаюцца, Захаручыха лае й намагаецца разбараніць, Косьцік нейдзе праз шчыліну пазірае й заходзіцца з

рогату. Ужо наапошку, калі відокам налюбуецца, вылазіць з укрыцьця й таропка падбягае, робячы выгляд, што быццам ён тут нейдзе збоку справай заняты быў, а цяпер вось бедных цюцькаў памірыць сьпяшыцца. Ну й актор-жа! спачатку не маглі людзі здагадацца. Ды нядоўга заняло ім, пакуль Косьцікавы хітрыкі раскусілі. Часамі-ж, бывала, Косьцік такі гурт сабакаў зьвядзе, такую грызьню пачнуць, так пакусаюцца, што тыднямі раны гояць.

Спачатна на такія Косьцікавы авантуры праз пальцы літоўскія жыхары глядзелі, ды неўзабаве спасьцераглі, што ад Косьціка й Ромкі ніякаму сабаку ні сучцы ў вёсцы мейсца ня будзе.

- Ну і ўшыўся-ж басячуга ў сабачую скуру! Каб ты галавой налажыў! - лаялі.

Насамперш хлапца Сабакевічам ахрысьцілі, а пасля, як найгоршага сабаку, кіямі ад хатаў гнаць пачалі. Кляў яго Пракоп Бахмач:

- А бадай ты ногі дзе паламаў, нячысьцік апантаны! Каб табе розум твой дарэшты высах, злыдзень паршывы! Каб цябе зімля ні насіла, дзе ты такі выгадаваўся!

Стары Бахмач Сабакевіча раз добра-ткі зімой прывучыў. Калі ён на Тапсіка Ромку натравіў, Пракоп яго так кіём аддубасіў, што той дзясятаму заказаў і даўжэйшы час на боль у крыжавіне й іншых мяйсцох скардзіўся. Доўга й зацята Бахмачу за гэта кулаком пагражаў, аддаць ды й надбавіць яшчэ абяцаў.

Скардзіліся людзі старому Бураку: навошта так сына распусьціў? Прыбяры яго да рук, а ня то мы самі прывучым!

Адказваў Паўлюк: «Што я зь ім, басячугам, зраблю, людцы добрыя? Рабіць ня хочыць, мяне ня слухаіць, сварыцца-агрызаіцца...»

Раілі людзі: аддай дзе за краўца ці шаўца, каб наламаўся, кавалак хлеба каб у руках меў.

Паслухаў Паўлюк людзей. Не да смаку тое Косьціку прыйшлося, калі ў другую вёску за краўца вучыцца мусіў ісьці. Гультаюга-абібока быў зь яго першаклясны, але-ж іголка - то не сякера ці плуг - у руках трымаць лякчэй.

Тры ці чатыры гады кравецкаму рамёству вучыўся Сабакевіч. Павесялелі за гэны час літоўскія людзі, лякчэй пачало вадзіцца сабакам, калі Ромка ў старога Бурака на прывязі скуголіў.

Аб тым, што за гэны час кравецкага шкаленьня Сабакевіч зусім новую й пабочную навуку здабываў, ні ведаць, ні сьніць літоўскія не маглі. Заразіўся Косьцік камунізмам. Нарэшце, - наважыў Косьцік, - тутака ўсе адказы былі. І на будучыню ўсё добра варажыла. Вунь зь Менску (тады ўжо на Мінск Маскалямі перайменаванага) цэлы час гарлапанілі, што яны аб заходня-беларускіх сялянах і рабочых турбуюцца ды ў гэнай турбацыі прост-напраст бяссоньніцай морацца, што калі насьпее такі час, дык тут не агледзіська, як яны гэтым бедным заходнім Беларусам руку дапамогі пададуць. Рука тая даўно, быццам, выцягнутая чакае, адно, відаць, час яшчэ не насьпеў.

І пачала інтэнсыўна й напорыста працаваць Сабакевічава галава, тая самая, якую нядаўна яшчэ «дурной як трэба» называлі. «Чакайце-ж, - думаў Косьцік, - прыдзе дзень, дык усіх вас як сабак выдрасірую».

Найбольш Сабакевічу ў камунізьме ўсе гатовыя адказы да смаку прыйшліся. Чым больш думаў аб іх трапнасьці й правідловасьці, тым больш імі захапляўся. Вазьмі хаця гэты, што ў тым «тэрцыянале» быў: «мы наш, мы новы мір пастроім, хто быў нічэм, той станіць фсем». - От дык хвостка. Проста цымус! - усклікнуў Косьцік, першы раз яго пачуўшы. Ад захапленьня чаго не прысеў. Гэта-ж трэба вунь якія галовы, каб так выдумаць! Чалавек ці адзін злысеў-бы й рады ня даў, а тутака так проста й ясна, як у сук уляпіў: «хто нічэм, той фсем». У тым ліку, пэўна-ж, і ён, Буракоў Косьцік, што да гэтага часу самым апошнім шэранькім «нічэм» па завугольлях лындаў, дык адразу ці не на самы шчыт узьлезе. Пры такой саладжавай думцы ажно шырэў і распрамяняўся задаволенай зьедлівай усьмешкай таўсташчокі Косьцікаў твар. «От каб так было, - думаў, - гэта-ж ні аднаму дзе ракі зімуюць паказаў-бы». Думаючы пра гэтае апошняе «паказаў-бы», зьзялі ў Сабакевічавых вачох больш зласьлівыя агенчыкі, чымся тады, як свайго Ромку на чужых сабакаў нацкоўваў.

Калі-ж стравіў ужо адну такую, як яму здалося, вялікую мудрасьць, калі пасьля гэтага наважыў шмат чаго й цімала каму будучыні паказаць, насьпела чарга й на іншае пытаньне: «А што-ж рабіць, каб тыя, што ёсьць нічэм, найскарэй сталіся фсем?» Тут чырвоны агэнт, гэны самы, што Сабакевіча вучыў, напагатове з адказам: «работаць, таварышч. Ідзею в масы, от как!» Той чырвоны нозьбіт цэлае бярэмя іншага наплёў, дый ня ўсё яно ў Косьцікаву маланаўчоную галаву адразу памясьцілася. Адно спанатрыў, што перш

павінен сам «рускай грамаце» падвучыцца, каб пасьля тую «ідэю ў масы» нясьці й шырыць, каб якнайхутчэй «новы мір пастроіць і стаць фсем».

Косьцік так заядла за працу ўхапіўся, што «рускую грамату», быццам той галодны заяц мёрзлую капусту, церабіў. Свае літоўскія людзі нашто ўжо Косьцікаву натуру ведалі, а цяпер, каб гэта ўбачылі, дык ніколі не далі-б веры, што гэты пільны вучань быў той самы злодзей і злыдзень Сабакевіч, што некалі ў пачатковай школе дзіркі на каленях папрастойваў.

Калі Косьцік пасьля навукі з рамёствам у руках у родную вёску вярнуўся, мала хто яго пазнаў. Падрос, паразумнеў, нават папрыгажэў. Ужо хто як хто, але нават тая самая пахатуха Аўдоля галавой зьдзіўлена ківала: «А ягодка-ж мая, а міленькая, глянь, як зьмяніўся хлапец. Як свае навучыць ні сумелі, дык чужыя радачку далі. Як пагараваў, дык і агледзіўся, нябось. Можа й будуць з яго яшчэ людзі, ягодка ты мая любая».

Ніхто ў Літоўцах аб заразьлівай Сабакевічавай хваробе ўявы мець ня мог, аж пакуль каля людзей не пачаў церціся. Сяляне-ж літоўскія наагул чыстыя й здаровыя былі, на сваіх трывалых устойлівых карэньнях гадаваныя, чужымі моднымі хваробамі ніколі дагэтуль не занемагалі. Хто-ж мог тады ў чым Сабакевіча падазраваць?

Сам Косьцік напачатку надта-ткі нясьмела й асьцярожна пачаў. Калі-ж спасьцярог, што хвароба даўжэйшы час да нікога прышчапіцца не хацела, ізноў тыц да таго агэнта: «так і так, маўляў. Памажы, бо нічога ні выходзіць». Той насамперш Косьціку добрую языковую лупцоўку даў, а пасьля раіў: «ты, брат, что? Беларучкай ідзею в масы думаеш? Так ня йдзёт! Ты ім, мол, проста й адкрыта, да ешчэ й ліцературу, вот как!» Пасьля такога настаўленьня ўзяўся Косьцік іншым тэмпам, з агнём і энтузіязмам завіхацца.

Людзі літоўскія ці раз раней пра камунізм чулі, а часамі й ад перабежчыкаў (мяжа-ж не за гарамі была) «з таго боку» весткі лавілі. Цікава-ж было, як там «у самым раі» жывецца. Ды неважнецкае ўцекачы пра «чырвоны рай» апавядалі. Значыцца, і ў гэтай галіне многія літоўскія падкаванымі былі. Жахнуліся, спасьцярогшы, што рабіў Сабакевіч. Ізноў вясковую рэакцыю на ягоную працу ці не найлепш падсумавала Аўдоля:

- А ягодка-ж мая, а міленькая, а ці-ж ні казала я, што зь яго людзей ня будзіць? І чаго толькі гэткаму добрыя людцы дзівяцца? Ці-ж то ня ён першым зладзюгам у вёсцы быў? Ці ня ўсіх сабак пазводзіў ды палову, як ня болі пакалечыў? Гэта-ж калі ў цюрму за бальшавіцкую работу трапіць, дык туды яму й дарога! Благое ня сеіш і ні даглідаіш, яно само расьцець.

Калі ўжо літоўскія добра ў Косьцікавай хваробе ўверыліся, некаторыя здалёк ад яго, як ад пошасьці, пачалі трымацца. Іншыя-ж ні так ні сяк ды ўсё-ткі-ж на бок стараніліся, каб лоб у лоб не сутыкнуцца, але каб і віду аб тым, што ўхіляюцца ад яго, Косьціку ня даць. Хто-ж яго ведае, што заўтра будзе. Адзін Шпунтоў Лявон і Макатунішчына Параска Косьцікаву немач перанялі, ды тым часам людзі таго не спасьцераглі.

Сам-жа Сабакевіч проста збаранеў быў і ня мог угадаць, чаму людзі, здаецца-ж і недурныя, а такой вялікай і сьветлай, як сонца, праўды бачыць ня могуць: тут-жа й аб «новым міры», і аб «зямлі для фсех», і аб «раўнаправіі» было; адным словам, што табе толькі ў галаву набегла, каб жыцьцё паправіць, дык яно там рыхтык і ёсьць. Чаму-ж тады такой вялікай мудрасьці ня бачылі й напярэймы камунізму не сьпяшаліся?

Тут Косьцік Сабакевіч - нашто ўжо тупіца быў - свой собскі «клясавы» адказ знайшоў ды ўсіх людзей у Літоўцах прыблізна так на гэныя бальшавіцкія клясы падзяліў:

Першая група: багатыя. Сюды належалі лекар Зянкевіч, «амэрыканец» Сявенька й іншыя, што яўнымі ворагамі ягоных ідэяў былі.

Другая група: сераднякі, якіх у Літоўцах некалькі было. Усе яны - прыдуркі, бо ня хочуць разумець, што камунізм ім лепшую долю нясе.

Трэцяя група: бедныя, якіх была ў вёсцы бальшыня, або тыя, што разумеюць яго й памагаюць - значыцца, найперш Шпунтоў Лявон і Параска Макатунішка.

Сябе-ж, вядома, Сабакевіч лічыў найразумнейшым у вёсцы.

Гэтак падзяліўшы людзей і запрогшы на помач тых, што да ягонай ідэі хінуліся й памагалі, узяўся цяпер Сабакевіч мэтадам «проста й адкрыта ідзею в масы», дакладна гэтак, як і раіў той агэнт. Так заўзята пхаў Косьцік гэную «ідзею в масы», што не спасьцярог, як «жондова владза» ягоны троп абнюхала ды й на хвост наступіла. Тут Косьцік

быў, і тут раптам яго не стала: глядзіш, і ўжо «да козы» ўпяклі. Калі-ж год у той «козе» адсядзеў, ізноў на сьвет вольны пусьцілі.

Аддыхнуў Сабакевіч чыстым сьвежым літоўскім паветрам, носам на бакі пачмыхаў, перадумаў ізноў, як і што, ды й давай за ранейшае, хоць куды ўжо асьцярожней. Ды як не высцерагаўся, ледзь не на дыбачках «ідзею в масы» валочачы, усяроўна каму да таго справа была, дык падпільнавалі, ды й не агледзеўся Косьцік, як ізноў забрыталі й «до пакі» пацягнулі. Гэтым разам наважылі, мусіць, што трэба Сабакевічу памагчы з галавы дурноту выпатрашыць. Калі ўжо чаго лепшага зь яго ня будзе, дык, можа, хоць парабок які панскі. Вось чаму спачатку «двадзесьця пеньць» уляпілі, а пасьля аж на два гады ў той «пацы» замкнулі.

Пасьля зьняволеньня Сабакевіч на волю ў Літоўцы не вярнуўся. Яго тут як абскубанага, усе ягоныя хады й выхады ведалі, на бок ад яго стараніліся. Паехаў Косьцік па людзях шыць ды пашываць. Шыў-бы можа сабе на карысьць і людзям на пацеху, калі-б рукі пры сабе трымаў. Дык-жа не. Ізноў ранейшае пачаў. А пільнае вока ўлады ня спала, за Косьцікам сачыла. Ужо паліцыя на тропе была, ды Косьцік гэтым разам, як старая выпрабаваная ліса, пранюхаў ды выперадзіў, наважыўшы скрывацца. Пошукі даволі забаўнымі зрабіліся, але шпікі промаху далі. Калі ў дзень Яна ў Гацях нехта чырвоныя афішкі параскідаў, адразу спанатрылі, што Косьцікавых рук гэта работа.

V

Лявон Шпунт быў Сабакевічавым аднагодкам. Разам зь ім пачатковую школу наведваў, разам садовіну латашылі, гародніну палолі-падлічалі, адно разам настаўнічынага гадзіньніка ня сьцібнулі. Раней за Косьціка скончыў Шпунт пачатковую школу й, пакуль той вылез ізь першай, гэты ўжо ў гацкай сямігодцы дзьве клясы надрабіў. Бацька наадрэз адмовіўся Лявона ў гімназію паслаць. Зямлі меў уволю, дык навошта сына вучыць? Трымаўся яшчэ дзедаўскіх гэтак званых мудрасьцяў, што ў школе адно на панкоў-дармаедаў вучаць. Маніўся Лявона да плуга наламаць, адылі той наконт гэтага зусім інакш думаў: яго й блізка на вяроўцы да плуга не зацягнеш.

Ня толькі здальнейшым, але скрытнейшым і памяркоўнейшым быў Шпунт за Сабакевіча: нічога не рабіў на хапу-лапу, а стараўся з развагай. Нейкі час ля дому бібікі зьбіваў. Прыгожа абшалёваная й дагледжаная хата ды гасадарскія будынкі Шпунтовага бацькі стаялі на вялікім хутары на схіле ля Гараваткі. Адгэтуль уся вёска, быццам на далоні, відаць была. Сядзіць, бывала, Лявон дома, бяз працы ацялюгваецца, лісу ў клетцы корміць, на гармоніку на ганку пілікае, ці іншай нябыліцай час марна травіць. Што бацька ні загадае - аднекваецца. Кляні ты яго ці не, хоць асінавы кол яму на галаве чашы, нічога не памагае.

- Сышоў-бы ты з маіх вачэй, гультая кусок! Дзе ты такі зломак на маю галаву ўзяўся! - бурчыць стары Шпунт, бачачы сына за бязьдзеліцай. Адно Шпунціха сяк-так сынавы інтарэсы талеравала. У яе-ж ён - адзіная пацеха.

І сам Лявон надумаўся з вачэй сыйсьці бацьку, калі не назаўсёды, дык хоць часамі. Меў ён добры новы ровар. У гэны час ровары ў «панстве» польскім надта-ж дарагія былі. Як-ні-як, з-за межаў часткі прывозілі, а ўдома складалі. І вось паехаў аднойчы Шпунт на тым ровары ў воласьць, каб працу напытаць.

Першы раз не пашэньціла, дый столькі тэй бяды. Яму-ж не сьпяшалася. Усё абнюхваў распытваўся, думаў. Аднойчы неяк мяйсцовы солтыс «дзіравы шляхцюк» Паўлоўскі нехаця нацякнуў, што «драгомішча» да направы валасных дарогаў трэба было-б. Солтыс, вядома, ня выдумаў гэта, а ледзь ня з самага верха чуў. Лявон аберуч за такую нагоду ўхапіўся. Навошта ўжо тады была ягоная шасьціклясная асьвета, каб, прыкладна, якой канавы ля дарогі адмерыць ня здоляў, ці «шарварку» дагледзець, каб выкапалі, ня мог? Адбылася такая транзакцыя між «панам солтысам» і Шпунтам: Лявон задубіў шляхцюку пляшку «чыстай звыклай», зь якой тут-жа й пацягнулі за посьпехі будучага «драгомішча», а солтыс пагаварыў із валаснымі дарожнымі ўладамі, і ў вёсцы Літоўцы новы «ужэнднік» пан Лявон Шпунт нарадзіўся.

Прайшоў месяц і гляньце, людцы мае: «драгомішч» Шпунт так руку на новай працы набіў, што здавалася «драгомішчаўскія» мудрагельствы ён яшчэ з матчынай калысцы із соскай усвойтваў. Асабліва-ж выгляд: выглянцаваныя із кароткімі хромавымі халяўкамі боцікі, за халявінай мерка, зялёныя галіфэ порткі, чорны або шэры

пінжак, расхрыстаная ў палоскі кашуля («драгомішч» у гальштуку не выглядаў-бы падзелавому), кепка-шапка набакір. Бальшыня такіх, як Шпунт, начальнікаў гімназіскія шапкі з абгрызенымі цэшкамі насіла. Лявон-жа й блізка гімназіі ня быў, дык вось і мусіў у шэрай кепцы начальнічаць.

А прыгледзеліся-б вы як Лявон на працы паводзіцца - пацеха цэлая. Ідзе з такой важнецкай мінай, дубчыкам хвоскім па халявіне для фасону сьцёбае, працу разьмяркоўвае. Здаецца, што палкі й брыгады войска да бою ставіць. І голас Лявонаў, як трэба дзе падагнаць было, надта-ж стымулюючым быў. Добра папацелі людзі пад Шпунтовым наглядам, што й гаварыць.

Спачатку аднавяскоўцы, даведаўшыся, што Лявон такім важным начальнікам стаўся, надвое варажылі: а мо й лепш, што свой, мо й пасобіць калі, лішняга адработку прыпісаўшы. Бывала ці адзін селянін, гэтага новасьпечанага начальніка сустрэўшы, шапку зьняць і дабрыдзень сказаць памкнуўся. Усё да часу. Шпунт хутка сябе добрым панскім служакам выявіў. Людзі абмінаць яго на дарозе пачалі.

- Ні па бацьку ён пайшоў, - казалі літоўскія. - Мусіць, не на той капыл роблены. Удаўся во хлыст апантаны, людцаў бедных ганяіць.

Меў Лявон і якасьці, зусім у Сабакевіча непрысутныя: адфраньціцца ды на людзкое вока паказацца любіў. Дяўчатаў-жа любіў амаль усіх без разбору, толькі адных больш а другіх менш. З гэтай прычыны даўно прыліплі да яго дзьве мянушкі: франт і бабнік, а пасьля ўжо й хлыст. Апошняя замацавалася ў пазьнейшы час.

Адно схіліцца на захад сонца, глядзіш - Шпунт-Хлыст, адчыканіўшыся, у вёску дарожкай на ровары з бацькавага хутара прэ, ажно пыл ззаду курыць; блёнд-чупрына, набок зачэсаная, зь ветрам забаўляецца. Калі мінае хату або дзе дзяўчыну ўгледзіць, да якой яму цяпер ня рупіць, наўмысьля прыкідваецца, быццам ня бачыць яе, яшчэ больш на роварныя ступні націсьне: гляньце, не да вас мне цяпер. Справы ў мяне вунь якой важнасьці й размаху. Чалавек я наагул, казаў той, бывалы, не абы каму роўня ды й вунь якімі вялікімі справамі варочаю.

Зірнуць вясковыя жанкі, як Шпунтоў даўгі цень па вуліцы й сьценах гаспадарскіх будынкаў выкрыўляецца, дый кажуць: «Глянь, во як папёр падла! Ці не абнюхаў ужо што ў другім месьце...»

А Шпунту-Хлысту якая да таго справа, што вясковыя жанкі языкамі меляць? На тое-ж даў ім Бог языкі даўжыні адпаведнай. У яго свае, аднаму яму толькі шпунтоўскія справы вядомыя. Цяпун кабетам на языкі! Лявон - чалавек хаджалы, абабіты, дый кругом, казаў той, удалы; ён - зусім непаседлівая птушка, інтарэсаў у яго безьліч. Інтарэсы гэныя яго кожны вечар у людзі гоняць, ажно бедны ровар ад уцехі з таго гону пішчыць.

Меў адну слабасьць Лявон. Каторы ўжо год на трохрадцы пілікаў, граць вучыўся ды як сьлед налажыцца ня мог. Усе ведалі, што не музыка, а партач зь яго. Але Лявон думаў накш. Глядзіш, бывала, на вечарыну сваю новую, дарагую трохрадку прывалачэ, дзесь збоку воддаль ад музыкі прымосьціцца. Калі-ж Тадэўка ад сваіх трасухаў зьняможыцца, перадыхнуць захоча, падойдзе хто з маладых - скажа Шпунту: «Заграў-бы ты, Лявон, што небудзь, танцаваць-жа рупіць.»

Любасьць пагледзець, зь якім майстэрствам Шпунт адмаўляцца пачне.

- Гармонік? Яно-ж сабе так, захапіў во, ніхай будзіць. Але-ж граць? Дзе-ж мне... Я-ж, праўду прызнацца, - і тут такую хвальшывую ўсьмешку зробіць, што, гледзячы, аж вам з нутра верне, - і граю ніякавата. Куды мне там, ніхай ужо другія...»

Тут яго гуртам возьмуцца хваліць-намаўляць, нарэшце вывалакуць і на покуці пад Хрыстом, Багародзіцай і Апрасіняй Полацкай прымосьцяць. Із маласкрываным задавальненьнем абгледзіць «драгомішч» свой гармонік, пяшчотна пагладзіць яго, быццам гэта каштоўнасьць невядома якая, голасна скрыпне раз і другі, наўгад прабегшыся пальцамі па клявішах (бачыў-жа нейдзе, што так вялікія майстры робяць) дый «Блакітны Дунай» выдушваць пачне. Ажно просіцца-енчыць гармонік, каб збавіцца ад таго Лявонава гвалту. Ідзе мізэрна, зь перабоямі. Адылі ня так цікава, што ён грае, але як грае, як выціскае з трохрадкі гукі. Гармонік сквірчыць, як парася, людзям ад той гры аж млосна робіцца. Ды хто-ж там пасьмее дарожнаму майстру ў вочы праўду сказаць. Скрывіць ён галаву сваю так, што даўгія валасы аж на гармонікавы складчыны ападаюць, то правым то левым вухам сваё піліканьне наслухоўвае, ды прыкідваецца, што ён такі вялікі майстра, якому няйнакш сам Сымон Музыка мусіў-бы пазайздросьціць. Гэтак надзьмуваецца індык, крыльлямі крывулі навокал саміцы па зямлі выпісваючы, калі яму ў індычай галаве

каханьне замроіцца. Цярплівыя літоўскія людзі, асабліва-ж маладыя, даўно да такіх Шпунтовых фартэляў звыклі. Грае вунь нешта надта-ж моднае, - думалі некаторыя, - бо аж ім прасьцяком клёку ў тым цяжка дайсьці.

Калі-б падобраму спытаўся хто Шпунта, чаму камунізм упадабаў, чаму Сабакевічу прапаганду памагаў шырыць, мо й адказаць ня здоляў-бы. Было, мусіць, у характары ягоным нешта такое, што таўхала на апрычонасьць ад іншых людзей. Было гэта, пэўна-ж, ня тое, што звычайна спанукае здольных і маральна здаровых да поступу, да помачы бліжнім у бядзе; рачэй, якраз наадварот - ці не вынік ягонае духовае паражнечы, хворага жаданьня вылезьці з натоўпу, павысіцца над іншымі, хоць мо тымчасам і не было гэта яшчэ цалкам усьведамленае й мэтанакіраванае ймкненьне.

Як-ні-як, Лявон лічыў сябе наўчоным, Каб - барані вас Бог - адважыліся вы яго недавукам назваць, пакрыўдзіўся-б да сьмерці. Асабліва-ж пасьля атрыманьня гэнае скупа-платнае працы «драгомішча» выявілася й узбуйнела ў яго ненаеднае жаданьне некім кіраваць, камандаваць, хаця-б дзеля таго толькі, каб пафарсіць перад дзяўчатамі, што ён вось, маўляў, ня просты мужык, а ўжо нейкі, хоць задырданы, але-ж начальнік - значыцца, і ня кожнаму роўня.

Лявон і чырвоную прапаганду пашыраў ня так, як кажуць, з-пад сякеры, як рабіў гэта Косьцік. Сабакевіч быў занадта парывісты, зухаваты, без патрэбы гарачыўся, лез напралом. Шпунт быў зраўнаважаны, памяркоўны, хітрэйшы. Ужо калі й наважыў каму падкінуць якую пісульку, дык рабіў гэта асьцярожна, на бакі аглядаючыся, каб за рукі ня цапнулі. Да таго часу як па масьле йшло. Мала хто Шпунта ў камуністычных каншахтах падазраваў, хоць тое, што Косьціку ў руку прыяў, нікому не было таямніцай.

Надта-ж не да смаку прыйшлося Шпунту, што малы Бахмач гэнага Янавага вечара яго ў Гараватцы бачыў. Пра Косьціка пастух ня ведаў - Шпунт быў упэўнены. Але-ж людзі чулі пра афішкі на Янавым фэсьце, здагадваліся, што ў ваколіцы павінен быць Сабакевіч, на тропе якога казённыя віжы мітусіліся. Ці-ж цяжка было здагадацца, што Лявон тады ўпоцемку ў Гараватцы мог рабіць? Людзі-ж недурныя, два й два латва складуць.

- Каб на цябе чорт, жабянё! Якое ліха цябе ікраз у гэту пару сюды прынясло! - лаяў Лявон, вяртаючыся да Косьціка, што сядзеў

упоцемку, плячыма абапёршыся аб дрэва.

- Хто там быў? - спытаў Сабакевіч.

- Бахмачоў сапляк.

- Нядобра. Раскажа. Дадумаюцца й пра мяне.

- Ну дык і што? - разьвёў рукамі Лявон. - Хто мог угадаць, што сюды вечарам чорт яго прынясець?

- Думаіш, ён скора раструбіць?

- Чорт яго бацьку знаіць. Мусіць, трэба прыказаць, каб...

- Абаждзі... Знаіш што? Мусіць, буду зьбірацца я ў дарогу, а ты валяй у дзярэўню ды намахай Бахмачову пальцам, каб ня пікнуў...

- А ты-ж куды?

- Пайду, наверна, ў Павалічы да Хвёдара. Ён мне ўгалок знайдзіць, каб дзе далей ад людзкога вока. Калі што будзіць новага, дык ізьвясьці, - сказаў, устаючы, Косьцік.

У гэны вечар гаварылі-ператрасалі ўсё, што адбылося ўдзень і раней яшчэ, раіліся аб людзях, над якімі працаваць трэба было-б, ці якіх ужо апрацоўваюць, аб плянах на блізкую будучыню. Цяпер яшчэ крыху пастаялі, папалілі, аганькі далонямі засланяючы, ды разыйшліся. Лявон пад Літоўцы, а Сабакевіч пад суседні бор падаўся.

VI

У Кмітавай хаце народу было, як дзьверы зачыніць. Рыпела яна Тадэўкавай полькай-трасухай, скакала-тупала дзясяткамі ботаў і чаравікоў, зьвінела й рагатала, выкрыквала галасамі старых і маладых. Шырака навосьцеж расхрыстаныя былі вокны. Малыя падшыванцы, на прызбу ўзьлезжы, на падваконьні вешаліся, галовы ў сярэдзіну торкалі, каб танцораў разгледзець. Іншыя іх за ногі цягнулі, штурхаліся, адзін за адным із крыкам і рогатам ганяліся. Кмітаў панадворак дзіцячымі босымі нагамі дуднеў. Група дзетак малела, бо маткі іх дамоў заганялі. Мужчыны то ўпоцемку ў сенцах палілі, то на лавах пад сьценамі сядзелі, ды на малечу, што занадта голасна сябе паказвала, злосна час-часам сыкалі.

Па вуліцы й панадворку там-сям парамі хадзілі дзяцюкі зь дзеўкамі. Чуваць быў звонкі дзявочы сьмех. Ці адзін зь дзяцюкоў -

зашмат, відаць, з пляшкі пацягнуўшы - няроўнымі нагамі баранаваў. Падлеткі найбольш у шырокіх сенцах таўкліся, а каторыя сьмялейшыя, дык і ў хаце. Гэтак пры самай сьцяне зь левага боку за дзьвярмі, наперамешку з жанчынамі, тулілася група падлеткаў-дзяўчатак. Стары дзяцюк Антось, што на вечарыны з барадой-дзеркачом прыходзіць панадзіў, каб каторай маладзіцы да болю твар нацерці, якраз вунь падыйшоў да дзяўчатак і зубы пачаў замаўляць. Доўга не пастаяць ім цяпер. Зараз у рух пойдзе Антосева барада-дзяркач, вялікі вэрхал ля парога падымецца, і дзяўчаткі, як мышы ад ката, ад Антося кінуцца.

З правага, боку ля прыпечку й палаткаў, важна наперад свой бэбах выпяціўшы, Кмітава Аўдоля із чародкай жанок расьселася. Квокча-гамоніць яна ў гэнай групе дый такую паважную позу трымае, як быццам тая каралева між свае дворнае сьвіты. Вочы ў гэнай чарнявай жанчыны ходзяць вельмі борзда, а язык ані ззаду не застанецца.

Неяк сварыўся раз на кабету Кміта: «Гэта-ж каб язык твой ды ў малатарню падпрог ці што, от-бы-ж і намалаціў. Ато, як тое трапло, напуста дый бяз толку ніякага...»

Шмат Аўдоліным вачом цяпер занятку было: трэба-ж бачыць, як хто апрануўся, павярнуўся, ступіў, хто з кім танцаваў, каторая дзяўчына на якога дзяцюка паглядала й цэлую безьліч іншых, здавалася зусім някчэмных, дробязяў. Аўдолі яны першай вагі былі, так як нармальным людзям паветра ці рыбе вада. Не на тыдзень, а ці на месяц аб тым, што сяньня пабачыць, гаворкі мусіць хапіць. Няма-ж як папусьціцца, каб, скажам, якая другая кабета больш, чым яна, прыцеміла. То-ж не ў чыёй іншай, а ў Аўдолінай хаце йгрышча было.

Тымчасам Аўдолі дрэнна бачна было, а Антосю забаўную дзеўку трудна вышукаць, бо падвешаная высака пад самай столяй закуродымленая лямпа вялікі пакой у паўзмроку трымала. Душачыся ад тытунёвага дыму й духмені, ледзь хліпала-ліпела ў закуродымленым шкле лямпы пярынка маленькага полымя з пляскатага ната. Даставалася-ж беднай Кмітавай, хоць і нестарой яшчэ, падлозе. Як каторы дзяцюк у вадным куце прытупваць пачне, дык колам раз, а мо й два абойдзе, пакуль скончыць.

Музыка Тадэўка, із цымбалістым Язэпавым Пецькам зь левага боку, маладой і прыгожай жонкай - з правага, граньнем тым ці не ў газарт сябе ўвёў. Трохрадка хадзіла ў руках ягоных лёкка й гладка, быццам сама арганічнай часткай Тадэўкі была. А ён прыпяваў:

Мяне здалі запісалі
Пад Аршаву ваіваць,
Маёй мілцы загадалі
Самой дома гараваць.

Тадэўкава жонка Надзя дапамагала музыку:

А мілёначак ты мой,
Я цябе любіла,
Ці ажэнісься са мной,
Я ўсё варажыла.

Тадэўка зноў на зьмену:

Ой, мілая, ты замець,
Ад чаго я стаў бялець.
Я ў дзярэўні, ты ў другой -
Рэдка відзімся з табой.

А Надзя яшчэ адну:

За гарою сучка брэша
Чорная, кудлатая,
Мяне хлопчыкі ня любяць,
Бо я нібагатая.

Надзя была ня меншай весялухай, чымся сам Тадэўка. Некалі гармонік гэтую пару на жыцьцёвым шляху злучыў. А моладзь круцілася ў віхры полькі, быццам ад спраўнасьці й вытрываласьці ў скоках залежала слава цэлай вёскі. Было цімала з суседніх вёскаў, дык мо каторыя літоўскія не хацелі перад імі падгадзіць. А Тадэўка - спацелы, із раськінутымі на бок даўгімі валосамі - быццам заўзяўся, каб з ног зваліць самых найтрывальшых танцораў. Побач заўзята памагаў яму цымбаліcты Пецька. Кійкі ягоныя, як апантаныя чэрцікі, скокалі, перабіраючы па струнах.

Янук, прабегшыся па панадворку, перакінуўся колькімі словамі із свайміцёзкамі й сябрамі, пераступіў высокі парог сенцаў і ўжо ў хату ўвайсьці меціў, як нейчая рука, быццам клешчамі, сьціснула правае плячо. Над самым Януковым вухам загудзеў бас:

- Ты казаў каму, што мяне ў Гараватцы відзіў?

Гэта быў пан «драгомішч». Ад яго тхнула смуродам манапалькі.

- Ну кажы, кажы! - спанукаў ён, адцягнуўшы Янука ў цёмны кут, каб ніхто ня бачыў, ды балюча ціснуў правую руку.

- Пусьці!

- Кажы!

- Не, ні казаў нік...

- Ну глядзі-ж, бо як скажаш і я дазнаюся, дык дзісятаму закажаш!

У Лявонавым голасе гучала сур'ёзная пагроза, што нагнала хлопцу страху. Вызваліўшы руку, ён воміг адскочыў ад Лявона й убег у хату.

У паўцемры намагаўся разгледзецца, дзе што робіцца. Паціснуў у качарэжнік, каб нікому не замінаць пад нагамі дый найбольш бачыць. Перш за ўсё ўтаропіўся ў вабразы на покуці. Здалося яму, што ад накуранага дыму й пылу аж насупіліся брывы нейкага сівабародага сьвятога й ледзь ня млела, трымаючы Богуша Лазара Крыж, Прадславіна рука.

Неўзабаве спыніўся гармонік, і дзеўкі ды дзяцюкі ціснуліся пад дзьверы, каб выйсьці на двор прахаладацца, калі зь сенцаў пачуўся голасны загад папольску:

- Стой! Ніхто ня выходзіць!

Янук пабачыў у сянёх два электрычныя ліхтарыкі. Адзін запыніўся пры знадворным парозе, другі асьвяціў сенцы. Янук кінуў вокам у той кут, дзе нядаўна затрымаў яго Лявон. Там нікога не было.

Адзін паліцыянт застаўся ля знадворных дзьвярэй, а другі ўвайшоў у хату. Гэтага малажавага, што ўвайшоў, Янук ведаў з Гацяў: зваўся Вадзімскі. На плячох меў стрэльбу. У хаце, як быццам на каманду, ўсё прыціхла. Людзі пастараніліся, і Вадзімскі стануў пасярод вялікага пакою, левай рукой пагладзіў кароткія чарнявыя вусікі й голасна сказаў:

- Сяньня ў Гацях на фэсьце былі раскіданыя бальшавіцкія афішкі. Вы, пэўна, ведаеце, чыіх рук гэта работа.

Тут Вадзімскі ці не наўмысьля затрымаўся, прыглядаўся моладзі й старэйшым, што сядзелі на лавах, або падпіралі сьцены ля парогу ці ля вялікай печы. У гэтым часе, асьмеліўшыся, мусіць, цішынёй навокал, вылез спад лавы вялікі шэры Кмітаў кот і наўскасяк праз пакой, ля паліцыянтавых, чыста выглянцаваных, але ўжо запыленых ботаў пабег да парогу. Наконт такога катовага падарожжа ці адны пачалі гадаць: як яно гэта варожыць, добра ці дрэнна? Некаторыя захіхікалі. Малеча яшчэ больш заўзята чаплялася знадворку на падваконьні, сунула ў хату галовы, каб пачуць і пабачыць, што робіцца.

- Я хачу, каб хто ведае, дзе ёсьць Косьцік Бурак, сказалі мне! - загадна прамовіў Вадзімскі.

Сьмешным нават выглядаў такі зварот. Ці-ж гэты панок думаў, што калі-б людзі й ведалі пра Сабакевіча, дык яму публічна сказалі-б? І тады Янук блізу на самым покуце пабачыў Шпунтовага Лявона. Прысуседзіўся ён да Хвядосавай Манькі, дзяўчыны прыгожай і кемлівай, ды ўжо нешта шаптаў ёй на вуха, быццам тая паліцыянтава гаворка не яго датычылася. «Добры зь яго чмут» - прабегла ў пастуховай галаве. Лявон, быццам выкліканы, зірнуў на Янука.

- Я маю час, - спакойна сказаў Вадзімскі. - Пачакаю. Можа, хто з вас і прыпомніць.

Некаторыя пачалі міжсобку шышыкаць, і бачна было, што такое захаваньне прадстаўніка ўлады дражніла шмат каго. У левым куце ад дзьвярэй, дзе стаяла надта-ж войстрая на язык Піліпава Аксеня, чуваць была паўгалосная спрэчка.

- А от і скажу, - гаварыла Аксеня суседцы Вульляне. - Як яму ня сорам!

Паліцыянт выняў з кішэні срэбную папяросьніцу, выцягнуў адтуль адну «Аванты», паволі прыпаліў кругленькай пазалочанай, наводля знараду, запальнічкай, зацягнуўся духмяным дымам і паглядаў навокал.

- Ну дык што? Ніхто ня ведае?

- Паночак, я ведаю, - піснула Піліпава Аксеня.

Усе разявілі ад зьдзіўленьня раты й так прыціхлі, што, здавалася, можна было пачуць гудзеньне пралятаючага камара.

- Гавары, старая! - сказаў з усьмешкай задавальненьня Вадзімскі.

- Ён у мяне, паночак, пад спадніцай схаваўся. Калі хочаш, дык зараз пакажу!

Аксенін тон быў сур'ёзны й задзірысты. Паліцыянт зьбялеў, а публіка ўся стрымала дых. Трывала так сэкундаў пяць, ня болей. Пасьля нехта грымнуў залівістым рогатам, а за ім усе гуртам. Зарагаталі так, што, здавалася, Кмітава хата ад сілы сьмеху разваліцца. А ў гэным рогаце ледзь чуваць быў паліцыянтаў крык:

- Ты, стара псякрэў! Мільчэць, хамы! Вы фшысцы комунісьці, вас як псуў постшэляць, кацапы!

Паліцыянт Вадзімскі, як варам абліты, выбег на двор і там із сваім таварышам далі волю языком у лаянцы, найбольш зьдзекваючыся зь літары «р». Не марудзячы, селі на ровары ды, праводжаныя ля вясковых двароў сабачым брэхам і басаногімі дзецьмі, якіх цікавілі зіхатлівыя гузікі, «ажэлкі» й вялікія ліхтарыкі на грудзёх, пакінулі Літоўцы.

Піліпаву Аксеню нахваліць удосталь не маглі. Не за тое, што, быццам, яна за Косьціка заступілася, ледзь ня гераіняй стала. Мала хто Косьціку й ягонай пазавугольнай працы прыяў. Задаволеныя літоўскія сяляне былі тым, што, калі няма Сабакевіча, дык хоць сабакі мелі супакой. Аксеню ледзь на руках не падкінулі за ейныя хлёскія, салёныя, у час сказаныя словы, якімі так зручна й умела за адным махам паліцыянтаву наіўнасьць і дурноту ўсім як на далоні паказала.

Пасьля даўгаватага й вясёлага перапынку яшчэ ямчэй кінулася ў скокі моладзь. Прыйшла ў чатыры пары «Лявоніха», і тут паказалі сваё ўмельства найбольш спрактыкаваныя.

Шмат чаго бачыў за гэны дзень Янук. Паўсталі пытаньні, якіх сам ня мог здужаць-абмяркаваць. Чуў раней, што за Сабакевічавым Косьцікам ганялася паліцыя, што быў дзесь у вязьніцы (мусіць яна страшная й там моцна мучаюць людзей), ведаў, што не любілі яго літоўскія, што кляў бацька. Шмат ужо наслухаўся Янук. Косьціка памятаў слаба, бо гэны ладную жменю гадоў паза вёскаю бадзяўся. Цяпер-жа Янук на свае вочы бачыў, як паліцыя шнырыла, шукаючы гэтага «камуністы». Калі сама паліцыя за ім ганялася (а чамусьці ён думаў, што паліцыя вечна занятая й на гэткае часу ня мае), значыцца, Косьцік мусіў быць важным чалавекам. А чаму-ж ён такі? Што гэта «камуністы»? Чаму Шпунтоў Лявон насядаў на яго, каб нікому ані-гу-гу аб тым, што бачыў яго ў Гараватцы? Што там былі за афішкі на фэсьце? Чаму гаварылі аб іх зь нейкім нясмакам, быццам гэта было

нешта гаркое, паводля зерня перцу, што якнайбарджэй стараесься з роту выплюнуць?

Не забаўляўся Янук доўга на йгрышчы. Пасьля ад'езду паліцыі, паслухаўшы, што людзі гавораць, пабег хутка дамоў, каб распавесьці бацьком. Ягоны кульгавы брат Мікола, дзесь чарку гарэлкі зь некім кульнуўшы, пабуяніць за дзесяць чарак хацеў. Януковага спануканьня, каб ішоў дамоў, як-бы й ня чуў.

Бацькі клаліся спаць, але Янукова апавяданьне аб тым, што сталася на йгрышчы, выслухалі зь цікавасьцяй. Калі-ж Янук прабаваў ад бацькі даведацца пра Косьціка й камунізм, той збываў яго абы чым, мала зразумелым. Пра камунізм адно сказаў, што ёсьць такі нейдзе ў Расеі, а які ён - добры ці што, - хто яго ведае. Адны хваляць, другія ганяць, усяк языкамі трэпяць. Па бацькавым няўмелым тлумачэньні Янук тропу не дайшоў, адно спанатрыў, што гэны нейкі «камунізм» усе зьвязваюць із Сабакевічам, зь «цюрмамі» й іншымі малавядомымі Януку рэчамі. Адылі адно цікавае даведаўся Янук, а гэта тое, што «па радзіву» ў доктара мужчыны слухаюць Менск, і што там «многа аб тым камунізьме брэшуць».

Пастанавіў хлапец пры нагодзе паслухаць «радзіва». Хіба ўдасца ажно ўвосень, як удома будзе. Із гэткімі думкамі заснуў.

VII

Янук сядзеў на ўзьмежжы скарбовага лесу, плячмі абапёршыся аб таўстую бярозу, і стругаў. Ня вымяркаваў нават, што з таго струганьня будзе: ці то дзяржальна да ляскі наводля нейкае галавы, ці што іншае. Ня важна. Рукам трэба занятак. Тапсік трымаў на воку кароваў, што пасьвіліся між кустаўя на лузе. Крыху, здавалася, змалела гарачыня. Сонца хілілася на захад, і хлапец ведаў, што за гадзіну дзесь пачнецца перадвячорная сымфонія: пасьмялеюць птушкі на полі й у лесе, загудзіць бяроставая дуда ліпавіцкага пастыра Хвядоса, што быў стары й усімі навакольнымі пастухамі паважаны ня толькі за ўмелае граньне, а й за тое, што аж двох падпаскаў меў; у бары пачнуць свае трэлі салаўі й розная птушыная дробязь, вялікую чуб-карону Архіпа абсядуць галкі ці груганы, каб разгледзецца, што адбываецца навокал.

Гэта ўсё, - ведаў Янук, - станецца пасьля, як пахаладнее. Тымчасам птушкі яшчэ трымаюцца ў ценю, а пастыр Хвядос сядзіць дзесь пад дрэвам і пляце кош ці што іншае.

Любіў Янук чытаць кніжкі, асабліва-ж прыгоды падарожнікаў, што па цэлым шырокім сьвеце валачыліся, новыя невядомыя землі адкрывалі, дзікіх людзей знаходзілі. Дый тут пан Лазоўскі ўпоперак дарогі стануў: кагадзе зусім выразна забараніў чытаць на варце. Найгорш, што кніжкі зьвяліся. Раней у вясковай настаўніцы пазычаў, а калі перачытаў усе ізь сьціплай школьнай бібліятэкі - не было адкуль узяць.

Карціла папрасіць Лазоўскага служанку Адэлю, каб яна патаёмна з прыватнай бібліятэкі пана асадніка пазычыла. Неаднойчы бачыў кніжкі ў вялікай шафе із шклянымі дзьвярмі, што ў найбольшым і найпрыгажэйшым пакоі стаяла. Самому лезьці туды было рызыкоўна, але-ж Адэля магла-б пасобіць, ёй усе куткі дасяжныя былі. Яшчэ адно прыгадаў хлапец: у доктара быў беларускі каляндар. Сам Стась некалі зь вялікай урачыстасьцю Януку малюнкі ў ім паказваў. Ужо тады нахаду прабаваў Янук чытаць з гэнага календара. Некаторыя літары зьверху мелі птушкі дый былі без хвастоў - ня так, як польскія. Янук мяркаваў, што чытаць можна налажыцца нават і вобмацкам, здагадваючыся, калі няма каму паказаць.

Найгорш, што Стась нават таго каляндара - даволі таўстой кнігі - не паказаў яму як сьлед; адно, перагледзеўшы малюнкі, паклаў у дохтараву шуфляду, дзе сам Зянькевіч трымаў яго, каб весьці ўлік часу й рабіць аднаму яму зразумелыя зацемкі. Прасіў тады Янук Стася, каб перагледзеў пры нагодзе бацькавы сховішчы, а мо знойдзе якія старыя кнігі. Той паабяцаў. Цяпер Янук прыгадаў гэта, складанчыкам стругаючы кавалак бярозавага кія.

Тапсік, што ляжаў побач, зірнуў у бок бору, узьняўся на лапы й пачаў бурчэць. Калі Янук павярнуў галаву ў той бок, куды пазіраў сабака, твар ягоны распрамяніўся шырокай ласкавай усьмешкай. Сьцішыў сабаку. На ўзьлесьсі, мецячы проста на яго, ішла ягоная школьная сяброўка Дуня Макатунішка.

Дзяўчына нагадвала ружу, што вось-вось мае распукнуцца прыгожым цьветам. Якраз дасягнула таго росту, калі дзяцюкі й мужчыны, зірнуўшы на яе раз, доўга праводзяць вачамі ды з чулай неспадзеўкай у голасе кажуць:

- Глянь во на яе, як пахарашэла! Учора яшчэ лучынка была, а сягоньня якая пекная. А што-ж зь яе будзіць заўтра?!

Дуня была Януковай аднагодкай. Сьветлавалосая, сінявокая, круглатварая, ледзь кірпаценькая, сярэдняга росту, апранутая была сяньня ў танную паркалёвую сукенку, босая. Даўгія валасы - мусіць, таму, каб не рассыпаліся на бакі - перавязаныя былі блакітнаю стужкаю. На правым плячы Макатунішка тарабаніла пузаты, туга напханы зрэбны мех. Янук ведаў, што было ў ім нейкае зельле.

Ад раньняе вясны, як толькі канчалася школа, завіхалася Дуня каля лекавага зельля. Маці ейная прадавала назьбіранае ў мястэчку купцом, што ў сваю чаргу збывалі зёлкі фірмам, якія рабілі зь іх лекі. Пачынаючы ад браткаў, празь ліпавы цьвет, васількі, чабор, валяр'янку і аж да панчошак, як руплівая пчолка ўвіхалася Дуня цалюсенькае лета. Пад восень перакідалася на грыбы й ягады. Гэтак ужо вось ці ня трэці год. Спачатку хадзіла з маткай, пасьля -найчасьцей ізь сяброўкай Юшкевічавай Клавай. Тую часта лянота брала, дык Дуня вандравала па палёх і лясох сама. Старалася абмінаць вясковыя землі, бо чаго добрага, возьме каторы дзядзька - сабакам нацкуе. На скарбовым і панскім раздольле было, хоць там лясьніка трэба было высьцерагацца. На ягады-ж, каб зьбіраць, талён трэба было купляць. Адылі Дуня ня толькі ведала бочныя сьцежкі й дарожкі, пазнала, дзе, што й калі расьце, але, быццам тая пранырлівая ліса, здалёк абмінала небясьпеку.

Іншыя жанкі й дзяўчаты да суседніх паноў на поліва, жніво ці іншыя польныя работы хадзілі. Макатунішка ўпадабала зёлкі. Тут над табой ніхто з паганякай не стаяў. Добра руку набіўшы, завіхнуўшыся, можна было больш, чым у пана, цэлы дзень крукам стоячы, зарабіць. Заробкі йшлі на вопратку й хлеб. Зімой-жа ў школу трэба было хадзіць, а ў хаце бяда з кожнага кута выглядала.

Ня меў Янук лепшае сяброўкі за гэту ўвішную, працавітую й прыгожую дзяўчыну. Сяброўства было, як звычайна між падлеткамі - дзіцячае, шчырае, безь ніякіх задніх думкаў. Сам сабе ня верыў Янук, калі прыгадваў, як да гэтага дайшло.

На краю Літоўцаў, пры балоце, на вузкім лапікле малаўрадлівае зямлі стаяла невялікая хата. Здалёк выглядала недакончанай. Так фактычна й было. Гадоў пяць таму перанесьлі Макатунішкі яе зь вёскі. Нанятыя ці ўпрошаныя людзі паклалі зруб, накрылі страху, услалі столь, уставілі вокны ды й так без гаспадарскага заканчэньня пакінулі.

Із страхі тарчэлі, быццам замарожаныя скасьцянелыя пальцы, непаадразаныя кроквы, вецер мейсцамі ўжо здолеў пазакасваць і павыскубваць салому. Хата ня мела нават сенцаў. Знадворныя дзьверы адчыняліся адразу ў пакой, што быў і кухняй, і спальняй, і ўсім чысьценька. Воддаль ад хаты, за дзьвюма паветкамі, як тая квактуха на яйках, прысела меншая будыніна, што служыла разам пуняй і хлевам. Часта чуваць было адтуль скуголеньне сьвіньні, рыканьне каровы й кудахтаньне курэй.

Ніколі ня быў Янук у гэнай хаце, хоць жыла там сяброўка Дуня з маткай, ізь дзьвюма сёстрамі й іхнымі дзяцьмі. Гэта была сям'я без мужчыны. Стары Макатун - апавядалі тыя, што ведалі, - даўно-даўненька зьбег сабакам сена касіць. Пакуль на той сенакос выбраўся, мала зь яго клёку для сям'і было: усяго, мусіць, што трое дачок прыдбаў. Удосыць нагаравалася Макатуніха, пакуль першыя дзьве падрасьлі. Спадзявалася на лепшае.

Падрастуць, думае, дык падзарабіць які грош дапамогуць: «Разам які аруд жыта насыпем, сьвіран склеціўшы, лёну напрадзём-натчом, кусок скарміны лацьвей завядзецца».

Набегла зусім што іншае: глядзіць маці на найстарэйшую й вачам веры не дае - гэтак неяк ненармальна круглець пачала. Тут-як-тут, бач, і новы крыклівы маленькі чалавечак на сьвет. Гэткага маці не спадзявалася, бо быў гэта ня той прыбытак, аб якім гавораць, што ад яго галава не баліць. Тут галава забалела-закружылася. Ды гэта адно пачатак быў. Малодшая, ці то на сястру заглядзеўшыся, ці што, навыперадкі давай: ажно двое адразу. Адкуль? Ізь кім набегалі? - ламала маці галаву.

Вясковыя жанкі, што на ўсім пільнае вока трымалі, найчасьцей Шпунтова Лявона ў павялічэньні Макатунішынай сям'і вінавацілі. Дачкі-ж, як вады ў рот панабіраўшы, каб словам заікнуліся...

Каб вось ня дзеткі гэтыя, можа-б, і зажылі палюдзку, у чужых пазарабіўшы й сваё куртатае лапікла зямлі дагледзеўшы. А так... Колькі ні таўчыся, усіх дзіркаў не залатаеш. Ратоў да яды, плячэй да апрананьня, ног да абуваньня хоць аднімай, а на заробкі адхінуцца некаму. Хоць ты гвалт крычы!

Мо й саромелася найменшая Макатунішка Янука ў хату свае маткі калі завесьці. Можа, ён, з гэтай спрэчнай і незвычайнай сямейкай пазнаўшыся, будзе аб ёй благія думкі мець. Шмат разумела дзяўчына,

усё тое непахвальнае, што аб іх людзі гаворылі, слухаючы. Не лахва была зацёпканую гліняную падлогу, поўзаючых па ёй мурзатых галапупых дзетак Януку паказваць. Або гэныя шырокія, на ўсю даўжыню сьцяны, палаткі ля пячы, дзе ўсе супольна, як снапы на памосьце, спалі... Навошта каму чужому непакліканаму носа туды тыцкаць?

Звычайна пасьля Калядаў пачыналіся вандроўкі Макатунішынай сям'і па людзях, што летам наймітаў патрабавалі. У гэтага пазычалі мех бульбы, у гэнага - жыта, крупаў ці яшчэ чаго. Варыва ставала свайго, але найгорш із скаромнінай было. Так і перабіваліся з прогаладзі ў посьніцу.

У добрых людзей адна, а ў Макатуніхі, бывае, ажно тры гаспадыні аднэй чапялой, качаргой, памялом ці віламі ля печы арудуюць. І калі скупога ў катлах ці місках не падзеляць, дрыжыць-трысецца тады ад сваркаў квола збудаваная Макатуновых хата: «Ты ўзяла маё, табе перапала замнога, ты не зарабіла, а сваіх дзяцей маім корміш», і гэтак бясконца. За зімовыя-ж пазыкі адраблялі Макатунішкі па людзях цэлае наступнае лета й восень. Заміж таго, каб перш зарабіць, а пасьля спажываць, тут наадварот: паўгады ці больш наперад за пазычанае жылі. У вёсцы й ваколіцы Макатуновых нядоля прыказачнай сталася. Здарыцца, што пытае адзін дзядзька другога: «Ну, як жывеш?» - «Добра, - адказвае запытаны, - як Макатуны, ні раўнуючы... »

Адразу ясна. Ледзь ногі валачэ, а аб зьвязваньні тых прыказачных «куртатых канцоў» і язык мазоліць шкада.

Мо й не была-б сям'я Макатуноў аб'ектам такіх кпінаў, калі-б ня гэны прырост.

- Гэта-ж нада во, - казала ці раз адна кабета, - каб вас пранцы, сколька папанаводзіць. Самі здыхлы за бульбінай прападаюць, а тут яшчэ чаго. Саўсім Бог розум адабраў, суседачка...

Кабеты ня толькі што ня скупіліся на каляровыя эпітэты, але аж празь меру перабольшвалі. Як у вадзін голас, падмацоўваючы ведамай прыказкай аб сучцы й сабаку, Макатунішыных дачок ганілі. Такую-ж давалі волю языкам, што, паслухаўшы, падумаў-бы добры чалавек, што ўсе жанкі літоўскія - прос-напраст сьвятыя: дзеткі ў іх ці ня шляхам духа сьвятога нарадзіліся.

Аб найстарэйшай Макатунішцы Парасцы, што з выгляду ніякаватая была, казалі, што быццам «ня ўсе дома» ў галаве ейнай.

Дык, калі й аб сынку ейным прыгадвалі, то на тое «ня ўсе дома» ськідку давалі. Калі-ж Параска, як пасьля выявілася, узялася Сабакевічаву трухлядзь-прапаганду разносіць, гэткі ейны занятак ізноў-жа на тое самае конта запісалі.

Куды больш зьвягалі на сярэднюю й ніштаватую з выгляду Алену, што аж двое - хлопчыка й дзяўчынку мела. Жанкі пастанавілі, што абодва ў Шпунтовага Лявона «цюцелька ў цюцельку ўдаліся й крошачкі пабралі». Парознаму тлумачылі Аленіну лёккадумнасьць, ці што іншае, дый, вядома, да ладу дайсьці не маглі. Часта й бацьку вінавацілі. Яблык, маўляў, далёка ад дрэва не адкоціцца.

Мяркавалі, што й наймалодшая Дуня ўтаптанай сьцежкай сваіх сёстраў пойдзе. Пастанавілі, што якраз так, а ня йнакш будзе, дый кропку над тым паставілі. Папрабавалі-б вы, чаго добрага, свае сумлевы адносна гэтых кабечых меркаваньняў выказаць, вас-бы найбольш руплівыя жанкі, што з найдаўжэйшымі языкамі, у белы дзень гэт! аж за літоўскае балота прагналі-б. Ці льга тады дзівіцца, што такую агульнапрынятую думку пра Дуню й Януку ў галаву ўвялі.

Надта-ж мізэрнай з выгляду, сухой як лучына, была Дуня Макатунішка, калі яшчэ ў пачатковую школу хадзіла. Вучні-ж - дзеці як дзеці; ад бацькоў удома шмат дрэннага пра Макатуноў наслухаліся, - думалі, што Дуня за іх горшая. Дзяўчынку часта й без прычынаў квялілі. Так напракудзяць, насоляць ёй, бывала, што адыйдзе на бок, вочкі кулачкамі трэ, каб сьлёзы ўтаймаваць. А заступіцца за яе не было каму. Дзяўчаткі ад сябе гоняць, гуляць зь ёй ня хочуць. Жаль і крыўда непамерная грудзі й горла душаць. Удома-ж ня лепш: вечныя звадкі, галіта. І ня гледзячы на ўсё, што даводзілася цярпець дома й у школе, Дуня была аднэй зь перадавых вучаніцаў. Як нехта сказаў, «затуканая й загуканая», яна расла наперакор перашкодам, маўклівая й спакойная.

Можа, і расла-б так дый пасьля й яна ахвярай каторага «сабакі» сталася-б, калі-б на паратунак той дзядзька, матчын брат, не прыйшоў. Сьвет дарогі ён ад Літоўцаў жыў. Невялікі зь яго быў багацей, але канцы з канцамі неяк зьвязваў. Меў добрую працавітую жонку й двое дзетак: старэйшага за Дуню хлопчыка й дзяўчынку - ёй аднагодку.

- Схадзіла-б ты, дачушка, да Андрэя, - сказала аднойчы Дуніна маці дачцэ, калі ёй адзінаццаць стукнула. - Ні раз-жа прасілі і ён, і Тацьцяна, каб ты прышла ды лета пабыла ў іх. Ізь іхнай Верачкай забаўляцца будзеш, весялей так удзьвюх.

Два разы ня трэба спанукаць было. Назаўтра раніцою - вясной гэта было - выйшла Дуня ў дарогу й перад полуднем ужо ў сваякоў была. Прынялі з радасьцю. Прабыла ў іх цэлае лета. Дзядзька Андрэй і цётка Тацьцяна былі людзьмі практычнымі й кемлівымі, навуцы цану ведалі. Ці раз із Дуняй аб сям'і Макатуновых гаварылі. Із балючым сэрцам глядзелі на галечу й рады былі-б чым дапамагчы.

Дзядзьку Андрэю й цётцы Тацьцяне хапіла з гэтай затуканай дзяўчынай колькі слоў замяніць, за язык яе пацягнуць, каб пераканацца, што розумам і жыцьцёвай сьпеласьцю даўно перагнала яна свой век. Таму хоць шмат чаго высьветлілі ёй проста як дзіцяці, адылі раілі ёй як узрослай. Загадвалі не пакідаць навукі, ды трымацца, каб сьлядамі сёстраў, як падрасьце, не пайшла. Дуня ўважна слухала тыя гутаркі й пасвойму іх запамінала.

Там-жа ўлетку навучылася зьбіраць зельле, а пад восень грыбы й ягады. Цётка Тацьцяна гэтым карысным рамяством ужо колькі гадоў з посьпехам займалася. Шмат чаму навучылі дзяўчынку сваякі. Верачка-ж была добрай сяброўкай. Ізь ёй Дуня абабегала шмат суседніх лясоў і палёў, памагаючы цётцы ў зьбіраньні зёлак і ягадаў.

Не агледзелася Макатунішка, як у гэтай любай сямейцы лета маланкай праляцела. Той сьветлы час пасьля шмат разоў у жыцьці яна прыгадвала. Калі-б папрасілі тады, магчыма, засталася-б у іх жыць назаўсёды. Ды трэба было пад дом, там чакала школа.

Зусім накш глядзела яна цяпер на сваіх сёстраў, іхных дзетак, добрую й любячую яе, але хваравітую й горам прыгнечаную матку. Інакш і да школьных сяброў паставілася: пасьмялела, ды кожнай абы якой жабе не дазваляла сабе на галаву пракудзіць. Новымі вачыма прыглядаючыся цяпер жыцьцю дома, бачачы, у якім нядоглядзе й бядзе расьлі малыя дзеткі, чуючы ў сямейных сварках шматлікія таямніцы саграшыўшых сёстраў, Дуня раньняй парой прайшла асноўную жыцьцёвую школу.

Парады радні прыйшлі да спадобы й Дунінай маці. Зь цікавасьцю слухала й перапытвала яна дачку. Калі-ж дзяўчына, не заікнуўшыся, сказала, што вучыцца ёй раілі, маці рукамі замахала й слухаць больш не хацела. Мала таго: накрычала на дзяўчыну, ды загадала, каб ня дурыла ёй з навукай галавы.

- Як-жа-ж гэта ты будзеш так дзень у дзень такі сьвет дарогі, часта па мокрадзі й непагадзі, аж у Гаці шлёпаць. дура ты бярозавая? -

сварылася Макатуніха. - Гэта табе жартачкі ці што? Падумаць толька добра, што яны табе параілі, разумнікі гэнкія! Лацьвей ім, чужога гора ні знаючы! А яны цябе абуюць, надзенуць можа, га?

Дуня ня ведала, што адказаць. Пры гэным матчыным вытыканьні цяжкай жыцьцёвай беспрасьвеціцы ейныя спадзяваньні на навуку, як прыгожыя мыльныя бурбалкі, - покаліся. Прыгадаліся цяпер словы дзядзькі Андрэя аб тым, што, падвучыўшыся, можна сьмялей на шырокі сьвет зірнуць, у людзі паказацца, з галечы й смуроду вылезьці. Няўжо-ж усё яно так і застанецца ў марах?

І тут, як дабраславенства зь неба, на дапамогу прыйшла цётчына навука аб зельлі, грыбах і ягадах. Дуня ўхапілася за гэта так сквапна, як галодны за акраец хлеба. Калі-ж скончыла чатырохгодку, вясной употайку ад іншых вясковых дзяцей зьбегала ў Гаці, дзе прынялі яе ў пятую клясу. Пасьля пачала ўвіхацца, як працавітая мурашка, ля зёлак, грыбоў і ягадаў.

Ківалі галовамі й надзівіцца не маглі вясковыя людзі з гэтага маладога й мізэрнага падлетка, што зусім непадобнай да іншых у сям'і расла. Дуня-ж даўгаязыкім кабетам не давярала, а таму й аб сваім аблюбаваным занятку мала з кім гаварыла. Пабойвалася, мусіць, каб іншыя наперад не забеглі ды зёлак ня вызьбіралі. Дарэмна. Нават калі сяброўку сваю Клаву да гэтага карыснага занятку намовіла, калі ўсе пра гэна даведаліся, ніхто навыперадкі ня кінуўся. Праца гэтая нялёккая была, хоць зельля навокал для ўсіх магло быць удосталь.

Зарабіла дзяўчына за лета на абутак і вопратку, ды й маці яшчэ колькі залатоўкаў дала. Паправілася, папрыгажэла з выгляду, падрасла, стала больш зараднай, набралася сьмеласьці й пэўнасьці ў сваіх сілах. Зь нецярплівасьцю чакала таго часу, калі пачуе ў Гацях першы школьны званок.

VIII

Ганарыўся Янук, што трапіў у пятую клясу. Што там ні кажы, а дзеткі зь Літоўцаў за межы чатырохгодкі рэдка калі ступалі. Хлопцы за плуг і касу, дзяўчаты-ж за серп і прасьніцу браліся. Далейшае як на далані відаць было.

- Мой дзед араў, бацька араў і ты араць будзеш, - казаў падрастаючаму сыну ці адзін непісьменны, цяжкай працай і горам зморaны селянін. Гэтыя словы былі не накіраваньнем у жыцьцё, а прыгаворам. Хто-ж гэта з маладых асьмеліцца такому ўжо выпрабаванаму, традыцыйнаму сівабародаму цьверджаньню, што пры прадзедах, дзядох і бацькох права грамадзянства здабыло, запярэчыць, або - ня дай Божа - яшчэ й наўсуперак пайсьці?

Адылі вось такі, як ільга сказаць, апошні з апошніх пастушок Янук наважыў не паводле гэнага ўцёртага ўзору ў будучыню сабе дарогу пракладаць. Калі-б ужо й давялося араць, дык што-ж, няхай сабе. Але чаго-ж сьпяшацца? Араць-жа таксама можна йнакш, чымся іншыя аралі дагэтуль, - значыцца, больш із розумам, не рабіць агрэхаў, каб спарнеў плён на ніве.

Мо, ня так выразна й акрэсьлена й не ў такой пэрспэктыве разважаў пра сваю цяпершчыну й будучыню Янук. Рачэй, адчуваў тое падсьведама, бо вучыцца бег прост-напрост напралом, маючы ненасытную прагнасьць пазнаньня навакольнага й далейшага сьвету.

Вага першага кроку ягонага ў гацкай сямігодцы падрасла яшчэ, калі ўявіў сабе, што гэта ён цяпер адзін з цэлай вёскі, адважны й прадпрыемлівы, што наважыўся далей, чымся іншыя, па няходжанай сьцежцы ступіць. Нават дзеці літоўскіх багатыроў, не гаворачы аб доктаравых, аб якіх казаў стары Бахмач, што «не твайго носа-палоса», і тыя вунь не асьмеліліся.

Із добрым настроем і вынікаючай з гэтага бадзёрасьцю, хоць не бяз пэўнай трывогі перад новай местачковай школай і незнаёмымі настаўнікамі, сьпяшыў Янук у першы дзень новага школьнага году ў гацкую сямігодку. Лазоўскі зьлітаваўся, адпусьціў пастушка раней, каб мог пачаць навуку разам зь іншымі дзеткамі.

Ішоў нацянькі праз скарбовы лес. Было тут цяпер суха й вельмі прыгожа. Цімала чаго цікавага можна было ўбачыць па дарозе ў багацьці лясное прыроды. Праўда, вясной ці зімой тут было мокра, літоўскія ў Гаці гасьцінцам або чыгункай хадзілі.

Ужо падыходзячы пад мястэчка, воддаль на польнай сьцяжыне асачыў ён малую дзявочую фігурку. Ня мог здалёк распазнаць, хто гэта быў. Якое-ж было Янукова зьдзіўленьне, калі, прыйшоўшы ў школу, на калідоры сустрэў не каго іншага, а Дуню Макатунішку.

- Ты што тутака робіш?! - сур'ёзна й быццам ласку робячы, што наагул сваёй увагай яе ўдастоіў, гаркнуў на дзяўчыну. Нават вопратка на ёй - новенькія чаравікі, шкарпэты, андарак, блюзка, хусьцінка - зьдзівіла пастуха.

- Тое, што й ты! - адсекла Дуня. Голас, няйнакш, выклікаў яго на паядынак. Здалося Януку, што кпілі зь яго блакітныя, як васількі, вочы, быццам гаворачы: «Ты думаў, што ты адзін такі ўвішны гэрой? А от і я за цябе ня горшая!»

- Ты... ты..., - пачаў Янук із такім зьдзіўленьнем, што раптам мову адняло. У малой Бахмачовай галаве паўстаў пэўны хаос. Зачырванеўся. Мусіць, калі-б у ліпені саджалка на аселіцы ягонага бацькі пакрылася ў пагодны дзень лёдам, то ня быў-бы гэтак зьдзіўлены, як цяпер, пабачыўшы ў гацкай сямігодцы Макатунішку. Зьбянтэжаны, ён павярнуўся й адыйшоўся, ды паглядаў на бакі, ці хто ня бачыў, што ён дзяўчыну ведае.

Усё было ў гэны дзень новае й неспадзяванае. Самых настаўнікаў вучыць пятую клясу прыходзіла аж тры. Для Янука навіна гэта была не абы якая, было над чым падумаць. Але ў галаве ягонай адбывалася зусім нешта іншае. Вунь у другім радку на задняй лаўцы сядзела Макатунішка. Янук часта касурыўся ў гэны бок.

Здавалася-б, што Янук і Дуня ў гэтым асяродзьдзі зь вялікай перавагай сынкоў і дачушак розных паноў і падпанкаў мусілі быць натуральнымі сябрамі. Хлапец ня здольны быў гэта адразу ўсьведаміць. Наадварот, ён думаў аб тым, што рабіць, каб гэта дзяўчына ані заўтра, ані пасьля сюды нагой ня ступіла. «Што-ж гэта скажа Стась, Уладзік, Алёша, ці іншыя вясковыя хлопцы, як толькі дачуюцца, што яна ў гэту школу разам са мной ходзіць? - турбаваўся Янук. - Яны-ж так сьміяцца будуць, што праходу па вуліцы ня будзіць».

І ўжо ўяўляў, як гоняцца за ім хлопцы, асабліва-ж тыя, што ягонай навуцы зайздросьцяць, выдумляюць мянушкі й небыліцы, бесьперапынна, як назойлівыя сабакі, зьвягаюць. Які сорам будзе, як разьнясуць-разьдзьмуюць: хоць ты на вочы людзям не паказвайся.

Янук зірнуў ізноў у дзяўчынін бок і чырванеўся ад злосьці. Дуня сядзела спакойна, слухала настаўніка, як быццам гэта ўсё так і быць мае, што яна ў пятую клясу побач яго, Янука, належыць. «Глянь ты на яе! Іж ты якая брыдота! Іншыя дзяўчаткі - дык паўбіраныя як лялькі, а

яна такая нейкая простая й нікудышняя каля іх», - думаў малы Бахмач. У гэны момант забыўся, што ніжнія зрэбныя штаны яму скуру ледзь не да крыві кастрыцай па дарозе ў школу нацерлі, што ў старой сіняй кужэльнай кашулі папраціраныя на локцях рукавы як сіта прасьвечваліся, што адно новымі ботамі мог-бы пахваліцца, калі-б, панюхаўшы сьмярдзючы дзёгаць, панскія дзеткі сваімі далікатнымі насамі не круцілі й ад яго ні адварочваліся. Маці, як на тую злосьць, зусім новыя й неабношаныя штаны споднія дала, каб яны прапалі. Так смыліць нацёртая скура, проста ступіць баісься. Але тая першая думка - «як-бы што зрабіць, каб нага ейная тут болі ні ступіла» - усёроўна верх трымала.

Дуня трымалася ад Янука воддаль. Як забытая ўсімі сірата, стаяла яна падчас перапынку на калідоры пры сьцяне, сочачы іншых дзяўчатак-шчабятушак, што шпацыравалі парамі ці тройкамі. Яны гаманілі гулкімі галасамі, заліваліся буйным сьмехам. Калідор быў паўнюсенькі, бо на дварэ ймжыў дожджык. Дзяўчына чулася ў гэтым новым асяродзьдзі зусім дзіка. Мяркавала, што ў ліку вучняў павінна быць якая вясковая дзяўчына, з каторай можна будзе пасябраваць, а таму пільна ўглядалася ў твары й на вопратку. А Янук усё касурыўся на яе зь недалёкага кута.

Доўга цягнуўся першы дзень школьных заняткаў. Калі іх канец абвесьціў апошні званок, згубіў Янук Дуню з вачэй, ды аж засопшыся нагнаў яе ў полі за мястэчкам. Ішла борзда, ледзь заўважна пазіраючы назад церазь левае плячо, быццам чакаючы зь Януковага боку нейкае неспадзеўкі.

- Стой ты! - гукнуў хлапец, нагнаўшы. Дзяўчына звольніла ходу й глядзела Януку проста ў вочы. Погляд гэны быў такі просты й сьмелы ды зусім бязь нейкіх нязычлівых адценьняў, што хлапец разгубіўся, адвёў уніз зрок.

- Што хочаш? - спытала.

- Я... хачу, каб ты са мной у школу ні хадзіла, - прамармытаў, апаноўваючы сваю разгубленасьць, пастух.

- Я з табой ні хаджу, - сказала Дуня ды зноў прысьпешыла кроку.

Янук, як абліты варам, застаўся ззаду. «Ах, каб цябе халера, жаба ты! Яшчэ во носа задзіраіць. Я-ж табе!» - наважыўся ён.

- Пажджы! - гукнуў зноў на дзяўчыну. Дуня гэтым разам прыкінулася, што яго ня чула. Ішла вальней, паглядаючы на яго бокам,

трымаючыся напагатове, каб у выпадку небясьпекі, як тая курапатка, пырхнуць да раптоўнага ўзьлёту. Хлапец ня ведаў, што далей рабіць. Гэта каб Макатунішка яго адразу спалохалася, пачала ўцякаць ці што, от тады-б ён кінуўся за ёй наўздагон, злавіў-бы дый мо адразу так накамшыў-бы туды, дзе баліць, настрашыў-бы, што адхацелася-б ёй школы. Яна-ж наадварот: проста й сьмела яму ў твар адказ кінула. Такога не спадзяваўся. За сваю разгубленасьць і няздарнасьць, за тое, што вось «гэтая жаба» да страты ягонай раўнавагі спрычынілася, яшчэ больш злаваў і кіпеў Янук.

- Я хачу, каб ты саўсім у гацкую школу ні хадзіла! Чуеш ты? - моцным і пагрозьлівым голасам загаманіў Бахмач.

Дзяўчына зірнула ад яго спадылба.

- Адчапіся! - сказала.

Хлапец зьбянтэжыўся канчаткова. Што тут рабіць? Набіць яе? Але-ж як гэта, калі не ўцякае? Вялікую крыўду пачуў да яе за тое, што не захавалася так, як ён хацеў. Звольніў кроку й застаўся ў роздуме. Дзяўчына-ж пасьпяшыла, быццам высьцерагаючыся, каб не пачаў абкідаць яе каменьнямі.

Ад гэнага першага дня Дуня пазьбягала Янука. Меціла заўсёды, каб выйсьці раней із школы й апярэдзіць яго. Вясковыя-ж падшыванцы, дражнячы Янука, быццам у вадну дудку трубілі. Нават Макатуном яго клікалі. Найперш хлапец гэна зьвяганьне міма вушэй стараўся пушчаць. Ды іншым разам, бывала, так дапякуць-дасоляць, што ажно рукі сьвярбяць, каб катораму ў мурло заехаць.

- І што гэта за школа, што Макатунішка туды ходзіць? Га-га-га! - кпілі зь яго. Выглядала, што яны, якія невукамі наважылі быць, сталіся цяпер разумнейшымі за яго адно таму, бо не наведвалі школы, куды хадзіла Дуня. Заміж таго, каб паспачуваць дзяўчыне, каб за зьвяганьне прылавіць і аддубасіць каторага, Янук яшчэ больш кіпеў злосьцю на Дуню: гэта яна віною ўсіх кпінаў была. Наважыў раз і назаўсёды адабраць у яе ахвоту да навукі.

Гэтым разам пасьля заняткаў выбег першы, борзда мінуў местачковыя хаты й, убегшы ў лясны гушчар прытаіўся ля самай сьцежкі. Сядзеў упрысядкі й праз галінкі кустоў сачыў, як Дуня, нічога дрэннага не варожачы, спакойна йшла дахаты. Крыху раптоўней пачало біць Янукова сэрца ў меру ейнага набліжэньня.

Калі мінала Янукова сховішча, ён раптоўна выскачыў з-за куста. Дуня перапалохалася, манілася падацца ўбок, але Янук хапіў яе за рукаў.

- Я-ж цябе правучу, крутушка ты! - сыкнуў. - Я табе казаў са мной у школу ні хадзіць!

Дзяўчына пачала тузацца. Сшыткі й кніжкі ейныя вытрасьліся з кужэльнай сіняй торбы на мокрае лісьцё.

- Пусьці мяне, ты... злы...

Адылі Янук уплёўся яшчэ мацней, падставіў нагу, пакаціў і пачаў таўчы яе кулакамі. Макатунішка, спасьцярогшы, што левая Янукова рука трымала за каўнер ейнае паліто, моцна ўкусіла яе зубамі. Хлапец із крыкам ад болю выпусьціў каўнер, але адно на міг. Яшчэ больш разьюшаны, пачаў біць дзяўчыну па грудзёх і па твары. У яе паказалася кроў з носу, але хлапец не ўтаймоўваўся. Меў намер біць, пакуль пачне прасіць літасьці.

У гэнай гарачцы не пачуў Янук ззаду крокаў. Нейкая моцная рука падняла яго, як кволае шчанё, ды паставіла на ногі.

- Ты што гэта выраблеш? Ах нягоднік! За што яе б'еш? - злосна загудзеў бас дзядзькі Захарука, і перад самым Януковым носам гнеўна задрыжэлі даўгія рудыя вусы. Дзядзька наскочыў, відаць, на іх неспадзеўкі.

Янук стаяў спалоханы й зьбянтэжаны, ды крыху пабойваўся, што яму цяпер ад дзядзькі ў каршэнь дастанецца. Балела ўкушаная рука. Макатунішка ўскочыла зь зямлі, абтрасала лісьцё, зьбірала ў торбу сшыткі й кніжкі. Твар ейны быў акрываўлены, у вачох стаялі сьлёзы. Захарук, быццам клешчамі, трымаў хлапца за правую руку.

- Дзядзька, пусьці, - прасіўся Янук.

- Скажы, чаму дзяўчыну біў, тады пушчу! - загадаў Захарук.

Янук маўчаў і тузаўся.

- Завошта ён цябе біў, Дуня? - спытаў рудавусы дзядзька дзяўчыну.

- Ні пушчаіць у школу. Кажыць, каб зь ім ні хадзіла, - дрыжачым галаском скардзілася пакрыўджаная Макатунішка.

- Так? - зьдзіўлена зірнуў проста Януку ў вочы здаравенны дзядзька. - Ты гэта што? Яна цябе пытацца маіць? Чаму-ж гэта?

- Калі яна,... - зацяўся Янук.

- Ну, ну! Што яна? - спанукаў дзядзька.

- Яна - Макатунішка, от што. Мне ўсе хлопцы наругаюцца, праходу ні даюць.

- От як! Дык гэта ты думаіш, што ты за яе лепшы, га? Скажы, чым-жа ты за яе лепшы!

Янука як быццам хто доўбняю па галаве ў той момант смаляну. Ніколі ня бачыў сваіх суадносінаў з Макатунішкай у сьвятле такога параўнаньня. Іншыя раней за яго ацанілі, пастанавілі, вынесьлі маральны вырок. Янук прыняў той вырок, як добрую манэту. Ніхто-ж раней не пярэчыў, што Макатунішкі - гэта нешта самае найгоршае й найніжэйшае. І ён малпаваў іншых.

- Дзядзічка, пусьці! Баліць, - прасіўся.

- А будзіш болі біць?

- Ня буду.

- Ну глядзі-ж, а то дух зь цябе вон, як другі раз злаўлю! - памахаў Захарук пагрозьліва жоўтым, пазакурваным тытунёвым дымам, пальцам. - Ты ня думай, што ты за яе лепшы. Усе чыста людзі перад Богам роўныя. Толькі адны ёсьцека багацейшыя, а другія бяднейшыя, адны маюць болі, а другія мені бяды, от як. А на другіх хлопцаў, каторыя цябе дражняць, плюнь. Яны самі ў школу лянуюцца хадзіць і табе й Дуні зайздросьцяць, от як. Ну, дык ты дзяўчыну ня крыўдзі, а памагай ей. Будзіш ці не?

- Ня буду біць.

- Дык глядзі.

Часта пасьля вяртаўся Янук да пастаўленага Захаруком пытаньня: «чым-жа ты за яе лепшы?» Падрастаючы ў асяродзьдзі, дзе быў войстры сацыяльны падзел, Янук пераймаў-малпаваў думкі іншых, разважаў прынятымі нормамі й катэгорыямі. Адно было лепшае, а другое горшае, гэта было чорнае, а тое - белае. Макатунішка была горшая за іншых таму, бо выводзілася зь бяднейшых, найбольш сацыяльна пакрыўджаных у вёсцы.

Захарукова пытаньне спрычынілася да завайстрэньня Януковай назіральнасьці. Пільней пачаў цяпер прыглядацца Макатунішцы, дый ужо ня з тэй пазыцыі, што раней, калі дзяўчына загадзя прыдзелена была да групы найгоршых.

Перадумаўшы, Янук ужо гатовы нават быў згадзіцца, што Макатунішка не абавязкова горшая за яго таму, што яна зь бяднейшых, што прынамсі гэта яшчэ канчаткова не ўстаноўлена; у сваёй ацэне

даваў пэўную скідку на дзяўчынін характар. Дуня-ж далей трымалася ад яго здалёк. Школу наведвала рэгулярна. Янук заўважыў, што выяўляла немалыя здольнасьці, матар'ял заўсёды мела добра апанаваны. Адно недахоп сьціпласьці замінаў Януку прызнацца, што з навукай ня горш, чым ён, спраўлялася. Калі-б хлапец прыгадаў яшчэ, у якіх умовах Дуня жыла й што дома амаль ня мела магчымасьці рыхтаваць школьных працаў, запраўды мо зьдзівіўся-б, як яна раду дае. Але так далёка думаць ці ацэньваць Бахмач яшчэ ня ўмеў.

Адзін выпадак зьбліжыў яго назаўсёды з Макатунішкай.

Гацкую школу наведвалі найбольш местачковыя дзеці польскіх ураднікаў, чыгуначнікаў, асаднікаў ды іншых. Гэта была тая катэгорыя людзей, якіх Янукоў бацька залічыў да «не твайго носа-палоса». Іхныя кругленькія пунсовенькія тварыкі ня звыклі моршчыцца ад нявыгады, а кішкі ў чэравах - бурчэць ад голаду. Добры мелі абутак, а на вопратцы рэдка калі дзе латку ўбачыш. Куды там да іх пастуху Януку раўняцца было! Зімой у іх і канькі, і лыжы, летам і мячы, і рыбалоўнае знарадзьдзе, а часу для гульняў і адпачынку хоць адбаўляй. Яны заўсёды ўлёгцы час праводзілі. Дзе гэта калі Янук бачыў каторага зь іх пры якой працы.

Прыгадвалася Януку адно ці другое яйка, што маці зь вялікай руплівасьцю адкладала ад тых трох ці чатырох нясушак, каб-жа хаця які дзясятак назьбіраць; прыгадвалася дбайна й сквапліва зьбіраная ў вялікім стаўбуне сьмятана, зь якой пасьля ў маслабойцы-самаробцы масла білі, а перагонам і сыраваткай свае дзеткі сытыя мусілі быць; тварог ішоў на сыр, які маці выціскала ў кружэльнай чыстай торбачцы й пасьля падсушвала. Усё гэта, старанна ашчаджанае, ад сваіх дзетак адабранае, пасьля ў мястэчка маці на рынак нясе, каб паном прадаць. За тыя-ж скупыя грошы трэба й солі, і газы, і запалкаў, і цукру - усё найнеабходнейшае ў гаспадарцы, без чаго не абыйдзесься. Самі-ж неяк ногі валачылі: то на сыраватцы, поліўцы, то на перагоне, а то часта й у прыгаладзь.

Дык вось гэта й былі тыя самыя дзеткі панкоў, што на цяжка сабраных маткай ласунках гадаваліся й круглелі. Як-жа не ласавацца й не абжырацца ім, калі ў іхных бацькоў усе грошы былі! Яны не даглядалі й не гадавалі, адно спажывалі. Януковы-ж ад цямна да цямна на неўрадлівай сваёй ці ўрадлівай панскай ніве кешкаліся, а калі гэта дзеткі Бахмачовы якія ласункі бачылі? Хіба адно на Каляды ці

Вялікдзень, дый то скупа. Дзіва няма, што Янукова чэрава на ліхой поснай страве бурчэла-жалілася.

Разважаньні гэткія радзілі ў Янука нялюбасьць да сыценькіх польскіх дзетак. Адылі як на дзіва, хоць часта галодны, Янук на навуку моцна налягаў і хутка адным зь першых вучняў у клясе стаўся. Местачковыя-ж вучні пачалі глядзець на гэтага худога, сьціпла апранутага юнака ізь зьдзіўленьнем і зайздрасьцю.

Янук увыдатняўся й іншым. Хаця ў школе забаранілі гаварыць пабеларуску, асабліва падчас лекцыяў, ён ніколі не цураўся роднага слова. Як толькі што трэба было да якога беларускага хлопца ці дзяўчыны сказаць, дык як наўмысьля ад нікога ня крыўся. Мо таму, што адным зь перадавых у клясе быў, настаўнікі гэта міма вушэй пушчалі. Не палюбілі-ж яго некаторыя, «хамам» і «кацапам» пачалі клікаць ды шукалі нагоды, каб «падцерці хаму носа». Янук не адказваў на іхныя выклікі й зачэпкі.

Было двух, што настырліва Януку на пяткі налазілі, безь зьняважлівае зачэпкі рэдка калі міналі. Сьціснуўшы зубы, доўга цярпеў хлапец. Ажно аднойчы пастанавіў, што перабіраюць мерку, што далей, то праходу нідзе не даюць. Калі якой рады ня ўзяць, дык і на галаву ўзьлезуць.

Пры першай нагодзе пасьля такой пастановы насаліў ён тым дакучлівым, колькі ўлезла. На вынікі доўга ня трэба было чакаць. Панкі ведалі, што й свіньня, бывае, дзеля свае патрэбы ад карыта адыходзіцца, дык у школе Янука не чапалі. Аднаго дня пасьля школы аж на краю мястэчка Бахмача прыпільнавалі. Янук ня першы раз удужкі браўся, і пакуль яго ўтаймавалі, дасталося й самім. Але-ж двух аднаму цяжка асіліць. Ну й спаганялі-ж ахвоту. Калі зьнядужэлы хлапец ня мог бараніцца, яшчэ паваленага чаравікамі даканчвалі.

- Ах, вы, што гэта робіце?! - крыкнула, падбегшы, Макатунішка. Забылася ўраз аб крыўдзе, якую Янук ёй некалі зрабіў, сьпяшалася на помач.

- Заўтра дырэктару скажу, пабачыце вы, бандыты! - крыкнула яна, уплёўшыся за палячкоў і адцягваючы іх ад Янука.

Адзін сыкнуў на дзяўчыну, але другі спыніў яго. Янук ляжаў на траве ля дарогі й стагнаў. Пазьбягаліся, каб пабачыць, што сталася, абступілі Янука й Дуню суседнія дзеткі й старэйшыя. Палячкі змыліся. Як тая клапатлівая кураводка затупала ля хлапца Макатунішка,

мяркуючы, як-бы яму памагчы. Кінулася ў суседні двор, намачыла ля калодзезя ў цэбрыку хустку й пачала абмываць акрываўлены твар. Стогнучы, хлапец уставаў.

- Але-ж і зьбілі, чэрці! - кляла дзяўчына. Яна нясьмела глядзела Януку ў вочы, быццам баялася, каб не прагнаў. Янук абмацваў твар, бакі. Смылела скура, набухалі пухліны, паказваліся сінцы. Ён із сарамяжлівай удзячнасьцю зірнуў на Дуню й рад быў-бы ейную руку пацалаваць. Ніколі яшчэ ня чуўся перад ёй такім маленькім. Ня мог наважыцца зірнуць у васількова-сінія заклапочаныя вочы, прыгадваючы, як некалі яе скрыўдзіў.

З таго дня пасябравалі. Разам хадзілі ў школу, дзяліліся вучнёўскімі клопатамі й інтарэсамі, уражаньнямі й спасьцярогамі аб іншых вучнях, настаўніках, кніжках, што чыталі ці жадалі-б прачытаць. Чым больш пазнаваў Янук Дуню, тым больш яе шанаваў.

Было гэта аднойчы перад Калядамі. Дуня, выкліканая да дошкі з арытмэтыкі, часта запіналася, голас ейны дрыжэў. Янук быў больш зьдзіўлены, чым разчараваны. Бачыў, як некаторыя дачушкі панкоў хіхікалі, задаволена моргаючы адна другой вачыма. Януку шкада стала Дуні. Калі-б мог, пасьпяшыў-бы ёй на дапамогу. Дзяўчынка, атрымаўшая дрэнную ацэнку, пунсовая ад сораму, вярталася на сваё задняе мейсца.

Дамоў ішла сумная. Як ні прабаваў разьвясяліць яе Янук, нічога не памагала.

- Скажы мне, чаму ты сягоньніка лекцыі ні знала. Ты-ж кажды раз...

- Учорака ні далі мне навучыцца, от чаму, - злосна адказала дзяўчына.

- Хто гэта?

- Знаіш хто...

Дрыжэла ейная ніжняя вусьніна. Заносілася на плач. Старалася не глядзець Януку ў вочы.

- Не, ні знаю, - сказаў Янук.

- Бахуры, от хто! - сказала й злосна зірнулі на сябру. Васільковыя вочы загарэліся благім агнём.

- Дык, а чаму ты ад іх ні схаваесься?

- Куды-ж? Да сьвіньні ў катух пайду, ці што? У нас цесна, разлажыцца недзіка.

Доўга йшлі моўчкі. Янук цяпер пачынаў разумець, як цяжка Дуні даецца навука. Іншая даўно рукой махнула-б, плюнула-б на яе. Але не яна. От-жа-ж і вытрывалая. Хоць із плачам, але цягне, не паддаецца. Ды, прызнацца, Янук і ня бачыў яе яшчэ ніколі ў плачы.

- Слухай, Дуня, - пачаў ён. - А можа-б разам са мной магла ты лекцыі адрабляць, га? Калі хочаш, я папытаю тату.

Дзяўчына доўга й уважна паглядзела на яго, нічога не адказаўшы. Здалося Януку, што тварык ейны праясьніўся, як у хмарны дзень нясьмела вызірне з-за кружалю хмар і хлыне сьвятлом, каб воміг зноў схавацца, сонейка.

- Ну, дык што ты на гэта? - насядаў Янук.

- Ні знаю, Янучок. Пагавару з мамай, што яна скажа. А ты папытайся свайго таты, калі захачу прыйсьці, то ці пусьціць.

- Ну добра, - буркнуў Янук.

Быў крыху разчараваны, што не згадзілася адразу. Падсьведама, відаць, жадаў, каб дзяўчына была ў яго ў нечым, хоць самым маленькім, залежная. Ужо нават хлопцы вясковыя спынілі дражніць яго Макатунішкай, калі ад некаторага часу іх маўчаньнем збываў. Адылі сам адно кагадзе пазнаў, як моцна быў да гэтай беднай Макатунішкі прывязаны, якую неацэненую меў у ёй сяброўку. І найгорш упікала яго гэтая ганарлівая, як яму здавалася, незалежнасьць ейная. Але чаму сяньня назвала яго «Янучок»? Гэта-ж сталася ўпяршыню. Адно маці гэтак яго клікала. Здрабнелае ймя мела таму для яго асаблівую цяплыню й ласку. Ня можа быць, каб з Дуніных вуснаў выскачыла яно прыпадкова. Мусіць, была яму ўдзячная за прапанаваную паслугу ды йнакш ня ўмела выказаць.

Назаўтра Дуня сказала, што маці дазволіла ёй заходзіцца да Бахмачоў рыхтаваць лекцыі. Януковы-ж бацькі ня толькі ня мелі нічога супраць таго, наадварот - былі задаволеныя. Навылёт ведалі, у якіх умовах жывуць Макатуны, і рады былі памагчы.

Ад таго часу, з прычыны такога збліжэньня між Януком і Дуняй, сяброўства іхнае яшчэ больш утрывалілася. Большую частку дня праводзілі супольна. Па дарозе ў школу й назад шмат было часу для гаворак. Дзяліліся міжсобку, бяз утойваньняў, усімі пытаньнямі, што іх супольна цікавілі. Янук ня бязь зьдзіўленьня спасьцярог, што Дуня шмат аб чым гаварыла з мудрасьцю й дасьведчаньнем старэйшых

людзей. Хлапца інтрыгавалі прычыны гэтых дасьведчаньняў, аж пакуль аднойчы не знайшоў іх кораня.

- Кім ты, Янучок, думаеш быць як вырасьцеш? - спытала Дуня.

Ішлі дамоў чыгункай. Шарэла. Дзесь воддаль сьціхаў грукат цягніка, што нядаўна абмінуў іх і паймчаўся ўва ўсходнім кірунку. Януку так ласкатаў сэрца гэны «Янучок» у Дуніных вуснах, што пару разоў меціў ужо адудзячыцца тым самым - назваць яе Дунячкай, але не асьмеліўся. Так і цяпер, адчуўшы цяплыню з боку сяброўкі, марудзіў з адказам.

- Ні знаю. Можа, вучыцелем... Але ці ўдасца гэта. У пшэкаў сваіх вунь хоць ты памялом вымятай.

Памаўчалі. Скарынкі зьледзянелага сьнегу па ўзбочынах чыгункі хрупалі пад нагамі. Разглядалі апрануты ў шэрань, казачны ў сваёй зімовай дрымоце, лес і першыя бледныя зоркі на небе.

- А ты, Дуня? - спытаў Янук.

- Ні знаю, - адказала раптоўна й коратка.

- Ну табе што: выйдзіш за багатага замуж і панаваць будзіш, - пажартаваў Янук.

- Ты папаў, як пальцам у неба. Ікраз багатыя такіх шукаюць!

У ейным голасе быў выразны сарказм.

- Ну дык што тады? Можа, служанкай у тоўстапузага якога пана збадзяіся? Хіба-ж ня будзіш так рабіць, як твае сёстры...

- Янук, барані цябе Бог! Як можаш ты аба мне так падумаць!

У словах ейных чуўся такі пярэпалах, зьмешаны з горачай, а ў вачох зазьзяла такая зласьлівая маланка, што Янук жахнуўся. Нярад быў, што на такую гутарку павярнуў. Цікавіла яго, што Дуня думала пра сваіх сёстраў. Ніколі-ж дагэтуль не пытаў яе пра гэта. І ўжо іншым разам, калі дзяўчына была, як здалося хлапцу, у гаворцы шчырая, наважыў спытацца.

- Ня гневайся, Дуня, што цябе гэта пытаюся. Што ты думаеш аб сваіх сёстрах?

Пагодны твар Макатунішкі воміг захмарыўся.

- Чаму пытаісься?

- Бо хачу знаць.

Добрых дзьве ці болей хвіліны йшлі моўчкі. Пасьля стрыманым голасам яна пачала распавядаць.

- Сёстры мае, сам знаіш, што пра іх людзі гавораць. Німа чым хваліцца. Дзяцей настараліся, цяперака самі ні рады Мне сэрца баліць, як я на іх і на гэтых бедных байструкоў гляджу. А ці ты думаіш, што гэта толькі яны вінаваты? Га? А гэныя-ж валацугі-бабнікі, што за імі бегалі, пакуль ні пазводзілі, то што, можа ні вінаваты? Яны яшчэ болі вінаваты. Чаму гэта ўсе ў нашых дзіўчат каменьнямі цаляюць, а чаму гэных сабак ніхто пальцам ні ткне, га? Скажы ты мне, Янучок, гэта.

Ніколі ня мог Янук уявіць, што Дунін ружовенькі тварык мог так крывіцца пры такой сіле злосьці й пагарды да «гэных сабак». Здавалася, што, каб магла, спапяліла-б іх.

- Янук, я табе праўду скажу: мне чатырнаццаты гадок ідзець і я толька падлётак. Але ці знаіш ты столька, сколька я пра жыцьцё знаю? Яны-ж і сваруцца, і Бог знаіць што расказваюць. Вушэй-жа ні пазатыкаю, дык і чую хоцькі-няхоцькі. Ты ў гэтым усім яшчэ зялёненькі надта, а я вунь якія дзівы чула. Ты, мусіць, думаіш, што ёсьціка нейкая любоў ці што. А я як наслухаюся й прыгледжуся, як мае родныя гаруюць, дык мне, Янучок, здаецца, што німа ніякага шчасьця на сьвеце й нічога пекнага. Ёсьціка толька нешта бруднае, от мусіць так, як сучка із сабакам, ды пасьля лішнія, нікому ніпатрэбныя шчаняты на сьвет...

Апошнія словы Дуня вымавіла з агідай. Янук не асьмеліўся павярнуць у ейны бок галавы, баючыся стаць аб'ектам дакору ў ейных прывабна-разумных васільковых вачох. Ён-жа хоць і ня зьведаў яшчэ таямніцаў каханьня, ды наконт іх наагул мала ведаў, ужо ў гэтым, нянавісьцю насычаным дзяўчыніным голасе, чуў дакор і пад сваім адрасам. Як-ні-як зь яго таксама-ж некалі вырасьце мужчына - значыцца, можа ў будучыні належаць да «гэтых сабак».

«Дык от сколька яна знаіць», - думаў ён пра дзяўчыну, што побач роўнымі крокамі мерыла дарогу. Тварык ейны быў пунсовы ад шчыплівага марозу, а вочы, што ганьбавалі ўвесь мужчынскі род, які спрычыніў шмат крыўдаў ейнай сям'і, у сваёй суровасьці выдаліся Януку яшчэ больш прывабнымі. Крадком, пазіраў на дзяўчыну, і ў галаве мігам нарадзілася думка, што варта было-б узяць гэтую прыгожую Дунечку й пацалаваць, папрасіць, каб не кіпела гневам, каб стала ціхай і спакойнай, дабразычлівай ягонай сяброўкай, як заўсёды. Ня ўсе-ж і мужчыны такія, як ёй здаецца. Вось узяць-бы хоць яго самаго: як вырасьце, дык ужо што як што, ну ніколі ня пойдзе такой

дарогай, каб прыдзялілі яго да «гэных сабак», каб прыносіць нявінным дзяўчаткам крыўду, спрычыняцца, каб няпрошаныя й нікім нялюбыя дзеткі на сьвет радзіліся. О не! Ён ніколі ня будзе гэткім! Але-ж як гэта ўсё Дуні пераказаць?

У гэны момант малы Бахмач адчуў, што дасьведчаньнем дзяўчына была за яго на колькі гадоў старэйшая. Ты паглядзі, аб чым яна гаварыла й зь якой эмацыянальнай сілай ганьбавала нейчыя ўчынкі! Значыцца, усё гэта было ў ейным асяродзьдзі дзесьці ў корані, мусіла перажыць, перацярпець, перадумаць, адно бачачы, як родныя гаруюць. А што-ж ведаў ён, Янук? Проці яе, дык ён горкае дзіця. Куды яму да Дуні!

Макатунішка абмінала гаворкі аб каханьні іншых людзей. Калі-ж даводзілася, прыкладна ў сувязі з тым, хто ў школе на каго заглядаецца, ці да каго «падстрэліваіць», то гаварыла неахвоча, збывала тэму паўсловамі.

Так і павялося, што тэму каханьня Янук і Дуня абміналі, як змовіўшыся. Янук адчуваў, што патрэбна гэта для добрага сяброўства з Макатунішкай. Вось і цяпер, седзячы пад бярозай, стругаючы, ён зь вялікай радасьцю сустрэў дзяўчыну. З выгляду мела яна ўжо поўнае права называцца дзеўкай. Ладна ўвыдатняліся ў яе прывабныя рысы росквіту раньняга дзявоцтва. Сказаў-бы хто, што яна была ўжо набухнутая й поўная абрысамі свайго хараства пупушка ружы, што вось-вось мела зацьвіцець. І ў гэты дзень на захад сонца, калі вакол пасьмялелі пасьля дзённае гарачыні птушкі, калі ўсё ажывала із сваёй млявасьці й пачынала буйнець сокамі сакавітага летняга росквіту, дзяўчына гэтая здавалася яшчэ больш прынаднай, чым калі ў іншы час.

- Глядзі, Янучок, асаднікавых каровак, а ня дудкі стругай, - усьміхнулася дзяўчына, адкінуўшы завязаны мех і мосьцячыся, каб прысесьці побач пастуха.

- Каровак гэтых цяперака й дзіця дагледзіць. Відзіш вунь, як панажыраліся.

- Добры зь цябе, мусіць, пастух.

- Лацьвей пасьціць, як ёсьцека на чым. От папасі ты ў нас удома, калі тэй карове хоць ты скапычаную голую зямлю грызі. То табе ні хаханькі. А што гэта ты ў мяшку тарабаніш?

- Адгадай.

Янук падцягнуў да сябе зрэбны парудзелы мех і браўся разьвязаць. Дуня лагодна стукнула яго па руках.

- Ні разьвязывай. А нос нашто?

Янук нахіліўся над мехам, колькі разоў чмыхнуў носам, цягнучы водар духмянага зельля. Дуня схапіла яго за галаву й пачала таўчы носам у мех.

- Ну, адгадывай скарэй! - падахвочвала, хіхікаючы.

- Ні адгадаю, лепі скажы.

- А от ні скажу.

- Ну, дык любіць цябе за гэта ня буду.

- І ня трэба, лепшага сабе знайду.

- Толькі-ж паспрабуй! - засьмяяўся Янук.

Настаў нязручны момант. Абодва абліліся чырваньню й глядзелі ў бакі, каб не сустрэцца вачамі. Шмат часу пазьней, прыгадваючы гэты момант, Янук пэўны быў, што, яшчэ аб тым ня ведаючы, яны тады ўжо былі закаханыя.

- Дык што? Многа назьбірала ўжо? - спытаў Янук, каб спыніць нязручнае маўчаньне.

- Нямнога. Алі-ж усё лета наперадзе.

Гамонка не вязалася. Не пра тое хацеў Янук выпытаць дзяўчыну.

- Слухай, Дуня. Ці праўда гэта, што вашая Параска камуністычныя афішкі разносіць?

- Якія?

- Бальшавіцкія.

- А хто гэта табе казаў?

- Так многа хто гаворыць. Праўда гэта ці не?

- Я яе ні пыталася. Можа, дзе й носіць. Я-ж за ёй ні хаджу й ні падглядаю.

- А яна што робіць цяпер?

- Во цяперака во?

- Ага.

- У ліпавіцкага пана, мусіць, у вагародзе поліць ці што. Чаму пытаісься?

- Знаіш, каго я ў Гараватцы на Яна вечарам відзіў?

- Каго-ж? Чарцей, можа...

- Чарцей, ды такіх, што й ты іх знаіш. Адзін Шпунтоў Лявон, а другі ці ня быў Косьцік Сабакевіч. Чуў як Лявон зь некім гаварыў. А ў

гэны-ж дзень каля гацкай царквы бальшавіцкія афішкі параськідалі, дык паліцыя й шпікі Косьціка шукалі. Двух-жа на вічарыня ў Кмітавых было. Дык Лявон, мусіць, із Косьцікам адну руку дзяржыць, а празь яго й твая сястра дастаець. Як ты думаіш?

- Параска каб калі заікнулася што. Сам знаіш, якая яна дзіўная бываіць...

Янук ведаў, што Дуня разумела пад тым словам «дзіўная», і далей не пытаўся.

- Што-ж тады Лявон табе казаў? - спытала Дуня.

- А што ён маіць казаць? Ні рад быў, што на мяне наткнуўся. Казаў мне, што нікому ані слова пра тое, што ў Гараватцы відзіў, а то...

- А то што?

- А то, кажыць, ні жывацей. Так і сказаў: ні жывацей. І яшчэ адно, але ні знаю, ці табе прызнавацца...

- Чаму-ж не, кажы! - загарэлася Дуня.

- Раскажыш каму?

- Яй-Богу, не! Дадушы!

Янук зірнуў у Дуніны вочы й пабачыў там шчырасьць.

- Гэты самы Лявон Шпунт мяне ў Кмітавых сенцах, скора пірад тым, як паліцыя прышла, злавіў. Я толька ўбег, а мяне нехта хап! упацёмку, дык я аж спужаўся. А ён мяне тады ў цёмны куток адцягнуў і пытаўся, ці я каму ні расказваў, што яго ў Гараватцы відзіў.

- Мусіць, баіцца, каб ні зналі...

- Няўжо-ж што...

- От-жа чорт лазовы. Гэта-ж цяперака добра было-б, каб яго ў цюрму ўпякаць, - сказала Дуня.

- Чаму?

- Ён маіх сясьцёр зьнявечыў. Дык ніхай-бы гніў там, ніхай-бы вошы заелі падлу!

Дунін голас шыпеў злосьцю.

- Ты знаіш, што гэта ён?

- А хто-ж? Я-ж ні глухая - чую, як яны гаворуць.

- От яно як.

- Што ты скажаш, Янучок, каб гэта пайсьці ды паліцыі сказаць? Ніхай-бы ўзялі.

- Божа цябе барані! Лепі ні чапай заразу. Яшчэ дазнаіцца, дык посьля ні дасьць жыць.

- Чорт яго бяры. От пайду ды й заяўлю.

- Калі ты гэта сур'ёзна, дык я табе ні пазволю.

- Як гэта так?

- Ты-ж мне бажылася, што нікому слоўца ні пікніш, што я табе раскажу.

- Праўда. От ліха, чуць душой ні скрывіла.

IX

Гэны нядзельны дзень пачаўся для Пракопа Бахмача вельмі рана. Учора яшчэ між ім і Аленай Бахмачыхай адбылася такая гутарка:

- Схадзілі-б, можа, заўтра ў маліны? - пачала жонка.

- Куды гэта?

- У казну, куды-ж яшчэ...

Пракоп прамаўчаў. Ён і жонка былі ў саракавых гадох, у самай сіле й росквіце.

- Калі тут, ці заўчорака гэта, відзіла вуньдзіка, як Бруніські дзьве, каждая па вялікім кошыку малін тарабанілі. А такія сочныя, вялікія, духмяныя. Людзі павызьбіраюць, пакуль мы сабяромся.

Пракоп ведаў, што хаця-нехаця, заўтра ў сьвяты нядзельны дзень трэба будзе йсьці ў лес па маліны. Трэба якога-ж варэньня, каб хоць на лекі.

- Можна было-б, - адказаў, марудзячы. - А як-жа гэта з талонамі будзіць?

- Абойдзіцца неяк. Дзе-ж грошы...

Мова была пра талёны, што трэба было выкупляць ад мяйсцовага солтыса, што тут выступаў як агэнт лясьніцтва, або ў самай лясьнічай «панствовай» канторы ў Гацях. Без талёну нельга было ў скарбовым лесе зьбіраць грыбоў, арэхаў, розных ягадаў. Адзін талён каштаваў 50 грошаў - паўдня жаночае працы ў ліпавіцкага пана ці ў суседнім фальварку.

Мяйсцовай лясной дзялянкай загадваў бальшыні вакольных людзей нялюбы руды, каржакаваты колішні легіянер Зьдзісек Бжончэк. Ён, які ліс, вечна стрыг вушамі й чмыхаў-нюхаў носам. Быў зь яго выдатны службісты. Калі пойдзеш у лес, не трапляйся яму лепш на

вока. Меў двох памочнікаў, што рабілі аб'езды. Тыя былі куды лагаднейшыя.

Агульна ў Заходняй Беларусі былі чатыры апірышчы польскага акупацыйнага апарату: паліцыянт, каталіцкі польскі ксёндз, солтыс і настаўнік. Для літоўскіх і суседніх быў яшчэ й пяты слуп у васобе пана Бжончыка. На яго баку была ўлада. Ён нават чыніў гвалт над сялянамі, што без дазволу стараліся сарваць якую ягадзіну, арэх ці грыб. А ўжо ніколі не папускаў злодзеям, што якое дрэва высячы паквапіліся.

Каму-ж гэта не рупіла ў лес! Цяжка нават уявіць Беларуса бязь лесу. У яго самога карэньні, можна сказаць, ад веку вякоў лясныя. У лесе такое багацьце ўсякага дабра, такое вялікае й неабдымнае харство! Але тут вось на дарозе вырас пан Бжончэк, і ані кроку! Ён тут гаспадар!

Аб гэтым усім думаў Пракоп Бахмач у нядзелю раніцы. Устаў з пасьцелі ціханька, усьпяліў на сябе зрэбныя порткі, падношаную сінюю кужэльную сьвітку й, перш за ўсё, упоцемку стануўшы перад абразамі на покуці, змовіў раньнюю малітву.

Бахмачыха чула, што ўстаў муж, але знаку аб сабе, што прачнулася, не падала. «Ніхай-жа думаіць, што сплю», - падумала. Рыпнулі ў сенцах дзьверы, і Пракоп ступіў на сухі панадворак. Даўно не было дажджу, прыгадаў Пракоп. Нахінуў пры калодзезі вядро, сьцюдзёнай вадой апаласнуў твар, выцер ручніком, што вісеў на плоце.

Ужо золак. Пабляднелі зусім зоркі на чыстым небе. Неўзабаве будзе віднець. Трэба, не марудзячы, вывесьці й напасьвіць па канавах ля дарогі Чарнулю. Там, як сонца на пядзю вышыні з-за балота вызірне, дык можна будзе падаіць, а тады й у «казну» па маліны пайсьці. На сваім-жа папары каб табе дзе травінка - гэтак усё высахла. Ды й колькі там гэнага папару - як добрай кабеце сесьці. Гэта во, каб не вадзіў пасьвіць па канавах ля дарог, ля могільніку ці дзе трапіцца сьвежае лапікла травы, то й напарстку не надаілі-б. А жыць-жа трэба, працаваць трэба. На круглагодняй посьніцы ногі выцягнеш.

Ледзь дакранўся Пракоп клямкі варот у хляву, як ад сярэдзіны дайшло да вушэй нізкае й задаволенае мыканьне. Чарнуля ведала, куды павядзе яе гаспадар - не першыня-ж гэта. Кабылы не было ў хляву, яна начавала за гумном у загарадзі.

Пракоп асьцярожна ступіў босымі нагамі ў хлеў. Саломы на посьцілку ў гаспадарцы даўно каб табе каліва засталося. Пад нагамі

стаяў рэдкі гной. Пракоп закінуў Чарнулі павадок на рогі, вывёў да карыта й напаіў. На вуліцы затрымаўся ля плоту, нарваў крапівы й выцер карове запэцканыя гноем бакі й чэрава. Рушыў праз аселіцы ў кірунку могільніка, а там павярнуў на бальшак, што з усходняга боку Літоўцаў бег праз чыгунку ў кірунку Галавачоў, а на поўдні хаваўся ў скарбовым лесе й там лучыўся із гасьцінцам. Па ўзбочынах бальшаку мейсцамі было шмат травы. Не марудзячы, Чарнуля пачала скубсьці, а Пракоп пачаў прыслухоўвацца раньнім гукам і прыглядаўся, як нараджаецца новы дзень.

Віднелася. Ужо спынілі гарлапаніць вясковыя пеўні, а на зьмену ім прыходзілі птушкі. Далёка над дубам Архіпам кружыла зграя варонаў. Пакаркаўшы, паляцелі на дзьве вялікія сосны, што расьлі на могільніку. З Гацяў далятала цяненькае галёканьне й лязгат буфэраў. Пракоп ведаў, што такія гукі робіць малы паравоз, што безьперапынна соўваецца па чыгунках, зьбіраючы ці раськідаючы вагоны. З Гацяў выходзілі тры чыгункі - на захад, усход і поўнач. Станцыя была немалая.

На полі зазьвінеў першы жаўранак. Дзесь голасна сакатала курыца, рыпелі асьверы, чуваць быў раньні гоман пастухоў, што гукалі, выганяючы на поле статак. Спачатку надта-ж асьцярожна, потым сьмялей загудзела дуда ліпавіцкага пастыра Хвядоса. Гудкае мэлядыйнае рэха пракацілася па скарбовым лесе, расплылося ў літоўскіх начоўках.

З-за балота павольна выкачвалася чырвоная куля й захварбавала найдальшыя на заходнім небасхіле кружэльныя пухнатыя хмарынкі. Пракоп, азіраючыся навокал, пабачыў, што дзень нараджаўся цудоўна. Адзін за адным прыкурвалі вясковыя коміны й паставілі дымы слупамі ўверх. На Захаруковай ліпе клякаталі буслы. Адзін зьляцеў, шыбануў колам над балотам і прызямліўся.

Пракопавы думкі павярнуліся ў іншы бок. Аб тым, што ў сям'і ягонай мае зьявіцца новы маленькі чалавечак, турбаваўся ўжо ня першы раз. Яно даўно навіной спыніла быць. Ужо й суседзі, а найперш за ўсіх тыя найбольш дапытлівыя пахатухі-сакатухі, ад якіх вачэй нічога не схаваеш, даўно падсьцераглі й гадалі, ці будзе хлопчык, ці дзяўчынка. Ім што? Языкамі памеляць ды спыняць. От яму, Пракопу, дык мароч галаву. Тутака чатырох апрануць ды накарміць рады не дасі, а пяцёх дык і пагатоў. Хто-б гэта турбаваўся, каб было дзе палюдзку

падзарабіць, або - яшчэ лепш - каб быў кавалак зямлі сваёй, варты таго назову. Пракоп - ня зломак, і не гультай: рукі ў яго, як казалі людзі, залатыя.

Не ў багацьці, выгадзе, ці пяшчотах вырас. Быў сынам дробнага арандатара. Меў старэйшага брата Хвёдара. Перад вайной яшчэ наважыўся Пракоп пашукаць лепшае долі на чужыне ў Пецярбургу. Не павялося й там. Адукацыю меў невялікую. Пасьля доўгіх стараньняў і прыгодаў, бяз сродкаў да жыцьця, уцёрся неяк у кантору пісарам. У самым хвасьце паставілі. Ды мала з таго суцехі было, заробку ледзь на пражыцьцё хапала.

Не азірнуўся, як пачалася катавасія, якую пасьля назвалі Першай сусьветнай вайной. Пракоп усё ліпеў ля свайго канторскага столу, ды трывожыўся, што й яго ваенная хваля паглыне й выкіне на нейкі невядомы чужы бераг. На ягоных вачох адбылася лютаўская рэвалюцыя. Пракопу рупіла ўжо дадому да бацькоў, ды ўсё яшчэ занадта моцна кіпеў мястовы кацёл. Ці ня варта пачакаць, пакуль разьясьніцца? Адылі нічога не ясьнела. Наадварот: адкуль ні вазьміся - павылазілі на верх бальшавікі. Пачалася такая бойня й неразьбярыха, што Бахмач, падмазаўшы пяткі, наважыў раз і назаўсёды разьвітацца з чужым местам.

Трагічная неспадзеўка чакала яго ў роднай вёсцы: бацькі памерлі ад голаду й хваробаў, а Хвёдара забралі ў войска, і сьлед па ім прастыў. Дзяцюк застаўся цяпер сам-адзін, як палец. Нейкі час лындаў-швэндаўся па ваколіцы, пасьля ўцёрся парабкам да ліпавіцкага пана. «Тут абы вайну піратрываць, каб які чорт качаргой ні падчапіў ды на бойню ні пацягнуў, - мяркаваў ён, - а тамака відаць будзіць».

Калі-ж нарэшце аціхла вайна, агледзеўся панскі парабак Пракоп Бахмач, што за ўсякую цану трэба было-б на які кусок зямлі ўзьбіцца. Надта-ж рупіла яму на сваім гаспадарыць. Бацька цэлае жыцьцё на чужых нівах вунь як папацеў, а як з гэтага сьвету сышоў, дык ні кала, ні двара па сабе не пакінуў.

Мара аб сваёй зямлі перарасла ў прагу й марыла па начох бяссоньнем. Як-жа яе прыдбаць? За што? Найлепшы спосаб - узяць із пасагам дзеўку. Вайна прарэдзіла шэрагі вясковых дзяцюкоў, шмат у каго не ставала рук да працы. Дзяўчатаў, якім замужжа карціла, было цімала. Меў Пракоп неблагія шанцы: з выгляду ніштаваты быў, а калі

за якую працу возьмецца, дык яна ў руках аж гарэла. Любасьць глядзець было. Галаву на плячох не для аздобы насіў.

Разгледзеўся Пракоп, узважыў магчымасьці, памяркаваў ды ўзяў на вока Алену. Даволі-ткі ў іх гладка пайшло, палюбіліся адразу. Алена мела старэйшую, ужо замужнюю, сястру Кацярыну й бацьку. Кожнай дачцэ ў пасаг бацька кавалак зямлі даваў.

Пайшоў Пракоп у прымы. Прыказка кажа, што прымачы хлеб - сабачы, але Бахмач ізь цясьцём, што ў гадох ужо быў, і з жонкай добра ладзіў. Ды цесьць скора памёр, а Пракоп, разам із шваграм ягоную спадчыну падзяліўшы, узяўся за гаспадарку. У ліпавіцкага пана на адработак старгаваў дрэва ды пачаў будавацца.

Па суседзтву зь лекаравай сялібай лёг зруб Пракопавай хаты. Сьцены ўкладалі талакой, а рэшту Пракоп майстраваў сам. Вельмі-ж папацеў ён тады, папанатужыўся. Побач із будаваньнем трэба было яшчэ за гаспадаркай глядзець ды ліпавіцкаму пану за будаўляны матар'ял адрабляць. Жончына пасажная зямля, апрача гароду, саду ды аселіцы, была пяшчаная, неўрадлівая. Ды прыказка-ж кажа: доранаму коню ў зубы не глядзяць. Быў Пракоп і гэтым Аленіным пасагам рад. Неўзабаве пачалі гаманіць, што вёска мае на хутары быць парэзаная. У Бахмача нарадзіліася надзея: калі пачнуць зямлю перамерваць, дык, можа, і яму лепшы кавалак зямлі адрэжуць.

Калі-ж вузкія палоскі на хутарныя дзялкі пачалі кроіць, дык сталася тое, чаго ні Пракоп, ні іншая вясковая бядота не маглі прадугледзіць: подкупамі каморніка, што на ўсякія ласкі быў прагавіты, багацейшыя найлепшую зямлю дасталі. Пракопу адрэзалі пяшчаны клінок на гэты бок могільніку пад чыгунку. Добра, што хаця пераносіцца не загадалі, ды пры хаце гарод, сад і аселіцу пакінулі.

Літоўская зямля наагул малаўрадлівая была. За выключэньнем дна тых начоўкаў, глеба ў бальшыні была то падгліністая, то пяшчаная. Што ні пасее на сваім кліне Пракоп, дык добра, калі апрача насеньня, якія прыгаршчы зярна зьбярэ. Жыта ці пшаніца -цяненькае, як павуціньне, і рэдкае ўзыйдзе, у каласку паўтузіна зярняткаў налічыш. І разжывіся тут як хочаш. Чалавек, завецца, на сваё ўзьбіўся. Гэта во, каб гною чортаву гібель наваліў, дык, мо, што й вырасла-б. А дзе-ж яго браць?

Так і завязалася зачараванае кола. Калісь, будучы ў пана парабкам, - дык вядома, што Пракоп на гаспадара рабіў. Цяпер-жа зь яго самога

быў нейкі гаспадар задрыпаны, ды ўсёроўна, як і раней, на пана працаваць мусіў: то яму за дрэва, то за зярно пазычанае, то за тое, то за гэнае. Іншым разам так запазычыцца Пракоп, што аж сорамна нагой у панскі двор ступіць. А тутака ўсё коратка, усё йрвецца: як ні вяжы - ўсяго не пазьвязваеш. Дый шчэ й прыбытак у хаце мае быць. Людзі з прыбытку ўцеху маюць. Бахмач-жа ня ведаў, як быць: ці наракаць, ці Богу дзякаваць.

Увішныя пчолы й чмялі ці мала насмакталіся ўжо нэктару з краскаў на нівах, а Чарнулінаму хвасту мухі й авадні прыспорылі шмат працы, калі Пракоп, яшчэ раз зірнуўшы на сваю хату й спасьцярогшы, што перастаў курыць комін, наважыўся дадому йсьці. Зь вёскі на дарогу выходзілі людзі. Сьпяшаліся ў Дубовічы на набажэнства ў царкве. Каталікі гэтта ня йшлі, бо найбліжэйшы касьцёл быў у Гацях. Ужо званы дубровіцкае царквы клікалі вернікаў у сьвятыню.

Бахмачыха Алена скончыла прыбіраць хату, паставіла ў прысак кацёл з варанай бульбай, каб была цёплая для Пракопа, ды аладкі за засланку. Колькі ўжо разоў выглядала праз вакно. Была яна працавітая й руплівая. Ніколі не пакладала рук. На ўсіх старалася напрасьці, наткаць, абшыць, абмыць, дагледзець гаспадарку; яна і з пранікам, і зь сярпом, за мяліцай і з траплом, яна за прасьніцай і за кроснамі. Вечная й няўстанная Пракопава спадарожніца, устойлівая й трывалкая ў працы, добрая й ласкавая з характару.

Матчына сэрца ныла за дзяцей. Старэйшаму Міколу не пашэньціла. Кульгавы, ён ня мог, як іншыя, пайсьці за плугам ці з касою. Часта дакучала нага. Каб вылекаваць, гаспадаркі іхнай цэлай на пакрыцьцё коштаў хірургіі не хапіла-б.

Колькі разоў раіліся, што рабіць. Хлапцу ўжо сямнаццаты пайшоў. Калі-б не аплата, на якую Бахмачы не маглі здабыцца, Мікола даўно пазнаваў-бы нескладаныя хітрасьці шавецкага рамёства. Ато дзе-ж гэта: Янук у Лазоўскага цэлае божае лета за статкам ногі абівае, ну й вазьмі ды аддай ім зароблeнае, каб Міколу на шаўца вучыць. Намагаўся Пракоп у вясковага шаўца Піліпа цану зьбіць. Той пакуль трымаўся свайго, але Бахмач ведаў, што нідзе ён ня дзенецца, палагаднее. Тымчасам-жа Мікола памагаў, што мог, ля гаспадаркі.

Больш супакойная Алена была за Янука. Паціху некалі пусьціла сьлязу, як аддавалі яго за пастуха да чужога чалавека. Янук, дзякаваць Богу, вытрымаў, падрос, уздужаў. Алена апошнім часам пагадзілася

ўжо нават із тым, што мае яшчэ ў сям'і прыбытак быць. Адылі чакала таго дня з хваляваньнем і неспакоем. Не было ніякіх выглядаў на лепшае. Як гэта рады дадуць?

Не пасьпеў Пракоп увайсьці ў панадворак, як Алена выбегла ўжо з даёнкай і ўслончыкам.

- Ідзі, там бульбу ды аладкі за засланкай бяры, а малако кіслае ў вялікім шчарбатым стаўбуне на паліцы стаіць.

Пракоп прывязаў карову ля карыта з вадой. Алена ўселася на ўслончыку, мокрай шматай старанна выцерла вымя, і першыя ніткі малака спачатку паволі, а пасьля барзьдзей пачалі цурчэць па дне бляшанае, пацямнелае ўжо ад гадоў, цынкаванае даёнкі.

- Вы ўжо елі? - спытаў Пракоп.

- Няўжо-ж цябе ждалі...

- Мікола кабылу дагледзіў?

- Га? Мусіць-ткі. Ён-жа сваю работу знаіць.

Бахмач абапёрся аб паркан і доўга глядзеў у вагарод, дзе расло варыва, па бакох абсаджанае сланечнікамі.

- От дожджу трэба на гвалт, - сказаў ён і зрокам кінуў уверх, быццам чакаючы адтуль нейкага неадкладнага адказу. Ён ужо забыўся, калі галіўся й стрыгся. Паволі чухаў правай рукой патыліцу.

- Гэта-ж агуркі во такія марныя, каб саўсім ні павысыхалі. Трэба было Міколу сказаць, каб паліў, можа ваду з гнаёўкай разьмяшаўшы...

- Сам чаму-ж ня рупіцца?

- От гаворыш як-бы не знаіш усіроўна. Ён дзе зь дзяцюкамі каб на чарку, дык ласы...

Пракоп ня піў і не паліў. Гэтыя дзьве слабасьці прышчапіліся, сам не спасьцярог калі, да сына. Ня мог яму гэтага дараваць, але колькі ні ўпікаў, нічога не памагала.

Увайшоўшы ў хату, зьдзеў і павесіў на крук шапку, выдабыў зь печы бульбу й аладкі, паставіў іх на стол. Із збана на паліцы наліў у гліняную міску кіслага малака. Сеўшы за стол, перахрысьціўся й пачаў паволі есьці. Вялікі шэры кот цёрся ля босых ног.

Ужо канчаў Пракоп сьнеданьне, калі расчыніліся дзьверы й паволі, быццам як складзены, у хату ўвайшоў Мікола. Гэта быў высокі худы дзяцюк. Зьдзеў шапку, павесіў побач бацькавай на сьцяне. Блёнд валосы нядбала рассыпаліся па галаве. Сінія вочы супакойна паглядалі на бацьку. Нічога не сказаўшы, сеў на ўслоне.

Хата мела глінабітную падлогу. Ня стала ў Пракопа сродкаў, каб здабыцца на дошкі. Сьцены навокал столу былі паабклейваныя газэтамі, а далей - голыя. На покуці віселі тры абразы. На сьцяне, што ад вуліцы, у зашклёных рамках тоўпіліся сямейныя здымкі. Ля сьцяны стаяў доўгі ўслон, на якім цяпер сядзеў Мікола. Побач перагародкі, што ад печы аж да сьцяны аддзяляла два ложкі ў спальні, стаялі два малыя ўслончыкі. У качарэжніку ў кутку ля печы прытаіліся вілы, качарга, чапяла, памяло й мятла. Ля печы на вялікай нізкай і шырокай бярозавай калодзе стаяла драўлянае вядро з вадой, а побач - медзяная, зробленая із знараднай гільзы, конаўка. Ля калоды стаяў цэбрык, куды зьліваліся памыі. Мухі поўзалі па мокрадзі, ляніва гудзелі на вокнах і на столі. Ля дзьвярэй, што ў сенцы, на сьцяне была шырокая паліца, адкуль Пракоп узяў тое кіслае малако. Паліца была завешаная гафтаванай у васількі кужэльнай фіранкай. Вопратка вісела побач на сьцяне й у вялікай драўлянай шафе ў куце. Два вялікія вокны, застаўленыя вазонамі на падваконьнях, выходзілі на вуліцу: адно, за сталом - на двор, а другое, крыху меншае, было ў спальні. Будуючы хату, Пракоп наўмысьля парабіў вялікя вокны. Калісьці ў месьце пазнаў простую праўду, што сьвятло патрэбнае чалавеку ня толькі надворы, а й у хаце. Хата была падмеценая й чыста прыбраная. Алена падбала пра гэта.

- Ну што кабыла? - спытаў Пракоп сына.

- Ды што?

- Паіў?

- Напаіў і даў травы, што ўчора выкасіў.

Пракоп, памаўчаўшы, пасьля сказаў:

- Я з маткай пайду ў казну маліны зьбіраць, а ты наглядай тут за пчаламі; дзень пекны, каб не раіліся. Пасьля палудня, як сонца пачнець спускацца на захад, павядзі карову напасьціць.

- Куды?

- Вядзі туды да бальшака. Там травы яшчэ многа.

- А што з пчаламі, калі-б рой?

- Ня думаю, каб яны... Учора вечарам слухаў, ды вясельля ні было. Калі-б што якое, дык знаіш, што рабіць - махнеш венікам, каб аселі, ды гукнеш каторага доктаравых, каб памог сабраць. Парупся, каб усё чысьцінька напагатовя стаяла.

Пракоп меў тры вульлі пчолаў і, мусіць, столькі-ж вульлёў стаяла пустых. Паставіўшы стаяк на высокай ліпе за пуняй, пазалетась злавіў рой. Летась у той-жа самы стаяк злавіў другі, дый адна свая сям'я роілася сёлета, дык ужо тры меў. Любіў Пракоп пчолаў. Шмат чытаў пра іх, практычна пазнаў норавы й жыццё. Тое вясельле, аб якім прыгадваў Міколу, заўсёды адбывалася ўвечар перад роем. Тады матка цягнула цяненькім галаском. Было й многа іншых галасоў розных адценьняў, якіх Пракоп жартаўліва дзяліў на сватоў і дружак. Учора пасьля зьмярканьня ён такога вясельля не падслухаў, дык і супакойны быў, што рою сёньня ня будзе.

Калі Алена перацэдзіла малако, спарадкавала судзьдзё, пабралі плеценыя Пракопам пузатыя кошыкі й накіраваліся на загуменьне. Адтуль мяжой між доктаравым і Шпунтовым хутарам мецілі на Гараватку. Ішлі паволі, разглядаліся.

Няголены, нястрыжаны, у сіняй кужэльнай сьвітцы й зрэбных портках, босы Пракоп крочыў наперадзе. Быў ён высокі, моцнага складу мужчына. Ростам ледзь не раўнялася зь ім Алена. Першыя маршчыны барознамі пайшлі араць ейны яшчэ прыгожы, падоўжаны, зь вялікаватым носам, твар. Накрытыя завязанай пад бараду паркалёвай хусьцінкай, дзьве даўгія касы блёнд валосаў ляглі кругам на галаве. Андарак з даматканага, добра ўжо працёртага паўсуконьніку, хаваўся пад выпускной сіняй кужэльнай кофтай. Ішла жанчына паволі, за Пракопам ці побач яго, як-бы ўсё мяркуючы, каб крыва не ступіць, ці дарэмна не панатужыцца. За месяцы тры, як прыблізна вылічыла, папоўніцца мае іхная сям'я яшчэ адным чалавекам.

Узьбіраючыся на горб Гараваткі, Пракоп збавіў кроку, каб пасабіць Алене. Прыйшлі да вялікага крыжа - таго самага, што стаяў над падоўжанай магілкай вояў зь вялікае вайны. Як-бы змовіўшыся, затрымаліся, перахрысьціліся, ды бяз слова пачалі разглядаць Літоўцы й ваколіцу.

Даўно ўжо сьціх раньні вясковы гоман. Цяпер вёска драмала. Хто пайшоў у сьвятыні, хто да суседзяў, а хто на поле ці ў лес. Нават жаўранкі рэдка дзе зьвінелі.

- Калі от так падзяржыць яшчэ бяз дожджу, ды сёлета ў нас скупей будзіць як калі. Насеньня зь нівы не сабяром, - сказаў Пракоп, трымаючы на воку свой клін зямлі, што вунь гэт за могільнікам падыходзіў аж пад самую чыгунку. Ён із зайздрасьцю глядзеў на

шырокі доктараў хутар, дзе жыта, як іншым разам казаў, «трубой вярнула, аж услалася». Вядома, доктар меў чым угнаіць. Тое-ж самае й у другога вясковага багатыра, «амэрыканца» Сявенькі, хутар якога быў побач бальшака - туды пад Галавачы з гэтага боку чыгункі. Зямля была там ці найлепшая ў вёсцы. Сявенька не дарма выдаткоўваўся на каморніка. Аплацілася.

- Каму, казаў той, дык і Бог і чорт суліць. Людзям нішчасьця, а яму - масьлініца, - скончыў Пракоп пра лекара. Алена стаяла моўчкі.

Зянкевіч, якога называлі доктарам, меў ці ня больш шчасьця як розуму. Падчас вайны скончыў фэльчарскі курс, працаваў нейкі час пры шпіталі, быў на фроньце. Пасьлей распазнаў лекавыя вартасьці зёлак, якімі асабліва ўмела карыстаўся між мясцовых сялянаў. Быў ён насамперш добрым знаўцам людзей. Ведаў, якое слова і ў які момант да каго ўжыць. Бывала, прыедзе якая цётка зь цяжкой хваробай. Ён так трапна й умела распытае што трэба, зручна гутарку павядзе, пацешыць, параіць, што гэта больш паможа, чым якія модныя лекі. З усімі быў на «ты», просты й адкрыты, зь нікога лішняга ня браў. Калі хто ня меў чым за паслугу адгадзіцца, дык і так было добра. Затое людзей прыходзіла й прыяжджала да яго маса. Усю лекарскую аптэку трымаў у шафе. Недарма Пракоп ці іншыя зайздросьцілі Зянкевічу. У хаце быў дастатак, на полі лепш, чым у іншых, радзіла, дый здавалася людзям, што не працаваў так цяжка, як яны.

Калі спусьціліся на другі бок Гараваткі й ужо падыходзілі пад зарасьнік, што ляжэў ля канавы, сказала Алена:

- Нешта-ж ні відаць Лазоўскага кароў. Як-жа там Янучок?

Пракоп разгледзеўся навокал і сказаў:

- Вуньдзіка відаць пры лесе ў кустох. Пазашываліся, пэўне, ў цень.

Падыйшлі да кароваў, што ацярэбліваліся ля кустоў, ляніва перакідвалі жованку, хвастамі малоцячы дакучлівых мухаў і аваднёў. Бахмач гукнуў Янука. Ніхто не адгукнуўся, і Пракоп гукнуў яшчэ раз. Найперш пачулася браханьне Тапсіка, што выбег зь лесу й кулем кінуўся да Бахмачоў. Ззаду бег Янук. Сабака кідаўся то да Пракопа, то да Алены, намагаючыся з радасьці лізнуць аж у твар.

- Ты-ж гэта дзе бадзяісься, кароў саміх пакінуўшы? - лагодна спытаў сына бацька.

- А што-ж ім? Нажорліся, куды-ж ім, - засопшыся зь бегу, тлумачыў Янук.

- А ты што ў лесе робіш?

- Дык гэта-ж Тапсік там нейкую нару апароў ды давай лапамі капаць. А я памагаць яму. Ажно нічога й ні нашлі, пад самы бярозавы корань павяла.

- Барсук, можа, - сказала Алена.

- А вы куды гэта?

- Па маліны йдзем.

- Ці ёсьціка яны там? Можа, другія вызьбіралі...

- Ты відзіў каго?

- Тры Бруніські яшчо зраньня пёрлі, а так яшчо некаторых відзіў, дык ні пазнаў здалёку.

- Гэтым Бруніськам дык уходу німа, - прабурчэў Пракоп. - Усё павызьбіраюць. Ну а як-жа ў цябе, што новага?

- Ды нічагусінькі. Усё як было, гэдак і ёсьціка.

У лесе пацягнула вільготным жыцьцядайным халадком. Дубы, бярозы, хвоі й іншыя дрэвы, змагаючыся ўверсе за доступ да сонца, згусьціліся-перапляліся свайме чубамі-каронамі. Так густой была страха дрэў, што рэдка дзе сонца ўніз трапляла. Што дзе расло ўнізе, выглядала вялае, бледнае. Калі-ж у тэй страсе была якая прагаліна, дык тутака ўнізе на сонячнай палянцы гусьцелі малыя, пышныя расьціны й кусты. Гэтта зусім іншы сьвет, чым на полі. Там чалавек быў млявы, а тут жвавы, жывы. Незьлічонае птушынае царства голасна славіла вясну й невычарпальныя сілы вечна зьменнай прыроды. Хацелася прысесьці, абаперціся аб камель каторага дуба ці бярозы ды поўніцца гэтымі жыцьцядайнымі песьнямі, сокамі... Хацелася назіраць крылатых жыхароў лясных гушчаў, што завіхаліся з працай і песьнямі, дзівіцца-любавацца ляснымі багацьцямі.

Пракоп і Алена йшлі моўчкі, кажны пры сваіх думках. Босыя ногі дзе шалясьцелі падсохлымі леташнімі лісьцямі, дзе трашчэлі сухімі галінкамі, а дзе тапталі вогкую парудзелую йгліцу. Пасвойму марыў Пракоп. Ён глядзеў на высачэзныя дрэвы-прыгажуны, дый наўгад на вока мерыў, колькі з каторага можна было-б дроваў напілаваць, якое было-б добрым бервяном на хату, ці шулом у пуні, з каторых танейшых ільга было-б змайстраваць хлёскія палазы на сані, загнуць дугу ці што іншае. Гэх, каб гэта так дазволілі яму зь пілой і сякерай ды

адным памочнікам які тыдзень ці другі ў лясной гушчы пагаспадарыць! У памяці сьвежым жыло недалёкае мінулае, калі за дрэва на будову сваёй малой хаты так цяжка мусіў папацець, папацягацца для панскага дабра.

«Гэта-ж чаго духоў зь цябе ня выціснуў, скуралуп! - кляў у думках Пракоп. - Ён на той лес ні трудзіўся, ні пацеў, рука ягоная ніколі з мазылём ні браталася; ён, гэны лес яму дарма прышоўся. А тут, калі якое палена адступіў, дык - духі зь цябе вон! - дзень і ноч яму рабі, ні адступіцца!»

Глянь, гэта ня лес, гэта любасьць. Вунь бярозкі-прыгажунькі, як тыя дружкі-маладзіцы на вясельле прыбраліся-выстраіліся. Дубы-волаты, як тыя мажныя паны між дробных мужыкоў, сярод іншых дрэваў раскашэліліся. Хвоі гонкія побач з гладкімі круглымі бярозамі ўверх пнуцца, за сонца спрачаюцца. А гэта-ж лес увесь і зямля, якую цяпер тапталі босыя, каравыя, парэпаныя ад золі й працы ногі Бахмачоў, усё гэта належала да «панства польскага». «Каб яно галавой налажыла, панства гэткае!» - думаў Пракоп. А вартаўніком маёмасьці «панства» быў ня хто іншы, як той каржкаваты, рудзенькі Бжончэк.

Лясьніка знаў Пракоп здалёк, чуў аб ім масу нядобрага.

- Лепі ні спатыкаць такое ліха, а як трапіцца на дарозе, дык абмінуць, - казалі пра яго людзі.

Здалёк Бжончэк выдаваўся малым, непагрозьлівым, нечым нязначным, на што ня варта было браць увагі. Аб ім Пракоп мала калі думаў, хоць хадзілі слухі, што крыўдзіў злоўленых у лесе. Цяперака-ж гэты самы малы палячок вырас да непазнавальных памераў. Ён тут во мог прытаіцца за каторым дрэвам і ні агледзісься, як на цябе скочыць, як каршун. Казалі, што меў нюх сабакі, хуткасьць зайца, спрыт лісы. Ці, можа, гэта са страху перабольшвалі?

Пракоп затрывожыўся. Як-ні-як, прыйшоў ён сюды зьбіраць майно «панства польскага», не купіўшы ў «пана солтыса» талёнаў. Аб Пракопавай сумленнасьці ведалі ўсе: ён каб калі каму дзе вока запарошыў.

Быццам таму, каб пабольшыць Пракопаву трывогу, адазвалася Алена:

- Надта-ж нядобрае я сягоньніка ўвосьні відзіла.

- А што? - спытаў муж.

- Нібыта паехалі мы да Данілы й тамака на лодцы выехалі на возера рыбу лавіць. Ловім мы гэту рыбу й толька от мелі сетку цягнуць, а мяне, адкуль ні вазьміся, як падхапіў вецір ды ў ваду. Пачала я тапіцца, ды ажно прачнулася. Аж спацела ўвосьні была, так страшна... Рыба - гэта ні на добрае, кажуць...

- Ат, ня веру я сном. Забабоны, казаў той, дый толька, - махнуў рукой Пракоп, каб суняць ня толькі жонку, а й сябе.

- Каб-жа даў Бог, усё добра было. Хто гэта ведаіць...

Ізноў ішлі моўчкі, слухаючы гоман лесу. Выйшлі на пералесак. Дрэвы парадзелі, замяніліся кустамі. Пракоп ведаў, што тут перад узбалоцьцем, будзе многа маліньніку. Там дзесь далей плыве ручэй, што пасьля ўпадае ў Бярэзіну. Мейсцамі там сенажаці на паплавох. Для мясцовых-жа людзей - крыніца ягадаў: чарніцаў, брусьніцаў, журавінаў. Туды налева зноў займалася высокая сьцяна стройнага, гонкага лесу, які цягнуўся пэўна ці не да Перасечана й далей аж за бальшавіцкую мяжу.

Маліньнік знайшлі хутка. Дзе-нідзе відаць былі жаночыя хусткі й чуваць гоман галасоў. Адно пачалі Бахмачы зьбіраць, калі падыйшлі із поўнымі кошыкамі Бруніські.

- Чулі, дзядзечка? - сказала найстарэйшая Мальвіна.

- А што? - падняла галаву Алена.

- Кажуць, лясьнік пільнуіць і калі каго біз талону зловіць, дык ягады адбіраіць.

- А Божа-ж мой! - вохнула Алена.

- А ты відзіла яго? - спытаў Пракоп.

- Я дык ня відзіла, але-ж людзі, можа, ня брэшуць, - адказала без запыну рослая, загарэлая чарнавалосая дзеўка. Дзьве меншыя сястры ейныя, кропля ў кроплю падобныя да Мальвіны, туліліся да старэйшай, як піскляты да кураводкі. У іх і кошыкі меншыя былі, хоць усе на адзін лад, зь бяленькага гладзенькага лыка плеценыя. Работа была старанная - кошыкі, як цацы. Гэта майстэрства рук старога бацькі, што зрэдчас адно прыкладаўся да працы ў полі, бо меў на гэта здаровага дзяцюка сына, што даваў усяму рады.

- Ды Бог зь ім, ніхай пільнуіць, - адказаў Пракоп, каб скончыць гаворку й ля маліны завіхацца. Бруніські зьніклі скора, як-бы іх тут зусім не было. Пракопа й Алену цяпер паглынула прагавітасьць, каб як найболей назьбіраць.

Шмат дзе маліньнік сьвяціўся белымі чаранкамі, але й ягадаў было ўволю. Былі яны пахучыя, смачныя. Збоку чуліся галасы, калі іншыя якія зьбіральнікі ў суседзтве былі. Сонца пякло шыі, паволі паўнелі малінамі кошыкі, птушыная сымфонія прыемна казытала слых, а духмяны водар ягадаў і краскаў ледзь не п'яніў чалавека. Гэтак незаўважна й у пільнай працы сплываў час. Ужо, як сказаў-бы Пракоп, кішкі марша на ўсю йванаўскую гралі, кошыкі былі амаль поўныя, сонца добра пахілілася на захад, калі дамоў ісьці наважылі.

Адно перайшлі пералесак і пачалі паглыбляцца ў дуброву, кіруючыся на сьцежку, як перад імі, быццам з-пад зямлі, вырас камлюкаваты руды чалавек. На правым плячы трымаў наперавес стрэльбу. Рудыя, непрыязныя вочы борзьдзенька бегалі па Бахмачох і найдаўжэй затрымаліся на кошыках. Бачыў Пракоп гэтага чалавека раней, ды ўсё зводдаль. Цяпер-жа стаяў перад імі на крокаў пяць, не далей, правая рука - ля замка стрэльбы, левая - у кішэні напушчаных на боты портак. Апрануты быў у выцьвілы вайсковы муньдзір, на галаве - шапка-канфедэратка.

Ззаду за лясьніком стаяў, шырака адкрыўшы чорны рот із здаравеннымі ікламі й выпнуўшы язык, вялікі сабака-ваўчар. Пракоп, прыгледзеўшыся гэтаму камлюкаватаму пану, адразу спанатрыў, што сустрэча гэткая нічога добрага яму ні варажыла. Алена інстынктоўна левай рукой сьціснула вышэй локця Пракопаву правую руку. У гэтым ціску выказалася й перадалася мужу ўся Аленіна трывога. Дзьве пары сялянскіх вачэй уліплі, напружана чакаючы далейшага, у палячка. А той спакойна, як і належылася гаспадару багатага лесу, прамовіў сіпаватым голасам:

- Талоны маеце?

У голасе было пытаньне й пагроза.

- Не, паночку, ні маем. Ні было ў нас грошы купіць іх, - пасьпяшыла з адказам Алена.

- Адкуль вы? - спытаў Бжончэк ужо болей сурова.

- Зь Літоўцаў, - адказаў Бахмач.

- Як прозьвішча?

- Бахмач Пракоп...

Пракоп не на жартачкі затрывожыўся. Зірнуў на бакі, быццам спадзяваўся ад некага дапамогі. Навокал не было жывой душы.

- Вы ня ведалі, што без талонаў нельга з панствовага лесу зьбіраць ягадаў?

Голас Бжончка павысіўся, пагражаў. Быццам адгадваючы думкі свайго пана, сабака пайшоў наперад, паказеліў рудыя вочы на Бахмачоў.

- Ведалі, але..., - пачаў Пракоп.

- Няма «але». Адстаўляйце кошыкі з малінамі і йдзіце адкуль прыйшлі, а штраф заплаціце пасьля!

Не было сумлеву. Гэта быў загад.

- Паночку, даруйце, мы-ж..., - пачала плаксівым голасам Алена.

- Маўчаць! Ніякае там «паночку»! Кажу - давайце маліны! - крыкнуў Бжончэк. Сабака пачаў бурчэць, гатовы скочыць на злоўленых.

Кошыкі з малінамі віселі спакойна на руках.

- Зараз, жлобе едэн! Колькі разоў казаць маю! А то застрэлю!

Лясьнік узяў напагатоў стрэльбу, ляснуў замком і мерыўся на Бахмача. У гэты час Бахмачыха, відаць бяз роздуму, з маланкавай хуткасьцю крутанулася наперад, каб засланіць мужа. Правай рукой, каб адхінуць яе набок, хапіла за рулю стрэльбы. Грымнуў стрэл. Алена ўхапілася за правы бок вышэй пахвіны й цяжка застагнала. Кошык зь ягадамі, што вісеў на руцэ, паляцеў вобземлю. Пракоп, кінуўшы свае маліны, абняў жонку. Алена дрыгала й вяла ў Пракопавых руках.

Усё гэта адбылося так хутка й неспадзявана, што Пракоп, - быццам яму хто добрую аплявуху заехаў - як у ймгле быў, ня ведаў, што рабіць. Алена, цяжка дыхаючы, асела на зямлю.

- Алена, міленькая, даражэнькая!... - вырваўся балючы голас з Пракопавых грудзей. Прысеў побач, узяў яе правай рукой пад галаву, левай мацаў рану. Аленіна кужэльная кофта была абсмаленая й закрываўленая з правага боку на якую пядзю вышэй пахвіны. Пракоп із жахам адцягнуў ліпкую ў крыві руку.

- Пракопка, галуб..., галубок мой, - стагнала Алена. - Божачкі, канцы мне, мусіць... ох...

Голас ейны слабеў. У шырака разчыненых вачах адлюстраваўся вялікі боль і жах.

- Пракопка, глядзі дзетак... ох, Божа... ні спус....

Галава ейная раптоўна ахінулася назад, і абамлела цела. Пракопаў твар атупеў у зьдзіўленьні й сполаху. Ня верылася, нічога ня верылася,

што бачыў на свае вочы, што трымаў у руках. Не, гэта не магло быць! Што гэта: сон ці ява? Цяжкое, непарушнае, зь біцьцём у сэрцы, маўчаньне трывала ня больш сякундаў пятнаццаці.

- Але-э-э-э-на! Але-э-э-э-на! - раўнуў немым голасам Пракоп, скалатнуўшы бязладнае цела. Крык гэты, перанасычаны роспачай, падхапіла й паслала далей дуброва.

- Забі-і-іў! - раўнуў колькі моцы Бахмач. - Людцы добрыя, забіў!

Не памятаючы, што рабіць, паклаў нябожчыцу на траву й, стоячы перад ёй на каленях, падняў галаву. Левай рукой, як звык гэта рабіць у заклапочаньні, правёў па сваім твары й вымазаў яго ліпкай крывёю. Вочы блукалі па дуброве, шукаючы лясьніка. Каржакаваты панок і сабака як пад зямлю канулі.

- Забіў, людцы мае, Алену маю забіў! - лямантаваў голасна Бахмач.

Людзям, што пасьпяшылі на гул стрэлу, крыкі й лямант Бахмача, паказаўся страшны вобраз: на траве, зачырвоненай крывёй і малінамі, зь перакуленымі побач кошыкамі, ляжала на сьпіне, выцягнуўшыся, мёртвая жанчына. Шырока адчыненыя ейныя вочы, поўныя тупога жаху, застылі поглядам уверх. Ля яе кленчыў, наўзрыд галосячы й захліпваючыся, утрапёны Бахмач. Плачу не было супыну. Аброслы шчацінай твар быў вымазаны крывёю. У чырвані сьлёзы рабілі малыя ручайкі-барозны. А чалавек сядзеў нерухома, зрокам уліпшы ў мёртвы твар жонкі, і ўздрыгваў ад плачу.

Людзі падыходзілі, паволі абступалі іх. Былі гэта пераважна жанкі й дзеткі. Нема ўпіваліся вачамі ў гэты вобраз, быццам баючыся турбаваць цішыню. Дзесь зусім блізка загрукатаў у камель дрэва дзяцел. Дыхнуў вецер, і аднастайна, ленна скрыпнула надламанае дрэва.

Пасьля першага ўструсу прыйшла гамонка.

- Гэта хто? Ці ні лясьнік забіў?

- Застрэліў, сукін сын...

- Гэта-ж Алена. Цяжарная. Божачкі мае!

Некаторыя хрысьціліся.

- Двух чалавек, лічы, са сьвету зьвёў...

- Чаму-ж гэта?

- Мусіць, ягады адбіраў, талонаў ня мелі...

- Дык ці-ж то за ягады страляць?

- От погань, ну й німа-ж на яго кары боскай! За ягады цяжарную бабу забіў!

- А дзе-ж ён дзеўся?

- Уцёк, мусіць, сабака. Пабаяўся, каб самаго ня прыхлопалі.

- Сабака!

- Панскі цівун!

Гамонка была ціхая, стрыманая. У кароткіх словах было выказана шмат. Стаялі навокал, прыглядаючыся людзкой трагедыі, ня ведаючы, што далей пачаць. Тыя, што ня зь Літоўцаў былі, распытваліся: а што, а як, а хто?

Чалавек наблізіўся да Бахмача, паклаў яму руку на плячо.

- Ні чапай яго, ніхай паплачыць, гора выліiць. Адыйдзіся.

Чалавек адыйшоўся. Доўга цягнулася напружанае маўчаньне. Падыходзілі новыя людзі, ціснуліся наперад, каб зблізу кінуць вокам на Бахмача й забітую Алену. Жанкі, што ведалі Бахмачоў, далі волю сьлёзам.

Прайшло гэтак мо хвілін дзесяць ці болей, а Пракоп усё сядзеў, утаропіўшыся ў мёртвы, ужо бляднеючы жаночы твар, цэлы калаціўся ўздрыгамі. Сьлёзы калаціліся па замазаным крывёю твары.

Нарэшце падняў галаву, схамянуўся. Глядзеў вакол сябе, быццам стараючыся прыгадаць, дзе ён ёсьць і чаму народ абкружыў яго шчыльнай сьцяной. У натоўпе пачаў некага шукаць вачамі.

- Давайце-ж памагчы чалавеку, - сказаў нехта. - Ня будзіць-жа ён тут у лесе...

- Арсенька, - гукнуў нізкім, ледзь чутным голасам Пракоп Піліпавага хлапца.

- Што, дзядзя? - адгукнуўся й падаўся наперад басаногі, гадоў дзесяці, хлапчук.

- Будзь добры, дзетка, падбяжы... тутака ніпадалёк мой Янучок Лазоўскага кароў пасьціць. Скажы яму, каб папрасіў Лазоўскага сюды каня з каляскай прыслаць.

- Ужо бягу!

Як-бы яго вецер падхапіў, рад услужыць у нядолі, хлапец кінуўся выконваць Пракопаву прозьбу.

У густой сьцяне людзей ізноў аджыла, спачатку ціхая, пасля галасьнейшая, гамонка. Жаночая рука паволі, пяшчотна, закрыла

Аленіны павекі. Нехта перасьцярагаў, каб не тапталі парассыпаных ягадаў. Перасьцярога была позная.

Уверсе ў лёккім ветрыку гаманілі кароны дубоў. Ці такое й ці раз яны бачылі. Нямыя сьведкі мінуўшчыны - калі-б Бог іх голасам узнагародзіў - цімала чаго цікавага й жахлівага расказалі-б аб зьдзеках над гэтым бедным працоўным паняволеным народам.

Унізе гаманілі людзі. Абрабаваныя зь зямельных багацьцяў, з плёнаў працы сваіх мазольных рук, заўсёды паніжаныя й уцісканыя, перад сабой аглядалі жывы й сьвежы вобраз панаваньня «панства польскага». Ён, гэты вобраз, які на розныя лады й кажны пасвойму камэнтаваў, застанецца ў памяці кожнага праз цэлае гаротнае жыцьцё.

X

Янук із Тапсікам пільна вартаваў, каб каторая карова не скубанула аўса, да мяжы якога падпусьціў статак. Раз ці два кінуў вокам у бок загуменьня, дзе паказаўся Лазоўскі зь нейкім другім панам - пэўна, таксама асаднікам. Гэны, гладкі з выгляду, пан прыехаў у Лазоўскага двор яшчэ пасьля полудня, калі вярнуліся асаднікі з касьцёла. Доўга абедалі. Цяперака, пэўна, Лазоўскага жонка, ейная дачка-гімназістка, ды тая другая пані із сваёй дачкой недзе сядзяць і гамоняць у цяньку ў садзе, а мужчыны выйшлі на поле, каб палюбавацца збожжам. Янук мяркаваў, што Лазоўскі пакажа таму чалавеку сваё жыта, лён, грэчку й іншае. Якую гадзіну ці дзьве будуць валачыцца па полі, Лазоўскі будзе выхваляцца, колькі й куды даў гною, што, калі й дзе сеіў, што там расло летась, ды ці ўрадзіла. Той другі пан прыкіне слова; гэтак, ходзячы й гамонячы, сплывацьме час. Чуў Янук ці адзін ужо раз і прыглядаўся, як вось так у нядзелю каторы гаспадар зь кім другім ходзіць па полі, аглядае сваё дабро, хваліцца, ганіць ці наракае.

Сочачы кароваў і Лазоўскага, Янук не спасьцярог, як Піліпаў Арсень выбег зь лесу. Той ужо быў блізка, колькі сілы ў нагах прастуючы на пастуха. Тапсік спасьцярог хлапца раней, узьняўся на пярэднія лапы ды мяркаваў, мусіць, ці скочыць на яго з брэхам ці пачакаць-паглядзець, што ягоны гаспадар Янук зробіць.

- Янук, мяне твой бацька прыслаў! - пачаў, спыніўшыся Арсень. Ён так засопся, што ледзь пасьпяваў лавіць паветра.

- Мой бацька? Што такое? Чаго ты так засопся?

- Дай мне духу злавіць, зараз скажу.

- Ну?

- Лясьнік тваю мамку забіў, застрэліў тамака ў лесе...

Януку здалося, што не дачуў. Папрасіў паўтарыць. Разглядаў твар прыбеглага хлопца, ці дзе ня знойдзе на ім ценю жартаўлівае ўсьмешкі. Твар Арсеняў быў такі сур'ёзны, вочы сьвяціліся такой вялікаю шчырасьцю, што пастух не на жартачкі затурбаваўся.

- Ты што... гэта... ні маніш?

Янукоў язык зрабіўся непаслухмянай цяжкой калодай.

- Яй-Богу, дадушы праўдачку кажу, каб з гэтага места ні сышоў! - біўся той песьцяй у грудзі.

- Як застрэліў? Чаму? - скалатнуў Янук Арсеня за руку, а нешта пачало душыць яго за горла. Ён бачыў лясьніка Бжончка - і ў лесе, і ў хаце Лазоўскага - не адзін раз. Ад людзей чуў аб ім шмат благога й зьнялюбіў яго здалёк. Ужо амаль даў веры Арсеню, што гэны «падла», як называлі яго навакольныя сяляне, мог застрэліць ягоную, Янукову матку. Але ўся Янукова йстота пратэставала проці такое ашаламляючае весткі, адмаўлялася прыняць яе.

- За ягады, - тлумачыў Арсень. - Кажуць, што вашы талонаў ня мелі. Ягады хацеў адабраць. Я табе кажу, што чуў, а забітую тваю матку - дык на свае вочы відзіў.

У Янука закружылася пад нагамі зямля. Воміг зьмянілася выглядам навакольле. Насамперш, для роўнага й рытмічнага дыханьня забракла паветра. Памутнелі ў вачох і загойдаліся лес, хутар Лазоўскага, Гараватка. Тое, што душыла за горла, крыху папусьціла, і па твары пачалі плысьці гарачыя, буйныя сьлёзы.

- Забіў ма-а-м-му, гы-гы-х!

Арсень стаяў, зрокам верцячы зямлю, і ня ведаў, што рабіць. Правай рукой скуб нагавіцу портак. Нейдзе здалёк, як-бы з другога канца зямлі, пачуў Янук нейкі голас.

- Твой гаспадар крычыць, каровы ў ваўсе, - прыгадаў Арсень. - Я пабягу, адганю.

Янук стаяў, як скамянелы. Усьведамленьне таго, што сталася, адабрала ўсякую волю. Дрыжэў. Дзесь з глыбіні сьведамасьці

неадчэпны сумлеў падказваў, што ўсё гэта, што прынёс Арсень, магло быць няпраўдай, дурной памылкай.

- От ужо адагнаў, - сказаў вярнуўшыся Арсень. - Бацька твой прыслаў мяне, каб ты папрасіў у Лазоўскага каляскі з канём, каб матку забраць...

- Га?

- Кажу-ж табе, ні марудзь! Бацька прасіў у Лазоўскага каляскі з канём, ды скоранька!

- Добра, ужо йду. Ты пабудзіш з каровамі?

- Пабуду.

- Дык я бягу.

Янук рушыў у той бок, дзе Лазоўскі стаяў із гладкім панам. Тапсік пару разоў брахнуў з уцехі. Адно калі Янук крыкнуў на яго гнеўным голасам, стуліў хвост ды пабег за хлопцам ззаду.

- Ты што гэта кароў ні глядзіш, балване едэн? - сыкнуў Лазоўскі на пастуха, калі той падыйшоў. - Авёс увесь паядуць, пся...

Убачыўшы заплаканы твар, асаднік не даказаў.

- А гэта што? Чаго сьлініш?

Янук стаяў, кулаком выціраў сьлёзы й ня мог здабыцца на слова.

- Ну, ну кажы! - спанукаў Лазоўскі.

- Маму ў лесе лясьнік забіў...

- Што? Што?

- Лясьнік забіў у лесе маму, гы-гы-ых...

- Хто? Пан Бжончэк? Не, гэта немагчыма! Што ты гаворыш, хлопча? Хто табе сказаў?

- Піліпаў Арсень прыбег. Вунь за каровамі глядзіць...

- Як? Чаму?

Янук не адказаў. Сьлёзы залівалі ягоны замурзаны твар.

- Ну, дык што-ж я? - пачаў нецярплівіцца асаднік.

- Тата прасіў, воз каб вы далі, маму дамоў адвезьці.

Лазоўскі маўчаў. Зь недаверам паглядзеў на тонкае пасма вусікаў сівавалосага гладкога пана, што стаяў побач, як-быццам ад яго спадзяючыся нейкага высьвятленьня.

- Ліха цябе ведае - можа, праўду кажаш. Паглядзім... Ты гэтага, - падумаў хвілінку Лазоўскі, - бяжы гані ў двор кароў, а я йду за возам.

Пакуль Янук прыгнаў кароў, на дварэ ў Лазоўскага ўжо стаяў запрэжаны аднаконны даўгі гнаявы воз. Асаднік перш хацеў запрэгчы

брычку, але пастанавіў, што для такое мэты яна не прыдатная: ня будзе як нябожчыцу пакласьці. Лазоўскага парабак Яўхім прынёс пэўныя рэзьгіні сьвежага пахучага сена й разаслаў яго на калясцы, наперадзе паклаў туга напханы мурагом кашэль.

- Бабу нявінную забіў, нялюдак, каб зь цябе трыбухі! - кляў Яўхім, наладжваючы воз і крытычным вокам аглядаючы, ці ўсё так, як мае быць.

- Добра, што во конь зараз за садам пад рукой быў, дык скора справіўся. Гэта-ж ні жартачкі, такоя нішчасьця...

Жанкі абступілі Арсеня й Янука.

- Дык як гэта было? Скажы, хлопча! Матка Боская Чэнстоховская, гэты-ж пан Бжончэк - такі мілы чалавек, здаецца, а кабету забіў, - бубнела таўстая, аплылая тлушчам, Лазоўскага жонка Даміцэля. - Раскажы, хлопча, як то сталася.

- Ня відзіў я, - казаў Арсень. - Толькі пачулі мы стрэл і тады крык, і як падбеглі, дык Бахмачыха ўжо была ніжывая. У правы бок стрэліў.

- А што-ж пан Бжончэк? Што ён казаў?

- Уцёк, ні сьледу ягонага там...

- Ну едзь, - загадаў Лазоўскі Яўхіму.

Парабак сеў на кашэль і ўзяў у рукі лейцы. Янук мігам ускочыў на воз і сеў за парабкам ззаду. Арсень не садзіўся.

- А ты куды, Арсень? Чаму ні садзісься? - спытаў Янук.

- Я, мусіць, у вёску пабягу, раскажу.

Ён борзда накіраваўся да брамы. Тапсік меціў, каб скочыць на воз.

- Ты бяжы! - загадаў яму Янук.

Добра адпасены гняды конь, паслухмяны лейцам гаспадара, трушком пабег з двара. Заляскаталі-зарыпелі патрабуючыя дзёгцю колы возу. Хурманка накіравалася ў бок скарбовага лесу. З боку Ліпавічаў вецярок прынёс сумна-працяглыя гукі Хвядосавай дуды. У Януковым сэрцы нарастаў жаль. Празь сьлёзы ён нічога ня бачыў.

XI

З гэтага боку Літоўцаў пад бальшак вуліца йшла дугой. На самым чубку дугі, бочнай сьцяной да вуліцы, стаяла Пятухова клець. Ля клеці

была доўгая лава. Гэтае мейсца было як-бы ўмоўленым зборным пунктам вяскоўцаў. Калі была непагадзь у якое сьвята ці ў будзённы вечар, дык сядзелі па хатах, калі-ж пагода - тут абавязкова можна было таго ці іншага спаткаць.

Гэты пункт, калі так яго можна назваць, быў найбольш стратэгічным у вёсцы. Адсюль добра можна было бачыць вёску напралёт у два бакі, назіраць што рабілася й на бальшаку. Тут больш мо чым дзе пераказваліся вясковыя навіны, спатыкаліся маладыя й старыя. Насупраць клеці - з другога боку вуліцы - была высокая, роўная зь верхам страхі клеці, гушкалка. Пабудавалі яе пазалетась. Гушкаліся найбольш дзяцюкі й дзеўкі, бо для малечы была яна не па сілах. Каторы сьмелы дзяцюк, устоячкі разгушкаўшыся, сягаў часам вышэй вярха перакладзіны. З асаблівай цікавасьцю сачылі яго тады ўсе прысутныя.

У гэну нядзелю, калі здарылася трагедыя ў скарбовым лесе, ля Пятуховай клеці было асабліва людна. Моладзь манілася рабіць вечарыну. Нехта пайшоў ужо да Кмітавага Тодара прасіць хаты. Тым часам прыходзілі яшчэ дзяцюкі зь дзеўкамі, гаманілі, жартавалі. Гулкім сьмехам зьвінелі дзявочыя галаскі. Усе былі апранутыя ў найлепшае.

Сваім франтаўствам і адвагай перад вялікім гуртам моладзі захацеў пафарсіць Шпунтоў Лявон. Аж здаравенныя слупы гушкалкі заўважна хісталіся пад ягоным калыханьнем. Расшыбнуўся колькі ставала сілы, ды ўсё яшчэ падпіхаў, каб тарчма стануць над перакладзінай. Ягоная даўгая, ветрам раскіданая, блёнд чупрына апаўзала на вочы. Тады ён нэрвова торгаў у бакі галавой, каб адкінуць валасы набок, ды з задавальненьнем кідаў вокам на тых, што прыглядаліся, быццам хацеў сказаць ім: «гляньце, які зь мяне гэрой, вам не раўня!»

У гэты час - адкуль ні вазьміся - зьявіўся Захарукоў сын Пятро. Яго лічылі ў вёсцы вялікім палахліўцам і прыдуркам. Для таго, каб Пятра залічыць да разумова зьвіхнутых, не было падставы. Гэта праўда, што ў сваім выглядзе й норавах, Пятро быў простым, неахайным і наіўным. Але-ж не адзін ён быў гэткі. Як той Дастаеўскага князь Мышкін, Пятро быў няхітры, шчыры й надта добры ў вадносінах да людзей. Ягоная даверлівасьць да любога чалавека была поўная. Кожны мог яго абхітрыць, абдурыць, абсьмяяць.

Пятро не засвойтаў у сваім характары галоўных рысаў спаўжыцьця зь людзьмі, дзе хітрасьць, няшчырасьць, чмута й ашуканства, прынамся ў практыцы, заўсёды былі карыснымі бакамі, а шчырасьць, няхітрасьць, прастадушная дабрыня й даверлівасьць - недаравальнымі заганамі.

Пятро быў цяпер у палатанай будзённай саматканай вопратцы, босы, з бруднымі нагамі, нястрыжаны. Яму было гадоў звыш за сямнаццаць. Высокі ростам і нябрыдкі выглядам - мог-бы даўно канкураваць зь іншымі дзяцюкамі за ласкі вясковых прыгажунь.

Гэтым разам захацеў падражніць яго вядомы вясковы дзяркач Антось. Падыйшоўшы, ён сыкнуў на дзяцюка, ды якраз так, каб усе чулі.

- Табе чаго? - агрызнуўся Пятро.

- А ты куды гэта? - наёжыўся Антось. - Уцікай, бо дам!

Антось зрабіў крок наперад, а Пятро падаўся назад.

- Ну а толька-ж папробуй! Як чмыхну ў рыла, дык зараз піракоціся! - голасна пагражаў Пятро, ды аглядаўся, каб у выпадку неперапівак, шмыгнуць зручна назад.

- Дай яму, дай, Пятро! - рагаталі сабраныя.

Быццам два пеўні ля якога сьметніка, Антось і Пятро меціліся адзін на другога, пагражалі сабе й другім людзям на пацеху. Антось падмігваў дзяцюком, каб гэта яны ведалі, што ён так сабе наўмысьля, адно зводзіць хлапца.

Ды прыеліся ўжо ўсім такія Антосевы штучкі. Некаторыя мяркавалі, як-бы паддаць ім імпэту, каб і папраўдзе пачалі «чмыхаць у рылы». Ведалі, што нікому ня ўдасца зьвесьці Пятра да бойкі, бо ён, калі запраўды на бойку заносілася, як каторы зь дзяцюкоў насядаў на яго, тукаючы-гукаючы, адыходзіў дзе ў кут, каб ня быць на вачох у людзей. За гэта, мусіць, і палахліўцам яго лічылі.

Непаседлівай моладзі рупіла, каб барзьдзей пайсьці й пусьціцца ў скокі, некаторыя адыходзілі ўжо ў кірунку Кмітавай хаты, каб даведацца, як будзе зь вечарынай. Казалі, што й музыка Тадэўка із сваім цымбалістым неўзабаве мае зьявіцца.

У гэты час з-за Тахвілінага саду, што быў воддаль вуліцы ў той бок пад Гараватку, паказаўся Піліпаў Арсень. Ён бег мяжой ля высокага тыну. Відаць было, што змарыўся, бо часамі звальняў, ішоў борздым крокам, тады зноў бег. Ад гэнага бегу неспакойна дрыгаў на ягонай галаве чорны чуб. Задыхаўшыся, стануў ён пасярод вуліцы,

зачарпнуў поўныя грудзі паветра ды так, каб усе людзі чулі, голасна крыкнуў:

- Бахмачыху лясьнік у лесе застрэліў!

Гоман сьціх, як хто адрэзаў. Усе павярнуліся й упіліся вачамі ў хлапца.

- Што ты гаворыш? Калі? Чаму? - пасыпаліся пытаньні.

Арсеня абступілі шчыльнай сьцяной і намагаліся пацягнуць за язык. Пятае празь дзясятае распавёў, што бачыў на свае вочы й чуў на свае вушы ў лесе, ды, крутануўшыся, подбегам рушыў у кірунку свайго дому, што быў у тым канцы вёскі пад Ліпавічы, непадалёк Бахмачовага.

Моладзь цяпер ажывілася. Пачалі на ўсе лады абмяркоўваць і пераможваць пачутае. Пасьля першага ўструсу наступіла маўчаньне. Усе, як умовіўшыся, рушылі да Бахмачовай хаты.

Вестка аб забойстве ў лесе маланкай абляцела Літоўцы ды пашыбавала ў суседнія вёскі. Ля Бахмачовай хаты рос натоўп. Чакалі, выглядаючы на дарогу, што за аселіцамі.

З гасьцінца, што паўз скарбовы лес і ліпавіцкія землі бег на Гаці, павярнула на літоўскую прасёлкавую дарогу хурманка, а за ёю група людзей. Яўхім, трымаючы ў ваднэй руцэ лейцы, ішоў побач возу й стрымліваў руплівага каня. Адно рыпеньне восяў, драбінак і ляскатаньне колаў суправаджалі гэтую панурую маўклівую працэсію.

Ззаду за возам, панурыўшы галаву, ішоў Пракоп, побач яго - заплаканы Янук і Тапсік, за імі - людзі з кошыкамі. Бахмач, звычайна абярэжлівы й разважны, цяпер ня бачыў ці не зважаў, дзе крыва ступіў у каляіну, ці босай нагой у які камень на няроўнай дарозе стукнуў. Ён усёй істотай патануў нейдзе ў мутных глыбінях, як праз сон адно бачыў, што дзеялася навокал, ды йшоў, мусіць, толькі таму, што яго вось скранулі зь мейсца ды йшлі ўсе навокал. Каб раптам хто яго затрымаў, дык не адразу здагадаўся-б чаму, а стаяў-бы да таго часу, пакуль ізноў нехта ці нешта спрычынілася-б да руху наперад, дый тады без усьведамленьня, навошта гэта патрэбна, пачаў-бы перастаўляць свае аціяжэлыя ногі. У ягоным уяўленьні ўсё яшчэ стаяў каржакаваты руды чалавек ізь зьвярыным поглядам і трыманай напагатоў стрэльбай. Зноў і зноў паўтаралася тая страшная сцэна, што так брутальна й нечакана адабрала ў яго найдаражэйшую й зусім у жыцьці незаменную

падпору. І пры кожным такім балючым паўтарэньні ўмірала маленькая частка Пракопа.

«Што-ж рабіць цяпер? Як быць?» Думкі, як груганьнё, мітусіліся ў галаве, як неспакойныя васеньнія хмары то сьпяшылі насустрач, то адплывалі ў нябыт.

«А каб Алена ня выбегла наперад, ні заступілася за мяне, можа гэты баньдзюга й ня стрэліў-бы... А можа, гэта ў яго так нехаця сталася, бо яна-ж за стрэльбу тарганула... Можа, ён толька пастрашыць хацеў... Бізгалоўя яго знаіць...»

Пры гэтай думцы й сумлевах аб невядомым яшчэ больш ныла-балела ў грудзёх.

«Усягды яна такая была, наперад ірвалася, зубы сашчаміўшы, хоць самой не па сілах прыходзілася, бо хацела, каб другім лякчэй было... От і галавой налажыла. І ні дарма-ж мусіць-ткі той сон сасьніўся. Божачкі мае, гэта як усіроўна якое ліха адчувала. Зьгінулі-б няхай яны прапалі тыя маліны, каб гэта чалавек... Ды позна, хоць ты вый-крычы, грудзі расьпірай, дык яе ні ўваскросіш...»

«А як-жа пахаваць? Навет доскі на дамавіну німа... Людзей папрасіць, каб памаглі...»

Ля могільніка павярнулі на хутарную Якубаву дарожку, пераехалі малы мосьцік, што на канаве ў аселіцах і празь Якубаў двор выехалі на вуліцу.

Народ ля Бахмачовай хаты стаяў ціха, як анямеўшы. Ужо як зусім наблізіліся, людзі расступіліся, каб даць дарогу пад'ехаць пад ганак. Кмітава Аўдоля шаптала на вуха Піліпавай Аксені:

- А ягадка-ж мая, а міленькая, глянь ты на Пракопа.

Завэдзганы крывёй Пракопаў твар быў аб'ектам агульнае ўвагі. Хто Бахмача яшчэ ўчора бачыў, дык сяньня ледзь пазнаць мог. Мутныя вочы глядзелі й, здаецца, ня бачылі. Запушчаная барада й валосы адно акцэнтавалі тое, што Пракоп нейдзе разьмінуўся з нармалёвым жыцьцёвым нуртом.

Калі Яўхім стрымаў каня ля самага ганку й мяркаваў, што тут рабіць далей, каб у хату нябожчыцу ўнесьці, да воза скочыла Аленіна сястра Кацярына. Ухапіўшыся за мёртвую бязладную руку й прыкладаючыся да грудзей замардаванае сястры, пачала галасіць і прыгаварваць:

- А мая ты Аленачка,
а роднінькая сястрычачка,
а цябе-ж біз пары закатавалі,
зараньня на той сьвет зьвялі,
ых-гых-гых...
А ты-ж усё жыцьцё гаравала,
а ты-ж дабра ня відзіла,
а каму-ж ты свайго Пракопа пакідаіш,
а каму-ж ты дзетак астаўляіш?
А хто-ж іх будзіць даглядаці?
А чаму-ж твая долічка такая нішчасная?
А ты-ж дабра ніякага ў жыцьці ні знала,
ты-ж сьветлых дзянёчкаў ня відзіла...

Натоўп стаяў бязрадны. Ці адна жанчына ціха пусьціла сьлязу. Да галосячай Кацярыны падыйшоў яе муж Алесь, русы высокі мужчына. Паклаўшы руку на плячо, прабаваў адцягнуць ад возу.

- Каця, ні плач, твой лямант нічога не паможыць...

Мікола, пачуўшы пра забойства маткі, яшчэ раней прывёў дамоў Чарнулю, цяпер стаяў крокаў пяць ад возу. Іншым разам сароміўся-б плакаць на вачох у людзей, цяперака-ж нестрыманыя сьлёзы, як гарох, каціліся па твары.

- Швагрок, будзь добры, памажы ўнесьці... Яхімка, ты таксама... - прасіў Пракоп.

На покуці пад абразамі ў хаце саставілі дзьве лавы, паклалі сяньнік і падушку і ўнясьлі нябожчыцу. Росламу, плячыстаму, дабразычліваму да людзей парабку Лазоўскага Яўхіму ня рупіла ехаць назад. Ён прывязаў ля плоту каня, падкінуў яму сена, узяўся паліць і гутарыць зь мяйсцовымі.

Кацярына бралася арганізаваць жанок, каб памыць і апрануць нябожчыцу-сястру. Пракоп раіўся з Алесем, дзе ўзяць дошкаў на дамавіну, каго папрасіць, каб зрабіў яе, хто-б мог выкапаць дол на могільніку й іншае. Перад хатай не суціхаў гоман. Людзі не разыходзіліся, а яшчэ больш іх прыбывала. Дзяліліся ўсімі дробязямі аб трагэдыі ў лесе, прыгадвалі ўсё добрае аб Алене й ліхое аб лясьніку.

- Калі-б ты, швагрок, - гаварыў Пракоп Алесю, - і твая Кацярына дагледзілі-б тут усё, дык мне трэба было скочыць да папа, каб заўтра

прыйшоў...

- Добра, я тутака буду глядзець, бяжы, - згадзіўся Алесь.

- Ды й Чарнулю трэба было-б падаіць, - прыгадаў Бахмач. Ён убачыў Міколу, што стаяў ля парогу, мяркуючы, мусіць, дзе цяпер яго мейсца. - Ты падоіш, Мікола?

Пакуль той здолеў адказаць, выперадзіла яго Кацярыніна дачка Надзя:

- Я, дзядзечка, падаю.

- Добра, дачушка, ты зробіш, - сказала ёй маці.

Раўнамерны гоман на двары раптам сьціх. Тыя, што стаялі перад знадворнымі дзьвярмі ў сенцах, выглядалі навонкі.

- Паліцыя прыехала, - пачулася знадворку й перадавалася з адных вуснаў у другія аж у хату. У галасох чулася трывожная цікаўнасьць.

- А гэта-ж які чорт іх прынёс...

Не пасьпеў Алесь даказаць сваё, як у хату, са стрэльбамі на плячох, увайшло двух: адзін чарнавусы маладжавы Вадзімскі й другі, пажылы, Мэндлік.

- Пахвалёны Езус Хрыстос, - сказаў грубым басам Мэндлік.

Ніхто яму не адказаў. Людзі насьцярожыліся, пільна сочачы прадстаўнікоў улады. Пракоп стаяў побач швагры пасярод хаты. Твар ягоны ўсё яшчэ быў ў крыві. Паліцыянты, убачыўшы гэта, зьбянтэжыліся. Глухое маўчаньне нічога добрага ня весьціла.

- Пане Бахмач, мы маем да вас пару пытаньняў. Пан Бжончэк замэльдаваў нам у пастарунак паліцыі панствовай, што вы напалі на яго ў лесе й што ён, у вабароне... - пачаў гэтак Мэндлік гаварыць да Пракопа.

У Бахмача дрыжыкі прабеглі па целе, моцна да болю сьціснуліся песьці.

- Вон! - выбухнуў ён голасна, коратка й адрывіста. - Каб вашага сабачага сьледу тут ня было! Жонку забілі й яшчэ цяпер тутака мне на вочы асьмеліліся паказацца! Вон!

Здавалася, што прытаіўся ўвесь сьвет, чакаючы далейшага. У гэну хвіліну Пракоп запраўды быў страшны. Выглядала, што гатовы быў з голымі рукамі кінуцца на гэтых азброеных нозьбітаў «владзы панства польскага», душыць іх кляшчамі рук, аж пакуль сьсінеюць у перадсьмяротных уздрыгах мяккія панскія шыі.

Алесь схапіў Пракопа за руку. Бахмач увесь калаціўся.

- Паночкі, ці-ж вы ня відзіце, што тут у нас? Уважце хаця нябожчыцу, калі вы ў Бога верыце, - плаксівым голасам прасіла Кацярына.

- Вон з маёй хаты кажу! - ня сунімаўся Пракоп.

- Чакай, пане, чакай, - адкрыў рот Вадзімскі.

- Страляйце й мяне, вы душагубы!

Із такімі словамі Пракоп вызваліўся ад Алесявай рукі й зрабіў крокі два наперад. Відаць, што дзеяў, пабуджаны высокім эмацыянальным напружаньнем, гатовы кінуцца на Палякоў. Вочы яго, здавалася, набеглі чырваньню. Апроч гэтых двох у чорнай вопратцы, ён нікога цяпер навокал ня бачыў. Янук сачыў бацьку ізь цімалай трывогай і - сам аб гэтым ня ведаючы - захапленьнем. Гэта быў зусім новы чалавек. Цэлы век перад іншымі гнуў сьпіну, цяперака яе выпрастаў, ішоў вялікі й жахлівы ў сваёй злосьці, наважаны за глоткі схапіць нозьбітаў зьненавіджанага чужога ладу.

Казалі пасьля людзі, што, калі-б у той час з боку паліцыі была якая, хоць найменшая, правакацыя, ніхто Пракопа не ўтрымаў-бы Паліцыянты гэта спасьцераглі й воміг зразумелі. Яны бяз слова перазірнуліся, мусіць, узялі пад увагу варожасьць сабранага народу й цішком пацiснулі за дзьверы. Адно Мэндлік, азірнуўшыся, кінуў цераз плячо:

- За пару дзён, пане Бахмач, прыйдзі на пастарунак. Трэба сьледзтва правесьці...

Бахмач тросься сярод хаты.

- Каб ты па пекле ракам хадзіў, як я да цябе пайду! - кіпеў ён.

XII

У гэны нядзельны вечар настаяцель дубовіцкае парахвіі, да якой належала вёска Літоўцы, сьвятар Абухаў прыймаў у сваім доме гасьцей. Ягоны сусед сьвятар Пцічкін прыехаў із сваёй сьвятаршай рана папаўдні, гадзінаў пару пасьля набажэнства ў сьвятыні. Часта заглядаў да Абухава Пцічкін, а гэты да яго. І ў гэты дзень, як заўсёды, рады былі сустрэцца.

Пасядзелі, пагаманілі, дзелячыся сьвятарскімі й сямейнымі навінамі, пад вечар пайшлі ў царкву, дзе супольна адбарабанілі вячэрню. Ужо пры выхадзе ізь сьвятыні пачуў сьвятар Абухаў найсьвяжэйшую навіну, прынесеную невядома кім зь Літоўцаў у Дубовічы, - аб тым, што сяньня ў скарбовым лесе лясьнік Бжончэк забіў літоўскую жанчыну.

Ці раз хваліўся Абухаў, што ён «заботілся о своей пастве». Таму й цяпер тую парахвіянку, што перадала яму вестку, умела пацягнуў за язык, каб усю драбязу выпытаць. Дзяліўся пасьля гэтай навіной із сваёй сьвятаршай і з гасьцямі, а сам адно мяркаваў, што рабіць, калі на хаўтуры яго паклічуць.

Не ўсьміхалася сьвятару Абухаву падарожжа для гэтай сваеасаблівай «заботы о пастве» ў Літоўцы. Сваеасаблівай яно, згодна сьвятаровай лёгікі, мела быць таму, што тут у два бакі глядзець даводзілася. Трымаўся той жыцьцёва апраўданае біблійнае праўды, што трэба аддаць «цэзарава цэзару, а божае Богу». Тутака-ж, здавалася Абухаву, божыя й цэзаравы інтарэсы былі ў калізіі. І як тады знайсьці бясьпечную сярэдзінку, а калі нельга, то як быць?

Папершае, гэты мужык з кабетай хадзілі ў лес зьбіраць ягады ў нядзелю. Значыцца, ня толькі сьвятар Абухаў, але самы звычайны сьмяротнік ведаў, што так рабіць мог адно сьвядомы грэшнік. Каму як каму, а такім людзям сьвятар Абухаў ніколі не даваў спуску.

Падругое, тут быў замешаны «цэзар» - значыцца, польская ўлада. Як-ні-як, гэны лясьнік быў дзяржаўным ураднікам, сачыў за дзяржаўным майном, выконваў свае абавязкі. Жанчыны, напэўна, дарма не застрэліў. Мусіць тутака - разважаў далей Абухаў - ці ня сам Бог рукой гэтага лясьніка пакараў грэшніка.

Прыйшоўшы да такіх першапачатных, усім як сонца ясных і незапярэчаных «ісьцінаў», Абухаў працягваў разважаць далей. Можа, Палякі й нічога не сказалі-б, калі-б ён, з духоўнага абавязку, паехаў хаваць застрэленую жанчыну. З другога боку - хто іх ведае? Напэўна, касурыліся-б на яго. А таго, каб каму з польскіх ураднікаў, хаця найменшаму, наступіць на балючы мазоль, сьвятар Абухаў якраз найбольш высьцерагаўся. Ды гэта было прост-напраст жыцьцёва неабходным.

Абухаў ведаў, што парахвіяне яго, як чужніка, ня любяць. Калі мае сяньня гэтую вялізарную парахвію, да якой аж шэсьць вёсак

належыць, - такі надта смачны кавалачак на зайздрасьць усім вакольным сьвятаром - дык гэта, вядома-ж, ня дзякуючы мяйсцовым сялянам. Тутака трэба польскім уладам у ня меншай меры, чымся царкоўным, дзякаваць за гэта. Дзіва, што гэтым уладам у руку прыяў. Адно апошні дурак на яго мейсцы йнакш рабіў-бы.

Вазьміце хаця-б гэны загад міністра асьветы й духовай апекі аб увядзеньні польскае мовы ў праваслаўных цэрквах і пры навучаньні рэлігіі ў школах. Іншымі сьвятарамі загад быў зь незадавальненьнем прыняты. Крывіліся, ацялюгіваліся, направа й налева аглядаліся, адвалакалі, варожачы, як рабіць, ажно прыйшоў другі, бязь ніякіх недаказаннасьцяў, напамінак. Але не Абухаў. Ён наперад выскачыў, адразу з «усердзіем» узяўся. І розум меў, як неўзабаве выявілася. Яго на вока ўзялі, добрым словам прыгадалі, у прыклад іншым паставілі. Вось што далёказорнасьць і ўслужлівасьць значыць. Выйдзі ты каму насустрач, дык выбягуць напярэймы й табе. Аб тым, што розныя славянізмы ў польскім перафразаваньні гучэлі брыдка й шурпата для вуха, Абухаў найменш турбаваўся. Бог зразумее, у чым справа.

Аж у пяці вясковых школах вучыў Абухаў «закон божы». Лішня гаварыць, што за гэтае навучаньне ў кішэню ягоную падарожнічалі не такія ўжо дробныя манэты. А вазьмі зямлю ягоную: пяцьдзясят гактараў на мяйсцовыя ўмовы, дзе зямлі была вялікая галадоўка, гэта табе ні хаханькі. Ды якой зямлі! У каго як каго, а на ягоных нівах азіміна ці ярына, як мяйсцовыя казалі, «трубой вярнула», бульба як павар'яцеўшы расла, лён - як на глум усім зайздросьнікам, сенажаць столькі сена давала, што хоць ты ім заваліся, не гаворачы ўжо аб садзе, за арэнду якога ад Жыда штогод найменш тысячу злотаў браў. Трымаў шмат кароў, сьвінньяў, авечак, коней зь пяцёра адпасеных і як зьвяроў дужых. Трох парабкаў і тры служанкі меў; на жніво, сенакос, выбіраньне бульбы й іншае наймітаў браў. Жылося сьвятару Абухаву добра, што й гаварыць. І не мяйсцовым людзям гэта заўдзячваў. Каб іхная воля была, чаго добрага, падзялілі-б-расьцягалі ягоную гаспадарку не агледзеўся-б калі.

Не грашыў Абухаў любасьцяй да беларускае зямлі. Адылі гэта зусім не перашкаджала яму любіць і спажываць плёны ейныя. Як кажа тая французская прыказка - апэтыт расьце падчас яды. Рос, ды шчэ й як рос, апэтыт Абухава. Чым больш сыцеў, багацеў, тым больш буйнела прагавітасьць ягоная.

Як благі сон прыгадваў Абухаў часы мінулыя, калі пасьля вайны, як дэзэртыр з расейскага войска, хаваўся й лындаў па гэтай чужой краіне. Сам ня зь бедных паходзіў, да працы ня хінуўся й ззамоладу, а тут жыцьцё паставіла яго проста ў бязвыхадны тупік. І невядома, як доўга трывала-б тое, калі-б напярэймы Абухаву не прыйшла сама «матушка веры ісьціннай рускай» - праваслаўная царква. Дакладней гаворачы - не царква Абухаву на выручку пасьпяшыла, а людзі, што ёю ў Польшчы й акупаванай Палякамі Заходняй Беларусі кіравалі. Стараліся яны як найбольш свайго брата ў сьвятарскія расы апрануць. Дый сам Абухаў, што заўсёды гультая корчыць любіў і беларучкай праз усё жыцьцё хацеў прайсьці, борзда спанатрыў, дзе лёккі хлеб расьце. Аб тым, што ягоная асабістая й хрысьціянская маральнасьць шмат дзе шванкавала й замінала стацца «пастырам авец праваслаўных», нянадта Абухаў турбаваўся. Дый «уладыкі», што пасьля кароткай падрыхтовы яго на сьвятара пасьвяцілі, нянадта пра тое дбалі. Ім галоўнае - абы свой чалавек. А там упражэцца неяк, рады дасьць.

Спачатку вольна й асьцярожна ступаў, а пасьля некаторае практыкі ўжо зусім сьмела й адважна на сьвятарскія ногі Абухаў стануў, у сьвятарскі пух пачаў абрастаць. Лішнім казаць, што не належаў да тых, якія духоўны шлях ахвярным пакліканьнем лічуць. Для яго гэта была проста прафэсыя, што спорыла багацьце, многа выгадаў і магчымасьцяў бяз значнага абмежаваньня асабістых і сямейных вольнасьцяў.

Царкоўныя рытуалы й іншыя мудрасьці засвоіў добра й часам «наізусьць». Гэта дазваляла яму зь вялікай лёккасьцю й амаль аўтаматычна, зусім без ангажаваньня свайго духовага «я», барабаніць дзе што патрэбна было. Вядома, вымагалася й нямала акторства, адылі й тут Абухаў ня зломак быў. Калі ты заўсёды на вачох у людзей, ды шчэ такіх назіральных і дапытлівых, як мясцовыя сяляне, ня маеш права промаху даць. Сваім выглядам і ўсёй вонкавай істотай паказаць мусіш, што ўся твая душа ў малітве Божай. Асабліва-ж на хаўтурах ці паніхідзе ты, як найбольш любы раб Божы, усяго сябе пасьвяціць мусіш прозьбе ласкаў Ягоных. Спачатку нялатвая была гэта для Абухава справа. Ды наламаўся-налаўчыўся так, што й запраўды, гледзячы на яго, маўлялі часта людзі:

- Ты відзіш, як гэты поп шчыра моліцца. Ужо гэткага дык пэўна Бог паслухаіць.

Тым самым людзям, не разгадаўшым зручна асвойтанага Абухавым рамёства, даводзілася няміла разчароўвацца пры іншых нагодах. Было гэта найчасьцей на пасьлякалядных ссыпках, калі разам із парабком на шырокіх развадняхпа сваёй парахвіі езьдзіў і «всякое даянія благо» зьбіраў. Тады людзі бачылі перад сабой прагавітага чалавека.

Зайдзе, бывала, у каторую хату, як накручаная катрынка малітву адляпеча, пару разоў крапілам па кутох махне й выглядае ўжо, каб яго шчодра за гэткую «благадзецель» абдарылі. Беларусы, як усім вядом, з натуры людзі добрыя й сумленныя дый шчодрыя - даюць ад душы, хто колькі можа. Адылі моршчыўся адпасены сыценькі твар Абухава, калі бачыў, што ў мех сыпалі гарнец, а ня цэлую сяўню жыта, калі нехта, з прычыны свае беднасьці, дзесяць грошаў, а ня цэлую залатоўку дасьць.

Узімку сялянскія меншыя дзеткі звычайна дома сядзелі. Як тут на двор босы ці голы ступіш? Па хатах сядзелі апранутыя ў вадных зрэбных кашулях, басанож. Наглядалі зіму адно праз размаляваныя штукаром-марозам малыя вокны, марачы аб ботах і цёплай вопратцы, каб на саначкі ці на лёд пабегчы. Для такіх дзетак кажны чалавек адтуль знадворку, што ў хату заглядаў, вялікай навіной быў. Уявеце сабе, як прыглядаліся яны такому дзіўнаму чалавеку, што ў даўгой расе, зь вялікай чорнай барадой, зьзяючым крыжам, махаў нейкай малой мяцёлкай і пырскаў вадой навокал, ды нейкай незразумелай мовай да «Божанькі», што на покуці, гудзеў.

Ледзь памятаў Янук, як першы раз убачыў Абухава. Сядзеў ён у хаце, рабіў на замарожаных шыбах кругленькія «вочкі» й цікава-прагавіта на двор выглядаў. Калі Абухаў увайшоў у хату, за сабой шмат холада ўпусьціўшы, малы Янучок не на жарты зьдзівіўся й насьцярожыўся ды назіраў, што далей будзе. Апрача таго, што сьвятар рабіў, найбольш цікавым аб'ектам Януковай увагі была даўгая й шырокая чорная барада. Нідзе й ніколі ня бачыў ён такой барады, такіх даўгіх пэйсаў.

Калі ўжо ўсё скончылася - значыцца, калі гэты дзіўны барадаты дзядзька накруціў нешта перад сабой залатым і прыгожым крыжам, усё паўтараючы «міца й сына», падыйшоў ён тады да Янука, што воддаль ад столу трымаўся. Парнуўшы вялікім указальным пальцам у чэрава так, што аж да сьлёз забалела, із брыдкай грымасай на сытым чырвоным твары сказаў:

- Ну что, мужык, нажрался бульбы, а?

Не разумеў Янучок, чаго гэты дзіўны дзядзька так брыдка зарагатаў, што аж ходырам задрыгала барада. Агідным і нялюбым выдаўся хлапчуку гэны твар і тыя дрыжачыя пэйсы ў барадзе, што нагадвала густую мяцёлку. Так балюча ў чэрава парнуў, што аж у вочках пякучыя сьлёзы накаціліся.

Ды ці толькі Янука так вітаў «слуга божы» Абухаў. Гэтак зьвяртаўся да дзетак амаль у кожнай хаце. І ўжо нашто цярплівыя былі сяляне й непашанай да духоўніка не грашылі, адылі некаторыя, пачуўшы такі «жарт» раз ці два, ня вытрымалі. Проста ў сьвятарскія вочы гледзячы, сказалі, што ад каго як каго, але ад духоўніка брыдка такое чуць. Абухаў - пык-мык! - усё пастараўся «замяць для яснасьці», на жарт зьвесьці. Неяк наагул ня мог ён старэйшым проста ў вочы глядзець, а ў гэны момант і пагатоў.

Усё гэта пасьля Абухаў на свой лад перакруціў. Мясцовыя «цёмныя мужыкі» не дарасьлі, каб ягоны субтэльны й дасьціпны жарт зразумець. Сьвятар, відаць, забыўся, што малыя дзеткі наагул, а на такіх кручкаватых жартах і пагатоў не разумеліся. Ён і не падазраваў, што гэнае грубое «мужык нажрался бульбы», тарнаванае ім із смакам на вачох старэйшых людзей, зусім коратка, вымоўна й калярова характарызавала ня толькі яго, як беднага на разумовую вынаходлівасьць чалавека, але й шмат чаго іншага.

Абухаў меў добры нюх. Борзда разгадваў людзей, іхную вартасьць, удзельную вагу ў грамадзтве й пры ўладзе. Ужо калі яму што рупіла, то ведаў, да каго пасьпяшыць із прозьбай, пранюхаўшы заднія хады; да каго паставіцца з ласкай, каму льга, а каму не выпадае пад бок таўхануць, каго абыйсьці й не чапаць. Адным словам, Абухаў рана пазнаў у гэтых мяйсцох і пры гэтай уладзе карысныя для яго простыя сьцежкі й крывулі, найважнейшыя слупы-апоры пры іх. Дзіва, што ў даволі кароткім часе разжыўся й разбагацеў Абухаў так, як некалі й сьніць пра гэта не даводзілася.

Ды яму ўсё было мала, усё расла яшчэ прагавітасьць. Вакольныя бедныя людзі паглядалі на «папоўшчыну», ківалі галовамі й пыталіся самі сябе: ці-ж запраўды аднаму чалавеку, хаця-б ізь вялікай сям'ёй, так многа самай лепшай зямлі й усяго іншага трэба, калі пасуседзтву такая галеча й нішчымнасьць сьвеціцца?

Многія так і называлі сьвятара скуралупам, несумленным абдзіральнікам, ненажэрам ды іншымі зьмяншальнымі мянушкамі. Іншыя-ж, пабожнейшыя казалі, што ім судзіць «бацюшку» нельга, бо яму, мусіць, Бог усё тое багацьце дае; а калі гэтак, дык ужо каму як каму, а ня ім-жа божыя шляхі й учынкі разгадваць.

Першыя, вядома, праўду казалі. Перад тым, пакуль каму цану за вянец, хрысьціны, паховіны ці што іншае засьпяваць, Абухаў намагаўся разьведаць пра матар'яльны стан чалавека, а тады ўжо сваё вымагаў. Браў, такім чынам, не за паслугу, а паводля прынцыпу - колькі ўдасца зьдзерці. Безумоўна, у яго быў свой мінімум, што мусіў узяць незалежна ад таго, ці чалавек меў чым плаціць, ці ў яго дзеткі ў хаце ўпрогаладзь сядзелі.

Калі йшло пра вянцы, дык поўбяды тут было. Людзі маладыя, жэняцца, весяляцца, новае жыцьцё пачынаюць будаваць. Калі й лішняе ад іх возьмеш, дык яны-ж маладыя, заробяць, нідзе ня дзенуцца. Найбольш балюча даваліся ўзнакі людзям сьвятаровыя ўзяткі за хрышчэньні й паховіны. Нараджэньне й сьмерць - два асноўныя й непазьбежныя працэсы йснаваньня. Людзі родзяцца і ўміраюць, наперад не разьведаўшы, ці будзе чым за сьвятарову паслугу заплаціць.

Гэткая жыцьцёвая сьвятарская этыка Абухава выцякала зь ягоных маральна-духовых нормаў. Чалавек лічыў, што яму, як адданаму «слугу божаму», больш чым каму іншаму розных матар'яльных дабротаў належылася, што ён за свае паслугі й так бярэ надта сьціпла, што калі ў «мужыка» будзе замнога, дык і так прап'е ці пусьціць куды ня трэба. Наапошку-ж, ужо хто як хто, а ён - «духоўны пастыр», спажыве рознае дабро якраз шмат разумней за іншых і якраз так, як трэба Богу.

Надта-ж вымоўным быў выпадак, калі Абухаў аддаў сваю старэйшую дачку замуж. Ужо на другую нядзелю пасьля вясельля, калі скончыў Сьвятую Літургію ў царкве, із крыжам у руках хваліўся сваім парахвіянам, што дачцэ ў пасаг дзесяць тысячаў злотых даў. Калі-б сьвятару давялося спажыць адно палову таго, што яму ў гэны час, чуючы пра пасаг, сулілі ў сваіх думках парахвіяне, пэўна, на вякі вечныя зь пеклам не разьвітаўся-б.

XIII

Вялікая лямпа гарэла над шырозным столам, застаўленым рознай емінай. На самым пачэсным мейсцы стаяла больш чым напалову выпітая літровая пляшка гарэлкі, папулярна званая манапалькай. Праз адчыненыя дзьверы з кухні чуваць было шыпеньне самавару.

Сядзелі за сталом даўно. Было іх чацьвёра: Абухаў і Пцічкін із свайміе сьвятаршамі. Абухава была таўсьцейшая за госьцю, азызлая ў твары, павольная ў рухах, голасная ў гамонцы. Пцічкіна была старэйшая за яе, больш гаваркая, часьцей сьмяялася. Лысы, як калена, дробны ў твары, з малой сівой бародкай, Пцічкін часта папраўляў і стрымліваў у гаворцы жонку.

Дзесьці з-за сьцяны з другога боку калідору далятала графонная мэлёдыя й гучныя вясёлыя галасы. Там сьвятаранка забаўляла сваіх наведвальнікаў.

- Маша! - гукнула Абухава ў кухні служанку.

- Што, матушка? - пачуўся адтуль нізкі жаночы голас.

- Ты доўга будзеш там з эцім самаварам важдацца?

- Січас гатоў, матушка!

У гэны час нехта пастукаў у пярэднія дзьверы.

- Маша, не слышыш? Хто-та ў дзьверы стучыць. Ідзі-ка пасматры, - зноў усхадзілася Абухава.

Праз пару хвілін у дзьвярох сталовага пакою зьявілася худаватая, старэйшая векам, служанка.

- То да вас, бацюшка, чалавек.

- Скажы яму, штоб абаждаў у этай комнаце, знаеш дзе, - загадаў лянівым голасам Абухаў, зусім не таропячыся зь мейсца. - Верна, эты с Літоўцаў.

- На пахарон? - спытаў, каб упэўніцца, Пцічкін.

- Так чаму-ж ты ня йдзеш пагаварыць зь нім? - спанукала Абухава.

- Пусьць мінут с дзесяток падаждзёт. Ты ім наўстрэчу тарапісь, так ані падумают, што табой уладзеюць, - адказаў, пазяхаючы, сьвятар.

Ужо колькі хвілін сядзеў Пракоп у пакоіку. Здавалася яму, што жыцьцё цяперака спынілася, усё нутро ягонае ахутала нейкая цямнота. Па тым мосьце, на якім стаяла ўсё тое, што дагэтуль прыдбаў у жыцьці, раптам трэснуў пярун. Вада падхапіла й панесла ашчэпкі мосту, а сам ён апынуўся па шыю ў разбушаваных хвалях. Тымчасам нясьведама, адно інстынктоўна рухаў рукамі й нагамі, каб утрымацца

на паверхні, зусім не патануць. Хвалі міналі Пракопа, а ён зусім не намагаўся, каб выкарыстаць тую плынь. Гэны пярун, што разбурыў Пракопаў мост, быў Бжончыкаў стрэл у лесе. Нешта тады абарвалася ў глыбі Пракопавай істоты. Згубіўся жыцьцёвы балянс. Хвалі намагаліся праглынуць яго.

Ужо раз даў належны ім адпор. Гэта-ж прыйшлі былі ў ягоную хату й хацелі ад яго Бог ведае чаго. Перш замардавалі жонку, а тады, мусіць, ці не прабавалі тлумачыць яму й іншым сялянам, што гэта ён, Пракоп, напаў на Бжончка й што гэны бедны лясьнік, калі бараніўся, дык забіў Бахмачыху.

Пракоп гэных людзей не спалохаўся й даў ім адбой. У вачох мігацеў пазалочаны арол - сымбаль чужога ладу. Да таго-ж было ўзбушавала ў грудзёх, што нозьбітаў нялюбае птушкі вытурыў за дзьверы.

А пасьля... Што-ж пасьля? Усё яно йшло-паўзло, як быццам увосьні, у густой імгле. Ледзь-ледзь распазнаваў Пракоп зарысы навакольнае мітусьні, што называлася йснаваньнем, ды так брыў некуды наўгад. У гэных зарысах найбольшае й цантральнае мейсца займала мёртвая постаць найбольш любай і дарагой сяброўкі.

І цяпер ён вось тут, у сьвятаровым пакоі. Ведаў, чаго прыйшоў. Сядзеў як зьдзервянелы, чакаў. Там дзесьці за сьцяной чуваць былі звонкія галасы й рогат моладзі. Хрыпеў-задыхаўся нейкі голас у сіпатай грамафоннай трубе. Што да іх Пракопу? Яны для яго як-бы не за сьцяной, па суседзтву, а на другім канцы сьвету былі. Якая-ж цяпер вялізная продань між тым, што адбывалася ў ягоным сэрцы й тым, што навокал. Зь іншага пакою даляталі мужчынскія й жаночыя галасы, бразгат судздзя. Там ядуць ці што - Пракоп не прабаваў угадваць.

Пракоп быў зусім абыякавы да таго, што адбывалася навокал. Нават, каб хто прыйшоў, узяў за руку ды сказаў: лезь вунь, Пракоп, праз гэнае вакно, - бяз одуму палез-бы.

Вочы яго ўжо каторы раз затрымліваліся на нечым сьветлым, што ляжала на падлозе ля парогу. Ці ня белае гэта што? А мо, яно толькі некалі было белае? Цяперака такое затаптанае, завэдзганае, што цяжка гадаць пра колер. Рызман, мусіць, нейкі. Пракоп пацікавіўся й пачаў разглядаць пры млявым сьвятле малой лямпы. На гэтай вялікай шмаце, што служыла дзяружкай пад ногі, пачаў адрозьніваць нейкія павышываныя каляровыя ўзоры. Былі яны якраз такія, якімі вясковыя

жанчыны ці дзеўкі аздабляюць ручнікі, настольнікі, кашулі. - «Гэта-ж, мусіць, і будзіць вялікі ручнік», - мяркаваў Пракоп.

І тады прыгадаў: людзі ці адзін раз гаварылі, што Абухаў ручнікамі й посьцілкамі падлогі ў хаце засьцілае. А Божа-ж мой! Можа, каторая парахвіянка прынесла ў царкву, каб на які абраз павесіў. І ягоная-ж нябожчыца Алена ці раз ручнікі ўзорамі вышывала ды ў царкву дарыла. Ды ці толькі адны ручнікі. А гэта вось пад нагамі адзін мо якраз і быў Аленін. Божа-ж ты мой! Пракоп аж жахнуўся, разважаючы такую магчымасьць, што вось перад ім ля сьвятаровага парогу, завэдзганы гразёй, вышываны можа рукамі нябожчыцы ручнік.

Ці-ж не памятае ён, зь якой руплівасьцю, стараннасьцю й адданасьцю папацела яна, вышываючы, як прыгожа й памастацку пад ейнымі спрактыкаванымі пальцамі расьлі, расьлі й зацьвіталі тыя палатняныя нітачныя васількі? Гэта-ж ні для каго іншага, а для самога Бога рабіла яна. Думала, мусіць, што праца ейная аздабляць будзе вобраз Стваральніка ці іншага сьвятога дзе на якім абразе. А тутака, на табе! А колькі-ж такіх ручнікоў, ці іншага, вытканага працавітымі мазольнымі рукамі сялянкаў было ў іншых сьвятаровых пакоях пад нагамі? Дык вось як ён шануе працу пабожных парафіянак!

Цяжкімі крокамі на калідоры зарыпела падлога, і ў дзьвярох вырасла мажная, аздобленая чорнай барадой, постаць Абухава.

- Ты ка мне? - спытаў сьвятар.

- Га? - ускочыў Пракоп з крэсла із прашмуляным цыраватым сядзеньнем.

- Я спрашываю: ты ка мне? Што з табой?

Абухаў выглядаў, быццам устаў ад доўгага «чаепіція». Нос і твар былі чырвоныя, вочы памутнелыя ад гарэлкі. Ці раз бачыў Пракоп гэтыя вочы ў царкве пры алтары. Тады яны былі йнакшыя - куды прыемнейшыя; можа, таму, што да Бога ў высі падносіліся. Цяперака-ж як-бы шукалі й не знаходзілі апоры, быццам ня ведалі, на чым ім затрымацца й ці затрымацца наагул. Бегалі-коўзалі па Бахмачу й нейдзе воддаль ззаду за ім.

- Я да вас, бацюшка, із просьбай, - пачаў Пракоп.

- Ну што? Гавары, гавары! - нагліў сьвятар, гледзячы на гэтага басанога, у зацяганай вопратцы, селяніна.

- У мяне нішчасьце, бацюшка... Жонка мая, яе сягоньня лясьнік...

Далей не хапіла паветра. Каторы ўжо раз той чорны вобраз нядаўнай трагэдыі кружыў увачу, аддаляўся. Сьвятар маўчаў.

- ... лясьнік у леся яе забіў...

- Гм... Упакой Госпадзі душу яе, - зусім механічна адлепятаў Абухаў. - А чаму-ж ты ў лес у празьнік пашоў? Ні знаеш, што ў царкву далжон быў?

- У будні дзень німа калі, бацюшка, работа...

- Заўтра хароніш?

- А калі-ж... Адкладаць німа як.

- Два пуды жыта.

Пракопавы думкі ў той час былі так расьцярушаныя, што ён зусім забыўся, што сьвятар можа вялікую цану засьпяваць. Думаў, што праслухаўся.

- Як, бацюшка, кажаце? - спытаўся.

- Два пуды жыта дасі, то пахараню.

Памылкі не магло быць. За паховіны сьвятар пытаў два пуды жыта. Пракоп цяпер прыгадаў, што ў ягонай хаце даўно свой хлеб зьвёўся, ужо колькі на пазычаным, а то й зусім ня бясхлебіцы перабіваліся. У ягоным сьвіране й мышам не было чаго есьці, мусіць ці не ў суседзкія перабраліся. А гэты вось сыценькі брухаты чалавек стаяў перад ім і наспакайней у сьвеце засьпяваў такую вялікую цану, што Пракопу той апошні дух ад неспадзеўкі заняло.

- Бацюшка, дзе-ж я гэта іх вазьму? Сам вуньдзіка бяз хлеба ўжо сколька часу... Вы-ж Богу служыце, дык, можа, беднаму пасобіце...

- Два пуды жыта, кажу. Ні дасі, то й гаварыць ня буду.

- І ні ўрадзіла-ж ў мяне сёлета, ні дай ты, Божа, майму ніпрыяцілю. А дзе-ж яшчэ тоя жніва. Ну, алі можа як сажну, дык заплачу... Што ўжо з вамі зробіш...

У Пракопа млелі ногі, ён ледзь стаяў. Пякло ў сярэдзіне. Ад таго нішчымнага сьнеданьня нічога ў роце ня меў. Яму патрэбная была цяпер матар'яльная й маральная падтрымка.

- Ня буду я ажыдаць, пака сажнеш. Заўтра, как пахараню, тады й заплоціш. Ну то как?

- Ні магу, бацюшка, памілуйце! Ці-ж вы беднаму ня можаце паспагадаць, папусьціць трохі хоць?

- Ні прыеду. Ідзі нанімай каго дзішавей, а мяне не ажыдай!

З гэткімі словамі сьвятар выйшаў з пакою. Вярнуўшыся ў ядальню, ён рассасуліўся на шырокім выгадным крэсьле й зьвярнуўся да Пцічкіна:

- Ну то што? Можа яшчэ па румачке?

- Ну эта как вы... Чалавек зачэм прыхадзіл?

- На пахароны прасіл. А плаціць ня хочэт. Гаворыць, што нету ў яго. Я атказался, - спакойна тлумачыў Абухаў, наліваючы манапольку.

У пакоі было нязручнае маўчаньне. Жанчыны й Пцічкін шматзначна пераглянуліся.

- То за ваша здароўе! - падняў Абухаў чарку.

Пракоп быў ашаломлены да рэшты. Чуўся так, як чалавек, што сьцякае кроўю. Выцягнуў руку з прозьбай, каб яму дапамаглі, перавязалі раны, агледзелі, а тыя, заміж помачы, укалолі ў найбольш кволае й балючае мейсца. Адылі не фізычную рану зрабіў зрабіў Пракопу Абухаў. Рана была шмат цяжэйшая й глыбейшая.

Не памятаў, колькі яшчэ, як аслупянелы, стаяў у пакоі, калі выйшаў. Ногі пацяжэлі, быццам іх хто волавам наліў. «Два пуды жыта. Ні дасі, то й гаварыць ня буду» - надакучліва зьвінелі сьвятаровы словы. Пракоп быў чалавекам глыбока веруючым. У яго галаве не магло зьмясьціцца, што сьвятар ня толькі задумаў гандлявацца зь ім у час такога цяжкога сямейнага няшчасьця, але зусім адмовіўся на паховіны прыехаць.

Зьнясілены фізычна, дабіты маральна, Бахмач ня толькі што ня мог разважаць лягічна, але нават думаць пасьлядоўна. І выглядала, што хвалі тэй рабушаванай ракі, у якой апынуўся сяньня пасьля абеду, цяпер канчаткова яго праглынуць. І ад Бога няма помачы й ласкі. За што-ж Бог так яго карае? Ці-ж нябожчыца можа быць пахаваная безь сьвятара, бяз слова Божага?

Не памятаў, як доўга йшоў. Цемра была, як пальцам у вока. Здавалася, што з дарогі зьбіўся. Пастаяў крыху, паслухаў, у якім баку чыгунка. З Гацяў далятала галёканьне цягніка. Бахмач наважыўся адпачыць, сеў на нейкі камень, далонямі падпёр твар. У галаве хаос думак бушаваў, быццам тое чорнае груганьнё ў мінулую вайну над трупамі ў Гараватцы. І хаос гэты, пры росьце эмацыянальнага паднечаньня, яшчэ большаў.

Сяньня раніцай яшчэ жыў у сонечным сьвеце. Калі пасьвіў Чарнулю пры дарозе, ён вокам сына гэтае зямелькі, якому любае

кожнае дыханьне й колер ейны, назіраў нараджэньне новага дня, бачыў, як прырода славіла Бога.

Пракопаў сьвет быў малы й цесны. І з кожнага кута яго шчэрыла зубы вялікая галіта й цяжкая нядоля. Але ён, за тым кароткім выняткам часу, калі працаваў у Пецярбургу, ня ведаў іншага сьвету. Тутака нарадзіўся, вырас. Колькі папрацаваў, папацеў, пагараваў, каб заваяваць сабе права грамадзянства ў гэтым сьвеце, зьвіць сваё, няхай сабе сьціплае, гняздо, ня быць апошнім між апошніх. Карэньні ягоныя, як гэнага шматстагодняга дуба на сугры Гараваткі, сягалі глыбака ў гэтую зямлю. Цяперака-ж, здавалася, гэтыя карэньні падсякалі. Пракоп пахіснуўся, траціў раўнавагу. Дзе-ж шукаць апоры?

Дзе падзелася тая залатая нядзельная раніца? Адыйшла яна, беспаваротная, адплыла ў вечнасьць, у нябыт. А зь ёю, здавалася, сплыло да рэшты Бахмачова жыцьцё. Мусіць, раніца тая была Бог ведае як даўно; так шмат чаго здарылася ад гэнага часу. Не хацелася даць веры, што яна, сьветлая й шмат абяцаючая, была яшчэ тутака колькі гадзін таму назад. Пракоп за гэты дзень пастарэў гадамі. Цяпер бачыў перад сабою цемрай ахутанаю, нязглыбленую бездань. З аднаго боку злосна-агідны руды каржакаваты лясьнік, а з другога - чарнабароды поп, штурхалі яго ў тую продань. Падаў і ляцеў, дарэмна махаючы рукамі й нагамі, каб за што зачапіцца, утрымацца. І ці будзе ўжо адкуль які ратунак?

- Давай, галгане едэн, ягады, ато застрэлю! - крычэў каржакаваты чалавек із стрэльбаю ў руках. Побач грозна вурчэў і скаліў іклы вялікі ваўчар-сабака.

- Ні дасі два пуды жыта, то ні пахаваю! - зьдзекваліся ў цемені дрыжачыя пэйсы ў чорнай барадзе.

- Божа, ратуй! Згаварыліся! Жывога ў магілу загоняць! - стагнаў Бахмач. Ён падняў галаву ўверх, аж да зыркіх у начной цемені зораў, паволі перахрысьціўся. Устаў з камяня, як прывід у дзёгці ночы паклыпаў у той бок, дзе яго чакалі. Тамака жывыя, дабразычлівыя людзі, сябры ягоныя. Там ён патрэбны. Дык трэба йсьці...

XIV

Пракопаў Янук да гэнай нядзелі ніколі лоб-у-лоб не сутыкнуўся ізь сьмерцяй. Нельга сказаць, каб сьмерць была для яго навіной. У ягоным уяўленьні сьмерці былі дваякія: адны - гэта тых, што адпраўлялі на вясковы могільнік літоўскіх людзей, а другія, гэта тыя, аб якіх гаварылі настаўнікі гісторыі ў школах. Першыя, вядома, былі побач. Маладому хлапцу здавалася, што яны былі нялюбымі, бо, калі каго хавалі, дык надта-ж многа галасілі. Адылі хоць на іх наракалі, запярэчвалі ім права да зьяўленьня ў вёску, сьмерці гэтыя прыходзілі няпрошаныя. Мусіць, мелі яны ў Літоўцах такое самае права, як, прыкладна, жыта, што каласіла нівы, салаўі, што сьпявалі па гаёх і дубровах ды ўсё чыста іншае, што бытавала навокал.

Тыя сьмерці, аб якіх гаварылі настаўнікі ў школах, належалі, мусіць, да зусім іншае катэгорыі. Іх называлі слаўнымі, гэройскімі, ды яшчэ й ахвярнымі. Як дзяцюк у касавіцу траву, касілі яны адважных людзей на палёх баёў. Людзі гэныя былі найчасьцей у росквіце маладосьці, фізычных сілаў і ваеннага спрыту. Дні іхнай гібелі паміналі пасьля доўгімі гадамі, некаторым ставілі помнікі, прысьвячалі адмысловы час, каб аддаць належную пашану. Значыцца, іхныя сьмерці не былі дарэмнымі: яны былі патрэбнымі, каб вольна жылі тыя людзі, што прыходзілі пасьля.

Сьмерць свае маткі юнак ня мог прыдзяліць ані да першае, ані другое групы. Гэта ня толькі таму, што была яна бязьлітасная й брутальная, што матка сканала з рукі чужога й бессардэчнага забойцы, але перадусім таму, што яна ў поўнай і жахліва-гвалтоўнай сваёй велічы першы раз станула перад пастухом Януком, забрала найбольш любую яму йстоту. Хлапец разгубіўся, спалохаўся. Сьлёзам не было супыну. Цэлы надвячорак і вечар, як п'яны, сноўдаўся ля бацькавай хаты, нідзе не знаходзячы сабе мейсца й патолі.

Зь мінулага вырастаў і прамяніўся перад ім дарагі матчын твар; ласкаў-суцяшаў яго, тулілі да сябе матчыны грудзі. Голас вымаўляў словы спагады, падтрымкі. Ведаў Янук, што голас гэны ня здольны быў да рэзкага слова нават тады, калі капрызамі свайміе гнявіў матку. Матка была для яго ўсім на сьвеце: апорай у злыбядзе, сябрам у дарозе, крыніцай сьвятла й ласкі, пацехай і радасьцю.

Ці праўда гэта, што яна адыйшла? А мо, гэта толькі благі сон? Не, ня сон гэта. Вунь на покуці ў хаце пад абразамі - пажаўцелая й страшная - гэта была яна. Гэта не кашмар. Жаль душыў і расьпіраў

юнаковы грудзі. Наапошку не было ўжо чым плакаць: перасохлі сьлёзы. Быццам жарства, нешта сухое дзёрла ў горле.

Як ніколі, людна было ў той вечар ля Бахмачовай хаты. Людзі прыходзілі, ціха заглядалі праз адчыненыя дзьверы ў хату, упоцемках поўнілі сенцы, як пчолы пасьля працавітага дня ў вульлі гудзелі на вуліцы. Выглядала, як быццам сабралася тут усенароднае веча.

Цяжка прыдушыла народ польская акупацыйная ўлада. Адылі гвалт гэны, асабліва апошнімі часамі, рэдка выяўляўся ў такой зыркай хворме, як сталася гэта сяньня ў скарбовым лесе. Нават тыя, што так ці йнакш шлі ўладзе насустрач, спатуралі ёй, або ў найлепшым выпадку былі пасыўнымі, цяперака пабачылі ейны запраўдны твар у поўнай нагласьці й брыдоце. Усе былі паднечаныя, некаторыя-ж - да лютасьці злосныя. Полымя нянавісьці разьдзьмухваў той просты факт, што безабаронная ахвяра была цяжарнай. Значыцца, замардаваў лясьнік не аднаго, а двох чалавек.

Нават найбольш рэлігійныя не асьмеліліся-б упікнуць Пракопа за тое, што грашыў, калі пайшоў зьбіраць ягады ў нядзелю. Гэта-ж нядзелю й лічылі ягадным днём. Буднямі на сваіх нівах ці ў пана працавалі. Разважаючы аб тым, што здарылася, на розныя лады, кожны меў нагоду прыгадаць і выліць сваё собскае гора, запраўдныя ці ўяўныя крыўды з рукі гэтае чужое ўлады.

Непаседлівы Янук, сноўдаючыся між людзей, спасьцярог за парогам у сенцах Дуню Макатунішку.

- Янучок, - сказала яна ледзь чутным голасам і запялася. Выцягнула руку, каб яго спыніць ці што, але рука гэная на паўдарозе зноў наважыла апусьціцца. У цьмяным сьвятле Янук спасьцярог васільковыя Дуніны вочы. У іх была спагада, няпэўнасьць і яшчэ нешта...

Разгубіўшыся, Янук на момант затрымаўся. Раптам, невядома чаму, стала яму вельмі сорамна. Вось ён такі ўжо вялікі й заплаканы быў. Як-жа гэта! Нават цяпер, у час цяжкой трагэдыі, не жадаў паказаць перад гэтай дзяўчынай свае слабасьці. Як заўсёды раней побач яе, хацеў быць устойлівым і самаапанаваным, а ня плаксай. Ня мог сьмела й проста зірнуць у бок гэных васількоў. Нашто ўжо зжыўся з Дуняй і разумеў яе, колькі гэта розных справаў разважалі-пратрасалі дый шчэ падзіцячаму часта абмяркоўвалі, усяроўна цяпер ніякавата было адкрыць перад ёй сваё сэрца й выліць адтуль поўнае гора.

Прадчуваў, што ня вытрымае, як малое дзіця расплачыцца. Таго найбольш баяўся. Мог-бы так зрабіць адно на грудзёх маткі. Як-бы яго хто раптоўна пекануў у кволае мейсца, борзда рушыў ад Дуні на двор, дый пасьля высьцерагаўся, каб зь ёю не сустрэцца.

На покуці ў хаце, прыбраная ў чорнае, жоўтая ў сьвятле сьвечкаў, ляжала нябожчыца Бахмачыха. У нагах стаяў малы ростам, стары й лысы аднавясковец Апанас, у руках трымаў пасалтыр і чытаў. Манатонны голас ягоны дрыжэў і сквірчэў, як тое полымя ў самаробных сьвечках. Вось-вось, здавалася, захрасьне ён нейдзе ў старым, абцягнутым паморшчанай скурай горле й больш не аджыве. Горла-ж прачышчалася, голас мацнеў, ды манатоннай ноткай, як той кволы матыль, вылятаў дзесь зь ягонай глыбіні, пырхаў над траскучымі й копцячымі полымем сьвечкамі, мітусіўся па змрочнай хаце й ужо амаль бясьсільна то асядаў на сьценах, то праз расчыненыя дзьверы намагаўся дастацца навонкі. А знадворку быццам панібраціў яму аднастайны гоман людзей.

У хаце было душна. На лавах сядзелі пераважна жанчыны. Некаторыя хліпалі ў насы. Рэдка калі нахіналася каторая да свае суседкі, штосьці на вуха шаптала. Пры самай нябожчыцы, панурыўшы галаву, сядзела Кацярына. Яна калі-нікалі ўсхліпвала, хусьцінкай выціралa вочы й нос. Побач сядзела дачка Надзя. Была гэта рослая, цёмнавалосая й прыгожая сямнаццацігадовая дзяўчына. Каму як каму, а ёй - крумянай і поўнай жыцьця, ня мейсца было тут, дзе на ўсіх цяжкі адпячатак палажыла сьмерць.

Знадворку ад сьвірана даляталі глухія гукі малатка, сякеры й пілы. Там на козлах, пры сьвятле ліхтара, зьбівалі дамавіну. Кацярынін Алесь майстраваў зь Якубавым Васілём. Ад ліхтара, што стаяў на падпярэчніку клеці, мужчынскія цені, як доўгія здані, вандравалі або спыняліся на панадворку. Дамавіна была ўжо амаль гатовая. Прымяралі й зьбівалі века.

Праз вокны цьмянае сьвятло з хаты прастакутнікамі змагалася зь цемрай на вуліцы. Яно коўзала на плячох і тварах натоўпу. Людзі падзяліліся на групы, абмяркоўваючы сяньняшняе здарэньне. Кажная група мела найбольш гаваркога й аўтарытэтнага дзядзьку, погляды якога бралі верх над думкамі іншых. Жарыліся й патухалі ў цемені вугалькі папяросаў. Дзесь з аселіцаў чуваць было кракатаньне жабаў, зводдаль набліжаўся гул цягніка. Ніхто не рупіўся пад дом.

У ваднэй групе найбольш ажыўлена й пераканальна гудзеў бас солтыса Паўлоўскага. Быў гэта рухавы, поўны жыцьця, у трыццатых гадох, мужчына. Як-ні-як, ён тут быў слупом улады. Лічыў сябе шляхціцам. Калі хто ў гутарцы зь іншым не хацеў называць яго па імені - а так бывала часта - дык проста казаў: гэты наш дзіравы шляхціц. Паўлоўскі мо й паходзіў з тэй зьбяднелай шляхты, што глыбака ў беларускую зямлю ўкаранілася. Хто там мог тропу дайсьці. Адылі ўсе ведалі, што якраз такая шляхта была тут найбольш стойкім і заядлым абаронцам польскае ўлады. Яна вырасла з народам, некалі была яго складовай часткай. Пасьля спалянізавалася, духова адыйшла да чужнікоў, але ўсяроўна лічыла сябе выказьнікам народнае волі.

Характэрна, што амаль ніхто з гэтай шляхты не карыстаўся дома польскай мовай; бальшыня ня ведала яе ў зуб. Ставілі знак роўнасьці паміж пальшчынай і каталіцтвам так, як гэтага вымагала ўлада. Няздольныя, такім чынам, выявіць польскасьць у мове ці чым іншым, намагаліся быць лепшымі каталікамі, чым сам папа рымскі, і лепшымі Палякамі, чымся паны й асаднікі, якіх панавозіла-панасаджвала на гэтую зямлю панская ўлада. У запраўднасьці-ж былі няўдалымі імітатарамі.

Другая, лікам пераважаючая, праваслаўная часьць Беларусаў была для гэтых імітатараў-Палякаў «рускімі». І сьвяткі, гэткім чынам, не называлі каталіцкімі ці праваслаўнымі, але «рускімі» й «польскімі». Такое разьмежаваньне Беларусаў, якому спатурала нацыянальная маласьведамасьць, прыяла ў руку польскім ураднікам, калі пры пярэпісу насельніцтва шляхам хвальшаваньня трэба было давесьці, што тут бальшыня «палякаў», а крыху «рускіх», маса «тутэйшых», а Беларусаў дык адно на развод ці звод асталося.

Сяньня Паўлоўскі трапіў у тупік. Адчуваў, амаль ведаў, што поўная праўда была на баку гэтых людзей. З боку Бжончка не магло быць апраўданьня за забойства Бахмачыхі. Паліцыя гаварыла йнакш. Як Пракоп прагнаў іх з хаты, забегліся да Паўлоўскага. Пераказалі солтысу лясьнікову вэрсію. Адно па выглядзе іхным здагадаўся Паўлоўскі, што незадаволеныя былі цэлай гэтай справай. Хацелі-б, відаць, як той Пілат, абмыць рукі, калі-б з абавязку не былі пакліканымі. Нацякнулі солтысу, каб сачыў, што тут будзе рабіцца, і «ў выпадку чаго, ты ведаеш дзе нас знайсьці». Казалі таксама, каб пасьля

паховінаў прыгадаў Пракопу зьявіцца на пастарунак для высьвятленьня справы.

Ужо хто як хто, а Паўлоўскі ведаў Пракопа зь першай рукі, як роднага брата. Бахмач, бывала, каб каму калі вока запарошыў, а ня тое, што на нейкага ўзброенага галаруч кінуўся. Вось чаму солтыс быў пэўны, што тутака хіба была на лясьніковым баку. Калі-ж людзі абурыліся нялюдзкім Бжончыкавым учынкам, дык мелі добрыя падставы на гэта. Ды Паўлоўскага тое зусім ня грэла. Наадварот - хто-ж, калі ня ён, мусіў у сабакі вачэй пазычаць, крывіць душой, падтрымліваць хвальшывую ўрадаваю вэрсыю? Як-жа йнакш?

Ты-ж адно паспрабуй, публічна прызнай гэтым людзям слушнасьць, дык толькі глядзі, што будзе! Ведаў солтыс вяскоўцаў, як сваю пецярню. Не сябры яны яму. Ці адзін укусіў-бы яго, каб зубам волю. Ого! Тут, брат, пальца катораму ў рот ні ткай, бо цэлага ня выймеш! Ты закінь за каторага слова, прызнай слушнасьць, дык спачатку панібратамі стануць, а пасьля - чаго добрага - нараўне цябе із сабой паставяць. А які-ж ён ім роўня? Ён-жа начальнік іхны. Таму мусіць воддаль трымацца й вэрсыю Бжончка падтрымліваць. Паўлоўскі-ж ня з тых, што ўчора нарадзіўся, ён ведаў чыю руку грэць.

Мужчыны слухалі солтысавай гутаркі неахвоча й, мусіць, толькі для прыліку не пярэчылі. Калі адгукаліся, дык няшчыра й асьцярожна. Нядоля навучыла іх цаніць-узважваць кожнае слова, каб лішняга ня ляпнуць. Халадзечу з боку аднавяскоўцаў Паўлоўскі адчуў вельмі выразна. Калі пераказваў, што яму казала паліцыя, заступаўся за Бжонка, або ганіў Бахмача, некаторыя маўкліва ківалі галавой, у найлепшым-жа выпадку адно патаквалі. Солтыс спасьцярог, што дзе-б ён ні павярнуўся, заціхалі галасы, людзі насьцярожваліся, адыходзілі на бакі. Не хацелі адчыняць перад ім сваіх сэрцаў, ня лічылі яго сем'янінам.

Солтыс падыйшоў да Лявона Шпунта. Прабаваў пацягнуць дзяцюка за язык. Той збываў яго паўсловам, а нават маўчаньнем. Хто-як-хто, а Лявон-жа заўдзячваў Паўлоўскаму сваю працу «драгомішча». І гэты гаварыць, адкрыцца не хацеў. Наапошку Паўлоўскі адчуў сябе зусім чужым у гэтай грамадзе.

Каб гэта хто з гэтых мужыкоў ды кінуў яму, як Паляку, абвінавачаньне ў вочы, узяў яго за чуб! От схапіўся-б тады ізь ім уджкі. Што-б там ні было, але душэўную злыбяду прагнаў-бы. Дык-жа не.

Проста, мусіць, залічылі яго, пана солтыса, у лік вінаватых дый кропку над тым паставілі. Нават толкам паслухаць яго ня хочуць. Проста абмінаюць. Гэта ўжо празь меру! - «Я-ж вам за гэта пакажу, пазнаіця вы!» - у думках пагражаў Паўлоўскі.

Пракоп, як той прывід, шмыгнуў ля плоту, некаторымі нават незаўважаны, дый пайшоў на двор да Алеся.

- Наказаў? - спытаў швагра, адклаўшы малаток.

- Наказаў, толька...

- Толька што?

- Ні прыедзіць.

- Ні прыедзіць? Як-та так?

- Два пуды жыта захацеў.

- Аж два пуды?

- Так...

Цені ад ліхтара замерлі на панадворку.

- Каб яму сваё бокам вылізла, як ягонай прагавітай кішцэ мала! - плюнуў злосна Алесь. Пракоп стаяў моўчкі, трымаючы на дамавіне вочы.

- Сказаў-бы-ж ты, што аддасі, як сажнеш ды змалоціш.

- Казаў.

- А ён?

- Хоча, каб адразу. Прасіўся я, казаў, што ні магу, дык ён каб табе на макулінку пасобіў. Гаварыць, кажа, ня буду.

- Ну, гэта-ж ня поп, каб яго зімля ні насіла!

Алесява правая рука да болю ціснула тапарышча. Страшна ў млявым асьвятленьні ліхтара выглядаў гэты здаровы чарнявы мужчына. У галаве ўжо мяркаваў, ці мог-бы дзе пазычыць, каб швагру выручыць. У самога зубы на паліцы, добра што бульба ды капуста шчэ не зьвяліся. А ў каго-ж пазычыш? Тыя, што далі-б, дык ня маюць, а тыя, што маюць, дык не пасобяць. Злосьць на сьвятара адсунула ў бок усе іншыя думкі. Каб дубовіцкая чорная барада пад рукой была, дык, здаецца, бяз одуму рашчапіў-бы войстрай сякерай галаву.

- Дык як-жа гэта будзіць? - прашыпеў Алесь.

Заміж адказу Пракоп сеў на шырокую калоду, што раней прыцягнулі з дрывотні, далонямі падпёр твар.

- Можа, якога другога папа папрасіць? - сказаў Васіль.

- Пазнавата. Дзе ты гэта каго... Заўтра-ж пахаваць трэба. Ліха яго матары, - цьвёрда наважыўся й глянуў на Пракопа Алесь, - Ні прыедзіць, дык і ні нада. Бізь яго абойдзіцца!

- Біз папа? - падняў галаву Бахмач.

- Біз папа. Памолімся й вечную памяць сьпяём самі. Панас зацягніць, а мы падхопім. Ня можа быць, каб Бог нас ні паслухаў.

Пракоп адказаў не адразу. Ён мяркаваў, ці гэта грэх будзе ці не, калі жонку безь сьвятара пахаваць.

- А можа, ты праўду кажыш?

- Пэўня-ж, праўду. Ніхай яму грэх будзіць, а ні нам. От як...

На двор выйшла Кацярына. Вестка, прынесеная Пракопам, маланкай перадалася прысутным ля Бахмачовай хаты. Як лес, ускалыханы ветрам перад навальніцай, гэтак ажывіліся цяпер літоўскія сяляне. У хаце стары Панас кінуў чытаць псалтыр, колькі разоў перахрысьціўся на абразы й сеў на лаву, а пасьля выйшаў на двор зачарпнуць сьвежага паветра. У галаве ягонай памясьціцца не магло, каб сьвятар зрабіць паховіны нябожчыцы адмовіўся.

Тлеючая ў сялянскіх сэрцах нянавісьць да Палякоў скіравалася цяпер у іншы бок. Поўную волю свайму языку даў солтыс Паўлоўскі. Усе, як-бы забыўшыся, што было колькі хвілін таму назад, патаквалі яму, памагалі словамі, лаянкай. Шматлікія пайшлі ў панадворак, абступілі Пракопа й мужчын ля дамавіны ды распытваліся пра дробязі. Вылез цяпер на паверхню Лявон Шпунт. «Драгомішч» і солтыс раптам знайшлі супольную мову, кожны із сваёй мэтай. Шпунту, як на замову, зьявілася добрая нагода ня толькі ўдарыць па сваіх архіворагах - сьвятарох, але й распаліць народны гнеў, накіраваць яго, можа, нават у пажаданае рэчышча. Паўлоўскаму-ж таксама цяпер была магчымасьць рэабілітаваць свой гонар, накіраваць увагу людзей у іншы бок ад Палякоў, нацкаваць на Абухава.

- Пайдзем, наб'ём папа! - кінуў Лявон Шпунт.

- Пайдзем! Давайце ўсе, дадзём гаду!

- Папа наб'ём!

Мікола, што прыслухоўваўся, кульгікаючы, пабег у панадворак.

- Тата, людзі папа ідуць біць! - кінуў, бегма.

- Якога папа? Што яны, падурэлі? - схамянуўся Бахмач.

- Абухава, каго-ж...

Пракоп ускочыў і разам зь іншымі пасьпяшыў на вуліцу. Запраўды, натоўп рушыў зь мейсца. Бахмач голасна зьвярнуўся да ўсіх:

- Гэта куды вы?

- Ідзём папа адлупцуем, так яго маць!

- Два пуды жыта яму бокам вылізуць!

- Стойце, людзі добрыя! - прасіў Пракоп. - Чаго вы ўсхадзіліся? Няможна-ж так. Калі гэта вы за мяне, дык астаўце, Бог зь ім...

- Чорт ізь ім, а ня Бог! А мы яго правучым! Ідзём, дзяцюкі, дадзём чорнай барадзе!

Алесь бачыў, што цяжка людзей стрымаць, дык пасьпяшыў на помач швагру:

- Людзі добрыя, на прамілы Бог, ці то вы падзічэлі? Што вы з таго папа выб'еце? Ці вы яго зьвяжыце й прывядзіцё? Гэта-ж нашто разбой па начы? Астаўце, нам такая помач ня трэба!

Тыя, што йшлі, завагаліся, спыніліся. Пачалі між сабой спрэчку. Лявонава падбухторваньне страціла першы ймпэт. Асядаў злосны ўздым. Відаць было, што пагавораць, палаюць уволю Абухава, дый толькі таго.

Ужо было за поўнач, калі разыходзіліся па хатах.

XV

На вялікім літоўскім могільніку, між бярозаў, асінаў, бэзу й меншага кустаўя, горда й велічна, быццам манарх і каралева ў зграмаджэньні сваіх вернападданых, узвышаліся дзьве вялікія сосны. Большая зь іх - у камлі тоўстая, як пяцём мужчынам ледзь абняць - нахілілася сваім чубам да меншай, простай і ў шапцы зусім сымэтрычнай, якраз так, як гэта робяць вясковыя цёткі, калі адна другой на вуха вялікі сакрэт маніцца пераказаць. Тысячамі вялікіх каранёў і мільёнамі маленькіх карэнчыкаў, заглушаючы суседнія дрэвы, прагна смакталі гэныя дрэвы пажыву з могілак, так добра ўзбуйнеўшых на попелах мінулых літоўскіх пакаленьняў. Ды ня толькі літоўскіх хавалі тут на вечны супачын: былі тут і дзялкі малых падсуседзяў з ваколіцы.

Гаварылі ці раз, гледзячы на гэныя сосны-прыгажуні, людзі:

- Глянь, якія пекныя! Дзіва што! Столька народу там ляжыць. Як ім гэттака ні расьці...

Здаралася й так, што казаў адзін другому жартам:

- Ці ты калі думаў, што гэта, можа, нашы дзяды ці бабулі шышкамі парабіліся?

- Як гэта?

- Ну от, скажам, гэна вялікая сасна на могільніку карэньнямі залезла ў дамавіны, на попеле нашых людзей жывець, дык шышкі павырасталі. Як ты думаеш?

- А ты знаіш, што ікраз так быць можыць...

І тады рагочуць жартаўнікі.

Многа людзей ляжала на літоўскім могільніку. Самому Богу ведаць колькі зь іх нармальнага, сьпелага веку дажыло, а колькі перадчасна - чужнікамі-прыблудамі ў непасільным ярме замораных - на той сьвет адыйшло.

Найбольш векам заавансаваныя вясковыя старажылы не маглі прыгадаць маладосьць гэтых соснаў. Давалі ім сотні гадоў. Узбуйнелі дзьве прыгажуні на попелах сваіх, і пераклікаліся-пераглядаліся яны празь літоўскую даліну-начоўкі зь гігантам Архіпам у Гараватцы, што вырас на попелах прыблудаў. Амаль заўсёднымі лучнікамі між гэтымі дрэвамі былі самыя гордыя й высакалётныя птушкі, - тыя, што рэдка зьніжаліся да лёту вераб'я ці іншае крылатае дробязі. Сядуць яны на шырокую разложыстую карону магутнага Архіпа, агледзяць наваколіцу, прыслухаюцца да гамонкі лісьцяў, гадаюць, што сьніцца сьведку даўно мінулых стагодзьдзяў. Калі Архіпавы думкі спазнаюць, шыбуюць із рэдкімі ўзмахамі крыльляў на могільнік, аздобяць гольле вялікіх соснаў, каб іхнай таямнічай гамонкі паслухаць, ад Архіпа навіны перадаць.

Калі ўзыйдзеш на чыгуначны адхон ды зірнеш на тыя сосны, дык здаецца табе, што яны, як дзьве гарэзьлівыя цёткі, стуліўшы ў сакрэце галовы, пакепліваюць са старога дуба на сугры Гараваткі. Людзі, часамі ў гурт сабраўшыся, падносяць ім новую пажыву то зь Літоўцаў, то ад падсуседзяў. А Архіпу ўжо ці ня два дзясяткі гадоў мінула, як нічога не прыбыло.

Хто-ж спазнае-разгадае, аб чым шумяць-гамоняць дзьве вялікія сосны на літоўскім могільніку? Мо прыгадваюць імглу часоў мінулых, сьняць пра лепшую народную будучыню? А мо й запраўды ўсе тыя

людзі, каторыя адыйшлі, увасобіліся цяпер у гэтыя дзьве пышныя, у вярхох калматыя прыгажуні, каб хаця пасьля сьмерці напіцца сонца й мокрадзі, нацешыцца вобразам любай роднай зямелькі, бо за час гаротнага жыцьця ня было калі? А мо адно, каб нема вартаваць, тужыць па страчаным і нязьдзейсьненым, ды прыглядацца, што на патоптанай і зганьбаванай радзіме вырабляе «цывілізаваны» дзікун-прыблуда?

І ня бачылі сосны з могільніку за свой век аніразу таго, што аглядалі перад полуднем у гэны панядзелак. З усіх хатаў у літоўскай даліне, а найбольш з тэй, што блізка з краю вёскі сюды пад гацкі гасьцінец стаяла, пачаў плысьці народ. Як вясной сьцякае ў даліны сьнегавая вада, гэтак цяпер людзі, групамі й паадзіночку, рухаліся на могільнік. Сабраны ля Бахмачовай хаты гурт паволі сунуўся вуліцай, павярнуў на хутарную дарогу Якубава Васіля й паволі набліжаўся да могільніку. Перад аднаконнай каляскай чалавек ішоў ізь вялікім драўляным крыжам, а на возе стаяла даўгая сасновая дамавіна.

Яшчэ зраньня ў верхнім куце могільніку чатыры пары працавітых рук на зьмену рыдлёўкамі выкапалі глыбокі дол. Сонца, прабіўшыся праз густое гольле дрэваў, пасьпела ўжо высушыць і зрабіць сыпкімі дзьве горбы жоўтага пяску на яе ўзбочынах. Сонечныя праменьні намагаліся нават ускосна зазірнуць у дол. Птушкі, што гойдаліся на галінах і займаліся свайміі шчабятлівымі справамі ў шапках дрэваў, пабачыўшы цяперака, як расьце ўдоле надзіва малагаманлівая людзкая грамада, шмыгнулі ў суседнія лясы, або на стрэхі й клёны ў вёску. Пабудзённаму апранутая, босая, зь непакрытымі галовамі, хрысьцячыся на крыжы, асьцярожна ступаючы між густых, дзе-ні-дзе пазарастаўшых і зраўнаных зь зямлёю насыпаў могілак, людзкая рака гусьцела й шчыльнай сьцяной тоўпіліся ля сьвежае ямы.

Падцягнулася да варотаў могілак ужо тая асноўная працэсія. Затрымалі каня. Дамавіна лёкка й павольна гушкалася на мужчынскіх плячох, збліжалася да новае ямы. Чалавек із крыжам паволі ступаў наперадзе. Сьцяна людзей адчынілася, каб даць мейсца, дамавіна гладкім дном зраўнала гарбок пяску побач ямы, каб апошні раз затрымацца на сонечнай паверхні зямлі. Ёй да канца падарожжа засталося ня больш за тры метры адлегласьці.

Зьнялі века труны, паклалі побач. Сонечныя праменьні песьцяць цяплом чорнае адзеньне, пажаўцелыя рукі й твар нябожчыцы. Над

тварам нахіляюцца родныя - дзеткі й старыя - блізкія й далейшыя, са стомленых грудзей вырываецца, перш прыдушаны, пасьля неўтаймаваны голасны плач і прамаўленьне. А супыненая рака народу, то пераступаючы з нагі на нагу, то выцягваючы шыі, каб лепш бачыць, найбольш вымоўная сваёй маўклінёй. Апошні раз малаток скончыў забіваць века дамавіны. На зручна падкладзеных вяроўках паволі апусьцілася яна ўніз, і на века паляцелі першыя жмені сыпкага жоўтага пяску.

Калі малы, лысы, старасьцю паморшчаны чалавек урачыстым і ўзьнёслым тонам голасна зацягнуў: «Упакой, Госпадзі, на векі вечныя душу рабы тваей Алены», - тады із сотняў грудзей паплыло роўнай мэлёдыяй і ўзбуйнела:

Ве-э-э-чная па-а-а-а-мя-а-аць,
Ве-э-э-чная па-а-а-а-мя-а-аць,
Ве-э-э-чная па-а-а-а-мя-а-аць!

І не было між гэтага натоўпу ані прадстаўніка цывільнае ўлады, каб на вечны супачын правесьці ахвяру свайго грэшнага бяспраўя, ані царкоўнае, што кагадзе прамяняць манілася свае духоўныя абавязкі на два пуды жыта. І людзі гэтыя, голавалосыя, басаногія, у палатканых саматканых сукенках і сьвітках, у сваёй сьціплай прастаце былі ў гэны час, як рэдка калі, блізка Бога. Няшчасным у няшчасьці спагадлівыя, адклалі яны на сяньня прылады працы, пасьпяшылі сюды, каб выявіць усяму сьвету, што яны - адна душа, адзін маральна й духова здаровы арганізм, аб які вось ужо стагодзьдзямі плешчуцца й разьбіваюцца, каб разкласьці й зьнявечыць, чужыя варожыя хвалі.

Доўга жыць будзе тое сонечнае панядзелкавае раньне ў памяці Літоўцаў. Можа, у сваёй глуха-нямой дрымоце прыгадаюць калі аб гэтым дзьве пышныя сосны-каралевы, мо, жмурачыся з Гараватчынай адлегласьці, памяне калі гэнае людзкое мора сівастагодні асілак Архіп. А старэйшыя літоўскія жыхары, пазіраючы на тыя сосны на могільніку, будуць казаць сваім дзеткам:

- Відзіця вунь гэныя вялікія сосны на могільніку?

- Ага. Ну дык што?

- Дзіва, што яны такія пекныя вырасьлі. У іхных-жа драўляных жылах і наша бярэменная гаротніца Алена недзіка ўвасобілася.

- Якая гэта Алена?

- Ды тая, што яе чужы азьвярэлы лясьнік за ягады маладую й цяжарную зараньня на другі сьветы адправіў... Памілуй яе, Госпадзі...

ЧАСТКА ДРУГАЯ

I

Так, як Гараваткa была-б некамплектнаю бяз волата Архіпа, гэтак вёска Літоўцы была-б няпоўнаю без Васілёвага бацькі, дзеда Якуба. Вядома-ж, ня мог Якуб раўнацца з дубам-волатам гадамі. Але дзед быў для Літоўцаў такім самым завяршэньнем і прыкметай, як Архіп для Гараваткі.

Надта-ж каляровы й цяглавіты гэта быў чалавек. Колькі ён меў гадоў, ніхто напэўна ня ведаў. Хваліўся, што прыгон добра памятаў, а падчас паўстаньня Каліноўскага паўстанцам памагаў. Пасьля-ж, калі зусім у пер'е аброс, доўгія гады ў «маскалёх» каратаў. «Вялікі самадзержац» гэнымі часамі сваю ўжо растаўсьцелую матухну-імпэрыю пашыраў і многія якія непакорныя народы ў тым працэсе пашырэньня праглынуць намагаўся. Косткай у горле яны «самадзержцы» заселі, дык, каб далей у імпэратарскі страўнік гэную костку папхнуць, і Якуба ў збройную талаку паклікаў. Якуб, вядома-ж, ня вельмі-та наперад у гэным папіханьні пяўся, але нейдзе ў гвалтоўнай мітусьні неасьцярожна сваю левую нагу куды ня трэба выткнуў, дык і адкусілі яе аж па калена. Вярнуўся ў родную вёску ўжо старым і падношаным калекам. Пазнавата было жыцьцё будаваць, дык прыліп да аднэй зусім яшчэ не ў гадох удавы, дый сына Васіля нажыў. Жонку гадоў дзесяць таму пахаваў.

- Сколька табе, дзядуля, гадоў будзіць? - пыталіся ці раз дзеткі.

Якуб дзеткамі ўсіх у вёсцы клікаў, а з малечай надзвычайна гаманіць і забаўляцца любіў. Гаварылі некаторыя, што сам другое дзяцінства перажываў.

На такое пытаньне дзед Якуб, бывала, памарудзіць з адказам, скубане сваю кароткую сівенькую бародку, па-бацькоўску пагладзіць па галоўцы аднаго ці другога нямыцьку, зазірне ў зацікаўленыя вочы, дый кажа:

- А мне, дзетачкі мае, мусіць, ужо капы са дзьве, калі ня болей мінула.

Калі хто старэйшы, вуха наставіўшы, збоку стаіць, Якуб падміргне яму з хітрай усьмешкай, быццам тлумачыць: «Ты-ж, братка, знай, што для дзетак хто старэйшы, таго болі шануюць».

Дзеці пачнуць лічыць, тады колькі гэта будзе дзьве капы. Нярэдка Якуба на помач паклічуць, самі такой праблемы не асіліўшы, дык пачынаецца тады доўгая й пацешная гутарка.

Яшчэ ня так даўно - усяго ці пару год таму - як на тое ліха, раматус за дзедаву правую руку ўчапіўся. Мяркавалі, ці гэтым разам дзеду капцы будуць. Дзе там! Доўга-ткі крактаў і кешкаўся стары, нават нейкую поскудзь, што шаптуны яму нараілі, ужываў, руку ёй аблепліваў. Па нейкім часе глядзяць людзі й веры сваім вачам не даюць: раматус Якубаў як рукою зьняло. І ня дзіва, што казалі літоўскія:

- Надта-ж жывучы наш кульгавы дзед Якуб, ікраз як той дуб Архіп. Ніякая трасца яго ні бярэць.

У тоне гаворкі вычувалася дзіцячае зьдзіўленьне й зусім несхаваная пашана.

Хоць гэны раматус дзед Якуб здужаў, апошнімі гадамі менш рухлівым і актыўным стаўся. Радзей ад свайго падворку й малога кавалку зямлі, што яму па жонцы прыйшоўся, адлучаўся. Калі-ні-калі нямогласьць замінала яму ўпарацца з такімі простымі гаспадарскімі работамі, як адрэзаць ці пашчапаць калоду дрэва, ці вядро вады ў хату з калодзезя прынесьці. Шванкаваў і зрок. Як ні кажы, гады сваё робяць. Цяперака гэта ня тое, што раней бывала, калі руплівага й павярткога аднаногага дзеда можна было й блізка й далёка сустрэць: ён і на поле прыклыпае, і да суседа, і на гэты канец вёскі й на другі.

- Немач нейкая на мяне, дзеткі, каб яе макарэц спапяліў, напала, - крактаў ці раз дзед.

А надта-ж хацелася яму між людзёў быць. Любілі яго ўсе, за залаты язык хвалілі. Адно, спачувальна галовамі ківаючы, незнарок прыгадвалі, што часта дзед дзіваком прыкідываўся. Калі пачне ён аб

чым разказваць - паслухаць міла. А колькі-ж за свой век зьведаў, пабачыў, перанёс! Колькі зь сівой, для іншых недасяжнай, глыбіні часу мудрасьці чэрпаў. Меў аб чым апавядаць.

Асабліва гарнуліся да яго дзеткі. Казкамі дзедавымі заслухаўшыся, яны аб сьвеце божым забываліся, у Якубавым казачным жылі. Дый сам дзед, быццам тая жывая, усім наяве хадзячая казка, быў. Абступяць яго, слухаюць, раты паразяўляўшы, яшчэ й яшчэ просяць. Меў Якубаў язык дар апавяданьня.

- За гэты мой язык-даўгун, каб яго макарэц, дык і ў маскалёх мне лішкі пірападалі. Яфрэйтара ні даслужыўся. А такоя-ж багацьцейка маладых гадоў чорту нямытаму аддаў, - усьміхаючыся, жартаваў Якуб.

Першая й можа найважнейшая калізія між дзедам і польскай уладай адбылася падчас грамадаўскага руху. Быў ён тады надта рухавы й актыўны, ня з тых, што на цёплай печы бакі адлежвалі й плечы грэлі. Ня толькі што сам адзін зь першых у Грамаду запісаўся, але панамаўляў-пацягваў туды бальшыню мужчынаў зь вёскі. Із жанчынамі куды цяжэй было.

«Вы, мужчыны, ужо там палітыку рабіце, а наша дзела ля катлоў, гаршкоў ды сьвіней», - казалі жанкі. Давялося на іх рукой махануць.

Быў вялікі народны ўздым, былі цімалыя пляны. Ня толькі родную школу арганізавалі й талакой будаваць ля бальшака блізу чыгункі ўзяліся, але й іншым беларускае школьніцтва на ногі ставіць памагалі. Плянаваўся гурток мастацкае самадзейнасьці, раіліся, як пачаць каапэратыўную краму.

Не пасьпелі як сьлед працу разгарнуць, як тутака ім камунізм улады прышпілілі, ды коршыкамі на іх кінуліся. За Якуба, як ваўкі за авечку, ці ня самага першага ўчапіліся. Ня даў дзед спуску й добра-ткі тых чорных груганоў-паліцыянтаў, што завецца, да нітачкі прабраў. Разам зь іншымі дзеда дзьве пары на «пастарунку паліцыі панствовай» трымалі - зьмяніць погляды языкамі й фізычнай сілай пераконвалі.

- Дзетачкі мае, - крактаў, вярнуўшыся, Якуб, - гэта-ж паганцы, каб іх макарэц спапяліў, пячонкі мне чаго ні адбілі!

Разагналі паны Грамаду, зачынілі літоўскую беларускую школу ў прыватнай хаце, пачаты сялянамі зруб пры дарозе «владза гмінная» ўзялася дакончваць, дый у тых сьценах школьнага будынку цяпер сялянскіх дзеткаў «пальшчызнай» пачалі калечыць. Асеў дзед Якуб.

Але ненадоўга. Пачалося тое, што літоўскія назвалі «Якубавай самасеячнай вайной».

З гэнага шырокага сьвету, дзе Якуб ладны кусок сваёй маладосьці стравіў, прынёс ён дзьве асноўныя здабычы: цёмнарудую люльку з доўгім крывым цыбуком і навык дыміць зь яе ледзь не бесьперапынна. На тытунь, вядома-ж, не ставала ў дзеда грошаў. Узяўся ён гадаваць тытунь-самасейку. Тутака ўпоперак дарогі стануў дзяржаўны закон аб забароне прыватнае гадоўлі тытуню. Уся тытунёвая справа знаходзілася ў руках «панствовай» манапольке. Калі Якубу прыгадалі аб гэтым добразычлівыя людзі, дзед станоўка матнуў галавою й адгукнуўся гэтак:

- Ды пашла яна к чорту, каб яе макарэц, тая засмарканая Польшч! Загадаіць яна мне што можна, а чаго не. Як я гэттака малым басанож бегаў, дык яе яшчэ й смуроду ні было.

Літоўскіх курцоў па пальцах рук аднаго чалавека можна было палічыць. Мясцовая ўлада, гэта значыць пан солтыс Паўлоўскі ведаў, хто самасейку мог гадаваць і борзда шапнуў аб тым на чуткае вуха «адпаведных чыньнікаў жандовых». Неўзабаве да дзеда Якуба завітаў манапольны акцызьнік і зусім не пасьброўску пацікавіўся, адкуль бярэ ён тытунь із такім самародным водарам.

- Самасейка, паночак, - прызнаўся зусім сур'ёзна, ня міргнуўшы павекам, Якуб.

- Сам гадуеш?

- Ды якоя там, паночку, гадуеш, - разьвёў рукамі дзед. - Таму-ж іна, каб яе макарэц, завецца самасейка, бо само сеіцца; я от два каліва знайшоў, дык адно канчаю курыць, а другоя вуньдзіка яшчэ расьцець. От паглядзі, паночак, сам, калі ні лянісься.

Выцягнуў дзед зь кішэні свой тытунёвы капшук, разьвязаў раменны матузок, ды паднёс пад самы панскі нос.

- Фэ! - зморшчыўся нос, - які смруд!

- Ну от-жа, паночак - сам, мусіць, ня курыш гэткага сьмярдзючага зельля, - закончыў зусім нахабна Якуб.

- А мне гэта другое каліва пакажаш? - пытаўся акцызьнік.

- Чаму-ж не. Яй-Богу пакажу. Хадзі.

Завёў Якуб пана ў самы кут агароду, дзе між рэдкіх сланечнікаў росла вышэй за пас пышнае каліва тытуню. Акцызьнік агледзеў яго, пацікавіўся, ці няма дзе тытуню навокал, напісаў пратакол. Сказаў

Якубу, што за тое, што сам прызнаўся, гэтым разам яму даруюць правіну. Папярэдзіў, што калі дзе знойдзе тытунь, які «сам пасеіўся», дык мае яе вырваць і выкінуць, або яму, акцызьніку, перадаць. Выцягнуў з каранём тое каліва й забраў із сабой, як «рэчавы довад».

Задаволены вяртаўся ў мястэчка ўраднік, а ўсьлед яму рагатаў дзед Якуб. Ён асьцярожна расьхінуў густыя калапні й пралез у сярэдзіну, дзе любаваўся сваёй тытунёвай плянтацыяй. Смактаў дзед крывую люльку й пакеплівaў з Паляка.

- Каб мяне, каб яго макарэц, ды каторы такі паўшабэлак абхітрыў, дык ня мне тады люлькай гэты божы сьвет капціць.

Акцызьнік заглядаў і наступнымі гадамі. Пранюхаў дзедавы хітрыкі, - вядома-ж, не без дапамогі солтыса Паўлоўскага, - накладаў на Якуба грашовыя кары, якіх той ніколі не плаціў. Прабавалі сьцягнуць.

- Прападзі ты, нячыстая! Дзе ў мяне тыя вашы злоты, каб на вас бізгалоўя! Населіся, як тыя вошы на беднага мужыка, каб вас макарэц спаліў! - лаяўся дзед.

Крывая дзедава люлька рэдка калі спыняла дыміцца. Тытунь рос у яго ў шматлікіх, рэдка ходжаных, мейсцах: у гародзе й на полі, на сваім і на суседнім, нават і ў лесе. Смуродзіў Якуб самасейкай і сьмяяўся:

- Нашлася мне тутака засмарканая Польшч нейкая! Ды я ні такіх вуньдзіка на чыстую вадзіцу выводзіў!

Калі-ж часам акцызьнік занадта насядаў, калі паліцыя націскала, каб тыя штрафныя злоты спагнаць, тады дзед гарэзьлівым прыдуркам прыкідваўся. Назалялі доўга-ткі, ды нарэшце супакой далі. Пан солтыс Паўлоўскі - дарма, што раней «урадавым чыньнікам» пра самасейку наказваў - цяперака, калі пабачыў, што «родакі» зь дзедам самасеячную вайну прагуляюць, ставіўся да Якуба з большаю пашанай і талерантнасьцю. А Якуб, набраўшы гарту й адвагі ў тэй самасеячнай вайне, цяпер і «бінзінку»-запальнічку прыдбаў. Надакучыла-ж із крэсівам ужо поркацца, а запалкаў дзе набярэсься, калі за адны пачак трэба цэлае яйка аддаць. Дорага каштаваў на запальнічку ад уладаў дазвол, таму Якуб із запальнічкай крыўся, пры людзях заўсёды агня прасіў. Чаго добрага, тыя ўлады «засмарканае Польшчы» - каб іх макарэц перакаціў - возьмуць ды адбяруць.

II

Было душна. На небе каб табе дзе хмарынка. Сонца хілілася ўжо з поўдня. Янук, сам ня вымяркаваўшы, чаго й навошта, некуды йшоў. Быў у стане поўнага атупеньня. Выкінуты з будзённай рутыны-раўнавагі, жыў цяпер больш вобмацкам, чымся сьведама. Забойства маткі лясьніком перакуліла Янукоў сьвет дагары нагамі. Вялікая й балючая рана як сьлед не пачынала яшчэ гаіцца. Бацька, што сам, як адурманены, ледзь ногі валачыў, дазволіў хлопцу пабыць дома які тыдзень ці болей. Тыя Лазоўскага хвасты нідзе ня дзенуцца.

Янук мінуў загуменьне й меціў на Гараватку. Зрок ягоны затрымаўся на вялікай пышнай шапцы волата Архіпа адно бегам і папоўз далей на суседнюю сасну, ледзь пахілены вялікі крыж. Нейдзе голасна крычэлі гусі; аж заходзячыся, заядла брахаў сабака.

Абыякавы да ўсяго, паглыблены ў свой, хаатычны цяпер, нутраны сьвет. Янук ішоў. Раптам схамянуўся, стануў, як укапаны, і ад зьдзіўленьня вылупіў вочы: абапёршыся плячмі аб дуб-волат, супакойна дымячы із сваёй крывой люлькі, сядзеў дзед Якуб. Ужо каго як каго, а гэтага старога калекі малы Бахмач аніяк тут не спадзяваўся.

Дзедаў баразнаваты, але яшчэ румяны круглы твар, із малым шнарам наўскасяк пад левым вокам, зьнізу закончаны кароткай сівенькай бародкай, выглядаў тут у Архіпавым цяньку крумяненькім і куды маладзейшым, чымся ў хатнім змроку. Дзедава працёртая шэрая сьвітка была расшпіленая зьверху аж да паловы грудзей, а лысую галаву накрывала шырокая кепка з абгрызанай цэшкай. Мо якраз кепка найбольш спрычынілася да таго, што дзед нагадваў стары сівенькі чашчавік. Якім мізэрным і малым быў ён у параўнаньні з таўстым камлём дуба Архіпа. Правая нага была босая, а зь левага галоша выглядаў рудаваты, із тупым зялезным канцом, кастыль.

Кара старога дуба была добра падгладжаная рукамі падлеткаў і моладзі, якія тое толькі й рабіл, што стараліся ўзабрацца на старэчыя Архіпавы плечы. Рэдка каму ўдавалася. Камель быў зьнізу надзвычайна таўсты й роўны. Мэтраў, можа, сем ад зямлі тырчэла, як кукса, Бог ведае калі й кім адпілаваная таўстая галіна.

Блакітныя, прыплюшчаныя дзедавы вочы глядзелі дзесьці ўдаль. Хлапец стаяў, мецячы, што рабіць.

- А я даўна ждаў цябе, сынку, - марудным роўным голасам сказаў дзед.

- Га? Ждаў? - як быццам спрасоньня сказаў Янук.

- Так, сынку, так, знаў, што прыдзіш.

- Як гэта знаў?

Янук і сам ня ведаў, што яго прывяло сюды. Як гэта дзед мог на яго тут чакаць? Ці-ж лёкка было ўзабрацца яму сюдзы з кастылём? Нешта было тут таямнічага.

- Сядзь во каля мяне, пагаворым.

Янук сеў побач на камяні і ўтаропіўся ў сінюю смуглавасьць дзедавых вачэй, якія той жмурыў, калі праз густое лісьце Архіпа трапляў на іх яскравы прамень сонца. Вочы здаліся Януку такімі ласкавымі й спакойнымі, голас такім лагодным, што ён адчуваў ад дзеда бацькаўскую цяплыню. Ведаў Бахмач дзеда ў розных станах: у маркоце й весялосьці, асабліва калі той апавядаў дзеткам усялякія нябыліцы; ведаў яго ў гарэзьлівасьці й журбе, у злосьці і ў ласцы.

- Ага, сынку, відзіў я сягоньніка ўвосьні нешта такоя, што пазвала мяне да Архіпа, - працягваў супакойна дзед. - І ведаў, што трэба зь некім пагаварыць. А зь кім-жа? Ажно гляжу - ты йдзеш. Дык я й здаўмеўся, што гэта ніхто другі й ня мог быць, толькі ты...

- Чаму-ж я?

- Не тарапіся. Усё сваім часам.

Янук з ранейшага ведаў, што калі дзед не хацеў гутарыць, дык і спануканьнем яму ніхто языка не разьвяжа. Так і цяпер. Дзед адказаў не адразу. Ён паёрзаў левай рукой па вытаптанай вакол сябе зямлі, знайшоў галінку, адламаў кароткі кавалачак, папоркаў у люльцы самасейку й зацягнуўся. Пусьціўшы блакітны дымок, прымружыў вочы й адкінуў назад сівабародую галаву.

- Як гэта слаўна прытуліцца да старога Архіпа й так во пасядзець. Ён-жа мне - ці ты гэта знаіш? - як брат родны. Мы зь ім так даўна - божачкі, як даўна! - знаімся. Гэттака-ж я малы, як ты во цяперака, некалі бегаў і таксама, як вы, падшыванцы, пяліўся, - вочы на лоб - каб на самы чубок узабрацца. А ён, гэты Архіп, і тады паказваўся такі сама стары, як цяпер. Бог ведае сколька яму гадоў. Кажуць-жа людзі, што той вялікі князь, што на Гараватцы тут некалі замак пабудаваў, дык ён яго сваёй рукой пасадзіў. Даўна гэта мусіла быць, ой даўна. А відзіш, які пекны дуб вырас. Ні дарам-жа кажуць, што гэта на чужых прахах

ён жывець... От як слаўна, што тады ліпавіцкаму пану ні далі яго зрэзаць, каб яго макарэц...

- А ці знаіш ты, дзетка, што дрэвы сваю гаворку маюць? Вазьмі Архіпа. Услухайся, як ён ветру адгукаецца, як лісточкі ягоныя дрыжаць, як камель ягоны гамоніць. Эгэ, сынок, маіць ён сваю гаворку, маіць... Гэта-ж ён таксама, як і мы з табой. От што нямы толька. Каб гэта яму Бог голас даў, дык ці ты знаіш што ён мог-бы нам расказаць, га?

Янук паступова забываўся аб яўным і ўваходзіў у дзедаў таямнічы сьвет. Першы раз ад часу трагэдыі ў сям'і думкі ягоныя накіраваліся на іншы шлях. Гэты скаржанелы, векам парэпаны чалавек, як упэўнены правадыр, паволі, загадкавымі шляхамі, вёў яго некуды ў невядомае.

- Даўно-даўненька, сынок, на гэтай зямельцы сам наш народ гаспадарыў. Ні было тут дарог тады такіх, як цяпер, чыгункі гэнай вунь ні было, адны вялікія лясы былі. У лясох зьвера ўсякага вялікае багацьце было: і мядзьведзі, і рысі, ласёў вялікія сем'і, па рэках баброў стады, рыбаў плоймы, а ў дрэвах птушак поўна, ды ні такіх як цяпер, што драбяза самая. От быў у нашага народу свой адзін гаспадар, і ўсе чысьценька людзі яго слухалі. Князем ён быў. Меў замак пекны й крэпкі, моцную дружыну азброеных людзей. А зваўся той князь Гаравік. У гэтага Гаравіка ды былі тры сыны: вялікія, здаровыя, пекныя. Любіў князя народ за тое, што ён надта-ж добры быў. Ён зь людзей скуры ні лупіў, падаткаў вялікіх ні браў, а толька вымагаў, каб кажны прылажыўся як трэба ў дружыну йсьці ці дружыне запас усяго зрабіць. Бо, хоць князь і ня квапіўся на чужое, алі знаў, што з боку суседы ёсьцека, што на яго напасьці могуць, каб зямлю й людзей забраць, народ у ярмо запрэгчы. Дык от князь Гаравік найболі сваю дружыну мацаваў і ня меў міласьці да таго, хто ні хацеў памагчы ці, як трэба, дык зброю ў рукі ўзяць. А так сабе Гаравік пазваляў людзям вольна жыць, на зьвера паляваць, рыбу лавіць, дабро ўсякае на зямлі сеіць. Адным словам, каждаму воля была.

Да сваіх-жа сыноў Гаравік быў надта строгі. Ён каждага ваеннага рамясла навучаў, на паляваньні з сабой браў ды на ваенныя гульні. Думаў-жа, што, калі сам памрэць, дык яны будуць над народам гаспадарыць; трэба, значыцца, каб умелі разумна са сваімі й чужымі жыць, а калі трэба, дык каб і за сваё ў баі адважна пастаялі.

Паплыла пра гаспадарства князя слава далёка й шырока, бо пры ўмелай гаспадарцы і народ багацеў і князю самому ўдастатак было. Поўна ў засеках было, ды золата і ўсякага багацьця ў скарбніцы князёвай. Адным словам, чулі пра яго блізка й далёка. Свае лірнікі й дудары піялі пра яго й славілі яго, чужыя-ж на край і людзей зь вялікай прагавітасьцяй глядзелі й мячы вайстрылі.

Надумаліся тады гэныя прагавітыя чужнікі на Гаравікова гаспадарства напасьці, багацьці ўсе пазабіраць і людзей заняволіць. Сабралі такую вялікую сілу, што сьвет яшчэ такой ня відзіў, і на наш край паходам пашлі. А Гаравіковы ганцы, што па краёх стаялі, князю данесьлі, што вялікая сіла чужых людзей на яго ідзець. Па ўсім вялікім Гаравіковым гаспадарсьцьве зайгралі тады паходныя дуды й пачаў сплывацца да князя народ. А ён узяў усіх сваіх трох сыноў, вялікіх і малых ваенных начальнікаў, цэлую сваю дружыну ды пашоў тым на спатканьня.

Доўга яны йшлі, а калі із ворагам спаткаліся, дык той ужо - каб яго макарэц спаліў! - глыбака ў нашу зямлю залез, народ забіваў, дабро паліў і рабаваў. Вялікі, дзетка, сярдзіты й даўгі быў бой. Удужкі як схапіліся, дык болі як тры пары стараліся адзін аднаго пірасіліць. Галовы людзей як тыя снапы на таку пад цэпам клаліся, рэкі ад крыві пачырванелі. Сам князь Гаравік і два ягоныя сыны - найстарэйшы й наймаладзейшы - надта-ж адважна біліся, а пры іх і народ цэлы. Яны от як гэты дуб Архіп саўсім зь места ні сайшлі і ў крыві варожай былі чырвоныя. Толька сярэдні сын, калі прыйшла цяжкая варожая навала, дык ён струсіў і ходу з поля бою даў. Гэта нашым многа пашкодзіла, бо трэба было дзірку залатаць, за гэнага князёвага сына, што ўцёк, грудзьмі пастаяць. Алі ўсяроўна ворага адбілі, хоць вялікая-ж надта сіла свайго народу лягла.

Як вярнуўся князь дамоў із двумя сынамі ды дружынай і цэлым войскам, дык перш за ўсё Богу дзякаваў за тоя, што сілу ім даў. А тады князь зрабіў вялікая гуляньня. Усіх харобрых да сябе паклікаў, нагароды каждаму даваў і цалаваўся з каждым, як з родным братам. Княжы замак ад таго народнага гуляньня, мусіць, сем дней і начэй гудзеў. Толька ўжо як узнагародзіў князь усіх харобрых і двух сыноў сваіх пірад усім народам, тады пазваў таго сярэдняга сына, што струсіў на полі бою, ды дамоў уцёк.

І от, сынок ты мой, прывялі зьвязанага гэтага труса Гаравікова сына пірад чало самога гаспадара. А ён сядзіць пры стале, ды ўся сьвіта ягоная, усе ў баі загартаваныя пасьля сьвежай пірамогі. І кажа тады Гаравік сыну:

- Выпрастайся, трус! Калі ні асьмеліўся ты, як вой, на полі бою ворагу ў вочы глянуць, дык чаго-ж тады баісься глядзець у вочы сваім людзям? Ніхто-ж цябе за гэта ня зьесьць.

Падняў той дзяцюк галаву, алі цяжка было яму глядзець у вочы бацьку ды воям харобрым, бо ўсім вялікую ганьбу ён прынёс, крыўду зрабіў, калі плячо ў плячо ізь імі на полі бою ні пастаяў.

А князь тады яму кажыць:

- За тоя, што ты з поля бою ўцёк і другіх на нібясьпеку выставіў, на вялікую кару заслужыў. Ты сам гэта знаіш.

Сын апусьціў галаву й дрыжэў ад страху.

- Гэтыя мне сыны, - сказаў князь і паказаў на двух, што сядзелі ля яго з правага й левага боку. - А ты ня сын! За цябе многа народу нашага лягло, бо сам ты, як крот, у дзірку схаваўся дый цяпер ад страху дрыжыш. А ці-ж ня ведаў ты, што на гэтым сьвеця ня ўсё дабратой робіцца? Нікаторыя дабраты ня цэняць і толька сілу знаюць. Дык і мы так: каб жыць вольна, каб над намі чужак верху ні ўзяў, мусім сільнымі быць, а як трэба, дык і бараніцца.

Уся сьвіта ягоная, дый княгіня, што зь левага боку ля сына маладзейшага сядзела, дый служба навіт чула князёвы словы. Усе ждалі як гэта князь пакараіць труса-сына. Княгіня навіт сьлязу пусьціла, бо ведала, што муж ейны вялікі ў ласцы быў і надта-ж суровы ў караньні.

А Гаравік тады й кажа:

- Ты ёсьць маё роднае дзіця, маё цела й кроў. За тоя, што ты зрабіў, я цябе мушу караць галавой. Ты сам гэта знаіш. Алі Бог мне сьветкай ніхай будзіць, што я ў ласцы заўсягды быў болі шчодры, чымся ў караньні. Дык і я для цябе такім буду. Галавой цябе ні пакараю, а дам табе нагоду паправіцца. Дык от слухай: ты возьміш людзей і ўсё, што трэба, і пойдзеш адгэтуль у той бок, дзе заходзіць сонца. Будзіш ісьці тры дні й тры начы. Сярод лясоў там знойдзеш выгадная места, пабудуіш замак, зарганізуіш дружыну й будзіш гаспадарыць над часьцяй народу, што табе прыдзялю. Зьбярэш і навучыш сваю дружыну, ажэніся й заложыш сваю гаспадарку.

Толька-ж помні, што ад таго часу свайго гаспадарства будзіш бараніць сам, калі хто нападзець. Ніхто з нас табе на помач ня прыйдзіць так, як ты ні прыйшоў нам на помач на полі гэтага бою, ды ўцёк, як вялікі трус, якога я цяпер мушу цурацца. А калі-ж на цябе нападуць, дык ты ні абаронісься і ў баі ляжаш, дык будзіць тады твайму народу вялікая гора. Гараваць ён будзіць пад чужымі, аж пакуль зь яго ні народзіцца новы адважны воін, каторы чужых прагоніць ды людзям волю верніць.

Так загадаў князь.

І от даў Гаравік сыну таму людзей, што ў вайсковай штуцы добра зналіся, а таксама такіх, што будаваць умелі, даў коні і зброю, харчы, ды выслаў яго туды, дзе заходзіць сонца. Ішоў той сын трохі што ні бізь пірастанку тры дні й тры ночы, аж прыйшоў от сюды й задзержыўся тутака, дзе мы з табой на Гараватцы. Надумаўся тут замак свой будаваць.

Пагараваў ён тутака многа, пакуль замак збудавалі ды гаспадарку на парадак навёў. Можа гэта ад таго й пачалі людзі гэта места Гараваткай называць. Дык от гэты новы гаравацкі князь, як ужо збудаваў вялікі й пекны замак, дружыну сваю выдрасіраваў і добра на ногі паставіў, тады нагледзіў сабе дзеўку, таксама са свайго народу, ды ажаніўся. Нікаторыя дзівіліся, што ён так зрабіў. Трэба табе, сынку, ведаць, што тады князі толькі із княжнамі жаніліся, хоць і чужымі, а ён дык із простай сваёй. Дзяўчынка, казалі, была, як маліна. А жаніўся ён із сваёй, хоць і простай, таму, бо ўжо тады пазнаў мудрасьць жыцьця, а сама найболі дык тоя, што із сваім народам трэба быць, любіць яго трэба, за яго галавой пастаяць. Бо ніколі ні забыўся ён вялікага сораму, што нажыў, калі з поля бою ўцёк. Пёк той сорам яго, як перац у гарляку. І думаў сабе гаравацкі князь, што, калі ўжо час прыйдзіць, дык ня толька тое паршывае кляймо зь сябе крывёй змыіць, але яшчэ пастараіцца й славу сабе вярнуць, каб і бацька агледзеўся. Ды бацька скора ўжо памёр. Два браты ягоныя гаспадарылі пасуседзтву, алі нінадта каб яны дружна із сабой жылі, ні гаворачы каб ізь ім.

От жаніўся, знацца, гаравацкі князь, надта-ж пекную дзяўчыну ўзяў. У сваім замкавым дзядзінцы разам із новай улюбленай княгіняй дубок малады пасадзіў ды загадаў паліваць-даглядаць, каб вялікі рос і пекны быў. Мы - кажыць - тут як гэты дубок расьці будзем і ніхто нас зь места ні кранець. Гэты дубок і ёсьць от гэты самы Архіп.

Пачаў, адным словам, гаравацкі князь шчасьця пазнаваць. Думаў, што аціхла ўжо, вайны праклятай ня будзіць. У яго навіт дружына добра выдрасіраваная была, гаспадарка на добры лад пашла. Калі-ж нібясьпекі зьнікуль ні было відаць, дык памякчэў гаравацкі князь, ні такім пільным стаў і, мусіць, трохі ваенная рамясло закінуў.

А тыя, сынок, благія ворагі, што іх раней бацька Гаравік із двумя сынамі разьбіў, дык яны за гэты час пакрапчэлі, у поўсьць абрасьлі, клыкі зноў ім павырасталі, як тым ваўком, ды давай тыя клыкі шчэрыць, глядзець, ці збоку дзе ўварваць кусок можна. Відзілі-ж, што Гаравік памёр, што сыны падзяліліся й паслабелі, дык давай на гаравацкага князя напасьці. І зноў сабралі сілу людзей і сюды із боем прышлі.

І от разьбілі яны гаравацкага князя саўсім. Ніхто зь ягоных братоў яму на помач ні пасьпяшыўся, бо бацька сказаў, што бараніцца сам маіць. Сам гаравацкі князь із сваёй маладой княгіней як львы змагаліся. Яна яму зброю падавала. Калі-ж чужыя ў замак уварваліся, дык князь жывым ні здаўся. Забілі яго й пекную маладую княгіню ля таго самага маладога дуба. Замак тады зруйнавалі, дружыну гаравацкую на чатыры вятры разагналі, а народ у цяжкае ярмо запраглі і як над скацінай пачалі зьдзеквацца.

Так сталася, сынок мой, што пасьля й тыя другія два браты ні ўстаялі самі, як на іх напалі. Дык і прапала воля цэлага нашага народу. На памін толькі руіны ад добрых гаспадарак асталіся, а народ у нішчасьці аж да сягоньнішняга стогніць. Толька чужыя паны міняюцца, алі нічуць людзям ні лягчэіць, а яшчэ горы робіцца. І поўзаюць перад чужымі нашыя, як тыя чэрві, а яны з нашага поту, з нашага мазаля жывуць, нашу кроў смокчуць.

Толька от расказваюць, сынок, што тры начы ўвосені, неяк пад Дзяды, у Гараватцы кажды год бываіць вялікі бой. Князь гаравацкі з сваёй княгіней дый з дружынай стараіцца адбіцца ад ворагаў, а яны насядаюць. Нікаторыя кажуць, што гэта ўсе чэрці ўскапашыліся ды на нашага князя процьмай ідуць. Ён тады завець і завець сваіх братоў на помач, але ніхто ні прыходзіць памагаць чужнікаў ці гэтых рагатых нячысьцікаў-чарцей адбіваць. І кажуць яшчэ, што гэтак будзіць аж да таго часу, знацца, князь будзіць помачы клікаць, аж пакуль наша зімля зноў будзіць у руках сваіх людзей, - знацца, калі чужніка прагонім.

Дзед змоўк. Выцягнуў свой капшук із самасейкай, выстукаў аб канец кастыля люльку, туга напакаваў яе тытунём, прыпаліў ды зноў загледзеўся ўдаль.

- А вы, дзеду, відзілі гэнага гаравацкага князя ўвосень, калі той бой ідзець? - спытаў Янук.

- Відзіў я яго, сынку, дый чуў, як завець помачы. Алі ні знаю цяпер, сынок, наяву тоя было ці ўвосьні. А гэта, што такая здань здаецца й што тутака замак быў і гэткі князь быў, дык гэта сама чысьцюсенькая праўда, каб я з гэтага места ні сышоў. Як ты, сынку, падрасьцеш, дык табе гэта саўсім ясна станіць.

Янук яшчэ ўважней прыгледзеўся дзеду. Ён выглядаў нейкім далёкім і таямнічым. Жыў цяперака, відаць, у сваім, яму аднаму дасяжным сьвеце. Дзед гаварыў далей:

- Гэттака-ж недзіка ў гэтай зямельцы даўно спарахнелі косьці гаравацкага князя й княгіні. І от як я сяду, ды свае плечы да Архіпава камля прыпру, ды як прыслухаюся, так і чую, як ён аб гэтым мінулым гамоніць, тужыць. Яму па згубленай славе маркотна. Па волі яму, сынок, маркотна. Ён-жа вуньдзіка пасьля вісельнікам стаўся. От на гэтым суку, што ты відзіш, адрэзаны ды як кукса тарчыць, дык нашых найлепшых людзей мужыкоў чужыя вешалі. Я-ж сам гэта помню. Малы тады быў, от такі як ты цяперака. Відзіў, як вешалі, як усіх нашых людзей зь Літоўцаў зганялі, на катаргу й на глум выправілі...

- Калі гэта? - ажывіўся яшчэ больш зацікаўлены Янук.

Дзед маўчаў. Мусіць, дух злавіць хацеў. Зрок ягоны блукаў дзесь гэт далёка, невядома дзе. Можа быў ён цяпер у тэй сівой, аднаму яму вядомай, для нашага народу крывавай, мінуўшчыне. Мо дзед стараўся яшчэ раз зазірнуць туды, памяць адсьвяжыць, пазьбіраць у жмут кавалачкі-россыпы свае маладосьці, ды мо й з таго згрувасьціць лягэнду. Адылі гэта не была лягэнда. Дзед сам тое перажыў. Хоць яшчэ й не як узрослы, паўнапраўны сябра, што разам зь іншымі дзяліў цяжар-гора, але-ж як малы, кволы, на якім усё цяжка адбівалася, якому балела, які чуўся бездапаможным. І цяпер вось усё для гэтага маладога дапытлівага юнака, такога самага мо гаротніка, як і дзед быў калісьці, трэба было сабраць, наверх вылажыць-пераказаць, каб добра прыняў, стравіў, каб з гэтага ў будучыні ўзыйшло й закрасавала нейкае плённае зярнятка.

Янук разглядаўся. Над Захаруковай бусьлянкай закружыў колькі раз і потым сеў на яе стары бусел. Нехта тарахцеў у полі панарадам з драбінамі. На захадзе паказалася цёмная смуга.

- Паноў гэттака, сынок, была некалі чортава гібель, як і цяперака. Толька-ж цяпер яны падрабнелі, а тады дык куды багацейшыя былі, каб іх макарэц спапяліў. Ды іх рэдка калі відзіў наш брат. Сядзелі недзіка ў гарадох ці за граніцай, каб на іх пропасьць, пузы свае таўстыя гадавалі й гладзілі, як тыя парсюкі кормныя. Дабро, што нашым мужыцкім потам зарабленае было, прагулівалі, прапівалі, на благіх дзевак распускалі. А маёнткамі іхнымі дык аканомы ўпраўлялі. А дзіля таго, каб мужыкоў у послуху пры рабскай працы дзіржаць, дык яны цівуноў мелі.

Цівун - гэта такі выродак і ні дай Божа які гультай, што сам рабіць ня хоча. Дык от стаіць над табой і вякаіць, бізуна збоку дзяржыць і ім паганяіць. Ты тамака із касой, ізь сярпом, із сахой ці із цэпам - потам заліваісься, вочы наверх табе ад цяжкой работы лезуць - а гэта брыда вечна над табой, як той благі сярдзіты сабака ўсіроўна. Калі каму гэтыя цівуны ўжо так доймуць, што чалавек ня ўсілах трываць дый возьміць агрызьнецца, дык як груганьнё нінажорнае зьлятуцца ды так саб'юць, што дваццатаму закажаш, дух зь цябе вон. Ох білі-ж, сынок, ай-яй як білі!

У пана сабака большую цану меў, чым наш пан сярмяжнік. Ганялі-варочалі намі горы, як скацінай якой. Мужык сваёй зямлі ня меў, дык на пана мусіў пяць ці шэсьць дзён рабіць, а на сябе ні было калі. Дый сілы тэй ні было, калі зь цябе ўсе духі вышматаюць. З таго малога куска зямлі, што пан у варэнду дасьць э, дык калі быў час яго абрабіць, дык яшчэ й цару й пану трэба падаткі плаціць. Дзяцюкоў-жа мужыцкіх сілком у маскалі бралі. Прыедуць у сяло, забяруць дый пагоняць на край сьвету. Як адслужыць гадоў дваццаць пяць, дык глядзіш - маладым і здаровым пайшоў, - а старым і саўсім зношаным верніцца.

Я знаю сынок, бо сам служыў. А там-жа такія нелюдзі - ні дай ты, Божа. Як у чым малым правініься, дык так бізунамі сьсякуць, што ня толькі зоры ўвідзіш, алі, здаецца, жывым пад зямлю лез-бы. Гэта шчасьлівы той, катораму ні пападзець. Ды такіх мала ёсьць. Мне папалося, сынок, от паглядзі.

Дзедаў голас дрыжэў. Нязграбнымі старэчымі пальцамі ён расшпіліў сьвітку ды сьцягнуў на шыю споднюю шэра-кужэльную кашулю.

- Зайдзі ззаду, паглядзі на плечы, сынок.

Янук устаў, зірнуў на дзедавы плечы й жахнуўся. Скура ўся была ў шнарах-пісягах. Яны крыжаваліся наўскасяк. Януку няцяжка было ўявіць, што заміж гэтых, цяпер загоеных, жаўтаватых рубцоў, былі некалі крывавыя барозны. Як-бы яму мову заняло, хлапец, ні слова не сказаўшы, ізноў сеў на камень.

- Казалі, сынок, мужыкі так: прыгон - дух зь цябе вон. Дый найгоры, што цар маніфэст зрабіў і кажыць: я вам, мужыкі, зямлю дам. У паноў працаваць ні будзіця. Ну і даў. А за тую зямлю дык трэба было вялікую сілу грошы плаціць. Дык і астаўся мужык у панскім кішані. Гэта-ж проста зьдзек быў з нашага брата. Адным словам, да такой бяды давялі, што людзі ў адчай кінуліся. І от тады паўстаньня пачалося. Усе, як усіроўна згаварыўшыся, надумаліся раз і наўсягды з гэтым пеклам скончыць...

- Гэта, дзядуля, што ў тысяча восімсот шэсьдзісят трэцім годзе было?

- Яно, сынок, яно.

- Дык аб гэтым нас у школе вучылі. Тутака ім Каліноўскі вёў, - памог ізноў дзеду Янук.

- Так, сынку, гэта той самы. Толька-ж тады ня ўсе зналі, хто ў галаве быў, ажно пасьля, як яго павесілі, дык народ дачуўся. А тады, як пачало ўсё як у катле кіпець, дык усе людзі па сваіх мястох і хто чым мага: хто касой, хто тапаром, хто цэпам, а каторы стрэльбу меў дык шчасьлівым быў. Дык во гэдак і кінуліся на паноў ды маскалёў. А калі войска й казакі прыйшлі ім на выручку, дык нашаму беднаму брату яшчэ патроілася работы. Цяжкоя-ж гэта было змаганьня, сынок, ой цяжкоя. Наш брат ніабучаны быў, болі крыкам чым крэпкай рукой маніўся браць. А дзе-ж ты проці войска ўстоіш...

Сколька гэта народу, хаты курныя пакідаўшы, пановы палацы із дымам пускалі, у лясох гнязьдзіліся, ад войска й казакаў хаваліся. Проста дзіва дзіўная. Здаецца, чалавек наш такі спакойны, Богу мілы, працавіты. А ўжо так даелі, так дапяклі, што азьвярэў, на гэтых катаў як воўк із клыкамі кінуўся. Ды дзе ты там рады дасі. Маскалёў чортава гібель панапаўзала, павярнуцца ні было дзе. Страхоцьцейка, сынку,

што выраблялася. Знаю я ўсё гэта, бо во такі, як ты цяпер, быў і нашым людзям весьці і ежу насіў. Мы малыя, дык да нас ні чапіліся. От разгледзім, дзе якоя войска, што яно робіць, і ды данясём сваім, што па гэтых вялікіх лясох крыліся. А дома толька самыя старэйшыя, калекі ды дзеткі малыя былі, а такія, што сілу ў руках мелі, дык усе ваяваць выйшлі.

Мусіць, цэлы год так было, а тады маскалі так прыдушылі, што ні было куды дзецца. Здаваліся. А ў тых міласьці ні было. Гэты вешаціль, што Мураўёў зваўся, дык страх што нарабіў: усю зямлю трупамі заваліў і крывёй заліў. Во тутака на гэтым Архіпавым суку было трох, што мужыкамі камандавалі і што іх ў лесе злавілі дый павесілі. Адзін ужо старэйшы, што галавой быў, дык гэта наш вясковы мужык быў, Іван Карпук зваўся. Ягоную сям'ю на атап ды ў Сібір, жонку й двоя дзетак пагналі. Значыцца, гэтага Карпука й двух яшчэ, каторыя памагалі, прыгналі сюды пад Архіпа ізь зьвязанымі рукамі, тады сагналі ўсіх людзей, што толькі дзе жывоя было, каб усе прыглядаліся, дый павесілі бедных. Ніхай Бог дасьць ім царства нябесная! - перахрысьціўся дзед.

Памаўчалі.

- Ну й што далей? - спытаў Янук.

- Загадалі, каб ніхто іх ні чапаў. Яны, - кажуць - маюць гэттака на Архіпавым суку вісець. Так гэта для пастраху зрабілі, каб людзі маскалёў помнілі. А як-жа ты іх ня будзеш помніць? Яны-ж у нашай і другіх вёсках стаялі й выраблялі што хацелі: п'янствавалі, дзевак маладых насілавалі, над людзьмі зьдзекваліся. Ой гора-ж вялікая, ні дай ты Божа, на народ наш было прыйшло. Баяліся людзі ценю свайго, а многа каторыя то ў норы пазашываліся й ні вылазілі, або ў лясох глыбокіх.

От, значыцца, віселі тыя тры паўстанцы тады цалюськую ноч і другі дзень. А відаць дык яны здалёку былі. Аж на другую ноч іх ня стала. Толька раніцай агледзіліся маскалі, што нехта пазабіраў іх і сук во гэты, надта таўсты, што цяперака як кукса тарчыць, адпілаваў. Гэта ўжо многа часу пасьля дазналіся мы, хто зрабіў. А гэта былі вясковыя дзяцюкі, каторыя ў лесе крыліся. Дык забралі яны павешаных паўстанцаў уночы, завязьлі й закапалі ў леся, а з таго Архіпавага сука здаравенны крыж зрабілі й над курганам паставілі. Той курганок і

цяперака ў леся ёсьць. Калі хочаш знаць, дык ён там на Выгар як ідзеш, пірад узбалоткам. Знаіш, дзе гэта?

- Гэта блізка ад сьцежкі?

- Ні так далёка направа.

- Я тамака нідзе крыжа ні відзіў.

- Дык німа цяпер, сынку. Крыж даўно згніў і заваліўся, толька на магіле вялікі плоскі камень ляжыць, і на ім напісана, што гэта паўстанцы. От, калі паглядзі, дык, пэўня, знайдзіш.

- Трэба будзіць пашукаць, - сказаў Янук.

Смуга на захадзе многа пашырэла. Пякло. Часам чуваць быў далёкі глухі гром.

- Надыходзіць бура, дзядуля. Чуеш, як грыміць? - прыгадаў Янук.

- Чую, дзетка, чую. Ніхай даець Бог дажджу, зімля даўна піць просіць, - ківаў дзед галавой і ўзноў узяўся набіваць люльку.

- Дык можа-б мы пад дом, дзеду, га?

- Ні тарапіся, сынок. Можа во яшчэ бокам пойдзіць.

Памаўчалі. Ізноў загрымела, гэтым разам бліжэй і галасьней. Заходні кавалак захмаранага неба перашылі раз і другі разгаліненыя маланкі. Янук думкамі вярнуўся да таго, што распавядаў яму дзед. Як на дзіва, палякчэла на сэрцы. Вялікае народнае гора, аб якім гаварыў дзед, зьлілося-зьмяшалася ў хлапцовым уяўленьні зь ягоным прыватным горам, і гэтае першае як-бы паглынула-аблекчыла апошняе.

- І от відзіш, сынок, сколька крыві сваёй ні пралівалі людзі, сколька ні папаявалі, пападужаліся, усіроўна рады ні далі. Ярмо, як было, гэтак і асталося. Прыгону німа, нікаторыя і ніблага са сваёй зямлі жывуць, ну алі бальшыня людзей, каторыя бізьзямельныя, дык як гаравалі так і гаруюць, як рабілі на паноў так і робюць цяперака. Нічагуткі ні зьмянілася. Усе найлепшыя землі пазабіралі, ты на іх працуй, а яны цябе горы за свайго сабаку маюць. Паткніся куды, дык ён із табой ні палічыцца каторы. От як і тваю матку пакойніцу... Гэта-ж такая залатая душа была: у яе і рукі да працы й галава на плячох. Каб-жа яе, а то й бабку ейную помню вуньдзіка. Алене гэта было жыць ды пажываць, дзетак гадаваць, а ні сырую зямлю парыць так рана...

Янука хтосьці зноў ціснуў-душыў за горла. У вачох накаціліся сьлёзы.

- Дык от табе гэты галадранец - каб яго зімля наша сьвітая ні насіла, адкуль ён узяўся! - за ягадзіну застрэліў.

Янук ня вытрымаў. Сьлёзы зноў паплылі гарохам. Адхінуўўся ад дзеда, каб скрыцца з плачам. Першыя хмары ўжо закрылі сонца а на захадзе каціўся гром.

- Ні стыдайся, сынок, сьлёзаў, ні адварачвайся ад мяне, - сказаў дзед Якуб. - Плачу німа чаго стыдацца. Гэта празь цябе ўсё наша гора плачыць. Як трэба, дык і паплакаць трэба. Толька от цэлы час каб ні плакаць, бо гэта ні памагаіць...

- Гэта ты, дзядуля, вялікую праўду кажаш...

- А як-жа, сынку. Або вазьмі гэтага папа Абухава. Ну, гэта-ж ня поп, каб яго макарэц, а сатана. Каб табе мало было, а то свайго ні знаіць дзе дзяваць, а такую цэну закаціў - два пуды жыта. Тутака мала сказаць, што ён зрабіў не пахрысьціянску, а на гэткага чалавека дык проста ну пятлі шкада. Але што яму нашы людзі. Ён-жа таксама маскаль, каб яго макарэц спаліў! Каб гэта свой, ды свайму спагадаў-бы, а гэты, дык паном і гэтым меншым гнідам на руку йдзець. Смокчуць наш пот і кроў, сынок, ой як смокчуць!

Старэчымі сіняватымі пальцамі левай рукі дзед згроб жменю зямлі й паказаў яе Януку.

- Відзіш, сынок? Гэта-ж наша родная зямелька. Здаецца, от, каб яе паціснуў добра, дык зь яе наша кроў і пот пацяклі-бы. Яна-ж наша карміцелька. І калі ўзяць якоя хочаш права, асаднікі, папы, ксяндзы, чыноўнікі - дык гэта-ж усё чужыя п'яўкі. Яны з нас сокі п'юць і нам на ногі стануць ні даюць...

Янук глядзеў на выцягнутую дзедаву із жменяй зямлі, і цяпер яму ўсё стала ясна. Паклікаўшы на помач багатую жыцьцёвую навуку, дзед вельмі драматычна й умела вытлумачыў малому Бахмачу асноўную жыцьцёвую загадку, узьвёў яго на зусім новую мяжу. Адно ў маладой юнаковай галаве нарадзілася цяпер шмат новых пытаньняў.

- Чаму вы, дзеду, мне гэта ўсё расказваеце? Чаму мне, а ні каму другому?

Дзед адказаў не адразу. Перш за ўсё ягоная левая рука высыпала жменю набранае зямлі, тады ўзялася памагаць правай, каб ізноў дыміла ў люльцы самасейка. Хмары на небе буйнелі, шырокай дзяругай абклалі ўвесь заходні небакрай, яшчэ ямчэй каціліся грымоты, далёка за Ліпавічамі й Гацямі зіхацелі маланкі.

- Ты, сынок, цяперака вялікая гора маіш. А гэткую цяжкую й балючую праўду дык толька той можа асягнуць, хто сам цяжка

церпіць, хто вялікі боль нясець у сэрцы. Ты-ж, сынок, дай Божа, каб на разумнага чалавека вырас. Ці-ж я, дзетка, ня віджу, як ты стараісься вучыцца? Я-ж ні сьляпы, хоць, можа, каторыя й думаюць, што я прыдурак які. Алі-ж я віджу. Дык от і мне ты на вока папаўся. Ты падрасьцеш, навучысься; можа, калі ў людзі пойдзіш. Дык тоя, што я табе расказаў, паможыць табе разабрацца ў жыцьці: што, як і чаму. А калі разьбярэсься, сваю добрую галаву на плячох будзіш мець, дык тады будзіш знаць, што рабіць. Бо помні, сынок, што доўга так быць, як цяперака во ёсьць, ня будзіць. Сьвет мяняецца. Ужо сколька я гэтых піраменаў відзіў. І прыдзіць яшчэ, можа, такоя, што сьвет і ня сьніў ніколі. Будуць яшчэ вялікія пірамены, ой вялікія. Тады можа й тоя, што я табе расказаў, прыпомніш.

Дзед змоўк. У вачох Янука зрабіўся ён такім самым таямнічым, як і спачатку, калі пачынаў зь ім гаманіць. Колькі-ж ён даў-бы, каб мог зазірнуць у дзедаву галаву й вымяркаваць, што ён думае, чаго яшчэ ня выказаў, а для сябе затрымаў.

- Ну дык, можа, сынку, пойдзім тады, каб на нас бура тутака ні навалілася. Дай мне, сынку, руку, устаць памажы.

Ішлі паволі. Дзед часта паглядаў уверх на захад ды ўголас дзякаваў Богу, што сабраўся прагную зямлю папаіць. Побач моўчкі йшоў Янук. Ён думкамі ўсё перабягаў, мерыў тыя загадкавыя шляхі-дарожкі, якія адкрыў сяньня перад ім гэты закарчанелы стары. Больш не турбаваў дзеда роспытамі. Спадзяваўся, што да гэтага будзе яшчэ нагода.

У той час, калі вецер наважыўся скалатнуць і старую шапку волата Архіпа й пазакасіць чубы каторым літоўскім стрэхам, ня ведаў дзед Якуб, на якую ўрадлівую й плённую ў будучыні глебу кінуў ён сваё зерне. І не здагадваўся, асьцярожна ступаючы побач дзеда, юнак, які вялізны скарб атрымаў ён у спадчыну ад гэтага старога гаротніка.

III

Бог ведае, калі ўцёрся ў Літоўцах такі звычай, што бытаваў шырака на нашай Бацькаўшчыне. Прыйдзе, бывала, Васіль да Сьцяпана ў які будзённы дзень за патрэбай: пазычыць чаго ці што

выпрасіць. Прывітаюцца, гутарку аб гаспадарскіх справах завядуць. Калі Васілю й Сьцяпану ніякая праца ня рупіць, дык і гутарка тады бывае павольная, разважная, із раскошнымі перапынкамі, каб-жа гамонячы, думкі да посьпеху не спанукаць. Калі-ж час бывае гарачы - жніво, касавіца, ці яшчэ што - дык гаспадар адразу здагадаецца, што візытар недарма ходзіць. Ды ўсяроўна, ані Васіль адразу ня выкажа свае патрэбы, ані Сьцяпан ня будзе прынагляць яго да гэтага. Ужо няхай там зерне з каласоў сыплецца ці мурог перасыхае, а пагаварыць-жа трэба, чалавека гнаць ня будзеш. Адно, у гэнай гамонцы Сьцяпан намагаецца адгадаць, ці ў Васіля патрэба малая, ці вялікая. Прыкметай можа быць Васілёў саладжавы голас, лісьлівая ўсьмешка й шмат іншага.

Калі Сьцяпан мяркуе, што даволі ўжо часу зглумілі й трэба канчаць, тады, зручны падабраўшы момант, скажа Васілю гэтак:

- Сам-жа, пэўня, ні так сабе ходзіш?

Васіль з паўслова зразумее, што гэта сыгнал, каб выявіў мэту свае візыты. Зноў-ткі ня скажа адразу, што «хачу тоя й гэна», а кружной дарогай пачне, перш выявіўшы дэталёва прычыны, чаму «тоя й гэна» хоча, дый прыабяцае, калі аддасьць ці іншым чынам адплаціць. Адно ў выпадку надта наглае патрэбы гэткія нормы захаваньня й гаворкі не трымалі.

Людзі літоўскія ведалі аж занадта добра, што «ні ў вадзін дзень Бог сьвет сатварыў» і што «нікога зь языком ні падгоніш». Тое, што чалавек патрабуе час, каб выказацца, памяркаваць, якімі весткамі падзяліцца, было да такое ступені нармалёвым, як дзённае сьвятло ці ночная цемень.

Выняткам у Літоўцах, што часта не трымаўся прынятых нормаў быў сам «дзіравы шляхціц, пан солтыс» Паўлоўскі. Ужо калі, бывала, ідзе Паўлоўскі па вясковай гразкай ці сухой вуліцы, дык адразу відаць, што гэта, скажам, ня нейкі стары карцёжнік Сымон Пятух, а сам нозьбіт улады «паньства польскага».

Пан Паўлоўскі - гэта аўтарытэт, які любому чалавеку бачна ў высока паднятай і накрытай фанабэрыста-зухаватым капялюшам цёмнарусай галаве, борздым кроку, у кароткім, адрывістым і аўтарытэтным голасе пры вітаньні сустрэчных, а найбольш, дык у добра-ткі абшмулянай скуранай торбе пад пахай. Ня тое, каб Паўлоўскі наўмысна фарсіў сваім аўтарытэтам там, дзе непатрэбна.

Калі ўжо пра франтаўство гаворыцца, дык тут пан солтыс, рачэй, меў-бы наўвеце сваё дзірава-шляхоцкае паходжаньне.

- Што гэта такоя важная ён носіць у гэнай сумцы? Пару сьвісткоў калі людзям раздаць, дык сумка яму яшчэ трэба, - сьмяяліся літоўскія.

Калі дзе нават людзі на полі ці ў гародзе працай занятыя, а пан солтыс ім «памажы Божа» скажа, дык тыя, каму гавора, па ягоным голасе й манеры адчуюць, што гэта ён больш з ласкі, чым з дабрасуседзкага зычлівага абавязку робіць. Такі ўжо зь дзіравага шляхціца быў начэльнік, што ён гэты свой уладна-аўтарытэтны голас лічыў неабходным заўсёды перад вясковымі дэманстраваць, каб ведалі, што ён «ня хрэн сабачы» й ня кожнаму панібрат.

Гэтак вось завітаў пан солтыс у Пракопаў двор у сераду вечарам, два дні пасьля паховінаў Алены. Пракоп пры карыце паіў Чарнулю, ды мерыў вокам даёнку, што вісела на паркане.

Кінуў Паўлоўскі кароткі «добры вечар» і аб нечым, для прыліку, забубнеў пад носам. Пракоп не адказаў на прывітаньне й глядзеў на солтыса недарэчнымі вачамі. Думкі ягоныя былі ў іншым баку. Было аб чым думаць. Гаспадарка цяпер уся на ягоных плячох. Прабаваў Міколу да печы прывучыць, каб хоць якую капусту ці крупы зварыў, сьвіньню й парася дагледзіў. Слабая зь яго помач, дый здароўе ня тое, каб матку заступіць. Памагала Кацярыніна Надзя - то яна ў печы выпаліць, то карову падоіць, то што іншае. Але-ж помач гэта была прынагодная. Так і неразьвязаным было пытаньне: як жыць-быць, што рабіць?

Цяпер перад Пракопам стаяў чалавек. Нешта нутранае адпіхала яго ад гэтага «дзіравага шляхціца». У памяці добра засвоілася нялюбая постаць із зухаватым капялюшом, фанабэрыста паднятай галавой. Гэта той, што памагаў тым асноўным прагавітым прыгнятальнікам скубсьці такіх, як ён, Пракоп; гэта шчупальца таго вялікага паразіта, што ўпіўся ў тваё цела й душу - смокча, ратунку няма. Апэтыт паразіта расьце, а вось гэты малы смактунок - адно калі-б паразіт загадаў яму - пачне ўпівацца ў новы кавалак акрываўленае мякаці, каб самому на тых соках узбуйнець дый уверх, у галоўны арганізм гаспадара-паразіта, пажыву перадаць.

Калі глядзеў цяпер Пракоп, пры карыце стоячы, на гэтага атлусьцелага й самазадаволенага шляхціца, у ягоным уяўленьні побач пана солтыса выраслі два чалавекі ў чорным. На іх зіхацелі гузікі, а

шапкі аздобленыя былі каранаванымі птушкамі. Нейдзе поблізу іх мітусіўся руды камлюкаваты забойца, пры ім шчэрыў зубы вялікі ваўчар. Прыплыла ды з новай сілай разбушавалася ў сялянскіх грудзёх ледзь стрыманая злосьць, пацякла зусім сьвежая рана.

А той гаварыў:

- Паліцыя загадала, каб ты на пастарунак прыйшоў?

Дык вось яно што. Гэныя людзі ў чорным, ізь дзярлівымі птушкамі на шапках, клікалі яго да сябе, каб пазьдзекваццa.

- Скажы, што ні прыду.

Пракопаў голас быў шорсткі й цьвярды.

- Сьцягнеш ты бяду на сваю галаву, Пракоп. Я табе раю...

Пракоп ня даў пану солтысу скончыць.

- Ты мне раіш! Хто цібя просіць? Ня друг ты мне, ты цюцька іхны! Ты во брэшаш, як табе загадаюць. З майго двара іздзі! Зараз! Пірадаў і добра. Ідзі, кажу!

Апошняе было сказана такім загадна-валадарным голасам, што фанабэрысты пан солтыс ажно зьдзівіўся. Патупаў на мейсцы, маніўся яшчэ раз рот разінуць, але, сустрэўшыся з Пракопавым зрокам, завярнуўся й пайшоў. Нават не засьвістаў, выходзячы з двара, як звычайна звычку меў.

Ужо прыцемкам забегся Пракоп да швагры й перадаў яму навіну.

- Дурны будзіш, калі пойдзіш. Каб іх зямля ні насіла! Жонку забілі й яшчэ чалавека цягаць хочуць, каб сабакі трыбухі вашы цягалі!

На другі дзень надвечар пасьля солтысавай візыты аж заходзіліся ад залівістага брэху ўсе літоўскія сабакі. Як змовіўшыся, гулкім лямантам праводзілі яны Мэндліка й Вадзімскага да Пракопавай хаты. «Шамуль-шамуль», - усьлед прычікільгала Кмітава Аўдоля, а непадалёк ззаду, каб не застацца - Піліпава Аксеня. Калі паліцыя ўвайшла ў двор, на вуліцы было ўжо колькі жанок і дзяцей. Мужчыны, абуджаныя агульнай цікавасьцю, усё яшчэ цёрліся ля сваіх двароў, рэдка каторыя памкнуліся ў Бахмачоў бок.

Нельга сказаць, каб паліцыя была навіной у вёсцы. Найбольш старога Бурака аблюбавалі, каб пацягнуць яго за язык і паспрабаваць што пра сына Сабакевіча выпытаць; іншым разам прыяжджалі колеры комінаў аглядаць і пах прыбіральняў нюхаць. Калі колер і пах панскім насом ды вачом даспадобы не прыходзілі, рады карныя пратаколы

пісалі, каб пасьля можна было ізь сялянскіх пустых кішэняў «злотыя» вывуджваць.

Пракоп быў у гумне й выграбаў з-пад паветкі леташнюю цьвілую салому. Разаслаў рэзьгіні, клаў на іх падгнілую салому, каб у хлеў на подсьцілку занесьці. Ён пачуў, як у вёсцы залівaліся брэхам сабакі, абапёр аб шуло варот граблі й зірнуў у бок вуліцы. Ля прысадаў мільганулі на ровэрах дзьве апранутыя ў чорнае фігуры. Бахмачу ня трэба было падказваць, хто гэта й да каго прыехаў.

Стаяў задуманы. Відаць, не адчэпяцца ад яго. Чаго-ж яны хочуць? Прыгадаліся ўчорашнія швагравы словы: «каб сабакі трыбухі вашы цягалі...» От ня могуць-жа пакінуць у супакоі чалавека, наўмысьля калупаюць сьвежую рану.

Бахмач туга зьвязаў гужом у рэзьгінях цьвілую салому, закінуў на плечы. Калі выйшаў з гумна, насустрач яму бег Янук.

- Тата, паліцыя!

- Віджу, ні сьляпы-ж я.

Мэндлік і Вадзімскі былі ў панадворку, глядзелі ў гумно, адкуль набліжаўся Пракоп. Ён паволі ўвайшоў праз адчыненыя Януком рыпучыя вароты ў двор, паставіў сваю ношу ля варот, што ў хлеў, і падыйшоў да візытароў.

- Чаго гэта, паночкі, ад мяне хочаце?

- Табе пан солтыс Паўлоўскі наказваў, каб да нас на пастарунак зьявіўся? - спытаў шурпатым голасам Мэндлік.

- Быў тут учора.

- А чаму-ж ня прыйшоў?

- Німа часу па вашых пастарунках цягацца. Той бандзіт жонку маю забіў, дык чаму яго ні цягаеце? Чаго вы да мяне прыліплі, як смала якая? Што вам трэба?

Вадзімскага твар успыхнуў чырваньню, і ён нешта памкнуўся сказаць, але Мэндлік яго стрымаў, гаворачы:

- Чакай. Можна ўсё гэта палагодзіць халоднакроўна.

І тады да Пракопа:

- Пане Бахмач, мы хочам, каб вы разумелі, што мы вас ня зьбіраемся крыўдзіць. Мы хочам толькі сьпісаць акт, як і што сталася. Пан Бжончэк нам заявіў, што вы на яго кінуліся, і што ён у самаабароне ўхапіўся за зброю...

- Каб яму так лёкка на тым сьвеця было, як ён праўду кажыць, вылюдак!

- Лаяцца ня трэба. Вы раскажыце нам, як было, мы запішам, вы падпішаце й квіта будзе. Калі са свайго боку вы захочаце аскаржыць пана Бжончка й падаць на суд, дык гэта ваша права. Хоць я не бачу прычыны. Вы адмовіліся паказаць талон на ягады, бо вы ня мелі, дык ён мусіў прыцягнуць вас да адказнасьці. Але-ж я ня думаю, што ён мусіў забіваць. За гэта вы маеце права яго цягнуць на суд.

- Суды вашы, - махнуў Пракоп рукой, - астатнюю кароўку збудзіш і голы-босы пойдзіш, пакуль праўды ў вас даб'есься. Знаю я суды вашы.

- Бяры, Адась, пішы, - загадаў Мэндлік Вадзімскаму. - Дзе тут прысесьці? - спытаў ён Пракопа, а той кіўнуў галавой на лаўку, што ля паркану. За брамай на вуліцы стаялі жанкі й колькі дзяцей ды прыслухоўваліся, што гаварылі ў панадворку.

Вадзімскі сеў на лаўку, выцягнуў з рудой торбы паперу й самапіску, паставіў на фармуляры дату й чакаў.

Мэндлік пачаў выпытвацца Пракопа ад прозьвішча й імя, а пасьля прыйшоў да галоўнага: як усё адбывалася. Пракоп расказваў не без хваляваньня. Ужо, мусіць, соты раз перажываў тую страшную сцэну ў лесе. Скрыпнулі ў сянёх дзьверы, зьявіўся побач Пракопа й стаяў моўчкі швагра. Пасьмялелі й абкружылі паліцыю жанкі, у тым ліку й Кацярына з Надзеяй.

Пракоп расказваў пра само забойства даволі абшырна, а Вадзімскі запісаў усяго тры сказы. У Бахмача нарадзілася падозра, што ён мог што перакруціць. Калі Мэндлік запрапанаваў падпісаць Пракопу акт, селянін узяў яго дрыжачай рукой. У вачох мітусіліся літары. Ужо зьмяркалася.

- Янучок, прачытай ты, што яны тут напісалі, - папрасіў Янука.

З напісанага Вадзімскім вынікала, што Пракоп з Аленай зьбіралі ў «панствовым лесе» ў нядзелю маліны. Калі лясьнік Бжончэк, сустрэўшы іх, запатрабаваў талон, Бахмачы ня мелі чаго паказаць. Згодна Пракопа, Бжончэк загадаў здаць ягады й калі замарудзілі, хапіўся за зброю. У гэны час заступілася за Пракопа Алена, і лясьнік стрэліў, забіваючы яе на сьмерць.

Пракоп узяў напісанае Вадзімскім, памарудзіў крыху ды дрыжачай рукой падпісаў. Мэндлік яшчэ раз запэўніў, што калі Пракоп

наважыўся-б падаваць справу забойства жонкі ў суд, можа, зьявіцца да іх.

Паліцыянты паехалі, праводжаныя галасьлівым брэхам сабак.

IV

Надта-ж высака хадзіла цяпер над Літоўцамі летняе сонца. Здавалася, што намагалася зазірнуць у кожны агарод, што ў засені прысадаў, абгледзець з усіх бакоў гарбатыя й простыя саламяныя стрэхі, палічыць колькі на каторай сабачых грыбоў вырасла, на іншых - зялёны мох падсушыць.

Касавіца даўно скончылася. Каласілася, налівалася й сьпела жыта. Вясковы каваль Андрэй, смокчучы празь вішнёвы муштук кручаную папяроску, пацеў пры гарне: аднаму аднавіць-навастрыць серп трэба, іншаму яшчэ што. Пад саламянымі стрэхамі прыціхла ўжо гамонка пра Бахмачоў і панскія ўлады, што гэтым разам з прычыны замардаваньня Алены так доўга ўва ўсіх на воку былі. Кожны ад усходу да захаду сонца працаваў ці то ўдома, ці ў вакольных паноў і асаднікаў. Рупіліся літоўскія сяляне, каб упару за кажную новую летнюю работу ўзяцца, каб не перасохла, не абсыпалася. А пагода як на замову трымалася. Не агледзеліся, як і жыта дасьпела.

Зажыналі найперш тыя, у каго збожжа на пяскох было. У хвасьце Пракопавай нівы побач із Бахмачом стаялі Кацярына й Надзя. Перахрысьціліся. Кацярына колькі разоў махнула сярпом. Рэдкія чэзлыя сьцёблы рассыпаліся між спрацаваных жаночых пальцаў.

- Тутака надта ня ўжнеш, - уздыхнуў Пракоп, кінуўшы вокам на неўрадлівую пяшчаную ніву, а пасьля на блізкія могілкі. Думкамі быў ён там. Рука, што зажынала кожны год, супачыўшы на грудзёх, ніколі больш не падыме сярпа.

Кацярына згарусьціла першы снапок, адклала набок. Вечарам стане ён пад абразамі на покуці Пракопавай хаты. Два пасмы жыта накрыж паклала на йржышчы, а на іх - прынесены з хаты кавалак хлеба й солі.

- Ну й памагай, Божа! - сказалі жняцы.

Сярпы ўзяліся зьбіраць рэдкія сьцёблы, якія прагавіта хапалі левыя рукі. Даволі-ткі многа трэба было жаць, каб на сноп сабраць.

- Тутака надта ня ўжнеш, - бурчэў ізноў Бахмач. Прыгадаў усе даўгі, што сплачваць трэба. У ягоным уяўленьні зноў пустэчаю сьвяцілася ля Каляд засекі, а ён - ізь мяхом, як і раней, - у пазыкі.

Вечарам таго самага дня сказаў Пракоп Міколу ў дварэ:

- Ты канчай тут работу, а я зьбегаю ў пуню ахапак мурагу кабыле прынесьці, а то зямлю цэлы дзень грызець.

Зайшоўшы ў пуню, старанна павыграбаў драбнейшы мурог ля памостаў, узяў з застаронку й натаптаў поўны кош. Павесіў граблі на шуло, ды стаяў у расчыненых варотах, прыглядаючыся, што дзе робіцца ў вёсцы.

Бахмачова пуня стаяла воддаль ад хаты й вышэй за дно літоўскай лагчыны, дык адгэтуль добра бачныя былі літоўскія хаты ў далечы. У двары солтыса Паўлоўскага, якога гаспадарка была ад Пракопавай за чатыры хаты, сам «дзіравы шляхціц» гаварыў зь нейкім мужчынам. Бойкім голасам, размахваючы рукамі, нешта даводзіў таму чалавеку, якога Бахмач здалёк ня мог распазнаць. Наставіў вуха, каб ухапіць якое слова, але дарэмна. Шматлікімі галасамі перашкаджала вясковая курыная сям'я, на цэлыя свае зяпы расхадзіліся нечага лекаравы гусі, адзываліся па дварох каровы да сваіх цялятаў, рыпелі асьверы, гаманілі многа дзе пагаспадарліваму людзкія галасы.

Далёка ляцела рэха гэтага вячаровага жыцьця. Бахмач мяркаваў, што заўтрашні дзень народзіцца ня менш прыгожым, чым сяньняшні, што ўжо пагасаў. Пракопаў нос насалоджваўся водарам сьвежага мурагу, зёлак. І тады з пуні да Бахмачовых вушэй прыляцелі зусім дагэтуль нячутыя гукі: шарахцела сена, быццам нехта поўз-карабкаўся па кладні. Здавалася, што гэты шорах набіраў сілы й сьмеласьці ды набліжаўся да краю.

Пракоп адвярнуўся, зьдзіўлены несамавітасьцю яшчэ ня ведаў чаго, як тут пару крокаў ад яго ссунуўся з кладні Косьцік Сабакевіч. Бахмачовы вочы шырака расчыніліся ад зьдзіўленьня й разглядалі гэтага няпрошанага госьця. Даўно ня бачыў яго Пракоп. На лобе спасьцярог шыракаваты шнар, якога, здаецца, раней там не было. Дзяцюк памажнеў, падрос.

- Ты што ў маёй пуні робіш? - спытаў суха Пракоп.

Косьцік не адразу адказаў. Ён абтрасаў дробнае сена, што панавылазіла ў даўно нястрыжаныя валасы, у падношаную шэрую сьвітку дый такога-ж колеру порткі. Кашуля была шырока расшпіленая.

- А што, ты думаіш, я тут раблю? - адказаў із задзёрам і выклікам дзяцюк. - Спаў во...

Ён цёр вочы, запраўды выглядаў заспаны. Шырака, ляніва пазяхаў, выставіўшы на паказ два роўныя шэрагі рудых зубоў. Бахмача зьдзівіла ня толькі Косьцікава «ты», але перадусім ягонае захаваньне. Быццам ён быў тут гаспадар, а Пракоп - нямілы госьць. Раней-жа, калі малы быў, таксама ветлівасьцю не грашыў, адылі старэйшым заўсёды даваў «дзядзя».

- Я ні хачу, каб ты ў маей пуні начаваў ці дняваў, от што... Яшчэ, ні дай Божа, паліцыя пранюхаіць. І так ад гадаўя адчапіцца ні магу...

- Аб гэтым-жа й хачу табе сказаць, - падхапіў Сабакевіч, цярэбячы калматыя валасы. - Яны-ж мне ні даюць спакойствія. Дык мы - ну як гэта сказаць? - цяпер у ваднэй лодцы, прама друзья будзім. Панімаіш?

Забурліла Пракопава нутро. Нахабны панібрацкі тон, тое непашанотнае «ты», ды гэта «адна лодка», а насамбольш зухвала-зухаватая поза добра-ткі дасалілі Пракопу.

- Сабаку ты друг, а ня мне! - падняў Пракоп голас. - Выбірайся з майго гумна, каб тут твайго й смуроду ні было, а то...

- А то што, дзядзька, зробіш? Ну скажы што, га? Пойдзіш у паліцыю? Данясеш тым самым катам, што тваю Алену са сьвета зьвялі?

Пракопа як быццам хто варам абліў. Ён дрыжэў. Гэты нахабны дзяцюк пекануў у самае кволае. Дый працягваў:

- Іж і дурны ты чалавек, Пракоп. Табе-б з намі цяпер дзіржацца, а ты мне дэфэнзывай грозіш! Цьфу!

Зьедлівая ўсьмешка на заспаным твары зьдзеквалася з Бахмача, выклікала на бой. А той плявок дык ужо й мерку перабраў. Бахмач зрабіў крок наперад.

- Ухадзі вон адсюль, сабака ты! Чаго цябе нячыстая на маю галаву прыгнала? Вон кажу! - сыкнуў злосна Пракоп, мерачыся на Косьціка, каб схапіць яго рукамі загрудкі.

У гэты момант Косьцік сунуў правую руку ў кішэню портак і воміг выцягнуў адтуль вялікі складанчык. Пстрыкнула ў

спрактыкаванай руцэ й выпрасталася зіхатлівае лязо. Косьцікавы вочы зрабіліся цяпер злоснымі. Дзяцюк, як пантэра, гатоў быў скочыць на Пракопа. Бахмач, зьбянтэжаны такім манэўрам Сабакевіча, застыў на мейсцы, сочачы нож.

- Ні скачы, Бахмач! - грозна сьцішыўшы голас, цадзіў праз зубы Сабакевіч. - Ні прынуждай мяне нож упатрабіць, бо яй-богу ні шучу.

А тады яшчэ больш пагрозьліва й шматзначна:

- Ты яшчо паскачаш у мяне як міленькі, як нашыя прыдуць!

Кроў хлынула ў Пракопаву галаву. Вялікая злосьць пры фізычнай немачы зьбянтэжыла яго канчаткова.

- Я пайду, а ты... выбірайся з пуні, - сказаў больш лагодна, падымаючы лёккі кош ізь сенам на правае плячо.

Не прыгадваў, як вытрас у ясьлі кабыле тое сена. Добра ўжо зьмяркалася, калі наважыўся зазірнуць да швагры. Той выслухаў яго зь вялікай увагай і зьдзіўленьнем, ды перапытаў:

- Дык як ён сказаў: нашыя прыдуць?

- Так і сказаў: ты, кажа, паскачыш у мяне, як міленькі, як нашыя прыдуць!

Мужчыны сядзелі на прызьбе. Збоку стаяла Кацярына. Доўга маўчалі.

- А чорт-жа яго бацьку знаіць. Будзь-жа тут разумным і ўгадвай, што будзіць...

У Бахмачовым голасе наскрозь пульсавала вялікая трывога.

- Ат, Пракоп, махні рукой. А чаго-ж яму спадзявацца? Вунь доктарава радзіва ўжо гадамі трубіць. што руку помачы пададуць, што прыдуць... Ды мала што брэшуць...

Ды й у Алесевым голасе чулася няпэўнасьць. Ніколі-ж так раней не разважалі аб вялікай праўдападобнасьці таго, аб чым сяньня з пагрозай сказаў Пракопу Сабакевіч.

- Алесь, а што будзіць, калі й праўда возьмуць і прыйдуць, а гэткі бандзіт і злодзей станіць над табой начальнічаць? Га?

І на гэта пытаньне ніхто не адважыўся адказаць.

Доўга тэй ночы ня мог заснуць Пракоп. На яго жыцьцё лёг новы цень.

V

На двары пачалі ўжо голасна гарлапаніць пеўні, калі прачнулася Дуня Макатунішка. Правы бок ныў ад цьвёрдых палаткаў, на якіх шчыльна, покатам адно побач другога, спала цэлая сям'я Макатуноў. Сяньнік, з пацёртай на дробную мякіну саломай, не памагаў, яго як-бы й не было.

Ды не ад самой цьвёрдасьці азбудзілася Дуня. Нешта моцна ўпілося ў мякаць шыі. Памацала пальцам, расьцёрла нешта ліпкае зь едкім смуродам. Здагадалася: гэта клоп.

Збоку раз-пораз варушыліся, кідаючыся з аднаго на другі бок, дзеці й жанчыны. Паразіты не давалі спаць. Дуні сон адразу сагналі з павек. Пэўны час ляжэла спакойна, углядалася ў цемру й думала. Тады нешта покнула зьверху проста на голыя грудзі. Дуня зноў абмацала клапа, з агідаю адкінула ў цемру. Ужо ведала - клапы вандравалі па столі, ды покалі ўніз на сваю пажыву.

Ці-ж першы гэта раз? Ведала, што будзе далей. Зараз ускарабкаюцца кабеты, засьвецяць газьнічку, пазапальваюць лучыны ды з бурчэньнем пачнуць паляваньне на агідных смактуноў крыві. Пасьля ўскапышацца, тручы спрасонку ручкамі заспаныя вочы, ды ўзьнімуць лямант дзеткі.

У гэткія часы прыгадвала Дуня свайго бацьку, таксама быццам як праз сон. Было гэта, мусіць, даўно-даўненька, перад тым, мусіць, пакуль на сабачы сенакос наважыўся йсьці. Зьяўляўся ён у ейным уяўленьні амаль заўсёды із лучынай у руцэ. Насуплены, злосны. Капціць лучынавы агонь, трашчыць ды прагна жарэ сухую драўніну чырвоны язык і ўсё падарожнічае па шчэлках ложка, палаткаў, па печы, па сьценах. Бацька - заядлы паляўнічы на клапоў. У паляўнічага густымі чорнымі валасамі абрасьлі напаўзакрытыя шэрай зрэбнай кашуляй грудзі. Калі пападзе на вялікую здабычу, тады чуваць нейдзе з глыбіні гэных касматых грудзей голас:

- Іж ты, падла, як крыві нажлопаўся, што ажно паўзьці ня можыць. Цьфу!

Бацька брыдка мацюкаецца. Маці ці каторая сястра памагаюць з лучынамі. Калі дзе ў якой шчылінцы большую клапіную сям'ю апоруць, тады труць, поруць так заўзята, ды палююць, што аж лучына ад смуроду сквірчыць. Забаўным, хоць і дакучлівым, было для Дуні

тое паляваньне. Сон пераб'е яно, што пасьля цэлы дзень рот ад зяваньня баліць.

Было вось так некалі ў старой хаце. Мяркавалі, што калі ў новую перабяруцца, то не дадуць-жа паразітам распладзіцца. Ажно й не прадбачылі трываласьці клапінага племя. Мусіць, у латаных кажухох і іншых рызманох на развод іх прынесьлі. Ня здолялі як сьлед абжыцца, як паразіты ў перабудаванай із старых бярвеньняў хаце загнезьдзіліся, а пасьля неўзабаве на худую Макатунішыну сям'ю начамі інвазіі пачалі рабіць.

- Божачкі сьвятыя мае! - ці раз змораным і крыўдным аж ад адчаю голасам наракала начамі старая Макатуніха. - Гэта-ж во як на беднага дык і людзі і ўсякія пранцы нападаюць. А каб-жа вы ўзялі ды дзе да каторага сытога й багатага ў хату заблудзілі, ягоную таўстую шыю ці плечы папакусалі!

І чаго ўжо толькі ні прабавалі, каб якое збаўленьне ад клапоў знайсьці, Макатунішкі! Павыносяць, было, зімою ў траскучы мароз на двор усю-ўсенькую вопратку, рызманы й пасьцелю. У хаце сьцены варам пааблівaюць, ніводнай шчыліны ня мінуць стараюцца. Разам із тым варам кіпіць у нявыгляднай Макатунішынай хаце колькігадзінная праца. Дашчэнту, здаецца, выпякуць клапінае племя.

- Ну, паглядзім-жа ўжо цяперака, - кажуць змораныя жанкі. - Калі сягоньніка іх ні зьвялі, дык якія пранцы тады памогуць?

Адна, другая, трэцяя ноч пройдзе спакойна. На чацьвертую ці пятую пачынаецца-аднаўляецца папярэдняе. А клапом на дапамогу вошы й блохі. Хоць ты няведама што, зьнікуль ратунку няма.

Бедавала Макатуніха, ці раз бедаваньне лаянкай перасольваючы:

- Гэта-ж каб на вас парашкі ці якую халеру, каб раз і наўсягды выдушыць можна было. А то ратуначку німа!

Гэту ноч, калі ўсе азбудзіліся, пачалі плакаць дзеткі, перабралася Дуня на шырокую лаву на покуці. Зграбла, вытрасла што магла з пасьцелі, скамячыла нейкую вопратку пад галаву, сяк-так накрылася. Пастанавіла, што ўвечары пойдзе спаць на сена. Праўда, сена тое, - за недахопам мейсца ў пуні хлявушкі, складзенае было збоку пад страхой. Лічы што на двары было. Страшнавата аднэй дзяўчыне там спаць.

- Дунечка, як-жа ты, дзетка, там засьнеш? - турбавалася маці, шкадуючы яе. - Гэта-ж лава голая. Каб табе што пад бок.

- Ну й тамака, мамачка, німа як. Глядзіце вы ўжо сябе.

На халоднай і мулкай лаве было яшчэ больш нявыгадна, але-ж хаця ад паразітаў далей. Яны там ля палаткаў панадзілі. Ужо сама сьведамасьць таго, што тут на покуці, мабыць, клапоў няма, супакоіла дзяўчыну, і яна намагалася заснуць.

Сон ня браў. Ляжала й думала. Марыла аб выгаднай мяккай пасьцелі, чыстай коўдры й сяньніку. А каб яшчэ асобнае ложка! Гэткія сьмелыя думкі выдаваліся ёй недасяжным шчытам мараў. Ведала, што некаторыя якраз так і жывуць: сьпяць асобна ды ў чыстым, ядуць уволю, працуюць, сілаў не надрываючы. Ня так, як яны, Макатуны - вечна зубы ашчэрыўшы, каб зусім у бяздоньні галечы не загразнуць, каб як-небудзь з дня на дзень дух перавесьці.

Была, мусіць, нейдзе ў жыцьці й лагодная рука лёсу, і поўная мерка шчасьця, і волі, і радасьці. Дзе яна? Ці судзіў Бог маладой і адно што падрастаючай Дуні калі зь ёю сустрэцца? Іншыя ўмелі й шчыра сьмяяцца, і поўнай мерай чэрпаць жыцьцёцую асалоду, як тая пчолка вясной і ўлетку нэктар з прывабнае краскі. Дуня-ж калі й сьмяялася, дык стрымана, вонкава, адно быццам для вока людзкога. Праўда, былі хвіліны, што падзіцячаму забывалася пра сваю худую долю, аддавалася й сьмеху й радасьці. Але трывала гэта коратка. Сьмех і радасьць былі нетрывалкімі, зманлівымі.

Была-ж нейдзе на сьвеце й прыгажосьць. Вядома, ня тая, якой поўніцца лес і поле, і вада, і неба, і сонца, і месяц. Гэта прыродная прыгажосьць была сталая. Бог даў яе для ўсіх, што ўмелі яе бачыць і цаніць. Дуня мела ў думках прыгажосьць самаго жыцьця, быту; прыгажосьць наедзенага чэрава й добра апранутага цела, мэтанакіраванай і плённай працы дый спажыванья тых плёнаў. Была, мусіць, і гэткая, ды не для яе.

Ведала дзяўчына, што й думаць аб такіх рэчах дарэмна. Куды ўжо ёй з такой апошняй у вёсцы й затуканай-загуканай сям'і ды аб нечым лепшым марыць. Сьмешна проста, дый годзе. Думкі адно й застануцца ніколі нязбытымі марамі ды мо шчэ больш напоўняць коўш горычы. Жыцьцё ейнае як палын, нічога яго, мусіць, не асалодзіць. Такімі думкамі сабе адно шкоду робіць. Ці ня лепш ужо нічога ня думаць ды каратаць бяду - вечна ў будзённай беспрасьвеціцы ізь сёстрамі й маткай калупацца?

Калі-нікалі было й спадзяваньне на Бога. Гэта-ж пра Яго казалі, што ўсемагутны й справядлівы, бачыць усю бяду й галіту й ведае ўсё чысьценька. Ці праўда гэта? Які-ж Ён запраўды? Ці гэткі суровы, із насуплепымі брывамі, што вунь на покуці ў іхнай хаце царствуе ды шкляным, ільдзяным зрокам абыякава на ўсю злыбяду іхную прыглядаецца? Ці, можа, ён зычлівы, ласкавы, добры, міласэрны, такі як яго адзін раз у школе намаляваў на лекцыі рэлігіі той дубовіцкі сьвятар? Хто-ж яго ведае...

На каго-ж тады спадзявацца, калі не на Яго?

А за сьцяной яшчэ сьмялей дзёрлі свае глоткі пеўні. Раз-пораз кукарэкаў Макатунішын галаган, у вадказ адгукаўся нейдзе на ўзгорку певень старой Пятушыхі, там далей рэфрэн трымалі зладжана - Дуня гэта ведала, - трывожачы сваіх курэй, бліжэйшыя й далёкія. Мабыць, нейдзе на ўсходзе за балотам, калі неба не замурзана, паказаліся ўжо зарніцы сонца, што паволі ды няўхільна набліжаецца, каб азбудзіць да жыцьця Літоўцы й цэлую сьпячую салодкім сном кароткай летняй ночы ваколіцу.

І тады ў Дуніным уяўленьні вырас перапоўнены багатымі чарамі скарбовы лес. Гэта-ж зараз, мусіць, трэба ўстаць - усяроўна сну ўжо ня будзе, - ды па грыбы сьпяшацца. Там пад дубамі й гладкакамлёвымі бярозамі пасьмялелі й павылазілі з травы наверх баравікі. Некаторыя, можа, й ня сьняць, што прывітаецца зь імі й нізка паклоніцца ім сяньня пасьля сьвітаньня падлетак-Макатунішка. Так ёй карціла ўжо туды. Гэта, можа, адзінае й найлепшае мейсца, дзе яна жыла, поўнілася чарамі іншага сьвету.

Праўда, там хадзіў із злым сабакам забойца Бахмачыхі. Дуня яго зручна абмінала й дагэтуль клопату ня мела. Як тая спрактыкаваная ліска, выхадзіла-выбегала яна гэны лес, угадвала, дзе й калі пайсьці, каб зь бядой лоб-у-лоб не сутыкнуцца. Лясьнік, праўда, заўсёды трымаў сабаку пры сабе, а часта й без сабакі валачыўся па лесе.

А лес, - Божа мой! - гэта ці не другі ейны дом. Там яна чулася вольнай і лёккай, прыглядалася кожнай букашцы й матыльку, лавіла чар салаўінай песьні й кожнае рэха. І здавалася ёй ці раз, што добра было-б у лёкка-пырхаючую птушку замяніцца, ейным крылатым бесклапотным жыцьцём дыхнуць. Але-ж ня можа быць, каб птушкі сваіх клопатаў ня мелі. На іх і каршукі й іншыя дзяруны палявалі, яны-ж мусілі й гнёзды на хісткіх галінах майстраваць, і дзеткаў гадаваць, і

ўсякую непагоду пераносіць. Ды ня можа быць, каб не жылося ім лацьвей, чымся літоўскім Макатуном.

Ужо добра парадзела цемра, калі аціхла ў хаце. Дуня ўстала, на дыбачках - каб, барані Божа, нікога не азбудзіць, - падыйшла да сьцяны, брала зь вешалкі сваю вопратку й апраналася.

- Дачушка, ты куды? - азвалася маці.

Дзяўчынка ў думках упікнула сябе за тое, што не магла цішэй, што матчына чуткае вуха ейнае вандраваньне па хаце распазнала.

- Па грыбы, мама.

- Паспала-б яшчэ - рана, мусіць.

- Ат, дзе там рана. Пайду.

Матка змоўкла. Дуня бачыла, як перавярнулася з другога боку ля сьцяны Параска. Мусіць, і яна чула.

Белая Дуніна хусьцінка, якой перавязала валасы, мільгала ў шарэчы раньняга сьвітаньня. На правай руцэ тарабаніла кошык, а ў ім - із кароткімі чыранкамі ножык. Борздымі крокамі мерыла дзяўчына мяжу між нівамі, абмінула з паўднёва-ўсходняга боку Гараватку ды накіравалася на калёнію Лазоўскага. Босыя ногі абмываліся сакавітай расой, што даймала сьвежым і прыемным халадком. Ведала Дуня, што покуль дойдзе да лесу, а ў тым лесе да аблюбаваных баравікамі мейсцаў, сонца высадзіць свой чырвоны лоб з-за балота, каб пачаць сьвяціць людзям у яшчэ адзін працавіты летні дзень. Шапку Архіпа абселі вароны. Дзесь на ўзьлесьсі, а мо ў вербах над канавай, аж заходзіўся ў сьпеве салавей. Яму дапамагаў другі й трэці.

Вялікі луг Лазоўскага драмаў пад шыза-зялёным дываном роснай атавы. Дуня прастала нацянькі да ўзьмежжа жытняга поля, пакідаючы за сабою сьцежку, як добрую баразну. Драмалі, здавалася, важкія адраныя каласы жыта. У раньняй задуме, мусіць, чакалі яны жняцоў. Дуня кінула зрокам на вялізную жытнюю ніву. Асаднік яшчэ не зажынаў. Хутка, можа ўжо й сяньня, стануць нейдзе ў хвасьце вясковыя наймітки-жнейкі і з традыцыйным «Божа памагай» зьвяжуць першы снапок, каб стануў ён ганарова на покуці гаспадаровае хаты. Сярпы пачнуць уядацца ў моцную мязгу вырослых на сакавітым угнаеньні жытнёвых сьцёблаў. Дзяўчаты й жанкі, як адважныя жаўнеры ў гарачай бойцы, зацята цяць будуць высокую сьцяну каласоў, у хвасьце за сабой пакідаючы суцэльны памост снапоў. Пад вечар мускулістыя рукі парабка Яўхіма паставяць тыя снапы ў тоўстыя

бабкі, а журботная жніўная песьня зь перасохлых і патрэсканых ад сьпёкі вуснаў паплыве над шырынёй урадлівае нівы.

І, сьпяваючы песьню гэную журботную, у сваёй красе непаўторную, думаць будуць жанкі аб нішчымніцы й нядолі пад струпелымі саламянымі стрэхамі. Прыгадаюць багацьце роднае зямлі, што поўніць чужыя кішэні, лёс свой гаротны, сям'і й дзетак, што чакаюць пакуль найміткі-маткі вернуцца ў родныя гнёзды. Разагнецца-выпрастаецца на захад сонца балючая сьпіна сялянкі, апусьцяцца спрацаваныя млосныя рукі, а зморaны мігценьнем сьцёблаў і каласоў зрок пабяжыць па заваяваным полі. Ужо каторы раз паўтараючы сьпяванае раней іхнымі бабкамі й прабабкамі, ня зьведаюць мо жнеі й гэтым разам поўнага таемнае глыбіні сэнсу пясенных словаў. Думацьмуць, па колькі заразьбілі, на як доўгі час таго хопіць, каб у гаршку закрасіць, ці залатаць іншыя дзіркі ў нішчымнай гаспадарцы; ці праца іхная ізь сярпом прынясе малую й кароткатрывалую радасьць у выглядзе новага абутку, якой таннай сукенкі, ці - на гора і ўтрапеньне ў хаце - пойдзе зноў на лекі, каб выратаваць каго ў сям'і ад хваробы. Неразборлівая ў хітрыках даверлівага сьвету, спрацаваная жнейка ўдзячная будзе ўвечары за прыгоршчы крышкаў із стала чужога пана. І гэты іхны гаспадар-прыблуда, дый іншыя паны ў іншых мейсцах - з воклікам «на здрове» і із самазадаволенай усьмешкай - у недасяжных гэтым працавітым жанком куткох спажываць муць сакавітае дабро, у той час, калі яны ў сваіх сялянскіх абрабаваных хатах гушкаць і гадаваць будуць для тых чужых гаспадароў новых будучых наймітаў.

Раз ці два кінула Дуня позірк у Лазоўскага двор. Церабіла дзяўчына скусанае паразітамі ўночы цела, туліла перавешаны на руцэ кошык і паглядала на задорна падняўшыя свае гонтавыя чубы гаспадарскія збудаваньні Лазоўскага. Дуня ведала, што, пэўна, у гэты час пад гэнымі стрэхамі завіхаецца ў раньняй гарачцы, каб выгнаць на поле статак, ейны найлепшы сябра й спадарожнік Янучок. Дуня прыгадала, што ўжо пару тыдняў ня бачыла хлопца. Што зь ім? Як ён чуецца й што думае? Ад таго часу, калі Алену забілі, ніколі не давялося зь ім сустрэцца. Ныла ў сваёй хаце бяда. Трэба было на зіму забясьпечыць ня толькі сябе, але й матцы памагчы. Чым далей, тым яна больш горбілася, станавілася бурклівай, сварлівай. Сёстры пакідалі ёй на догляд сваіх дзетак, хадзілі ў наймы, ды, мусіць, думалі, што

матка неяк там дому й дзетак дагледзіць. А матка, вядома, сэрца для ўсіх мае вялікае. Прыбітая горам, яна трывала, цягнула як магла.

А Дуню клікалі баравікі ў дубровах, ягады на ўзбалотках і балотах, зёлкі на чыгуначных адхонах, палёх і палянах. Лета-ж не надгаблюеш. Яно кароткатрывалае й багатае плёнамі. Завіхайся, як тая пчолка, пакуль час, пакуль не перацьвіло, ня згніло. Дуня-ж ня ўчора спавіваная была - ведала яна гэта аж занадта добра. Іншыя жалі чужое поле, натужваліся на чужых нівах, а для яе было сваё жніво й свой незаменны час.

Што-ж з тым Янучком? Які ён бедненькі й пануры быў у гэны вечар! Што ён цяпер думае? Чаму-ж усе самыя найгоршыя беды валяцца на Бахмачову сям'ю? Ужо й пра паліцыю дый пра той войстры Сабакевічаў нож, каторым старога Бахмача Косьцік страшыў, ведала цэлая вёска, у тым ліку й Дуня. І спачуваньне й жальба шырака расьпірала маладыя дзявочыя грудзі. Так палюбіла яна гэтага задзірлівага хлопца. І хоць ніколі шчэ нічога важнага не было выказана славамі, шматлікае было перададзена позіркамі. Калі-б нават, здаецца, і мову адняло, дык, зірнуўшы адно аднаму ў вочы, мігам выказалі-б усё.

Трэба яго на днях, а й сяньня шчэ ўбачыць, распытацца, разьведаць, як жыве, у які бок накіраваныя ягоныя думкі... Сваё гора ўпярэмяшку з чужым палыном пякло нутро. І не ўсьведамляла, і ня ведала Дуня Макатунішка, што не на ёй быў пачатак і не на ёй скончыцца; што й пад гэтым старым сівастагоднім дубам Архіпам і ў гэтым, цяпер скарбовым, лесе - гэтак раней зь бясьсільнай немачай у грудзёх тое самае цярпелі й думалі ейныя продкі, дый, можа, тое самае пераносіць будуць і ў немачы падносіць да Бога заплаканыя вочы нашчадкі.

Лес бурліў тысячагалосьсем гаманлівай птушынай сымфоніі, сьвяціўся-зіхацеў тысячакалёр'ям хварбаў расьціннасьці. Лес славіў новы й у сваёй асаблівасьці, можа, яму аднаму характэрны новы дзень. Тут быў свой чар, адмысловы ягоны подых. Тут была воля, прастор, бязьмежжа. Поўнымі грудзьмі і ўсёй сваёй істотай упівалася Дуня гэтым раньнім лясным чарам. Здавалася, што яна была таксама часткай гэтае бязьмежнае й шматколернае стыхіі, што між бязьлічных і зьменных колераў і адценяў матэрыі й гуку нейдзе займала сваё асаблівае й аднэй ёй апрычонае мейсца. Дыхала яна й упівалася багацьцем шчодрых прыродных сокаў і гукаў, разам з усім жывым і

квітнеючым у думках славіла Стварыцеля, пышнасьць і плённасьць ды незаменнасьць Ягонага тварэньня.

Нявыспаная дзяўчына як-бы набрыняла, налілася сокамі жыцьцядайнай ды жыцьцётрывалай пажывы. Таго кашмару з клапамі й іншымі нявыгадамі як-бы й не было. Палякчэлі цяпер ажыўленыя раньняй расою ногі, параскашнелі насычаныя сьвежасьцю раньняга паветра грудзі.

Між старых і дрэмлючых дубоў, між касалапых кустоў, між зграбных, як вясельныя дружкі, бярозаў пырхала й скакала Дуня, як борзьдзенькі матылёк. Калі насустрач выходзілі сем'і баравікоў, нізка прыгінаўся-прысядаў гэты матылёк да зямлі. У кошыку апыналіся тоўстакарэнныя ядраныя каралі грыбнога племя, а дзявочы маладзенькі твар поўніўся й расквітаў задаволенай сьціплай усьмешкай.

Нейдзе здалёк прыляцелі ўжо ці раз раней чутыя гукі дудкі ліпавіцкага пастуха Хвядоса. Тутака-ж збоку, быццам у вадказ, спачатку кволыя, а потым ужо куды сьмялейшыя, адгукнуліся гукі з поля Лазоўскага. Выпрасталася струной у бары маладая дзяўчына, вуха ейнае пільна надслухоўвала раньні канцэрт пастухоў. На прыкрытым вяснушкамі дзявочым твары зьявілася спачатку загадкавая няўцямнасьць, а пасьля распрамяніўся ён шырокай усьмешкай. Вочы поўніліся ціхай радасьцю. Быццам застыла ў нерухомасьці на валосах сьветлая хусьцінка. Ня ведаў, пэўна-ж, малады басаногі пастушок, што граньне ягонае ловіць вуха любае дзяўчыны, тэй сяброўкі-матылька, што яшчэ раней за яго, як руплівая пчолка, выляцела да дзённага занятку; што гукі тыя казычуць цяплом добрае дзявочае сэрца, у каторым ён ужо мае прытулак.

Макатунішка паставіла на траву грыбны кошык, стаяла й слухала. Як прагны вады падарожнік у пустыні п'е з асьвяжаючае аазы, гэтак Дуня забылася цяпер аб сваім існаваньні, аб усім сьвеце. Навосьцеж расчыніліся дзьверы ейнага чульлівага сэрца, стаяла бяз руху й насалоджвалася пастушковым граньнем ды любай і неабсяжнай прыродай.

Цяплом раньніх праменьняў казытала сонейка цёмназялёнае шво лясных чубоў, ручайкамі прабіваліся тыя праменьні ў нетры густога лесу. Зіхатлівыя кавалкі золата асядалі на галінках і лісточках, на трапяткім птушыным пер'і, падкрадаліся яны й ніжэй аж да лясное

падэшвы. Азалаціласа й сьветлая касынка на Дунінай галаве, загарэліся раньнія дзявочыя вяснушкі.

Каб зьявіўся побач мастак із пэндзалям, дык Богу падзякаваў-бы за такі цудоўны вобраз. На палатне вырасла-б маестатычная ў раньнім харастве постаць беднае вясковае дзяўчыны, зачараваная сымфоніяй новонароджанага дня. Калі пэндзаль мастака паклаў-бы апошнія рысы, на малюнку мог-бы зьявіцца адзін з такіх напісаў: «Зачараваная», або «Новонароджаная сымфонія», або «Німфа ў грыбох».

Адылі ні той вобраз, ні напіс пад ім, - як поўнымі й гэніяльнымі ў сваёй задуме ні былі-б, - ня выказалі-б дзясятай частачкі тэй мастацкай суцэльнасьці, гарманійнасьці й дасканаласьці хварбаў, якімі так багатыя былі ў гэнае раньне Дуня Макатунішка й беларускі лес. Тут цалкам адсутнічала поза й штучнасьць, лякіроўка й надзьмутасьць. Як рэдка калі падчас свайго жыцьця бываюць людзі, Дуня ў гэныя хвіліны поўнілася свайміі шчодрымі хварбамі. У ейным позірку, у спантанічнай позе, у журботным задуменьні, у непрыкрашанай мадэрнай моднасьцю прастаце, увасобілася выключнае й незабытае харство. Колькі даў-бы ці адзін вялікі мастак, каб злавіць і замацаваць на палатне такі вобраз!

Із поўным кошыкам пуцатых тоўстагаловых баравікоў вярталася дахаты Дуня Макатунішка, калі ладна паднялося й пачало прыпякаць ужо сонца. Як мурашкі, цярэбячы жытнія загоны, распаўзьліся па палёх сяляне. Дзяўчына пайшла краем лесу й павярнула на шырокі луг, дзе пасьвіліся каровы Лазоўскага. Не было надта часу, бо маці казала нешта ўчора, што ў Гаці ці ня прыйдзецца сяньня ізь зёлкамі схадзіць. Але карціла пабачыць Янука.

Пастух спасьцярог дзяўчыну здалёк і, калі прыблізілася да яго, ня выказаў ніякага зьдзіўленьня, быццам вось пяць хвілін назад зь ёю бачыўся. Глядзеў на яе спакойна. Ля ног яго ляжаў Тапсік і, выпяціўшы язык, паглядаў то на гаспадара, то на дзяўчыну, быццам угадваючы што ён мае рабіць з прычыны паяўленьня гэтае наведвальніцы ў полі.

У Януковых вачох Дуня дагледзіла нешта новае, чаго там не было раней. Хлапец спаважнеў, здавалася, падрос. Яна была пэўная, што ад часу, калі бачыліся, ён шмат перажыў. Гэта не магло мя мець уплыву на ягоную натуру.

- Але-ж ты рана справілася, - сказаў зусім спакойна Янук і паправіў правай рукой шэрую кепку на галаве.

- Гэта баравікі вінаватыя, а ня я, - хвалілася, зірнуўшы на кошык, Дуня.

- Многа ёсьціка?

- Мястамі хоць ты касой касі. Шкода, што ні было куды браць.

- Дык можаш яшчэ раз схадзіць, не?

- Можа й схаджу яшчэ сягоньніка. Алі перш можа ў Гаці пайду, трэба зёлкі Жыду занесьці. А тады ўжо калі, дык па паўдні.

- Усё зьбіраіш ды зьбіраіш, - казаў хлапец, прыглядаючыся пузе.

- Трэба-ж. Жаць ні пайду.

- Ну што ў цябе там?

- Ды нічога. Можа ты мне што новага скажаш?

- Сама, пэўня, знаіш. Усе людзі гавораць.

- Ты пра гэтага баньдзіта, што на бацьку з ножам кінуўся?

- Пра каго-ж яшчэ. Бадзяіцца, як той сабака, па чужых заўгольлях. Бацька прыпільнаваў, дык і кінуўся. Толька-ж я думаю сабе, чаго гэта ён якраз у нашую пуню прыйшоў? Ну добра, што піраспацца, але чаму гэта нашу выбраў? Ці гэта ад бацькі хацеў чаго?

Дуня нічога не адказала.

- І знаіш яшчэ што? Мушу табе расказаць. Прышоў я раз на Гараватку пад Архіпа. А там, угадай хто сядзіць: стары дзед Якуб. І каб ты чула, што ён мне расказаў. Доўгая гэта гаворка. Надта цікавую лягэнду пра Гараватку расказаў, от што. Ды яна такая нізвычайная, што от ужо столька дней думаю і ні магу да толку дайсьці, ці так магло быць, ці не. Дзед мне добрую загадку даў. Алі мушу табе расказаць...

- Тапсік, чорную кусі! - загадаў Янук сабаку.

- Дык раскажы, - сказала Дуня.

- Дык гэта так адным ці двумя словамі ня йдзець.От калі зьбярэсься ды будзеш час мець, то можа. Віджу, што ты сьпяшысься, мусіць...

- Ну ніхай патвоему будзіць. А скажы мне, дзе гэта тут хто на дудцы йграў?

Янук крышку пачырванеў, спусьціў вочы долу й нічога не адказаў.

- Пакажы, дзе яна, - настойвала Дуня.

- А нашто табе? Ды які там зь мяне ігрэц?

- Ну алі чаго-ж стыдаесься? Пакажы, можа і я заграю.

Янук падыйшоў да крушні каменьня, што ляжала на ўзьмежжы, выцягнуў адтуль закручаную ў нейкі рызман бяроставую дудку. Падаў

Дуні.

- Гляньце вы на яго! - дзівілася дзяўчына, уважна абглядаючы дудку. - І калі гэта ты яе зрабіў? Што табе ў галавы прыйшло?

- Ні я зрабіў, а ў ліпавіцкага Хвядоса выпрасіў. У яго іх ні адна.

- Дык што, музыкантам будзіш?

- Каб я знаў. Мне цяперака ні да граньня. Але от пагуджу дык душу адвяду...

- Ну а мне можна папробаваць?

- Чаму-ж не. Дуй.

Дзяўчына, нязручна трымаючы, прыклала дудку да вуснаў і няпялілася. Аж пачырванелі шчокі, а дудка ледзь адгукнулася нізкім тонам.

- У-ух! - злавіла паветра Макарунішка. - Гэта-ж, мусіць, ня так лёкка, як я думала.

Яна пачырванела ня толькі ад напружанага дзьмуханьня, але й ад сораму.

- Ну гэта-ж ні бабская работа, - задзірыста сказаў Янук. - Дый на пусты жывот цяжка. Ты-ж ці ела яшчо?

- Не.

- Дык от другім разам папробуеш на поўны жывот.

- Дык пайду, - сказала дзяўчына, аддаючы пастуху дудку.

- Прыдзі другім разам калі, дык пірадам табе, што мне дзед Якуб расказваў.

- Добра, забягуся калі.

Яна ўзяла на руку напоўнены бурагаловымі баравікамі кош і пайшла, а Янук доўга глядзеў усьлед. Шкадаваў, што не магла пабыць зь ім якую гадзіну ці болей, каб падзяліцца думкамі, якія вось ужо колькі часу не давалі яму супакою.

У Макатунішыным падворку дзеткі корпаліся ў пяску, самы найменшы ганяўся за курыцай. Старая Макатуніха сварылася на яго, каб перастаў. Дуня на хаду хапіла астыўшую ўжо бульбіну з муньдзірам, сербанула кіслага малака ды ўзялася за грыбы. Ладна прайшло часу, пакуль пачысьціла, параскладала на бляхі й паставіла ў печ і на двор на падаконьні сушыць баравікі.

Ужо ля полудня пабегла яна з васількамі ў Гаці. У мястэчку быў адзін крамнік, што купляў зёлкі. Зваўся ён Габа. Было вельмі не на руку зьбіральнікам зёлак, што Габа трымаў у Гацях зёлачны манаполь і

плаціў менш, чымся рынкавыя цэны ў іншых далёкіх мястэчках, дзе зёлкамі гандлявалі Жыды. Хоць, праўда, усе тыя Жыды прапанавалі адну цану, як змовіўшыся, адылі на хуньце можна было які лішні пятак вымантажыць. Але дзе-ж ты паедзеш такі сьвет дарогі. Цэлы дзень трэба траціць. Не аплаціца аўчынка вырабкі. Дык і Дуня, адна з многіх, была на Габавай ласцы, калі прыносіла ў Гаці зёлкі.

Гэтым разам Жыда не было ў краме, а зёлкі прыняла старая Габіха. Грузная й таўстая над меру, брыдкая з твару, скупая на словы, яна папыталася Дуню, ці ўжо васількі скончыліся, ды якія зёлкі яна цяпер зьбірае. Раіла прыносіць усё назьбіранае да яе, бо яна дае найлепшую цану, нават большую, чымся ў Докшыцах ці Глыбокім можна дастаць.

Дуня ведала цану жыдоўчыных словаў і таму дзівілася, як гладка гэтая таўстабрухая кабета магла чмуціць. Не было-ж-бы для яе ніякага ўрону, каб не выхвалялася няпраўдай, каб памаўчала. Не, дык мусіць, ня ўцерпіць. Усе Жыды такія, - думала дзяўчына.

Праз поўадчыненыя заднія дзьверы, адкуль далятаў дзіцячы вэрхал, увайшоў у краму малы жыдзянёнак, гадоў так, можа, тры. У руках трымаў ён абкусаную вялікую булку, якая - Дуня гэта ведала - каштавала ў пякарні дзесяць грошаў. Хлопчык стаяў у дзьвярох замурзаны, дзьве сьвечкі з-пад носа аж у рот, ды мяў тую булку ў бруднай руцэ. Ажно Дуніны вочы разыйшліся. Забылася, што мусіць сачыць, ці Габіха на вазе не ашукае, - зрок ейны ўпіўся ў тую булку. Малы паглядзеў на Дуню моўчкі, пасьля кінуў булку вобземлю й пайшоў за дзьверы. Дзяўчына глядзела на булку, што ляжала на закарэлай і прагнілай мейсцамі падлозе, ды нешта ціснула яе за горла.

Тымчасам Габіха адклала зельле й лічыла грошы.

- Два злоты й фуфціг, - сказала, перадаючы Дуні манэты.

- Як гэта? Тры кілі было! - усхадзілася дзяўчына.

- Ні было. Ты мяне асукаць хоца, - сказала Габіха. Чырвоны, як з на драждох падыйшоўшымі шчокамі твар задрыгаў пры гэтых словах.

- Матка із бязьмен вазыла? - пыталася Дуню.

- На бязьмен, але-ж...

- Васа бязьмен нядобгы, - цьвердзіла сваё Жыдоўка. - Мая вес добгы, мая вес ні зманіць. От паглядзі!

Пры гэтых словах яна паклала на вагу кашолку, каб зважыць яе. Крыху націснула на кашолку рукой, каб збольшыць вагі. Рычаг паказаў

блізка паўкіляграма. Тады Жыдоўка высыпала ў яе высушаныя пялёсткі васількоў, гэтым разам ізноў не адымаючы і, як здалося Дуні, прытрымліваючы вагу рукой. Дзюбкі рычагоў зыйшліся гарызантальна. На талерцы ляжалі важыкі ў два з паловай кіляграмы.

- Ну відзіс, мае вес добгы, гэта васа бязьмен нядобгы.

Дуня была злосная. Нават стары Габа быў сумленьнейшым. Яна бяз слова загарнула грошы ў хусьцінку, завязала іх старанна ды, ціснучы ў потнай руцэ, выйшла з крамы.

- Гэта лахудра, каб яе гаручка, абманываіць на вачох, - гаварыла дома Дуні матка. - Трэба было глядзець яе, ато жыць нябудзіць, калі не абманець.

VI

Сонца добра пахілілася ўжо з паўдня, калі Макатунішка зноў пайшла па грыбы ў скарбовы лес. Ведала, што ўжо пачыналі нарастаць панчошкі, ягады на балоце чакалі яе. Неўзабаве трэба будзе на іх перакінуцца. Апошнімі часамі прайшло добрых пару дажджоў, вільгаць трымала ў лесе, дык і шкада было-б кідаць недагледжанымі цэлыя сем'і баравікоў.

Наважыла дзяўчына абегаць тыя мейсцы, дзе не была раніцай. Як заўсёды, цягнула яе дуброва. Здавалася, што там баравікі былі прыгажэйшыя. Ведала, што Бруніські - найбольшыя літоўскія канкурэнты па ягадах і грыбох - маглі тут ужо вызьбіраць. Але не. Нешта яшчэ засталося. У вадным мейсцы натрапіла на вялікую грыбную грамаду й цалкам аддалася нізкім паклонам. Сонца добра-ткі пякло ў шыю. Ужо забылася яна пра злосьць на Габіху й суцэльна занятая была цяперашнім. Адзін за другім падразала карэньні й клала грыбы ў кошык.

Непадалёк на старой бярозе голасна загрукатаў дзяцел, і Дуня выпрасталася, каб паглядзець. Любіла яна сачыць ляснога лекара пры працы й не магла надзівіцца, колькі ў яго было сілы ў малой, здаецца, кволай шыі й дзюбе. А дзяцел, не зважаючы на тое, што наглядала ягонае майстэрства маладая прыгажуня, заядла церабіў кару.

Там, дзе дубы падступалі да гусьцейшага лесу, амаль суцэльным плотам расьлі ляшчыны. На чупрынах дрэў гэйсала рудая, зь вялікім пушыстым хвастом, з добрую мяцёлку, вавёрка. Хвост задзірліва трымала ўверх. Адно калі пераскоквала на іншае дрэва, тады хвост абніжаўся, быццам памагаючы ўласьніцы плысьці па паветры. Ведала Дуня, што недалёка той час, калі пачнуць дасьпяваць арэхі. Цяперака яны наліваюцца ўсярэдзіне малаком, а можа ўжо й цьвярдзеюць.

Дзяўчына падыйшла да арэшніку, прыгнула галіну й разглядала сарваны арэх. Яшчэ ня ёсьць арэхавая пара - пастанавіла, раскусіўшы мяккую шкарлупіну.

Гэтак стоячы й разважаючы пра арэхі, дзесь ззаду за сабой пачула трэск. Здалося, што нехта падкрадаецца. Азірнулася. Нікога не было навокал. Ізноў узялася за грыбы. Гронка баравікоў падвяла яе зусім блізка пад гушчар, і не магла яна ведаць, што адтуль спаміж галінаў сочыць за ёй юрлівая пара вачэй. Дуня была так занятай, што спасьцерагла чалавека толькі тады, калі быў ён побач.

- Ну як грыбы, Дуня? - спытаўся Лявон Шпунт.

Ён стаяў ня больш двух-трох крокаў ад дзяўчыны. Быў у ваднэй кашулі, крамных ганавіцах і падношаных ботах.

Зьдзіўленьне дзяўчыны было вялікае. Адкуль ён тут? Што яму да яе? Ведала-ж дзяцюка як аблупленага. Гэтая сустрэча нічога добрага не варажыла. А Шпунт глядзеў на яе зь вялікай, як здалося, пяшчотай у вачох. Хоць бачылася зь ім няраз раней, ніколі не прыглядалася да гэтых, цяпер памутнелых, вачэй. Была ў іх нейкая неразгаданая прагнасьць. А Лявон гаварыў:

- Алі-ж ты й выросла, як расовая каза. Даўно меў я цябе на воку. Цяпер-жа, ластавачка, ты ад мяне ні ўцячэш.

Здалося Дуні, што ў гэтага сьвятлавалосага дзяцюка зараз пачнуць сьлінькі цячы: такая нейкая асалода й прагнасьць нечага адчувалася ў ягоным голасе. Пакуль змагла абмяркаваць сытуацыю, Шпунт, быццам клешчамі, учапіўся за ейную руку й цягнуў яе ў лясны гушчар.

- Ты с-сукін сын! Пусьці мяне! - крычала, змагаючыся, дзяўчына.

Лявонава касматая рука яшчэ больш сьціснулася ля дзяўчынінай сярэдзіны. Дуня была ў роспачы. Ведала, што ад такога быка абараніцца малыя мае шанцы. Цягнучы яе, той борздымі крокамі ўшыўся ў гушчу лесу й звалiў на зямлю. Кошык з грыбамі перакуліўся побач, і баравікі рассыпаліся па вялай траве й ігліцы. Адна Лявонава

рука намагалася ўтрымаць Дуню на зямлі, а другая ўвіхалася ля ейнае спадніцы.

Дуня крутанулася з усіх сіл, але дзяцюк яе ўтрымаў. Агідны твар, як кавальскі мех, соп ля самых вачэй. Быццам пашырыліся зрэнкі ў тых юрлівых вачох; выглядалі цяпер прагнымі й ненасытнымі. Гэта быў не чалавек, а дзікун. Ужо зусім блізка нахіліліся й наблізіліся да ейнага твару вусны. У вялікай роспачы, што сілы яе пакідаюць, Дуня напружылася, каб вырвацца зь дзяцюковых клешчаў. Яна крутанула галавой і лбом моцна стукнула ў дзяцюкоў нос. Адтуль пацякла кроў.

- Дык ты гэткая! - соп злосна Лявон. - Абажджы, я-ж табе...

Ён так пляснуў шырокай даланёй дзяўчыну па твары, што аж у галаве зазьвінела. Дуня пачала крычэць. Левай рукой Лявон намагаўся закрыць ёй рот, а правай ірвануў за блюзку на грудзёх. Пры відзе голых дзявочых грудзей яшчэ больш узбуйнела й раздражнілася дзяцюкова юрлівасьць. Яго апанавала нейкая зьбянтэжаная гарачка. Нэрвовымі рухамі ніяк ня мог упарацца із спадніцай. Дуня, выбраўшы момант, падцягнула ўверх калена ды з усёй моцы заехала яму ў мейсца галоўнае актыўнасьці. Лявон голасна застагнаў ад болю. Удар трапіў у найбольш чульлівае мейсца. Дзяцюк на ймгненьне выпусьціў дзяўчыну з рук.

Дуня ўсхапілася й кінулася наўцёкі. Закрываўленая, з голымі грудзьмі, яна бегла, часта спатыкаючыся аб карчы й карэньне на дарозе, баялася азірнуцца назад. Куды бегла, сама ня ведала. Абы далей ад гэтага дзікага чалавека. Ззаду пакінула напалову запоўнены грыбамі кошык.

VII

Ці раз перадумваў Янук дзедаву гутарку пад дубам Архіпам. Добра ўсьведаміў ужо, што дзед расчыніў перад ім навосьцеж нейкія таемныя дзьверы, што ён зрабіў ужо першы крок праз парог. А што-ж бачыў за тым парогам? Было першае ўсьведамленьне адносна жыцьцёвага парадоксу вось на гэтай, крывёй і потам сваіх людзей, як казаў дзед Якуб, прасякнутай зямлі. Цяперака зусім інакшым у пастуховых вачох выглядаў і ягоны гаспадар асаднік Лазоўскі, і тая

местачковая паліцыя, якую бацька, - зь нябожчыцай на покуці тырчма сапхнуты на прадоньне трагічнага жыцьця - так адважна пагнаў із свае хаты. Інакш выглядалі й навакольныя людзі - ягоныя вяскоўцы. Як тыя краты рыліся яны пры цяжкой і непаплатнай працы. Гэта яны былі гэтай зямлі гаспадары, а тыя, што выглядалі чыстымі, сытымі, прыгожа апранутымі, задаволенымі, із гладкімі безмазолістымі рукамі й такімі-ж гладкімі тварамі, - тыя былі чужымі паразітамі. Пры ўсьведамленьні гэтага Янук аж страпянуўся. Думка абнадзейвала й палохала яго.

Малы Бахмач наразе быў задаволены тым, што вось нехта дапамог яму адкрыць вялікую праўду. Адылі адчуваўся нясьмелым у гэтым новым сьвеце. Як малое дзіцё, што вось толькі зрабіла першых колькі самастойных крокаў, ды прытулілася да прыполу маткі, вагаючыся далей пазнаваць сьвет із собскага ходу, гэтак Янук ня ведаў цяпер, у якім кірунку даць наступны крок. А рупіла йсьці далей, адкрываць новае, дагэтуль непазнанае й нязглыбленае. Ведаў, што галавы ў прыпол яму ўжо не схаваць, так ці йнакш пойдзе наперад.

І так гаравацкі князь, што перш уцёк з поля бою, а пасьля - калі ворагі на яго напалі - загінуў у вабароне роднае зямлі, дый гэтае апошняе вялікае народнае паўстаньне, удзельнікам якога быў некалі дзед Якуб, заваявалі ягоную багатую ўявай і думкамі йстоту. Пхалі некуды да таемнага й нязьведанага. Тымчасам прабаваў вобмацкам. Дзедава гутарка ня толькі адкрыла перад ім новы, дагэтуль нязьведаны сьвет, але нарадзіла больш загадкаў, чым высьвятліла.

Пра паўстаньне супраць царскае Расеі вучыўся некалі ў школе. Там націск клаўся на польскі характар, кіраўніцтва, ідэйную лінію гэтага паўстаньня. Праўда, «чырвоны дыктатар Літвы» - Кастусь Каліноўскі, займаў пачэснае мейсца ў ліку гэрояў, але ў параўнаньні зь іншымі яму давалі скупа ўвагі. Дый самое слова «Літва» было нейкай загадкай. Як гэта так, што гэная Літва, што цяпер вось тут побач ізь Вільняй, сталася такой маленькай, а некалі пашыралася й на нашую зямлю? Вось і іхная вёска завецца Літоўцы. Ці ў гэтым ёсьць нешта супольнага? Каб гэта тады ўзяў ды спытаўся настаўніка пра гэта, як аб паўстаньні й гісторыі Літвы вучыліся? Ліцьвіны-ж - ён гэта чуў - і сваю мову мелі, мусіць, зусім ад тутэйшай адменную.

Янук зусім у разважаньнях заблытаўся. Блукаў вобмацкам, упоцемку. Многа было, мусіць, недаказанага. Дый разважаць лягічна

ня ўмеў яшчэ. А чалавек, што адчыніў тыя першыя дзьверы, грэўся нейдзе на прызьбе, з крывой сваёй люлькай, смактаў самасейку. Ці мог-бы ён, падпіраючыся сваім кастылём і абношанай кульбай, павесьці ў гэны новы сьвет крыху далей - паказаць і вытлумачыць што й да чаго?

Ці раз пазіраў Янук у глыбокай задуме на волата Архіпа. Колькі бачыў і ведаў гэты магутны дуб! Колькі-ж мог-бы ён распавесьці, калі-б Бог даў яму мову! А дуб, як валадарны гаспадар, пануры й грозны ў хмарны дзень, малады й задзірлівы ў пагоду, маўкліва пазіраў на навакольныя гоні, на запрацаваных людзей. Раньняй вясной слухаў ён крык аратага й сачыў аднастайны крок сейбіта, у касавіцу насалоджваўся водарам сенажацяў і гоманам касцоў, у жніво - млосна-абамлелы - прачынаўся надвечар ізь сьпякотнае дрымоты, каб сквапна лавіць журботныя мэлёдыі жнейкаў. Пад восень, калі ўся прырода навокал прыносіла плёны працавітаму чалавеку, стары Архіп сеяў на Гараватцы жалуды. І ягоны плён быў ня лішнім. Зьбіралі сялянкі тыя жалуды, сушылі, малолі, кармілі імі сьвіняў.

Найцяжэй даводзілася Архіпу ўвосень і зімою. Дажджавыя й сьнежныя шквалы, вятры блізкія й далёкія - усе па дарозе напатыкалі стагодзьдзямі загартаваныя, войнамі калечаныя Архіпавы грудзі. І кожная бура ці мяцель бралася з гігантам удужкі, трасла ягоным чубам, прабавала сваю моц. Аблядзянелы й абсыпаны шэраняй, яшчэ больш цудоўна красаваўся гаравацкі волат у сонячны зімовы дзень. Здавалася, што наўмысьля абрастаў сьнежнай, зіхатліва-іскрыстай барадой, каб пафарсіць у маестаце поўнае даўжыні свайго веку. Гляньце, маўляў, ніхто тут мне навокал ня роўня!

Кожны літоўскі чалавек, калі хацеў гадаць пра пагоду, насамперш цікавіўся, чым быў заняты Архіп: ці ягоны чуб спакойна абселі ці, каркаючы, кружыліся над ім вароны, ці пазалотай прыаздобіўся ён на захадзе сонца, ці касурыўся на захмаранае неба ўраньні.

Ува ўсіх яго выглядах і прыздобах, у кожную пару дня й году бачыў Архіпа Янук Бахмач. Цяперака-ж, калі перад хлапцом адчыніліся рыпучым старэчым Якубовым голасам дзьверы ў таямнічае й нязьведанае, паглядаў пастух на волата із дозай дзіцячае зайздрасьці й дакору. Ведаў, што ўтоеным багатым гістарычным багажом ніколі зь ім, юнаком, стары волат не падзеліцца. Ці-ж ягоная ў тым віна, што наканавана яму адно прыглядацца, прыслухоўвацца й вечна нямым

быць? Казаў Якуб, што дрэвы - значыцца ў іх ліку насамперш дуб Архіп - таксама жывуць ды пасвойму гаварыць умеюць. Але як знайсці ключ да іхнай гамонкі? Мусіць, чараўніком трэба быць.

Пазаўчора наважыўся Янук пайсьці ў лес і адшукаць магілу тых паўстанскіх гэрояў, аб якіх прыгадваў дзед. Ведаў, што Лазоўскі не дазволіць яму адлучыцца ад статку, дык пастанавіў скрывіць душой. Сказаў, што абавязкова мусіць бацьку праведаць і папрасіў дазволу прыгнаць статак у загарадзь ля хлявоў якую гадзіну перад захадам сонца. Лазоўскі ведаў хлапчукову настойлівасьць. Ня пусьціць, дык - чаго добрага - возьме ды ўцячэ, а пасьля шукай дзе другога пастуха.

Сонца нізілася ўжо цалкам на захад, калі Янук прыгнаў у загарадзь добра напасеных кароваў і памкнуўся з Тапсікам у кірунку Гараваткі. Зашыўшыся ў зарасьнік, ён пераскочыў па жардзінох цяпер ужо добра зьмялеўшую канаву ды з другога боку яе, як быццам некім падганяны, рушыў борзда ў кірунку бору. Выгар той, на ўзьмежжы якога, як казаў дзед, быў паўстанскі курган, знаходзіўся які кілямэтар у глыбі лесу. Казалі, што на Выгары, што нагадваў лысіну між скарбовага лесу, таксама была некалі гушча дрэваў. Быў пажар, дрэвы пагарэлі, дык вось і застаўся такі лысы горб. Янук раней і цяпер мала думаў пра праўдападобнасьць такога здарэньня.

Мала калі ўлетку блудзіў Янук па лесе, хоць на сумежжы яго праводзіў многа часу. Ад кароваў не было як адлучыцца. Цяпер-жа, увайшоўшы ў самы ягоны глыб, ён звольніў кроку, разглядаўся, колькі разоў піснуў ды прыслухоўваўся да рэха. А рэха паўтаралася, ляцела нейдзе воддаль і там яшчэ адклікалася, быццам дражнячы яго. Тапсік абнюхваў усё падарозе. Зазірнуў у нару пад корч сьпілаванае хвоі, залівістым брэхам даў ведаць пра сябе нявядомаму жыхару тэй нары. Янук адклікаў Тапсіка, які неахвотна, быццам із дакорам глядзеў гаспадару ў вочы за тое (той не разумее й не дазваляе заняцца сабачай уцехай) ды паволі йшоў ззаду.

Да захаду сонца часу заставалася няшмат. Нельга марудзіць. З набліжэньнем да Выгару Янук поўніўся нейкай таемнай баязьлівасьцяй, непакоем. Тая сьведамасьць, што вось ён ідзе на магілу гэрояў, што, мабыць, неўзабаве адкрые яшчэ нейкую загадкавую бачыну кнігі ў новым сьвеце, трывожыла ягоную кволую юнацкую душу. У насычаным змалку казкамі пра ведзьмаў, ваўкалакаў і зданяў уяўленьні - нейкія, неразгаданыя бліжэй, цені захінулі дарогу, і Янук

звольніў хаду. Паволі азіраўся навокал. Нідзе не было жывое йстоты. Толькі птушкі, вавёркі й усе іншыя лясныя жыхары працягвалі свае перадвячорныя заняткі. З пазалочанымі ўверсе чубамі ленна стаяў лес. Тапсік спыніўся перад пастухом і ўпорыста глядзеў яму ў вочы, быццам угадваючы, што Янук будзе рабіць далей. А Бахмач у думках ганіў сябе за недахоп адвагі й дзякаваў Богу за тое, што яго вартуе неразлучны й верны спадарожнік. Із гэткім сябрам дык ня толькі ўдзень, але ўночы можна на які хочаш курган пайсьці.

Ладна папахадзіў хлапец навокал таго Выгару, а кургана ніяк знайсьці ня мог. Да вушэй даляталі зводдаль і гукі дудкаў пастуховых, і песьні жнейкаў, і гуканьне цягніка, і карканьне варонаў нейдзе ўверсе над лясной шапкай. Скора пачне шарэць, і як тады знойдзеш тое мейсца?

Гэтак рашчараваны йшоў уперад сябе абы йсьці, не пастанавіўшы яшчэ, ці працягваць пошукі, ці не. На вока трапіла рослая хвоя, якой споднія галіны зьвісалі аж на зямлю. Янук спыніўся й пачаў прыглядацца. Пад абвіслымі галінамі хвоі спасьцярог пастух нешта паводле гарба, пакрытага йгліцай. Тапсік падняў уверх галаву й пабачыў на хвоі вавёрку. Скочыўшы наперад, ён пачаў брахаць і шоргаць лапамі. Янук хацеў сьцішыць сабаку, але зыркае вока ягонае пабачыла, што пад Тапсікавымі лапамі было ня што іншае, як пляскаты, прадаўгаваты, адным канцом уросты ў зямлю, надмагільны камень.

Не марудзячы ні хвіліны, узяўся хлапец за работу. Адламаў канец галіны з хвоі ды зьмятаў ігліцу. Зь верхняга канца камяня распазнаў Бахмач знак крыжа. Ніжэй значыліся нейкія напісы. Забыўшыся пра ўвесь сьвет, Янук пачаў зграбаць з камяня зямлю й сцызорыкам, што, на вялікае шчасьце, знайшоў у кішэні, сашкрабаў старую нарасьць. Сабака, зьдзіўлены гэткім гаспадаровым захаваньнем, забыўся на пра вавёрку ды глядзеў, што робіць Янук.

Гэта карпатлівая праца трывала хвілін мо дзесяць. Калі Янук скончыў, выпрастаўся на ўвесь рост ды прыглядаўся свайму цікаваму адкрыцьцю. Якім-жа ўдзячным тады быў ён свайму бацьку, што параіў некалі навучыцца «рускія буквы» й паказаў кожную зь іх. Цяперака хоць марудна, ізь цяжкасьцю, але ўсё-ж прачытаў Янук пад крыжом наступнае:

Боже упакой і прыймі
у царствіі вечная
рабов твоіх повстанцев
Іван Карпук
Петр Белы
Якав Малыш
1864 год

Глухім малатком білася сэрца ў грудзёх басаногага, худога юнака, што паволі ўсьведамляў значэньне выдзяўбанага на камяні долатам нейкага вясковага патрыёта напісу. Гэта наваадкрытая бачына ўзрушыла яго сваёй прастатой і ляканічнасьцю. Тут, пад ягонымі нагамі, парахнелі косткі ахвярных народных гэрояў, а ён, бедны, але прагавіты юнацкай цікавасьцю, ня ведаў яшчэ, нашто яму гэта новазнойдзенае прыдасца. І ня мог нават варажыць тады, паднечаны такой знаходкай, што пацьвердзіла апавяданьне дзеда Якуба, што гэта - як і шмат іншага, знойдзенага пазьней у падарожжы па другім баку адчыненых дзедам дзьвяроў, - распаліць-разьдзьмухае некалі ў будучыні ў ягоным сэрцы такое буйное й незгаручае полымя, што ці раз прывядзе яго на край страшэннае згубнае продані.

VIII

Дуня, часта азіраючыся назад, бегла колькі моцы. Крокі ейныя звальняліся ў меру таго, як грудзі дыхалі ўсё цяжэй і цяжэй. Гэта, мусіць, ня сэрца, а нейкі цяжкі молат малаціў у сярэдзіне. Цурком сплываў па твары пот. Змарылася дарэшты. Калі за бярэзьнікам паказаўся просьвіт поля, звольніла.

...Прыгадваючы ўчорашняе адкрыцьцё ў лесе, Янук думкамі яшчэ й яшчэ перабягаў усё тое новае, што ўведаў апошнімі часамі. Нават забыўся пра кароваў, што вось панадзілі ў суседнюю канюшыну. Тапсік, як заўсёды, быў напагатове. Безь Януковага спануканьня ведаў сваю работу. І калі гэтым разам наёжыўся й пачаў брахаць, пастух думаў, што зноў падвялі яго рагатыя. Але сабака гэтым разам кінуўся ў кірунку лесу. Янук ня зьдзівіўся, калі сабака спыніў брахаць, прыязна

махаў хвастом, набліжаючыся да дзяўчыны, што борздымі крокамі йшла да пастуха.

Так, гэта Дуня. Як добра, што яна ў гэты час зьявілася. Можна будзе цяпер вось падзяліцца зь ёй тым сакрэтам, аб якім згадваў раніцою. Але што зь ёю? Чаму яна з пустымі рукамі? Чаму так зачырванеўшыся й спацеўшы, так цяжка дыхае? А грудзі?

Янук разявіў ад зьдзіўленьня рот і аслупянеў. Дзяўчына аднэй рукой трымала падзёртую на грудзёх і закрываўленую блюзку. Януку прыйшла ў галаву жахлівая здагадка: Бжончэк, мусіць, на яе напаў. Дрыжыкі прабеглі па каленях, і цэлага холадам абняло.

- Што з табой, Дуня? Чаму ты такая?

- На... напаў на мяне басяк, - сказала, задыхаючыся.

У васількох на спацелым твары прытаіўся жах. Дрыжэла ўся, дый не ад холаду.

- Хто? Дзе? - крыкнуў Янук. У галаве закружыла. Думкамі ўжо бараніўся перад адказам, які - ведаў - зараз пачуе.

- Гэты бандзюга драгомішч...

- Ён? А я думаў - лясьнік...

Тое, што не ўгадаў, анічуць не зьмяніла Янукова настрою. Пад нагамі, здавалася, загушкаўся луг. Уяўленьне зручнымі й майстэрскімі штрыхамі нарысавала вобраз у лесе: кволая, быццам тая вясеньняя неразбуйнеўшая яшчэ краска, ягоная мілая сяброўка ў рукох дужага й прагавітага ў юрлівасьці Лявона. Яна змагаецца, бароніцца апошнімі сіламі, а ён ірве-шматае вопратку й налягае. Бездапаможны дзявочы крык кліча ратунку. І ненасытны, агрэсыўны мядзьведзь ломіць, абрывае з краскі кволыя пялёсткі, топча ягонае, Янукова, сьвятое сьвятых.

Ніколі не ўяўляў, што гэтая вясковая бедная дзяўчына так валодала ім. Цяпер пагвалчаная амаль перад ягонымі вачыма, яна тузала-разрывала ягонае чульлівае нутро. Нешта сарвалася ў сярэдзіне. Дрыжэлі Януковы вусны. Ня мог здабыцца на слова. А ў Дуні, як пацеркі, па потным твары хлынулі сьлёзы. Забыўшыся на ўсё, яна рукамі намагалася выцерці твар. З-пад парванай блюзкі на ўвесь рост вызірнулі пунсовыя дзявочыя грудзі. Хлапец, канчаткова ашаломлены такім відокам, апусьціў уніз вочы. Чырваньню загарэўся ягоны твар.

Нязручнасьць трывала доўга. Напружаньне было такое, што разладаваць яго, здавалася, можа адно новы вялікі выбух. Надта-ж

мала было сказана.

- Дык і што? - спытаў пастух.

Не, зусім ня тое хацеў сказаць. Але як гэта выславіць? Дуня пазірала на яго, з пытальнікамі ў вачох. А хлапец баяўся вымавіць нешта жахлівае, што душыла-прыгнятала.

- Як-та што? Кажу-ж табе... - дрыжэла ў ціхім плачы дзяўчына.

- Удалося яму? - нарэшце вымавіў Янук ды чакаў найцяжэйшага, зьнішчальнага ўдару.

- Што ці ўдалося?

Нявіннымі пупушкамі грудзі ўсё яшчэ саромілі Янука. Дзяўчына, уздрыгваючы з плачу й перапалоху, быццам забылася пра іх. У сьлёзных васількох перш паказалася няўцямнасьць, пасьля перапалох перамешаны зь нейкім недаверам, ды зноў зусім выразная цьвёрдасьць.

- Ах ты! - крыкнула дзяўчына й зрабіла борзды крок наперад. - Дык вы ўсе такія мужчыны! Бандзюгі, зьвяры!

Пры гэтых словах яна так ёмка стукнула Бахмача кулаком у твар, што той ажно пахіснуўся.

- Вы ўсе роўныя! На адну вяроўку вас! - крыкнула, заліваючыся сьлязьмі, і пабегла.

Гэтага ўжо было занадта. Пад Януком гарэла зямля. На лузе Лазоўскага зрабілася цесна.

Дуня паспакайнела, пакуль дабралася да свае хаты. Хоць нэрвовасьць, спрычыненая ўтрусам у лесе цалкам яшчэ ня мінула, дзяўчына магла думаць адносна спакойна. Падсумаваўшы ўсё, усьведаміла, што фактычна ніякае крыўды «драгомішч» ёй не зрабіў, апроч таго, што добра патузаў. Але, - цешыла сябе ў думках спрытная дзяўчына, - дасталося-ж і яму ў самае балючае.

Здалёк пачула Дуня стук у дварэ. Секачом маці секла ў невялікім цэбрыку зеляніну, што назьбірала на полі для сьвіньні. Макатуніха адразу спасьцерагла, што з дачкой нешта здарылася.

- Што з табой, дачушка? А дзе-ж твае грыбы? Божачкі мае, блюзка парваная, кроў! Хто цябе, золатка, лясьнік?

- Шпунт...

- Ён? А каб-жа яго пярун зь яснага неба, а каб яго чыстая зямелька не насіла, а каб...

Маці паехала ў кленічы, а дачка стаяла й пазірала старой проста ў вочы. Макатуніха, уляпіўшы свой зрок у дачку, старалася адгадаць што запраўды сталася.

- Раскажы, як было, - загадала яна. - Алі ўсё чысьцінька кажы, нічога ні таі. Я тавя матка, ад мяне нічагусянькі ні хавай.

Абрыўкамі, часта спыняючыся, дзяўчына пераказала, што сталася. Нялёкка гэта было. Вусны дрыжэлі, вочы сьлязіліся. А маці ўсё пільна ўзіралася, ці не дагледзіць у вачох якога фальшу.

- Тады я так зьнімаглася, - канчала Дуня, - што канцы мне прыходзілі. Насеў на мяне, як мядзьведзь; сапець, а такі страшны, думала - задушыць. Дык я падцягнула нагу і з усёй сілы як дала яму паміж ног, што ён аж застагнаў і пусьціў мяне. Тады я наўцёкі... От і ўсё...

- Ні маніш? Ні знасілаваў ён цябе? - хацела ўпэўніцца маці.

Дуня не адразу адказала. Яна доўга й упорыста глядзела матцы ў вочы, быццам штосьці прыгадваючы, а потым сказала цьвёрда:

- Не!

- Прызнавайся, кажы праўду, - наступала Макатуніха. У дзяўчыніным голасе было столькі шчырасьці, што матцы цяжка было паверыць сваім вушам. - Калі што якоя, дык я пайду яго гэтым секачом бандзюгу!

- Чаму-ж ня верыш? Каб што было, дык сказала-б, - адказала настойліва Дуня.

Памаўчалі.

- Ну ідзі памыся, ды залатай блюзку, а па кошык сходзіш заўтра.

IX

На наступны дзень пад вечар прыйшоў да Янука Мікола. Як толькі зыйшоў з Гараваткі, здалёк пазнаў яго Янук па хадзе. Чаго-ж бы ён ішоў? Нешта сталася. Добрае ці дрэннае нясе? Калі-б добрае, дык не было-б надта пільнае. Мусіць, ізноў бяда нейкая.

Тапсік кінуўся старэйшаму брату напярэймы, намагаўся лізнуць яго ў твар. Мікола спыніўся ды занадта спакойна, зь нейкай загадкавай падноткай, сказаў:

- Тату забралі.

- Тату? Хто? Чаму? - пытаўся Янук.

- Паліцыя, Мэндлік із Вадзімскім. Сягоньніка зараз папалудні прыехалі ды пачалі шарыць усюды: па хаце, у клеці, у гумне. Знайшлі бальшавіцкія ахвішкі...

- Ахвішкі? Ня можа быць! Хто-ж іх там палажыў?

- У тым-жа й загадка. Хто падлажыў, той, мусіць, і паліцыю навёў. А хто-ж гэта патвоему мог зрабіць?

- Ну з каторых... Лявон ці Косьцік, іх рук ні мінула. А можа сам каторы сышчык, каб пасьля тату ўзяць? Га?

- За руку ні злавілі, дык і ўгадвай. Тата казаў ім, што нідаўна Косьціка ў гумне на кладні сена знайшоў і што той на яго із нажом кінуўся. Дык тата кажыць, што, можа, гэта Сабакевіч па злосьці зрабіў, за тоя, што прагнаў яго. А яны тады кажуць яму: чаму-ж ты ні прыйшоў і ні заявіў нам? Дык і слухаць ні хацелі. Таўхаляў у каршэнь надавалі й павялі.

- Ай-я-яй! - із адчаем у голасе ўсклікнуў Янук. - Трэба-ж нейкую раду браць. Саб'юць да паўсьмерці, а тады яшчэ ў цюрму кінуць.

Чулі ці раз раней, як паліцыя катавала людзей, западозраных у камунізьме. Хлапцоў холадам абняло.

- Дзядзя Алесь пайшоў у Гаці, можа што паможыць, - казаў Мікола.

- Ай-я-яй! - енчыў Янук. - Ну чаго гэта прыбіліся яны да нас, як усіроўна, сьляпы да плоту? А калі дзядзька Алесь пайшоў?

- Зараз посьля таго, як я яму наказаў. Быў на полі, дык часу заняло. Мне казаў, каб я па цябе зьбегаў. Ён думаіць, што лепі, каб ты дамоў ішоў. Німа-ж каму рабіць...

- Ну а тату як забіралі, дык што ён табе казаў?

- Ні далі яму пагаварыць. Нічога мне ні сказаў, толька крыкнуў: глядзі, сынок, гаспадарку... пакуль вярнуся...

- От людаеды, от бандзіты! Гэта-ж, можа, саб'юць беднага татачку...

Янук ледзь стрымаў плач.

- Дык ты думаеш, што мне кідаць Лазоўскага?

- Ну а як-жа быць?

Асірочаныя Бжончыкам юнакі стаялі, як анямеўшыя. Кінутае Міколам пытаньне было такое шырокае, усёабдымаючае, такое цяжкое

да разьвязаньня, што хоць ты пад зямлю жывым лезь. Маўчалі доўга. Янук канцом свайго вішнёвага пугаўя пароў долак у траве. Ён усадзіў таўсты канец пугаўя ў ладна падсохлую зьверху зямлю й круціў ім, каб зрабіць конаўку. А думкі бегалі, не маглі знайсьці пункту апоры. Зьнявідныя, гвалтоўныя сілы раскідалі Бахмачова гняздо, тапталі іх...

Пастух падняў уверх пугу, з наважнасьцю зірнуў брату проста ў вочы.

- Ідзём, пагонім кароў. Німа як. Чорт яго бяры з Лазоўскім і ягонымі ботамі. Як трэба дома, то трэба...

Асаднік насупіў брывы, калі Янук перадаў яму дрэнную вестку пра бацьку. Твар Паляка не распрамяніўся спагадай, наадварот - на ім зьявілася няскрываная злосьць.

- Пойдзеш, дык ідзі, смаркачу едэн! - ледзь не крычаў Лазоўскі. - Вы ўсе, сабачая косьць, паршыўцы! Думаеш мне бацькі твайго шкода? Я думаў, што ён чэсны чалавек, добры хрысьціянін, ажно ён бальшавік. Цьфу на вас, хамы пшэклентэ! Усіх вас на адну вяроўку павесіць трэба. Бальшавіцкімі афішкамі забаўляцца пачаў! Чулі вы гэта?

- Паночку, мы-ж кажам, што падлажыў нехта... - пачаў Мікола.

- Што ты мне, смаркачу едэн, угаварыць хочаш? Ня веру вам ані на макулінку. Для вас усіх кулю ў лоб, пане дабрадзею! Так з вамі! Усе комунісьці! А дзе-ж я цяпер пастуха вазьму ў гэту пару? Ты, жаба, глядзі, - зьвярнуўся ён да Янука, - каб твая нага больш у маім двары ні ступіла. Чуеш?!

Пачуўшы паднечаны асаднікаў голас, з хаты выйшла пані Лазоўская.

- Чаго ты, Мецю, крычыш? Што сталася?

- Ды во гэтыя, сабачыя іх косьці, кажуць мне, што ў іхнай пуні паліцыя бальшавіцкія афішкі знайшла, бацьку на пастарунак забралі. Дык пастух дамоў зьбіраецца. Ну ты чула ці не?

- Янэк, - падыйшла пані Лазоўская, - ты чаму такі неўдзенчны? Мы з табой як родным сынам апякаваліся, а ты нас кідаеш. А каровы як будуць?

Янук прыгадаў усю гэтак званую даброць і ласку, што зазнаў у гэтых людзей. Калі-б запраўды яны так апякаваліся родным сынам, то ці ўсядзеў-бы ён у бацькавай хаце? На думку ўсплыло адпаведнае

мейсца, куды маніўся паслаць паноў Лазоўскіх разам зь іхнымі каровамі, ды стрымаўся. Мікола тузануў яго за рукаў:

- Хадзі, пойдзем. Ніхай шалеюць. Ня людзі-ж гэта, мусіць, калі так гаворуць...

Доўгі час ішлі моўчкі, абыйшлі бокам густое калючае іржышча. Сабака, апусьціўшы хвост, плёўся сьледам ззаду. Спанатрыў і ён, што сталася нешта невясёлае. Час ад часу спадылба, быццам на ім ляжэў цяжкі грэх, вінавата пазіраў на Янука. Праходзячы паўз авёс, Янук пару разоў заядла сьцебануў па буйных зялёных каласох, быццам хочачы Лазоўскаму гэтым урон зрабіць.

З усходняга краю асаднікавага хутару, дзе цэлы дзень восем сярпоў грызьлі буйное жыта, прыляцела да вушэй Бахмачовых хлапцоў песьня:

Ніва, мая ніва, - неўрадлівая,
Доля-ж, мая доля, - нешчасьлівая.
У чужога пана ўраджаем спорыць,
А маіх-жа дзетак дома голад морыць...

Апошняя пазалота зьнікла зь вяршыні дубу Архіпа. Над ім неспакойна кружылі вароны. На захадзе сонца закрылася шырокай смугой хмары. Узыходзячы на Гараватку, разглянуўшыся, Мікола сказаў:

- Ці ня зьменіцца пагода. Глядзі...

х

Зь ліку якога тузіну паліцыянтаў у Гацях, што наглядалі за гацкай воласьцю, ці не найбольш актыўным быў малады пан Вадзімскі. Гэты спрытны пракудны дзяцюк-буян прыйшоў на службу ў мінулым годзе. Нельга сказаць, каб лёккай дарога ў чорны муньдзір была. Многа панкоў на лёккі хлеб квапілася. У паліцыі ні шмат ведаць, ні рабіць ня трэба было.

Прабаваў Вадзімскага бацька, валасны ўраднік, із сына Адася чалавека зрабіць. Па «панствовай зьніжцы» пасылаў яго ў глыбоцкую

гімназію, каб навуку даць. Але Адася да навукі, як лянівага каня да вупражы, цягнула. За пяць гадоў ледзь-ледзь тры клясы скончыў. Колькі ні прасіў-маліў бацька, панствовыя ўлады скасавалі сынаву «зьніжку», а сам коштаў сынавай адукацыі пакрываць ня мог.

Лындаў Адась год-другі па мястэчку, зь мяйсцовай такой самай недавучанай гімназіяльнай басотай розныя гэцы адстаўляў. Рана асвойтаў такія няхітрыя штукі, як піцьцё гарэлкі, карты, просталінейнае й нахабнае заляцаньне да дзяўчатаў, майстэрства бойкі, дый нават злодзейства прабаваў. Бацька ведаў, што калі так сына самапасам пусьціць, дык пасьля ад бяды не абярэсься. Што-ж рабіць? У якую прафэсыйную школу паслаць? Пад бокам такое не было, а на далейшую адлегласьць ягоная кішэня ня вытрымае. Ня было як працісьнуцца й у вабсаду мяйсцовае чыгункі: туды кожны панок-беларучка, што недавучаным быў, ці іншага варштату працы не знайшоў, як цьма на сьвятло лез.

І тады ўзяўся стары Вадзімскі за свайго колішняга сябру з войска, камандanта мяйсцовае паліцыі Мэндліка.

- Пацясьніся, браток, паспагадай, прымі на службу майго Адася. Золата зь яго, а не паліцыянт, будзе. От пабачыш!

Гэткая прысалоджаная старым Вадзімскім прозьба нянадта Мэндліку даспадобы прыйшлася. Дый ня мог-жа ўзяць ён недавука якога ў паліцыю. Перш трэба было на вышкаленьне аддаць, а тады... Ужо калі Адасяў бацька ў кішэню палез і гаркаватай манапалькай свае прозьбы падмацаваў, тады Мэндлік пачаў пераконваць паветавыя ўлады, што яму дапамога патрэбная. А як-жа! Вунь камуністыя аж кішаць навокал! Калі б чалавек чатыры рукі меў, дык не ўпараўся-б ізь імі! Абавязкова паліцыю мацаваць трэба, безадвалочна!

Зусім нядвузначна сказалі Мэндліку павятовыя ўлады, што цэлая згваздка ў гэтак званым скарбе панствовым. Скарб гэны даволі-ткі худы, быццам, каб усім, што ўраднікамі хочуць быць - у тым ліку й пашыранай паліцыі - ля яго рукі можна было пагрэць. Вось, прыкладна, калі-б Мэндлік узяўся часьцей колерам сялянскіх комінаў ды платоў прыглядацца, або час ад часу водыр вясковых прыбіральняў сваім панскім носам праверыць мог, дый адзін ці другі пратаколчык на залатовак пяток адчыканіць - дык чаму-ж, можа й якому лішняму Адасю знайшлося-б на «панствовым пастарунку» мейсца. Вядома, што пан Мэндлік за такую мудрую параду аберуч схапіўся. Зрэшты, што

яму? Адась - чалавек пісьменны, - казаў той, - пратаколаў колькі хочаш табе насьцёбае й справу як належыцца спрэцызуе, дый ногі ў яго ня зношаныя. А што мужыкі стагнаць будуць, дык што яму, Мэндліку, да гэтага? Заплацяць, чорт іх ня возьме.

І вось гэткім чынам, пасьля папярэдняга вышкаленьня, зьявіўся на «панствовым пастарунку» ў Гацях новы сябра чорнае сямейкі Адась Вадзімскі. Як і трэба спадзявацца было, Адась намагаўся паказаць свае здольнасьці з найбольш пазытыўнага боку. Служба яму вельмі да смаку прыйшлася. Хоць зялёным выглядаў ён між спрактыкаваных па службе сяброў, але надрабляў энтузіязмам. Ужо калі ў якую вёску едзе комінам прыглядацца, ці пах прыбіральняў правяраць, або зь якім кмецям справу мець, дык падрастаў Адась, быццам на дражджох. Каторага селяніна так абшурцуе, ды - няхай адно найменшая нагода - так «у халяву» плясьне, што аж «гвязды» ў беднага ў галаве народзяцца.

- Владза з тобон розмавя, хаме едэн! - падмацуе свае паводзіны Адась, калі здарыцца, што людзі ня выкажуць адпаведнае гэтай «владзы» пашаны.

Закружыла гэта «владза» Вадзімскаму ў галаве. Няцяжка ўявіць, як чуўся ён пасьля тэй няўдалай візыты ў пошуках Сабакевіча на купальскім ігрышчы ў Літоўцах. Так закранулі яго, на публічны сорам выставіўшы, што, здаецца, калі-б голы перад гэтымі «хамамі» стаяў, то так не саромеўся-б. Зрэшты, - разважаў паліцыянт, - хамы то быдла. А ці-ж голы чалавек можа быдла сароміцца.

Найбольш закранула яго, што такая простая вясковая цётка, - «хамка цёмна», - ды яго, разумнага, на чыстую ваду вывела. Узяў яе на вока. «Жыць ня буду, калі не адгаджуся ёй за гэта» - прыабяцаў тады сабе Вадзімскі. Да гэтай цёткі далучыўся пасьля Пракоп Бахмач, калі, пасьля забойства ягонае жонкі, з хаты на вачох цэлай вёскі выгнаў. Гэта ня толькі зьнявага ўлады, а проста бунт! Ужо тады карцела Адасю бліжэй свайміі рукамі й ля тэй цёткі й Пракопа Бахмача паласавацца, але зраўнаважаны камандант Мэндлік устрымаў яго. Фактычна-ж ня мелі да Пракопа прычэпкі. Сам Бжончэк, вядома, шанаваны імі свой чалавек быў. Адылі, хоць афіцыйна прынялі ягоную вэрсыю, ведалі ці падазравалі, што яна хвальшывая. Які гэта сялянін з голымі рукамі на ўзброенага чалавека кінецца? Бахмач да такіх не належаў.

Ведаў Адась, што ёсьць надта добры й выпрабаваны спосаб. Уведзена было ў паліцыі, што калі якога чалавека трэба было ў рукі ўзяць, дык падкідалася яму камуністычная літаратура. Спадзяваўся Вадзімскі, што гэткім чынам і Бахмачу сьвіньню падкладуць. Чакаў дарэмна. Ужо камбінаваў як-бы гэта на сваю руку зрабіць. Можна было-б, але рызыкоўна. А што калі Мэндлік здагадаецца, а пасьля абвінавачваньне яму выставіць, што безь ягонага ведама таго рабіць ня мусіў? Як тады быць? Нельга-ж пэцкаць на той самы стол, які корміць яго.

Ажно тут падмога зь неспадзяванага зусім боку прыйшла. Той дык ня толькі падклаў, але праз другую асобу паліцыі ў вушы ўвёў. Ужо нашто ён паршывы, гэты Сабакевіч (а дабяруся-ж я да ягонай скуры, жыць ня буду!) - думаў Адась, - але хвалю яго за залатыя рукі.

Дый ня выйшла-б мо ўсё так гладзенька, калі-б той самы Бахмач прыйшоў, прыкладна, да яго, Вадзімскага (ну чаму-ж да Мэндліка? Мог-бы-ж і да яго) ды сказаў, маўляў, так і так, знайшоў Сабакевіча ў гумне, з ножам на мяне кінуўся. Але-ж гэты дурань маўчаў, чорт яго ведае чаму, а той яму за гэта маўчаньне яшчэ здохлага ката пад бок. От дык добра!

- Цяпер-жа ня знойдзе ён у маіх руках апраўданьня! Папалася птушачка. Я-ж цябе прывучу! - паціраў Вадзімскі рукі із злосна-прагавітым поглядам у выцьверозеўшых ад учарашняга ўжо вачох.

І як прывялі Бахмача на пастарунак у гэны дзень, паказаў Вадзімскі сваю ўмеласьць. Мэндлік сам пры допытах прысутнічаў, але сродкі фізычнага пераконваньня даручыў поўнасьцю Адасю. І любаваліся дзяцюковы рукі кожнай часткай Пракопавага цела. Парабілі яму крывавыя пісягі на сялянскай сьпіне, сінцы на твары, пухліны пад пятамі. Найбольш ёмка хадзіла ў Адасявых руках прадаўгаватая круглая гума із гнуткай пружынай усярэдзіне. Як хлёстка прылягала яна да падэшваў Пракопавых ступнёў! А цяжкі стогн так шчодра саладзіў пустую Адасяву душу! Яшчэ й яшчэ! Ды дзе там «двадзесьця пеньць»! Гэта каб лічыў, дык-бы лік страціў. Дый лічыць навошта? Тут, казаў той, даверылі, тутака ён, Адась Вадзімскі, свой «акзамінт» здаваў. Гэта табе не абы-што! Дзіва, што стараўся. Тут табе й за зьнявагу, і за іншае; маеш уволю, ведай, як з намі задзірацца. Колькі раз абамлелага вадой адлівалі, у тую козу-прыбудоўку зацягнуўшы. Зь ейных тоўстых муроў ніякага гуку звонку не пачуеш.

Чалавек скуголіў ад болю, пляваў крывёю, ня мог ні сесьці, ні на нагах стануць, ні легчы. Круціўся на падлозе ў пякельных муках. А да афішак бальшавіцкіх усяроўна не прызнаваўся.

Зьнямогся нарэшце й Адась. Пастанавілі да заўтрашняга далейшае вандраваньне катавальных прыладаў па Пракопавым целе адкласьці. Тады прыйшоў Пракопаў швагра й маліў-прасіў, каб Бахмача дамоў пусьцілі. Мовы аб гэтым не магло быць. Швагру сказалі, што калі Пракоп такое золатца, згодна зь ягонымі словамі, то чаму ён адразу на Сабакевіча не заявіў? Тут Алесь прабаваў тлумачыць, што Пракоп камуністым, як такім, ніколі не спагадаў, але чалавек ён будучы надзвычайна натуры добрай, сумленны, пабожны, ня мог асьмеліцца, каб хоць на каго пайсьці ў паліцыю даносіць. Ня з тых ён, што мог-бы каму нагу падставіць, хоць сам вечна крыўджаным быў.

Паліцыянты прыгадалі, як Пракоп іх із хаты на вачох усяго вясковага народу выгнаў, і такое Алесява тлумачэньне аб Пракопавым добрым характары шкляна-лядзянымі позіркамі сустрэлі. Не знайшоў на тых сыценькіх тварах Алесь ані макулінкі зразуменьня ці спагады. Тады папрасіў із Пракопам пабачыцца.

Калі Вадзімскі завёў яго ў «козу», швагра, зірнуўшы на Бахмача, жахнуўся. Пракоп, увесь скатаваны, круціўся ў немачы й енках на цэмантовай падлозе, не пазнаючы сваяка. Прабаваў Алесь гаварыць. Дарэмна. Тады спытаўся Мэндліка, калі-ж можна чалавека дома спадзявацца.

- За пару днёў, можа. Залежыць, калі прызнаецца, - адказаў суха Паляк. - Можа, гадок ці больш яму ў вязьніцы палячыцца прыдзецца...

Бяз слова выйшаў Алесь на зьмярканьні з пастарунку. Ягонай злосьці й болю не было межаў.

- Гэта-ж так чалавека зьнявечыць, каб ваўкі вашу панскую падлу цягалі, каб вас, каб вас...

Скрыгаталі зубы й да болю ціснуліся песьці.

Аж на трэці дзень адпусьцілі Пракопа, не дастаўшы ад яго прызнаньня. Алесь прывёз яго, лежачага, стогнучага на высланай уздоўж сенам калясцы. Чалавек ледзь ліпеў. Ізноў гудзела Пракопава хата галасамі ўсіх літоўскіх. Аглядалі Бахмача, злаваліся, лаялі чужыя ўлады.

- Чалавека нявіннага чуць на сьмерць не забілі й шукай ты рады, - казаў адзін.

- Гэта каб на суд іх!

- Пакуль ты ў іх якой праўды дойдзеш, дык яны зь цябе астатнюю кашулю зьнімуць, от як. Мала во судзіліся?

- Іхная права. Што хочуць - тоя робюць.

- А няўжо-ж цябе пытацца будуць... Наш чалавек для ях як якоя палена ёсьціка...

Бяспраўныя людзі адчувалі нялюдзкі цяжар дзярлівае ўлады й не маглі бараніцца ці адбівацца.

Ля Пракопа хадзілі спрактыкаваныя рукі суседа Зянкевіча. Вясковы лекар залечваў раны, як мог. Ягонае добрае сяброўскае слова памагала Бахмачу ня менш, чымся лекі. Паволі, але паступова Бахмач пачаў крэпнуць і пад восень, як здавалася, зусім ачуняў. Адылі адно звонку. Скардзіўся на розныя нутраныя болі, асунуўся, згорбіўся, пастарэў. Назаўсёды зьнікла яго рухавасьць дый нават тая макулінка жыцьцёвае радасьці, што была ў ім раней, пакуль на сям'ю не напала пошасьць з двох бакоў.

Людзі, калі сустракалі цяпер павольнага, зломанага Пракопа, глядзелі на яго із спачуваньнем, а за вочы ківалі галовамі. Дый што-ж тут чалавеку паможаш? Кажны свае бяды меў. А ці была такая йстота, каб усе гэныя беды зьведала-перамерыла, дый каб тым найцяжэй пакрыўджаным помач паклікала?

Пракоп працаваў, як мог, пры гаспадарцы. Адылі стаўся чалавекам фізычна нямоглым, цэлы час лізаў свае раны, стагнаў-наракаў на болі то ў баку, то ў сьпіне, то ў грудзёх, то ў якім іншым мейсцы. На пастарунку ў Гацях пакінуў колькі зубоў. Адась Вадзімскі адабраў ад гэтага борздага й цягавітага чалавека ладную долю ягонага здароўя, зрабіў вялікі ўрон на будучыню.

Ад пастуховай пугі ў Лазоўскага пятнаццацігадовы Янук быў цяпер як-бы катапультай перакінуты на галоўнага цяглавіка Бахмачовай гаспадаркі. Галоўнасьць гэта была ў тым, што на ім - ня гледзячы на ягоны век - ляжаў цяперака асноўны цяжар фізычнае працы. Бацька й Мікола былі паўінвалідамі. Дзіва няма, што Янук стараўся выручаць іх пры цяжэйшых работах. На юнацкіх рукох увачавідкі павырасталі й цьвёрдай падэшвай узбуйнелі мазалі. Ныла начамі ад цяжкай працы цела. Пракопу ажно давялося стрымліваць

хлопца. У такія моманты дрыжэў вялікім палітаваньнем бацькаў голас і накачваліся ў вачох сьлёзы.

Сам Янук ня толькі больш ніколі не прыгадваў гацкае школы, але, калі бацька раз неяк памкнуўся штосьці сказаць пра яе, хлапец зірнуў яму ў вочы ды ўздыхнуў. І словамі нельга было больш выказаць. Запраўды: навошта цяпер навука? Практычная карысьць зь яе раўнялася-б нулю. Не адчыніць-жа яна дзьвяроў у сьвет, ня вызваліць із зачараванага кола, не прасалодзіць горкае посьніцы-нішчымніцы. Закрытыя былі ўсе хады, пазапіханыя ўсе шчыліны-прадушыны.

XI

Неяк позьняй восеньню, у вялікую золь, калі ўжо сьцямнелася, вярнулася Дуня са школы. Яна была наскрозь прамоклая. Твар быў бледны, вусны дрыжэлі, трасло ўсё цела. Маці зірнула на дачку й забегала ля яе, вохкаючы ды ахкаючы.

Гэтак пачалася Дуніна хвароба, што трывала добрых тры тыдні. Часамі аж да непрытомнасьці ў гарачцы, дзяўчына душылася, ловячы перасохлым горлам паветра. Высахла як лучына. Чаго маці ні прабавала: і зельля рознага, і націраньня, і банькі ставіла, і лекара Зянкевіча клікала, дачка ўсё не магла выхадзіць хваробы. Сухі кашаль пярыў, як у дошку. Зянкевіч казаў, што дзяўчына мела запаленьне лёккіх.

Макатунішыны жыцьцёвыя ўмовы - і перапоўненая хата, і брак добрых харчоў, і лекаў, і нармалёвае чысьціні - заміналі Дунінаму ачуньваньню. Часта трызьніла яна ў гарачцы, парэпаныя сухія вусны вымаўлялі шмат чаго незразумелага. А матка, - бездапаможная ў гэтым новым горы - адно Богу не спыняла маліцца, прасіць Яго, каб з дапамогай прыйшоў. Адно калі аднойчы раніцай дачка - ізь вялікай натугай, здаецца - ледзь заўважна ўсьміхнулася, а ў васільковых вачох зьявіўся новы абнадзейваючы прамень, ведала старая Макатуніха, што Дуня неўзабаве ачуняе. Матцы як-бы хто стопудовы цяжар із сэрца звaліў.

Калі Дуня ўжо даволі ачуняла, расказала матцы што здарылася ў гэны дзень па дарозе з гацкае школы.

- Ішла я дамоў калеяй. Дождж такі назолісты й сьцюдзёны, такая золь, каб ты ведала мамачка... аж да касьцей пранімаіць. А вецір дык проста шквалам вадзяным у вочы смаліць... Лес па бакох выіць і выіць толька. Як возьміцца вецір кусты й дрэвы за чубы трасьці, ды як возьміцца галасіць, дык здаецца, што як якая зграя ваўкоў ці што. От-жа й страшна мне зрабілася. Сьпяшу дамоў дый па бакох баюся аглянуцца. Толька-ж я піраходжу гэны мост, што піраз канаву з балота, тамака, дзе ўсе кажуць, што здані здаюцца, а тутака мне раптам як зараве збоку нейкі чорт ці што, дык я так і замерла ад страху. Праўда, мамачка, я ні знаю што гэта было, алі я чула, я чула...

На Дуніным твары адлюстраваўся ўвесь жах ранейшага перажываньня. Яна не магла здабыцца на слова.

- Ня бойся, дачушка, - схапіла Макатуніха яе ласкава за руку. - Гэта табе, пэўня, здалося.

- Каб-жа здалося, мамачка, дык не. Я й сягоньніка чую яго. Я давай подбегам, ды аж уся калачуся. А тутака ўжо цямнеіцца. А гэны страшны голас ня толькі ня сунімаіцца, а, здаецца, яшчэ расьцець і расьцець... Я давай ходу, а тутака, здаецца, мяне за падол ззаду нехта дзяржыць. І што далей было, дык ня помню. Ці ні аб шпалу якую я нагой зачапілася ды пад адхон кульнулася. Сэрца маё, як малатком, чаго з грудзей ня выскачыць. Я, мусіць, тады памяць згубіла, бо ні знаю, як доўга ліжала. Прышла да сябе, як цягнік ішоў. Расплюшчыла вочы, чую што прамокла, нітачкі сухой на мне німа. Дык я ўстала, ды - адкуль ногі ўзяліся - бягу колькі мага сілы. Гэдак пёрла, што на цэлы сьвет забылася. Адзежа на мне ўся ад гэнага бегу сагрэлася. Аж спацела. Ды-ж дадому кусок дарогі. Змарылася, задыхалася. Мусіць, ізноў прамокла й прастыла. Пакуль прыйшла, дык мяне прабрала да самых костачак...

- А мая-ж ты дачушка, а мая міленькая, - шкадавала дзяўчыну матка, трымаючы яе худую руку, - казала-ж табе: кідай гэту школу, начорта яна табе. Чуць во на той сьвет ні пашла. А божачкі мае сьвятыя, усякія пранцы во на нас, ніяк ад бяды ні адкапаісься...

Макатуніха памаўчала, ды працягвала больш станоўкім голасам:

- Ня пойдзіш болі ў школу, от што. Гэта здуру выдумала чорт знаіць што. Трэба было мне адразу разумнай быць дый ні пусьціць. Гэта-ж ні жартачкі, чуць выжыла... Дурная я. Думаю - ніхай сабе йдзець. А што яна табе дасьць, тая навука, га? Паняй усіроўна ня

будзіш! Садзіся во з намі кудзелю прасьці. Гэта й біз навукі можаш. Другія дзіўчаты прадуць, і ты будзіш...

Васільковыя вочы вандравалі дзесьці далёка - мусіць, там, дзе былі дзяўчыніны думкі. Цяжка гадаць, што ў гэны час думала наймаладзейшая Макатунішка. Ці пра тое, што падчас штодзённых школьных падарожжаў ня мела пры сабе Янука, ці варажыла, навошта ей навука спатрэбіцца, ці шкадавала змарнаваных грошы на абутак і вопратку, дый што цяпер не было з таго ніякаяе карысьці...

Тымчасам пагадзілася зь лёсам і пакінула гацкую школу.

XII

Доўгія васеньнія й зімовыя вечары спрыялі Януковаму паглыбленьню ў вясковы сьвет. Із большай пільнасьцю ды ўвагай пачаў ён прыглядацца й прыслухоўвацца людзям. Часта можна было бачыць яго ў каторай хаце, як маўкліва сядзеў і пільна лавіў вухам тое, што гаварылі старэйшыя. А ў гамонцы было шмат цікавага й пра сваё жыцьцё й пра «палітыку». Амаль заўсёды наўзьверх усплывала тэма народнае нядолі, спалучаная з надзеямі на палепшаньне ў будучыні.

Янук ніколі не мінаў нагоды, каб паслухаць, што гаварыў «Мінск». А гаварыў ён шмат: і аб беспрасьветнай галіце заходнябеларускіх сялян і рабочых пад панскім панаваньнем, і аб зьверствах польскіх акупантаў над камуністымі й звычайнымі людзьмі, і аб лепшай будучыні, што, быццам, мае прыйсці для гэтых прыгнечаных людзей з дапамогай «братоў з-за мяжы», і аб нейкай ахвярнасьці «лепшых народных сыноў - камуністых», дык крыху бянтэжыўся. Што гэта за «яны» й дзе яны былі такія лепшыя? Ці мо да іх належаў і гэты самы Косьцік Сабакевіч, самы першы злодзей і апрышак, якога цэлая вёска праклінала? Каму-ж ён, гэты выродак, у Літоўцах на мазоль ні наступіў? Ён на бацьку з нажом кінуўся, камуністычныя афішкі падклаў. Гэта за яго паліцыя бацьку ледзь не закатавала й здароўе яму адабрала. Калі такі чалавек належаў да «лепшых народных сыноў», што за агульнае дабро свае галовы клалі, дык якія тады мелі быць «горшыя сыны»? Тутака Янук прыходзіў у тупік, зь якога - намагайся колькі хочаш - не знаходзіў выхаду.

А мо ён добра Косьціка ня ведаў? Можа, у Бураковага сына былі такія бакі, якіх дагэтуль не спасьцярог? Мо й рабіў ён дзе што добрае?

Мусілі-ж быць людзі, што маглі-б паказаць дарогу ў заблытаным Януковым сьвеце. Тады прыгадаў Бахмач дзеда Якуба. Ужо калі хто зможа працерці засьлепленаму вочы, дык гэта дзед.

Літоўскі патрыярх часта занемагаў і ўвосень і зімой, калі шванкавала надвор'е, рэдка паказваў свой нос за дзьверы сьцюдзёнае хаты. Калі не ляжаў на ложку, дык дыміў на покуці самасейку ды забаўляў унукаў.

Наведаўшы дзеда, Янук загаманіў, здалёку абыходзячы галоўнае, што пякло яго вось колькі ўжо часу. Распытаўся пра дзедава здароўе, распавёў, што дзе чуў ці бачыў. Дзед крактаў і гаварыў скупа, не сьпяшаючыся.

- Слухаю часта ў доктара радзіва, - казаў Янук ужо тады, калі вымяркаваў, што разбудзіў дзедаву ўвагу. - Тамака ўсё кажуць, як добра жыць у Расеі, якія шчасьлівыя там людзі. Многа і пра нас гавораць. Кажуць, што наша жыцьцё надта цяжкоя, што паны благія, і што прыдзіць час ды ўсё палепшыцца. Я от часта так думаю сам сабе пра гэта. Вы-ж, дзеду, столька часу пражылі, так многа пазналі, вы-ж мусілі-б і пра гэта нешта сказаць... Як вы, дзядуля, думаеце?

Пільным зрокам упіўся Янук у Якубаў твар.

Дзед кашлянуў, плюнуў на глінабітную падлогу, пацягнуў зь люлькі едкае самасейкі ды яшчэ крыху памарудзіў.

- Ні знаю, дзетка, што цяперака там робіцца ў іх. Пэўня-ж нешта тамака зьмянілася пасьля таго, як цара скінулі. Дый мне неяк ня верыцца, каб яно на лепшае пайшло. Знаю-ж я іх, як аблупленых. Гэта-ж на маіх вачох нашага брата вешалі. От да гэтага дык чаму-ж, у іх рукі здатныя. А да гаспадаркі каб яны, дык ні надта. Ніколі ў іх парадку ні было. Гэта што яны па радзівя брэшуць, дык чаму-ж не? Языком, казаў той, можна. А ці праўда тоя, што кажуць, дык хто гэта праверыў?

- Людзі, што во сюды адтуль прыходзяць, дык саўсім другоя расказываюць. Кажуць, што такая біда, такая галіта, ні дай ты Божа. Цэрквы яны пазамыкалі, Бога ні прызнаюць. Дык што-ж гэта такоя? Калі яны Бога ні баяцца, дык чорт у іх гаспадар. А я цябе пытаюся: калі гэта які чорт каму дабро рабіў ці цяперака робіць? Га? От, сынок, ты сам тут падумай. У цябе-ж ні качан капусты на плячох, а галава. Я

от сабе так думаю, што калі яны Бога адцураліся, дык можа й Бог на іх забыўся...

- Ты кажаш, што хвалюць гэтых камуністаў, што тутака ў нас. Каго-ж гэта яны так вялічаюць? Можа, гэта нашага Косьціка Сабакевіча, Шпунтовага Лявона, ці Параску Макатунішку? Гэта-ж усё гультаі, галадранцы, каб іх макарэц!

Пры апошніх словах дзедаў голас задрыжэў, і ён ізноў сакавіта плюнуў на падлогу.

- Калі яны каму што добрага зрабілі? - працягваў дзед. - Кажуць людзі, што пакажы ты сябе на дзеля, а ні на языку - от як! А гэтыя што? Каб ім бокам тоя вылізла, што яны другім робяць! А ці ні пра іх-жа гэта кажуць, што яны за бедны народ, проці паноў?

Відаць, дзед бы паднечаны. Ён гаварыў цяпер барзьдзей і больш заядла смактаў самасейку.

- Кажу табе, сынок, што ні знаю, як там у іх. Толька я от сваёй старой галавой як памяркую, дык віджу, што тут нешта ні так выходзіць, як па радзівя брэшуць. Ні забудзься, сынок, адно: нашаму брату-сірмяжніку ніхто ніколі ні спагадаў, ніхто ніколі нічога ні даваў і ні памагаў, а кажды толька зь яго нажыцца стараўся, от як. А тыя людзі, што самі Бога адракліся, цяперака нам у вушы ўводзяць, што народу сама найбольшая дабро робюць, якога яшчэ ніхто ніколі ні рабіў. Калі гэта ўзяць за добрую манэту, дык трэба тады паверыць, што чорт ангілам зрабіўся, от што...

Дзед памаўчаў.

- Пасьля вайны, - працягваў Якуб, - як устанавілася граніца, ды нікаторыя ўвідзілі, што тут жыцьця ня будзіць, дык многа нашых людзей тады ўцякло. З нашых Літоўцаў вун Пітухоў старэйшы брат Сьцёпка ды Панасаў сын Аляксей, як Грамаду разганялі, туды пайшлі, дый з другіх вёскаў маса. Пайшлі, бо лепшага жыцьця шукалі. І от, значыцца, пайшлі, і як у ваду канулі, ні слуху ні духу, памінай як звалі... А чаму-ж гэта так? Ты думаіш, яны пра сваіх забыліся, ці што? Ну ніхай-бы адзін такі, што мог-бы ні адгукнуцца, дык-жа не. Людзі кажуць, што із другіх вёсак тоя самая - ніякай чуткі. От разьбярыся сам. Людзі пішуць з Амэрыкі, з Аргіньціны, адусюль, толькі ні з Расеі. А гэта саўсім пад бокам. Не, сынок, нешта тут ня тоя. Каб гэта добра было, дык адгукнуліся-б, быць ня можыць. Каб было добра там, як па тым радзівя брэшуць, дык і пасылкі прыслалі-б, як каторыя з Амэрыкі.

Мусіць, тамака дабрата такая... Нашым людзям, сынок, - кажу табе, - ніхто ні паможыць. Гэтыя во паны й асаднікі ў жабракоў торбы адбіраюць, а тыя, мусіць, таксама ані на ногаць ня лепшыя. Ці гэта мы так перад Богам за што саграшылі, ці хто ведаіць...

XIII

Асноваю жыцьця й быту літоўскіх і навакольных сялянаў была зямля. Яна карміла й апранала, урадлівымі гадамі была ласкавай і шчодрай маткай, неўрадлівымі - скупой і нямілаcэрнай мачыхай. Прывязанасьць да зямлі не матывалася адно тым, што акупант перагарадзіў усе шляхі ў места ці далейшы пазавясковы сьвет. Зь няпамятных часоў людзі ня ведалі жыцьця іншага, апроч таго, што неразлучна было зьвязана зь зямлёй. У народным фальклёры зямлі адводзілася самае пачэснае мейсца.

Калі акупанты наважылі падрэзаць беларускія народныя карэньні, дык хапіла ім адно зьменшыць плошчу зямельнае сялянскае ўласнасьці. Гэтак рабілі Палякі, панасылаўшы сюды сваіх асаднікаў, якія - згодна словаў дзеда Якуба, - адбіралі ў жабракоў торбы. Сьціснутыя на малых і малаўрадлівых дзялках, сяляне, быццам сьпелыя грушы, падалі ў панскія капялюшы, рабіліся бяспраўнымі парабкамі. Акупант адным стрэлам забіваў двох зайцоў: быццам чарвяк - спачатку аслабіўшы яго - тачыў здаровы народны сялянскі арганізм, а кантролю над гэтым зьнядужэлым гаспадарча целам перадаваў у рукі паноў, асаднікаў і пануючых бюракратаў.

Беларускія сяляне - хоць гэткай думкі некаторыя гладка й выказаць не маглі-б - добра разумелі, што зямля была асноўным апірышчам проці чужацкае асыміляцыйнае навалы. Калі нават вясковы чалавек із свае волі йшоў у места ці далейшы сьвет, так і глядзі, што прапасьці мог. У кожным выпадку надвое трэба было варажыць. Як ссохнуць ці зьнядужыць магло кволае дзіцё, адлучанае ад матчыных грудзей, гэтак сялянскі сын мог прапасьці безь зямлі-маткі.

Дзіва няма, што слова «зямля» было найбольш зацяганым на языкох літоўскіх дый наагул усіх беларускіх сялянаў. Аб зямлі заўсёды гаманілі, пра яе марылі, за яе змагаліся, сварыліся, судзіліся. На

вузкапалосіцах адзін другому пераворваў, перакошваў і іншае. Зямля мела вялікую вагу ў сялянскіх жаніцьбах. Так і глядзіш, як каторая дзеўка пайшла замуж не за чалавека, а за зямлю; іншы дзяцюк за зямлю падаўся ў прымы, а яшчэ іншы браў дзеўку толькі таму, што зямля ў пасагу была.

Прыслухайцеся да звычайнае вясковае гаворкі: усюды, як бінзіна на паверхню вады, выплывае тэма зямлі ці безьзямельля. А нават калі й ня выплыве, дык адчуваць будзеце, што яна тут недалёка дзесь, зусім побач, у думках і ў мяркаваньнях неадступна прысутная. Вясеньняя сяўба ці касавіца, жніво ці малацьба, ворыва ці мяцьцё лёну - праз усе цыклі прац, зьвязаных із гадавымі порамі, чырвонай ніткай праходзіла тэма зямлі й безьзямельля. І не ўяўлялі людзі безь зямлі жыцьця, дарма, што сьціснутыя, чужнікамі ў лапці абутыя, гаспадарча зьнядужэлыя, самі, як карчы, у зямлі гэтай трухлелі, ды побач новыя парасткі, чужніком таптаныя, пускалі ад старога карэньня.

Пасьля зямлі ды сямейных справаў другой найбольш аблюбаванай тэмай у гамонках літоўскіх сялян была палітыка. Палітыканствам займаліся пераважна старэйшыя. Цікаўнасьць да палітычных падзеяў у сьвеце далёка за межамі родных Літоўцаў і польскае дзяржавы сягала сваімі карэньнямі ў далёкую мінуўшчыну. Ведалі людзі, што калі дзе вецер разьдзьмухае якую большую буру, дык ня мінуць ёй іхнае краіны й Літоўцаў. Гэтак было раней, так магло быць і ў будучыні. Гэта-ж і да гэтага часу яшчэ Напалеонавых «Пранцузаў» паміналі, дый усяго васямнаццаць гадоў назад прайшла апошняя й найжахлівейшая вайна. Ня гэтак важна, што разважаньні мяйсцовых палітыканаў часта былі недарэчныя й наіўныя (пераважна таму, што да сяньняшніх часоў і гаспадарстваў падтасоўваліся ўчорашнія меркі); важны сам факт, што палітычныя падзеі ў сьвеце паланілі ўвагу працавітых літоўскіх людзей.

Пагроза новае вайны вось ужо які год вісела над Эўропай. Дрэнныя весткі даходзілі й да літоўскіх палітыканаў. Мала хто спадзяваўся, што зьмена аднаго чужога ладу іншым, калі такая будзе, прынясе яму лепшую будучыню. Адылі не пасьпеў 1939 год як сьлед у пух абрасьці, вымяркавалі людзі, што быў ён больш трывожным і пагрозьлівым, чымся ўсе ранейшыя.

На лаўцы пад Пятуховай клецяй, на вясковых прызбах і пад саламянымі стрэхамі з вуснаў у вусны перадавалася цяжарнае жахам

слова: вайна. Спачатку рэдка, яно зь бегам часу ўсё сьмялей і часьцей выплывала ў гутарках і наапошку пачало выціскаць на апошні плян тэму й турботы пра зямлю. Людзі цяпер або зусім у гаворцы запіналіся, або гаварылі з паднечаньнем, у якім адчувалася няпэўнасьць і боязь. Хмарыліся барознамі веку аздобленыя сялянскія твары. Старэйшым ня трэба было фантазіі: добра запамяталі жахі мінулае вайны. Дзеці-ж распытвалі старэйшых, у Гараватцы й на ўзьлесьсі ля гасьцінцу знаходзілі старую йржавую амуніцыю. Для малечы была яна прадметам забаваў. Выцягвалі з набояў кулі, сушылі порах, нанава «закаркоўвалі», дый стралялі, ці то паклаўшы ў вогнішча, ці наладзіўшы якое прымітыўнае прыладзьдзе наводля стрэльбы. Будзе вайна - думаў каторы нямыцька - дык будзе больш набояў, можна будзе пазабаўляцца. Запраўднага характару вайны дзеці не маглі ведаць.

Весткі з шырокага сьвету, што прыляталі ў літоўскія начоўкі, часта былі ўжо іншымі сфальшаваныя, надзьмутыя або паменшаныя. Дзяржаўны прапагандовы апарат прапускаў іх праз сваё бюракратычнае сіта. Людзі шмат чаго даведваліся ад Жыдоў, якія, вядома-ж, заўсёды й усё ведалі, многа чаго гаварылі сваім найбольшым дабрадзеям, дый то пад вялікім сакрэтам. У тых вестках найбольш фігураваў «неміц». Гэта літоўскім людзям таксама здавалася нармалёвым. Чаму-ж не? І раней, калі дзе што важнае пачыналася, дык «неміц» там быў першы.

Многа было гамонкі пра нейкі «калідор», а з другога пра «плашч із гузікамі». Палякі гарачыліся й крычэлі, што моцна й непарушна стаяць будуць у гэным калідоры, ды ніякаму Немцу не аддадуць аніводнага гузіка з таго «плашча». Літоўскім сялянам да таго «калідору» й «плашча» столькі справы было, колькі курцу да соскі. Аднаго баяліся, што Немцы схопяць Палякаў загрудкі, дык гэтыя астатнія іх, Богу духа вінаватых, могуць на помач паклікаць. А навошта ім свае парэпаныя ці падэшвай ад працы аброслыя пальцы ў гэнай катавасіі мачаць?

Прыйшла й мінула вясна, надбегла лета. Адно другую паганялі гаспадарскія працы. Рана ўставалі на ногі сяляне, сачылі ўзыходзячае з-за балота чырвонае сонца, штодзённа віталіся з Архіпам на Гараватцы, позіркам дбайлівых сем'янінаў кідалі на Захарукову бусьлянку, што на ліпе, варажылі ці бусьліха яйкі ўжо пачала грэць ды

калі бусьляняты, зь яйкаў вылупіўшыся, шыі й ногі свае выпрастаюць. Пазіралі на каралевы-сосны на могілках, пацелі на палёх і на сенажацях, горбіліся й натужвалі сілы ў суседніх паноў і асаднікоў. Зямля аддавала цяпер людзям шчодрыя й скупыя плёны. Трэба было іх сабраць, і не ставала часу на тое, каб думаць, дзе й у каго хто які калідор думае адбіраць. Вечаровая дзіцячая гамана пяшчотна казытала вушы бацькоў і матак, што спрацаванымі варочаліся дахаты пасьля даўгога летняга дня. Усё, здавалася, было пастараму. Але як доўга? Што нясе заўтрашні, пасьлязаўтрашні дзень?

Калі ў пачатку верасьня пад саламяныя стрэхі прыляцела вестка, што Немцы пачалі ўжо панскую Польшчу дзяўбці, усьлед-жа за ёй зьявілася й новае, рэдка чутае й мала каму зразумелае слова: мабілізацыя. Зухавата-фанабэрысты солтыс Паўлоўскі мусіў у вадзін дзень большую частку вёскі з мабілізацыйнымі наказамі абегаць. Ніколі шчэ раней так не муляла яму пад пахай гэная абшмуляная скураная торба. Солтыс усім проста й ясна пра мабілізацыю растлумачыў. Людзі зразумелі й жахнуліся: заўтра асноўны цьвет літоўскае моладзі мусіў адпраўляцца Бог ведае ў які далёкі сьвет, каб бараніць той «калідор і плашч із гузікамі».

У той вечар позна па літоўскіх хатах не сьціхала гамонка. Хныкала ці адна дзяўчына, тулячыся да свайго кавалера, якому аддала сэрца. Хто ведае, куды вядзе заўтрашняя дарога й як скора любы вернецца пад родную страху. Прагавіта пазірала матка на сына, жонка на мужа, каб у запас наглядзецца, а сэрца грызла чорная трывога. Жаночыя рукі рэзалі боханы разовага жытняга хлеба, сушылі на дарогу сухары, пакавалі ў торбы сьціплую скароміну, а падол спадніцы ці ручнік выціраў матчыны сьлёзы, якім не было, здавалася, супынку. Тыя, у чыіх хатах не было мабілізаваных, заходзілі да пакліканых у войска, каб, як казалі, душу адвесьці. Нават малыя дзеткі, хоць дакладна не ўяўлялі поўнай сур'ёзнасьці таго, што здарылася, спанатрылі вялікую й раптоўную перамену. Балянс нармалёвага жыцьцёвага ладу быў зрушаны. Ці адзін раз рука брала й ледзь стрымоўвалася, каб злосна не скамшыць позву, вочы ўглядаліся ўжо каторы раз у зусім няхітрыя й ляканічныя словы. Усяму вінаватыя былі гэтыя чартоўскія паперкі.

Калі ў мірны час зь вёскі мелі адпраўляць каторага навабранца на службу, дык напярэдадні моладзь ладзіла яму вечар. Тады маладыя

галовы туманіла родная сівуха. Пад гукі гармоніка, гуртам і ў разрэз сьпявалі «пасьледні нонешні дзянёчак». Даўно ў нябыт адыйшла беларуская вайсковая традыцыя, пагасьлі ў гістарычным ліхалецьці родныя вайсковыя песьні. І гэты «нонешні дзянёчак» быў некалі адным чужынцам у Літоўцы прынесены. Цяпер-жа іншы чужынец за Бог ведае што чужое й нялюбае пастаяць клікаў. У гэны вечар ня поўніліся літоўскія начоўкі зацяжнымі маладымі галасамі, бо гэтым разам у вагонь і на сьмерць трэба было йсьці. Колькі зь іх знойдзе дадому шлях здаровымі, колькі нікому непатрэбнымі калекамі, а колькі ў чужой далёкай краіне застанецца на вечны супачын? Гора было занадта вялікае й агульнае.

XIV

Нахмарыўся разьвітальны дзень. Па самым дне начоўкаў раніцою паўзьлі дымы зь літоўскіх комінаў. Праймаючыя холадам хмары зьніжаліся й імкліва плылі над літоўскай лагчынай. Яны, здавалася, не маглі наважыцца, ці ім адно з пагрозай шыбануць над Літоўцамі, ці памарасіць вёску густым дожджыкам.

Рана зьявіўся да солтыса Паўлоўскага ўраднік з гацкага мабілізацыйнага бюра. Пагаманіўшы із шляхцюком, абодва накіраваліся пад Пятухову клець, дзе быў зборны пункт для пакліканых. Хутка зь блізкіх і далейшых хутароў, із гасподаў, што засталіся на старым паселішчы, пачалі плысьці сюды людзі. Хоць ці аднаму з мабілізаваных зазірнула ў галаву думка, каб ня йсьці, а дзесь схавацца й перачакаць, «пакуль гэта біда сплывець», адно Шпунтоў Лявон учора поцемкам выбраўся ў сваю, яму адному вядомую, дарогу. Мабілізаваныя прыходзілі ў суправодзе радні, што мела спадарожнічаць ім аж у Гаці. Здавалася, што ля Пятуховай клеці сабралася ўся вёска. Ураднік, паставіўшы ровар ля плоту, сядзеў на лаўцы й паўголасам гаманіў із солтысам, касурыўся на надвор'е й паглядаў на гадзіньнік. Солтыс раіў яшчэ пачакаць, бо бачыў, што ня ўсе сабраліся. Прыехалі й тры хурманкі, замоўленыя Паўлоўскім учора, каб на іх адвезьці падарожныя клункі. Людзі гаманілі, гулі як пчолы ў вульлі пасьля працавітага дня, але адчувалася, што гамонка

тая была стрыманая, не чуваць было гулкога й безклапотнага сьмеху. Шматлікія вочы сачылі ўрадніка й солтыса, што яны скажуць і зробяць.

На звароце вуліцы з бальшака, што прабягаў упоперак вёскі ад балота, паказаўся нетарапкі ў кроку й рухах Сымон Пятух, старэйшы брат гэтага самага Пятуха, ля чыёй клеці сабраўся народ. Сымон быў старым дзяцюком, векам гадоў пад пяцьдзясят мусіць. Ягоны вузкі й даўна голены гарбаносы твар із глыбокімі западзінамі там, адкуль выглядалі малыя рудзенькія вочкі, зьверху аброс густымі мяцёлкамі броваў. Дзяцюк пакінуў дома свае адзіныя, яшчэ не зусім дабітыя, з доўгімі рудымі халявамі боты й босымі нагамі мясіў яшчэ сухі мяккі дарожны пясок. Зашмальцаваная камізэлька, кужэльная кашуля-касаваротка, засалены пінжак і паўсуконныя порткі з калошамі ў трубы, ды шэрая, папраціраная па бакох кепка, што зьехала на правы бок і напаказ выставіла густы венік рудых валасоў зь левага - вось гэта была нязьменная вопратка ў будні й у сьвяткі. У старэйшага Пятуха, як заўсёды, часу было хоць ты адбаўляй. Быў ён найбольш ведамым карцёжнікам, гультаём, і заядлым курцом у вёсцы. Любіў і выпіць, калі была нагода. У карты гуляў, як казаў, каб час забіць і звычайна напуста. Калі не было чаго паліць, стараўся ад старой маткі сьцібнуць пару яйкаў ды прамяняць іх у Жыда на тытунь. Жыў у самым паўднёва-ўсходнім кутку Літоўцаў на ўзгарку. У некаторых людзей лазьні былі вялічынёй зь ягоную хату, але для яго й маткі было даволі мейсца. І пра тыя два гактары зямлі Сымон нянадта рупіўся. Лебяда, пырнік і быльлё заглушалі там пасеяную на заўсёды дрэнна апрацаванай зямлі збажыну. Для аднаго канякі й каровы ледзь мог Пятух сена за лета назапасіць. Вяскоўцы так апавядалі аб Пятуховай гаспадарлівасьці: Ляжаў ён аднойчы на печы й карміў клапоў. Ногі, быццам тыя качэргі, ажно зьвісалі над пяколкам. Ці-ж Пятух вінаваты, што муляр кароткую печ пабудаваў? Маці кешкалася ля печы, а Пятух цешыўся, што яму добра ў плечы грэе. Пайшоў дождж, і прагнілая страха была таму віной, што вада неўзабаве пацякла із столі на адзіны ў хаце ложак.

- Сымон, - казала яму маці, - дождж ідзець, страха цячэць, вада вуньдзіка на пасьцелі. Чаму страху ні залатаіш?

- Ні знаіш што рабіць? - пачуўся зь печы лянівы голас. - Адсунь ложак, дык ні нацячэць.

Першы спасьцярог Сымона Антось, той самы, каторага празвалі Дзеркачом і які быў у ліку пакліканых.

- От ужо й Сымон ёсьцека, цяпер можам ісьці, - загаварыў голасна Антось, каб зьвярнуць агульную ўвагу. - Ну што, Сымон, пойдзіш з намі ў салдаты?

- Адчапіся ты! - буркнуў голасна Пятух. Ён ёмка выплюнуў з роту дагарэўшы акурак, выцягнуў зь левай адтадуранай кішэні капшук з тытунем, адраваў кавалак газэты й супакойна, маленькімі вачыма бегаючы па грамадзе людзей, узяўся вярцець новую папяросу.

- Ну, Сымон, калі-ж будзіш жаніцца? - пакеплівaў далей Антось. - Параска Макатунішка ўжо як лучына па табе ссохла.

- Тады, як бык будзіць цяліцца! - адказаў, не паварушыўшы мяцёлкамі, стары дзяцюк.

Тыя, што чулі гэтую гаворку, зарагаталі.

- Ён, мусіць, жджэць пакуль Параска пяцёра будзіць мець, каб адразу на гатовыя, - кпіў з натоўпу другі мужчынскі голас.

Дзякуючы Пятуху, заўсёднаму аб'екту жартаў, які зусім нічым не прыгадваў працавітага й дбайнага гаспадарлівага малодшага брата, павесялелі некаторыя ў грамадзе.

З другога боку вёскі прычыкільгаў да натоўпу дзед Якуб. Абступіўшы, людзі віталіся зь ім, радыя нагодзе, каб перакінуцца словам. Стары, вядома, як скажа, дык ёсьць што паслухаць. А дзед пыхкаў сваю крывую люльку ды скупіўся на словы.

- Ну што гэта дзед, вы ваіваць ні сабіраіціся? - пыталі яго.

- Ды вы, дзеткі, ужо бізь мяне неяк абойдзіціся. Я адкаратаў сваё, - пагладзіў дзед бародку, гледзячы на ўсіх і на нікога ў васаблівасьці.

- Дзед тут будзіць за нашымі гаспадаркамі глядзець, дзевак замуж выдаваць, каб племя наша ні зьвялося. Пітуха во ажаніць трэба...

Некаторыя засьмяяліся, але няшчыра, стрымана.

- Німа за што, - казаў дзед, быццам не спасьцярогшы надзьмутай штучнай весялосьці. - Німа за што ваіваць. Ні наша гэта дзела за паноў грудзі выстаўляць. Калі на іх прыдзіць якое бізгалоўя, дык так ім і трэба. Яны за нас, нябось, ні пастаяць.

Дзед плюнуў сабе пад ногі й пацягнуў з крывой люлькі. Абступіўшыя яго спасьцераглі, што літоўскі патрыярх ня меў намеру жартаваць і, пэўна-ж, яшчэ нешта важнае скажа. А дзед зірнуў пад

клець, дзе ўжо ўсталі з лаўкі й аглядалі людзей солтыс із рослым ураднікам.

- Вы-ж глядзіце, дзіцюкі, - казаў Якуб, - калі там якія ніпіраліўкі, дык пад дом цісьніціся, от што...

- Маўчы ты, дзед Якуб, ато якоя благоя вуха пачуіць! - перасьцерагла Кмітава Аўдоля, што й гэтым разам парупілася, каб у цэнтры падзеяў быць.

- Чаго гэта маўчы? - агрызнуўся дзед. - Ды што гэтыя паўшабэлкі мне старому калеку зробюць? Пляваў я на іх. А свайму во катораму трэба сказаць, каб на ражон дарма за чужоя ня лез...

У гэты час ураднік падаў голас, каб усе пакліканыя падыйшлі да яго бліжэй, ды паводля лісту пачаў перавяраць, ці ўсе сабраліся. Хутка выявілася, што не было Косьціка Сабакевіча й Шпунтовага Лявона. Першага, вядома, сам ураднік не спадзяваўся, але-ж прыгадаць трэба было. Дапытваўся, дзе дзеўся Лявон, ды ніхто ня змог яму адказаць.

- Пойдзем, няма часу чакаць, - сказаў ён станоўка. - Пра яго ўжо парупяцца адпаведныя дзейнікі...

Апошнія словы гучэлі пагрозай.

На лісьце было звыш за трыццаць прозьвішчаў. Пакліканым ураднік загадаў зыбрацца ў групу й ісьці наперадзе, а ззаду мелі ехаць хурманкі з багажом ды маглі йсьці тыя з радні, хто хацеў праводзіць мабілізаваных аж у Гаці. Рушылі паволі. Солтыс із ураднікам вялі калёну на бальшак, а пасьля павярнулі на прасёлкавую дарогу, што побач могільніку вяла на гацкі гасьцінец. Расьпісаныя гумовымі ўзорамі каляіны ўраднікавага ровару зараз-жа ззаду затоптваліся босымі ці абутымі ў лапці нагамі літоўскага народу. Калёна расьцягнулася; тыя з радні, што йшлі ззаду, пачалі далучацца да праводжаных імі родных, ізноў пачалася часта спыняная гаворка. Людзі, здаецца, усе тэмы вычарпалі. Што гаварыць у такі час? Мінулае прыгадваць ці трывогу перад небясьпечнай будучыняй выказваць? Як доўга будзе гэтая разлука? Калі зноў над Літоўцамі й цэлай пагвалчанай краінай засьвеціць сонца? На палёх чакала гаспадарлівых рук нязжатая ярына. Заўтра, калі Бог пагоду дасьць, ізноў у хвастох ніваў стануць ізь сярпамі прарэджаныя сем'і. У працы гадаць будуць, што з сынамі, мужамі, ці любымі... Дзе яны, у каторы бок гоніць іх чужы вецер?

У самым хвасьце калёны маўкліва крочыў і Янук Бахмач ізь неразлучным Тапсікам. Ён яшчэ не вымяркаваў, ці яму аж у Гаці йсьці, ці дзесь на дарозе назад завярнуць. Паглядаў на дарожныя сьляды, якія пачаў мачыць-заціраць густы, як празь сіта, дожджык. Людзі настаўлялі каўняры, жанчыны й дзеўкі нацягвалі хусткі. А дожджык зьверху то сеяў, то спыняўся. Ня ведаў, мусіць, нябесны сейбіт, ці неба мае плакаць зь перапынкамі, ці без супыну...

Таронта, 1963-1964

К. АКУЛА



ЗАКРЫВАЎЛЕНАЕ СОНЦА

КНІГА ІІ. ЗАКРЫВАЎЛЕНАЕ СОНЦА

1

На захад сонца раньняя восень дыхала туманам балотнае нізіны, па якой марудна зьбірала свае воды верхняя Бярэзіна. Золкая масьлянка кудзеляй спавівала шырокія паплавы й расплывалася па літоўскіх начоўках. Раніцай, калі пачынала прыграваць сонца, туман найперш асядаў у літоўскай лагчыне, суседнім балоце, а найдаўжэй трымаўся ў гушчарах над ракою.

Марудна й лена адмірала лета. Сьпелы верасень забаўляўся кволым павуціньнем, снаваў сярэбраныя ўзоры на бабках ярыны, аздабляў сувоямі тонкае пражы чубы кустоў на ўзьлесьсі й аржышчы азіміны. Буйнейшы вецер каламаціў павуцінныя кросны, зрываў сярэбраныя ніткі з кустоў ды нёс іх уверх да сонца. Павуціньнем забаўляліся падлёткі. Начэплівалі яго на палкі, уважна разглядалі малых чорных майстроў дзіўнае тонкае пражы. Зьзяла на сонцы тое павуціньне чыстым доўгім серабром.

Засланае малочнай смугой неба наганяла млосную ляноту, якую ў даліне літоўскай трывожыў адно перазвон малаткоў зь зялезам у кузьні. На парыжэлай Гараватцы сонна варушыў лістотай, покаў жалудамі й грэў сівыя баразнаватыя плечы гігант Архіп, а на могільніку ў каронах дзьвёх вялікіх соснаў вяла зьвягалі гракі й вароны. На нівах сярпы дагрызалі апошнія хвасты ярыны, галёкалі на статак пастушкі, а ў гумнах панскіх найміты, быццам мурашкі руплівыя, увіхаліся ля пражорлівых малатарняў.

Мясцамі чырванеў ужо лес. Рупліва, часта прыхавана ад вока людзкога, завіхаліся пры зборы плёнаў лясныя жыхары. Гарлапанілі ў верхавінах дубоў шустрыя сойкі, трушчылі сасновыя шышкі нястомныя дзятлы. У арэшніку, сасьняку й ельніку гэйсалі гаспадарлівыя рудыя вавёркі. Сноўдаліся па купінах і смакталі сьпелыя журавіны ласі й сарны. На паплавох, пад клапатлівым наглядам бацькоў сваіх, усё яшчэ здавалі акзаміны паляваньня на вужоў і жаб

уздужэлыя бусьляняты. Некалі сабяруцца яны ў карагод, ключом паплаваюць-пакружаць на разьвітаньне над роднымі мясьцінамі ды ў далёкую дарогу на поўдзень рушаць. У нетрах балотнае глухамані крычэлі журавы. Нікуды ім ня рупіла, бо бацькаўшчыну пры першых замаразках пакідалі.

Як на заказ, ужо каторы тыдзень прыгожая пагода трымала. Здавалася, што запаволенае жыцьцёвае тэмпа плыло нармальна. Адылі варта было прыгледзіцца й прыслухацца вёсцы, павандраваць па ваколіцы, зазірнуць на нівы, у гумны, вечарам дзе на прызьбе прысесьці, як няцяжка спанатрыць, што ў глыбіні запаволенага пульсу жыцьця адчувалася затоенае трывожнае дыханьне. Навет дуда Хвядосава надарваным голасам цягнула.

Разам з навабранцамі павандравалі ў сьвет чужы літоўская весялосьць. Здаецца ўчора тое сумнае разьвітаньне было. Утрываліся ў памяці гарэзьліва-выклікаючыя радкі песьні Тадэўкавай:

Вы ня думайце, Палякі
што мы будзем ваяваць!
Мы засядзім у вакопах,
самагонку будзім гнаць.

Ці да самагонкі ім цяпер? З-над Одры й Віслы кацілася жахлівае рэха. Рукі тыя, што цяпер мелі-б увіхацца з прыладамі працы сялянскае, недзе чужымі стрэльбамі й за чужыя інтарэсы цэліліся ў чужых, ніякага ўрону ім не зрабіўшых людзей. Ногі, што роўным крокам сьвежыя барозны за плугамі слядзілі-б, цяпер у абгортках жаўнерскіх і цяжкіх чаравіках перабягалі недзе палямі крывавае бойні. Галасы, што дзетак цешылі-б і патолілі, у чужой краіне нячысьцікаў, вайны майстроў пракліналі. Вочы, што плёнамі працы родных ніваў любаваліся-б, недзе, жахам перапоўненыя, сьмерць і глум мерылі. Вусны, што цалункамі сваіх выбраных галубілі-б, у дарожным пыле й гарматным дыме недзе сьмяглі. Сэрцы, што жывой любоўю да роднай старонкі поўніліся, у непасільнай зьнямозе недзе крывавіліся. Дый хто ведаў колькі іх спынілася ўжо.

Тымчасам сяляне літоўскія пра моладзь сваю ў вагні вайны турбаваліся, зь нядобрымі прадчуваньнямі пры працы корпаліся, запаволенае жыцьцёвае тэмпа трымалі. Зямля скупыя плёны працы

гаспадаром аддавала, заманлівым асеньнім супакоем дурманіла. Як наўмысна, добра пагода ўладзілася, каб дзе на небе хмарынка, каб які буйны вецер узьняўся. Ці ня быў гэта той прыказачны, надзіва залаты супакой перад бурай гвалтоўнай, каторая не за гарамі ўжо вунь усхадзілася...

2

Даўно адгарлапанілі ў вёсцы пеўні й паволі разганяў начную цемру зябкі золак. Ля хлявоў голасна сакаталі куры, пад стрэхамі пераклікаліся галубы, хмарамі наляталі на гумнішчы й накідваліся на парассыпанае зерне сьвежай збажыны шпакі. Рэдка дзе скрыпнуў асьвер. Адно самым руплівым няўлежна ў цёплых пасьцелях было. Надта-ж марудна раскатурхвала вясковы народ са сну сьвятая нядзеля.

На гасьцінцы непадалёк Гаравацкай пушчы канчалася ўсяночная праца. Учора верх партыйнага падпольля загад прыслаў. Выканаць яго трэба было, хоць на галаве стань. Ад поўначы дзесь працавалі. Цяпер-жа Косьцік Сабакевіч і Лявон Шпунт скруцілі піпкі, прыкурылі, папярхікалі едкім дымком ды адыйшліся колькі крокаў, каб дзяцішчам сваім, новазмайстраванай брамай прывітальнай палюбавацца. Паваліцкі Хвёдар і Параска Макатунішка раскручвалі доўгае белае палотнішча з напісам, матузы да яго прывязалі. «Да Здравствует Доблестная Освободительная Красная Армия!» - крычэлі паўмэтровыя, прыгожыя чырвоныя літары. У канаве цярпліва чакаў свайго пачэснага месца на браме вялікі партрэт.

Ад тэлефоннага слупа з аднаго боку гасьцінцу да вялікай бярозы з другога, мэтраў на восем уверх, упоперак дарогі праляглі чатыры здаравенныя бярозавыя жардзіны, зьбітыя шматлікімі папярэчніцамі. Мясцамі аздобілі іх верасам, або чырвоным матар'ялам агарнулі. Цяпер адно павесіць гэны вялікі партрэт, удаўжкі прымацаваць да жардзіны кліч прывітальны й справе канец, могуць вызваляць.

Косьцік Сабакевіч, Лявон Шпунт, Параска Макатунішка й Паваліцкі Хвёдар, - чатыры перадавыя падпольнікі з ваколіцы - сустрэнуць дарагіх братоў з Усходу з хлебам і сольлю як гаспадары й гэроі падпольля, заўтрашнія правадыры працоўнага народу. Якая-ж

салодкая надыходзіць радасьць! Зноў згадаў Косьцік тыя бясконцыя цяжкія дні й ночы, панскія вязьніцы, жыцьцё ў холадзе й голадзе, калі чалавек ценю свайго баяўся, роднаму не давяраў. Навет учора, калі загад канчаткова з нары вылазіць прыйшоў, браму прывітальную для «доблiснай» майстраваць, дык і то асьмеліцца паказацца на сьвет божы боязна было. Дзіва што! Гэтак сполаху нагналі - па начох адно з нары вылазіў - што за вуглом кажнага будынку, здавалася, тайны шпігун на яго цікаваў.

Сказалі, што «доблiсная» заўтра перад абедам вызваліць маніцца, дык браму назарэз да раніцы трэба было скончыць. Рук не пакладаючы, ад поўначы працавалі. Добра пры тых жардзінах, пакуль зрэзалі й папрыбівалі, папанатужыліся. Дый без асьцярожнасьці нельга было. Ня дай Божа, наляці паліцыя. Косьцік свой абрэз захапіў, каб чорту якому непакліканаму ў выпадку чаго адбой даць.

Што й гаварыць, здорава папацелі. Ноч бяз прыгодаў прайшла. На досьвітку такавалі дзесь заўзята ў лясной глушы цецярукі, пераклiкаліся на хутарох пеўні, а пасьля маланкай прагрукаталі па чыгунцы з Загацьця тры паравозы й колькі вагонаў. Нячуванае-нябачанае: ажно тры паравозы на такі эшалён кароткі. Ці не пранюхаў панок які, што «нашы» з Усходу сяньня «братом сваім» руку падаваць маюць. Спасьцярогшы, як рука гэна перазь мяжу выцягвацца манілася, каб ямчэй пяткі падмазаць, аж тры паравозы падпрог. Калі-ж яны ў Гаці прыджгалі, адразу пажвавеў на чыгунцы рух. Заварушыліся ў трывозе паны. Куды ўцякаць? На Захадзе Сосаў хаўрусьнік Адольф, каторага маскалі нарабаваным ад народу дабром падкармілі, ужо бальшыню «моцарствовай» праглынуў, страўнік задаволена гладзіў, са смакам над Бугам аблізваўся, на прынадны кавалак Беларусі пазіраў.

Канчаўся нарэшце кашмарны час Косьцікаў, калі быў самым апошнім «нічэм», ды нараджаўся дзянёчак сьветлы, калі тым доўгачаканым «всем» расьцьвіце й ўзбуйнее. Выкачвалася з-за Гараваткі сонейка яснае.

Думка пра вялікую перамену да шалу няпрытомнасьці лашчыла-казытала сэрца. Скакаць і галёкаць з радасьці напірала. Няхай-бы гулкае рэха ад Косьцікавага гарластага ўра па цэлай неабсяжнай Гаравацкай пушчы, па нівах і далінах пералівалася!

Яшчэ гадзіна, мо дзьве...

Дзесь там на мяжы заводзяць маторы, а мо й рушылі ўжо. Пад крокамі дзсяткаў тысячаў ног, пад калёсамі й гусяніцамі магутных машынаў дрыжаць прымежныя беларускія гасьцінцы. Хваля прыбліжаецца, магутнее, напірае.

Сабакевіч зірнуў на няскончаную браму. Саладжавай усьмешкай распрамяніўся шырокі твар. Брама-ж ня толькі «доблісную» вітаць будзе, але й яму, гаротнаму й нястомнаму змагару за народнае шчасьце, шлях у сьветлае заўтра адчыніць.

- Ну й нарабіліся, бля..ха! Алі за тое, - задаволена цмокнуў вуснамі, зацягнуўшыся горадзенскім тытунем Косьцік, - ніхай здраствуіць! Такая хлёсткая й крэпкая, як сама ўласьць савецкая. Цаца, ні брама! Ніхай знаюць, што ні пэцкалі строілі.

- Нас піражывець! - рупліва пераборшчыў Лявон. - Ну толька-ж канчаць трэба, саўсім разьвіднелася ўжо...

- Дык даеш! - схамянуўся Косьцік. - Хто-ж палезіць?

- Ніхай Макатунішка. Яна найлягчэйшая.

Борздым крокам рушыі да брамы. На жвіры й гліне гасьцінца валяліся аполкі дрэва й трэскі, а ў канаве - сталярскія прылады. З кужэльнае абгорткі злавесна пазірала руля Косьцікавага абрэзу. Лявон узяў скрутак тонкай вяроўкі й парэзаў яго на кароткія кавалкі ды падаў Парасцы.

- На, лезь. Партрэт і лозунг прывяжаш. Вазьмі й ножык, дзіркі прапорыш дзе трэба.

Зяваючы Макатунішка пераступіла з нагі на нагу. Стройная, танклявая, як бярозка маладая, босая, загарэлыя лыткі, раськіданыя валосы, апранутая ў белую блюзку ў краскі, зялёную спадніцу, дзяўчына заспанымі вачыма пазірала на Шпунта.

- Чаму гэта я? А з вас каторы ня можыць?

- Ну лезь ужо, Параска, ня медлі. Ты-ж найлягчэйшая й найболі павярткая ў нас, - спанукаў Косьцік.

Лявон зірнуў у вадзін і другі канец мёртвага гасьцінца.

- Скарэй во, бо саўсім разьвіднелася ўжо! - прынагляў ён.

- Лезь, Параска! - падтрымаў сяброў Паваліцкі Хвёдар.

Дзяўчына палажыла ў кішэню спадніцы парэзаную вяроўку, Лявонаў ножык-складанчык і пачала таропка лезьці па драбіне. Дзяцюкі моўчкі прыглядаліся як ёмка ўсьпіналася наверх. Гэтак магла лезьці адно дзяўчына каля гаспадаркі й лесу выгадаваная. Калі

ўзьлезла, аблапіла верхнюю жардзіну рукамі, а нагамі асьцярона ступіла на ніжнюю. Жэрдка ўгнулася, але трымалася.

- Ня зломіцца? - гукнула Параска.

- Сьмела, ня бойся! - падбадзёрыў Шпунт.

На доўгую галіну зь цьвяком на канцы Паваліцкі Хвёдар падчапіў партрэт і падаў яго Макатунішцы. Цяпер усе на спраўнасьць ейных рук чакалі. Для раўнавагі Мякатунішка шырака расставіла ногі і ўзялася прывязваць партрэт. Занятая працай, яна не спасьцерагла прыглушанага хіхіканьня дзяцюкоў, што зьнізу пільна ня толькі за ейнымі рукамі сачылі.

- А што-ж ты думаў, - штурхнуў локцем Косьціка Лявон, - што біз штаноў яна?

- Каму-ж знаць, калі ні табе? Ці раз ты туды злазіў? - адсек Косьцік. Як на загад тройка голасна зарагатала.

- Ах вы, нягоднікі! - злосна крыкнула зьверху Параска. - А-цьфу на вас!

Дзяцюкі борзда адскочылі й спорны плявок сьліны шлёпнуў у жвір.

- Рабі, рабі ўжо! - гаркнуў Косьцік. - Даёш скарэй!

Мінула хвілін зь пятнаццаць. Рознагалосьсем птушыных песьняў усхадзілася Гаравацкая пушча, перагаўкваліся па навакольлі сабакі, нейдзе ў Ліпавіцкім двары рыкалі каровы. Пунсовым пажарам зацьвіла за гарбом Гараваткі неба. Спачатку ледзь чутна, а пасьля гулка загрукаталі ў лесе калёсы. Дзяцюкі трывожна пераглянуліся.

Параска канчала прывязваць палотнішча, як раптам воддаль зь лесу выкацілася на самакатах група жаўнераў у круглых шапках. Ззаду борзда гнала запрэжаная парай коней каляска. Першая ўгледзіла іх зьверху Макатунішка.

- Гляньце, глянь! - выставіла дзяўчына ўказальны палец і анямеў ад страху ейны голас.

Здарылася гэта так раптоўна, што дзяцюкі, забыўшыся пра ўсё, кінуліся ў паніку. Не ў галаве мусіць быў Косьціку ягоны верны абрэз, калі ўсе тры, як раптам спалоханыя курапаткі, нырцом ірванулі ў прыдарожны зарасьнік. Калі й чуў каторы, дык ніводзін не адклікнуўся на ўтрапёны лямант Мактунішкі, што бездапаможна ўверсе на браме калацілася.

Яшчэ на хаду пасаскаквалі жаўнеры з самакатаў і колькі раптоўных стрэлаў сьцебанула па прыдарожных кустох і дрэвах.

- Не страляць! - раўнуў рослы, мурлаты капітан. - Псякрэў, бальшавікі! Чорта якога цяпер у лесе знойдзеш, - плюнуў ён сакавіта ў той бок, куды дзяцюкі скрыліся. Вочы ўсіх жаўнераў, - а было іх больш дзесяці, - прагна ўпіліся ў Параску, што асінавым лістом дрыжэла ўверсе над групай помстай дыхаючых КОПаўцаў.

Наладаваная вайсковымі трантамі й амуніцыяй каляска спынілася ззаду. Спакойна жваў даўгую саломіну й лейцамі стрымліваў двух прыгожых коняў, выгадна расьсеўшыся на козлах здаравяка-хурман. Відаць пры доглядзе коняў зашмальцаваў свой зялёны мундзір. Коні нецярпліва жвалі цуглі, топалі ў гужох, а белая пена з храпаў камякамі спадала на жвір гасьцінца.

Аддыхаючы з хуткага бегу, жаўнеры стаўпіліся каля брамы. Некаторыя закурывалі. Твары прамяніліся ўсьмешкамі, што бываюць у паляўнічых, калі зьвер у пастку трапіць.

- Матка боская чанстахоўская, Ёзус Марыя! То ўжо скурчы сыны бальшавікоў спатыкаць прыгатаваліся. Бачылі вы такое? Трэба было іх усіх, як скурчых сыноў, даўно перадушыць!

- Гэта толькі што нашы польскія сэрцы добрыя! Мы да іх як ласкавая матка, а яны нам нажы ў сьпіны рыхтавалі.

Асабліва злосна бурчэў і лаяўся прысядзісты, з маленькімі рыжанькімі вусікамі дзядзька.

- Але-ж і папалася птушанё. Ну таго... дык чаго гэта чакаем, пане капітан?

Ледзь прытомная ад жаху Параска памкнулася ў вадзін і другі бок, але ацяжэлыя ногі й галава ніяк не маглі наважыцца што рабіць.

- Гм, брама даволі хлёсткая, але мне здаецца, што на ёй дэкарацыяў замала, - зьедліва ўсьміхнуўся афіцэр і яшчэ больш на правы бок сваю круглую шапку ссунуў. - Як думаеце хлопцы?

Здагадлівасьць распрамяніла сяржантаў твар.

- Яшчэ от хоць-бы адну дэкарацыю на ёй павесіць, - пацёр ён далоні. - Хлопцы, вяровачку!

- Злазь мігам! - шорсткім голасам загадаў капітан Парасцы.

Калі Макатунішка адубелымі нагамі пачала нарэшце ступаць па драбіне, капітан гукнуў на хурмана.

- Пад'яжджай, Яцак!

Як успыхвае раптоўным полымем сухая салома, гэтак ажыла грамада КОПаўцаў. Ня здолела Макатунішка дабрацца да ніжніх ступнёў драбіны, як некалькі рук учапіліся за ейныя ногі й вопратку. Цягнулі й тузалі, суправодзячы голаснай лаянкай, у каторай дамінавала-грымела літара «р».

Мігам апынулася Макатунішка на возе. Хтосьці балюча вывіхнуў і ззаду трымаў ейныя рукі. Зьмейкай узьвіўся над верхняй жардзінай брамы таўставаты гуж і неўзабаве хлёсткая добра зьвязаная пятля лашчыла гладкую, польнымі вятрамі й сонцам цалаваную, дзяўчыніну шыю.

- Паночак, даруй! Я-ж ня вінаватая, мне загадалі... Злавіце іх, - дрыготкім голасам прасілася Параска.

- Маўчаць, хамка-бальшавічка! - гаркнуў афіцэр. - Будзеш спатыкаць бальшавікоў на пачэсным месцы.

Прарэзьлівы рогат дзікім рэхам скалануў лес.

- Пане сяржант, гатоў? - спытаў афіцэр сяржанта.

- Так ест, пане капітан, - запэўніў падафіцэр, заціскаючы на Парасчынай шыі пятлю.

- Яцак, ірвані зь месца!

Спакойны й зроўнаважаны хурман, што маўкліва прыглядаўся падрыхтоўчай мітусьні, рэзкім махам даўгоў пугі сьцебануў па конях. Парэпаныя босыя Парасчыны ногі задрыгалі ў паветры. Угнулася пад раптоўным цяжарам жардзіна, моцна ўрэзалася ў шыю пятля, болем скрывіўся дзявочы твар.

Ледзь здолеў лес паўтарыць радасны вокліч жаўнераў, як чарга стрэлаў загуляла па партрэце Сталіна й чырвоным палатне. Ёмка загаўкалі па хутарох сабакі.

Стукнутая моцным жаўнерскім чаравіком, паляцела з-пад брамы драбіна. Косьцікаву абрэзу так і не далося свайму гаспадару ў крытычны момант пасобіць. Агледзіўшы яго, жаўнер размахнуўся й стукнуў аб кола й кароткая руля разьвіталася з прыкладам.

- У дарогу жвавей! Няма часу! - спахапіўся капітан.

Ці трэба было падганяць. Страх, як мудрасьць адвечная кажа, вялікія крыльлі мае. Мігам запылілі па гасьцінцы самакаты й загрукалі калёсы. Каб вешацелі замарудзілі крыху, не абыйсьціся ім бязь сьветкаў свайго злачыну.

Пад прастрэленым партрэтам тупатварага дэспата супакоілася ў вабдымках хуткае сьмерці цела Макатунішкі. Вялікі палец правай нагі чамусьці недарэчна задраўся ўверх. Сонцам золатам абліло раськіданыя мяккія пушыстыя валасы, пётлёй задраны ўверх падбародак.

На абочыне гасьцінца зашалясьцелі кусты й нясьмела, пазладзейску азіраючыся на бакі, паказалася «баявая» тройка.

3

У тую ноч, калі на гацкім гасьцінцу расла трыюмфальная брама, трывога сагнала сон з павекаў старое Макатуніхі. Учора напрыцемку, спарадкаваўшы гаспадарку, падыйшла да маткі Параска.

- Мама я йду памагаць, - сказала.

- Куды? Што каму памагаць? - зьдзівілася матка.

Хаця ці мусіла дзівіцца. Параска даўно па начох валачылася ды афішкі ці якую трасцу разносіла. Прызнаць трэба, што высьцерагалася, каб свае сям'і пад паліцыйны абух ня ставіць. Дзяўчына маўклівая, навет з маткай на словы скупілася. Людзей не агітавала, адно пачкі нейкіх бальшавіцкіх паперак ці наказы ад аднаго да іншага дастаўляла. Ногі хаджалыя сьлядзілі сьцежкі й дарожкі ў суседнія вёскі, фальваркі й маёнткі. Ноч заслонай і памочнікам была.

- Сягоньніка браму на гасьцінцы строіць будуць, заўтрака бальшавікі прыдуць, - суха паведаміла дачка маці.

Старая Макатуніха рот разінула. Стаялі на двары. Малыя ваконцы хаты хліпалі сьвятлом каганца. За дзьвярмі Аленін голас патоліў крыклівае малое. На ўзгорку ля Пятуховай хаты наперамену зь лякатаньнем колаў бубнелі два мужчынскія басы. У Бураковым двары злосна накінуўся на некага Сабакевічаў Ромак. Зь цемені ад бальшака борздым крокам сьпяшыла дахаты Дуня, што надвячоркам да Юшкевічавай Клавы пайшла.

- Бальшавікі, кажаш? - няўцямна перапытала дачку матка. Дуня моўчкі спынілася побач.

- Заўтра прыдуць. Сягоньніка загадалі мне, каб я ўночы браму прышла строіць памагаць.

Цэлы дзень пацела пры малатарні ў ліпавіцкага пана Параска. На захад сонца адкуль ні вазьміся Паваліцкі Хвёдар з наказам.

- Дзе, якую браму? - дапытвалася Макатуніха.

- Дык-жа гэтта на гацкім гасьцінцы пры казённым лесе.

- А што такое, мама? - спытала Дуня.

- Параска кажыць, што заўтра бальшавікі прыдуць.

- А хто табе сказаў, Параска? - даходзіла Дуня.

- Свае сказалі... ты цікавая такая, - буркнула Параска.

Макатуніха, такой весткай паднечаная, пра язык забылася. Колькі-ж гэта дачка клопатаў ей прынесла. Мала таго, што сваей бяды па вушы, дык-жа зьвёў нячысьцік Параску з тымі, што па вязьніцах бакі абівалі, бальшавіцкую работу вялі. Сама найгорш, што дзяўчына, агулам паслухмяная, гэтта матчыны перасьцярогі на ўвагу ня брала, самадумам ішла. Макатуніхі пагрозы - быццам гарох аб сьцяну. А ці-ж ім, галечу церпячым, якая рагатая трасца патрэбна?

Навет і сама дзеўка не патрапіла-б вытлумачыць як у гэну калатушу ўвязла. Спачатку марыла яе бяссоньніцай дзявочая туга па мужчыну, каторага - прадчувала гэта - ніколі мець ня будзе. Ці-ж сакрэт, што ў сваей і суседніх вёсках дзеўкі без замужжа старэлі? А хто-ж гэта калі зьмерыў усе таемныя глыбіні, што нясе мор васеньніх дзявочых гадоў? Невясёлая доля-мачыха ткне ў рукі серп, граблі, мяліцу ці прасьніцу. Ні сьлёзы, ні ўздыханьні пры цьмяным сьвятле за калаўротам не спатоляць сэрца дзявочага, што шчымець будзе па няспоўненых спадзяваньнях, нязбытых марах. Як краска незаплодненая, паволі зьвянеш-засьмягнеш у буднях беспрасьветных. У нязьлічонай колькасьці прынадных вобразаў паўстане перад табой зьява замужняга быту: матчына сэрца казычачы шчэбет дзетак, ласкі мужа каханага... Нязьведанае, неасягальнае...

І ніколі пагадзіцца ня зможаш, што за іншых ты горшая. Адылі ты ўсім на воку, ці аднаму па дарозе замінаеш. Людзі чэрствыя асудзяць, ярлык незаслужаны прычэпяць. А ці ведаеш, што мор чужых войнаў і акупацыяў зьвёў са сьвету твайго любага, каторы дзьверы ў сямейнае шчасьце адчыніў-бы?

Цяжкі кон прыгнуў да зямлі сьпіны сялянскія, любоў і спагаду ў сэрцах блізкіх змарыў. Быццам краты, тачылі ў неўрадлівай зямлі свае норы, на сонца глядзець іх адвучылі. І хто-ж гэта, сваей горыччу перапоўнены, прытулак у сваім сэрцы тваім цярпеньням знойдзе? Ты-

ж - жыццёвая няўдача, звычайны правал. Ты - калека-недарэка - не змагла навет усьпяліцца на ня так высокія ступні замужжа. І працу, і помач тваю любіць будуць, ды як паленам табой кідаць. Няўмольная й неспатольная доля старасьці дзявочай.

Зусім незаўважна зьявіўся, Парасчыну галаву адурманіў спрактыкаваны ў зводжаньні старых і маладых дзяўчат франт «драгомішч». Прыйшлі гутаркі й шэпты па завугольлях, прыйшлі ўздыханьні й фізычныя парыванньні. Таемнай салодкай глыбінёй авалодаў згаладалым целам дрыготка-бурны ў сэксуальнай поўні кульмінацыйны акт. А пасьля першага кроку прыйшлі наступныя. І гэтак беспаваротна.

Ды Лявон ня спыніўся на фізычным авалоданьні дзяўчыны. За палкімі цалункамі прыйшлі нашэпты зусім іншага характару. Не агледзелася заварожаная дзеўка, пакуль яшчэ зацяжарыла, як ногі ейныя босыя, пры цяжкой працы на нівах парэпаныя, абівалі начную расу, а за пазухай таіліся якія камуністычныя афішкі.

Запозна спанатрыла Шпунтовы хітрыкі адурманеная Параска. Занаравілася, упёрлася. Адылі Лявон не разгубіўся, па трапны аргумант у кішэню ня лазіў. Калі не памаглі ласкавыя намовы, паліцыяй пагражаў. Прынесшы такі вялікі ўрон беднай дзяўчыне, Лявон на сьвежую цаліну пайшоў, а шантажом Параску далей на падпольнай працы трымаў. І вось кара боская: прагная прынадным цялесным шчасьцем паласавацца, дзеўка глыбака ў дрыгву ўлезла. Ня было навокал ратунку. Як пясок на нязмазаных дзёгцем колах, памагалі гэтта матчыны перасьцярогі.

Балела за дачку сэрца матчына. Часамі нараджаўся сьветлячок спадзяваньня. А мо й зьменіцца калі на лепшае? Некаторыя-ж кажуць, што бальшавікі за бедных стаяць, паноў і багатых з наседжаных гнёздаў вытурваюць. Можа й Макатуном пасобяць. Каму як каму, а Макатунісе дапякла беспрадонная галеча.

Зірнула задумана матка на дачок і задрыжэў хваляваньнем ейны голас.

- Дачушка, я-ж знаю, што каб і прыказала табе дома сядзець, дык усіроўна панясець цябе... Дык ідзі-ж, Бог з табой... толька глядзі асьцярожна, каб чаго...

Макатуніха чмыхнула ў нос, пусьціла сьлязу.

- Добра, мама, - пасьпяшыла запэўніць яе Параска.

Цалюткую ноч Макатуніха бяссоньцай марылася, быццам што дрэннае прадчувала. Нейдзе на золаку раскатурхалася Дуня, дзьвярмі скрыпнула. Чульлівае вуха разбудзіла з паўдрымоты матку. Нылі на мулкім палу бакі. Праз замурзаныя ваконцы, на якіх ужо бзыкалі мухі, ціснуўся ў хату новы дзень. Апраналася. Трывожнае вока зірнула на пустое месца, дзе звычайна спала Параска. Накрыла дзетак, зірнула на Алену, што салодкім сном спала, ды на двор паклыпала.

За літоўскім балотам зарніцы ўзыходзячага сонца зачырвонілі просінь чыстага неба. Калі-б гэты дзень быў будні, даўно-б паднялася гукамі працы вёска. Сяньня-ж нядзеля. Рэдка дзе ляніва скрыпне ля калодзезя асьвер, радасным зьвяганьнем прывітае якога раней устаўшага гаспадара сабака.

Ля хлеву прымасьцілася на зэдліку ля каровы Дуня. Сівыя ніткі званілі па дне пустога вядра. Худая чорная карова прагавіта спажывала сьвежа нажаты Дуняй на дарожным адхоне пырнік. Пахла сьвежай травой і сырадоем. Макатуніха спынілася ля калодзезя, прамыла сьцюдзёнай вадой змораны твар.

- Як, мама, ні спалася табе мусіць? - спытала дачка.

- Не, золатка, ні магла заснуць. Праўда гэта ці не, што Параска казала, але сон прагнала. Бог ведаіць што будзіць.

- Якая там праўда, - разважала Дуня, - ці мала чаго калі яна казала.

- Яно-ж сабе так, дачушка, - згадзілася матка, - алі-ж цяперака вайна, усіх маладых вунь пазабіралі. Мусіць той неміц добра-ткі палякам уляпіў. Чаму-ж цяперака гэтым во ні прыйсьці, калі ўздумаюць? Хто-ж іх задзержыць?

- Ну стой-жа, ты! - гукнула Дуня на карову, каторая ўсьпела ўжо скончыць траву, ды крутанулася задам ад дзяўчыны. Малако закрыла дно вядзёрца. Дуня пагладзіла карову па баку, ды зноў прымашчвалася пад вымя.

- Чаго-ж гэта я стаю? - спахапілася Макатуніха, - падсьвінак вуньдзіка сьцяну грызець.

Дуня перацэдзіла пахучы сырадой, пераліла ў гладыш, паставіла на паліцу ды выгнала ў загарадку карову. Тымчасам маці справілася з падсьвінкам і курамі. Сонца выкачвалася ўжо з-за балота, пазалаціла Архіпаў чуб.

- Ну дзе-ж гэта дзяўчына падзелася? Ці ні пара ёй дамоў? - трывожылася Макатуніха.

- Ні бядуй, мамачка, прыдзіць, ня дзе ні дзенецца.

За Гараваткай пачулася чарга стрэлаў. Дачка з маткай спыніліся перад хатай.

- Чуеш, дачушка?

- Чую, ні глухая-ж...

- Дык гэта-ж тамака, дзе Параска казала браму будуць строіць. А божачкі-ж мае, можа нядобрае што. Трэба пабегчы даведацца!

Трывожным прадчуваньнем новага ліха ўспыхнула Макатуніха. Тузанула дзьверы.

- Алена, глядзі дзетак! За Гараваткай на гасьцінцы страляюць. Трэба пабегчы паглядзець... каб там барані Бог...

- Мама, я з табой! - пасьпяшыла Дуня.

- Як хочаш, дачушка. Скарэй-жа! А Божа-ж мой! - залямантавала старая. Дачка з маткай подбегам кінуліся на бальшак і без аглядкі накіраваліся на Літоўцы.

4

Дзяцюкі паказелілі вочы на браму, а найбольш на павешаную Макатунішку й стаялі на абочыне дарогі, быццам укапаныя. Зьбялелы таўсташчокі Сабакевічаў твар перасмыкнуўся брыдкай грымасай. Звузіліся шэрыя вочы й задрыгаў на лбе шырокі шрам. Касматая рука палезла ў незачэсаныя валосы, галава на таўстой шыі ледзь павярнулася да Лявона.

У Паваліцкага Хведара пад тонкім гарбатым носам і маленькімі чорнымі вусікамі сьціснуліся тонкія вусны. Ледзь заўважна варушыўся малы войстры падбародак. Нэрвова дрыгала галава. Рудыя звужаныя вочкі то коўзалі па павешанай Парасцы, то па сваіх сяброх. Ростам быў найменшы з трох, выглядам - дробны, такі, якога мала хто бярэ на ўвагу.

У «драгомішча» Шпунта над вузкім лбом і замурзаным тварам навісла тоўстае пасма ясных валасоў. Твар зморшчыўся, а перапалох у блакітных вачох зьмяніўся загадкавай няўцямнасьцю. Карэлая сьветлая кашуля зь цёмнасінімі палоскамі недарэчна спаўзла на левае плячо, з-пад шырока расшпіленага прарэха каўняра вызіралі рэдкія рудыя

касмылі. Глыбока ўсунутыя ў кішэні рукі то сьціскаліся ў кулакі, то адчыняліся. Тысячы мурашак вандравалі па целе.

Здавалася, што прытаіліся ў лесе птушкі, прыціхлі па хутарох сабакі. Адно дзесьці ля балота пеніўся на ланцугу таўстым басам Сабакевічаў Ромак. У вушах усё яшчэ гучэлі адгалоскі страляніны й гарканьня КОПаўцаў. Доўга трывала маўчаньне. Над сьветлай явай вялікага дня вызваленьня павіс дзявочы цень.

Лявон Шпунт зарагатаў раптоўна й гвалтоўна, ажно адскочылі ў бакі ягоныя сябры.

- Гэ-гэ-гэ-гэ! От-жа і ўкрасілі сссукіны ссыны! Гэ-гэ-гэ! На самай сярэдзіне, пад Сталінам нячысьцікі! Гэ-гэ-гэ!

Рогат да болю глыбока тузаў высокую Лявонаву фігуру, гарляк душыўся раптоўнымі гукамі, лес дражніў глухім рэхам. Гэта быў наглы рогат звар'яцелага чалавека, што выцягнуўшы руку па ўзнагароду атрымаў па шчацэ ёмістую аплявуху.

- Маўчы, дурань! - сьціснуўшы зубы, раўнуў Сабакевіч. - Ашалеў, ці што?

У Сабакевічавых вачох зазьзялі маланкі. Рукамі як клешчамі ўчапіўся за Шпунта й пачаў трэсьці быццам яблыню, калі ззамоладу чужыя сады латашыў. Здавалася, што ад трасеньня гэнага зломіцца Лявонава шыя. Даўгія валосы рассыпаліся, вочы наплылі сьлязьмі, твар пачырванеў.

- Піра... піра-сс-тань, Косьцік! - ледзь выцадзіў праз зубы Лявон.

- Маўчы, кажу табе! - хрыпеў паднечаны Сабакевіч.

Перад вачмі рыжавусага Захарука, што першы зь Літўцаў прыбег на месца злачыну, адкрыўся несамавіты вобраз. На новазбудаванай браме пад самым партрэтам Сталіна вісела жанчына, а на гасьцінцы тузаліся й пыхцелі, як кавальскія мяхі, Сабакевіч і Шпунт. З дурнаватай мінай прыглядаўся ім збоку Паваліцкі Хведар. Не марудзячы, Захарук кінуўся разбараняць дзяцюкоў. Левай рукой узяў за плячо Косьціка, а правай за Лявона й разлучыў іх як дзьве недарэчныя жабоцькі. Зьбянтэжаныя вочы дзяцюкоў ськіваліся на вялікага шыракаплечага дзядзьку, што іх так бясцырымонна разьвёў ды цяпер мерыў абвінавальным позіркам.

- Гэта вы што, хлопцы, здурэлі ці якой трасцы? Што гэта тутака ў вас робіцца? Нашто брама гэта? Хто бабу павесіў? - паказаў Захарук таўстым, рудым ад табачнага дыму пальцам на Макатунішку.

Лявон закашляўся і ўпіхаў у штаны кашулю, трос галавою, каб адкінуць назад непаслухмяныя валосы. Быццам злачынец, Косьцік вінавата пазіраў то на найдужэйшага ў вёсцы гаспадара, то на Лявона, то на браму. Маленькая макулінка чалавечае годнасьці, што захавалася нейдзе глыбака ў Косьцікавай натуры, паставіла яго, распранутага да поўнай духовай галечы, перад дакорлівымі вачмі літоўскага асілка. Каб сілу меў, не сьцярпеў-бы. Сьвярбела правая рука. Як бабахнуў-бы гэтаму самаўпэўненаму дзядзьку здаравенную аплявуху, як закрыў-бы гэныя дакорлівыя колкія вочы! Што яму да таго, што тут сталася? Чаго так рана прынесла яго сюды нейкая трасца на міравога пасрэдніка.

Як ніколі ў жыцьці, адчуў Сабакевіч сваю фізычную слабасьць і маральную нікчэмнасьць. Тлумач ты цяпер во гэтаму дзёрзкаму мужыку, дый во гэным людзям, што ўжо да гасьцінцу зь вёскі набліжаюцца, што, як і чаму гэтта адбылося. Збыўшы Захарука маўчаньнем, Косьцік разглядаўся навокал. Ля абочыны гасьцінца знайшоў раструшчаны абрэз. Захарук падыйшоў да Паваліцкага Хвёдара.

- Можа ты, Хвёдар, скажаш што тут сталася?

Хведар памарудзіў.

- Цэлую, братка, ноч браму строілі. Нас трох і Макатунішка. Сягоньніка рускія прыйсьці маюць. Раніцы нячыстыя сілы копаўцаў нарваліся. Мы ўсьпелі ў лес уцячы, а яе павесілі.

- Ааа, - разінуў вусаты рот Захарук, - дык гэта бальшавікі сягоньніка прыйдуць... Павесілі, кажаш? Гэта яны стралялі?

- А хто-ж, - буркнуў Хвёдар.

- Цьфу на вас! - узлаваўся Захарук. - От і нарабілі-ж, дзялкі. Жарцікі во, нявінная дзяўчына галавой налажыла. Вам-бы штаны спусьціць ды аддубасіць, каб сесьці не маглі! Чаму-ж не баранілі яе, га?

- Баранілі? - успыхнуў Хвёдар. - Самім яшчо на ражон? Нас во траіх і біз аружжа, толька ў Косьціка аднаго абрэз, а іх чалавек дваццаць. От і бараніся...

- Ну мы... нашы іх яшчо паймаюць псоў панскіх! Ні я буду! - пагрозьліва загрымеў Сабакевіч.

- Ну, ну паймаіш, - зьдзеклівым тонам адказаў Захарук. - Ката за хвост, ці з носу ды ў рот, гярой гэткі!

Косьцік узгарэўся, бурчэў пад носам, ня ведаючы дзе рукі падзець. Бясьсільная злосьць расьпірала грудзі.

- Дый што-ж там такое, калі няшчасьця... Свабоды-ж бяз жэртваў ні бываіць, - пасьмялеў Хвёдар Паваліцкі.

- Гм, - задумаўся Захарук, пільна мерачы зрокам Хвёдара, ды аглядаючы браму з усімі ейнымі адзобамі. - Кажаш: свабоды бяз жэртваў ні бываіць... Можа ты й разумнейшы-ткі за мяне, хлопча. Ну як на маю цёмную мужыцкую галаву, дык ці не пасьпяшыліся вы, малойчыкі... А можа каб у пару, дык і цэлымі выйшлі-б...

На гэта ніхто нічога не адказаў. Лявон ужо аціх, стаяў і слухаў.

- Дык сягоньніка, кажаш, прыйдуць? - пытаўся Захарук. - А калі, рана ці позна?

- Далжны рана, - адказаў Паваліцкі, - но точна ні знаем.

У голасе прабівалася нота сумлеву й рашчараваньня.

- Ага, во як - прадаўжаў Захарук, - ну й наварылі-ж вы, дзяцюкі, кашы... што й гаварыць. А хто-ж яе расхлёбваць за вас будзіць, га? Чаго стаіцё, як папруцянелі? Ці можа вісець во гэдак будзіць, бальшавіком на паказ?

Сьвежым раньнім тварам зірнула з-за Гараваткі сонца й сьвятлом заліло гасьцінец, прыдарожны лес, браму й труп на ёй. Як валадарны самаўпэўнены гаспадар, у падкасаваных зрэбных портках, выліняла сіняй кужэльнай кашулі, басаногі, з апоўзлай на патыліцу кепкай-аладкай, стаяў побач замарожаных сваей ненаважанасьцю трох падпольнікаў даўгавусы дзядзька. З-над брамы тупым зрокам уталопіўся ў гэтую групу ўтрапёных людзей бяздушнатвары дыктатар.

- Ну дык чаго пасталі? - загарэўся Косьцік. - Давайце здымаць.

Але сам Косьцік і сябры ягоныя, быццам ім хто волю адабраў, топалі на месцы. Увагу іх адцягнулі людзі, што незаўважна зьявіліся на гасьцінцы. Літоўскія жыхары, устрывожаныя страляніна, пасьпяшылі сюды зь вёскі. Ці ня першай з рукамі запэцканымі ў сажу, - мусіць ад чалесьнікаў, - прысьпела Аўдоля Кмітава. У гурце былі й два лекаравы хлапцы, і Бахмач Пракоп зь Януком і ягоным неадлучным Тапсікам, і Піліпава Аксеня з Арсенем.

- А матухны-ж мае, а божачкі! - галасьліва завойкала Аўдоля. - А што-ж гэта, ягодка мая мілінькая, гэттака нарабілася?

Натоўп гусьцеў. Падыходзілі, але не дакраналіся да вісячай дзяўчыны, аглядалі браму ды дакорлівымі вачмі мерылі трох

перадавікоў камуністычнага падпольля.

І тады, адкуль ні вазьміся да натоўпу далучыўся Антось Дзяркач. У правай руцэ трымаў неадлучны бярозавы кій, а па ягоным сухім, змарнелым твары з гусьценька чорнай бародкай, што зь дзеркача ў мяккую мяцёлку вырасла, шныраў праменьчык вядомай вясковым людзём кплівай усьмешкі.

- Антось! - кінулася да яго першая Піліпава Аксеня. - А ты адкуль?

- З дому, - кпіў Дзяркач.

- Як гэта з дому? Цябе-ж на вайну забралі. Дзе ты быў?

Дзеркача абступілі з пытаньнямі. Некаторым карціла рукой яго памацаць, каб пераканацца, што гэта не здань.

- Забраць то забралі, ды толька ні ўпілнавалі, хэ-хэ-хэ... - дробненькім сьмехам паехаў Антось. - Вы помніце, што дзед Якуб казаў? Што німа нам за каго на ражон лезьці, га? От я й не палез.

Набліжыліся да грамады падпольнікі. Уся ўвага зьбеглася на пранырлівым вясковым жартаўніку. Як непараўнальны гэрой, рос на вачох Антось. Распытвалі пра ўцекі, ды чаму іншым уцячы ня собіла. І Антось, першы раз у жыцьці здабыўшы такую агульную пашану аднавяскоўцаў, прыгадваў свае зусім нязвычайныя прыгоды: як па дарозе зь цягніка ў казармы шмыгнуў упоцемку за вугал хаты, як хаваўся пасьля па лясох і сялянскіх гумнах, як нарэшце пазаўчора вечарам пастукаў у дзьверы роднай хаты. І хто ведае што было-б, калі-б даведаліся пра яго ў вёсцы. Пазаўчора зходзіў пацягнуць бацьку за язык дзіравы шляхціц Паўлоўскі. На бацьку не насядаў. Зьбянтэжыўся зусім яго просталінейны розум ад часу, калі пачала пыхцець і на ўсе застаўкі трашчэць «моцарствовая». Адылі бацька параіў Антосю скрыцца, «покуль праясьніцца». Хаця-нехаця, Антосю давялося паслухаць гоману начнога Гаравацкае пушчы.

Увачавідкі рос ды поўніўся ціхім гоманам натоўп. Захарук усьпеў ужо пераказаць мужчынам навіны. Неспадзяваная вестка пра непазьбежны прыход «рускіх», што прасаладзіла некаторыя ўяўленьні, захмарылася трагэдыяй, ахвяра якое вісела ў людзей на вачох.

- Павесіць-бы во Сабакевіча й гэтых мурзікаў разам! - голасна сказаў Пракоп. Адразу прыкусіў язык. Слова выпушчанае як птушка, - паспрабуй злавіць яго. Надта-ж яшчэ нылі Пракопавы бакі ад рук Вадзімскага Адася, калі за Косьцікавы правакацыі папакутаваў.

- Пракоп, здурэў ці што? - сыкнуў збоку швагра Алесь. - Ці-ж ты ня чуў, што сягоньніка бальшавікі прыдуць?

- Брама ня выдзіржыць! - зарагатаў Антось Дзяркач.

- А што-ж яны вінаватыя? - ціўкнула Аксеня. - Палякі во павесілі.

Настаў напружаны момант. Людзі расступіліся, каб даць дарогу Макатунісе з Дуняй. Матка зірнула на браму й на твары людзей, адылі ня быў гэта позірк прытомнай жанчыны. Яе гаротны твар скрывіўся болем. Спынілася пару крокаў воддаль ад павешанай дачкі. Дробная постаць здрыганулася, яна раптоўна падбегла, угледзілася ў мёртвы твар Параскі, а ўдушлівы плачвырваўся з глыбокіх нетраў грудзей. - Параска, Па-а-ра-ссач-каа маая! А божжачкіі-ж мае! А што-ж гэта з табой зрабілі? Гы-гы...

Дрыжачыя рукі выцягнуліся ўверх, каб абхапіць ступні ног. Жанчына пахіснулася, упала. Целам ейным торгаў удушлівы плач. Першай падскочыла да яе Дуня, за ёю - Кмітава Аўдоля й Піліпава Аксеня. Паднялі, ласкавым словам намагаючыся спатоліць матку. Ды галашэньне набірала сілы.

Дуня ніводнае сьлязы ня пусьціла. Доўга прыглядалася павешанай сястры, быццам адубелая ўзіралася ў трох камуністаў. Пасьля зірнула на кій, якім падпёрся Антось. Раптам падскочыла да дзяцюка, маланкавым рухам вырвала кій, ажно Дзяркач на нагах пахіснуўся. Дзіва колькі гэта дзяўчо, злосьцяй спануканае, сілы мела. Адным скокам апынулася ля Шпунтовага Лявона і, ёмка размахваючы кіем, пачала абкладаць дзяцюка.

- Бандзюга! Басяк! Здыхляк! Злыдзень! А ты яе са сьвету зьвёў, а ты яе павесіў а ні палякі! Во, на табе!

Дуня нагадвала разьюшаную тыгрыцу. Пэўне-ж ня толькі за Параску Лявону пападала, але й за Дуніну асабістую крыўду, за гэны гвалтоўны напад у скарбовым лесе. Махала кіем ёмка й гвалтоўна, а Лявонавы намаганьні абараніцца яшчэ прыспорылі яму ўрону. Калі дзяцюк выцягнуў рукі, каб злавіць кій, дзяўчына малаціла па галаве. Цурком кінулася з носу кроў. Мігам падскочыў Косьцік, але гэтта й яму дасталося. Як апантаная, Дуня таўкла й Сабакевіча. Людзі рагаталі, крычэлі й падбухторвалі.

- Маладзец. Дуня! Так ім трэба, давай ім!

- А людцы, а ягодкі мае, гляньце што робіцца!

Бахмачоў Янук разінуў рот і веры сваім вачом ня мог даць. З таго неспадзяванага захапленьня вярнуў яго здаравенны таўхель у бок і голас доктарава Стася: - Глядзі, Янук, глядзі які маладзец твая дзяўчына.

Янук няўцямна зірнуў на сябру й нічога не адказаў. Захарук падскочыў да дзяўчыны, аблапіў яе ззаду пад рукі ды адцягнуў ад камуністаў. Антось адабраў свой кій.

- Бандзюга, бабнік, чорт лазаты! - не ўтаймоўвалася маладая Макатунішка. - Павесіць і яго, гада!

Распачлівы злосны крык рэхам пераняла Гаравацкая пушча. Быццам на загад, суняўся натоўп. Соп і выціраў з носу кроў Лявон, зьвярыўся на Дуню Косьцік Сабакевіч і ўдушліва хліпала старая Макатуніха.

5

Пачулі адно цяпер, калі аціх вэрхал. Далёка ў нетрах пушчы цяжкім гулам поўніўся гасьцінец. Як сьвет сьветам, ніхто зь літоўскіх такога ня чуў. Быццам пружынілася, стагнала змораная гаротная зямля. Удаўжкі і ўшыркі, як вада ў разводзьдзе, расплываўся па шырокай пушчы гул. Анямелі ў сполаху зьвяры й птушкі. Каторае крылатае шмыгнула ў кароны дрэваў, а іншае - пад цемя лесу. Колькі моцы ратавалася ў гушчарах хмызьнякоў чатырохногае. Чаканьнем новага й няведамага застылі ў нярухомасьці пад брамай сонцам асмужаныя, зьвернутыя на поўдзень сялянскія твары.

- Ідуць! - раўнуў з захапленьнем Паваліцкі Хвёдар.

- Танкі! - падтрымаў Сабакевіч.

Радасьць распрамяніла твары Косьціка й Хведара, адно франт «драгомішч» нязручна затыкаў сваей насаткай нос. Ад Дунінай лупцоўкі зьявіліся на твары сінякі. Камічна выглядаў зьбянтэжаны гэткім борздым наплывам неспадзяваных выпадкаў літоўскі бабнік.

Быццам заварожаны, прагна сачыў натоўп глотку гасьцінцу ў сьцяне лесу. Вось-вось выплыве адтуль бясконцая, тысячамі людзей кіраваная, стальная пачвара, папаўзе па старых гасьцінцах, гулам новае гаворкі й лязгатам зброі ціхія мірныя сёлы й нівы заліе. Пачвары яшчэ

ня відаць, але чуваць як энэргіяй тысячаў конскіх сілаў дыхаюць і равуць у лесе магутныя маторы. Хвіліна, дзьве, тры. Паднечаныя сэрцы поўняцца загадкавай трывогай. Ад Літоўцаў да гасьцінцу сьпяшаць людзі.

З-за павароту выпаўз руда-зялёны, запылены танк, выпрастаў на браму й гурт людзей вялікую цыгару-гармату. На вежы ягонай людзі спасьцераглі людзі чырвоную зорку. Чарапаха-гаргара вялічынёў была зь Пятухову хату. Плёхалі па дарожнай гліне шырокія стальныя лапы гусяніцаў, пыльны хвост паволі асядаў на прыдарожныя зарасьнікі. За павадыром вылез зь лесу другі й трэці. Імчалі на поўны разгон. Зь вежы першага танку тарчэў да паловы росту чалавек. На ім - чорная камізэля, на галаве - наводля падсядзёлка чорная шапка.

Літоўскім сялянам дыханьне заняло. Хто-ж дзе калі такое бачыў? Навет вэтэраны першае вайны, - нашто ўжо выдумлялі - пра такое ніколі не згадвалі. Быццам на каманду, сяляне адыходзілі на абочыны гасьцінцу.

Янукоў Тапсік даўгавата са Стасевым Мурзікам нюхаўся. Гэны гул насамперш паставіў на зважай ягоныя вушы. Калі-ж пачвары выпаўзьлі зь лесу, сабака натупырыў шэрсьць на шыі, пачаў пагрозьліва вурчэць ды ірвануў насустрач танкам з голасным браханьнем. Наўздагон пакаціўся камяк-Мурзік ды дружна загаўкалі іншыя прысутныя сабакі. Завагаўся зь перапалоху Янука, а пасьля за сваім гадаванцам пасьпяшыў. Тапсік ці то гаспадаровага загаду не пачуў, ці нязвычайнае паднечаньне ягонай паслухмянай натуры замінала. Апярэдзіўшы далёк Мурзіка, дапяў да першага танку, брахаў што моцы. Але хітрун трымаўся воддаль ад гусяніцы, цяўкаў і на чалавека, што ўсьмешкай распрамяніўся на вежы.

Чалавек гаркнуў нешта шофэру, галава якога тарчэла сьпераду, танка пачаў звальняць і спыніўся перад самым натоўпам. Склыгалі гусяніцамі й затрымліваліся заднія. Паволі людзі ўгледзелі ў чалавека на вежы па дзьве шпалы на пятліцах каўняра, кірпаты нос, шырокі падбародак, плоскі твар, шырака ад пераносіцы разьмешчаныя вочы. Вочы гэныя папаўзьлі па людзях, затрымаліся на браме й тады зморшчыўся нявысокі лоб.

- Што за чорт? Што ў вас гэтта? Чаму жанчына вісіць? - спытаў парасейску шорсткі бас.

Людзі маўчалі й пазіралі на Сабакевіча. Дзяцюк падыйшоў да танку.

- Палякі павесілі, таварышч камандзір.

У дрыжачым голасе - нясьмеласьць, на твары - чырвань сораму.

- Павесілі, кажаш? Дык вы-ж гэта ёлупы сабраліся з павешанай жанчынай нас сустракаць?

Цяпер чалавек выглядаў такім грозным, як і ягоная пачвара што з задняй трубы капціла сьмярдзючым бінзінным дымам.

- А ну зараз-жа зьніміце яе! - загадаў.

Мужчыны кінуліся да трупа пры браме. Мала хто прыглядаўся ім, апроч старое Макатуніхі й Дуні. На вачох былі танкі з чырвонымі зоркамі на вежах. У стальных пачварах сядзелі чужыя людзі. Некаторыя былі на мясцовых сваіх людзей падобныя, іншыя-ж - то касавокія, то плоскатварыя, жоўтыя й цёмныя. Ды вось дзіва дзіўнае: танкісты шчыра ўсьміхаліся хоць і малазразумелай мовай гаварылі. Некаторыя вяскоўцы, ужо пасьмялеўшы, перакідваліся прывітаньнямі, выцягнутыя рукі ціснулі.

Наважыліся падыйсці да машынаў і дзеці ды падлеткі. Доктараў фарсун Уладзік прыблізіўся да другога танку, пальцамі памацаў бок.

- Ні чапай, укусіць! - жартаваў Антось Дзяркач.

- Ня бойся, дзяцюк, ён ня кусаецца, - усьміхнуўся на вежы шырокі круглы твар.

Цела Макатунішкі палажылі на адхоне. Заплаканая матка прасіла Захарука, каб адвезьці яе дахаты парупіўся.

Афіцэр пярэдняга танку вылез зь вежы, нехлямяжым крокам падыйшоў да тройкі камуністаў. Паздароўкаўся. Косьцік прадставіўся сам, пасьля адрэкамэндаваў таварышоў. Зь лісьлівай падхалімскай ўсьмешкай адразу згадаў пра «барбу процiў панскага іга», прамяніўся, рос, пазіраў на бацьку й мачыху, што гамонцы прыслухоўваліся. Стары Бурак ня мог разабрацца ці сын ягоны стаў сяньня забойцам ці гэроям.

Афіцэр цярпліва слухаў Сабакевіча, пытаўся хто браму будаваў, сквапна пра польскіх памежнікаў распытваўся. На мапе адшукаў Гаці й хацеў ведаць ці там якая абарона ёсьць. Вельмі шкадаваў Косьцік, што ня мог сваіх вызвольнікаў з хлебам і сольлю сустрэць. Адылі й тое, што вось ня зь кім іншым, адно зь ім гаворыць на вачох цэлае вёскі гэты важны камандзер, спрычынілася да росту ягонага аўтарытэту.

Даўгая калёна, - адзін танк упрытык другому - расьцягнулася да лесу, роўна гула маторамі, смуродзіла едкай бінзінай. Танкісты пасаскаквалі на дарогу, некаторыя гаварылі зь сялянамі. Два малодшых афіцэры падыйшлі да пярэдняга. Гэты выплюнуў недакурак, адрывістым тонам загадаў: - Давайце назад в колону, поезжаем!

Рушылі паволі. Цяжкія лапы гусяніцаў на рудую муку дзяўблі груды гліны, раўнялі колавыя каляіны. Густой коўдрай уздымаўся пыл і сяляне адыходзілі ад гасьцінцу. Танкісты шчодра ўсьміхаліся, махалі рукамі, некаторыя кідакі ёмкае, голаснае «здрасьце».

Басаногі Захарук сьпяшыў дахаты, каб запрэгчы павярткога гнядога й старой Макатунісе ў горы пасобіць. Руху войска, здавалася, канца ня будзе. Сонца добра над Гараваткай паднялося, грэла сялянскія плечы й шыі. Гулкі запылены зялезны вуж мерна поўз гасьцінацам, лёгкі ветрык забаўляўся пылам і бінзінавым смуродам.

- Алі-ж і сіла! Ай-я-яй-яй-я! - чулася між разяваў. - От і бальшавікі табе! Гэта-ж брахалі палякі, што сам адзін смурод у іх, біда адна! А ты глянь, ты глянь! Дзе-ж яшчо каму такую сілу задзержыць?

Няведама хто й калі старой Пятушысе наказаў. Апошняй мусіць зь вёскі да гасьцінцу прыклыпала. Каго як каго, а яе гэтта ніхто не спадзяваўся. Рэдка калі за весьнічкі двору свайго выглядала. Ці адзін вясковец даўно забыўся, што старая - гадоў за восемдзесят - дзесь яшчэ ліпела з гультаём сынам на лапіку зямлі. Адно калі раніцы капціла з тонкага, з абрэзу нейкай трубы змайстраванага, Пятуховага коміну казала каторая жанчына ў вёсцы: - Глянь, Пятух во закурыў. Мусіць-ткі клеваіць яшчо старая Пітушыха.

І не ўяўлялі людзі такой нагоды, што прынадзіла-б старую на шырокі гасьцінец. Падсьлепаватая, кволая, яна апіралася бярозавым кіёчком, міргала выцьвілымі вачмі. Ды хада яе наўзьдзіў борздай людзям паказалася.

Даўно-даўненька, гадоў паўтузіна ці больш заняло ей пакуль спатоліла горыч па Язэпку сваім, што дзесь на японскай вайне прапаў. Прыйшла вялікая беспрасьвеціца то ў наймах, то на сваей вузенькай палосцы. Сыны - малеча, іх накарміць і апрануць трэба было. Ажно ў трыццатых гадох найстарэйшы ў Расею лепшай долі шукаць пайшоў. Доўга сьлязілася ўдава, на бальшаку прастойвала, праз маленькае ваконца на дарогу выглядала. Зусім спадзяваньні на сынаў паварот страціла, калі Расею як у зрэбным мяху завязалі.

Цяпер-жа здалося жанчыне, што Бог ейныя доўгія малітвы нарэшце выслухаў, зрэбны мех разьвязаў. Можа-ж можа й ейны Сьцёпка-галубок вернецца. Дападлівая Аўдоля першая старую Пятушыху спасьцерагла.

- Глянь, ты, глянь, ягодка мая! Божачка ясны, - таўханула Піліпаву Аксеню, - а гэта што вылізла?

Старая ціснулася наперад. Пад пахай трымала нешта загорнутае ў ручнік, прастакутнае хвормы. Сівыя валосы рассыпаліся з-пад новае хусьцінкі ў клеткі, кутамі пад бараду завязанай. Мо на сьмерць дзе яе ў куфры трымала. Апранулася ў белую кужэльную блюзку, цёмна-руды андарак, басаногая. Затрымалася. Борзда мігаючы вачмі, зірнула на людзей і машыны ды разгарнула ручнік. У руках трымала ікону Збаўцы, мо тую самую, каторай калісь мужа й сына праводзячы на чужыну багаслаўляла.

Маўкліва прыглядалася рухлівай бальшавіцкай калёне. Мала хто ведаў-бы, калі-б давялося, як і пра што са старой пачаць гутарку. Танкі гэным часам сьцішылі ход і зусім спыніліся. Пятушыха прыблізілася да вялікай запыленай машыны, ды высака над галавой падняла ікону. Людзі з панцырнай пачвары прыглядаліся дзівоснаму зьяўленьню.

- Сыночкі мае, саколікі мілыя, ніхай вас Бог багаславіць! - прамовіла надзіва выразным голасам, іконай зрабіла знак крыжа. Зморшчыўся сухі й жоўты твар танкіста зьверху.

- Это что ў вас, матушка?

- Гасподзь Ісус Хрыстос наш, сынока. Ніхай памагаіць вам...

- Да что вы шутите, матушка? Мы без Бога уже лет двадцать, на кога чорта он нам, - разрагатаўся маскаль.

Старая страсанулася, быццам гадзюка яе джгнула, але падыйшла амаль упрытык да машыны. Людзі чулі колкія танкіставы словы.

- Ды ты-ж, сынок, ні гавары так... няможна на Бога, грэх. - дрыжэў Пятушыхі голас.

Быццам адганяючы назойлівага авадня, махнуў маскаль на старую рукой. Танкі рушылі раптоўна. Пахіснулася Пятушыха й моцныя рукі падхапілі яе ззаду, ад гусяніц адвалаклі. Каторым давялося нядзвычайную тую сцэну бачыць, да болю горка было глядзець на дрыжачую, з іконай у руцэ, старую, што ледзь на нагах трымалася, сьлёзы выціралa. А з-над брамы адным прастрэленым і другім цэлым вокам касавурыўся ўніз бяздушны дыктатараў твар.

6

Ужо добра пакарацеў сонечны дзень, калі некаторыя сяляне, уволю пылу наглытаўшыся, бінзіннага смуроду нанюхаўшыся, прыгадалі, што ад раньня нічога ў ратох ня мелі. Пракоп паклікаў сыноў, а Алесь - жонку й дачку. Маладыя не хацелі дадому йсьці. Імбы тут цэлы дзень праліпець і то можа мала было-б. Адно калі пачулі абяцанку, што могуць пасьля паўдня назад вярнуцца, павалакліся ўсьлед за бацькамі.

Ішлі моўчкі. Ладны кавалак ад гасьцінцу адыйшоўшы, спыніліся на лекаравым жытнішчы. З узгорку вачом іхным паказалася надзвычайнае зьявішча. Ад глоткі гасьцінцу ў пушчы ды аж да павароту за чыгуначным пераездам пад Ліпавічамі, шлях стагнаў пад цяжкімі стальнымі машынамі. Гульлівым рэхам адклікалася Гаравацкая пушча, шырокім разьліўным гоманам поўніліся літоўскія начоўкі. І здавалася, што адно стальныя круглыя вежы, з таўстымі цыгаркамі наперадзе, паўзьлі па шэра-рудой кудзелі густога пылу. Дзесь у гэны суцэльны гул з боку Дубовічаў уварвалася кволае бомканьне царкоўных званоў.

- Вы чуеце? Дубовіцкі абух у сваю краму клічыць, - іранічна кінуў Алесь.

- Божа-ж мой, што-ж гэта будзіць! - ахнула Кацярына.

Ад часу Аленіных паховінаў бальшыня літоўскіх мужчын і жанчын перасталі ў Абухаву царкву заглядаць, а хадзілі ў далейшую Слабаду, дзе сьвятар ня толькі носьбітам Хрыстовага слова, але й шчырым памочнікам сялянаў быў.

- Ня чуў во мусіць, што на дарозе вытвараіцца, - спасьцярог Пракоп.

- Пачуіць, ня дзе дзеніцца. А пачуўшы, сукін сын, можа яшчэ во да гэтых служыць папрэць, як палякам служыў, - зьедліва дадаў Пракопаў швагра.

- Упасі цябе Бог, Алеська. Гэтыя-ж мусяць у Бога ня веруць, - спахапілася Кацярына.

Ішлі памалу, на гасьцінец аглядаліся. Цёрлася ля ног высокае жытняе іржышча, па каторым гуртамі забаўляліся сьвяшрчкі. Вялікі каршун шыбануў з шырокае Архіпавае кароны, ды быццам планер, прымаючы параду, ледзь варушачы крыльлямі, плыў узбоч панцырнае калёны.

- Ня веруць? - зьдзівіўся Алесь, коса на жонку зірнуўшы, - дык ці-ж Абуху Бог трэба? Ён-жа табе любога Бога за пару пудоў жыта на рынак папёр-бы.

- Ды чаму-ж не... папёр-бы, чорт пайсаты, - згадзіўся Пракоп.

Мінулі доктараў двор, падыйшлі да Пракопавай хаты. Насустрач, абапіраючыся мыліцай, чыкільгаў пасярод вуліцы дзед Якуб. Патрыярх літоўскі занемагаў мусіць апошнімі часамі, бо рэдка калі з прызбай сыновай хаты расставаўся. Гулкая нясусьвеціца на гацкім гасьцінцы даплыла мусіць і да ягоных глухаватых вушэй.

- Здаровы, Пракоп, Алесь, Кацярына, - прывітаўся здалёку. - Што гэта дзе робіцца? Маіх ня відзілі?

Голас, як на стары век, быў надзіва звонкі й выразны.

- Бальшавікі на гасьцінцы йдуць, ні канца ні краю німа? Дый вашы тамака-ж, - сказаў Пракоп.

- Бальшавікі? - разінуўся шчарбаты рот. - Дык праўду мусіць во казалі... А я, цьфу, каб на іх макарэц, узяў дый не паверыў.

- Так, дзядуля, бальшавікі, мора цэлае, - пацьвердзіў Алесь.

Стары абапёрся на мыліцу, выцягнуў з роту цыбатую люльку, пільна жмурыўся на суседзяў.

- А Божа-ж мой, бальшавікі значыцца, - перахрысьціўся дзед. - От табе й на! А як гэта кажаш, Пракоп, ідуць? Едуць ці што?

- Ды едуць-жа, едуць. Самыя танкі, ні канца ні краю німа. Схадзіў-бы паглядзеў...

- Ты ўжо, Пракопка, зь мяне ні падтруньвай. Дзе мне старому такую дарогу шкандыбаць?

Дзед пальцам патаптаў табаку ў люльцы.

- Танкі, кажаце? Ня відзіў-жа я ніколі якія гэта яны.

- Ня відзілі-ж да сягоньнішняга й мы. Надта-ж вялікія й страшныя пудзілы, от гэтак зь Пітухову хату вілічынёй. Кажны арудзію маіць. Ды ні на калёсах, а на гусяніцах яны. Мусіць і цяжкія-ж надта, бо так глядзі як гасьцінец выраўнялі.

Дзед стаяў і думаў. Ці ўяўляў, што такога дажыве?

- А гэтта-ж Піліпаў Арсень прыбягаў ды казаў, што старэйшую Макатунішку палякі павесілі. Праўда гэта?

- Павесілі. На самай браме пад Сталінам, - паясьніў Алесь.

- На каторай гэта браме?

- Ды на гэнай, што во гэтыя тры галадранцы - Косьцік, Лявон і Хведар Паваліцкі - за ноч пастроілі. Дзяўчына-ж ім памагала.

- Госпадзі мой, спасі душу яе, - перахрысьціўся стары. - А як-жа яны яе? Дзе-ж тыя галадранцы былі? Чаму ні баранілі яе, каб іх макарэц спапяліў.

- Тамака-ж і былі, а дзе-ж... Ды як нарваліся палякі, копаўцы гэтыя значыцца, - гэтак нам людзі расказвалі - дык дзяцюкі ў штаны панапускалі, у кусты ходу, от як...

Журботнае бомбканьне дубовіцкіх званоў спынілася.

- Спасі, Госпадзі, душу ейную, - кратаў дзед Якуб. - Якая яна там ні была, але ці-ж так можна?

Заварожаныя патокам пасьпеўшых падзеяў, стаялі пасярод вуліцы.

- Ты, дзеду, самы ў нас найразумнейшы. Скажы во што настаніць цяперака. Ты-ж некалі ў Расеі быў. Палепшаіць ці пагоршаіць? - пацікавіўся Алесь.

Дзед хмыкнуў, пальцам пакалупаў пад сьвіткай за паясьніцай, ды бледнымі ясна-блакітнымі вачмі пазіраў дзесь у бок Ліпавічаў.

- Як гэта вам, братцы, сказаць? Хто-ж яго знаіць... Некалі вуньдзіка сама Расея ні тая была. Многа вады з таго часу, як мяне чэрці на канец сьвету загналі, сплыло. Пры цары-ж - сам знаіш - людзі ў Бога верылі. А гэтыя мусіць чорта на покуці пасадзілі. А там, дзе чорт гаспадарыць, дык ці прыходзіцца чаго добрага ждаць? У чорта ўсё пачартоўску. Гэтулькі магу вам, братцы, цяперака сказаць. Пажывём ды ўвідзім, як тая прыказка кажыць. Доўга можа і ждаць ня прыдзіцца.

Дзесь з-за Гараваткі даляцеў да вушэй іхных зусім іншы гул. Янук першы падняў на неба вочы. Натупырыўся й Тапсік. Зусім нізка з-за сугра выплыў вялікі, з чырвонымі зоркамі на крыльлях, самалёт. Ужо пралятаючы над самай вёскай, пачуўся лёгкі стрэл. З жывата ягонага, як мак, пасыпалася нешта дробнае.

- Тата, тата! - усхапіўся Янук, - іраплан нешта кінуў! Відзіш вунь? Гляньце, гляньце!

- Чаму-ж ня віджу? Паперкі нейкія.

Янук, Мікола й Надзя пагналіся за паперкамі. Нікуды ня трэба было бегчы. Паперкі асядалі на стрэхах, падалі на вуліцу.

Захарукоў Пятро, калупаючы ў носе, паволі шкандыбаў у гэты бок з другога канца вёскі. Спыніўся, лыпнуў вачмі, спасьцярогшы «манну зь неба». Лавіў і камшыў паперкі ў карэлай руцэ.

Ад бальшака пачуўся грукат каляскі. Спанукаючы гнядога, сьпяшыў на гасьцінец Захарук, каб забраць труп Макатунішкі. Людзі адыйшліся на бок, каб даць яму дарогу. Алесь стрымаў Захарука рухам рукі.

- Гэта ты па пакойніцу? - спытаў.

- Ага, папрасіла-ж старая.

- А хто-ж гэта пахаваць? Сама Макатуніха рады ні дасьць.

Лейцамі стрымліваў Захарук нецярплівага коніка, што ёмка сьцёбаў хвастом па баках.

- Дык брат-жа ў яе ёсьць. А гэтыя во гяроі што, ні памогуць?

- Ты думаеш пра нашых камуністаў?

- Ну а каго-ж... За іх-жа дзяўчына галавой налажыла. Дый мы-ж ні калекі. Трэба бабе памагчы.

Афішкі, ськінутыя з самалёту, усё яшчэ падалі. Захарук узяў адну, што трапіла на воз, ды разглядаў яе.

- Вы гляньце, а гэта што?

- Нешта можа цікавае. трэба во пачытаць, - сказаў Пракоп.

- Ну, братцы, німа мне часу. Тамака ждалі й піраждалі мяне. Як прачытаеце, раскажаце. Дый загляніце там пасьля да Макатуноў.

Захарук зірнуў на сына, што стаяў побач, памкнуўся нешта сказаць, ды ёмка сьвіснуў кароценькай пугай і гняды раптоўна тузануў зь месца. У доктаравым дварэ стаялі дзьве хурманкі. Праз адчыненыя вароты й доктарава поле накіраваўся Захарук на гасьцінец.

- Ну дык, Пракоп, ты найболі з нас паруску граматны. Прачытай што тут пішуць, - спанукаў Алесь.

Кажны трымаў прынамсі па аднэй афішцы ў руцэ, але цяпер усе пазіралі на Пракопа.

- Даўно-ж і я, братцы, паруску чытаў, - тлумачыў Бахмач, разглядаючы афішку. - Чакайце, алі-ж гэта ні паруску, а панашаму, значыцца пабіларуску, яй Богу! - зьдзівіўся Пракоп.

- Ну дык яшчо лепі, - узрадавалася Кацярына, - чытай ужо, ні марудзь.

«Браты Беларусы! - пачаў Пракоп, - Надыйшоў сьветлы доўгачаканны дзень вашага вызваленьня. Сёньня вялікі савецкі народ падаў вам братнюю руку дапамогі. Наша слаўная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія перайшла ўсходнія межы панскай Польшчы, каб вызваліць вас ад белапольскага панскага прыгнёту...»

Пад гул савецкіх танкаў з гасьцінцу й гамонку навакольнай прыроды часта запінаўся дый зноў набіраў моцы Пракопаў бас. І гэна аграмадная новая сіла, што ўскалыхнула дрэмлючыя беларускія лясы й нівы, патокам магутнае зброі хлынула ў марудна-гаротнае сялянскае жыцьцё, цяпер вось праз гэтыя чорныя літары прамаўляла Пракопавым басам.

Гаварыла пра цяжкі лёс беларускіх сялянаў, пра зьдзекі й эксплёатацыю з боку паноў, пра посьніцу й голад, пра зямлю - іхную зямлю - каторую зрабавалі паны памешчыкі й асаднікі, пра родныя школы зь беларускай мовай навучаньня, каторых ім ня далі, пра страшны глум. І гэта новая магутная сіла паведамляла, што з прыходам Чырвонае Арміі прыйшоў нарэшце й доўгачаканы канец пакутаў іхных.

Ад гэтага памятнага дня ўсё мае паправіцца, бо ўзыйшло й зазьзяла на ўсходзе залатое сонейка шчасьлівага заўтра. Жыватворчымі праменьнямі сагрэе і ўмацуе яно зьняможаны арганізм рабочых і сялян. Слаўце й багаславіце дзень 17-га верасьня - дзень вашага вызваленьня. Збыліся вашы адвечныя мары. Стаіцё на парозе шчасьлівае будучыні. Ад гэтага часу будзеце мець і зямлю, і волю, і будзеце гаспадарамі свайго лёсу.

Пракоп скончыў чытаць. Усе задумаліся. У спрацаванай, парэпанай руцэ трымаў лістоўку. Рука, што да гнаявых вілаў, поручняў плуга, касы й цэпу прывыкла, што ў зьнямозе сьціснулася ў тую жахлівую нядзелю, калі басяк Бжончэк у Гаравацкай пушчы Алену забіў, гэта рука цяпер крукам, нязграбна трымала ськінутую з чужога самалёта паперку.

Рэха прыляцела з далёкай чужой краіны, адкуль калісьці ў вагні рэвалюцыі давялося ўцякаць. І гэта чужая й бліжэй няведамая сіла прамаўляла «нашай» мовай. Што-ж гэта за загадка такая? Надта-ж марудна працавалі цяжкія да ўзруху сялянскія мазгі. За плугам, касой, сярпом, цэпам навучыўся чалавек адрозьніваць сяброў ад ворагаў, па розных прыметах прыроды - угадваць пагоду. Навокал было

канкрэтнае, матар'яльнае, намацанае. Навет шчасьце й гора, весялосьць і сум канкрэтнымі зьявамі былі: гэтта ўсьмешка, а там сьлёзы. Бяз хітрыкаў, казаў той, жылося. Прырода - прыяцель і вораг канкрэтнымі вобразамі прамаўляла. І нідзе ў гэтым простым няхітрым жыцьці моднага й крывадушнага, здавалася, ня было. Чалавек мог выцягнуць руку, памацаць, дый ведаў дзе сябра, а дзе вораг твой.

У пана пры касьбе, малацьбе, ці жніве потам вочы залівала. І тая залатоўка мізэрная, што так нясьмела й сіратліва ў зрэбнай сялянскай кішэні тулілася, сваей мовай да сэрца прамаўляла. Ведаў, што ашукалі яго, паразіты. Ды за сваё, зароблена, патрабавалі яшчэ каб прасіў, розныя «пеленгнаваныя» рукі цалаваў: будзь ласкавы, паночак, заплаці. Рабіў-жа вунь, вочы на лоб лезьлі.

Іншы сьвет - свае сермяжнікі. У бальшыні - простыя, сумленныя людзі. Колькі зь іх зубы на паліцы трымала. Ды ў выпадку патрэбы ня людзі зь мяккімі рукамі, а гэтыя гаротнікі стануць. Як у гэну нешчасьлівую нядзелю, ці панядзелак. Забылася пра яго ўлада сьвецкая й царкоўная, сьцяной збоку станула цэлая вёска. Свая кашуля блізка цела свайго.

Калі зьявіцца ў хату які ўраднік, ці абмаскалены царкоўнік, так і ведай, што па апошняе прыйшоў. Калі-ж «пахвалёны» ля парогу ад сярмяжніка пачуеш, ведай - сябра ў хаце. І ці ні тая галіта, чужое ярмо паставіла цябе побач зь ім найбліжэй да Бога.

А гэтта што за дзівы-дзівосы? Наехалі Бог ведае адкуль, зь неба паперкі кідаюць, горы залатыя адразу абяцаюць. Што сіла, ну дык сіла! Фанабэрыстыя польскія паўшабэлкі адно «шабэлькамі» памахвалі, а гэтыя дык тых у тысячу разоў пераплюнулі. Але ці-ж гэта яны сюды табе што даваць прыйшлі? Дагэтуль-жа так было, што як каторага чужніка сюды чорт прыгнаў, дык паразіт рабаваў, на народным целе тучнеў. А гэтыя і зямлю, і волю даваць маняцца. Эгэ! І на паперцы гэнай пад самым нізам нейкі Молатаў, старшыня нейкага «саўнаркому» падпісаўся.

На які капыл усё гэта мерыць? На ўсе абяцанкі, усю гэту магутную сілу падае патройны цень: Косьцік, Лявон і Хведар - злыдні мясцовыя. Калі вось на такіх новая ўлада абаперціся мае, дык якая яна тады сама ўлада гэна? Якога дабра ад басякоў-галадранцаў чакаць? Ці-ж ні напісана ў Сьвятым Пісьме, што з бруднай крыніцы толькі

бруднае, а з чыстай адно чыстае можа пацячы? Адвечная, назьменная праўда, ад самаго Бога закон.

Зь лекаравай хаты выйшлі людзі. Барадаты стары мужчына - сьвітка ў лапіках, працёртыя зрэбныя порткі, босы - падсаджваў на воз захутаную ў кажух жанчыну, што крактала й стагнала. На другую каляску сядаў здаравенны сярэдняга веку дзядзька. Паказаўся й сам Зянькевіч. Перакінуўся словам зь людзьмі, лянівым крокам падыйшоў да тыну, паглядзеў на аселіцы, пакруціў свае даўгаватыя вусы, ды спасьцярогшы людзей ля Пракопавай хаты, накіраваўся да іх.

- Ну што гэта чуваць? Здаровы! - залепятаў.

- Ня чуеш во што на гасьцінцы робіцца? Сам, нябось, заседзіўся мусіць з хаты ні вылазіш, - адказаў Алесь.

- Хвароба ні дня, ні ночы, ні сьвята ні знаіць. Думаеш мне ні надакучыла? Ай-яй як надакучыла! Алі от ніяк ад людзей адчапіцца ні магу. А гэта-ж бальшавікі сягоньніка па радзіву крычаць, ажно апарат падскакваіць... раніцы гэта слухаў. Зь Менску гэта казалі, што сягоньня на досьвітку пачалі заходнюю Біларусь і Ўкраіну вызваляць, от як. Каб вы чулі толька якое нам дабро нясуць, дык проста вушам сваім чалавек ня хочыць верыць. Ды расказвалі вуньдзіка людзі, што па тым гасьцінцы, каторы з Докшыц на Глыбокае, дык яшчо болі пруць як гэттака во... Гэты во дзядзька з таго боку, - кіўнуў Зянькевіч галавой на здаравяку, што якраз зь ягонага двару выехаў. - Ідуць, едуць, надта-ж вялікая сіла, відаць, - цягнуў лекар. - А гэта праўда, што Макатунішку палякі на гасьцінцы павесілі?

- Ага, праўда, - адказаў Пракоп.

- Божа мой, от сіла нячыстая.

Яшчэ распытаў доктар што напісана ў тэй паперцы, каторую з самалёта ськінулі, буркнуў пра тое, што галодны, завярнуўся й пайшоў. Запраўды мусіць рупіла яму некуды, бо надта-ж пагутарыць зь людзьмі любіў. У хаце ягонай, як у карчме на скрыжаваньні дарогм заўсёды поўна народу было. Апроч хворых заходзілі падчас польскае акупацыі людзі «паслухаць што там зь Менску брэшуць». Гэтта й быў цэнтар навакольнае актыўнасьці. Радыё прыносіла навіны - часта хвальшывыя - са сьвету, а суседзі - з ваколіцы.

- Ну што ты, дзеду, пра абяцанкі бальшавіцкія думаеш? - спытала Якуба Кацярына.

- Як гэтта сказаць вам? - задумаўся літоўскі патрыярх. Відаць было, што як рэдка калі, Якуб цяжка думкі зьбіраў. - Пажывём, увідзім, - адказаў. - Слова - адно, дзела - другое. Пабудуць, пагаспадаруць, тады новага паспытаеце. Дай-жа Бог, каб на лепшае яно... алі-ж ня верыцца, ой-жа ня верыцца нешта...

7

Вышыні й пропасьці гэнага нязвычайнага дня можна было зьмерыць адно з адлегласьці часу. І тыя паднечаныя галовы, што ўцалелі, ды пасьля ўзялі на войстры сялянскі зуб развагі тую гістарычную шуміху, дакаралі сябе за дзяцінную, зялёную наіўнасьць.

А дзень быў даўгі й бурлівы. У спакойныя, драмлівыя літоўскія начоўкі прыплыла магутная чужая хваля. Доўгія гады загачаная на недалёкай мяжы, рушыла яна вялікай сілай на дарогі й гасьцінцы, калаціла нетрамі зямлі, хваляваньнем поўніла простыя сялянскія сэрцы й трывогай азмрочыла будучыню польскіх чужынцаў.

Два дзесяцігодзьдзі агароджаная незагойнай ранай на жывым народным целе, пакацілася яна цяпер з усходняй спараліжаванай паловы Беларусі на абрабаваную заходнюю. А над ей і ейным перадзе лунаў магутны зманліва-прывабны кліч: вызваленьне.

На пачатку было слова. І ўсё пачалося ад слова, і нічога ня было перад словам, апроч Аднаго Адзінага...

І каб даць першапачатак жыцьцёваму працэсу, Той Адзіны стварыў слова...

І з пачатку магічную вартасьць слова мела: яно цешыла й патоліла, лашчыла й прынаджвала, забівала й руйнавала, квяліла й гнявіла, узносіла на вышыні й ў прадоньні кідала.

Як і кажны кій, слова два канцы мае. Крывадушныя майстры ўзялі чыстае й прыгожае слова, ды на свой лад перакруцілі, за словам чыстым і празрыстым злыдняў хвальшу пасадзілі. І не спасьцераглі людзі добрыя. Адкуль-жа ім, нядоляй мораным, ведаць было, што ў той час, калі рукамі мазолістымі сьціплыя плёны зямлі зьбяднелай зьбіралі, нехта на іх новую ды яшчэ больш модную пастку майстраваў.

І як на працягу стагодзьдзяў даўгіх, гэта і цяпер слова магутнае сэрцы й галовы іх паланіла, уяўленьне дурманіла. Галодны на веру бярэ, а прагны й чорту душу з глыток вады прадасьць. Гэтак і ў той дзень. Над нівамі й сенажацямі прагучэла слова. Палымянае, зманлівае, валадарнае. Новымі спадзяваньнямі пакрыўджаных людзей падбадзёрыла.

Мала хто ў гэны дзень на сонца глядзеў. Як тут зірнеш уверх, калі замінала тое, што пад нагамі паўзло. Шкада. Калі хто прыгледзеўся-б сонцу, спасьцярог-бы, што зацьменілася яно таўстой павалокай пылу. Магутныя машыны растаўклі на дробны парашок рудую гліну на гасьцінцы. Пыл сьляпіў вочы, таймаваў дыханьне, асядаў на цела й вопратку, дрэвы й расьліны, рудой дзяругай узвышаўся над імклівай арміяй. На схіле з паўдня сонца налілося чырвонай медзьдзю.

Закрываўленае сонца...

Адылі з гасьцінцу й зь лесу, з танкаў і аўтамашынаў гучэла разьлівалася па прасторы магутнае слова: вызваленьне.

Як бура ўсьпеніць гладкія хвалі, гэтак чужая навала страсанула, ўзбурыла нетры сялянскага жыцьця. Усё, што жывое, што рэдка калі з-пад стрэх трухлявых у гурт зыходзілася, цяпер павылазіла на вуліцы й дарогі. Прыглядалася, прыслухоўвалася, хвалявалася, разважала, хоць і ня вітала чужынцаў з такім палымяным энтузіязмам, як чаўплі пасьля пра гэта пісакі-найміты на бачынах партыйнае прэсы.

Людзі сачылі буйныя хвалі, намагаліся ў іх нетры заглянуць. Адно зьверху над віхром і пенай панаваў і буйнеў магутны кліча: вызваленьне.

Дужае, прыгожае, прынаднае й чыстае як крынічная вада гэта слова. З адлегласьці спанатрыць льга было прыемны водар яго. Валакліся здалёку й зблізку сасмаглыя, адчынялі парэпаныя вусны, каб ад жыватворчай крыніцы перасохлы арганізм асьвяжыць. Ішлі калекі са сваімі ранамі, бо верылі, што прыйшла пара гаеньня. І адно сьветлае й шматабяцальнае бачылі. Гэта - унізе, пад нагамі. Бо мала хто ў дзень гэны на сонца вочы падняў.

Рух на гасьцінцы парадзеў, магутны хрыбет перапоўз у Гаці, Глыбокае ці мо далей. Ля гасьцінцу ліпелі яшчэ самыя заўзятыя разявякі, што на бурчэньне жыватоў не зважалі. Людзі-ж таўклілся цяпер на вясковай вуліцы. Ля старэйшага Пятуха клеці найбольшая грамада сабралася. Разьвязаўся мех: горача спрачаліся й многа курылі.

Уцёкі Антося Дзеркача на задні плян адыйшлі. Намагаліся ўстанавіць, як далёка «бальшавікі» пойдуць, ці немцаў назад папхнуць. Мала хто разважаў цьвяроза, бо бальшыню ў палоне трымала гэта магутнае слова - вызваленьне. Яно прынесьці мела зямлю й волю.

Па маёнтках і асадах дрыжэлі ў перапалоху чужыя паны, асаднікі й службоўцы. Абухам аглушыла іх чырвонае «вызваленьне». Шматлікія спрабавалі ўцякаць, але палавілі іх на дарогах. Іншыя-ж рукі на сябе налажылі. Дый куды-ж ўцякаць, калі ня хочаш трапіць да тых, што за Бугам загаспадарылі?

Ля Макатунішынай хаты сабралася група людзей. У хаце - прыглушаныя ўсхліпы. Як ачмураная, лындала па каморы, цягала носам Алена. Юшкевічава Клава, каторую Дуня папрасіла дзетак забавіць, старалася малых спатоліць. Зьбянтэжаныя нештодзённай зьявай, дзеткі заміналі пад рукамі, голасна плакаў Парасчын сынок.

Напокуці дзяругамі завесілі пол. Жанчыны мылі й прыбіралі нябожчыцу. Загадвала Піліпава Аксеня. У печы грэлі ваду. Дуня пайшла наказаць дзядзьку Андрэю й цётцы Тацьцяне. Рупіла ей пабачыцца зь Верачкай. Старая-ж Макатуніха, стомленая ўчарашняй бяссоньніцай, сьпяшыла рэдка ходжанымі сьцежкамі ў далёкую вёску, каб папрасіць на паховіны сьвятара. Куды бліжэй было ў Дубовічы, але сьвежымі яшчэ былі ў памяці выпадкі з паховінаў Пракопавай Алены. Слабодзкі-ж сьвятар бедным людзям пасабляў, супрацьлежнасьцю маскаля Абухава людзі яго ўважалі. Макатуніха меркавала, што калі зусім задарма не паслужыць, дык пэўне-ж і на апошнюю скарынку хлеба не паквапіцца. Сьлёзы сьляпілі жанчыне вочы, заміналі на сьцежку глядзець.

На дварэ Шпунтовага бацькі марудна, часта зяваючы, гаманілі ўчарашнія падпольнікі. Гаспадарка на схіле Гараваткі ляжала. Адсюль, як на далані, відаць быў гацкі гасьцінец і вёска Літоўцы. Дзяцюкі ператрасалі пытаньне паховінаў Макатунішкі. Наадрэз адмовіўся памагаць Лявон. Прычыну меў добрую: вёска бачыла яго коранем шматлікіх Макатунішыных утрапеньняў, Пакажыся тут літоўскім на вочы. Франт-фанабэра надта любіў гэроям выстаўляцца, а гэтта ў кажнай амаль пары сялянскіх вачэй дакор спаткаеш. Аднекваўся й Паваліцкі Хвёдар. Ужо каторы раз паўтараў, што ён гэтта адно з боку-прыпёку. Жыў разам з бацькам-чыгуначнікам у казённай хаце ля чыгункі ля самых Паваліч, што ляжалі на ўсход ад Літоўцаў.

Увесь цяжар наладжаньня паховінаў падаў на Косьціка Сабакевіча, каторы пасьля такой нефартуннай раніцы ля брамы не хацеў у хаўтурную грамаду паказвацца, ды сам за ўсіх камуністаў вачмі сьвяціць. Ён настойваў, каб сваіх верхаводаў параіцца, ды рабіць што загадаюць.

- Знаеце што, дзяцюкі? Давайце пойдзім па чарцы піракулім, а там можа праясьніцца трохі, - запрапанаваў Лявон.

- Добрая думка, - згадзіўся Хвёдар.

- Чаму-ж не, - падтрымаў Косьцік.

- Матка, яечню пячы! - гукнуў Лявон, дзьвярмі скрыпнуўшы. Руплівай Шпуньціце паўтараць ня трэба было. Дзяцюкі раскашэліліся на ўслонах ля стала. Неўзабаве прыемна засквірчэлі на патэльні скваркі. Лявон нарэзаў хлеба й выцягнуў пляшку першаку. Сівуха прыемна забулькала ў вялікіх чарках. Паднялі за вызваленьне, за сьветлую будучыню. Адно пасьля трэцяй чаркі пасьмялелі языкі, а пасьля чацьвертай да няскончанай тэмы вярнуліся. Ранейшыя розьніцы поглядаў цяпер больш ёмкімі словамі выказваліся, Быццам змовіўшыся, Косьцік і Хвёдар на Лявона насядалі.

- Сынок, а чаму-ж-бы не памагчы табе? - ўбілася ў гутарку Шпуньціха. - Бабы-ж самыя, радачкі ні дадуць...

- А ты, маці, маўчы! Ні касаіцца цябе тутака! - гаркнуў пачырванелы Лявон і на падмацаваньне свайго аргуманту кулаком па стале трахнуў.

- Добра, пушчай так і будзіць, - фінальным тонам заключыў Косьцік. Мутнымі вачмі ўважна сваіх субяседнікаў зьмерыў: уважайце, маўляў, цяпер «уласьць» прамаўляе.

- Калі на тое пашло, дык так і зробім, - пачаў Сабакевічаў аўтарытэтны голас. - Вы падскочце ў Гаці і ўсё дзела Саладуху расталкуйце. Што ён скажыць, тоя й будзіць. Я-ж сам да Макатуноў падамся. Бабы, верна, ні маюць з чаго дамавіны зрабіць. Дык от, значыцца... у бацькі дошак папрашу. Дзяўчына-ж на харошую дамавіну заслужыла, хэ-хэ, - спрабаваў Косьцік гаворку жартам закончыць і твар ягоны грымасай скрывіўся.

- Цяперака ты, братка, падзелавому гаворыш. Адразу-бы так, - апрабаваў Косьцікаву пастанову Паваліцкі Хвёдар. Вялікім размахам рукі выцер засаленыя вусны й вусікі.

Калі апусьцела патэльня й літроўка. дзяцюкі ўсталі з-за стала й навет Шпуньцісе не падзякаваўшы, за дзьверы накіраваліся. Лявон з Хвёдарам на самакатах у Гаці выехалі, а Косьцік праз хрыбет Гараваткі йшоў да Макатунішынай хаты. Ступаў паволі, на свае зьбітыя хромавыя боцікі пазіраў. Даўно-даўненька халявы скрыпець перасталі, гэтак наскрыпелі-абрыдлі ім швэнданьні пад уладай панскай. Прыгадаў, што пры першай нагодзе трэба было-б бацьку падаіць, каб даў тавару на новыя боты, якія, як вядома-ж, шавец Піліп яму, начальніку паважнаму, хутка й хлёстка пашые.

Ацяжэла адурманеная самагонкай і бяссоньніцай галава. Цягнула прылегчы, пару гадзінаў добрага сну адкаціць. Адылі розныя думкі назойлівым роем у галаве гудзелі, вайстрылі падношаную дзяцюкову энэргію. Спасьцярог, што ногі ягоныя на Архіпа накірунак трымалі. Спыніўся, працёр заспаныя вочы. У іх засьвяцілі злыя самалюбныя аганькі.

Ня чуў ніколі Косьцік пра Бальзаковага студэнта Растыньяка, што з пажадальным уздыханьнем мерыў з узвышша Сталіцу Сьвятла й мяркаваў як пакарыць яе. У студэнтавых думках маячылася неасягальнае багацьце й прынадныя прыгажуні ў раскошных спальнях, а ў Сабакевічавых - улада, помста й собская нажыва. Ласкі прыгажунь былі далёка ззаду. Адылі й Растыньяковы й Косьцікавы пажаданьні вырасьлі з аднаго карэньня. Розьніца была ў этапе працэсу самаго пакарэньня, ды ў абыймах мэтаў. Малады студэнтадно марыў і плянаваў, а Ромлкаў гаспадар ужо на вяршыні з усей сілы пяліўся.

«Алі яны гэтага яшчо ні знаюць» - думаў Сабакевіч.

Яны - гэта Сявенькі й Бахмачы, Зянькевічы й Кміты, Юшкевічы й Пятухі, Бруніські й Захарукі, ды іншыя. Ён - іхны заўтрашні, дый цяперашні ўжо начальнік. Так, чаму-ж не цяперашні? Пры першай нагодзе падраўняе зухаватаму солтысу Паўлоўскаму ягоны фанабэрысты капялюш на русай галаве. Дзе - цікава ведаць - дзяржыць цяперака пан шляхціц сваю патрапаную, задрыпаную тэчку? Што сам парабляе? Можа «цяркі» па далікатнай шляхоцкай скуры бегаюць? Гэ-гэ-гэ! Чаму-б не паказаць ім ужо сягоньніка, хто ў літоўскіх начоўках уласьць маіць? Вунь хаця-б пры тых паховінах... Паховіны - маленькая, нягеглая калода, каторую ён, Косьцік, з-пад ног неўзабаве адкініць. А там... тамака трэба будзіць ні на жартачкі ўзяцца. Вось тады... Як соладка й прыемна будзіць заглянуць Амэрыканцу Сявеньку ў ягоны

прышчаваты, з бульбападобным носам і рыбінымі вачмі, твар ды гаркнуць як на цюцьку, каб яго трасца! А Марыля-ж ягоная - баба-тыгрыца, дзеўка-гарэза, кабыла расавая... Такая прыгожая й хлёсткая дзяўчына некалі была, ды за такога змызганага й прагавітага старога замуж паквапілася. Аднаго сынка вунь за гадкоў пяць спэцкаў, - ці ні паўгоду назад таму нарадзіўся - дый то, кажуць, парабок памог. Цьфу, лапцюжына! Даўно ясна стала Косьціку, чаму самому некалі па носе ад яе дасталося. Як і іншыя дзеўкі вясковыя, за багацьцем і зямлёй пагналася, на два дзясяткі гадоў старэйшае прынадзіла яе коўдла... Са старога парахно сыплецца, а яго - гэроя заўтрашняга - набок, як кукурузку нікчэмную якую... Абаждзі ты, я-ж цябе ўежджу!

Косьцікавы мутныя вочы ўпёрліся ў вясёлы, сьветла-блакітны шчыт Сявенькавай хаты, а ззаду - гумно з фанабэрыстым казырком. Ня толькі купіў Амэрыканіц найбольш урадлівы клін зямлі вясковай, а яшчо які кусок за зялезнай дарогай ад зьбяднелых галавацкіх шляхцюкоў адкаціў. І бацьку ягонаму, знацца й яму, як наўмысна, што скула пад бокам... Здалося Сабакевічу, што навет Сявенькавы будынкі кпілі зь яго, выклікалі. У дзярэўні старыя, трухлявыя, гарбатыя стрэхі, а ў гэтага вунь якія харомины, з-пад тапара й склюта нідаўна...

Ля самага літоўскага балота Буракова гаспадарка прытаілася. Хату засланілі дзьве пышныя рабіны, што быццам вартаўнікі ля варот службу трымалі. Ззаду - хлявы й гумно, збоку - высокі журавель калодзезя, што цяперака вераб'і абселі. На скрыжаваньні дарог, між Сявенькавым і бацькавым хутарамі - літоўская школа. Быццам сірата, - калі ня лічыць будкі патрэбніка, - сьвяціла яна бляшанай страхой.

Косьцік кашлянуў, працёр ацяжэлыя сонныя павекі, рукой адгроб назад валосы, ды вочы ягоныя пабеглі далей па будучым уладаньні, а думкі - сьледам за імі. У галаве адурманенай адбыўся падлік: што, каму й за што... Вазьмі хаця-б гэтага недарэку-боўдзіла Бахмача. Нашто ўжо чалавек, здаецца галаву меў на плячох, некалі ў Піцеры пісарам, ці што, працаваў. А што зь яго? Панскі легіянер Бжончэк яму бабу прыхлопнуў, так ужо паны - яці ух растакую, - дасалілі, а гэты як быў ёлупам, так і астаўся, ані-ні ні паразумнеў. Гэта-ж табе такім, як Косьцік, у руку прыяць, дык дзе там... Я-ж табе й за Ромку, і за сябе адгаджуся, ні жывацей ты! Мала яшчэ панская паліцыя косьці табе падраўняла!

Сьціснуліся Косьцікавы кулакі. Зрок ягоны прыліп да ўпаўшых бакоў (згаладалая карова), парослай зялёным мохам і сабачымі грыбамі страхі Пракопавай хаты, пасьля перапоўз на высокую, сагнутую ўверсе, лекараву радыё-антэну. «Доктар балбатун, іці яго маць, - разважаў у думках Косьцік, - алі можа й няшкодны балбатун. Радзіва зь Мінску людзі ў яго слухалі... з другой стараны біларускую каталічаска-буржуазную пічаць зь Вільні выпісваў, польскай паліцыі рукі грэў. Над гэтым падумаць трэба, а цяперака як жыдоўскі кручкаваты нос, вапрасіцельны знак паставіць... от как!»

Ад Зянькевічавай хаты Косьцікаў зрок пералез на дзьве вялікія сасны на могільніку, але там ня спыніўся лічыць ні варон, ні круганоў, а павандраваў аж да малых Бруніськавых будынкаў, што на вясковай мяжы пад панскі лес схаваліся. «Грыбнікі, такую вашу маць, у лесе сідзяць! Людзі свае, здаецца, навіт разу пуні далі піраначаваць, калі зімля пад нагамі гарэла. Ды чорт вас, панскіх рымскіх каталікоў, знаіць... сірмяжнікі-ж, здаецца, біда, як тое сала ў Шпуньціхі на скаварадзе, сквірчыць, а іх да панскай айчызны цягніць... Будзь разумным, разьбірайся. Ды нічога, народная ўласьць разьбярэцца...»

Прыгадаўшы ўладу, выпрасталася Косьцікава ацяжэлая галава, падбадзёрыліся падношанае, раніцай так зьняважанае пры браме, гэна гэройскае «я».

Трэба-ж шпіёнаў. як тых клапоў, са шчэлак павыкалупваць, ды папрыхлопваць каторых. Можа ад гэтай мэнды - дзіравага шляхціца пачаць. Ды там недзіка ліста...»

Саладзіў Косьцікава сэрца водгалас вайсковае калёны з гасьцінцу. «Вось для чаго жыў і змагаўся,» - думаў дзяцюк. Моцна засьвярбела галава. Сабакевіч пакалупаў у сваіх буйных, растрэпаных валосах, ды з-пад чорнага ногця выкінуў на карэлую даланю вялізную шэрую, зь цёмным хрыбтом, вош.

- Цьфу ты, нінажэрная контра! Пралітарскую маю кроў п'еш! - вылаяўся ён. - Я-ж на цябе мачыху напушчу, абаждзі!

Згадка пра мачыху нарадзіла думку, што пры першай нагодзе трэба наведаць лазьню, добра выпарыцца й выхвастацца добрым бярозавым венікам, аж да чырвоных рубцоў на скуры, ды зьмяніць бялізну. А сяньня яшчэ трэба гутарку з бацькам мець. З маладых гадоў неяк ня клеілася зь ім. Кулацкае кодла, зусім ачарсьцьвеў стары Бурак.

Яшчэ раз зірнуўшы на нівы, пакалупаныя бульбянішчы, кінуў вокам на Архіпа, непадалёк пахілены Гаравацкі крыж, засьценак Лазоўскага з другога боку, ды вольным крокам паклыпаў да Макатунішынай хаты.

У дварэ кінуў на прывітаньне задрыпанае «здрасьця». Людзі глядзелі на нябрыты твар, пачырванелы шрам на лбе, мутныя вочы, расшпілены паўсуконны шэры пінжак, раськіданы чуб валасоў. Дзяцюк спыніўся, павольна агледзіў сабраную грамаду, ды рэзкім голасам гаркнуў:

- Ну чаго паказелілі вочы? Першы раз мяне відзіця, ці што?

Жанчыны пераглянуліся. У такой загадкавай сытуацыі ніхто ня ведаў як рэагаваць на Косьцікавы словы. Прывязаны ля хлева Захарукоў конь касавурыўся на свайго гасппадара. Дзьве шэрыя курыцы разграбалі гной. У загарадзе церлася аб плот худая Макатунішына карова. Пра яе, відаць, сяньня ўсе забыліся. З мужчын вясковых быў тут нязьменны ў сваім выглядзе Захарук, Сымон Пятух са сьмярдзючай папяросінай у зубах, ды Антось Дзяркач зь неадлучным кіем. Стаялі ля дзьвярэй у хату й Сабакевіч падыйшоў да іх.

- Што гэта тутака робіцца? - спытаў.

- От, праўду сказаць, нічога, - адказаў Захарук. - Старая недзіка па Слабодзкага папа пабегла, а Дуня - сваяком наказаць. У хаце Алена з бабамі. Мы от гаварылі гэтта, што німа з чаго дамавіну зрабіць, сам знаіш...

- Я бацьку папрашу, у яго дошкі далжны быць, - адказаў Косьцік. - Ты кажаш, што старая па папа пабегла? Начорта поп той! Савецкая ўласьць папоў ні знаіць, от што! Параска за што галаву налажыла, як ты думаіш?

Косьцік наўмысна падняў голас, каб іншыя чулі. І запраўды жанчыны вушы наставілі.

- Я-ж... сам ведаеш, маё дзела гэтта збоку. Пахароны - дзела сямейнае, - адказаў Захарук. - Як яны хочуць... ды неяк ніпалюдзку яно было-б. А хто-ж Макатунісе загадаіць?

- Як то хто? Той хто ўласьць маіць, дык той і загадаіць! - адрэзаў Косьцік. - От паехаў Хвёдар ізь Лявонам да парційнага сакратара ў Гаці. Што той скажа зрабіць, тоя й будзіць.

- Ну рабіце-ж, воля ваша, - зварухнуў плячыма зьбянтэжаны такой рэзкасьцю Косьціка Захарук. Выцягнуў бярозавую табакерку з горадзенкай і ўзяўся круціць папяросіну.

- Дзядзька Захарук, - зьвярнуўся камуніст лагаднейшым тонам, - калі мой бацька дошак дасьць, дык возьміцiся дамавіну зрабіць?

- Чаму-ж не. Некаму-ж трэба, сама ня зробіцца. Во Антось і Сымон памогуць мне.

Пры Захаруковых словах жвавей забегалі рудыя Пятуховы вочкі й карэлая рука выцягнула даўгі сьмярдзючы цыбук з роту.

- Дык гэтага-ж... я, знацца, ніколі такога ні рабіў... ні дам рады, - адмаўляўся вясковы абібок.

- Рубанак умеіш у руках дзіржаць? - спытаў Захарук.

- А калі ўмею, дык што?

- Цьвек малатком умееш убіць?

- Хто-ж ня ўмеіць...

- От відзіш, толька ахвоты трэба. Пэўне-ж яшчо й дошку пілой можаш адрэзаць. А за хворму вазьмуся сам.

- Зробім, ні сьвятыя гаршкі лепяць, - усьміхнуўся Дзяркач.

- Добра тады, - сказаў Косьцік - астаецца толька каго знайсьці, каб яму выкапаў. Цяперака зайдуся паглядзець што ў хаце робіцца.

Падчас падпольнае працы давялося Косьціку нязьлічаныя парогі абіваць. Зжыўся з галечай, як іншы зь нялюбай мачыхай. Адылі дзьверы Макатунішынай хаты адчыняў неахвотна. Каб ня тая ўяўная высокая плошча, на каторую паставіла яго «вызваленьне», на вяроўцы яго на гэтыя хаўтуры не прыцягнулі-б. Перад дзьвярмі на момант завагаўся, паволі націснуў клямку.

Маленькія ваконцы хаты давалі мала сьвятла звонку й Косьцік, адчыніўшы дзьверы, не спасьцярог дзе ступіць. Ледзь не паляцеў з парогу тарчма на гліняную падлогу. У час спыніў на языку лаянку. Парнасьць і кісьля ўдарыла ў нос. Дзяцюк разгледзіўся. Пры печы качаргой зграбала жар Алена. Апранутая ў старую памятую сукенку з закасанымі рукавамі, яе сумны твар у водсьвеце дагараючых вугалёў, адштурхіваў чалавека тупой, няпрыязнай, зрэзыгнаванай заўзятасьцю. На ўслонах сядзелі жанчыны, а напокуці, на шырокай лаве, прыладжвалі цела нябожчыцы Піліпава Аксеня й Кмітава Аўдоля. Побач на стале сквірчэла й хліпала на кноце вялікай рудой сьвечкі даўгаватае полымя.

Некалі сьцены паабклейвалі «Кур'ерам Цодзенным» з тучным чырвоным загалоўкам. Цяпер зьнізу ад падлогі да, вышыні як дзеткам рукамі дастаць, а над лавамі й куды вышэй, сьцены былі аголеныя, мясцамі пасмы газэты павырываныя былі аж да столі. Спаміж голых круглякоў павыскубвалі дзеці мох. За печчу на палу ляжалі пасьцелі й рызманы. На прыпечку, побач зь сінім змылкам, ляжалі мокрыя шматы й стаяла шэрая мядніца з вадой. Чарада гаршкоў, гліняныя міскі й іншы посуд падчырківалі агульны хаос.

Косьцік пачмыхаў носам, пазіраў на Алену, ня ведаючы як гаворку пачаць. Гэтая галеча, што шчэрыла зубы з кажнага кута пакою, зусім сапсавала вялікі й энэргічны ўздым, што ўзбуйнеў пры смачных разважаньнях пра будучыню свайго валоданьня на Гараватцы пад Архіпам.

- Ты сама дома? - спытаў Алену.

- А табе чаго? - буркнула жанчына. У шурпатым голасе ня было няпрыязьні, адно змораная абыякавасьць. Гэтак гамоняць людзі ў беспрасьветнай тупой апатыі.

- Дык як гэта чаго? Памагчы-ж вам трэба.

- Ага...

Алена Макатунішка ўпілася ў Косьціка тупымі вачмі, рукой выцерла спацелы лоб і цёмне пасма сажы дало ёй яшчэ больш няпрыветлівы выгляд.

- На дварэ казалі мне, што Дуня пабегла па дзядзьку, а маці па папа.

- Ага.

Жанчыны зь цікавасьцю слухалі аднабочную гаворку, сачылі Сабакевіча.

- Дык што вам памагчы? - скроб Косьцік у буйных валосах.

- Га? Ні знаю, сам глядзі.

Косьцік страсануў галавой, пазіраў на прысутных жанчын. Маўчалі. Навет звычайна гаманлівыя Аксеня й Аўдоля гэтым разам як на злосьць, каб табе слова. Зьбянтэжаны Сабакевіч, больш не марудзячы, асьцярожна ступіў на вялікі плоскі камень ля парогу й адчыніў скрыпучыя дзьверы.

Каб у пару не спасьцярог, дык зьбіў-бы з ног старога Панаса, што з псалтырам пад пахай вырас на парозе. Гэткага спатканьня стары, відаць, не спадзяваўся. Стануў, як акамянелы, маргаў павекамі, а ў

ягоных вачох прытаілася насьцярожанасьць і няўцямнасьць. Чуў пра Буракова бязбожніка-камуністу шмат нядобрага. Жылістая рука моцна сьціснула псалтыр.

Соладка рабілася на сэрцы старога Панаса, калі людзям у бядзе мог пасобіць, хоць і сам ня вельмі раскашаваўся ў шматдзетнай сыновай сям'і. Калі пачуў дзе пра візыту старой шчарбатай ведзьмы з касою, хрысьціўся й голасна казаў: - Божачка, чаму-ж мяне ты й на гэты раз мінуў? Пасьля браў свой добра патрапаны й абшмуляны псалтыр, ды сьпяшыў да сьвежай дамавіны. Шанавалі за гэта старога людзі. Рэдка калі хто яго прасіў, бо верылі, што Панас сам нейкім чынам праведае і ў час зьявіцца ў хату.

Косьцік зірнуў на старога, памкнуўся нешта сказаць, але махнуў рукою.

8

- Ну дык ты йдзеш, ці ня йдзеш? Гэта ты за што ўзялася?

Паўлюк Бурак, яшчэ не зачыніўшы дзьвярэй, зь сяней наваліўся на жонку. Ніна Бурачыха сядзела на зэдліку пры стале й часала свае прыгожыя каштанавыя валосы. Думала, што варта было-б нагрэць вады й памыць іх добра, але такі намер да заўтрашняга адлажыла. Не хацелася ў сьвятую нядзельку з сырымі дровамі вазіцца. Стары вурчэў і кідаўся ў кленічы, калі бралася за сухія бярозавыя, што ў капцы на дрывотні ля клеці ляжалі. У печы загадваў хворастам паліць, ды - адкуль яны ў яго браліся? - шчапаў і сам валок у хату каб падсыхалі за ноч сыраватыя карчы.

І яшчэ думала Ніна Бурачыха пра бальшавікоў, пра танкі на гасьцінцы й пра нейкія зьмены, што неўзабаве прыйдуць. Вярнуўшыся ад гэнай Косьцікавай брамы, хацела была з мужам памяркаваць як яно й што будзе. Малагаманлівы й бурклівы Бурак і сяньня на словы скупіўся. Дзіва ня было-б, калі-б сын гадамі за гэту новую ўладу сьцен па вязьніцах ня выціраў. Мужчыны ня ладзілі між сабою. Стары ці не зьбянтэжыўся, ня ведаў чаго цяпер спадзявацца. Прыйшоўшы дахаты, пасёрбаў капусты, зьеў камяк учарашняй паджаранай дранкі, ды адразу пачаў штыліць, каб памагаць бульбу перабіраць ішла.

Бульба ў горбе на таку ляжала. Перабіраньне - немалая й марудная праца. Кормную, малую як арэхі, для сьвіньней ссыпалі ў вадзін катух, а емінную - ў другі ў варыўні. Некаторыя літоўскія за бульбу яшчэ ня браліся, а непаседліваму Бураку і ў нядзелю да працы рупіла. Ніна ведала чаму Паўлюк не марудзіў. Пасьля бульбы зараз да апрацоўкі лёну гнаць будзе. І гэтак без канца. Навет сяньня, у такі нязвычайны дзень, стары злыдзень-скупіньдзя адпачыць не даваў. Іншыя ў вёсцы пазьбіраліся, гамоняць, час маюць. Каму як каму, а Бураку ўрону ня было-б, каб пасьвяткаваў. Але-ж, кажуць, ня йдзі за багатага, а йдзі за любага й разумнага.

Стол быў засланы прыгожым, вышытым рознаколернымі ўзорамі, настольнікам. На аркушы шэрай паперы стаяла простакутнае, зьнятае са сьцяны люстра. Якраз калі Ніна разглядала свой твар у гэным люстэрку, расчэсвала валосы, ды думала пра пра ўсё новае, што сяньня ў вёску наплыло, Бурак дзьвярмі за сьпіной скрыпнуў. Кіпеў, відаць, бурчэў пры той бульбе, дый ня вытрымаў.

- Сказала, што ні пайду сягоньніка. Ідзі ты, знаіш куды! - агрызнулася Бурачыха. - Куды гэта табе рупіць? У людзей, як у людзей, а ў цябе ўсё ніпалюдзку. От лёг-бы ды паліжаў...

- Каб ты ліжала ды ні ўстала! - усхадзіўся Бурак. - Мала во раніцы ляжыш, сонца ў зад упрэцца, што дабудзіцца ні магу, дык мяне яшчо цягніш. Мусіць і любіла-б толька, каб з табой ліжаў ды яшчо чаго добрага...

- Ну а чаму-ж не? Ня зломак-жа ты! Ці маю да каго чужога йсьці, га? Нашто табе багацьце? На той сьвет забярэш?

Паўлюк спыніўся сярод пакою. Цяпер аглянуўся на дзьверы й крок назад зрабіў. Пра бульбу пачалося, а баба глядзі вунь куды павяла. Ведаў небясьпеку гэтай тэмы й высьцерагаўся яе, як агня. Колькі ўжо мазгі яму пра гэта напіліла. Калі яе да мяжы давядзеш, дык з табою не пацацкаецца, а бярэ качалку, ды па галаве. Гэта не Матрона пакойная. Ложка асобнае сабе Паўлюк справіў. Не агледзеўся калі, жонка шмыг пад коўдру! Паспрабуй уцячы адтуль на печ, дык і там жыць ні дасьць. Звадак дарэмных ня шукаў. Думаў спачатку, што як Матрону ўезьдзіць. Не на тую трапіў. Ён рукой за падпругу, а яна за качаргу, ды так натаўкла, што пару тыдняў бакамі рабіў. Мала таго. Яшчэ па вёсцы разбарабаніла-разьнесла, людзям у вочы зірнуць было сорамна. А

навошта яму дзіцё тое, клопат на галаву? Пацехі ніякай, аднаго злыдня вунь выгадаваў...

Згадаўшы Косьціка, Бурак схамянуўся. Цяпер-жа сын пэўне начальнікам нейкім стане. Можа, дзякуючы яму, ўдасца лесу які кавалак дастаць. Даўно думка пра собскую лазьню супакою не давала, ды на бярвеньне грошы шкадаваў.

Бурачыха ўстала з зэдліка ды, быццам гатовая да скоку тыгрыцы, ўважна сачыла мужа. Здавалася, што вось неўзабаве кінецца ды пачне рваць і тузаць. Вялікім хваляваньнем ускалыхаліся пад прыгожай, вышытай блакітнымі васількамі, кужэльнай блюзкай тугія грудзі. Басаногая, у зялёнай спадніцы ў жоўтыя пасачкі, Ніна мела прыгожую, надта прапарцыянальную фігуру, круглы лагодны падбародак, поўныя ружовыя вусны, просты, ледзь з намёкам на курносасьць, нос, вялікія, прывабнага адценю, вочы, шырокія бровы й высакаваты, роўны лоб. У вачох іскрыліся пажадальныя аганькі. Кажны празорлівы мужчына адразу спанатрыў-бы, што гэту прывабную жанчыну адным можна было толькі спатоліць.

Ведаў тое й Паўлюк. Але, - разважаў ён, - гулі з бабай у пасьцелі адно, а дзіця - што іншае. Празь дзіця Ніна старалася-б гаспадаркай авалодаць. Бязьдзетную можна каленам у зад і паслаць туды, адкуль прыйшла. Зусім што іншае, калі-б мела дзіця ад яго. Хоць ня зломак, цяпер рабіць ня хоча, а тады й пагатове: у сваю хату страшна было-б паказацца.

Найбольш Паўлюку праца карціла. Матрона некалі цэлую гаспадарку на сваіх худых плячох трымала, а гэтай жанчыне зусім ні ў галаве тое. Яна адно ў меру, ніколі пры працы не папанатужыцца. Даўно прычыны Паўлюк шукаў. Другая ці раз ужо зь якім дзяцюком зьнюхалася-б. Бурачысе-ж, зь ейным выглядам, адно вокам маргні, дык дзесяцера на пачаканьні стане. І каб так зрабіла, не завагаўся-б Паўлюк дзьверы ей паказаць. Дык-жа не, злыдніца гультайская, як-бы яе хто да хаты прывязаў, адно на яго насядае.

Гаварылі позіркамі. Гэткае разуменьне адзін аднаго, як прыладжаная на час бомба, трымала іх у нэрвовым напружаньні. Колькі разоў рупіла ўжо Ніне палюбоўніка пашукаць. Адылі ведала, што стары Бурак адно чакаў гэтага, каб з хаты выгнаць. «Трасца табе, пацярплю. Жыць ня буду, калі цябе не перажыву,» - думала жанчына.

- Багацьце! Якое багацьце? Ты нажыла можа? - ня сунімаўся Бурак.

- На каго, на цябе рабіць буду? Даволі раблю. Глядзі які ў мяне ў хаце парадак! - крыкнула Ніна й падмацавала свой аргумант адрывістым жэстам рукі. Хата запраўды ад чысьціні зьзяла. На ложках - прыгожыя саматканыя дываны, на камодах - вышываныя накрываньні. Весела сьвяцілася чыстая жоўтая падлога, дбайлівасьць гаспадыні відаць была й навокал печы.

- Ідзі й пірабірай тую бульбу, калі табе, прагавітаму, божых будняў мала, а мяне ні чапай! - адрэзала Ніна.

У Паўлюковых вачах зьзялі маланкі й моцна сьвярбелі карэлыя ад бульбы рукі, але ведаў дзе спыніцца. Выходзячы, так трахнуў дзьвярмі, што аж падскочылі на прыпечку гаршкі й закыдахтала ў вагародзе курыца. Ніна падыйшла да вакна. Згорбленая постаць накіравалася ў гумно. Ірвануўся на ланцугу, ды зь лісьлівымі вачмі кінуўся лізнуць у твар гаспадара Ромак. Стары размахнуўся нагой і моцна стукнуў сабаку ў жывот. Скуголячы, Ромак падкорчыў хвост і паціснуў у будку. Палажыўшы морду ня ніжняй дошцы адтуліны, енчыў з болю.

- Нелюдзь ты, на сабаку злосьць спаганяіш! - крыкнула праз вакно Ноіна.

Па дарозе ў гумно распачаў Паўлюк доўгія кленічы. Чаго добрага, можа цяпер баба сьвіней карміць, кароў даіць, птушак даглядаць і есьці варыць адмовіцца. Ці першы гэта раз. Пасьля добрай звады адно есьці зварыць, ды на стол навет не падасьць, тыдзень ці больш глухой сьцяной прыкідваецца, а статак і іншае самому даглядаць трэба. Цяжка, ой як цяжка тады да нармальнага ладу вярнуцца. Пацярэбіць Паўлюк галаву, памяркуе, ды паедзе ў Гаці, каб якую хустку ці матар'ялу крамнага купць. Трэба-ж неяк жонку раздабрыць, на нармальныя сьцежкі хатняе жыцьцё пераставіць.

Надта-ж высьцерагаўся стары Бурак, каб меркі ня перабраць. Ды што зробіш, калі жанчына выклікае? Ён ей слова, а яна яму дзесяць у вадказ. Нясусьвеціца цэлая паўстае. І хто ведае якімі шляхамі павандраваў-бы вечар гэны, калі-б ня тое «вызваленьне». Зьявілася яно ў хату ў постаці Бураковага Косьціка.

Калі сонца стамілася морам «вызвольнікаў», ды ўжо за Гаравацкую пушчу хілілася, Косьцік ішоў хутарнай дарожкай ад бальшака, ды высьвістываў нейкую бальшавіцкую песьню-

падбадзёрку. Першым пачуў яго адданы гадунец Ромак. Калі суняўся боль ад Бураковага ўдару ў жывот, сабака задрамаў. Трызьніўся яму млявы сон, а ў сьне гэным зьявіўся ня хто іншы, як сам валадарны гаспадар Косьцік. Згадаўшы мілы пах Косьцікавай вопраткі, рук і твару, паварушыўся Ромкаў нос. Ледзь чутны сьвіст даляцеў да сабачых вушэй. Зварухнулася левае, а пасьля правае вуха. Калі мілы тон Косьцікава сьвістаньня заказытаў вясёлым прадчуваньнем Ромкава сэрца, ваўчар адчыніў вочы й высадзіў з будкі галаву. Памылкі не магло быць. Ромак скочыў на двор і аж засьпяваў ад радасьці нацягнуты моцным ланцугом таўсты дрот.

- Ромак, Ромак, дружа мой! - галёкнуў здалёку Косьцік, спасьцярогшы шалёную радасьць любімага гадунца. Дрот адным крукам быў прымацаваны да вугла хаты, другім да клеці. Дужы сабака так заядла торгаў ланцуг, што здавалася ня вытрымаюць крукі й Ромак рванецца на свайго мілага, даўно нябачанага гаспадара. Гвалтоўны басісты голас задыхаўся-душыўся ў нашыйніку. Ромкава паднечаньне расло ў меру калі Косьцік, паволі прыбліжаючыся, адчыняў вароты. Здавалася, што вось-вось сабака задушыцца з радасьці.

- Памалу, памалу, ні тарапіся дружа мой! - сунімаў Ромка Сабакевіч і нарэшце сабака рынуўся на дзяцюка. Штуршок ледзь яго з ног не звалiў. Стоячы на задніх лапах, сабака ростам Косьціку раўняўся. Шырокім ружовым языком колькі разоў лізнуў дзяцюка ў твар, як зручны акрабат адскочыў назад і, раптоўна адбіўшыся, зноў рынуў наперад. Гулкі радасны брэх пераклікаўся ў нетрах суседняга балота.

Пры вакне ў хаце выросла расчасаная галава мачыхі, а згумна выйшаў, каб пабачыць каго так аблюбаваў Ромак у дварэ, стары Бурак. Крыху пастаяў, ды рушыў на спатканьне сыну. Мачыха вуйшла з хаты й спынілася на парозе сеняў.

- Ну давольна ўжэ, давольна! - стрымоўваў Косьцік сабаку, трос вялікую шэрую лапу, ды бараніўся ад чырвонага языка.

- Які ты харошы, дружа мой... ды мусіць цябе на прывязі ўсё ўрэмя дзіржаць.

Ён адчапіў нашыйнік ад ланцуга. Здабыўшы волю, Ромак высака падскочыў, напісаў на пяску вялікае паўкола, імкліва кінуўся за вароты. Пабрахаўшы зь вялікае радасьці, ўзяўся пільна абнюхваць платы ды

вуглы будынкаў. Вялікі, ружовы язык вісеў між белых клыкоў, а вочы пільна сачылі гаспадара свайго.

- Вы гэта што, мусіць ніколі з прывязі яго ні спускаеце? - зьвярнуўся Косьцік да бацькоў, што маўкліва з боку стаялі.

- Бываіць, спускаем. Гэта ён так цешыцца, бо цябе даўна ня відзіў, - адказала Ніна.

Косьцік ня прыгадваў, калі апошні раз дома быў. Магчыма месяцаў шэсьць таму назад. Шпігуны й паліцыя на пяткі наступалі, да старога Бурака часта «пагавэньдзіць» заходзілі.

- Ну дык, маці, давай цяперака хоць палюдзку прывітаімся, бо тамака на гасьцінцы ні было як.

Пакуль Бахмачыха слова змагла сказаць, Косьцік аблапіў яе памядзьвежаму, пацалаваў у вусны і ўважана, бессаромна разглядаў у твар.

- Алі-ж і пахарашэла ты, матухна мая! Ні праўда, бацька?

Паўлюк буркнуў сабе нешта пад носам, ды адвярнуўся.

- Іш ты які! - усьміхнулася ласкава Ніна, - бацька ні дагледзіць, дык сын хоць пагладзіць!

- Ты, бацька, што? Ні відзіш якую гэта харошую бабу маіш? Ці гэта вы можа пастараму яшчо ваюеце? Ну-ну! Я вас скора паміру!

Косьцік не памахаў па настаўніцку пальцам, ды поза й тон вылучалі яго як гаспадара. Бацькі чуліся як дзеці, на дрэнным учынку злоўленыя. Сын падыйшоў да бацькі й выцягнуў руку.

- Давай, бацька, паздароўкаемся. Як дзялішкі?

- Ды от так...

- Січас ня буду ўжо па начах ад сышчыкаў хавацца, - хваліўся Косьцік. - Січас я - хазяін! З вамі буду часта відзіцца, парадкі наводзіць, так сказаць...

Паўлюк Бурак недаверліва пазіраў на сына.

- Пэўня-ж начальнікам нейкім будзіш? - спытаў нясьмела.

- Пэўня-ж ні пастухом, - задзірліва адказаў Сабакевіч. - За што-ж я па цюрмах страдаў?

- Дык заходзь, Косьцік, у хату. - запрашала мачыха. - Віджу, што змучаны ты надта. Калі спаў? Прызнайся!

- Заўчорака, здаецца.

- Дык хадзі, хадзі! - узяла яго руку. - Пасьля нагаворымся. Можа табе есьці зрабіць, ці што?

Пераступілі парог. З кута сяней нясло пракіслай паранкай. Няёмка чуўся Паўлюк. Жонка й сын захоўваліся так, быццам ня ён тут гаспадар. Косьцік стаяў пасярод хаты й разглядаўся. Воляй ці не нацешыцца хацеў. Гэта ня тое, што раней: загляне ў хату, ды кажнага ценю й голасу баяцца трэба. Цяпер ён сам у гэтай хаце гаспадар. Раней ці пазьней і бацька ласкі нейкай у яго папросіць. Агледзеўшы хату, Сабакевіч сеў на пачэсным месцы ля стала. Быццам непажаданы візытар, бацька прымасьціўся на канцы лавы. За дзьвярмі пачуўся сабачы піск.

- Упусьці, маці, Ромка ў хату. Даўна ён мяне відзіў, дык пускай нацешыцца.

Ніна адчыніла дзьверы й Ромак адным скокам апынуўся ля Косьціка. Спрабаваўшы лізнуць яго ў твар, палажыў галаву на дзяцюковы калені й напорыста глядзеў яму ў вочы. У гадунцовых вачох сьвяцілася глыбокая адданасьць і ўдзячнасьць.

- Дык скажы, Косьцік, чым табе ўгадзіць? - лісьліва спытала мачыха. - Можа есьці хочаш?

- Ды не. Я мусіць тых абажду.

- Каго гэта?

- Хведар зь Лявонам у Гаці да Саладухі паехалі. Той скажа, што маем рабіць. Прыедуць назад, дык тады можа й накорміце нас. Раніцы я ў Лявона заўтракаў. Нам тутака з гэтай пакойніцай заботы. У баб гола ў хаце. Дзяўчына для народу работала. Ага, во што, бацька: можа ў цябе ёсьць дошкі, з каторых дамавіну зрабіць.

Паўлюк трымаў карэлыя ад працы рукі, як плашкі, на каленях і ня сьпяшыўся з адказам. У ягонай спрактыкаванай галаве пайшлі ў рух мазгавыя спрунжыны, каб хутка спанатрыць адказ на пытаньне: калі даць, дык што ўзяць. Скнэра нікому нічога не даваў за добрыя вочы ці ласкавую ўсьмешку. І ў вачох ягоных, што так раптоўна ажылі пасьля сынавага пытаньня, падазронасьць перамяшалася з практычнай жыцьцёвай калкуляцыяй. Цёмныя лапікі розных вялічыняў распаўзьліся па вылінялых і мясцамі папраціраных зрэбных портках ды кужэльнай сьвітцы. Зь левага, ашчэранага, даўно мусіць нюхаўшага дзёгаць, боту выглядала каравая ануча. Рука памацала кароткія рыжыя вусікі й тады Паўлюк неахвотна адказаў:

- Дык дзе-ж у мяне якія дошкі... Лесу німа, сам знаіш... От каб бярвеньня якога, лазьню трэба было-б як згарусьціць, а то як памыцца

захочаш, дык заўжды йдзі да каго ласкі прасіць.

- Ты, бацька, ці ні надуць мяне хочаш? - груба адказаў Сабкевіч. - У цябе дошкі пад паветкай ліжалі, сам відзіў, каб я з гэтага места ні зыйшоў... Што ты зрабіў зь імі?

Сынава гаворка йшла ў такім накірунку, што зусім старому Бураку не падабаўся. Дый тое зьверху сказанае «бацька» надта-ж не да смаку было. Калісьці «татам» клікаў.

- Што ты, Косьцік, упасі цябе Бог! - спахапіўся стары. - Гэныя дошкі? Дык гэта-ж самыя лепшыя дошкі!

- Калі гэна сама лепшыя, дык у цябе мусіць і горшыя ёсьць. Га? - учапіўся сын за бацьку. - Ці можа ты думаіш, што з гнілых дамавіну зробяць?

- Дык я-ж ні казаў, што з гнілых, алі можа абыйдзецца і з горшых... А хто-ж яе, тую дамавіну, рабіць будзіць?

- Згадзіўся Захарук, Сымон Пятух і Антось Дзяркач.

- Ну Захарук рукі маіць добрыя, а тыя два - гультаі. Ды во гэты хітрун неяк выкруціўся, ўцёк. Чаму-ж во другія ні ўцяклі?

- Гэта, бацька, ні наша дзела. Уцёк і добра зрабіў. А дамавіну, калі сказалі, дык зробяць.

Настала маўчаньне. Прыпёрты сынам да сьцяны, маўчаў Паўлюк.

- От што я табе скажу, - пачаў стары, - калі ты мне дасі лесу, дык я табе дам дошак. Трэба лазьню пабудаваць, сам знаіш. І сам-жа мусіць ні купаўся даўна, праўда?

- Што праўда, то праўда. Трэба было-б выхвастацца й папарыцца. Алі што-ж, буду ждаць пакуль лазьню пастроіш? - усьміхнуўся Сабакевіч. - А як гэта кажаш, каб я табе лесу даў? Дзе ў мяне ёсьціка той лес?

- Дык-жа ні цяпер, - пасьпяшыў адказаць бацька. - Я-ж ні кажу, што от адразу давай. Ты-ж нейкім начальнікам будзіш, дык там рука ў руку з другім начальствам, от тады й дасі. Ну дык як?

Косьцік пацерабіў галаву.

- Ты, бацька, надта далёка мне наперад забег. Я яшчо ня ёсьць ніякі над лесам начальнік.

- Ну а калі будзіш? - не адступаў стары Бурак.

- Як буду, тады тоя й будзіць. А бабу трэба січас пахаваць.

- Дык я-ж і кажу, што ні сягоньніка. Дык як, абішчаіш?

- Ніхай, - сказаў сын. - Можа пойдзім дошкі паглядзець?

Скрыпнулі дзьверы й мужчыны накіраваліся ў гумно. Ніна падбегла да вакна. Косьцік выглядаў куды дужэйшы за бацьку. Прыглядалася мужчынам і думала Ніна, што трэба цяпер як мага паддабрыцца, пасобіць пасынку, Дарма-ж па вязьніцах не сядзеў. На твары жанчыны зьявілася чырвань наводля той, што раней пры звадцы з Паўльком успыхнула. Думкі Нініны спыніла раптоўнае Ромкава браханьне. Ад варот, на самакатах, ехалі Лявон з Хвёдарам.

9

На золаку лагодны вецярок падкрадаўся лесам. Ля Гараваткі ён пасьмялеў, дыхнуў поўнай моцай і заўзята скалануў дуб-гігант. Схамянуўся спрасоньня пышны Архіпаў чуб. Рыпнуў дуб сукамі, атрос кволае лісьце й злосна сыпануў жалудамі. Пасьля гвалтоўнага ўздыху, вецер параўнеў і пырснуў рэдкімі буйнымі кроплямі. Роўнамернаму глухому гоману з пушчы шапталі ў вадказ хвоі й таполі з Гараваткі. Яшчэ цясьней, здавалася, спляліся ў абдымку кароны дзьвёх вялікіх соснаў на літоўскім могільніку. Пра што гаманілі сястрыцы на стыку сплываючай ночы й нованароджанага дня? Пра сьвежую яму ў іх падножжа, ці пра новыя парадкі? У ліпавіцкім маёнтку пераклікаліся вартавыя. Учора на зьмярканьня спыніўся гэтта пяхотны вайсковы адзьдзел.

Частым скрыпам скардзіліся ў гэну ноч ложкі ў спальнях мясцовых панкоў і асаднікаў. Шукалі патолі, марыла іх бяссоньніцай трывога. Пан Лазоўскі каторы ўжо раз ускарабкаўся ад свае Даміцэлі, упоцемку шураваў па вялікай спальні, буйны русы чуб церабіў. Падыйшоў да вакна, адчыніў фортку. Сьвежае паветра хлынула ў пакой. Лазоўскі шырака разявіў рот, пазяхаў. За вакном яшчэ панавала цемра. Што рабіць? Уставаць? За што брацца?

Учора ўжо заказырыўся й аблажыў яго ёмкімі матамі калісь маўклівы й паслухмяны парабок Яўхім. Сяньня, а найдалей заўтра, зьявіцца перад яго гасподай новая ўлада. Як быць з золатам? Дрэнь тая бясьпечная схованка, калі яго й сям'ю як ваўкі авечак павалачы могуць.

Зыйшліся ўчора свае, да зьнямогі раіліся. Нэрвы, роспач, паднечаньне, едкі табачны тым і безнадзейная пропасьць у вачох. На

тварах, што нядаўна яхіднымі валадарнымі ўсьмешкамі прамяніліся, пагардай да мужыкоў крывіліся, цяпер чорны цень загаспадарыў. Кагадзе магутныя й поўнаўладныя - цяпер бязрадныя й бездапаможныя, быццам крыга лёду на ўзбушаванай лёдам рацэ. Уцякаць? Куды? Яшчэ і яшчэ раз: што рабіць?

Над раньнем зусім не на жартачкі раскапрысілася неба. Густыя сівыя хмары аблажылі з захаду й заглумілі водсьвет узыходзячага сонца. Ці адна літоўская жанчына, корпаючыся зь віламі ці чапялой ля печы, разьдзьмухваючы пасырэлыя дровы, казала: - Каго Бог дык і на той сьвет палюдзку адпраўляіць, а гэтую во... хто яе ведаіць, што тутака рабіць... мусіць на добрую імжаку заносіцца. Клыпай ты па такой мокрадзі на могільнік гэны...

Сяляне - не гіпакрыты, яны справядліва мерыць наўчыліся. Каторому лепшаму, віднейшаму чалавеку, дык і па сьмерці ад іх пашана большая, а ніякаватаму - дык і ніякай.

З абчарнелых сажай комінаў, па зялёна-шэрых, абімшэлых стрэхах, нізка спаўзьлі на двары, хлявы, клеці й гумны сівыя дымы.

Цэлую ноч цешыўся воляй Косьцікаў Ромак. Воля саладзейшая была яшчэ таму, што Паўлюк ужо колькі месяцаў яго на прывязі трымаў. Учора сабака прагна ўзіраўся ў позна асьветленыя вокны, энтузіястычна «драгомішчу» на разьвітаньне зацяўкаў, аж пад Косьцікаву бараду сваю доўгую пысу сунуў. Пачнуцца мусіць цяпер, як у той залатой даўнасьці, цікавыя вандроўкі. Так ужо карціла каторага вясковага сабаку-жэўжыка клыкамі за шыю страсануць.

Калі раніцай Ніна накарміла яго, Ромак удзячна лізнуў ей па руках і твары. Пільна падслухоўваў гукі зь сяней, скроб дзьверы ў хату. Вось неўзабаве скрыпнуць завесы і дзьвярох зьявіцца наймілейшы сябра.

Сталася зусім нешта нечаканае. З хаты Косьцік выйшаў познавата, дый ня сам, а з тым чарнавусым, каторага Ромак зусім яшчэ мала абнюхаў. Гаспадар паляпаў яго па шыі, да болю сьціснуў вуха, прамовіў пару слоў, дый за нашыйнік узяўся. Што гэта? Непаразуменьне якое? Як ласкава й лісьліва не стараўся заглядаць у Косьцікавы вочы, нічога не памагло. Пудовым цяжарам уплёўся за нашыйнік ланцуг. Косьцік адыйшоўся, паглядзеў на гадунца.

- Жалка, брацец ты мой, цябе, - сказаў. - Знаю што хочаш, алі ні магу. Дзяла ў цябе сабачыя, а ў мяне... служэбныя.

Дзяцюкі селі на самакаты й даўно скрыліся за дарожным адхонам, а Ромак доўга, заядла й плаксіва цяўкаў аж да хрыпаты голасу, ня могучы пагадзіцца з такімі новымі парадкамі.

Пад поўдзень парадзела імжака й празь нізкія хмары часта вызірала сонца. Вецер прыносіў гаману й тарахценьне хурманак з гацкага гасьцінцу. Малая група літоўскіх абкружыла сьвежую яму на могільніку. Старая Макатуніха ў суправодзе сям'і, спасьцярогшы ваду ў яме, заенчыла: - Божа мой, як-жа гэта так, у ваду?

Прысутныя пераглянуліся.

- Што-ж зробіш... Бог так даў, а ей усіроўна, - адказаў брат.

Янук і Зянькевічаў Стась прымкнулі да групы тады, калі зачыненая дамавіна стаяла на горбачцы зямлі побач ямы, а людзі, апусьціўшы галовы, слухалі Сабакевічаву прамову.

- Дарагія таварышы, аднасяльчане! Када я работаў для камунісьцічаскай парціі й са мной да з другімі работала от наша пакойніца, дык я ажыдаў таво дня када мы ўмесьця на таржэсьцьвенным празьніку будзім вялічаць нашых асвабадзіцеляў, доблісную красную армію й савецкі народ, каторыя падалі нам руку й асвабадзілі ад праклятага панскага іга. Таржэсьцьвенны дзень прышоў, ну от забраў ад нас адну із самых лутшых работніц, самых жэрцьвінных людзей. Пагэтаму я з баляшчым серцам стаю над яе гробам...

- Ну трэба сказаць вам, таварышы аднасяльчані, што свабоды бяз жэртваў ня бываіць і вы самі гэта мусіця знаць.

Сабакевіч змоўк, мутнымі вачмі ўглядаўся, ў прысутных, быццам чакаючы пацьверджаньня такой вялікай, ніколі нячутай, ім упяршыню адкрытай праўды. Сосны й хвоі марасілі дробным дожджыкам. Людзі пазіралі ўверх, горбіліся, туліліся адкрытыя галовы ў каўняры адзеньня. Быццам у вадказ на Сабакевічаву гутарку, у каторай зьдзекваўся зь дзьвёх сумежных моваў, уверсе над сястрыцамі-соснамі ўсхадзіліся вароны. Пахнула сырой ігліцай, прэлым лісьцем і жывой смалой.

- Пагэтаму гавару вам, таварышчы аднасяльчане, што нада шанаваць жэртвы, - бубнеў далей Ромкаў гаспадар, - бо яны жызьнь за нас аддалі, гэта значыцца штоб лепшая было жыцьцё для нас. Параскева Іванаўна, гэта наша пакойніца, каторую мы сабраліся хараніць, была асоба жэрцьвінная, яна ні шчыталася зь нічым када

работала для камунісьцічаскай парціі, значыць для асвабаждзенія трудзяшчыхся западнай Беларусіі. Наша ўласьць прышла й січас мы добра жывём. Ну жалка, што када з вастока сонца засіяла дык Параска мусіла галавой налажыць. Гавару вам, таварышчы аднасільчане, што да нас прышоў новы дзень. Таварышч Сталін пазабоціўся... аб нас, каторыя стагналі пад панскім польскім ігам, паслаў нам сваю доблісную красную армію на помашч...

Ззаду за Косьцікам, прытрымліваючы рукамі крыж на грудзёх, нахіліўшы сівую галаву, стаяў старэнькі слабодзкі сьвятар. Казалі, што гадоў яму пад восемдзесят. Зрок трымаў унізе, дзесь на веку дамавіны; ледзь вярушыліся ў малітве яго вусны. І было ў гэным вобразе над магілай штосьці камічнае ў сваей недарэчнасьці й грандыёзна-велічнае ў прастаце, быццам Бог супаставіў побач, усім на вока, дзьве вялікія й зусім супрацьлеглыя сілы. Надзьмуўшы тоўстыя шчокі, шырака расставіўшы патрапаныя й гразёй запэцканыя хромавыя боцікі, выпяціўшы грудзі, «новая ўласьць» расьпіналася перад хаўтурнікамі пра нячутыя дагэтуль у вёсцы нейкія даброты, ласкі, што вось прынесьлі літоўскім сялянам апошнія падзеі. Гэта была «ўласьць» у асобе пагарджанага свайміі людзьмі дзяцюка, калючага атожалка ад свайго дрэва. Хто гэта калі яго напокуці калі пасадзіў? А пасланьнік сілы адвечнай, найвышэйшай і адзіна справядлівай вунь сьціпла за плячмі гэтага атожалка малітвы шэпча.

Ці мала хто Косьціка слухаў, ці многа, гэты кантраст яшчэ да пазаўчарашняга зусім нясумяшчальных побач сябе людзей быў так вымоўным, што думкі самі напрашваліся.

- Іш ты яго, ханжа во распаўзлася. Цяперака зажывём, калі во такі над табой руку будзіць дзіржаць!

Сказана было даволі голасна. Людзі азірнуліся. Як звычайна, ня вытрымаў Антось Дзяркач. Косьцік, заварожаны сваей прамовай, мусіць ня чуў. Ён далей прымітыўна маляваў «блага» новае ўлады, пра нябожчыцу забыўшыся. Між прысутных ня было ні Сявенькі, ні Зянькевічаў, ні Бахмача са сваякамі, ні Бурака з Бурачыхай, ні Шпунтоў. Людзі спасьцераглі адсутнасьць найбольш кемлівых літоўскіх гаспадароў. Побач Косьціка тарчаў Паваліцкі Хвёдар. Ён скроб патыліцу, азіраўся навокал з такім выражэньнем, быццам казаў: людцы добрыя, я-ж тутака з боку-прыпёку, а галава ў нас во...

Янук цікаваў за Дуняй. Змарнелая, босая, у пакамечанай шэрай крамнай сукенцы, вынашанай рудой накідцы, яна стаяла побач Кмітавай Аўдолі. Трымалася спакойна. Хлапцу іншыя хаўтуры прыгадаліся. Салёныя сьлёзы залівалі збалелыя вочы, у грудзёх захрас цьвёрды камяк. І тады, ён неспадзявана зь дзяўчынай у сенях сустрэўся. Цяпер яшчэ сорам за тое скроб. А яна вось якая спакойная, зусім не плача навет. Але гэта-ж ня матка ейная.

- Ты відзіш, Янук, колька вунь апенак? - таўхнуў пад бок Зянькевічаў Стась.

Янук зірнуў у той бок, куды паказаў вялікім, карэлым ногцем Стасеў палец. Недалёка ад іх, пышнымі цёмнарудымі грнкамі апенькі распаўзьліся па аграмадным гнілаватым пні. Колькі кошыкаў можна было напоўніць. Дрэва, відаць, звалілі даўно, не пры Януковай памяці.

Нарэшце спынілася доўгае Сабакевічава бубненьне. Людзі ціха загаманілі. Паглядзеўшы, што не марасіць зьверху, мужчыны зьнялі з дамавіны века. Быццам на сыгнал, пачаліся ўсхліпы жанчын. Сьвятар падыйшоў да дамавіны й пачаў маліцца. Пры лёгкім шуме ветру ў каронах прыгажунь-соснаў, надзвычайна ўрачыста гучэў лагодны, ціхі й выразны голас. Хаўтурнікі хрысьціліся, маліліся пры ўсхліпваньні жанчын і пасьля ўсе разам засьпявалі «вечную памяць». Ужо калі дамавіна дакранулася вадзянога люстра на дне ямы, ямчэй усхадзілася галашэньнем старая Макатуніха. У гэны час Хвёдар з Косьцікам, адбыўшы павіннасьць, націскалі на ступні самакатаў, бяручы кірунак на Шпунтоў хутар.

Зусім нечакана ажыў гацкі гасьцінец. Між прысадаў дарогі выплывала з Гаравацкай пушчы вялікая, шэрая калёна людзей. Іржалі коні, лякаталі колы, рыпела вупраж і чуваць была ціхая, памяркоўная гамана. Янук і Стась пераглянуліся ды борзда рванулі зь месца. Колькі хвілін пасьля, задыхаўшыся ад хуткага бегу, спыніліся ля ўчора ўежджанага гасьцінцу.

Войска йшло трымя радамі, а наперамен валакліся малыя, нагружаныя хурманкі. Адразу кідалася ў вочы суцэльная беднасьць гэтай нехлямяжнай арміі. Жаўнераў у стар'ё апранулі. Шматлікія стрэльбы трымаліся на плячох на абшмуляных вяровачках. У старой, палатанай вупражы напружваліся зацяганыя коні, - рэбры скурай абцягнутыя.

У параўнаньні з учарашняй магутнай танкавай калёнай, войска гэта нагадвала зарганізаваны натоўп жабракоў, дохлую грамаду, што мусіць адкармлівацца на гэтую зямлю прыпаўзла. Хлопцы разявілі раты, пазіралі на старэйшых, што абступілі дарогу.

Літоўскія гарэзы спачатку маўчалі, вачом не давяраючы, пасьля-ж кпінамі распрамяніліся твары.

- Дык гэта-ж дрэнь, а ня войска! - зарагатаў Стась.

- Ціха ты! - перасьцярог яго Янук.

Маўкліва прыглядаліся бядзе на гасьцінцы.

- Слухай, Стась, - загаманіў зноў Бахмач, - давай у Гаці зьбегаім, паглядзім што там робіцца.

- Давай!

- Калі?

- Ды хоць і цяперака. Але перш можа сходзім пад'есьці.

- Ты вечны ненаеда. Давай во адразу бяжым.

Хлопцы неўзабаве выперадзілі дохлае войска. Іх босыя ногі пакідалі выразныя сьляды па ўчора так прыгожа выраўнаным танкамі, сяньня-ж раніцы добра змочаным гацкім гасьцінцы.

10

Пракоп і Алесь сядзелі ў куце ля стала, Янук, Надзя й Мікола - на лавах каля сьцен, а Кацярына - ля печы. Гутарка йшла так, як мокрае гарэла. Усе скупіліся на словы, больш думалі.

Кагадзе забегся да Пракопа калішні «драгомішч», цяперашні «акцівіст» Лявон Шпунт.

- Дзядзька Пракоп, прыхадзіце ў нядзелю пад вечар у школу, - сказаў, прывітаўшыся.

- А што тамака ў школе?

- Сход будзіць, от што. Прыказ прышоў.

- От як, - разявіў рот Пракоп. - А што за сход такі?

- Камісар прыедзіць. Тамака ўвідзіця й пачуіця.

Не разьвітаўшыся, «акцівіст» пайшоў, каб іншым наказаць. Забягаўся й да Алеся.

- Ні казаў-жа табе Лявон, пра што той камісар гаварыць будзіць? - пытаўся Алеся Пракоп.

- Ды не. Ён сьпяшыў, бо казаў, што цэлую вёску трэба аб'езьдзіць. А пра што, ты думаіш, камісар можыць гаварыць?

- Пра новыя парадкі, а што яшчо...

- Ну дык во...

- Можа варта схадзіць?

- Варта? Казаў мне Лявон, што абізацільна, от што...

- Каб ён і ні казаў, дык і так усе папрыходзяць. Людзям карціць даведацца што новага.

- Чаму-ж не, цікава...

- А гэтага дзіравага шляхціца ні адпусьцілі яшчо? - спытала Кацярына.

- Казаў мне ўчора шавец Піліп, што Лазоўскага парабок Яўхім яму тавар на боты прынасіў. Добры хром, сам відзіў учорака. Гэта-ж мусіць у пана свайго ўзяў. Дык казаў, значыцца, Яўхім, што і Лазоўскага дзержуць і гэтага нашага дзіравага дый многа каго.

- Скончылася кату масьлініца, - адазваўся Алесь, - піраберуць во памаленьку ўсіх павукоў гэтых.

- Піраберуць, чаму-ж не, - згадзіўся Пракоп.

- Вы ня цешцеся з чужой бяды, - папярэдзіла Кацярына. - Глядзіця, каб вам ні дасталося. Знаіця якое начальства будзіць цяперака.

У хаце запанавала цішыня. Вялікая чорная муха, зьнядужэлая доўгімі намаганьнямі, каб выбрацца на двор, вяла трымцела на карэлай шыбе вакна.

- Ты, Янук, от што, - адумаўся Пракоп, - заміж гэтта тарчэць, дык бяжы й паслухай дзе й што людзі гаворуць. А як даведаешся дык прыдзіш і нам раскажаш.

- Добра, тата, схаджу. Толька да каго пайсьці?

- Найперш тамака ля Пітуховай клеці некага знайдзіш. Сам глядзі, не малы-ж ты ўжо.

На вуліцы Янука спыніў Стась.

- А ты, Янук, ня відзіў што Макатунішкі ад ліпавіцкага пана паперлі, а я відзіў, - хваліўся сябра, выціраючы бурбалку пад носам.

- Як гэта паперлі? Хто? - разявіў рот Янук.

- Алена з маткай. Два мяшкі на плячох, ды такія цяжкія, што чуць ішлі.

- А табе хто казаў, што зь Ліпавічаў?

- Чуў як Кмітава Аўдоля бабам гаварыла.

Янук рушыў пад Пятухову клець.

- Ты куды гэта? - насядаў Стась.

Янук нічога не адказаў, адно пагладзіў Тапсіка. Задуманы пра Макатунішак і мяшкі, што «паперлі», ён ці ні забыўся пра сябру.

- Ага, я знаю, знаю! Думаіш ні знаю? - усхадзіўся доктараў хлапец. - Гэта ты да Дуні пойдзіш паглядзець, ці пекную ей сукенку прынясьлі. Я знаю, знаю! - галёкаў, падскакваючы.

Янук схапіў невялікі камень і ёмка пусьціў яго Стасю пад ногі. За камянём кінуўся сабака. Доктараў сын зручна адскочыў на бок і камень стукнуў аб тын.

- А от і знаю, от і угадаў! - хваліўся Стась.

Ля Пятуховай клеці стаяў Захарукоў Пятро й чагосьці ўзіраўся ў перакладзіну гушкалкі.

- Гэй, Пятро, што ты тамака ўвідзіў такога? - гукнуў Янук.

- Ого, яшчо што! Вірабей на віраб'ісе ехаў, от што, га-га! - зарагатаў дзяцюк. - А ты ня відзіў?

- Ды не, дзе мне там відзіць. А куды-ж ён паехаў, той вірабей? - усьміхнуўся Янук.

- Ды на Рахволіну гэну ліпу. Гы-гы-гы! - рагатаў Пятро, выставіўшы карэлы палец.

Янук пазіраў на прастадушнага дзяцюка й самаго сьмех браў.

- Ну дзе хто ёсьць, Пятро?

- Пашлі арудзіі глядзець, казалі.

- Якія такія арудзіі?

- Кажуць, што бальшавікі надта-ж вялікія ў Ліпавічы прыцягнулі.

- А хто пашоў?

- Ды многа хто. Я ні знаю.

Янук зьбянтэжыўся. Што думаць пра дзяцюка, каторы ўсё яшчэ сачыў тое месца, дзе быццам «вірабей на віраб'іся» ехаў? Паволі рушыў. Ужо быў на паўдарогі да Макатунішак, калі спасьцярог куды йдзе. Самі ногі павялі. Даўно рупіла Дуню бачыць, ды ўсё замінала нешта.

У Макатунішыным дварэ было пуста. На дарожцы Аленіны дзеткі забаўляліся з каляскай і на іх пазірала з-за плоту карова. Янук спыніўся ля дзьвярэй хаты.

- Мама, як-бы гэта дзе люстэрка дастаць? Німа ў чым паглядзецца... ў гэтым асколачку ні відаць нічога. Мама, пекная я ці не?

Мілы галасочак за дзьвярмі, поўны нейкай радасьці, казытаў Янукова сэрца.

- Ты сядзі тутака й ня рыпайся! - намахаў хлапец пад нос Тапсіку пальцам і адчыніў дзьверы.

У хаце было цемнавата, але Януковым вачом да гэтага не прывыкаць. Хуткім позіркам ахапіў цэлы новы сьвет, тое нешта зусім адменнае й надзвычайнае, што зьмяніла раптам атмасфэру там, дзе вечна галеча панавала.

Макатуніха з Аленай стаялі перад кучай адзеньня ля стала й разглядалі сукенкі. На лаве ляжалі блюзкі, андаркі, навет пара пальтаў. Перад сьцяной ля стала, выпінаючыся перад тым спэцканым мухамі зубам, што астаўся ў раме ад пабітага люстэрка, круцілася й гладзіла паясьніцу рукамі ягоная сяброўка Дуня. Янук ступіў пару крокаў і спыніўся. Дуня рэзка пабярнула галаву й васількі-вочы зазьзялі цудоўнай усьмешкай.

- Янучок, як добра, што ты прышоў. Скажы ці любіш ты гэту сукенку? Га?

Доўгія валосы, як гладка расчэсаны лянок, ападалі на плечы й закрывалі верх лёгка-блакітнай шаўковай сукенкі. Быццам для яе пашытая, сукенка ўвыдатняла харство дзяўчынінай фігуры. Колерам гарманізавала яна з тымі васільковымі вачмі, у каторых зьзялі цяпер іскрынкі захапленьня й радасьці. Шорсткія ад працы далоні рук бесьперапынна гладзілі сярэдзіну сукенкі, быццам шоўкам гэту шорсткасьць згладзіць хацелі.

Янук разявіў рот і пра язык забыўся. Твар ягоны заліла сарамлівая чырвань. Ці ня ў прыліве захапленьня новым набыткам, дзяўчына забылася зашпіліць перад сукенкі зьверху. На Янука пазіралі дзьве тугія, ружовыя пупушкі дзявочых грудзей. Нешта казытала пад грудзьмі, млявасьцю поўнілася цела, ледзь трымалі ногі. Зь мінулага выплыў вобраз тых самых тугіх дзявочых пупушак, мо крыху меншых. Дзе гэта было? Тады Дуніны васількі вялікай злосьцю іскрыліся. Так,

гэта ці ні на полі, пасьля таго як Шпунт на яе ў лесе напаў, танную й зношаную сукенку зьверху парваў. Яму-ж, тады нявінаватаму, дзўчына хлёсткую аплявуху адвесіла. Цяпер-жа ў гэтых вочках-васілёчках радасьць вялікая, гарэзьлівыя матылькі пырхаюць.

- Ну дык што-ж ты, Янучок, паказеліў вочы, як Сідараў баран на новыя вароты? Язык у цябе авечкі зьелі, ці што? Скажы што! - насядала дзяўчына.

Дзьве старэйшыя жанчыны ля стала так занятыя былі разгляданьнем вопраткі, што Дуні й яго зусім на ўвагу ня бралі. А перад ім задаволеная прыгажуня выкручвалася. Не ўяўляў дагэтуль якой прывабнай наймаладзейшая Макатунішка была. Ейная блізкасьць у гэтым новым, дарагім адзеньні, каторае пэўне на днях у нейкай панічкі адабралі, зьбянтэжыла яго канчаткова. Тугія дзявочыя грудзі, закончаныя пунсовымі пупушкамі, ня толькі саромілі яго выглядам, але, здавалася, прынаджвалі пахам і цяплом. А Дуня, сукенкай заварожаная, зусім мусіць пра іх забылася.

- Янучок, чаго маўчыш? Скажы, пекная сукенка ці не? - крутнулася дзяўчына.

- Як табе сказаць... надта-ж пекная, надта, надта...

Януку духу ніхапіла. Дунін твар яшчэ больш ад такой пахвалы пасьвятлеў. Янук хацеў дадаць яшчэ, што ня толькі сукенка прыгожая, але куды прыгажэйшая яна сама, ягоная Дуня. Адвагі не хапіла. А трэба-ж было гэта абавязкова сказаць. Ці раз бачыў у мястэчку каторую, прыбраную ў дарагое паненку. Але ці-ж сукенкай качаргу аздобіш? А гэтта во перад ім расьцьвіў сьціплы і ў гэтай сьціпласьці цудоўны васілёк. Якая-ж то пахвала «надта, надта»? Шэрыя, малазначныя словы. Дуня-ж зноў Януку наперад забегла.

- Цяперака, Янучок, разам на вічарыну пойдзім, танцаваць будзім. Пойдзіш са мной? - станула дзяўчына ўпрытык да Янука й цяплом дыхнула ў ягоны засаромлены твар. Пажвавеў у скронях пульс. - Чаго-ж ты так чырванеішся, га? Ня ўмеіш танцаваць? Дык навучымся, ні бядуй!

- Не, ня гэта, - буркнуў хлапец.

«Што гэта зь ёй? - ня мог уцяміць Бахмач. - Забылася пра сіські свае, ці гэта наўмысна, каб мяне пазводзіць?»

Млявасьць расплывалася па целе, дрыготкімі сталі калені й кружылася галава. Ніколі раней ня зьведаў Янук такога адчуваньня. У

скронях борзда білі малаточкі. Калі нечага неадвалочна ня зробіш, каб пазбыцца зьявы, што зусім волю яго скавала, могуць ня вытрымаць дрыготкія калені ног.

- А што з табой? Чаго ты, як бурак, зачырванеўся? - насядала Дуня.

Янук раптоўна крутнуўся й кінуўся ў дзьверы. Тыя самыя нядужыя ногі, каторыя ледзь трымалі яго ў хаце, цяпер, пераступіўшы парог, набралі няведама адкуль сілы й маланкавым тэмпам панесьлі яго па ніве.

- Уцякаіш? Дурань, ці што? - ледзь дагналі яго дакорлівыя Дуніны словы.

Бег як мага. Затрымаўся, каб злавіць паветра й агледзіцца ці не даганяе яго тая цудоўная зьява. Ля Макатунішынай хаты было пуста. Сонца хілілася на захад. З боку Ліпавічаў далятаў гул трактарных матораў. Янук згадаў тое, што казаў яму Пятро й наважыў заглянуць у маёнтак. Калі туды пайшлі людзі тыя «вялікя арудзіі» паглядзець, дык там і навіны будуць. А навінаў і прасіў бацька.

11

Першы вянец зрубу літоўскае пачатковае школы зьвязалі яшчэ ў грамадаўскія часы. «Грамаду» пасьля акупанты разагналі, таму й будынак пад загадамі «моцарствовай» улады рос вельмі неахвотна. Адылі школе мусіць пад тузін гадоў ужо было. І ніколі за кароткі век свой ня была яна такім асаблівым цэнтрам увагі, ніколі ня зьбіралася ў сьценах яе так шмат сялянскага народу, як у гэны вечар, калі меў прыехаць той камісар. Наказалі сабрацца ня толькі літоўскім, але й жыхарам з суседніх пасёлкаў.

Цяжка было яшчэ сонца з грывы ліпавіцкага саду качаргой дастаць, калі дарогамі й сьцежкамі больш дападлівыя пачалі зыходзіцца. Падрыхтаваць школу да сходу ўзяўся сам «акцівіст» Шпунт. І цяпер першым, што збліжаліся да будынку, паказаўся дзіўны вобраз: на франтавой сьцяне школы вісела даўгое чырвонае палотнішча зь вялікім напісам белымі літарамі, а перад ім топаў і

рукамі размахваў, суправодзячы тое маханьне шорсткай лаянкай сам у собскай асобе выдатны вясковы франт.

Прычына нязвычайнага Лявонава паднечаньня ўсім на воку была: Прывітальны лёзунг апавяшчаў: «Да Здравствует Доблестная Освободительная Р К К А!» Апошнія чатыры літары між сабой вялікія прамежкі мелі. Нехта чырвонай хварбай замазаў першую літару, а між двух «к» намаляваў белай хварбай вялікае «а».

- Вы паглядзіце, людцы добрыя, што зрабілі! - крычаў «акцівіст» Шпунт, паказваючы пальцам на вялікі кліч. - Ну ці ня выродкі гэта? Я-ж ім, такую-растакую, пакажу!

Першымі прыйшлі Кмітава Аўдоля й Піліпава Аксеня. Парасейску жанчыны чытаць ня ўмелі, дый наагул малапісьменнымі былі, адылі знайшлі сэнс у вапошніх чатырох літарах, зь якіх выйшла зусім зусім неадпаведнае Лявонаваму смаку слова.

- Глядзіце, што басота з пасьледніх букваў зрабіла! - калаціўся Лявон. дзяцюк быццам да шлюбу адфранціўся: як цаца касьцюмчык, выглянцаваныя чаравікі. Адно растрэсены хвалісты чуб, чырвоны ад злосьці твар ды расшпілены каўнер з адцягнутым гальштукам выказалі яго паднечаньне.

Пасьля пачатковае няўцямнасьці, жаночыя твары расплыліся поўным, шчырым сьмехам. Гэтаксама рэагавалі й іншыя сяляне, калі зразумелі прычыну «акцівіставага» ўтрапеньня.

- Чаго рагочаце, ёлупы нідапечаныя? - грымеў дзяцюк. - Гэта жартачкі вам, ці што?

Учора пад вечар, паклікаўшы на дапамогу Піліпава Арсеня, прывёз Лявон з дому драбіну ды разьвесіў палатно з напісам. Поўбяды было-б, калі-б палатно зь Лявонавай ініцыятывы зьявілася. Сам Косьцік Сабакевіч, каторы ў Лявонавых вачох куды падрос як ля большых бальшавіцкіх начальнікаў стаў аціраццa ды ў сельсавет залез, наказаў яму гэтак:

- Зрабі, дружышча, усё, каб гэтым разам тварам у гразь ні падаць. Палатно з лозунгам на відным месьця павесь, штоб нашы асвабадзіцілі відзілі, панімаіш, як народ з нашай дзярэўні іх прыветствуіць.

Лявону ня трэба было казаць, якой задняй думкай Сабакевіч кіраваўся. Нясоладка пасьля забойства Макатунішкі пры браме было. Цяпер трэба было натужыць сілы, каб «асвабадзіцеляў» добра ў роднай школе прывітаць. І вось у які бок яно павярнулася. Лявон зусім

страціў раўнавагу, стаяў перад палотнішчам, размахіваў рукамі, брыдка й голасна лаяўся. Людзі рагаталі й дзіва няма, што «акцівіст» бачыў сябе аб'ектам таго сьмеху. Ды заміж таго, каб думаць як пазьбегчы новае катастрофы, ён у галаве сваей, нянадта на розум спорнай, ніяк ня мог знайсьці асноўнага адказу: якім чынам шкоднік узабраўся аж пад страху й напэцкаў тое, што так брыдка чыталася.

- А хто-ж гэта так зрабіў, каб яго пранцы? - стрымаўшы сьмех, пыталася Кмітава Аўдоля.

- Ды ці я ведаю? - разьвёў рукамі бездапаможны Лявон. - Гэта-ж каб я ведаў, каб ён мне ў рукі папаўся, дык я-б яму во гэтымі собсьцьвіннымі рукамі галаву адкруціў-бы. Ды вот што мне ніясна: гэта-ж як ён аж пад страху ўзьлез? Учорака я драбіну прывазіў, а гэты во, - чорт яго бацьку знаіць - як гэта ён узьлез...

Негаманлівы Аўдолін Тодар, што даўгаваты час стаяў і прыглядаўся збоку, нарэшце адчыніў рот.

- Дык гэта-ж што ты, ні дадумаўся? Відзіш унь Сявенькавы пустыя казлы стаяць, дзе канюшына паскідана? От прыцягнуў іх сюды, паставіў і ўзьлез.

Запраўды Тодарава спасьцярога мела добрую аснову. Побач на Сявенькавым канюшынішчы стаялі козлы. Зямля тут добра радзіла й Амэрыканец нядаўна скасіў ды параскладаў сушыцца канюшынную атаву. Адно ля пустых козлаў ляжала збоку вялікая куча.

- Ты праўду, Тодар, сказаў, - распрамяніўся Лявонаў твар, быццам гэта ён сам, а не Аўдолін ціхаманы муж гэнае адкрыцьцё зрабіў. - Ну я яго, чарта лысага, знайду, я яго із пад зямлі выкапаю! Пазнаіць ён як новую савецкуў ўласьць аскарбляць! - зноў злосьцю сьцяўся Лявонаў твар.

- Ды ты, Лявон, от пакуль яго знайдзіш, дык падумай што рабіць цяперака, - ціхім і разважлівым голасам параіў Кміта. - Зараз-жа можа камісар прыедзіць...

- Так, так, ты праўду кажаш. Але што рабіць? - затопаў заклапочаны Лявон.

- Давай во зьнімім ды ўсё.

- Зьняць? Дык гэта-ж мне сам Косьцік яго даў. Як-жа так, проста зьняць?

- Ну а як-жа паправіш?

Лявон нічога ня выдумаў і топаў-бы мо яшчэ доўга, калі-б яго Тодар не спанукаў. Наапошку прызнаў рацыянальнасьць Кмітавай думкі. Зь Сявенькавай нівы прыцягнулі казлы, падставілі да школьнай сьцяны ды зьнялі палатно з тым прывітальным клічам.

Расла ля школы гушча людзей. Прыходзілі маладыя й старыя, жанчыны. мужчыны й падлёткі, быццам на веча надзвычайнае. Само слова «камісар» дзіўнавата гучэла. Што гэта за чын такі? Ваенны ці цывільны? Сама найстарэйшыя, якую вунь якую даўнасьць ды розныя злыбяды й чужыя ўлады памяталі, намагаліся нейкія адпаведнікі знайсьці, да цяперашняга прымерыць, хоць само цяперашняе больш загадкавым чымся ўчарашняе сталася. На адным усе да згоды прыйшлі, што высокі той чын меў быць. А калі такога чалавека да іх у Літоўцы пасылаюць, дык пэўне-ж нешта надзвычайна важнае ім скажа, бо «вялікі чалавек малымі дзяламі ня будзіць рук пэцкаць».

Раскажа, пэўне-ж, як жывуць людзі ў тых калгасах, каторыя вось чырвонаармейцы пад нябёсы каму трэба й ня трэба выхваляюць. Дый наагул можа раскажа, што ім новая ўлада дасьць. Ці хто тады думаў, што ня ўлада ім, а яны ўладзе даваць маюць? Жаўнерам ты вер і ня вер. Адно ўжо надта дапытлівыя людзі на языкі ўзялі, што надта-ж усё ў Гацях бальшавікі раскупліваюць. У кажнага грошы жмут, усе крамы да сьцен агалілі. Панясі ці павязі што на продаж, зьмятуць адразу, быццам век таго ня бачылі. А калі ў вас дома рай такі, усяго так уволю, як апавядаеце, дык чаго на наша налятаеце, як мухі на ліпучае?

Людзей прыбывала. Надыйшоў Амэрыканец Сявенька, што наагул рэдка калі ў людзі паказваўся. Нармальным здалося, што зьявіўся лекар Зянькевіч, катораму ніякай патрэбы да іншых хадзіць ня было, бо свая хата людзьмі заўсёды поўнілася. Літоўскага патрыярха Якуба сын Васіль на калясцы прывёз. Дзед ссаў неадлучную люльку, асьцярожна зьлез з возу, прывітаўся зь вясковымі. На яго ўсе зьвярнулі ўвагу. Крыху пастаяўшы, Якуб побач сына паклыпаў у школьную залю.

Удава Вульляна, што на спорным кавалку зямлі ля балота жыла, адразу выказала жанчынам свой намер, што пра сыноў-галубкоў, каторых Палякі ў войска забралі, абавязкова камісара распытаецца. Яе падтрымалі іншыя, каторым пра родных хацелася што-небудзь даведацца. Аціхла над Бугам вайна, дык цяпер і неба праясьніцца мае.

Старэйшыя стаялі групамі, апошнія навіны ператрасалі. Адно дзеці бегалі навокал зь вялікім гоманам. Некаторыя падлёткі спажывалі лёгкадаступнае «дабро», прынесенае акупантамі: курылі скручаныя ў газэтную паперу карашкі. Падарожжа ў нязьведаны смак смуроднага дыму адбывалася воддаль ад бацькоў. Адно доктараў Уладзік дэманстрацыйна скруціў «казіную можку», ды аж закашляўся, небарака, паказваючы сваю ўмеласьць прысутным дзяўчатам. Пасьля таго, як Паялкі змабілізавалі вясковых дзяцюкоў у армію, падрасла Ўладзікава ўдзельная вага між мясцовых прыгажунь.

Пракоп і Алесь гаварылі зь Сявенькам. Амэрыканцу гадоў за пяцьдзесят пераскочыла, а выглядаў ён куды старэйшы. Асаблівасьцю ягонай быў вялікі, падобны да даўгой бульбіны, здэфармаваны нос, чырвонны ды ў жоўтых прышчох. Гэты нос быццам зьдзекваўся з прапорцыі наагул нябрыдкага твару. Сам Сявенька ці раз расказваў, што ў Амэрыцы доўгі час працаваў пры печы ў стальной хвабрыцы Пітсбургу. Таму твар наагул, а нос асабліва пацярпеў ад вялікай гарачыні. Хударлявы, спрацаваны, ён ці не найбольш цікавіўся што сюды прынёс бальшавіцкі лад. За цяжка запрацаваныя на другім баку акіяну грошы, ён купіў гактараў звыш трыццаці ўрадлівай зямлі. Ці дазволіць новая ўлада калішняму амэрыканскаму рабочаму спажыць плёны свае працы на роднай зямлі?

На дарозе ля могільніку, суправоджаныя хмарай пылу, выраслі дзьве грузавыя аўтамашыны. Народ аціх. Машыны прыбліжаліся борзда й спыніліся на школьным пляцы. Зь пярэдняй кабіны вылез вайсковы афіцэр з трымя шпаламі на пятліцах, а сьледам за ім ішоў Косьцік Сабакевіч. З кузаваў пасаскаквалі жаўнеры, чалавек больш дваццаці, усе бяз зброі. Афіцэр агледзіў натоўп. Вочы сялян сачылі кожны ягоны рух.

- Здраствуйце, таварышчы! - сказаў голасным басам парасейску.

- Здрасьця! - адгукнуліся некаторыя.

- Добрую школу, таварыш Бурак, маеце, прынамся звонку. - сказаў афіцэр голасна Косьціку. - Самі будавалі?

- Да, самі, - адказаў Косьцік. - Пачалі пры Грамадзе, пасьля-ж...

- Гэта Грамада, каторую Палякі ліквідавалі, ці як?

- Да, та самая.

- Ага, ну харашо, - разглянуўся афіцэр. - Пойдзем у сярэдзіну?

Гэтта Косьцік зірнуў на Шпунта.

- Будзьце добры, таварыш камісар, - паказаў на Лявона, - пазнакоміцца: гэта наш месны акцівіст і мой харошы друг з падпольнай работы, Лявон Шпунт.

- Очень приятно, - сказаў маскаль, падаўшы Лявону руку.

- Будьте любезны, заходите, - запрашаў Сабакевіч.

За афіцэрам і мясцовымі камуністамі пайшлі маскоўскія жаўнеры, а пасля літоўскія сяляне. Адно шафёры трымаліся грузавых машын, каторыя абступілі дзеці. Сяляне ўваходзілі ў школу павольна, некаторыя доўга мяркавалі як прысесьці на цесных вучнёўскіх лаўках.

Пераступіўшы парог, Янук Бахмач здрыгануўся. Нехта яго балюча ўшчыпнуў за мяккое месца. З правага боку за дзьвярмі ў паўцемры сьмехам расплылася грамада дзяўчат-падлёткаў. Здалося, што дзесь між пуцатых твараў мільганулі вочы-васількі й дзьве ямачкі ля гарэзьлівага роціку. Янук наважна схапіў за руку Дуніну сяброўку Клаву, адцягнуў яе на бок і цяпер пазіраў у насьмешлівы вясёлы тварык.

- Гэта ты што, куранё такое галапупае, шчыпацца будзіш? Я-ж цябе зараз!

Дзяўчаты пырскнулі звонкім сьмехам, а Дуня, быццам між снапоў, шмыгнула між людзей у дзьвярох. Янук замарудзіў, пакуль пралез праз шчыльную сьцяну целаў.

Калі выглянуў на двор, дык зь левага боку ля вугла мільганула кароткая спадніца й босыя пяты. Хлапец узяў направа й павярнуў за вугал. Дуня спасьцерагла яго раней і нацянькі, празь Сявенкаву ніву меціла на казлы з канюшынай. Дабегшы, дзяўчына-рагатуха раптоўна затрымалася. Твар прамяніўся гарэзьлівай уцехай, ажно паглыбелі на шчоках ямачкі. Пад прыгожай ружовай сукенкай уздрыгвалі грудзі-пупушкі.

Ня мог затрымацца з раптоўнага разгону Янук. Аблапіў дзяўчыну й абое паваліліся ў мяккую мядова-духмяную канюшыну. «Куранё галапупае» заходзілася сьмехам, як мага адпіхала хлапца, а Янук шчыпаў яе за бакі.

- Пі-ха-ха-ха... пірас-ха-ха-ха... пірас-стань, дурненькі! Пірастань! Ха-ха-ха! - прасілася й задыхалася сьмехам Дуня.

Яна спрабавала адкаціцца, каб пазбыцца Януковых рук, але хлапец яшчэ больш насядаў. Дунін твар наліўся чырваньню й яшчэ больш пахарашэў. Мяккая шаўковая сукенка, каторую Янук бачыў

першы раз, лашчыла дзявочую сярэдзіну й ніз яе загаліў калені. Адкуль ні вазьміся, Янука апанавала тая самая млявасьць, як тады ў Дунінай хаце. Духмянасьць сьвежай канюшыны п'яніла галаву, а ў скронях зноў пачалі малаточкі малаціць. Шорсткія рукі, што ведалі адно пастухова пугаўё, граблі ці поручні плуга, спыніліся й шоўк лашчылі.

- Ты, кураня гала...

Ён не даказаў. Дзяўчына раптоўна спыніла сьмех. Адно хвалявaліся грудзі, а ў вачох-васількох прытаіліся гарэзьлівыя, на паядынак выклікаючыя агеньчыкі. Памякчэла пругкае дзявочае цела. На ледзь адчыненых вуснах затрымалася пасма пышных валасоў. Шырэй адчыніўся роцік і валосамі забаўляліся белыя зубкі. Вочы-васількі туманом зацягнула. Дзе гэта штосьці падобнае бачыў Янук? Ці ні такія вочы былі ў каровы, калі ей пабегаць прырупіла? Засмужаныя дзявочыя вачаняты сталі да нясьцерпнага болю прынаднымі, яны вабілі й калолі, дурманілі й нешта жывёльнае, да гэтага часу нязьведанае ўнутры будзілі.

Дзесь воддаль усхадзіліся, як між курэй перад налётам коршуна, дзявочыя пісклявыя галасы й загудзеў матор. У канюшыне чырыкалі сьвяршчкі, а легкі вецярок забаўляўся буйным Януковым чубам. На могільніку дзярла глотку варона. Янук крадком зірнуў на голыя Дуніны ногі, напоўнены нейкім незразумелым жаданьнем чароўны тварык і ў ап'янелай галаве паўстаў суцэльны хаос, на лбе выступіў пот. Нешта таўхала ды намаўляла, каб даболю сьціснуць у вабдымках гэта «куранё галапупае», але адвагі не хапала.

- Янучок, любіш мяне?

Словы прыляцелі на крыльлях ласкава-пяшчотнага ветру. Ды не. Бачыў як паварушыліся прынадна-мілыя вусны.

- Га?

Голас Янука быў глухі, быццам чужы.

- Пытаюся, ці любіш мяне, дурненькі...

Цяпер-бы ўскочыць, колькі мага сілаў ходу даць, дзесьці ў нару глыбокую залезьці. Такога ад яе не чакаў. Пачалося ад звычайнай дзіцячай гарэзьлівасьці. Пажадальныя аганькі ў вачанятах-васількох і той прывабны роцік волю забралі. Твар набух сарамяжлівай чырваньню.

- Калі любіш, дык пацалуй, - дрыготкім, ледзь чутным голасам сказала Макатунішка.

Учэпістыя рукі схапілі Янукову галаву й да ягоных вуснаў прыліп той прывабны роцік. Аж дыханьне забрала, калі шчыльна прытулілася да яго дрыготкае дзявочае цела. Дуніна пажадальнае дрыжэньне перадалося Януку, узбурыла ягонае нутро,. Ашаломлены, хлапец ірвануўся, устаў на поўны рост. У вачох дзяўчыны мільганула зьбянтэжанае рашчараваньне. Быццам для абароны ад няўхільнага ўдару, рукой закрыла твар.

Янук кінуўся наўцёкі. Збоку мільганулі й схаваліся за казламі з канюшынай квяцістыя хусткі. Выбухнуў голасны сьмех. Януку здавалася, што з сораму памрэ. Падгледзілі. Як-жа цяпер каму на вочы паказацца, калі возьмуць ды перакажуць? Вусны гарэлі першы раз зьведаным цалункам, раптоўнымі штуршкамі намагалася вырвацца з грудзей сэрца.

Блізу школы запаволіў ход. Даўгія цені будынкаў і дрэваў даўно расплыліся ў шэрым зьмярканьні. Янук спыніўся й на поўны рот зачарпнуў паветра. Школьныя вокны ўжо гарэлі сьвятлом. Здавалася, што ўзмоцнілі свае чырыканьне сьвяршчкі. На бальшаку раптоўна бліснулі аўтамабільныя сьвётлы. Машына запішчэла тармазамі й спынілася. Шафёр выскачыў з кабіны.

- Таварышч, мала! Яшчо, яшчо раз! - крычэлі дзеці.

- Давольна раз! А ну-ка давай, пацаны, сьлізайця! Давай пабыстрэе!

- Таварыш, яшчо раз падвязі!

- Нет, давольна, сьлізайця!

Дзеці караскаліся з кузава неахвотна, ад машыны не хацелі адыходзіць. Янук пастаяў, зірнуў на сьвётлы ў вокнах будынку ды накіраваўся ў шырака адчыненыя дзьверы, адкуль то пырхаў матылём, то бубнеў шаршнём нейкі нячуты да сяньняшняга дня голас.

12

У дзьвярох стаўклася непаседлівая, цяпер-жа надзіва прыціхлая малеча. Янук праціскаўся асьцярожна, азіраўся на бакі, каб адкуль

штурхаля не атрымаць.

Заля, як тыя старэйшыя казалі, бітком набіта была. Ніколі ня бачыў Бахмач гэтта так многа народу. Занятыя былі ўсе лаўкі, людзі па кутох стаялі. У нос дала задуха й едкі смурод карашкоў. Жаўтаватая столь схавалася за суцэльным палатном шэрага густога дыму, што нагадваў валакно лёну, каторае маці некалі дбайна часала на густых, набітых у дошку цьвякох. Праз шырака адчыненыя вокны валакно паволі рухалася на двор.

Сьпераду ля стала, каторым звычайна ў школе карыстаўся настаўнік, стаяў на ўвесь рост, махаў рукамі й бесьперапынна гаварыў, камісар. З правага боку ад яго сядзеў Косьцік Сабакевіч, зь левага - Лявон Шпунт, навокал іх і на пярэдніх лаўках - бальшавіцкія жаўнеры. Крыху далей на правы бок на крэсьле спасьцярог Янук бліскучае, ледзь аколенае нізка па бакох сівым пухам, цемя галавы дзеда Якуба. Літоўскі патрыярх смактаў неадлучную люльку, ляніва варушыў вейкамі вачэй. Пры ім раскашэліўся здаравенны сын Васіль.

Найбольш кідалася ў вочы нафуфыраная, гарбаносая, рудавалосая постаць старшыні камбеду Сымона Пятуха, які сядзеў ці не на самым пачэсным месцы наперадзе. Прыбраўся ён у сурдут, што мусіць у нейкага пана сьцягнуў. Людзі так зжыліся з пакамечанай кепкай, недагледжанымі касмылямі ды смуродным цыбуком гэтага дзяцюка, што цяперашні гальштук, падстрыжаная рыжая бародка й валосы зьявіліся надзвычайнай навіной. Заміж калісьці згорнутай з газэты й табакі цыгаркі, Сымон цяпер вялікай «казінай ножкай» капціў. Два здабыткі з ласкі акупантаў - сурдут ад папярэдніх, «казіная ножка» ад цяперашніх, дый надта-ж паважны выгляд гарбаносага твару - паказвалі дзяцюка-абібока ў зусім камічным выглядзе. Збоку ля Пятуха сядзеў Захарук. Косьцікаў бацька трымаўся бліжэй ззаду, сеў ля дзьвярэй.

З правага боку пасярэдзіне ўбачыў Янук свайго бацьку з Алесем і цёткай Кацярынай ды Амэрыканцам Сявенькам. Ля дзяўчат прысеў брат Мікола. Як квактуха зь вялымі крыльлямі, побач зь неадлучнай Аксеньняй рассасулілася на лаве зь левага боку ля вакна Кмітава Аўдоля. Ейны зыркі зрок борзда вандраваў па грамадзе, а галава, пэўне-ж, у гэны час брала на памяць усялякую драбніцу, што на вока трапляла.

Апроч літоўскіх, відаць былі й твары з суседніх пасёлкаў. Дзіўным здавалася амаль суцэльнае маўчаньне гэтай вялікай грамады. Прысутныя лавілі, здавалася, кажнае камісарава слова, баяліся зварухнуцца, кашлянуць, мужчыны ціха курылі, хоць дым ад курэньня ледзь змагаў праз вокны на двор уцякаць. Ці не таму курылі многа, што бальшавікі каго трапіла шчодра карашкамі ўгашчалі. Дый з агнём цяпер ня было патрэбы высьцерагацца: «сьпічкі па дзьве капейкі», гэта-ж ня тое, што пры «панскай Польшчы», калі за каробку сернікаў трэба было восем грошаў упяліць.

Янук спыніўся ля Дзяркача Антося. Доктараў Стась схапіў яго за руку й пасадзіў ля сябе на краю школьнай лаўкі. Прыслухаўшыся, малы Бахмач уцяміў, што ня так проста было дайсьці тропу ў тонкасьцях мовы бальшавіцкага афіцэра, бо з вуснаў яго цякла чужая рака. Мо таму людзі слухалі ўважна, каб хаця вяршкі злавіць.

Янукоў зрок спыніўся на чатырох партрэтах на франтавой сьцяне над грывай камісара. Сьвятло ў лампе, мусіць ад густога дыму, ліпела дробным хліпканьнем. Цяжка было добра разгледзіць на партрэтах бальшавіцкіх начальнікаў, што загаспадарылі на зьмену польскаму крыжу, дзярліваму «панствоваму годлу» ды вусатаму Зюку з-пад Вільні.

Першы «таварыш» зь левага боку ўвыдатняўся амаль квадратовым тварам, лысай лабацінай, здаравеннай памялом-барадой, вусамі, ды двума пукамі валасоў, што зьвісалі па бакох твару й з барадой зьліваліся. Нагадваў ён Іцку, што селядцамі ў глыбоцкай краме таргаваў.

Узяў некалі бацька з сабой Янука на кірмаш. Вялікі пост быў на носе, дык па дарозе дахаты забегся Пракоп у краму селядцоў купіць. Доўга з крамнікам таргаваўся, а Янук сачыў як хадуром хадзілі ў жыдоўскай барадзе пэйсы й дрыжэлі з-пад ярмолкі якраз во як у гэтага даўгія пукі валосаў. Выйшаў бацька з крамы, як вялізны скарб трымаў у руках загорнутыя ў «Кур'ер Віленскі» селядцы, ёмка плюнуў на бок і злосна прашыпеў: - Цьфу на цябе, жыдзішча праклятыя! На паўтузіне селядцоў усяго толькі адзін грош спусьціў. Каб табе бокам вылізла!

Іцка на партрэце выглядаў больш зухаватым за таго глыбоцкага, ды было ў гэнай зухаватасьці нешта з камічнага. Вось, здавалася, чхне ён зараз палюдзку й разьвеюцца-разьлятуцца гэныя пэйсы й вусы.

«Таварыш» з другога партрэту паказеліўся на першага. Гэты меў бародзішча з добры бярозавы венік, каторым у лазьні хвасталіся, здаравенныя вусішчы й даўгія, назад чэсаныя валосы. Твар ягоны нагадаў Януку ўрадніка, аднаго аздобнага панка, што бачыў у горадзе, хоць той без барады хадзіў.

Трэці партрэт сьвяціўся вялікай, як кацёл, у каторым маці бульбу сьвіньням варыла, круглай лысінай. Косыя, прыжмураныя вочкі жулікавата пазіралі на двух папярэдніх барадачоў.

«Таварыш» з апошняга партрэту паказеліў тупыя, ледзяныя, бяз іскрынкі жыцьця ў іх, вочы проста ў залю. Холадам ад іх нясло. Гэтага, як чуў Бахмач, звалі Сталінам. Партрэт ягоны Палякі на браме прастрэлілі, якраз у вока, шэльмы, трапілі.

Зьнізу пад партрэтамі вісеў лёзунг. Бачыў Янук ужо ці мала такіх у Гацях. Вялікія літары з чырвонага палатна крычэлі: «Да здравствуют освобождённые трудзящиеся массы Западной Белоруссии и Западной Украины!»

Косьцік Сабакевіч, у шэрым касьцюме, пад гальштукам, важна ля камісара расьсеўся, від баявы трымаў. Нагадваў на кучы гноя пеўня, што вялікай курынай грамадой валадарыў.

То цурчэў бесьперапынна, то капаў буйнымі, для адпаведных націскаў, кроплямі камісараў голас. Ніколі ня чуў Янук такой складнай, даўгой і бесьперапыннай гамонкі. Мужчына сярэдняга веку, сьветларусыя, пышныя валосы, круглы, добра адпасены твар, завойстраны падбародак. Сінія вочы ў сулад гутарцы й жэстам рук бегалі па грамадзе, але, здавалася, яе ня бачылі. Твар мяняўся адценьнямі. Афіцэр гаварыў малазразумелай мовай, але выглядам ад мясцовых ня розьніўся. Можа сам з такіх мужыкоў выводзіўся.

Янук уважна разгледзіў гладкі пас, што бег праз камісарава плячо й спалучаўся з шырокай дзягай, якая ахапляла тучны жывот. Прыгожым золатам зьзяла ў спражцы вялікая пяцікутная зорка.

Цяжка было канцэнтравацца на сэньсе камісаравай гаворкі. Рэха назойліва прыносіла палкае дзяўчыніна шаптаньне: «пытаюся, ці любіш мяне, дурненькі... калі люнбіш, то пацалуй». Яшчэ не астылі ад гарачага цалунку вусны; здавалася, што зь вялікага сораму пачырванелі кончыкі вушэй. Высака заголеная за калені сукенка, белыя зубы жвуць-забаўляюцца мяккімі валосамі, духмянасьць канюшыны й пажадальныя аганькі ў вачох дурманяць галаву.

Пэўне-ж, усе пра гэта ўжо ведаюць. Як-бы гэтта з сораму не згарэць. Вунь празь дзьверы пхнуцца назад сакатухі-рагатухі, а між імі Дуня. Янук крадком зірнуў на яе. Апанаваная, шэльма, як быццам нічога й ня было. Адно сяброўкі з зухавата-насьмешлівымі тварамі на яго пазіраюць. Сорамна, уцячы некуды трэба было-б. Але цікавасьць да бальшавіковай гамонкі верх бярэ. Бахмач намагаецца слухаць, сэнс лавіць.

- І ні было ў нас, дый і ні магло быць ніякіх сумніваў аб тым, як жылі й цярпелі закабаленыя масы працоўных Заходняй Беларусі, - гаварыў бальшавік. - Гэта-ж будзьце ласкавы самі разабрацца: наша савецкая краіна пабудавана рукамі рабочых і сялян, наша доблесная рабоча-сялянская Чырвоная Армія - як і сам назоў гаворыць - сфарміравана з рабочых і сялян. Мы ліквідзіравалі эксплуатацыю чалавека чалавекам, заводы належаць рабочым, а ўся зямля - хлебаробам. Дый наша слаўная камунісьцічаская партыя складаецца з рабочых, сялян і працоўнай інцілігенцыі. Ды вазьміце нашага правадыра, мудрага айца ўсіх народаў, вялічайшага і мудрэйшага з мудрых, таварышча Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Ён-жа...

Ускочыў з лавы, ляпаць далонямі пачаў Косьцік Сабакевіч. Заядла плёскалі, паўставаўшы, бальшавікі. На такое нешта нячутае-нябачанае ў вёсцы, ня ведалі як рэагаваць сяляне. Некалькі вялых усплёскаў пачулася ў грамадзе, адно Сымон Пятух так пырыў рукамі, што выпала з рудых зубоў і рассыпалася дымячымі карашкамі на падлозе ягоная «казіная ножка». Зусім спакойна сядзеў, адно галаву вышэй падняў, прыглядаючыся чужынцам, літоўскі патрыярх дзед Якуб. Калі аціхла, камісар прадаўжаў:

- Таварышч Сталін сам з батракоў. Гэта ня хто другі, а ён сам, самы верны саратнік вялікага Леніна, ваплаціў лепшыя ідэі нашай слаўнай камунісьцічаскай парціі і правёў гэтыя ідэі ў жыцьцё. Гэта дзякуючы ні каму другому, а толькі яму, вялікаму і мудраму таварышчу Сталіну, вы сёньня карыстаецеся сонцам вялікай свабоды. Гэта дзякуючы яму зьдзейсьніліся вашы адвечныя мары. І ці-ж магу я навет словамі пераказаць цяжкія цярпеньні гэтага вялікшага ў міры правадыра, калі ён толька падумае аб тым, што міліярды працоўных на сьвеце яшчэ, на вялікі жаль, не карыстаюцца сонцам свабоды, што іх эксплуаціруюць і што яны прагнуць вызваленьня ад капіталістычнага іга? Гэты чалавек, гэты геніяльны бацька ўсіх народаў, ён ёсьць лепшы

зь лепшых. Вялікае мусіць мець ён сэрца, калі ў ім маюць месца цярпеньні ўсіх заняволеных на сьвеце, ды многа й цяжка мусіць ён працаваць, каб мары іншых збыліся, так як вашы...

Здавалася, што нехта падняў гаць і хлынуў акіян мілагучных, аздобленых прывабнымі адценямі пахвальных эпітэтаў. Усё гэта пра таго з тупым, ледзяным зрокам, ад якога холадам нясло, што абыякава паказеліў на залю пазбаўленыя жыцьця вочы. Камісар пыхцеў, мяняўся ў твары, пяліўся, як жаба на корч, каб перадаць усе вялічыні характару, дабрату сэрца й цярпеньні крамлёўскага гіганта. У гэных хваласьпевах ягоных, насычаных шчырасьцю й пераканальнасьцю, была такая моц эмацыянальнае сугэстыі, што магла-б зьбянтэжыць найбольш зацьвярдзелага скептыка. Грамада слухала, быццам заварожаная. На камісаравым лбе выступіў пот. Сам ён так рашчуліўся тым, што апавядаў, што ў вачох ягоных сьлёзы паказаліся. Ад няспыннага мора слоў ці не перасох голас. Афіцэр колькі разоў спыняўся, горла прачысьціць намагаўся. Ён нагнуўся й нешта Косьціку сказаў. Той паклікаў да сябе нехлямяжага Пятуха, якому перадаў, што камісар вады хоча. Заля ажыла. Ягодка-Аўдоля спанатрыла важнасьць Пятуховага заданьня й адразу перадал гэта Аксені, каторая шмыгнула зь Пятухом у сенцы. Ля парогу расступіліся й за хвіліну зь сяней паказалася Аксеня са шклянкай вады, а за ёй чыкільгаў Сымон Пятух.

Камісар выпіў ваду за тры глыткі, сядзеў і выціраў насаткай пот з твару, дый зноў нешта паўголасам сказаў Сабакевічу. Ромкаў гаспадар устаў.

- Таварышчы, мы січас праслухалі очынь інцярэсную рэч таварышча Маршалкава і благадарым яму за гэта. Мы цяперака знаім пра нашага вялікага важдзя таварышча Сталіна і яго заботы аб нас. І мы далжны, па маяму мненію, паслаць благадарсьцвінная пісьмо савецкаму правіцельству за наша асвабаждзеньня й паслаць тожа благадарсьцвінная пісьмо лічна таварышчу Іёсіпу Вісарыенавічу Сталіну...

Гэтым разам воплескі пачаліся ад Пятуха. Сквапліва падтрыманыя бальшавікамі, яны завялі й рассыпаліся між сялян. Пасьля камісаравай гутаркі, хто мог пярэчыць Косьцікавай прапанове? Сабакевіч прачытаў зьмест ліста чырвонаму дыктатару, які зноў-жа рэдкімі вялымі воплескамі быў «энтузіястычна» прыняты.

Хоць гэным часам вялікая задуха поўніла залю, ніхто не маніўся на двор ісьці. Ці ні чакалі самага найцікавейшага. І чакаць доўга не давялося. Косьцік папрасіў спыніць на залі гамонкі.

- Цяпер таварышч Маршалкаў будзіць гатоў атвеціць, есьлі ў каго ёсьць якія вапросы.

Адразу паднялася Вульляна.

- Я-бы от хацела ведаць калі гэта мае сыны-галубкі з вайны вернуцца. Вайна-ж ужо мусіць скончылася й вы, паночак, можа скажаце...

Вульляна кутом хусьцінкі выціралa сьлёзы, што ў вочы наплылі. Слова «паночак» выклікала сьмех.

- Гэта-ж даруйце, таварыш камісар, ці як вас зваць... Гэта язык мой так па прывычцы...

- Нічога, гражданка, нічога, - усьміхнуўся афіцэр.

- Дык як гэта, ці маглі-б вы сказаць? - насядала Вульляна.

- Вашых сыноў белапалякі змабілізавалі?

- Ага. Дый ня толька маіх, алі ўсіх зь вёскі.

У голасе жанчыны адчувалася трывога ня толькі за сваіх, але за ўсю вёску. Камісар не сьпяшаўся. Ён паволі агледзіў прысутных. У шматлікіх вачох прачытаў вялікую цікавасьць.

- Як вам ведама, сыноў вашых, братоў, мужоў і бацькоў забралі польскія памешчыкі, асаднікі й розная буржуазія, каб яны пралівалі за іх сваю кроў, каб ваявалі за інтарэсы чужыя для сялян і рабочых, каб мець пушачнае мяса для вайны, якую яны самі-ж, значыцца белапольская буржуазія, распачалі. Яны, канешне, груба памыліліся й вайну прайгралі. Як пэўне вам таксама ведама, Савецкі Саюз мае дагавор дружбы зь Вялікай Германіяй. З гэтага выходзіць, што Савецкі Саюз і лічна Іосіф Вісарыёнавіч Сталін ня толькі пастараюцца вярнуць дамоў вашых змабілізаваных землякоў у найкарацейшы срок, але й тое, што наш саюзьнік - Вялікая Германія - пойдзе нам на руку. Гэта адносіцца тых з вашых, каторыя папаліся ў плен да германцаў. Калі-ж ідзе пра тых, што злажылі аружжа нашай Чырвонай Арміі, тут дзела выглядае яшчэ лепш. Іх распусьцяць дамоў неадкладна. І ў адным, і ў другім выпадку - магу вас запэўніць - сам таварышч Сталін паклапоціцца, каб землякі вашы скора дамоў вярнуліся.

- А як-бы гэта, таварыш камісар, каб даведацца дзе яны цяпер? - зноў пыталася Вульляна. - Можа-б вы памаглі?

- Гэта можна, - згадзіўся бальшавік. На твары ягоным зьявілася наіўная дзіцячая ўсьмешка, што быццам гаварыла: «Ну што-ж ты, баба, ня ведаеш, як гэта лёгка? Вунь узяў ды сьвіснуў і ўжо гатова, сыны-галубкі твае заўтра дома будуць.»

- Да, гэта можна, - паўтарыў Маршалкаў. - Зрабіце сьпіс усіх мабілізаваных і перадайце мне лічна ў рукі, а я ўжо аб гэтым паклапачуся.

Ня толькі Вульляна, але шмат іншых літоўскіх з палёгкай уздыхнула пасьля такога важнага адказу ад гэткага высокага бальшавіцкага начальніка. Ці ў ваднэй галаве пажадальныя мроі ўзяліся ўжо маляваць вобразы мілых блізкіх сустрэчаў.

Устаў Захарук, пакруціў свой рыжы вус, зірнуў на бакі й тады зьвярнуўся да новае ўлады.

- Як гэта, таварыш камісар, скажыце нам, цяперака новыя парадкі будуць? Найболі нас цікавіць зімля. Хто маіць мала зямлі, дык ці яму дадуць яшчо болі, ці не? Адным словам, так сказаць, якая цяперака гаспадарка пачнецца?

- Вы гэта па зямельнаму пытаньню?

- Ага.

- Ну гэта пытаньне магу вам адказаць вельмі коратка: усе, каторыя маюць мала, атрымаюць столькі, колькі яны могуць апрацаваць. Зямля, каторую некалі забралі ў вас памешчыкі й асаднікі, зноў станецца вашай. Панятна? Найперш, канешне будзе ў вас зроблены ўчот маёмасьц, а пасьля таго ўчоту прыдуць надзелы зямлі. Падробна гэта паясьніць вам Канстанцін Паўлавіч. Яго прыдзялілі к вашаму меснаму сельсавету і яго абавязкам, як і абавязкам вашых дэпутатаў, каторых самі выбярэце, будзе абясьпечыць вас усімі дабрамі савецкай улады. У вас, відаць, камітэт беднаты ўжо зарганізавалі?

- Да, таварыш, - устаў Сымон Пятух, - я прыдсідаціль.

- От і добра, - сказаў Маршалкаў. - Такім чынам гэты камітэт мусіць адразу памагчы бедным. Гэта першае. Пасьля, - гэта я хачу асабліва падчыркнуць, таму што гэта вельмі важнае, - у вас будуць выбары. Вы перш выбярэце дэпутатаў каторыя будуць мець сабраньне з цэлай Заходняй Беларусі і яны мусяць вырашыць пытаньне ўзьяднаньня яе з вашай радзімай, ад каторай вас сілай адарвалі белапалякі. Мы вас вызвалілі ад панскага іга і эксплуатацыі і вам толькі астаецца падзякаваць за гэта ды цьвёрда й рашуча заявіць, што

вы - сілай адраванае дзіця - жадаеце цяпер вярнуцца на ўлоньне вашай радзімы, Савецкага Саюза. Панімаеце?

Пры апошніх словах камісар усьміхнуўся, адылі ўсьмешка была няшчырай. Зь сярэбранай папяросьніцы ён выняў даўгую папяросу. Косьцік чакаў ужо зь сярніком. Заля пажвавела, людзі раіліся пра пачутае.

- Агульна хачу заўважыць, - прадаўжаў, зацягнуўшыся й выпусьціўшы хмару дыму камісар, - што я, улічваючы агранічаны час, не магу, а таму й ня буду імкнуцца ўваходзіць у падробнасьці ўсіх працэсаў і зьмен, каторыя для агульнага дабра прынясла вам савецкая ўлада. Магу адказаць вам толькі на галоўныя пытаньні, каторыя падробна могуць паясьніць вам нашы палітрукі й актывісты на сабраньнях, што адбудуцца ў вас. Я перакананы, што яны задаволяць вас сваімі адказамі. Да вашай дзярэўні будзе прымацаваны адзін палітрук, які падрыхтуе вас да выбараў і іншых зьменаў.

Устаў Кмітаў Тодар.

- Таварыш камісар, вы от сказалі, што дадуць зямлю панскую тым, каторыя ні маюць зямлі саўсім, ці мала яе маюць. Ну а як будзіць у нас з тымі, каторыя многа зямлі маюць? У нас-жа і такія ёсьць.

- Я раней сказаў, што кожны палучыць зямлі столькі, колькі зможа апрацаваць. Значыцца тыя з вас, каторыя мелі многа зямлі й наймалі рабочую сілу, ня змогуць самі апрацаваць яе. З гэтага выходзіць, што й месныя кулакі мусяць аддаць лішкі зямлі. Савецкая ўлада забараняе эксплуатацыю чалавека чалавекам. Ясна вам?

На залі пачуўся гоман.

- А калхозы ці будуць у нас, таварыш камісар? - голасна спытаўся Тодар.

Камісар не сьпяшыў з адказам. Ён перш уважна агледзеў Тодара.

- Гэта ад вас саміх будзе залежыць, - сказаў.

- А ці праўда гэта, што ў калхозах жывуць людзі так добра, як байцы нам расказваюць? - прадаўжаў Кміта.

- Гэта што байцы вам расказваюць, усё дакладна й правільна. Ды вы-ж памяркуйце самі: усе сяляне нашага неаб'ятнага Савецкага Саюза цяпер у калгасах. Яны пераканаліся ў перавазе калгасаў над адзіналічнымі гаспадаркамі й самі ў калгасы пайшлі. Іх ніхто ня прымушаў і прымушаць ня мог. Ды як-жа? Вам ужо вядома, што ў Савецкім Саюзе няма эксплуататараў і эксплуаціраваных, ды і

ўладарамі самой дзяржавы ёсьць ня хто другі, а рабочыя й сяляне. Выбраныя народам дэпутаты кіруюць дзяржавай. З гэтага паўстае пытаньне: ці-ж яны, як і наагул усе людзі, маючы ўладу ў сваіх руках, будуць самі сабе шкоду рабіць? Ясна, што не. Народ сам ёсьць гаспадаром. Народ сам аб усім клапоціцца для свайго й дзяржаўнага дабра. Значыцца, калі ў Савецкім Саюзе ўсе сяляне ў калгасах, калі яны, маючы ўладу ў руках, маглі ў калгасы ня йсьці але ўсе зь вялікім эмтузіязмам пайшлі, значыцца калгаснае жыцьцё гэта вышэйшая й лепшая ступень зямельнай гаспадаркі і я перакананы, што ў будучыні вы ў гэтым пераканаецеся й пастроіце ў вашай дзярэўні калгас.

Гэткі, здавалася, грунтоўна-лёгічны адказзадаволіў прысутных.

- Хачу сказаць вам, - зноў гаварыў камісар, - што савецкія ўлады зробяць усё магчымае, каб вы зразумелі новыя парадкі. У вас будзе многа пытаньняў і магчыма, што гэты пераход з польскага рабства ў жыцьцё, дзе вы самі будзеце гаспадарамі, будзе нялёгкі. З гэтай мэтай будуць у вас міцінгі, будуць прыяжджаць нашы палітрукі, ды і я сам лічна буду заглядаць да вас, каб памагчы вам. Таварышч Сталін дбае аб вас, як і аб усіх другіх. Верце, што мы не пашкадуем для вас ні сродкаў, ні часу.

Маршалкаў сеў, пацягнуў папяросу й праз дым углядаўся ў дзеда Якуба. Пасьмялелі на залі галасы. Чакалі нечага новага. Лявон устаў з-за стала, падыйшоў да Косьціка й нешта спытаўся. Косьцік кіўнуў галавой. Лявон сеў на сваё месца, а Косьцік узяў голас.

- Прашу слухаць! Ціха будзьце! - сказаў голасна.

Прысутныя сьціхлі.

- Таварышч Шпунт хочыць сказаць нешта важнае.

Лявон паправіў гальштук, адкінуў валосы назад, устаў.

- Маё гэта самае дзела, так сказаць, касаіцца ведаіця самі чаго...

Ён зацяўся, зірнуў на Косьціка, Маршалкава.

- Учорака я... значыцца мне сказалі павесіць лозунг на школьнай сьцяне. Мне во гэты... Піліпаў Арсень памагаў. Знаіця самі. І вы-ж, гэта самае, знаіця што сталася...

Лявонаў голас пачаў дрыжэць, дзяцюк зачырванеўся, цяжка дыхаў. Зноў зірнуў на начальства й зачарпнуў сьвежай адвагі. Мясцамі ў залі пачуўся сьмех пры згадцы што сталася зь Лявонавым клічам і ўчарашні «драгомішч», спасьцярогшы гэта, злосна бліснуў вачмі.

- Гэта вам ня сьмешачкі! Хто спаскудзіў? Савецкая ўласьць і таварышч Сталін вас асвабадзілі, а вы што? Нехта такое зрабіў, а вам сьмешачкі! Врагі народу, контра!

Лявон крычэў. Камісар, мусіць зьбянтэжаны такім зваротам справы, нахіліўся да Сабакевіча й той яму нешта тлумачыў.

- Я вам скажу от што: гэтага чалавека, ці сколька іх там было, мы знайдзім і яны будуць атвічаць па новаму савецкаму закону за гэткі крымінал! А як-жа! Па новаму савецкаму закону, я вам чэснае слова даю!

Лявон спыніўся, аглядаў людзей. Зрок ягоны затрымаўся на нафуфырыным Пятуху й рыжы, кудлаты гультай зь вялікай заядласьцю пачаў смактаць ужо каторую з чаргі «казіную ножку», ды азіраўся на людзей быццам кажучы: «браточкі, што ён гэта, ці ні на мяне?» Пагроза «новым савецкім законам» зрабіла сваё. Людзі прыціхлі. Мо прыгадалі каторыя, што гэны мэдаль «свабоды», каторым гіпнатызаваў іх камісар, мае другі бок, што «новым савецкім законам» завецца.

- Я прашу вас, будзьця добрыя, - палагаднеў Лявон, - хто з вас відзіў, ці можа чуў хто гэта спэцкаў лозунг, дык прыдзіця й скажыце мне. Калі хто паможыць, дык гэта яму запішыцца. Хачу каб вы зналі, што гэта наша обшчая задача, значыцца знайсьці гэтага ворагу народу. Дык прашу вас, памажыця. От я і скончыў.

Лявон раптам сеў. Людзі пераглядаліся. Пачаліся ціхія гутаркі. Аксеня і Аўдоля паклікалі да сябе колькі жанчын, у іх ліку і Косьцікаву мачыху, пачалі шаптацца. Нітка нечага важнага, відаць, пачала снавацца ад Аксені.

- Как же вы, отец, довольны приходом советской власти? - зьвярнуўся Маршалкаў да дзеда Якуба.

Дзед павярнуўся, зірнуў на залю, мусіць каб упэўніцца, што да яго, а не да каго іншага камісар гаварыў.

- Гэта вы от мне гаворыце?

- Да, отец.

- Чаму-ж, каб сказаць...

- Сколько вам лет, отец? Верно больше ста?

- Ага, ды ўжо-ж, болі як сто...

- Еслі так, вы верно крепостное время помните? - пытаўся Маршалкаў.

Выглядала гэта на публічны допыт, але дзед Якуб не зьбянтэжыўся, адказваў спакойна.

- Чаму-ж не, сынок, помню, каб яго макарэц спапяліў...

- Вот это интересно.

- Яшчэ пісягі на плячох нашу, каб ня помніў...

- Это что такое?

- Лупцавалі некалі, от рубцы на целе асталіся.

- Разве так? Поэтому благодарите товарища Сталина, что за длинную жизнь он вам действительную свободу принес.

- Ну Бог яго ведаіць... Як вы кажаце, дык можа й доля праўды ёсьць. Старому нідаверку пасобіць можна.

На камісаравым твары зьявілася няўцямнасьць. Ён нахіліўся, нешта Косьціку сказаў. Сабакевіч устаў.

- Наш сягоньнішні міцінг скончыўся. Січас пастаўце па бакох скамейкі. Есьць у нас баян і балалайка, дык пагуляім.

13

У гэны вечар не сьвяціліся вокны літоўскіх хатаў, ня зьбівалі дзеці пятаў у пікара, ці мячык. Амаль усё, што жывое, сплылося гэтта ля школы. Адно дзівіцца трэба было, колькі памясьціцца магло ў будынку людзей. Сяляне прыходзілі яшчэ падчас камісаравай гутаркі, ціснуліся ля адчыненых вокнаў і дзьвярэй. Цяпер-жа ўсе выйшлі на двор, каб зачарпнуць сьвежага паветра, падзяліцца думкамі пра пачутае й новае, што прыехала ў вёску на гэных двух вялікіх грузавікох, ля якіх сабраліся дзеці й падлёткі.

Аксеніна група жанчын чакала ля дзьвярэй і пільна сачыла за Маршалкавым. Ён набліжаўся ў суправодзе Косьціка й Лявона. Бальшавіцкія жаўнеры гутарылі зь дзяўчатамі, абступілі Хвядосаву Маньку. Дзяўчына гаварыла бойка й звонка сьмяялася, аж падскаквалі круглыя, тугія грудзі.

- Ідзець-жа, ідзець, ягодка, - таўханула Аксеню Кмітава Аўдоля. - Дык-жа гавары, ягодка, за ўсіх нас.

Гэтта-ж перад выхадам спыніла камісара Вульляна.

- Таварышч, я-ж гэта... хацела сыноў, каб запісалі...

- Ага, гэта тых, што белапалякі змабілізавалі?

- Так, пано... таварышч, сыноў-галубкоў маіх.

- Хорошо, мать, - кіўнуў бальшавік галавой і зьвярнуўся да Косьціка. - Вы, Канстанцін Паўлавіч, абавязкова зрабіце сьпіс усіх мабілізаваных, не забудзьцеся.

І ён ішоў далей. Аксеня выйшла камісару напярэймы, але няведама дзе падзелася ейная сьмеласьць, ня ведала як пачаць выкананьне даручэньня. Тымчасам Маршалкаў разглядаўся як абмінуць групу жанчын, што замінала ў праходзе.

- Пазвольце, - сказаў ветліва, - можна прайсьці?

- Ну дык ты-ж кажы, ягодка, - падбадзёрвала Аўдоля.

- Таварыш камісар, - пачала Аксеня й спынілася.

- Да, гражданка, вам что угодно?

Вочы ягоныя, здалося Аксені, праколвалі, глядзелі наскрозь.

- Дык я-ж гэта... хацела сказаць... Ага. Вы нам расказалі які добры й вялікі таварышч Сталін, як ён асвабадзіў нас і другія, як таварышч Молатаў, тожа добрыя. Дык мы тут, бабы, разгаварыліся, што за іх дабро для нас, за тое, што нас асвабадзілі, каб ім які падарак паслаць...

Аксеня выказала гэта адным дыхам. Спынілася, ня ведала што далей зрабіць.

- Вы, жанчыны, думалі падарак паслаць таварышчу Сталіну? Так вас разумею, ці не?

- Ага, да, таварышч, так...

- Гэта цудоўна вы выдумалі! - захапіўся камісар. - Так, гэта цудоўна! Ну а які падарак вы будзеце пасылаць?

Пачуўшы такую пахвалу ад Маршалкава, Аксеня аж змалела. Цяпер ейная першапачатковая думка здалася то дрэннай, то зусім недарэчнай. Як-жа ты з такім падаркам ды да самога Сталіна ткнешся? Аксені было яшчэ ніякавата й таму, што цяпер сталася цэнтрам агульнае ўвагі. Жанчына зірнула на сябровак. Непаслухмяным зрабіўся язык. У вачох жанчын пабачыла падбадзёрваньне й таму сьмела загаварыла да Маршалкава.

- Мы гэта-ж, таварышч камісар, гаварылі ці варта толькі асьмеліцца, бо нічога, ведаеце, дарагога ня можам...

Яна спынілася, а маскаль чакаў далейшага слова.

- Ну так, прадаўжайце.

- Дык вось-жа, мы нічога дарагога паслаць ня можам, самі ведаеце, пад польскім ігам жылі... Можа таварыш Сталін і каторыя другія начальнікі, як ён, нашага падарка ня прымуць?

Аксеня, відаць, не асьмелілася падаркам пахваліцца. Маршалкаў усьміхнуўся, зірнуў на Косьціка.

- Дык ты-ж, цётка, скажы, што вы надумалі паслаць і я ўверан, што таварышч камісар пасаветуіць ці варта пасылаць ці не, - растлумачыў Сабакевіч.

- Мы гэтага-ж, свайго дамашняга палатна надумаліся паслаць, ось што, - нарэшце прызналася Аксеня. Яна зірнула на камісара, сарамяжліва, быццам дзеўка перад першым прызнаньнем у каханьні, апусьціла вейкі. Камісар зычліва ўсьміхнуўся.

- Добра, цудоўна! - усклікнуў Маршалкаў. - Я думаю, што вы надзвычайна прыдумалі. Бяз сумніву, таварыш Сталін вам лічна падзякуе. Аб вас даведаецца ўвесь народ і вы станеце прыкладам для жанчын усей рэспублікі.

Цяпер Аксеня ўявіла сябе гэраіняй, гэт далёка за Літоўцамі слаўнай. Ды што там Літоўцы, унь аж у Маскве пра яе пачуюць. Гэта-ж ня хто іншы, як сам таварыш Сталін асабіста ей падзяку прышле. Вось будзе што людзям паказаць. Вялікая слава, ўжо казытала Аксеніна сэрца. Бойкая, наравістая, агрэсыўная, гэта яна, а ня Піліп у хаце гаспадар. Што той Піліп: сядзеў вунь над калодай. малатком цюкаў, шылам калоў, фратвай прышываў. Рухавік - яна, Аксеня. Ласкава зірнула на сына, што стаяў побач задаволены, што матку хваліў такі вялікі маскоўскі начальнік.

- А як-жа гэта, - гаварыла збоку да маскаля Аўдоля, - як-жа гэта, таварыш камісар, паслаць падаркі? Пошты-ж цяперака німа.

- Ды пусьцяк гэта, - махнуў Маршалкаў рукой. - Зьбярыцеся, зрабіце пасылку, напішыця хто й каму... Вы апроч таварышча Сталіна і другім членам палітбюро партыі хочаце падаркі паслаць?

- Ну ўсім-жа, усім, - пацьвердзіла Аксеня.

- Дык от, вельмі добра, цудоўна. Падаркі перадайце мне. Я паклапачуся, каб іх адразу адправілі ў Маскву.

Пачуўшы такую пахвалу ды абяцаньне помачы ад бальшавіцкага камісара, паднечаныя жанчыны загаварылі ўсе разам. Энтузіязм разьліўся ў цэлы шэраг прапановаў, каторых адразу нельга было вырашыць. Насамперш трэба была ўстанавіць хто й каму падрыхтуе

падарак. Сталіна адразу прысвоіла Аксеня. Думка пра падаркі ў ейнай галіне нарадзіліся, дый была яна ці ні найлепшай ткальняй кужалю ў вёсцы. Жанчыны згадзіліся сабрацца на наступны дзень і падзяліць прозьвішчы бальшавіцкіх палітбюроўцаў.

У школьнай залі напінаўся мяхамі й рыгаў баян. У вялікім коле пасярод два жаўнеры скакалі «рускага». Калі тым духу не хапіла, зьмянілі іх іншыя скакуны. Гэткім чынам «рускі» трываў ладны кавалак часу. Адзін маскаль прынадзіў да скокаў Хвядосаву Маньку. Пад гул і рогат з бакоў, дзяўчына нядрэнна патрапляла чырвонаармейцу. Ногі да танцаў мела спрытныя, але недахоп практыкі ў такой акрабатыцы хуткаў выгнаў пот на лоб, дзяўчына задыхалася ды неўзабаве, пры агульным рогаце, азадкам села на падлогу.

Ромкаў гаспадар нешта сказаў баяністу. Той кіўнуў галавой, скончыў «рускага» й пераключыўся на «Кацюшу», Спачатку нясьмела, пасьля байчэй пацягнулі за баянам галасы. Лявон і Косьцік дзёрлі глоткі, быццам каб пахваліцца сваім майстэрствам перад літоўскімі сялянамі. Праз шырока адчыненыя вокны й дзьверы песьня вылятала на двор, рэхам адклікалася між вольхаў і вербаў у блізкіх аселісах і далейшым балоце. Навокал школьнага будынку групамі гаманілі сяляне, ніхто дамоў ня сьпяшаў. Адно Васіль уссадзіў крэкчучага бацьку на каляску ды рушыў з двара. Дзесь уліпавіцкім маёнтку конаўкай сьвятла разганяючы цемру, грувасткі касалапы гусянучны чалябінец валок на загадзя раскапаную пазыцыю цяжкую зэнітку.

Наўздагон «Кацюшы» паплыла «Есьлі заўтра вайна». Гэта была куды баявейшая. Перад кажнай звароткай словы казаў чарнявы гарбаносы чырвонаармеец. - Дружно, все разом! - спанукаў ён прысутных. Адылі апроч бальшавіцкіх жаўнераў мала хто сьпяваў.

Нястомны баяніст пераключыўся на польку-трасуху. Як восеньню лісьце пад сільным ветрам, закружылі на залі пары. У гурце старэйшых і падлёткаў ля парогу стаяў і прыглядаўся танцам Янук. Да грамады меншых дзяўчат падыйшоў рыжавалосы бальшавік. Дзяўчаты сьціснуліся, пачуўся віск і сьмех. Маскаль учапіўся за Дуніну руку й выцягнуў дзяўчыну з грамады. Спачатку ногі яе хадзілі нязграбна, нясуладна з танцорам. Сарамяжліва азіраліся на бакі. Неўзабаве ўжо добра патрапляла чужніку. Учэпістая касматая рука прыгарнула гібкую дзявочую сярэдзіну. Раз ці два вочы-васількі спыніліся на Януку. Нешта балюча заскрабло яго ў грудзёх.

Алесява дачка Надзя сядзела побач Бруніськавай Мальвіны. Калі спасьцерагла Шпунтовага Лявона, што як таран, не аглядаючыся на бакі, ішоў проста ў ейным кірунку, падумала, што дзяцюк на Мальвіну зрок меў. Дзеўка аж гарэла. На твары яе паднечанае чаканьне: вось дзяцюк ідзе, паласавацца можна. Мальвіна даўно ў старых дзеўках марнела. Цяпер-жа, акупанты прарэдзілі лік дзяцюкоў сваей вайною, Мальвіне пры адных марах даводзілася астацца. Спагадлівая да суседкі, Надзя спасьцерагла Лявонаў намер адно тады, як выцягнулася ягоная рука.

- Ну што-ж, золатца разумнае, маж й січас ні пойдзіш?

Ужо пасьля сходу мусіць усьпеў сербануць недзе, бо самагонкай ад яго нясло.

Надзя зачырванелася. Як у кажнай вёсцы, гэтак і ў Літоўцах, дзеўкам вызначалі шансы замужжа перадавыя клясыфікатаркі-пахатухі. Паводле характару й выгляду Надзю паставілі блізка сьпераду, паводле пасагу - у хвасьце. Надзін дзяцюк Міхась ваяваў ці бібікі ў палоне зьбіваў недзе. Каму-ж цяпер за яе заступіцца? Дзўчына ведала цану Лявонавага заляцаньня, пазьбягала дзяцюка як магла. Яна зірнула на бацькоў, што ля дзьвярэй стаялі.

- Патанцуй, Лёнька, са мной, галубок! Ха-ха-ха! Хадзі! - запрашала, устаючы з лавы Мальвіна. Дзеўка аж пабрыдзела ад недарэчнага сьмеху, што трос вялікімі, абвіслымі грудзьмі.

Лявон быццам ня чуў яе. Юрлівы, паднечаны самагонкай зрок распранаў сьціплую, нясьмелую, чырвоную аж да кончыкаў вушэй Алесяву дачку.

- Што-ж ты, Лёнька, дзевак табе мала? Ты-ж знаіш, што я Міхасёва. Мальвіну во вазьмі, - адказала Надзя.

- Якая ты такая Міхасёва? Дзяцюк твой знаіш дзе? От я тут хадзяін і січас мая будзіш! - гаварыў таран і дзьве рукі паднялі дзяўчыну з лавы. Баяніст рыпеў нейкую дагэтуль у Літоўцах няведамую мэлёдыю факстроту. Зьбітая з тропу хамскай нахабнасьцю, Надзя не агледзілася як апынулася між танцуючых і намагалася патрапляць няроўным крокам дзяцюка. Ашчаперыў яе як мядзьведзь, адну лапу ззаду ніжэй паясьніцы трымаў. Дзяўчыне дух займала. Яна схапіла Лявонаву руку.

- Што ты робіш, нястыднік? Людзі глядзяць!

- Га? Ну што людзі? Ім сваё, а нам сваё...

Ён насядаў яшчэ мацней, басіў дзяўчыне на самае вуха. З роту нясло самагонным гарам.

- Нястыднік, каб ты згарэў! - сыкнула Надзя, - Ня цісьні гэтак, дыхаць німа чым!

- Я-ж цябе люблю, - дыхнуў юрлівасьцю дзяцюк.

Надзя жахнулася. Ведала цану Лявонавай нахабнасьці. Зірнула на зьбянтэжаную матку ля парогу.

- Любіш як мядзьведзь. Ня можаш танцаваць як людзі? Калі табе ласкаў захацелася, дык ідзі да Мальвіны, дзеўка аж гарыць...

Надзя баялася раззлаваць Лявон й трымала лягодны тон.

- Я во да цябе, красоткі, прышоў, дык ні пасылай мяне да Бруніськавай. Калі душна, дык пойдзем на двор.

Насядаў і цісныў яшчэ больш. Надзя спасьцерагла, што калі нейкім чынам ня вузваліцца з абдымкаў падпітага мядзьведзя, дык у гарачцы язык можа шкоды сабе й бацьком нарабіць. Яна раптоўна й зручна крутанулася й пакуль актывіст спасьцярогся, ужо стаяла ля парогу ля маткі.

- Мама, ідзём скарэй дамоў, бо ад гэтага мядзьведзя німа ратуначку ніякага!

- Добра, дачушка, хадзі.

Лявонавы нахабныя заляцаньні даўно сачыла ягодка-Аўдоля. Гаворачы з Аксеняй пра палатно, часта ўкідвала свае заўвагі. Калі Надзя зручна вышмыгнула ад Лявона, дзяцюк стаяў між танцуючых, цяжка дыхаў, міргаў юрлівымі вачмі.

- Уцікла, от маладзец! Глядзі, глядзі на яго, Аксеня! І дзяцюк, здаецца, з галавой, ягодка, алі мусіць напіўся ўжо, - сказала Кміціха сваей неадлучнай суседцы.

14

У гэны вечар надта ўсхадзіўся сьцюдзёны вецер. Калаціў доктаравы клёны, лісьцем замятаў літоўскую вуліцу й двары. У васеліцах тужліва шумелі вольхі й вербалозы. Зьгіналі на могільніку пышныя чубы сёстры сосны, скрыпела пакалечанымі дрэвамі й

злавесна гудзела Гаравацкая пушча, удужкі зь ветрам браўся на Гараватцы гігант Архіп.

У Пракопавай хаце вясёлым буйным полымем трашчэў у печцы-бакавушцы сухі сасновы хвораст. На пліце варылася вада на зацірку. Прымасьціўшыся на зэдліку, Мікола абломваў хрусткія сасновыя галіны, зьбіраў з падлогі ігліцу й кідаў пад пліту. Полымя брала раптоўна, ярка асьвятляла змрочны пакой і людзей у куце пры стале. Медзьдзю аблiваліся задуманыя змрочныя твары. Здавалася, што пазлазілі яны з малюнку каторага рэнэсансавага мастака й застылі пад абразамі ў Пракопавай хаце. Полымя ўспыхвала зыркім агнём і раптоўна малела.

Цень запанаваў ня толькі ў Пракопавай хаце. Ці адзін селянін пазіраў на сухі хвост кнута ў лямпе. Нафты на дне асталося столькі, што й камару ўтапіцца ў ей цяжка было-б. Хмарнелі твары пры згадках пра кілямэтравай даўжыні чэргі пры гацкай краме-сельпо. І мала каго цешыла гэна бальшавіцкае выясьненьне: - Нафты няма? Ды не сьпяшыце, усяго хопіць. Пачакайце, справімся!

Акупантавым самахвальствам хаты не асьветліш. Надыходзілі доўгія вечары й жанчыны трывожыліся, што ўпацёмку нічога не напрадзеш. Як кашаль хваробе, памагала ім тое бальшавіцкае «пачакайце».

Доўга зьзяла яркімі вокнамі літоўская школа. Прывалаклі сюды электрычны рухавік, паказвалі такія фільмы, як «Ленін в Октябре», «Чапаев», «Броненосец Потемкін» і іншыя. Каб падкаваць людзей у «палітграмаце», ды навучыць чытаць і пісаць «паруску ніграматных», разы два на тыдзень лекцыі давалі. Прыяжджаў зь Ліпавічаў палітрук, часам і сам Маршалкаў заглядаў.

Пра гэта вось, аблакаціўшыся на стол напокуці, гаварылі ў Пракопавай хаце Алесь, Пракоп і Янук. Пад трэск хворасту й шум ветру за вакном млява йшла гутарка.

- Ну гэтыя-ж пахатухі туды чаго? Што ім? - пытаўся Пракоп. - Яны-ж ні бэ, ні мэ...

- Ты гэта пра Аўдолю й Аксеню?

- Ну.

- Казала Надзя, што цікуюць, каб Маршалкава прыпілнаваць ды даведацца ці Сталін палатно атрымаў.

- А паслалі?

- А як-жа. Ды каб гэтыя толька, а то й Макатуніха таксама. Ці ні Пятух з таго камбеду прыцягнуў, сьвіснуўшы недзе. Во ўжо нядзелі тры назад выслалі, а нічога яшчо ні чуваць.

- Во яно як...

Недзе на дварэ вецер тоўк акаціцай у сьцяну.

- Янучок, выйдзі ты, паглядзі каторую акаціцу б'ець. Можа прывязаць, ці што. Нечага во надуець, так усхадзіўся.

- Добра, тата.

- З гэтым самым камбедам... Пітуху-гультаю цяперака ні рабі, адно сьмярдзючкай-самакруткай сьвет божы капці ды людзей аграбай. Цьфу, басяк! - узлаваўся Пракоп.

- Права-ж іхнае. Яшчо во хто гэта мне на днях казаў, - задумаўся Алесь, - ага, во Тодар, значыцца, казаў, што ня толька паноў і асднікаў абіраюць. Тамака-ж самая, казаў, уласьць савецкая падчышчаіць. Казаў скора й да нашых багацейшых даберуцца.

- Чаму-ж не, даберуцца...

Тата, вада кіпіць, - адазваўся Мікола, што пільна трымаў вуха, каб ніводнага слова не прапусьціць.

- Ну дык добра. Запалі, сынок, лучыну ды зацірку рабі.

Мікола пайшоў у сені й прынёс адтуль малое карытца. Наліў у яго ваду, дастаў з-за пячы вялікую лучыніну, запаліў яе ды ўторкнуў у дзяржала, прыладжанае з аднаго боку карытца. Паставіўшы яго на прыпечку, палез у шафу.

- Тата, у нас мукі мала.

- Як у цябе з млівам? - спытаў Пракопа Алесь.

- Ды ўжо мука на зыходзе. Мяшок жытняй мусіць ёсьць ды пшанічнай жменька. Трэба во да Сявенькі йсьці, на зацірку пазычыць прасіць, а на млын аж у Докшыцы тыя цягнуцца. Тут у Гацях усё вайсковае мелюць. А ў Докшыцах, кажуць, завоз надта вялікі. Жыду, кажуць, млын забралі, дык новыя парадкі, ці біспарадкі пачаліся. Нейкія талоны нібыта вымагаюць, ці якую халеру... Пакуль ехаць, дык трэба Шпунта распытацца, гэты-ж мусіць знаць.

- Гэтага бандзіта! - плюнуў Алесь. - Каб яго зімля ні насіла, як во маей дзяўчыне праходу ні даець!

- А чаго-ж ён?

- Ну як гэта чаго? Ні знаіш, што сабаку трэба? Маладых во палякі ўсіх падчысьцілі, а гэты басяк застаўся. Цяпер во яму разгул, усё поле

чыстае. Ну дык і давай, праходу дзяўчыне ні даець. Ды начальнік-жа яшчо...

Памаўчалі.

- Уласьць! Да лучыны дажыліся! - скардзіўся Пракоп. - Бяз солі еш... Што гэта робіцца? Зямлю, кажуць, даваць будуць, дабро наступіць. Ну паглядзім...

Пракоп зьмяніў тон.

- Ты гэта кажаш, быў у школе ўчорака?

- Ага.

- Ну й што тамака?

- Ат, махнуў, - памарудзіўшы, рукой Алесь, - гэты палітрук жыдок пра галасаваньне плявузгаў. - Тавагыш Сталін, - кажыць даёт вам вазможнасьць самім гашыць, хаціця ля вы пгысаідзініцца да нашага ніаб'ятнага Савецкага Саюзу, ілі нет... Пыхцеў як мех кавалёў. Як-бы тоя «пгысаіддзіненьня» нівядома якое дабро.

- А калі тое галасаваньне маіць быць?

- Ды ні казаў. Скора мусіць. Можа от людзям у вушы начаўпуць, дык тады.

- Ну як-бы гэта было, каб людзі прагаласавалі, што ня хочуць да іх далучыцца? - усьміхнуўся Пракоп.

- Пра гэта жыдок ні казаў. Ды да каго-ж мы маім прылучацца? Ці можа самі асобна гаспадарыць пачнём? Паспробуй во, ні прылучыся, яны табе пакажуць дзе ракі зімуюць...

У хату ўвайшоў Янук.

- Ну як там на дварэ? - спытаў бацька.

- Ды дуець і ні пірастаець, - неахвотна адказаў юнак. - Можа во надуіць чаго.

- Учорака чуў я на рынку ў Гацях, - узяў голас Мікола, - як адзін чалавек са Слабоды расказваў, як у іх сяле адзін біларус із таго боку праходам быў. Ішоў куды, ці што... Дык расказваў, што мы яшчо бяды ні відзілі. У іх народ даўна пра мяса забыўся, на самым посным крупніку й бульбе марнеіць. Калхозы ўсіх у лапці абулі.

- Гэта ты чуў? Каторы знаёмы чалавек?

- Свой чалавек. Відіў я яго раней на кірмашы.

- Во як. А што яшчо расказваў?

- Наша жыцьцё, казаў, німа чаго да іхнага, калхознага, раўняць. Неба й зімля, кажыць. Ходзяць, казаў, абарваныя, спрацаваныя, худыя,

як жабракі. А ў тым калхозя, дык як дзед Якуб Якуб расказваіць, як у прыгоне некалі. Многа каторыя, кажыць, упёрліся, у калхозы йсьці ні хацелі. Дык тады Сталін усіх на Сібір павысылаў. Гэта, кажыць, самых найлепшых, найболі працавітых. Толька бедныя й басота асталіся. Што-ж гэта яшчо... ага, казаў, што людзі настрашаныя такія, што цяпер чалавек баіцца роту адчыніць, навіт наракаць забыліся.

Мікола пачаў мяшаць заціркy.

- Страх, што гэта чуваць. Няўжо-ж праўда?

- Калі-ж гаворуць, дык нешта ёсьць. Німа дыму біз агня.

Запанавала доўгае маўчаньне. Адно вецер грукаў весьнічкамі, сьцёбаў рабінаю па страсе, ачэсваў падстрэшша, праз няшчыльныя вокны прабіраўся ў хату.

- Трэба во скора падвойнныя вокны ўстаўляць, мусіць, бо халадзеча бярэцца. Пакрова ўжо нідалёка, а там і зіма, ні агледзішся калі, - прыгадаў Пракоп.

- Пайду дамоў, - устаў Алесь, - недзіка там ужо вячэра гатовая. Дабранач.

- Дабранач.

Заціркy сёрбалі паволі. Колькі разоў уставаў ад стала Янук, каб зьмяняць лучыну. Хоць прыказка кажа, што лыжкай і ўпоцемку ў рот трапіш, практыкаваць гэта ніхто ніхто ня імкнуўся. Сядзелі з трох бакоў стала, схіліўшы галовы над міскамі. Адно вялікі шэры кот голасна мяўкаў пад сталом і цёрся ля босых ног.

- Аа-псік, ну цябе! - сыкнуў Мікола.

- Дай во кату ў чарапок, таксама-ж есьці хочыць, стварэньне божае, - зьвярнуўся бацька да Міколы.

- Усьпеіць, нікуды яму ні сьпяшыцца, дый гарачага ён ня будзіць есьці, - адказаў Мікола. Калі скончыў есьці, наліў кату ў гліняны чарапок заціркі ды сказаў Януку: - Цяпер ты прыбірай, я сваё ўжо зрабіў.

- Можаш і сам, пан нівялікі, - адказаў Янук.

- Вы гэта што, зноў зачынаіця? Янук, прыбяры. Ні пан і ты ніякі, можаш памагчы, - падняў голас Пракоп. - І я болі ні хачу ніякіх сварак. Рабіць німа каму, самі ведаіця.

- Узяў-бы ты, тата, ды ажаніўся. Хоць-бы во гаспадыня ў хаце была, - сказаў Мікола.

Калі-б гэта было сказана ў іншых абставінах, Пракоп можа наваліўся-б на сына. Ды ў Міколавым голасе было гэтулькі шчырасьці й добрага жаданьня, што бацька ўстрымаўся.

- Ты гэта адкуль такую думку ўзяў? - сказаў лагодна Пракоп. - Маці нідаўна на той сьвет адыйшла, а ты во што... Як табе ня грэх?

- Грэх грэхам, а жыць неяк трэба. Бог можа даруіць. Сам можа відзіць вунь, што біз бабы ніякай гаспадаркі німа.

Пракоп уважна зірнуў на старэйшага сына. У будзёншчыне мала нагодаў да душэўнай размовы было. Ад шэрага жыцьця пачарсьцьвелі, здавалася, сэрцы. Стрымліваліся пачуцьцёвыя выказваньні. Так ужо павялося, што часта адно слова, зірк вачэй, цень ці прамень на твары замяняў тое, што ў іншых людзей забрала-б шмат часу для пылкіх выказваньняў.

Пытаньне гаспадыні ў хаце вымагала даўжэйшага разважаньня. Не пазьбегнеш эмоцыяў, мо і спрэчак ня мінеш, Хоць ведаў Пракоп, што вялікая праўда была ў словах сына, але нічога пазытыўнага ня мог-бы цяпер зрабіць. Звонку выглядаў апанаваным і зроўнаважаным, але дзесьці глыбака ў грудзёх загнязьдзіўся чарвяк з таго часу, як чужынцы падсеклі ягонае карэньне. Кажуць, што час ёсьць найлепшым лекарам. Праўда. Да вясны крыху зажыла душэўная Пракопава болька. Ды новыя падзеі зноў адбіралі роўнавагу, нярэдка бяссоньніцай марылі. Намагаўся трымацца перад сынамі, ды болькі гэнай глыбака не схаваеш, Неасьцярожнае слова ці рух былі надта вымоўнымі.

Мікола мяркаваў, што мужчыну ў бацькавых гадох жанчына патрэбна была ня толькі для гаспадаркі. Перад Бахмачом, як на добры лад, ляжаў яшчэ прастор жыцьця. Калі-б знайшоў сабе сабе добрую сяброўку, ды ня толькі бацьку раўнавагу вярнула-б, але й яму, Міколу, вялікі цяжар з плячэй зваліўся-б. А дзевак выбар цяпер быў вялікі. і мо таму, што насьпелае сарвалася зь Міколавага языка зусім нечаканна, бязь ніякага папярэджаньня, аж уздыхнуў лягчэй. Стаяў і пазіраў на бацьку. Што-ж ён скажа?

- Ну знаіш што, Мікола, ні час пра гэта цяперака, - сказаў Пракоп. - Ні паліце во дарма лучыну, спаць ідзіце. Можа калі пра гэта пагаворым.

«Ага. - падумаў сын, - значыцца ні сказаў наадрэз, што не. Дык можа яшчо што й будзіць з гэтага».

Мікола зірнуў на Янука й той мігам зразумеў ягоную думку.

- Спаць? Я яшчо во на сяло думаю. Ноч вялікая, высплюся, - сказаў дзяцюк.

- Да каго-ж ты гэта?

- Недзіка некага знайду.

- Можа дзе самагонку знайдзіш?

- А чаму самагонку? Думаў, што можа дзяўчынай упікнеш, ажно самагонкай, - усьміхнуўся сын.

- Табе мусіць дзіўчаты ў галаве. Ат, ідзі, - махнуў Пракоп рукой.

Доўга качаўся ў пасьцелі й ня мог заснуць Янук. У галаве блыталася-крыжавалася павуціньне думак. Неяк на днях, нечакана сустрэўшы Дуню, выплыла наверх новае й неспадзяванае: школа. Дзяўчына казала, што быццам у Гацях бальшавікі школу маюць адкрываць і ці не жадаў-бы Янук пайсьці й даведаццапра навуку.

Ад часу, калі нямоглы бацька здаў на ягоныя слабыя плечы гаспадарку, думкі пра навуку на задні плян адыйшлі. Адно ў марах часам сябе на школьнай лаўцы бачыў. Былі калісьці мроі пра перамену. Цяпер-жа яна прыйшла. На лепшае ці на горшае? Прага да навукі не змалела. Кажуць Французы, што апэтыт падчас яды расьце, а Янукова прага да ведаў ніколі ня спыняла росту. Калі Дуня згадвала пра школьную лаўку, аж млосна зрабілася. Варта было-б новы сьвет пазнаць.

Памкнуўся нешта Дуні сказаць, зьбянтэжыўся, зачырванеўся. Завязаўся між імі нейкі, Януку ня зусім зразумелы вузел. Дзяўчыніна блізкасьць і непасрэднасьць зьвязвала яму язык, забірала волю. Бянтэжылі хлапца дапытлівыя й добразычлівыя вочы-васількі.

- Ні... ні знаю. Сама ведаеш як у нас...

Абмінаў дзяўчынін зрок, баяўся, што ўсё на ягоным твары вычытае. З аднаго боку спанукала нешта, каб душу перад сяброўкай раскрыць. А што будзе, калі пачнеш скардзіцца ды сьлінькай выглядаць будзеш? Трэба трымацца, мужным быць. Дуня спасьцерагла, як гарэў Янукоў твар.

- Што з табой, Янучок? Чаму ты як бурак чырвоны зрабіўся? Часта ні пазнаю цябе.

Васількі больш дапытліва й глыбей у твар пазіралі.

- Ні пытайся.

Янук адвярнуўся й раптоўна адыйшоў. Спачатку ногі непаслухмяныя былі. Мо вярнуцца й расказаць? А пра што раскажа? Пра мазылі й цяжкую працу? Аж здрыгануўся пры думцы такой. Прыгадаў далёкі той час, калі дзяўчыну ў школу ні пушчаў. Яна-ж горшая была. - А чаму-ж горшая яна? - пагрозьліва вырасла на лясной сьцежцы высокая постаць дзядзькі Захарука.

Нешта ў нутры пякло. Цяпер «горшая» яму разам у школу ісьці суліла. Бачыш, як яно перавярнулася, зьмянілася. Ды ў іх-жа цяпер у хаце дабра поўна, хоць і з камбеду нацяганага. А Пракоп Бахмач можа ў Сабакевіча на чорнай лісьце запісаны.

Ногі пайшлі раўней. Адно раз азірнуўся. Дуня стаяла, сачыла за ім, мо спадзявалася, што вернецца.

На мяжы дрымоты, у той паласе, дзе смугой паволі зацягваецца сьведамасьць, прыгадалася тое нікчэмнае зьбянтэжаньне. І зноў, здавалася, загарэўся чырваньню твар.

Вецер аціхаў. Недзе на вуліцы пачуліся гулкія, няроўныя галасы. Адзін буяніў, іншы гарлапаніў нейкую няведамую «частушку». Вечарамі бальшавікі да вясковых дзяўчат заглядалі й цяпер мусіць у Ліпавічы вярталіся. Недзе прахапіўся й забрахаў Тапсік.

Янук перавярнуўся на другі бок, глыбака ўдахнуў паветра й смачна пазяхнуў. Галасы за вокнамі аціхлі ненадоўга. Мусіць ішлі іншыя, бо чуваць была гаворка. Тапсік кінуўся да весьнічак і гулка забрахаў. Воддаль адклікнуўся доктараў Мурзік. Моцны дзёрзкі голас вылаяўся трохпавярховым матам. Гэта ці ні падбадзёрыла Янукова гадунца, бо аж заходзіўся ад браханьня. Гулкі стрэл скалануў паветра за вакном. Тапсікаў голас раптоўна перамяніўся ў балючы енк, быццам душыўся сабака. Енк той, спачатку вельмі галасьлівы, скора слабеў.

- Так тебе, подлец! - пачуўся за вакном грубы голас. І рогат.

Жахлівая думка падарвала Янука з ложку. Кінуўся да вакна й прыліп носам да сьцюдзёнай шыбіны. Празь нізка абвіслыя галіны рабінаў, што расьлі перад ганкам, спасьцярог дзьве вайсковыя постаці, што йшлі ў доктараў двор.

- Тата, мусіць бальшавікі Тапсіка застрэлілі! - крыкнуў трывожна Янук і кінуўся ў дзьверы.

Поўнік вызіраў з-за хмараў і, быццам хлапцу на помач, млявым рудым сьвятлом разрэдзіў гушчу цемры. Янук пабачыў двух бальшавікоў ужо за лекаравай брамай. А пад плотам, дрыгаючы ўсім

целам, цяжка хроп залітым крывёй горлам, душыўся ягоны найлепшы сябра. Хлапец прысеў перад ім, узяўся за вушы. У рудых поўзакрытых вачох гасьлі апошнія іскрынкі жыцьця.

Недзе зь вялікай глыбіні, як шырокая разьліўная рака, прыйшоў плач. Хлынуў раптоўна, набіраў моцы, трос усім Януковым целам. Гарачыя сьлёзы залілі вочы. Хлапец намагаўся зірнуць сабаку ў рот. Едкі смурод пораху зьмяшаўся са сьвежай крывёй.

У Бахмачовым уяўленьні ажыў маленькі, забаўны шчанючок, каторага некалі ад шляхцюка з Галавачоў прынёс. Шчанюк абрастаў доўгай рудой поўсьцю, вырас вялікім, разумным сабакам. Вось ён гэйсае з хлапцом па Гараватцы, забаўна падскаквае й шырокім, чырвоным языком лізнуць Янукоў твар намагаецца. Вось ён на балоце гадзюку абнюхаў. Тая ўстала пагрозьлівай дугой, шыпіць, пружыцца, а сабака аж заходзіцца браханьнем, як звар'яцелы мох дзярэ. Вось ён гаўкае на ваверку на хвоі ў Гаравацкай пушчы, лапамі разграбае нарасьць над магільным камянём паўстанцаў, гоніць кароў, або туліцца да яго ў цяньку бярозы на хутары Лазоўскага. Такога разумнага сабакі мусіць на сьвеце ня было.

Ніколі ўжо не зазьзяюць неабдымнай радасьцю пры сустрэчы з гаспадаром гэтыя любыя вочы, ніколі ня будуць бегаць зь ім па родных гонях і лясох гэтыя касматыя лапы й не махне забаўна на прывітаньне даўгі пушысты хвост. У нябыт адплыла часьць Януковага сьвету. Хлапец падняў галаву й зірнуў на бронзавы месяц. Вецер мусіць добра падмёў неба й сам на заслужаны адпачынак пайшоў. Месяц пазіраў на літоўскую лагчыну з поўнай сваей маестатычнай велічы. Празь сьлёзы начны прыгажун крывіўся й мітусіўся.

У адной кашулёнцы й сподніках, Янук зусім не адчуваў сьцюжы. Нястрыманы плач калаціў грудзьмі й хлапец не спасьцярог за плячмі людзей, адно галасы пачуў. Нечая рука лягла на плячо.

- Лепі йдзі ў хату, бо прастыніш, - ласкава сказаў бацька.

Янук азірнуўся. Побач бацькі, ззаду стаяў доктараў Стась і Мікола.

- Дык гэта-ж, каб яго халера, забіў мусіць-ткі, - гаварыў Стась. - А каб на яго гром, каб яго зімля ні насіла! Хто гэта?

Янук устаў, зірнуў на сябру.

- Хто-ж... Бальшавік праклятый!

- Байцы?

- Яны.

- От-жа нячысьцікі, каб іх зімля ні насіла! Такога добрага сабаку забілі, - сьцьвердзіў доктараў сын.

Гэткі Стасеў камэнтар выклікаў у Янука новую хвалю плачу й стрымаўся адно тады, як бацька за плячо страсануў.

- Кажу, ні стаі голы на дварэ, бо прастыніш. Мала бяды? Трэба было на прывязі дзіржаць!

- А што з сабакам рабіць?

- Ды што-ж... ідзі во спаць, заўтра закапаеш.

Пра закопваньне Янук і ня думаў. Цяпер слова гэна станула перад ім у поўнай сваей брыдоце. Бачыў некалі, як ямы на могілках засыпалі. Насыпаўшы надмагільны гарбок, плёскалі рыдлёўкамі па гліне. Асабліва ёмка й зручна рабілі гэта каторыя мужчыны ці дзяцюкі, што ня першы раз гэту няўдзячную павіннасьць выконвалі. Цяпер гэна бацькава простае й шорсткае «закапаеш» выклікала ў Януковым уяўленьні жахлівы вобраз. Шырокай, зьзяючай ад частага ўжыванья, рыдлёўкай яно плёснула па найбольш кволых і балючых мясцох Янукова сэрца. Новай хваляй пракаціўся плач. Хлапец кінуўся да трупа сабакі, абняў яго й пачаў крычаць: - Ні дам! Тапсік, мой міленькі, што з табой зрабілі?!

Яго сілай пацягнулі ў хату.

Доўга трывала жахлівая ноч.

«Трэба было на прывязі дзіржаць!» - гучэлі бацькавы словы. Позна. Чалавек пасьля бяды разумны. Але чаму гэта Тапсіка, а не якога Ромку?

Быццам у вадказ на гэта, дзесь здалёку з-пад балота даляцела вясёлае Ромкава гаўканьне. Ці здалося гэта? Бандыты, нечысьць! Адну найбольшую радасьць меў на сьвеце й цяпер яна ў нябыт адыйшла. Сьлёзам ня было супыну.

15

Дзед Якуб трымаўся абагрэтага кута, рэдка калі ад хаты адыходзіўся. Не таму, што жыцьцятрывалы патрыярх літоўскі сьветам цікавіцца перастаў, а таму, што сьвет заглядаў у кут ягоны. Калі пагода

добрая, сядзіць дзед на прызьбе, зь піпькі дым самасеечны пацягвае. Ідзе каторы мужчына ці жанчына, затрымаецца, паздароўкаецца, дзедавым здароўем пацікавіцца, апошнімі навінамі падзеліцца.

А навінаў многа. На скрут галавы павярнула жыцьцёвае тэмпа. І якраз ня хто іншы, а сам дзед Якуб неяк у гутарцы параўнаў літоўскія начоўкі й навакольле да спакойнага возера, што доўгі час межавала з загачаным суседнім морам. Пакуль гаці трымалі мора, у возеры быў супакой, пладзілася й плёхалася свая рыбная дробязь. Кагадзе новая сіла разбурыла гаці й магутнае мора ў гэнае літоўскае возера хлынула. Вялікая рыба нетры вады ўскалыхнула. Свае дробныя акуні й плоткі, да ранейшае ціхамані й ленага жыцьця прызвычаеныя, цяпер зьбянтэжыліся, адурманелі. Як хвалі бурлівыя, выпадкі ўзялі борздае тэмпа. Дзед Якуб, каторы некалі паўстанцам Каліноўскага памагаў, не паглыбляўся ў гісторыю й ня прыгадваў колькі разоў чужнікі тыя ўяўныя гаці разбуралі, ды ў родныя вадзяныя глыбіні чужыя кіты-пражоры наплывалі.

Цяперашняя чырвоная рыба насамперш за чыстку былай польскай адміністрацыі й зямельных уласьнікаў узялася. Навосьцеж адчыніліся брамы ў маёнткі, фальваркі й асадніцкія гаспадаркі. Абіралі хутка, налётам. Чаго павезьці ці панесьці ня здолелі, тое тапталі паводле прыказкі: «сам ні гам, дык і другому ні дам». Рознае масьці панкі й пані заклікалі на дапамогу абедзьвюх Матак - Чанстахоўскую й Востробрамскую, па начох рукі ў немачы ў модлах ламалі.

Быццам грыбы пасьля спорнага цёплага дажджу, паўставалі па вёсках камітэты беднаты, забранае ў чужнікоў дабро між найбяднейшых сялян разьмяркоўваць. Літоўскі камбед фармальна ачоліў найбольшы вясковы гультай, карцёжнік і п'яніца Сымон Пятух. Фактычным рухавіком быў Лявом Шпунт. Увайшлі туды Макатунішкі, шавец Піліп, Кміты, Бруніські дый яшчэ колькі, пераважна многадзетныя, што на двух ці трох гактараў бяду караталі.

Яшчэ не раскрыліся бальшавіцкае сацыяльна-праўнае аблічча й ці хто ў Літоўцах мог мяркаваць, што й сам фактычны бацька камбеду, Лявон Шпунт, дый спэц-упаўнамочаны сельсавету, Косьцік Сабакевіч, ад буйных кулакоў атожалкамі выводзіліся, ды што ў будучыні пад бальшавіцкую касу мелі трапіць. Хто там цяпер мог карэньнем сацыяльнага паходжаньня цікавіцца, калі ўсім бедным было чаго

ўволю цягаць, а пры тым цяганьні ў прагавітай мітусьні яшчэ дабро пад ногі таптаць.

Найбольш лакоміліся мясцовыя камуністы. «Грабілі награбленае» не навосьлеп, а намагаліся рукі пагрэць ля больш каштоўнага й меншага, што ад непажаданага вока людзкога скрыць можна было. Ды ўся мясцовая рыбная дробязь і ўявіць не магла як нажываліся тыя прыплыўшыя з чужога мора кіты. У параўнаньні зь імі мясцовыя жывіліся адно крошкамі з багатага стала.

У некаторых вясковых хатах новае жыцьцё пачалося. Зусім немалая перамена выразна вонкава ператварыла фармальнага старшыню камбеду. Цяпер Сымон Пятух непаваротліва ацялюгваўся ў бліскучым сінім панскім сурдуце, каторы, казалі, у асадніка Лазоўскага сьцягнуў, у ботах з бліскучымі халявамі, прыгожых зялёных галіфэ портках, навет гальштук пару разоў прычапіць маніўся. Нябрыты й карэлы, як і раней, ён быццам стаўся навочным узорам тэй вядомай прыказкі: «з мужыка пан такі, як з гною куля». Літоўскія хутка падгледзілі, што ня зводзіліся цяпер у Сымона маскоўскія рублі й чэрвонцы, што пагладзеў ягоны жывот і твар, што ямчэй і больш адважна ў карцёжкі сьцёбаў. З горадзенскай махоркі на савецкія карашкі перакінуўся. Ня звычайныя, простыя, як раней, цыбукі, а хлёсткія «казіныя ножкі» круціў. Ці раз плявузгаў, што гатовых папяросаў уволю мог мець, але вялічынёй не падходзілі.

- Ну што-ж... разоў пяць пасасеш дый канец. А я-ж, самі во знаіця, як закапціць дык каб закапціць...

Павесялела ў Макатунішынай хаце. Было ўволю й мукі, і бульбы, і мяса, і вопраткі. Мо спрычынілася да гэтага й наглая страта Параскі. Як-ніяк, гэта бедная, Богам крыўджаная сям'я ў людзей на воку была. Мо таму й ня помсьціўся Дуні за тую лупцоўку перад брамай на гасьцінцы запраўдны рухавік камбеду Лявон Шпунт. Літоўскія чакалі нечага. Ня з тых выводзіўся Лявон, што крыўды дароўвалі. Але мусіць і Лявон і Косьцік у забойстве Параскі вінаватымі чуліся. Як-бы там ні было, а факт стаўся відавочным, што з тых багатых крыніцаў, адкуль цяпер рассыпаліся й на бакі пры рабаўнічых налётах плёхала, чэрпалі вёдрамі ці прыгоршчамі й самыя найбяднейшыя, у тым ліку й Макатунішкі.

Пры спажываньні «награбленага» расла ў сэрцах сумленных бедных людзей удзячнасьць новай уладзе. Ня скупіліся на пахвалы й

мяркавалі, што цяпер запраўды тыя ненавісныя гаці ў непраглядным лапцюжным балоце зь месца зрушыліся й пачне жыцьцё чыстай крыніцай бурліць.

Адно больш цьвярозыя й разважлівыя новым ладам зьбянтэжыліся, галовамі ківалі й на словы сккупіліся. Дзед Якуб, каторы вачмі праводзіў ці адну камбедаўскую, наладаваную дабром хурманку на вуліцы, зусім адкрыта перасьцярогу выказаў: - Ну добра цяперака... ніхай пажывуць, паласуюцца. Ім-жа трэба. Галадранцы, век куску хлеба рады былі. Алі што браць будуць, як гэта скончыцца? Тады каго абіраць будуць?

А сыну Васілю, што сталярскім рамяслом у свей няспорнай гаспадарцы дзіркі затыкаў, дзед раіў: - Ты, Васіль, на чужое ні ляці. Старой праўды ніхто ня зьменіць, а праўда тая кажыць, што чужое бокам вылізіць. Што лёгка прыплывець, тое лёгка й сплывець. Няхай сабе гэныя панкі, каб іх макарэц, і абіралі нас. Ніхай сабе цяперака і іх абскубуць... ёсьціка каго... алі дармавізна нізарабліная толька шкоду чалавеку робіць. Помні, што толька тое добра спажываць ці шанаваць будзеш, каторае сваім мазалём заробіш.

Паслухаў сын бацькавых парадаў і не пайшоў у камбед, хоць і спанукалі яго.

Людзі на дзедаву перасьцярогу адказвалі: - Чаго ты, дзед, бядуіш? Як тую зямлю падзелюць, ды пасеюць і пасадзюць і ўсім уволю будзіць...

Ківаў дзед галавой, неразборліва пад носам гудзеў, або самасеечным дымам пярхікаў. І хто мог тады падазраваць, якой вялікай дзедава перасьцярога была.

Тыя, што назіраць умелі, вялікія кантрасты навокал спасьцераглі. Савецкая «салдатня» пэрыядычна й настырліва ўводзіла ўсім у вушы пра вялікае шчасьце, прост-напраст зямны рай на тым баку. Калгасы й саўгасы сама дасканалымі інстытуцыямі на зямлі сталіся, улада рабочым і сялянам належала, усе ўсяго ўволю мелі, галіта дрэнным няслаўным успамінам сталася. Пра ўсіх і ўсё клапаціўся наймудрэйшы й найгэніяльнейшы «настаўнік і бацька ўсіх народаў». Адылі апавяданьні тыя пра райскі дабрабыт былі нагэтулькі на «адзін капыл шытыя», так усё цюцелька ў цюцельку да сябе падобныя, што хіба апошні дурань гэта ўсё за добрую манэту ўзяў-бы.

У гарадох і мястэчках бальшавіцкая «салдатня» - гэтак папулярна называлі чужынцаў, - неўзабаве ўсе крамы пачысьціла. На рынку сялянскае дабро аграмадны спрос мела, а ад чырвонцаў у тэй «салдатні» кішэні трашчэлі. Ля «сяльпоў» і «гарпоў» кілямэтравыя чэргі за хлебам, сольлю, нафтай і цукрам стаялі. Зусім у новым значэньні атаўбавалася слова «даюць» і выціснула нармальна ўжыванае «прадаюць».

Разважлівы й асьцярожны беларускі селянін ці мяшчанін параўноўваў апавяданьні пра «рай» з наглядным фактамі, ды зь няскрыванай іроніяй пытаўся: - Калі-ж ў вас такі рай тамака, дык чаго-ж вы, як шараньча, на нашу бяду налятаеце? Эгэ, мусіць дрэнь тамака ў вас...

І няхто ня ведаў дзе нарадзіўся пашыраны па цэлай новазабранай краіне той да глыбіні сэрца сваім трагізмам кранаючы жарт пра нейкага сярмяжніка. У гурце сялянаў, што між вазоў на кірмашным рынку гаманілі, стаяў высокі селянін у сярмязе. Ён маўкліва і ўважна слухаў як бальшавіцкі афіцэр апавядаў пра залаты дабрабыт на сваей радзіме. Жаўнер зручна й хітра адказваў на розныя кручкаватыя пытаньні. Дрыжэў селянінаў твар і ў вадзін момант, калі, здавалася, цярплівасьць ягоная скончылася, адкінуў палу сярмягі ззаду й зьдзеклівым голасам сказаў: - Калі ні было савету, ня відзіў азадак сьвету, а як прыйшоў савет, дык увідзіў азадак сьвет.

З-пад адхіленай палы сярмягі запраўды пазіраў на сьвятло дзённае празь вялікія дзіркі ў портках голы азадак.

Гэты зручны трык выклікаў гром сьмеху. Бальшавіцкі афіцр пачырванеў, пачаў злосна лаяць селяніна й зараз паклікаў «рэбят» у шапках з малінавымі аколышкамі, каторыя пацягнулі вынаходлівага дзядзьку ў НКВД. Выпадак стаўся публічнай антысавецкай дэманстрацыяй. Казалі ў Літоўцах, што падзея адбылася на рынку ў Докшыцах, некаторыя называлі навет сьмелага дзядзьку. Адылі пра падобны выпадак апавядалі і ў іншых мясцовасьцях акупаванае краіны.

Быў і яшчэ адзін факт першакляснага значэньня, што паглыбляў пропасьць між «вызвольнікамі» й мясцовымі: як і раней, на замку стаяла калішняя польска-савецкая мяжа, адно на зьмену зьненавіджанаму КОП'у прыйшла бальшавіцкая ахова з сабакамі.

- Чаму ні адчынілі граніцу? - пыталіся людзі. - Хваліце дабро сваё, рай там нейкі, а паказаць мусіць баіцеся?

Акупанты тлумачылі, што ў Заходняй Беларусі, каторая пад акупацыяй «панскай Польшы» была, аж кішэла ад шпіёнаў, дывэрсанатаў і непажаданага элемэнту, што мог-бы, калі-б адчыніць мяжу, перабрацца на той бок і цімала шкоды нарабіць «гасударству» нарабіць. Але здаровы сялянскі розум браў афіцыйнае тлумачэньне на войстры зуб. Калі-ж вы, такія нашы любыя браты, хочаце нас да сваіх родных, у тым ліку й бацькоўскіх Сталінавых грудзей прытуліць, дык ці-ж вам якая дробная агэнтурная мошка замінае? Чаму-ж такая сіла, як ваша, ды мае такой дробязі баяцца?

Асабліва ўстрывожыліся тыя, каторыя радню ў Расеі мелі. Чакалі, што пасьля даўгой, штучнай разлукі вернуцца нарэшце дамоў родныя. Адылі незагойная рана на жывым народным целе, каторую некалі ў Рызе бальшавіцкія й польскія акупанты зрабілі, крывавілася далей. І сыпалася на яе маскоўская соль.

16

У гэну раніцу прыгрэла крыху млявае ўжо сонца, аж дзед Якуб на прызбу вылез. Сядзеў, ссаў люльку, у пясок паплёўваў. Дзесьці пад балотам гула малатарня, ля школы чуваць быў гоман дзяцей, ляніва зьвягаў у Піліпавым дварэ сабака. Пуставала Якубава хата. Нявестка дзесь упрочкі выбралася, а Васіль некаму падлогу клаў, ці хату апраўляў. Сачыў Якуб апошнія ўздрыгі залатой восені й мяркаваў што добрага ці што дрэннага прынясе зіма. З Рыгоравай варыўні далятаў глухі гул жорнаў. Зь Піліпавага двору паказаўся Антось Дзяркач. Прычыніў весьнічкі, стрымаўся, зірнуў у вадзін бок і другі бок вуліцы ды, спасьцярогшы дзеда, весела засьвістаў і зусім бяз посьпеху накіраваўся да Якубавай хаты.

- Здароў, дзед Якуб, - гукнуў на прывітаньне.

- Здароў, Антось, - адказаў дзед. - Адкуль гэта й куды цябе гоніць?

- Нікуды ня гоніць, да Піліпа забегся во.

Дзяцюк прысеў на прызьбе, плюнуў у пясок і неадлучнай бярозавай палкай пачаў «сарокам кашку мяшаць».

- Боты надумаўся пашыць, ці што?

- Эт, якія там боты, - махнуў рукой Антось, - цяперака во Пітуху, Шпунту ці Сабакевічу боты шыіць, а ні нам, бідалагам.

- Нешта-ж во да цябе гэты шпуньцік, каб яго макарэц, учашчаць пачаў, кажуць, - гаварыў Якуб. - Праўда гэта ці не?

- Чаму-ж... заглядаіць...

- А што-ж яму трэба? Ці гэта ён думаіць, што ты там каля школы напэцкаў?

- Алі ты, дзед, цікавы, - хітра ўсьміхнуўся Дзяркач. - Скора састарэішся, хы-хэ-хэ...

Антось так раптоўна й голасна зрагатаў, што зь цікавасьці аж выпрасталі шыі й паднялі высака галовы ля тыну куры.

- Ты Антось, зь мяне ня кпі, - з дакорам адказаў дзед.

- Прычапіўся як смала, цьфу на цябе! - пачаў сур'ёзна Антось. - У твайго бацькі, кажа, і ў цябе краска ёсьціка, вы вокны майструеце, дык вы й напэцкалі. А калі ня вы, дык той, хто ад вас краску браў. Надта-ж упякло яму. Я гэтак сьцярпеў раз і другі раз, ажно яму ўходу німа. Дык я тады яму гэтак кажу: ідзі, кажу, лепі пастарайся загнаць каторай дзеўцы сваю загагуліну, бо дзіцюкоў Палякі прыбралі, дык дзеўкам чэшацца. А ён як азьвярэў, начальнік вялікі, дык Божа ты мой мілы! Паўгадзіны кіпеў, сукін сын. Я вам пакажу, кажа, які начальнік я цяперака! Я вас у ын-ка-вэ-дэ, от як! Чуў ты яго? І хто-ж гэта, ён думаіць, ён ёсьць? Панскі атопак, пры Польшчы паном служыў, а цяперака во гэтай брыдзе... Дык чорт цябе бяры, жыві як хочаш, рабі што хочаш, думаю сабе, алі чэсных людзей ні чапай. Дык дзе там! Прыліп і ні адчэпіцца, сукін сын!

Антось злосна плюнуў у пясок і канцом кія добра працаваў, каб сарокі галодныя ня былі.

- Дык гэта ён да цябе толька таму, што вы майструіце й краску маіце?

- Ну а чаму-ж?

- Падумаўшы, дык чорт яго бацьку знаіць... краска мала ў каго ёсьць. Алі калі такімі сьлядамі йсьці, дык макарэц яго...

- Я табе, дзед, скажу, што з гэтым бязьменам жарцікаў німа. Ён плёскаіць-ляпаіць, а глядзі й міліцыю навядзець. А тады што?

- Чаму-ж не, яму-ж воля... Ну алі-ж ты, Антось, мусіць і ад мяне ўкрываіш, - хітра зазьзялі дзедавы вочкі. - Людзі-ж гавораць. Німа

дыму біз агня...

- Алі-ж ты, дзед, цікавы. Кажу, што скора састарэішся, як замнога знаць будзіш. Га-га-га!

Антось голасна зарагатаў. Хітрун зьмяніў тон і мову й хіба надта дасьведчаны, добра ведаючы яго чалавек мог спанатрыць калі Антось праўду гаварыў.

- Скажу табе, дзед, пад сакрэтам, - нахіліўся Антось да дзедава вуха, - толька глядзі, каб нікому ані гу-гу. Згода?

- Ты-ж знаіш мяне. Нашто пытаішся? - з дакорам адказаў Якуб.

- Ну дык от, скажу сакрэт: я гэну самую паскуду Лявону падлажыў. Га-га-га! - голасна зарагатаў дзяцюк.

Дзед уважна зірнуў на яго.

- Ці ня кпіш ты зь мяне, сынок?

- Дадушы, яй-Богу! - стукнуў Антось кулаком у грудзі.

- А чаму ты так зрабіў? - сур'ёзна спытаўся Якуб.

- Ну от табе й на! Сказаў адзін сакрэт дык ты, дзед, яшчо болі знаць хочыш.

- Гэта ў вас ці ні за дзяўчыну некалі пашло? - прадаўжаў дзед.

Гэтта Антось зірнуў на дзеда войстра, з дакорам у вачох, быццам яго раптоўна нешта пеканула. Дзед зразумеў.

- Ну ладна. Я яго, каб яго макарэц, гэтага ханжу сам ні магу цярпець. Дык тое, што тут гаварылася, між намі...

- Ат, - махнуў Антось рукой, - такая важнасьць. Сьветак ні было. Ніхай думаіць што хочыць.

Дзяцюк загледзеўся на Тахвіліна гумно. Уверсе плаўна кружыў коршун. Ён камянем упаў уніз і з таго месца пырхнула грамада галубоў. Пільнае Антосева вока асачыла дзяруна, калі гарызантальна, із шпаркімі ўзмахамі крыльляў праляцеў над плотам уздоўж Тахвілінага саду й скрыўся за вішнёвай гушчай. З таго боку крычэлі патрывожаныя куры.

- Хапіў, баньдзюга!

- Ты пра каго гэта? - спытаў дзед.

- Каршун ля Тахвілінага гумна галуба схапіў.

З-за балота прыкаціўся гул цягніка. Недзе ля пераезду загудзеў паравоз. Сіпавата-басісты, з дамешкай хрыпаты гук. Быццам нехта ў дзьве вялізныя пляшкі дзьмухаў. Чыгунку акупанты пашырылі адразу.

Цяпер даўгія эшалёны танкаў, гарматаў і іншага ваеннага багацьця цягнулася на захад.

- Ну як і загудзіць-жа такі паравоз, дык ажно лыткі дрыжаць, сэрца недзіка ў пяткі ўцікаіць, - дзівіўся доктараў Стась, - нагледзеўшыся паравозаўі ўволю наслухаўшыся таго гудзеньня ў Гацях. Дзеці налётам тарчэлі пры чыгунцы «маскоўскія паязды» аглядаць. - Надта-ж, надта вялікі той паравоз маскоўскі, - казаў Стась, - а на самым перадзе дык у яго чырвоная зорка. Ён можа польскія малыя тры могбы папхнуць, ня здужалі-б аднаго. Як чмыхне, дык чмыхне, от-жа й сіла!

- Што ў Піліпа чуваць? - спытаў дзед Антося.

- Казаў, што скора зямлю дзяліць будуць і галасаваць будзім.

- Гэта ўжо старое.

- Казаў Піліп, што гэта Аксеня ягоная цяперака саўсім сьвежую навіну прынесла. Адно толька нівядома калі тое «скора» будзіць.

- Даберуцца во. Куды ім сьпяшыць, можа людзей яшчо ні паабіралі. А што пра паноў і асаднікаў?

- Гэтым, кажуць, на Сібіры колькі хочаш месца. Вывозіць будуць.

- Вывозіць, кажаш? Як гэта вывозіць? Сем'мі, ці як?

- Хто іх ведаіць... гэтага ні кажуць. Алі гэттака сакрэту німа, што паедуць дык паедуць. Усе бальшавікі так кажуць, як у вадну дудку ўсіроўна, - мяшаў Антось далей сарокам кашу.

- Ці-ж гэта ім пяршына, - уздыхнуў дзед. - Гэта-ж як за маей памяці... калі ні аднаго дык другога, а ўсё ў тую праклятую Сібір, каб яна скрозь зямлю правалілася. Самому мне прышлося...

Дзед выстукаў зь люлькі табаку, напакаваў сьвежай і прыкурыў.

- А ў каго гэта сягоньніка малоцяць?

- Ды ў Бурака-ж, у каго яшчо... Казалі, што на дні тры ці ні зьбярэцца.

- Цябе ня клікаў?

- Не. Алі трэба будзіць зайсьціся паглядзець.

- От гэтым цяперака раздольле. Сын - начальнікам, а ў бацькі ад дабра аж піраліваіцца.

- Стары жмінда надта-ж прагавіты. Цяперака яшчо можа Косьцікавай рукой будзіць пробаваць разжыцца. А во, як на лёгкі памін, абодвы цацы, - ажывіўся Дзяркач, перастаў «сарокам кашу

мяшаць» і паказаў кіем у бок клеці малодшага Пятуха. На самакатах набліжаліся дзьве ведамыя фігуры.

- Гэта-ж хто, ці ня гэтыя? - спытаў дзед. - Я ні давіджу так далёка.

- Яны-ж, Косьцік і Лявон. Па «гасударсьцьвінных дзілах» мусіць, - скрывіўся дзяцюк. - Пільныя дзялішкі. Бацька з наймітамі малоціць, а сын бібікі зьбіваіць. Начальнік! Скончылася экспла... як гэта яны, чэрці, называюць яе? - эксплатацыя чалавека чалавекам. Га-га-га!

Самакаты спыніліся ля прызбы.

- Здрасьця, таварышчы, - гукнуў Сабакевіч. - Як жывяце?

Касавурычыся на Антося, Лявон нешта буркнуў сабе пад носам.

- Гэта ты, сынок, мяне ўжо таварышам вялічаіш, га? - спытаў дзед Косьціка.

- Пірад савецкай родзінай і правіцільствам ды камунісьцічаскай парціяй усе мы таварышы, - адцяў Косьцік і фанабэрыста пазіраў на дзеда й маўклівага Антося.

- Ніколі і ў галаву мне ні прышло, хто мне таварышам будзіць, - скрывіўся дзед.

Косьцік быў апрануты ў даматканы сівы паўсуконны пінжак, зялёную вайсковую кашулю, сінія галіфэ порткі й скураныя вайсковыя боты. З-пад пінжака выглядала кабура з пісталетам. Лявон мусіць ня прыдбаў яшчэ нічога з савецкай вопраткі, бо апрануў падношаныя цёмныя порткі, чаравікі, а белая расшпіленая кашуля выглядала з-пад сьвяточнага пінжака.

- Што добрага чуваць, таварышы? - прадаўжаў Косьцік.

- Ды нічога, - адказаў Якуб. - Ад вас во трэба пачуць што было-б. Вам-жа цяперака відней.

- Пачуіш, дзед, пачуіш так многа, што на вяку сваім можа ня чуў. Дзяржыся толька, многа новага будзіць.

Задзірлівасьць, самалюбства й пагроза гучэлі ў Косьцікавых словах. Гэтак мог гаварыць чалавек, што нарэшце на нейкую вяршыню ўсьпяліўся, гаспадаром-валадаром стаў. Антось і Лявон маўчалі. Незадаваленьне такой сустрэчай відаць было ў іхных позірках.

- Ну нам некада, - буркнуў Косьцік. - Другім разам, пака...

- Куды-ж іх пагнала? - спытаў дзед.

- Чорт іх знаіць. Ужо, відаць, пацягнулі недзе, басякі...

17

На паліцы ў куце хліпала млявае полымя каганца. Роўна й мерна гулі жорны. Потам залівала Пракопавы вочы й спружыніліся мускулы правай рукі. Левай даланёй Пракоп выціраў пот і намагаўся трымаць тэмпа. Роўна ціснуў на ручку жорнаў. Гэтак найлягчэй. Адно запаволь напор і тады куды цяжэй надрабляць. Часам зьмяняў Пракоп руку, але левая хутка слабела. Менш да цяжкой працы прывучаная, дый бок пачынаў ныць у тым месцы, што некалі ад Адасевых рук на «панствовым пастарунку» пацярпела.

Ноздры спацеўшага носу ўцягвалі жыцьцядайны пах падпражанага меленага аўса, апэтытнае ўяўленьне ўжо лашчыла прынадную аўсянку, што заўтра жоўтай гушчай запрашальна на Пракопавым стале стане. Да таго дойдзе мо сьвежы журавінны кісель і вось забясьпечыцца цэлая посная пятніца.

Левая рука брала за сявенькі цёплы яшчэ, падсушаны ў печы авёс і насыпала ў жорны. На сьцяне варыўні матляўся аграмадны пачварны цень. Быццам гігант, засланяў ён амаль усю сьцяну, што над катухам з бульбай, борзда сьпяшыў у кут, дзе пераломваўся і ўжо над кадушкай, што стаяла блізу дзьвярэй і насычала паветра пахам сьвежа-квашанай капусты, цень зьнікаў у цемры. Але вось ён зноў вынырнуў адтуль-пераломваўся ў куце й на часіну ўжо выразным гігантам затрымліваўся над катухом з бульбай, каб пачаць папярэднюю вандроўку.

Вялічынёй як добраму кату пралезьці, ваконца асьвятляла крыху варыўню адно раніцай. Малым яго наўмысна зрабілі. Было-б большае, пільнуй тады зладзеяў. Лучыну ў варыўні паліць небясьпечна. Глядзіш, пырсьне іскрой ўбок, займецца полымем павуціна й шукай тады ратунку. А каганцова полымя. якое параўнаў-бы Пракоп да кацінага вочка, зьядала апошнія кроплі цэннае нафты. Пры такой думцы млосна рабілася. Учора Мікола калеў у Гацях тры гадзіны ў чарзе за нафтай і вярнуўся дахаты з пустой літроўкай. Поўбяды было-б, калі-б жорны не спатрэбіліся. Выглядала, што ня толькі аўсянку, але й зярно на хлеб саматугам трэба малоць будзе. Учора Сявенька вярныўся з млыну ў Докшыцах і прывез надта няцікавыя навіны. Сяляне чакалі ў чарзе па два-тры дні.

- Засыпаюць казённае, ну а ты чакай. Алі што-ж маюць рабіць, людцы добрыя? - апавядаў Сявенька крыўдна-дрыжачым голасам. - От і чакаюць, на вазох сьпяць, каб наперад хто ні піралез. Я табе, Пракопка, кажу, каб я з гэтага месца ні зышоў, такога яшчо ня відзіў. Жыда ўжо мусіць пагналі, а на яго месца нейкага савецкага басяка паставілі, паруску гаворыць. Чорт яго басячыну бацьку знаіць адкуль ён. Гарэлкай заліўшыся, ідзець дык ад яго на сажні тры як ад броварнай сьмярдзючай бочкі нясець. От ты да яго й падступіся. Гэта каб знаў, як каторыя другія пранюхалі, дык самагонкі літроўку купіў і з сабой узяў-бы. Каторыя так робяць, дык ім першая рука. А рэшта - стаі ў непагадзі, зябні да касьцей, галодна... што яму, басяку... Некаторыя, што гарэлкі ні прывязьлі, спрабавалі нейкага права даходзіць, ведаеш. Дык як ашчэрыўся, п'янюга! Я вам іці вашу маць, кажа, кулакі, буржуі й падкулачнікі, січас зламлю вашы буржуйскія рогі! Вон атсюдава! Госпадзі мой, ня відзіць лепей такога! Бокам мне гэтыя мяхі зь зярном вылізьлі, каб яму прагавітае на гарэлку горла, нячысьціку, залажыла. Думаю сабе: сядзеў-бы я лепі дома, круціў-бы памалу жорны й окэй, здаравейшы быў-бы. Мліва мне гэта бокам вылізіць. Жарцікі, так празяб і прагаладаўся. Хоць ты сядзь ды плач, дажыліся, называецца... Сваё, казаў той, цяжкім потам запрацаванае, спажыць ня маеш як. І даходзь ты дзе якога права...

У змрочнай варыўні спацелы да паясьніцы Пракоп, няспынна налягаючы на жорны, зноў і зноў сустракаў назойлівы вобраз пакрыўджанага Сявенькі. У старога Амэрыканца сьлёзы на вочы пры апавяданьні набеглі. Жах Пракопа браў. Гэтта да папярэдняй няшчымніцы, што вечна ў хаце падчас польскае акупацыі панавала, далучылася зусім нешта новае, чаго яшчэ зусім дакладна вызначыць ня мог. Да ўлады дабралася свая, дый, згодна апошніх вестак, савецкая басота. «І даходзь ты якога права... свайго, цяжкім потам запрацаванага, спажыць няма як», - гучэлі пагрозьліва Сявенькавы словы. Што гэта такое творыцца? Зьверху адны абяцанкі, рай, маўляў той Маршалкаў, на зямлі настане. Каб вам гэтыя абяцанкі бокам...

Пры жорнах днямі й тыднямі трэба будзе папацецьць. Нікога не падпражэш. Дзеці вунь думалі, што лёганька гэта. Узяўся Янук. Які-ж зь работнік, адкуль у яго сіла тая. Ды яшчэ па Тапсіку прыйсьці да раўнавагі ня можа. Круціў, круціў, задыхаўся, зьнямогся. Міколава здароўе слабое. Яму хатняй гаспадаркі хапае. Дык вось напірай сам.

Калі-б на тым пастарунку за Паўлюковага басяка сярэдзіны ні адбілі, што яму такія жорны змагчы... круціў-бы, пасьвістываючы.

Гэтак заварожаны горкімі думкамі пра мізэрны быт, роўна трымаў Пракоп тэмпа. Жорнава камень гудзеў раўнамерна й грыз ня толькі падсушаны ў печы авёс, але й горкімі прадчуваньнямі цёмнага й няведамага цёр, быццам тое зярно, макулінкі нейкіх Пракопавых спадзяваньняў на лепшае.

Зьнекуль шырака хлынула сьвежае паветра й зусім прылягло й плоскім зрабілася, ледзь-ледзь не пагасла на маленькім кнаце каганца млявае полымя. Пракоп левай рукой згроб назад спацелыя раськіданыя валосы, падняў вочы й спасьцярог у шырака рашчыненых дзьвярох тых двух, пра каторых цэлы час дрэннае згадваў. Спынілася й моцна сьціснула ручку жорнаў Пракопава рука. Ад нечаканасьці такой непажаданай сустрэчы паленам зацьвярдзеў у роце язык.

Тыя доўга стаялі моўчкі. Нейкая нявыразная ўсьмешка блудзіла на Косьцікавым твары.

- Іш ты яго, як расхадзіўся! - кінуў Сабакевіч праз плячо да Лявона.

Ззаду за камуністамі спасьцярог Пракоп яснавалосую Янукову чупрыну. І згадаў, што добрыя людзі, чалавека пры працы сустрэўшы, «Божа памажы» казалі. Гэты-ж Ромкаў гаспадар кінуў тыя іранічныя словы зь яхіднай усьмешкай на вуснах. І ўсьмешачка тая, таму што ледзь заўважная, скрытая, больш колкай здавалася.

- Так, расхадзіўся! Мельніцу сваю на ўсю йванаўскую разагнаў! - голасна падхапіў ззаду Шпунт.

- Здрасьця, таварыш Бахмач! - наўмысна голасна гукнуў Косьцік. - Меліш?

Пракоп падыйшоў да дзьвярэй і спыніўся пару крокаў ад парогу.

- Здароў Косьцік, Лявон. Як маецеся?

- Чуеш? - сказаў Косьцік Лявону, - пытаецца як маемся...

- Ага, хочыць знаць як маемся, - малпаваў Косьціка Лявон.

- Січас я табе ня Косьцік, а Канстанцін Паўлавіч Бурак! Панімаеш?! - адказаў зь няпрыхаванай пагрозай у голасе Сабакевіч.

Пракоп зьбянтэжыўся. Нядобрае прадчуваў. Ці не наважыліся, паўзуны, зь яго пазьдзекавацца?

- Што вам трэба? - спытаў суха.

- Чуіш, таварыш Шпунт? Таварыш Бахмач хочыць ведаць што нам трэба, - яхідная ўхмылка скрывіла Косьцікаў твар.

- Чую, таварыш упылнамочаны, - згадзіўся Лявон, - таварыш Бахмач хочыць ведаць што нам трэба. Ізьвесна...

Пракоп спасьцяроr, што дзяцюкі былі добра выпіўшы. Можа якраз гарэлка штурханула іх на такую кусьлівую гутарку. Прыказка-ж кажа: што ў цьвярозага на розуме, тое ў п'янага на языку. Гэтта-ж важнай была ня так тэма гутаркі, гэтак як адносіны гэтых двух паўзуноў да яго. Разглядалі Пракопа, як нейкую жывёліну ў заапарку.

- Меліш, спрашываю? - падняў Сабакевіч голас.

- Ну што-ж... сам відзіш, ні хаваюся...

- А хто табе разрашыў малоць? - дзёрзка спытаў Косьцік.

- Як гэта? - зь няўцямнасьцю спытаў Пракоп. - Гэта яшчо каго пытацца трэба?

- Ну а чаму-ж не? Ну а каб прышоў, прымерна, мяне спрасіў. Язык табе адсох-бы, ці што?

У Косьцікавых вачох успыхнулі злосныя аганькі, якраз наводля тых, што загарэліся былі тады, як зьлез з кладні ў ягоным гумне ды з нажом на Пракопа кінуўся. Адылі была істотная розьніца. Тады Пракоп сустрэў валацугу як гнеўны гаспадар, цяпер-жа басяк быў носьбітам «народнае ўлады». Ці то ад скразьняку, ці ад страху ўзялі Пракопа дрыжыкі. Голы да пояса, спацелы, мясцамі пакрыты аўсянай мукой, ён зьбянтэжыўся й глядзеў на слуп сонечнага сьвятла, што празь дзірку ў сьцяне дыяганалей перасякаў нутро гумна.

- Гэта што, закон такі? - здабыўся на адвагу Пракоп.

- Як я скажу, так і закон! Панімаіш?

- Га? Во гэтага я ня ведаў...

- Ты чуіш, таварыш Шпунт? Гэтага ён ня ведаў, - сказаў Косьцік.

- Чую, таварышч упылнамочаны, гэтага таварышч Бахмач ня ведаў, - паўтарыў калішні драгомішч.

- От ніблагадарны чалавек! - выбухнуў Косьцік, зірнуўшы перш на Пракопа, пасьля на Лявона й барэшце на Янука. - Прышла народная ўласьць, стала быць... рабоча-крысьціянская, наша собсьцьвінная. Чалавек першы раз у жыцьці свабоду палучыў. Ты панімаіш, таварыш Шпунт? Першы раз у жызьні палучыў чалавек свабоду, паўтараю: сва-бо-ду! Так заместа паблагадарыць тым людзям, каторыя за гэту свабоду, што ён робіць? Спрашываю цябе: што ён робіць? Знаіць-жа

чалавек, што січас пры ўласьці свае людзі, значыцца тыя, каторыя для ягонага блага работаюць. Яму-ж цяпер ужо ня трэба баяцца паноў, асаднікаў, другіх белапольскіх эксплуататараў. Свае-ж людзі пры ўласьці. Панімаеш? - выставіў Косьцік указальны палец на Лявона. - І знаіць-жа чалавек, што цяпер ужо ня трэба аб жызьні забоціцца. Усяго хватаіць. А як чаго нету, дык да каго нужна абраціцца? Га? - спрашываю цябе, - да каго? Ну ясна, да сваей уласьці!

- Верна, - згадзіўся Лявон.

- Слышыш, таварыш Бахмач? Да каго абраціцца нужна?

Пракоп нявыразна нешта буркнуў пад носам.

- Дык ты чаму-ж да нас ні прышоў, чаму нам ні сказаў, што таварышчы, мол так і так, у тым і ў тым у мяне нужда ёсьць, памажыце... Э-гээ, як то так можна? - запаволіў Косьцік тэмпа.

Янук пазіраў на тое тучнае, чырвонае Косьцікава мурло, то на дрыжачага, моцна церпячага ад гэтай зьдзекліва-насьмешлівай гутаркі бацьку. Каб быў дужы, каб мог схапіць і змагчы гэтых двух басякоў...

- Дык уместа таго, штоб ён да нас прышоў, пасаветаваўся й помашчы папрасіў, дык не, мы гэта далжны аб ім забоціцца. Сядзім, значыць і думаем: як гэта наш таварыш Пракоп там пажываіць, ня нужна лі яму чаго-нібудзь... Іш ты, які ніблагадарны! - махаў Сабакевіч Пракопу ля спацелага твару пальцам і прамаўляў тонам, якім дакараюць дзяцей.

- Ніблагадарны, гэ-гэ! - згадзіўся Лявон.

- Ну эта, прымерна, было-б прасьціцельна, есьлі-б гэта ня мой друг так зрабіў. Ато хто-ж гэта так зрабіў? Ды ніхто другой, як мой лучшы друг Пракоп Бахмач, людзі добрыя! Да, он сам! Гэ-гэ! - зьдзекваўся Косьцік.

- Ну да, лепшы друг, - згадзіўся Лявон.

- Да разьве ты ня помніш, таварыш Бахмач, як ты мяне ў сваім гумне прыхінуў, на кладні начлег даў? Як патом цябе белапольская паліцыя цягала, га?

Хвіліна маўчаньня трывала доўга. Недзе над Гараваткай усхадзіліся вароны, у Ліпавічах гудзеў трактар. Па чарзе, быццам моцна пакрыўджаны, Косьцік пазіраў на людзей. Янук глядзеў уніз. Накачваліся сьлёзы. Ужо колькі раз пазіраў на вілы, што ў застаронку стаяі. У выпадку чаго, дык... Страшна падумаць было.

- Ты-ж за мяне,таварыш Бахмач, страдаў. Панімаіш?

- Верна, савяршэнна верна, таварыш упылнамо... - вярзіў Лявон.

- Ну так от. Есьлі ты так пастрадаў за нас, каторыя за савецкую ўласьць бароліся, так зачэм січас ты такі няблагадарны тым людзям, так сказаць, што пры ўласьці, каторыя табе памагчы хочуць? Э-гэ, што-ж гэта такое, спрашываю я вас таварышчы?

Зноў Косьцік у вельмі пакрыўджанага ператварыўся.

- Апяць хачу спрасіць цябе, таварыш Бахмач, чаму ты ў камбед ні запісаўся? Га? Пачаму?

Пракоп маўчаў.

- Спрашываю, ну атвічай-жа! Языка ні маеш, ці што?

- А можа й ні маіць? - усьміхнуўся Лявон.

Косьцік стрэліў ў Лявона дакорлівым позіркам.

- Ну, таварыш Бахмач, скажы чаму ты ў камбед ні запісаўся? Да разьве, есьлі-б ты запісаўся, мукі мала было-б табе? Зачэм-жа тады малоць?

- Я чужога ні хачу, - цьвёрда сказаў Пракоп.

Дзяцюкі цяпер пазіралі адзін на аднаго ды на Пракопа з такой няўцямнасьцю, быццам-бы пачулі, што Літоўцы маюць зараз пад зямлю праваліцца.

- Э-гэ! - сьвіснуў Сабакевіч. - Ты слышыш, таварыш Шпунт? Слышыш, што сказаў?

- Чую, чаму-ж не...

- Ён сказаў, што чужога ня хочыць, пераказваў, быццам вялікую тайну, прыціскаючы й зьдзекваючыся з кажнага слова Сабакевіч.

- Так верна, - згадзіўся Лявон. - Таварышч Бахмач кажыць, што чужога ня хочыць.

- Якое гэта чужое, ты ідзіёт? - раўнуў Косьцік.

Пракоп, цяпер ўжо не на жарты перапалоханы, адступіў крок назад. Косьцік наблізіўся, дыхаў алькагольным гарам у твар. Ён пачаў ціхім, сіпатым зьмяіным голасам, так што ледзь чуваць было. Голас набіраў моцы.

- Сам таварыш Ленін када-то сказаў: граб награбленае! Да! Таварыш Ленін так і сказаў. А ты, дзіравенскі ідзіёт, думаіш, што ты мудрэй Леніна, га? Спрашываю цябе! Ты ня хочаш чужога? Якога гэта чужога? Разьве панскае і асадніцкае то ні наша? Разьве ня мы на іх работалі, разьве ні яны нашым потам жылі, ды ад нас пасьледні кусок

хлеба забіралі? Га? За каго ты таварыша Сталіна й нас шчытаіш, за дурняў? Га?

Косьцік адыйшоўсдя ад парогу варыўні. Ён зрабіў пару кругоў па гумне, пазіраючы коса на Пракопа й іншых.

- Ну а як ты, Янук, думаіш, праўду гавару, ці не? - спытаў Янука.

- Так, - буркнуў ледзь чутна перапалоханы Янук. Даўно спасьцярог, што Косьцік быў азброены й навет пару разоў руку на кабуры трымаў.

- От відзіш, таварышч Бахмач, дажа й сын твой са мной сагласін. Ну што-ж, ідзіёт ты да й толька таво...

Сабакевіч махнуў рукой, плюнуў на бок і спыніўся ў вадчыненых варотах гумна. Залажыўшы рукі назад, доўгі час стаяў нярухома. Лявон спыніўся побач, мяркаваў што будзе далей. Пракоп выйшаў з варыўні, надзеў кашулю. Ён пазіраў на Янука, ня ведаў што рабіць. Маўчаньне трывала доўга. На страсе паднялі вэрхал вераб'і. Кінуўся на некага доктараў Мурзік.

- Пракоп, нясі гарэлку! - адвярнуўся Косцік і гукнуў на Бахмача. - Маць тваю за нагу, так і быць. Хоць ты і ідзіёт, алі-ж разам страдалі, дык і трэба адпразнаваць прыход нашай камунісьцічаскай савецкай власьці... Як ты думаеш, Лявон?

- Верна, нужна адпразнаваць, - падхапіў Шпунт.

Пракоп ня рушыў зь месца. Зьняважаны й перапалоханы, пазіраў то на двух басякоў, то вельмі ўпарта глядзеў на Янука, быццам у яго вачох ратунку шукаў.На таўстых Косьцікавых вуснах пырхала ледзь заўважная ўсьмешка, дрыгаў шрам на лбе.

- Ну дык чаго стаіш, як той на вясельлі? - падняў голас Сабакевіч. - Ці можа за савецкую ўласьць ня хочаш з намі выпіць? Кажу, гарэлкі нясі!

- Німа ў мяне гарэлкі, - ціхаў сказаў Бахмач.

- Што? Гарэлкі німа? От біда вялікая, - ўсьміхнуўся Сабакевіч. - На во грошы, пашлі пацана, ніхай купіць.

Ён падыйшоў да Бахмача і з выцягнутага зь кішэні жмуту банкнотаў адзьдзяліў адзін чырванец і даваў Пракопу. - На, бяры, ні сьцісьняйся. За савецкую ўласьць вып'ем.

Апроч прынагоднай чаркі на якім сямейным, ці рэлігійным сьвяце, Пракоп ніколі ня піў. Жахнуўся думкі, што басякі гэтыя сядуць

за ягоным сталом і, калі непаслухмяны будзе, могуць гарэлкі сілай у рот наліць.

- На, кажу! - налягаў Сабакевіч і сілай упхнуў чырванец у Пракопаву руку.

- Янучок, гэта самае... зьбегай да Кміты, у яго пэўня ёсьціка, - сказаў дрыжачым голасам Пракоп, усьведаміўшы, што выкруціцца яму ня ўдасца.

- Добра, тата, - адказаў хлапец. Ён узяў з бацькавай потнай, зарабленай у аўсяную муку рукі новы банкнот, што надта прыемна ў руцэ шалясьцеў. Не марудзячы, праз двор рушыў на вуліцу. Разгарнуў грошы ды ўважна ім прыглядаўся. На паперцы сядзеў такі самы лысун з прыжмуранымі вочкамі й жулікаватай ухмылкай, як на тым партрэце ў школе. Янук ужо ведаў яго прозьвішча, што рэдка сходзіла з вуснаў савецкіх палітрукоў. Часта гарлапанілі пра яго ў песьнях.

18

Кміта Тодар, пачуўшы каму патрэбна гарэлка, усьміхнуўся.

- А грошы табе ён даў? - спытаў.

Ня ўсьпеў Янук паказаць яму чырванец, як Тодар яго з рук выхапіў.

- Гэта дык здорава, - цмокныў вуснамі ў паперку. - Калі такімі новінькімі раськідаіцца, дык мусіць водзяцца яны ў яго.

Тодар плюнуў на паперку, пацёр яе.

- Абнавіць во трэба. Ну што-ж, за чырванец мусіць літроўку гнаць... Пачакай, я тут зараз...

Тодар зьбегаў уніз у склеп і хутка вярнуўся зь літроўкай. Сівуха была добра закаркована.

- Калі скажа, што дорага, ці што, дык скажы, што гэта за сталічную лепшая, - паднёс свой карэлы ўказальны палец Януку пад нос. - Будзіш помніць?

- Буду, - адказаў хлапец.

- Пачакай, так ні нясі, загарнуць у нешта трэба.

У куце шупляды Тодар знайшоў кавалак газэты й загарнуў пляшку.

- От так лепі будзіць, - сказаў, - толька-ж глядзі, барані Божа, ні пабі.

- Ну от відзіш як скора, умеючы, - сказаў Косьцік Януку, калі той увайшоў у хату.- Нясі, Пракоп, закуску.

Пракоп, бяз слова, выйшаў у сенцы.

- Тодар здачы даў табе? - спытаў Косьцік Янука, што пільна ўзіраўся ў новых начальнікаў.

- Ды ні даў...

- Ні даў? Іш ты яго! Ну да я зь ім рашчытаюся. Ад яўрэяў мусіць навучыўся.

- Казаў, што самагонка ягоная лепшая, чым сталічная, - паясьніў Янук.

- Як, як? Лепшая, чым сталічная? Га-га-га! - зарагатаў на поўне горла Косьцік. - Ты слышыш, Лявон? От і шэльма, крутадух! Га-га-га!

Лявон памагаў Косьціку й два дзяцюкі шчыра й голасна рагаталі, калі Пракоп адчыніў дзьверы. Зірнуўшы няўцямна на няпрошаных начальнікаў, ён маўкліва паставіў на стол мску салёных агуркоў, палажыў акраец хлеба, пайшоў да паліцы і ўзяўся расстаўляць пасуду.

- Прабачце, дзяцюкі, - сказаў сьціпла, - нічога ў мяне скаромнага німа, от агурок, ды хлеб...

- Да чаго ты бядуіш? - падыйшоў да гаспадара Косьцік і са штучнай добразычлівасьцю так шлёпнуў Бахмача па плячы, што той аж пахіснуўся. - Садзіся во, - узяў Пракопа за руку й сілай пасадзіў на краю стала. - Ты чуў, што Тодар твайму пацану сказаў, га? От шэльма, кажа, што яго самагонка за сталічную лепшая. Га-га-га! Чуў такое, таварыш Бахмач?

Пракоп нічога не адказаў, пазіраў на дзяцюкоў коса, быццам на зьвяроў, асьцерагаючыся, каб ня ўкусілі.

- Ну дык ты, Лявон, чаго марудзіш? Адпячатывай! - загадаў Сабакевіч.

Лявона ня трэба спанукаць было. Рухам спрактыкаванага п'яніцы, ён хапіў пляшку й хлёстка стукнуў па левай далані. Корак выскачыў на стол, а Лявон пачаў напаўняць чаркі. Ён наліў амаль палову першае, затрымаўся й спытаў Пракопа:

- Ты, таварыш Бахмач, чаму гэтыя напарсткі нам падаў? Гуляць зь імі, ці што? Стаканаў у цябе нету?

Пракоп прынёс з паліцы й паставіў на стале дзьве шклянкі.

- Гэта чаму два? - спытаў Косьцік.

- Ды я-ж, самі знаіця, ня п'ю, - зьбянтэжыўся Пракоп.

- Ні прытварайся! - груба сказаў Косьцік. - Ты што, за савецкую ўласьць, за здароўе таварыша Сталіна ня вып'еш?

Апраўдвацца было небясьпечна. Пракоп зрабіў яшчэ адно падарожжа да паліцы й паставіў на стале трэцюю шклянку. Лявон узяўся наліваць з асалодай. Носам уцягваў самагонны пах.

- Прыгару ні чуваць, - сказаў. - Мусіць Тодар ужо добра руку набіў.

Лявон пачаў ад Косьцікавай шклянкі. Зірнуўшы на сябру, Сабакевіч кіўнуў галавой.

- Ты што гэта, традыцыі ні знаіш? Гаспадару трэба першаму наліваць.

Нічога не адказаўшы, Лявон нагнуў пляшку. Самагонка прыемна булькала. Наліўшы палову шклянкі, Лявон пазіраў на Косьціка.

- Лі, лі поўную, - усьміхнуўся той. - Таварышч Бахмач за таварышча Сталіна поўную вып'іць. Праўда, Пракоп?

Нахабна вымаўленае «Пракоп» асабліва ўкалола Бахмача. Быццам хацеў сказаць «бязьмен ты». Была гэтта й зьнявага, і зьдзек. Таўстыя вусны ўсьміхаліся, шэрыя вочы пагражалі. Асноўным аб'ектам Пракопавага зацікаўленьня, што поўніла яго вялікай трывогай, была шклянка Кмітавай самагонкі, каторую зухавата налівала Лявонава рука. Вось яна, чысьцюсенькая-поўненькая, стаяла на ягоным, Пракопавым стале й на паядынак выклікала. А Лявон ўжо напоўніў Косьцікаву й падганяў сваю. Разьліў больш паловы пляшкі.

Косьцікава вялікая правая далонь, белая й гладкая, што мусіць ужо ад ніткі й іголкі адвыкла, спакойна адпачывала ля поўнай шклянкі на стале. Золатам зьзяў на пальцы вялікі сыгнэт з прыгожым чырвоным камянём і літарай «К» ан ім. Якраз у гэну хвіліну Сабакевіч зірнуў на свой ручны залаты гадзіньнік. Спасьцярогшы ўсё гэта, у вадным кірунку павандравалі Пракопавы думкі. Калішні сабакарэз сядзеў цяпер гаспадаром у яго хаце. На руках - чужое золата, у кабуры - пераканальны довад сілы «народнай улады». Гэта той самы шэльма, што некалі пачаў сваю дарогу «ў людзі» кражай настаўнічынага гадзіньніка ў пачатковай школе. Хто тады мог прадбачыць, што з таго шчанюка-злодзея вырасьце? Плён дасьпеў, спажывайце, людзі добрыя...

Дзяцюкі ўсталі. Неахвотна, паволі падняўся Пракоп.

- Дык от, таварышчы, - урачыста пачаў Косьцік, высака, перад самым носам трымаюччы шклянку, - вып'ем усе да дна. Паўтараю: да дна!

Зірнуў упарта на Пракопа й прадаўжаў: - За наша асвабаждзенія ад белапанскага іга, за нашу народную, савецкую ўласьць, за нашу доблісную Красную Армію, што нас асвабадзіла, да і за нашага важдзя, атца ўсіх народаў, вялікага й мудрага таварышча Сталіна! Да здраствуіць!

- Да здраствуіць! - падтрымаў Лявон.

Косьцік і Лявон пачалі піць зь вялікай насалодай. Спасьцярогшы, што Пракоп ледзь вусны памачыў, Сабакевіч перасьцярог: - Пракоп, за таварышча Сталіна п'ем, стала быць да дна далжон!

Пракопава нутро пратэставала супраць пякучай, смуроднай, гаркой вадкасьці. На сілу пару кропляў адпіў. Косьцік зноў зьвярнуўся да яго: - Кажу табе яшчо раз, таварыш Бахмач, гэта другі раз прадупрэждаю, што за таварышча Сталіна абізацільна нужна піць да самага дна. Панімаіш? А трэці раз прадупраждаць ня буду.

Перамогшы агіду, Пракоп нагнуў шклянку. Сочачы дзяцюкоў адпіў пару глыткоў, ды шклянку трымаў пры вуснах. Відаць, пераканаўшыся, што Бахмач узяўся піць, Косьцік скончыў сваю разам зь Лявонам. Праз плечы камуністы шпурнулі шклянкі ў качарэжнік. Адпіўшы мо трэцюю часьць, Пракоп затрымаўся. Мігам зар'ентаваўшыся, ён кінуў сваю шклянку праз плячо. Шкло пырснула на глінянай падлозе. Зьбянтэжаны Янук устаў з лавы.

- Так і трэба! - гукнуў Косьцік. - З каторага стакана пілі за таварышча Сталіна, з таго ніхто болі ні далжон піць. Маладцы, га-га!

Усе селі. Прыйшло нязручнае маўчаньне, каторае зноў спыніў Косьцік.

- Эта самае, - пачаў ён паволі, бяручы відэльцам з талеркі кіслы гурок, - мне здаецца, што таварышч Бахмач ня выпіў да дна... Верна, таварышч Шпунт?

- Да, верна, ня выпіў, - згадзіўся папугай.

- І многа ня выпіў? - прыжмурыўшы хітра вочы й кусаючы гурок, пільна ўглядаўся ў Пракопа Ромкаў гаспадар.

- Оо так мусіць з палавіну, ці болі, - мяркаваў Шпунт.

- Болі як палавіну? - намагаўся дзівіцца Косьцік. - Верна, Пракоп?

Бахмач маўчаў.

- Я цябе спрашываю, Пракоп, верна ілі нет, што ты палавіну ці болі ня выпіў?

Голас быў цьвёрды, рэзкі.

- Я-ж вам казаў, што што ніколі ня п'ю, - ледзь чутна, з трывогай адказаў Пракоп.

- Я цябе ні спрашываў, ці ты п'еш ілі нет, - сказаў Косьцік. - Ці ты ні знаў гэтага, што калі п'еш за здароўе якога дарагога чалавека, дык трэба да дна выпіць, так як рускія робяць? Што дажа тыя, каторыя нікада ня п'юць, прыдзержываюцца гэтага? Га?

- Я-ж гэта самае... чуў, - прызнаўся Пракоп.

- Ну так от, галубчык... ты, стала быць, прызнаўся, што за нашага важдзя таварышча Сталіна ні хацеў выпіць. Верна?

Ці яго хапіў скразьняк у варыўні, ці ад перапалоху пачалі браць Пракопа дрыжыкі. Холадна стала. Той глыток самагонкі замуціў галаву. Пытаўся сам сябе Пракоп, ці ня лепш было-б, змагаючы агіду, выпіць поўную шклянку. Абы не чапіліся, каб хутчэй іхныя нячыстыя ногі зь яго хаты панясло. Дзяцюкі, злосна пазіраючы на яго, кусалі хлеб і жвалі гуркі.

- Верна? - насядаў Косьцік.

- Косьцік, ні чапіся ты да мяне. Відзіш, што я слабы й ні магу, - сказаў Пракоп дрыжачым голасам. Думаў, што такім зваротам знойдзе нейкі мост да сумленьня басяка. Не магло-ж быць, каб ня меў ён ніякага сумленьня. Калі была ў яго навет маленькая макулінка яго, дык льга было дарогу шукаць.

- Ты гэта што косьцікаіш? Які я табе Косьцік? Ні казаў я табе раней як абрашчацца? - выбухнуў Ромкаў уласьнік.

Пракоп схіліў галаву. Глядзеў на шрам на стале, які дзеці некалі ножам зрабілі. Шрам бег з кута наўскос на якога паўмэтра даўжыні. Пры канцы яго была выкалупана ўпадзінка. Якраз гэна месца, цямнейшае за навакольную гладзь, пачало мігацець у вачох.

- Я цябе навучу! - сіпеў Косьцік збоку.

Адылі Пракоп чуў і ня чуў яго. Было гэта быццам рэха нейкай недарэчнай зьявы, што на ягонай лаве расьселася. Ды зьява-ж гэта, - ня можа-ж быць! - скора вось прападзе й зусім добры й жыцьцядайны супакой запануе ў Пракопавай хаце. Бахмач падняў галаву й вярнуўся ў рэальны сьвет. Зірнуў на Янука на лаве. Хлапец спасьцярог у

бацькавых вачох нешта недарэчна-бездапаможнае. Ці мо было гэта ад таго, што бацька ніколі гарэлкі ў вусны ня браў, а цяперака Кмітавай «лепшай чым сталічнай» пад пагрозай мусіў сербануць, ці таму, што ніяк выхаду з пасткі ня мог знайсьці.

- Штрафнога яму! - запрапанаваў Лявон.

- От малайчына, друг Лявон! - шлёпнуў Косьцік таварыша па плячы. - Люблю цябе за ум твой тонкі й пачціцільную, так сказаць, фізіяномію. Штрафнога, кажаш?

- Ну да, штрафнога. За таварышча Сталіна ня выпіў, так палагаіцца! - паправіў падбадзёраны Сабакевічам Ляцвон.

- Так і быць, штрафнога! - урачыста згадзіўся Сабакевіч і стукнуў даланёй па стале так, што аж посуд задрыжэў і недзе за вакном закудахтала зь перапалоху курыца. Лявон прынёс з паліцы шклянкі й адну зь іх набухтырыў самагонкай. Дзяцюкі аціхлі й пазіралі на Бахмача. У позірках загнязьдзілася ўпартая нянавісьць. Указальным пальцам Косьцік пачаў раўнамерна стукаць па стале. Стук паступова ўзмацняўся й моцна трывожыў Пракопа. Цяжка было вытрымаць зухавата-выклікаючы Косьцікаў позірк і Бахмач зусім зьбянтэжыўся. Зірнуў на Янука, што аж падняўся з лавы, разумеючы напружаньне.

На вуліцы пачуліся мужчынскія галасы.

- Ну, за таварышча Сталіна! - загадаў Косьцік.

Голас роўны й пагрозьлівы, а палец прадаўжаў барабаніць па стале, прысьпяшаючы тэмпа. Пракоп пазіраў на гэты палец, то на цэлую, аброслую валосьсем Косьцікаву руку, на зьзяючы сыгнэт на пальцы. Стук адбіваўся ў Пракопавых грудзёх балючым рэхам.

- Устань! - гаркнуў Косьцік. - За таварышча Сталіна да самага дна!

У Пракопавых вачох мільгануў абрыс кабуры Косьцікавага пісталету. Жартаваць, басяк, ня мог. Чаго добрага, застрэліць. Паволі падняўся Пракоп. Правай рукой узяў шклянку, але дрыжэла млосная рука, абліваў яго сьцюдзёны пот. На паўдарозе рука спынілася ды паставіла самагонку на стол і лягла побач. Тая самая рука, што давала раду цяжкім і шурпатым прыладам сялянскай працы, цяпер бездапаможна адпачывала пры шклянцы Кмітавай «лепшай, чым сталічнай».

- Госпадзі, зьмілуйся, - пачаў дрыготкі Пракопаў голас, а вочы празь сьлёзы маліліся да абразоў напокуці.

- Ты гэта што? - раўнуў, ускочыўшы з лавы Косьцік, - які такі табе Госпадзі? За Сталіна піць кажу.

Рэха Сабакебічавага голасу скаланула Пракопавай хатай, але гаспадар не зварухнуўся, ён прыліп зрокам да абразоў.

- Сьвятая Апрасіньня Полацкая, Дарагая і Справядлівая, заступіся і памілуй! - дрыжэў, насычаны жальбой Пракопаў голас.

Нешта ненатуральнае было ў гэных трох, застылых пры стале фігурах: сонцам асьветлены, спацелы Пракопаў твар, вочы сьлязьмі наплыўшыя, дрыжачыя вусны, дурнаватая Лявонава фізіяномія й дыхаючы агнём ненавісьці, во-во гатовы рынуцца на чалавека Сабакевіч.

Спыніў дыцханьне Янук. Зараз іскра ўспыхне.

- Я табе, іці тваю маць, пакажу тваю Прасіньню! - выбухнуў Сабакевіч. Маланкавым рухам схапіў напоўненую Пракопаву шклянку й ёмка пусьціў у кут. Гучна пасыпалася з рамак шкло й самагонка пырснула навокал. Ён трапіў у цэнтр абраза Прадславы.

- Во табе, твая Прасіньня, ідзіёт ты! - раўнуў п'яны Сабакевіч. - Ты, стала быць, за таварышча Сталіна піць ня хочаш! Я-ж цябе січас...

Ён замахнуўся, каб даць Пракопу аплявуху, але Лявон зручна схапіў яго за руку.

- Пірастань, Кастусь, мерку знай!

Адчыніліся дзьверы. Увайшоў Алесь, а за ім Антось Дзяркач. Перазь іхныя плечы пазірала Кмітава Аўдоля. Спыніліся ля парогу.

- Што гэта такое тут робіцца? - спытаў Алесь.

Зрок ягоны спыніўся на камуністах, пасьля на швагры, а найдаўжэй на пабітым абразе напокуці.

- Ээ-гэ! А хто-ж гэта ў нас такі ўдалы майстра, што так пекна абразы наўчыўся біць?

Аблакаціўшыся на стол, Пракоп ашчаперыў з двух бакоў галаву, закрыў далонямі твар. Адно дрыжэлі яго худыя плечы. Лявон і Косьцік цяпер расьселіся на лаве, задам да стала й моўчкі прыглядаліся прыбыўшым.

- А ягодка-ж мая! - ахнула Аўдоля, - абразы пабіў! А каторы-ж гэта?

- Часта мы спатыкаемся сягоньніка, - усьміхнуўся да двух камуністаў Антось. - Гэта-ж, як той казаў, самі-ж пэўня ні так сабе ходзіце?

- А табе што? У тваю хату прыйшлі, ці цябе маем пытацца? - агрызнуўся Шпунт. - А табе, баба, што трэба? - гаркнуў ён да Аўдолі.

- Ну як табе сказаць? - паволі пачаў Антось, - Начальства, гэта самае, я думаў, надта й надта занятае, новае жыцьцё, казаў той, строіць... ну дык гэтта й прыйшло ў галаву, што пэўня-ж ні так сабе, бізь якой-небудзь патрэбы от ходзіце... Алі-ж і трапіў, шэльма, у самую сярэдзіну абраза. Каторы гэта з вас такі варашылаўскі стралок?

- Надта-ж ты, Лявон, расхадзіўся, што й старых ні шануіш. Што я табе, сука якая? - прабірала Шпунта Аўдоля.

Алесь зірнуў на Янука, што памкнуўся нешта сказаць.

- Ты, Янучок, маўчы, - сказаў Алесь пляменьніку. - Ніхай той зухаваты сам прызнаіцца. Гэта-ж і стралок зь яго мусіць нісамавіты, ці-ж жарцікі ў самую сярэдзіну папасьці! Алі-ж гарэлачка-самагоначка мусіць тутака вінаватая...

- Ты, Алесь, лепі прыкусі язык. І ты, Антось, - пагрозьліва сказаў Сабакевіч, - ане, то...

- То што? - спытаў Антось.

- Пазнаіш што, - памог Косьціку Лявон. - А ты, Аўдоля, лепі ішлаб дамоў, ні тваё тут дзела.

- Вы гэта што, пагражаіце? - спытаў Алесь.

- Як хочаш думай, - адказаў Косьцік. - Ні табе мішацца ў чужое, дзе начальства цяне ня просіць.

- Якое гэта чужое? - заступіўся за Алеся Антось. - Ці гэта ні швагра ягоны пры стале сядзіць? Ці гэта можа Пракоп вас у госьці папрасіў, ды для вашай пацехі свой абраз пабіў?

- Ты, Антось, знаіш што, надта ня рыпайся! Я цябе яшчо вазьму ў вабарот за тое, што лозунг спэцкаў, - устаў з лавы Лявон.

- Ты гэта што, мяне за руку злавіў? - адсек Антось. - Знаіш, Шпунт, тую прыказку: ні страш бабу...

Зірнуўшы на Аўдолю й Янука, Антось ня скончыў прыказкі.

- Ну мы яшчо паглядзім! - пагражаў Лявон.

- Дык каторы з вас такі спэц, што так ёмка па абразе даў? - насядаў Антось.

- Пытайся ў іх, калі хочаш, - паказаў Косьцік, устаючы, на Бахмачоў. - І я вам пасаветаваў-бы болі інцірасавацца сваімі дзіламі, а мені нашымі. Так здаравей будзіць для ўсіх. Давай пайдзем, Лявон.

Косьцік накіраваўся да дзьвярэй.

- А я з табой яшчо буду гаварыць, - сказаў Лявон Антосю на адыходзе.

Камуністы стукнулі дзьвярмі і ўжо зь сяней пачуліся моцныя маты. Антось і Алесь пэўны час ненаважана стаялі. Алесь наблізіўся да Пракопа, палажыў яму руку на плячо.

- Пракопка, што гэтыя гіцлі гэтта нарабілі?

Пракоп памалу працёр далонямі вочы, зьбянтэжана зірнуў на швагру, пасьля на Аўдолю.

- Ат, - махнуў рукою, - можа лепі прамаўчаць...

Антось і Алесь хутка зар'ентаваліся ў чым справа. Раскажы што перад гэтай пахатухай, дык уся вёска заўтра ведаць будзе.

- Ну што ты, дзядзька Пракоп, - голасна сказаў Антось, - а што тут утойваць? Ніхай ведаюць людзо.

Настала нязручнае маўчаньне. Янук пазіраў у вакно, пасьля адвярнуўся.

- Паехалі, - паведаміў.

Аўдоля прысела каля хлопца на лаве й лісьліва зазірнула яму ў вочы.

- Хто-ж гэта абраз пабіў, Янучок? - спытала.

- Сабакевіч, хто-ж яшчо, - адказаў злосны хлапец.

- А ягодка-ж мая, Сабакевіч, кажаш! - ахнула Аўдоля. - А навошта-ж яму абраз? Ён у яго есьці прасіў, ці якой трасцы?

- Гэта-ж тату сілай напаіць хацелі, а калі ён ня мог выпіць, дык як схопіць Косьцік поўную шклянку самагонкі, ды як чарахніць па абразе?

- От каб яго зімля ні насіла, галадранца кусок! - плюнуў Алесь.

- А ягодка мая, гэта-ж ці так можна па абразе? Як яму ня грэх? - дзівілася Аўдоля.

- Які там грэх... басяк-жа ў Бога ня верыць, - спасьцярог Антось.

- Алі-ж чаму гэта па абразе? - дамагалася Аўдоля. - Што гэта было тутака, Пракоп?

Бахмач маўчаў. Ён дрыжэў пры стале, мусіць ня могучы вярнуць раўнавагі.

- Тата маліўся да Прадславы Апрасіньні, ня мог гарэлкі зь імі піць, от што, - тлумачыў Янук.

- Дык што-ж, маліцца няможна? - заўважыў Алесь. - А чаму яны яго змушалі, за што гарэлку пілі?

- За таварышча Сталіна й асвабаждзеньня, во за што... І Лявон ды Косьцік пагражалі тату, што за таварышча Сталіна й за асвабаждзеньня трэба піць да самюсенькага дна, а калі ён ня вып'іць, дык яны яму нешта пакажуць. Ну й паказалі, - выказаў адным дыхам Янук.

- А ягодка-ж мая, нявіданае-няслыханае, - охкала Аўдоля. - А дзе-ж гэта яны самагонку бралі, сынок?

- Ды ў вашага-ж купілі, - адказаў Янук, - мяне пасылалі.

- У Тодара? - зьдзівілася Аўдоля.

- А ў каго-ж, - адказаў Янук.

- І колькі-ж ён узяў зь іх? - узрастала Аўдоліна цікавасьць.

- Цэлы чырванец.

- Ты, хлапец, мусіць брэшаш. Быць гэтага ня можыць! - запратэставала пахатуха.

- Цётка Аўдоля, што гэта гавораце? Я вам сабака, ці што? - дзёрзка адказаў Янук.

- Ну я-ж яму пакажу, я-ж яму вушы абарву! - усхадзілася жанчына. - А казаў-жа, што німа. Ды яшчо самагонку прадаець, каб абразы біў гэты...

Яна спыніла кленічы, каб лішняга не сказаць, разглядалася навокал, быццам спагады шукаючы. Раптам крутнулася й выходзячы моцна стукнула дзьвярмі.

- От-жа й баба, - ціха сказаў Антось. - І ўдаець нібыта ні знаіць, што Тодар самагонку гоніць і прадаець. Сука! Як гэта ей ня стыдна!

- Дзе ў яе той стыд, - спасьцярог Алесь. - Глядзі, унь ўжо пэўня ў Піліпіхі пра гэта ўсё барабаніць. Скора цэлая вёска знаць будзіць. І які чорт яе сюды прыгнаў?

- А ніхай усе знаюць. Чаго хаваць? - сказаў Антось. - Дай во гэтай нечысьці дарогу...

- Эх, Антось, ты Антось, - пачаў Алесь, - здаецца й вялікі й разумны ты, а як малы гаворыш. Ну ніхай цэлая вёска знаіць, ніхай і дзесяць вёсак знаіць, дык што ім, басякам, дарогу хто загародзіць? Ня відзіш, што робіцца? Басота да карыта дабралася. Іх права, іх сіла, робяць што хочуць, от як...

- Праўду ты, Алесь, кажаш, - памаўчаўшы адказаў Антось, - басота сілу цяперака маіць. Дзяржыціся, людзі добрыя!

Мужчыны прыселі ля стала й пачалі пытацца гаспадара пра гэну дзіўную візыту. Янук доўга стаяў, пазіраў на старэйшых. Да вушэй

даляталі беразборлівыя гукі. У вачох стаяла постаць дрыжачага, прыбітага, некалі ўстойлівага бацькі.

Пачалі дрыжэць вусны, нешта моцна ціснула сьлёзы з вачэй. Ня памятаў калі выбег з хаты, мінуў гумно. Азірнуўся за Тапсікам і моцна забалела ў грудзёх. Ужо прытуліўшыся да магутных плячэй Архіпа, даў волю сьлёзам. Лёгкія дрыжыкі юнацкіх плячэй сунімаліся на стыку з камлём Архіпа. Запаволіліся сьлёзы й моцна, да болю сьціснуліся кулакі.

Як праз туман, нейкая дзіўная, у гэтым сьвятле ніколі раней нябачаная, распрасьцерлася ў начоўках вёска Літоўцы. Новая вёска, з новым затоеным дыханьнем, няпэўым поступам у таямнічае заўтра.

19

Барабаншчына па падрыхтоўцы да выбараў «дзіпутатаў у народны сход», што меўся ў Беластоку адбыцца, трымала ў бесьперапынным мліве языкі партыйных палітрукоў на працягу даўгіх васеньніх вечароў.

- Самі дадіте кандідатов, самі і ізберать будете, - пяліўся Маршалкаў у суправодзе Косьціка, Лявона й Пятуха.

- Оні, значітся эті ваші лучшіе сыновья і дочері, отождествлят ваше многолетнее стремленіе к прісоединенію к родіне нашей, могушчественному Советскому Союзу... Вы воплотітесь в одно тело с нашей родіной і станет ваша мать родная на зашчіте вашіх інтересов, а тогда...

Ад «тогда» пачыналася пералічваньне «благаў», што вось гэтта за парогам чакалі. Варта адно дзьверы адчыніць, як тыя «блага» у хату хлынуць. Піпку пакурваць і ў столь пляваць будзеце, а «айцец народаў» лепш чымся сам Архангел Стораж вас забясьпечыць.

Маршалкавы вочы мутнелі, твар пакрываўся аўрэоляй сьвятасьці, калі згадваў як цяжка было раней і які рай павінен настаць. Жанчыны пускалі сьлёзы, у куты хусьцінак чмыхалі. Неяк аднойчы падачас пералічваньня тых «благаў», што скора ў Літоўцы быццам меліся прычыкільгаць, ня вытрымаў Антось Дзяркач.

- Гэты куды гладзей за дубовіцкага абуха брэшыць.

Сыкнулі збоку на Антося жанчыны. Дзяцюк агледзеўся й пашкадаваў, што так неасьцярожна выказаўся. Многа хто ледзь рогат стрымаў.

Калі-ж Маршалкаў гаварыў пра «лучшіх сыновей і дочерей» дык ня цямілі людзі пра каго была мова.

- У вас замечательныя люді есть, коммуністы й беспартійные, - паясьняў савецкі камісар.

Цэлы цымус - і пра гэта неўзабаве літоўскія даведаліся - палягаў у тым, што пануючая камуністычная партыя й народ рознымі меркамі «замечательных людей» бралі. Дык немалое было зьдзіўленьне, калі на адны, перадвыбарным вечары Сымон Пятух на гэны «народны сход» кандыдатамі Косьціка й Лявона паставіў. Многа каторыя на залі вушам сваім ня верылі ды ніхто супярэчыць не асьмеліўся. Трэба-ж было ўсяго двух кандыдатаў і вось сам каравы Сымон, пэўне-ж па загаду зьверху, «лучшіх сыновей» высунуў. Зірнулі людзі на Пракопа Бахмача, што ў куце маўкліва побач Алеся сядзеў. Пра тое як Косьцік зь Лявонам яму абраз пабілі й пабандыцку напаіць намагаліся, вестка шырака па людзях пайшла.

Напярэдадні выбараў Лявон Шпунт пры помачы Аксені, ейнага Арсеня, малодшага Пятуха й пад наглядама самога «упылнамочанага сельсавету», а цяпер кандыдата Косьціка Сабакевіча, «выбарчы ўчастак» падрыхтаваць узяўся. Як доўга жылі-былі Літоўцы, нічога падобнага людзі ня бачылі. Ці-ж жарцікі, сама, казаў той, гісторыя ў вёску прывандравала. Мужыцкі разьняволены народ сваіх «лучшіх сыновей» у «народны сход» выбіраць будзе. Гэткім тонам, ужо добра падвыпіўшы, гаманіў рыжавусаму Захаруку Косьцік Сабакевіч. Аж рос на вачох адзін з тых «сынавей», калі на пярэдняй сьцяне Пятуховай хаты зьявіўся ўжо зусім добра ведамы ледзянавокі твар, а пад ім вялікімі літарамі лёзунг: «Спасібо товарішчу Сталіну за Осцобожденіе». Гэтта-ж зьнізу, меншыя за той верхні, прыліплі да сьцяны партрэты Лявона й Косьціка.

- Да, гэта гістарычэская ўрэмя... сам народ сваіх будзіць ізьбіраць... Гістрычэская ўрэ...

Косьцік перастаў даводзіць Захаруку пра важнасьць падзеі й сачыў як Лявон жардзіну намагаўся паставіць.

- Даёш, паможам!

У выкапаную раней малодшым Пятухом яму ля весьніц паставілі вертыкальна спорную бярозавую жардзіну, увышкі так мэтраў зь пятнаццаць. На версе яе чырвоны сьцяг з залатым серпам і молатам распасьцёрся на на лёгкім ветры.

- От, да й здраствуіць!

Лявон горда зірнуў на сьцяг, пасьля на сьцяну, дзе ягоны партрэт унізе прыліп да «атца народаў».

- Цяпер свой свабодны народ і свая ўласьць!

Шпунт рабіў такі выгляд, быццам адно яго намаганьнямі «свая ўласьць» у вёску прыйшла. Ніхто, вядома-ж, ня зьбіраўся яму пярэчыць. Як-ніяк, важнасьць Лявона й Косьціка вырасла ў сялянскіх вачох.

Ноччу сьцебануў спорны дождж і надта-ж доўга гістарычная раніца не асьмельвалася заглянуць поўным сьвятлом у вокны літоўскіх хат. Зяблы ветрык разганяў па начоўках дымы з рана закурыўшых комінаў. Выпялілася ўрэшце з-за балота млявае сонца. Падгнілай атавай і прэлым лісьцем з аселіц цягнула.

Першым на «выбарчы ўчастак» зьявіўся Лявон Шпунт. Кагадзе загадала яму «камунісьцічаская парція» каб ён, як кандыдат, не перашкаджаў працэсу галасаваньня, адно за парадкам сачыў. Кінуўшы вокам на гэты агульны парадак на зябкім Пятуховым дварэ, зморшчыўся Лявон. Цяўкнуў ля будкі сабака й скрыпнулі ў хаце дзьверы. Уладзімер, малодшы Сымонаў брат, ступіў на вялізны камень ля дзьвярэй.

- Здароў, Лявон! - прывітаўся голасна.

- Здароў, Уладзімер! - даказаў кандыдат.

- Алі-ж і здорава вас, начальнікаў, сягоньніка ночы дождж адпсяюрыў. Ну паглядзі во, ха-ха-ха! - разрагатаўся Пятух. Быў гэта крэпкі, вясёлы з твару, рухавы мужчына. - Сталіну дык добра-ткі нюню скрывіў, а вы, жабоцькі. дык саўсім па сьцяне распаўзьліся. Ха-ха-ха!

Лявон ня ведаў, што сказаць. Брала злосьць за гэны гулкі сьмех на Ўладзімера, а найбольш дык хіба-ж на самога Бога. Чаму ён з дажджом не пачакаў?

Зьверху на сьцяне ледзь ліпеў скрыўлены пасінелы Джугашвілі, а зьнізу пад лёзунгам - як той Уладзімер казаў - распаўзьліся жабоцькі. Партрэты кандыдатаў сталіся непазнавальнымі. Лявон падыйшоў да сьцяны, згроб рэшткі «кандыдатаў» і выкінуў за плот.

- Цьфу, такую тваю маць! Якраз як і тады, каля школы нейкі брыда, Дзіркач мусіць напэцкаў. А цяперака дык сам бацька нябесны, такую яго... Ніяк ні вязець!

- Сталіна таксама ськініш? - пытаўся Ўладзімер.

- Мусіць не, - вагаўся Лявон. - Папраўдзе сказаўшы, дык чорт яго знаіць... бізь яго-ж німа як...

- Га-га-га! - паехаў рогатам Уладзімер, - маладзец зь цябе камуніст, з гэткімі Сталін далёка заедзіць. Чорт яго знаіць, кажыць, бізь яго німа як... га-га-га!

Лявон то чырванеў, то бялеў. Азірнуўся навокал ды ўсьцешыўся, што адно Пятуховы вушы сказанае чулі. Трэба сабе на лбе запісаць, што язык на прывязі трымаць. Вось каб дзе так пры людзёх сказаў...

- Пасінелы партрэт «бацькі народаў» Лявон пакінуў на сьцяне. Каму трэба той, той разьбярэцца ў чым справа.

Прыехалі дзьве грузавыя машыны зь Ліпавічаў. Вылезла шэсьць «байцоў» і сам Маршалкаў. Ён прывітаўся кароткім «здрасьця». - Всё готово? - спытаў.

- Да, таварыш камісар.

- Давай аднаго ці двух чалавек, - сказаў Маршалкаў Лявону, - няхай паедуць па тых, што самі прыйсьці ня могуць.

Прыйшла Піліпава Аксеня з сынам. Лявон папрасаіў яе ў «балаціравачную камісію». Жанчына не магла разгадаць новага слова, што на Лявонавых вуснах нарадзілася. Ці была гэтта што ад балота? І пры чым тут балота? Такой кемлівай і ганарлівай, ёй-жа пытацца сорамна было.

- А што-ж я, Лёнька, у тэй блаціровачнай камісіі рабіць буду?

- Га? Ды што-ж... сядзець і балоты лічыць будзіш, во... Дасі, значыцца, чалавеку, каторы прыдзіць, балот, каб ён яго ў скрынку ўкінуў. А каторы ня кініць, дык значыцца пойдзіць за той стол завешаны дываном, ён тады ні галасуіць за сваіх лепшых сыноў камуністаў і біспарційных, дык такога мы на вока возьмім. От...

«Балоты» цяпер сталіся яшчэ большай загадкай, але спанатрыла Аксеня, што не ад Лявона ёй нейкага клёку дабіцца. Пабачыўшы Маршалкава, павесялела жанчына. Не атрымалі-ж яшчэ ад «бацькі народаў» адказу наконт падаркаў. Аксеніны сяброўкі ей галаву ўжо прадзяўблі. І карціла-ж шаўцовай жонцы хутчэй стацца тэй жанчынай, «прымеру каторай пасьледуюць жэншчыны ўсей рэспублікі».

Аксеня наблізілася да камісара, усьміхнулася. Спадзявалася, што бальшавік ледзь не ў абдымкі яе возьме. Колькі разоў бачыў яе навечарох, навет у «красным угалку», што для мясцовай агітацыі й пашырэньня «палітграматы» зрабілі. Гэтта сталася дзіва дзіўнае. Маршалкаў зірнуў нейкімі мутнымі (ці не ад учарашняй п'янкі) вачмі й навет ня прывітаўся. Засеў у горле камяк і ледзь сама чула свой няроўны голас.

- Таварыш камісар, атвет з Масквы прышоў, ці не?

- Ах, Аксіня Іванаўна, - затросься палітрук, - ды нажаль яшчэ не, але днямі напэўна ўжо будзе.

Тон і манера выразна паказалі, як няпрыемным было для Маршалкава Аксеніна пытаньне. Яна адыйшла набок, сачыла як жаўнеры выцягнулі патэфон, прымасьцілі яго на стале ля сьцяны. «Казіныя ножкі» засмуродзілі сьвежае раньняе паветра. Жаўнер з васпаватым тварам з набажэнствам адчыніў скрыню - тое бальшавіцкае цуда, мэханізму якога ніяк не маглі зразумець малаадукаваныя дзядзькі. Зьмяніў спачатку голку, пасьля доўга ручкай круціў. На шпянёк пасярэдзіне нацэліў дзірку ў кружэлцы, пасунуў кружэлку ўніз і карэлым рудым ад табакі пальцам крануў круг. Апусьціў на кружэлку каціную галоўку з голкай. Спачатку надта трашчэла й шумела, а пасьля сіпаты голас аб'явіў «гэч тавагыша Іёсіпа Вісагыёнавіча Сталіна».

Манатонна-хрыплаваты голас гучэў недзе ў вялікім будынку, бо адбівалася гулкае рэха й часта спыняла яго бура воплескаў. А пры воплесках гэных падскаквала, здавалася, з захапленьня голка.

- Як то так рукі ім ні забаляць, ягодка мая?

Аўдоля, відаць, напякла ўжо аладкаў, накарміла сям'ю й побач Аксені цяпер стаяла.

- Нешта-ж нівясёлая ты сягоньніка, ягодка, - прадаўжала пахатуха. - Чаму гэта?

- Ат, ні пытайся, - адмахнулася Аксеня рукой.

- Скажы, калі ні сакрэт, - налягала Кміціха.

- Які там чорта сакрэт... сама знаіш... паслалі во палатно, а фігу за яго...

Аксенін дакорлівы голас дрыжэў ноткай крыўды.

- Папытайся во яго, - паказала Аўдоля вачмі камісара.

- Пыталася.

- Калі?

- Во цяперака.

- І што-ж ён, ягодка, сказаў?

- Тое самае «к сажаленію ні палучылі». От як...

- Ну а ні казаў чаму?

- А што-ж ты за язык яго пацягніш?

- Трэба, ягодка мая, будзіць з другімі бабамі пагаварыць, што рабіць далей, от як...

- Ніхай сабе. Толька-ж у галаве маей ня месьціцца, чаму гэта другія бабы клююць мяне, як усіроўна тоя палатно я сабе забрала ці што... Сама-ж я дала найлепшага дый найболі і яшчо самому Сталіну...

Аксенін голас гучэў крыўдай. Жанчына глядзела ўніз, ня могучы вытрымаць пранырліва-дапытлівага Аўдолінага зроку.

- Ціха ты, ягодка, неяк будзіць.

Тымчасам запаволілася «гэч тавагыша Сталіна». Васпаваты жаўнер адхіліў на бок каціную галоўку з іголкай ды доўга круціў патэфоннай ручкай. «Тавагыш Сталін» адразу пажвавеў, голас ёмка грымеў-хваляваўся недзе над крамлёўскімі рэдзькамі, сягаў-імкнуўся некуды ўвысь і якраз тады, калі здавалася, што вось-вось пырсьне занадта надзьмуханы вялікі барані пузыр, расплыўся шырокі акіян воплескаў.

На патэфоне лягла новая кружэлка. Жыдзенькі дзявочы галасок зацягнуў:

На зака-а-а-аці ходзіт па-а-арынь
возьлі дома маіво-о-о...

Гэтта прышкандыбаў у ведамым сурдуце Сымон Пятух. Не сьпяшаючы, выцягнуў сваю карэлую пецярню Марашалкаву, пасьля Лявону, Аксені дый Тодару з Аўдоляй.

- А ты чаго гэта, як ня еўшы, валюхаешся? - накінуўся на Сымона Шпунт.

- А што такое? Гарыць, ці што? - адазваўся гультай.

- Па людзей січас трэба ехаць... знацца па тых, каторыя самі прыйсьці ня могуць. Усе, як адзін чалавек, далжны галасаваць. А твая маці прыдзіць?

- Ды мусіць не, трэба паехаць забраць.

- Ну дык во, паедзіш забярэш яе, пасьля дзеда Якуба дый сама глядзі яшчо каго...

- Каторым? - зірнуў Пятух на грузавікі.

- Січас скажу. Ды помні, што ад найстарэйшых пачынаць. Тутака фатограф ёсьціка, ён зробіць зьнімкі, каторыя ў газэця напічатаюць. Панімаіш?

- Ну. А дзе-ж Косьцік?

- Ні тваё дзела. Скора будзіць.

Скрыпеў, шуneў, трашчэў патэфон. Хадзіў «на закаце парынь, ухадзілі на гражданскую вайну камсамольцы» і ўжо ці ня міліённы раз «выхадзіла на бераг Кацюша». Колька яна, бедная, у чарзе за буткам мусіла калець, каб такую колькасьць разоў басанож на гэны бераг не хадзіць...

Ля Пятуховай хаты быццам кірмаш у чацьвер на Глыбоцкім рынку. Шырака адчынены ў хату дзьверы. Надзьмутая, з важнай кіславатай мінай сядзела ля «балаціравачнай скрыні» Аксеня. Побач варушыў даўгімі рыжымі вусамі Захарук. У шэрым школьным сшытку Дуня Макатунішка адзначала прозьвішчы тых, што галасавалі. У вёсцы мала хто «паруску» ведаў. Колькі не адмаўлялася, ня выкруцілася ад Лявона, дый ведала-ж, што шмат камбедаўскага дабра трапіла Макатуном з ласкі Шпунта. Укусі яго, дык сябе ўкусіш. Казалі людзі некаторыя, што новы лад вымагаў новага падыходу да людзей. Але з другога боку памятала дзяўчына гвалт у лесе. Калі Лявон збоку аціраўся, на старожы трымалася. Гэтак і сяньня раніцай, вельмі балюча за мяккое месца ўшчыкнуў.

Людзі гаманілі за дзьвярмі, мала хто ў хату заходзіў. Спанукаў іх сам энтузіястычны Лявон. Зьявіўся на самакаце Косьцік.

- Быў на ўчастках Паваліцкага Хвёдара й Саладухі, - паясьніў, прывітаўшыся. - А як тут ідзець?

- Ат, медлінна, - махнуў рукой Шпунт.

У суправодзе вясковых сабак і дзяцей укаціўся ў двор грузавік. Першай саскочыла рухавая Вульляна. Выцягнуліся рукі на помач дзеду Якубу. Літоўскі патрыярх пазаўчора ў пасьцелю залёг. Колькі ні пратэставаў Васіль і нявестка, каб ня трывожылі занямогшага, Пятух учапіўся за дзеда, як клешч за скуру.

- Прыказ дык прыказ! - падняў ён голас. - Мне сказалі прывязьці жывога ці мёртвага, от!

Паласаваўшыся нарабаваным камбедаўскім дабром, стары абібок нагоду ўбачыў. Ягоны сур'ёзны твар і задзірлівыя словы не давалі месца на ніякі сумлеў, што забярэ дзеда. Якуба апранулі й вывелі да машыны.

- Што-ж ты гэта, Сымон, каб цябе макарэц, з пасьцелі мяне хворага цягніш! Выбіралі-б бізь мяне! - пратэставаў дзед.

- Нічога табе, дзеду, ні станіцца, - запэўніваў Пятух. - ты-ж найстарэйшы, дык за табой, казаў той, усе пойдуць.

Зьняможанага дзеда паставілі на ногі на Пятуховым дварэ ды, падтрымліваючы, павялі да «балаціровачнай скрыні». Ледзь шкандыбаючы, стары вурчэў пад нос, не адказваў на нічые вітаньні.

- Дык што з гэтым рабіць? - спытаўся, узіраючыся мутнымі вачмі ў літары на «балоце».

- Гэта, дзядуля, нашы кандыдаты. Вы галасуіце за іх, дык укіньце ў гэту скрыню і ўсё, - тлумачыла Аксеня.

- Кандзідаты, кажаш? Хто-ж яны? - спытаў дзед.

- Таварышчы Шпунт і Бурак.

- Таварышчы, кажаш? Каму-ж яны такія таварышы?

Людзі ціснуліся ў дзьверы, аціхкла гамонка.

- Ну гэта такая мода, так завуць цяперака. Паноў-жа німа, усе толька таварышы, - спакойна тлумачыла Аксеня. Захарук падкручваў вусы й маўчаў. Адно Дуня пазірала зьбянтэжана то надзеда, то на іншых.

- Ага, унь яно як... таварышы, кажаш.., - паволі крэкчачы, гаварыў дзед. А тады раптоўна й злосна: - Алі якія такія яны мне таварышы, калі хворага з пасьцелі сьцягнулі? Што гэта й памерці спакойна німа як? Бізь мяне ні маглі?

- Да как это так, отец? Да нельзя так. Вы прімером всей деревні должны быть, - голасна сказаў Маршалкаў, што дагэтуль збоку трымаўся. - За вамі другіе последуют.

- Прымерам, кажаш... - зморшчыўся дзед. Ягоны слабы зрок блудзіў па людзях, вусны памкнуліся нешта сказаць, ды стрымаліся. - На, укінь гэты сьвісток, каб адчапіліся ад мяне, старога й хворага, - адаў дзед «балот» Дуні й адыйшоўся.

Дуня ўкінула выбарчы білет у скрыню і ўзялася запісваць дзедава прозьвішча. Васіль мігам адбыў сваю павіннасьць і ўзяў бацьку пад

руку, каб надвор памагчы выйсьці. Чырвонаармеец меціў на дзеда фотаапаратам.

- А ну-ка отец, на меня смотрі! - загадаў голасна.

- Обожді, братец, давайте сюда кандідатов і другіх, - спыніў ягоМаршалкаў.

Ля дзеда паставілі «таварышчаў кандзідатаў», побач стануў Маршалкаў і старшыня камбеду. Прынясьлі «балаціровачную скрыню», якую абкружыла «балаціровачная камісія». Ужо пасьля ўсяе гэтае муштры шчоўкаў апарат. Адно не ўдалося ўпрасіць дзеда, каб на фотакамэры ўсьміхнуўся. Ён бурчэў і раіў усім прысутным, каб яго скарэй у цёплую пасьцелю пусьцілі, бо дрыжыкі бяруць. Пасьля здымкаў, дзеда мелі павезьці дамоў, «балаціровачная камісія» заняла папярэднія месцы, а да Маршалкава падыйшла Вульляна.

- Таварыш камісар, я да вас...

- Так, грамадзянка, чым магу служыць?

- Я, гэта самае... можа помніце... пра сваіх сыноў-галубкоў, каторых гэта палякі на вайну забралі, вас пыталася. Дык вы-ж тады гэта абяцалі, што дагледзіце... Можа яны там дзе да немца папаліся...

- Што ей трэба? - спытаўся Маршалкаў Косьціка парасейску.

- Двух яе сыноў палякі на вайну забралі, - адказаў Косьцік.

Выгляд Сабакевіча гаварыў быццам напярэдадні ўжо цэлую ноч выбарчую перамогу сьвяткаваў.

- Дык што, калі забралі? Пры чым тут я? - шорстка адказаў бальшавік.

- Як гэта пры чым ты?! - Вульляна наўмысна павысіла голас, каб усе пачулі. - Ты-ж мне абяцаў, што сам Сталін гэтым дзелам займіцца. Ня помніш нічога?

- Пачакай, пачакай, грамадзянка! - крыкнуў Маршалкаў. - Так, я вас памятаю цяпер... Ну так, зусім памятаю.

Камісар намагаўсяўсьміхнуцца, але на твары паказалася грымаса.

- Ну так, памятаю. Гэта вы мяне на першым міцінгу пра сыноў пыталіся? Так, ці не?

- Я, ага...

- Вы сьпісок усіх зрабілі, Канстанцін Паўлавіч? - зьвярнуўся камісар да Косьціка.

- Перадаў вам, - адказаў Косьцік.

- Ну дык калі вы мне перадалі, дык я уж верна перадаў далей... Ну да...

Маршалкаў узіраўся ў Вульляніны вочы, быццам хацеў сказаць: «Маеш адказ. Чаго яшчэ, баба, хочаш?».

- Ну й што? Дзе мае сыны? - насядала жанчына. Яна выціралa сьлёзы, пазірала на людзей, што сьцяной абступілі яе й двух начальнікаў. Маршалкаў пачырванеў. Дзясяткі дапытлівых вачэй і сьцінутых вуснаў узлавалі яго.

- Слухай, баба, - пачаў камісар голасам войстрым, як брытва, - ці-ж ты думаеш, што калі-б твае сыны й іншыя былі ў нас, дык мы ня пусьцілі-б іх дамоў? Відаць, што яны ў плен папаліся. Так, верна ў пляну, калі ніякіх вестак няма...

- Ну а калі ў пляну, - голасна насядала на афіцэра Вульляна, - дык ты-ж казаў, што зь немцам вы нейкі там вялікі саюз зрабілі, дружбу маеце... гэта-ж вашыя словы... Ні так вы казалі? Ну а калі німа ні слуху ні духу пра маіх сыноў-галубкоў, дык як тады пра другіх? Што гэта? З усей вёскі людзі пад зямлю праваліліся, ці што? І яшчо-ж сам казаў, што лічна сам таварыш Сталін гэтым займіцца... Мусіць ты такі брахун, як і той поп дубовіцкі!

Буйныя сьлёзы накаціліся на Вульляніны вочы. Стрымаўшы дыханьне, народ маўчаў. На ейным плячы лягла рука. Удава адвярнуллася й сустрэла спагадлівыя, лёгка-блакітныя вочы літоўскага патрыярха.

- Ты, дачушка, ні насядай на гэтага, каб яго макарэц, камісара. Можа ён і забыцца мог, можа і ні знаіць. Трэба пацярпець, нахрапам нічога ня зробіш, памагчы ні паможаш, а шкоду можаш на галаву сваю...

Вульляна, цяпер голасна расолакаўшыся, прытулілася да дзеда. Гладзячы яе па валосах, як дзіця, Якуб улажыў у рот люльку.

Якраз калі дзедава ласкавая й дрыготкая рука суцяшала жанчыну, на дварэ «выбарчага ўчастку» зьявіўся Янук Бахмач. Басаногі, ў зрэбных портках, сіняй кужэльнай кашулі, ён спыніўся й прыглядаўся.

Даўно карціла Януку пабегчы на тыя выбары, але трэба было карову падаіць, памагчы Міколу гаспадарку ўпарадкаваць. Пасьля гэнай памятнай Косьцікавай і Лявонавай візыты, зноў пачаў занемагаць бацька. Ці не праняў яго тады скразьняк у варыўні. Змарнеў, асунуўся, але хваробе не здаваўся і ўсё прадаўжаў з жорнамі

ходацца. Пасьля гадзіны-другой пры камяні пачынаў крактаць і зьлягаў у пасьцелю.

- Ты во, Пракоп, у цёплым выліжся, дык чорт зараз тую трасцу прагоніць, гаварыў, зьнімаючы банькі, лекар Зянькевіч. - А жорны нікуды ні ўцякуць. Паляжы во, кажу, дык і немач скарэй выхадзіш.

Каб гэта ў лежню чалавеку было. Духовы ўдар падчас тэй візыты нанава зрушыў балючае, падсяканае некалі Палякамі карэньне. Першыя подыхі «народнай улады» ледзянілі сялянскія сэрцы. Пракоп наадрэз адмовіўся йсьці галасаваць.

- Даволі ўжо й так зьдзекуюцца, басякі! - злосна казаў швагру Алесю. - І гэта-ж во яшчо хочуць каб чалавек, сабе на душу напэцкаўшы, галасаваць за іх ішоў. Палякі нашто ўжо чэрці былі, а гэтыя дык іх ці ні піраплюнулі. А трасца-ж вам у бакаціну.

Гэтыя бацькавы словы прыгадаліся на Пятуховым дварэ, калі ўслужлівы доктараў Стась падбег да яго й расказаў як Вульляна спачатку распытвала Маршалкава, а пасьля напала на бальшавіка. Мігам зразумеў малады Бахмач чаму дзед намагаўся Вульляну спатоліць. Сам хваравіты, ледзь-ледзь клыпае, здаецца, а колькі нявычэрпнай сілы, вялікага духовага гарту меў гэты сівы, прыгорблены, аднаногі чашчавік.

З патэфоннай кружэлкі гарлапан зноў «гэч тавагыша Сталіна» пачаў. Янук спыніўся ля прачыненых дзьвярэй хаты й мяркаваў куды яму йсьці. У хаце спасьцярог Захарука й побач Дуню. Нейкая рука страсанула яго за плячо.

- Ну а ты, пацан, чаму бацьку ня прывёў? Дзе ян?

Лявон стаяў перад ім, як важны генэрал. Твар прамяніўся зухаватаю нахабнасьцю, выклікаў, зьдзекваўся. Муынаватыя, нецьвярозыя вочы памалу поўзалі па малым Бахмачу.

- Ідзі сам яго спытайся. Пусьці! - тузануўся Янук.

Рука яшчэ мацней сьціснула хлопцава плячо, а ацяжэлы Лявонаў язык пагражаў: - Ты, гэта такую тваю маць, чаго на дыбы становісься, жабянё? Як спрашываю, дык атвічай! Начальства з табой гаворыць, пацан ты!

- Бацька хворы, - адказаў Янук.ж

- Хворы? Эгэ... прытварыўся, сукін сын!

- Калі ня верыш, дык сам ідзі паглядзі!

Лявон паклікаў Косьціка й клешчы звольнілі Янукова плячо. Падыйшоў Стась.

- Чаго ён цябе? - спытаў.

- Ні знаіш? Чэпіцца, шэльма, што бацька ні прышоў, а бацька - сам знаіш - усе плечы ад банек сінія...

Ня меў Янук ахвоты Стасю свае крыўды выліваць. Пераступіў парог і апынуўся ля стала перад Дуняй.

- Памагаіш, Дуня? - спытаў, крыху зьбянтэжаны.

- Так, Янучок, папрасілі каб запісвала. Казалі, што мала хто ў нашым сяле паруску можыць.

Перад сталом стаялі жанчыны й перакідваліся словамі з Аксеняй і Захаруком. На печы, апранутыя ў крамныя кашулёнкі, зрэбныя портачкі, павытыркалі заходжаныя пяты і як кураняты туліліся адзін да аднаго два Ўладзімеравы хлапчукі. Аднаму было тры, другому - чатыры гады. Пятухова маладая, пасьвяточнаму апранутая жонка ківала на іх пальцам, ля прыпечку стоячы, каб гоману не рабілі.

Дуня зьзяла поўняй расьцьвілай прыгажосьці. Сіняя аксамітная блюзка й зялёная спадніца, прыгожа рашчэсаныя валосы, прывабныя вочы-васількі, румяныя шчокі - яна была выдатнай аздобай «балаціровачнай камісіі». Васількі пазіралі на Янукла проста й даверліва. Хлапцу ня давялося спанатрыць калі загаспадарыла ў іх самаўпэўненасьць і дзявочая зусім выразная гарэзьлівасьць.

- Ну а ты ўжо навучылася пісаць? - спытаў Янук.

- Буквы знаю, фамілії магу запісваць, - хвалілася Дуня.

- Надта-ж скора.

- У школе як далі нам па тры буквы на дзень дык за два тыдні ўсе пазналі. Гэта-ж мы ня дзеткі малыя...

- Ага, - сказаў Янук і яшчэ больш зьбянтэжыўся.

- Можа сягоньніка на вічарынку пойдзім? - выручыла Дуня.

- Дзе, якую?

- У ліпавіцкай пуні.

- Ага, знаю. А хто-ж робіць? Зь кім пойдзіш?

- Байцы робяць. Гэта Клава мяне падахвоціла.

- Сваіх дзяцюкоў на вайну забралі, дык вы з байцамі цяпер.

У Януковым голасе чуўся дакор. Дзяўчына спасьцерагла.

- Майго-ж на вайну ні забралі. Ты-ж мой, - сказала зусім проста й шчыра дзяўчына.

Чырвань заліла Янукоў твар.

- Які зь мяне дзяцюк? Ты ня строй кепікаў...

- Ніякіх кепікаў, - усьміхнулася Макатунішка. - Хадзі во й пойдзем.

- Ня ведаю, - буркнуў Янук.

- Ну што-ж ты, Янук, аднекваішся? - укінуў Захарук. - Ты цяперака-ж мусіць за яе ня лепшы.

Укалоў дзядзькаў язык. Заняты Дуняй, Янук і забыўся пра яго. А той проста ў жывое й балючае трапіў. У памяці паўстала адлеглая часам сцэнка ў лесе. Цяпер Бахмач ужо баяўся на Дуню зірнуць. Бяз слова шмыгнуў празь дзьверы.

20

Здавалася, што хмары паўзьлі нізка й закраналі вярхі волатаў Гаравацкае пушчы, карону дуба Архіпа й чубы сёстраў-соснаў на могільніку.

«Цёмна, як пальцам у вока» - думаў Янук, выйшаўшы на вуліцу й разважаў, ці не вярнуцца ў хату. Калі-б жыў верны яго сябра Тапсік, Янук рушыў-бы на вечарыну без развагі. Прыгадаўшы застрэленага бальшавікамі сабаку адзінота й пэўная бездапаможнасьць узрушыла Янукова сэрца. Адно на момант. Дзесь у вадлегласьці выклікалі вочы-васількі. Вочы іскру ў юнацкае сэрца закінулі. Іскра незгасная, заўсёды прысутная, хоць мо й не дапякала ўсё-ж бесперапынным тленьнем хлапца трывожыла. Хапіла сяньня побач дзяўчыны стануць і адразу павялічылася гэнай іскры гарэньне. Ні подых ветру, ні які там скразьняк, а просты й гарэзьлівы позірк вачэй прыцягваў, дапякаў, трывоыжыў.

З глыбіні раньняга дзяцінства выныpала малое, худое, затуканае, карэлае дзяўчо, зь якога зьдзекваліся іншыя дзеці і якое ўсім па дарозе замінала. Цяжка было верыць, што быццам наўсуперак і на злосьць усім «лепшым» яно вырасла-ўзбуйнела й расьцьвіло цудоўным васільком. Калі-б хто спытаў яго пра гэнэзу ці працэс гэнага ператварэньня-росту, напэўна ніяк ня мог-бы вызначыць таго шляху Янукоў раптам ацяжэлы язык. Малы Бахмач напэўна зусім разгубіўся-

б, зьбянтэжыўся, бо адкуль было яму ведаць пра лёгіку ці заканамернасьць шмат якіх зьявішчаў. А для яго й гэна «галапупае жабянё» й цяперашні васілёк былі адно зьявішчамі, каторыя тут-жа побач існавалі раней і вось адно зь іх, поўнасьцю, расьцьвіўшае й прынаднае лакоміць-выклікае цяпер. І як-жа тут вызначыш ці рухавіком, прыкладна, сяньняшняй вандроўкі на вечарыну была ўквеленая гордасьць, ці мо закінутая васількамі-вачмі ў сэрца іскра? Калі-б быў дзяцюком, танцаваць умеў, калі-б перарос тую сарамяжлівасьць юнацкую... Калі-б, калі... Гавораць што дзяўчаты да старэйшых за сябе гарнуцца, Калі так, дык ён, Янук, ня Дунін кавалер. Ды вось найгорш, што выкліку няма як дараваць. Калі яна ўжо наперад забегла, навет «рускую грамату» за два тыдні на зуб узяла, дык калі яна разумее працэс дасьпяваньня хлапцоў і дзяўчат і розьніцы ў веку іх сталасьці, дык навошта выклікаць яго тады? І ці ня можа быць, - і Янук аж здрыгануўся пры такой думцы, - ці-ж ня можа быць, што яна яго адно зводзіць, можа за гэта далёкае намер помсьціцца мае?

Холадам хлопца праняло. І ня было гэта такая стынь, што ад аселіцаў цягнула, ні тая золь, што дзесь над Бярэзінай трымала. Сьцюжа нарадзілася ў глыбіні й мусіць навет тэмпэратурай не вызначалася.

Дык ішто-ж цягнула яго туды? Няўжо-ж каханьне? Але што такое каханьне? Сяброўства, супольнасьць, ці яшчэ што? Прыгадаў прачытанае некалі апавяданьне пра першае каханьне. Як там было, як пісьменьнік вызначыў яго? Дзе, на якім менавіта пункце хлапец ці дзяўчына ўсьведамілі пра каханьне й пачалі імкнуцца да зьліцьця ў адно цэлае? Здаецца, што дарога не вызначалася ніякімі вехамі. Былі прыжмураныя сарамлівыя вочы, шырака разьліты па твары румянец, зьбянтэжанасьць рухаў, доўгія й многазначныя ўздыханьні, нелад у гутарцы, адубела-спараліжаваны язык, што ў вадно слова намагаўся сканцэнтраваць усё нявыразнае, што бурліла ўнутры і была галоўна нейкая параліжуючая, магутная сарамяжлівасьць, што адпіхала якраз тады, калі сэрца з гарачым імпэтам намагалася прыцягваць. Дык дзе тыя вехі? І дзе дакладна знаходзіўся цяпер Янук?

Быў гарачы цалунак у канюшыне. Бурным салодка-гаркім хмелем апарыў вусны, хаос у галаве ўзьвярэдзіў, а бессаромна заголеныя ногі малаткамі гарачага пульсу перадаліся ў скроні й сэрца. І навет цяпер, ужо з адлегласьці, навет у цемры соромна й ніякавата было. Гойдаўся

пад нагамі грунт, хвалявалася-круцілася зямля на тэй уяўнай восі. Было ўсепаглынаючае зьбянтэжаньне, камплетны амаль параліз. У гэткі момант найлепш было-б, мусіць, залезьці ў нейкую нару, каб не спасьцераглі людзі чырвані на твары, каб ня кпіў ніхто зь ягонай бязраднасьці.

Крыўдна й балюча. І ня было ніякіх сродкаў кантролі, ні супрацьдзеяньня. Бушаваў шырокі вір. Бурлівыя хвалі ў пырсках захлынаючай пены несьлі кволы, бездапаможны лісток.

Недзе ў цемры між кустоў над канавай вецер шалясьцеў сухой асакой. У прыглушанай гамонцы сабраліся вольхі й марудна скрыпела надломанае некалі бурай дрэва. Дзяруга хмараў цягнула з усходу. Літоўцы схаваліся ў цемры, адно, здаецца, сьвяціліся вокны ў Кмітавага Тодара і Ўладзімера Пятуха. Калісьці даўгія васеньнія вечары зьзялі літоўскімі сьвётламі-пацеркамі ў начоўках аж да поўначы. Дзеўкі й жанчыны пралі кудзелю, а мужчынскі род ладзіў-майстраваў гаспадарскае знарадзьдзе. Маладыя на вечаркі зыходзіліся. Гучныя галасы песьняў бурлілі радасьцю жыцьця. Недахоп нафты зьвязаў больш чым руплівыя рукі.

На чыгунцы з-пад Полацку пачуўся гул. Шырэў, рос, разьліваўся рэхам у прычыгуначнай пушчы. Наладаваныя вайсковым матар'ялам цягнікі на захад хадзілі гэтта часта. Пад Дубовічамі рос пук сьвятла. Ён даўжэў і зырчэў, ды неўзабаве яснай конаўкай разрэзаў густую цемру. Нізкі, сіпаты сыгнал тузануў літоўскай далінай. «І чаго яму, сіпатаму чорту, трубіць?» - падумаў Янук. - «На гэным-жа дубовіцкім піраезьдзе нікагуські німа.»

У кабіне лёкаматывы ўявіў Бахмач плоскатвараг, касавокага савецкага Ваньку: набрынялая алівай і мазутай ды гарам «сьпяцоўка», тырчма ўверх казырок шэрай кепкі, а ў роце неадступная, часта гаснучая «казіная ножка» са сьмярдзючых карашкоў. А мо ня так. Мо гэны ў чорным «жалезнадарожным» мундзіры, на галаве ў яго круглая шапка з чырвонай зоркай, а на каўняры - скрыжаваныя развадныя ключы з малаткамі. І першага, і другога бачыў Бахмач у Гацях, калі пашыралі чыгунку й прыйшлі першыя савецкія цягнікі, а дзеці зьбегліся паглядзець «надта-ж надта вялікія маскоўскія паравозы».

Цягнік праімчаўся хутка і ўліўся ў гоман гацкае станцыі. У начоўкі цішыня вярнулася. Янук падыходзіў да гасьцінцу. Былі ўжо чуваць зь Ліпавічаў галасы, гул матору. Янук ведаў, што дзяўчаты

зьбіраліся й пайшлі мусіць яшчэ да зьмярканьня, ды не спасьцярог каторыя. Ціснулі боты. Адны-адзіныя, што меў, каторыя бацька летась адступіў. Зьбітыя й палатаныя былі, але ашчаджаў іх Янук, бо ведаў, што іншых не здабыць яму цяпер. Сьвітка таксама зь плячэй бацькавых. Не пакажашся-ж на вечарыну босы ды ў вадной кашулёнцы, асабліва-ж калі сьцюжай праймае. Сьвітка была паўсуконная. Хоць крыху й завялікая, але што зробіш. Падрасьце, заробіць, тады й касьцюм будзе.

«Можа лепі было-б узяць з сабой доктаравага Стася», - думаў Бахмач. Ды надта-ж нястрыманы хлапец быў зь яго. Языку поўная воля, а галава - пляшка цёмная. Калі што туды трапіць, - нагні й вылі, - ні кроплі сабе не пакіне. Язык - жорны. Зусім па бацьку пайшоў, адно стары Зянькевіч усвоіў мудрасьці жыцьця й памяркоўна сваё трапло ўжывае.

Адчуваў Янук, што падарожжа на вечарыну рызыкоўнае было. А што будзе, калі Дуня ці каторая дзяўчына танцаваць яго выцягне? І што будзе, калі ня будуць патрапляць у танцах яго ногіў мулкіх бацькавых ботах? Ад сораму згарэць давядзецца. Сустрэнь тады доктаравага гарлапана. Ён пры людзях рогатам паедзе.

Янук затрымаўся на чыгуначным пераезьдзе. Глуха гудзелі тэлефонныя правады. Зыйшоў з гасьцінцу й прылажыў вуха да слупа. Гэны навык нарадзіўся ў яго тады, калі першы раз пазнаў цывілізацыю. Цягнікі, тэлефонныя лініі, школы, - усё тое, што прыходзіла зь верхняга, малаведамага яму сьвету, было для Янука цывілізацыяй.

Кажны слуп гудзеў пасвоему. Чаму мелі слупы розны гул? Ці розьніцу рабіла вялічыня, таўшчыня, ці гудзелі, зусім ня слупы, а правады? Дзеці спрачаліся пра тое часта. У школе сорамна было настаўніка пытацца, каб не абсьмяялі.

Задзёр Янук галаву і ў цемры намагаўся тэлефонным чашкам прыгледзіцца. Былі яны калісьці аб'ектам дзяцей і Янук у гэным няхітрым спорце добра руку набіў. Чашкі былі фарфаровыя белыя й шкляныя сінія, ці зусім празрыстыя. Калі каторы малы вісус чашку камянём зьбіў дык гонар вялікі меў, бо спорт гэта не такі лёгкі, як здавацца магло збоку. Вісус браў сабе ў кішэню часьць зьбітае чашкі, значыцца часьць тае цывілізацыі ды клаў недзе ў схованку разам зь іншымі чарапкамі й бліскучкамі. Чужое-ж гэта было, пэўнага роду

трафей значыцца. Тэлефанічная адміністрацыя пасьля на слуп усьпіналася, жорсткім «псякрэвам» мясцовае «быдла» й «хамства» лаяла ды чашкі мяняла. Нейкі мэндлік ці іншы вадзімскі пры першай нагодзе «брудным хамам урвісам» пад насамі пальцам махаў. І калі «псякрэвы» з тэлефоннай канторы панапраўлялі лініі, а вадзімскія ці мэндлікі пальцамі намахалі, дзеці зноў пачыналі практыкаваць «хто скарэй пацэліць». Чашкавы спорт у Літоўцах меў такое самае права грамадзянства як мячык ці пікар. Апроч таго ён быў падмацоўваны жаданьнем дасаліць «псякрэвам» мэндлікам і вадзімскім.

«Пра што гаварылі цяпер тэлефонныя правады? Якія гукі й куды несьлі? Пэўне-ж іншыя чым пры панох», - разважаў Янук, вуха ля слупа трымаючы. - «І што рабіць цяпер з чашкамі, зьбіваць іх, ці не?»

Ад часу, як «народная ўлада» прыйшла, ня браліся дзеці за каменьне. Можа ня вырашылі яшчэ, ці цяпер чашкі былі «нашыя» ці іншым «псякрэвам» належылі. Ня ведаў Янук які вялікі сымбалізм мелі ягоныя думкі.

Прасторны будынак зь нізкім плоскім, гонтавым дахам - абвіслая па бакох шапка рослай мухаморы - сьвятлом вокнаў і гоманам вечарыны ажыўляў навакольле. Кагадзе пабудаваў яго ліпавіцкі пан у лагчыне, непадалёк гонкіх ліпаў вялікага саду. Не маглі дайсьці клёку навакольныя сяляне, навошта той будынак пану спатрэбіўся. Быў-жа ў маёнтку абшырны так званы палац, у каторым ці пералічыш розныя, памоднаму называныя каморы. Пан меў не адзін маёнтак. Казалі людзі, што будынак гэты, прасцораю мо на пяць вясковых хатаў, калі ня больш, пабудаваў пан для баляў і летнім павілёнам назваў. І запраўды, ўжо на зыходзе салодкіх часоў «жэчпаспалітай» ці раз поўніўся будынак музыкай, гоманам маладых і старэйшых панкоў. Сяляне-ж, бачачы такое багацьце будаўляных матар'ялаў на роскаш ужытае, словамі й думкамі ў розныя цікавыя месцы пана пасылалі.

Ліпавіцкі бальшавіцкі гарнізон меў электрычны генэратар і фільмовы пражэктар. Часта зыходзіліся навакольныя сяляне таго цуда на белым палатне паглядзець. Калі трымала пагода, Ленін ладзіў сваю рэвалюцыю на адкрытым полі або вялікім дварэ. Калі-ж капрысіла неба, той самы Ільіч ці Чапаеў граміў-разьбіваў усялякую «контру» ў новым прасторным будынку, каторы сяляне ліпавіцкай пуняй назвалі.

Пра назоў гэты якраз цяпер думаў Янук. «Гэта ня пуня, а цэлы вялізны вуль цяперака», - пастанавіў Бахмач, згадваючы гул пчол у

каторым вульлі бацькавай пчалінай гаспадаркі ў летні вечар. Шырака зьзялі адчыненыя дзьверы пуні. Недзе ў гэным вялікім вульлі была адна мілая пчолка з выклікам у вачох, што Янукова сэрца казыталі.

Пад шырокай стольлю віселі чатыры лямпы. Смурод карашкоў, задуха й пот забіралі дыханьне. Два вайсковыя баяністы гралі «рускага». Цяжка было разгледзець, хто хадзіў упрысядкі ў шчыльным коле людзей. Янук затрымаўся ля парогу. Непадалёк, за дзьвярмі нейкі незнаёмы сівавалосы дзядзька слухаў двух жаўнераў, што ператрасалі абрыдзелую ўжо трасянку пра дабро калгасаў. Кемлівы селянін стаўляў пытаньні як шпількі, уводзіў у азарт чырвонаармейцаў. Дзядзькі й цёткі таўкліся ля дзьвярэй, былі й дзеці.

Янук падыйшоў да кола й праз шчыліну ў цесным вязьме спасьцярог як ёмка хадзілі ногі двух байцоў. Быццам лёгкія пеўнікі кружылі яны навокал дзеўкі. Тая-ж больш павольна, але зусім зграбна перабірала нагамі. Час ад часу рукі намагаліся абцягнуць заголеную сукенку. Янук распазнаў Хвядосаву Маньку. Казалі людзі, што каб танцаваць «рускага» дык трэба ў чорта і вытрыманьня пазычыць. Чырвонаармейцы й мясцовая моладзь плёскалі ў такт рукамі, некаторыя-ж, падвыпіўшы добра, на нагах хісталіся.

Баяны сьпяшылі тэмпа. Плёсканьне й заахвочаньне гледачоў павялічылі азарт танцораў. З твараў іх цёк сакавіты пот. Вось, здавалася, змогуцца, здадуцца. І ў меру павялічэньня тэмпа, аціхала плёсканьне, разяўляліся ад зьдзіўленьня раты. Калі здавалася, што пырсьне да адказу нацягнутая струна, голсаным заключным скрыпам змоўклі баяны. Шчыльнае кола людзей выгнулася мускуламі, завіхрыла і неўзабаве з моцных вайсковых глотак усплыло гулкае «ура». Два чырвонаармейцы й дзеўка апынуліся на руках пад стольлю. У тым падкіданьні высака загалілася Манькіна сукенка. Няведамае жаданьне, наводля таго, што наплыло некалі з Дуняў у канюшыне, млоснасьцю прабегла па целе. Перапоўненая заля забушавала. Нехта аберуч схапіў Янукову левую руку.

- Прышоў, Янучок?

Васілёк разбуйнеў у новай блакітнай сукенцы, каторую некалі, выставіўшы тугія пупушкі грудзей, што так засаромілі Янука, прымярала перад зубам люстэрка на сьцяне. Янук разгубіўся. Здавалася, што ўсе прысутныя прыглядаліся толькі ім. І ўжо дзе як дзе,

але гэтта на публічнай вечарыне так проста й бясцырымонна ей ня трэба было-б да яго прыліпаць.

- Ну што-ж, Янучок, авечкі табе язык адкусілі, ці што? Скажы-ж хоць слова.

- Я... гэта-ж самае... ну прышоў...

Янук чуў як нешта сказаў ягоны язык.

- Алі-ж ты і дзіця, стыдлівы які!

- Дуня, ты так прытулілася... можа й стыдлівы...

- Мяне стыдаісься?

Зноў расплыліся звукі баянаў. Гралі вальса.

- Ізвольте, барышня.

Перад Дуняўй стаяў афіцэр і, не чаклаючы адказу, закінуў за плячо дзяўчыне руку.

- Янучок, я посьля...

Дуніны словы Бахмач прыгадаў пазьней, калі апынуўся на лаве ля сьцяны. Заля гойдалася пад мэлёдыю нейкага прыгожага, раней нячутага вальсу. Адно куды пазьней даведаўся Бахмач што гэта быў за танец і што людзі ў маскоўскіх катоўнях пад тыя гукі на другі сьвет адыходзілі.

- Ну й што, забраў баец тваю дзеўку?

Шырокай усьмешкай дыхаў рабацінны твар і пад носам ня вісела неадлучная «бірубалка».

- Забраў, ці не... а табе што?

Янук пашкадаваў, што гаркнуў. Крыўдна было, што ў такі нязручны момант гэты сапляк пад бокам.

- Алі-ж ты, халерачка, зласьлівы які! Што гэта, Дуня цябе ўкусіла? - насядаў Стась.

- Ніхай во цябе, такога зуха, каторая ўкусіць!

- Ну ўжо ні крычы так! Калі яна ні твая, дык чаго да цябе так туліцца?

Гэта быў апошні чалавек, катораму Янук даверыў-бы свае тайны сэрца. Скажы яму што, дык гэта тое самае, што ў чацьвер на глыбоцкім ранку разгарлапань.

- Ну а твая дзе? - адсек Янук.

- Німа ў мяне.

- Як німа дык знайдзі сабе. Паглядзі вунь колька напаўзло. Цягні Бруніську найменшую, аж пішчаць вунь усе тры.

Янук перасаліў. Мо пішчэлі іншым разам, але ня сяньня. Усе дзеўкі ў вялікім спросе былі, а найстарэйшая Мальвіна, што даўно спадзяваньні на замужжа страціла, прамянілася ад радасьці, што моцна гарнула яе да сябе жаўнерская рука. Плёткі нарадзіліся раней, а з прыходам «вызвольнікаў»яшчэ больш іх нарасло. Некаторыя жанчыны яе «салдацкай крутухай» называлі. Хто ведаў, коплькі было ў тым праўды.

Вальс скончыўся. Зручна высьлізнуўшы ад свайго партнёра, Дуня побач Янука на лаўцы села. На лбе ейным выступілі кропелькі поту, зьзялі з задавальненьня вочы й шпарка гойдаліся пад мяккай, блакітнай тканінай грудзі.

- Засаплася, мусіць? - спытаў Янук, крадком пазіраючы ў ейныя вочы.

- А ніхай іх, Янучок, як накруцяць! - адказала хутка, насаткай выціраючы з твару пот. - Ды яшчо якая зь мяне там танцорка... Пойдзім з табой танцаваць. Добра?

Янук баяўся зірнуць дзяўчыне ў вочы, каб у ягоных трусьлівасьць ня вычытала. А воддаль, - ён быў пэўны таго, - пазіраў на іх з дурной усьмешкай на твары Стась.

- Ну, Янук, пойдзіш?

- Ты-ж знаіш, што танцаваць я ніколі ні танцаваў.

- Біда вялікая! - усьміхнулася дзяўчына. - Навучышся. Я табе памагу. Ну?

Януку душна зрабілася.

- Кажу-ж табе, што танцаваць я ані ў зуб! - апраўдваўся Бахмач.

- Ні бядуй, некалі-ж пачынаць трэба. Як ня будзіць першага разу дык ня будзіць і пачатку.

- Алі-ж як гэта асьмеліцца?

- От я табе пакажу, памагу.

Дуня прыхінулася яшчэ бліжэй і проста ў вочы ягоныя зірнуць намагалася. Нізка выразаны трохкутнікам верх сукенкі цяпер адхіліўся і на хлапца ў цэлай поўні пазіралі тугія, голыя закончаныя румянымі пупушкамі грудзі. Разьлілася па целе млявасьць.

- Ну як гуляіш, Дунічка? Глядзіш, каб дзяцюк твой самапасам ня бегаў? Ха-ха-ха!

Дуніна сяброўка, Юшкевічава Клава, паехала дробненькім сьмехам. Высокі здаравяка ў вайсковым мундзіры гарнуў яе да сябе.

Яго правая рука бессаромна ціснула сьпераду вялікія дзяўчыніны грудзі. Клава перарасла Дуню, хаця дзяўчаты аднагодкамі былі. Не падабаўся Януку Клавін войстры язык, што часам і матам не ганьбаваў. Прыгожая з выгляду, гнуткая ў рухах, цяпер вольнай была. Дзяцюка ейнага «моцарствовую» бараніць пагналі.

- Пірастань, кажу! - сыкнула дзяўчына на бальшавіка й плёснула па дакучлівай руцэ.

- Ну да ты чаво эта, - не адставаў жаўнер, - я люблю тебя.

Маскаль дыхаў гарам гарэлкі.

- Трэба ты мне, палюбоўнік гэткі, ха-ха-ха! - зарагатала дзяўчына. - Напіўся, чорт, ды прыліп...

Дуня прыглядалася пары, зьбянтэжана зірнула на Янука.

- Мой дзяцюк во саўсім нясьмелы, а ты свайго адагнаць ня можаш, - усьміхнулася Макатунішка.

Гулкі баян пачаў імклівую польку. Мігам Дуня станула перад Януком і цягнула яго за руку.

- Ну хадзі пакуль мяне каторы пацягніць! - спанукала.

Януковы ногі зусім ацяжэлі. Колькі разоў нязручна ступіў, намагаўся трымаць такт. Дуня затрымала яго.

- Глядзі во на мае ногі. Добра? Цяперака пачынай: раз, два, тры, раз, два, тры. Ідзі левай наперад, дастаў да яе правую, а тады левую. Ну гэтак. Відзіш, як лёгка? Ну я цябе буду вясьці. Пачынаем: ра-аз, два, тры. Ды ты ні сьпяшы толька. О так... відзіш?

Янук вачмі сачыў дзяўчыніны й свае ногі. Дуня цягнула яго за сабой і намагалася згарманізаваць нязграбныя Януковы крокі са сваімі.

- Ну як? От відзіш, ужо добра патрапляіш. Болі ў каленях гніся, ня тое, што як на калках якіх... о так...

Здавалася, што ўжо быў у гэтай першай лекцыі нейкі прагрэс. І калі-б, Янук канцэнтраваўся на танцы, мо ўсё добра абыйшлося-б. Трэба-ж было яму назад азірнуцца, можа ўпэўніцца ці цэнтрам увагі ён ня стаў. І запраўды, некаторыя зь цікавасьцю пазіралі на юных танцораў. Янук зьбянтэжыўся, неяк раптоўна адубелі ногі, душна зрабілася. Якраз калі Дуня намагалася крутнуць яго, як мядзьведзь ступіў ей на правую нагу. Дзяўчына ахнула з болю, моцна скрывіўся вясёлы да гэтага часу тварык.

- Цюхцяй, ты! - сыкнула на Янука. - Мядзьведзь, каб цябе!

Яна злосна адпіхнула хлопца й пакульгала да лавы. Янука як варам абліло. Пазіраў на зьзяючы прыгожы чаравічак і здавалася ў млосны момант сораму й зьбянтэжаньня, што каб мог, дык зьдзеў-бы ягой пацалаваў-бы пакрыўджаную ножку. Але найбольш апяклія яго рашчараваныя, балючыя васількі.

Янук ня кінуўся памагчы дзяўчыне сесьці, прасіць прабачэньня. Адно ў тым зьбянтэжаньні ўбачыў, што калі будзе між танцораў стаяць дык з ног зьбіць могуць. Здалося яму, што цяпер ўсе абвінавальна глядзяць на яго, як на якога злачынцу, каторы дзяўчыну скалечыў. Ад сораму закружылася галава й Янук пасьпяшыў да выхаду. Азірнуўся праз плячо й спасьцярог як ля Дуні мільганула квяцістая сукенка Клавы. Калі меціў у шырака адчыненыя дзьверы, здалося, што за плячмі, разам з баянам, тросься ад гулкага рогату доктараў Стась.

21

- Каб на вас каршун! - крычэў Мікола на курэй. - А калі ні каршун, дык бальшавікі ніхай вас пажаруць, от як!

Мікола затрымаўся, каб паветра злавіць. Колькі ні ганяўся ніяк ня мог курэй у хлявушок накіраваць.

- Глядзі-ж, Мікола, палаві ўсіх, пакуль пірапісваць прыдуць, толька чатырох пакінь, - наказваў бацька.

- От ты тутака й палаві. Цьфу на вас! - злосна плюнуў дзяцюк. Балела нага й падбіты палец. Ганяючыся за курамі, у камень недзе стукнуў. І брала злосьць на Янука й бацьку. Брат недзе адыйшоўся, а бацька ў Гаці пайшоў пра млын праведаць. Змогся пры жорнах.

А перапішчыкі, як чуваць, на другім канцы вёскі былі. Каб сяньня ня прыйшлі, добра было-б. Зьлятуцца куры на курасадню, пайшоў - цап за хвост, ды схаваў дзе ў бясьпечнае месца, пакуль гэта трасца міне. Ня тайнай у вёсцы было, што кажны гаспадар як мага больш дабра ад вока «народнай улады» стараўся схаваць. Дзіва што! Калі пайшлі па вёсках пярэпісі, адразу насьцярожыліся сяляне. Гэта-ж пад панскай уладай нічога падобнага людцы ні бачылі. Ужо каторы бедны падаткаў ня мог заплаціць, той дрыжэць пачынаў. Зьяўляўся ў хату й апісваў усё, да апошняй іголкі, гэтак званы саквістратар. Пасьля ўсё

тое мізэрнае дабро за няплачаныя падаткі забіралі. Агулам-жа падатак ад зямлі бралі, статку й птушку ніхто ня сьпісваў. Гэтта-ж кажную гусь, качку, курыцу, авечку, - не гаворачы пра большае, - ўсё пагалоўна сьпісвалі. А навошта ім гэта?

Мікола забыўся пра курэй, абапёрся на тын і з агароду, што за клецяй, пазіраў на вуліцу. Сонца хінулася з паўдня, засела ў нейкай млява-шэрай гушчы. Зраньня пакапрысіў прымаразак, пасьля адпусьціла. З захаду зацягвала неба й пачынаў варушыць вярхамі доктаравых клёнаў вецер. Дзесь над балотам крычэлі жураўлі. Далёка плыла журботная туга па пакіданай бацькаўшчыне. Мікола намагаўся знайсьці ключ, але ніяк ня мог спасьцерагчы дзе ляцелі ў падарожжа птушкі.

Па пустой вуліцы, з-пад Якубавай хаты нетаропка шкандыбаў Захарукоў Пятро. У правай руцэ трымаў даўгую палку, зьбіваў ля плоту ўжо шэрую ад першых замаразкаў крапіву. Гэтак заняты, ён не заўважыў як параўнаўся зь Міколам.

- Каму гэта сена косіш, Пятро? - спытаў Мікола.

- Га? Ды во сабаку кудлатаму. чорту лазатаму ды яшчо таму-сяму.

Дзяцюк голасна зарагатаў.

- І многа ўжо накасіў? - сур'ёзна спытаў Мікола.

- Эгэ колька... Вялікі стог накасіў, цэлую пуню навазіў, дзьве кладні натаптаў і суседу трохі даў... гэ-гэ-гэ...

Недарэчнасьць Захарукова сына найбольш увыдатнялася ў яго дзіцячым, прастадушным сьмеху з найменшай дурніцы. Часта забаўляўся складаньнем сугучных словаў і асабліва сьмяяўся-цешыўся, калі рыфмаваньне лёгка да гутаркі трапляла. Гэтак, як цяпер.

- Чуў, што ў Вульляны бальшавікі курэй ловяць? - забег Пятро наперад Міколу. Ягоныя звычайна няпрысутныя, дзесь пазіраючыя воддаль вочы цяпер заварушыліся жвавей. Рад быў вялікую навіну Міколу перадаць. Якраз папярэдзіў Бахмачовага сына, бо пра гэта хацеў дзяцюк пытацца.

- У Вульляны? - перапытаў Мікола.

- Няўжо-ж... Лавілі ды ўсіх ні палавілі, дзьве ўцякло і мне папало, - лепятаў Пятро.

- Ну ты, Пятро, ні выдурняйся, скажы хто курэй ловіць!

- Хто ловіць? Гэ-гэ-гэ! Ты многа знаць хочаш і скора састарэешся, гы-гэ-гэ...

- Ні выдурняйся, кажу! Скажы, хто курэк ловіць! - падняў Мікола голас.

- Ну добра, табе, добраму чалавеку, скажу.

Ён азірнуўся ў вадзін канец вуліцы, у другі, быццам высьцерагаючыся, каб ніхто вялікае тайны не пачуў.

- Кажы, - спанукаў Мікола.

- Ловіць гэты камбедавіц Сымон і нейкі бальшавік у чорным, каторага можа з Гацяў прыслалі...

- Ага, во як. І што робяць з тымі, каторых зловяць?

- У мяшок іх кідаюць ды на рынак вязуць, гэ-гэ-гэ, - рагатаў дзяцюк. Пры тым рагатаньні так шырака адчыніў рот, што сьліна тоненькім шнурком на яго падбародак пацякла.

- Кажу, ні выдурняйся, Пятро, - крыкнуў злосны Мікола, - кажы, як ёсьць!

Пятро раптам спаважнеў, азірнуўся на два бакі вуліцы, выцер сьліну з барады.

- Сьпісваюць усё чысьценька, - сказаў ціха й спакойна.

- Сьпісваюць, кажаш?

- Ага, сьпісваюць.

Мікола задумаўся, правай рукой адгарнуў на бок даўгія валосы, уважна зірнуў Захаруковаму сыну ў вочы. Той спаважнеў, мовы ня было.

- Значыцца, што сьпісваюць?

- Кажу ўсё: сьвіньней, курэй, авечак, цэлую гаспадарку.

- І гэты бабыль Пятух, кажаш?

- Ага.

- Каб яго зімля ні насіла! - падняў Мікола голас. - Ну а ні казалі, навошта яны сьпісваюць?

- Ні знаю, - адказаў дзяцюк. Ён рушыў пад Зянькевічаў двор, зьбіваючы палкай крапіву ля тыну.

Мікола азірнуўся. Дзе падзеліся куры? Некаторыя-ж пэўне пралезьлі ў доктараў агарод, а іншыя мо пад клець схаваліся.

- Мікола!

- Га?

Ля тыну стаяла Алесява Надзя.

- Што новага чуў? Можа Пятро што казаў? - спытала.

- Так, казаў, што ў Вульляны нейкі бальшавік і наш гультай-абармот Пятух пірапісваюць усё чысьцінька.

Ён коратка пераказаў Надзі, што пачуў ад Пятра.

- Можа-б ты падыйшла ды паглядзела, што там робіцца, га? - прасіў Мікола дзяўчыну, - бо я сам дома й ні хачу, каб наляцелі. Бацька казаў курэй палавіць, толька чатыры пакінуць, алі я мусіць рады ні дам. Ды можа яны прыйдуць заўтра, дык я іх сягоньніка на курасадні цапну.

- Калі хочаш, памагу, - запрапанавала Надзя.

- Ды мусіць не. Лепі ідзі, паглядзі, што робіцца. Бо хто яго гэтага Пятра знаіць, ці праўду ён казаў.

- Добра, падбягу, - рушыла зь месца дзяўчына.

- І яшчо адно, - сказаў Мікола.

- Ну?

- Калі ўвідзіш дзе Янука, - ён даўно са Стасем у гэны бок пашоў, - дык скажы, каб зараз-жа дадому йшоў. Добра?

Надзя рушыла ў вёску. Ля Ўладзімера Пятуха клеці ўбачыла Янука, Стася ды Антося Дзеркача. Спынілася.

- Янучок, Мікола прасіў, каб ты дамоў ішоў.

- А што там такога пільнага?

- А што гэта? - зьдзівілася Надзя, зірнуўшы на прыбітую да сьцёны газэту. У цэнтры бачыны, на самым пачэсным месцы здымкі, падтрымліваны іншымі, стаяў дзед Якуб.

- Відзіш сама, - адказаў Янук, - дзеда во на выбарах зьнялі і ў іхную газэту трапіў. Гяр-рой, брат, дзед наш!

- А што тутака пішуць? Адкуль газэта? Можа ты, Антось, прачытаеш?

- Газэта з Глыбокага, - падказаў Янук.

- «Глыбоцкая праўда» - сказаў Антось. - А пішыць, што наш дзед Якуб сам першы выйшаў, ці проста выбег у гэны дзень на іхныя выбары. Так каторы чалавек, як гэта прачытаіць, дык падумаіць сабе, што наш стары дзед цэлых сто гадоў на гэныя выбары чакаў і цэлую ноч ні спаў, так-жа яму гэта ні цярпелася. Калі-ж першыя пеўні гукнулі, дык ён бегам кінуўся Косьціка й Лявона выбіраць.

- А нявестка праклінала, што старога й хворага гультай Пятух з пасьцелі сьцягнуў, - сказала Надзя. - Кажаш, тут пішуць, што ён гэта сам і зь вялікай ахвотай галасаваць нібы за іх пабег?

- Каб яшчо сам, ато кажуць, што дзед і другім прыклад даў, ну амаль усю вёску за сабой пацягнуў.

- Ого, які наш дзед маладзец! - усьміхнулася Надзя. - А мы во тут з боку жывём і ні падазравалі навет.

Дзяўчына ўважней прыгледзілася груповай здымцы. Найбольш увыдатнялася на ёй высокая постаць Маршалкава. Распраменены твар гаварыў: я тут гаспадар. І з выглядам «і я-ж тут з боку-прыпёку» стаяў побач вусаты Захарук, нешта нявыразнае гаспадарыла на тцары Аксені, а лагодная ўсьмешачка Дуні аздабляла ўвесь гурт. З фанабэрыстым выглядам прыхінуўся да кіслага Косьціка Лявон Шпунт. Дзед Якуб зморшчыўся, касавурыўся на Маршалкава і ягоны выгляд выразна запярэчваў баявому апісаньню літоўскага дзеда. Яго падтрымліваў Захарук. Здымка атрымалася даволі выразная, бо газэту надрукавалі на добрай паперы, ці ня з тых запасаў, што ад паноў асталіся.

- Паглядзі во на яго! Чалавек, што з крыжа зьняты! - спасьцерагла дападлівая Надзя.

- Мусіць ні падкрасілі як сьлед, - усьміхнуўся Антось.

- Ну а калі тыя зь Біластоку вернуцца? - спытала Надзя.

- Чорт іх знаіць, - адказаў Антось, - на днях мусіць.

- Я-ж думала, што ты ўсё знаіш, - усьміхнулася дзяўчына.

- Гэтых надта за язык ні пацягніш.

- У каго-ж пірапісваюць?

- Былі во ў Сявенькі. тады ў Вульляны, так во з тога боку ад балота гоняць.

- А ў вас?

- Яшчо не.

- А ў Бурака?

- І ў таго яшчо не. Што яму, калі сын начальнік... Той калі дзе й прыхінець дык можа насядаць ня будуць. А Сявенька жаліўся, што і ў клець лазілі, і збожжа пасьпісывалі, і ўвесь статак, і птушку, усё чысьценька пагалоўна. Толька сабак і катоў ні чапалі.

- Навошта гэта ім?

- Навошта? - зьдзівіўся Антось. Янук уважна слухаў, а Стась у носе калупаў. - Падаткамі во скора абложуць, вось на што. Людзі з таго боку казалі, што падаткі будуць браць ня толькі грашмі але й натурай, значыцца ад кажнай курыцы давай ім яйкі, пер'е, ад каровы - малако й

мяса, ад авечак - воўну й мяса, ад пчол - мёд. Ну а што вашы парабляюць?

Нашы каля дому, а дзядзька Пракоп у Гаці пра млын праведаць пашоў. Жорны ня ў сілах круціць...

Надзя зьвярнулася да Янука: - Янучок, Мікола казаў, каб ты дамоў зараз ішоў. Чуеш?

- А што тамака дома?

- Сам увідзіш. Казаў, што пільна трэба. Ну я табе два разы казаць ня буду.

Аж на трэці дзень пасьля гэтай гутаркі пры Пятуховай клеці зьявіліся ў Бахмача перапішчыкі. З паўдня хінула. Пракоп якраз у хаце быў.

- Здраст..., - гукнуў ад парогу Пятух.

- Добры дзень, - ціха адказаў Пракоп.

- Мы да цябе, Пракоп, знаіш... атнасіцельна гэтага... ўласьці сьпісаць усё прыказалі, - паясьніў Сымон. - Мусіць чуў?

- Яшчо каб ня чуў... Гэта-ж пакуль вы праз цэлае сяло прайшлі і кажды глухі вас пачуў, ня толька што...

- Ну дык і харашо... Можна прысесьці?

Пятух накіраваўся да стала. Худы чалавек у чорнай, як у чыгуначнікаў, вопратцы, шэрай кепцы, каторай пры ўваходзе ў хату з галавы ня зьдзеў, буркнуў нешта пад носам і цяпер рассасуліўся з аднаго канца стала, а Пятух з другога.

- А гэта са мной таварышч Пётр Іванавіч, спіцыяльна каторага ўпаўнамочылі дзіля пярэпісі, - паказаў Сымон на тога.

Пракоп прыпёрся да сьцяны, злажыў на жываце рукі й чакаў. У хату ўвайшлі сыны й Алесь. Швагра прывітаўся й сеў. Запанавала нязручнае маўчаньне. Пятух выцягнуў спорны капшук з табакай, адрываў тоненькую паперу, круціў яе ў даўгаватую конаўку, загнуў пасярэдзіне, насыпаў карашкоў і прыкурваў.

- Віджу во... гэта самае... што сам у газэту ўжо ня круціш, а гільзу дастаў, - сказаў Пракоп.

- Ага, - зацягнуўся Сымон, - гэта-ж у жыда Янкіля дастаў.

Пры згадцы «жыда» чалавек у чорным войстра зірнуў на старшыню камбеду.

...яўрэя Янкіля дастаў, - паправіў курэц, - вялікі жмут, на доўгі час будзіць.

Ён расшпіліў прыгожы чырвоны кажушок, аблакаціўся выгадна на стол, шапку на лаве палажыў. Карціла Пракопу спытацца, на чыіх плячох гэны кажушок раней быў, ды не адважыўся.

- Стало быць, начнём? - загаварыў чалавек у чорным.

І Алесь, і Пракоп цяпер запраўднага начальніка спасьцераглі. Чакалі далейшых пытаньняў. Пачалося ад «імя, отчества й фамілііі». Пасьля дабраліся да зямлі, статку й іншай маёмасьці. Пісаньне адбывалася даволі хутка. Зручна хадзіла маскалёва рука на нейкай афіцыйнай форме. Пры Пракопавых адказах чалавек уважна пазіраў у гаспадаровы вочы. Бахмач адказваў скора й лішняга не гаварыў, Даўно перажваў вялікую жыцьцёвую мудрасьць, што начальству трэба адказваць дакладна й коратка, асабліва-ж калі начальства варожае. Кажнае неасьцярожна сказанае слова можа помсьціцца.

- Нашто гэта сьпісваеце? - спытаў Алесь, калі змог слова ўкінуць.

Маскаль коратка зірнуў на Алеся й нічога не сказаў. Аблічча сухое, наскрозь казённае. Здавалася, што на прышчаватым твары ніколі не магла гаспадарыць усьмешка ці радасьць. Шэрая, васеньняя марудная хмара. Пракоп і Алесь ці раз пераглянуліся й хутка здагадаліся, што чалавека мусіць «адтуль» прыслалі.

Праверка пачалася ў сьвіране, прадаўжалася ў хлявох і кончылася ў гумне. У куратніку маскаль зірнуў на жэрдкі, на якіх начавалі куры, доўга пазіраў на памёт пад нагамі.

- Сколькі курей у вас вы сказалі?

- Чатыры.

- Удівітельно. Необыкновенно большіе куры должны быть.

Маскаль уважна зірнуў Пракопу ў вочы. Як на дзіва, Пракоп добра вытрымаў гэны позірк.

- Погодіте, это что ў вас? - спыніўся маскаль, не даходзячы да гумна. На мяжы між вішняў і сьліваў стаяла Бахмачова пчаліная гаспадарка.

- У вас здесь запісано, что імеете трі колоды пчёл, а я віжу шесть. Как эта так?

- Саўсім проста: тры вульлі пустыя, пчолы памерзьлі.

Без далейшай гутаркі, маскаль павяліччыў лік вульляў на тры ў сьпісе Пракопавай маёмасьці.

- Што вы робіце? - запратэставаў Пракоп. - Кажу, што тры ўсяго маю, а гэныя пустыя стаяць. Вазьміце ды праверце.

На бяздушным, прышчаватым твары Пятра Іванавіча ледзь заўважна шмыгнуў праменьчык іроніі.

- Нічего, товарішч Бахмач, будет шесть.

Фінальнасьць маскалёвага тону так ашаламіла Пракопа, што першы раз перад тварам тупалобага начальніка страціў самакантролю.

- Алесь, глядзі, браток, што-ж гэта робіцца! - зьвярнуўся да швагры. Той адно паварушыў плячмі, ледзь сьціснуў вусны, а ў вачох загарэліся злосныя іскрынкі.

- Каб вам нячыстая сіла скуру сьпісала, каб вас зімля гэта цяжка спрацаваная ні насіла! - кінуўся Бахмач у кленічы пасьля таго, як перапішчыкі да доктара Зянькевіча пайшлі.

22

- Ну і ўсыплюць-жа табе цяпер бабы, ягодка мая, - гаварыла да Аксені Кмітава Аўдоля. Яна турботна зірнула на захад, дзе над Гацямі вісела шырокая цёмная хмара. Дзьмуў спорны вецер і дрыжыкам брала васеньняя золь. Выйшаўшы з будынку НКВД ў Гацях, жанчыны апынуліся пад густым ліўнем. Пасьля таго як іх у сярэдзіне прынялі, ніводнай у галаву ня прыйшло, каб ад дажджу ў той страшнай будыніне скрывацца. Там холадам ад сьцен нясло, мову параліжавала.

Забегліся ў вакзал. Станцыя аж душылася ад войска й ня было мовы, каб дзе цёплы кут знайсьці. Скрыліся пад страхою, а пры першым супыне дожджу рушылі дамоў. галодныя й мокрыя, сьпяшылі цяпер колькі ў нагах моцы. З-за павароту выскачыў вялікі вайсковы грузавік. Пакуль жанчыны спасьцераглі, ён плёхнуў на іх вадой з дарожнай лужыны.

- Ах, кабе табе, сынок, бельмы наверх павылазілі, як ты ня відзіш куды едзіш!

Кмітава пахатуха абтрасла ваду з вопраткі, рукавом выцярла мокры твар і старалася не адстаць ад Аксені, каторая, цяплей апранутая і лепш абутая чымся Кміціха, не звальняла кроку.

- Усыплюць, кажаш, усыплюць... лацьвей ім... А што-ж я вінавата, га? Казаў той баўтун: «паслужыш прымерам жэншчынам усей

рэспублікі», каб ты чорту нямытаму ўвесь свой век служыў! Ну скажы, Аўдоля, чым я вінавата?

Аўдоля борзда тэпала збоку ў дзіравых чаравіках, паўсуконным пальце. Каб не мокрадзь, не даймаў-бы так вецер. А там. глядзі, нацягне ды ліне. Жанчына неспакойна азірнулася назад.

- Дык, ягодка-ж мая, я гэта знаю, алі ці бабы табе памяркуюць? Увідзіш...

І далей ішлі моўчкі, сушэйшыя месцы па гасьцінцы выбіралі. І ніхто не прыгадаў найважнейшага, пагрозьлівага, жахам што поўніла, што сказаў, пальцам добра пад носам намахаўшы, гацкі кручканосы «анкавідзіст».

Вандроўка да вышэйшага начальства ня ўчора наклюнулася. Трэба-ж было нейкай справядлівасьці на Маршалкава шукаць. Палатно забраў і «хвастом накрыўся». Ані тых падзякаў ад Сталіна, Молатава, Кагановіча, ані нічога. І трэба-ж было во на такога нядобрага трапіць. Ня было-ж сумлеву, што зьверху ўсе добрыя, сумленныя, спагадлівыя былі, адно пра народнае дабро дбалі. Дый прыказка кажа, што ў бочку мёду часам лыжка дзёгцю пападзе.

Пасьля доўгіх гутарак пра тое, каб вось гэтую лыжку дзёгцю абмінуць, а ў самую бочку мёду заглянуць, накш кажучы - справядлівасьціі нейкай на Маршалкава пашукаць, накіраваліся сяньня раніцай жанчыны ў Гаці. У сельсавеце параілі ім дзе Маршалкава знайсьці. Нельга-ж было яшчэ адзін раз не папытацца, праверыць. А можа...

Бальшавік прыняў іх у сваім бюро суха й няпрыязна.

- Я-ж вам ці раз казаў, што пасылкі перадаў і дзела з маіх рук. Ня верыце?

Жанчыны лыпалі вачмі, ня ведалі што далей рабіць, да каго йсьці той справядлівасьці шукаць.

- Ну дык што я маю сваім таварышкам казаць? Яны мне ўжо галаву прадзяўблі, - адказала Аксеня.

Камісар адказаў не адразу. Уважна пазіраў на жанчын, але думкамі быў дзесь далёка.

- Пачакайце, я вас зараз задаволю...

Пры гэтых словах узяўся за тэлефон. Гаварыў ціха й коратка. Літоўскія сялянкі не дайшлі ладу ў размове гэнай.

- Хадзіце са мной! - загадаў, апрануўшы шынэль і шапку.

Ішлі галоўнай гацкай вуліцай. Маршалкаў - сьпераду, жанчыны - пару крокаў ззаду. Маўчалі. Бальшавік павярнуў перш на станцыю, пасьля перасек пляц да шырокага ходніка, што цягнуўся ўздоўж двух- і трохпавярховых будынкаў, крытых чырвонайа чарапіцай, дзе некалі»ужэнднікі» й «каляяжы» жылі. Аўдоля першая зірнула на вялізную шэрую, з каменя, мусіць, высечаную фігуру на падстаўцы, што стаяла на цэнтральным месцы малога парку ля вакзалу.

- Глядзі во, - таўханула Аксеню.

Піліпава жонка абыякава зірнула на помнік чырвонаму дыктатару.

- Скора-ж усьпелі, - сказала.

Ад каменнага твару Аксеня зноў угледзілася ў сьпіну Маршалкава, быццам там намагалася прачытаць што ў недалёкай будучыні здарыцца. Афіцэр ішоў шпаркім і роўным вайсковым крокам, рэдка азіраўся. На станцыі стаяў даўгі таварны цягнік, войска высыпала зь цяплушак на плятформу. Некаторыя несьлі ў кацялкох вар, а ў руках - аграмадныя белыя камякі.

- Што гэта ў іх у руках белае, ягодка?

- Цукар, мусіць.

- Такія вялікія кускі цукру? - зьдзівілася Кміціха.

Лязгат буфароў, скрып тармазоў, галёканьне паравозаў, смурод дыму, гамана сотняў людзей. Вялізны вайсковы мурашнік ладна павялічыў цяпер значэньне навет і раней рухавай станцыі. Ішлі на ўсход. Жанчыны спасьцераглі каля дамоў грузавыя аўтамашыны, людзей у мундзірах чыгуначнікаў. Некалі добра дагледжаныя, цяпер рыжыя траўнікі скалясілі грузавікі. Скрозь ляжалі паламаныя платы, кучы хламу.

Маршалкаў павярнуў налева, на дарожку абсаджаную гонкімі маладымі таполямі. Глыбака ў гушчы дрэваў схавалася прыгожая вільля. Належала яна калісь багатаму пану Вілінскаму. З таго боку чыгунак ягоныя абшырныя і ўрадлівыя землі прымыкалі аж да мястэчка. І вільлю гэту, і самога пана жанчыны бачылі раней.

- Куды-ж гэта ён нас, ягодка?

- Нехта, мусіць, надта важны ў гэтым доме жывець, - адказала Аксеня.

На дварэ стаялі аж тры легкавыя машыны й адзін грузавік. У ваднэй машыне ззаду сядзела двух у шапках з малінавымі аколышламі. Адзін чалавек, мусіць шафёр, нешта калупаўся пад адкрытым верхам

аўта сьпераду. Маршалкаў адчыніў дзьверы двухпавярховай вільлі, прайшоў калідорам і пастукаўу дзьверы зь левага боку. Не пачуўшы адказу, лёгка прачыніў дзьверы, зазірнуў у сярэдзіну й кіўнуў жанчынам.

- Сюда! - загадаў.

Жанчыны ўвайшлі ў вялікі пакой.

- Сядайце, я зараз, - сказаў адрывіста й пакінуў жанчын.

Адна-адзіная электрычная лямпачка млява асьвятляла абклеены шэрай паперай пакой. На стале стаяў тэлефон, ляжала кніга ў чорных вокладках, у куце - трохножная вешалка. І ўсё. Шэрасьць закрывала шчыльная ваконная фіранка. А чалавек зь ледзяным зрокамзаймаў пачэснае месца на сьцяне супраць лавый бяздушна пазіраў у нейкую нявызначаную даль. На калідоры раптоўна пачуліся, а пасьля аціхлі крокі й галасы. Нехта доўга й марудна бубнеў за сьцяной. Часам спыняўся, пасьля зноў прадаўжаў памяркоўным тонам. Што й каму гаманіў гэты голас, адгэтуль цяжка было разабрацца.

- Куды гэта ён нас, ягодка, прывёў?

- Ынкавэдэ, мусіць... Відзіла гэных двух, што ў аўтамабілі сядзелі, у шапках з малінывымі аколышкамі?

- Дык гэта яны? Каб чаго, ягодка, кепскага, ні дай Божа...

- Як гэта кепскага? А за што нам такога кепскага?

- Ды хто-ж, ягодка, угадаіць іх...

Пачуліся на калідоры шпаркія крокі. Шырака адчыніліся дзьверы і ў пакой увайшоў кручканосы чалавек сярэдняга росту ў сініх галіфэ й зялёнай кашулі. Не зьвярнуўшы на жанчын ніякай увагі, адсунуў крэсла, сеў ля стала, надзеў на кручкаваты нос акуляры і ўгледзеўся ў вадчыненую кнігу ў чорных вокладках. Блеск сьвятла зьзяў на брытай, круглай як арбуз галаве. Аксеня ціханька кашлянула, але чалавек той прадаўжаў трымаць нос у кнізе. Так прайшло хвілін, мусіць, пяць. Жанчыны неспакойна пераглядаліся, ня ведаючы як разумець абсалютную абыякавасьць да іх кручканосага чалавека за сталом. А той нарэшце закрыў кнігу й пачаў павольна разглядаць іх. Цёмнарудыя вочы й маска-твар не давалі ніякага знаку пра тое, што адбывалася пад гладка брытым чэрапам. Зь кішэні ён выцягнуў сярэбраную папяросьніцу, улажыў у рот даўгую папяросу й пстрыкнуў запальнічкай. Зірнуў на сто, падняў трубку тэлефону.

- Георгий Иванович? Пепельницу у меня убрали. Да, если можете, в номере три...

Праз якую хвіліну дзьверы адчыніліся, увайшоў у пакой мужчына, паставіў на стале пепельніцу й бяз слова выйшаў.

- Што вам трэба? - спытаў чалавек жанчын парасейску.

- Таварыш Маршалкаў ні казаў вам? - спытала Аксеня.

- Я вас пытаюся, - суха адрэзаў кручканосы, - хто вы такія й адкуль будзеце?

- Мы зь Літоўцаў, - адказала заклапочаная Аксеня.

- Імя, па бацьку й прозьвішча!

Літару «р» вымаўляў паводле «г» й гэта давала камічны цень яго сур'ёзным пытаньням.

Энкавэдыст запісваў адказы. Абыякавым голасам ён выказаў жаданьне ведаць зусім, здавалася, няважныя дробязі асабістага, сямейнага жыцьця й сацыяльнага паходжаньня. Першы раз давялося жанчынам адказваць на такія пытаньні. Пераказвала пасьля Аўдоля: - Гэта-ж падумай, ягодка, як нас да костачкі пірабраў. І нашто яму ўсё гэта?

У пакоі ня было гадзіньніка й не маглі ведаць літоўскія сяброўкі, колькі часу трывалі выпыты, але прысягнулі-б, што надта доўга. Дабраўшыся нарэшце да Аксенінай ініцыятывы паслаць бальшавіцкім верхаводам падарак, кручканосы гарбуз хацеў ведаць ня толькі ўсе прозьвішчы сьмелых дабрадзееек, але навет зусім нязначныя дробязі. У бальшыні адказвала Аксеня. Кемлівая й хуткая на язык, яна добра спасьцерагала ўсялякія кручкі.

- Нашто вы ўсё гэта пытаіцеся? Што мы зло якое каму зрабілі, ці што? - ня вытрымала Аксеня.

- Я буду вас пытацца, а вы будзьце дабры адказваць, - рэзка адказаў кручканосы гарбуз. Ён колькі разоў уставаў, хадзіў па пакоі, а часам сядаў і запісваў. Літоўскім жанчынам здавалася, што селі на лаве, а прадаўжалі на іголках сядзець. Каб маглі хаця ўгадаць навошта былі гэныя даўгія выпыты.

Кручканосы чалавек падняў трубку тэлефону, коратка буркнуў нешта ў яе.

- Следуйте за мной!- загадаў.

Выйшлі на калідор, павярнулі налева. Мінуўшы колькі дзьвярэй, сходамі спусьціліся ўніз. Энкавэдыст адчыніў дзьверы і ўключыў

сьвятло. Сьцены абшырнай каморы абвешаны былі цывільнай вопраткай, а ў вадным канцы ляжалі нейкія транты, кучы газэтаў і кніжак. З правага боку жанчыны спасьцераглі драўляную скрыню рудога колеру, якраз такую, як зрабіў Кміт Тодар для высылкі падаркаў у Маскву. Энкавэдыст паволі адчыніў скрыню, дастаў адтуль жмут абрэзаў кужалю й трымаў перад сабою.

- Эта ваше? - спытаў.

Нічога не адказаўшы, Аксення выцягнула руку, узяла абрэзы. Сумлеву быць не магло: у руках трымала канцы палатна з павышываным прозьвішчамі крамлёўскіх валадароў і дабрадзеек літоўскіх. Пры гэтым разгляданьні пачалі дрыжэць Аксеніны рукі. Нешта гарачае хлынула ў твар і засеў у гарле камяк. Зірнула на Аўдолю, што ледзь магла стрымаць за зубамі язык.

- Гэта кускі нашага палатна, нашы прозьвішчы на іх. А дзе палатно? Можа паслалі бяз прозьвішчаў нашых? - адважылася Аксеня.

- Ніхто й нікуды яго не пасылаў, - спакойна й зроўнаважана адказаў энкавэдыст.

- Як гэта панімаць? Што вы хочаце сказаць?

- Ня ўсьпела даказаць, як страшэнная здагадка праясьніла галаву. Дзіва няма, што дапытваў!

- Вам зусім ня трэба панімаць. Навет лепш будзе для вас і сяброў вашых, калі ня будзеце панімаць і проста выкініце ўсё гэта з памяці сваей. Ясна вам?

Пагроза зусім выразная. Як адубеўшы, жанчыны ня ведалі, што рабіць далей.

- Я вам добрую раду дам: забудзьцеся што тут было й нікому не расказвайце пра гэта. Калі-ж даведаемся, што каму раскажыце, будзе дрэнна, вельмі дрэнна. Панятна?

- Панятна, - адказалі аднагалосна жанчыны.

- Можаце цяпер ісьці дамоў.

І цяпер, па дарозе дахаты, гучэў у вушах той пагрозьлівы бальшавікоў «савет».

- Пэўня-ж прапілі, басякі. Як ты думаеш, Аксеня?

- Вы паслужыця прымерам жэншчынам усей рэспублікі! Цьфу, басяк! - плюнула Аксеня.

Аксенінаму дрыготкаму, зласьліваму голасу адгукнуўся вецер, што скалануў вярхамі прыдарожных разьвесістых бярозаў ды пырскамі

шчодра абсыпаў дзьвюх жанчын, тэпаючых па мокрым пяску гасьцінцу.

- Паслужыце прымерам жэшчынам усей рэспублікі! Каб ты чорту ў пекле служыў, нехрыст апантаны! - паўтарала яшчэ зласьлівейшым голасам Аксеня. Адно Аўдоля азіралася пераз плячо, а Піліпава жонка быццам і ня бачыла капрызнага надвор'я. Яна рогам хусьцінкі выцерла вочы, каб стрымаць сьлёзы. Навет Аўдолі не магла цяпер у вочы проста глянуць. Які аграмадны сорам! Дый найгоршае наперадзе чакала. Ужо бачыла перад сабой чаргу дапытлівых літоўскіх дабрадзееек, што нейкім чэрцям у Маскве хацелі падарак зрабіць і якіх меншыя мясцовыя чарцягі ашукалі. І што яна скажа ім, калі гэны кручканосы гарбуз навет язык на прывязі загадаў трымаць! У глыбіні дзесь дасьпяваў і квяліў сэрца зласьлівы дакор.

- Чаго табе ўсюды першай лезьці? Пілнавалася-б во гэтай сьвіной мешалкі ці чапялы й досіць бы зь цябе. Кажу, нарвешся некалі!

Гэтыя простыя й незласьлівыя словы мужавай перасьцярогі прыгадаліся цяпер Аксені ў зусім новым сьвятле, новай шырыні. Нарвалася.

- Ну як-жа гэта, ягодка, будзіць? Што мы зробім, як бабы пра палатно пытацца пачнуць? Га?

Сьціснуўшы плечы й пазіраючы пад ногі, Аксеня маўчала. Ды што магла на тое адказаць? Звычайна бадзёрая й вясёлая, яна быццам на дзясятак гадоў пастарэла, змоўкла, асунулася. Аўдоля старалася зірнуць сяброўцы ў вочы, знайсьці нітку сувязі, якую ці ні парваў Маршалкаў і ягоны кручканосы таварыш з НКВД.

- І такі во добры чалавек нам гэты Маршалкаў паказаўся, - бубнела дробненькім голасам Кмітава пахатуха, - здавалася, што хось ты яго да раны прылажы. Помніш во, як на тых зборах гаварыў? Ён табе ажно сьлязу пусьціць. Чалавек-душа, здавалася, лепі як свой каторы... Ён як гаварыў, дык колька яшчо нашых баб у плач уводзіў. Гэта-ж здавалася, што такі чалавек як ён, ягодка, нікому вока ні запарошыць, а ня то што... Ну й паглядзі, што зрабіў. Гэта-ж проста каб бабам нашым расказаць, дык каторыя паверуць толька...

- Ты во глядзі, яшчо за даўгі язык возьмуць, - злосна адказала Аксеня. - Ці можа так скора забылася што той ынкавэдыст казаў, га?

- Ды чаго-ж ты, ягодка, кідаешся на мяне? Як гэта так я забылася? А калі ўжо пра мой язык гаворыш, дык ці-ж твой карацейшы?

- А можа й карацейшы... давай памерым! - агрызнулася Аксеня. - Гэта каб ня ты дык можа-б і ні пасылалі таго праклятага палатна... каб яно лепі праз зямлю праваліласа! Во нарабілі бяды!

- Каб ні я? - прарэзьліва-зласьлівым тонам крыкнула Аўдоля. - Гэта-ж ад каго, калі ні ад цябе думка вышла, га? Каб табе, ягодка міленькая, памяць ужо саўсім забрала, як ты ня помніш і на мяне складаеш! І як гэта ты можаш?!

- Думка-ж мая была. алі-ж я вас пыталася. А сама-ж знаеш зь якой вялікай ахвотай ты за гэта ўзялася. Зараз усім разбрахала, давай і давай, ні задзержыць цябе ніяк...

- Каб табе Бог так здароўе даваў, як я давала! - адсекла Кміціха. - Каб ты ў пекле так брахала, як я каму разбрэхівала! І як табе ня стыдна на мяне складаць! Калі Маршалкаў цябе пахваліў, дык як каралеўна якая - галава аж пад неба, жардзіной ні дастаніш! - хадзіла. Ах каб цябе!

Аксеня здрыганулася. Быццам укушаная гадзюкай, яна зь нянавісьцю зірнула на Аўдолю, сьціснула вусны. Спачатку ледзь заўважна, пасьля-ж раптоўна пачало дрыжэць ейнае цела. Неўзабаве неўтаймаваны плач суправодзіў Кмітаву Аўдолю. Аксеня дала сьлёзам поўную волю. Разгубленая Кміціха памкнулася прыгарнуць да сябе сяброўку, але на паўдарозе спынілася выцягнутая рука.

23

Ноччу зазімак пацярушыў сьнегам, мароз кволымі жылкамі-нэрвамі выпрабоўваў сваё майстэрства на тонкіх скарынках лёду ў лужынах, канавах і сажалках. Раніца прыйшла ясная, сьвежая, спакойная. Каб хоць адной галінкай паварушыў маестатычны гаравацкі Архіп. Яшчэ бліжэй, здавалася, прыхіліліся да сябе зьбялеўшыя сёстры-сосны на могільніку. У Гаравацкай пушчы й ліпавіцкіх гаёх на дэманстрацыю прыбраліся ў новым бельлі стройныя сосны й хвойкі. Яны зьзялі ў сонцы й маглі хваліцца сваей пышнай прыгажосьцю перад голымі бярозамі, клёнамі й асінамі.

Далёка чуваць былі галасы пеўняў над ранкам. Слупамі выпрасталіся над комінамі дымы. Асьцеражней хадзіла ў пушчы

розная жывёльная малеча. Мёртвая маўкліня спрыяла большым дзяруном, што цяпер на помач носу паклікалі й свае вушы.

Вялікая грамада літоўскіх сялян набліжалася да ліпавіцкага поля. Радасьцю зьзялі вочы й далёка над бельлю прыцярушанымі роўнымі нівамі сягала вясёлая, нястрыманая гамонка.

- Зямля наша! Во калі зажывём!

- Дачакаліся! Цяперака, як свой кусок зямлі мець будзеш, дык ніякі прыблуда з твайго мазаля ня будзіць жыць. Сам сабе будзеш пан!

- А як-жа!

- Ды і во яшчо што: казаў Косьцік, што кажны можа мець зямлі колька захочыць! Ого!

- Ні колька захочыць, а колька абрабіць можыць.

- Ну яно-ж сябе так...

- Дык ці-ж ты думаеш, што каторы паквапіцца каб мець болі зямлі чымся абрабіць будзіць магчы?

- Нашто-ж яна тады яму?

- Нібыта па шэсьць актараў на аднаго каня...

- Ну а як каторы ні маіць каня?

- Дык дадуць...

- Толька-ж і глядзі, рот настаўляй, каб ні праваронiў як будуць даваць.

- Усё дадуць, усім хопіць. Вунь дзе колька ўсякага дабра на маёнтках і хвальварках...

- Ну паглядзім.

- Што тамака глядзець... ужо відаць.

Бадзёра сьлядзілі прысыпаны сьвежым белым пухам гасьцінец сялянскія ногі. Грамада кіравалася на прасторныя, урадлівыя гоні, што за чыгункай суседзілі зь літоўскімі начоўкамі, а з захаду канчаліся сьцяной гонкага гаю. Пракоп з Алесям маўкліва ў хвасьце валакліся. Новы грамадзкі тэрмамэтар выпхнуў іх ці не на самае чало «прыгнечаных і эксплуаціруемых» масаў, значыцца тых, пра каторых найбольш барабаніла й быццам клапацілася «народная ўлада». І будучыня перад імі можа прасьцерлася проста й прывабна, як тыя ўрадлівыя гоні, калі-б не мясцовыя «косткі ў горле». А косткі гэныя - Бурак Косьцік і Шпунт Лявон - дзесьці ўрачыста й фанабэрыста крочылі на самым перадзе грамады.

Дваіўся ў Пракопавай галаве сьвет. З аднаго боку - вялізная прынада спорнага кавалка ўрадлівай зямлі. Мара пра зямлю ўжылася, уелася ў жывое сялянскае цела й сьведамасьць з пакаленьняў далёкіх. І ці-ж запраўды Ўсемагутны наканаваў яе зьдзяйсьненьне сьціпламу й працавітаму Пракопу? Вунь-жа перад ім, як вокам абняць, вялізныя, урадлівыя, жыцьцядайныя панскія гоні. Колькі-ж папацеў на іх пры працы на чужога прыблуду! Цяпер-жа во ягоныя хаджалыя, вытрывалыя ногі скора ступяць на гэныя гоні. Адмеруць яму ладны кавалак і вось у гэты незабыўны дзень Пракоп назаве сваім, для сябе й нашчадкаў на векі вечныя.

І тачыў Пракопава эмацыянальнае нутро, не даваў супакою думкам чарвяк трывогі. Як пагадзіць адносіны двух мясцовых злыдняў да яго з новымі парадкамі зьверху?

Не магло быць сумлеву, што бальшавікі бедным сялянам зямлю давалі, паноў ліквідавалі. Значыцца, сумленна працуй, старайся, дык і табе й людзям будзе ўволю. Гэта-ж вунь пазаўчора, зь Беластоку вярнуўшыся, абедзьве «косткі» пра гэта расьпіналіся. Праўда, плявузгалі й іншыя, - насамперш Маршалкаў - і раней, ды ніхто зь іх не называў часу калі нарэшце абяцанкі зьдзейсьняцца. Гэтыя-ж во насамперш шырака пастановы беластоцкага сходу размалявалі, слова ў слова прачыталі ўсё, што было прынята для паляпшэньня долі сялянскай дый зараз узяліся тыя пастановы ў жыцьцё праводзіць.

Затуканаму-загуканаму мужыку, якога чужыя й свае паны стагодзьдзямі абскубалі, можыш нагаварыць мільёны прыгожых слоў і яны нічога ня будуць значыць у параўнаньні з прыгоршчамі ягонай уласнай урадлівай зямлі. Няхай яго сабе зь няверным Тамашам побач паставяць: не дакранецца рука зямлі дык і не паверыць.

Лёгка пераплюнеш біблійнага недаверка, калі брату твайму сярмяжнаму зь няпамятных гадоў розныя прыблуды сёмае неба абяцалі, а ўсё да гвалтаў і рабункаў зводзілі. Дзіва няма, што й абяцаньні «улады народнай» сяляне адразу пад абстрэл узялі. Вывялася-ж яна з таго самага кодла, дзе некалі спачатку ўзбуйнеў і растучнеў, а пасьля прадзедаў іхных у прыгон загнаў сама ненажэрны й прагавіты «самадзержац». Праўда, тупее гадамі памяць людзкая й мала дзе ў краіне пагвалчанай жылі яшчэ сьветкі таго найбольшага й найжахлівейшага народнага паўстаньня. Літоўскі-ж патрыярх Якуб - атожалак часоў сівых-бурлівых, звычайна маўчаў, але пры нагодзе

патрапіў раскалупаць балючую рану народную. І за што тады змагаліся? За волю, за кавалак зямлі свае, за тое, каб маскаля пазбыцца... Колькі яшчэ песьняў з тых часоў датрывала...

Мо й прыйшоў нарэшце зьдзекам канец? Мо й запраўды перамянілася на лепшае? Мо й сам згрыбелы дзед літоўскі дачакаўся адплаты за ахвяры паўстанцаў Каліноўскага, мо й нарадзілася тое вечна чаканае, ніколі неасягальнае «сьветлае заўтра»? А можа гэта ўсё - стары хвальш і абман у новай хворме?

Разважаючы такую магчымасьць, - а была яна надзіва рэальная, - аблівaў Пракопа пот сьцюдзёны, цяжка валачыліся наперад ногі і ў вачох цямнела. Кволае здароўе ледзь давала вытрымку такім духовым выпрабаваньням. Калі-б не насеў Алесь, не пайшоў-бы, мусіць, на падзел зямлі.

- Плюнь ты, швагрок, на басякоў гэтых. Яны-ж толька тое робяць, што ім зьверху загадаюць, - тлумачыў Алесь. - Гэта-ж ня Косьцікава й Лявонава ўласьць, а новая, савецкая, каторая ўсім чысьцінька,што працуюць зямлю во даць хочыць. Ну а як даюць, казаў той, дык бяры...

Пракоп уважна зірнуў на швагру. Гаварыў той самы чалавек, каторы нядаўна яшчэ так камплетна й згодна патаківаў яму, што басякі свае й чужыя да ўлады дабраліся. Неадступна назаляў вочы пабіты напокуці абраз Прадславы й аж цяпер трасло жыватом пры згадцы сьмярдзючай самагонкі, каторую сілай лілі.

«Калі даюць, дык бяры, а як б'юць, уцякай». Разумная, ці ні адвечная, ад калыскі прыжытая праўда. Адно-ж - процілежнасьці.

Уверх дном нейкую вялікую жыцьцёвую пасудзіну перакулілі. Вазьмі хаця млын той. Жорны бакамі вылазяць. Гэтта ў памяці шматразовыя вандраваньні на млын у Гаці і ў Докшыцы, гэтта й сьлязьлівы, змораны Сявенька, гэтта й шчодрыя дакоры й балючыя пытаньні. А прыгадай бясконцыя чэргі за нафтай, хлебам, сольлю, цукрам, не гаворачы ўжо пра які трант, каб цела прыкрыць. Што гэта? Парадак ці арганізаваны хаос? І як знайсьці цэлы корань ладу нейкага, калі з аднаго боку няспынны паток абяцаньняў бурліць, а з другога - галеча й безгаспадарлівасьць.

Лягчэй было-б Алесю ў новыя парадкі ці беспарадкі ўжыцца. Нідзе далёка ад вёскі нагой ня ступаў, а хоць і кемлівы быў мужчына, вока ягонае так далёка як Пракопава, не сягала. Ня быў Алесь на працы ў Петраградзе, ня зьведаў ніякага далёкага сьвету й не пацярпеў

ад мясцовых двух злыдняў. Пракопу-ж абрыдзеў і вялікі, чужы горад і куды больш дапяклі, чаго ў магілу не загналі басякі гэтыя.

Пакідаючы збоку пытаньне пра сваю й Алесяву жыцьцёвую дасьветчанасьць, адзін факт, можа асноўны ключ, усіх ягоных турботаў, трымаў у галаве Бахмач. А факт гэты, як сьвет абжыты і ўсім вядомы, сьветчыў, што не магла існаваць ніякая, ня толькі вялікая й магутная дзяржава, калі ня было ў ёй парадку, устаноўленай заканамернасьці. Як ні ганьбавалі ўжо цара калішняга, ды ўсё-ж пад панаваньнем ягоным кажны бачыў нейкую заканамернасьць, дысцыпліну й парадак. Гэтта-ж гавораць і абяцаюць адно, а робяць іншае. Траціўся давер і да гэных, што наверсе, не гаворачы ўжо пра злыдняў, што на сваім сялянскім хлебе вырасьлі. А мо ўвесь гэты беспарадак і быў новым парадкам?

Пракоп жахнуўся пры такой новай думцы. Калі-б так было, дык навошта й каму гэта патрэбна? Дзяржава-ж мусіць жыць, усе часьці ейнага арганізму мусяць пасьлядоўна сваё рабіць. Глядзі во што будзе навет у тваей собскай гаспадарцы калі, скажам, ладу ў сям'і няма...

- Нешта-ж ты надта надуўся, - пачуўся голас збоку.

- Га?

- Кажу, што з табой? - спытаў Пракопа Алесь. - Ці табе яшчо ніздаровіцца?

- Ды нічога, так сказаць... от думкі...

І яны йшлі далей.

- Казаў табе раней, - прадаўжаў Алесь, - што німа чаго надта думаць. Даюць дык бяры.

Трымаў прымаразак і скрыпеў пад нагамі тонкі сьнег. Пракоп не азіраўся па бакох, не заглядаў у вочы Алесю адно праз кут вока маячыў шваграў сілуэт. Разьвярэджаныя думкі выклікалі больш пытаньняў чымся даходзіла адказаў. Дзесьці ў глыбі сьведамасьці загнязьдзіўся закаранелы, небясьпечны страх. Дакараў сябе Бахмач за тое, што ці ні шукае дзіркі ў цэлым, намагаецца лішняе выдумляць. А мо ранейшы перапалох яшчэ трымае? Гэта-ж ні жарцікі, так бакі набілі, гэтак пазьдзекваліся, што цяпер і бацьку роднаму цяжка паверыць было-б.

А мо бязладзьдзе гэтага новага ладу адно часовае зьявішча? Самі-ж бальшавікі ні раз казалі, што «ні адразу Маскву пастроілі», трэба «абаждаць», усе такія малыя недарэчнасьці, як чэргі пры крамах, ці нейкі млын, каторы ня можа зь мліваm справіцца - зьявішчы

пераходныя, спрычыненыя тым, што разбураецца стары й будуецца новы парадак. Вось дзе яно: «новы парадак». Гэты «парадак» на ўсе спосабы скланялі, сялянскія вушы ім абтрапалі. А ад чаго пачынаецца «новы парадак»? Ад разбурэньня й беспарадку?

«Эх, можа й шукаю дзіркі ў цэлым», - думаў Пракоп. - «Дадуць, дык вазьму, а што пасьля... адбяруць, дык адбяруць...» Гэткім канчатковым выснавам падбадзёрыўся Пракоп і зірнуў навокал. Пярэднія сяляне згрупаваліся ля гасьцінцу на малым сугры, што да забароненай зоны прымыкаў. Зонай гэнай быў ладны кавалак поля, абгароджаны высокім плотам з калючым дротам. У вадным куце загарадкі, далекавата аж пад ліпавіцкім гаем ляжалі стосы мэталёвых бочак. Казаў нехта, што ў бочках бінзіну трымалі. Ля тога кладу бочак відаць было двух жаўнераў у даўгіх шынэлях, з пупаватымі будзёнаўкамі на галовах і штыкамі на стрэльбах, пераз плячо перавешаных. Бліжэй пад ліпавіцкі сад, абкапаныя зямлёй, тарчэлі рулі гарматаў, ці ня зэнітак. Вартаўнікі былі й каля гарматаў.

Літоўскія сяляне маўкліва пазіралі на Косьціка.

- Так вот, значыцца, - пачаў Сабакевіч звонкім голасам, - будзем браць, значыцца, па алфавіця. Хто першы ў нас?

- Бахмач, мусіць?

- Ну так, ён-жа на «бэ».

- Давайце яго сюды! Таварыш Бахмач, сколька зямлі вам?

У Косьцікавым голасе гучыць звычайная дзелавітасьць, ні іроніі, ні пагрозы. Азіраючыся на швагру й вясковых, Пракоп падыйшоў да Сабакевіча. Абапёршыся на змайстраваны зь бярозавых прутоў трохкутнік, сьмярдзеў з боку карашкамі Захарук, нехлямяжа трымаў у кішэнях гладкіх портак рукі Шпунт Лявон і калоў маленькімі вочкамі старшыня камбеду.

- Сколька вам зямлі, спрашываю? - паўтарыў Косьцік.

- Як гэта? - перапытаў Пракоп. - Колька-ж дадуць...

Як перапалоханы заяц, Пракоп недаверліва сачыў начальнікаў. Калі-б заміж абяцанага кавалка зямлі пачалі ў бакі камшыць, - дай Божа здаровыя ногі.

- Дадуць... дадуць! - гарэзьліва перакрывіў Косьцік. - Спрашываю, сколка хочаш?

- Дык значыцца можна колька хачу? - ня верыў Пракоп.

- Табе-ж кажуць: бяры колька хочаш! - прыкінуў Тодар.

- Яно-ж так, - пацьвердзіў голас у грамадзе.

- Калі так... дайце восім актараў, - асьмеліўся Пракоп.

- Ну вот, так даўно сказаў-бы, - выцягнуў правую руку зь кішэні Шпунт.

- Так і запішам: Бахмачу восім актараў. - пацьвердзіў Косьцік. - Пішы, Лявон. А вы, - зьвярнуўся да Захарука й Пятуха, - бярыце й мерце. Там відзіця гэны куст пры гасьцінцы? От ганіце трохвугольнікам прама на яго. Як адмерыце сколька да яго метраў, тады адшчытаім сколька палагаіцца ўшырыню. Панятна? Ты, Лявон, шчытай сколька квадратных метраў далжно быць.

- Па дзесяць тысяч на актар, - нядбайна адказаў калішні драгомішч.

- Знаю й бізь цябе, - зірнуў іранічна Косьцік. - Запісвай і шчытай сколька ўсяго.

Лявон выняў зь кішэні блакнот і ўзяўся запісваць.

- Дый ні забудзь, што трэба плян па распрадзяленьню зямлі начарціць і пасьля ў сільсавет пірадаць, - паважна закончыў Сабакевіч.

Перастаўляючы бярозавы трохкутнік, Захарук пасоўваўся пад чыгунку. Побач яго шкандыбаў, копцячы «казінай ножкай», старшыня камбеду.

- Семдзесят тры, семдзесят чатыры...

Захарук спыніўся перад слаба сьцятай лёдам лужынай.

- Абыйсьці, ці як? - спытаў Пятуха.

Лужына была вялікая. Абыходзячы, дакладна не адмерыш.

- Чорт яго знаіць, - плюнуў Сымон, выцягнуўшы з роту «казіную ножку». - Давай бокам, німа чаго мачыцца.

Асноўная група сялянаў, між імім колькі жанчын, трымалася на сугры. Некаторыя-ж сігалі перазь ніву, узараную пад зяблівa, прысыпаную сьнегам, наглядаючы, мусіць, лакомы кавалак.

- Эй вы, там! - гукнуў Сабакевіч, - ня крывіце, ідзіце прама на куст, як палагаіцца!

Захарук і Пятух азірнуліся.

- Дзе тутака прама, разумны гэткі! Ідзі сам памачыся! Калі Пракопу пару мэтраў даўжэй ці карацей дык біда вялікая! - адказаў голасна Захарук. - Ты што гэта ўлегцы шкандыбаіш а я сам раблю? - зьвярнуўся да Пятуха. - На, рабі!

Старшыня камбеду ўчэпіста ўзяў трохкутнік і пачаў мерыць.

- Сколька ты нашчытаў? - спытаў Захарука.

- Восемдзесят два.

Нагналі іх Тодар Кміт і Сымонаў брат Уладзімер. За хвілін пяць дайшлі да вызначанага куста. Войстрай сякерай Тодар высек таўсты лазовы кол і ўзяўся ўбіваць яго.

- Сколька там нашчыталі? - крычэў зьверху Лявон.

- Сто дваццаць два.

- Давайце назад!

Мужчыны не сьпяшыліся.

- Ты, Лявон, запісвай, а вы, мужчыны, мерце ўпоперак. Як угаварыліся, будзім мерыць па сто метраў, знакі стаўляць. Так будзіць лягчэй падшчытываць.

Дайшлі зь Літоўцаў людзі. Ніхто надта не сьпяшыў мерыць. Устанавілі парадак надзелу па альфабэце, адмерылі мяжу ля забароненай зоны. Адны мерылі, іншыя загадвалі, трэція калы ўбівалі. Праца пайшла хутчэй пасьля асваеньня тэхнікі распадзелу.

- Гэта-ж, мусіць, ці ні сама найлепшая панская зімля. Га, тата? - спытаў Пракопа Мікола, што прычыкільгаў пазьней і цяпер разглядаў ніву. Пракоп адказаў не адразу. Быццам ня верачы ўсяму, што навокал адбывалася, ён нейкімі задуманымі, адсутнымі дзесь вачмі блудзіў па адмеранай яму зямлі, затрымаўся даўжэй на вялікім полі, дзе распаўзьліся літоўскія, дый спыніўся на тым галоўным гурце, што відаць быў на круглаватым бохане аж над лесам.

- Гэта-ж так, сынок... тутака ў пана, што ні пасеіць, дык радзіла, як на лес гледзячы расло... Пшаніца, як золата! Праўда, калі ўзяць лён, дык той зямлю лягчэйшую любіць, а як на бульбу, асабліва-ж гутманку, дык толька падглінак. Ну алі будзім глядзець. Кусок спорны, даў-бы толька Бог здароўя дый каб яно так было, як абяцаюць...

- А што мы тут пасеем, тата? - спытаў Янук.

- Га? Ды вось я хаджу й пра гэта самае думаю. Азіміны-ж ужо ні пасеіш, дый ў пана тутака й была сёлета азіміна. Дык, мусіць, каб зь ярыны што... Цяперака-ж думаць трэба чым гэта засеіш. Пакуль тая вясна, дык глядзі унь - мышы ў клеці з голаду ногі выцягнуць. Зімля то зімля, сама не засеіцца. Каб урадзіла дык і зярно добрае трэба. А дзе яго возьмеш?

- А можа дадуць, тата?

- Ні знаю, сынок, пра гэта яшчо ні гаварылі. Трэба будзіць папытацца.

- Алі-ж і пекная ніва! - захапляўся Мікола. - Ты-ж, тата, мусіць надта рад, што такую далі.

- Чаму-ж не, кусок зямлі добры, німа чаго сказаць.

Пракопавы вочы зазьзялі адно на часіну. Былі гэта вочы, зь якіх блеск радасьці прабіваўся як сонца з густых, завалокшых неба хмараў.

Пытаньне насеньня абмяркоўвалі з Алесям, якому далі кавалак зямлі за тры дзялкі ад Пракопавага.

- Трэба-ж варажыць, што начальства маіць галовы на плячох і мусіла пра гэта падумаць. Яны-ж знаюць, што многа ў каго ня будзіць чым засеіць, дык можа з панскага дадуць. Вазьмі сабе хоць каго з гэтых, каторым зямлю дзеляць, дык колька, ты думаіш, зь іх насеньня маіць... А ці-ж на тое зямлю даюць, каб пуставала?

- Яно-ж сабе так, ну паглядзім, - згадзіўся Пракоп.

Даўгі, жаўтавата-буры кажух Косьцікавага бацькі Паўлюка поламі гойдаўся ў такт нехлямяжаму кроку ягонага ўласьніка. Бурак спыніўся на гасьцінцы, разгледзеўся й паволі прыбліжаўся. Ён затрымаўся, доўга сачыў што робіцца за ваеннай загарадкай ды, пару разоў кашлянуўшы, зноў зрушыў зь месца. Пракоп і Алесь загадкава прыглядаліся гэтаму «няпрылюдку», як яго ў вёсцы называлі. Кажух выглядаў, як быццам адно што з-пад іголкі. Гэты факт зьдзівіў Бахмача й ягонага швагру. Скнара Бурак звычайна паказваўся ў людзі ў старых рызманох. Выдатна пашыты кажух усьміхаўся спэцыяльнымі аздобнымі гузікамі й прыгожым узорам на грудзях.

- Здарова, мужчыны, - гукнуў Бурак.

- Здароў, Паўлюк.

- Віджу гэта, што мой начальнік мусіць ужо адрэзаў вам па добраму куску. Як яно тут?

Ён абапёрся на таўставатую аздобную ляску й пазіраў то на мужчын, то на гоні, то пад лес, дзе трымалася галоўная грамада.

- Ды-ж адрэзаў, ага, - адказаў Алесь.

- Гэттака-ж во мусіць ці ні самая найлепшая зімля, - гаварыў Бурак. - Як гэта яна вам папалася й чаму вам?

Алесь зірнуў пытальным зрокам на Пракопа.

- Як тутака табе сказаць чаму... Ды во пачалі дзяліць па фаміліях, як яны па алфавіця йдуць дык і папалася, - паясьніў Пракоп.

- Ага, от яно як. Добры-ж, надта добры кусок. Хто-ж гэта ні знаіць, калі пры дарозе во, на воку ўсім...

У Бураковых шэрых вачох успыхнула іскрынка ці то зайздрасьці, ці прагавітасьці. Рэдка бачылі людзі гэтага мужчыну ў грамадзе і яшчэ радзей гаспадарыла ўсьмешка на ягоным твары.

- Ну а сам-жа бярэш? - спытаў Алесь.

- Гэта зямлю, ці што?

- Ага, зямлю.

- А думаеш, што дадуцць і мне?

- Ну а чаму-ж не? Свой-жа начальнік, як сам ты сказаў, дык чаму-б ні далі... Кажуць-жа, што даюць кажнаму, колька хто захочыць.

- Гэта ты, Алесь, зь мяне кепікі строіш, ці што?

Сухі кашаль вырваўся гвалтоўна. Паўлюк нахіліў каўнер, зашпіліўся. Кашаль трываў даўгавата. Неяк дзіўна зірнуўшы на мужчын, бяз слова на адыход, Бурак пашкандыбаў у той бок, дзе трымалася большая грамада.

- Кажух во новы з кубла выцягнуў, мусіць, бо кашаль пярыць. Нябось, прагавітасьць ці ня мерку пірабрала ды сілаў ні стаець. Ці ні хацеў-бы во яшчо зямлі кусок, але нашто яна яму ўжо, - гаварыў Алесь, калі пайшоў Бурак.

- А ці ён-жа мерку знаіць? - спытаў Пракоп.

24

Сявенькава Марыля таўкла ў ступе мак. Ступа стаяла ў куце ля дзьвярэй і жанчына часта пазірала на маленькага сына Валодзьку, што забаўляўся зь ягняткамі. Пазаўчора акацілася авечка й муж прынёс двое чорненькіх, зь белымі залысінкамі, ягнятак у хату, каб пазабаўляўся сынок. Цяпер дзесь з аўчарні далятала голаснае бляяньне маткі.

Упарадкаваўшы раніцай статак, Сявенька напакаваў два мяхі рознага дабра й павёз да Жыда ў Гаці, каб на нафту, соль ці цукар памяняць. Пакуль новыя ўлады не забралі прыхаванага, ў знаёмага крамніка мусілі трымацца запасы. Сявенька мяркаваў, што лепш было зайсьці праз заднія дзьверы, або й пераплаціць, чымся гадзінамі ў

чарзе пры дзяржаўным «гарпо» калець ды можа з пустымі рукамі дамоў вяртацца. Ды каму-ж у тую чаргу йсьці? Собіла людзям сем'і большыя мець. А дзе возьмеш час, калі сам адзін у гаспадарцы? Таму здавалася Сявеньку, што найлепшым быў шлях замены тавараў воддаль ад вока людзкога.

- Сынок, ты-ж памаленьку, ня душы іх! Што-ж ты робіш?! Я-ж цябе!

Марыля падбегла да замурзанага Валодзькі, каторы моцна ашчаперыў ягня за шыю. Маці выхапіла яго й паставіла на кволыя яшчэ ногі. Лёгка, шкадуючы, дала малому па руках і пагрозьліва памахала пальцам.

- Кажу табе, няможна душыць, ніхай бегаіць! Ато біць буду, во!

Валодзька-пястунок, прыгожы кругленькі нямыцька, зарабіўшы ад маткі па руцэ, скрывіў вусны й зморшчыў твар.

- Ну ні плач, ні плач, золатка, ня трэба, - патоліла матка, схіліўшыся на паўзунком. Малы слаба яшчэ на нагах трымаўся.

- Кажу-ж табе, гуляй зь ягняткамі, алі ні душы іх. Ды іх во можа лепі да маткі было-б... чуеш во, як бляець...

Марыля адной рукой трымала ягня, а другой гладзіла сына па галаве.

- Глядзі во, якая пекная авечачка. Ну скажы, як авечачка маму кліча: мэ-э-э-э-э-э!

Шустры Валодзька не хацеў, мусіць, паўтарыць, як ягнятка маму кліча. Ён хутка падпоўз да ягня, згроб яго за ногі й моцна, зь вялікай адданасьцю прытуліў да сябе. Ягнё пачало вырывацца, колька мага сілаў.

- Кажу-ж табе, ні душы! Ах ты, смаркач ніпаслухмяны!

У прыплыве раптоўнай злосьці Марыля схапіла хлапца й адвесіла поўнай даланёй па азадку. Сынок-пяштунок быццам гэтага й чакаў. Як на сыгнал, ён залямантаваў голасна.

- Ну ні крычы-ж во, як-бы цябе хто на кавалкі рэзаў. Чорт яго ведаіць, бацьку гэтага... казала во, што болі бяды, чым пацехі будзіць... нашто было прыносіць? Тая ў хлеве горла дзярэць, а гэты ў хаце. А ну вас!

Марыля жвава павярнулася падбегла да лавы, зьняла ручнік зь дзежкі й зірнула ў сярэдзіну яе, ці падыйшло цеста.

- Трэба во канчаць мак таўчы, булкі рабіць ды ў печ садзіць, а ты мне ні даеш, - махала Марыля пальцам на сына. - Колькі разоў назаляла язык, прасіла бацьку, каб таўкач меншы зрабіў, бо гэты чаго руку ні адравець... Ну гуляй, сынок, гуляй.

Валодзька сядзеў пасярод хаты на чыстай жоўценькай падлозе, цёр вочкі, недаверліва паглядаючы то на матку, то на ягнят, што бляялі й церліся адно ля другога ў куце пад сталом.

- Трэба во найлепі іх да маткі занясьці. Ніхай пасасуць, бо галодныя ўжо.

Гэтак гаворачы, Марыля ўзяла ягнят і выбегла на двор. Матка сустрэла дзяцей радасным бляяньнем, зь нейкай удзячнасьцю зірнула ў Марыліны вочы й не пасьпела як сьлед лізнуць сваіх дзетак па галовах, як тыя ўзяліся таўхаць пад вымя, варушачы куртатымі хвосьцікамі. Абнюхаўшы дзетак, авечка задаволена бляяла, а Марыля мяркавала як гэта прыгожа Бог надарыў жывёл мілым адчуваньнем мацярынскасьці й дбайлівасьці пра малое, новонароджанае. З гэткімі думкамі, прычыніўшы дзьверы ў хлеве, жанчына сігала праз шырокі двор да хаты, на хаду зірнуўшы на шэрае, золкае неба, што волавам павісла ўверсе. Невялікі чорны Мурзік, узрадаваны сустрэчай з гаспадыняй, раптоўна павярнуў дарожкай пад гумно й гулка забрахаў. З гумна на самакаце прыбліжаўся Сабакевіч. Адно на момант спынілася Марыля, ямчэй забілася ейнае сэрца й хутка пабегла ў хату.

Зрабілася млосна, разам і горача й сьцюдзена, дрыжыкі па целе бегалі. Гэтта й страх, і чаканьне новага, няпэўнага, няведамага. Забылася пра цяжкі таўкач у руцэ, каторым цяпер з падвойнай сілай таўкла ў ступе й адно адчувала як слабеюць калені, як зьнясіліла нейкая дзіўная млоснасьць.

Прыгадалася летняе, ліпеньскае, на польнай сьцежцы між жытніх васількоў. З Гацяў ішла. Заварожаная дзіўнымі гукамі прыроды, сама як краска «на амэрыканцавым хлебе» разбуйнеўшы, цягнула пад носам нейкі дзявочы раманс і жадала, каб вось так у няскончанасьць ішла, каб гэтак заўсёды побач красавалі-усьміхаліся васількі, прынаджвала на межах шыпшына, ківалі на спатканьне махрыстымі чубамі фанабэрыстыя прыгажуні бярозкі ў гаю. Дзявочасьць ейная скончылася й ня скончылася. Муж быў той і ня той. Ён то й любіў, і шанаваў яе, ён і перасьцярагаў, каб не перапрацоўвалася, але вось прыходзіла ноч і заміж тых чаканых, дых забіраючых мілых абдымкаў,

пачыналася крактаньне, нямогласьць, нараканьне. Ці гэтак маладая, гарачая, поўная энэргіі дзеўка замужжа сабе ўяўляла? А гэта Васіль пад бокам надзіў. Там-жа далей стаяў бравурны, баявы, закаханы, пагрозьлівы Косьцік. Ды часам здавалася, што нічога гэтага ня было, што ўсё гэта - ява, сон нязбыты. Было адно неба й сонца, песьні жаваранкаў і васількі й каласілася жыта.

Ён вырас пасярод сьцежкі вялікі, магутны й пагрозьлівы. Ад нечаканасьці, зь перапалоху хацела крыкнуць, кінуцца ў густую сьцяну збажыны, але абамлелі, ацяжэлі ногі. Стаяла дрыжачая, няпэўная. Было ў гэтага дзяцюка нешта, што скоўвала яе волю, параліжавала рухі. Буян, крамольнік, вязень, начная птушка, крот, што ад уладаў вечна скрываўся, ён у памяці ейнай юнацкай неадступным гаспадаром стаяў, як ніхто іншы верадзіць сэрца маладое патрапіў. І каб ні бацькі...

- Ага, птушачка, злавіў! - сустрэў ёмкі, звонкі голас. - Што-ж, думаеш уцікаць цяперака ад мяне? Паспробуй!

Не жартавалі валадарныя, наважаныя вочы. Энэргічнасьць відаць была і ў шырокіх, прыціснутых поўных вуснах і навет у нябрытым падбародку. - Ты што-ж гэта за старога, крэкчучага ханжу пашла? За зямлі кусок, га? Табе што, мая любоў - гэта гной пад нагамі, каторы таптаць можна?

Прыгадвалася пасьля, што кінулася ў бок інстынктоўна, без папярэдняе развагі. Колькі ў нагах моцы, бегла нацянькі праз жыта. Сьцёбалі па твары каласы, займала дыханьне. І як спыніла бег, вялікім малатком біла сэрца ў грудзёх. Усьведаміла, што не так самога цялеснага Сабакевіча, як свае слабасьці баялалася. Адна маленькая неразвага дый ня будзе павароту назад. Сьведамасьць здрады чалавеку, што гадамі бацькам ей мог быць, іржой разьесьць будучыню. І задаволеная была, што ўстрымалася. Былі сустрэчы й пазьней, але заўсёды на бок ладзіла віхнуць.

Аж прысядаў, заліваўся браханьнем Мурзік перад дзьвярмі сяней. Раптам заенчыў, у бок адскочыў. Енк суправодзіў басісты, злосны Косьцікаў мат. Марыля забылася пра Валодзьку, заядла таўкла мак, а ў сэрцы нарастала трывога. Пачуўся кароткі й моцны стук у дзьверы. Затрымаўся ў млоснай руцэ над ступай таўкач і маці разгубленым позіркам кінула на сына.

Шырака адчыніліся дзьверы й цьвёрдым, упэўненым крокам увайшоў у пакой Сабакевіч. Чырвоны, новенькі, вышываны ля каўняра

кажушок, расшпіленая кашуля, з-пад шэрай кепкі пазіралі буйныя валосы. Косьцікавы вочы пабеглі насамперш па пакоі, затрымаліся на Валодзьку й пасьля павандравалі на Марылю.

- Што-ж гэта ні адчыняеш? Ні пазнала можа?

Марыля загарэлася чырваньню ў твары й пазірала ўніз.

- Сама дома?

Голас намагаўся трымаць лагодным, хоць няцяжка было спасьцерагчы, што рабіў гэта з намаганьнем.

- А ты што, ня ведаеш? Мусіць падпілнаваў, калі так сьмела ў хату лезеш.

- Што такое падпілнаваў?

- Ды што майго дома німа.

- Чорт яго, тое старое парахно, пілнаваў. Думаеш баюся яго ці што?

- Ну дзе-ж табе баяцца...

- Во, во, правільна кажаш, Марыля, баяцца мне німа каго, асобінна такога старога кулака, як твой.

Косьцік зрабіў пару крокаў, затрымаўся перад Марыліным сынком. Малы баязьліва пазіраў на вялікага дзядзьку ў чырвоным кажуху.

- Як гэта кулака? - адвярнулася Марыля ад ступы.

- Гэ-гэ, - усьміхнуўся Ромкаў гаспадар. - А ты-ж, дурненькая, мусіць і ні панімаіш. Гэтак савецкая ўласьць называіць людзей, каторыя многа зямлі й багацьця маюць ды чужы труд іспользуюць. Эксплуататары. Памімаіш? Гэта ўрагі народа. Іх на Сібір вывозяць патаму, што яны проці гасударства. Да, врагі народа, іці іх маць! І твой тожа ўраг народа, кулак!

Від заклапочанай, прыгнечанай нечаканым цяжарам ягоных словаў жанчыны міла казытаў Косьціка недзе ў грудзях. Гэта тая самая, некалі пераборлівая дзеўка, пышная ластавачка-гарэза, каторую яму, Косьціку, ніяк не ўдалося ў рукі свае цапнуць. Цяперака-ж яна вось вось гэтта перад ім, у ягонай сіле. Выцягвай руку й бяры, гарні да сябе. А як пахарашэла, як увыдатніліся яе ранейшыя прывабнасьці. Мусіць праўду кажуць, што жаночая прыгажосьць пасьля першага дзіця расьцьвітае. Гэтак і Марыля. Як дрыготка-прывабліва ходзяць пад тонкай паркалёвай поўныя, тугія грудзі, як пахарашэў увесь ейны

стан і навет, здаецца, папрыгажэлі ногі. І цяпер яна, гэта цаца, «расавая кабыла» поўнасьцю ўжо ягоная, бо нікуды ад яго не ўцячэ.

Юрлівым туманам зацягнула дзяцюковы вочы. З салодкай сьведамасьці, што некалі недаступная дзяўчына цяпер поўнасьцю ягоная, думка раптоўна таўханула ў зусім іншы бок. Вось пад нагамі вывадак. Цюцелька ў цюцельку парабок Вася. Значыцца стары кулак-ханжа навет і ў пасьцелі ня змог... Косьцікава каляровае ўяўленьне рэзкімі штрыхамі намалявала недаступную яму калісьці ластавачку-мару ў абдымках нямоглага й крэкчучага Сявенькі. Стары, недалужны клоп на красцы прыгожай. А Васіль парабок, на помач яму... Нешта кальнула Косьціку пад грудзьмі. А жанчына вось аж дрыжыць ад жаданьня, ёй адно давай ды давай... І за што так жыцьцё згнаіла? За зямлю? Дзе тая зямля цяперака? І чаму-ж яна, - чыстая, прыгожая, жыцьця поўная, - яму першаму не трапіла? Яму - народнаму гэрою, за лепшае шчасьце змагару... Належала-б так. Сьціснуліся вусны.

- Гэта за тое, што зямлю маюць, дык на Сібір іх? - пыталася Марыля. - Дык што-ж, зямлі мець няможна? Учорака-ж сам, мусіць, людзям зямлю раздаваў.

«Сама мяне вядзець», - думаў Косьцік. - «Трэба памалу, намёкамі, страху нагнаць, паволі ўсю гэну гордасьць стаптаць. Каб на каленях памілаваньня прасіла... во як!»

- Гэта чый? Васілёў? - спытаў рэзкім тонам.

Згадка пра Сібір напалохала Марылю й яна не адразу на новую хвалю пераключылася.

- Як Васілёў? Мой! - адказала цьвёрда. Яна падбегла, узяла сынка-пястунка на рукі, моцна прыгарнула да грудзей, села на лаве пры стале й гладзіла Валодзькавы мяккія валосы.

- Васіль, увесь чысьценька Васіль! - бязьлітасна гнаў у Марыліну гордасьць балючы цьвек Сабакевіч. Ён падыйшоў да жанчыны, схапіў яе за плячо. - Што-ж, стары клоп дажа дзіця спэцкаць ні сумеў, га? Збоку мусіла шукаць, сучка ты?

У шэрых вачох зазьзялі маланкі. Ніколі ня бачыла іх такімі Марыля. Гэты чалавек мог лёгка замардаваць. Зь ім няма жартаў. Косьцік крутнуўся, адыйшоўся, роўнымі крокамі мерыў ушыр і ўздоўж камору. У хаце было ціха, адно паскрыпвалі Косьцікавы боцікі. Ён зірнуў на Марылю й на сына, затрымаўся на вянках прыгожай, адборнай цыбулі пад стольлю, на шастку сьвежых каўбас. Мільганула

думка, што «стары клоп» ужо парсюка закалоць, каўбас нарабіць парупіўся.

- Косьцік, чаго ты зь мяне зьдзекуешся? Якая я табе сучка?

У голасе гэным чуваць была яшчэ гордасьць, хоць ужо не такая пышная, як раней.

- Я над табой ня зьдзекуюся, Марыля, - палагаднеў Сабакевіч. - Я толька стаўлю точкі над «і». Панімаеш?

- Не. Якія гэта такія точкі?

- Ну от возьмім цябе. Паглядзім, што ты была раней і што січас... Дзеўка ты была - кроў з малаком: харошая, красівая, ну і гордая, жардзінай носа не дастаць. І я-ж цябе любіў, сама знаеш. Ды і ці толька я адзін... Ну а ты што? Ці гэта ты каб на чалавека глядзела, як замуж ісьці? Га? Да нет, адкудава там... Зямля табе, во што! Ні чалавек табе быў важны, но толька штоб зімля была. Так ілі нет?

- А што-ж, муж мой чалавек кепскі? - трымалася Марыля.

- Цьфу на цябе! - крыкнуў Сабакевіч. - Ты гэта што, бараніць яшчо яго будзіш? Можа ён табе й даў тое багацтва, каторага хацела. Алі што, гэта ўсё? Можа скажаш мне, што ём і ў пасьцелі працавіты, га? А табе-ж толька давай да давай! Што, не?

- Косьцік, як табе ня стыдна! - успыхнула Марыля.

- Мне стыдна? Я за табой бегаў, цябе ажыдаў, думаў, што ты чыстая й харошая, што агледзішся, прыдзіш... І ты за гэту зямлю красу сваю стаптала, вышла за парахно тое, а посьля парабковымі ласкамі жыла... І мне стыдна? Дзе-ж гэта тая твая гордасьць, дзе твой які гонар, га? Каго ты стыдзіш, порхаўка ты гнілая! Пашла ты за зямлю, разумненькая такая, дык во на табе зямлі! Ні казаў я табе некалі, што ўсім зямлі хваціць? Січас во кажды можа мець сколька хочыць, сколька сам абработаць сумеіць. Ты вазьмі да цьвяроза падумай, дурная ты баба, сколька твой жаніх, з каторага парахно сыпіцца, зямлі абработаць можыць. Га? Эксплуатацыя чалавека чалавекам скончылася наўсігда! Панімаіш ты? Чужыя на вас рабіць ня будуць, от как! Дый помні тожа, што ўсех кулакоў-буржуяў, каторыя з чужога труда й мазыля жылі, стала быць каторыя другіх эксплаціравалі, іх усех пачысьцяць, а зь імі і сем'і іх паедуць к чортавай мацеры адсюдава. Панімаеш? Ты знаеш, дурная баба, дзе ты можаш быць? Дык от, разумніца, ні хацела паслухаць мяне, пагналася за зямлёй, дык цяпер фігу маеш... Панімаеш?

Войстры Косьцікаў голас калоў, тузаў, зьдзекваўся. Пот і млоснасьць прыходзілі хвалямі. Сьлёзы нахлынулі раптоўна, гарохам. Праўда, намаляваная шорсткім Сабакевічавым голасам, выглядала такая няверагодная й адначасна нагэтулькі рэальная, што Марыля ў адчай кінулася. Яшчэ сяньня раніцай быў цьвёрды быў цьвёрды грунта пад нагамі, былі мары й спадзяваньні. Дзе яны цяпер?

Спасьцярогшы матчыны сьлёзы, кінуўся ў плач Валодзька. Заварожаная й запалоханая Косьцікам, матка ўзялася цяпер спатольваць сына.

- Ціха, сынок, ціха, міленькі. Ні плач, золатка.

Яна накіравалася ў спальню, што за перагародкай.

- Ты, сынок, мусіць і есьцікі й спацькі захацеў, мой ты міленькі. Пара ўжо...

Марыля села на ложку ля калыскі й расхіліла сукенку. Сын прылёг да грудзей прагавіта й прыплюшчыў вочы. Маці гладзіла ясную галоўку.

- Во, мой сынок, есьцікі захацеў, цацанька. Скора-ж цябе адвучыць трэба, бо вялікі ты ўжо...

Хлапец смактаў грудзі, а Марыля адплыла на шырокі акіян. Спачатку паволі, пасьля ямчэй усхадзіліся хвалі й гулкім прыбоем калацілі, верадзілі Марыліна сэрца. І ні відаць было ў гэных хвалях ніякае дарогі. Дзесьці зьверху межавалі яны зь цёмным, грозным небам.

Нехта зьдзекваўся, рагатаў зь яе, з маленькага сынка і з мужа ейнага. «Гэ-гэ-гэ! За зямлёй пагналася, маеш фігу за гэта, сучка ты!»

Каб ні бацькі, можа накш злажылася-б. Так, напэўна накш было-б. Чаму ей волі ні далі? - Ні глядзі, дачушка, што ён за цябе старэйшы, - раіла некалі маці. - Ужывешся. Зімля важна. Што табе малады дасьць? Будзіш зь ім цэлы век, як той Марка па пекле цягацца. Фігу маіць і фігу мець будзеце. Рукамі сваімі ні даробіцеся. А ў гэтага й зямлі, і золата, і дабра ўсякага, хоць ты завалісь. Жарцікі, так многа часу ў Амэрыцы зарабляў. Ідзі за яго, дачушка, панаваць будзеш...

Пайшла. Напанавала. Няхай яно пропадам прападзе, гарам такое замужжа гарыць. Можа каб шчэ ні зьмянілася. А так, як цяпер жыць? Зямлю ўсім дарма даюць, а ад багатых адберуць, бо сам не апрацуеш.

Марыля рэдка куды хадзіла, мала плётак слухала. А іх-жа заўсёды ўволю. Казалі людзі мудрыя, што ні такі чорт страшны, як яго

малююць. Ажно зьявіўся адзін у хату. Размаляваў...

Хвалі на акіяне ўзрасталі. Магутным разьлівам вылі ў глухой цемры й зьдзекліва рагатаў нейкі шурпаты голас.

Марыля падняла галаву. У дзьвярох стаяў Косьцік. Яна забылася пра голыя грудзі, пра Валодзьку, каторы зусім аціх, на руках задрамаў. Яе прыкавалі, ёю авалодалі лёгкім туманам асмужаныя вочы. І Марыля ўжо ведала, што будзе далей: з аднаго акіяну перакінецца ў другі, з духовага ў цялесны. Яна паволі ўстала й лагодна палажыла сына ў калыску.

25

Калі-б самім давялося быць у Гацях і пажадалі выбрацца на Глыбокае, мусілі-б пачынаць ад тых вілаў, дзе зыходзіліся Докшыцкая й Глыбоцкая вуліцы й дзе рассасулілася шырокая, з упалай гонтавай страхой Габішына крама. Пачынаючы вось ад гэнай крамы, праехаўшы па няроўным бруку Глыбоцкай вуліцы так мэтраў за дзьвесьце, налева ў рынак упрэцеся. Спыніце вашага руплівага каня. Гэта-ж нам затрымацца выпадае. Чуеце стук сякераў, малаткоў, скрыгат пілаў? Так, майструюць нешта. Ужо вунь зьвязалі з дрэва нейкі прастакутнік, дошкамі яго абіваюць. На памост выглядае. А гэта там воддаль ля самага поля, - бачыце вунь мураваны белы будынак неабшырных разьмераў? - гацкая бойня. Сюды прыводзілі й прывозілі на забой кароў, авечак і сьвіньней. І стаіць бойня, - бачыця во? - воддаль ад рынку, зусім як-бы за мястэчкам. Самі-ж, пэўне, добра й памяркоўна ўгадаеце прычыну.

На рынку гэтым, дабрадзею, дзе мы во з вамі затрымаліся, нельга сказаць, каб калі якія вялікія кірмашы адбываліся. Яно-ж сабе быў у Гацях і рыначны дзень, каторым пашанцавала быць аўторку, прыяжджалі навет, хоць і скупавата, людзі. Ды кірмаш тут ніколі ня быў тых разьмераў як, скажам, у сераду ў Докшыцах, ці ў чацьвер у Глыбокім. Гэтта людзі, каторым запраўды што большае збыць трэба было, падноскаў надта не тапталі й часу цэннага ня глумілі. Вядома-ж, мястэчка малое, дык «каляяжы» якія-б пражорлівыя ня былі, дабра

многа спажыць ня могуць. Вось таму, дабрадзею мой, кірмашы ў Гацях такія сьціплыя былі.

Сытуацыя крыху перамянілася, як «саветы» прыйшлі. Тыя «саветы», як мо й самім чуць давялося, - салдатні пераважна, - поўныя кішэні лысых мелі. Лысымі звалі дзесяцірублёўкі, або паіхнаму чырвонцы, а гэта таму, што на іх тая найбольшая, значыцца значыцца галоўная бальшавіцкая брыда была намаляваная. Здарылася ці раз, што заміж запраўдных лысых бальшавіцкія жаўнеры «гасударсьцьвіннымі аблігацыямі» за тавар плацілі. Гэта былі прыгожа зробленыя паперкі, што дзяржава за пазыку людзям давала й грашовае вартасьці яны ня мелі. Штучку гэту, вядома-ж, сяляне мясцовыя хутка пранюхалі і ўжо ведалі запраўдных лысых, ад розных «аблігацыяў» іх адрозьнівалі.

Людзі мясцовыя, да ўнармаванага жыцьця прызвычаеныя, гэтта падумалі, што новыя парадак можа быць моцны й трывалы, не раўнуючы як тыя пачварныя пудзілы, што ў дзень вялікага «вызваленьня» так шмат рудога пылу на гацкім гасьцінцы ўскаламуцілі. Значыцца, што моцнае, тое пэўне-ж і багатае дый трывалае. Народ наш, - самі, пэўне-ж, ня ўчора спавіваныя, дык мяркуйце, - да ладу й працы прызвычаены, парадак, навет абрыдлым чужніком астаноўлены, шанаваць прыспасобіўся. Вось чаму й пасьля гэтае перамены народ адразу за гаспадарку ўзяўся. Як ніколі раней, ажыў гаманой гацкі рынак. Прыемна шалясьцелі ў спрацаваных сялянскіх руках новыя й прыгожаыя «лысыя», а ў вачох аганькі спадзяваньня тлелі. Чаго й трэба, дабрадзею мой, збыт ня сялянскія тавары быў першаклясны. Як падурэўшы, дальбог, «саветы» падчышчалі каляскі аж да голых драбінаў, як-бы ад вякоў рознае еміны ня бачылі.

Няўцямнасьць зьмяніла спадзяваньні ў сялянскіх вачох, калі за тыя «лысыя», колькі ні тарчы ў чарзе ля таго сельпо ці гарпо, навет фігі макавай табе ня купіць. Як што прывязуць, дык няйнакш напаказ.

- Дык наплявaць на гэту брыду лысую! - сказаў народ, маючы на думцы бальшавіцкія грошы, што так прынадна шалясьцелі. - Сваё, значыцца, аддай, а купіш за іх фігу.

Вось з такой, дабрадзею мой, прычыны надта-ж скора апусьцеў гацкі рынак. Невялікі сякі-такі гандаль, - з кошыка й з-пад палы, - перанёсься ў тыя вілы да Габішынай крамы. Вядома-ж, і бяз брыды лысай зусім не пражывеш, асабліва калі яна вунь па цэлай зямлі

таўчэцца, людцам добрым цярпеньня й бедаў спорыць. А ў ваўторак, у самы белы божы дзень, выходзілі й вылазілі на гацкі рынак суседнія куры й пеўні, дый тыя разглядаліся ўважна навокал, каб якія саветы за хвост не ўчапіліся.

Самім давялося пра кастрычніцкую ці акцябрскую чуць? Гэта-ж кажуць, што сёмага лістапада сьвяткаваць яе тут будуць. Мусіць таму з дошак тыя вунь чатыры з малаткамі й піламінейкую трыбуну ці што будуюць. Але-ж. Калі самім ня собіла ніколі ніякай кастрычніцкай сьвяткаваць, дык загляніце. Кумпанii, кажуць, усялякае будзе. Насамперш, кажуць, зьявіцца вялікае бальшавіцкае начальства, дый сваіх разявякаў, пэўне-ж, падганяць ня будзе патрэбы. Як на яе ні глядзі, гэта самая кастрычніцкая то, мусіць, нейкі новы цымус, ад каторага, як камісары заўсёды і ўсюды аж да няпрытомнасьці вярзяць, зусім новы й найбольш шчасьлівы бальшавіцкі сьвет пачаўся.

Нядоўга давялося Дуні Янука намаўляць.

- Пойдзем, Янучок, - пачала лагодна дзяўчына. - Ты-ж ведаеш, усім наказваюць, каб ішлі. Гэта-ж вялікае сьвята іхнае, дый наша. А разам з тым і нашу школу цяперака паглядзіш. Яна-ж каб ты відзіў як зьмянілася...

- Эт, чаго мне тамака, - пачаў адмаўляцца хлапец.

- Дый увідзіш хлопцаў сваіх... усе твае дружбанты ў школу ходзяць.

Гэтта Макатунішка на чульлівую струну наступіла. Карціла Януку даўно ў школу зазірнуць, прайсьціся дарагімі для памяці клясамі й калідорамі, паглядзець хто зь ягоных аднакласьнікаў на школьную лаўку вярнуўся.

- Ну добра, - згадзіўся Янук.

Раніца таго кастрычніцкага сьвята бальшавіцкага, што на сёмага лістапада выпала, нічога пацешнага не варажыла. Вецер гнаў хуткія золкія хмары й адно каля дзясятай крыху пасьвятлела.

- Дык што-ж ты, гэта ні гатовы яшчо? - навалілася Дуня на Янука са скрыпам дзьвярэй.

- Дык як-жа ісьці, калі, мусіць, дождж будзіць? - апраўдваўся хлапец.

- Які табе дождж! Усе вуньдзіка йдуць. Хадзі, бо спозьнімся. Нам-жа ў школу на час зьявіцца сказалі. Скарэй! - цягнула Макатунішка.

- Табе то так... ты вучаніца. А мне тамака з боку-прыпёку, - ня ўступаў Бахмач.

- Ну от што пачаў! Ты-ж у нас свой між сваіх. З радасьцю прымем, ня толька што. Скарэй!

- А ты, Мікола, куды? - спытаў Янук брата.

- Пайду і я, - адказаў брат.

- І ня лень табе?

- Ну а чаго? Часу-ж ёсьць, ні сінакос-жа гэта.

- Ты з намі? - спытаў Янук.

- Ды дзе там маім нагам з вамі справіцца. Бяжыце ўжо, а я неяк памалу павалакуся.

Янук з Дуняй адразу ўзялі борзды крок і выперадзілі шмат каго па дарозе. Яшчэ здалёку спасьцераглі сабраную перад школай вучнёўскую моладзь. У групах і паасобна над галовамі тарчэлі ўсе аднаго памеру, недзе аднэй рукой змайстраваныя ледзянавокія дыктатары. Мясцамі вецер тузаў разгорнутыя палотны, што крычэлі:

ДА ЗДРАВСТВУЕТ ПОБЕДОНОСНАЯ ОКТЯБРЬСКАЯ СОЦИАЛИСТИЧЕСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ!

ДА ЗДРАВСТВУЕТ ТОВАРИЩ СТАЛИН ОТЕЦ И УЧИТЕЛЬ НАРОДОВ ВСЕГО МИРА!

ДА ЗДРАВСТВУЕТ...

Янук ужо спраўляўся з чытаньнем, хоць і ў расейскую школу яшчэ не хадзіў. І прыгадалася яму, што ўжо недзе раней падобнае бачыў: і транспарэнты, і лёзунгі, і вялікую грамаду людзей. Дзе гэта было? Мусіць у тых фільмах, што бальшавікі вечарам у Ліпавічах паказвалі. Адно там людзі іншыя былі: яны ў баях змагаліся, іх падганяў той самы лысун, каторы на грошах намалеваны. Так яно й было.

...ТОРЖЕСТВЕННОЕ ШЕСТВИЕ...

чытаў далей Янук.

- Чаго разявіўся? - таўханула пад бок Дуня.

- Ды вунь панапісвалі. Ты відзіла такое?

- Відзіла. Хадзі, я табе вучыцялёў пакажу.

Макатунішка ўчапілася й цягнула Янука за руку.

- Вунь там на ганку стаяць, - паказвала.

Янук яшчэ ня ўсьпеў разгледзець тых на ганку, як зачапіўся за нейкую нагу. Ён ледзь ня ўпаў і зараз пачуў знаёмы гулкі рогат. Адвярнуўся.

- Здароў, Янук! - прамяніўся й дыхаў амаль у вочы твар Загорнага Лявон, таго самага, з каторым гады два ў гацкай школе на аднэй лаўцы сядзеў.

- Здароў, здароў, Лявон! - зь вялікай радасьцю ўсклікнуў Бахмач. - Як маешся?

- Добра, браток. Толька от пра цябе часта думаў. Чаму гэта ў школу ня ходзіш?

- Ды знаіш... - зацяўся Янук. - Усякае ліха. Трэба было-б.

- Праўду кажаш. Ні глядзі на ліха. Навука навукай...

І тады Лявон зусім да Януковага вуха прыліп.

- Хадзі, пацягнем, - шапнуў.

Пакуль Янук скумекаў што й да чаго, той ужо за руку яго цягнуў. Забеглі за вугал школы, на той бок дзе нікога ня было.

- На во, пацягні.

- А што гэта?

Загорны трымаў у руцэ паўлітровую плоскую пляшку, амаль больш паловы напоўненай празрыстай вадакасьцю.

- Во пацягні дык будзіш ведаць. Ні марудзь-жа. Я захіну, на ўсякі выпадак, каб ніхто ня відзіў.

Янук выцягнуў корак і ўважна яго абнюхаў.

- Дык гэта-ж ці ні маскоўская чыстая? Алі чаму бутылка такая? Яны-ж у круглых прадаюць. А налепка дзе?

- Вось і дурань ты. Піраліў у плоскую, каб у кішэнь было выгадней улажыць. Цягні, ні марудзь!

- Чорт яе знаіць, я гарэлкі ніколі ня піў, - марудзіў Янук.

- Ну дык пара цяпер пачынаць.

Янук нагнуў пляшку й вельмі нясьмела пацягнуў. Забрала дыханьне. Закашляўся, аж сьлёзы паказаліся.

- Каб... ач-хі! Каб цябе халерачкі!

Лявон голасна зарагатаў.

- Цягні яшчо. Сьмялей, ня бойся!

Пры гэтых словах Загорны нагнуў малую пляшку Януку ў рот. Бахмач намагаўся спажыць яшчэ глыткі са два, але моц гарэлкі забірала дыханьне й нейкае, раней нязьведанае цяпло разьлілося шырака па жываце, замуціла ў галаве.

- Ну ні магу, ні пхай! - аддаў Янук Лявону пляшку.

- Добра трошкі пагрэцца, дзівак ты. Сьцюжа во.

Загорны пацягнуў з пляшкі, заторкнуў яе, улажыў у кішэню суконнай сьвіткі й шлёпнуў Янука моцна па плячы.

- Ні бядуй, кажу. Цяплей во на такім надвор'і стаяць будзіць. Выгналі-ж во, шэльмы. Завуч і піянерважаты ўжо вушы абляпалі ўсім, што абавязкова зьявіцца маюць, толька пажар, патоп ці сьмерць могуць быць апраўданьнем, калі хто ня прыдзіць, - усьміхнуўся Загорны. - Дык відзіш як ёсьць, а гэтта яшчэ пакрапіць можыць, дык і будзіць тады табе акцябарская на ўсе застаўкі.

Янук ужо добра адчуў мутны прыліў у галаве й цяпло па цэлым целе. Вельмі дадатна ўплывала на яго й пагодлівая Лявонава натура. Гэты ніколі носа ня вешаў. Янук ведаў, што хлапец жыў у дабрабыце, асаднікавых кароў ня пасьвіў. Параўнаньня зь Януковым жыцьцём быць не магло.

Далучыліся да грамады. Ля брамы гулкі сіпаты голас кідаў вучням нейкія загады. На перадзе калёны вецер гуляў з чырвоныымі сьцягамі, ззаду йшлі розныя транспарэнты й Сталінавы партрэты.

- Кажу, наплюй на ўсё й прыхадзі ў школу, - бубнеў побач Лявонаў голас. - Мусіць ужо скора пойдзім.

- Добра табе казаць, наплюй на ўсё. Ні так яно проста, - жаліўсё Янук.

- Ну а што? Ня пойдзіш цяперака, дык цэлы год прападзець. А дома неяк і бізь цябе збойдуцца. Кажу, прыходзь!

- Добра, падумаю, - сказаў Янук нянадта пераконлівым голасам.

Школьная калёна тройкамі паволі рушыла на дарогу. Ля чыгункі зачыніліся вароты й чакалі пакуль перапаўзе даўгі вайсковы цягнік. Цэлы марш да рынку трываў з паўгадзіны. Янук ішоў побач Лявона і ўжо адчуваў як суцэльна ўліўся ў вучнёўскую грамаду. Лявон меў слушнасьць, шкада траціць цэлы год навукі.

Гацкія жыхары павыходзілі на вуліцы, пазіралі на вучняў. Ад рынку даляталі гукі духавой аркестры. Гэта гралі мясцовыя пажарнікі. Янук прыгадваў тых польскіх пажарнікаў, што калісь у залатых,

зьзяючых на сонцы шлёмах гралі на «дзень канстытуцыі» - трэцяга мая, або ў хмарны дзень «непадлегласьці» - адзінаццатага лістапада. Цяпер-жа людзі, што дзьмухалі ў трубкі блізу трыбуны, ля якой стоўкся лес сьцягоў, транспарэнтаў і Сталінавых партрэтаў, апрануліся ў чорнае й ня мелі зьзяючых шлёмаў.

Палова рынку запоўнілася людзьмі. Між выбранага тузіна на трыбуне, вайсковых і цывільных, Янук спасьцярог Маршалкава, Сабакевіча й Саладуху.

Аркестра прыціхла й да мікрафону падыйшоў чарнявы вайсковы палітрук. Гэтага Янук знаў даўно, сустракаў на перадвыбарных зборках. Палітрук пачаў гаварыць паволі й мерна. Тэма, якую давялося чуць ранней, гэтым разам асабліва націскала на «вялікі акцябар». Людзі прамову слухалі спакойна, аглядаліся на пагражаючыя хмары.

«...велікая октябрьская соціалістіческая революція положіла основанія новой жізні, создала могушчественную страну рабочіх і крестьян і она сегодня под руководствоам самого умнейшего в міре учітеля і отца всех народов, товарішча Іосіфа Віссаріоновіча Сталіна ідет...»

Пры згадцы крамлёўскага валадара тыя, што стаялі на абвешанай чырвоным палатном трыбуне, быццам на каманду заплёскалі ў далоні. Іх падхапілі бліжэйшыя ад трыбуны й плёсканьне завяла на плошчы.

«...і несёт освобожденіе всем трудяшчімся міра. Так как вы долгіе лета ожідалі освобожденія от белопольского панского іга, так точно ожідают сейчас освобожденія і порабошчённые всего міра. Оно, это освобожденіе непременно прідёт, ібо...»

- Алі-ж, братка, брэшыць ён як шарманка накручаная, - таўхануў Лявон пад бок Янука.

- Мусіць усіх іх добра на той самы лад накруцілі, - адказаў Янук.

Пасьля палітрука выступаў Маршалкаў і Саладуха. Рослы, дужы Саладуха адно разагнаўся басаватым гулкім голасам, як нарэшце разгневалася неба. Нізка паўзучыя хмары лінулі густым сьцюдзёным дажджом. Як на каманду, людзі з рынку пачалі расплывацца на ўсе бакі. Некторы час басіў яшчэ, а неўзабаве змоўк і Саладухаў голас.

26

Калядніца ўзялася за гаспадарку паволі. Рупліва пазьмятала лісьце й іншы расьлінны хлам ля платоў, хатаў і гумнаў, падчысьціла лысыя гарбы на палёх і нівах. Добра абнізіўшы тэмпэратуру, трывалка зашкліла ўсе вадзяныя прасторы. Нясьмела пачаў забаўляцца сьнег.

На літоўскім лузе, дзе малеча ўзялася ладзіць калаўрот на галалёдзіцы, сьнег сыпаў дробным, колкім у твар макам, а вецер плёў зь яго крутыя гужы, каторымі сьцёбаў па сіне-празрыстым лёдзе. Халадзеча даймала праз даматканыя сьвіткі неданоскі, кажушкі, лезла празь дзіркі ў ботах, шчыпала-пякла ў твары. Халадзеча ня толькі ня спыніла, але навет не запаволіла дзіцячага мурашніку ля калаўроту. Першы лёд - першая вялікая радасьць. Гулкім звонам ліліся дзіцячыя галасы ля аглоблі калаўроту. Каторым ня было як за аглоблю ўзяцца, тыя за вопратку чапаліся. Хвост напружваўся, гнуўся, танцаваў, рваўся, канькамі лёд крэмзаў. Каторыя-ж ня мелі канькоў, тыя сунуліся падэшвамі ботаў-неданоскаў. Вэрхал над лугам стаяў несамавіты.

Мусіць не да спадобы гэткае вялікае сваевольства дзяцей літоўскіх прыйшлося ветру ўсходняму. Злосна скалануў чубамі клёнаў, бярозаў і хвояў, шырэй адчыніў усходнія дзьверы й замяніў колкую сьнежную манну на буйныя крупіны. Ужо зусім на зьмярканьні, разагнаўшы малечу па гасподах, вецер абамлеў ад нямогласьці і ўлёгся ў Гаравацкай пушчы. І тады шырака адчынілася неба. Сьнег падаў роўнымі, вялікімі матылямі, клаўся шчыльна, мяккай белай прастынёй засьцілаў голыя прасторы. Хто ў тую ноч дзе на адлегласьць ад хаты свае адбіўся, доўга ў памяці сваей нечага падобнага для параўнаньня мусіў шукаць. Мяккі, пушысты дыван завесіў шляхі, схаваў аб'екты арыентацыі. Відаць было на адлегласьць не далей, як добрай пугай махнуць.

І з гэнай глыбокай пярыны на золаку зноў раскатурхаўся вецер. Спачатку нясьмела перакідваў трасянку, пасьля дзьмухаў мякіну і ўжо калі зусім разьвіднелася, падпрог на помач тысячы чарцей. Нячысьцікі асядлалі магутных віхрыстых коней і густой кавалерыяй узяліся гэйсаць навокал хатаў, хлявоў, сьвірнаў і гумнаў. Ля будынкаў імчаліся дзе коламі, дзе паўколамі, дзе гужамі ўпрысядкі віліся. а дзе на ўвесь рост падымаліся, быццам гатовыя да рабунку ўланы. Набраўшы разгону ад літоўскага балота, навала чартоўскай коньніцы накідвалася на стрэхі, тузала-рвала трухлявую салому. Трашчэлі пад магутным

напорам латы й кроквы, дрыжэлі сьцены. Не адразу агледзеліся людзі, што разбэшчаная стыхія раськідала бусьлянку на Захаруковай ліпе, пашкодзіла шмат чые стрэхі.

Вялікай шуфляй падымаўся сьнег з адкрытых гоняў, абкладаў-абсыпаў будынкі, гароды, сады. Ужо пад полудзень, калі аціхла бура, літоўскія сяляне, як краты, пачалі тачыць ў сьнезе праходы, сьцежкі, дарогі. А сьнег ня спыняўся яшчэ пару дзён. І калі мелі літоўскія людзі якую паважную прычыну наракаць на сваё гэаграфічнае палажэньне, дык хіба ў гэну пару вялікага сьнегападу.

- Ці ні ўсхадзіліся гэта гаравацкія чэрці! - дзівіліся некаторыя.

- Каму па каму, а нам два камы, - параўноўвалі літоўскія сваё палажэньне зь іншымі вёскамі, што на вышэйшым грунце ляжалі.

Ці аднаму кемліваму літоўскаму гаспадару прыйшла думка, што мала бракавала для таго, каб вецер зусім літоўскія начоўкі засыпаў. І мо якраз тады ці адзін прыгадаў тых далёкіх, няведамых продкаў, што наважылі ў гэтым месцы пасяліцца.

Сьнежная навала ўляглася папаўдні на чацьвёрты дзень. Адразу пажвавеў пульс прысыпанай вёскі, пачалося доўгае й маруднае адкопваньне, пракладаньне шляхоў. Гурбы сьнегу сягалі падстрэшшаў, адпаведна паменшалі ростам голыя дрэвы, некаторыя пахаваліся камлямі ў круглых конаўках, а суччо іх зьвісала ўпрытык да сьнежных грэбляў. Несамавіты й непрадбачаны сьнегапад зьмяніў жыцьцёвае тэмпа вёскі. Людзі напраўлялі стрэхі, вычышчалі гарышчы хатаў, каб не растаяў сьнегі не пацякла праз столь вада.

І калі ўсё дужае й працаздольнае безадкладна ўзялося за гэту, нікім непрадугледжаную працу дык меншыя дзеці цяпер забыліся пра лёд і новаладжаны калаўрот на лузе. У ход пайшлі саначкі. Ды сьнег яшчэ ня ўлёгся. Санкі з малечай вязьлі ў мяккай ў мяккой белай пярыне. Навет людзкія галасы чуліся ў новай прапорцыі. Калі раней са Шпунтовага двору лёгка чуваць было гамонку вёскі, цяпер гукі губляліся ў сьнежных карытах ля гумнаў, хатаў, у задзьмуханых садох, дый зьнікла зусім рэха.

Ня ўсьпелі Літоўцы паправіць патузаныя стрэхі, як сьлед папракладаць у сьнезе сьцежкі й дарогі, калі раптоўна пасьцюдзянела. Казалі пасьля сяляне, што няйнакш недзе нехта адчыніў далёкую, жахлівую Сібір. За ноч тэмпэратура раптоўна кульнула ўніз і хаця шматлікія ў вёсцы мо ніколі ў жыцьці ня бачылі градусьніка, агульная

апінія, калі такая існавала, спынілася-б прынамся на саракоўцы ніжэй нуля. Ледзянелі сокі дрэваў, трашчэла й ламалася гальлё, дрыжэў статак у халодных хлявох. Дарма, што амаль бесперапунна дымілі цяпер коміны й зьядалі пропасьць дроў вялікія печы, халадзечу суняць было цяжка навет у хатах. Замярзалі ў паветры пырскі вады, енчыў ці адзін лёгкадумны, калі ў посьпеху голай рукой за намезлае вядро ўзяўся. Наляталі на гумны лясныя птушкі, падкрадаліся начамі да хлявоў ваўкі й заядла грызьлі сады зайцы.

- Чорт іх ведаіць... мусіць гэтыя во Сібір нам прынясьлі, - наракаў нехта.

- Хто гэта?

- Асвабадзіцелі нібы, а хто-ж...

Як доўга жылі літоўскія людзі, ніхто ня мог прыгадаць такой лютай сьцюжы. Дзед Якуб апавядаў, што холад запраўды даўся яму некалі ў знакі, але было тое ў далёкай, чужой, няпрыветлівай краіне, калі пагналі яго былі цара-бацьку сілай «зашчышчаць».

- Кажу вам, каб яго макарэц спапяліў, што як сьвет сьветам, як доўга во па гэтай грэшнай зямлі хаджу, ніколі такога ў Літоўцах яшчо во ні было. Прынесьлі во Сібір з сабой.

І ў вадзін люты сібірскі дзень прыйшоў ў вёску наказ, каб усе, хто меў сілу лапату трмаць, на гацкі гасьцінец выходзілі. Колькі бальшавіцкіх грузавых машынаў, што намагаліся праехаць, завязла ў сьнезе. Навакольныя сяляне, спанатрыўшы гэта, на сьмех паднялі маторных разумнікаў. Адылі хутка аціх сьмех, калі ўпраглі іх у рашчышчаньне гасьцінцу. Станулі людзі плячо ў плячо й рылі тунэлі, што мясцамі глыбінёў у двух чалавек сягалі.

Ніяк не маглі ажывіць у адкапаных машынах маторы. Пакідаць-жа грузавікі на гасьцінцы было немагчыма. На помач прывялі сялянскіх коней, падпрэглі па чатыры ў машыну ды, падпіхаючы ззаду, пасьцягвалі іх у Ліпавічы. Рашчышчаны гасьцінец намагаліся цяпер трымаць адкрытым. Спатрэбіўся пастаянны нагляд і дадатковае рашчышчаньне тых мясцоў, якія няўтомны вецер засыпаў сьнегам.

Засьнежаная краіна спрыяла «вызвольнікам» у вадным галоўным мерапрыемстве, пра каторае не адразу даведаліся сяляне. Звычайна пасьля поўначы, калі сьпяць працавітыя й сумленныя людзі, на маёнткі, фальваркі й асадніцкія засьценкі наляталі ўзброеныя людзі. Работу сваю намагаліся рабіць ціха, каб не спасьцерагло непакліканае

вока. Прыбліжаліся да аб'екту ціха, як здані, пазладзейску. Настойлівы стук у дзьверы раскатурхваў перапалоханага гаспадара. Абмундзіраваныя, узброеныя людзі ўрываліся ў гасподу, як каршуны на кволых птушак, наляталі на сонных людзей, загадвалі неадкладна ў дарогу зьбірацца. Не, зусім ніякіх рэчаў ні запасаў браць з сабой ня трэба. Заўтра, ці дзень пасьля, вялікадушны валадар усіх дахаты адпусьціць. Вось адно цяпер «быстрэй, быстрэй!»

Людзі са зброяй былі надзіва негаваркія. Дзе не памагаў ляканічны загад, там пагрозьліва пераконваў кантаваты штык. Плач дзетак, праклёны матак, стогны слабых ці нямоглых не сягалі непакліканых вушэй. Хапуны лётам кантралявалі маёмасьць «ворагаў народу», найбольш цэннае пхалі ў свае кішэні. Дрэнна апранутых людзей выкідалі празь дзьверы ў сані ды, насядаючы на коней, зьнікалі ў марознай сьнежнай далі.

- Вывозяць!

Жахлівае, крылатае слова шырылася па ваколіцы. Слова падстрэлілі. Каму трэба, «народная ўлада» дала грунтоўныя выясьненьні. Іншыя-ж, перапалоханыя цьвёрдай рукой улады, без адвалокі прышчамілі языкі.

27

Хутка зыходзіў зімовы дзень. Высыпаўшы з двухпавярховай гацкай школы, дзеці таропка разыходзіліся. Найбольш вярталася ў мястэчка. На выглажаных палозьзем дарогах вясковыя вучні азіраліся, каб нагледзець якога добрага дзядзьку, што дахаты падвёз-бы.

Маўкліва йшоў побач Дуні Янук. Думаў. Было шмат новага й цікавага, сэрцу блізкага. Няведама дзе гутарку пачынаць. Бянтэжыўся быццам гэны прыказачны камар у абозе нудыстаў, Мусіць тыдні тры назад вярнуўся Янук у школу. Сталася гэна зусім нечакана. Неяк павячэраўшы, сказаў бацька сыну:

- Зьбірайся, Янучок, у школу.

Хлапец разявіў рот.

- Ты, тата, жартуеш ці што?

- Чаму-ж жартую? Кажу, ідзі ў школу. Ты-ж хочаш, не?

Бацькавы вочы пазіралі на яго шчыра шчыра й проста, быццам гаварылі: што-ж ты скрываеш, абібок? Ці-ж ня відаць, што аж пішчыш, як у школу хочаш?

Янук спасьцярог добра ведамую іскрынку ў бацькавых вачох і ведаў, што не яму скрываць што. Ужо колькі разоў хадзіў на вячорныя курсы ў літоўскай школе, дзе «паруску» вучылі. Сын сачыў бацьку. Кавалак панскай зямлі быццам сьвежай жыватворчай хваляй падзеяў. Паясьнеў бацькаў твар, зьнікла крактаньне-нараканьне, перастала дрыжэць спрацаваная рука, калі на прыгожыя, роўныя ськібы бохан хлеба рэзала. Праўда з-пад жорнаў хлебкаструбаваты быў, але-ж ён свой, ня той, за каторым у «сяльпо» трэба было гадзінамі ў чарзе калець. Цяпер у гутарках ня зводзіліся пляны пра ўрадлівы кавалак зямлі.

- Гэта-ж ня тое, што мой клінок пяску, - мяркаваў Бахмач, - дзе, казаў той, адно каліва здругім ні суседзіла. Там-жа зімля-зямелька, сам-жа вунь працаваў на ей, знаю...

Так гаварыў адроджаны, уздужэлы чалавек, што кагадзе пра сэнс спадзяваньняў забыўся. У хаце жылі будучыняй. Яна поўніла арганізмы сіламі, налівала жыватворчымі сокамі ці ня ўсе змораныя клеткі гэтай гаротнай сям'і.

- Дык чаму-ж не, - прызнаўся Янук, - хацець хачу ды яшчо вунь як. Алі-ж хто дома рабіць будзіць?

- Ты во ні бядуй, як кажу дык ідзі. Вучонаму сьвет адкрыты, а мы тут неяк рады дамо. Вясной-жа, чаго там, школа скончыцца і зноў памагаць будзеш.

Хлапца намаўляць ня трэба было. З радасьці пад самую столь карціла падскочыць. Гэта-ж колькі разоў ужо слова на языку было, ды не асьмельваўся. Ведаў бацькаву нямогласьць.

- А за каго-ж я буду вучыцца, тата?

- Як гэта за каго?

- Людзі-ж во вучацца то за вучыцеля, то за доктара, то за інжынера...

- Гэта ты, сынок, надта ўжо разагнаўся, - усьміхнуўся Пракоп. - Цяперака пра гэта табе яшчо думаць ня трэба, пакуль тое прыйдзіць... Я-ж знаю, што яны накш чымся Палякі тыя вучаць. Гэтта я ні пра язык гавару, а праграму. Дык работы будзіць... А кім будзеш, - паглядзім. Хто ведаіць, як яно далей пойдзіць...

Пры апошніх словах захмарылася бацькава аблічча. Баяўся Янук, каб не раздумаўся раптам бацька й не назваў усяго, толькі што сказанага, благім жартам. Але бацька не раздумаўся. Гэткім чынам вярнуўся Янук у знаёмыя, калісьці ім аббеганыя-абабітыя пакоі й калідоры, ды вось цяпер яго хаджалыя ногі патраплялі Дуніным.

- Куды гэта ты павярнула?

Задумаўшыся, адразу не спасьцярог, што дзяўчына не пайшла праз пераезд, а павярнула ўздоўж чыгунак направа. Гэтта хадзіў дадому ўлетку. Нацянькі праз поле й лес было шмат бліжэй.

- Пойдзім ля могільніку, скарэй будзіць, - адказала Дуня.

Яна мела наўвеце вайсковы польскі могільнік. Ляжаў на ўзгорку за паўкілямэтры ад станцыі, а зараз-жа за ім пачынаўся лес і летам бегла празь яго выхаджаная сьцежка.

- А ці пройдзем-жа? Ні знаеш, ці завеяла?

- Казалі бабы, каторыя хадзілі, што сьцежку даўно пратапталі.

- Ну глядзі.

Заходняе неба румянілася тым гарэньнем, што варажыла люты мароз. Побач чыгункі зьзялі інеем дрэвы. Скрыпеў пад нагамі сьнег. На станцыі пераклікаліся паравозы, лязгалі буфары. Ля галоўнай вуліцы пыхцела дымам з коміну мястэчкавая электрастанцыя. Дзесь на той бок вагзалу, у гушчы вагонаў, пачаў паволі чмыхаць паравоз. Кідаў уверх вялізныя клубы дыму. Чмыханьне згусьцела, чорны слуп падняўся ў празрыстую марозную вышыню і ўжо здалёк чуваць было ззаду за паравозам тарахценьне сотняў калёс. Зь вялікай чырвонай зоркай наперадзе, паравоз выпаўз з гушчы вагонаў, параськіданых па чыгуначных шляхох. Дабягаючы да сэмафору, ахутаў вучняў гарам і дымам, ды накіраваўся на маладэчанскую чыгунку. Янук і Дуня спыніліся й прыглядаліся даўгому эшалёну, наладаванымі ваеннымі машынамі, танкамі, вялікімі скрынямі.

- Глянь ты, матка мая, колька гэта дабра езьдзіць, - захапіўся Янук. - Куды ты, Дуня, думаеш яны гэта вязуць?

- От дзівак, - усьміхнулася дзяўчына, - недзіка на нямецкую граніцу, а куды-ж...

Янук памаўчаў, падумаў.

- Дык нашто-ж ім тамака танкі? Яны-ж кажуць, што зь немцамі саюз маюць. Ці гэта на саюзьніка зьбіраюцца ўжо?

- Трапеш абы што, - махнула рукой Дуня, - ідзі ды іх запытайся. Ідзём во скарэй, бо сьцюдзена.

Дуня паскорыла крокі. Цягнік уцёк на захад. Зноў пацішэла, адно сьнег пад нагамі скрыпеў. Янук задумаўся. Ня ведаў зь якога боку гутарку пачаць. Ці гэта тая самая дзяўчына, што васількамі прынаджвала, выклікала? Ці гэта тыя вусны, што гарачым вцалункам у канюшыне ў цёплы васеньні вечар яго апяклі? Ці гэта тая гнуткая сярэдзіна, на каторай ляжала касматая, - ой як балела гэта Януку! - байцова рука на вечарыне? Пунсовыя ад марозу шчочкі й вочы-васількі былі тут-жа побач. Васількі глядзелі так проста й зусім абыякава. Што за перамена! Дзеўка замянілася ў вучаніцу.

Апранулася ў цёплы кажушок, вязаную ваўняную, сінюю шапачку, выгадныя боцікі з валёнкамі ўсярэдзіне. Зірнуўшы на свае абноскі, Янук задумаўся. Пракоп Бахмач мог-бы ў камбед належыць, «награбленае грабіць»...

- Дуня.

- Ну?

- Ты гневаешся на мяне за тое, што я тады на вечарыне балюча на нагу ступіў?

Чаму ён гэта сказаў? Хацеў пра школьнае, а тут яно само наверх усплыло. Пунсовы тварык прачнуўся з задуменьня, расплыўся прывабнай усьмешкай.

- Янучок, які ты... які ты дурненькі, - таўханула дзяўчына яго плячом.

- Што я, чаму я дурненькі? - крыўдна буркнуў хлапец.

- Ну бо ты думаеш, што нешта такое важнае сталася. Я даўно аб тым забылася, - адказала жартаўлівым голасам Дуня.

Пэўны час маўчалі.

- Ты глядзі, Янучок, што гэта там!

Воддаль ад чыгункі ляжалі кучы цэглы, дошак ў, бярвеньня. Мясцамі са сьнегу вызіралі курганы чорнае зямлі. Пачатак нейкага фундамэнту прастакутнікам павёў направа ад дарогі.

- Будуюць, мусіць, нешта.

- Ага.

- Алі-ж, мусіць, нідаўна пачалі, бо тут нічагусянькі ні было.

Падыйшлі да месца будовы. Кучы конскага калу, пацяруха корму, недагарэўшыя смалякі на вогнішчах, што курылі яшчэ дымком, да

чарнаты вытаптаны вялікі пляц, - усё гэта сьветчыла, што кагадзе людзі тут працу пакінулі. Ля дарогі стаяла дашчаная будка. Са стрэшкі тарчэў круглы бляшаны комін, што цяпер курыў чорным дымком. Ля дзьвярэй паказаўся чалавек у вушанцы, апрануты ў чорны шынэль. Пасярод таго, што выглядала на фундамант, на двух слупох прыбітая табліца апавяшчала вялікімі чырвонымі літарамі:

ЧЕРЕЗ ТРУД К ПОБЕДЕ КОММУНИЗМА!
И.В.Сталин

- Гэта, мусіць, будзіць тое самае фазаво, - сказала Дуня.

- Якое такое фазаво?

- Значыцца фабрычна-завадзкое абучэньня, школа нейкая, - паясьніла дзяўчына. - Чула, як Жыды ў мястэчку гаварылі.

Чалавек у вушанцы, са шчаціністым чарнявым тварам, стаяў ля будкі й прыглядаўся вучням. Мінуўшы новабудоўлю, трапілі на неаб'езджаную дарогу. Ісьці было куды цяжэй.

- Знаеш што, Дуня?

- Ну што?

- Ці ня лепі нам на калею пайсьці? Скарэй будзіць.

- Добра, давай!

Лагодным адхонам узабраліся на чыгунку. Пазіраючы адзін на другога з задавальненьнем, пераскаквалі адлегласьць між шпаламі, гэткім чынам паскорыўшы тэмпа вандроўкі. Воддаль налева, мо празь пятнаццаць чыгуначных шляхоў, вызірала чырвоная страха нізкага, падоўжанага вакзальнага будынку. Наперадзе чыгункі адбягалі направа й шмат вагонаў стаяла каля лесу, што прымыкаў да станцыі з паўдня.

- Ты паглядзі, колька яны гэтта набудавалі. Гэных-жа калеяў, што каля лесу, саўсім ні было, - спасьцярог Янук.

- Тамака ў лесе, казалі, усякага хламу й бінзіны ў бочках панавозілі, дык мусіць каб пад'яжджаць было як, - адказала Дуня.

Яна пераскочыла адзін, пасьля другі чыгуначны шлях і як гібкая сарна хутка бегла па шпалах. Янук ледзь патрапляў ззаду. Гэтака намагаючыся адно другому навыперадкі, амаль не заўважылі, як прыблізіліся да тых двух эшалёнаў, што на бакавіне пры лесе стаялі. Янук раптам спыніўся.

- Дуня, а можа ля могільніку ня пойдзем? Можа тамака празь сьнег ні прабрацца?

Спыніласяш задыханая Дуня. Пара валіла з ратоў.

- Ціха! - падняла дзяўчына ўверх руку.

Да вагонаў пры лесе было адлегласьці мэтраў дзьвесьце.

- Чуеш? - шапнула дзяўчына. Твар ейны насьцярожыўся.

- Чую, - адказаў Янук.

З вагонаў даходзіў гоман... Ды гэта ня быў гоман. Гэтак не гаварылі людзі. Нехта то стагнаў, то енчыў, то літасьці прасіў, то распачлівым, сэрца сьцінаючым голасам сьпяшыў навыперадкі іншым стогнам і енкам. Маса галасоў. Сотні, тысячы. Між іх прабіваліся танюсенькія, сіпатыя, зьнядужэлыя дзіцячыя. Распачлівая нясугучнасьць квяліла нэрвы, маразіла кроў. Зь перапынкамі брахалі сабакі.

- Што гэта? Божа мой! - жахнулася Дуня.

- Глядзі, глядзі, во вартавыя са стрэльбамі. Мусіць у гэных вагонах людзі...

- Якія людзі?

- Адкуль мне знаць... Во слухай!

Стогны й енкі то мацнелі, то слабелі. А праз тое жудаснае нясугалосьсе прабівася кашаль, хрыпата. Гэтак маглі галасіць адно зусім зьняможаныя ў роспачы людзі. Заварожаныя такой несамавітай загадкай, юнакі анямелі, замяніліся ў слых і зрок. Усе вагоны былі таварныя. Звалі іх, - Янук гэта чуў, - цяплушкамі. У такіх сама Чырвоная Армія езьдзіла. З даху кожнага вагону тарчэў комін і дым валіў часамі. Праз адчыненыя дзьверы спасьцярог аднойчы Янук чыгунную печку, у якой весела хліпаў агонь.

Адылі ў гэтых «цяплушках» ня відаць было зьверху ні комінаў, ні дыму. А калі так то ня было ў сярэдзіне й печак. Іх назваць трэба было-б не цяплушкамі, а можа халадушкамі. І як людзі тыя ў сярэдзіне сьцюдзёных вагонаў такія лютыя маразы вытрымоўваюць? Ніколі ня чулі юнакі такіх стогнаў і енкаў. Нейкім дысанансам у гэна стогнучае мора ўліўся кволы дзіцячы галасок. Пярхікнуў і суняўся...

- Гэта страшна! - жахнулася Дуня. - Што гэта такое, Янук? Хто гэтыя людзі й чаму іх дзержаць?

Яна прыхілілася да Бахмача, яе рука моцна сьціснула Янукова плячо. Янук зірнуў на пунсовы тварык. Заклапочаныя васількі пазіралі

вялікім, трывожным пытальнікам. Вартавыя ў круглух шапках, даўгіх шыналях, са штыкамі на стрэльбах, хадзілі навокал і ўздоўж вагонаў. Адзін вёў на павадку сабаку ваўчара. І здалося Януку, што з крайняга вагону, з таго маленькага ваконца ўверсе, што пад страхой, вылазілі рукі. Кастлявыя, сінія. Разьгіналіся й корчыліся пальцы. Рукі, - было іх некалькі, - намагаліся вылезьці як найдалей з вагону, але нешта іх трымала.

- Па-а-а-мілуй... пааа-мі-і-і!

Нехта прасіў літасьці, адно слова зьняможаным, шурпатым голасам паўтараў. Раптам моцна забрахаў сабака. Да крайняга вагону падыйшоў вартавы, у правэй руцэ трымаў павадок, на каторым тузаўся, аж прысядаў ад хрыпаты вялікі, буры ваўчар. Вартавы пазіраў у гэты бок і нешта крычаў. Пакуль юнакі спасьцераглі, што гэны крык да іх адносіцца, побач таго першага спыніліся яшчэ два. Вартавы паказаў сюды рукой і нешта сябром гаварыў. Адзін зь іх схапіў сабаку і ўсе тры кінуліся ў гэты бок.

- Вам чыво зьдзесь? Ухадзіце!

Выразны голас. Людзі ў зялёным беглі й крычэлі. Адзін выхапіў з кабуры наган.

- Янучок, гэта яны на нас! - страсанулася Дуня.

- Давай ходу!

Зь месца ўзялі колькі моцы. Янук азіраўся, ці ня спусьцілі з павада сабаку. Адзін трымаў ваўчара, што рваўся наперад, але здалося Бахмачу, што вартавыя іх даганяюць.

- Янучок, скарэй, бо здагоняць! - падахвочвала Дуня.

Беглі ў кірунку вакзалу. Між імі й шляхам, застаўленым вагонамі, зьзялі ў заходнім водсьвеце рэйкі. Кроў біла ў скроні, займала дыханьне, а даўгаваты бацькаў армяк замінаў Януку даць поўны ход нагам. Хлапец зноў азірнуўся. Вартавыя крычэлі, махалі кулакамі. Янук крыва ступіў, нага зачапілася за шпалу ці якую патарчаку, хлапец рынуўся на зямлю, кніжкі й сшыткі плёхнулі з торбы ў сьнег. Па нечым цьвёрдым скаблянуў локаць і моцна забалела ў баку.

- Дуня, пачакай!

Дзяўчына спынілася, падскачыла памагчы хлопцу ўстаць. Яна дрыжэла. Гарачае дыханьне абліло Янукоў твар.

- Як ты гэта... алі-ж разява! Глянь, даганяюць, скарэй!

Мігам згрэблі раскіданыя сшыткі й кніжкі й кінуліся далей. Дабегшы да вагонаў, шмыгнулі пад буфары. Вартавыя спыніліся. На другім баку вагонаў пабачылі воддаль чалавека ў чорнай вопратцы.

- Скарэй, скарэй ідзём, тутака, мусіць, няможна, - спанукала Дуня.

- У баку баліць, - скардзіўся Янук.

- Пасьля стагнаць будзеш. Ідзём!

Януку ніякавата было, што дзяўчына яго спанукала. Каб ня гэты даўгі армяк, можа ня ўпаў-бы. Азіраючыся па-бакох, яны пралазілі між вагонаў. Глянулі назад. Там нікога ня было. Вартавыя вярнуліся, мусіць да стогнучых людзей. Цяпер Дуня выпрасталася.

- Ууу-ух, Янучок, дай адсапнуцца. Алі-ж і нагналі страху, каб іх халера!

Дзяўчына паправіла кажушок, нацягнула на вушы шапачку.

- Алі-ж і мароз бярэцца, - сказала.

Рухам і гоманам жыла станцыя. Юнакі ўзялі дарогу лявей, туды, дзе на абочыне стаяў даўгі ланцуг пасажырных вагонаў. Яшчэ затрымаліся, зірнулі на вакзал. Там кішэў, пружыўся мускуламі, топаў ботамі людзкі мурашнік у зялёным. Збоку, у вялікай будцы, нядаўна з дошак ля станцыі збудаванай, дыміла кухня, браджэлі кацялкі. З усходу ўкаціўся, скрыпнуў тармазамі, адсапнуўся вялікай чорнай лёкаматывай цягнік. Даў кароткі, сіпаты гудок і спыніўся. Лязнулі буфары. Быццам бульба са скрыняў, высыпала з вагонаў войска. Недзе ў тым вэрхале захліпаўся-рыгаў баян. Ля будынку вакзалу ярчэлі сьветлы. На шэрай сьцяне, пад выцьвілым напісам ГАЦІ, даўгое, бруднае, сажай зачарнелае палатно апавяшчала:

ДА ЗДРАВСТВУЕТ ТОВАРИЩ СТАЛИН
ОСВОБОДИТЕЛЬ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ!

28

У канцавым пасажырным вагоне на бочнай чыгунцы навосьцеж адчыненыя стаялі дзьверы. Адтуль вылятала надвор сьмяцьцё. Паказаўся да паловы зношаны камель мятлы, ногі ў брудных чаравіках-шчыблетах, а наапошку вырасла ў квацістым, карэлым,

шырокім хвартуху таўстая сярэдзіна, вялікія грудзі й твар-месяц. Навокал месяца спаўзалі даўгія, незачэсаныя, цемнаватыя касмылі.

- Глядзі, Дуня, Манька во... падмятаіць, - таўхануў Янук сяброўку.

- Дзе?

- А вунь там.

- Пірапечка, ха-ха-ха! - зарагатала Дуня.

Яны падыйшлі да вагону. Пабачылі шырака адчынены рот, наіўна-дабратлівую, простую, аж шкадаваньне выклікаючую ўсьмешку, дый нейкую асаблівую прапорцыю ў тулаве. Цэлы-суцэльны мякіш. Мятла абаперлася аб сьцяну вагону, лёгка скалыхнуліся вялікія грудзі.

- А чаго-ж вы гэттака швэндаіцеся?

Голас, што нізкім альтам вылез з глыбіні мякішу, дапоўніў дзівоснасьць гэтай нязвычайнай істоты. Для гацкай станцыі Манька была тым, чым Жыдоўка Габіха для мястэчкавага рынку. Габішына крамаў кліне вуліц Глыбоцкай і Докшыцкай раскашэлілася. Прыгрэе, бывала, сонца. Пульхная Габіха на лаўцы перад крамай старожыць, кажнага падарожнага на кані на сваей двойцы аклікне.

- Што ні паедзеш на рынак дык ў таўстую Габіху, як у добрую пуню ўпрэшся, - жартавалі людзі. І не ўяўлялі бяз Габіхі гацкага рынку, так як ня было станцыі бяз Манькі Пірапечкі.

Хто й калі яе Пірапечкай ахрысьціў? Казалі, што некалі ў адной пані «каляяжыхі» служанкай была. Калі-ж панін сынок у «хамчыны» дзявочыя тайніцы паспрабаваў заглянуць, вылупцавала «каляяжыха» дзяўчыну й дзьверы паказала. Казалі...

Выводзілася Манька зь сям'і найменш папулярнага й найбольш неабходнага ў Гацях чалавека, што зь вялізнай рудой бочкай ва ўсе гацкія прыбіральні заглядаў і якога васьмёхлітарнай мянушкай клікалі. У самы захаднім хвасьце мястэчка, у трухлявенькай хаце жыў. Калі ягоны шыроказады, пародзісты бэльгійскі гняды тую вялікую бочку па каторай гацкай вуліцы цягнуў, выглядалі людзі здалёк, ці ня плёхла зь яе, абыходзілі й аб'яжджалі яго, а перад прыходам «вызвольнікаў» паліцыя загадала адно за агародамі езьдзіць, на вуліцах зусім не паказвацца.

І апроч гэнай васьмёхлітарнай мянушкі ці вядаў хто як завецца чалавек. Казалі, што пасьля першай «каляяжыхі» Манька ў іншых паноў і падпанкаў хаты прыбірала, а пасьля на станцыю прыбілася. Ад няпамятных, здаецца, часоў, была яна гэтта пад рукою, так яна так як

гэна абшмулянае крэсла ў чакальні, ці той рыначны плот, ля якога каней прывязвалі. Як той бяздомны цюцька, што існаваў, здаецца, каб на яго тукнуць-гукнуць, гэтак і Манька. Казалі, што быццам некалі чатыры клясы прабэкала-прамэкала. Кажнаму на сустрэчу шырака рот адчыняла, ласкавае якое слова пачуць хацела, а зь яе сьмяяліся, у найлепшым выпадку зь літасьцю пазіралі.

Пайшла Манька ў моду, калі «вызвольнікі» прыйшлі. Калі які цягнік, бывала, на станцыю прыходзіць, стаіць грудзі выпяціўшы, быццам на прывітаньне, Манька, круглымі вачамі лыпае, месяц-твар усьмешкай расплываецца. Расказваў нейкі мястэчкавы жартаўнік: - Знаеш, гэта самае, уіжджаіць на гацкую станцыю поізд і глядзіць здалёку, што Манька пірад вакзалам стаіць. Крычыць тады, гэта самае, качагар машыністу: Пазры, Ванька, унь барышня, сматры за цыцку паравозам ні зачапіся!

Натура Маньчына, як у сук уляпіў, да новых парадкаў пасавала. Думаць зусім ня трэба было, усё прасьцюсенька й ясна. Поўнымі вялікімі грудзьмі чэрпала дзеўка паветра «асвабаждзеньня». Казалі людзі, каторыя ведалі, што Манька напралом у авангард адданых Сталіну «трудзяшчыхся» улілася, ды ў сажалцы сталінскай «народнай улады» як павярткая-крутая рыбка плёхалася. Іншыя-ж асалоду дэталяў смакавалі й цьвердзілі, што працэс Маньчынага ўліцьця ў Сосаву калатушку не такім прасьцюсенькім быў. Аблюбавалі, быццам, сваецкія жаўнеры Маньчын мякіш. Ня перабольшвалі, мусіць, языкі людзкія. Вядома-ж было, што Манька ніколі кавалера ня мела. Як-жа тады ей напярэймы гэнаму жыватворчаму «вызвольнаму» духу ні пайсьці? Дый ці толькі духу?

Калі першыя кантаватасьці «вызваленьня» абгладзіліся, калі народ пачаў найясьнейшую пад сонцам ды найбольш сьветлую сталінскую канстытуцыю практыкаваць, за выбарамі ў «народны сход западнай Беларусіі» прыйшла чарга на выбары ў гэтак званы «савет дзіпутатаў трудзяшчыхся беларускай савецкай сацыялісьцічаскай распублікі». Побач зь іншымі партрэтамі й плякатамі, каторыя абляпілі гацкія платы й сьцены, зьявіўся круглы месяц Манькі Пірапечкі. Напіс на плякаце заклікаў: «Галасуйце за выдатнейшых людзей, перадавых прадстаўнікоў рабочых і сялян, камуністаў і беспартыйных. Марыя Іванаўна Кукішка, кандыдат ад акругі х...»

Шматлікія людзі ўпяршыню даведаліся прозьвішча «выдатнейшага чалавека, перадавога прадстаўніка» Манькі Пірапечкі. Мястэчкавыя жартаўнікі ад зьдзіўленьня раты разявілі. Ненадоўга. Новыя пераказы пра Маньчын прагрэс у «выдатнейшыя людзі» пачалі майстраваць. А дзеўка, як і цяпер, далей чысьціла вагоны, лічыла цягнікі, шырака разяўляла дурнаватай усьмешкай рот.

- А што ты, Манька, загародзіш нам, ці што? - усьміхнулася Дуня.

- Ды што вы мне, каб я загараджвала, хы-хы-хы, - разрагаталася дзеўка.

- Чаму-ж ты, Манька, такую работу робіш? Цябе-ж вунь у начальнікі выбіруць, - жартаваў Янук.

- Таварыш Сталін сказаў работаць, работаць і работаць, - ёмка адрэзала дзяўчына.

- А ён так сказаў? - пытаўся далей Янук.

- А ну канечна сказаў, чудак ты, хы-хы-хы.

- А ты, гэта самае, там была й чула?

- Ды разьві нада было быць? Як савецкае начальства гаворыць, што сказаў, так палагаіцца верыць, што дзісьцьвіцільна сказаў. Ну ні так?

Мякіш абапёрся на мятлу й шэрыя вочы пазіралі на юнакоў проста й наіўна.

- А што таварыш Сталін сказаў работаць? - цягнуў Янук.

- Ну як што... Эгэ! - усклікнула Манька, - ты, сапляты, што гэта зь мяне кепікі ўзяўся строіць? Ды я цябе, такую тваю...

Маньчын язык пачаў вярнуць прынесеныя маскоўскія брыдоты. Сіпаты голас трос грудзі й здавалася, што неўзабаве мятла рынецца на Янукову галаву.

- Ну пірастань, Манька, пірастань, - намагалася суняць дзеўку Дуня. - Скажу нам лепі, ці цябе ў дзіпутаты выбіруць.

- Канечна выбіруць, - без запыну адказала Пірапечка.

- А хто табе казаў, што выбіруць?

- Ды як гэта хто? Сам таварыш Саладуха казаў, от хто.

Месяц зазьзяў трыюмфальным поглядам. Упэўненасьць гэтай дзеўкі нагадвала наіўна-дзіцяннае «мама казала, от хто».

- Дык ты мусіць тады проста ад падмятаньня паняй будзеш, як у дзіпутаты пападзеш, - кпіў Янук.

- Якой такой паняй?! Ты гэта што, ня чуў куды паноў вунь вязуць? Тамака яны ў тых вагонах выюць, ідзі паглядзі, - кіўнула дзеўка галавой у той бок, адкуль кагадзе юнакі ўцяклі. Твар ейны ўзгарэўся, спакойныя вочы заіскрыліся, ды ўсхадзіліся вялікія грідзі. Здавалася, што неўзабаве мякіш гэты, што тросься з паднечаньня як дрыгва, кінецца на тых ненавісных, выючых паноў. Жорсткая рэакцыя, што ажывіла гэту тушную й павольную асобу, мела асаблівы камічны выгляд.

- А гэта там у тых вагонах паны сідзяць? - падміргнуўшы Януку, цягнула Маньку за язык Дуня.

- Няўжо-ж хто, - адказала дзеўка.

- А якія гэта паны? - пытаўся Янук.

- Ды чорт іх ведаіць якія. Пасабіралі, панімаіця, гэта барахло з маёнткаў, фальваркаў, адаўсюду...

- А калі іх іх пазьбіралі? Доўга так стаяць?

- Да ўжо нядзелю, верна, ілі болі, - адказала сіпатае альта.

- А есьці ім даюць? Чаго яны выюць?

- Да я ні знаю. Верна ні даюць, да і нікаво ні падпускаюць блізка. І пускай здыхаюць, нашто ім есьці...

- Дзеці там таксама ёсьціка? - спытаў Янук.

- Верна ёсьціка, - неахвотна ўжо буркнуў «выдатны чалавек». - Ды сказала я табе, есьлі хочаш узнаць дык пайдзі сам туды, а мяне ні спрашывай. Накога чорта яны мне...

- Ні распытвайся ты яе, - таўханула Янука Дуня. - Ня відзіш, што злуецца? Ідзём замарудзілі, позна ўжо.

Янук зірнуў на пульхную дзеўку, памяркаваў, што, мусіць, больш ужо зь яе ня выпампуеш, ды рушыў побач Дуні. Бокам абыйшлі вакзал і накіраваліся на галоўную вуліцу. Ужо шарэла й электрычныя лямпачкі на слупох зіхацелі млявым сьвятлом. Мароз адзываўся пад нагамі храбусткой скарынкай пачарнеўшага сьнегу й цяў коньчыкі вушэй, канцавіны рук і ног. Янук угледзеўся ў сустрэчную лямпу й здавалася яму, што кашаль-чханьне далёкае электрастанцыі, чутнае праз навакольны гоман, хліпала на дроціку лямпы. Доўгая канцэнтрацыя на сьвятле сьветчыла адно, што хлапец дзесьці далёка думкамі блудзіў.

Енк у вагонах... і мілы, знаёмы тварык... кастлявыя, сінія рукі... і блізкі галасок... спагада й розум... Што гэта й адкуль? Недзе яно

вязалася разам. І Янук прыгадаў. Раптоўна спыніўся й Дуню моцна за рукі тарганўў.

- Дуня, ведаеш што?

- Ну што?

Янук маўчаў і шырокімі, ледзь прытомнымі вачмі пазіраў у дзяўчыніны пытальныя васількі.

- Кажы што. Ні трасі мяне, гавары!

- Гэта самае... от што прыпомніў я... Знаіш, хто тамака пэўня ў тых вагонах сядзіць?

- Ну?

- Я думаю, што яны тамака.

- Хто гэта яны?

- Ну гэтыя-ж Старажонкі, хто-ж... з Галавачоў. Ні знаіш? Іх-жа, кажуць, таксама забралі, з панамі разам, от як...

І Янук моцна, голасна зарагатаў. Дуня пазірала на сябру й ня ведала што рабіць.

- З панамі! Чуеш? Біда аж пішчэла, галапупых поўная хата, а яны от не абы зь кім, а зь вялікімі панамі ў Сібір паедуць. Чуеш, Дуня? Што ты на гэта скажаш, га?

Старажонкі - шматдзетныя арандатары вялікага неўрадлівага фальварку. Гліна, глей, падзолак. Колькі іх бралася, грызла, калупала зямлю ды, плюнуўшы, адыходзіла. І Старажонкі паласавацца хацелі. Бацька малы, чарнявы, як корч, цяглавіты рабацяга. Ужо сына старэйшага, гадоў зь пятнаццаць, да працы падпрагаў. У хаце дзяцей як бобу, васьмёрка, мусіць. Жартаваў тады нехта, што папа рымскі наказаў, каб каталікі размнажаліся, дык Старажонак надта заўзята ватыканскія наказы выконваў. Хата-ж у фальварку была вялічынёю на які тузін.

Старажонкава Верачка, хлёсткая малая цаценька, разам зь Януком і Дуняй у адной клясе засёды першай вучаніцай была. Ды што там для яе праграма школьная! Цэлы, здавалася Бахмачу, неабсяжны літаратурны сьвет знала: і Міцкевіча, і Сянькевіча, і Рэйманта, і Жаромскага, і Гётэ, і Бальзака, і Шэкспіра. Янук пра некаторых тых вяліканаў першы раз чуў, а Верачка-цаценька іхныя творы чытала. Мала таго. Гэта ад яе пачуў Янук Купалавы, Цётчыны й Коласавы вершы. Зь ёю на якую хочаш тэму гавары. Часта дзівіўся Янук, што дзяўчо, як казалі, вялічынёю з кукіш, а колькі разуму Бог ей даў.

- Што ты хочаш, каб я сказала? - глуха адазвалася Дуня, галаву апусьцўшы. - Мусіць таму ўзялі, што яны Палякі.

- Палякі? - перапытаў Янук.

- Ну, яны-ж каталікі.

- Фэ, от і сказала, разумніца, - скрывіўся Янук. - Ці ты ведаеш, што мне гэта цаканька-Верачка адзін раз казала?

- Што?

- Казала, што ня ўсе каталікі ёсьць Палякі. Тыя, каторыя гавораць пабіларуску й роджаныя тутака, дык яны Беларусы, хоць і каталікі. Яна гэтак казала. І ведаеш яшчо што?

- Ну?

- Казала цаканька-Верачка, што калі-б так было, як Палякі кажуць, значыцца, што ўсе каталікі ёсьціка Палякі, дык трэба было-б тады ўсіх французаў, Гішпанцаў, Італьянцаў ды цімала яшчо якіх Палякамі папісаць. Дык цяперака сама відзіш, што Палякі наўмысна лухту паролі, народ наш ашуквалі. Дык Старажонкі ніякія ні Палякі, от як.

- Цаканька-Верачка, мусіць праўду казала, - згадзілася Дуня.

- А от папаліся й паедуць на Сібір тую. І за што?

У Януковым уяўленьні зьявілася малое, недаслае на свае гады дзяўчо. Анельскі тварык, вельмі разумныя й заўсёды вясёлыя вочкі. Цяпер-жа тая дзяўчына-цаканька (мянушка надзвычайна трапна характарызавала яе ўдома і ў школе) недзе, як у клетцы, зь дзеткамі калее. А мо каторага на руках трымае? А можа ўжо памерзьлі, ці з голаду душу Богу аддалі?

Думка скаланула Янука марозам жахлівейшым, чымся той, што ціснуў на захад сонца. Юнакі йшлі моўчкі. Янук зірнуў на плот. Адтуль з плякатаў пазіраў месяц Манькі Пірапечкі й гэны назойлівы напіс: «Галасуйце за выдатнейшых людзей, перадавых прадстаўнікоў...»

- Тпрррррруу! - пачулася гулкае на дарозе. Дзядзька Захарук спыніў каня. - Ну сядайце! Чаго глядзіцё, як бараны на новыя вароты.

Не марудзячы, Янук зручна кульнуў Дуню за шырокія дзядзькавы плечы й прымасьціўся сам.

- Алі-ж дзядзька маладзец! Каб табе Бог здароўя поўныя прыгоршчы! - пахваліла Захарука Дуня.

- Но-о-о-о-о! - пагнаў гнядога гаспадар. - ...йшоў, цюхцяй!

Дзядзька, скарэй лёганька пагладзіў, чым сьцебануў канёў зад і падатлівы гняды, што ведаў кожны гаспадароў рух, трушком рушыў у дарогу. Ён бег так роўна й бязь ніякіх намаганьняў, што, здавалася, чалавек дзесьці на мяккай раўніне ў прасторы плыве.

- Захініцiся вы, жабоцькі, ато памерзьніце, - загадаў вучням Захарук.

Пры хуткай язьдзе больш дацінаў мароз.

- Надта-ж хлёсткага коніка, дзядзька, маеш, - пахваліла Захаруковага гнядога Дуня.

- Ага, - буркнуў рыжавусы селянін, - ён-жа нічога-ткі...

- Што-ж чуваць, дзядзька Захарук?

- Эт, нічога. Што ў вас?

- А дзядзічка, а роднінькі, каб ты відзіў, што мы сягоньніка зь Януком відзілі, - сказала прыцішана-таямнічым тонам, нахіліўшыся да Захарукова вуха, Дуня.

Селянін сьцяміў, што дзяўчына мае яму нешта важнае сказаць і таму пільна прыслухоўваўся.

- Гэта-ж во тамака за станцыяй, з таго баку каля лесу два саставы вагонаў стаяць. Дык людзі тамака ў тых вагонах так стогнуць, так галосяць... Мы зь Януком са школы йшлі ды задумалі-ж гэта нацянькі праз поле дамоў... ажно тамака, чуем, выюць-галосяць, акасьцянелыя сінія рукі з вагонаў выцягваюцца... слабыя, хрыплыя галасы дзетак... такі крык і стогн, аж сэрца разрываіць, як блізка падыйдзіш. Алі-ж хто падыйсьці асьмеліцца... Янук і я аж аслупянелі, пачуўшы гэта, алі нас вартавыя з сабакамі даганялі, дык мы колька сілаў мага, аж дух займала, давай наўцёкі...

- Гэта ці ня тыя будуць, каторых дзьве нядзелі назад пазабіралі, - сказаў Захарук.

- Як гэта? - усхапілася Дуня, - Дык іх так доўга галодных і на холадзе дзяржаць?

- А няўжо-ж, - адгукнуўся раўнадушна Захарук.

- А Божа-ж мой! - усклікнула ўтрапённым голасам дзяўчына. - Бедным людзям ніхто не паможыць!

- От памажы... Паном ні варта памагаць, скула ім у бок, - з націскам спасьцярог Захарук. - Алі-ж там многа людзей, так сказаць нашага брата, нівінаватых ні ў чым. Дык як ты ім паможыш, каб і

хацеў? Скарэй сам пападзешся. Кажаш, што за вамі гналіся. Як гналіся?

- ЫнкавудЭ з сабакамі, - пасьпяшыў адказаць Янук. - І яшчо крычэлі на нас.

- Дык от, будзьце асьціражней другі раз, - параіў памяркоўны дзядзька.

- Гэта праўда, дзядзька Захарук, што іх ня кормяць і што ў холадзе яны мерзнуць? - спыталася Дуня.

- Так людзі кажуць.

- Дык яны-ж памерзнуць і з холаду паўміраюць, - жахнулася дзяўчына.

Задуманы Захарук доўга глядзеў на вучняў, выняў з роту сьмярдзючы руды недакурак ды ёмка плюнуў праз правае плячо.

29

Антось Дзяркач прахапіўся зь нялёгкай дрымоты. Ныў зьмярцьвелы зад і плечы ад халоднае, цаглянае сьцяны й цэмантовае падлогі. Маленькая камора, дзе трымалі яго ўжо дні два, - дакладна ня мог ведаць, - набрыняла сьцюжай, сьцены пакрыліся інеем. Ня было на чым ні сесьці, ні прылегчы. Зьверху ярка сьвяціла электрычная лямпачка, нема пазірала зь дзьвярэй «вочка» й гэта ўсё, што тут было. Праўда быў яшчэ ён сам, Антось, Дзеркачом празваны. Тросься з холаду, корчыўся пусты жывот. Цяжкім дурманам замарочаная, бяссоньніцай змораная, ці ні паўтоны важыла галава.

За дзьвермі пачуліся крокі. Антось паволі падняўся, пачаў нясьмела пацягвацца, пазяхаць, рукою твар мацаць. І гэны ягоны, звычайна цьвёрды дзяркач памякчэў ужо, забыўся дзяцюк, калі апошні раз брыўся. Крокі за дзьвярмі спыніліся, нехта пазіраў у каморку. Неўзабаве адыйшоўся й недзе ў калідоры скрыпнулі дзьверы. Антосеў зрок спыніўся ўверсе, аж пад самай стольлю, дзе маленькае, падоўжанае ваконца загарадзілі стальной рашоткай. Навет удзень праз тое ваконца не пабачыш нічога, бо зрок у нейкую сьцяну ўпіраўся.

Пра гэту прыбудоўку калішняй вільлі пана Вілінскага ня ведаў Антось да часу, пакуль самога сюды прывялі, ночы ўдома схапіўшы.

Адно таму, што Антось амаль кожную сьцежку-дарожку й кажны дом у Гацях ведаў, зар'ентаваўся дзе апынуўся. Але якім чынам правочыў турму-прыбудоўку? Яно, лепш падумаўшы, прыгадаў-бы пэўне-ж, што ад часу прыходу «вызвольнікаў» людзі пранюхалі дзе запраўдная «народная ўласьць» памяшчаецца, дый трымаліся воддаль яе. Ад часу допытаў, Аксені й Аўдолі як хто языкі завязаў. Жанчыны пасварыліся, але ўсё-ж неяк выплыла наверх у якім будынку палатна шукалі.

Ад пачатку арышту ня спыняліся Антосевы допыты. Пачыналася ад «імя й вотчаства» дзеда й прадзеда. Бацькавага дзеда Антось прыгадваў, ведаў навет, што чатыры валокі зямлі й васьмёра дзяцей меў. Што за людзі былі іншыя дзяды ці бабкі? Сьветлая памяць тым, што на вечны супачын адыйшлі.

Спачатку сьмешнымі здаваліся пытаньні таго лысага, брытага гарбуза. Спрабаваў абыходзіць, жарты закідаючы. Адылі кручканосы гарбуз, бязь ніякае літасьці, марудзіў сваё. Тупая, упартая маска, нейкая казённая мумія. Адно неяк не пасавалі да гэнай маскі разумныя й хітрыя вочы. Калі глядзелі на цябе, праразалі ўглыб, бачылі наскрозь, здаецца. Выглядала, што нічога ад іх не схаваеш. Калі бальшавікова глотка раўла «врёш, сволоч!», здавалася Дзеркачу, што яны адно пацьвярджалі тое, што даўно спасьцераглі рудыя вочы.

Даводзілася Антосю й сумлявацца. Ніколі-ж у сваім недаўгім жыцьці не спатыкаўся з падобнай праблемай. Хітры як ліс, практычны жартаўнік, што любіў пакпіць і навет пазьдзеквацца з чужой помпы, надзьмутасьці ці звычайнай недарэчнасьці, ён гэтта адчуваў сябе пад узьдзеяньнем нейкай ня зусім зразумелай яму брытвы. Выглядала, што брытва цяпер адно зьверху забаўлялася-ёрзала, але вайстрыню яе ўжо добра на сваей скуры адчуваў. Вось яна, глядзі, рэзане ўглыб і тады крывавіць будзеш.

Пасьля прадзедаў, дзеда, бабкі, бацькі й маткі йшлі пытаньні наконт іншых бакоў «сацыяльнага праісхаждзенія». Шмат распытваліся аб тым, як сталася, што ён адзін з усей грамады новабранцаў змог дамоў уцячы.

Антось хадзіў па маленькай каморцы, - крокаў зь пяць мо ўдаўжкі й тры ўшырыню, - ды тросься з холаду. У адурманенай бяссоньніцай галаве хаосам блыталіся розныя думкі. Вось зноў выплыў наперад кручканосы гарбуз: «Я тебе покажу, такая твоя контра!» Здавалася, што

недзе знутры крычэў адно сам голас, а пуцатая маска быццам і ня прысутнічала пры тым.

Нехта накрамзоліў штосьці на сьцяне. Антось прачытаў:

«Ешчэ Польска не згінэла,
а вы, кацапы, пацалуйце мне...»

Цікава, колькі ўжо праз гэту камору прайшло людзей? Ці сядзелі яны доўга, ці коратка? І чаму гэта бацька ня прыйшоў? Няўжо-ж ён ні стараўся? А мо ні пусьцілі? За сьцяной чутна хадзіў вецер. Шорах ветру, здавалася, распазнаў-бы Антось - сябра лесу, поля й нівы, хоць-бы яго пару мэтраў пад зямлю закапалі. Недзе нешта глуха стукала, мабыць аканіца аб сьцяну. Можа бура на дварэ? Цікава, ці цяпер дзень ці ноч?

Антось стануў, прыхіліўся да сьцяны, пачаў мяркаваць, калі забралі яго з дому, колькі часу мог быць пад замком. Пяць разоў вадзілі на допыты. Час тады валачыўся балюча-марудна й паколькі ня бачыў гадзіньніка, лёгка меру часу траціласа. Дый што за розьніца? Так ці гэтак,пакуль духі зь цябе ня выматаюць, мусіць, ня пусьцяць. А мо й зусім дарогі дахаты ня бачыць яму? Можа на Сібір пашлюць?

Дзяцюк здрыгануўся. Тросься, мусіць, ад тэй інеем пакрытай сьцяны, да якой прыхіліўся. І здавалася яму, што калі ад холаду гэтта не апруцянее ды на волю выпусьцяць, дык можа здароўем падупасьці. Не хаханькі-ж галоднаму ў такой халадэчы пасядзець. На дварэ, напэўна, скрыпуча-кусьлівы мароз. Цяжкая, змучаная галава зноў на сон хіліла. Але як гэта на халоднай цэментовай падлозе пасьпіш?

Заскрыгаў ключ у замку, скрыпнулі дзьверы й пачулася ўжо ведамае «сьледуй за мной». У пакоі допытаў ні душы жывой. Як і раней, утаропіўся Дзяркач у ледзянавокую маску на сьцяне. Чакаць давялося нядоўга. Кручканосы гарбуз увайшоў шпаркім крокам, сеў за сталом.

- Табе хто пазволіў сесьці? - гаркнуў на Дзеркача.

Антось устаў з лаўкі.

- Прозьвішча! - пачалося ўсё з пачатку.

Антось ня меў магчымасьці праведаць у раней дапытванных ды вымяркаваць чаму кажны раз пачыналася з таго самага, каб пасьля шматлікіх «матаў» да галоўнага прыйсьці.

- Я ўжо вам раней казаў, - буркнуў Антось.

- Скажы яшчэ раз!

- Ну дык нашто гэта? Я-ж ужо расказаў і аб дзядох, і бацькох, і сваё сацыяльнае праісхаждзеньня. Вы-ж усё запісалі, - з дакорам паясьніў Антось.

- Ты это что, мне указывать будеш?, что делать? - раўнуў гарбуз. - Я спрашиваю, а ты отвечай! Понял, сукин сын?

- Понял, - буркнуў Дзяркач.

На працягу наступнай гадзіны, ці мо й даўжэй, паўтарылася ўчарашняе й пазаўчарашняе. Быццам першы раз, сьледчы паволі й дбайна запісваў адказы, курыў і спакойна пераходзіў да наступных пытаньняў.

- Хто памог табе спэцкаць лёзунг на літоўскай школе перад зборамі?

Вось яно, галоўнае.

- Які лёзунг? Хто яго пэцкаў? Ня ведаю аб чым гаворыце, - спакойна адказаў Антось.

- Ты гэта што, упарты балван? Пачакай, я многа часу маю. Ні прызнаешся дык здохнеш тут. А ну стань ля сьцяны, рукі ўверх. Скарэй ты, сукін сын!

Антось падыйшоў да сьцяны, падняў уверх рукі.

- Бліжэй, выпрастайся, от так! - раўнуў сьледчы за вухам і так заехаў каленам ззаду ў сярэдзіну, што Дзеркачу дыханьне заняло. - Не варочай галавы, проста ў сьцяны глядзі!

Гэтак выпрастаны, прылёгшы да сьцяны, рукі выцягнутыя над галавою, Антось застыў у далейшым чаканьні. Сьледчы хадзіў па пакоі, нарэшце сеў за стол. Маўчаў. Мінула шмат часу.

- Паўтараю: хто памог табе спэцкаць лёзунг у школе?

Антось маўчаў. Млявасьць разьлілася па канцавінах і па ўсім целе. Цяжкімі намаганьнямі стараўся трымацца, каб ня ўпасьці.

- Отвечай, вредитель ты, сукин сын, когда спрашиваю!

Голас цьвёрды й моцны, добра вытрыманы. Нікчэмнік, мусіць, зусім не хваляваўся, моцна набітую руку ў допытах меў. Абыякавасьць - вось усё, што адчуваў Антось. Але да рэзыгнацыі яшчэ не дайшоў. Навошта казаць хоць-бы якую макулінку праўды, а яшчэ больш выдумляць? Скажы адно, дык цягаць будуць пакуль прызнаешся, што

Крэмль узарваў, самога Сталіна павесіў. У галаве пачало шумець, слабелі калені й пруцянелі рукі. Адчуваў, што доўга ня вытрымае.

Былі моманты, калі ў сярэдзіне змучанай галавы два чалавекі спрачаліся. Адзін наважыў пайсьці сьледчаму на руку й навыдумляць усялякай трасцы. Гэтта небясьпека падсьцерагала: калі бальшавік спанатрыць, што ўсё выдумаў, дык можа яшчэ горш быць. Другі-ж Дзяркач проста навосьлеп супярэчыў таму першаму ўгодніку. Надта-ж балюча рэзала бальшавіцкая брытва. Але чым глыбей яна старалася ўрэзацца ў Антосеву мякаць, тым больш хацелася аддаць назад удвая.

«Скула табе ў бок, жыдзішча праклятый!» - катэгарычна адказаў першаму гэты другі, адважны й непакорны, да канца гатовы змагацца Антось. - «Здыхлаты на цябе, нячысьцік. Зьгірдзішся ты перш, чым табе што скажу!»

Пасьля такога канчатковага й наважнага адказу ажно лягчэла Антосю цялеснаму, каторы да сьцяны прыліп.

- Видно, голубчик, - сказаў кручканосы гарбуз, устаючы з-за стала, - что баловаться хочешь. Погоди, сам попросиш. У нас время хватит.

З гэтымі словамі сьледчы пакінуў пакой.

Адно зачыніліся дзьверы, як Антось сеў на лаву. Дрыжэлі калені, недзе зусім да сьпіны прысох жывот і зусім высах рот, быццам у яго хто жарствы насыпаў. З халоднага ў гарачае кідала. Ці маглі быць якія сумлевы, што калі-б дамоў неяк удалося вярнуцца дык прыдзецца ў пасьцелю залегчы.

Ня ўсьпеў Антось як сьлед на лаве расьсесьціся, як шырака, з гукам адчыніліся дзьверы й малады, прысядзісты, шыракаплечы чалавек з каўказкім тварам убег у пакой. Бачыў Антось яго раней. Сьледчы паклікаў каўказца на помач, калі Антось адмаўляўся танцаваць пад бальшавіцкую дудку. Каўказец нічога не гаварыў, адно сьлепа загады выконваў. Відаць, што ў сваім рамясьле набітую руку меў, бо без найменшага намаганьня так цябе схапіць за найбольш кволае месца мог, што дзясятаму закажаш. У рамясьле тым адчувалася нейкая грацыя й стрыманасьць. Давалася адно столькі фізычнай сілы, колькі якраз патрэбна было. І думаў ужо раней Антось, гэта тупалобага робата гледзячы, што бяда была-б тэй ахвяры, якой гэты каўказец усе свае катавальныя здольнасьці пачаў-бы прысьвячаць.

Як дзярлівы тыгра, тупалобы мігам перад Антосем апынуўся. Быццам абцугамі, схапіў дзяцюка пальцамі за нос, паставіў на ногі. Не агледзеўся Дзяркач як хутка й якім менавіта чынам тое сталася. Войстрай дзідай кальнула яго нешта пад мышкай, у гарляку залажыла праход для паветра, балюча крутнулася правае плячо й поўным цяжарам звaліўся дзяцюк на падлогу. Калі-ж намагаўся злавіць у лёгкія хоць крыху паветра, каўказцаў бот душыў тое месца, дзе ля жывата зьбягаліся Антосевы ногі. Нястрыманы боль агнявымі шпількамі расплываўся па целе, выціснуў з вачэй сакавітыя сьлёзы. «Задушыць, сукін сын», - мільганула ў Антосевай галаве. Пачаў крычэць, колькі моцы. Бот адпусьціў на тым месцы, дзе сыходзіліся ногі, клешчы злавілі яго за вушы й мігам дзяцюк ужо ля сьцяны стаяў. Магутная сіла крутнула рукі й не агледзеўся як прыліп да сьцяны якраз у такой самай пазыцыі як тады, калі сьледчы дзьвярмі скрыпнуў. Адылі цяпер зморанае цела балела ў многіх мясцах і пратэставала. Адчыніліся ззаду дзьверы й каўказец зьнік на калідоры. Ужо па іншых кроках распазнаў Антось таго, што ў пакой вярнуўся.

- Следовательно, повторяю: кто тебе помогал испортить лозунг на литовской школе и с кем ты всё время в деревне делал антисоветскую пропаганду?

Дзіва. Лагодна-памяркоўна гучэў бас. Калі-б гэта дзесьці ў сямейным коле яго пачуў, пабажыўся-б чалавек, што якраз такім лагодна-ласкальным тонам бацькі да сваіх дзетак гавораць. А мо гэты агідны кручканосы гарбуз і меў сям'ю й дзетак, якіх навет мог ласкаць і песьціць? Што ён за чалавек?

Антось дрыжэў і маўчаў.

Шарганула за сталом крэсла, ацяжэлае, пузатае тулава выгадна распаўзлося, адчыніліся таўстыя, круглыя вусны й адтуль прыляцеў да Антосевых, смылячых і чырвоных вушэй сяброўскі зварот: - Будьте любезны, садитесь, пожалуйста.

Круты паварот. Але Антось, змораны фізычным перакананьнем каўказцавых рук, прытомнасьці яшчэ ня страціў. Не марудзячы, адыйшоў ад сьцяны й сеў пры стале насупраць сьледчага на самым краю крэсла. Ззаду адчыніліся дзьверы й перад Антосем на стале касматая, чорнавалосая рука паставіла поўную шклянку чыстай, надта прынаднай, празрыстай вады. Не пасьпелі ззаду сьціхнуць крокі, як Антосева рука ўжо на стале была.

- Погодите минутку, гражданин, пабеседуем. Вы, наверно, пить хотите?

Пяшчотны тон... Рука сьледчага адсунула на сярэдзіну стала шклянку з вадой. Зьдзек. Антосева рука абамлела на калене. Піў вачмі. Гарэлі сьмяглыя вусны. Ня было насупраць ані кручканосага гарбуза, ані ледзянавокага Грузіна на сьцяне, адно надзіла, зьдзеквалася зь яго, зьбітага й зганьбаванага вялікая, прынадна-празрыстая, жыцьцядайная шклянка чыстай вады. Вада - альфа й амэга ўсяго жыцьця-быцьця, усей шырыні мізэрнага Антосевага існаваньня. Як ня дзіўна, адны й тыя самыя рэчы набіраюць зусім іншага значэньня й моцы, калі бачыць іх у розных пэрспэктывах. Хіба адно змораны, зьняможаны падарожнік пустыні бачыў калі ваду ў падобным сьвятле, як ўяўлялася яна цяпер Антосю Дзеркачу. Вось яна гэтта, зусім перад дзяцюковым носам. Адно часіна, адзін рух рукі і яна асьвяжыць вусны, уліе жыцьцёвую сілу ў зьняможанае цела. Адылі між сьмяглымі, парэпанымі дзяцюковымі вуснамі, сухім жыватом і вадой-збавіцелькай станула бяздушная, грозная магутнасьць бальшавіцкага паліцыйна-сьледчага апарату. Вада сталася максымальнай прынадай-пасткай. Прадайся, прызнайся, падпішы ўсё, што вымагаюць, адно тады зможаш адсьвяжыць сьмяглыя вусны, прамачыць страўнік.

У тым месцы й часе, дзе апынуўся Антось Дзяркач, чалавек не разважае памяркоўнымі й цьвёрдымі катэгорыямі, не абасноўвае зьмененых вартасьцяў звычайных, будзённых, нармальных рэчаў. Хіба адно волатам пад сілу такое нешта. Загіпнатызаваны відам празрыстай вады, сядзеў Антось і ў галаву яму не магло прыйсьці, што лягчэй цярпець было-б, калі-б на бок галаву адвярнуў. Тымчасам сьціплая вялічынёй шклянка вады расла ў змучаных бяссоньніцай Антосевых вачох да манументальна-непазнавальных разьмераў, засланіла ўсё навокал і ў меру такога гіпнозу расла ягоная сьмягласьць, напаўняўся балючай жарствой змораны страўнік.

- Вы курите? - спытаў ласкавы голас. Сьледчы падсунуў адчыненую папяросьніцу.

- Не, - адказаў Антось. Ён ня зводзіў вока з вады. «А што каб раптам схапіць і выпіць? А пасьля... што будзіць, ніхай будзіць», - думаў Антось. Гэткую нагла-зухаватую ў корані перасек каўказкі твар. Антосева левая рука, быццам для пацьверджаньня небясьпекі, памацала там, дзе зыходзіліся ногі. Страх уваскрос новым болем.

Гарбуз пачаў гаварыць.

- Может быть вам неизвестно... Советская власть самая лучшая и самая гуманная в мире. Первой и преимущественной заботой этой власти - человек. Это совершенно понятно, ибо самые порабощённые слои эту власть для блага своего и тех которые придут позже. Следовательно не было и не будет у нас заботы большей, чем та, которую ощущаем для человека. Но исходя из этого, не должны мы забываць и другую сторону того столба, на котором построена первая и самая могущественная социалистическая страна в мире. Эта другая сторона - наша полнейшая и крайняя преданность нашей родной коммунистической партии, нашему правительству и в первую очередь нашему вождю, великому и мудрому учителю, отцу всех народов мира, товарищу Сталину...

Настаўніцкі голас спыніўся. Аўтамат і тут, дзе ня было паслухмяных нявольнікаў, што пры згадцы дыктатара пачалі-б аддана плёскаць далонямі, зрабіў вытрыманы перапынак.

- У многих из нас есть ещё отрицательные пережитки прошлого, которые следует уничтожить и выбросить как нам чуждые и вредные, - прадаўжала лагодным басам шарманка. - Это сделать изумительно легко. Да! - падчыркнуў кручканосы гарбуз, - изумительно легко. У вас тоже эти пережитки есть. Они у вас, конечно, не по вашей вине, ибо вы жили в обществе, где человек человеку был волк. Понимаете? Человек человеку врагом был. У нас наоборот: человек человеку есть самый лучший друг. Видите как у нас? Стало быть, если каждый из нас есть другом каждому другому так и последовательно мы должны быть наибольшими друзьями. И наиболее преданными нашей власти. Ибо кто же, если не она, наша власть, ощущает для нашего блага наибольшую заботу? Вы должны полностью довериться вашим местным руководителям, активистам, коммунистам, не иметь никаких секретов, наоборот - навстречу им идти. Да, навстречу! Видите ли, как это просто и изумительно легко? Вы, может быть, не понимая наших порядков, каким то образом попали в шайку врагов советской власти, злобных клеветников. Может быть, вы хороший человек и раньше никто не раз'яснил вам советских порядков, не дали вам возможность увидеть полноту, красоту и гуманную справедливость советского мира. Так я вам сейчас и предлагаю эту возможность. Признайтесь, что вы делалі советской власти большой вред, назовите нам тех людей, с

которыми вместе работали и я вас уверяю, что советская власть, которая есть самая лучшая и гуманная в мире, простит вам и как родной отец или мать станет заботиться о вас и откроет вам дверь благополучной жизни.

Шарманка спынілася. Пстрыкнула запальнічка й над сталом падняўся круг дыму. Гэта ня быў той дым, што рэзаў лёгкія дзяручым смуродам карашкоў.

Рука падсунула Антосю шклянку вады. Ня верачы, вязень зірнуў на нямую маску й адно пасьля ласкавага «выпите, пожалуйста» сьмяглыя вусны прыліплі да берагу шклянкі. Ніколі, мусіць, за цэлы свой куртаты век не адчуваў Антось такой вялізнай асалоды. Трыма ці чатырма вялікімі глыткамі вада апынулася ў дзяцюковым страўніку. Зь вялікім смакам Дзяркач аблізаў асьвежаныя вусны й спанатрыўшы новапрыбыўшыя сілы ў цэлым арганізьме аж раўней сеў на крэсьле.

- Сейчас вас отведут в камеру, - гаварыў сьледчы. - Советую вам хорошенько передумать всё, что я здесь сказал и следующим разом не только самому признать все акты вашей вредительской работы, но и выдать всех ваших поплечников. Нет нужды убеждать вас в том что вас ожидает если не сделаете как вам советую.

Антось ня ведаў колькі прайшло часу як з допытаў вярнуўся. Дзесь па калідоры, за гэным вочкам часта адчыняліся дзьверы, каротка гудзеў голас, а Дзяркач шнураваў ушыр і ўдаўжкі камэры, чакаючы калі зноў яго выклічуць. Спрабаваў спаць, але, задрамаўшы, прачынаўся ад нясьцерпнага холаду, уставаў, бегаў, хукаў у рукі, дрыжэў-калаціўся. Пасьля, здвалася, няскончанай вечнасьці, адчыніліся дзьверы каморы й вартавы загадаў: - А ну-ка давай, с вешчамі!

Дзяцюк зірнуў на вартавога, вочы прабеглі па пустой каморы. Зь якімі «вяшчамі»? Забралі-ж амаль голага, не далі навет з бацькам разьвітацца. У знаёмай яму ўжо канторы кручканосы гарбуз сядзеў за сталом. Калі вартавы зачыніў дзьверы, ён коратка сказаў: - Вы сейчас пойдёте домой. Лишь подпишите эту заявку, что никогда и ником не будете говорить о том, что здесь происходило. Поняли?

Напалоханы й зьняможаны Дзяркач чакаў чаго іншага, але не таго, што чуў і бачыў. Няйнакш сьледчы выдумаў нейкі дрэнны жарт. Зноў непрадугледжанае пачнецца. Ці зможа ён высьлізнуць з гэтай новай, няведамай пасткі?

- Ну чего стоиш? Разве по-русски не понимаеш? Что с тобой?

Сьледчы падсунуў яму паперку й палажыў збоку ручку. На паперцы было нешта напісана, але колькі ні намагаўся Антось прачытаць, - а парасейску ня ведаў добра, - літары скакалі, дваіліся. Дом, цяпло, міска сытнай стравы, - вось што, быццам сонца, зазьзяла на цёмным у апошнія дні Дзеркачовым гарызоньце. Ён навет ня памятаў, калі падпісываў тую паперку.

Ці раз пазьней Антось разважаў пра нядужасьць і вытрымаласьць фізычную. І часта прыгадваў як гэным часам, калі адчыніліся перад ім дзьверы на волю, лягла зноў сонечная й прывабная дарога да роднае хаты, адкуль узялася тая моц, куды сплыла тая вялікая нядужасьць. Спачатку хістаўся як п'яны, але па меры таго як аддаляўся ад быўшай вільлі Вілінскага, цяперашняга гнязда «народнай уласьці», раўней ягоны крок, дужэў арганізм, сьвяжэла змучаная галава. І паволі, вельмі паволі вярталіся на месцы ўсе пешкі, коні й каралеўскія фігуркі жыцьцёвай шахаўніцы.

Перш за ўсё Антось спасьцярог, што на сьвеце панавала прыгожая, марозная зімовая раніца. Усё, здаецца, выглядала бязь зьмен. Людзі, каторых бачыў на вуліцы, каля станцыі, а пасьля і ў вілах Глыбоцкайі Докшыцкай, дзе Гібішына крама раскашэлілася, займаліся штодзённымі, патрэбнымі справамі. Праўда прыватны гандаль скончыўся, крамы пазачынялі, адзін калішні каапэратыў, цяперашні «горпішчапромторг» гудзеў натоўпам. Народ выліўся ў даўгі хвост чаргі, што цягнуўся аж да калішняга «пастарунку паліцыі панствовай». Антось мяркаваў, што пэўне нешта важнае давалі. А мо хлеб чорны...

І ўсё-ж у Антосевых вачох жыцьцё выглядала накш, чым раней. Зьмена магла адбыцца ў яго самога. Вазьмі, прыкладна, гэных людзей у чарзе. Ці мала каторы думае, што калеючы на марозе за кавалкам хлеба, ён на дне нядолі апынуўся. Але ці каторы зь іх зьведаў тую камору, дзе апошнімі днямі калеў Антось, ці хто зь іх ведае пакуты, волю страціўшы?

Гэтак думаючы, ішоў Антось, не наважыўшы яшчэ што рабіць. Так звычайна захоўваецца арыштант, што пачынае на волі першыя крокі ставіць. Дзяркач сустрэўся лоб у лоб з Тодарам Кмітам.

- Антось, куды ты? Як гэта з табой, пусьцілі? - гукнуў той з бадзёрым выглядам. Ён трымаў нешта ў лужэльнай торбе пад пахаю. Апрануты быў у новыя боты з рудымі халявамі, суконную тужурку,

барашкавую шапку. Кароткія вусікі прыдавалі весялосьці румянаму твару.

- Здароў, Тодар. От чаго ня ўзьбіўся на цябе, загледзіўся, - вінавата пачаў Антось.

- Здароў, здароў! - трос руку Тодар. - Дык адкуль ты й куды.

- Ды ні пытайся. Каму-ж ведаць, калі ні табе?

- Што ты, дзяцюк, вярзеш? Праўда, што там быў? - націснуў Тодар на перадапошняе слова

- Так, быў.

- Ну й што?

- Браток, ні пытайся, бо ні скажу. Паперку мусіў падпісаць.

- Якую гэта паперку?

- Такую, дзе прырок вады ў рот набраць. Кумекаіш?

Рашчараваны Тодар адвёў вочы набок, думаў.

- А Косьціка ці Лявона ня відзіў тамака?

- Не, ня відзіў, - спакойна адказаў Антось. - А чаго ім тамака цігацца?

- Дык от-жа ня ім цігацца, а іх пацягнулі, - зьнізіўшы голас, ледь чутна паведаміў Кміта.

Нельга сказаць, каб Антось адубеў ад такой навіны, але ён нізка й працягла сьвіснуў, а вочы ягоныя нявыспаныя, з выразам «глянь ты, што робіцца», затрымаліся доўга на Тодаравым твары.

- Алі ты абажджы, - казаў Тодар, - ты во змучаны, відаць... Каб сьцюжа цябе ні хапіла, давай зайдзімся.

Антось не адмаўляўся, калі Тодар яго за руку пацягнуў. Ня ведаў, куды цягне, а Кміта задняй вулачкай прывёў яго ў рэстаран. Уласьнік Шапіра ня ведаў, што далей будзе, рэстаран не пераключыўся яшчэ на новы лад. Сваіх кліентаў, што любілі чарку, Жыд часам і на кухні ўгасьціў.

У Шапіравым дварэ Тодар падыйшоў да свайго каня, прывязанага да плоту, падкінуў яму сена, пагладзіў па шыі.

- Падай нам, Хаім, чаркі! - загадаў Тодар гаспадару, калі зачыніў скрыпучыя дзьверы й расьселіся каля стала. - Гэтта пагрэемся, - зьвярнуўся да Антося. - Дык, кажаш, рот зачынілі, то й пытацца ня буду. Алі-ж віджу, што ня ў выгадзе быў...

Гэтак гаворачы, Тодар выцягнуў з торбы празрыстую паўлітроўку маскоўкі, сьвежы бохан крамнага хлеба й кавалак сала. На доўгім

стале напокуці, побач рознага посуду, шыпеў вялікі руды самавар. Пах селядцоў, капусты й печанай цыбулі атакаваў нос. Адзін столік пуставаў ля дзьвярэй. І трымаў, мусіць, Шапіра поўны самавар на выпадак, калі хто зайдзе пагрэцца.

- Ай, Тодаг, ты чалавек боскі, ты са свая гагэлка ходзіць, - усьміхнуўся лысы, пузаты, з малой, сівой бародкай Хаім.

- Як ты, Хаім, зноў пачнеш прадаваць гарэлку, дык ня буду сваей прыносіць, - усьміхнуўся Кміта.

- Праўда кажаш, - згадзіўся Жыд. - Можа чай падаць?

- Давай, браток. Наш Антось ці ні прастыў во...

Тодар наліў чаркі, парэзаў сала, адкроіў хлеба.

- Дык давай, за тваё здароўе, - падняў чарку. - І за дарогу дамоў, - падміргнуў вокам. Гэткім чынам Жыд не зразумеў пра што йдзе.

Пасядзелі ў Шапіры, мусіць, каля гадзіны. Антось павесялеў. Гарэлка добрым цяплом разьлілася па акалелым целе. Сьвежы крамны хлеб з салам быў як-бы збаўленьнем. Добры чай зь лімонам дапоўніў Антосева задавальненьне.

- Алі-ж заседзіліся. Трэба ехаць, бо баба наваліцца, - усхапіўся Тодар.

- А чаго-ж тваей бабе ні хапаіць? - спытаў Антось, нацягваючы сярмягу, якую Тодар трымаў на сядзеньні й цяпер пасуліў лёгкаапранутаму дзяцюку.

- Ды чаго ей... Ня ведаіш трапла? Но-о-о-о, пашоў! - гукнуў Тодар на каня й кароткай пугай сьцебануў паветра.

- Алі-ж цябе як Бог падаслаў. Калі-б гэта я дахаты дабрыў, - задаволена-вялым голасам сказаў Антось.

- Дарога цяпер ужо ўтоптаная. Ні я дык нейкі другі Макар падвёз-бы.

Тодараў малы, шустры конік узяў трушком і, мінуўшы вакзал, пераезд, пабег яшчэ весялей па гладкай, добра ўзежджанай дарозе. Абапал гасьцінцу павесілі аброслыя інеем бароды старыя кашлатыя вербалозы. На паўдні, за Гаравацкай пушчай вызірнула халоднае зімовае сонца. Іскрыўся серабром сьвежа халодны сьнег на хвалістых гонях, маўчалі маестатычныя хвоі й замерлі кастлявыя вольхі на лузе. Прыемна скрыпелі палазы. Дзяркач жмурыў вочы ад дражнячага, яркага блеску сьнегу, з асалодай удыхаў чыстае марознае паветра. Яго

хіліла на сон. Тодар параіў закруціць ногі ў дзяругу, што ў санёх трымаў.

- Дык як-жа гэта, кажаш, Косьціка й Лявона забралі? За што-ж іх? - цікавіўся Дзяркач.

- Чорт іх знаіць. Літоўскія ня могуць у тым ніякага ладу дайсьці. Гэта-ж іхныя, казаў той, найлепшыя людзі. Казала Шпуньціха, што ночы ынкавудысты наляцелі, як ваўкі дзяцюка пацягнулі. Ды пазабіралі й другіх камуністаў, з другіх вёсак. А нашто й чаму?

Як кароткая Тодарава пуга, каторай не патрабаваў навет паганяць коніка, новае, цікавае пытаньне павісла ў паветры.

30

Вялічынёй з добрае памяло, мышынага колеру барада пракідвалася белаватымі пэйсамі й закрывала шырокія грудзі. Яна то патаківала-трэслася зьверху ўніз, то запярэчвала, на бакі гойдалася. Вусны гэтага дзівака, што назваў сябе Максімам Паўлавічам, варушыліся скора, паказвалі два залатыя зубы ў адтуліне між вялікімі вусамі й барадой. Увага клясы сканцэнтравалася на тых вуснах і бледна-ружовых, хваравітых шчоках, бульбападобным носе, баразнаватым шырокім лбе й вялікай лысіне, сівымі касмылямі абкружанай. Малыя, рудыя вочкі коўзалі па вучнях, або, калі трэба было падчыркнуць нейкі загіб аргуманту, пазіралі дзесь у няведамую даль.

Прыгадваў Янук зь нейкай кнігі здымак. Дзядзьку з такой дубінай, як пастухі маюць, ды вялізнай барадой і круглай лысінай назвалі тады «ізраільскім прарокам». Прозьвішча Янук ня прыгадваў. Дай вось такі даўгі кій Максіму Паўлавічу й выліты прарок будзе.

Прывёў яго ў клясу дырэктар сямігодкі Якаўлеў, сказаў вучням, што прыслалі яго з адзьдзелу «народнага абразаванія» для выяснения «некоторых вопросов по религии».

Якаўлеў пайшоў, клясны апякун Мікіта Пятровіч прымасьціўся на крэсьле ля вакна й пачаў драмаць, а гэты дзядзька гаварыць пачаў паволі, а цяпер ужо й запраўды расплыўся. Можа й сам у сваю гаворку верыў, калі па шчырым выглядзе меркаваць. Адзін Ёсіп Вісарыёнавіч,

што вісеў на даўно паскрэбанай рознымі пісакамі к просячай хвабры пярэдняй сьцяне, абыякавымі ледзянымі вачмі пазіраў недзе праз вакно на гацкую чыгунку.

Сочачы гэту бараду, прыгадваў Янук Янук іншую. Вялікі ўказальны палец да гаркаты сьлёз парнуў у жывот і пачуўся зьдзеклівы голас: «Ну что, мужык, нажрался бульбы?» Казалі, што Абухаў вёў людзей да Бога, а гэты, мусіць, да чорта, ці, як паіхнаму сказаць, да дыявала. Абое рабое.

Максім Паўлавіч трашчэў, як накручаная шарманка: «...обезьяна сломила ветвь и вместе с нею упала на землю. Перад нею лежал большущий, круглый, с толстой кожей плод дерева, ветвь которого она сломила. Следующей задачей обезьяны было питание этим плодом. Но вот здесь что то необыкновенное случилось. Как усердно не старалась обезьяна раздавить этот плод, ничего не получалось. Она задумалась. Сообразила взять его в лапы, ударяя одной то другой, но напрасно. После длинных и бесполезных усердий, взяла обезьяна ветвь, отломила самый толстый и тяжёлый конец её и этим то концом начала ударять плод. Таким образом, при помощи сломаной ветви удалось обезьяне разбить плод дерева.

Учтите одно, что, может быть, процесс, который я вам здесь представил, случился не на протяжении часа или даже двух часов. Может быть обезьяне, чтобы сообразить тот простой факт, что кусок сломанной ветви может быть для нее полезным орудием для сокрушения кожи плода, понадобилось длинное время. Суть дела, конечно, не во времени, а в том, что это был замечательный шаг в процессе эволюции обезьяны от своих примитивных предков к человеку. Подчеркиваю главную точку моего рассуждения: обезьяна начала сооброжать и употреблять орудия труда. От в чем заключается главное одного из многих шагов в развитии...»

«Можа гэты самы Максім Паўлавіч недзіка калі быў папом», - разважаў у думках Янук. - «Яго-ж во надзень, пастаў ля царскіх дзьвярэй у царкве, дык цюцелька ў цюцельку выліты поп будзіць». Янук зірнуў навокал. Вучні слухалі ўважна. Сам разумеў ня ўсё, але галоўнае злавіў. Прыблуда гэты апавядаў, што чалавек ня Богам створаны, а ад малпы род свой вядзе,

«Миллионы лет занял процесс постепенного перерождения, стало быть эволюцыя от своего совершенно примитивного начала к

настояией степени развития человека. Наука прочно доказала, что было именно так, а не иначе. Наука всё это утвердила на фактах», - барабаніў прыведзены Якаўлевым дзівак з «народнага абразаванія».

На румяненькіх Дуніных шчочках і ў ледзь прыжмураных васільковых вочках - поўная канцэнтрацыя. Каб хаця ў ягоны бок зірнула. Што яна думае пра барадатага лысуна, ці тую «абізьяну»? Не памяшчалася ў Януковым усьведамленьні думка, што нейкі пра-пра-далёкі продак яго гэйсаў па афрыканскай ці барнэйскай джунглі, гугнявіў незразумелымі гукамі да таварышоў і на суку сядаў «за стол» спажываць плёны свайго гэйсаньня па дрэвах. А можа кавалкам сука які гарэх ці ананас пырыў, пакуль зь яго жыжка...

«...в меру своего развития начала обезьяна исключительно на задних лапах передвигаться, всё реже и реже хвостом пользоваться. С течением времени хвост совершенно исчез...»

Максім Паўлавіч вуснамі, а Янук думкамі якраз да хваста малпы дабраліся. Клубы дыму паказаліся над чыгункай. На шырокіх плятформах, накрытых брызентам, як вялізныя цыгары, расьселіся гарматы. Цягнік ішоў на ўсход, а не на захад. Мусіць на Фінляндыю. На днях вялікія гусянічныя «чалябінцы» падпрэглі й павалаклі ў Гаці гарматы зь Ліпавічаў. Ніхто нічога асаблівага ў тым не спасьцяраг. Валачэцца з аднаго на другое месца войска, цягае за сабой вялікія й малыя цацы свае. Мо таму, што войску патрэбна, а мо таму, што надта непаседлівае яно. Надта там хто зь літоўскіх у гэных вайсковых справах разьбіраўся. Дык і што-ж, калі гарматы ў Гаці павалаклі?

У Ліпавічах астаўся нейкі пэхотны адзьдзел паводля таго, што ў дзень «вызваленьня» стрэльбы на абшмуляных вяровачках нёс. Асталося-ж, пэўне, і некалькі «максімаў» ды «тачанак», мо навет такіх, пра каторыя ў адной песьні гарлапанілі: «ах тачанка-растачанка, все четыре колеса».

Ажно вечарам урачыста затрашчэла ў доктара Зянькевіча хрыпатым радыё й нейкі голас зь Менску, пачаўшы зусім неўрачыстым прачышчэньнем глоткі, паведаміў, што «гнюсная Фінляндзія, талкаемая да авантуры ненажэрнымі захаднімі інцірвентамі-капіталістамі, учора напала на міралюбны Савецкі Саюз. Зараз баі йдуць на шырокім фроньце ад Паўночнага акіяну да паўднёвага пярэсмыка Карэліі.»

Охцінькі мне! Не зачыняліся ў гэны вечар дзьверы доктаравай хаты. Ня было спрэчак на тэму «хто каго», а мяркавалі як гэта такая малая жабоцька на магутнага слана асьмелілася.

«...наука сделала эту истину совершенно определенной. Именно поэтому наука отрицает бога, как создателя...»

Сымон Пятух, схаваўшы калматую грыву ў каўнер кажуха, каторы, мусіць, у Лазоўскага сьцягнуў, маўкліва смуродзіў «казінай ножкай», на гразкую падлогу пляваў. Зьніякавеў і аціх ад таго часу, як Косьціка й Лявона пацягнулі. Антось яму зусім нядвузначна пра розныя цымусы ў руках «народнай уласьці» шапнуў. І хоць Сымону цяпер, як казаў той, вароты да ўлады ў Літоўцах навосьцеж адчыненымі стаялі, гультай, карцёжнік і п'яніца зусім аціх і асеў.

«...кому эта гнусная ложь нужна? Тем мракобесам, которые через религию владели умами, а стало быть и материальным имуществом народа, тем, которые рабочих и крестьян, всех трудящихся закабалили. Ведь не кто иной, а сам Владимир Ильич Ленин сказал, что религия - опиум для народа...»

У хаце ўжо больш як тры пары сам Мікола гаспадарыў. Літоўскім сялянам, у тым ліку й Бахмачу, дрэва зь Перасечана вывозіць загадалі. На каня па трыццаць кубамэтраў налажылі. А кабыла-ж жарэбная была. Спадзяваўся бацька, што калі добрае жарабё прывядзе, можа на каня ўзжывецца.

«...именно клерикалы воспрепятствуют всякому прогрессу, потому что прогресс - это наука, а где наука, там народ, увидев истину, отбросит клерикалов-мракобесов и их ложные суеверия и притчи...»

Бацька выхадзіў прастуду, Косьцікам і Лявонам у варыўні нагнаную. Часта скрыпеў, быццам старое, надломаннае дрэва, але наракаць надта не наракаў пасьля таго, як ласы кавалак зямлі ў Ліпавічах прыдзялілі. Дзіва колькі пасьвятлеўшае заўтра жыцьцёвае моцы дало. Хапіла аднаго кавалка ўрадлівай зямлі, каб чалавек на поўны рост стануў, гадоў на дзесяць памаладзеў.

«...Советская власть рабочих и крестьян стремится к благополучию жизни своих граждан и потому бдительно разоблачает какую-либо религиозную чужеложь. Но нельзя сказать, что легко разоблачать религиозную ложь. Мало того, что наше советское правительство и коммунистическая партия, что наши организации воинствующих безбожников, вдохновенные великой идеей

всенародного блага, ведут широкое фронтовое наступление на гнусных мракобесов, антинародных клерикалов и их темные религиозные суеверия и предрассудки. Недостаточно всего этого, ибо столетия церковной лжи прочно внедрили в народе религиозные предрассудки и сегодня ещё не сдаются самые отставшие и темные элементы его. Чтобы истребить эти предрассудки, разоблачить ложь клерикалов, отставшим указать путь к воинствующему научному марксизму нужны усердия каждого из нас. Да, нужно проявлять всевозможную бдительность, повторяю - беспощадную бдительность...»

Дрыжыць млосная Пракопава рука, трымаючы набухтырыную Шпунтом шклянку агіднай сівухі. Зладзейскія Сабакевічавы вочы, як кот мыш, пільнуюць зьняможанага Януковага бацьку, каторага ў халодны пот кідае. Ён паволі, цяжка ўстае за сталом. Рука апушчаецца й ставіць шклянку на стол, вочы сьвецяцца скрухай і дрыжыць голас малітвы: «Сьвятая Апрасіньня Полацкая, Дарагая Правідніца наша, заступіся за нас!»

Тры постаці застылі пры стале. Цяжкое дыханьне й мёртвае маўчаньне. Міг - цэлая вечнасьць. «Я табе, яці тваю маць, пакажу тваю Апрасіньню!» - грыміць разьюшаны, хрыплы бас і шклянка цаляе проста ў цэнтар абраза Прадславы. Як цяжкі мех, бацька асоўваецца на лаву, дрыжаць бледныя вусны.

«...бдительность нужно применять везде и всегда, ибо враг не сдается и не думает сдаваться. Борьба с клерикалами-мракобесами будет длинной и упорной...»

Кагадзе пашырылася ў Літоўцах навіна, што чорнабароды Абухаў у Дубовіцкай царкве свае модлы спыніў. Парафію ўлада асядлала такімі вялікімі «ўзносамі», што каб няведама якімі грамадамі ў царкву сьпяшылі й якія вялікія матар'яльныя ахвяры прыносілі, дык усё ў касматую «асвабадзіцельную» лапу трапіць, а самому дубовіцкаму сьвятару, быццам, на грыбную поліўку навет ня хопіць. Казалі, што быццам сьвятар з залатым крыжам пры царскіх варотах на тэму такога нефартуннага павароту справы, густа ў чорную бараду чмыхаючы, прасьлязіўся, помачы прасіў. Ды «узносы», як з гэных гутарак спанатрыць можна было, ня толькі царкоўную, але й Абухаву прыватную маёмасьць учэпістамі лапамі агарнулі. На дзьвярох Дубовіцкае вялікі замок побач нейкай урадавай запіскі вісеў, а сам сьвятар, з пляшкамі бліжэйшае сваяцтва завёў.

«...нужно сообразить, что мракобесы-клерикалы совершенно бессильны без поддержки масс. Задача наша поэтому есть в просвещении...»

Максім Паўлавіч левай рукой палез пад бараду, расшпіліў аплік і пару гузікаў шэрай, у клетачкі, сьвіткі ды далей шаманіў сіпата-траскучым голасам. Янук зірнуў на шчэрбіну свайго левага бота. Тарчэлі адтуль рудыя драўляныя цьвікі. Налезла сьнегу, пальцы нагі варушыліся ў вільготнай анучы. Бурчэў-наракаў жывот. Можа за пару гадзін па гэтым марозішчы дахаты дабярэшся, а там Мікола з капустай сустрэне. Добра, калі кавалак косткі зь мясам пападзе.

Уздрыгнуўся з дрэмкі ля вакна Мікіта Пятровіч, зірнуў на агітатара з «народнага абразаванія», кінуў вокам на вялікую белую цыбуліну-гадзіньнік на руцэ. Каб перапынак скарэй.

«...которые помогают мракобесам, есть везде вокруг вас. Они - ваши друзья, знакомые, ваши родственники. Будьте бдительными и стремитесь с самого начала их разоблачить ибо разоблачение есть первой степенью просвещения...»

Косьцік ведаў, што рабіў. Ён Януковага бацьку «мракабеса разаблачаў». Вось яно што.

«...наши общие интересы, стало быть интересы коммунистической партии, могуиественного советского государства, правительства его и мудрейшего из мудрых отца народов, гениального корифея коммунизма, товарища Сталина, стоят выше интересов семейственных, собственных и прочих...»

Кляса перасеялася. Адыйшлі нафуфырыныя, намаляваныя, пасьвяточнаму апранутыя панкі й паненкі. Недзе мо ў вагонах па дарозе на Сібір, ці ў іншым катуху «ніаб'ятнай» голад і холад ім з павекаў сон зганяе. Там-жа й Верачка-цацанька з галапупымі разам. Божа магутны! У клясе ўважна слухалі гэтага дзівака сьціплыя, простыя, даверлівыя сялянскія дзеткі. Спачатку было «асадзі назад» зь сёмай і шостай у пятую. Бальшавіцкая мешалка перамяшала, на новы лад падраўняла. У шостай больш здольныя засталіся, а ў сёмую наплылі сынкі й дачушкі «васточнікаў». «Народнаўладніцкая» мешалка прынесла ў клясу лапці, сукенкі й сьвіткі ў лапіках, розныя транты-абноскі, вожыкамі стрыжаныя галовы. Затаптаная гразёй падлога даўно вады й мыла прасіла. Цяпер-жа адно «камбедаўцы» вопраткай вырозьніваліся.

Званок зь нізу заврухнуў з дрымоты Мікіту Пятровіча, а сьмелы шорах выказаў агульную нецярплівасьць дзяцей. Максім Паўлавіч на міг спыніўся ў сярэдзіне няскончанага сказу.

- Жалко, так быстро время пролетело... Пускай. На второй раз продолжим...

Вучні выходзілі ў калідор. Янук стаяў пры вялікім вакне, празь незамерзлую сярэдзіну шыбы пазіраў на бель роўнага поля, што з правага боку падбіралася пад дуброву, а зь левага да чыгуначных шляхоў. На станцыі дыміла колькі паравозаў, мясцамі варушыліся вагоны, гэтта бліжэй ужо вырасьлі сьцены вялікай будыніны, таго «фазаво». Там чарнелі ля працы «фуфайкі».

- Што-ж ты, Янучок, сягоньніка такі нівясёлы?

Стаяла зь левага боку, упрытык да яго пляча. Румяная, пышная, расьцьвіўшая. Вось, здавалася, хутка на пунсовых шчочках зьявяцца ямачкі, гарэзьлівай усьмешкай загарыцца тварык, а васількі, зводзячы й абяцаючы, пацягнуць у краіну хмельнага, кроў грэючага-хвалюючага дурману. Янук, не без намаганьня, адвярнуўся, каб не глядзець на дзяўчыну.

- Ды так сабе... А што мне нівясёлым няможна быць?

31

Перад зьмярканьнем папусьціў мароз і ўскатурхаўся свавольнік-вецер. Ляніва пазабаўляўся сьнежнай трасянкай ля гумнаў, хатаў, на ўхабінах раскапанага тунэлю гацлага гасьцінцу, на ўзьлесьсі Гаравацкай пушчы, скалануў Архіпаў чуб. Пачаў арганізаваць уланаў чартоўскай коньніцы дый не на сьмех шаржаваць вакол будынкаў. Пасьмялеўшы, сьнежныя, бела-пуховыя буяны джгалі ўздоўж і ўпоперак зусім адкрытага прастору літоўскіх начовак. Выраставалі, імчаліся на злом галоваў, падалі й зноў паўставалі.

Ці ёсьць што больш велічнае й захпляючае, чымся завіруха, калі магутная стыхія імкне насустрач ночы! Ля гумнаў скрыпяць азяроды, рыпіць у садзе надломаны камель ці галіна, жаляцца скуголяць голыя чубы клёнаў, ля вільчыкаў засланкай грукоча тая дошка шчыта, каторую «во трэба прыбіць дабрацца». Хтось упоцемку вобмацакам

лазіць па гарышчы, поўзае па склепе, кешкаецца пад страхой. Асьцярожна прачыні знадворныя дзьверы зь сяней і прыслухайся: гэта вунь магутны тытан схапіў чуб той ліпы, што ў садзе. Ды не, пільней трымай вуха: гэта ня ліпа ў садзе, Няйнакш так грыміць сам волат Архіп. А мо й не адзін ён. Мо ў Гараватцы са старых валатовак устала князёва дружына, зыходзіцца на веча, шуміць-гамоніць народ, раіцца як бацькаўшчыну ад напасьніка бараніць. Чуеш, як вунь іржаць коні, зьвіняць шлёмы й кальчугі, дзіды й забралы? І ці ні клінок з аздобленай ручкай урэзася-скрыгануў у шчыт напасьніка? Чуеш гулкія званы? Яны Гаравацкіх клічуць. Гасіце-ськідайце смаляныя вогненныя ядры, не давайце агню да цэнтру дзяржавы дабрацца! Дый не бараніцца, а наступаць вам, бо найлепшай абаронай ёсьць атака. Гудзяць ваенныя рагі, галосяць дуды, зьбягаюцца вартавыя й памежныя зьблізку й здалёку. На бой, каб даць адпор! А дыханьне ворага прагнае, напорыстае. Гультай- леў пранюхаў здабычу і ўжо на сухадрэвіне першыя груганы зьявіліся. Будзе гэтта бой вялікі, сіла народу галовы паложыць. Чуеш, як напіраюць дружыны волатаў? І ня трывожыць цябе хісткая, зьняможаная рука абаронцы? Трымайцеся, ня дайце ходу цемры, бо за гэтым боем мяжа. Далей ні прасьвету, ні жыцьця, адно на валатоўках вецер хаўтуры адпяваць будзе.

. . . . . .

У Бахмачовай хаце кацiным вочкам ліпеў на дне перавернутага верхам уніз гладыша на стале каганец. Абапёршыся падбародкам на далоні, сядзеў пры стале Мікола. Ягоныя буйныя, даўно нястрыжаныя валосы навісьлі над правым вокам. Хлапец матнуў галавой, адкінуў назад валосы і ўтаропіўся ў маленькае полымя каганца, што варушылася пад подыхам ветру, які прабіраўся празь сьцены, абкладзеныя звонку кулявой саломай і абсыпаныя кастрай. Бліжэй парогу, ля вялікай печы, весела хліпала ў круглай чыгуннай печцы полымя. Печку кагадзе прывалаклі ў хату, паставілі на цаглінах і падлажылі пад ніз абшырны кавалак таўстой бляхі, а комін правялі ў круглую дзірку цаглянай печы.

Янук паволі сьцягнуў боты, павесіў на шнуры над печкай сушыцца анучы, надзеў туфлі й сеў на зэдліку ля печкі. Зірнуў на брызентавую сумку, у якой насіў кніжкі й сшыткі ў школу, нешта памяркаваў ды ляніва прыжмурыў вочы. Незадаволены Міколавай

капустай, бурчэў жывот. Хлапец раптам устаў, выбег у сенцы й хутка вярнуўся зь вялікай жоўтай антонаўкай у руцэ. Адкусіў вялікі кавалак і паволі, смакуючы, пачаў жваць.

- Ужо зьмякчэла? - спытаў ляніва Мікола.

- Яшчо цьвірдаватая, алі ўжо есьці можна, - адказаў Янук.

Абнюхаўшы прыемны пах антонаўкі, Мікола пацягнуў носам. Яблакі належваліся на гары ў кастрыцы.

- Хто ведаіць, якія налета антонаўкі будуць і ці будуць толька, - мяркаваў Мікола. - Такі марозішча. Пэўня ўсе сады памерзнуць.

Янук не адказаў, адно апэтытна спажываў яблык.

- Халерачка, во ўсе дарогі пазамятаіць. Як гэта бацька верніцца? - спытаў Мікола.

Янук уважна зірнуў на брата. Той быццам вярнуў да рэчаіснасьці ягоныя думкі, што блудзілі дзесьці вельмі далёка. За вакном вецер насядаў на высокія, дашчаныя вароты пры вуліцы. Вароты скрыпелі, быццам на такі зьдзек скардзіліся. Міліёнамі сярэбраных, празрыстых матылёў стыхія хвастала знадворныя шыбы падвойных вокнаў.

- Трэба было во аканіцы зачыніць, - сказаў Янук.

- Дык зьбегай ды зачыні, - параіў Мікола.

- Я босы, - апраўдваўся Янук.

- Можаш абуцца. Ні напрацаваўся ў тэй школе, нябось.

- Ты ўжо напрацаваўся... паўтары сьвіньні накарміў, пару авечак, карову ды кацёл капусты за цэлы дзень зварыў. Напрацаваўся, называецца, - скрывіўся меншы Бахмач.

- Маўчы! - узлаваўся Мікола.

Бразнулі дзьверы з вуліцы й нехта шукаў клямкі дзьвярэй у сенцах. У камору ўбегла Алесява Надзя.

- А браточкі, сьнегу во кучу вам прынесла! - усклікнула дзяўчына звонкім голаса, схапіла з кута мятлу ды выбегла зноў за дзьверы, а неўзабаве вярнулася ўжоз абмеценымі ботамі. Твар дзяўчыны з румянымі, круглымі шчокамі, ружовымі вуснамі, пасінеўшым кончыкам носу, прысыпанымі сьняжынкамі валосамі, зьзяў на парозе прыемнай і добрай, зычлівай усьмешкай. Гэтак цьвіла дзяўчына, што дбала пра гаспадарку, сваіх і чужых людзей. Вочы пабеглі па пустой. змрочнай хаце й на твар напоўз цень.

- Німа дзядзі яшчо? - спытала.

- Сама-ж відзіш, - адказаў Мікола.

- Відзіць віджу, алі-ж запытацца трэба было. І таты-ж німа, а яны-ж разам. Ну як вы тутака?

Яна ськінула шэрую, падношаную бурку, якая крыўдзіла гнуткую й прыгожую Надзіну фігуру. Каб аздобіў яе ў якое адпаведнае адзеньне, хавайцеся тады вы, вялікія, пудрай і рознымі парашкамі ці мазямі размалёваныя гарадзкія модніцы.

Зірні бліжэй на гэту сьціплую вясковую кветку і ўяві яе між блакітных званочкаў цьвітучага лёну, побач памежнай шыпшыны, ці дзівоснага чабору. Прыгожы матылёк, якому пырхаць ля пышнага суквецьця садоў, бэзаў, ці канюшыны. Хоць дзяўчына найлепш цьвілаб, здаецца, на ўлоньні вясны, яна й цяпер, у глухую зімовую завіруху, у паўзмрочнай хаце сьвятлом вялікім прамянілася.

- Чаму-ж гэта лямпадкі не запаліце? - спытала Надзя й падыйшла да абразоў.

- А нашто? - спытаў Мікола.

Лямпадку палілі на вялікя сьвяты.

- Бацька-ж у дарозе, - адказала Алесява дачка. - Трэба, каб Бог шчасьліва вярнуцца памог. Дарогі, пэўня, сяўсім пазамятала, так дуець, што ні дай Ты, Божа...

Зь сярэбранай чашкі, што на лянцужку перад абразом Збавіцеля дзяўчына выняла чырвоную шклянку, да паловы напоўненую воскам, абцерла з кноту нагар, падыйшла да печкі.

- Маеце якую саломіну? - спытала.

Янук дастаў з-за печы кавалак лучыны. Яна ўспыхнула вясёлым агнём. Дзяўчына запаліла кнот у лямпадцы, павесіла перад абразом напокуці й перахрысьцілася. Полымя лямпадкі чырваньню абліло абраз Збавіцеля, пабіты й незашклёны абраз Сьвятой Прадславы й Маткі Боскай з Хрыстом на руках. Кут аздобіўся ўрачыстай таямнічасьцю.

- Ці хто ўжо прыехаў, можа чула? - спытаў Янук.

- Ды не. Да нас вунь Аксеня забягалася, дык казала, што яшчо німа нікога.

- Прыедуць. Як гуртам, то ні заблудзяць. Толька от што дарогі пазамятала, дык даўжэй займіць, - спакойна разважаў Мікола.

- Як-жа гаспадарка ваша? Усё ў парадку?

- А што маіць быць ні ў парадку? - пытаньнем адказаў Мікола.

- А што ў цябе ў школе, Янучок? - падцягнула дзяўчына табурэцік і села ля печы.

- Эт... што табе сказаць, - думаў Янук. - Сягоньніка нейкая абізьяна прыхадзіла ў школу й казала нам, што Бог - выдумка, што мы ўсе ад абізьяны вядземся...

Дзяўчына ўважна зірнула на двуроднага брата.

- Як ён сказаў? Ха-ха! - пырснула Надзя гулкім сьмехам. - Ад абізьяны? Чалавек? Сьмяешся, ці што?

- Яй-божачкі, каб я з гэтага месца ні сышоў, от на Бога прысягну! - спаважнеў Янук.

Хвіліна маўчаньня. Вецер сьцёбаў канцамі галінаў бэзу па вакне. Скрыпнулі вароты, што ад вуліцы.

- Ці-і-іха! Шшшшш! - падняла Надзя палец. - Не, ніхто ня езьдзіць, гэта вецір. Дык хто гэта такі да вас, кажаш, у школу прыяжджаў?

- Дарэктар Якаўлеў прывёў яго да нас і сказаў, што ён прыехаў з адзьдзелу «народнага абразаванія». Сам такі лысы, барада, як памяло, на цэлыя грудзі. Касмылі, выліты поп. Нейкі чорт, мусіць, ад бязбожнікаў.

- І што ён галдзіў?

- Ды от казаў, што жылі на сьвеце абізьяны, першыя значыцца... людзей яшчо ні было. Тады, кажыць, за міліёны гадоў яны навучыліся карыстацца, як ён сказаў, «арудзіямі труда», Хадзіць пачалі на задніх лапах, хвасты ім паадпадалі, бо ўжо ні было патрэбы хвастамі за дрэвы чапляцца. «Как абізьяніна галава начала думаць, упатрабляць арудзіі труда, тада начаўся працэс разьвіція чалавека, іба абізьяна начала мазгі ўпатрабляць». Нешта во такое плёў. А як Богу дасталося ад яго, мамачкі мае! Ну і дасталося-ж усім тым, што ў Бога веруюць.

- Ну а што вучні на гэта? - цікавілася дзяўчына.

- А што-ж вучні... слухалі ды ўсё. Што хто думаіць, дык ці ты ў каторага на лбе прачытаеш?

- А ты што думаіш? - ня спынялася Надзя.

- Алі-ж ты цікавая, - упікнуў Янук, - скора састарэешся.

- Ну алі-ж мне скажаш, - усьміхнулася Надзя, таўхануўшы хлапца плячом.

- Якая ты сьмешная... Ну што я магу думаць? Першы во раз пачуў... Мне здаецца толька, што каб яно так было, як ён кажыць, дык

чаму яшчо ў тых джунглях цяперака поўна абізьянаў? Чаму яны ўсе ні перамяніліся ў людзей, як ён казаў нібы тое было?

- Бо можа гэтыя ні такія абізьяны? Можа яны дурнейшыя за тых іншых?

- А можа гэны пэйсаты гарыла з «народнага абразаванія» найбольшы дурань за іх усіх? - адсек Янук і злосна плюную.

- А яго ніхто ні пытаўся, чаму ўсе абізьяны людзьмі ні зрабіліся? - з усьмешкай спыталася Надзя.

- Ніхто нічога ні пытаўся яго. Расшумеўся, як папоў самавар... Пад канец намякнуў, што яшчо ня скончыў. Званок абарваў. Можа яшчо раз прыедзіць.

- А як Бога няма, паягонаму, дык ні казаў тады ў каго нам верыць? - спытала дзяўчына. - Можа ў Сталіна?

- Яшчо да гэтага ні дабраўся. Алі калі другі раз прыдзіць дык тады ўжо, пэўня, даведаемся, - закончыў Янук з сарказмам у голасе.

- Ну чорт зь ім, - сказала дзяўчына. - От што прыпомніла: пазьбірай Янучок, усё карэлае, найперш бялізну, ручнікі ды ўсякую ўсячыну, што памыць трэба. Заўтра забягуся, луг зраблю ды ўсё памыю. Добра?

- Мікола-ж у нас гаспадар, дык яму лепі відаць. Сама гэта знаіш, - адказаў Янук.

- Ты, Мікола, дагледзіш?

- Добра, - адказаў Мікола.

- Пабягу-ж я назад, - крутнулася Надзя. - Тамака сама мама дома.

Скрыпнулі пярэднія дзьверы й дзячына, кінуўшы «дабранач» на разьвітаньне, зьнікла ў сьнежнай навальніцы. Гадзіну пазьней ля варот пачуўся голас і Янук, хутка апрануўшыся, выбег паглядзець. Сьнег цярушыў у вочы, але, здавалася, палагаднеў. З вуліцы бацька намагаўся адчыніць высокія дашчаныя вароты, навокал якіх намяло сугор сьнегу.

- Чакай, тата, я прынясу лапату, - пасьпяшыў Янук.

Зь сенцаў бегам хапіў шырокую лапатуды ўзяўся адчышчаць сьнег. Бацька трымаў за аброць кабылу, гладзіў яе па мордзе. Захутаны ў бурку, зь вялікім башлыком на галаве, сьпераду тарчэлі аблядзянелыя на канцох вусы. У сыпкай сьнежнай маньне нагадваў нейкую дзіўную зьяву.

- Сынок, адпражы кабылу, накрый яе коўдрай і падвяжы, каб ня ськінула яе, падпругай, ды падкінь ей лепшага мурагу. Трэба будзіць

папаіць, якую гадзіну спусьціўшы...

Дзіўны, скрыпуча-дрыжачы, нязвычайны голас. А яшчэ больш нязвычайным было тое, што бацька цяжкім крокам адразу накіраваўся да задніх дзьвярэй хаты. Янук перастаў раскопваць сьнег і пазіраў на шырокія бацькавы плечы, башлык, таўстыя ў анучах і лапцёх ногі. Прыгадаў хлапец, што ніколі, прыехаўшы зь якой вялікай ці малой дарогі, не сьпяшыў бацька ў хату пакуль кабылы не ўпарадкаваў.

Янук адчыніў вароты і ўзяў кабылу за аброць. Ступала яна няроўна, на бакі хісталася, быццам замінаў ёй у хадзе цяжарны жывот. Любіў Янук гэту цяглавітую жывёліну. Калі раней даглядаў яе, сустракала хлопца кароткім іржаньнем, мордай лісьліва ёрзала па ягоным плячы ці твары, выказваючы такім чынам радасьць павароту пад родную страху. Цяпер-жа, - і гэта зьдзівіла хлопца, - кабыла йшла, здавалася, зь нейкім намаганьне, а вочы яе быццам і не пазналі Янука. Зьнізу ля пысы й цугляў вісела кароткая намаразь сапылёў. Янук узяў за аброць, намагаўся павярнуць галаву да сябе.

- Кося мая, коська добрая... як табе цяжка, - прамовіў хлапец.

І не пачуў Янук у вадказ зычлівага іржаньня. Распрог сані, адчыніў у хлеве дзьверы, з крука зьняў шырокую коўдру. І цяпер, падчас начной мяцеліцы, нясло ад яе едкім конскім потам. Паволі й старанна накрыў Янук кабылу, узяўся падвязваць коўдру падпругай. І тады перадалося Януку выразнае, дагэтуль неспазнанае ім дрыжэньня. Здавалася, што пачыналася яно ў кабыліных нагах ды перабягала ў жывот. Іншым разам ахвотна, - ня ўтрымаеш яе, - сьпяшыла да напоўненых пахучым сенам ясьляў. Цяпер-жа спанукаць трэба было.

Зачыніў Янук хлеў і мяркаваў ці завее пасярод двара сьнегам сані ды ззаду прывязаныя да іх падсанкі. Бура, здаваклася, крыху спагнала ахвоту, але яшчэ калола ў твар ахапкамі шорсткай манны. Янук абстукаў са сьнегу боты, абмёў іх камлём мятлыды, вобмацкам шукаючы дарогі ў сенцах, адчыніў дзьверы.

Ля цёплай чыгуннай печкі, выцягнуўшы ногі, нярухома сядзеў бацька. Адмярзалі лапці з анучамі, зь іх уверх уносілася пара, а кроплі вады капалі на падлогу. Левай рукой бацька забаўляўся з мокрымі вусамі. Твар зарумяніўся, а застылыя на нейкім пункце вочы не падняліся й ня зірнулі на Янука. На прыпечку стаяў ведамы Януку кацёл зь ведамай Міколавай капустай.

- Ні дай Ты, Божа, калі што станіцца! Зацігаў, мусіць, бедную кабылу. От нечысьць праклятая. Узваляць столька здаравеннага даўгога бярвеньн, ну й цягні аж на тую станцыю. дзе-ж гэта ей, жарэбнай, ды яшчо па такім сьнягу справіцца! Як ськініць дык і дзіва ня будзіць. Спадзяваўся на маладога каня ўзжыцца, аж тутака во...

Дрыжэў няроўны бацькаў голас і часта плюшчыліся вочы. Памалу паднялася левая нага, лягла на калена правае й крукаватыя, шурпатыя пальцы ўзяліся памалу разьвязваць вяроўкі лапцей і адкручываць анучы. Мікола палажыў крыглы бохан хлеба й паставіў гліняную міску на стале.

- Ты, сынок, гэта самае, паразьвешвай, каб сохлі, - зьвярнуўся бацька да Янука. - Дзе-ж гэта хто калі чуў, каб па трыццаць кубамэтраў на каня давалі! Паспробуй, вывязі! Дзіва, што кабыла падбілася. Мусіць ня відзіць нам таго жарабя...

Маўклівы Янук стаяў ля прыпечку й пазіраў на зьняможанага, крэкчучага бацьку. Дрыжачы голас спыніўся й па левай шчацэ скацілася вялікая, празрыстая сьляза. Нехта абцугамі сьціснуў Януку ў грудзёх. Напокуці, у чырвоным шкле, хліпала перад абразамі лямпадка. Каб не расплакацца, Янук перастаў глядзець на бацьку, перавёў вочы на абразы й здалося яму, што ў пабітым шкле ажыла чырвонай сьлязой пад вокам Прадславы засочлая кропля Тодаравай «лепшай за сталічную»...

32

Любінаму дзевіру Міхалюку ці ня першы раз у жыцьці так пашанцавала стацца цэнтрам агульнае ўвагі вёскі. Рассасуліўшыся за сталом, падпёршы падбародак правай даланёй, ён крыўдна-ляніва варушыў тоўстымі вуснамі.

- Дык-жа-ж от кажу, што ажно ў Вільню загналі. Паслалі мяне ў полк... ну дзе гэну самую чынную тады служыў. Вы-ж помніце... Ну дык мяне туды й цяперака, значыцца, - каб я з гэтага месца ні зышоў, пабажуся от, - ды адразу аж за тую Аршаву недзіка на хронт... а нашых ні знаю куды параськідалі...

- Дык як-жа гэта ты, Міхалючок, ні пытаўся нікога, ці ня відзіў нікога, дый нічагусянькі ні знаіш і ня ведаеш?

Вульлянін плаксьлівы голас перадаў эмацыянальную зьнямогу доўга чакаючай, сплаканай маткі, што ў асобах сваіх двух «галубкоў» усё спадзяваньне й будучыню ў гэнай далёкай вайне страціла. Каб хоць які сьціплы праменьчык, макулінку-вестачку прынёс Міхалюк. Дакорлівым рашчараваньнем у з болем пазіралі на Міхалюка дзясяткі жаночых і мужчынскіцх вачэй. Не магло памясьціцца ў галаве, што з таго сьвету вайны, якая праглынула столькі вясковай моладзі, першым вярнуўся найбольш ведамы, нічога няздольны сказаць тупіца. Каб на яго месца хто больш празорлівы, кемлівы...

Ды ні выпадала Міхалюка вінаваціць. Сьвежым у памяці бытаваў і пры згадцы сьмехам людзей душыў надта-ж паказальны зь Міхалюковай вайсковай кар'еры выпадак.

Калі пару гадоў перад вайной адбарабаніў дзяцюк «чынную», далі яму ў Вільні чыгуначны бялет і сказалі яму цягніком дамоў ехаць. Няпісьменны Міхалюк, каторага ледзь у пехаце не заганялі, пакуль левую ад правай навучыўся адрозьніваць, больш як чатыры пары зь Вільні ў Літоўцы пехатой шкандыбаў. Дзівіліся людзі, што не заблудзіў, ды гэтта ськідку давалі на тое, што навет Міхалюкоў непаваротлівы язык у родным краю дарогі мог дапытацца.

- Дык чаму-ж ты на поізд ня сеў? - пыталіся яго, рагочачы.

- Дык-жа пашоў садзіцца, алі ня ведаў на каторы. Тамака ў Вільні паяздоў тых сам чорт ні разьбярэць, ні так як гэттака ў Гацях, - адказаў сур»ёзна Міхалюк.

- А як пусьцілі дамоў, далі якую паперыну, ці што?

- Дык от-жа далі нейкую.

Зь кішэні выцягнуў і камшыў нешта ў вялікай, тады ўжо адвыклай ад гнаявых вілаў далані. Людзі прыгледзеліся й распазналі пасьветку з войска й чыгуначны білет з Вільні ў Гаці.

Пакрыўдзіўшы Міхалюка ў адной дзялянцы, добра ўзнагародзіў яго Тварэц у іншай. Пры малацьбе, касавіцы, вывазе гною й іншых працах, дзе здаравенныя мускулы патрэбныя былі, ці хто ў Літоўцах і суседніх вёсках мог зь дзяцюком справіцца,

- Ні нарадзіўся мусіць той, каторы зь Міхалюком пры гнаявых вілах зраўняецца, - кпіў Антось Дзяркач. - Тры разы, братцы мае, кініць, глядзіш і воз. От ужо толькі вілы падаваць спраўляйся.

Мядзьведзь, сілы сваей ні знаіць. Як падчэпіць пад камінь, вілы - трэсь! Глядзіш ужо двух ці трох сукоў німа. Хэ-хэ-хэ! От і ўбі ты ў мазга-ўню ягоную, каб памяркоўна, вілаў ні ламаў.

Люба, удава па Міхалюковым брату, жыла са сьвякроўкай, якой пад семдзесятку падбягала. Кавалак зямлі мелі спорны, ды якая-ж гаспадарка без гаспадара. Міхалюк зь Вільні пехатой прышкандыбаць здолеў, але ўсё-ж гэта ня тое, што ладам гаспадарку павесьці.

Давалі вясковыя дзяцюку ськідку й на яго няпісьменнасьць, і невялікую кемлівасьць, і нехлямяжасьць у вопратцы, дый звычайную ляноту. Пры іншай нагодзе ніхто-ж, пэўне, на яго й крывога слова не сказаў-бы. Гэтта-ж, як наўмысна, вайна паставіла Міхалюка ля самага чульлівага жыцьцёвага нэрву, найбольш дакучлівай і балючай раны. Прынёс-бы якую вестку, - памысную, прыемную, ці навет сумную пра каго зь вясковых новабранцаў, - зусім накш было-б. Людзям проста ў галовах не магло памясьціцца, што быў ён «тамака, з усімі разам», прынамся вёску з адным скрыпам дзьвярэй пакінуў, ды зусім нічога пра нікога ня чуў. Антось Дзяркач патрапіў навет з рук чужынцаў вышмыгнуць, а гэты...

- А ў каторым ты палку быў, дык тамака нікога з нашых ні было?

- У мяне пад бокам нікога... Алі полк-жа, кажуць, вялікі, можа якіх пару тысяч чалавек, - вяла адказаў Міхалюк.

Міхалюк схудзеў, ды гэтым крышку з выгляду зьіначыўся. Папраціраліся локці рукавоў і калені порткаў таннага польскага мундзіру. Як на дзіва, Міхалюк трымаўся чыста.

- Ну а як-жа ў палоне было? - спытаў Тодар. - Добра кармілі?

Тут разьвязаўся Міхалюкоў язык. Спануканы дапаможнымі пытаньнямі, апавядаў паволі, смакуючы розныя дробязі. Хаця-нехаця людзі слухалі, кажнае слова лавілі. Дый мяркавалі некаторыя, што як разгаворыцца дык можа пра каторага зь вясковых дзяцюкоў прыгадае. Рашчараваліся.

- Гэта нейкая кара боская, - заключыла са сьлязьмі на вачох Вульляна. - Чаму Ён вярнуў аднаго такога, як усім на зьдзек? Мала во людцы церпяць, навіны якой чакаючы? Дык навіт ні саветы нічога ні знаюць, ні навіт гэты свой, як вады ў рот набраўшы...

- Ну а як цябе дамоў пусьцілі? - пытаўся Кмітаў Тодар, што стаяў воддаль, абапершыся аб вушак дзьвярэй і жваў сухую травіну.

- Дык-жа прышоў неміц, сказаў раўс, гэй нагаўза... Ну а тады нас сабралі на поізд і прывязьлі на граніцу ды масклалём аддалі.

- Каго гэта вас?

- Ну каторых дамоў пусьцілі.

- Многа было?

Дзяцюк задумаўся.

- Мусіць былі сотні, ні лічыў.

- Алі каторых гэта пушчалі?

- Тых, знацца, каторыя пад Расеяй цяперака. Ні пушчалі Палякаў, толька Біларусаў і Ўкраінцаў.

- Гэта, мусіць, ці ня тое, ягодка, што казалі бальшавікі: немцу яго шпіёнаў аддалі, а за тое неміц нікаторых нашых дамоў пусьціў, - паясьніла суседцы Аўдоля.

- А калі так многа пусьцілі, дык нікога з нашых ні было?

Міхалюк з адказам не сьпяшыў. Ён уважна зірнуў на зацікаўленыя, нецярплівасьцю насычаныя твары.

- Нікагусінькі, - сказаў коратка.

- От гэты Маршалкаў і наабяцаў. Казаў, што сам Сталін паможыць, - заключыў Уладзімер Пятух.

33

На дзень куцьці крыху папусьціў мароз і дзесь пад полудзень за гарбом Гараваткі навет нясьмела вызірнула сонца. Калі падкая да лыжнага й санкавага спорту малеча абсыпала сугор ды гулкімі галасамі напоўніла літоўскія начоўкі, пажвавела тэмпа падрыхтоўкі да сьвята ў вясковых хатах, хлявох і гумнах. Традыцыя наказвала, што Збавіцель радзіўся ў хлеве й таму ўсей хатняй жывёле ў гэты дзень трэба было асабліва пасобіць. Мужчыны ня скупіліся з посьцілкай і кормам. Жанчыны прыбіралі хаты, рыхтавалі стравы для стала куцьці й вялікага Дня Нараджэньня.

Калі-б літоўскія «народнай улады» паслухалі, куцьцю й Каляды давялося-б зь вялікай нішчэмніцай сустракаць. «Народная ўлада» ў асобе Сымона Пятуха й гэнага бурклівага зьнекуль маскаля, перапісвала-перлаічвала ўсю вясковую маёмасьць. Гэтта-ж на хвасьце

пярэпісі прыйшоў зь сельсавету загад, што бязь ведама ўлады ніякі селянін ня мае права браць для свайго ўжытку мяса-яйкі-сала-нарыхтоўкі. Загад той, пераказаны вуснамі старшыні камбеду кагадзе на сходзе, спачатку выклікаў вялікую няўцямнасьць, пасьля-ж злосьць і лаянку. Вядома-ж, людзі літоўскія ня ўчора ад соскі адвыклі, таму гэтта на сходзе, ці, як яго зьверху модна называлі, - міцінгу, трымаліся назьдзіў асьцярожна.

- Дык калі свайго, што выгадаваў, казаў той, цяперака ні закалоць і ні зарэзаць, дык як тады быць, што есьці? - спытаў звычайна маўклівы Якубаў сын Васіль.

- Я-ж... гэта самае, - заікаўся Пятух, - кажу вам тое, што мне сказалі. Ну самі разьбірайцеся.

Старшыня камбеду зірнуў на прысланага Саладухам з Гацяў маладжавага, гадоў пад трыццаць урадніка Яўхіма Скаруповіча. Вясковыя ведалі яго здалёку, а тыя, каторым ўжо ўрад сельсавету наведаць собіла, казалі, што называлі яго яшчэ фінансавым ці ўзносавым агентам, значыцца якраз тым, каму грашовыя й натуральныя падаткі сьцягваць даверылі. Дзяцюк устаў, сьмелым зрокам узяў усіх «наўчот» ды прачысьціў горла.

- Вы спрашываіця, таварыш, што есьлі нільзя ні закалоць, ні зарэзаць, дык, гэта самае, як тады жыць, што есьці. Ну а я от вапросам на вапрос атвечу: есьлі, прыблізіцільна, кажды з вас, ды ня толькі з вас, ну і з другіх дзярэўняў тожа будзіць распараджацца сваім імушчаствам так, як яму ўздумаіцца, так разрашыця спрасіць вас: як тады будзя жыць наша савецкая гасударства вапшчэ? Га? А дзілі таво, штоб і гасударства было давольна і граждане тожа, ці як тутака ў нас кажуць, - каб воўк быў сыты й авечкі цэлыя, - так далжна быць нейкая сісьцема? Есьлі ні панімаіця, так я вам січас паясьню.

Дзяцюк затрымаўся, пільна агледзеў «міцінгоўцаў».

- Гасударсьцьвінная сісьцема, - гэта закон, парадак. Усё імушчаства й вапшчэ налічнае бярэцца на ўчот і тады людзі, каторых паставілі тым імушчаствам заведаваць, сагласна ўказу правіцільства распараджаюцца сколька з таго даць гасударству на нарыхтоўкі, а сколька грамданам для іх собсьцьвіннага ўпатрабленія. Гэта значыць, што далжон быць і ёсьціка такі законны распадзел вапшчэ што ідзець гасударству на налог, а што людзям на іх пітаніе і упатрабленія. Січас панімаіця?

- Ну калі так, - адважыўся Васіль, - дык тады, мусіць, дабро прадукуюць зьнізу, а дзеляць зьверху. Ну алі скажыце, таварыш Скаруповіч, калі хто сваю авечку зарэзаць ці от якую сьвіньню перад Калядамі закалоць захочыць, дык тады як гэта быць? Гэта-ж як вы самі пра гэну сісьцему кажаце, дык, мусіць, трэба некага пытацца, ці сваё калоць ці рэзаць можна. Як так?

- Ну да, верна. Вапшчэ есьлі хто хочыць што са свайго імушчаства ды на сваё ўпатрабленія дык нужна заяўка на гэта. Панімаіця?

- Заяўку тую каму? - спытаў доктар Зянькевіч.

- Ды каму-ж... нам, - адказаў малады ўраднік.

- Ага, ну а як-жа... пэўне-ж вам, - буркнуў лекар.

Далей Скаруповіч паведаміў, што цяпер дзяржава бярэ «налогі» натурай адно ў залік, што неўзабаве зьявяцца гэтак званыя «павесткі аб налогах» і тады ўжо кажны будзе ведаць колькі зь яго належыцца «гасударству», а колькі на свой пажытак застанецца.

Каб свой жывот дарма ня бурчэў, ды каб і «сісьцему» ні ўквяліць, пасьпяшылі людзі з заявамі ў сельсавет. Ды тая «сісьцема» глухое вуха на сялянскія заявы наставіла. Ураднікі прымалі заявы, абяцаючы, што скора парупяцца пра іх. Гэнае скора расьцягнулася зь дзён на тыдні й выглядала, як нехта ў вёсцы трапна сказаў, што «чакай, дурань, зь неба манны».

- Маць тваю за нагу! - плюнуў доктар Зянькевіч. - Каляды йдуць, парсюка вунь выкарміў, а цяперака пытайся чорта лысага ці яго «сісьцема» табе сваё зьесьці пазволіць.

Зянькевіч паклікаў Любінага дзевіра Міхалюка, узяў на помач свайго Ўладзіка й на золаку ўтрох узяліся калоць добра выкармленага парсюка. Той-жа ад тушы на ногі ледзь мог падняццай гулкім скуголеньнем разгаманіў пра свае перадсьмяротныя цярпеньні на ўсю вёску. Дзіва няма, што калі шчаціна тучнага парсюка, добра прулажанага на доўгай плашцы ля казлоў, смылела й гарэла ў вясёлым полымі добрай кулявой саломы, прыйшлі лпюдзі даведацца, калі доктар Зянькевіч дазвол атрымаў.

- Памажы, Божа! - прывітаўся Пракоп.

Зянькевіч зірнуў на суседа.

- Дзякую, - адказаў.

Засунуўшы плашкі-далоні ў «жандовыя» галіфэ, Міхалюк прыглядаўся полымю, а Ўладзік разьмяркоўваў пукі саломы.

- Як-жа гэта ўдалося табе? - пытаўся Пракоп.

- Ты пра што гэта? - зірнуў на яго доктар.

- Пра заяўку. Калі пазволілі, пытаюся.

Ужо разьвіднелася. Казлы былі прыладжаныя ў агародзе за хлевам. Дым ад саломы спорнымі клубкамі ляцеў проста ўверх, а пах сьвежага, падсмаленага сала прыемна казытаў нос.

- Ні ждаў, - коратка адказаў Зянькевіч. - Прайшло болі як дзьве нядзелі як злажыў заяўку, а яны там мітрэнжацца бізь ніякага адказу. От плюнуў ды, думаю, паспрабую. Пагляджу, што з гэтага будзіць.

- Гэтак яно? - зьдзівіўся Пракоп. - Ну а я-ж думаў, думаў, ды пабаяўся.

- Знаіш што, Пракопка? Падумаўшы так цьвярозым мужыцкім розумам дык яно выглядаіцль гэтак: ты гадаваў, карміў, даглядаў, а нейкага там начальніка ласкі прасі, рукі яму можа цалуй, каб пазволіў табе сваё ды ў свой рот улажыць. Я ўжо думаю сабе, што калі адразу прычэпяцца, дык унь ніхай другога забіраюць. Ну ні так?

Пакуль парсюка Зянькевіч асмаліў, прыходзілі й іншыя за язык яго пацягнуць і ўжо сярэднім ранкам цэлая вёска ведала пра доктараў учынак. Улада ў асобе старшыні камбеду прышкандыбала даволі пазнавата.

- Дык от, таварыш Зянькевіч, ты закалоў і абсмаліў, ну я-ж мушу ў сільсавет аб гэтым заявіць, - тлумачыў Сымон Пятух.

- Заяўляй, - сказаў цьвёрда лекар.

- А ты думаіш ні заяўлю? От січас-жа йду, - пагражаў той.

- Кажу-ж табе, чалавек добры, заяўляй! Ты-ж - начальнік!

Пятух зірнуў на маўклівых Міхалюка і Ўладзіка, пачмыхаў носам, завярнуўся й пайшоў.

- Ханжа карцёжная, п'янюга! - сыкнуў гаспадар, калі Сымон ужо ня мог пачуць. - Ласун на чужое, абжорся панскім і асадніцкім. Чакай, дастукаешся й ты свайго, як тых двух басякоў!

З гэтымі славамі лекар узяўся абскрабаць нагар на парсюковай скуры. Наступнымі днямі пачалі на золаку ўспыхваць агні за іншымі вясковымі хлявамі ў агародах. Іншыя авечак рэзалі. «Нарыхтоўка» мяса перанеслася і ў іншыя вёскі. Зянькевіча неўзабаве выклікалі ў сельсавет, набарабанілі пра адпаведныя строгія мры кары, якой ніяк ня мінуць яму ў блізкай будучыні. Сельсавецкія ўраднікі рукамі сваіх «дзіпутатаў» пашырылі новы, яшчэ больш строгі загад, у якім

гаварылася, што без дазволу дзяржавы нельга было для свайго ўжытку забіваць ніякага «пагалоўся». Неўзабаве зьявіўся наказ пра неадкладную пастаўку мяса дзяржаве і ў лік таго мяса трапіў другі доктараў парсюк. Як там мела быць далей, хто там ведаў. Цяпер-жа, галоўна дзякуючы доктаравай ініцыятыве, на калядных сталах была забясьпечана скароміна.

Паволі і ўрачыста месьціўся ў даліне калядны вечар. Перад зьмярканьнем суняўся на Гараватцы дзіцячы гоман, лагодна млела на захадзе чырвонае зарава й пажвавела празрыстым блескам буйная Мілавіца. Маестатычна-ціха драмаў пад расьцьвіўшымі тысячамі зорак нябесным купалам гігант Архіп. Сьціхла гамонка ля гумнаў і гасподаў.

У Бахмачовай хаце на зэдліку напокуці пад абразамі разьмясьцілася малая ялінка. Яшчэ перад полуднем прынёс яе, хлесткую й сьвежа-пахучую прыгажуню з Гаравацкай пушчы Янук. Прыладзіў на крыжы-падстаўцы, адсунуў з кута стол, паставіў на зэдліку й аздобіў тымі папяровымі, у бальшыні самаробнымі анёлкамі й ланцугамі, дзедам Марозам ды зоркамі, што захаваліся ў скрыні на гарышчы зь леташніх Каляд. Ня было сёлета ані матар'ялу, ані часу майстраваць новыя аздобы. Ялінка адтаяла й ажыла прыемна казычачым нос пахам. Пад вечар пах гэты дапоўніўся араматам сьвежага балотнага сена, якім заслалі стол ды розных страваў, што запрашальна-прывабна разьмясьціліся на абшырным абрусе, некалі дбайна вытканым і прыгожымі ўзорамі вышытымі рукамі нябожчыцы Алены.

Пасярод на самым пачэсным месцы, у невялікай глінянай місцы, згатаваная зь ячных крупаў, прыпраўленая тоўчаным макам і мёдам, стаяла куцьця. На талерцы, абложаная роўненькімі скрылькамі цыбулі, залітая семенным алеем ляжалі парэзаныя два селядцы, каторыя нейкім дзівам удалося Пракопу праз заднія дзьверы выгандляваць у гацкага крамніка. У іншых місках і на талерках - марынаваныя грыбы, журавінны кісель, вінігрэт, гуркі, халодная вараная бульба, хлеб, а ў гладышы - жытні квас. Навет і посуд - талеркі, відэльцы й сталовыя нажы, - трымалі недзе ў скрыні і ўжывалі адно на вялікія сьвяты. Сьвяточны стол выглядаў-бы куды больш сьціплым, калі-б не парады й помач Алесявых Надзі й Кацярыны. Ні сам Пракоп, ні Мікола надта не ладзілі з тонкасьцямі харчовага рыхтаваньня.

- Тата, а як са сьвятлом будзіць? - пытаўся бацьку Янук.

Пракоп апранаўся ў сьвяточнае. Ён падумаў.

- Зьбегай, сынок, у сьвіран і там з куфра дастань сьвечку, знаіш з тых, што са свайго воску рабілі.

Янук скрыпнуў дзьвярмі. Неўзабаве ў медзяным падсьвечніку, побач куцьці вясёлым полымем згарэлася высокая, таўставатая сьвечка.

- Запалі таксам на покуці лямпадку, - загадаў бацька.

Скончыўшы падрыхтовы, урачыста й паволі, як і належыцца ў сьвяты вечар, селі за стол Бахмачы. Пракоп зірнуў на месца, дзе ранейшымі гадамі сядзела ягоная жыцьцёвая спадарожніца.

- Перш памолімся, - сказаў бацька.

Усе ўсталі, тварамі да абразоў, перахрысьціліся.

- Госпадзі, Божа наш, адзін Уладар, што на небе й на зямлі, - пачаў роўным і пакорлівым голасам бацька, - вялікі ёсьць дзень прыходу да нас Сына Твайго Мілага, Адзінароднага, каторага зь вялікай ласкі Тваей і міласьці да нас паслаў Ты, каб Ён навучаў нас, цярпеў за нас, паказаў нам дарогу як збавіцца грахоў. Увасобіўся Твой улюблёны Сын у цела чалавечае, нарадзіўшыся ад Дзевы Марыі ў гэту ноч у Віфліеме... І вялікая Твая ласка й любоў да нас, Госпадзі Божа, калі Ты, сатварыўшы нас на вобраз свой, выправіў Сына свайго Ісуса на зямлю, катораму даручыў паказаць нам Твае законы, каб мы, малыя й грэшныя з дарогі ня зьбіліся. І Сын Твой, Божа наш, ні прыйшоў да нас у багацьці вялікім, а як бедны сярод найбяднейшых.

- Дзіва німа, Ацец Нябесны, што калі людзі пазналі Віфліемскае Дзіцятка, што гэта той, пра каторага ад пачатку гаварылі прарокі, на зямлі вялікая радасьць настала. Яшчо Ты, Госпадзі, паслаў зорку Віфліемскую, каб паказала дарогу тым, што народжанаму Сыну Твайму хацелі пакланіцца, а анёлам загадаў песьнямі прыход Бога на зямлю славіць. Мы, вялікія грэшнікі, што можа нідастойныя вялікай ласкі Тваей. У гэты вечар пакланяемся Табе ў васобе Сына Твайго нованароджанага, будзем славіць Яго разам з анёламі Тваімі й прасіць у Цябе, Божа наш, памілаваць нас грэшных, памагчы нам у цяжкім жыцьці кажны дзень... Памілуй нас, Госпадзі, Божа наш, памілуй, Хрыстос нарадзіўся, славім Яго, - хрысьціліся Бахмачы.

Ані Янук, ані Мікола ня чулі раней, каб бацька маліўся так проста й шчыра, сваімі словамі. Такой малітвы ня чулі з вуснаў ніякіх сьвятароў у ніякіх мясцовых сьвятынях. Гэта стоячы, злажыўшы рукі,

сыны пытальна перазірнуліся. Нешта новае варушыла іх сэрцы. Бацькаў твар, зьвернуты да абразоў напокуці, ажыў нейкай няведамай сілай, што перахапіла яго празрыста-пакорны зрок. Пасьля, шмат пазьней, ужо зусім у іншых абставінах паўстане ў Януковым уяўленьні велічнай явай гэта бацькава постаць і гадаць будзе гаротны Бахмач пра сэнс многа чаго відавочнага, а мо больш яшчэ адно спанатронага, падсьведама тады адчутага.

А бацька прадаўжаў:

- Вялікі, дужы й справядлівы Хрыстос наш, каторага нарадзіны сягоньня сьвяткуем. Радуемся прыходу Твайму. Будзь добры выслухаць гэту простую, можа няўмелую, алі шчырую малітву нашу. Ні гавару да цябе моднымі чужымі словамі, бо ня помню ўсіх тых малітваў, каторыя ў цэрквах вучаць. Гавару, Госпадзі мой так, як умею й прашу мяне выслухаць.

Пракопаў голас дрыжэў. Здавалася, што вось-вось абарвецца, засядзе дзесьці ў сухім горле.

- Спачатку, Госпадзі, прашу даць вечны спакой і прыхінуць у ласцы Тваей нябожчыцу нашу, гаротніцу Алену. Калі памінаю яе тутака за гэтым сталом, дзе толька можа трэба Твайму прыходу радавацца, дык гэта таму, што яшчо ні загаіліся й надта баляць раны з таго лета. Паспагадай нам, Госпадзі, памілуй яе, нашу дарагую й добрую, каторую чужы гвалтаўнік на той сьвет паслаў...

- Яшчо, Госпадзі, сягоньніка народжаны Ісус Хрыстос, прашу даць здароўя сямейцы маей, каторая гэттака ля стала. Даруй нам грахі нашы, зрабі нас дужымі, дай нам руку Тваю, паддзержы нас, слабых, каторым так лёгка з дарогі зьбіцца можа найболі цяперака, як прыйшлі да нас тыя, што ганяць Цябе, навуку Тваю топчуць, абразы Твае б'юць, дамы малітвы паскудзяць і зачыняюць. Прашу Цябе, Госпадзі Божа наш, выслухай гэтую прастую малітву нашу, ні пакідай, а паддзержы ўсю сямейку нашу...

- Сьвятая Прадслава, Апрасіньня Полацкая, Нябесная Заступніца наша, прашу Цябе, маліся за нас, крыўджаных і паніжаных, прасі ў Госпада Айца Нябеснага ласкаў і помачы для нас,. Як Ты некалі на зямлі памагала нам і заступалася за нас, так цяпер і на небе ні забывайся аб нас у малітвах сваіх.

- Яшчо, Госпадзі Божа, прашу паслаць сакавіты ўраджай на нівы нашы, каб гумны поўныя дабра былі каб у хлявох прыплод вёўся і ў

вагародах ды садох каб добра й спорна расло. Ніякая травіна на полі, ні рыба ў рэчцы, ані яблык на дрэве ні расьцець бяз волі Тваей, Госпадзі. Дык прашу Цябе, даруй нам грахі нашы, прыспор нам дабра ды дзяржы нас у ласцы й апецы сваей, Госпадзі. Божа няш, памілуй нас, грэшных. Ісус Хрыстос, памілуй нас. Ніхай сьвятло навукі Тваей вечна жывець між нас, каб жылі й працавалі мы так, як Ты нам загадаў. Благаславі, Госпадзі, гэту яду, што на стале. Слава Айцу й Сыну й Сьвятому Духу, амінь.

Перахрысьціўшыся, Бахмачы селі. Колькі часін маўчаў Пракоп, пасьля зірнуў на сыноў і стравы на стале. Крыху пачало хліпаць, а пасьля параўнела жоўтае полымя сьвечкі.

Узяліся за куцьцю. Елі маўкліва. Пасьля куцьці прыйшла чарга на селядцы, вінігрэт і іншае. Ужо недзе па чацьвертай страве загаварыў Янук:

- Гэткага, прызнацца, тата, я яшчо ніколі ня чуў.

- Чаго?

- Такіх малітваў.

Накладаючы вінігрэт, бацька зірнуў на сына.

- Я кажу, тата, што ніколі ня чуў, каб хто так проста, як ты, маліўся. Ну знаіш... моляцца з кніжак пацаркоўнаму, алі-ж ні от так проста панашаму, што толька свая галава выдумаіць. Ні праўда, Мікола?

- Я таксама ніколі такога ня чуў, - згадзіўся брат.

Бацька спакойна перажваў- і глынуў ежу ў роце, выпіў квас і абцёр вусы, уважна зірнуў на сыноў.

- Знаеце што? Я ніколі, мусіць, ні расказваў вам гэтага... Як я некалі ў тым Пітраградзе жыў, дык пазнаў аднаго чалавека нашага. Такі от сабе просты вясковы дзяцюк быў, там з-пад Полацку недзіка. От, значыцца, працаваў ён там на хвабрыцы, чытаць і пісаць кумекаў трошка, алі ўжо ў тых яцях і іжыцах ні разьбіраўся саўсім... Гэта, знаіця, пры цары такія дзьве сьмешныя буквы былі, каторыя трэба было доўга вучыцца, каб ведаць дзе іх паставіць, а дзе няможна. Ну я нейкі-ж там пісар быў, хоць і нівялікі, дык тыя яці й іжыцы знаў. Ну алі я ні пра іх, а пра дзяцюка гэтага...

- Значыцца, жыў ён ні так далёка ад мяне й мы, бывала, у тэй самай царкве калі спаткаемся. Адзін раз гэтак стаю я ў царкве, людзей кругом поўна ну й значыцца гляджу, - збоку лі мяне гэты самы

Полацкі. А стаю блізка лі яго і от чую, што моліцца. Тамака-ж, вядома, хор недзе высака на клірасе пяець, сьвяшчэньнік сваё, а дзяк - сваё, а гэты, - чую яго збоку, - моліцца. Ну людзі моляцца. Што-ж там, сказаць, спіцыяльнага, што хто ў царкве моліцца? На тое-ж яна і ёсьць царквой, каб у ей маліліся людзі. Ды нешта мне на вуха папала, што гэты ні так тыя малітвы кажыць, як другія...

- Бярыце во, налывайце, запівайце квасам, - паказаў Пракоп сыном на гладыш. Мікола ўзяўся наліваць квас.

- Надта-ж смачны, такі сьвежанькі, дзякуй Богу, удаўся, - паясьніў Бахмач.

- Ну й што далей? - пытаўся Янук.

- Што далей, значыцца, пытаешся... От наставіў я тады вуха й чую, што гэты Полацкі цярэбіць сабе пад нос во гэткай гаворкай як мы тутака, ні раўнуючы, між сабой... Ён гэта ня тое, каб выпінаўся, каб каторыя людзі чулі, ну алі-ж я гэттака саўсім збоку лі яго, дык добра чую... Я калі спанатрыў, што гэты дзяцюк простай гаворкай сабе пад носам, дык падумаў, - от добра гэта помню, каб з гэтага месца ні зышоў, калі ніпраўду кажу, - што можа ён от так сабе што якое ды ў царкве вярзець. Ажно чую, што не, гэта ён так да Бога гаворыць. І пабажуся, што ня тое, каб ён патрапляў тым напісанным і кнігах малітвам, алі што са сваей галавы выдумаіць. Трэба прызнаць, што надта-ж складна ў яго выхадзіла. Я гэта, - як вам сказаць? - ня тое, каб зьніякавеў, ці што, алі от, думаю сабе, а гэта што за дзіва такое... Гэта я спачатку так трошачкі падумаў. Мне тады ўжо, трэба вам ведаць, дзесьці пад дваццаць пятку падбіралася, ні маленькі ўжо значыцца, сёе-тое ў жыцьці я ўжо відзіў. Алі-ж, прызнаюся шчыра, - ніхай мне нованароджаны Хрыстос будзіць сьветкай, ніколі ў галаву ні прышло, што можна сваей простай гаворкай і так пасвоему, як умеіш, да Бога маліцца. Калі чалавек аб гэтым калі думаў, дык мусіць здавалася, што малітвы ўлажылі людзі мудрыя, у Бога дастойныя, ну й яны сваё дзела зналі. Чалавек проста браў малітоўнік, ці можа якую малітву калі ў школе вызубрыў, ну й маліўся. Ніколі ў галаву ні прыходзіла, што можна накш рабіць. Тады-ж, у гэнай царкве, збоку ля гэтага чалавека стоячы, я пачаў думаць. Скажу шчыра: спачатку сьмешным гэта здалося, ято ён рабіў, алі калі задумаўся далей, дык і не.

- Алі от, думаю, што будзіць тоя ніхай будзіць, а я вазьму й запытаюся яго чаму ён так робіць. А чаму-ж-бы не? Калі ён так да Бога

папростаму асьмеліўся гаварыць, дык, пэўне-ж, чалавек ён адважны і ўдумлівы, душой можа ня скрывіць і мне скажа. Скончылася, значыцца, у царкве, выходзім і тады я да яго. Паздароўкаліся. Ну і я так ня тое, каб адразу з гэтым пытаньнем выскачыў. Ідзём па вуліцы, перакідваем трасянку пра тое, як жывецца... Кажу я тады да яго: - Скажы мне, Мікалай, чаму гэта ты ў царкве так маліўся? Я от збоку лі цябе стаяў і, даруй мне, падслухаў. - Як гэта, кажаш, так? - ён мне ў вадказ. - Ну знацца ні па кніжнаму, так простай гаворкай, - кажу. А ён мне на гэта: - А што, няможна?

- Я гэтта, прызнацца вам, зьніякавеў. Можа, думаю сабе, ні скажа дзяцюк. Я-ж хацеў ад яго даведацца, а ён пытаецца ці можна... Алі гэта анічуць мяне ні асадзіла. - Мікалай, - кажу, - я-ж гэта ні таго, каб разьбіраццаці можна ці няможна. Мяне от цікавіць, чаму ты так рабіў. Я гэткае, знаіш, першы раз чуў... Усе-ж тыя малітвы гавораць, каторыя з царкоўна-славянскіх кніжак наўчыліся. Алі, - кажу, - надта-ж пекна ў цябе выходзіла.

- Спачатку, як гэта я яго выпытваць пачаў, дзіржаўся як вожык, можа адразу ні скумекаў, што я бізь ніякіх задніх думак... Алі як пахваліў я яго, што так складна ў яго выходзіла, дык гляджу - дзяцюкоў твар паясьнеў і тады ён мне так проста й папрыяцельску ў вочы мае глянуў.

Мікола й Янук, заслухаўшыся, забыліся пра яду, задумліва чакалі далейшага. А Пракоп, памалу й памяркоўна ўзяўся накладаць кісель на талерку.

- Ну й што далей было? - нецярплівіўся Янук.

- Гэта самае, бярыце во кісель і ўсё есьце ды слухайце, адно другому не замінаіць, - адказаў Пракоп і прадаўжаў.

- Ішлі мы тады ўжо па набярэжнай Нявы, - як сягоньніка прыгадваю. - дзень быў пекны, сонейка, вясна ўжо на крыгі лёд у рацэ дзяліла. Надта-ж так лёганька й добра на дварэ дыхалася. Той дзяцюк Мікалай, трэба вам сказаць, гаварыў павольна, на вецер слоў ня кідаў, а ўсё так добра й грунтоўна перадумываў. І калі што скажа, дык паслухаць яго цікава было. Ён і ў тую нядзельку анічуць гаварыць ні сьпяшыўся. Станулі мы, помню, над ракой ля плоту такога каменнага і ён загледзіўся на той лёд, што ўжо на крыгі крышыўся, задумаўся, дый так мне паволі кажа: - Знаіш, Пракоп, што я слаба з тых кнігаў царкоўных чытаю. Ну, кажыць, Сьвятое Пісаньне знаю, бо многа ў

царкве чуў, ды ад сваіх каторых пабожных людзей. Малітвы-ж таксама нікаторыя знаю, хоць можа ні так слова ў слова, як яны напісаны тамака. Алі мне самому, - кажыць, - цяжка тыя славянскія кручкі даваліся, калі пробаваў, а школы вялікай я ні маю. Расейскія таксама, - кажыць, - ні надта каб гладка йшлі. І от, ведаеш, хочацца да Бога сказаць тое, што на душы ляжыць, а тутака гэныя мудрагелістыя кніжныя знакі замінаюць. І от ці раз думаў сам сабе, што гэта рабіць. Можа другі, будучы на маім месцы, пашоў-бы да папа ці дзяка якога, каб памог, алі я ці то ні асьмеліўся, ці то нагоды ні знашоў.

- Тады мне раз прыгадалася, - кажыць, - што я некалі са Сьвятога Пісаньня недзіка чуў. А гэта было тое, што раз Ісус Хрыстос сказаў сваім апосталам. Можа й ты помніш, Пракоп? - пытаецца ён мяне. А Хрыстос сказаў апосталам: ідзіце й навучайце ўсе народы. Значыцца, я даўгавата над гэтым мазгаваў. Як-жа гэта Хрыстос пасылаў сьвятых апосталаў навучаць усе народы? Паякому яны мелі навучаць? Мы-ж знаем, - кажыць, - што кажны народ па свойму гаварыў, значыць і сам Бог знаў пра гэта. Ды Ён-жа таксама мусіў знаць, што калі вучні ягоныя пойдуць усе народы па цэлым сьвеце навучаць, дык каб Божае Слова да іх дайшло, мусілі языка да людзей знайсьці. Ну што, ні праўда? - кажыць мне гэты самы Мікалай. А я тады, прызнацца вам, першы раз такое паясьненьне чуў, хоць тое, што загадаў Бог апосталам ісьці і навучаць усе народы я чуў са Сьвятога Пісаньня раней. Ну алі я ні задумваўся над гэтым, а гэты Полацкі глядзі во што...

- Ну ён мне тады далей расказываіць: - Калі Бог так загадаў сваім апосталам навучаць усе народы, значыў мусіў даць усім народам права свайме гаворкамі разьбірацца ў навуцы Хрыстовай, маліцца. От, як... Мусіць, выходзіць тады, што ўсе гаворкі пірад Богам роўныя, што кажны маіць права такое як другі, што німа гэттака ніякай казёншчыны, значыцца ты мусіш так, а ня гэтак рабіць... Бог, відаць з гэтага, пачуіць калі будзіш да яго маліцца так, як твая маці цябе гаварыць навучыла, а ня тое, што калі з кніжкі ні навучышся, ды яшчо якой чужой гаворкай, дык Бог ад цябе адвернецца. Сама важна, каб малітва твая ад душы, каб шчырая, от як...

- Дык от, братка Пракоп, так я гэта ўсё пірадумаўшы, пачаў нашай гаворкай маліцца, - кажыць мне гэты самы Полацкі Мікалай. Трэба вам прызнацца, - заключыў Бахмач, - што чым болі я пасьля думаў над гэтым, дык болі зь ім згаджаўся, відзіў якую глыбокую праўду гэты

пабожны дзяцюк мне як на талерку вылажыў. От як яно было... Дык і я, знацца, так ужо малюся. І думаю, што Гаспадар наш нябесны, Гасподзь Ісус Хрыстос і Сьвятая Прадслава Апрасіньня й ўгоднікі божыя сьвятыя мяне чуюць і разьбіраюцца што й да чаго...

Пракоп пакорна зірнуў на абразы, перахрысьціўся, акінуў вачмі сыноў сваіх задуманых і маўклівых.

- Гэта, тата, вялікая праўда, што той Полацкі табе казаў. Толька што мала хто, відаць, сам сабой такую сьцежку пратопчыць. А гэта-ж, відаць, трэба і пратоптываць самому, бо я ня чуў, каб калі які поп дзе такое сказаў, - падтрымаў бацькавы развагі Янук.

- Разумны дзяцюк гэны самы Мікалай быў, - уставіў, пераможваючы страву ў роце, Мікола.

- Мусіў быць. Я пасьля часта яшчо зь ім відзіўся,. Ён так, як у тым царкоўным, так і ў другім жыцьці саматугам добра пасвойму разьбіраўся. Хоць навукі ня меў, алі галаву во якую! Гэта-ж як падумаіш, нікаторыя вунь якія высокія школы за сабой маюць, а ці можна сказаць, што каб самі яны думаць умелі? - зрабіў выснаву Пракоп.

У куце, перад пабітым абразом Прадславы паволі тлела полымя ў лямпадцы. Урачыстая сьведамасьць адкрыцьця новай і блізкай дарогі да Бога асьвятліла твары прысутных за гэтым сталом. Пасьля цягнулі з-пад абруса сена й варажылі пра даўжыню веку кажнага. І ўсе выцягнулі па даўгой травіне. Супольна, сугучна, ціха і ўрачыста сьпявалі калядкі. Яшчэ пазьней дзяліў Янук рэшткі куцьці жывёле ў хлявох, а скончыўшы таптаў хрусткі сьнег на дварэ, разглядаў на небе зоркі й ветах маладзіка. Здавалася, што зоркі сяньня зьзялі куды ясьней, нейкім празрыста-ўрачыстым гарэньнем, быццам ажывіліся на ноч Вялікага Прыходу.

У начоўках панавала ўрачыстая цішыня, адно рэдка па гасподах цяўкалі сабакі. Недзе ў Ліпавічах пачуліся галасы. Пераклікаліся, мусіць, вартавыя. І Януку здалёку здалося, што да вушэй ягоных прыляцела ведамая ўжо, ядавітая трохпавярховая маскоўская лаянка.

34

Яўхім Скаруповіч зноў трымаў цэнтр увагі «міцінгу» ў літоўскай школе. На сход сабралася большая грамада, чым на нязьлічоныя іншыя сходы, ад якіх сялянам пачало ўжо моташна рабіцца. Гэтым разам Сымон Пятух, наказваючы людзям, падчырківаў, што «яўка абізацельна» для ўсіх, каторыя зь Пірасечана лес вывозілі, што падлік будуць рабіць і прэміі даваць. Само моднае слова «прэміі» дзіўна на Пятуховым языку гучэла. Некаторыя людзі чулі яго першы раз і распытваліся «што гэта за цымус такі гэныя прэміі». Тады Сымон тлумачыў, што гэта будзе заплата і ўзнагарода за вываз лесу. Магчымасьць, што нарэшце заплацяць, - вер ці ня вер гэтай «брыдзе» Пятуху, - прымусіла шматлікіх мужчын, што вазілі лес, дый шмат іншага вясковага народу напоўніць залю. Зь цікавасьці заглянулі сюды й некаторыя малодшыя, у іх ліку Янук і Дуня.

Цьмяна сьвяціла лямпа за пярэднім сталом, за каторым стаяў ды вялымі рухамі сваіх рук падмацоўваў гутарку пра «сісьцему», яйкі - дзяржаве, малако - дзяржаве, зярно - дзяржаве, льняное семя - дзяржаве, мёд - дзяржаве, усё чыста - дзяржаве той самы сельсавецкі ўраднік Скаруповіч. Каб людзі, барані Божа, не забыліся які аўтарытэт для іх дабра гутарку вядзе, Яўхім пачаў зьверху, ад самага Крамля, назваўшы «наймудрэйшага з усіх мудрых атца ўсіх народаў», каторы, відаць, бяссоньніцай морыцца, турбуючыся пра дабрабыт ня толькі літоўскіх сялян, але і ўсіх вялікіх і малых народаў. Пасьля «таварышч» Скаруповіч са сьціплага моўнага запасу свайго выцягнуў колькі абшмуляных і ўежджаных ужо эпітэтаў пад адрасам «добліснай», што вызваліла й каторая ня сьпіць «січас» на ніякай мяжы, бо «ніаб'ятную» сьцеражэ, а ў Фінляндыі дык і здорава-такі дае ў каршэнь «гнюсным фінскім мілітарыстам і прочым капіталістам». Гаваркі Яўхім спыніўся на «народнай уласьці», значыцца ў тым ліку і людзях гацкага сельсавету, што, згодна наказу таго-ж самага «наймудрэйшага з мудрых» адно пра мясцовае народнае дабро й грамадзян дбаюць.

Ужо пасьля такога ёмістага ўступу зьнізіўся Яўхім да літоўскіх хлявоў, аўчарняў, гумнаў, курасадняў, вульляў і назойліва-манатонна прыгадваў, што трэба дзяржаве здаваць. Не забыўся па дарозе заглянуць у «сісьцему», адзіна-справядлівую і ўсім як на далані ясную.

Людзі сядзелі, пазяхалі, драмалі.

І нарэшце да вывазу лесу Скаруповіч дабраўся.

- У мяне тутака сьпісок, вапшчэ... учот занчыцца вывазу дрэва дзярэўняй Літоўцы. На ім віджу ўсе фамілііі й сколька хто атработаў. От інцярэсна: нікаторыя ня выпаўнілі нормы й вапшчэ...

Трымаючы ў руках сьпісаны ліст паперы, Яўхім наўмысна затрымаўся, доўга разглядаў прысутных, быццам хочачы падчыркнуць цікавы факт, што «нормы ня выпаўнілі».

- Віджу фамілію Пракофія Бахмача, што выпаўніў наймені, усяго трыццаць два працэнт нормы. Ёсьць ён тут? - спытаўся войстра.

- Я тутака, - устаў апрануты сярмягу Янукоў бацька.

- Чаму нормы ня выпаўніў?

- Я-ж, гэта самае, стараўся, таварыш зь сільсавету, ды жарэбную кабылу зусім зацягаў, - пачаў дрыжачым голасам Пракоп. - Ні магла яна, бедная. От ажарабілася раней чым трэба, ні данасіла дык жарабя, - памажы яму Божа! - болі ляжыць, бо ня можыць значыцца на ногі ўстаць. І сягоньніка сам ня ведаю, што зь ім рабіць. Надта-ж конь мне трэба, алі калі што нідалугай нарадзілася дык якая-ж тут рада, мае людцы добрыя? От папытайцеся, таварыш зь сільсавету, людзей. Усе ведаюць.

Пракоп разьвёў рукамі, паціснуў плячмі й сеў.

- Ага, ну да, - прыняў да ведама Пракопаву гутарку Скаруповіч. - Нада было кабыле ажарабіцца і вапшчэ... Ну што січас, стала быць пасьля таго, як ваша кабыла ажарабілася? Вы апяць... вапшчэ... паехалі дрэва вазіць?

- Дык казаў-жа вам, - тлумачыў Пракоп, ужо не ўстаючы, - што кабыла зацiганая, ня можыць... Улегцы падзіржаць яе трэба, каб падужэла.

- Сколька врэмя таму, як кабыла ажарабілася? - насядаў Скаруповіч.

- Дык ужо ці ня месяц будзіць... Я-ж кажу...

- Дык вы думаеце кабылу ў хлеве дзіржаць, ужо цэлы месяц дзержыце, а лесу вапшчэ ня думаеце вазіць? - павысіў Яўхім голас.

- Я-ж кажу, - бараніўся Пракоп, - што слабая яшчо. Трэба...

- Вы мне кажаце! - крыкнуў Яўхім, - вы мне не кажыце! Я вам буду казаць і вапшчэ... панімаіця? А вы маўчыце і мае распаражэнія спалняйце!

Гэткі Скаруповічаў выбух параліжаваў шэпты ў залі. Людзі спачувальна пазіралі на Пракопа й няпрыхаваная варожасьць да

фінагента зьявілася ў некаторых сялянскіх вачох. Ніколі дагэтуль не давялося Пракопу быць аб'ектам публічнага ганьбаваньня. Ён апусьціў галаву, глядзеў як дрыжэлі рукі, тыя самыя рукі, што калісьці ў глыбока-засьнежанай пушчы тузаліся зь вялізнымі чурбанамі першакляснага дубу ці бярозы, якую пасьля ў «саюзную Гірманію» высылалі.

Янук сядзеў побач Дуні. Яшчэ напачатку сходу паклікала яго да сябе дзяўчын. Гутаркі як і ня было. Паўслова, мірг вока васілька, штурхель у бок, дробненькая ўсьмешка, кепікі, вось і ўсё. Здавалася Януку, што быў зьдзек і падман, абяцаньне нязьведанага й таўханьне пад бок. Усё гэта адбывалася ў вялікай цеснай грамадзе, між завязаных кутамі пад бароды хустак, поту ад тыднямі нямытага цела, недахопу сьвежага паветра. Вабілі пад шаўковай сукенкай у модным пальце тугія грудзі, прынаджвала цяпло дзявочага цела, дурманіла галаву ейнае дыханьне.

А там за сталом гаспадарыў нахабна-валадарны й дурнаваты ў гэтай ролі Скаруповіч. Збоку смуродзіў самакруткай басяк Пятух. Гарой напокуці стаяў фінагент і голас свой вайстрыў не на каго іншага а на яго бацьку. Пракоп стаяў пры пярэдняй лаве, азіраўся на бакі, стараўся вытлумачыць тое, што ўсім у вёсцы даўно ясна было. Якраз як тады, перад пабітым абразом Прадславы, бацька выглядаў скорчаны, паніжаны, прыбіты. І Скаруповічаў крык-загад недарослага гарлапана-ўрадніка, каторы адно ў пух абрастаў, нічога пра жыцьцё ня ведаў, выклікаў літоўскага селяніна на паядынак.

- Ты знаеш што? Ні крычы на мяне! - сыкнуў і выпрастаўся Бахмач. - Ці ты, жаба зялёная, думаеш, што я кабыле што загадаю? Хочаш дык завяду цябе ў хлеў, сам паглядзі, ці кабылу можна сягоньніка ў ваглоблі запрэгчы. Можа яшчо лепі будзіць, калі да жарабя прыгледзішся... Вуньдзіка яшчо цяпер на ногі цяжка ўстаець, хоць ужо болі як месяц мінуў... А чыя віна? Нашто пёрлі? Ні маглі даць тыдні тры-чатыры, каб кабыла вынасіла? Вы, - сам-жа кажаш, - народная ўласьць. Калі так, дык ня толькі з народу браць мусіце, але й памагаць людзям трэба. А гэта-ж таму, што вы не далі кабыле вынасіць то цяперака двух калекаў у маім хлеве. А ці-ж ты ня відзіш, - хіба-ж ты ні гаспадароў сын, - што біз каня гаспадаркі німа ніякай? Га? Дык скажы, што я цяперака рабіць маю? І ты, цаца вялікая, гэттака

прыехаў ганьбаваць мяне за тое, што я хворую кабылу на забой у лес ні пацягнуў? Га?

Грымеў Пракопаў голас. Змалеў за сталом ураднік Скаруповіч. Гэтта ніяк і нічога ў «сісьцему» ні ўкладалася... Вось яно простае, голае, рухлівае, бурлівае й запраўды несхвальшаванае жыцьцё. Нязьбітыя доказы. Як да гэтага датарнаваць інструкцыі партыі й «сісьцему»?

І стаяў у Януковых вачох бацька родны, вялікі й пагрозьлівы. Выскраблі ягонае цярпеньне ці ня больш, чым тады, як ікону Прадславы пабілі. Дзесьці была тая глыбіня, зь якой вырастаў поўны, маестатычны, пагрозьлівы і ў гэтай пагрозьлівасьці дужы й небясьпечны Пракоп. Сумленны й працавіты чалавек, намагаючыся дагадзіць «народнай уласьці», натужваўся, зьгінаўся ў крук, браў над сілу, навет калечыўся. Хрысьціянска-беларускай душы чужым было ўсялякае круцельства. За натугі мо спадзяваўся пахвалы, а ў найгоршым выпадку спагады й падтрымкі. Гэтта-ж яму плацілі брутальнымі дакорамі, лаянкай, пагрозамі, публічным ганьбаваньнем. Усё гэта ў імя некага «наймудрэйшага з мудрых, найлучшага з лучшых, найлюбімейшага атца ўсіх народаў», ды нейкай агульнасправядлівай «сісьцемы», значыцца такога ладу, што даў раду ўсім вялікім і малым жыцьцёвым праблемам, зазірнуў у найглыбейшыя западзіны жыцьцёвай цемры ды ўсё-ўсенькае гарачым сонейкам «сталінскай канстытуцыі» асьвяціў. Адно вунь тая «сісьцема» на помач вялізным танкам, грузавым аўтамашынам і гусянічным чалябінцам мусіла Пракопаву жарэбную кабылу падпрэгчы, пакалечыць і матку і жарабя. У халоднай канюшні яно кволае й дрыжачае цяпер на ногі ледзь-ледзь устане, як п'янае хістаецца, спрабуе хадзіць ды зноў падае.

Пракоп сеў. Ці гэта з гарачыні ў поўнай залі, ці з паднечаньня закруціла ў галаве. Расшпіліў суконку, рукой памацаў грудзі й адчуў як зь вялікага напружаньня прысьпяшыла ход сэрца. А ў залі панавала мёртвая цішыня, стрыманае дыханьне. Пракоп зірнуў на бакі. На яго й гэнага «сісьцемнага» гарлапана за сталом глядзела дзясяткі вачэй. Вельмі душна ў сермязе зрабілася. Сьціскаліся вусны й вочы. Вось-вось набягуць сьлёзы. Чаму ні дадумаўся, ні дагледзіў? Чаму наадрэз не адмовіўся й ня даў кабыле вынасіць? Нахай-бы паскакаў-патэпаў гэты брыда Сымон. Што-б ён зрабіў? А цяпер як кабылу й жарабя

выратуеш? Можа матка й выхадзіць, але як паставіш на ногі роджанага недалугу? Уквэкаўся дый годзе. І ўсяму віной звычайная дурнота. Жаль распіраў Пракопавы грудзі й млоснасьць потам на лбе выступіла. Вялікім намаганьнем стрымліваў сьлёзы.

- Таварышч Бахмач, - прачысьціў горла й ціхім голасам пачаў сельсавецкі фінагент, - прысутствуюшчыя выслушалі вас. Думаю, што сягоньня ня будзім болі задзержывацца на вашым неіспалненьні палан. Я далажу аба ўсім у сільсавет і пушчай з вамі разьбіраюцца. Сьледуюшчыя, - пачаў Скаруповіч чытаць прозьвішчы літоўскіх гаспадароў і працэнты, што зарабілі за вываз дрэва.

- Хачу вас ізьвясьціць, што па зарплату нужна ў сільсавет явіцца. Там заработаныя дзеньгі за вываз дрэва палучыце. А січас, - гэтта Скаруповіч спыніўся, уважна прыгледзеўся прысутным і даўжэй затрымаўся на седзячым сьпераду рыжавусым Захаруку, - хачу ў прымер усім вам паставіць аднаго чалавека, каторы дажа норму піравыпалніл, патаму што вапшчэ выпалніл на сто пяць працэнтаў. Для гэтага чалавека наша народная ўласьць прызначыла прэмію і вапшчэ... Но пака этага самага, пака прэмію пірадам, хачу нескалька слоў аб бальшым значэніі піравыпалнені плана сказаць. Панімаеце, што наша савецкае гасударства ня толька трэбуіць ад людзей чэснага труда для нашага обшчага блага й вапшчэ, но і атнасіцельна вазнагражданіць гэты труд. Таму што, як я вам раньшэ сказаў, наша правіцельства й лічна таварышч Сталін...

Скаруповіч наўмысна спыніўся на прозьвішчы дыктатара. Заля маўчала. Фінагент глытнуў камяк сьліны.

- ...і лічна таварышч Сталін ня раз указывалі й січас указываюць, што бяз труда ня было й ня будзіць атнасіцельнага прагрэсу.

Абтрапанае, нуднае й нястраўнае манатонным голасам падарожнічала з гарляка фінагента, вандравала між чатырох сьценаў і глохла між завязаных пад бароды хусьцінак, сермягаў, кажухоў. Можна было падрамаць і нічога важнага ня страціць аж да моманту, пакуль гэны манатонны голас ня падымецца на ўрачыстую ноту, спаткнецца на перапынках і ажно тады прынясе нешта новае. Гэтак вось і цяпер. Пасьля добрых хвілін дзесяці нуды, фінагентаў голас затрымаўся, гарляк кашлянуў.

- Січас хачу аб'явіць гражданіна, з каторага саветую ўсім браць прымер і вапшчэ... На сто пяць працэнтаў план піравыпаўніў таварышч

Захарук Пётр Паўлавіч!

- Маладзец! - сказаў голасна звычайна маўклівы Аўдолін Тодар.

- Ці-і-іха ты! - сыкнула на яго жонка.

- Стала быць, Пётр Паўлавіч, - прадаўжаў Скаруповіч, - я хачу паблагадарыць вам ад імя сельсавету. І яшчо вапшчэ надзеімся, што ў будушчым тожа будзіце выпаўняць і піравыпаўняць нормы плана й будзеце прымерам усей вашай дзярэўні й вапшчэ...

Гэтта Скаруповіч затрымаўся. Можа воплескаў чакаў. Людзі маўчалі. Фінагент сагнуўся й з-за лавы дастаў скураную сумку. Літоўскія пасьля намагаліся адгадаць ейнае паходжаньне: ці то трафей ад польскай паліцыі, што гэтак хутка з «крэсаў» змыліся, ці ад каго з новых «вызвольнікаў». У гэны момант, калі Скларуповіч сумку адчыняў, вочы ўсіх літоўскіх сьлядзілі ягоныя рукі, пасьля перапаўзьлі на рыльца пляшкі, што вяршочкам з сумкі вызірала. Паволі выцягнутая з сумкі, звычайная літроўка, напоўненая рудой вадкасьцю й заторкнутая коркам трыўмфальна станула ў цэнтры стала.

- Самагонка, мусіць, - сказаў голас ззаду.

- Дурны ты, дзе ты відзіў рудую самагонку, - супярэчыў іншы.

- Можа гэты ханжа Сымон гнаў. Ён-жа спэцкаіць...

Пачуўся сьмех.

Сымон Пятух, мусіць, прыкінуўся, што ня чуў, бо ляніва, як і належалася начальніку ў такую ўрачыстую хвіліну, зірнуў на залю, а пасьля зноў зацягнуўся дымам з папяросы. У гэным часе побач літроўкі зьявілася поўная шэрая пачка карашкоў, а сумка паынулася зноў недзе ззаду на лаве.

- Стала быць, - урачыста абвесьціў сельсавецкі ўраднік, - гасударства прызначыла прэмію, гэта ёсьць адзін літар карасіны й пачку табаку. Пажаласна, палучыце, Пётр Паўлавіч, - паказваючы рукой на прэмію, зьвярнуўся Скаруповіч да Захарука.

На залі цяпер панавала поўная цішыня. Людзі пераглядаліся. Рашчараваньне са зьдзіўленьнем на тварах зьмяшалася. Прэмія быццам на паядынак выклікала, зьдзеквалася гола-бедным, нікчэмным выглядам літроўкі нафтыпобач пачкі танных карашкоў. Людзі пазіралі на Захарука. Той меціў падняцца, азірнуўся на бакі. Пакуль наважыўся, з правага боку выйшаў ягоны рослы й вялы сын Пятро. Не азіраючыся на нікога, прыклыпаў да самага стала, ледзь нагнуўся, прыглядаўся прэміі. Бальшавіцкая нагласьць гэтта асабліва камічна спалучылася зь

недалужнасьцю Захарукова сына. Ён указальным пальцам тыцнуў у прэмію й голасна зьвярнуўся да бацькі:

- Глянь, глянь, тата, на цэлы дзянёчак табе на самакруткі пыхцець будзіць... От ужо-ж і накурышся ды яшчо вечарам будзіць чым у лямпе кнот замачыць. Чаму-ж ні бярэш?

Гэтакая шчырая дзяцюкова спасьцярога выклікала гвалтоўны сьмех у залі. Фінагент Скаруповіч, зьбянтэжаны такой бязглуздай нечаканасьцю, абліўся чырваньню. Збоку скрывіўся твар старшыні камбеду.

- Гэта што за глупасьць? Вапшчэ, хто вас прасіў, як вас зваць!? - дзёрзкім голасам сыкнуў ураднік на Пятра.

Хлапец, быццама яго гадзюка джгнула, адскочыў ад стала й пацiснуў направа ў гушчу народу. Сьмех не спыняўся.

- Так, Пятро, цяперака бацьку ня трэба будзіць у чарзе на золаку тарчэць, пакуль Жыд сельпо адчыніць, - пачуўся ззаду моцны голас, суправоджаны буйным рогатам.

- Будзіць мець болі часу дрэва саюзнай Гірманіі навазіць! - падтрымаў іншы.

Скаруповіч мяняўся на твары колерамі. Відаць было, як дрыжэлі ягоныя рукі. Намагаўся нешта сказаць, пачынаў ад таго «вапшчэ», але жартаўлівыя водклікі з гарамады заглушалі яго. Нарэшце моцна стукнуў па стале, аж прэмія падскочыла.

- Пётр Паўлавіч, забярыце вашу прэмію!

Аглядаючыся на бакі. Захарук устаў з лавы, узяў літар нафты й пачку карашкоў і гэтак павярнуўшыся бокам да ўрадніка, ня ведаў ці дзякаваць ці што дый дзе падзець тую прэмію, аб'ект агульнага рогату.

- Міцінг шчытаю закрытым! - паведаміў фінагент.

- А чаму грошы за работу ні прывёз? - пачулася пытаньне.

- Прыдзіце па грошы ў сільсавет.

- Каб ты ракам хадзіў!

Гэта апошняе прыляцела ззаду.

- Ты знаіш, як зваць гэтых людзей, каторыя тутака сьмешачкі рабілі? - нахіліўся да Пятуха Скаруповіч.

- Га? Што кажаш? - наставіў Сымон вуха.

- Кажу, ці знаіш усіх тых, каторыя гэтта мяне на сьмех паднялі? - паўтарыў фінагент.

У залі стаяў роўны гоман.

- Дык во, каб ні знаў, - адказаў Пятух, - а навошта табе?

- Трэба ім пазакрываць морды й вапшчэ... Волю дасі дык на галаву табе наробяць...

35

Перад сэмафорам спыніўся, некалькі разоў сапнуў і чмыхнуў парай на бакі ды паставіў вялізны слуп дыму проста ўверх грузны, тупалобы, зь вялікай чырвонай зоркай сьпераду, паравоз. Панакрываліся брызентам на плятформах ззаду ваенныя цацы, што гэтта, мусіць, на «гнюсную Фінляндзію» праяжджалі.

Перад закрытм пераездам затрымалася чарада хурманак, наладаваных «нарыхтоўкамі». Апусьціўшы галовы, дышачы парай з абмерзлых ноздраў, дрыжэлі ад марозу ў ваглоблях коні. У пацатых мяшкох на развалках ляжала «збожжа-дзяржаве», сядзелі захутаныя ў кажухі, сярмягі, абутыя ў лапці ці валёнкі, з абмерзлымі вусамі дзядзькі.

Зь лесу цягнікоў гацкай станцыі паволі, чмышачы густым сінявата-чорным дымам і густой парай валачыла вялізную сям'ю вагонаў дужая лёкаматыва. Хуткасьць брала паволі. Пералезла пераз пераезд, а за ёю сьпяшылі даўгія наладаваныя бярозавым і дубовым бярвеньнем плятформы. Дрэва ў «саюзную Гірманію» скончылася й за ім ішлі зачыненыя таварныя вагоны, дзе спачывала «збожжа - дзяржаве, мяса - дзяржаве, яйкі - дзяржаве, усялякае дабро - дзяржаве» ды іншыя «нарыхтоўкі».

Калі абарваўся хвост таго, што паджгаў у «саюзную Гірманію», рушыў гэты з ваеннымі цацамі ў «гнюсную Фінляндзію». Ужо пасьля яго падняліся запоры пераезду і, напінаючыся ў аглоблях развалак, цягнулі «нарыхтоўкі дзяржаве» коні. Далей за пераездам у вялікіх, пачарнелых ад сажы сьценах, дымячы з трох комінаў, чыгуначнае дэпо грукала сваім сьлёсарска-рамонтным жыцьцём. На страсе вялізнай майстэрні пачарнеў ад гары сьнег. Халодным сьвятлом аблівала зьверху мястэчка зімовае сонца, зьзялі на дарозе гладкія каляіны ад палозьзя саняў, наляталі вераб'і на парассыпаную па дарозе пацяруху. Моцна трымаў у сваіх учэпістых кіпцях замезлую зямлю мароз.

Пры самым вакне, у перапоўненай клясе сядзеў Янук. Ён ня бачыў таго, што за вакном адбывалася. Разам з дырэктарам Якаўлевым і вучнямі двух клясаў прыглядаўся як рыхтуе паўстаньне, рукамі рымскіх гладзіятараў выбірае зброю, узважвае магчымасьці перамогі над тыранамі з форуму вялікі Спартак.

На стале перад Якаўлевым ляжала таўстая, у шэрых палатняных вокладках, кніга. Дырэктар чытаў. Ня было ў праграме пятае клясы дырэктаравай лекцыі. Вучыў ён геаграфію й гісторыю ў трох старэйшых клясах. Сяньня занямог, мусіць, стары матэматык і таму дырэктар загадаў паклікаць пяцікласьнікаў у шостую клясу, адкіннуў нармальную праграму і ўзяўся чытаць.

Танклявы, сухі ў твары, напалову ўжо лысы, малады дырэктар мог-бы прыкінуцца старэйшым студэнтам, ці ўраднікам, калі-б ня ведаючы яго, дзе між людзей сустрэлі. Надзіва дзяцінны з выгляду твар ня ўзбуджаў з боку якое-небудзь пашаны, а хутчэй да панібрацтва спанукаў. Гэта да таго часу, пакуль дырэктар рот адчыніў. Прыпадковы панібрацец адразу насьцярожваўся, рабіў хуткую пераацэнку чалавека, у каторага напалову лысай галаве зь дзяцінным тварам мусіў мясьціцца няштодзённы розум.

Прадметы, выкладаныя дырэктарам, даваліся вучням чысьцюсенькай насалодай. У клясу настаўнік уваходзіў борздым, спружыністым крокам і мамантальна аціхалі вучні. Скупа ўсьміхнуўшыся. Якаўлеў чытаў дзёньнік прысутнасьці, выклікаў аднаго ці двух для праверкі матар'ялу ды, не марудзячы, роўным вольным крокам пачынаў вандраваць перад фронтам лавак.

- Амазонка, как вам всем ізвестно, пересекает контінент Южной Америкі с запада на восток, - пачынаў роўны нізкі бас.

Вучні не спасьцераглі, калі пераносіліся ў флёру й фаўну бразылійскай джунглі, ці іншым разам слухалі пра паўжабракоў з-над сіняга Нілу. Суправоджаныя красамоўствам дырэктара, валачыліся Ганібалавы сланы праз засыпаныя сьнегам, небясьпечныя Альпы, тапіліся пад напорам Ганібалавых вояў Рымляне ў Тразіменскім возеры, або квяліў далікатны слых рымскіх патрыцыяў шурпаты голас Нэрона. Пасьля дырэктаравай лекцыі мала хто пацеў над гісторыяй ці геаграфіяй дома, хіба адно каб затрымаць у галаве галоўныя даты й факты.

Сяньня нешта зусім неспадзяванае сталася. З вуснаў таленавітага настаўніка, каторага ніхто з вучняў ня чуў, каб калі беларускай мовай карыстаўся, паплыла прыгожая, прывабная, як крыніца чыстая мова бацькоў вучняў гэтых.

- Вследствіе того, что заболел Іван Нікіфоровіч, собрал я здесь два класса, но так как нормальной програмы не могу преподавать, предлагаю вам чтеніе із рімской історіі, - пачаў на ўступ дырэктар. Далей коратка й зьвязна паясьніў пра пэрыяд, да якога адносілася чытаньне, дзеючых людзей і ажно тады адчыніў таўставатую, шэрую кнігу.

Шматколерным багацьцем паплыла з вуснаў Якаўлева вялікая й цудоўная беларуская мова. Яна бруілася вясёлкамі вялікае трывогі рымскага канфлікту, вуснамі патрыцыяў клікала на помач розных вялікіх і малых багоў, выгіналася й цадзілася мілагучнасьцю людзей з-над Нёмана, Дзьвіны, Дняпра, малюючы вялікую драму магутнага, адыйшоўшага ў гістарычныя кнігі й памятнікі краю. Дырэктар замяніўся ў мастака, што быццам насалоджваўся-забаўляўся сьпеўнасьцю, гібамі й перагібамі моўнае тканіны паняволенага народу. Голас то зьніжаўся, запавольваў, сьціхаў, гладзіў-няньчыў, ладзіў прыгожую казку-нябыліцу, то зноў з мэтанакіраваным імпэтам уздымаўся на вышыні, грымеў гневам, пярунамі, маланкамі, ці зноў рагатаў, прасіў патолі, супакою. Захапляла самая шырыня дырэктаравай танацыі, разьмеркаваньне перапынкаў. Калі слухач ня ведаў тайніцаў майстэрства мастацкага чытаньня, дык ня гэтта месца й час іх разгадваць. Сакавітая рака зь Якаўлевых вуснаў ашаламляла, брала слухача ў палон цудоўнага моўнага багацьця, ангажавала, валачыла, адрывала ад рэальнага й на лёгкіх крыльлях пераносіла ў іншае, няменш праўдзівае й цікавае.

Быццам заварожаны-зачараваны, разявіў шырака ад зьдзіўленьня рот і забыўся пра суседку Дуню Янук. Калі дырэктар пачаў чытаць, Бахмач зь няўцямнасьцю на твары зірнуў на дзяўчыну й іншых вучняў. Але чараўніца мова падхапіла, завалодала, панесла.

Кагадзе, пасьля лекцыяў пайшоў Янук зь Лявонам Загорным у мясцовую краму купіць патрэбныя школьныя падручнікі. Кнігі былі, але не ў расейскай, а ў беларускай мове. Пакінуўшы краму з пустымі рукамі, зайшліся хлопцы да Лявонавага дзядзькі, здольнага агранома, што на краю Гацяў меў вялікую прыгожую хату ды надта ўзорны сад і

агарод. Апроч добрай і даходнай аграноміі, маладжавы Лявонаў дзядзька ганарыўся й вялікай бібліятэкай, у якой амаль поўнае багацьце беларускіх выданьняў нашаніўскага й акупацыйна-польскага пэрыяду.

Прывіталіся. Дзядзька папрасіў вучняў сесьці й расказаць навіны.

- Ды от нічога такога, - гаварыў Лявон, - хадзілі ў краму падручнікі купляць.

- Ну й што, купілі?

- Ды дзе там... Такіх, як нам трэба, паруску німа, атолька розныя практыкаваньні ды выкрыўляньні, - скрывіў вусны Лявон. - Ня якога чорта нам такія.

- Біларускія, значыцца? - хацеў упэўніцца аграном.

- Ага, ну а якія-ж... - адказаў Лявон.

- Эгэээ, брацец ты мой! - успыхнуў перад хлопцамі аграном. - Смаркач ты, малакасос нікчэмны, бутылка цёмная, на свае роднае ўжо пачынаеш пляваць, ні разабраўшыся яшчо што і ў чым! Заміж таго, каб зацікавіцца, распытацца, сваё палюбіць і шанаваць, дык ты ўжо крывішся, пад ногі таптаць хочаш?

Можа каб той дзядзька добрым ладам, ласкава вытлумачыў, параіў, можа тады вочы адкрыў-бы. Але-ж не. Як-бы ядавітай гадзюкай укушаны, ён тросься з гневу, бічаваў пляменьніка кленічамі, пагражаў, зьдзекваўся. Можа яно было й рацыянальна, можа ў самога дзядзькі гаркога даўно на сэрцы накіпела. Хто-ж яго ведаў... Адно тады, - прыгадаў пасьля Бахмач, - было сорамна й крыўдна. Там, дзе маглі-б адчыніцца дзьверы ў родны сьвет, пляснула вялікая аплявуха.

На розных сходах чужнікі карысталіся расейшчынай, дый навет свае ўчэпістыя басякі з «народнае ўлады» калечылі чужое й свайго цураліся. Мусіць, ці так трэба было, ці мода такая. Дый ці думаў пра тое паважна Янук, або каторы іншы школьны юнак. Чужая моўная плынь заваліла старую мяжу і ўварвалася ў краіну разам з тымі магутнымі танкамі ды абшмуляным хамутамі й стрэльбамі на вяровачках зь пянькі. Тыя зь вёскі, што былі некалі ў Расеі, трымалі ў пашане мову Піцера, бо там была крыніца й сілы, і нейкага бліжэй нявызначанага палітычнага розуму. Сваё-ж жыло ў песьнях, казках і прыказках... Вялікая, багатая й цудоўная, чужнікамі гвалчаная мова, што цяпер ашаламляла свайміколерамі зь Якаўлевых вуснаў, жыла й цьвіла як шматгранная ў нязьлічоных колерах прырода. Апляваная

чужнікамі, ганьбаваная мясцовымі недавукамі, яна чакала свайго новага прыходу. І вось дзе яна, незраўнаная прыгажуня, вуснамі таленавітага «васточніка», добрага настаўніка, выдатнага чытальніка-мастака нарэшце шырака адчыніла дзьверы, загудзела-загаманіла, забавіла-зачаравала. Мо й сам Якаўлеў ня ведаў што робіць.

Сэнс надзвычайнага адкрыцьця ледзь не ашаламіў Янука. Першае зьдзіўленьне ўступіла месца надзвычайнаму захапленьню, а пасьля ўжо й памяркоўнаму, мо яшчэ крыху наіўнаму разважаньню. «Дык от якая яна пекная!» - думаў Янук. - «Саўсім нягоршая, а можа яшчо й лепшая, чым расейская. Глянь, як ажылі старыя Рымляне. І гэта ўсё панашаму. А калі гэта так, дык чаму ўсе казалі, што польская й маскоўская ёсьціка пяknейшыя? Ніпраўда, мусіць...»

У Гацкай сямігодцы беларуская мова была адно абавязковым прадметам. Была й родная літаратура, а ўсё іншае выкладалі парасейску. Мову й літаратуру беларускую надта суха й схэматычна выкладаў завуч Перабораў, чалавек, відаць, здольны. Адно, што насядаў ён на рознае аканьне й яканьне, дзеканьне й цеканьне. «у»кароткае, склоны, лады й іншае. Маючы, мусіць, праграмны падыход, наводля прынцыпу «абы збыць». Перабораў, ведама-ж, трымаў вучняў воддаль ад цудоўных скарбаў і вялікага мастацкага патэнцыялу роднае мовы. У ягоных вуснах і Купала, і Колас, і Зьмітрок Бядуля гулі суха казённа, калолі асотам, адштурхоўвалі, прыносілі нейкі жвіраваты, штучны смак. Націск на правілы набліжаў мову да матэматыкі, шаблённыя пераказы апвяданьняў ці іншых мастацкіх твораў спыняліся на зафіксаваных праграмных вэрсіях, што пасьля ўсьміхаліся пяцёркамі, крывіліся тройкамі, або зьдзекваліся двойкамі ў вучнёўскіх дзёньніках. Завуч Перабораў чытаў неяк штучна, быццам чужынец, у найлепшым выпадку як чалавек, якому прадмет быў прынамся ў сярэдняй ступені абыякавы. Калі гэта ня была казёншчына, - а сам завуч бяздушным настаўнікам-рамесьнікам, - дык што гэта тады было?

Наўмысна ці нясьведама, прыпадкова ці з намерам дырэктар узяў вучняў за рукі, узьвёў на вышыню й адчыніў перад імі магутную, вечна жывую, бурлівую й цудоўную стыхію. Працэс адбыўся незаўважна, прост-напраст арганічна, бязь ніякае прынукі. Ня быў-бы дырэктар красамоўным і таленавітым настаўнікам, ня любіў-бы мовы Купалы, Коласа й Багдановіча, не заваражыў-бы чараўнічай сілай

ейнай сваіх вучняў, прынамся не разбудзіў-бы вялікага й чароўнага сьвету ў Януковым сэрцы.

- Што ты думаеш, Дуня? - спытаў Янук Макатунішку на перапынку.

- Думаю пра што?

- Пра Якаўлева чытаньне.

- Добра чытаіць, лепі як ты ці я, - усьміхнулася дзяўчына.

- І гэта ўсё? - спытаў рашчараваны Янук.

- Ну а што яшчо?

- А тое, што пабіларуску чытаў, от... тое, што нам здавалася, што можа ён пабіларуску й ня ўмеіць, а ён во глядзі як, дый яшчо...

Янук затрымаўся, ня ведаў як выказацца.

- Яшчо што? - таўханула дзяўчына.

- Я сам, знаіш, слухаў і проста сваім вушам ня верыў. Мне здавалася, што ёсьць пекныя мовы, алі толька ні наша... Ну можа руская, польская ці французкая... от як я думаў. Цяпер слухаў я Якаўлева ды проста анямеў. Дзіва дзіўнае! Ці чула ты такое нешта пекнае, як наша гаворка? Як яна гучыць, ляціць, захапляіць, піраліваецца як чыстая крыніца. Кажу табе: мусіць гэты Якаўлеў вялікі штукар у чытаньні бо так-жа пекна, так пекна ў яго выходзіць, што я ніколі не паверыў-бы...

- Так, падумаўшы дык ты праўду кажаш, - згадзілася дзяўчына. - Алі-ж гэта для таго, хто сам любіць чытаньнем забаўляцца, мову любіць. Мне то яно ня вельмі. Ну я люблю гэта, ні магу сказаць, што не, алі ня тое, каб я за моўнай пікнатой прападала...

- Табе, мусіць, толька зёлкі ды краскі, - усьміхнуўся Янук.

- Так, гэта маё. Алі-ж знаеш, што я й да навукі ня зломак...

Янук мяркаваў, што альбо лепш спыніць гаворку, або зьмяніць тэму. Так ці накш, пытаньне прыгажосьці ці вялікасьці мовы, тое, што сяньня чуў і пра што думаў, гэта адно вяршок ледзяной гары. Зачапі вяршок, зацікаўся цэлай гарой, дык тады трэба пад ваду лезьці, шмат чаго іншага заглыбляць.

36

Каторыя з вас ведалі Пракопа Бахмача ў іншыя часы, - прыбітага, згорбленага, церпячага, - не пазналі-б у гэну тыравеньскую раніцу, калі зь сяўнёй на грудзях новую ніву сеяў. Ніва, як вам ужо ведама, некалі ліпавіцкаму пану належала, а пры падзеле зямлі Бахмачу трапіла.

Павольна і ўрачыста ступаў па чорнай ральлі Янукоў бацька, буйнае, пазычанае ў Сявенькі зерне жменяй рассыпаў. І крок памяркоўны, і рукі размах налева й направа, і сама постаць цяпер выпрастаная, і гаспадарлівыя вочы, здавалася, за кажным зярняткам сачылі. Гэтак сейбіт Пракоп, спадзяваньнямі на лепшае перапоўнены, ажыў, уздужэў і быццам вясна навокал, сокамі наліваўся. Уверсе, пад ласкавым сонцам гаманілі песьнямі жаўранкі, на доктаравых клёнах высьвіствалі шпакі, у бары канцэрт трымалі іншыя птушкі, а на Захаруковай ліпе, дзе гаспадар паправіў пашкоджаную зімой бусьлянку, клекаталі буслы. Сьляды лапцей, падшытых гумай зь нейкай знойдзенай на абочыне дарогі бальшавіцкай шыны, аставаліся на пульхнай, сьвежа пабаранаванай, ральлі. Побач, на адмераных дзялках, сеялі іншыя вяскоўцы. Даўшы адпачыць кабыле, Янук рушыў з бараной зь верхняга кута. На сьвежа забаранаваную ральлю наляталі галкі.

У пазыкі па насеньне, апроч Пракопа, прыйшло і з паўтузіна іншых вяскоўцаў. «Граб награбленае» вымяла панскія сьвіраны. Зерне паехала ў «ніаб'ятную», пра якую розныя дзівы ў вадзін голас апавядалі чырвоныя жаўнеры. Калі мясцовыя сяляне й не спадзяваліся, можа, што гэныя шчасьлівыя калгасы з-за ўчарашняй мяжы памогуць ім насеньнем, дык, бязумоўна, мяркавалі, што ёсьць запасы ў панскіх і асадніцкіх сьвіранах і ўсім павінна іх хапіць. Ды «нарыхтоўкі» ня толькі панскае павымяталі, але бальшыню дабра і з багацейшых сялян выцягалі. Дык калі пасьля «нарыхтовак» вялікай народна-ўладавай фігай вырас усім на паказ гэтак званы семянны фонд, людзі ў пазыкі да сваіх пайшлі. Сявенька, - чалавек натуры добрай і спагадлівай, шмат каму пазычаў, бо сваей зямлі сам абсеяць ня мог, а наймы скончыліся. Некаторыя хадзілі ў пазыкі да Косьцікавага бацькі Бурака, але гэны, празь меру прагавіты, так разьбедаваўся, што, здавалася, на яго беднасьць трэба было-б цэлай вёсцы ссыпку рабіць. Тымчасам у Паўлюковым гумне, у тым катуху, куды ён яшчэ зімою бальшыню дабра ў новых мяхох перацягнуў і прыкрыў, каб ня бачыла непакліканае вока, сыцелі цяпер пацукі й мышы.

Здавалася, што пасьля сібірскай зімы зямля й сонца натужвалі ўсе свае жыцьцядайныя сілы, каб адрабіць і паправіць тое, што зглуміў мароз. Людзі спачатку варажылі на двое, але калі поўнасьцю азеляніліся лясы, прыбраўся ў лістоту гігант Архіп, за гумнамі зьдзекліва чарнелі сады. Хіба адно сьляпому ня відаць было, што мароз непапраўную шкоду прынёс. Пракоп з жахам спасьцярог, што вымерзла бальшыня яго пчол, а тых пару сем'яў, што выжылі, падкармліваць трэба было. Са сьлязьмі на вачох злосна вылаяў Бахмач таго маскаля-перапішчыка, што сьпісаў ня толькі тады яшчэ поўныя, але й пустыя вульлі.

Трымалася цёплая пагода, надыходзіла лета. Прагожа ўзбуйнела на Пракопавай ліпавіцкай дзялцы пшаніца, весяліўся бульбоўнік, усьміхаўся лён, авёс і ячмень. І часта хадзіў любавацца-цешыцца новым пярэстым хутарам Бахмач. Хадзіў да таго часу, пакуль ня прыйшлі падатковыя наказы. Прынёс іх у хату цяпер малагаманлівы Лявон Шпунт. Яго й Косьціка недзе пасьля Вялікадня адпусьцілі. Ромкаў гаспадар месяцы два ў Вялейцы на нейкіх, як казалі, важных курсах затрымаўся. Вярнуўшыся, працаваў у раёне ні то сакратаром, ніто кнігаводам. Казалі, што неўзабаве арганізацыяй калгасаў маніцца заняцца. Лявон-жа ў гацкім сельсавеце служыў.

Пасьля атрыманьня наказаў, пачаліся ў Літоўцах абмеркаваньні падаткаў. Справа ў тым, што вышыня іх перарасла ўгадкі найбольш сьмелых фантазёраў. Ужо нашто асьцерагаўся каб лішняга не сказаць, пасьля арышту ў Гацкім НКВД Антось Дзяркач, дый той цяпер рот адчыніў.

- Скажу вам, братцы, чаму цяперака па дваццаць пудоў жыта ад актара плаціць будзеце, - тлумачыў Антось. - Бальшавікі як загадаюць, каб яна вырасла ды ўрадзіла, дык і вырасьціць, і ўродзіць, ня дзе яно дзенецца. Так як яно ў іх там за граніцай усё вырастаіць. Ня чулі, можа? Гэта-ж во прыйшоў раз адзін баец да мужыка. Разгаварыліся. Той яму сваімі пчоламі захацеў пахваліцца, дык баец і кажа: - Знаеце што? От у нас пчолы, бальшушчыя, як у вас вераб'і, ні раўнуюючы! Мужык разявіў рот і думаіць сабе, што як гэта такія вялікія пчолы могуць быць... Нячуванае... Ён і пытаіцца байца: - Ну скажыце, пажаласна, калі ў вас пчолы такія вялікія, дык як яны ў вуль праз такую малую лётку ўлезуць? А баец яму ў вадказ: - Чудак ты, мілый мой, канешня што ўлезуць. Пішчаць да лезуць!

На зьмярканьні ў нядзелю дзеці ганяліся за травеньскімі хрушчамі, што насядалі на дзьве пышныя рабіны перад Алесявай хатай. У ліпавіцкім бары голасна кукавала зязюля. Мужчыны сядзелі на лавачцы ля тыну й гаварылі.

- І ўсе так гавораць, што гэткіх падаткаў, ці, як яны называюць, налогаў ня будзіць як выплаціць. Хоць ты ўсё аддай, а рады не дасі. Як быць? - казаў Алесь.

- І навыдумлялі-ж... то пазямельныя, то падаходныя, то іншыя чартоўскія, а цяперака яшчо нейкі кульналог, а грашовыя наверх, мусіць. Што гэта робіцца? - мяркаваў Пракоп.

- Я гэттака, швагрок, падазраю нешта, - сказаў Алесь.

- Ну што?

- Ты-ж толька сваім здаровым розумам падумай: ці-ж яны ні знаюць, што нікому такія падаткі ні пад сілу? А калі так, дык навошта гэтак робіцца?

- Кажы, што думаеш, - спанукаў Пракоп.

- Памоему яно ўсё з думкай робіцца. Калі людзі ня будуць магчы выплаціць, - а гэта саўсім ясна, што ніхто рады ні дасьць, - дык тады пачнуць кідаць тыя зямельныя надзелы з панскага. Праўда, ці не?

- Можа, - буркнуў Пракоп.

- Згода. Людзі, значыцца, пачнуць адмахвацца ад зямлі як чорт ад вады сьвянцонай. Бальшавікі тады скажуць, што, маўляў, зямлі вам далі колькі вы хацелі, а вы ня ўмелі яе апрацаваць і падаткаў не плаціце. Значыцца, гледячы бальшавіцкімі вачамі, дзе прычына?

- Ну як табе сказаць... ці ня людзі вінаватыя...

- Во, во, так і скажуць. Ну а калі так, дык да чаго гэта вядзець? - працягваў Алесь.

- Да калхозаў, думаеш?

- Ну а да чаго-ж, калі ні да калхозаў? Значыцца, скажуць, што вы гаспадарыць ня ўмееце, дык хадзіце ў калхозы, мы вас, братцы, навучым. От як! - заключыў Алесь.

- Нячыстая сіла! - сказаў злосна Пракоп.

- Няўжо-ж чыстая... От возьмуць цябе ў свае рукі й ня пікніш, браціц. Хоцькі-няхоцькі, а ў калхоз пойдзіш, як мілінькі.

Пракоп пацерабіў за шыяй і доўга, упарта глядзеў швагру ў вочы. У ліпавіцкім бары спыніла сваё кукаваньне зязюля.

- Верыць ня хочацца. Дзе-ж іх галовы? Як у людзей ня будзіць нічога, дык і ў іх тады фіга будзіць начаваць...

- Гэта так, на розум бяручы дык трэба пагадзіцца, - згадзіўся Алесь, - што калі будзіць у людзей, дык будзіць і ў дзіржавы. Алі-ж тутака вер ты гэтаму чорту й ня вер. От паглядзі ўжо як пачалі гаспадарыць. Абяцалі насеньня даць. А далі?

- Ні было чаго, мусіць.

- А тое, што пазабіралі з маёнткаў, ад асаднікаў, дык дзе яно падзелася.

- Мусіць сабе ў свой саюз завязьлі.

- Ну дык от, значыцца... Калі ў іх тамака так добра, такі рай, як кажуць, усяго ўволю, дык нашто ім наша? Мусіць хрэн там у іх, галота адна, во...

37

Дападлівыя й пранырлівыя прасачылі як першапачатковая лагодная ўсьмешка «народнае ўлады» зьмянілася на грымасу, а ўжо пасьля ці раз сьціналіся вусны й шчэрыліся зубы. Працавіты селянін літоўскі моцна натужваў свае мускулы, шчодрым потам паліваў сваю дзялку. Вера ў даброты людзкія й боскія трымала верх над кашмарам прынесенай чужнікамі злыбяды й таму салодкім быў пот і стомленасьць на новай зямлі.

- Як добра папрацуім і ўродзіць, дасьць Бог, дык будзіць і ім, і нам, - казаў ці адзін узмужнелы гаспадар.

- Нашто-ж тады было браць зямлю, каб на ей ні папрацаваць? А як забяруць усё, дык хто тады задарам працаваць для іх будзіць? - мяркаваў іншы.

Зьвезенае збожжа ці то саматугам, ці ў супалку ў гумнах малацілі. І ня ўсьпелі каторыя зьвярнуць яшчэ пазычанага насеньня, як шырака адчынілася прагавітая лапа «вызвольніка». Львіная доля сабранага плёну ў арганізаваных карагодах хурманак, абавязкова з чырвоным сьцягам на пярэдняй, паехала на дзяржаўныя ссыпныя пункты. Лёзунгі над хурманкамі абвяшчалі: «Датэрмінова выканаем план нарыхтовак дзяржаве!», «Збожжа дзяржаве!», «Да здравствует велікій...»

На ссыпным пункце ў Гацях маскаль з васпаватым тварам і чырвоным носам выдаваў адпаведныя квіты, дзе апроч колькасьці прывезенага збожжа напісана было й па колькі «руб» плацілі за яго ў канторы сельсавету. Параўнаўшы цану, якую дзяржава плаціла за збожжа, з той цаной, што тая-ж самая дзяржава брала за гатовы хлеб у савім «сельпо», людзям зь няўцямнасьці прапорцыі цэнаў адбірала мову. Адылі, калі парадзелі на дарогах хурманкі з пузатымі зрэбнымі й кужэльнымі мяхамій чырвонымі сьцягамі ды лёзунгамі, а падаўжэлі на чыгунках цягнікі, што валаклі народнае дабро ў «саюзную Гірманію», узрастаў на вёсках ціск, каб аддавалі «лішкі мяса, збожжа, яек, малака, мёду й іншага дзяржаве»

Зьбянтэжаныя бальшавіцкаю нагласьцю, спрацаваныя сяляне сьпяшылі цяпер у сельсавет, дзе на праміласьць боскую прасілі, каб забралі назад дараваную ім зямлю. «Народная ўласьць», каторая, здавалася, ад самага памятнага дня «вызваленьня» мела адну мэту свайго існаваньня, - напярэймы бегла дапамагаць сялянам, - цяпер быццам зьдзічэла.

Дападлівыя й пранырлівыя спанатрылі, што баромэтрам новых парадкаў быў ня хто іншы, як свае-ж собскія атожалкі, Сабакевіч і Шпунт, перадусім першы.

- Глядзіце на Ромкавага гаспадара. Як ён галаву нізка дзержыць, дык нам лепі будзіць, а як паднімаіць яе дык нам тады хоць ты бакамі рабі, - гаварыў, аглядаючыся праз плячо, Антось Дзяркач.

У той час, калі валачылі на дарогах «нарыхтоўкі дзяржаве», высака трымаў Сабакевіч Косьцік сваю галаву. У вадзін вечар на твары Косьцікавага бацькі Паўлюка загаспадарылі сьвежыя сінякі. Таленавіты сын прывёў да бацькавае клеці вызначаныя сельсаветам хурманкі, што забралі «лішкі збожжа дзяржаве».

Наконт крыку й ляманту, што адбываўся пасьля ў Паўлюковай хаце, дый наконт яўнага Косьцікавага доказу адданасьці ўладзе, а не свайму бацьку, доўга ня сьціхалі Літоўцы. І ўжо тады, робячы выснавы, нейкі нядошлы патрыёт былай «моцарствовай» заўважыў: - Казалі Палякі, калі іх вывозілі, каб ня цешыліся зь іхнай бяды. І праўда. Паглядзіце навакол сябе: калі так сын бацьку робіць, дык чакай чалавек дабра якога...

Позная восень назаляла зяблым дажджом, нізкімі хмарамі, абрыдзелымі ўраднікамі, палітрукамі, доўгімі сходамі ў школе. На

сходах, каторыя чамусьці бальшавікі называлі «міцінгамі», як правіла, насамперш прыгадваў «сісьцему» ды чытаў лісту падаткаў, культналогаў, розных «лішак», што мясцовыя сяляне вінаваты былі дзяржаве, ведамы нам фінагент Скарутовіч. Уступ гэткі можна было назваць зьмякчэньнем, або зацьвярдзеньнем прысутных, у залежнасьці зь якога боку на гэта глядзець. Дзяржава, што звычайна раскашэльвалася за сталом «праўленьня» ў асобах фінагента Скаруповіча, Шпунта, Сабакевіча дый яшчэ аднаго прадстаўніка зь сельсавету ці раёну, уважала сход зьмякчэньнем кандыдатаў на вяршыню савецкага дабрабыту, - у калгас. У галовах бальшыні літоўскіх людзей, лік якіх на сходах паступова малеў, адбываўся працэс супрацьлеглы пажаданаму ўладамі.

Зазімак сыпнуў сьвежым, дробным сьнегам. Дагледзеўшы сваю сьціплую гаспадарку, Пракоп прычыніў вароты ў гумно, думаў, што на зіму варта было-б сабаку мець. Калі пойдзе сьцюжа наводля леташняй, могуць падкапацца пад хлеў ваўкі й выцягнуць дзьве авечкі, што на расплод трымаў. Задуманы, пасьпяшыў у хату, дзе Мікола сьнеданьне рыхтаваў. Паволі выцер за дзьвярмі боты, увайшоўшы ў хату ўзяўся рукі мыць.

- Зіма ўжо, мусіць, возьміцца, - сказаў.

Мікола зірнуў на бацьку, дастаў зь печы аладкі, ўзяўся падаваць на стол, ля якога сядзеў Янук.

- Паедзіш, тата, сёлета ў Пірасечана? - спытаў малодшы Бахмач.

Бацька няўцямна зірнуў на сыма.

- Ты што, кепікі робіш зь мяне? На кім гэта паеду?

У бацькавым голасе прасмыкнула нотка горычы, прыгадалася зьняважлівае паніжэньне на тым сходзе, дзе Захаруку так званую прэмію далі. Кот мяўкаў пад сталом, калі Бахмачы ўзяліся спажываць аладкі з мачанкаю. У гэны момант пачуліся за дзьвярмі крокі.

- А гэта-ж хто так рана?

Адчыніліся дзьверы й на парозе зьявіўся Косьцік Сабакевіч. Апрануты ў чырвоны, вышываны нацыянальнымі ўзорамі сьпераду кажушок, сінія савецкія галіфэ порткі, чорную шапку астраханку, бліскучыя хромавыя боцікі, дзяцюк высака трымаў галаву й глядзеў проста ў вочы. Адно хуткае й зыркае вока магло спасьцерагчы, што адсутнічаў у Косьцікавых шэрых вачох зласьлівы аганёк.

- Здароў, Пракоп, Мікола, Янук! - прывітаўся голасна. - Можна зайсьці?

Гучэла гэта ніякавата. Груба-шурпаты голас прызвычаіўся загадваць і не спадарожнічала яму лагоднасьць. Пракоп глядзеў на арганізатара калгасаў зь няўцямнасьцю, аладка з мачанкай спынілася на паўдарозе ў рот. Зьбянтэжаныя сыны пазіралі то на бацьку, то на Косьціка.

- Ды ўжо-ж заходзь, - адказаў Пракоп.

- Пекных сыноў маіш, Пракоп, - сказаў Сабакевіч, сядаючы воддаль ад стала на зэдліку ля сьцяны.

Працэс спажываньня аладак зноў спыніўся на пару часінаў. Сыны зірнуллі на бацьку, пасьля на Косьціка. Пракоп-жа адно пазіраў на прыйшоўшага.

- Прабач во, што німа чым пачаставаць, - сказаў Пракоп.

- Нічога, дзякую, я заўтракаў, - адказаў дзяцюк.

- Калі, гэта самае, ходзіш за якімі лішкамі, ці тым, - як яго чэрці завуць? - кулем, ці яшчо якой трасцай, дык можаш мой парог мінуць, бо нічога ў мяне німа. Калі-ж...

- Да нет, Пракоп, я не за тым. От пабяседаваць зайшоўся да толька таво, - паясьніў Сабакевіч.

Цяжка было веры даць. Праз голас прабівалася лагоднасьць, а на твары са шрамам на лбе прасмыкнула нешта наводля зычлівае ўсьмешкі. Адсутнічала казённае «таварышч». Пакуль Ромкаў гаспадар ступіў на парог, за сталом панавала лёгкая й непасьпешлівая вольнасьць, лагоднасьць. Гэта быў той пэрыяд дня, калі чалавек зрабіўшы першы крок у гаспадарцы, спыняецца й бязь ніякае прынукі разважае пра наступнае. Сабакевічава прысутнасьць, загадкавасьць ягоных адносінаў, таго цяжарнага «пабяседаваць», нагальванізавала Бахмачову сям'ю й напружаньне перайшло аж на спажываньне аладак. Кот голасна замяўкаў пад сталом, пацёрся аб Міколаву нагу й хлапец злосна кінуў у яго аладкай.

- Адчапіся во! - сыкнуў.

Кот пачаў есьці аладку ля сьцяны.

- Пекнага ката маіце, - сказаў Косьцік.

На тварах Бахмачоў зьявілася зьдзіўленьне. Перш Косьцік хваліў хлопцаў, цяпер-жа ката. А што далей?

- Ну што чуваць, Пракоп? - прыязна, з выразным намаганьнем гаварыў Сабакевіч.

- Нічога от, сам знаіш, - буркнуў Пракоп, спадылба пазіраючы на Косьціка. Напокуці нямым выклікам вісеў абраз Сьвятой Прадславы Апрасіньні з пабітым шклом.

- Здароўе як? - пытаўся далей Сабакевіч.

- Эт... дзяржуся, - неахвотна адказаў Бахмач.

Наступіла доўгае й нязручнае маўчаньне. Пракопу здавалася, што Косьцік намагаўся нейкім чынам да яго ў ласку ўбіцца. Калі так, дык ён, Пракоп, быў Сабакевічу патрэбны й хоць вялікая цікавасьць спанукала Бахмача, каб памагчы Косьціку разьвязаць язык, прыгадаўшы ранейшае, насьцярожыўся й сачыў.

- Зайшоў-жа я во, панімаіш, праведаць што случылась, чаму на міцінгу ня быў, - сказаў Сабакевіч.

Сьнеданьне кончылася. Бахмачы сядзелі ля стала й ніхто нікуды не сьпяшыўся. Пракоп аблізаў вусны, забаўляўся з вусамі ды чакаў што далей будзе гаварыць Сабакевіч.

- Панімаіш... канечня нібальшая біда, што ня быў, ну ўсяк бываіць, случай які то...

Косьцік спыніўся, мяркаваў.

- Ці гэта так важна, што я ня быў? - азваўся Пракоп. - Бізь мяне ні абыйшлося тамака?

Сабакевіч падумаў, уважна зірнуў Пракопу ў вочы.

- Я-б сказаў, очынь важна. Сам знаіш: калхоз нам у дзярэўні нужна залажыць. Біз калхоза, - сам відзіш, - людзі рады ні дадуць. Хацелі зямлю. Наце вам, дала савецкая ўласьць. Ну й што пасьля таго? Сам знаіш, дажа налогаў гасударству ня могуць уплаціць. А ў калхозе пра налогі ня трэба будзіць і думаць.

- А хто-ж іх заплаціць? - ціха спытаў Пракоп.

- Ну як гэта хто? - крыўдным голасам адказаў Сабакевіч. - Опшчая гэта ўсё, панімаіш, стала быць аб налогах нечага забоціцца. Калхоз налогі заплоціць.

На языку ў Пракопа вісела ўжо наступнае пытаньне, але стрымаўся. Ня верыў-жа ён, што Косьцік прыйшоў у хату яго, ласкавын і дабразычлівым намагаўся быць адно таму, каб пра даброты калгасаў расказаць.

- Ты панімаіш, Пракоп, мне ніясна чаму гэта нашыя людзі ў калхозы баяцца йсьці. Канечня, некаторыя гавораць, што ўражая агітацыя вядзецца. Думаю, што ёсьціка там доля праўды, ну ні саўсем гэта правільна. Есьлі-б я сваіх людзей ні знаў, ну знаю іх як аблупленых... Розум у іх ёсьць і есьлі яны ўжо ўвідзяць удобства, каб пайсьці ў калхозы, так памоему ніякая ўражая агітацыя іх ні задзержыць. А ўдобства пайсьці ў калхозы ўсім відны. Таму й ні панімаю чаму задзержка...

- А можа зарана яшчо? Можа яшчо людзі падумаць хочуць? І чаго ўжо так напралом лезьці ў тыя калхозы? - пытаўся Пракоп. - Ты-ж сам знаіш, што нашы людзі прынукі ня любяць. Дык каб тут быў час падумаць, каб ніхто ні пхаў...

- Ну панімаіш, дзела ў тым, што жалеза нужна каваць пака гарачо! - узарваўся зь месца Сабакевіч.

- Ня чуў-жа я, каб дзе ўжо калхоз які зрабілі, - спакойна й разважна адказаў Пракоп. - Нешта марудзяць... Унь колька вёсак, а калхозу ніводнага й на развод. Мусіць разумныя ня толькі ў Літоўцах жывуць. Каб там такое, Бог ведаіць якое дабро ў тых калхозах, дык чаму-ж, ня ўдзержылі-б ад іх людзей...

- Ты ўжо ўсе налогі заплаціў? - спытаўся Косьцік.

Пракоп узгарэўся. Даймала колкае «ты» й начальніцкі тон.

- Сам-жа знаіш, пэўня, дык навошта пытаешся, - адказаў.

Пракоп паціснуў плячмі.

- Цэлае лета пацеў сам і унь сыны на тэй ліпавіцкай дзялцы. Дзякуй Богу, урадзіла.Ды каб аддаў усё-ўсенькае на тыя налогі й кулі, і нейкія чортам выдуманыя лішкі дык і то ні хапіла-бы. Ну што-ж... Ніхай во гэту астатнюю кашулю з плячэй зьдзіраюць! - шорстка выказаўся Пракоп.

- Дык відзіш, панімаіш, пра астатнюю кашулю пачынаіш, - стрымана пачаў Сабакевіч. - А ці ты спрасіў сябе, зачэм яна, твая кашуля якому чорту нужна? Я табе раньша гаварыў і цяперака гавару й паўтараю: ня будзь ты мудрэй усіх мудрых. Прыйшла новая ўласьць, новы парадак, каторага многія ні панімаюць. От у чом дзела, панінаіш? Новая ўласьць гэта і ёсьць уласьць народу. Стала быць для таго, штоб народ васпользаваўся ўсімі вазможнасьцямі новай жызьні, нужна і дажа савершэнна ніабхадзіцельна, штоб ніхто ні сапраціўляўся новым законам і парадкам. Так от, - гэтта Сабакевіч падыйшоў і затрымаўся

пры канцы стала, - есьлі сказана, што, калхозы гэта - вышшая сьцепень сацыялісьцічаскай сельскахазяйственнай благадаці, значыць так і ёсьць. Стала быць, чым скорша ў калхозы цем лутша...

Гэтта замахнулася Косьцікава рука, хацела, мусіць, па стале на падмацаваньне довадаў пра калгасы стукнуць, але спынілася на паўдарозе. Рух гэнай рукі прынёс Пракопу мінулую зьяву. Гэта-ж яна, тая самая, што ў ікону Сьцятой Апрасіньні шклянкай самагонкі папусьціла. Болем перацяўся Пракопаў твар.

- Скажы, чаго ад мяне хочаш? - уськіпеў Бахмач. - Мне й так цяжка. Чаму спакою ні даеш?

- Тота-ж то! - усклікнуў Косьцік. - Памагчы хачу.

- Ты? Мне памагчы?

- Ну да.

У хаце запанавала доўгае маўчаньне. Бацька й сыны пераглянуліся.

- То есьць... штоб я табе памог, ты далжон памагчы мне, - фінальным тонам паясьніў Сабакевіч.

Здагадка распрамяніла Пракопаў твар. Вось чаму прыйшоў у хату гэты гэты гарлапан. Нешта новае заплянаваў. Асьцярожненька трэба.

- Саўсім ніясна мне, што ты мне можаш дапамагчы й што я табе, - сказаў Пракоп.

- Так от паслухай. - Гэтак Косьцік сеў ля стала зусім насупраць Пракопа. - Ты, Пракоп, ёсьць харошы й чэсны чалавек, добры хазяін. Да цябе ў дзярэўні многа хто прыслухоўваецца, прыглідаіцца. Гэта, што я табе раней пад п'яную руку казаў, забудзься. Ты чалавек чэсны й трудалюбівы. От штоб гэта дзела калхозу зь места зьдзьвінуць нада штоб такія, як ты, людзі першыя за новым парадкам пашлі. Панімаеш? Цябе многа хто слухаіць, от пачаму...

Пракоп проста пазіраў у шэрыя вочы й ня мог распазнаць хвальшу там, дзе мільгаў хітранькі сьветлячок.

- Гэта значыцца ты хочаш, каб я пачаў памагаць табе людзей у калхозы агітаваць? - вельмі ціха спытаў Бахмач.

- Да нет, якая там агітацыя, - выразна зьмякчэў Ромкаў гаспадар. - От есьлі-б слова закінуў ці ў бяседзе, ці як там... Панімаіш? Штоб ня толька процію ня быў, ну штоб словам дзе падзьдзяржаў. Я ні прашу, штоб па хатах агітаваць хадзіў. Гэта дзела вашых акцівістаў, от как...

Пракоп сядзеў аблакаціўшыся на стол. Цяпер адхіліўся назад, зірнуў на сыноў і Сабакевіча. Ваганьне ягонае было зусім відавочнае.

- Як сам ты гаварыў, што людзі марудзяць, - цягнуў далей Косьцік, - дык можаш і ты памарудзіць. Можаш січас атвета мне ні даваць. Я абажду. Но падумай, пажаласта. А есьлі січас якія вапросы яшчо маіш, так даёш...

- Вапросы, дапросы, спросы, пірапросы, - гавэньдзіў пад вус Пракоп. - Ні тое, ні гэтае. Падумаць падумаю, чаму-ж ні падумаць, - павесялеў Бахмач з той прычыны, што нейкая разьвязка ёсьць і Сабакевіч насядаць перастане. Так значыць, гэта самае... падумаю...

Бахмач устаў ад стала й разам падняўся Косьцік.

- Ну а скажы, калі ўжо мне так давяраеш, колькі-ж у Літоўцах так на першую руку ў калхоз запісалася-б, цяперака занчыцца, от адразу, - пацікавіўся Пракоп.

- Ні магу табе січас на гэты вапрос атвеціць. Ну так пажалуй... уся камбедната ды яшчо пару. Прызнаюсь, ні знаю. Ну пака, - махнуў вяла рукой Косьцік, - зайдуся другім разам.

На такое разьвітаньне Пракоп нічога не адказаў і доўга яшчэ стаяў пасярод хаты пасьля таго, як зачыніліся за Косьцікам дзьверы.

- Што думаеш, тата? - спытаў Янук.

- Ды от чуеш, што басяк выдумаў. Прыйшоў, бязьмен, мяне проста ў вочы хваліць і суліць, каб я яму памагаў. Значыцца, ён мне паможыць. Так, як раней, мусіць... Каб табе бокам такая помач вылізла!

38

Здавалася, што ён не гаварыў, а выдушваў словы з поўных круглых вуснаў з-пад гарбатага носу. Дзіўна сьціскаліся пуцатыя шчокі. Чалавек нахіляўся над сталом, выпінаў грудзі, махаў рукамі. Праз табачны дым людзі сачылі гэтага дзівака, слухалі чмялінае бубненьне. Пры гэтым напінаньні языка й шчок хваляваўся круглы жывот, звужаліся рудыя вочы. І яшчэ адно дзіва: чалавек гаварыў пабеларуску. Мова з-пад гарбатага носу плыла з намаганьням, прыдушаная, якраз такая, якой мог гаварыць чужынец, для каторага

гаворка была казной-прымусам. І ствараласа яшчэ ўражаньне, што гаварыў ужо многа раз паўтаранае, шаблённае.

Прадставіў яго Косьцік Сабакевіч як «прысутствуюшчага з раёну таварышча Цімермана, каторы раскажыць нам аб калхозах і другое...» Надта-ж, мусіць, карціла Сабакевічу калгасную справу зь мёртвага пункту зрушыць, дый першым штуршком меў-бы, відаць, быць калгас у родных Літоўцах.

Косьцікавы й Лявонавы візыты й нагаворы па хатах сабралі ў школьную залю амаль усю вёску, навет дзеда Якуба нейкім чынам падлабунілі. Цяпер-жа стары, зморшчаны чашчавік драмаў пад чмялінае бубненьне агітатара Цімермана. Галава дзедава хілілася набок і адно сын Васіль, збоку седзячы, лагодным штуршком вяртаў бацьку на тэрыторыю ўрачыстага сходу.

- Такім чынам паказчыкі сельскай гаспадаркі дзяржавы, - гаварыў Цімерман, - даказалі перавагу калгаснай сістэмы над прыватнай сістэмай, ды вялікую мудрасьць геніяльнага таварышча Сталіна.

Янук зьявіўся неўзабаве пасьля пачатку. Як вялізная гара, вушак уваходных дзьвярэй падпёр Любін дзевер Міхалюк. Нясло ад яго потам, гноем і карашкамі. Кастлявая рука нязграбна трымала «казіную ножку», сьлінькаватыя вусны смакталі цыбук і роўнымі кружкамі пускалі сіні дымок. Міхалюк пазіраў то праз плячо ў сені, то ў залю, быццам на старожы стаяў.

- Проціў мерапрыемстваў пяцігодкі, калі пад рукаводзтвам таварышча Сталіна й роднай камуністычнай партыі наша сацыялістычная краіна ступіла на парог сьветлай будучыні, выступіла чорная рэакцыя, значыцца недабітая буржуазная дробязь, рэлігійныя мракабесы, кулакі й падкулачнікі, усякая другая контра. Працэс калектывізацыі, такім дзелам, меў масу прэ... перашкодаў.

Пры сьцяне, між жанчын сядзела Вульляна. Хусьцінка на лоб апаўзла, безнадзейнасьць вызірала з апалых глыбака ў паморшчаны твар вачэй. Так і не вярнулі сыноў-галубкоў ейных. Ягодка-Аўдоля трымала стратэгічную пазыцыю ля вакна з правага боку побач шырокай і грудзістай Бруніськавай Мальвіны. Пасьля таго няўдалага падарку крамлёўскім валадаром і візыты ў гацкім НКВД не ўлягліся яшчэ нелады з Аксеняй. Шаўцова шчабятуха цяпер свайго Піліпа трымалася.

- Але наша родная камуністычная партыя, на чале зь вялікім правадыром працоўных усяго міра таварышчам Сталінам, наперад разаблачыла гнюсныя планы ворагаў сацыялістычнага сельскагаспадарчага будаўніцтва й разьбіла іх у пух і прах! Адтуль пачалося пераможнае шэсьце калгаснай сістэмы...

Пазіраючы на Цімермана, шапталіся й хіхікалі Дуня з Клавай. Прыгнечаны, зморaны, быццам яго хто з крыжа зьняў, ліпеў ля Пракопа стары Сявенька. Асунуўся апошнімі часамі. Вандравала па вёсцы плётка, быццам Косьцік цяпер зь Сявеньчыхай сьпіць і старога на ўвагу не бярэ.

Цімерман, мусіць, ня быў вайсковым, бо зьявіўся ўшэрым цывільным адзеньні. Калі яму й жылося сытна й добра, дык па вопратцы не згадаеш. Была шэрая яна, як цяпер ўсё шэрым сталася.

Глядзячы на сумныя твары, Янук блудзіў уяўленьнем, разважаў. Што гэтта найбольш вочы й вушы рэзала? З аднаго боку цякла душаная мова бальшавіцкага прапагандысты, з другога - людзі з такім прыгнечаным выглядам, быццам іх хто на могільнік меў зараз валачы.

Усплылі ва ўяве вобразы «герояў» зь «Лініі Манергейма», фільму, што кагадзе ў ліпавіцкай пуні бачыў. Як-жа ёмка там «доблісная» Фінаў лупцавала, пакуль да Выбаргу дабралася! «Гнюсныя Фіны» прост-напраст бяз портак ад «няпераможнай» джгалі. А як запраўды было?

Тыя, што былі на гэнай вайне й каторым удалося дахаты вярнуцца, апавядалі шэптам, пераз плячо аглядаючыся, ды з жахам у голасе. Так упсяюрылі Фіны «непабядзімай», што й самому ледзянавокаму крамлёўскаму дыктатару сон з павекаў сагнала. Жарцікі табе! Жменечка тых Фінаў, а так засупонілі! Насамперш усю афіцэрню бальшавіцкую, што на белым сьнезе ў чорнай вопратцы, як на паказ, ваявала, Фіны кулямі пералічылі. Пасьля-ж «пушачным мясам» паласавацца захацелі. А ў гэным фільме такія яны, браце, героюшкі, што аж тая бравая «гармошка» з захапленьня не ўтаймуецца. Басота нячыстая, галеча бязбожная! Як у Сьвятым Эвангельлі сказана: з бруднай крыніцы адно бруднае пацячэ...

І Жыд гэты плявузгае, як шарманка накручаная. Лухта. Панскай зямлёй надзялілі: наце, налятайце, цешцеся. Людзі аджылі, узмужнелі, некаторыя навет радасьць песьні прыгадалі. Аж пакуль увесь плён цяжкое працы гэнай ненажэрнай дзяржаве ўвавуліць загадалі. І вядзе

далей уява: Косьцік перад пабітай іконай, прыгнечаны Сявенька-Амэрыканец, Захарук перад «прэміяй» на стале, зьбіты бацька зь Перасечана, нямоглае жарабя, барадаты бязбожнік у школе й чамусьці Якаўлеў са сваей цудоўнай беларускай мовай...

Як тут разабрацца? На якую мерку мерыць? Моташна, дыханьне забірае. Трэба выйсьці. Няхай там ззаду чмель гудзе. Янук праціснуўся да дзьвярэй.

- А січас, пасьля дакладу таварыша Цімермана, ці ёсьць якія вапросы? - устаў Сабакевіч.

Людзі пазіралі адзін на аднаго, пазяхалі. Падняўся Захарук.

- Вы, дзядзька, маеце які вапрос? - спытаў Косьцік.

Захарук стаяў з краю, ля самага праходу. Быццам наўмысна марудзячы, ён кінуў недакурак самакруткі пад ногі, плюнуў на яго й растаптаў лапцем, азірнуўся на бакі. Правы рыжы вус вісеў ніжй левага й гэта давала Захаруку шорсткі выгляд.

- Чаму-ж не, казаў той, каб ня меў...

Уласьнік бадзёрага гнядога коніка, ударнік, узнагароджаны за вываз лесу зь Перасечана азірнуўся па бакох, падкруціў правы вус уверх.

- Гэта-ж я хацеў пра каня спытаць, калі сам ты, ці гэты таварышч што можыць сказаць... Дык я хачу ведаць як гэта ў калхозя біз свайго каня быць? Коні-ж заберуць, ці не?

Косьцік вагаўся, пазіраў на Цімермана.

- Коні ў калгасе належаць калгасьнікам. Значыцца, калі вы ў калгасе, дык яны й да вас належаць, - упэўнена адказаў Цімерман.

Усе Літоўцы ведалі Захаруковы конскія інтарэсы. Некаторыя яго цыганом называлі. У іншых, здавалася, лепшае масьці коні вадзіліся. Дзядзька-ж Захарук на коні, мусіць, спецыяльныя рукі меў. Глядзіш, здаецца, нядошлага якога прыдбаў. Калі-ж паходзіць ля яго, дагледзіць, дык той першаму й дзясятаму ня ўступіць.

- Значыцца тады, як вы, таварышч, кажаце, калі кахозныя коні нашы, дык тады можна каторага запрэгчы калі захочаш? - паправіў цяпер ужо левы вус Захарук.

Цімерман устаў.

- Як гэта запрэгчы? Паясьніце.

- Ну значыцца, надта проста: калі каторы мне на што трэба дык пашоў і запрог, - бойка адказаў Захарук. Рука ягоная палезла ў правую

кішэню вынашанага кажушка, дастала адтуль скураны капшук. Захарук паволі адвязаў матузок, выцягнуў зложаную газэту, ды пачаў адрываць кавалак на самакрутку. Цэлы час Цімермана з вока ня спускаў.

- Калі вам няясная такая драбніца, дык я зараз паясьню, - пачаў Цімерман, надзімаючы шчокі і жывот, як індык. - Калгас - гэта ёсьць зямля, людзі і інвентар, у тым ліку й коні. Як агульная гаспадарка, яна мае дбаць аб агульным дабры. Значыцца, пагэтаму старшыня калгаса глядзіць за ўсімі мерапрыемствамі для карысьці ўсіх членаў калгаса.

Сам задаволены з такога адказу, Цімерман сеў. Але стаяў і спакойна насыпаў з капшука табаку ў кавалак газэты Захарук. Ён языком пасьлініў адзін беражок паперы, залажыў яго на другі й пагладзіў пальцамі. Увага ўсей залі цяпер сканцэнтравалася на Захруковай самакрутцы, бо ведалі пранырлівасьць конскага гандляра.

- Ну дык як тады з канём? - спытаў наўмысна паволі рыжавусы дзядзька.

Цімерман зь няўцямнасьцю зірнуў на Захарука.

- Я-ж вам сказаў!

- Вы мне ні сказалі! - горача запярэчыў Захарук. - Вы гаварылі аб агульным дабры і ўспомнілі, што ўсім загадваіць старшыня калхозу. Дык я тады магу пайсьці і ўзяць каторага хачу каня й запрэгчы, ці не?

- Ня можаце! - войстра адказаў Жыд.

- Чаму не?

- А таму, што конь ні ваш.

- Дык як-жа гэта так? Вы-ж во цяперака, - от ніхай мне Бог і ўсе гэтыя добрыя людзі будуць сьведкамі, - цяперака казалі, што коні нашы, - напіраў селянін.

- Ну так, яны то вашы, занчыцца калгасныя, а там імі і гаспадаркай загадвае старшыня, каторага вы выбярэце. От вас выбяруць старшынёй, дык вы будзеце загадваць.

- Значыцца, павашаму выходзіць, што коні нашы й ня нашы. Дык, каб запрэгчы свайго каня, я мушу йсьці да старшыні й яго ласкі прасіць? - насядаў Захарук.

- Дазвольце спытацца: па якой патрэбе запрэгчы?

Гэта выглядала на кручок. Захарук падумаў.

- Для сваей патрэбы.

- Ні калгаснай?

- Як гэта? Ды не. От я захачу, скажам, у Гаці чаго паехаць на сваім гнядым. Дык як?

- Старшыню трэба пытацца, - суха адказаў агітатар.

- От яно як. Адразу так сказаў-бы. Нейкі чорт забярэць ад цябе твайго каня, а ты йдзі яго чартоўскай ласкі прасі, можа яшчэ ягоныя рукі цалуй, няведама як пакланяйся, каб табе свайго каня даў... Цьфу!

Спорны плявок упаў побач раней растоптанага недакурка, а Захарук сеў. На залі пачуўся сьмех. Наступіла агульнае адпружаньне. Устаў Косьцік.

- Здаецца мне, - пачаў ён, - што наш дзядзька Захарук зь яснага ніяснае зрабіў. Самі ведаеце, што ў каждай гаспадарцы трэба парадак. Так і ў калхозя. Панімаіця? Каб гэта кажды пачаў якога хочыць каня запрагаць, ці рабіць што яму самому ўздумаецца, дык дзе тады парадак? Панімаіця вы, ці не?

- Ці ёсьць яшчэ якія пытаньні? - зьвярнуўся да прысутных Цімерман.

Пытаньні пра гэтак званыя працадні, падаткі ды прыватную маёмасьць забралі шмат часу. Цімерман спасьцярог, што і ў гэтай вёсцы ня знойдзеш на шляху ў кагас таго энтузіязму й вялікага ўздыму, пра каторыя вечна плявузгаюць партыйныя газэты. Як і ўсюды раней, перад ім былі завязаныя языкі, вочы бяз блеску радасьці, твары бяз жыцьця. І Цімерманаў зрок затрымаўся на сівенькім, зморшчаным чашчавіку, што драмаў побач мажнага мужчыны збоку.

- Калі вы ня маеце да мяне больш пытаньняў, дык я тады да вас маю, - урачыста заявіў Цімерман.

Вочы грамады цяпер яшчэ ўважней сачылі Жыда.

- От вы, грамадзянін, як ваша празьвішча й па бацьку? - зьвярнуўся агітатар да дзеда Якуба.

- Тата, гэта ён да цябе, - зварухнуў літоўскага патрыярха Васіль.

- Га? Што? - паволі адчыніў вочы дзед. - Каб яго макарэц, ці ні задрамаў во...

- Вы, грамадзянін, будзьце ласкавы, - пачаў Цімерман яшчэ лагадней, - як вас зваць?

- Мяне гэта? - упэўніўся дзед.

- Так, вас.

- Усе завуць мяне дзедам Якубам.

- Добра, Якаў значыцца?

- Ды які там Якаў, каб яго макарэц! Кажу-ж, Якуб!

- Ну няхай, - сказаў Цімерман. - Колькі вам гадоў будзе?

Дзед зірнуў на сабраных, усьміхнуўся.

- Дзеткам кажу, што ўжо капы са дзьве пераваліла, а так папраўдзе, мусіць даўно за сотню пайшло. Самі-ж відзіце, што німалады.

- Ну та, гэта відаць, - згадзіўся Жыд. - Вы, мусіць, за свой век многа чаго цікавага перажылі. Так, ці не?

- Чаму-ж не... Многа, браток, многа перажыў, - згадзіўся Якуб.

- Можа й прыгон помніце?

- Ага, помню й прыгон, каб яго макарэц спапяліў. Помню, яшчо як помню...

- Вы мелі зямлю сваю, ці батрачылі?

- Яно на маім даўгім вяку ўсяк было, каб яго макарэц. Была й зімля, была й бізьзямеліца...

- А вы задаволены, што савецкая ўлада вас вызваліла? - прадаўжаў Цімерман.

Сход слухаў зь вялікай цікавасьцю.

- Ад чаго гэта, кажаце, вызвалілі? - спытаў жвавей.

- Гэта што? Вы ня чулі? - усхапіўся Цімерман, устаючы. - Ад памешчыкаў, паноў, экспуататараў, белапалякаў, ад тых, што з працы вашых рук жылі. Гэта што такое? Дзе вы былі? Таварыш Бурак, гэта што, у вашай вёсцы ніякай агітацыі не праводзіцца? Ніхто людзям не паясьніў аб тых вялікіх дабрадзействах, якія прынесла савецкая ўлада?

Зьбянтэжаны Сабакевіч пачырванеў, ніякавата пазіраў то на раённага агітатара, то на сабраных.

- Чаму-ж не. Агітацыя праводзіцца, разьясьнялі цэлы час і я сам сьцежкі пратаптаў ад вугла да вугла...

Цімерман зноў сеў, заклапочана пазіраў на дзеда Якуба. У залі пачаліся шэпты. Косьцік устаў і зьвярнуўся да дзеда Якуба:

- Я ні знаю, дзед Якуб, чаму ты так гаворыш. Ці ты гэта наўмысна, ці зьдзіцянеў?

Заля аціхла. Косьцік затрымаўся, набраў сьмеласьці й прадаўжаў.

- Ты кажаш, што помніш прыгон, многа сьвету відзіў, знаеш добра што было, як цяжка людзям было жыць пад нянавісным царызмам і пад белапанскім ігам. Знаіш як былі народ закабалілі. Цяперака відзіш, што савецкая ўласьць усім зямлю дала, асвабадзіла ўсіх ад прыгнёту,

што прыйшло вялікае шчасьце пад сонцам сталінскай канстытуцыі. Можа табе болі, як каму відаць, як цяжка было людзям жыць і якое вялікае шчасьце прышло. Можа табе самому трэба было-б пра гэта ўсё людзям у вушы ўводзіць... Дык ты што? Прыкідваешся, што ня відзіш што сталася? Панімаіш?

Косьцік змоўк, але стаяў, быццам чакаў на дзедаву рэакцыю.

- От маладзец ты, Косьцік, - сказаў дзед шорстка. - Добра во ты мне ўсё расказаў. Цэлае во жыцьцё, каб яго макарэц спапяліў, я сьляпым быў, а цяперака ты мне вочы адкрыў. Помню твайго дзеда ў пялёнках і ўсю радню тваю помню. І скажу табе адно, сынок: як сьвет сьветам, дык нікога ў сям'і й радні тваей такога разумнага ні было, як ты ўдаўся. Вырас, разумнік, уздужэў так, што свайго роднага бацьку за горла схапіў. Маладзец, цаца зь цябе ого якая! Для цябе німа ні бацькі, ні Бога, ты, мусіць, думаеш, штіо ты сам ёсьць бог. Ну што-ж... ведала вунь цэлая вёска, што ты сабак зводзіць умееш, ніякаму, каб цябе макарэц, сабаку праходу ні даваў. А цяперака во за людзей узяўся. Сын сабачы. Цьфу!

Паднечаны й злосны, дзед Якуб азірнуўся.

- Ідзем, Васіль, дамоў, німа тут чаго слухаць, - сказаў сыну.

У залі падняўся гоман.

- Ты відзіш во яго! Зьдзіцянеў стары! - тросься Косьцік, калі Васіль, падтрымліваючы бацьку, кіраваўся да дзьвярэй.

- Я-ж цябе, такую тваю!

- Ты мне ні пагражай! - адвярнуўся дзед. - Пацалуй ты мне, старому калеку, знаеш у што... Я пражыў сваё, а ты яшчэ не. От пра сябе падумай, чалавекам будзь, калі можаш. Хадзі, Васіль!

39

Каля паўдня ў сыботу Янік пачуў звон шорхавак з таго боку ад бальшака. Ля Кмітавай хаты спынілася санная брычка, людзі нешта распытвалі Аўдолю. Неўзабаве брычка рушыла й хутка збліжалася. Добра дагледжаны буланы конь гуляючы ступаў па ўтоптанай дарозе. Дзяцюк, што сядзеў сьпераду на казьле, нацягнуў лейцы й голасна спыніў каня перад Бахмачовай хатай.

На сядзеньні зь левага боку, апранутае ў чорнае сукно, разваліўся цёмны, даўганосы юнак гадоў пад сямнаццаць, побач яго - круглатварая сярэдняга веку жанчына ў падношаным пальце з футраным каўняром і вялікай, белай, ваўнянай, махрысткай хусткай на галаве. З правага боку сядзеў мажны, у чорным чыгуначным адзеньні, зь дзьвюмя чырвонаымі шпаламі на каўняры мужчына ў футранай шапцы. Калі-б навет і тых шпалаў ня было. Янук дадумаўся-б, што гэтыя людзі «адтуль». Штосьці было ў іх выглядзе й вопратцы. Янук ня ўсьпеў ім добра прыглядзецца, як мужчына спытаў яго парасейску:

- Скажы, калі ласка, малады чалавек, ці тут Пракоп Бахмач жыве?

Янук рот разявіў. Адкуль гэты вялікі ўраднік, - абы хто-ж не насіў шпалаў чыгуначніка на каўняры, - ведаў імя й прозьвішча бацькі?

- Так, тут, - адказаў Янук.

- А ты, малады чалавек, можа сын ягоны?

- Так, Пракоп Бахмач гэта мой тата. Зараз пазаву.

Янук шмыгнуў на ганак і ў хату. Посьпех быў лішні. Ледзь ня стукнуў бацьку ў лоб у цемнаватых сенцах.

- Стой, куды цябе гоніць?

- Тата, чалавек пра цябе распытваў... нейкі савецкі й цябе знаіць.

- Так? Відзіў іх праз вакно. Няўжо-ж гэта Хвёдар?

Шырака адчыніліся пярэднія дзьверы. Уважна прыглядаючыся, Пракоп паволі крочыў да брычкі. Чыгуначнік вылез, затрымаўся, прыглядаўся Пракопу.

- Пракоп, няўжо-ж гэта ты?

- Хвёдар?

Доўга трымаліся ў вабдымках.

- Браток мой любы, якая радасьць, якое шчасьце, ніколі сьніць ня сьніў! - захапляўся Хвёдар сустрэчай, цалуючы брата.

- Хвёдар, ты як з таго сьвету. Бог ні бязь міласьці, мусіць.

- Ну як жывеш? - пытаўся госьць.

- Пагаворым. Алі-ж, браток даражэнькі, ну ні пазнаў-бы я цябе, каб дзе от так на дарозе спаткаў ці што. Так многа часу сплыло, Божа мой! - гаварыў паднечаны Пракоп і бязрадна стаяў перад братам. - Ну дык чаму ні знаёміш? Ды прашу, заходзьце ў хату.

- Будзь ласкавы, гэта мая жонка Марыя Іванаўна, а гэта - сын Уладзімер.

Пракоп паціснуў вялую руку Марыі Іванаўны й патрос пляменьнікаву.

- А гэта мой сын Янук, - паказаў на хлопца.

- Мы ўжо раней пазнаёміліся.

- Ах, якое шчасьце, які Бог міласьцівы! Гэта-ж падумаць, падумаць толька! - ня сунімаўся Пракоп. - Мы цэлы час думалі, што на вайне ты прапаў. Але пра гэта пасьля. Заходзьце, калі ласка ў хату.

Госьці стаялі.

- Ах даруйце, - агледзеўся Бахмач. - Гэта-ж ні падумаў саўсім, бо галава дурная з той ніспадзеўкі. Адкуль вы прыехалі й адкуль ваш хурман?

- Са станцыі Гаці.

- Хурмана адпусьціце, а я сам адвязу вас куды трэба. Дык заходзьце ў хату, калі ласка.

- Добра, - сказаў Хвёдар. - Слухай, дзяцюк малады, - зьвярнуўся ён да хурмана, - едзь назад. Нас прывязуць. Вялікі табе дзякуй.

Дзяцюк нічога не сказаў, гукнуў на каня й пачаў заварачвацца.

- Вы багажу ніякага ні маеце? - спытаў брата Пракоп.

- Гэта што?

- Прабач, мне і ні ў галаве, што ты, можа, пабеларуску гаварыць забыўся... Пытаюся, ці маеце што з сабой?

- Ды не. Станцыя тут-жа, як рукой падаць. Дык навошта?

Калі зайшлі ў хату й разьдзеліся, Янук спасьцярог вялікае падабенства бацькі й дзядзькі. Хвёдар перарос Пракопа. Смуглявы, буйнавалосы, ён здаваўся надта блізкім і разам з тым недаступным. Марыя Іванаўна, што да гэтага часу роту не адчыніла, цяпер зьдзела пальто, сьцягнула з галавы хустку й разглядалася.

- Дайце, я павешу, - падыйшоў Янук.

- Калі ласка. Я для цябе нешта маю.

Жанчына гаварыла чыста парасейску, з прыціскам, характэрным маскалём. Навет Хвёдар, што ўжо пачаў у гутарку ўкідаць беларускія словы, розьніўся вымовай ад жонкі. Пакуль Янук павесіў пальто на круку на сьцяне, жанчына палезла ў ручную торбу й выцягнула цэлую жменю загорнутых у чырвоныя паперкі цукеркаў.

- От, дзяцюк ты мой, гасьцінца табе. Трымай.

З гэткімі словамі Марыя Іванаўна насыпала Януку поўную жменю цукеркаў.

- Дзякую вам, - сказаў Янук ды падыйшоўшы да Ўладзімера. - Будзем есьці разам? - спытаўся.

- Не, дзякую, - адказаў той. Ён стаяў сярод хаты й разглядаўся. Янук ня ведаў пра што зь ім гаварыць.

- Разьдзенься, сядзь, - сказаў ён Уладзімеру.

Тымчасам дзядзька Хвёдар распранаўся, бязь ніякае прынукі сеў на лаве ля стала. Таўставатая й пульхная Марыя прысела побач мужа. Нейкі час плялася нясуладная гутарка, ажно Пракоп раптам нешта прыгадаў.

- Янучок, зьбегай ты да Тодара, - сказаў Пракоп сыну, - папрасі ў яго літроўку. Скажы, што пасьля заплачу.

- Нічога ня трэба, Пракоп. Нікуды ні пасылай. Я штосьці маю, - забег наперад Хвёдар. - Марыя, будзь добрая, там у мяне ў кішэні, - сказаў жонцы.

Жанчына ўстала, падыйшла да вешака ля парогу і зь сярэдняй кішэні пальта дастала вялікую пляшку маскоўкі ды паставіла яе на стале.

- Я, браток, ня п'ю, ды от для вас думаў, - пачырванеў Пракоп.

- Ды знаеш, браце, гэта ўжо занадта. Ды чаму? Па чарачцы ўсе зробім, - намаўляў брат.

- Я калісьці, бывала, пры гасьцях дык чарку выпіў, - тлумачыў Пракоп. - Але тут у нас нядобрае ў хаце было. Гэты-ж наш акцівіст, ці як яго, чорта, цяперака зваць, дык ён як толькі зьмена прыйшла то мяне тут сілай паіў ды ікону во пабіў, - паказаў Пракоп зрокам у кут.

- Гэта што? - зьдзівіўся Хвёдар. - Хто пабіў і навошта?

- Доўга, браток, расказваць... Наш мясцовы камуніст гэта. Хацеў мне сілай гарэлкі ў рот наліць і крычаў, каб за таварыша Сталіна й за савецкую ўласьць піў. А я-ж хваравіты, вунь пры Паляках паліцыя пячонкі адбіла, дык і бараніўся, як мог... Тады гэты басяк поўнай налітай чаркай ды як чарахніць па іконе, так і пасыпалася шкло...

- Ды гэта ён цябе насілаваў? - сур'ёзна спытаў Хвёдар.

- А як-жа.

- А хто ён такі, гэты чалавек?

- Буракоў сын. Помніш Паўлюка Бурака?

Хвёдар зморшчыў лоб.

Помню, ну так, помню. Дык гэта яго сын? Я, пэўна, ні знаю яго?

- Малы шчанюк быў... Ня будзеш знаць.

- Дык гэта ён за Сталіна й за савецкую ўладу?

- Ну так.

- Маладзец, дзяцюк, ведае што рабіць, - сказаў Хвёдар і зірнуў на жонку й сына.

- Я ні знаю, - адказаў зьбянтэжаны Пракоп. - Ні знаю ці маладзец, - паўтарыў, скоса зірнуўшы на брата.

- Ды не, Пракоп, - сказаў той, не за тое маладзец, што хуліганіць, а таму што Сталіна вялічае. Разумееш?

Хведар доўга глядзеў на Пракопа, як-бы зрокам хацеў нешта недаказанае языком вытлумачыць.

- Ты лепі знаеш. Я нінадта разьбіраюся, - сказаў Пракоп. - Алі чаго-ж я сяджу, нешта на стол трэба, - устаў гаспадар. Ён загадаў Януку прынесьці хворасту, распаліць пліту. Неўзабаве на сквараджзя засквірчэласала й смажылася каўбаса з тых сьціплых запасаў, што ў клеці віселі пад самай страхой (каб пацукі не дабраліся) на якую нечакана-пільную патрэбу. Прыемны пах расплыўся па хаце. Хвёдар падыйшоў да печкі.

- Як гэта завецца? Хвораст, ці што?

- Так, хвораст, - адказаў Янук.

- Помню. Ведаеш, многа забыўся пра гаспадарскае з дому. Прыкладна, у нас на Ўрале, дзе я служыў, печкі палілі вуглём. Але тут, вядома, вугля няма.

Ён прайшоўся ўдаўжкі і ўшыркі па пакоі, пазіраючы на Пракопа, што стаўляў пасуду на стол, спыніўся перад здымкамі на сьцяне, пачаў пра некаторыя распытвацца. Уладзімер падыйшоў да Янука, стаяў і маўкліва пазіраў на полымя ў печцы. На стале зьявіўся разовы жытні хлеб, гуркі, капуста шыткаваная,

- Вы госьцікі, прабачце нам, што нічога спіцыяльнага німа, - гаварыў Пракоп. - Каб-жа гэта чалавек ведаў...

- Ну ды што ты, навошта гэта, Пракоп? - зьдзівіўся Хвёдар. - Усё во, што маеш і ёсьць для нас спэцыяльнае.

- А калі Мікола вернецца, Янук?

- Ні казаў.

- Заседзіцца можа.

- Гэта твой другі сым? - зацікавіўся госьць.

- Так. На сяло недзе пашоў.

Як на добрую згадку, адчыніліся дзьверы й на парозе стаяў Мікола. У хату ўвайшоў нясьмела, спачатку зірнуў на незнаёмых людзей, пасьля на патэльню на печцы, пацягнуў носам. Вочы яго павандравалі на стол, пры якім завіхаўся бацька. Пабачыўшы пляшку водкі й каўбасу, дзяцюк мяркаваў, што гэтта адбываецц нешта надзвычайнае.

- Мікола, от і ты на добры ўспамін. Паглядзі, якая ў нас вялікая радасьць у хаце: гэта во мой брат Хвёдар, яго жонка Марыя і сын Уладзімер, - адрэкамэндаваў бацька.

- Здрасьця, - прывітаўся Мікола.

Госьці спасьцераглі, што хлапец кульгае, але ніхто пра прычыну не распытваўся.

- Дома, значыцца, бацьку памагаеш, ці ў школе? - спытаў Хвёдар.

- І дома, і за шаўца вучуся, усяк бываіць, - адказаў Мікола.

- Гэта за каго вучышся? - не зразумеў дзядзька.

- За сапожніка, - пратлумачыў хлапец.

- Ага, так, шавец - гэта сапожнік, - сказаў Хвёдар і спытаўся Пракопа: - Ні расказваў ты мне пра жонку. Калі памерла?

Пракоп уважна паглядзеў на гасьця, памяркаваў.

- Пачакай, братка, пасьля раскажу. Давай перш перакусім.

Селі госьці за стол бяз прынукі, Пракоп - на табурэце напрыканцы стала, Хвёдар і Марыя - на лаве ля сьцяны, а хлопцы - насупраць іх.

- Перш памолімся, - сказаў ціха Пракоп. - У імя Айца й Сына й Сьвятога Духа, амінь. Госпадзі, Божа наш, багаславі гэту яду і ўсіх за сталом. Дай нам усім здароўя й даруй нам грахі нашы. Дзякую Табе, Госпадзі, за тое, што вярнуў брата майго й сям'ю ягоную. Дзякуй Табе, Госпадзі, за ласкі Твае вялікія для нас. Ніхай імя Тваё вялікае славіцца сягоньня, заўтра й на вякі вякоў. У імя Айца й Сына й Сьвятога Духа, амінь.

Перахрысьціліся ўсе тры літоўскія Бахмачы, а госьці сядзелі й няўцямна пазіралі адзін на аднаго. Сам Пракоп, звычайна сядаючы за стол перад спажывай, адно хрысьціўся, але сяньня, паднечаны нязвычайным здарэньнем, наважыў падзякаваць Богу за вялікую ласку Ягоную. Пасьля малітвы спасьцяроr, што недаверкаў, мусіць, за сталом госьціць.

- Дык, калі пазволіце, па чарачцы, - запрапанаваў Хвёдар і ўзяўся за пляшку.

- Будзь добры, - сказаў Пракоп, - налівай. Ну толька адну кроплю для мяне.

Брат набухтырыў Пракопу поўную чарку.

- Ну а вам? - спытаў Хвёдар хлопцаў, наліўшы жонцы й сабе. - Будзеце піць?

- Я вып'ю, - адказаў Мікола.

- Я ніколі ня піў, - прызнаўся Янук.

Хвёдар наліў Міколу поўную, Януку - трэцюю часьць, а сыну - палову чаркі.

- Усе будзем сьвяткаваць гэты дзень, калі мы, пасьля так доўгай разлукі нарэшце спаткаліся. Таму прапаную ўсім выпіць! - тлумачыў госьць, устаючы.

- Дай, Божа, здароўя вам і нам, - падтрымаў Пракоп.

- Дык за здароўе!

Пракоп ледзь вусны памачыў. Марыя Іванаўна й Хвёдар выпілі да дна, хлопцы таксама. Адно Янук закашляўся й зморшчыўся, калі водка забрала яму дыханьне.

- Алі-ж моцная, каб яе чорт! - сказаў, зірнуўшы на Ўладзімера.

Узяліся закусваць. Госьці, відаць, спадабалі, самаробную каўбасу, бо елі са смакам.

- Добрая каўбаса, - сказала Марыя. - Самі рабілі?

- Ну а хто-ж, - адкзаў Пракоп. - Як там у Расеі, самі ня робяць?

Жанчына зірнула на мужа й сына.

- Ды не, у нас усё з крамаў. Алі знаеце якое харчаваньне з крамаў... От ваша нешта новае, іншы смак...

Неўзабаве Хвёдар наліваў па другой чарцы, але гэтым разам абмінуў юнакоў. Мікола зірнуў спадылба, хацеў, мусіць, яшчэ выпіць, але ў такім таварыстве не асьмеліўся нічога сказаць. Пракоп другім разам дапіў сваю чарку да паловы. Пазіраў на гасьцей і ня ведаў як прадаўжаць гутарку, а лічыў гэта сваім абавязкам.

- Сам будзеш у Гацях працаваць, ці што? - спытаўся брата.

- Так, камандзіроўка. Вядома сам начальству запрапанаваў. Паеду, думаю, пад дом, пагляджу хто з вас жывы й здаровы й як усё наагул.

- От добра зрабіў, - пахбваліў яго Пракоп. - Працуеш на чыгунцы?

- Так, на чыгунцы, - адказаў брат. - Цэлы час працаваў на чыгунцы.

- Мусіць, нейкі начальнік вялікі. бо далі табе во гэтыя, як іх назваць, што на каўняры?

- Цяпер начальнікам руху, - коратка адказаў Хвёдар.

Прыйшлі роспыты, згадкі пра старое, далёка мінулае маленства, ніткі даўно парваныя, часы на стагодзьдзе ці больш назад у нябыт адыйшоўшыя. Маскоўка развольніла языкі. Хвалюючыся, Пракоп расказаў, як Бжончэк Алену застрэліў, дубовіцкага сьвятара згадаў. Да гэнага часу Хвёдар чаркі з чатыры выпіў, але слухаў брата ўважна, даваў пабочныя пытаньні, сядзеў сканцэнтраваны, задуманы. Марыя Іванаўна слухала маўкліва і ўважна. Сын Уладзімер пазіраў на Янука, быццам нешта спытацца хацеў.

- А як-жа вы там жылі? - спытаў Пракоп. - Як там у вас жыцьцё? Ці яно такое добрае, як кажуць?

Хвёдар прыкінуўся, што недачуў і зльвярнуўся да сына:

- Ты слухай, сынок, не надакучыла табе сядзець са старымі? Можа-б ты зь Януком пагуляў, на саначках паезьдзіў?

- Хадзі, Уладзімер, у нас добрая горка ёсьць, паезьдзім, - падхапіў Янук.

Хвёдараў сын ахвотна згадзіўся й хлопцы выйшлі.ж

- А ты, Мікола, ні маеш ніякага занятку? - спытаў Пракоп сына, хутка разгадаўшы братаў манэўр. - Ідзі там у гумно, паглядзі ці трасянка ёсьць у запасе й накармі статак.

Мікола ўстаў, з дакорам зірнуў на бацьку. Хацелася яму, мусіць, гасьцей паслухаць, яшчэ чарку выпіць.

- У нас гэта, ведаеш, навет перад дзяцьмі сваімі бывае небясьпечна, - тлумачыў Хвёдар, пасьля таго, як зачыніліся за Міколам дзьверы.

- Як гэта небясьпечна? Чаму так?

- Доўга табе расказваць. Дам прыклад, можа сам зразумееш. От у Маскве стаіць помнік Паўліку Марозаву. А хто-ж быў той Паўлік Марозаў?

- Хвёдар! - дакорлівым голасам сказала жонка, моцна скрывіўшыся.

- Ды што ты, Маша, я-ж з братам сваім гавару, ня зь кім... Разумееш? А чаму-ж не расказаць? Няхай ведаюць сваіх вызвольнікаў... Чым раней, тым лепш...

Пасьля гэткага ўступу, Хвёдар Бахмач наліў сабе поўную чарку гарэлкі.

- Ты вып'еш, ці што? - зьвярнуўся да Пракопа.

- Ды не, ні глядзі на мяне, я не магу.

- Дык от, - прадаўжаў Хвёдар, - такім чынам, хто-ж такі гэны Паўлік Марозаў? Гэта дванаццацігадовы хлапчына, што бацькоў сваіх, як злачынцаў, у НКВД аддаў. Проста - выродак.

Хвёдар спыніўся.

- Як гэта ў НКВД? Чаму?

- Як ворагаў народу, от як. Відаць, падслухаў, якл нешта супраць савецкай улады казалі, ці што. Перадаў пра гэта свайму настаўніку ў школе, а той далей. Забралі, разумееш, бацькоў і сьлед прастыў, а сына далі ў прыклад іншым юнакам, як пільнага піянера. Помнік яму збудавалі, от як... Такім чынам дзяржава, партыя й Сталін даражэй бацькоў і сям'і. Бяры, маўляў, уся моладзь з Паўліка Марозава прыклад, от як...

- Божа ты мой! - жахнуўся Пракоп. - Дык тады-ж бацьком сваіх дзяцей баяцца трэба, роту німа як адчыніць!

- А як-жа, - згадзіўся госьць, - вось і ўяві сабе жыцьцё ў такой сыстэме, дзе дзяцей ворагамі бацькоў парабілі.

- Госпадзі наш, Ісус Хрыстос! - перахрысьціўся Пракоп.

- Чатыры гады ці што, можа й больш, пачынаючы з трыццаць трэцяга, уся краіна была ў абдымках тэррору. Я працаваў на чыгунцы бачыў як на ўсход людзей вывозілі. Здавалася, канца ня будзе. Прыйшла калектывізацыя, калхозы значыцца. дык усіх, хто супраціўляўся, раней ці пазьней на Сібір адправілі. На Ўкраіне, кажуць, міліёны людзей гэты ёлуп голадам замарыў. Дый што гаварыць, ці толькі на Ўкраіне! Цягнікі начамі праз наш горад на Ўрале праяжджалі й нікому з нас блізка не пазвалялі падыйсьці. Але я ўжо так і знаў хто й што едзе, калі быў загад неадкладна спэцыяяльны прапусьціць. Бывала, што й затрымлівалі дзесь на чыгунцы збоку. Чуў я лямант і праклёны, чуў і вартавых і сабак. Спэцыальныя атрады НКВД, вось хто канвой трымаў. Спараліжавалі ўсю краіну, чалавек ценю свайму ня верыў. Разумееш? Пасьля-ж партыйная чыстка прыйшла, народныя суды гэтак званыя, Сталін усіх сваіх паплечнікаў і сяброў зьбяёдаў.

- А Божа-ж ты мой, - шаптаў Пракоп.

- От табе й Божа, - прадаўжаў добра ўжо паднечаны Хвёдар. - Ні памог ні Бог, ні памог ніхто. Міліёны людзей, мусіць, ёлуп зьнішчыў. Пацягалі й Марыю Іванаўну, пацягалі й мяне. Спрабаваў я ў партыю, але ня прынялі. Думаю, ня хочаце, дык і ня трэба. А ўсёроўна пацягалі. Разоў дваццаць, мусіць, біяграфію выпытвалі: адкуль, хто дзед і прадзед, хто такія бацькі? Сацыяльнае паходжаньне ім давай. У дабавак і сам той факт, што мейсца майго нараджэньня апынулася пад белапольскай акупацыяй, зусім ня спрыяў мне. Наадварот: глядзі каб шпіёнства табе ня прышылі. Вось як, Марыі Іванаўны бацька афіцэрам царскае арміі быў. Разумееш? Прапаў чалавек няведама дзе. Дык, разумееш, падазрэньне. Ці ні змагаўся з чырвонымі, ці ні быў у Калчака, ці Дзянікіна? Значыцца, калі-б і змагаўся з бальшавікамі на баку белых, дык ці-ж дачка мусіць за гэта адказваць? Ці-ж яна яму загадвала? Так цягалі днямі й начамі. І вось, разумееш, браток, навет і сяньня чалавек з чалавекам сябраваць баіцца, адзін на другога даносы робіць...

Маўчаньне трывала доўга.

- Гэта страшна, - уздыхнуў Пракоп. - Тутака ўсяк гавораць, алі ад савецкіх нічога ні даведаешся.

- Яны гавораць, што ім палітрукі загадаюць. Зрэшты, ніхто з савецкіх табе праўды ні скажа. Народ пазнае тады, калі чыстка й вывазы пачнуцца, калі Бог пра ўсіх забудзецца, а Сталін будзе рабіць што хоча...

- Ты думаеш, што й тут будзіць тое, што ў вас было?

- Дарагі мой, - адказаў Хвёдар, наліўшы сабе чарку, - дык ці-ж што-небудзь зьмянілася? Сталін жыве, НКВД і калгасы існуюць, нічога не зьмянілася. Пацягнулі спачатку на Сібір паноў вашых, а пасьля й на іншых чарга прыйдзе. Помні мае словы, дарагі мой.

- Гэта-ж чорт ведаіць што, - сказаў заклапочаны Пракоп, - мусіць горш чым за Польшчай будзіць.

- Напэўна горш будзе. Я тут усяго дзьве нядзелі, ды ўжо прыглядаўся як народ жыве, ці жыў. Вядома, многа ў вас бяды было, сам ведаеш. Але калі параўновываць з нашым, дык ваш селянін, каторы працаваў, меў і сала, і масла, і малако, і, відаць, апрануцца меў за што й наагул, калі ня гультай, дык жыў нядрэнна. Так, ці не? Гэткага жыцьця нельга ніяк зраўняць з калгасным.

- Гэтыя калгасы, - сказаў Пракоп, - як у іх жывецца?

- Горш як у прыгоне. Чуў пра прыгон?

- Чаму-ж не...

- Розьніца, мусіць, тая, што прыгоньнікамі валодалі буйныя ці меншыя землеўладары, а калгасьнікамі, - і гэта літаральна, - валодае дзяржава. Калгасьнік, напрыклад, за год заробіць нейкую колькасьць працадзён. У калгасе ёсьць ураджай добры, або й няма. Зьбяруць плёны, змалоцяць і хто, ты думаеш, першы з лыжкай і міскай? Дзяржава йдзе першая. Яна забірае ўсе налогі, пасьля семенны фонд забярэ сваё. Разумееш? Рэшта, колькі там астанецца, дзеляць на працадні. І вось, калгасьнік атрымае паўкіляграма зярна, столькі то бульбы й іншага, - колькі там на працадзень выпадзе, - вось жыві ды пажывай, братка. А нормы-ж на працадзень такія даюць, што як дурны наробішся. Ясна, што ніхто не хацеў і ня хоча ў калгасе быць. Але-ж у горад не ўцячэш, бо там ня прыпішуць цябе. Дазвол ад уладаў трэба, а яны-ж спытаюць адкуль ты, дый не пагладзяць па галоўцы.

Раптам праясьнела Пракопава галава. Выявілася ўсё недаказанае й нявытлумачанае мясцовымі агітатарамі й палітрукамі. Вось яна, просьценькая й хітрая пастачка: прыгон у новай хворме, з новым уласьнікам і партыйным цівуном.

- У нас цяперака якраз наш Косьцік, - гэты самы, каторы абразы мне пабіў, - усіх у калхоз гоніць. Ужо па хатах лазіў з нагаворамі, сходы рабіў. Людзі ўпіраюцца, многа чаго ня ведаюць, але ўжо нядобрае пранюхалі. Ёсьць бедныя, што ў калхоз адразу пойдуць, алі такіх мала. Бальшыня надта-ж асьцярожная. Людзі думаюць, што калхоз ад іх залежыць. А як ты думаеш, што мне рабіць?

Пракоп зірнуў брату ў вочы, быццам там ратунак таіўся.

- Знаеш што, братка мой, - пачаў Хвёдар, - калі так пайшла справа, дык раю табе йсьці адразу. Так лягчэй будзе. Ты кажаш, што Косьцік - басяк. Згода. Але-ж якраз на такіх савецкая ўлада аснавалася. Улічы, што раней ці пазьней усе будуць у калгасах. Іншага выхаду няма. Тых, што супраць калгасаў, як ворагаў народа ў Сібір вывязуць, адкуль ніхто не вяртаецца, а калі пойдуць у калгас пазьней, дык ім будзе горш за тых, што калгас зарганізуюць. Вядома, справа гэта твая. Але бяручы на ўвагу тое, што я табе сказаў, - улічы, што гавару як роднаму брату й ніякай іншай душы на зямлі я не сказаў-бы гэтага, - лепш у калгас ісьці спачатку. Напэўна ўбачыш і сам пераканаешся.

Дзьверы адчыніліся й на парозе затрымаўся Алесь. За вокнамі ўжо шарэла.

- Гэта я во толькі з Гацяў вярнуўся й сказалі, што ў цябе госьці, дык і зайшоўся.

- Добра зрабіў, - сказаў Пракоп. - Хацеў я цябе й тваіх адразу папрасіць, алі загаварыліся. Во мой брат Хвёдар зь сям'ёй.

Алесь знаёміўся. Прыйшла неўзабаве й Кацярына. Гутаркі на іншыя тэмы пайшлі.

На ўзгорку Гараваткі забаўляўся з Уладзімерам Янук. Рухавы хлапец любіў санкі. Адно гаворка ніяк не вязалася й Бахмач ня ведаў чаму. Якімі справамі ці рэчамі цікавіўся гэты новы сваяк? Казаў, што ўжо дзесяцігодку скончыў.

Над Літоўцамі асядаў мяккі зімовы змрок. Далёка кацілася па даліне рэха вёскі.

Адвёзшы гасьцей ужо дзесь пасьля поўначы ў Гаці, цэлую ноч марыўся бяссоньніцай Пракоп.

40

Сявенька выпраг каня ля гумна. Мяркаваў, што трэба будзе намазаць калёсы й зірнуў на дзежку з мазутай. Ласкава пагладзіў каня па мордзе, сьцягнуў аброць і пусьціў яго ў загарадку. Задаволены, што пазбыўся вупражы, конь заіржаў і пабег да кабылы, што адгукнулася з лугу, на якім пасьвілася з жарабём. Сявенька думаў пра Гаці, пра крамніка Іцку, якому сяньня завёз залатую царскую пяцірублёўку за разныя тавары. Абрыдзела ў чэргах стаяць, рознай нечысьці пакланяцца. Разьвязаў рудую зрэбную торбу, у якой стаялі загорнутыя ў рызьзё два літры нафты. Зірнуў на мяшкі з цукрам, сольлю й матар'ялам. «Вось да чаго дажыўся», - падумаў.

Прыгадалася нялёгкае ў заакіянскай краіне, дзе маладыя гады й сілы аддаў. Ела-сьляпіла-паліла вочы й твар пітсбургская доменная перч. Вугаль, агонь, жужаль, зялеза, гар, дым... Дыханьне забірала. Ішоў на працу малады, гадоў з дваццаць. Пасьля дванаццаці гадзін, вяртаўся ў цесны й няўтульны пакой зусім нямоглы, быццам гадоў пяцьдзесят на плечы ўзьлезла. Улетку, калі жыцьцядайнае сонейка на

двары зьзяла, тэмпература ля печы пякельная была. Пацеў, салёныя таблеткі глытаў. Нап'ешся сьцюдзёнай вады, цячэ цурком пот, слабее арганізм і зноў сушыць смага.

Нялёгка, нясоладка было. І цэлы час, пра тую нечысьць і гарачыню пякельную, праз асьлепленыя полымем вочы, праз сьцісканьне паса на жываце, недаяданьне й адкладаньне тых марных заработкаў у банк, праз усё гэта як збаўленьне, як чысьціня й харство радасьці сьветлае, маячылася воддаль родная, дарагая «абяцаная зямля». Яна мярэжылася бязьмежнай зялёнай, сакавітай нівай, крыніцай жывой вады, пахучымі й грацыёзнымі сёмушнымі бярозкамі, прыгажунямі-хвойкамі, задаволенай і шчасьлівай сямейкай за абедным сталом у чыстай хаце са здаравенных круглякоў, няўрымсьлівым стаеньнікам у ваглоблях і яшчэ дзівоснымі, зоркамі абсыпанымі Калядамі, а часам і вялізным, белым сьнежным прасторам у пагоні сабак за зайцамі. «Зямля абяцаная» трымала й падбадзёрвала, спадзяваньнямі плённае восені прынаджвала, зоркай усходняй запаветнай на сьветлым гарызоньце зьзяла.

Хто-ж ён і адкуль? Бедны, найніжэйшы зь нізкіх чалавек-ноль.

Як рэдка каторы, цаніў Сявенька працу, бо праца - шлях да дабрабыту, годнасьці, чалавецтва. І яшчэ праца дасьць такія ўмовы, што дазволяць яму паказаць фігу ўсім паном і падпанкам, гультаём і прайдзісьветам. Ці-ж не ў Сьвятым Пісаньні сказана, што «у поце чала твайго здабываць будзеш хлеб свой»? А калі Гасподзь Бог сказаў так, выгнаўшы абібока Адама з раю, дык ці мог ён, Сявенька, супярэчыць гэтта?

І прыгадваў яшчэ далейшае мінулае, калі на розных паноў і падпанкаў працаваў. Салёны пот заліваў вочы і адно ледзь на сьціплае пражыцьцё хапала. Амэрыка неадступнай марай цягнула. Пастанавіў заашчадзіць на дарогу, паехаць, зарабіць грошы, а тады будучыню на пагвалчанай зямлі, пад зьдзеклівымі чужнікамі будаваць. Пры доменных печах маладосьць і асноўныя сілы пакінуў, але на бацькаўшчыну ня з пустымі кішэнямі вярнуўся.

Старая вёска, як і раней, у непраглядной будзёншчыне кешкалася. Спачатку палоскі былі шырынёй, як жабе пераскочыць. І ўсё яшчэ бацькі зямлю між сыноў дзеляць. Калі так трываць будзе, дык хутары да камарынай лыткі змалеюць. Рук да працы процьма, грошы гаспадараць, выкарыстоўваюць нядолю народную.

Нарэшце вырас, пераплюнуў усіх у вёсцы Амэрыканец Сявенька. Вялізны кавалак зямлі купіў. Стары кавалер зь зямлёй і капіталам. Найпрыгажэйшыя дзеўкі налётам замуж пруць. Як смала, Марыліны бацькі прыліплі. Грашыць няма чаго: дзяўчына першай красы й маладосьці была. Бяры кахай, сямейку разводзь, жыві ды пасьвістывай, бо наймітаў хапае. Ад гару й сьпякоты пітсбургскай доменнай печы ўзьлез Сявенька на багаслаўленае сёмае неба.

Адылі ня ўсьпеў як мага разгарнуцца, пачало крышыцца-валіцца старое, наплыло й насела новае. Басота, каторай не дазволіў-бы праз парог свае хаты пераступіць, дзякуючы нейкай нечысьці, што ў Расеі верх узяла, цяпер сумленным і працавітым людзям загадвала. І ня відаць было ніякае палёгкі, ніякага зьніча ў цемры.

Сявенька зірнуў на вупраж. Новы падсядзёлак трэба было-б справіць, падпруга й хамут ужо таксама працёрліся. «Ніхай яно пропадам прападаіць, жыцьцё гэткае», - думаў. Як ні старайся, рукі да працы не гарнуцца. На каго-ж працаваць? Леташніх падаткаў ня выплаціў, а дзе там ужо сёлетнім раду дасі. І яшчэ, як на сьмех усім, панадзіў да жонкі брыда гэты, каб яго зямля не насіла. Ён-жа - начальнік цяпер. Баба апраўваецца, што, маўляў, у выпадку чаго дык ня вывезуць, можа, Косьцік заступіцца. Чорт яго, ліха такое, разьбярэ. І марыўся бяссоньніцай Сявенька, гаротнік ззамоладу, гаротнік у Амэрыцы й гаротнік цяпер, калі гады с паўдня спаўзаць пачалі.

Ідучы пад хату, зірнуў Сявенька на нівы свае. Ды яны ўжо й не ягоныя, бо цяпер «народная ўлада» лапу налажыла. Зямля-матка, зямля-карміцеклька, яна, як часьць цела твайго, прадаўжэньне жыцьця жывога, цяпер сіратой бяз догляду пакінутая, на глум чужнікамі ўзятая, ужо пустазельлем, сьвірэпкай, лебядой і асотам зарастала. Адмірала, пусьцела ніва й паволі расла пякучая, вялікая пустка ў грудзёх гаспадара руплівага. Цудоўна зелянілася за бальшаком прасторная сенажаць. Ледзь стрымліваў Сявенька сьлёзы. Адвярнуўся ў іншы бокі спасьцярог як воддаль зелянеў на гарбе Гараваткі маестатычны Архіп. Колькі пакаленьняў продкаў пазірала на яго? Па ім варажылі людзі пагоду, ён быў сымбалем устойлівасьці проці навалаў і ліхалецьцяў. Масу асколкаў ад розных войнаў у драўніне сваёй трымаў. Што яшчэ чакае гэтага гіганта?

Сявенька падыйшоў да плоту, асьцярожна адчыніў і зачыніў весьнічкі й адно тады спасьцярог ля падстрэшша хаты самакат. Ледзь

ня выпусьціў з рук дзьве цэнныя літроўкі нафты. Цень ад клеці падаўжэў на чатыры росты чалавека. Дзьверы ў сянёх былі прычыненыя й ня відаць было нідзе ані малога Валодзькі, ані Марылі. Хлопчык, пэўне-ж, сьпіць у гэтым часе. Падбег да Сявенькі й пачаў лізаць, ціха скуголячы, руку сабака.

- Пашоў вон! - сыкнуў гаспадар.

Сабака пранюхаў нядобры гаспадароў настрой. Ён прылёг на пярэднія лапы, вінаватымі вачмі пазіраў на чалавека, быццам прабачэньня просячы.

- Ідзі ў будку, кажу! - гукнуў Сявенька.

Азіраючыся, сабака адыйшоў.

Сявенька затрымаўся перад самакатам ля парогу. Дрыжэлі рукі й бязьмежная злосьць абцугамі ціснула сэрца, скорыла дыханьне. Рука выцягнулася да дзьвярэй, павісла й апусьцілася. На зьняможаным твары мільганула ледзь заўважная ўсьмешка. Азіраючыся на бакі, прыгнуўшыся, Сявенька накіраваўся за вугал хаты. Ішоў паволі, асьцярожна, прыбліжаўся да вакна са спальні. Зірнуў уверх і спасьцярог адчыненую фортачку. Здалося, што да вушэй даляцеў басавіты мужчынскі голас. З гэтага боку хаты, ля сьцяны, рос маліньнік у перамешку з крапівой. Перад самым тварам, нешта моцна лопнула паветрам, выскачыла з маліньніку. Перапалоханы гаспадар аж прысеў. З гнязда нясушку сагнаў. Курыца закудахтала на ўсю шырыню свае глоткі й шмыгнула за вугал хаты. Забыўшыся, ледзь ня вылаяўся Сявенька ўголас, але ў час стрымаўся. Тады спасьцярог, што левай нагой у яйкі ўквэкаўся. І мільганула злосная думка, што Марыля, - нашто ўжо калі працавітай была, - цяпер навет за нясушкамі не глядзіць.

- Чуеш? Курыцу нехта сагнаў.

Марылін голас, праз фортачку. У голасе - заклапочанасьць. Сявенькава кроў малаткамі біла ў скроні. Здавалася, што тыя ў спальні празь сьцяну пачуюць.

- Сабака, можа, - адказаў абыякавы Косьцікаў голас.

- Ты, Косьцік, любіш мяне?

Ласкавы Марылін галасок, той самы, што яму некалі розныя салодкія пяшчоты абяцаў.

- Ніхай сабе, люблю, - адказаў абыякавы бас.

- Косьцік!

У голасе трывога.

- Га?

- Думаеш, што раскулачаць і вывязуць нас?

Трывога ў голасе расла.

- Так.

- Дык як будзіць? І старога, і малога й мяне?

- Усіх, - адказаў цьвёрды й аўтарытэтны бас.

- Ай-яй-яй!

Здалося Сявеньку, што заенчыла сучка. Ён рукавом абцёр пот з твару. Нос цягнуў рэзкі пах мяты.

- Я-ж табе сказаў, што рабіць. Стары ёлуп многа золата маіць. Вымантажыш, дасі мне, дык астанешся.

Млоснасьць корчыла Сявенькавы калені, слабіла ўсё цела.

- Ты гэта сур'ёзна, ці што?

- Раз кажу, дык сур'ёзна, - цьвёрда адказаў Косьцік.

Хвіліна маўчаньня.

- Каб гэта магла... Чорт ведаіць дзе ён яго хаваіць.

- Як захочаш то сумееш. Ты-ж ягоную слабіну знаеш.

Жончын галасок паволі й мэтадычна рэзаў Сявеньку на балючыя кавалкі. Здавалася, што няма для дыханьня паветра. Нехта завалодаў мазгамі, гнаў думкі на нячыстае й кружылася галава. Сьціснуліся зубы. За фортачкай скрыпнуў ложак.

- Ты, што гэта сягоньніка ўсхадзіўся? Мала табе яшчо?

У голасе - пажаданасьць.

- А табе шкада? Змыліцца яна, ці што? - зарагатаў Сабакевіч. - Ці можа старому астаўляіш?

- Сьлінька той! Каб ён мог! Насапецца, запыхціць, як кавальскі мех. Абрыдзеў ужо.

Пагардлівы, зьмяіны, з тоненькім, ядавітым джалам, голас. Джала пеканула Сявеньку пад самае рабро. Перад вачмі замаячыліся чырвоныя, зялёныя й сінія кругі. Дрыжэлі рукі. Але ўжо Сявенькавы ногі борзда нясьлі яго навокал хаты. У сянёх ля дзьвярэй, са сталярскага стала рукі схапілі тапор.

Таго самага дня, калі сонца садзілася за Гаравацкую пушчу, Бурачыха вярталася з Гацяў. Ад гасьцінцу пайшла чыгункай, пералезла праз плот на Сявенькаў хутар. Бурачысе нікуды не сьпяшылася і яна разглядалася навокал, паўз Сявенькаву пуню кіравалася на бальшак, за

якім чакаў дом. Ля пуні спынілася, прыслухалася. Навокал нікога ня відаць было, адно з хаты далятаў зьняможаны плач дзяціны, а ў дварэ скавытаў сабака. Бурачыху ня зьдзіві-бы звычайны дзіцячы плач. Ці мала дзе й калі дзеці плачуць. Але плач Марылінага Валодзькі насычаны быў зьняможаным хрыпам, такім, які чуеш у дзіця, што плача доўгія гадзіны. Бурачыха стаяла й мяркавала. І сабака скавытаў дзіка, зусім неяк непасабачаму.

Жанчына хуткім крокам рушыла на двор. Здалёк пабачыла адчыненыя ў сянёх дзьверы, збоку самакат. Сабака не забрахаў, як звычайна, а кінуўся ў ногі, вішчаў зь нейкага дуру. Бурачыха на момант спынілася. Дзяціны плач перайшоў у цяжкі, зьняможаны хрып.

Яна ступіла на прыступак ля парогу сяней і зірнула ўглыб, ды ледзь на нагах утрымалася. На бэльцы, пад паваленай драбінай вісеў чалавек. Бурачыха закрыла твар рукой і тады зноў, быццам хочачы ўпэўніцца, што гэта не зьява, зірнула яшчэ раз налева. Новая, з таўстой сівой пянькі, вяроўка ўелася ў шыю й неяк дзіўна задрала ўверх Сявенькаву бараду. Жанчына манілася падыйсьці бліжэй, прыгледзецца, але з хаты прынадзіў яе хрыплы галасок і яна шырака адчыніла дзьверы.

На парозе, ля дзьвярэй спальні, запэцканы ў чырвонае, засьлінены, жахлівы, ледзь яго пазнаць, тросься й хрыпеў малы Валодзька.

- Госпадзі мой нябесны! - жахнулася Бурачых й падыйшла да адчыненых дзьвярэй спальні. Вочы яе шырэлі й здавалася, што вось-вось зь ямаў твару выскачуць. Звычайна лагодны твар перацяўся жахлівым перапалохам. Пачалі дрыжэць вусны, рукі, жанчына пахіснулася і, як цяжкі мех, асунулася на падлогу побач закрываўленага хлопчыка.

41

Выпрастаўшы босыя ногі на калясцы, Янук пусьціў вольна лейцы й кабыла йшла гасьцінцам бяз прынукі. Адно ўважаць трэба было на грузавыя аўтамашыны. Янук не бачыў чэрвеньскага хараства прыроды: ні зелянеючых лугоў, ні прыбранага, быццам на Сёмуху, лесу, ні жоўці

красак побач дарогі, ні кучаравых, як бараноў, хмарак на блакітным небе. Змучаны хлапец ехаў у паўдрымоце.

Ад часу, калі зьявіўся дзядзька Хвёдар, адбыліся ў Бахмачоў перамены. Перш за ўсё параілі Януку кінуць школу й пайсьці працаваць на пошту. Бацька зь недаверам аднёсься да братавай думкі, што лепш у калгас ісьці раней чым пасьля, бо ўсяроўна ня выкруцішся. Хоць штучнае акупантава дзяцішча ўжо спавівалі ў Літоўцах, хоць і заявіла яно аб сваім узыходзе на гістарычную літоўскую плятформу хрыплым Пятуховым голасам, не хапала яму жывога й здаровага дыханьня. Забойства Косьціка, Марылі й самагубства Сявенькі да глыбі страсанула вёску, прынесла непажаданыя насьледкі. Як узгарэўшы, пачаў цяпер праяўляць надзвычайную «бдзіцельнасьць» Лявон Шпунт, асабліва-ж пасьля таго, як патрымалі яго ў НКВД, дзе, як мяркавалі, насьпяваў цэлую лісту кандыдатаў у далейшаыя падарожжы. Забралі Антося Дзеркача, старога Бурака з жонкай, пацягалі, але выпусьцілі языкаватага лекара Зянькевіча. Прыціхлі людзі ў начоўках літоўскіх. Сявенькава й Буракова, - дзьве найбольшыя гаспадаркі ў Літоўцах, - сталіся асновай калгасу «героя Чапаева». Ня ў прыклад іншым, новасьпечаныя калгасьнікі браліся за гаспадарку, як агонь за мокрае. Зноў пайшлі чуткі пра далейшае раскулачваньне багацейшых сялянаў, на сходах часта да хрыпаты гучэў гістэрычны Шпунтоў голас. Сам старшыня таго ненатуральнага дзецішча, Сымон Пятух далей смуродзіў цыбуком з карашкоў, хадзіў бадзёра мабілізаваць «адзіналічнікаў». Людзі, звычайна, адкупліваліся самагонкай і, такім чынам, Пятуховы энтузіязм да гаспадаркі часта-густа расплываўся ў алькагольнай ханжы. Учарашнія сябры камбеду, цяперашнія калгасьнікі, ласыя на чужое марудзілі, азіраліся па бакох і шматлікія ўжо бачылі, што «канчалася кату масьленіца». Аднаасобнікі, у тым ліку й Пракоп Бахмач, памалу кешкаліся ля сваіх гаспадарак, сачылі як замыкалася ўдушлівае кола. Хвёдараў паварот з глыбі Расеі падмацаваў Пракопа, даў спадзяваньні, што на ўсялякі выпадак, калі прыйдзе патрэба, зьявяцца на помач «плечы». Навет Лявон Шпунт адносіўся да яго накш чым да іншых, зусім не насядаў, а Пятух і зусім абмінаў, бо ведаў, што не чакае яго ні гарэлка ні пашана ў Бахмачовай хаце.

Паралюш сялянскага жыцьця йшоў побач зусім няпрыхаванай трывогі. Чакалі нечага новага, быццам яшчэ горшага й ніхто ня мог

вызначыць у якой хворме гэнае нешта мае выявіцца. Навет дзед Якуб зрабіўся бурклівым, радзеў на сваей прызьбе, грэўся. Мо спанатрыў, што перапалоханыя людзі на давер скупіліся. Зіма даўным-даўно адыйшла на поўнач, але загнязьдзілася ў сэрцах сялян літоўскіх зіма яшчэ жахлівейшая, - тая, што запаволіла й часткова спараліжавала самае звычайнае жыцьцёвае тэмпа.

Дзесь за межамі й далей той калішняй «моцарствовай» многа глуму нарабіў «неміц». Пасьля маланкавых паходаў на тры бакі сьвету, прытаіўся дзесь і цікаваў новую здабычу бэрлінскі абжора-груган. Ці ягоны страўнік не палягчэў яшчэ перад новым нападам, ці ня вымяркаваў зь якога боку насесьці на новую ахвяру...

Панавала немач і роспач. Сьціскаліся злосна зубы, бездапаможна ў малітвах да Бога складаліся далоні. Блудзіў сялянскі зрок па пагвалчаных нівах і млелі ногі ў чэргах перад дзяржаўнымі крамамі. Чужнік-гвалтаўнік рукамі «ваінствуюшчых бязбожнікаў» зачыняў сьвятыні, ськідаў зь вежаў крыжы. Разбураліся адвечныя асновы. Што прыйдзе заўтра? - Ніхай хоць чорт прыдзіць, абы пірамена, абы лепі было жыць, - гаварылі ў роспачы людзі.

Тымчасам чужнікі новым «налогам» запрэглі сялянскіх коней. У Гацях ля чыгункі зладоўвалі й насыпалі вялікія й даўгія валы каменьня зь ліку «па трыццаць кубаметраў на лошадзь». Каменьне ладавалі на цягнікі, адвозілі некуды на будову лётнішчаў. Іншыя-ж звозілі каменьне аж у Слабаду. На роўным узвышшы за вёскай масьцілі шляхі для самалётаў зьняможаныя, галодныя, абдзёртыя нявольнікі, прыгнаныя сюды Бог ведае зь якіх глыбіняў «ніаб'ятнай».

Янук адпрасіўся з працы на пошце, каб памагчы бацьку вывезьці «па трыццаць кубаметраў ма лошадзь». Вялікае каменьне, што мог падняць ці ўскаціць па дошцы на каляску, браў з адхонаў чыгункі, з Гараваткі й калішняга панскага поля. Цяжкага возу не накладаў, каб кабыле пасобіць. Цяпер Янук ехаў паволі дамоў і мяркаваў, ці ўсьпее яшчэ адзін воз да захаду сонца наладаваць і ў Гаці завезьці. Заробленыя грошы па аднаму чырвонцу на кубамэтар, прыабяцаў яму бацька на касьцюм.

Янук спыніўся на абочыне гасьцінцу, зьлез з каляскі, разглянуўся па бакох і з прыдарожнага, сьвежа скошанага, ужо падсохлага сена ўськінуў вялікі ахапак у каляску. Далей ехаў паволі. прыжмурыў вочы, думаў пра розныя апошнія падзеі й бачыў перад сабой адно руды

кабылін зад, што раўнамерна гойдаўся на бакі, хвост, што часта па бакох сьцёбаў ды адвіслую на правы бок грыву.

- Янучок! Ты што, заснуў гэта?

Дзявочы сьмяхотлівы галасок празьвінеў над левым Януковым вухам і аж спалохаў яго. Побач, на самакаце зьявілася Дуня. Пышнай усьмешкай зьзяў яе загарэла-асмужаны, радасны тварык. Даўгія, мяккія валосы перавязала блакітнай касынкай, а паркалёвая, жоўтая сукенка зьвіла дробнымі ружовымі краскамі. Зь пяшчотна адчыненых поўных ружовых вусенак вызіралі роўныя, белыя зубкі. Зухавата-прынадныя вочы зь хітрынкай-праменьчыкам пазіралі на хлапца.

- А ты адкуль узялася?

- Зь неба звалілася. Ха-ха-ха!

- Гэта табе на небе самакат далі?

- О так! Сьвяты Мікола даў! Ха-ха-ха!

Янук зручна перахінуўся праз бок каляскі і ўшчыпнуў Дуню за бок.

- Ах ты, нягоднік! Няможна так! Скажу маме, дык яна цябе вылупцуіць, - сьмяялася дзяўчына.

Дуня абаперлася правай рукой аб борт каляскі й так хвіліну ехалі моўчкі. Янук пазіраў на поўныя дзяўчыніны грудзі, гладзенькі падбародак, круглую, як адточаную добрым майстрам, шыю і далей уніз, дзе рама мужчынскага самакату зусім загаліла Дуніны ногі.

- Адкуль-жа ты самакат узяла?

- Казала табе, што сьвяты Мікола даў, ха-ха-ха, - рагатала дзяўчына.

- Гэта, мусіць, сьвяты Мікола некага раскулачваць памагаў... Га-га-га! - зарагатаў Янук.

Макатунішка нічога не адказала, адно зірнула на яго скоса.

- Ты з Гацяў едзеш? - спытаў Янук.

- Ага.

- Школу скончыла?

- На днях ужо.

Зноў хвіліна маўчаньня. Мінулі чугуначны пераезд.

- Ты знаеш што, Янучок?

- Ну?

- Даўно з табой пагаварыць хацела.

- Гавары.

Бурклівы Янук прыгадаў ці адну жаўнерскую руку, што гарнула-туліла гэту дзяўчыну на вечарынах, яшчэ цяпер зьвінела ейнае хіхіканьне ў цемры. Кальнула ў сэрца. І стаяла яна побач, як цудоўная, пышна расьцьвіўшая зьява, зь беленькімі зубкамі, мяккімі вусенкамі й выклікаючымі на паядынак вачмі-васількамі. Стаяла ўдзень і ўночы. І нараджаліся думкі. Часам, у юнацкіх снох, сядала яму на калені, моцна-моцна гарнулася-тулілася, горача, да страты прытомнасьці цалавала. Зьява вялікая, як цьвітучае жыцьцё, як цудоўная вясна, як сьветлая крыніца.

Але вось зьявілася яна побач, тымі васількамі скрабла-вярэдзіла кволыя струны. І ня мог Янук проста ў вочы ёй зірнуць. А дзяўчына, нахабніца, зводзіла, быццам у самае нутро ягонай душы зазірнуць намагалася.

- Як тут во так пагаворыш...

- А чаму не?

- Давай паглядзім, што ў лесе робіцца.

- А кабылу дзе дзець?

- Прывяжы, ні ўцячэць.

Янук падумаў.

- Трэба было-б яшчэ воз каменьня на станцыю завезьці.

- Нікуды яно ні ўцячэць, каменьне тваё. Здаганяй мяне!

Дзяўчына раптоўна націснула на самакат і гонка пусьцілася гасьцінцам, аж хвост касынкі з пушыстымі валосамі забаўляўся. Янук пугай сьвіснуў над кабылай і сьцебнуў па бакох лейцамі. Кабыла трушком пабегла за дзяўчынай. Дуня азіралася, махала рукой, падганяла.. Уехаўшы ў Гаравацкую пушчу, яна павярнула направа ў бочную дарогу. Гэтта лес быў густы, колы стукалі па карэньні. Дуня пад'ехала яшчэ добры кавалак, павярнула налева й на малой паляне зьлезла з самакату. Янук прывязаў кабылу да камля бярозы, адпусьціў падпругу, узяў з возу й падкінуў ей сена. Азірнуўся. Самакат ляжаў пад хвояй, а дзяўчыны нідзе ня было відаць.

- Ку-ку! Ку-ку! Лаві зязюльку!

Звонкі галасок прыляцеў зь левага боку й рэхам адгукнуўся ў глыбі пушчы. Скосныя праменьні сонца залацілі маладое лісьце, нос казытаў арамат красак. Воддаль дзесь закукавала запраўдная зязюлька. Янук скочыў у гушчар налева.

Бярозанька, сасоначка.
пакліч майго мілёначка.
Жду хвілінку, жду я дзьве,
ды мілёначак ня йдзець.

- Гэта, раней няведамая Януку песенька даляцела да яго з глыбі лесу з правага боку. Не марудзячы, хлапец кінуўся туды. Дрэвы парадзелі. Як матылёк, дзяўчына пырхала ад аднаго дрэва да другога навокал паляны. Янук нагнаў яе і ўчапіўся за руку. Дуня зручна крутнулася, падставіла нагу й хлапец не агледзеўся, як ляжаў на траве, а а Макатунішка гарэзьліва ўсьміхалася, з вышыні пазірала яму проста ў вочы.

- Даганяў мяне, пакуль цябе ні злавіла! Ха-ха-ха!

Янук схапіў яе за нагу й пакаціў.

- Я-ж цябе цяперака нашчакачу!

Бахмач казытаў за бакі, за грудзі, а дзяўчына-рагатуха аж заходзілася ад сьмеху. Ён спыніў казытаньне, пачырванеў, сарамяжліва паглядзеў на грудзі, што хвалявaліся пад тонкім крамным паркалем, на поўадкрытыя вусны, гарэзьлівыя вочкі. Дуніны рукі схапілі хлопца абцугамі й сьмела, прагавіта прыляглі да ягоных дзявочыя вусны. Янук адчуваў п'яную асалоду. І вусны, і краскі, і выразна чутнае біцьцё Дунінага сэрца зьлілося зь недалёкім кукаваньнем зязюлі, зь іншымі птушынымі сьпевамі. Хлапец шыбаваў дзесь над хмарамі да цудоўных, нязьведаных вышыняў. Дзяўчына адняла вусны.

- Янучок, ты мой міленькі, які-ж ты дурненькі, - сказала.

- Чаму?

- Ці-ж ты ня відзіш, што цябе люблю? Чаго-ж стыдаішся?

- І я..., - зацяўся Янук, зірнуў набок, - цябе люблю...

- Дай мне сваю руку, - загадала, ды схапіла левую Янукову руку.

- Ты калі шчупаў дзяўчыну?

- Што?

Яна павяла Янукову руку пад сукенку й зноў прагна прыліпла да ягоных вуснаў. Хлапец дрыжэў, набухаў, здавалася, як пузыр, што неўзабаве лопне. Млоснасьць і павышаны пульс зусім адурманілі яго. Здавалася, што перагарыць з напружаньня. І калі ўжо зусім забрала дыханьне, дзяўчына прахапілася, адпіхнула яго й чырвоная, палкая, цяжка дыхала.

- Хацеў-бы, можа! - сказала глухім голасам і пагрозьліва памахала пальцам. - На бярозцы грушы растуць!

- Я-ж табе пакажу, як зводзіць, нястыдніца ты! - крыкнуў злосна Янук.

Дуня нырнула між дрэваў і пакуль задыханы Янук выбег на паляну, яна ўжо ціснула на ступні самакату.

У тую ноч доўга ня мог заснуць Янук Бахмач. Трызьнілася й зводзіла Дуня, а кабыла зь цяжкім возам каменьня напінала гужы й ніяк не магла ўзабрацца на ўзгорак на гасьцінцы.

Таронта, 1971-1973

К. Акула

ГАРАВАТКА

КНІГА ТРЭЦЯЯ

БЕЛАРУСЫ, ВАС ЧАКАЕ ЗЯМЛЯ

"Пагоня"
Таронта
1981

КНІГА ІІІ. БЕЛАРУСЫ, ВАС ЧАКАЕ ЗЯМЛЯ

Памяці змагароў,
што ахвяравалі жыцьцё
за волю Беларусі

1

Сонца пражыла шыю, пот выступаў на лбе, каструбаватая кужэльная кашуля, добра нявыкачаная, відаць, валкам, церла бакі, а ў кішэні спацелая рука камечыла хрусткія чырвонцы. Чырвеньскі дзень сухменем загаспадарыў над местам на ўзгорку, шырокай далінай сенажацяў направа ды старымі, часта цяжарам гадоў пахіленымі бярозамі, што аж у два шэрагі з кажнага боку праводзілі ў даль глыбоцкі гасьцінец. Янук спыніўся на абочыне між касалапых бярозаў і пазіраў на ўсход. Дзесьці гэтта крынічылі першыя воды, зь якіх нараджалася Бяроза рака, названая яшчэ Бярэзінай, а гэта таму, што быццам спад бярозы пачатак брала. Ці раз ужо хлапец абяцаў сабе знайсьці тую крыніцу, але гэта, відаць, ня так проста было. Рака зьбіралася зь некалькіх рукавоў і трэба было хто ведае якую адлегласьць прайсьці, каб на адно саліднае рэчышча натрапіць.

Над Докшыцамі панаваў млявы летні супакой. У самым цэнтры чубам гусьцелі пышныя дрэвы, схавалася старая драўляная царква. Даўно спыніў млоснае бомканьне невялікі звон, але сяляне, - гэта ведаў Янук, - пэўне таўкуцца навокал царквы групамі, кураць, перасейваюць-пераможуваюць страшную навіну.

Вайна!

Слова даляцела да Януковых вушэй ад сярмяжнікаў і мяшчанаў. Падзея гэта, відаць, спрычынілася, што больш народу вонках, чымся ў царкве было. Адно тады зразумеў юнак, чаму пазачынялі сяньня дзяўржаўныя крамы, у якіх звычайна «у выхадныя» гандлявалі.

Вайна!

Пяцілітарнае слова пырхала з адных вуснаў у другія, насьцярожвала твары, моршчыла ілбы, спараліжавала гарэзьлівасьць і вясёласьць. Некаторыя твары распрамяніліся ці ня ў сілу таго, што «ніхай абы чорт прыйдзіць, абы ня гэтыя, абы зьмена». Скупасьць вестак пра вайну лажылася на заклапочаных тварах загадкай. Ведама было, што «Неміц бамбіў Кіеў і Коўна» яшчэ недзе на золаку. Хто каго пагнаў? Хто дужэйшы? Ведалі, што напаў «Неміц» ды і ўсё. Вестка тая зьявілася, відаць, у траскучым дэтэктары «ня з гэтага, а таго боку». Значыцца, праўда, бо «брахні з гэтага боку» даўно верыць перасталі. Скупасьць навін нарадзіла трывогу, няпэўнасьць. Што яна, гэта новая катастрофа, прынясе?

Злосны Янук, схіліўшы галаву, памалу рушыў сьцежкай ля гасьцінцу. Чэрці! Пачакаць не маглі! Такую аграмадную гару каменьня вывез, кабылу зацягаў, першы ў жыцьці касьцюм спадзяваўся сабе справіць. Ужо вакол таго касьцюму пляны вялікія снаваў. Уяўляў, як зьдзівіцца Дуня, калі так прыгожа, як дзяцюк апрануўшыся, на вечарынку яе павядзе.

Рупіла Януку перад Стасем новым касьцюмам «пафарсіць». А як-жа! І перад Уладзікам навет! А чаму-ж-бы й не перад ім? Тады няхай-бы зайздросьцілі. Сваймі-ж рукамі зарабіў. А Дуня... Нашто ўжо ёй тады было-б на каго аглядацца, калі такога прыгожага свайго дзяцюка на вечарыне забаўляла-б... Дый тут мо не пра агляданьне на іншых ішло. Яна-ж ягоная дзяўчына была, прынамся так здавалася, хоць часам, - Бог яе ведае, - надта-ж гарэзіла. Упікала яго гэта ейная нейкая зьверхнасьць, лёгкаважаньне. Быццам ласку табе рабіла прыгажуня, прост-напраст цудоўная, у панскія модныя транты аздобленая. Што й гаварыць... Ляпей было-б дзяўчыну пры сабе трымаць, ад нейкіх чужнікаў-байцоў яе адгарадзіць. Няхай бы бачыла, што ён - не жабоцька нейкі, а зусім ужо ўзрослы, дасьпелы дзяцюк. Вось як!

Салодкая, прынадная думка прапала, як мыльны пузыр. Няведамы прагавіты напасьнік, што праглынуў ладны кавалак Эўропы, пакрыжаваў і сьціплыя Януковы пляны. Намагаўся хлапец вайну ўявіць. Цяжка. Мала што старыя апавядаюць: «сьвішчуць кулі, як касой людзей косяць, з арудзіяў бухаюць, ура крычаць, конныя й пехата шквалам налятаюць!» І што яшчэ? Словы, словы. Можа калі й было так... І нічагусенькі пра танкі й самалёты. Трывожнае паднечаньне прыйшло на зьмену таму вялікаму жалю, што цяжка

запрацаванага касьцюму няма як купіць. А перадусім няпэўнасьць. Ці прыйдзе вайна сюды? А калі так, што яна прынясе?

Быцам пляшамі на хворай галаве, лапіклы ніваў сьвяціліся пусткаю, пазарасталі лебядой, пырнікам, сьвірэпкай і асотам. Гэта там, дзе каторыя сяляне, ня вытрымаўшы вялізных бальшавіцкіх падаткаў, пакідалі родныя нівы. Бедная зямля! У іншых мясцох пышнымі дыванамі каласілася, гойдалася жыта, араматам пракосам млелі сенажаці, пырхалі між красак шматкалёрныя матылькі, гудзелі шмялі й пчолы, зыгавалі пры кустох ад аваднёў каровы. Сьвятая нядзелька спыніла працавітыя мазольныя рукі. Добраслоўлены супакой. Пад загрозай калгаснай прыгоншчыны, гаспадар павольным, удумлівым крокам брыдзе па полі, любуецца поўнай нівай і сьлязу выціскае над апустошанай. І ў дзень такі ці-ж льга было паверыць, што дзесьці на захадзе разгарэлася ўжо вялікае полымя, што паўзе сюды, уядаецца ў ціхую й зьнявечаную старонку?

Гул пачуўся з заходняга боку. Янук стрымаў крок, закрыў брылём далоні ад сонца вочы ды ўглядаўся ў смуглява-блакітны прастор неба. Адзін-адзіноханькі малы самалёцік плыў паволі чорным крыжыкам так высока, што нельга было ягоных знакаў распазнаць. Мізэрненькая сірата, наводля тых з калісь расхваленага «баёвага лётніцтва моцарствовай». У вялікім і чыстым прасторы сакавітай прыроды ён гудзеў недарэчным шаршнём.

Неўзабаве гул аціх і Янук паклыпаў далей пыльнай сьцежкай ля гасьцінцу. Прысьпешыў кроку. Трэба было жвавей дахаты. Выйшаў рана, калі яшчэ не раскатурхалася вёска. Цяпер, пэўне-ж, нязвычайная навіна ўжо ў літоўскія начоўкі даляцела.

Перад хатай гаманілі Пракоп і Алесь. Янук падыйшоў да іх.

- А што-ж ён... Ну, кажыць, нічаво няізьвесна, - гаварыў швагру Пракоп. - Вайна то вайна, кажыць, будзім сматрэць...

- Пра каго гэта ты, тата? - спытаў сын.

- Ды пра Хвёдара. Я ў Гацях быў, каб даведацца што там дзе робіцца. Ну а ты? Дзе твой касьцюм? Чаму з пустымі рукамі?

- Вайны спалохаліся, крамы пазачынялі, нічога ня купіш, - крыўдзіўся Янук.

- Ты глядзі як, - разважаў Пракоп. - Ну а што ў горадзе чуваць?

- Мала. Пра вайну ля царквы чуў, а так ніхто болі нічога ні знаіць Кажуць што яшчэ на золаку Неміц Коўна й Кіеў збамбіў.

- Бог знаіць што будзіць, - сказаў бацька. - Ну што там, Уладзімер, чуваць? - гукнуў да Пятуха, які ад лекара Зянькевіча выйшаў.

- Нешта яны зь Менску, чэрці, нічога не гавораць. Кажуць, што на «сьвяшчэнным рубяжы» баі заядлыя, што «доблісная» сьцяной стаіць, алі хто каго... нічога ані гу-гу... А так усё баявыя песьні граюць.

- Дзе гэта так? - спытаў Янук.

- Ды ў радзіве, - адказаў Уладзімер. - Мусіць там нейкія ніпіраліўкі ў іх. Каб пагналі Немца, ох як гарлапанілі-б...

2

Марыя Іванаўна тупала па абшырным пакоі, цёрла вочы й паўтарала: - І што я буду цяпер рабіць? Што буду рабіць?

Жанчыну асядлаў страх. Рассыпаныя валосы, стары зношаны сарафан. Яна, здавалася, пастарэла ад першай сустрэчы ў Літоўцах на гадоў дзесяць.

- Як ён мог так зрабіць, пакінуць нас самых, ні сказаўшы, ці вернецца ці не! І што я буду рабіць, як гірманцы прыйдуць, га?

Бахмачы сядзелі на шырокай, папраседжанай, зь дзіркамі, скуранай канапе, што, відаць, часы «севера-западной жалезнай дарогі» прыгадвала. Пакой знаходзіўся ў вадным з абшырных будынкаў блізу гацкае станцыі. Гэтта некалі «каляяжы» жылі. Апроч старой рудой канапы ў пакоі стаяла яшчэ старамодная шафа з пасудай і стол з чатырма, даўно не аднаўлянымі, крэсламі - цэлы камплет. Калісьці чырвоная драўляная падлога цяпер прасьвечвалася пратоптанымі да гладзі драўляных слаёў сьцежкамі.

На абклееных паперай у краскі сьценах стоўпіліся ў зашклёных рамках сямейныя здымкі. На аднэй зь іх Хвёдар Бахмач трымаў позу - проста ў лоб, - у поўным муньдзіры чыгуначніка ў нейкага традыцыйнага фатографа. Сур'ёзны, бяз усьмешкі, васковы твар. Відаць, што фатографы гэныя можа на цэлую шырыню «ніаб'ятнай» дый калішняй Рэчыпаспалітай ад аднаго нямудрага бацькі вяліся: «Рукі так во перад сабой, ні глядзець у бакі, вачмі ня моргаць, а так во проста на плёнку. Не, не варушыцца, бо ня выйдзе...» Тэхніка! Чорт вас

ведае, - думаў аб'ект плёнкі, - можа й ня брэшаце. Руб ці злот улепіш і хвашчыся тады, як ня выйдзе!

- Давольна, мамаша, неяк будзе, - буркнуў пры стале Ўладзімер. - Калі нічога ні сказаў дык уж, пажалуй, вернецца.

- От да, разумнік найшоўся! Неяк будзе! - паднецілася Марыя Іванаўна ды шпарчэй затупала па вытаптанай падлозе. - Уж ты, мой ангел храніцель, пасаветуеш, старую бабу забясьпечыш. Што будзе, як германцы прыйдуць?

- Пачакай, - адазваўся заклапочаны Пракоп, - давай ні сьпяшым, памяркуем. Чаму ўжо адразу так Немцы прыйдуць? Адкуль вы гэта ўзялі?

- Як адкуль? З запада во ізьвесьція прыйшлі: Беласток, Гродна, Ліда занятыя. Наверна яны ўжо ў Маладзечне. Тут-жа во праездам людзі былі, перадалі. Нашы на цэльным фроньце ў паніцы. Афіцыяльна-ж нічога няма, усе ўцякаюць напралом. Можа й майго тая вална падхваціла. Учора вечарам пайшоў, хоць ужо пасьля бамбёжкі тут нармальна ні работалі. Я ўсю ноч ні спала. Пабегла утрачкам, а там нікога...

- Дык, што ў Гацях ніхто з савецкіх ні астаўся?

- Усё начальства на скрут галавы ўдрала: і НКВД, і міліцыя, і з жалезнай дарогі. Пасьля першай бамбёжкі як падурэлі, а ўчора яшчэ хужэ. От толька некаторыя сем'і жалезнадарожнікаў асталіся, тых, значыцца, што ў разьездах. Учора позна прыйшло ізьвесьція, што недзе окала старай граніцы германцы вялікі мост збамбілі, так поездам ужо пуці нету...

- Дык можа Хвёдар і вернецца? - мяркаваў Пракоп.

- Вернецца, вернецца... Чаму-ж ён нас з сабой не забраў?

Настала прыкрае маўчаньне.

- Знаеш што, Марыя? Як што якое, перабірайся з сынам да нас. Пакуль усё ўляжыцца, у вёсцы перасядзець лепі. А калі й Неміц прыйдзіць, дык што ён табе, бабе з сынам, зробіць? Ня можа-ж быць, каб ён да цябе прычапіўся...

- Дзякую табе, Пракоп, - адказала братавая, - але цесна ў вас. Што будзе тое й будзе, лепей ужо тут будзем. А там далей будзіць відаць. Так, сынок?

- Ну да, мамаша, так і зробім, - згадзіўся Ўладзімер.

Сядзелі й разважалі доўга. Канфузіяй і трывогай перасыпалася гутарка. Зьдзіўленьню ня было мяжы: як гэта такая, на выгляд магутная, бальшавіцкая армія ў першыя дні вайны рассыпалася-разьбеглася ў жаху й паніцы?

Прыгадаў Янук учарашні дзень. Намовіў Стася, - дый ці трэба было яго намаўляць? - каб зьбегаць у Гаці й праведаць, як вайна йдзе. Перад полуднем, каля дзясятай, нацянькі, праз пушчу дайшлі яны ўжо польскага вайсковага могільніку, як на захадзе пачуўся роўны гул, што рос, прыбліжаўся. Нізка над чыгункай паказаліся тры сярэбраныя, двухматорныя самалёты. Выглядала, што двайныя хвасты мелі. З-над станцыі прыляцеў жахлівы гук узрываў, якога ня толькі раней ня чулі, але і ўявіць не маглі. Насамперш сьвіст, а пасьля выбухі. Зь перапалоху хлопцы на зямлю пападалі. Бомбы трапілі ў вялікі склад будаўляных матар'ялаў ля таго «фазаво», некалькі ўзарвалася між вагонаў. Уверх шуганула полымя й дым. Моцна білася Янукова сэрца, зусім зьбянтэжыўся Стась.

- Каб іх халерачка, але-ж і ўпсяюрылі. Глядзі, загарэлася!

Адно хлопцы ўсталі, каб падыйсьці бліжэй, як самалёты зрабіўшы вялікую дугу ў паўночны бок, зноў прыляцелі з захаду й яшчэ раз паўтарыўся ашаламляючы сьвіст і выбухі. Усё гэта стаяла цяпер у Януковых вачох.

Марыя Іванаўна, Уладзімер, Янук і Пракоп выйшлі з хаты, спыніліся ля даўгой, некалі зялёнай, цяпер ужо шэрай лаўкі. На яе сьпінцы відаць былі пачарнелыя мэталёвыя лацінскія літары - ПКП, а пад імі глыбака ножам выразанае - «палякі курвы праклятыя». Бахмачы пазіралі на чыгуначныя шляхі. Дыміў яшчэ склад ля «фазаво», курыліся й некаторыя вагоны. Вецер дыхаў смуродам гумы й смалы. Між вагонаў завіхаліся людзі.

Ужо пазьней, з адлегласьці перажытага, ахрысьцілі мясцовыя жыхары гэны пэрыяд, - ад часу, калі «змыліся бальшавікі» да прыходу Немцаў, - «біларускай уладай». Наляталі людзі на казённыя крамы, вагоны, склады. Багацейшыя Жыды, што нейкім шляхам больш за ўсіх пра вайну ведалі, уцякалі на ўсход неўзабаве пасьля атрыманьня жахлівае весткі. Адно найбяднейшыя аставаліся.

Разгледзеўшыся й памеркаваўшы, Пракоп зноў прыгадаў Марыі Іванаўне, каб у выпадку чаго да яго з сынам перабіралася, а жанчына зноў выказала спадзяваньне, што Хвёдар вернецца.

- Што, тата, будзем рабіць? - спытаў Янук пасьля разьвітаньня.

- Давай паглядзім дзе й што... Можа й нам што пападзець.

У бок ад вакзалу натрапілі ці ні на самы большы цэнтр актыўнасьці. Ля вялізных дзьвёх цыстэрнаў кешкаліся мужчыны. З крану вёдрамі налівалі сьпірт, шмат яго разьлівалі ў жвір. Таўханіна й гармідар. Побач, сеўшы на рэйках і шпалах, голасна гаманілі ўжо найбольш вясёленькія. Выявілася, што сьпірт з цыстэрнаў прыйшоўся да спадобы мясцовым і налётным п'яніцам. Бахмачы прыглядаліся з адлегласьці.

- От і брыда! - плюнуў Пракоп. - Во каму цяпер воля!

- А колькі зь іх ужо нажлопалася! - падтрымаў бацьку Янук.

Позна вечарам Бахмачы валаклі дахаты кажны па тоўстым скрутку «мануфактуры». Было гэта цёмнага колеру сукно. Нялёгка да яго дабраліся. Ля вагону таўкліся дзясяткі людзей, напралом адзін праз аднаго пяліліся ў вадчыненыя дзьверы. Пракопу й Януку дасталося ці мала таўхалёў пакуль, нарэшце, удалося й ім паласавацца. Бачыў Янук увачох у людзей, зь якімі побач жыў, - нармальных, цяглавітых, працавітых людзей, - вялікую прагавітасьць, аграмадную заядласьць у здабыцьці нажывы.

- Але й натаўклі, каб іх халера! - скардзіўся бацьку, валочачы на плячох вялікі скрут матар'ялу.

- Ну але будзеш пекны касьцюм мець, - адказаў бацька.

- Касьцюм, хоць з награбленага, - усьміхнуўся сын.

- Яны нас, а цяперака мы іх, - дадаў, загадкава распрамяніўшыся Пракоп.

Янук зьдзівіўся. Нешта новае зьявілася на твары чалавека, які ў жыцьці сваім нікога ня скрыўдзіў.

- Як гэта? - спытаў хлапец.

- Ну ты-ж помніш як гэтыя басякі, значыцца Косьцік і Лявон, нада мной зьдзекваліся? Гэта-ж ня хто другі, а яны казалі пра таго брыду Леніна, што ён сам сказаў: «граб награбленае». Значыцца, як яны грабілі, дык чаму-ж іх няможна? Дык гэта-ж па праву ўсё наша. Глядзі во - дзіржалі на станцыі, а для бедных людзей у крамах нічагусянькі ня было. А гэта-ж ня грэх, сынок, сваё браць. Так ці не?

Сын уважна зірнуў на павольнага, памяркоўнага ў хадзе бацьку. І тады абое, як на сыгнал, зарагаталі.

3

Здавалася, што калішні рэвалюцыйны кліч «граб награбленае» падтрымаў-бы тых людзей падчас «біларускай улады» ў Гацях, якія намагаліся-б апраўдаць свае паступкі. Людзі гэныя - а была іх бальшыня, - у Бога верылі, навукай Хрыстовай у жыцьці кіраваліся, ніколі ня кралі. Адылі недахоп прадуктаў штодзённага ўжытку падчас бальшавіцкага глуму спанукаў цяпер кожнага, няхай сабе й самага маральна беззаганага, пашарыць па казённых складох, крамах, пашукаць дзе што ёсьць. Нікчэмная колькасьць солі, нафты й цукру, што знайшлася на полках, пайшла ў расход першая. Камплетна аголеныя крамы скардзіліся навосьцеж паадчынянымі дзьвярмі, пабітымі вокнамі. Шукальнікі тавараў разбрыліся па чыгуначных шляхох станцыі, правяралі таварныя вагоны й будынкі ўрадавых устаноў.

Янук і Стась добра пападбівалі сабе пяты, ад раньня намагаючыся што-небудзь знайсьці ў абчышчаным ужо мястэчку. У завулку, гэтта-ж ля галоўнае вуліцы, зазірнулі ў невялікі драўляны будынак із забітымі сьпераду дзьвярмі й вокнамі. Праз прачыненыя бакавыя дзьверы ўлезьлі ў сярэдзіну. Тут панаваў паўзмрок. Асьцярожна, каб у выпадку небясьпекі шмыгнуць наўцёкі, хлапцы разглядаліся. У нос ударыў тухла-салёны пах. Вочы цяпер прызвычаіліся да змроку. Гурбы зрэбных, напханых нечым мяхоў, званеныя ў груд, займалі цэлы невялікі будынак.

Відаць, што ранейшыя «разьведчыкі» папярэдзілі літоўскіх. Паразьвязаныя мяхі й вялікія кавалкі сушанай рыбы валяліся пад нагамі. Стась узяў у рукі вялікі шэры кавалак, адкусіў, пажваў, зморшчыўся і з агідай выплюнуў.

- Цьфу, салёная гадасьць нейкая!

- Але-ж, якая сухая, - гаварыў Янук, ломячы іншы кавалак. - Чаго плюеш?

- Надта-ж салёная.

Янук узяў кавалак у рот, пажваў і таксама выплюнуў.

- І хто яе такую, халеру, есьць! - у голасе чулася злосьць і рашчараваньне.

- Каб што добрае, дык думаеш яно валялася-б? Даўно расьцягалі-б.

- А каб вымачыць? - разважаў Янук.

- Кінь ты! - нагліў Стась. - Ідзём куды, мо што лепшае знайдзім.

Ля цыстэрнаў са сьпіртам нельга было прайсьці. П'яніцы гарлапанілі, лаяліся, іншыя-ж запэцканыя, алькаголем адурманеныя, спалі каля рэек. Едкі пах паразьліванага сьпірту трымаўся ў паветры. Першая цыстэрна апусьцела, завіхаліся ля другой. Ладна зыйшоўшы з поўдня прыпякала сонца.

- Глянь, колькі паразьлівалі. Але-ж ім і выгада. Хоць ты ў сьпірце купайся. Ня сьнілі такога. От-жа доўга помніць будуць! - сьмяяўся Янук.

З захаду, з боку сьветафору пачуліся адзіночныя стрэлы. Кулі ціўкнулі над галовамі. Адтуль ланцугом паволі йшлі жаўнеры. Пачаўся перапалох. Як мага, хлопцы ірванулі з чыгунак. Стась шмыгнуў першы, а па ягоных пятах Янук. Прабегшы ля карэлага будынку вакзалу, засопшыся, затрымаліся ў малым парку якраз ля вялікага помніка Сталіну.

- Але-ж чэрці напалохалі! - гаварыў зьбялелы Стась.

- Ты відзіў іх? - спытаў Янук.

- Каго?

- Немцаў, каго-ж, вунь там... Гэта-ж яны страляюць, - паказаў Янук у той бок, дзе раней спасьцярог ланцуг жаўнераў. Стрэлы прадаўжаліся й ад вагонаў у паніцы, з крыкам беглі людзі.

- Давай уцікаем! - дрыжэў Стась, - ато застрэляць.

- Чаго ты дрыжыш, як тая асіна? Яны над галовамі страляюць, каб людзей пастрашыць.

Аглядаючыся на чыгункі, хлапцы рушылі між дрэваў.

- А ты глядзі, гэтаму чорту нехта ўжо макаўку зьбіў! Ха-ха-ха! - рагатаў Янук.

Вялізная шэрая гіпсавая галава ляжала між белых рамонкаў ля плятформы помніка. Безгаловае тулава, яшчэ раней дзёгцем спэцканае, цяпер тарчэла нікчэмным аб'ектам у ваенным хаосе.

Па галоўнай вуліцы беглі людзі з клункамі ў руках, а між чыгуначных шляхоў трывала страляніна. Ужо пазьней выявілася, што ля цыстэрнаў Немцы пастралялі п'яніцаў, што спалі або ўцячы не змаглі.

Адно хлопцы дайшлі да Габішынай гарбатай, цяпер закрытай, крамы ў вілах дзьвюх вуліцаў, як з Глыбоцкае вуліцы пачуўся гула матораў. Сьпераду паволі ехалі дзьве запыленыя панцырныя машыны, з чорнымі крыжамі па бакох, а за імі - грузавікі з жаўнерамі. Людзі сьпяшылі сюды з усіх бакоў, выходзілі з хат, спыняліся на ходніках, каб прыгледзіцца гэтым новым «вызвольнікам».

Зь верху пярэдняй машыны разглядаўся маладжавы афіцэр зь сярэбранымі пагонамі. Ён махнуў рукой, калёна спынілася. Афіцэр пачаў разглядаць мапу. Пагрозьліва пазіралі з панцырных машынаў рулі цяжкіх кулямётаў. Тымчасам навокал машынаў гусьцелі людзі, цікаўна сачылі новапрыбылых, што вось безь ніякага вялікага гулу ці стрэлаў укаціліся ў мястэчка з глыбоцкага гасьцінцу. У кузавах жаўнеры. Спакойныя, суровыя твары ў шлёмах. Сядзяць на лаўках з абодвух бакоў адкрытага зьверху кузава, із стрэльбамі на «вольна».

- Віват! Віват!

Тонкі й прарэзьлівы голас пачуўся з групы людзей, што стаялі з другога боку вуліцы. Яго падхапілі й іншыя.

- Чуеш? - таўхануў Янука Стась.

- Хто-ж гэта іх так вітаіць? Ах, каб цябе! - зьдзівіўся Бахмач.

Крыкун падняў руку на прывітаньне Немцам.

- Дык гэта-ж Пшыбыльскі Збысек! - спасьцярог Янук.

Пшыбыльскі выводзіўся з тых бедных «каляяжаў», найбольш дакучлівых «панскіх блох», зь якімі Янук у гацкую школу хадзіў. Апрануты ў сіні гімназіяльны касьцюм, - магчыма, абноскі старэйшага брата, - уключна із шапкай з абрэзаным казырком. Ля яго церліся іншыя, добра ведамыя Бахмачу, «блохі». Зьненавіджанае кодла «пшэкаў», гарлапанаў, патрыётаў «моцарствовай». Гэта-ж яны тым заядлым «псякрэўскім» патрыятызмам заўсёды афішаваліся. Пры іх, быццам кураняты, стоўпіліся разныя паненачкі.

Пярэсты натоўп з двух бакоў вуліцы разявіў раты. Немцы ажывіліся ў аўтамашынах.

- Ты глядзі, якія салдаты чыстыя! - захапляўся побач голас. - Гэта ня тое, што брудныя бальшавікі!

- Москаў капут! - крыкнуў жаўнер з другой панцырнай машыны.

- Віват! - гарлапаніў у вадказ Збысек, а яму дружна памагалі сябры. Задавалоеныя ўсьмешкі на тварах, быццам сваіх уланаў віталі.

- Москаў капут! - паўтаралі із задаволенымі ўсьмешкамі Немцы.

- Я, я, Москаў капут! - згаджаліся Палякі.

Прыгадаўся Януку верасеньскі дзень, калі паўзьлі па гасьцінцы сотні танкаў. Закрываўлёнае сонца, трыюмфальная брама із прастрэленым вокам на дыктатаравым твары, павешаная Палякамі Параска Макатунішка... Дзе падзелася тая вялізарная сіла? Дзе тыя сотні й тысячы танкаў, гарматаў, аўтамашынаў, што на захад паўзьлі па чыгунцы за вокнамі гацкае школы? А гэтыя во, - зірні ты на іх, зухаў! - спачатку такога перцу далі бальшавікам, а цяпер незаўважна й паціхоньку ўлезьлі ў мястэчка.

Афоцэр зь першага возу войстра скамандаваў, паказаў рукой налева й калёна рушыла ў бок чыгуначнай станцыі.

- Давай, пойдзем паглядзім што ў школе робіцца, - прапанаваў Янук.

Ішлі побач чыгунак. Гар і дым ад разьбітых вагонаў і таго складу, што яшчэ тлелі, нікім нятушаныя, трывожыў насы. Лёгкі вецер забаўляўся пер'ем, то разьмятаў яго, падкідаў уверх, то зьбіраў у кучы між рэек, шпалаў і адхонаў. Нехта знайшоў вагон, у якім былі «пух і пер'е дзяржаве». Што не змаглі вынясьці, тое растрыбушылі, на вецер параскідалі.

На абочыне стаяў даўгі лянцуг плятформаў, наладаваных прыгожым бярозавым і хваёмым бярвеньнем. Некалі-ж было яно, пэўне, прызначанае ў «саюзную Гірманію». Цяпер тая вялікая «саюзьніца» з грукатам і трэскам сюды ўварвалася, ня было куды сьпяшыць. На першакляснае дрэва - выдатны будаўляны матар'ял, паглядаў не адзін селянін, мяркуючы, ці не магло-б яно трапіць у ягоную гаспадарку на зруб новае хаты ці гумна. Шкада! Сам ня хопіш, на плячох дамоў не завалачэш, талаку гукаць трэба. А хто мог сабраць яе за кароткі час «біларускай улады», калі кажны сам сабе, хоць маленькі кавалачак, хоць макулінку але ў сваё логава цягнуў? А каб дружна ўзялася група мужчын дзесяць з каляскамі, можа было-б усё бярвеньне вывезьці. Позна. Трапіць у рукі «саюзьнікаў».

Ля двухпавярховай школы панаваў вялікі рух. З паўдзённага боку вялікага двору стаялі грузавыя вайсковыя аўтамашыны. Побач, каля трысьцену, дзе складалі школьныя дровы й вугаль, дыміла круглая палявая кухня, ля якой завіхаліся кухары. З аўтамашынаў жаўнеры ўносілі ў школу свае рэчы. Чуваць былі крыкі каманды ў незразумелай

мове. Ля брамы плоту, із стрэльбай на правым плячы і ў шлёме, хадзіў роўным крокам вартавы.

Узыйшоўшы на пераезд, юнакі спыніліся. Яны спасьцераглі вартавых і між вагонаў на станцыі. «Біларуская ўлада» скончылася.

- Што рабіць? Падойдзем бліжэй? - пытаўся Стась Янука.

- Чорт іх знаіць... страшна неяк.

Местачковыя жыхары групамі зьбіраліся ля хатаў, дзяліліся апошнімі навінамі. І ў галасох, і на тварах - спадзяваньне на лепшае. Упэўненасьць, што ня будзе горшым за тое, што адыйшло.

На ўзгорку ля Слабады, кілямэтры на два адлеглай, дзе апошнімі часамі рукамі зьняволеных бальшавікі будавалі лётнішча, чуўся няспынны гул. З грукатлівым гудам прапелераў прызямляліся там тоўстабрухія транспартныя самалёты, зусім непадобныя да тых, сярэбраных, што кагадзе бамбілі станцыю.

- Ты глянь, ай-яй-яй, колькі іірапланаў! - захапляўся Стась.

- Віджу, не сьляпы-ж я!

Самалёты рабілі над лётнішчам круг і сядалі. Хлопцы спрабавалі іх лічыць, але наглядаючы й за тым, што робіцца навокал, неўзабаве зьбіліся з тропу.

4

Некалі на клеці Ўладзімера Пятуха гаспадарылі плякаты з напісамі «да здравствует». Перад камэдыяй, якую называлі выбарамі, панаваў гэтта васпаваты ледзянавокі Грузін. Іншым разам на зьмену прыходзілі плякаты на тэму «сустрэнем» і «перавыканаем».

А ў гэны ліпеньскі дзень зь Пятуховай сьцяны загаварылі новыя «вызвольнікі». Аграмадзіна-ваяка Вэрмахту, з аўтаматам у руцэ, вялізны бот з шыпамі на падэшве. А спад таго боту, з жахам у вачох, што вялічынёў па яблыку, быццам пацукі ўцякаюць ува ўсе бакі Жыды ў форме НКВД. А зьверху вялікі напіс:

ПАНЕСЛАСЯ ЖЫДА-БАЛЬШАВІЦКАЯ ХЭЎРА І БОЛЬШ НЯ ВЕРНЕЦЦА!

Аўтары плякату надта ўдала й пераконліва спалучылі асноўныя прапагандовыя элемэнты: магутную й непераможную сілу ў васобе нямецкага жаўнера й нікчэмнасьць паразітнае бальшавіцкае ўлады ў фігурах зьдзеклівых пацукоў з НКВД. Дый галоўнае: усё гэта ўцякло-»панеслася й больш ня вернецца». Цешцеся, яшчэ раз вызваленыя, з радасьцю пазірайце ў сьветлую будучыню. Запомніце, што што ворагамі вашымі былі жыдкі з НКВД. Спалучэньне «жыдкоў-пацукоў» зь ненавісным народу рэжымам рабіла выдатны эфэкт.

Зірніце яшчэ раз, «новавызваленыя». Вось ён - новы валадарны апякун, з аўтаматам у руках, грозныя, помстай поўныя вочы пад нізклім казырком шлёму, сьціснутыя вусны. Вялізны бот топча пацукоў «жыда-бальшавіцкае хэўры». Непераможны ваяка «новай Эўропы», каваль і гаспадар «новага парадку».

Суседні плякат, з малюнкамі сакавіта-ўраджайнага поля, гарэзьлівым вільчыкам на чубку страхі гумна й прывабнай хатай побач - ідылія-мара кажнага селяніна - гаварыў яшчэ больш важнае:

БЕЛАРУСЫ! ВАС ЧАКАЕ ЗЯМЛЯ!

Скупыя напісы й вялікі зьмест: магутны й шляхотны «вызвольнік», «жыда-бальшавіцкая хэўра», што больш ня вернецца; руплівага гаспадара чакае «зямля абяцаная». Што больш магло прыяць людзям, якія ў роспачы некалі казалі: «ніхай лепі сам чорт пануіць, абы ня гэтая брыда»?

Унізе пад гэнымі плякатамі вісела трэцяя, меншая паперка, задрукаваная выразнымі літарамі. Пасярод яе ўверсе, раскінуўшы шырака выстылізаваныя крыльлі, арол трымаў свастыку ў кіпцюрох. І загаловак: «Паведамленьні Галоўнае Каманды Нямецкіх Збройных Сілаў». Гэтта даволі шырака расьпісвалася дзе й што зрабілі Гітлеравы бамбавозы, ганчакі й зьнішчальнікі, якія гарады й землі заняла армія. Посьпехі, відаць, былі вялізарныя. Надзівіцца весткам з фронту не маглі літоўскія сяляне. А пад нізом гэнага паведамленьня нейчая рука лацінскімі літарамі «Москаў капут!» напісала.

Гэна першае аблічча «новага парадку», што цяпер Пятухову клець аздабляла, прывёз учора з Глыбокага заўсёды да ўсяго дападлівы із сваім гнядым конікам рыжавусы Захарук.

- Алі-ж і добра Неміц гэтта бальшавікоў адчыканіў! Ха-ха-ха! - рагатаў Уладзімер Пятух. - Ты глянь, якія пірапуджаныя морды! От і драла даюць!

- І пабіларуску во ўсё! Знаіць, каб яго халера!

- Ну як-жа яму ні знаць... Кажуць-жа, што Біларусам цяперака нейкую ўладу дадуць.

- Ого?

- Дадуць, як гэныя далі, адно рот разяўляй.

- Ну а паглядзі што унь пішуць: Біларусы, вас чакае зямля. От як!

- Ага, чакаіць. Тры мэтры на паўтара на кожнага!

- Эх ты, разумнік гэткі!

Асноўная ўвага на Захаруку трымаклася. Сядзеў ён, прыгорбіўшыся, на лаве, пугаўём пясок між каравых босых ног тачыў. Паволі, дрыжачым голасам гаварыў:

- У Бярэзьвіцкай цюрме надта-ж многа нашага народу яны, нячысьцікі, зглумілі. Неміц кажыць, што гэта Жыды з НКВД так мардавалі, пірад тым значыцца, як уцікаць мелі. А гэта яны ў быўшым манастыры наш народ дзіржалі. От гэта я на свае вочы відзіў, што многа закатаваных ляжыць. А расказваюць, што надта-ж зьдзекваліся зь людцаў бедных - вешалі, насы абразалі, вочы выкалвалі, бабам грудзі выразалі, жываты паролі, каб ім, баньдзюгам, на тым сьвеце так давялося!

- Ах, Матка Боская, людцы бедныя!

- Яны, сукіны сыны, нікаторых так зьнявечылі, што родныя свае ні пазнаюць... Божа мой, як паглядзеў я! Нашто ўжо жывот у мяне крэпкі, а чаго кішкі ня вывернула. А людзей мора, усе сваіх шукаюць!

- Ты, дзядзька, кажаш, што гэта нашыя людзі. А хто яны?

Звычайна вясёлы й жартаўлівы Захарук цяпер абмінаў сканцэнтраваныя на ім зрок сабраных, быццам сам віноўнікам тых злачынстваў быў. На чэрствым сялянскім твары цень жаху гаспадарыў. Дрыжэлі вусны. Забыўся, што пагасла ў пальцах самакрутка.

- Многа каго людзі па паперках пазналі. От-жа на двары многа сьледчых дакумантаў валяецца параськіданых. Гэта-ж, мусіць, нячыстая сіла, зьбіралі ўсё ў кучу, каб спаліць, ды ня ўсьпелі. А вецер параськідаў. Значыцца там судовыя й сьледчыя паперы ізь зьнімкамі й прозьвішчамі. Найболі Біларусаў, а ёсьць Палякі й Жыды таксама.

- І Жыды забітыя?

- А як-жа. А з нашых, кажуць, дык многа папалася гэта каторых нахапалі апошнім часам пірад прыходам Немца. Глыбокае, кажуць, Неміц разбамбіў адразу дык тады энкавудэ і ўся бальшавіцкая ўлада пяткі падмазала. Колькі дней нікога ня было й людзі пападчышчалі крамы, як і гэтта ў нас у Гацях. Але тады гэтыя, нячыстая сіла, вярнуліся яшчо назад і давай, хто папаўся пад руку, проста страляць, або ў Бярэзьвічы... Дык от так масу народу нашага на той сьвет зьвялі. Ну і кажуць, нахапалі апошнімі чадамі нашых грамадаўцаў...

Ледзь варушыў лісьцем дрэў лагодны ліпеньскі вецер, нярухома стаяла побач гойдаўка. Ля Бураковых прысадаў журботна выў Ромка, а ў Тахвіліным садзе трашчэла сарока.

- Каб яго халера, сабаку гэтага! - лаяў Пятух Уладзімер. - Нікому ні даецца, ніяк во ні прынадзіш. Саўсім зьдзічэіць.

Сонца за поўдзень хілілася. Позна ўчора Захарук з гораду вярнуўся. Сяньня раніцай прынёс Пятуху Ўладзімеру афішкі й папрасіў, каб на клеці папанаклейваў. Ашныраўшы новае, Піліпаў Арсень, а там ужо і Аўдоля ягодка па вёсцы навіну разьнесьлі. Неўзабаве пачалі зьбірацца людзі, ішлі яшчэ й цяпер.

- З гэтага боку, воддаль ад манастыра, - прадаўжаў Захарук, - выкапалі вялізную яму й туды закатаваных ськідалі. Я праціснуўся перазь сьцяну народу й прыгледзіўся: Божа мой, аж нос ад смуроду зарываіць. Як снапы, паськідваны пластамі, толька што парубнём ня прыціснутыя. Я спрабаваў лічыць, але скора зьбіўся. У некаторых дзіркі ў патыліцах пазнаць можна. Гэта-ж так, нячыстая сіла, стралялі. А яшчо ў каторых дык петлі на шыях, а твары так зьнявечаныя, што ні пазнаеш. Бабы навокал галосяць, Божа ты мой! І ўжо надта-ж народ злуець, праклёны толька з вуснаў чуваць. От каб яму тыя каты бальшавікі ў рукі папаліся, дык мусіць на кускі парвалі-б, скуру пасмамі дзерлі-б. Гэта-ж ні жарцікі табе. Падумаць, што нарабілі бальшавікі!

Захарук закрыў твар рукамі й дрыжэў. У вачох сьвежай стаяла брацкая магіла нявінных суродзічаў.

- А ягодка-ж мая міленькая, а Госпадзе мой! - войкнула Кмітава Аўдоля. - Азьвярэлі саўсім людзі. А што-ж гэта будзіць?

- Дык Неміц пушчаіць туды ўсіх, каторыя глядзець хочуць?

- Во, а чаму-ж не... Ён падахвочваіць яшчо, каб відзілі людзі якія людаеды гэтыя бальшавікі. Неміц усю віну за гэта на Жыдоў валіць.

- Але-ж ты кажаш, што й Жыды пабітыя ёсьцека.

- Ага, ёсьцека, сам відзіў. Мужчыны, каторыя пазналі іх, паказвалі мне. Дык, гэта самае, тамака Немцы ваенныя для парадку стаяць, а народ усё чаргой ідзець глядзець туды. Адзін салдат празь нейкую конаўку, каб усе чулі панашаму паясьняіць усё. Кажа хто нашых людзей катаваў і забіваў.

«Дзіравы шляхціц» Паўлоўскі ніякавата азіраўся па бакох, мяркуючы дзе й як ды якое слова ўкінуць. Пашанцавала яму. Ці прыйшло калі яму ў галаву, што мусіў-бы людзям за дабрату й стрыманасьць падзякаваць? А з другога боку загадка: чаму Косьцік Сабакевіч і Лявон Шпунт яго ня выдалі? А можа выратавала тое, што адзін зь першых у калгас запісаўся?

Цяпер бянтэжыў яго новы парадак. Што ён прынясе? Каму за ўладу ў вёсцы брацца? І ці ні спатрэбіцца зноў той начальніцкі капялюш і абшмуляная тэчка?

- Ну а пра Бурака з бабай ня чуў? - пытаўся Захарука Ўладзімер Пятух.

- А дзе падзеўся Антось Дзяркач?

- Яно-ж пра іх саміх ня чуў, але слухі ходзяць, што нікаторыя зь цюрмы бралі ды ў Расею гналі. Дык можа й яны туды папалі, гэта значыцца калі яны ў Бярэзьвічах былі.

- А ягодка-ж мая, гэта-ж ні дай ты Божа, каб і іх пабілі. Як-жа гэта можна так над людцамі зьдзеквацца?

- Ну й што будуць з гэтымі забітымі рабіць?

- Цяперака там Неміц ужо зганяіць людзей з коньмі, вывозяць некуды.

- Ну а як хто свайго знайдзіць?

- Трупоў радні аддаюць.

Дзяд Якуб маўкліва сядзеў на лаве побач Захарука, ссаў сваю неразлучную люльку. Цяпер загаварыў.

- Дык кажаш многа там яго, каб яго макарэц, гэтага Немца? А хто табе во гэтыя паперкі на сьцяну даў?

- Дык, гэта-ж самае, казалі на рынку людзі, што Неміц раздаваў. Але мяне тады там ні было, ня відзіў што за Неміц. От я задзержыўся на рынку, гляджу - куча людзей, нешта чытаюць і гаворуць, дык і я туды. Нейкі дзядзька й мне афішкі ўруку тыцнуў. Вязі ў свае сяло, -

кажыць, - ніхай людзі чытаюць. Дык я й прывёз. Але мне здаецца, што я яшчо адну ці болі іх меў, ды запхнуў недзіка...

Кінуўшы даўно патухлы недакурак, Захарук шарыў па кішэнях.

- А ці многа там таго Немца, каб яго макарэц спапяліў? - пытаўся дзед Якуб.

- Ды ёсьцека. Вунь і на станцыі, і гімназію занялі, усюды іх. Але, гэта, кажуць, праездам. Ага, во яна, гэта самая паперына.

Ён выняў зь кішэні й разгарнуў невялікі, як на дзьве бачыны сшытка, шэры ліст друку.

- Хто тут найлепі прачытаіць? - зірнуў навокал дзядзька. - От ты. Янук, чытай, ніхай усе слухаюць.

Янук падыйшо-ў да Захарука, узяў пакамечаную паперку, прыглядаўся ей.

- Да жыхароў вызваленых тэрыторыяў! - пачаў юнак. - Вялікая й няпераможная Нямецкая Армія вызваліла вас ад жыда-бальшавіцкага гвалту. Дзякуйце за гэта Вялікамуі Правадыру Нямецкага Народу Адольфу Гітлеру.

- Крапчэй ты, ядрыт тваю палку, бо ні чуваць!

- Ну добра, добра, чытаю-ж... Для канчальнай перамогі над бальшавізмам вы мусіце падпарадкоўвацца й памагаць Нямецкай Арміі. Для ўстаўленьня парадку й бясьпекі на вызваленых землях загадваецца наступнае: здаваць нямецкім уладам усю зброю. За ўкрываньне зброі - сьмерць.

За супраціў нямецкім уладам - сьмерць.

Выдаваць нямецкім уладам дэзэртыраў і ўцёкшых палонных з Чырвонай Арміі. За перахоўваньне іх - сьмерць.

Па захадзе сонца, ад гадзіны восьмай у гарадох і мястэчках, да шостай раніцы нельга хадзіць па вуліцах бяз пропускаў.

Жыды ня маюць ніякіх правоў. Адносна іх будуць выданыя спэцыяльныя загады. За перахоўваньне Жыдоў і помач ім - сьмерць.

У пытаньнях гаспадарчага й грамадзкага парадку, да часу ўстанаўленьня цывільнае ўлады, зьвяртацца да мясцовае нямецкае камандатуры.

Янук скончыў чытаць, яшчэ прыгледзіўся вялікаму й прыгожаму шрыфту ды аддаваў загад Захаруку.

- Ды навошта яна мне? Павесь на сьцяну.

- Сьмерць, сьмерць ды сьмерць. Здорава! - сказаў Тодар Кміт.

- Ну а што ты думаіш, Неміц з табой цацкацца будзіць, калі ні паслухаеш? - сказаў Уладзімер Пятух. - Парадак трэба-ж...

- Ну парадак трэба. Дый глядзі, многа камуністаў пахавалася.

- Ну а пра Жыдоў ня чуў болі? - пытаўся Захарука дзед Якуб. - Што зь імі? Чаму ім права ніякага?

- Людзі кажуць, што Неміц іх здорава прыціснуў. Нібыта ў Польшчы пазганяў іх і дзержыць асобна ды на работу пад канвоем ганяіць. А так ніякіх правоў ні маюць. Хто-ж яго ведаіць, што ён тутака зь імі рабіць будзіць. Ужо каму як каму, а Жыдом, відаць, ад Немцаў пападзецца.

Гутарка расплылася. Кажнаму рупіла свае думкі пра пачутае выказаць. Да гурту ля Ўладзімеравай клеці тымчасам прывалюхаў Сымон Пятух. Аброслы твар, з роту тарчэла смуродная казіная ножка. Зашмуляная сьвітка, неадлучная аладка-кепка на галаве. Згорблены, ён, быццам напалоханы заяц, асьцярожна ківаў на бакі, як-бы баяўся каб хто на яго сабаку ня спусьціў.

- Эй, Сымон, як тамака калхоз твой? - жартаваў Алесь.

Літоўскі гультай ня прывітаўся зь людзьмі, дый не хацеў, відаць, усім на воку быць. Калішняя пэўнасьць і нахабнасьць зьніклі із зношанага твару. Заклапочаны, ён ня мог людзям проста ў вочы глядзець.

- Дык-жа... Яно-ж, гэтага... - пачаў нязьвязна, пазіраючы на поўныя кпінаў твары. - Ты-ж, Алесь, знаіш, што людзі ўжо свой статак і ўсё другое разабралі й таго каўхозу як і ня было... Ды, значыцца, чорт знаіць, што Неміц зробіць...

- Які-ж такі зь цябе гаспадар, калі ўся твая гаспадарка распаўзлася?

- Ат, кінь Алесь, кепікі строіць.

- А дзе-ж Шпунт і Паваліцкі Хвёдар? - спытаў Тодар Кміт.

- Ды нідзе ня відаць, - адказаў Уладзімер Пятух. - Ня чуў, Сымон?

- Ня чуў. Можа дзе каля дому хаваюцца.

Калгас разьвязаўся бязь ніякіх «урачыстых мітынгаў» і пануканьняў, як толькі людзі пранюхалі, што прыгонная ўлада галаву скруціла. А тыя першыя нефартунныя перадавікі кажны сваё, быццам згаварыўшыся, дамоў пацягнулі. Сявенькавы-ж хлявы, дзе трымалі агульнае дабро, пусткай цяпер сьвяцілі.

5

На паўночна-ўсходнім водшыбе Гацяў, на абшырным плоскім сугры, у засені ліпаў, клёнаў ды бярозаў, прытаілася на выгляд шустрая, із аднэй, наводля конусу, вежай, малая драўляная царква. Пабудаваная, згодна мясцовых многалетак, яшчэ за прапрадзедаў сівых, яна, відаць, у гэны адлеглы час зьмяшчала ў сябе падчас малебенаў сьціплы мясцовы гурт вернікаў. Здаравенныя круглякі хвоі, здольнымі рукамі дапасаваныя й аснаваныя ў хворме крыжа на каменнай аснове трывалка вытрымалі напор ліхалецььцяў часу. Звонку сьвятыню пакінулі без ашалёўкі. Галоўныя дзьверы й карнізы ды абрамоўкі вокнаў мясцовыя мастакі аздобілі нацыянальнымі, павыразанымі ў дрэве арнамэнтамі. Нутро абабілі дошкамі, а дбайлівыя рукі мастака ўпрыгожылі сьцены размалёўкамі рэлігійных здарэньняў. Каторы з гэных сівых прадзедаў, мастак-самародак, аздабляў нутро, ён унёс у царкоўнае мастацтва лёкальны элемэнт. Прататыпамі апосталаў і сьвятых ажылі людзі зь мясцовымі рысамі, адзеньнем, прасякнутыя сокамі роднае зямлі, што ведалі цану поту й балючага мазыля. Калі голуб, як дух сьвяты, на аднэй іконе лунае ў паветры над Ярданам, дык на іншых жаваранак спадарожнічае сьвятым мучанікам у іхных вандраваньнях для праслаўленьня Ўсявышняга й загаеньня ранаў бліжняга.

Асабліва мясцовы калярыт ажываў на Сёмуху, калі зьмешаны з ладанам пах бярозак дурманіў галаву, лёгкі вецярок лашчыў шматкаляровыя касынкі на галовах схіленых у малітве жанчын, што ў набожнай скрусе згуртаваліся перад аўтаром і вонках сьвятыні.

Як грацыёзная дзеўка, апранулася ў сваё пышнае харство прырода. Урачыста шапталіся вакол гонкія бярозы, ліпы й клёны, у пчаліным гудзе млелі краскі. На ўзлесьсі, ля шэрагаў калёсаў, адганяючы нястомных аваднёў, фыркалі коні й гімнам спад неба суправодзілі голас сьвятара галасістыя жаўранкі. Зірнуўшы на грамаду вернікаў на ўлоньні прыроды, прыслухаўшыся хваласьпевам хору, ды водгукам жыцьцядайнай вясны, трэба было літаральна згадзіцца з тым, што «ўсялякае дыханьне хваліць Госпада».

Царква нагадвала прыгожа змайстраваную цацку, умела й арганічна ўпісаную ў мясцовы пэйзаж. Але ад часу сівых

прапрадзедаў, за доўгія й часам бурлівыя дзесяцігодзьдзі, ня вытрымала яна столькі глуму, як за кароткіх паўтара гады бальшавіцкае акупацыі. Насамперш улады зрабавалі зь вежы звон, а мясцовыя бязбожнікі-актывісты, у хмельным прыплыве вандальскага камуністычнага энтузіязму, выламалі дзьверы, пабілі вокны, зьнявечылі іконы, дэкарацыі й царкоўныя кнігі. Як бедная й зганьбаваная сірата, між магільных помнікаў, чакала сьвятыня новага ўваскрошаньня й сьвятлейшых дзён.

Царква калісьці належала да Слабодзкае, кілямэтры чатыры з гакам адлеглае парафіі. Гактары два царкоўнае зямлі спанукалі вернікаў яшчэ за часоў польскае акупацыі пабудаваць гэтта новую й большую сьвятыню. Прырост мясцовага праваслаўнага насельніцтва патрабаваў гэтага. Чужыя ўлады не дазволілі, бо йшло гэта ў разрэз зь іхнай плянавай асыміляцыйнай палітыкай. Тут-жа побач, быццам дзеля таго, каб задэманстраваць хто тут валадар і ў якой мове Бог нібыта лепш модлы разумее, вырасла новая аграмадзіна - мураваны польскі рымска-каталіцкі касьцёл.

Зь няпамятных часоў малая гацкая сьвятыня ажывала колерамі рэлігійнага фэсту на Сьвятога Яна. Гэтак было й падчас польскага глуму. У сьвяты дзень босыя сялянскія ногі вандравалі сюды навет з далейшага навакольля й зусім невялікая доля вернікаў магла ўмясьціцца ў сярэдзіне сьвятыні, бальшыня-ж малілася на траве перад фронтам яе. Побач, у некаторай адлегласьці, на сталох пад палатнянымі стрэхамі гаспадарылі розныя крамнікі, пераважна з цукровымі прадуктамі, рознымі булкамі й абаранкамі, марозівам і багацьцшм лёгкіх напіткаў. Традыцыйна з фэсту без гасьцінца для дзетак ці радні ніхто не вяртаўся.

Хоць ад часу новага «вызваленьня», гэтым разам з захаду, да фэсту Сьвятога Яна быў надта-ж скупы лапік часу, традыцыя веры спанукала да акцыі новага аднаўленьня. Мясцовыя рупліўцы, паразумеўшыся із слабодзкімі сьвятарамі й здабыўшы дазвол у нямецкай камандатуры, закасалі рукавы. Вымялі, пазьбіралі й спалілі на вогнішчы агідны бязбожніцкі хлам, памылі падлогу, сьцены, аўтар, іконы, падсьвечнікі й харугвы. Таму, што бязбожнікі панішчылі царкоўныя кнігі, наказалі сьвятаром, каб захапілі свае.

Позным паабедзьдзем пад купальскі вечар нізка шнуравалі над лугамі ластаўкі й розныя недарэчнасьці выраблялі вароны ды іншыя

птушкі. Пару дзён трымала млява сьпякота, а пасьля, як казалі мясцовыя знахары надвор'я, як у мяшку завязала. Сьмелых шукальнікаў расьцьвіўшае кветкі папараці, зусім пад поўнач, неба прывітала маланкамі й громам. Абложныя хмары хлынулі сакавітым, спорным дажджом. Вецер заядла змагаўся з чубамі садоў, прысадаў і лясоў, ды ўжо каля другіх пеўняў узяўся начыста разьмятаць неба. Зарніцы зазьзялі на ўсходзе маестатычным, спадзяваньні на вечнае адраджэньне ўліваючым у душу хараством і прачнуліся сымфоніяй у кустарніках салаўі. Сонца прывітала новы дзень лагоднай мацярынскай усьмешкай. Сьвежасьцю цалаваліся адмалоджаныя дубровы й лясы, рана ўскатурхалася звонкагалосая зязюля й хлёсткім клекатаньнем выпрастаў на бусьлянцы даўгую шыю грацыёзны птах. Над ацьверазеўшымі ад млоснасьці гонямі палёў зазьвінелі жаўранкі.

Межамі між ніваў, нацянькі праз палі й лугі, польнымі дарогамій бальшакамі йшлі і ехалі людзі. Ужо недалёка ад царквы, прысеўшы на траве, абувалі чаравікі дзеўкі. Прагавітая вайна ў чужой краіне сквапна трымала ў сваіх абдымках дзяцюкоў, а таму рэдка зьвінеў вакол гарэзьлівы дзявочы сьмех. Ля пахіленага вакол могільніку тыну, ліпаў і бярозаў паспарнела ў параўнаньні зь мінулымі гадамі сям'я жабракоў. Там, дзе некалі з бойкім гармідарам масьціліся й гандлявалі крамнікі, цяпер, над узбуйнеўшымі на конскім кале краскамі, пырхалі матылі.

Калі старэнькі слабодзкі пратаярэй аберуч падняў над галавой Сьвятое Эвангельле ды дрыжачым ад хваляваньня голасам засьпяваў «Благаславёна царства Тваё», тады ў вадказ ўзьняўся й шырака ў вялікай грамадзе разьліўся «амін». Царква, што кагадзе скардзілася забітымі дзьвярмі й вокнамі, ажыла цяпер урачыстымі малітвамі й сьпевам. Яе нанава высьвяцілі.

Ужо пасьля вынасу Сьвятых Дароў фырканьнем двух матацыклаў па дарозе зь мястэчка аб'явіла сябе новая ўлада. Грукат скрыгатам уварваўся ў набожную атмасфэру вялікага натоўпу вернікаў. Сотні вачэй насьцярожана сачылі чатырох жандармаў. Узброеныя, у шлёмах, яны спыніліся воддаль машыны й павольна набліжаліся да грамады. Крайнія ўжо маніліся расступіцца, каб новым вяльможам дарогу ў сьвятыню даць, як тыя спыніліся, перакінуліся між сабой скупымі словамі ды хутка ад'ехалі.

Слабодзкі айцец пратаярэй, у асысьце малодшага сьвятара, што памагаў яму вялікай парафіяй загадваць, для казаньня выйшаў ад

аўтара аж на сходы перад дзьвярмі.Ягоны павольны цьвёрды бас добра чулі ўсе прысутныя.

- Дарагія браты й сёстры ў Хрысьце!

Сьвяткуем сяньня нараджэньне Яна Прадвесьніка, званага Хрысьціцелем, Прарока, якога паслаў нам сам Госпад Бог, каб хадзіў і прапаведаваў усім аб вялікім прыходзе на зямлю Сына Божага Ісуса Хрыста. Айцец наш нябесны дбаў пра дзяцей Сваіх, створаных на вобраз і падабенства Яго, але ведаючы недасканаласьці характару людзкога, лічыў патрэбным падрыхтаваць людзей, каб дастойна прынялі на зямлі Сына Свайго адзінароднага. Вы чулі сяньня ў Сьвятым Эвангельлі пра зьяўленьне ангела Гаўрыіла да старога сьвятара Захарыя зь весткай, што жонка яго Альжбета народзіць сына, якому ён дасьць імя Яна й каторы мае падрыхтаваць людзей да сустрэчы Збавіцеля. Стары Захары не паверыў ангелу Гаўрыілу, а той за недавер зрабіў яго нямым аж да часу нараджэньня сына.

Калі Ян Прадвесьнік вырас, пасьля доўгага прабываньня ў пустыні, вярнуўся да людзей ды навучаў народ пра таго, што вось-вось мае прыйсьці й катораму Ён казаў, «я недастойны адвязаць паскі на абутку ніог Яго». Хадзіў Ян Хрысьціцель па Юдэі й навучаў людзей, каб трымаліся законаў Майсея, каб стараліся ачысьціцца ад грахоў сваіх. Быў ён бескампрамісным у змаганьні з усяляікм злом і не спатураў нікому, хто сьляпым на гвалт і несправядлівасьць прыкідваўся. Дзіва няма, што людзі, якія тады ўладу мелі ды якім Ян Прадвесьнік упікаў за грахі іхныя, абрушыліся з помстай на вялікага Прарока. Яна Хрысьціцеля вязьнілі, а пасьля адсячэньнем галавы пакаралі Яго.

Можна спытаць: чаму-ж так сталася, што сам Госпад Бог, паслаўшы Прарока Свайго на зямлю, каторы прапаведваў вялікі прыход Сына Свайго адзінароднага, дазволіў грэшнікам зьдзекваццa зь Яго, а потым Яго сьмерцю ўкараць? Адказ на гэта просты: шлях да збаўленьне вядзе празь цярпеньне й няма збаўленьня без пакутаў. Якраз во на прыкладзе такім, як ахвярнае жыцьцё Яна Хрысьціцеля, Госпад Бог паказаў нам, што без ахвяры няма ачышчэньня ад грахоў. Самі цяпер ясна бачыце, што сіла ўсюды верх трымае, яна ня лічыцца ні з навукай Хрыстовай, ні з тымі, што за Збавіцелем сьледам ідуць.

Вы былі сьведкамі таго, што нячыстая бязбожная сіла зрабіла гэтта ў нас, колькі зьдзекаў і глуму прынесла, колькі нявінных людзей

забіла або на вялікія пакуты паслала. Сьветчаньнем сказанага ёсьць і наша сьціплая, пабудаваная некалі рукамі нашых продкаў сьвятыня. Яе зьнявечылі, пашкодзілі, а пасьля зачынілі. Мы яе, зганьбаваную й пашкоджаную, як маглі ачысьцілі й нанава высьвяцілі. Маліліся тут нашыя продкі, маліліся й далей будзем маліцца будзем мы й нашыя дзеці. Прасіць будзем Усявышняга, каб трымаў нас у ласцы й апецы Сваей, каб не пакінуў у бядзе й глуме, каб ператрываць мы маглі страшныя часы, каб зямелька наша родная й народ наш вытрымалі навалу жахлівае сілы.

У павольны й зроўнаважаны, эмацыянальна насычаны сьвятароў голас улучыўся новы элемэнт. Ледзь-ледзь чутна дрыжэла паветра. Яшчэ поўнасьцю не праверанае вухам дрыжэньне адчувалася ўсей істотай, паступова й няўхільна ўзмацнялася. Людзі пачалі пазіраць адзін на аднаго, коні ля вазоў стрыглі вушамі, ёрзалі нагамі. Думкай паглыблены ў казаньне сьвятар на колькі часін стрымаў свой язык, але зараз-жа намагаўся прадаўжаць.

- ...самі бачыце да чаго здольны чалавек, калі ня будзе трымацца навукі Хрыстовай, калі на ўслугі д'ябла пойдзе. Тады спануканы сатаной, будзе ілгаць, абкрадаць, калечыць, зьдзекваца, забіваць. Бо чалавеку, які так ці накш мае сілу і ўладу ў руках, сатана нашэпча, што Бога няма, што сам ён ёсьць найбольшай сілай на сьвеце.

Гаці ляжалі ў сумежжы галоўнага шляху з захаду на Полацак, Віцебск і Маскву. Пылілілся некалі вакольныя дарогі пад капытамі коньніцы вялікалітоўскіх (беларускіх) князёў і гэтманаў, маскоўскіх і казацкіх атаманаў, войскаў Напалеона, а ўжо пазьней легіёнаў Пілсудзкага й атрадаў Гая. Дзіва няма, што й цяпер магутныя сілы Бэрліну, з гарластым крыкам «Москаў капут!», лявінай катастрафальнага зьнішчэньня сунуліся па зямлій цесным зрабілі неба. Як сьвет сьветам, ніколі не пралятала тут вялікая колькасьць самалётаў і намагайся, як хочаш, а ня ўявіш псыхічнага дый навет фізычнага эфэкту на звычайных сялян такога жахлівага гулу, каторы бязь ніякага папярэджаньня створаць раптам самалёты, літаральна закрыўшы неба. Гэтак даслоўна сталася.

Цяжкія бамбавозы ад краю да краю чыстага, ласкава-блакітнага неба зьзялі, як прыгожыя сярэбраныя цацы. Плылі, здавалася, паволі, ды ў гэнай павольнасьці й зарганізаванасьці, параліжуючы страшэнным гулам усялякі рух пад сабою, выглядалі жахліва

маестатычна. Вернікам пры царкве, увагай сканцэнтраваным на сьвятары з крыжам перад пагвалчанай сьвятыняй, зьяўленьне ў небе здалося ў вышэйшай меры нярэальным.

Перамогшы першы жах, захопленыя падлёткі пачалі наперабой лічыць. Хваліліся некаторыя пасьля, што аж да пяцісот далічылі. Дрыжэлі зь перапалоху, іржалі, тузалі вупраж коні ля вазоў. Быццам спараліжаваныя, паразяўляўшы раты, пазіралі ўверх і жагналіся людзі. Старэнькі пратаярэй, заглушаны грандыёзнай сілай зьверху, паволі пражагнаўся, зірнуў на сьвятара побач сябе. Сьціснула зіхатлівы пазалочаны крыж дрыготкая рука, а ў вачох, каторыя ўжо так шмат нядолі й цярпеньня бачылі, зазьзялі іскрынкі жаху. Куды-ж лятуць і каму зьнішчэньне нясуць гэтыя цудоўныя апараты сьмерці?

Прайшло пару хвілінаў пасьля пралёту бамбавозаў. Людзі ціха гаманілі, але аглядаліся на сьвятароў, што быццам заварожаныя, стаялі ў дзьвярох сьвятыні. Гул паволі аціхаў і ў тэй цішы чуткае вуха злавіла скрып драбін і лякатаньне колаў з боку касьцёлу.

- Бачылі сілу? - пачуўся цяпер ужо даволі рэзкі й паднечаны голас пратаярэя. - Ці патрабую вам казаць яшчэ тое, што казаў раней, а менавіта, што сільны чалавек, спануканы д'яблам, аб'явіў сябе Богам? І падумайце пра насьледкі гэтага.

Скрыпучы й паднечаны сьвятароў голас абарваўся. Вернікі зь няўцямнасью пазіралі адзін на другога, шапталіся.

- А цяпер памолімся да Вялікага Прарока Яна Прадвесьніка й да Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб загаілі раны зямелькі нашай, каб панаваў гэтта мір і дабрабыт, каб не адлучаныя былі дзеткі ад матак, жонкі ад мужоў і каб ня плакалі над магіламі родныя, каб ня множыліся ўдовы й сіроты, каб вярнуліся дамоў забраныя чужынцамі на вайну дзяцюкі нашыя і каб не спадарожнічала нам, мірным, і Госпаду адданым людзям, гора й няшчасьце. Памолімся за выбачэньне грахоў і папросім Госпада, каб трымаў нас у ласцы й апецы сваей.

З такімі словамі сьвятар крыжам дабраславіў вернікаў і са сваім асыстэнтам накіраваўся ў царкву. І неўзабаве з кагадзе зганьбаванае й новавысьвячанае сьвятыні паліліся малітвы й мэлёдыі хору.

І тады вернікі, што маліліся звонку, пачалі прыглядацца калясцы, што тарахценьнем сваім зьвярнула на сябе ўвагу адтазу пасьля пралёту бамбавозаў. Дакладней гаворачы, калясцы ўважна прыглядаліся з прычыны яе жабрачага выгляду. Змораны, запылены, спацелы конь,

проста галава між пярэдніх ног вісіць, рэбры да самага найменшага палічыш, - ледзь валачыўся, хіляючыся на бакі ў аглоблях. Збоку йшоў зьняможаны, худы, аброслы, у абноскі апрануты мужчына, галава абвязана шэрай хусьцінкай, а на возе сядзела маладжавая, з выгляду вельмі стомленая жанчына. Каштанавыя валосы, з пасмамі сівых, распаўзьліся спад квяцістай хусткі, а бочы яе зь нейкай зьбянтэжанасьцю азіраліся навокал, не знаходзячы, здавалася, ніякага пункту апоры. Зношаная фуфайка дапаўняла яе хворы выгляд. Звычайна гнаявы панарад з драбінамі па бакох сьвяціўся пусткаю, апроч подсьцілкі ізь сьвежай травы.

Жанчына спыніла свой зрок на парэпаных босых нагах. Левая, перавязаная ніжэй калена, чырванела закарэлым пятном. Мужчына, стомлены, відаць, даўгой хадою, спыніў каня. Той ляніва махнуў галавою, каб адагнаць аваднёў і мух. У царкве вернікі падыходзілі да крыжа.

- От, Ніна, дзякуй Богу, прыехалі, - сказаў змораным голасам мужчына да спадарожніцы.

- Ага... Ну дык што? - спытала Ніна.

- Паглядзім. Сваіх знайдзім.

Піліпава Аксеня, што ўжо справілася крыж пацалаваць дыразглядалася дзе й зь кім на траве для абеду разлажыцца, падыйшла да групы ля возу. Яна зь няўцямнасьцю ўважна прыглядалася жанчыне на возе, мужчыну побач яе, а тады твар Аксенін распрамяніўся радаснай усьмешкай.

- Ніна, а божачкі мае, Ніначка, дык гэта-ж ты! Антось, родненькі, Госпадзе мой! Людцы добрыя, бяжыце сюды, гляньце хто тутака да нас прыехаў!

Аксенін голас поўніўся радасьцю й зьдзіўленьнем. Паўлюк Бурак зь Нінай Бурачыхай і Антось Дзяркач трапілі ў сквапныя абдымкі НКВД амаль разам і каля ўзьнялася ваенная бура, асабліва-ж пасьля выкрыцьця жахаў у Бярэзьвічах, літоўскія сяляе страцілі спадзяваньні, што яны вернуцца.

Пачуўшы Аксенін усхваляваны голас, неўзабаве літоўскія людзі абкружылі каляску й яе пасажыраў. Цяжка было веры вачом даць, што гэты зьняможаны, худы мужчына зь вялікім заростам на твары - гэта той самы шустры, бадзёры, вынаходлівы, паваротлівы і языкаваты ды зусім хлёсткі дзяцюк, што некалі прывандраваў з польскай

мабілізацыі. А жанчына гэна, у агіднай абшмулянай ватоўцы, з пасмамі сівых валосаў, некалі прывабнымі, а цяпер горычай перапоўненымі вачмі, гэта тая-ж Бурачыха, прыгожая й жыцьцярадасная, што некалі магла навет старэйшага за сябе скнэру Паўлюка ўходаць. На яе прыгожым, ладна-сьветлым некалі твары паказаліся першыя зморшчыны.

- А людцы мае, чаго-ж стаіцё? - гаманіла Аксеня. - Вазьміце-ж во пасадзіце іх, дайце ім есьці ці піць, можа хочуць...

Антось, якому ўжо ці мала хто трос руку ды якога засыпалі пытаньнямі, адазваўся:

- Дайце піць. Можа хто квас маіць ці што...

Вялы й слабы голас падчыркнуў запраўдную смагу.

- А ягодка-ж мая, а родненькая, - закудахтала Кмітава Аўдоля, - гэта-ж во як з таго сьвету вярнуліся.

Антось Дзяркач асунуўся на траву. Яму далі збан з квасам і дзяцюк прагна прыліп да яго вуснамі. Жанчыны памаглі Ніне з возу зьлезьці і Бурачыха, ступіўшы на зямлю перавязанай ніжэй калена нагой, застагнала.

- Ей во нагу трэба было-б абчысьціць і перавязаць, каб, барані Божа, заразы ці чаго... Падстрэлілі, сукіны сыны, - паясьніў Антось. - Дзе тут можа Зянькевіч ёсьць? Хлопцы, ты Янук і Стась, падкіньце каню травы якой й напаіце яго. Гэта каўхозны конь, нібарака, каб ня ён, дык Ніну кідаць трэба было-б...

Антось зноў прыліп вуснамі да збана, а тады перадаў яго Аксені, якая старалася напаіць Бурачыху. Янук узяў каня за аброць, адвёў крыху набок.

- Давай, Стась, вунь да гэных, ад іх нахапаем сена.

Яны мігам падбеглі да шэрагу вазоў, пры якіх ня было лпюдзей наскублі два добрыя ахапкі сена. Худы калгасны конь узяўся жваць неахвотна, быццам не сваймі зубамі.

- Знаіш, ён, мусіць, піць хочыць, - скказаў Стась.

- Ага. Алі-ж дзе тутака яго напоіш? Ніхай пачакаіць. Хадзі, паслухаем што там Антось расказваіць.

Хлопцы вярнуліся да гурту людзей, што раскладаліся зь ядой на траве побач Антося й Ніны. Зянькевіч аглядаў Нініну лытку. З маленькай пляшкі мачаў у сьпірт вату й абмываў закарэлую рану.

- Гэтта, дзякуй Богу, выглядаіць добра, - гаварыў лекар. - Будзіш жыць і замуж яшчо выйдзеш, - намагаўся жартаваць.

Лекаравы словы ня выклікалі ўсьмешкі на Нініным твары.

- Гэта што сталася?

- Кажу-ж, прастрэлілі, сукіны сыны, - тлумачыў Дзяркач. - Неміц цягнік разбамбіў, многа людзей пабіў, а ў наш вагон у сьцяну папаў, дык мы выламаліся ды наўцёкі. А канвойнікі, гады, страляць пачалі, каб іх самае горшае пекла ні мінула...

- І дзе гэта было?

- Ды вунь за Дзьвіной. Зь Бярэзьвіч пагналі нас на Лужкі й Дзісну, а па дарозе тых, што нядужыя, не маглі йсьці, як сабак стралялі. Гэтак во ейнага Паўлюка прыкакошылі, нячыстая сіла... Божа ты мой, што за сьвет настаў! Пасьля нас у цілятнікі, як быдла, напхалі. Недзіка на той бок Полацку, за Дзьвіной, Неміц наляцеў, разбамбіў, многа пагарэла, а каторыя разьбегліся.

Лекар Зянькевіч перавязаў Ніну нагу, злажыў свае рэчы ў скураную сумку і ўстаў. - Ну от будзеш упарадку, - сказаў задаволены, Ніне. - Падзякуй Богу, што куля ў лытцы не засела, а збоку прайшла.

- Дзякуй Богу й дзякуй табе, доктар, - адказала падбадзёраная ьанчына.

- Зайдуся да вас пасьлязаўтра, гляну, піравяжу. Але, здаецца, усё ўпарадку. Гэта што, вы з Антосем цэлы час разам?

- Ага, дзякуй Богу. Каб ня ён, прапала-б я. Мяне спад агня выцягнуў, даглядаў. А майго-ж Паўлюка, відзіця як, недзіка пры дарозе, як скаціну, забілі й навіт ні пахавалі. Божа мой, і за што гэта так?

Ніна пачала хліпаць, але сухімі асталіся змораныя вочы. Жанчыны пасьпяшылі із спагадай. Навокал сяляне параскладалі харчы, узяліся есьці. Угашчалі Антося й Ніну, зьявілася навет самагонка. Радасьць зь вяртаньня Антося й Ніны была стрыманая. Думкі забягалі наперад, да няпэўнага й цьмянага заўтра.

6

Залізваньне ранаў узяло часу. Антось Дзяркач трымаўся дому, бацьком ня скардзіўся, хоць часамі дакучалі болі ў сярэдзіне. Дражніла яго пераборлівая ласкавасьць маці. Жанчына, што выплакала вочы падчас бяссоных ночаў, даглядала цяпер сына, як дзіця кволае. Яна яму то скварку, то яечка, то кавалак мяса лішні.

- Пірастань, матка, давай во бацьку, а я ўжо й так ачуняў, - адмаўляўсдя Антось.

- Еш, сынок, ні глядзі, трэба табе якнайскарэй на ногі стануць. Жарцікі во, як быццам з таго сьвету вярнуўся. Веры ні дала, ні пазнала, гэтак во, нячыстая сіла, заходалі.

З гэткімі словамі падсоўвала яшчэ больш еміны. Антось пра кашмары ў беразьвецкай турме неахвотна гаварыў. Сам пагоднага характару, не хацеў азмрочваць бацьком настрою.

- Пазьдзекваліся, кажаш? - пытаўся бацька. - Моцна білі?

- Ага, тата, білі, крэпка білі.

- За што гэта?

- Ат, тата, пірастанем. Ні люблю ўспамінаць.

- Ну што-ж... Ня хочаш, за язык ні пацягну.

Антось маўчаў і думаў. Наглядзеўся зьверства, наслухаўся ад людзей. Крыху ачарсьцьвеў. Дый навошта раны вярэдзіць?

- Дзе Лявон Шпунт? Ня чуў? - спытаў бацьку.

- Чорт яго знаіць, ня відзіў. Алі во калі гэта, ці ні пазаўчорака Васіль Якубаў казаў, што каля дому яго відзіў. На сяло ні паказваецца. А навошта ён табе?

- Як ты думаеш? - зірнуў сын уважна бацьку ў вочы.

- Ты скажы.

Доўгае маўчаньне.

- Хачу распытацца, як на мяне й на другіх даносы рабіў. А калі ні захочыць расказаць то я на яго загагуліну знайду, язык разьвяжу.

У Антосевых вачох загарэўся благі агонь.

- Глядзі сам, сынок. Але нашто табе? Ніхай-бы яго Неміц прыбраў. Табе можа лепі ціха сядзець...

Антось доўга думаў. Раптоўна падняў вочы й зірнуў бацьку проста ў твар

- Цягалі адныя й другія, ледзь вырваўся. А гэтыя што, думаеш? Неміц, ён нас так і ні зачэпіць? Вайной? Кінь ты, бацька. І ні

агледзішся, як нейкая трасца гоп! і на сьпіну. Ня відзіш, што робіцца, ні кумекаеш?

- Дык што-ж рабіць будзіш?

Антось памарудзіў з адказам.

- Ні знаю, тата, можа скора што праясьніцца. Алі знаю, што пасядзець ні дадуць.

Дзяцюк скрыпнуў дзьвярмі й выйшаў на двор. Ля Бураковай хаты радасна цяўкаў Ромка. Антось спасьцярог жаночую хустку ля тыну. Ніна пастаяла ля сабакі, мусіць нешта есьці дала ды накіравалася ў вагарод. Антось рушыў у тым кірунку. Ад супольнага падарожжа «з таго сьвету» часта пра яе думаў. Жанчыну трымаў на воку й раней, - дарэчы, як і ўсе дзяцюкі ў вёсцы, - але з натуры быў больш прывык ля старэйшых дзевак аціралца, замужніх мінаў, хоць, як мяркаваў, у Ніны й раней нядрэнныя відокі меў.

- Ай, Антоська, мой саколік, а я толькі во пра цябе думала, - распрамянілася Ніна, пабачыўшы яго. Стаяла з матыкай між радоў морквы.

- Які я табе саколік? А што ты пра мяне думала? - усьміхнуўся Антось.

- Як гэта што? Ты-ж мой збавіцель. Пра каго-ж, калі ні пра цябе мела думаць?

Яна папаўнела й паправілася. Праўда, гэта ня быў той калішні прывабна-бесклапотны твар. У вачох з дробнымі зморшчынкамі навокал загнязьдзілася цьвёрдасьць. Адылі працэс аздараўленьня пачаўся. Яго пазнаць можна было ў выглядзе, рухах і гутарцы.

- Ну як нага?

- Ды што нага... Дзякуй Богу, магла-б з табой ужо й польку топнуць.

Зірнула на яго вачмі ласкай перапоўненымі. І здалося дзяцюку, што там больш, чымся ласку пабачыў.

- Ну пра гэтае топнуць дык цяперака рана гаварыць. Ні да топаньня цяперака.

Ніна нічога не адказала. Узялася матыкаваць густое зельле ў чорнай мягкай глебе, якую добра ўчора вымачыў дождж. На абшырным кавалку адно палова была выпалата.

- Трэба во паганяць, ато саўсім трава заглушыць.

- Алі-ж і насадзілі яны тут вам, - сказаў Антось.

- Толькі ні нам. Сабе каўхоз залажылі. А нас, Антоська-саколік, недзіка ў Сібір на дзікія ягады вязьлі. Ну алі выйшла, што й гэтага ім фігу... Брунісьчына Мальвіна ўчорака прыбягала. Дасі, кажа, Ніна, нам гародніны, нашы-ж дзеўкі гэттака крукам цэлую вясну пацелі. Чуеш? Чаму на сваім, кажу, твае дзеўкі ні садзілі? Такая ўласьць, кажыць, была. А што-ж, кажу, цябе ўласьць сілай сюды цягнула? Дык яна тады мне: - зімля твая, алі работа наша. Дасі й нам гародніны. Уцікай, кажу, сучка, з майго! Бяжы, кажу, да тэй уласьці, што людзей загадала абіраць і забіваць, ніхай яна табе дасьць, ад яе, кажу, спаганяй. Ды як сыкнула я на яе, дык от лататы дала!

Матыка спынілася. Жанчына зірнула глыбака ў Антосевы вочы.

- Алі што гэта я пра сваё бубню? Скажы, Антоська, што рабіцьмеш?

Антось пазіраў на поўныя грудзі пад тонкай летняй блюзкай, на круглыя, як памайстэрску адточаныя й загарэлыя рукі й ногі, ды на зусім умеру поўныя ды пэўне-ж мяккія вусны, роўны носік.

- Жыць буду, от што. Дзевак буду любіць, зямью араць, сеяць, касіць, малаціць. І яшчо што? Ага, буду спаць і есьці, і чыстым паветрам дыхаць.

- Алі-ж ты жартаўнік, - усьміхнулася жанчына, таўхануўшы яго лёганька пад бок. - Ці ты калі сур'ёзна зь кім гаворыш?

- Але-ж, гавару. Знаеш вунь колькі сур'ёзнага ўнас было падарозе.

- Ну я не пра тое. Таго лепі ні ўспамінаць. Я пра заўтра. Я пра цябе й мяне, і...

- Ніначка, знаеш што? - Ён зацяўся, а тады яно само вырвалася. - Знаеш, я цябе люблю... Ты... Ты надта-ж пекная й мілая, і я таксама пра цябе думаў... Але...

- Любіш Антоська? А мой-жа ты саколік!

Жанчына ўміг распрамянілася, налілася жыцьцём. Антось даўно ня бачыў яе такою. Зварухнулася, быццам каб прытуліцца да яго ў абдымку. Антось спасьцярог гэта выразна, але нейкая насьцярожанасьць стрымала яе. Азірнулася. Магчыма, што высьцерагалася ў агародзе.

- Ніна, я...

- Што?

Зводзілі ейныя вочы. Антось ніколі перад такім выклікам не стаяў. Адно падай руку, а поціск ейны сыгнал перадасьць. Гэтта-ж і хата

непадалёк, пару крокаў ступіць. Адно ваганьне...

- Я думаю, што ці ні зарана яшчо, знаіш?

- Гэта ты пра майго?

- Ага. Людзі-ж мы, хрысьціяне, у Бога верым. Ці ня грэх?

Зморшчыны ля вачэй падаўжэлі, а нядаўнюю гарэзьлівую яснасьць вачэй зацягнуў хмарны цень. Антось завярнуся да весьнічак.

- Куды ты, Антоська?

Дзяцюк спыніўся, падумаў.

- Схаджу ў Гаці праведаць дзе што робіцца. Сядзець нічога ня высядзіш.

- Глядзі-ж, Антоська, асьцярожна.

У голасе ейным Дзяркач вычуў апякунчы тон, якраз наводля матчынага.

- Ніначка, ці ні зарана маей апякункай хочаш быць? - Ён падміргнуў. І тады бачыў як паварушыліся яе вусны і ўздыхнулі тугія грудзі.

- Ну што, Ромак, пойдзем разам?

Сабака падскочыў з радасьці, тузануў ланцуг. А Антось забаўна, як даўно не рабіў, засьвістаў, выходзячы з двору.

7

Антось ішоў галоўнай вуліцай Гацяў. Не сьпяшыў, разглядаўся. Сонца хілілася з паўдня, добра прыгравала. Насустрач ішлі дзьве жанчыны, па выгляду вопраткі местачковыя. Вясковыя цяпер не хадзілі на рынак з таварамі, бо ўжо колькі разоў здарылася, што «Неміц усё адбраў». Ніхто ня ведаў чужое мовы, а самі нямецкія жаўнеры, звычайна двойкамі й тройкамі, валачыліся па вёсках, гралапанілі «матка, яйка, матка, шпэк», іншыя-ж курэй, гусей і качак лавілі.

Насустрач Антосю вельмі хутка праімчаліся два вайсковыя грузавікі з жаўнерамі ў кузавах, паднялі за сабой вялікі хвост пылу. Поўным жыцьцём кіпела станцыя, чмыхалі паравозы, гучэла незразумелая мова. Ля будынку вакзалу стаялі польныя кухні, бражджэлі жаўнерскія кацялкі. А воддаль, направа ад вуліцы, у прысадах бярозак, рабінаў, бэзу й засені садоў маўчалі ў летняй

дрымоце местачковыя хаты. Зь нізкай, што на ліпе, бусьлянкі зьляцеў на луг вялікі птах.

Антось прачытаў чорнымі літарамі на вялікай белай дошцы:

О Р Т С К О М М А Н Д А Т У Р

Вартавы із стрэльбай на плячы і ў шлёме стаяў побач ходніку, каторы бег ад адлеглага ад вуліцы шырокага, нізкога, калісьці сінім колерам маляванага будынку, у якім гнязьдзіўся «пастарунак паліцыі панствовай». Антось перайшоў на другі бок вуліцы, каб, па старой прывычцы, мінуць «асінае гняздо». Мінуў чыгуначную майстроўню поўную стуку молатаў, скрыгату напільнікаў, скрыпу колаў, смуроду мазуты й гару дыму. Гэтта, відаць, хапала працы, але хто там працаваў, Немцы ці мясцовыя, Антосю не давялося чуць.

Павярнуўшы вуліцай направа, дзяцюк прадаўжаў ісьці абсаджанай ліпамі брукаванай дарогай. Па бакох яе, у зелені садовых дрэваў, плянава выраўняліся два шэрагі чырвоначарапічных мураваных дамоў. Некалі тут жылі сыцейшыя панкі-ўраднікі, такія, якім сялянкі насілі на продаж пад дзьверы яйкі, масла й сыры, бо панюські іхныя ляніліся на рынак хадзіць.

Пры адным доме Дзяркач убачыў зялёна-шэрую вайсковую аўтамашыну і чалавека ў мундзіры за рулём. Яшчэ за хвілінаў пяць дзяцюк апынуўся ў шырокай адчыненай браме. Зь левага боку наўскасяк усьміхаўся на сонцы вялікі добра дагледжаны сад. У куце, між рослага маліньніку роіліся пры вульлях пчолы. Парнік аранжэрэі дыхаў шыракаадчыненымі сэкцыямі шкляного даху. Спрэчку вялі вераб'і.

Антось пастаяў, разгледзеўся. Аўтавыя шыны дугой вярнулі ў правы бок, дзе воддаль між кветак, язьміну, бэзу й рабінаў прысеў нізкаваты, чырвонай бляхай крыты, мураваны дом. Там жыў гаспадар саду, парнікаў, аграмаднага гароду з рознымі сэкцыямі гародніны й садовых прышчэпаў, прыпадкова ведамы нашаму чытачу аграном, дзядзька Януковага сябры Лявона Загорнага Кастусь Падгайскі.

Гэтага цікавага й даволі адукаванага чалавека пазнаў Антось даўно, яшчэ ў раньніх дваццатых гадох, калі разам адбывалі «чынную» службу. Асьцярожны, памяркоўны, вызначаўся ён надзвычайнай працавітасьцю й ашчаднасьцю. Скончыўшы сельскагаспадарчую

школу, даўжэйшы час практыкаваўся на працы ў іншых, а яшчэ далёка ад часу «вызваленьня» з усходу купіў нядрэнна дагледжаную, зь вялікім кавалкам гароднае зямлі, гаспадарку на краю Гацяў. Гэтта ён запраўды паказаў сваю напорную працавітасьць. За колькі год узорная гаспадарка пачала даваць шчодры прыбытак. Падгайскі змог з большага сплаціць даўгі й агулам палажыў трывалкія асновы на будучыню. Позная жаніцьба не прынясла яму ўцехі. За два гады астаўся бязьдзетным удаўцом.

Ад Кастуся Падгайскага Антось пра беларушчыну спанатрыў. Аграном належаў некалі да Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, трымаў кантакт зь беларускай Вільняй, пісаў на сельскагаспадарчыя тэмы ў беларускія календары й часопісы. Ведама, за гэткую актыўнасьць меў розныя няпрыемнасьці ад польскіх прыдзіраў. Ці раз намагаліся яго завэрбаваць, а пасьля, калі не ўдалося, шантажавалі ў вачох уладаў мясцовыя камуністычныя элемэнты. Кастусь, відаць, трымаўся надзвычайна асьцярожна, бо з прыходам бальшавікоў, хоць ня спыняліся розныя шыканы й прычэпкі, усё-ж пакінулі яго на сваім месцы. Праўда, узорную гаспадарку ягоную далучылі да суседняга саўгасу. Як ведамы й спрактыкаваны аграном, што рэдка калі трапаў языком, а больш выказваўся ўзорнай працай, ён стаўся неабходным для саўгасу й так, відаць, у бальшавіцкіх вачох «ідэйна ненадзейны» чалавек утрымаўся ў родным куце. Хоць ягоныя парнікі, дбайна дагледжаны гарод, сад і ўсю маёмасьць зрабаваў саўгас, мясцовыя сяляне - бальшавіцкія прыгоньнікі, пад кіраўніцтвам быўшага ўласьніка й цяперашняга галоўнага агранома саўгасу, даглядалі за «народнай маёмасьцю». Гаспадарка Падгайскага не пайшла на глум наводля іншых, што сталіся «нашымі», «народнымі», а значыцца мала хто пра іх дбаў.

Антось спыніўся. Перад шырокай, на цэлую сьцяну, вэрандай стаяла вайсковае аўта. Асьцярожна, каб, барані Божа, не сьцягнуць на сябе якога ліха, Антось узыйшоў на ступенькі й прыслухаўся праз прачыненыя дзьверы. Памяркоўны й зроўнаважаны Кастусёў голас штосьці даволі доўга гаварыў панямецку. Пасьля хутчэйшым тэмпам адазваўся другі голас, што належаў, відаць, прыехаўшаму аўта. Воддаль на чыгунцы прагрукатаў цягнік і Антось, выкарыстаўшы гэта, каб не пачулі крокі зьбег зь вэранды, абыйшоў вакол хаты й пачаў разглядаць што рабілася ў парніках. Яму ўсьміхаліся пышныя розы,

іншыя вазонныя кветкі, дасьпяваючыя памідоры. Антось пачуў гул матору й бачыў як на дарогу, абсаджаную ліпамі, шмыгнула вайсковае аўта. Ён выйшаў з парніка й накіраваўся ў аграномаву хату. Пастукаў у дзьверы. Крокі наблізіліся і ў адчыненых дзьвярох зьявіўся аграном.

- Антось, братка, здароў. Заходзь, - запрасіў ён. - От добра, што гэта ты, браток, ато я баяўся, што зноў з гэтай нямчуры... Спакою не даюць, то адзін то другі, каб іх халера... Але-ж чакай, чаго гэта мы стаім? Хадзі ў кухню.

У гэтым доме ўсюды было прасторна. З правага боку ад уваходу праз адчыненыя дзьверы відаць быў стол, завалены кнігамі й паперамі, полкі з кнігамі ля сьцен, а апроч крэсла ля стала, воддаль стаяла скураная канапа. Гэты пакой аграном называў бібліятэкай. Цяпер адчыніў ён дзьверы ў абшырную кухню. У куце стаяла печка зь белых кафляў, ля сьцяны - шафы на пасуду й харчы, пры вакне - стол з чатырма крэсламі. У кухні навет быў кран з вадой, люксус запраўды ў гэны час у тых ваколіцах рэдкі. Адны дзьверы з кухні вялі на двор. Ведаў Антось, што гэты здольны й руплівы чалавек меў ззаду выкапаны склеп, дзе трымаў разнае варыва. Функцыю такога склепу Падгайскага па вёсках поўнілі, хоць і ня поўнасьцю, варыўні.

- Дык от, прысядзь, браток, а я тут што-небудзь на скорую руку падгатоўлю, бо й сам галодны як бяздомны сабака, ад раньня заняты быў. Гэты Неміц мне многа часу забраў.

Гэтак гаворачы, Кастусь стаўляў пасуду на стол, браўся чорны хлеб рэзаць. Сярэдняга росту, моцнага складу, хуткі ў рухах, апрануты ў кароткія летнія трусы й кашулю бязрукаўку, Кастусь меў густыя рыжыя валосы - зьява між Беларусаў даволі рэдкая. Шырокі твар з простымі рысамі, павольнымі й дапытлівымі вачмі адразу будзіў да сябе давер. Загар на целе сьветчыў пра тое, што бальшыню часу праводзіў у полі ці ў гародзе.

- А хто гэта такі быў? - спытаў Антось.

- Іхны-ж ваенны аграном. Прыджгаў гадзіны дзьве таму назад з загадам ад камандanта, ну й давай аглядаць гаспадарку, распытваць ды казаць мне які парадак новы трэба рабіць. Знаеш, от такое наша прафэсыянальнае... Але-ж ты, братка, пачакай, можа па чарцы зробім? Ты-ж рэдкі госьць у мяне. Шнапсу паспрабуеш.

- Што за шнапс?

- Нямецкая гарэлка. Ты пасядзі тут, я зараз вярнуся.

За колькі хвілін Падгайскі прынёс сьпелыя памідоры, радыску, зялёную цыбульку, парэзаў памідоры і хлеб, палажыў на талеркі, выняў з шафы каўбасу й пляшку рудой нямецкай гарэлкі.

- Бяры, братка, хлеб, каўбасу, гародніну Ты-ж, пэўне, ад раньня ня еў.

- Ды не.

- Дык вось, бяры, за нашае здароўе, - спанукаў Кастусь, наліўшы чаркі й даючы адну Антосю.

- За наша здароўе, дай Божа, - згадзіўся Дзяркач.

Выпілі й пачалі закусваць. Сьвежы чорны, з баханкі ў хворме вялікай цагліны, хлеб смакаваў добра з вандзонай каўбасой.

- Цікавы й хлеб, дый гарэлка нішто сабе. Дзе бярэш?

Падгайскі сажваў і праглынуў уложанае ў рот.

- Ды ад Немцаў, адкуль-жа... Яны-ж маё во забіраюць. Каб ты відзіў, дня ня пройдзіць, каб іх ня было. Выбралі во ўжо колькі гародніны, каб іх халера!

- І як яны, нічога ня плацаць, так сабе бяруць?

- Камандант дае цэтлік дзе напісана, колькі забраў дый кажа што некалі цывільныя ўлады заплацяць.

- Што гэта цэтлік?

- Ну як квіт панашаму. А я яму, чорту, веру, што мне заплацяць? Ну але што рабіць буду? Кажыць, - відзіш, ужо, сабакі, даведаліся, - што гэта саўгасная зімля, ні мая значыцца. Я кажу, што ўсю маю гаспадарку бальшавікі зрабавалі ды ў саўгас пірадалі.

- Ну й што ён на гэта?

- Чакай, кажыць, цывільная ўлада прыйдзіць, тады разьбяруцца. Ну пагляджу, буду свайго дабівацца.

- А якая гэта цывільная ўлада, чыя?

- Давай яшчо па аднэй чарцы вып'ем, - казаў Падгайскі, наліваючы. - Дык вось, прапаную за лепшую будучыню, каб ня было так блага як пры гэнай нячыстай сіле.

- Я за гэта заўсягды гатоў! Дай Божа! - згадзіўся Антось.

- Дык вось пра гэту цывільную ўладу, - прадаўжаў аграном, калі выпілі. - Гэтыя-ж, ведаеш, браток, што цяперака тут во, гэта ваенныя. Фронт сунецца на ўсход. Ваенныя выбяруцца з фронтам, а на іх месца прыйдзіць цывільная нямчура. От пра іх камандант гаворыць.

- Ну й што ты думаеш, будзіць? Табе-ж лепі тутака відаць, бо я сяджу ў вёсцы, як у мяшку завязаны.

- Цяжка, Антось, сказаць што будзіць. Цяперака во, відзіш, мы ад сьвету саўсім адарваныя. Гэта я пра сваіх людзей зь Вільні думаю. Трэба будзіць зь імі зьвязацца. Будуць-жа камітэты нейкія ці што, газэты свае будуць. Новыя парадкі пачнуцца. Цяперака-ж, пакуль гэтыя вайсковыя хапуны тутака гаспадаруць дык німа нічога нармальнага. Калі тая цывільная ўлада прыйдзіць дык Неміц будзіць памочнікаў патрабаваць. Гавару пра ніжэйшую адміністрацыю, такую як воласьці, паветы ну й школьніцтва. Немцу-ж ня хопіць сваіх людзей, каб за ўсім гэтым глядзець, яму-ж ваяваць трэба. Дык вось, братка, калі гаварыць пра цывільную ўладу дык яна, на маю думку, будзіць двайная, нямецкая й біларуская... Таму нам цяперака трэба разглядацца й прыглядацца, ды калі настаніць час - ні спаць у шапку!

- Я віджу, што ты, Кастусь, ужо многа чаго пірадумаў. Калі так, дык можа скажаш і мне, што рабіць?

- Ты што, сьмяешся? Я ведаю, Антось, што ты добры жартаўнік. Ні ад учарашняга знаемся. Але як ты гэта хочаш, каб я табе сказаў што рабіць?

Антось памаўчаў, узяў скрылёк памідоры на відэлец.

- Не, Кастусь, жартаў тут німа. Паслухай. З нашай вёскі Палякі змабілізавалі вунь колькі дзяцюкоў у войска. Ну й дзе яны? Толькі адзін гультай, самы найбольшы недалуга вярнуўся. А дзе рэшта? Я, як сам знаеш, вышмыгнуў ім з рук. Гэта раз. Бальшавікі мяне арыштавалі па даносу Лявона Шпунта. Блізу галавой не налажыў у дарозе. А ты чуў, што яны ў Бярэзьвічах нарабілі, колькі людзей вымардавалі?

- Ага, чуў. Жахліва!

- Ну дык во. Відзіш, я два разы з пасткі ўцёк. І от, дзякуй Богу, вярнуўся я дамоў, сяджу й думаю: а чаго-ж ад Немца чакаць? Ты думаеш, што ён аставіць мяне й такіх, як я, ды ні зачэпіць? Нівядома як вайна пойдзіць. Можа ён ужо бальшавіком сьпіну зламаў, а можа й не. Ты кумекаеш што?

- Дык чаму-ж не, чую ад Немцаў. Кажуць, што гоняць па ўсіх франтох. Віцебск, кажуць, ужо забраны, Кіеў абкружаны, а там на Ленінград сьпяшаць. Ну але гэта толькі пачатак. Ты гэта самае, Антось, пытаешся, ці такіх як ты зачэпяць, ці не. Але-ж тут ня трэба быць надта мудрым, каб ведаць, што для вайны патрэбна й войска й

сіла рабочая. Як ні пападзеш у вадно дык у другое. Пасядзець дома яны табе ні дадуць. Праўда, цяпер, кажу табе, зарана ведаць што й як будзіць, але яно скора праясьніцца. Трэба быць гатовым. Я ні пра сябе гавару, бо я маю работу, магу ім быць патрэбным. Гавару пра такіх як ты, дзяцюкоў, моладзь...

Памаўчалі.

- Знаеш што, Антось, я пагавару тут з тым і сім, буду вушы й вочы адкрытымі дзіржаць. Як што цікавае, дык табе пірадам. Добра?

- Чаму-ж не? Ты тут збоку, казаў той. Буду на цябе й лічыць.

- От яшчо адно што цікавае: Саладуху Немцы забралі й расстралялі, чуў? Трэба быць асьцярожным...

- Так? Не, ня чуў.

- Дык от цяперака чуеш. Ну Саладуха быў камуніст, а мы ня ёсьціка. Але, знаеш, чаго я ні разумею? Немцы-ж самі ня ведаюць мясцовых камуністаў, ім-жа нехта даносіць. Ну як ты думаеш?

- Вядома свае пальцам пакажуць.

Аграном усьміхнуўся.

- Што пакажуць пальцам - гэта праўда. Але свае ці чужыя?

На такое загадкавае пытаньне Антось ня ведаў як адказаць. Ён упарта глядзеў Падгайскаму ў вочы. Абое маўчалі.

- Чорт іх знаіць якія чужыя...

- А вось давай, Антось, разам падумаем. Ці мала ў нас тут чужых, каторым многія з нашых людзей нявыгадныя? Пра камуністаў я цяпер ні гавару, бо яны ў норы пазалазілі, або зьбянтэжаныя, ня ведаюць што рабіць... Але вазьмі паляч'ё. Ты думаў пра іх?

- Ды не. А што такое яны робяць? Яны-ж цэлы час крычалі, што Немцы - найбольшыя іхныя ўрагі. Я думаю, што яны цяперака Немца баяцца, каб ня выдушыў іх.

- Наіўнасьць, наіўнасьць, Антось. Крычаць на немцаў яны маглі. Але ні забывайся, што паляч'ё ня будзіць спаць, а нешта рабіць возьміцца. Ну й цяпер уяві, што Неміц дасьць нам, Біларусам, як і належыцца, - бо гэта-ж наша зімля, - дасьць, значыцца, нам школы й адміністрацыю. І што Палякі будуць рабіць, падумай. Вып'ем яшчо?

- Давай яшчо па аднэй. Бог тройцу, казаў той, любіць.

Падгайскі наліваў гарэлку, а Антось задумаўся. Аграном назваў яго наіўным. А ён-жа думаў, што меў ненайгоршую галаву на плячох.

- Ну, знаеш Кастусь, з гэтымі Палякамі ты мяне ў тупік паставіў. Чакай, абажджы... Няўжо-ж ты думаіш, што яны маглі-б разам зь Немцам пайсьці, каб нас ізноў душыць? Страшна падумаць...

- Яно-ж сабе страшна, але падумаць трэба. Бо калі мы ні падумаем, Антось, дык хто будзіць за нас думаць? Праўда? Я табе зараз раскажу чаму я так мяркую, што можа здарыцца. Але раней прыпомню табе вось што: ты ведаеш, што я звычайна негаваркі, язык за зубамі ўмею дзіржаць. Праўда?

- А як-жа...

- Але я знаю дзе й калі язык трэба за зубамі дзіржаць. Пірад табой магу быць адкрытым і таму я так усьцешыўся, што ты да мяне прыйшоў. Трэба пагаварыць і падумаць разам. Але ці ты знаеш, што я агульна пра жыцьцё думаю, чаму я такі а ня іншы?

- Ды не, ні саўсім.

- Я заўсягды стараюся бяду прадбачыць. Гляджу на самыя чорныя колеры, рыхтуюся да найгоршага. От што мне памагаіць. Усё гэта, відзіш, што я меў, пакуль гэтыя нячысьцікі, бальшавікі, прыйшлі ды забралі, я здабыў цяжкай працай і навукай. А гэта таму, што на нікога ні спадзяваўся. От, Антось... Каб ні расьцягваць, скажу табе проста, што трэба прадугледзіць самае горшае й цяпер, дый асабліва цяпер. Я прыслухоўваюся што Палякі між сабой сюсюкаюць і пшэкаюць... Знаеш, аціраюцца тутака каля мяне... Ну, ведаеш, свой, местачковы ну й гэтак далей. Вось-жа й чую сёе-тое. Скажу табе проста: ужо Палякі думаюць як прыспасобіцца, каб неяк уладу ў свае рукі пры Немцах узяць. Вядома, яны асьцярожна, бо ваенная ўлада яшчэ тут. Але паночкі ўжо адзін аднаму на вуха, як, маўляў, уладзіцца, каб цэлымі быць дый сякую-такую ўладу мець. А ты падумай, ну, прашу цябе, падумай, што добрага для нас, калі паляч'ё тутака над намі верх возьміць, га?

- Вядома што будзіць...

- Во, во, вядома, а як-жа. І ты знаеш, што трэба толька, каб між іх адзін ці другі адважны ды з галавой найшоўся, сказаў, павёў, як яны ўсе на падтрымку яму. Што-ж, ні праўда?

- Праўда, мы іх знаем.

- От, Антось, чаго я баюся. Нашыя людзі, ведаеш, спакойныя, асьцярожныя, даўно пры ўладзе ня былі. Пакуль яны куды, дык гэтыя ўжо пазалазяць. Ну, скажам, Неміц будзіць паліцыю арганізоўваць, на

дапамогу сабе. Ну й пазалазяць туды Палякі... Значыцца яны будуць мець у сваіх руках стрэльбы. Ну й вядома, ні над Немцам-жа яны будуць начальнікамі, а над намі...

- Гэта як ты, Кастусь, кажаш, так яно можыць і быць...

- А чаму-ж не? Знаеш, я ня ведаю і ты ня ведаеш, як яно запраўды будзіць, але-ж мы Палякаў знаем. Трэба прыглядацца, дзіржаць кантакт між сабой, каб у выпадку чаго адпор даць. Як ты думаеш?

- Табе, братка, відней. Я спадзяюся, што калі што важнае будзіць дык мне пірадасі, каб мы сабе памагалі. Добра?

- А як-жа. Так мы і ўмовімся. Ну дык на здароўе.

Выпілі па трэцяй чарцы.

- А во, - сказаў Кастусь, - чуць ні забыўся, у мяне два вараныя яйкі ёсьць. Хочаш? Добра закусіць.

Ён падаў іх з шафы на стол. Антось узяў адно, пачаў абіраць.

- А што з Жыдамі будзіць, ты чуў? - спытаў гаспадара.

- Немцы ўсё кажуць, што «юдэ капут». Ну але як яны й што будуць рабіць, дык гэта ўвідзім. Цяперака нашыя мясцовыя бедныя жыдкі сідзяць, як мышы пад мятлой. Надта-ж баяцца. Багацейшыя паўцякалі. Ад палячкоў чую, што ў Польшчы Неміц Жыдоў у «гетто» пазаганяў.

- Як гэта ты сказаў? Гет...

- Гетто. Гэта нямецкае слова. Як-бы па-нашаму сказаць - загарадзь; замкнутая ці адгароджаная часьць гораду ці мястэчка. Тамака зьбяруць усіх Жыдоў і дзіржаць пад вартай іх. Ганяюць на работу. Значыцца, волі Жыды ніякай ні маюць, яны саўсім пад кантроляй.

- Гэта Палякі так расказвалі? Дзе гэта так ёсьць?

- У Варшаве, Лодзі ды ў другіх гарадох. Сюды-ж прыяжджаюць нікаторыя Палякі, што працуюць на чыгунцы, дык от яны й прывозяць такія навіны.

- А тутака ў дэпо хто цяпер працуіць?

- А ну тыя, каторыя й раней. Вядома, Неміц гаспадарыць. Кажуць, што нікчэмныя заработкі. Дый наагул гэта ўсё часовае. Яно поўнасьцю выясьніцца, як цывільныя ўлады прыйдуць. А тымчасам вось што: трэба быць асьцярожнаму, каб у нямецкія рукі ні папасьціся. От скажуць, што ты камуніст, пакажуць пальцам на цябе. Каторы Неміц

схопіць і бяз суду, браток, шлёпніць цябе. Чакай, можа й табе трэба было-б аўсвайс узяць?

- Што гэта такое?

- Гэта дакумант, пасьветка, выданая Немцамі. Часам, калі зловяць, от, скажам, які ваенны патруль цябе задзержыць, дык трэба ім аўсвайс паказаць. Але, братка ты мой, ня ведаю, ці табе дадуць яшчо. Даюць толька тым, што для іх працуюць. От мне таксама далі, бо лічаць мяне як пастаўшчыка гародніны для іхных кухняў. Я распытаюся й табе пасьля скажу. Ты знаеш, Антось, от што, давай умовімся: калі ў вас што цікавага, дык паведамі мне, акалі ў нас нешта важнага дык я вестачку табе пашлю. Добра?

- Так і трэба.

- Але ведаеш, Антось, калі сам ні маеш часу ці што, дык ёсьць там у вас хто-небудзь іншы, які хлапец, скажам, каб сюды падбег да мяне? Ну можа які школьных гадоў?

Антось падумаў.

- Бахмачова Янука знаеш?

- Знаю. Ён з маім пляменьнікам Загорным раз да мяне заходзіў. Гэта некалі ягоную цяжарную матку гэты басяк Бжончэк у лесе забіў. Так?

- Так. Гэты хлапец мае галаву на плячох, яму можна давяраць.

- Дык вось і дамовіліся. А я буду тут вушы й вочы адчыненымі дзіржаць. Калі пачнецца почта, прыйдуць якія газэты, ясьней усё будзіць. А тымчасам, кажу яшчо раз: асьцярожна. Асабліва трэба глядзець што паляч'ё вырабляіць.

Антось устаў.

- Але-ж я, братка, і заседзіўся. Трэба, мусіць, пад дом мне. Дзякуй за ўгашчэньне.

- А вось, яшчо адно. Забыўся ў цябе спытацца: дзе-ж Лявон Шпунт падзеўся?

- Я яго ня відзіў ад часу калі вярнуўся. Ты-ж чуў, што са мной было?

- Ні саўсім. Ты лепі пасядзі, раскажы. Чорт яе ня возьміць, работу гэту. Усяроўна забяруць дабро, чэрці нямытыя. А мне аднаму й так даволі.

Антось зноў прысеў, прыглядаўся спрацаваным шорсткім рукам Кастусёвым, а думкі ягоныя вярнуліся да таго мамэнту, калі апынуўся

ў Бярэзьвічах. Паволі расказаў сябру прыгоды ў няволі. Час ад часу Падгайскі ўкідваў трапнае пытаньне. Пры гэткай гутарцы прасядзелі яшчэ добры кавалак часу. Задуманы аграном раптам устаў.

- Знаеш што, Антось, браток, усё гэта надзвычайна цікава, але ўжо відзіш, сонца на захад хіліцца. А тутака ў нас пасьля захаду сонца хадзіцьь няможна. Прыстрэліць могуць. Дык, братка, ні выганяю, але...

- Чаму-ж я пра гэта ні падумаў? - схапіўся Антось. - Добра, ужо йду.

- Хвілінку, от што: пастарайся, братка, шапні там на вуха аднаму ці другому ў сваёй вёсцы, каб муку, збожжа, яйкі, скарóміну дзе схавалі. Гэта нямчура, знаеш, налёты робіць. Паедуць дзе на вёску, пазьбіраюць каляскі, нарабуюць, колькі змогуць, і сабе цягнуць. Гэтак ні раз было ўжо. Дык от скажы гэта людзям, будзь добры. Ну табе ўжо пара.

Кастусь выцягнуў на разьвітаньне руку.

- Дзякую за перасьцярогу й за гасьціну. Бывай, - разьвітаўся Антось.

8

Крокаў пяць ззаду за бацькам, Янук намагаўся роўна прыціскаць касой, трымаць рытм і раўняцца на бацькаў пракос. Касіць даводзілася й раней, але ніколі, здавалася, ня йшло на вытрымку з суседзямі. Гэтай нялёгкай для юнака працы не памагала няпэўнасьць. Накш касілася на сваім собскім, а зусім што іншае калі няведама на чыім.

Праз плячо Пракоп Бахмач аглядаўся на сына, падахвочваў яго. Ня першы раз гнаў Янук пракос усьлед бацьку і ўмеў ўжо ўгадваць яго па рухах, асабліва па тым, як трымаў Пракоп галаву, навет па касмылі валасоў, што коскай зьвісалі над вухам. Бацька касіў заядла, з напорам. І вось неўзабаве, - ведаў гэта Янук, - на плячох, між лапатак, празь сіня-бледную кужэльную бацькаву кашулю пакажацца пляма. Спачатку авальнае хвормы, яна пачнець шырэць і распаўзацца. Гэта пот. Пасьля плямы з поту з падпахаў спалучацца з гэта з плеч і ўжо зусім спацелую кашулю ськіне пасьля бацька на траву, адсапнецца, выцершы рукой

лоб і бровы ды далей насядзе. І скажа: - Дзякуй Богу за пагоду. Трэба насядаць, каб у добрую пару...

Янукова каса роўна ўядалася ў густую траву вялікага ліпавіцкага лугу. А воддаль, направа йшлі іншыя касцы зь Літоўцаў: Тодар Кміт, Уладзімер Пятух, Якубаў Васіль, Бруніська й найбліжэй да іх Антось Дзяркач. Там, пэўне-ж, неўзабаве яшчэ іншыя падскочуць. Хто першы ступіў на гэты луг? Бруніська, кажуць. Тут-жа яму адно перазь мяжу. Ні зь кім не параіўшыся, прыбег на калішні панскі, а пасьля саўгасны луг раней за ўсіх. Пачуўшы, наважыліся й іншыя, ды ўжо дружней высыпалі на сакавітую сенажаць. Пакуль там новая ўлада дабярэцца дык сена ў гумнах апынецца. Людзі з суседніх вёсак касілі на іншых калішніх панскіх лугах.

Саўгасныя працаўнікі, каторыя жылі тут і якім ня было куды йсьці, прыглядаліся, што адбывалася, а некаторыя для сябе касілі. Нямецкія ваенныя ўлады забралі шмат жывёлы, зрабавалі рознага дабра. Навет пастух Хвядос, ня маючы чаго пасьвіць, трымаўся дзесьці наседжанага кута і ўжо ня вітала ўсходу сонца ягоная бяроставая труба. Тымчасам ня было яшчэ нямецкага загаду адносна гаспадаркі зямель.

Чырвонае сонца выкацілася з-за грэбня балотных зарасьнікаў на ўсходзе, весела закукавалі ў Гаравацкай пушчы зязюлькі ды старэчым буйным чубам прыглядаўся ваколіцы, ледзь шэпчачы лісьцямі, на Гараватцы гігант Архіп.

- Дзякуй Богу за залаты дзянёк, добра во падсушыць, - памяркоўна, з задавальненьнем сказаў Пракоп, уторкнуўшы ў зямлю касавіла. Ён дбайліва, жменяй скошанай травы выцер лязо ды выцягнуў зь кішэні зьлізаны па канцах брусок. - Павайстры, сынок. Маладзец ты, роўна пракос дзяржыш.

Падахвочаны юнак паставіў касу. Ягоны брусок - маленькі язычок трывожыў яго. Трэба надта высьцерагацца, каб, замахнуўшыся ім, не чарахнуць рукой па вастрыю касы. Бацька ўчора яе добра выкляпаў, а сакавітая раса й роўны луг як нельга лепш аблягчалі працу. Бахмачы пачалі зь вялікім размахам косамі ўядацца ў траву. Раса сьвяжыла босыя ногі, што пакідалі на скошаным роўныя сьляды. Зоркамі сьвяціліся маленькія кроплі на сьцяблінках, а пах сьвежа кошанае травы казытаў ноздры носу.

- Як ты, тата, думаеш, колькі мы можам скасіць?

- Ды во.., - спыніўся бацька, - цяжка сказаць. Хто скарэй і болі скосіць, таму й будзіць.

Ён зірнуў направа, дзе воддаль, з посьвістам, касілі іншыя.

- Старайся, сынок, каб хоць на пару вазоў было. Свайго-ж, ведаеш, што кот наплакаў.

І Янук пачаў націскаць што моцы, каб ад бацькі не адставаць. Калі брат Мікола ў той час, калі сонца ўжо вышэй Архіпа ўзьлезла, прынёс у абвязанай ручніком глінянай місцы цёплую вараную бульбу з пахучым укропам, пару добрых скварак ды ў асобным збанку кіслае малако, бацька аблічыў з задавальненьнем, што ладны кавалак лугу зваявалі. Усё-ж не бяз трывогі зірнуў ён на суседніх касцоў.

- От каб нам да гэнага лазьняку ўсьпець, - кіўнуў галавой убок, бяручыся за сьнеданьне. - Трэба сьпяшыць, пакуль сонца расу згоніць, бо тады цяжэй будзіць.

Да іх з таго боку ад касцоў нехлямяжа, пераступаючы валы сена пракосаў, збліжаўся Антось Дзяркач. Ён, відаць, таксама нядрэнна націскаў, бо пот выступіў палосамі праз крамную кашулю сьпераду. Ад часу вяртаньня «з таго сьвету» ён пагладзеў, вярнулася даўная ўпэўненасьць і навет калішняя поўная гарэзьлівая жартаўлівасьць, так добра ведамая вясковым дзеўкам.

- Здароў, дзядзька Пракоп! - гукнуў здалёк. - Здаровы сыны. Памажы вам, Божа!

- Памажы, Божа, працаваць ці есьці? - пажартаваў Пракоп. - Здароў, Антось. Можа во прысядзеш піракусіць?

- Ды не, дзякую. Узяў я з сабой нешта ў торбачку. Піракушу, як пару пракосаў яшчо праганю. Ды націскаць трэба, бо дзень залаты... А як вам косіцца?

- А, нічога... Янук надта добра памагаіць. На пару вазоў, думаю, справімся, калі ні наляціць хто...

Пракоп з пытаньнем зірнуў на Антося.

- Ну Янук у вас маладзец. Дзяцюк ужо!

Янук аж падрос на вачох у Антося.

- А адкуль-жа маіць наляцець? - спытаў Пракопа Антось.

- Ды хто іх ведаіць... Сам ня чуў нічога? Можа во быў дзе?

- Дык я-ж во дзіля гэтага, можна сказаць, да вас прышоў...

- А што? - падняў Пракоп галаву, спадзяючыся навіны.

- Быў на днях у Падгайскага Кастуся. Разгаварыліся...

- Ага, ні і як ён?

- Так сабе, дзержыцца. Неміц у яго проста загаспадарыў, гародніну забіраіць...

- Як гэта забіраіць? Задарма?

- Ды даець яму квіткі й кажыць, што калі цывільная ўлада прыйдзіць то заплаціць яму тады за ўсё.

- Цывільная? Калі гэта?

- Дык яны-ж ні кажуць. От фронт пасуніцца на ўсход, дык тады цывільныя прыйдуць... Ну, алі пра гэта доўга гаварыць, можа пагаворым як свабадней будзіць, можа па захадзе сонца.

- Чаму-ж не, зайдзіся, Антось. Надта ўсё гэта цікава, што табе Падгайскі мог сказаць. Яму там да Немца бліжэй, лепі відаць.

- Добра, можа зайдуся. Алі цяпер, дзядзька Пракоп, хачу піраказаць вам што мне Кастусь казаў. Шапні, кажа, там нашым на вуха, каб якую скарóміну, муку, яйкі, птушку, ну ўсякае дабро пахавалі, бо Неміц на вёскі налёты робіць, мужыкоў абіраіць. Дык от, кажыць мне аграном, ніхай прыхінуць што якоя могуць. Гэдак і сказаў, а ўсё болі самі дадумацца можаце. Аказваецца, што як наляціць войска, дык пазабіраіць коні з вазамі, награбіць усякага дабра й сабе валачэць...

- Ну а што зробіш, як прыедуць? Усяго ні пахаваеш. Тыя чэрці паабчышчалі, каб іх зімля ні насіла, а цяперака гэтыя бяруцца...

- Знаю, знаю, але зразумей, што нямецкія налёты, гэтыя хапу-лапу робяцца ваеннымі, дык і бяда таму, каго абчысьцяць. Бо як прыйдзіць цывільная ўлада дык тады й падаткі будуць.

Мужчыны змоўклі. З захаду на чыгункай пачуўся гул, ён рос і прыбліжаўся, неўзабаве ў сьвятле раньняга сонца зазьзяла вялікая сярэбраная група бамбавікоў. Касцы паднялі ўверх галовы.

- Зноў лятуць кляваць! - усклікнуў Антось.

- От сіла! А дзе-ж бальшавіцкія падзеліся? - пытаўся Янук.

- Добра, што нячыстая сіла ў штаны напусьціла. Так ім і трэба! - злосна сказаў Антось.

- Ах, Божа ты мой! - уздыхнуў Бахмач, устаючы ад сьнеданьня. - Нівядома яшчо, што гэтыя во пакажуць, чым вайна скончыцца. Ніхто дабра нам ні прыносіў...

- Добра, дзядзька Пракоп, пагаварыць пагаворым, - усхапіўся Антось, - але я мушу назад да касы...

- А бацька ні памагаіць?

- Занямог нешта.

Антось зрабіў крок, другі й спыніўся. - І з табой, Янук, хачу такжа пагаварыць, - сказаў.

- Са мной? Пра што? - зьдзівіўся Янук.

- Ды... посьля... Цяперака німа часу. Увідзімся.

І пасьля гэтых слоў Дзяркач раптоўна рушыў да сваей, уваткнутай воддаль у скошаны луг касы. Непадалёк яе крочыў, грацыёзна падымаючы доўгія ногі, быццам каб не замачыцца, прыгожы рослы бусел. Ён нешта злавіў у дзюбу, падняў галаву, праглынуў і пазіраў на Антося, які шпарка прыбліжаўся. З павольным узмахам крыльляў падняўся, зрабіў вялікі круг і прызямліўся ля хмызьняку над канавай. Пастаяў, глянуў навокал ды ўзяўся прадаўжаць сваё паляваньне.

Мікола ўзяў пасуду.

- Чуў, Мікола, што Антось казаў? Сёе-тое трэба будзіць схаваць, прыхінуць, - казаў Пракоп сыну.

- Ага, трэба.

- Ды чорт яго знаіць што й куды, - задумаўся Пракоп. - Ну ладна, ідзі дамоў і там, за гаспадаркай глядзі.

Янук узяўся за касу й задумаўся: пра што хацеў пагаварыць зь ім Антось Дзяркач? Часам здавалася яму, што цяперашні Дзяркач і ранейшы - гэта два апрычоных чалавекі. Колішні жартаваў, сваволіў, часта над такімі падлёткамі, як Янук, зьдзекваўся, сур'ёзна да іх не гаварыў, ад сябе гнаў. Ад часу вяртаньня з бальшавіцкае вязьніцы Антось выразна спаважнеў, стаўся больш памяркоўным, задуманым, на слова ашчадным. І ці тая гаворка, якую прыабяцаў, мела што супольнага зь візытай да Кастуся Падгайскага, пра якую во толькі што бацьку згадываў? А калі так, то чаму якраз меў зь ім, Януком, пра яе гаварыць?

- Ну ты, сынок, што, ужо стаміўся? - спытаў бацька. - Давай націскаем. Відзіш-жа, што час ні стаіць.

Янук падумаў, зірнуў на бацьку. Яго ня трэба было два разы спанукаць. Хуткім крокам пайшоў да касы і ўзяўся яе вайстрыць.

9

Янук сядзеў на Гараватцы ля дуба Архіпа і яшчэ раз намагаўся прыгадаць гутарку, што меў з Антосем Дзеркачом. Калі-б ня тая гутарка, а асабліва нешта недаказанае, навет ці не таямнічае ў ёй, не сядзеў-бы ён тут, не чакаў-бы на тое, калі-ж нарэшце асочыць Лявона Шпунта.

- Ты, Янук, братка, паслухай мяне, дык ні пажалееш посьля. Ты і я - добрая пара. Прыдзіцца нам многа чаго разам рабіць. Павер мне, я ўжо ці ні два разы сьмерць абхітрыў, ведаю што гавару. Ня будзіш каяцца, кажу табе. Гэтага-ж басяка, каб яго зімля ні насіла, знайсьці трэба, пакуль з рук ня высьлізьне. Дык як?

Антосевы вочы шчырасьцю зьзялі. Сядзелі на крушні каменьня на мяжы між жыта. Далей, у доле відаць была разложыстая, пышная шыпшына. І здавалася, што ўвесь сьвет замкнуўся ў рамкі хараства жыта, якое канчала наліваццa, васількоў, што духмянасьцю нос казыталі, шыпшыны, што валадарна на шырокай мяжы загаспадарыла. І яшчэ дзесь уверсе траляляў жаўранак і веяў, няньчачы посьцілку нівы, млявы вецер.

Хлапец мяркаваў, што Дзяркач зьмяніўся. Прайшоўшы столькі ліхалецьцяў, - насамперш уцёкі з польскае мабілізацыі, пасьля-ж вяртаньне «з таго сьвету» бальшавіцкае вязьніцы, - гэты дзяцюк быў куды хітрэйшым і вытрывалым, чымся іншыя, што навокал хат сваіх бібікі зьбівалі. І ўжо калі ён што шчыра гаварыў, варта было слухаць.

- А што ты хочаш з гэным басяком рабіць? Нашто ён табе?

- Пагаварыць зь ім...

- Пра што?

Антось скоса зірнуў на Янука, быццам хацеў сказаць: замнога знаць будзеш, скора састарэешся.

- Ты знаеш хто мяне ў цюрму пасадзіў?

- Бальшавікі, хто-ж...

- Колькі іх? Адзін, тысячы? Хто зь іх?

- Ну дык хто? Лявон?

- Ясна, што ён. Таму-ж і хаваецца, бо мяне баіцца.

- Дык лягчэй пайсьці й Немцам наказаць, яны яго возьмуць. Ён-жа камуніст...

Антось сарваў колас жыта, расьцёр яго на далоні, узяў пару зярнят у рот і пажваў.

- Ужо наліліся, цьвярдзеюць, - сказаў. - Думаў я і аб гэтым. Ды пакуль там які Неміц, я сам хачу гэтай брыдзе ў рашку плюнуць. Дый ці толькі плюнуць! Ці ты знаеш, колька гэты басяк бальшавіцкімі рукамі нашых людзей зглуміў, каб яго гром ня мінуў? Гэта нячыстая сіла ні маіць права па нашай дарагой, ім апаскуджанай, зямлі хадзіць, ён на пятлю заслужыў.

Лагодна гойдалася жытняе калосьсе. З другога боку крушні пырхнула пліска й пачуўся піск птушанят. Убачыўшы людзей, птушка адляцела, прысела на камень воддаль мяжы.

- Глядзі, во пліска, мусіць тут гняздо, малыя пішчаць. Адыйдзем, - сказаў, устаючы, Антось.

Усталі, пайшлі шырокай мяжой і спыніліся побач буйнага куста шыпшыны.

- Як ты, Антось, кажаш, што ён нашых людзей глуміў? Ну на цябе данёс, а на каго яшчэ? - пытаўся Янук. Яму яшчэ ня верылася, што Антось, які так нядаўна, - год назад, прыкладна, - на ўвагу яго ня браў, цяпер гэтак шчыра й адкрыта зь ім гаварыў. Дый пра якія важныя рэчы!

- Ён-жа, Косьцік і Паваліцкі Хвёдар, - гэта адна басяцкая банда. А ты-ж ведаеш, што яны пры бальшавікох рабілі?

- Ага... А дзе Павальіцкі Хвёдар?

- Ні знаю. Можа з гэтым басяком дзе.

У Антосевым голасе чулася нотка нецярплівасьці. Янук перастаў насядаць з пытаньнямі. Здавалася, што Дзяркач і бязь іх раскажа яму ўсё, што патрэбна было ведаць. І запраўды дзяцюк паінфармаваў Янука, хаця даволі агульна, пра тое, што дзеілася ў Гацях, што даведаўся ад Кастуся Падгайскага. Асабліва зацікавілі Янука аграномавы мяркаваньні пра тое, што могуць пачаць рабіць Палякі, каб выкарыстаць для сябе Немцаў і як гэта можа прынесьці шкоду Беларусам.

- А пра якіх Палякаў Падгайскі гаварыў? - захацеў удакладніць Янук.

- Ды якіх-жа... Тых, што ў Гацях і ваколіцах асталіся, значыцца падонкаў усякіх, што на нашых людзей нажы войстраць.

- Дык гэта значыць, можа й такіх, што я іх знаю, можа з каторымі ў школу хадзіў?

- Во, а чаму-ж не. Але гэтыя яшчо маладыя. За старэйшымі сачыць трэба.

- Яй-Богу гэта можа быць! - сказаў з націскам на апошняе слова Янук.

- Што такое? - спытаў Антось.

- А тое, што Палякі Немцам могуць служыць. Я-ж відзіў як гэтыя пшэкі, павыходзіўшы ў Гацях на вуліцу, Немцаў віталі. Знаеш што, Антось? Наслухаўшыся ў іхнай школе пра іх патрыятызм і проста дзікую нянавісьць да Немцаў, ніколі не паверыў-бы, каб ня відзіў на свае вочы...

- Дык ты паможаш мне, ці не?

- А што табе памагчы? - хацеў упэўніцца Янук.

- Гэтага прадажнага юду знайсьці.

- Скажы мне, чаму сам проста ня пойдзеш да іх у хату й ні папытаеш? Можа ён там сядзіць і цябе жджэць...

Антосеў твар спахмурнеў. Здалося Бахмачу, што гэта той, калішні Дзяркач, што зараз-жа, бяз цырымоніі, возьме цябе за галёнкуй швырне ўбок. Але Янук памыліўся.

- Ну ты ня сьмейся зь мяне, - мільганула грымаса на Антосевым, твары. - Я ўжо хадзіў. Сказалі, што німа й ні знаюць дзе ён...

- І ты ім паверыў?

- Ды не. Хлусяць.

Янук уважна глянуў на Антося. Дзяцюк пазіраў на яго бязь хітрасьці, як добры сябра ці брат. Хлапец ня сумляваўся, што Антось запраўды патрабаваў ягонае помачы. А калі так, дык як-жа адмовіцца? Ён нагнуўся й сарваў у жыце кветку васілька. Не сьпяшыў з адказам, абрываў з васілька пялёсткі. Дзесьці непадалёк узьляцеў і зазьвінеў жаўранак

- Што ты хочаш, каб я зрабіў? - зірнуў Янук Антосю ў вочы. - Дый ты-ж знаеш, што я бацьку мушу на полі памагаць. Дык як з гэтым?

- Ты ні бядуй. Я з бацькам пагавару і яму адраблю, як трэба. У мяне таксама праца на полі чакаіць. Але гэта работа першая. Дзень, два, і мы яго, басяка, зловім. А тады...

- Што тады?

- Увідзіш...

Найлепш сачыць Шпунтову гаспадарку было з Гараваткі. Калі чаго ня відаць спад дуба Архіпа, можна было няпрыкметна, каб ня

трапіць на вока із Шпунтовае хаты, абыйсьці навокал на супрацьлеглы канец сугра й адтуль прыглядацца. Янук вось цяпер і мяркаваў, ці не пайсьці ў той бок паўз пахілены, шашалем паточаны крыж і знайсьці іншы назіральны пункт. Адылі, рашыўшы, што «абое - рабое», прадаўжаў сядзець пад Архіпам. Антось прасіў яго, каб спасьцярог і пасьля пераказаў яму пра ўсялякую актыўнасьць вакол Шпунтовае гаспадаркі, няхай сабе, на ягоны погляд, няважную, нязначную, маленькую, дый ня толькі дзеяньні людзей, але, прыкладам, і сабакі: калі й на каго забрахаў, ля каго аціраўся, ці навет куды пабег. Антось, відаць, мяркаваў, шро сабака можа зрадзіць сховішча Лявонава.

Ніколі раней ня меў Янук такога паважнага заданьня. Але, каб здабыць для Антося якія-небудзь інфармацыі, трэба было быць надзвычайна ўважлівым. Канкрэтна, зусім нельга было дазволіць, каб увага твая адбегла ў які-небудзь іншы бок, каб праваронiў якую-небудзь дробязь, што можа аказацца для Антося надзвычайна важнай.

Седзячы пад дубам Архіпам, Янук хутка ўсьведаміў, што сачыць ня было так лёгка. Думкі несьлі яго ад Шпунтовай гаспадаркі. Прыйшла вайна, было пра што думаць. А вунь лёгка-блакітнае, зь вясёлай усьмешкай неба раскінулася гэт за далёкую, імглістую йстужку Гаравацкае пушчы. Сонца ўжо добра паднялося, ападала раньняя раса й надыходзіла дзённая сьпёка.

Навокал Шпунтовае гаспадаркі нічога асаблівага не адбывалася. Стары Шпунт хадзіў па ваду, Шпуньціха даіла карову, накарміла сьвіньчо, кышкала на курэй, паіла цяля. Шпунт наважаў на поля каня, спутаў яго, пастаяў, паразглядаўся, пусьціў карову ў загарадзь. Перастаў дыміць комін і на некаторы час аціхла. Сьнедалі, відаць. А дзе мог быць Лявон?

Януку надта хацелася натрапіць на Лявонаў сьлед, прыслужыцца Антосю. Дый сам Янук за зьдзекі над бацькам на Лявона злаваў. У вушах гучэлі Дзеркачовы словы: «ты і я - добрая пара. Прыдзіцца нам многа чаго рабіць разам.» Янук добра ведаў, што Антось слоў на вецер ня кідаў. Ведама-ж, памятаў Янук яго як калішняга вясковага гарэзу, што дзеўкам праходу не даваў і з усіх іншых пакпіць любіў. Але што іншае, калі Антось гаварыў сур'ёзна, так як учора да яго. І прачынаўся тады ў Януку прыгоднік, якому шмат чаго бачыць, пражыць на гэтым сьвеце хацелася. Да гэтага-ж часу нікуды надта ад дому не адлучаўся. А цяпер, вайной, магчыма й адлучыцца ад роднай хаты.

І думаў яшчэ Янук, што, каб асачыць Лявона Шпунта, ці мэтазгодна адно спад дуба Архіпа Шпунтовай гаспадарцы прыглядацца? Можа трэба куды пайсьці, каго распытацца, а можа навет як-небудзь улезьці да Шпунтоў у хату ці гумно, праверыць, ці Лявон дзе на гарышчым прыкладам, ня скрываецца? Гэткія думкі не давалі Януку супакою, але ўсё-ж ня мог наважыцца на што іншае, чымся тое, што раіў яму Антось. А ён і параіў спачатку пасядзець пад дубам, зводдаль за Шпунтовай гаспадаркай паназіраць.

Сабака Жэўжык тузануўся на прывязі, запішчэў. Янук спасьцярог Шпуньціху з вузялком у руцэ, а ў другой трымала кошык. Сабаку, відаць, рупіла разам з гаспадыняй у дарогу. Жанчына пагладзіла яго, сказала нешта ласкальнае ды, разглядаючыся навокал, адчыніла доўгія, скрыпучыя вароты ў гумно. Затрымалася, яшчэ раз разглянулася. Здавалася Януку, што надта ўважна пазірала ў ягоны бок, але быў пэўны, што не магла, калі-б спасьцерагла яго пад дубам, пазнаць з такой адлегласьці. Хлапец яшчэ шчыльней прытуліўся да камля гіганта й уважна сачыў жанчыну з вузялком у аднэй і кошыкам у другой руцэ. Пастаяўшы ля варот, яна паволі, валюхаючыся на бакі, пайшла пад гумно. Сабака плаксьлівым голасам гаўкаў на ланцугу.

Калі Шпуньціха, ужо не аглядаючыся ў ягоны бок, схавалася за казырком павеці, Бахмач раптоўна падняўся й бегам кінуўся пад гумно. Наглядаючы за дворам, каб стары Шпунт яго не спасьцярог, ён хутка прыблізіўся, сагнуўшыся ў рослым аўсе, да задняй сьцяны гумна й прысеў на кукішкі ды слухаў. Маліньнік цяпер хаваў яго ад людзкога вока. У гумне сакатала курыца. Ня чуваць было людзкіх галасоў. Янук ведаў, што Шпунтова гумно стаіць асобна, ня злучанае зь ніякім будынкам. Праз шчыліну зазірнуў у сярэдзіну.

З другога боку прасьвечваліся шчыліны ў вялікіх дзьвярох, праз падваротню ўлезьлі ў сярэдзіну яшчэ дзьве курыцы, і адна - не, гэта быў певень, - ён гнаўся за курыцай, якая, відаць, была неахвотная да любошчаў. У куце стаякла сячкарня, а ў іншым палавіна кладні была заваленая сенам. Ні сьледу Шпуньціхі, ні Лявона. Янук кінуўся за кут гумна й тады, хутка разглядаючыся, спасьцярог вытаптаную сьцежку празь мяжу ў жыце. І здавалася, што далей мільганула жоўтая, у дробныя чырвоныя красачкі, хусьцінка. Асьцярожна, сочачы, каб Шпуньціха яго не заўважыла, прыгінаючыся між жыта, юнак рушыў усьлед. Сумлеву ня было. Дайшоўшы да канца жытняе нівы, жанчына

спынілася, разглянулася, перавязала хусьцінку на галаве, а тады сагнулася над кошыкам, паставіўшы яго на траве. Вузялок с правае рукі палажыла ў кошык, закрыла вечка й пайшла ніжэй Гараваткі, хмызьнякамі, у бок Гаравацкае пушчы. Хто-б яе цяпер пабачыў, падумаў-бы, што ў лес па маліны ці што выправілася.

Янук падазраваў, што дзесь у пушчы скрываецца аб'ект ягных пошукаў. Думка падбадзёрыла. Трэба абавязкова йсьці ў троп жанчыне, якнайбольш асьцярожна, каб, барані Божа, ня ўгледзіла яго. Зь іншага боку паўставалі сумлевы. Няўжо-ж матка асьмелілася несьці сыну ў белы дзень харчы? Ці-ж ня ведала небясьпекі? Ці ня лепш было пайсьці зьмярканьнем, каб бясьпечней ад вока людзкога непажаданага скрыцца? А калі ў белы дзень рызыкавала, дык ці ня было на гэта важнае прычыны?

Як-бы там ня было, Янук пастанавіў усьлед Шпуньцісе йсьці. Знайшоўшы, як яму здавалася, Лявонаў троп, ня мог-бы сабе пасьля дараваць, калі-б зараз яго страціў. Хмызьняк ля Гараваткі неўзабаве скончыўся. Гэтта хутар калішняга асадніка Лазоўскага клінам лугу ўразаўся пад гасьцінец. Шпуньціха меціла праз ладна памяльчэўшую цяпер канаву на адкрыты луг і Янук, прытаіўшыся за кустом, мяркаваў што далей рабіць: ці рызыкнуць і паказацца на чыстым лузе, ці абабегчы гасьцінцам, дзе захінуць яго прысады. Доўга не марудзячы, ён накіраваўся на гасьцінец.

На калішнім хутары Лазоўскага, які так добра ведаў Янук, цяпер пасьвіліся вясковыя каровы. Некаторыя літоўскія сяляне карысталі з надыходу новае ўлады, выганялі туды свой статак. А ў хаце Лазоўскага жыў калішні ягоны парабок Яўхім. Падчас савецкае акупацыі хутар быў далучаны да ліпавіцкага саўгасу.

Дзесь далёка, над Слабадой, пачуўся гул. Відаць, там яшчэ сядзелі й адтуль падымаліся нямецкія самалёты, хоць цяпер ужо куды радзей. Янук ужо бег гасьцінцам і спасьцярог, што жоўтая, у краскі, хутка схавалася на ўзьлесьсі Гаравацкае пушчы. Цяпер трэба было як мага сьпяшыць, каб ня страціць з вока Шпуньціхі ў вялізным лесе. Ішоў у сьлед жанчыне, асьцерагаючыся. Там дзе гасьцінец бег проста, чакаў пакуль схаваецца яна за паваротам, тады сьпяшыў, бегучы побач гасьцінцу, каб найскарэй дабегчы да наступнага павароту. Янук ведаў гэты гасьцінец даволі добра, хоць ня так, як тую ўходжаную сьцежку,

якую школьнымі гадамі ў Гацях пазнаў - кажную драбніцу, кажны папярэчны корань патарчаку, кожны куст ці камень.

Дайшоў да месца, дзе вузкая лясная дарога пераціналa гасьцінец. Гэтта стаяў нявысокі прыдарожны крыж. Крыху, відаць, падгніў, пахіліўся, зялёным мохам абрасла ягоная драўляная шапка-дах. Пачарнела нейкім мясцовым разьбяром выразаная выразаная з дрэва фігурка Збавіцеля з абсохлым вянком васількоў на галаве. Адломаная левая рука зьвісала зь іржавага цьвіка.

Дзесь у верхавіне сухастоіны грукаў дзяцел. Спыніўшыся ля крыжа, Янук мяркаваў, ці пражагнацца, але паднятая напалову правая рука апусьцілася, вочы прабеглі па простым гасьцінцы і ў іх паказалася рашчараваньне. Дзесьці зьнікла жоўтая, у чырвоныя краскі, хустка. Ня відаць яе было і ў пралётах да паваротаў лясное дарогі. Ня ведаючы, куды кінуцца, затурбаваны не на жарты Янук топаў на месцы, войстра ўзіраючыся ў фігурку Збавіцеля, быццам адтуль адказу чакаў. І чаму-ж не падумаў ён пра гэта скрыжаваньне? Куды цяпер кінуцца? Як мага сілаў падбег ён у правы бок, паўзіраўся, пастаяў і зараз-жа рынуўся ў левы бок. Засопшыся, вярнуўся на скрыжаваньне, разважаў што рабіць далей. Не магла-ж Шпуньціха гэтак скора прайсьці даўгога й роўнага пралёту гасьцінцу наперад. Значыцца пайшла налева або направа. Але куды?

10

- Ну й што? Згубіў разінька?

Голас пачуўся ззаду. Юнак крута павярнуўся. Перад ім стаяў у цэлай сваей, заўсёды нейкай загадкавай прастаце, зь лёгкай усьмешачкай на твары, незаменны Антось Дзяркач.

- Як? - пачаў Янук. І ня ведаў што далей сказаць. Чыраваньню наліўся твар, млоснасьць гнула калены. - Як, ты тут? - знайшоў нарэшце язык.

Галоўны літоўскі дзяцюк стаяў перад ім і ўсьміхаўся, а ўсьмешка кпіла зь Янука. Быццам гэта ня той самы чалавек, што кагадзе так пасьброўску прасіў юнака памагчы яму, даводзіў якая зь іх можа быць «добрая пара». Першае зьдзіўленьне змылася прыплывам злосьці: што

за благі жарт выдумаў Антось? На правым ягоным плячы вісела, напханая нечым абношаная рудая, зрэбная торба.

- Гэ-гэ-гэ! - зарагатаў цяпер сухім сьмехам Дзяркач. - Ну што, добра напалохаў цябе? Дык што, згубіў Шпуньціху?

Усьмешка зь кпінамі няпрыемна скрывіла дзяцюкоў твар.

- А хто яе ведаіць, куды яе чорт панёс!

Янукоў голас гучэў горычай рашчараваньня. Зьбянтэжаны Антосевым зьяўленьнем, засаромлены тым, што цётку згубіў у лесе, ён злаваў на сябе больш чымся на гэтага нахабнага дзяцюка. Здавалася, адылі, што той кпіць, забаўляецца зь цябе. Правай рукой Антось агарнуў зрэбную торбу, што зьвісала з пляча на палатнянай шлейцы, ды гладзіў яе, быццам у ёй ляжаў скарб вялікі. Левай рукой узяў Янука за плячо й зусім пасяброўску, зычліва зірнуў шлопцу ў вочы.

- Ня злуй, браток, зараз табе ўсё раскажу. Толькі во давай, - азірнуўся Антось вакол сябе, - з дарогі сойдзім, каб нас тут ніхто ня ўвідзіў.

- Ну а калі хто ўвідзіць, дык і што? - агрызнуўся Янук, ды тарганўў плячо, каб вызваліцца ад Антося. Але дзяцюкова рука яшчэ больш, быццам клешчамі трымала яго.

- Ты, мусіць, зь мяне кепікі строіш? Нашто я табе? - злаваўся Бахмач.

- Пажджы, чакай во... Хадзі з дарогі, сядзем, раскажу.

Ён цягнуў Янука за руку. Заглыбіліся ў гушчар. Спыніліся ў прагаліне ля шырокага пня бярозы. Дрэва, відаць, аб'ёмнае было. Тут-жа ляжала вялікая куча гальля.

- Відзіш во, якое дрэва, зладзеі, звалілі. Гэта-ж, пэўне, у «саюзную Гірманію» паехала. Тут-жа лес самы найлепшы высякалі. Цьфу, зладзеі! - плюнуў Дзяркач.

Ён разгледзіўся. Падшыўка пушчы засланяла іх ад дарогі й толькі зыркае, дападлівае, мабыць, вока магло-б іх адтуль угледзіць. Янук пазіраў на кучу трэсак, пілавіньне вакол цьвёрдага, роўнага пня, параськідванае навокал гальлё, сьляды колаў. Адсюль нядрэнна можна было бачыць скрыжаваньне дарогі.

- Дык от, братка, садзіся. Цябе, пэўня, цікавіць, што папрасіў я цябе злыдня гэтага знайсьці й за табой сьледам іду. Га?

- Ага, - буркнуў Янук і скоса зірнуў на дзяцюка. Ён сеў на пень, а Анатось стаяў побач, разглядаўся па лесе й гаманіў зроўнаважаным, як

бацька да сына, голасам.

- Я цябе папрасіў памагчы, бо хацелася мне цябе праверыць. Знаіш, я ведаю, што хлапец ты нядурны, ну алі гэтага мала...

- А навошта табе мяне правяраць? Што я твой служка, парабок ці якая яшчо трасца?

Пахла маліньнікам. Янук разглядаўся, ці не пазірае дзесь ня яго спад бярозкі прыгажун які, хоць яшчэ й ранавата на грыбы было. Над трэскамі й пілавіньнем гудзеў вялікі руды чмель. У вяршалінах хвояў ямыгнула шырокім хвастом-памялом вавёрка.

- Але-ж ты, братка, і чэпішся! - гаварыў Антось.

Голас войстры, як брытва. Янук спасьцярог гэта й мяркаваў, што дзяцюк хоча выгаварыцца.

- Многа чаго ні знаіш. Некалі будзіш відзіць, што й чаму. Цяперака-ж ведай, што я да цябе, як старэйшы, прыйшоў пагаварыць і параіцца. Усё гэта трэба. Увідзіш. Я прыйшоў да цябе, хоць мне твая помач нінадта й трэба была. Відзіш, я даўно знаў дзе ёсьціка Лявон.

Янука пеканула, быццам джала пчалінае. Гэта ўжо ці ні зашмат. Проста зьдзекі. Але ў час стрымаўся. Зірнуў на Антося зь недаверам і насьцярожанасьцю. Той прысеў побач на траве й лашчыў пузатую, нечым мяккім набітую торбу.

- Ты знаў дзе ён ёсьціка?

Антось адно зірнуў на хлапца й усьміхнуўся.

- Дык навошта зводзіш мяне?! - устаў злосны Бахмач. - Знаў і мне ні сказаў, прасіў мяне сачыць за Шпунтовай гаспадаркай. А я, як дурны, паслуха, сяджу, час ідзець, а бацьку памагчы німа каму. От і выківаў. Чорт знаіць, што робіцца! Пайду дамоў. Трэба я табе, я кабыле другі хвост!

- Пачакай, Янук, ня злуй, ні сьпяшы. Зараз пойдзім да гэтага басяка Лявона! - затрымаў Антось юнака рукой.

- Чаго мне, на якога чорта мне ён? - адпіхнуў Янук Антося. - Сам ідзі. Ну цябе!

- Што гэта з табой, хлопец? - не адставаў Антось, спыніўшы Янука. - Забыўся можа, як ён разам з Косьцікам з твайго бацькі зьдзекваўся, га? Ня хочаш паглядзець, як бандзіт упадзець пірада мной на калені, рукі будзіць цалаваць, каб ні забіў яго? Га? Хадзі?

Янук спыніўся. Памяць уваскрасіла вобраз у хаце. Косьцік Сабакевіч сілай бацьку гарэлку ліе, ікону напокуці б'е, а гэта гніда,

Лявон, як сабачка ўслужлівы, збоку рагоча, Косьціку памагае. Боль заскроб сэрца. Як-жа такую нагоду ў нябыт пусьціць? Цікава, вельмі цікава будзе паглядзець як Антось з тым сабакам рахункі наводзіць будзе.

- Хадзі, ні марудзім! - загадным тонам сказаў Дзярка.

- Дык можа скажаш мне, дзе ён цяперака? - насядаў юнка.

- Знаіш, дзе старая лясьнічоўка?

- Знаю.

- Тамака ён.

Лясьнічоўку гэну ледзь прыгадаў Янук. Некалі, ведама, бачыў яе, гэта тады калі маці жыла, як у імгле прыгадваў яе выгляд. Пасьля, калі Бжончэк застрэліў матку, калі страшыў дзяўчат, ягады адбіраў, сабакам нацкоўваў, людзі ад тае лясьнічоўкі воддаль трымаліся. Калі-ж прыйшлі бальшавікі й нянавісны лясьнік недзе змыўся (былі весткі, што перабраўся ў «генэральную губерню»), новыя гаспадары сачылі за лесам ня горш, чымся старыя паны. І паставілі свайго-ж лясьнічага, дый той із зброяй хадзіў. Ведама, чалавек ня свой, ізь нейкіх Манголаў, атаўбаваўся ў той лясьнічоўцы й пільна сачыў, каб ніхто якое галіны дрэва зь лесу не хапіў. Праўда, бальшавіцкі лясьнік, як гаварылі, быццам лепшы за Бжончка быў, бо дазваляў ягады дзяўчатам і жанчынам зьбіраць, дый - казалі, - за літроўку ці другую самагонкі можна было й дроў у яго адхапіць. Ды ўсяроўна, некаму не дагадзіў, бо ўжо на другім годзе бальшавіцкага паняволеньня зямлі гэтае, нехта, як мясцовыя выражаліся, пеўніка яму падпусьціў. Праўда, як чуў Янук, быццам пеўнік гэны не ў пару выскачыў, бо не ўдалося яму шмат стравіць, агонь пагасілі, а хату нібыта адбудавалі.

- Антось, гэта праўда, што лясьнікову хату быў нехта за саветаў падпаліў? - спытаў Янук Антося.

- Праўда.

- А яна ўся згарэла?

- Ды не, саўсім мала...

- І як яна цяперака?

- Абгледзілі абгарэлую, ну й стаіць, жыць можна. Дый там-жа адрына збоку.

- А ты Лявона там відзіў?

- Ды не. А чаму?

- А калі ты яго там ня відзіў, дык адкуль знаіш, што ён тамака?

- Знаю.

- Табе нехта сказаў, мусіць.

- Ты, Янук, як замнога будзіш ведаць то скора старым станеш, - жартаваў Антось.

Ішлі ўжо з паўгадзіны. Агністымі палосамі сонца прабівалася праз густыя шапкі хвояў, то блыталася ў пышных каронах дубоў, або ласкала вярхі стройных, высокіх бярозаў. Янук, па прывычцы сваей, азіраўся ці дзе якія грыбы ёсьць, а Антось Дзяркач ішоў маўкліва, часамі спыняўся, прыслухоўваўся, ды часта сваю торбу гладзіў. Яны пайшлі ад таго скрыжаваньня на левы бок, па нейкім часе скруцілі направа на лясную сьцежку, а цяпер вось Антось, як выглядала, трымаў нацянькі да тае лясьнічоўкі. Безь яго помачы, відаць, Янук мог-бы згубіцца.

- Што ты, Антось, у торбе нясеш? - спытаў юнак.

Дзяцюк нічога не адказаў, адно скоса на хлопца зірнуў.

- Можа ты Лявону абед нясеш? - пажартаваў Бахмач.

Антось маўчаў. Выйшлі з густых высокіх дрэваў. Перад імі меншыя кусты дабягалі да чаротаў, сітніку, асакі, што расьлі над ручаём. На другім баку яго лес падымаўся ўверх і там, - гэта памятаў Янук, - дзесь на шапцы сугра, які людзі называлі Рыжай Валатоўкай, знаходзілася лясьнічоўка.

- Трэба, мусіць, штаны падкасіць, - раіў Антось.

Праз аер і чароты яны спусьціліся да ручая, які тут ляніва рухаўся, каб дзесьці далей папоўніць воды Бярэзіны. Прыемна пах аер, над вадой тырчэлі стракозы, хутка коўзаліся па вадзе чорныя конікі. Добра асьвяжыліся падбітыя ўжо ногі. Янук зачарпнуў у далоні вады, лінуў ёю ў твар. Сонца пякло зьверху.

- Можа пакупаемся, га, Антось? - спытаў Бахмач.

Дзяцюк, што йшоў сьпераду, зірнуў праз плячо, усьміхнуўся.

- Ням калі. Нас вунь чалавек чакаіць.

- Гэта хто?

- Лявон, хто-ж...

- А ён ведаіць, што мы прыйдзем?

Антось гучна зарагатаў.

- Ого, каб ведаў... Ён-бы пад зямлю схаваўся.

Падыходзячы да Рыжае Валатоўкі, запаволілі кроку. Як хітры ліс, Антось разглядаўся, здавалася, што нюхаў. І чамусьці трымаўся

воддаль ад утоптанай сьцежкі.

- Чаму мы па сьцежцы ня йдзём? Яна-ж нас да самай хаты давяла-бы, - пацікавіўся Янук.

- Відзіш, які ты зялёны, як ты нічога ні думаеш. А ты пра Шпуньціху забыўся? Ну а як мы яе на сьцежцы лоб у лоб стрэнем, то тады што будзіць, га? А яна можа ўжо там із сынам наседзіцца дый зараз варочацца будзіць... Трэба-ж думаць.

Але Антосева асьцярожнасьць не спатрэбілася. Ня ўбачылі яны на дарозе жоўтай хусткі, ня сустрэлі нікога іншага.

- Сьцеражонага й Бог сьцеражэць, - паясьніў яшчэ раз Антось. - Ціха, памалу. Хадзі во сюды, відзіш вунь там бляшаную страху? Гэта й будзіць лясьнічоўка.

Крытая чырвонай бляхай хата ў засені пышных ліпаў, пабудаваная з круглага бярвеньня, прыплюшчылася абсмаленым, забітым дошкамі, вакном на зарослы пырнікам, лебядой і крапівой двор, калі так льга назваць вольнае ад дрэваў лапікла зямлі сьпераду. Ля тыну буйнеў хмель. Другое вакно хаты скардзілася голымі рамкамі й аднэй адарванай, што наўскасяк, на аднэй завесе трымалася, аканіцай.

Шэрая, укапаная ў зямлю цыстэрна, лавіла ваду маленькага, крынічнага ручайка, хлюпала гэтай вадой перазь берагі зьверху. Некалі памаляваныя вапнай, цяпер шэрыя сьцены хаваліся за густым сланечнікам. Вузкая лясная дарога зьзяла адтулінай у сьцяне лесу з другога боку двара, а адрына воддаль ад хаты на гэны бок замыкала гэты запушчаны, асірацелы лясьнічы ансамбль. І яшчэ нейкай недарэчнасьцю тарчэў мэтраў сотню ці больш адсюль на пахіласьці ўзгорка шкялет нявысокай вежы. Калісьці, відаць, сачылі зь яе за навакольнай пушчай, пажарамі.

- Зайдзем ззаду, - сказаў Антось.

- А дзе тут зад, а дзе перад?

- Дзьверы ў хату з гэнага боку. Нам трэба падыйсьці, дзе гушча лесу падкрадаецца пад самую сьцяну, каб, калі хто паглядае празь якую дзірку, ня ўвідзіў нас.

З другога боку спасьцераглі цэлае, дошкамі незабітае, зашклёнае вакно. Антось борзда скочыў некалькі крокаў направа ды, махнуўшы Януку рукой, прысеў за густым і высокім кустом арэшніку. Вялікі шэры заяц выбег з-за кута хаты й паволі прысеў ля сьцяны, наставіў вушы, разглядаўся. Януку карціла скочыць і, пакуль той спасьцеражэ,

схапіць яго за вушы. Антось, палажыўшы ўказальны карэлы палец на вусны, з усьмешкай зірнуў на Янука.

- Ш-ш-ш-ш!

Ён узяў спад ног сухую галінку й кінуў на зайца. Спалоханы, той шмыгнуў за кут хаты. У лесе гаманілі птушкі, дзесь воддаль у кірунку Гацяў ледзь чутна гукнулі два стрэлы.

- Чуеш?

- Што? - зірнуў Янук на Антося.

- Нехта ў хаце бубніць.

Прыслухаўшыся, Янук адрозьніў людзкія галасы ад птушынай шчабятні.

- Ага, чую, - адказаў.

- Памарудзім яшчо. Ніхай Шпунльціха пойдзіць. Ён гэттака, басяк.

Чакаць давялося нядоўга. З-за хаты паказалася жоўтая, у чырвоныя краскі, хустка. З кошыкам у руцэ, жанчына спакойна валюхалася па сьцежцы. Не разглядалася. Праз густую шапку кароны дрэва на зморшчаны твар упаў слуп сьвятла й тады здалося Януку, што ўбачыў пад вачмі сьлёзы. І зьдзівіўся, што і ў басяка злачынцы Лявона ёсьць матка, каторая і сьлязу па ім калі-небудзь пусьціць і якая, пэўне-ж, любіць яго мо больш за ўсіх на сьвеце.

Антось устаў, усадзіў правую руку глыбака ў торбу.

- Ідзём. Цяперака ён наш!

Ціханька падыйшлі да дзьвярэй і Антось асьцярожна націснуў клямку, але дзьверы не адчыніліся. Дзяркач зірнуў на Янука.

- Стань набок, за вушак!

З Антосевай торбы, якую цэлы час нёс, перавесіўшы праз правае плячо, паказалася цяпер дзяцюкова правая рука, а ў ёй рэвальвэр з барабанчыкам, якраз такі, як некалі насілі ў кабурах энкавудысты. А пасьля ўсё сталася маланкава хутка. Правым чаравіком Антось гвалтоўна стукнуў у дзьверы. Мігам адляцела ўнутры зашчалка й дзьверы шырака адчыніліся. Прыгнуўшыся, Антось нурцом кінуўся ў хату. І гэтта-ж зараз грымнуў гулкі стрэл.

- Кідай, сукін сын! Зараз-жа, бо застрэлю!

Валадарны Антосеў голас з нутра хаты не пакідаў ні якага сумлеву, што дзяцюк не жартуе. Нешта бразнула аб падлогу.

- Янук, дзе ты? Бяжы сюды!

Бахмач убег у абшырны пакой, дзе з правага боку пабачыў Антося з наганам у руцэ. Ён, відаць, страляў з кукішак, а цяпер падымаўся на ногі. У куце, налева, стаяў Лявон Шппунт. Перад ім на падлозе ляжала стрэльба. З правага пляча, вышэй локця, праз кашулю цякла кроў. Бледны, раскіданыя даўгія блёнд валосы, аброслы рыжай барадой, зь перапалоху зьзяючыя бочы. Янук прыгадваў як бачыў дзяцюка апошні раз: выдатна адпасенае круглае рыла, упэўненасьць, на твары капрызная нахабнасьць. Шпунт пахудзеў, дрыжэла ў яго ніжняя вусьніна, якраз так, - гэта добра памятаў Янук, - як некалі пры гэнай браме на гасьцінцы, дзе Палякі павесілі Параску Макатунішку. Апрануты быў у шэрую крамную кашулю, чорныя суконныя порткі навыпуск з прыгожых боцікаў, бяз сумлеву «трафейных» зь нейкае кучы, дзе «грабілі награбленае».

На покуці пакою разьмясьціўся малы стол і два крэслы. Зь іншага боку стаяла нізкая, шэрая зялезная печка, адна з тых, якія некалі маглі купіць багацейшыя за сялянаў панкі. Тут-жа непадалёк прысуседзілася шафа із шклянымі дзьвярмі, усярэдзіне перапоўненая пасудай. Непадалёк печкі шарэла на бярозавай калодзе цынкавае вядро, побач яго цэбрык, а на паліцах на сьцяне каструлі й збаны. На стале ляжаў пачаты бохан сьвежага хлеба, сала на талерцы, стаяў малы гладыш з малаком. Харчы гэтыя, відаць, прынесла Шпуньціха. Праз адчыненыя ў другі пакой налева дзьверы відаць было добра асьвечанае сонцам вакно. Пры сьцяне стаяла выгадная, скураная канапа, а на падлозе перад ёй ляжаў даматканы палавік. Ізь сьцяны пазірала вялікая, рагатая ласёва галава.

- Янук, падымі стрэльбу! - загадаў Антось.

Янук нясьмела рушыў да Шпунта.

- Сьмялей, сьмялей! Гэты клоп, каб на яго агонь, цяперака табе нічога ня зробіць.

Янук падняў стрэльбу. Выдалася яна цяжэйшай, чымся думаў. Ніколі раней ня трымаў у руках зброі. Антось падыйшоў да стала, падцягнуў крэсла, сеў побач Антося ды запытальна пазіраў то на яго, то на Лявона. Дзяцюк дрыжэў у каленях, намагаўся закасаць правае рукаво, што зачырванелася ніжэй пляча.

- От, цяпер, Янучок, братка мой, - адсапнуўся Дзяркач, - відзіш каго гэта мы злавілі. Гэта ня ёсьць нейкі просты сабе, цяглавіты, працавіты, пабожны, добры вясковы дзяцюк. Так, ці не? Гэта ня ёсьць

такі, што слухае бацькоў, ходзіць у царкву, верыць у Бога, любіць на ніве сваей за плугам ці бараной папацець, ці касой добра памахаць. Не, гэта ня той рупны, працавіты, паслухмяны бацькаў сын, як у нас многа ёсьціка. Праўду кажу, ці не?

Трымаючы перад сабой накіраваны проста на Лявона наган, зь вельмі сур'ёзнай мінай, Антось зірнуў на Янука, міргнуў левым вокам. Голас паважны, ледзь-ледзь жартаўлівы, мо такі, якім-бы дасьціпны бацька вучыў сына пагаспадарску жыць.

- Ну чаму-ж ні адказваеш? Праўду кажу, ці не? Ты-ж яго знаеш.

- Праўда, такі ён ёсьць, - згадзіўся Янук.

- Значыцца згода. А цяперака давай паразважаем. Прыпомні сабе, што ён ужо пры тэй засмарканай Польшчы, гультай гэты, пачаў, як кажуць, у людзі лезьці. Помніш?

- Ага, чаму-ж не, - буркнуў Янук.

- Задумаў ён, значыцца, у людзі пайсьці. З бядой напалавіну прабэкаў-прамэкаў тыя чатыры клясы, а тады што? Белага хлеба яму захацелася, от што. Так, так, Янучок браток, наш чорны хлеб пану Лявону Шпунту прыеўся, трыбух ягоны наравіць пачаў, яму беленькага захацелася. Простая кужэльная кашуля яму плечы муляла, зрэбныя штаны кастрой сьцёгны церлі. Крамніны яму захацелася. А як-жа! І от гэты мужыцкі вывадака, нашай зямлі выродак, каб яго зімля ні насіла, пайшоў паном чужніком служыць. І тут як тут, - ні пасьпелі добрыя людзі агледзіцца, - ізь сермяжнага мужыка Шпунта саўсім ні благі драгомішч зрабіўся. Справіў, значыцца, пан драгомішч Леон «першожэнднэ буцікі», штаны галіфэ, сурдут, пане тэго, і ходзіць ды нашых бедных мужыкоў па розных панскіх шарварках, каб ён скрозь зямлю праваліўся, ганяіць. Эгэ, каб ты адно, браток Янучок, тады гэтаму вялікаму пану прыгледзіўся. Фу, як ён фанабэрыўся, як пры каждай аказіі над нашым братам зьдзекваўся.

Антось, здавалася, зусім не глядзеў на Лявона, быццам той быў гэтта няпрысутны. А Шпунт стаяў і дрыжэў перад ім, трымаўся за правую, акрываўленую руку. Як бацька, із кпінкай у голасе, Антось спакойна, рэчова, зраўнаважана да юнака гаманіў. Янук ня ведаў як на ўсё гэта рэагаваць. За сьцяной у лесе сымфонію птушкі вялі, лілося праз адчыненыя дзьверы й вакно сонца й нейкай тупасьцю пазірала шклянае вока ў ласёвай галаве.

Лявонавы ногі зрабілі крок. Гулкі, прарэзьлівы стрэла глушыў пакой. Шпунт замёр на месцы і з жахам на Антося пазіраў.

- Табе сказаў, сукін сын, стаі й ня рыпайся! - пагрозьліва паясьніў Антосеў голас дзяцюку, што цяпер усім целам тросься.

Едкі смурод пораху стаяў у паветры. Дзяркач стрэліў у падлогу ля Шпунтовае нагі.

- Кажу, ня рыпайся, бо другі раз проста ў нагу дастанеш. Не сьпяшы на той сьвет, пакуль я скончу расказваць якая ты мошка гадкая!

Антось борзда ўстаў з крэсла, уміг апынуўся ля Шпунта і ўзяўшы кашулю за прарэх каўняра, рвануў. Лявон пахіснуўся, але ўтрымаўся на нагах. Усё трымаючы рэвальвэр з прыцэлам у жывот, рвануў яшчэ раз кашулю й сьцягнуў рукаво з правае рукі. Уважна прыгледзіўся.

- Эх ты, гніда паршывая! Руку я табе прастрэліў? Драпінка малая а ты тут прытвараешся! - крыкнуў Антось і левай рукой наводмаш з усяе сілы ўдарыў дзяцюка па твары. Той моцна пахіснуўся. Відаць, Дзяркач стукнуў у нос, бо адтуль пацякла кроў. Ён адскочыў назад і сеў на крэсла.

Янук зьбянтэжыўся. Здавалася яму, што некалі гэты фанабэрысты, нахабны, грубы ў адносінах зь людзьмі драгомішч-актывіст кінецца на Антося. Дарма. Той стаяў, чмыхаў носам, то бялеў, то чырванеў. А ў вачох яго, - гэта выразна відаць было, - зьзялі маланкі. Што ён у гэны час думаў?

- Ну значыцца, ты, Янучок, помніш пэўня які з гэтага нікчэмніка драгомішч быў. А ці ведаеш ты, які зь яго дзяцюк ніпаседлівы быў, як са сваёй загагулінай за кажнай спадніцай, што на вока пападзецца, ганяўся? Ён табе гэта ня тое, каб каторую добрую дзеўку ўважыў. О не! Яму ніякай нормы, абы бабе пад спадніцу залезьці. Колька гэты басяк добрым дзяўчатам нэрваў і жыцьця напсаваў...

Янук прыгадаў летні дзень, Лазоўскага каровы й Дуню з разарванай сьпераду блюзкай. Гэта тады атрымаў ад любай дзяўчыны такую ёмкую аплявуху. І за што?

- Ён і Дуню раз хацеў у лесе ўзяць, - паскардзіўся Янук дрыжачым голасам.

- І на Дуню тваю напаў? Ха-ха-ха! Дзіва што! Дуня-ж твая надта пекная дзяўчына. Дзіва што Дуню хацеў! Усю сям'ю Макатунішыну байструкамі абдзяліў. От гэта дык нягоднік. Цьфу!

Трымаючы вока на Лявона, Антось паднёс свой наган, уважна яго абгледзіў, а пасьля нацэліўся ў Лявонаву калматую галаву.

- Антось, пажджы..., - адазваўся дрыжачым голасам Лявон.

- Чаго маю ждаць? - трымаючы прыцэл, спытаў Дзяркач.

Лявон намагаўся нешта сказаць, але голас ягоны заглох у дрыжачых вуснах. Жахлівым перапалохам зьзялі на замазаным крывёй твары вочы. Антось апусьціў рэвальвэр і спакойна прадаўжаў:

- Алі што там гаварыць пра баб, над каторымі зьдзекваўся, бег за каждай спадніцай і меры ні знаў. Але гэта, хоць, - каб пярун яго трэснуў! - і шкоды многа каму нарабіў, усётакі яно яшчо ні сама важнае. Бо сама найважнейшае, аказваецца, братка Янучок, было яшчо напарадзе. У гэтай нячыстай сілы вунь якія рогі вырасьлі, калі тыя праклятыя асвабадзіцелі прыйшлі, от калі. Тады ён свае дзярлівыя кіпці распусьціў, паганай натуры поўню-паўнюсенькую волю даў, от калі. Тады яно пачалося, братка ты мой.

Антось зірнуў на стол.

- Ты, Янук, можа есьці хочаш, то бяры еш. Гэтаму гнідзе й так гэтыя харчы ня трэба будуць.

Янук глянуў на стол, памяркаваў, але ня рушыў зь месца. Заінтрыгаваны тым, што Антось зробіць зь Лявонам, паднечаны, ён ня меў цяпер, здавалася, найменшага апэтыту.

- Не, ні хачу, - адказаў.

- Дык от аказваецца, што гэты нядошлы начальнік, - працягваў далей спакойна Дзяркач, - калі пшэкі яго нядошлым начальнікам, знацца цівуном над нашымі сярмяжнікамі паставілі, дык ён толька што свае сілы пробаваў. Але гэта трэба помніць, што ў яго цяга да цівунства была змалку, бо-ж мусіць ні адну бутэльку гарэлкі трэба было «жандовай уладзы» ці там якому задрыпанаму солтысу Паўлоўскаму, каб яго трасца, паставіць, каб хоць і такога засмарканага начальніка дабіцца. Алі-ж тут ні сама важнае тое, якое начальства, знацца, праца гэна была задрыпаная, як кажуць, а важна тое, што вось такі шпуньцік ужо змалку начальнічаць над другімі лез. Вось што сама важнае. Такая во, відзіш, вош, яна ўжо тады пялася на хрыбет свайму ўзьлезьці і ў жывое цела ўпіцца. Ого, ты толька падумай, братка Янучок. Ці ня помніш, як гэты бязьмен, надзеўшы адпрасаваныя свае порткі, кашульку, ці яшчо пад гальштук із касьцюмам, ды сядзіць на той бліскучы свой ровар, грыву на бок, ды так адфраньціўшыся

фарсіць бывала... Помніш? І гэта ўжо ня той нейкі замурзаны, - рукі ў мазылях ад гнаявых вілаў ці ад касы, - Янук, а гэта яго вяльможнасьць, пан драгомішч з ласкі тэй жэчыпаспалітай нядошлай. От хто гэта быў! Алі, якім ён тады вялікім, як яму здавалася, начальнікам ня быў, усё-ж гэта былі толька цьвяточкі, а ягадкі вунь мелі яшчо наперадзе быць. Кумекаіш. Янучок?

Янук чуўся ніякавата, што Антось такі ласкальны, як ніколі раней, тон да яго ўжываў. Праўда, - Янук добра разумеў гэта, - Антось па практыцы калішняй, меў немалы запас майстэрства кпінаў. Язычок, калі трэба, хлёстка, быццам брытвай, мог па мякаці чыйго самалюбства праехацца. А ўжо што й гаварыць, калі Антось пры гэтым жадаў выліць злосьць назапашаную. Сьцеражыцеся тады, людцы мілыя! А ўсё-ж квяліла гэнае няпрывычнае «братка Янучок».

- Дык гэта, аказваецца, толька цьвяточкі былі. Яшчо ў гэтага, каб яго пранцы, нядошлага шпунта прагавітасьць улады й нажывы толька што тады расьцьвітала. Ну і ўжо вядома, што цьвяточак гэты пірацьвіціць а тады, людцы добрыя, вунь які плод будзіць. Цешцеся, дабрадзеі любыя, спажывайце. Дык от і прыйшоў той час, калі з усходу новая нечысьць на нас навалілася. І гэта-ж ні сакрэт быў, што й драгомішчам будучы, труцень і паразіт гэты ўсякую бальшавіцкую брыду добрым людзям у рукі тыцкаў, усякую камуністычную баламуту сваім языком, каб ён яму яшчо тады адсох, між нашых пірапрацаваных сірмяжнікаў пашыраў. І ўжо хто як хто, а ён, тады яшчо драгомішч пан Шпунт, цьвёрда верыў, што прыйдзіць той для яго слаўны дзень, калі той, «хто быў нічэм, той станіць фсем». Гэта-ж так у інтэрнацыянале пяюць, нечысьць бязбожная! Дык от наш шпуньцік верыў і чакаў, ну й дачалаўся. І ад радасьці, як гэны дзень нарэшце прыйшоў, дык у нашага прагавітага паразіта так сэрца з радасьці ёкала, што чаго яму разрыву ні было. Ого, чаму-ж ня цешыцца! Цяпер от ён, Лявон Шпунт, адданы барэц за «ідэі вялікага Леніна й Сталіна», цяперака нарэшце ён, каб яго гаручка, раскашэліцца!

Антось спыніўся, зноў вельмі ўважна пачаў разглядаць свой рэвальвэр, цэліцца ў Лявона. Шпунт, зьбялеўшы, заварушыў вуснамі, каб нешта сказаць, але Антось яго папярэдзіў:

- Жыць хочаш, Лявон?

Шпунт маўчаў. Жахліва перапалоханы, паказеліў вочы на Дзеркача.

- Пытаюся яшчо раз, ці хочаш жыць?

- Хачу, Антось, браток...

Яхідная ўсьмешка шмыгнула па Антосевым твары. Ён адняў ад вока наган.

- Чуеш, Янук, што ён сказаў? Ён хоча жыць. Ты чуў гэта?

Антось падскочыў да Лявона.

- Я табе, гадзюка ты бальшавіцкая, ніякі ні браток! - сыкнуў Дзяркач. - Табе братамі начысьцікі-паразіты, што на народнай сьпіне сядзелі, нашу кроў пілі, з нашага поту жылі, во хто табе браток, жмінда ты чырвоная!

Правай рукой наводмаш ён сільна ўдарыў Лявона па твары. Той пахіснуўся, але ўтрымаўся на нагах і засланіўся левай рукой, спадзяючыся, відаць, новага ўдару. Але Дзяркач плюнуў на Лявона.

- Братам мяне называіць, басяк гэты, бальшавіцкая хлюндра. Я табе пабратаюся!

Сеўшы, Дзяркач з пагардай пазіраў на Шпунта й прадаўжаў спакойна, быццам перад хвілінай ня было ніякага выбуху: - Ну што табе далей расказваць... Сам знаеш, як вось гэта нячыстая тройка, бальшавіцкія гарлапаны,значыцца Сабакевіч Косьцік, Паваліцкі Хвёдар і гэта вош пачалі людзей аграбаць, а тады бальшавіком памагалі людцаў у Сібір вывозіць, у цюрму садзіць. Гэта-ж яны даносілі на ўсіх так званых «ворагаў народу». Гэта нячыстая ханжа лічыла сябе «народнай уладай», ні абы чым. Кумекаіш? Улада ды яшчэ народная! Гэта іх нібы народ выбраў, гэту хлюндру нядошлую, каб народу на сьпіну ўзьлезьлі й кроў ягоную пілі. Ну а што табе расказваць, як гэта «народная ўлада» гаспадарыла? Ты-ж помніш як у гумно да твайго бацькі прыйшлі ды зьдзекваліся, а пасьля што, напіўшыся, у хаце выраблялі! А пасьля, нячысьцікі, у бальшавіцкі калгас, значыцца ў прыгон гналі. І ці ты думаеш, што яны мала нашых добрых людзей у лапы бальшавіцкага энкавудэ аддалі, ці думаеш мала за іх на Сібіры ці на Салаўках церпіць? Гэта-ж яны, нячыстая сіла, галадранцы, па ўсім сельсавеце ці раёне гаспадарылі. Дык ты знаеш колька маглі нявінных людзей загубіць?

Янук запраўды толькі цяпер, прыслухоўваючыся да быццам спакойнага, але нацягнутага, як тугая струна, Антосева голасу, усьведаміў вялічыню злачынаў Шпунта.

- Станавіся на калені! - гаркнуў збоку Антось. - Не, не перада мной, а перад Януком. Цялуй яму ногі, прасі, каб дараваў табе за сябе й за бацьку!

Лявон зьбянтэжана пазіраў на юнака й дзяцюка.

Голасны стрэл страсануў хату, напоўніў пакой смуродам. Лявон прыгнуўся, ухваціўся за левую нагу. Але, як і раней, Антось стрэліў побач у падлогу. Відаць, што добра валодаў зброяй. Шпунт, зьбялеўшы, упаў на падлогу. Янук устаў.

- Паўзі да Янука, цялуй яму ногі, прасі, каб прабачыў за сябе й за бацьку!

Зьбянтэжаны Янука пазіраў то на Антося, то на Лявона. Перастаўляючы калені, з жахам у вачох скоса пазіраючы на Дзеркача, Шпунт прыбліжаўся да юнака. Хлапец зірнуў на свае карэлыя ногі й чакаў, што Антось загадае Лявону ўстаць. Але Дзяркач стаяў і маўчаў. Твар, якога Янук раней ня бачыў; зусім ня той чалавек, якога ведаў даўно, як суседа; ня той гарэза, што дзяўчат забаўляў-сьмяшыў і ня той шчыры сябра, зь якім яшчэ ўчора так паважна на мяжы ля крушні каменьня гаварыў. Не. У гэтым твары пасялілася пагардлівая нянавісьць, што сьціснула вусны, звузіла вочы й самога Дзеркача ў гатовую да скоку пантэру замяніла.

- Цалуй Януку ногі!

Гаркнуў адрывіста. Не магло быць найменшага сумлеву, што зараз-жа бухне наступны стрэла, але гэтым разам, магчыма, не ў падлогу.

- Калі ён табе даруіць то можа жывым пойдзіш. Калі не, застрэлю, баньдзюга!

І тады Янук зусім блізка адчуў жар няроўнага дыханьня, пабачыў разінутыя засьмяглыя вусны, закрываўлены нос, тупыя, жаху поўныя вочы, раскінутыя блёнд валосы. Галава сьхілялася перад ім. Хлапца страсло агідай.

- Цялуй Януку ногі! Прасі, каб дараваў!

Няўцямны Янук дрыжэў, а дзьве Лявонавы рукі, як мядзьведзёвы лапы, агарнулі ягоныя ногі. Адчуў унізе, пад раскінутымі валосамі, няроўную хрыпату.

- Янук, д-д-даруй... акхі, акхі. Гэта-ж ні я над тваім бацькам зьдзекваўся, а Косьцік...

- Ты, сукін сын, яшчо апрўдавацца будзеш?

З гэтымі словамі Антось падскочыў да стоячага на каленях перад Януком Лявона й чаравіком з усяе сілы заехаў яму ў жывот. Шпунт застагнаў, левай рукой схапіў жывот і круком сагнуўся перад Януком.

- Кажу, брыда, апраўдавацца яшчо будзеш?

- Янук, прашу, прасьці мяне.

Голас, як на дзіва, быў чысты й выразны.

- Чуў, Янук?

Бахмач зь няўцямнасьцю стаяў і пазіраў то на Антося, то на Шпунта, ашчаперыўшага ягоныя карэлыя ногі.

- Цяпер цалуй яму ногі! - крыкнуў Дзяркач.

Нашто ўжо перапалоханы выглядаў Лявон, як быццам у трасцы дрыжэў, але нейкая непераможная сіла, магчыма апошняя макулінка чалавечае годнасьці, не дазваляла яму нагнуцца колькі сантымэтраў і прылажыць вусны да карэлых юнаковых ног. Павярнуў спацелы твар набок і зірнуў на Антося. У позірку гнязьдзілася роспач зьмешаная зь вялікай нянавісьцю.

Антось нацэліў рэвальвэр проста ў скроню.

- Кажу астатні раз: цалуй Януку ногі, абедзьве нагі! Болі паўтараць ня буду!

У хаце запанавала поўная цішыня. Янук, потам абліты зь вялікага паднечаньня й зьбянтэжаньня, чуў, як з грудной клеткі на волю рвалася сэрца. Млоснасьць гнула калені. А збоку - сухі, шорткі Антосеў твар і нейкі джгучы голас.

Перш на правай, а пасьля на левай ступні адчуў гарачае, перарыванае дыханьне й мокрую мяккасьць. І гэта апошняя, як маладая жгучка, апякла юнака; ён хацеў ірвануцца, ўцячы, але ўчэпістыя рукі трымалі ягоныя ногі. У той час агіда й нейкі жывёльны нясмак, навытлумачальная брыдота агарнула ўсю яго істоту. Было-ж некалі, што Тапсік яму ногі лізаў і ён з гэтага цешыўся. Але гэтта, мусіць, ня сам фызычны стык так агідна дзейнічаў, як можа сьвядомасьць нікчэмнасьці й нізкасьці гэтага чалавека. Дый наагул, ці мог у той час Янук усьвядоміць, што запраўды дзеіцца? Ці не занадта раптоўна гэта ўсё прыйшло? Яшчо ўчора нічога падобнага ня мог-бы ў сваей галаве ўявіць.

Антось падняў сваю правую нагу, паставіў чаравік на Лявонаву шыю.

- Во так, ня стыдайся, басяк! Ты-ж - народная ўлада. Дык ты народу гэтаму, на чыей сьпіне ты, паразіт, сядзеў, цалуй цяпер ногі!

Чаравік націскаў. Лявонавы вусны прыціснуліся цяпер да карэлае правае ступні. Гэтага было зашмат. Янук ірвануўся і ў той час, як Антосеў чаравік націскаў на Лявона, раптоўна скочыў, вызваляючы ногі зь мядзьвежых Шпунтовых абдымкаў. Бахмач адбегся ў кут. Зьдзіўлены раптоўным Януковым скокам, Дзяркач адыйшоўся ад Лявона.

- Устань! - крыкнуў. - Адыйдзіся назад, да сьцяны!

А тады зачарпнуўшы паветра, не сьпяшаючыся, пачаў лагодным бацькоўскім тонам да Янука: - От відзіш, Янучок, якая гэта скаціна. Я ні дзіўлюся, што ты адскочыў, бо так брыдка. Ну алі што скажаш? Выбачыш яму, ці не?

Пытаньне павісла ў паветры. Зьбянтэжаны Янук пазіраў на Дзеркача й адно зь вялікім намаганьнем зірнуў на абрыдзелага Шпунта.

- Ты сабе падумай, ці, каб ён быў на тваім месцы, што тады было-б? Выбачыў-бы ён табе, ці што?

І запраўды, сьвет абкруціўся й зірнуў на Янука зусім іншым, жахлівым, бязьлітасным бокам. Гэны зьненавіджаны дзяцюк у куце, цяпер зусім стаптаны, паніжаны, гэта тойсамы, які ў іншым часе й месцы вынырнуў бязьлітаснай пачварай, што зь ягонага бацькі зьдзеквалася. І дрыжыкі жаху мурашкамі прабеглі па Януковым целе.

- Гэты басяк, калі ён верх над людзьмі дзяржаў, саўсім ні зь кім ня лічыўся. Ён быў проста што скаціна. Для яго ні Бога ні было, і ніякай увагі, ніякай спагады да свайго брата-сермяжніка. Алі Бог усё відзіць. От прыйшоў і ягоны час за грахі расплачвацца. Ну але, Янук, ты сабе падумай: от цяперака наш над ім верх. А каб так сталася, што гэты галаварэз зноў над табой верх узяў, дык ён бы цябе памілаваў? От ён цяпер, хоць, праўда, і пад прымусам, але-ж табе ногі цалаваў ды прабачэньня прасіў. Відзіш, што гэты паўзун робіць, абы толькі сваё нягоднае, паскуднае жыцьцё ўратаваць. Сам відзіш. Дый што тут відзіць? Ён і быдлам станецца, абы сваю прадажную, нягодную скуру выратаваць. А посьля, ні дай Божа, каб да цябе дабраўся, тады ні жывацей, ён табе спуску на ногаць ні дасьць. Гэта, Янучок, басяк гэты із сама найгоршых падонкаў у нашым народзе. Лавіць іх трэба й душыць, як клапоў, каб і заваду ня было. Мы із табой от судзім гэтага

клапа й я думаю, што табе ня трэба казаць які ў нас будзіць прыгавор. Сам падумай.

Антось устаў, пільна зірнуў на Лявона, што стаяў ля сьцяны, выняў зь кішэні патроны, адкінуў у рэвальвэры барабанчык і, уважна трымаючы Шпунт на воку, ладаваў зброю. Лявон паварушыўся.

- І ня думай, басяк! Ні ўдасца!

Гатовы да стрэлу наган ізноў нацэліўся ў Шпунтову галаву.

- Зьдзявай боцікі! - гаркнуў Дзяркач.

Шпунт лыпаў вачмі, пазіраў то на Янука, то на Антося.

- Ты чуў, ці не? Зь мёртвага-ж сьцягваць ня буду!

І зноў грымнуў стрэл. Янук чхнуў ад смуроду пораху.

- Сядзь і зьдзявай, клоп!

Больш Лявона спанукаць не давялося.

- Дык от, Янучок, ты будзь судзьдзя. Ты зробіш гэтаму чалавеку прыгавор. Добра?

Януку здавалася, што навокал яго адбываецца нейкая недарэчнасьць Ды няпраўда. Нікчэмнік у куце, - тойсамы, што пад Антосевым прымусам ногі ягоныя цалаваў, - гэта-ж ня хто іншы, як калішні «драгомішч-акцівіст», той, пра каторага некалі вясковыя дзяўчаты казалі, што «не сваей сям'і вывадак». Вунь ён, нікчэмненькі ў голасьці сваей, жывёліна з жывёл...

- Ну дык як? Што скажаш?

У Антосевым голасе гучэла нотка лагоднае нецярплівасьці.

- Прыгавор? Як, які гэта прыгавор? - з поўнай няўцямнасьцю спытаў Янук.

Антось устаў, узяў з кута стрэльбу, хутка адчыніў замок і выкінуў адтуль патрон. Ён нанава ляпнуў замком, увесь час ня зводзячы вачэй са Шпунта.

- Прыгавор? Гэта значыць, што маем зрабіць з гэтым басяком, от што. Калі скажаш, што ён на сьмерць заслужыў, дык тут-жа яго й застрэліш. А калі не... Ну дык як?

Янук апусьціў галаву. Антось сунуў яму ў рукі стрэльбу.

- На, дзяржы.

Янук аблапіў кодаўб стрэльбы, пазіраў перад сабой й нічога ня бачыў. А думкі хаосам, адна другой наперагон, роіліся ў галаве. «Як гэта от так забіць чалавека? Калі я скажу забіць дык і заб'ём...»

Ён зірнуў на Лявона. Няўжо лёс гэтага чалавека ў ягоных руках?

- Я.., Я ні знаю.., - сказаў дрыжачым голасам.

- Калі ні знаеш, дык прыпомні колька гэты пацук, гэта камуністычная ханжа нашых добрых людцаў у бальшавіцкія крывавыя лапы выдаў, от як. Кумекаеш? Як цябе вош ці клоп грызець, дык ты што, яго можа шкадаваць будзеш? Так і гэтага во... Ён-жа ў народнае цела ўпіўся, кроў нашу ссаў...

Янук навет ня бачыў, як няўклюдна, быццам гнаявыя вілы, стрэльбу трымаў.

- Стой, чаго ты стрэльбу так дзяржыш? Гэта-ж ні качарга табе! Во так, глядзі!

Антось палажыў наган на стол, маланкавым рухам выхапіў ад Янука стрэльбу й нацэліўся ў Лявона.

- Во так, прыцісьні гэту качаргу да пляча, левай рукой падпірай зьнізу, а правай, значыцца ўказальным пальцам націскай на курок. Відзіш? - тлумачыў Дзяркач. - Цяпер тутака правым вокам глядзі на мушку й цаляй яму проста ў грудзі ці ў галаву. А як страляць дык толька правым пальцам курок націсьнеш і шлёп. Кумекаіш? Толька крэпка прыціскай прыклад да правага пляча й левай рукой дзяржы моцна зьнізу, бо як націсьнеш курок то можыць яна цябе моцна ў плячо таўхануць. Ну й каб куля пайшла куды цаляіш то трэба, каб стрэльба саўсім ні здрыганулася. Відзіш? На.

Стрэльба зноў апынулася ў Януковых руках і ён узяўся яе трымаць так, як раіў Дзяркач. Але зброя была прост-напраст непасільна цяжкая, ледзь трымаў яе ў дрыжэчых руках.

- Так во, роўна дзяржы! Чаго ў цябе рукі дрыжаць?

Антось забег ззаду за Янука, усё з наганам напагатове, Лявона сочачы, выраўняў Януковы рукі, прылажыў яму прыклад да пляча, падняў рулю.

- Во так, глядзі, роўна. Стань раўней на нагах, свабодна, расстаў ногі так, для раўнавагі. Ну а цяпер указальны палец на курку дзяржы. У замок я заладаваў патрон, так што табе толька пацісьнуць і - бабах! - гэтага клапа на сьвеце ўжо ня будзіць. Роўна, роўна, ня дрыжы!

Імгла засланіла Януковы вочы. У шэрасьці перад мушкай дрыжэла раскіданая Шпунтова чупрына, мігцела ма замурзаным твары кроў. Бянтэжыў Дзеркачоў голас. Дзе тая раўнавага? Гэта, відаць, не сапраўднасьць, а сон. Жарам заліло Янукоў твар, мурашкі па сьпіне пабеглі. Пахіснуліся ногі. У гэны момант спацелы палец курчова

ўчапіўся за курок, руля пахіснулася ўбок, страшна таўхануўу плячо прыклад і перад прыплюшчаным вокам грымнуў гулкі выбых. Янук быццам праз сон усьведаміў, што Лявон прысеўі паволі асунуўся на падлогу, а ў млявых руках апусьцілася стрэльба.

- Дурань! Ты-ж у яго ні пацэліў! - раўнуў ля правага вуха Дзеркачоў скрыпучы голас. - От, разінька, ну цябе!

Голас пеканув Янука як джгучка-крапіва й ён вінавата схіліў галаву. Антось вырваў з рук стрэльбу й з размахам кінуў яе на стол. Стрэльба перакуліла збан з малаком, што пакаціўся і з гулам упаў на падлогу. Цурком пацякло разьлітае малако.

- Ні цяпер цябе страляць вучыць. Можа другім разам.

Пасьля гэтых слоў Антось падбег да Лявона, што скорчыўшыся на падлозе сядзеў і, схапіўшы за рулю наган, з усей сілы ўдарыў дзяцюка ручкай па галаве. Той схапіўся загалаву й са стогнам апоўз на падлогу. Тады Антось, быццам зусім азьвярэўшы, нагой заехаў Лявону ў жывот. Адзін, другі, трэці раз. Зь бязладнага цела выходзіў прыдушаны стогн.

- Здыхай нячысьцік! Каб на цябе круганы, а ня людзі!

Ён яшчэ раз ударыў нагой Шпунту ў жывот. Спыніўся й пазіраў на Янука.

- Ну што? Прыстрэліш, ці не?

- А ён яшчо жывы? - спытаў Бахмач.

- Няўжо-ж...

Ці раз у будучыні згадваў Янук гэну часіну, калі ледзь тлеючае Шпунтова жыцьцё было ў ягоных руках. Адылі думка забойства чалавека, што некалі памагаў зьдзекваццa з бацькі й іншых, станула перад ім у сваей велічнай злачыннай жахлівасьці. «Гэта грэх. Як гэта так?» - мільганула ў галаве.

- Ну дык? - насядаў нецярплівы Антось.

- Чаму ты хочаш, каб я яго страляў?

- Вось табе й на. Колька часу сядзеў і ў галаву дзёўб што гэта за цаца такая, як з бацькі й другіх зьдзекваўся, а цяпер пытаішся, чаму страляць...

- А чаму ты яго ні застрэліш?

Антось спасьцярог у Януковым голасе калі ня зухаватасьць то нейкі выклік. Ён зірнуў на Лявона, што кучай гною расплыўся на падлозе, доўга і ўпарта ўглядаўся ў Януковы вочы. Відаць, што нешта думаў...

- Можа лепі ня будзем, - сказаў вяла.

- Дык і ты ні асьмелішся застрэліць? - зноў выклікаў Янук.

У вадказ на гэта Антось няпрыязна, амаль злосна зірнуў на юнака, нічогане сказаў, згроб свой наган, схаваў у торбу і ўзяў ў руку стрэльбу. Разглядаўся па пакоі. Лявон ляжаў нярухома. Рэдкія кроплі разьлітага малака капалі са стала на падлогу, быццам шматкроп'е па гэтай цікавай сустрэчы стаўлялі.

- Ён і так падохніць! - тонам поўнага перакананьня сказаў Антось, зірнуў на Лявонавы боцікі ў куце. - Хочаш боты? Дык бяры.

Янук падумаў, ботаў ня ўзяў. Антось плюнуў і адчыніў дзьверы. Спыніўся ля таўстой хвоі, палажыў тобу з наганам ля ног і зручным рухам выцягнуў са стрэльбы замок. Із размахам яго далёка ад сябе між вершалін дрэва, а патрэны з каробкі палажыў у кішэню. Зірнуўшы абыякава на Янука, што прыглядаўся гэткай дзеі, Дзяркач узяў за рулю стрэльбу і зь вялікім размахам стукнуў сярэдзінай яе па таўстым камлі хвоі. Кодаўб трэснуў. Пасьля яшчэ двух удараў прыклад адляцеў ад рулі. Абодва кавалкі Антось адкінуў у розныя бакі й выцер аб штаны рукі.

- Чартоўскае прыладзьдзе! Як-бы гэта, каб бізь яго людзі жыць маглі?!

Пасьля гэтых слоў, ужо ня гледзячы на Янука, Антось накіраваўся схілам да тэй сьцяжыны, якой прыйшлі сюды. Зьбянтэжаны такім захаваньнем старэйшага дзяцюка, Янук зірнуў уверх, дзе парз густыя вяршаліны дрэваў вызірала засмужанае неба, яшчэ раз азірнуўся на хату ды павольна пайшоў за Дзеркачом.

11

Спацелай рукой Янук камшыў кужэльную торбачку, тую самую, у якой некалі нябожчыца маці смачныя сыры пад камянём выціскала. У торбачцы таіўся сьціплы набытак солі. Юнак намагаўся ўгадаць, ці бацька накінецца на яго за тое, што такі, можа ня зусім удалы гандаль зрабіў.

На золаку яшчэ разбудзіў Пракоп сына. Калі хлапец ацерабіўся і ачухаўся, пазяхнуў раз-другі, пачаў усьведамляць зьмест ласкавага й

роўнага бацькавага голасу:

- ...у Глыбокае сягоньніка... Гэта-ж сьвята вялікае ёсьціка, сьвятога Пятра, дык і людзей, пэўня, у царкву набярэцца. Мне й самаму карціла-б зьезьдзіць, алі-ж кабылы шкода, хапаіць ей работы вуньдзіка беднай... Дый баюся, каб дзе Неміц па дарозе не схапіў; было-ж ужо й такое, людзі кажуць. А схадзіць назарэз трэба. У хаце, - во сам відзіш, - каб табе парашынка солі. Я табе, сынок, торбачку круп насыплю, кусок бараніны ўлажу. Зайдзіся да Іцака, знаіш таго самага, у каторага мы каляску з кабылай ставілі, калі нам на рынак заяжджацца ня трэба было... Яны-ж, Жыды, там пры савецкіх крамах аціраліся й імі загадвалі, дык і соль у іх, пэўня, ёсьціка, а есьці то ў іх нінадта што... От ім трэба пэўня, крупы й мяса. Калі Іцак сам солі ні маіць, дык ён ад другіх Жыдоў можа дастаніць. Толька-ж ты, сынок, глядзі, таргуйся, каб цябе ні ашукаў. Добра, сынок?

Усё гэта бацька ледзь не адным дыхам сказаў. Янук усё зразумеў, апрач таго «таргуйся». Як таргавацца? Колькі солі трэба было-б узяць за тое дабро - крупу й леташнюю бараніну, - што бацькла нарыхтаваў у пуцатай торбе? Пракоп Бахмач на гэта адказаць ня змог.

Лішнім было-б Янука ў дарогу спанукаць. Даўно рупіла яму ў Глыбокае, хоць і няблізка гэта было. Але што юнацкім гадом адлегласьць! Трывога-ж бацькава пра кабылу свае асновы мела. Колькі-ж разоў новыя гаспадары-гарлапаны ў сялянаў коней адбіралі, наскочыўшы дзе як каршун на кволую птушыную дробязь, із пабоямі й траскучым незразумелым вэрхалам, ды на якую працу гналі. Галодныя, зьняможаныя, зьбітыя, вярталіся сяляне дамоў з праклёнамі новых «вызвольнікаў».

І царква, і Іцак цяпер ззаду асталіся. У Януковай торбачцы солі ня больш кіляграмаў двух. А побач ішла вельмі-ж даўно, ад прыходу Немацаў прынамся, нябачаная Дуня.

Дзьве пары босых ног паволі ступалі па мяккім жоўтым пяску на абочыне гасьцінцу, выміналі, дзе трапляўся, шурпаты й колкі жвір. Сонца ладне з паўдня схілілася, лагодны сухавей лашчыў твары й валосы. Па дарозе гуртамі йшлі людзі, рэдка тарахцела каляска. Расьсеюцца-рассыплюцца ў свае вёскі ці хутары па бочных дарогах і сьцежках гэтыя вернікі, што сяньня вялізарную царкву маленьнем гаманой поўнілі. Адно Януку з Дуняй дарога найдаўжэйшая да далёкіх Літоўцаў дабрацца.

Якая радасьць! Дзяўчына роўна, нібы забаўляючыся, ізь ей аднэй свомай нейкай грацыяй крочыла побач. Песьціў Януковы вушы мілым шчэбетам лагодны Дунін галасок. Пазіраў Янук на хвалістыя, густыя, як сьветлы чэсаны лён, пабеленыя сонцам летнім даўгія Макатунішчыны валосы, асмужаны загарам носік і шчокі, пунсовыя й прыадчыненыя, калі маўчала, вусны, мерна дыхаючыя пад тонкім шоўкам грудзі. Зусім у меру, як-бы для закругленьня й завяршэньня сваіх цялесных прынаднасьцяў, Дуня папаўнела, сакавітынм маладым нэктарам налілася. Шчэбет пераказваў розныя дробныя прыгоды, што ў матчынай радні летам дзяўчына мела.

Сустрэліся зусім прыпадкова каля царквы. Пасьля зацяжнога торгу зь Іцкам, ад якога давялося горы жыдоўскага гора наслухацца, Янук на схіл сьвятой літургіі трапіў. У зусім перапоўненую царкву нельга было ўціснуцца. Пасьля багаслужбы вернікі паплылі шырокай ракой праз галоўныя дзьверы. Дробіліся, на групы й сем'і дзяліліся. Пад гоман узмужнеўшых ля тоўстых, аблупленых з тыну й вапны царкоўных сьценаў, жабракоў людзі раскладаліся зь емінай на траве, пад дрэвамі, каб голад замарыць, пагаманіць, навінамі замяніцца, адзін аднаго пра здароўе распытацца ды ўжо пазьней нясьпешна па хатах расплывацца.

Янук прыхіліўся плячмі да мураванай сьцяны, жваў сухі й чэрствы, як жвір, хлеб ды ашчадна, баючыся, што вось-вось скончыцца абкусваў маленькі кавалачак сала. Ад недалёкага, зялёнага з выгляду возера, нясло гніллю водарасляў і рыбнай луской. Ціхая гамана поўніла вялізны царкоўны двор. Вочы юнаковы вандравалі па каляровых хусьцінках, розных кепках і магерках, а ці не мільгане дзе знаёмы твар. З адлеглых за сьвет Літоўцаў рэдка калі тут людзі бывалі.

- А госпадзе мой, людцы добрыя, каго-ж я гэттака бачу!

Міленькі галасок, даўно нячуты званочак. Колькі разоў пра яе думаў, кажны рух цела, зірк вачэй, адцень голасу адтварыць намагаўся! Дзяўчына падыйшла так, што Бахмач спасьцярог яе толькі цяпер, калі твар ягоны гарачым дыханьнем абліла. Правая рука паднялася, каб прыгарнуць яе, але ў пару апусьцілася...

- Дуня, як гэта! - прагаманіў зь нечаканасьці амаль перапалоханы. Кончылася, ці, дакладней сказаць, пачалося няўклюдным жэстам рукі, поціскам непаслухмянымі пальцамі дзяўчынінага локця... Проста, здавалася, наскрозь празь цябе пазіралі незабытныя вочы-васількі. У іх

гаспадарыла добра ведамая гарэзьлівасьць. І выклік. І абяцаньне. Шчодрая вымоўнасьць і недаказанасьць. І яшчэ нешта. Шмат большае. Штосьці такое, што ўзбуджае пульс крыві й спанукае дыханьне, спараджае паскарэньне тэмпа ў скронях і аслабляе сілу ў ваколіцы каленяў. Вочы-васількі пазіралі даступна-проста й прынадна. Здавалася, бачыш яе поўную, сокамі маладога хараства набрынялую грушу дасьпелую, бярозку стройную, а яна ўсё-ж астаецца нейкая ня зусім даканца разгаданая, крыху таямнічая. Чым больш прыбліжаешся тым больш загадак, выклікаў...

У роце засеў камяк несажванае жарствы хлебнае, кавалачак сала. Твар, здаецца, ад сораму гарыць, аж па кончыкі вушэй чырванее. Нешта ня тое... Не пазьбягаў-жа раней зрокам сваім васількоў прынадных. Няўжо-ж ад доўгага нябачаньня перамена? Здавалася, што ля сьценаў гамана й мольбы жабракоў узмоцніліся. Заварушыліся паволі спыніўшыя пераможваньне хлеба санкі й камяк хлебнай жарствы із тэй сьціплай скаромінай шмыгнуў праз гарляк.

- Ты што жвеш і каго чакаеш? - спытала Дуня.

- Цябе чакаў. І як ты знала, што я тутака? - здабыўся на жарт Бахмач. Трапіў на добрую ноту.

- Мяне чакаў? Ах, які-ж ты разумненькі, добранькі, залаценькі, мой міленькі Янучок! А я-ж тут з раднёй... Дый вываражыла, што сягоньня пад цярквой ня толькі жабракоў, але й свайго мілага знайду, - разрагаталася дзяўчына.

Гарэза ў поўным пераліве вясёлкавых колераў. Цяпер Дуня й павяла гэным ладам. І ўжо калі спаважнелі, калі падзяліліся рознымі навінамі, парадзеў шчэбет. Разьвіталася із сваякамі й на вялікую Янукову радасьць крочыла цяпер побач яго. Бо, як выясьніла, ужо на днях мела ў Літоўцы пасьля доўгай адсутнасьці вярнуцца.

Дарога вяла пад гару. Янук замяніўся ў назіральніка. Даўно, ох як даўно ня бачыў Дуні. Адылі назіраньню яе замінаў жыд Іцак дый ягоная Хайка ці як яе там... У вачох стаялі. А калі так, дык чаму Дуні пра іх не расказаць?

- Солі, кажаш, дастаў? Дзе гэта? - выбегла насустрач, быццам угадала Януковы думкі Макатунішка.

- Знаеш старога Жыда Іцку, таго самага, да якога мой бацька заяжджаўся некалі ды на двары кабылу з возам ставіў? Ён гэттака во,

як толькі ў горад уедзеш дык на правым баку. Некалі гуталінай і нейкай там галянтэрыяй таргаваў...

- Мусіць знаю. Ну дык адкуль у яго соль?

- Дык яны-ж. Жыды, знаеш, пры бальшавікох усімі крамамі загадавалі то й сабе назапасілі. Ну а ў каго-ж, калі ня ў іх дастанеш?

- І за што гэта ён табе солі, за пекныя вочы даў?

- Каб-жа... Бацька насыпаў торбу круп, кусок бараніны ўлажыў, от і даў, называецца. Баюся, што бацька крычаць будзіць, што замала солі дастаў. А Жыд як пачаў стагнаць, пра сваё гора расказваць дык усе пэйсы ў барадзе засьлініў... Неміц б'ець, Неміц на работу ганяіць, Неміц усё дабро адбіраіць, ге-э-э-э-э-валт! - ратуйце, людцы!

- Во як! А ты што думаеш?

Янук не сьпяшыў з адказам. Ішлі дарогай, што вужам намагалася ўспаўзьці на пяшчаны, дзе-нідзе сухой травой парыжэлы ўзгорак. Адтуль, быццам на пелене, ува ўсёй сваей сьціплай велічы, побач нябачнай здалёку бяды й галечы, разьляжа перад імі невялікі горад Глыбокае.

- Знаеш, Жыд Жыдам. Ён, як сьвет сьветам, крычаць будзіць, што рэжуць яго ўжо тады, калі ніхто яшчо й нажа на яго ня войстрыць. Дык цяжлка тут разабрацца. І я-б рукой махнуў, калі-б нешта мне ў таго Іцкі ў вочы ня кінулася. Знаеш, нешта такое, што задумацца мусіў...

- Што такое?

- Жах, вялізны страх. Чакай, як гэта табе пераказаць? Гэты жах увесь у вачох ягоных. Чалавек аж дрыжыць, як асіна калоціцца. Ці ты відзіла калі як конь аўтамабіля спалохаецца? Ну, ага, пэўне-ж відзіла. А ці ты глядзела ў конскія вочы?

- Ну...

- Тады ў каня ў вачох вялікая, страшная паніка ёсьцека. Гэта нешта саўсім дзікае, яго цяжка вытлумачыць. Конь са скуры ірвецца, гатовы чалавека стаптаць, а ў вачох ашалелы саўсім. От такую самую паніку відзіў я сягоньніка ў Іцкавых вачох... А можа ні ў ягоных, як у ягонай Хайкі ці як яе там... Дзікі, зьвярыны страх. Гэтак, відаць, баіцца чалавек, якому за скуру гарачай смалы заліюць. Скрыпеў стары Іцка, пярхікаў, сьлініў, што Неміц іх на працу ганяіць і надта моцна страшна б'ець...

Дзяўчына маўчала. Яна нагнулася, сарвала ля дарогі белы рамонак, выцягвала пялёсткі. Янук мяркаваў, што Дуня перастала

ягоным апавяданьнем цікавіцца.

- І што казаў ён, што зь імі будзіць?

- Чаму ён меў мне казаць? Жыды свае дарогі й сьцежкі маюць, яны больш знаюць, чым табе скажуць. Але тутака, мусіць, нічога добрага сабе ня выварожылі. Кажуць, што ў Польшчы Неміц іх пазганяў і дзяржыць разам. Чорт яго ведаіць... Адным словам, стогнуць Жыды, ой як стогнуць. Шкада людзей! Нашто над імі так зьдзекваццa?

- Ты Жыдоў шкадуеш?

- Ясна, што шкадую. Я процiў гвалту над чалавекам. Бог ня даў права, казаў адзін аднаго любіць, памагаць, а ня душыць!

Воддаль ад дарогі прыгнулася крывая сасна. Падножжа яе абступіў ядловец, непадалёк шарэла крушня каменьня.

- Хадзі, вунь прысядзем, сьпяшыць няма куды, - прапанаваў Янук.

Селі на вялікі камень і моўчкі пазіралі перад сабою. Абкружанае ўзгоркамі, места рассыпалася ў глыбокім доле, ад чаго, відаць і назву сабе ўзяло. З правага боку, ад Усходу, лагодныя ўзгоркі, быццам хвалі, напіралі на гарадзкія будынкі. А з фронту, тут-жа пад нагамі нашых юнакоў, бялелі ў засені таполяў муры калішняй гімназіі, у якой падчас польскае акупацыі месца дзеткам мясцовых «кацапаў» ня было. На правы бок, вышэй, на ўзгорку расьселася даўгая, аднапавярховая «чырвоная» школа. За гэтымі будынкамі зелянела невялікае, мо гактараў дзесяць, аброслае трысьніком, чаротам і аерам возера Глыбокае. З правага боку ў ваду яго ўглядалася ахутаная зеленьню сьвятыня, цяпер праваслаўная царква, а калісь кляштар, касьцёл і цьвярдыня надта агрэсыўных ды між мясцовага народу нялюбых Кармэлітаў «босых».

На зялёным даху яе распоўзься аграмадны бізантыйскі купал, які абступілі чатыры вежы. Ззаду да сьвятыні прытуліўся вялізны, з чырвоным дахам, будынак калішняга кляштару. Насупраць царквы, перазь немалы пляц і вуліцу зухавата чапурыўся дзьвюмя барокавымі франтавымі вежамі рыма-каталіцкі парафіяльны касьцёл. Ракой Бярэзьвіцай, што прабягала пад мостам на Віленскай вуліцы, гэтта-ж побач старога й бязьдзейнага вадзянога млыну, возера Глыбокае спалучалася з возерам Беразьвецкім. На паўночным канцы апошняга відаць быў сілуэт калішняга Базыльянскага касьцёлу й кляштару.

Палякі трымалі тут гарнізон кавалерыі, а бальшавікі замянілі яго ў вязьніцу, у якой закатавалі шмат выдатных мясцовых людзей.

Направа ад праваслаўнае царквы зелянеў стары гарадзкі сад, а за ім - могільнік. Шнуром старых бярозаў бег гэтта гасьцінец на Лужкі й Дзісну. За царквой і парафіяльным касьцёлам, у паўночна-ўсходнім куце стоўпіліся двух- і трохпавярховыя будынкі. Два зь іх калісь памяшчалі пачатковую й тэхнічную школы. Стаялі побач бальшака, што бег на Азерцы й Мамаі.

У прадаўгаватае Беразьвецкае возера з аднаго боку ўглядалася сьвятыня з кляштарам, а заходняга - сасьняк на пяскох. Вялізная і крыклівая хмара груганоў і варон ніколі ня сьціхала над жыдоўскім могільнікам побач конскага рынку, які атрымаў мазву ад таго, што калісь на ім пераважна коньмі гандлявалі. Галоўны-ж рынак ляжаў на скрыжаваньні вуліцаў Віленскай і Докшыцкай, у цэнтры места. Сюды з паўдня дабягаў і гасьцінец, ля якога сядзелі цяпер нашыя юнакі. Паўдзённы й захадні бок гораду раскінуўся на ўзвышшах. Гэтта пасялілася бальшыня Жыдоў і выросла калісьці вялікая, як пуня, сынагога. У недалёкай будучыні паўстане тут і глыбоцкае «гетта», у якім зброя й пажар вынішчуць рэшту жыдоўскага насельніцтва пад восень 1943 году.

Чыгунка з Гацяў дугой падбягала да гораду з паўдня. Цягнікі спыняліся на станцыі паблізу шырокага Докшыцкага гасьцінцу, дзе на белай вадакачцы вялікімі літарамі напісалі назву гораду, а чыгунка бегла на захад, - на Варапаева, Паставы, Сьвянцяны й Вільню.

Юнакі любаваліся панарамай места. Яго зелень, пярэстасьць будынкаў і аж тры сьвятыні, што ў абодвы возеры ўглядаліся, ідылічным выглядам запярэчвалі існаваньню якой-небудзь вайны. Праўда, кагадзе ў Бярэзьвічах нос зарываў смурод ад трупаў замардаваных бальшавікамі вязьняў, а цяпер нямецкая жандармэрыя СС, апора «новае Эўропы», разьмясьцілася ў выгадным будынку побач Бярэзьвіцы на Віленскай вуліцы. Зьявіліся ўжо й жоўтыя мундзіры нямецкае цывільнае ўлады, а польская разьведка, на службе свайго замежнага ўраду, ужо рабіла лісты Беларусаў, якіх пасьля зьнішчала нямецкімі рукламі як «камуністых».

- Пекны горад! Не? - сказала Дуня.

Янук задумаўся. Калі глядзіш на яго здалёку, дык із сваей велічнай панарамай горад дзіва які прыгожы. Ды ў памяці трываў іншы цобраз:

ля вэрхару крамаў із прынаднымі таварамі аж кішэла ад бедных дзетак, вуліцы й завулкі сьмярдзелі адсутнасьцю адходнае сыстэмы, а зялёнае й прыгожае здалёку возера поўнілася гусіным і іншым калам, сьцёкамі ды іншым хламам. Рыбак з вудачкай (былі й такія-ж, - зьлітуйся, Божа! - рыбакі) мог прасядзець ці адну пару й нічога ня клюнула. А дзядзька Захарук ізь сьлязьмі ў вачох апавядаў як бальшавіцкая брыдота ў бярэзьвіцкім манастыры-вязьніцы нарабіла. І прыгадваў Янук, на яго думку, найбольш велічную аграмадзіну - праваслаўную царкву. У сярэдзіне надта-ж прасторнага, наводля рэпы, купалу пырхалі «сьвятыя птушкі». Юнак іх на свае вочы бачыў. Такія самыя, як на іконах Хрышчэньня намаляваныя, ды пра якіх у дзень Вадохрышча сьпявалася:

І дух відзе галубіне...

Дух гэны, як у сьвятым Эвангельлі сказана, у выглядзе галуба на Хрыста зыходзіў. А гэтыя-ж галубы, што гаспадараць усярэдзіне вялікага царкоўнага купалу, улезьлі туды, пэўне-ж, праз пабітыя вокны, якіх зьнізу не разгледзіш, завысака. А што яны - зусім ня дух, на гэта доказы ёсьць. Стаіш у царкве, Богу молішся, а тут раптам плёх на галаву. Памяркуйце самі

Ад «сьвятых птушак» да Жыда Іцкі зь ягонай Хайкай, ці як яе...

- Ой, ня будзіць дабра, Януцок, ня будзіць! - лямантаваў Іцка й жывёльны страх у вачох ягоных загнязьдзіўся. - Насы ў Польсцы пазганялі ў «гетта», б'юць і страляюць! Ой, ні цакаць і нам дабра!

- «Бедныя людзі, шкада іх! - думаў Янук. - І няўжо Неміц гэты такі зьвер?»

Маўчала побач Дуня. Вышчабяталася. Спасьцерагла, што Янук пільна да яе прыглядаецца. Усьміхнулася. Не хацелася з гэтага месца йсьці. Здавалася юнаку, што сядзеў-бы так зь любай дзяўчынай, цешыўся-б цудоўным відам гораду й няхай-бы забаўляўся валосамі лёгкі вецярок.

Ззаду, з-за плячэй, адтуль, дзе гасьцінец усьпінаўся на пяшчаны ўзгорак, даляцелі дзікія крыкі, скрып калёсаў і адзінотны стрэл. Янук і Дуня ўміг скочылі й пабеглі ў гэны бок. Трымаліся воддаль ад бальшака. пад прыкрыцьцём кустоў. Перад імі на даўгім, прынамся на кілямэтр, гасьцінцы, убачылі вуж вазоў-аднаконак, наладаваных

шэрымі мяхамі. І гэны вуж, як адразу было відаць, завяз у сыпкім, дробным пяску. Гэты адрэзак дарогі добра, аж занадта добра, ведалі вакольныя сяляне й стараліся, калі зь цяжкімі вазамі, аб'яжджаць яго докшыцкім гасьцінцам.

Новы ўладар, вядома, мог пра гэта ня ведаць, або й перасьцярогаў на ўвагу ня браць. Зь сялянскімі сьвіткамі ўперамешку варушыліся ля вазоў нямецкія мундзіры. Некалькі чалавек, натужыўшы як мага мускулы, учапіліся за сьпіцы калёсаў, намагаліся пхнуць пярэдні воз. Адзін лейцамі спанукаў і пугай лупцаваў у аглоблях сівога каня.

- Нооо! Каб цябе воўк, нооо! - крычаў заядла селянін.

Калі сяляне, чалавек шэсьць, стараліся зварушыць пераладаваную каляску, Немцы ім не памагалі. Адзін прыкладам стрэльбы біў у плечы, па галовах, дзе трапіў, а іншы, запеніўшыся, лаяўся на ўсю глотку. Ён стрэліў уверх, мусіць таму, каб страхам спанукаць і каня і сялянаў да большага намаганьня. Але колы аж па восі ўвязьлі ў пясок і ясна было, што ня выбрацца адтуль калясцы з такім цяжкім ладункам.

Юнакі сьцішылі дыханьне, прыселі за кустом. Дзіўным быў можа ня сам факт, што Немцы сялянаў білі, але чыста прымітыўна-дзікі спосаб біцьця. Стрэльба ў руках Немца, як качарга, то прыкладам, то руляй таўкла па сялянскай мякаці, па касьцях. Падобна селянін на таку снапы цэпам малаціў некалі. Чалавек, стукнуты моцна ззаду, пахіснуўся, упаў. Немец падскочыў да ляжачага і з усяго размаху ботам яго ў твар ударыў. Закрываўлены, із глухім енкам, селянін схапіўся за галаву, адкаціўся набок.

- Фэрфлюктэ, мэнш! Шнэль, шнэль! - дзёрлася запененая глотка.

Ля ўсіх вазоў варушыліся, натужваліся змучаныя людзі.

- Глянь, глянь! - усклікнуў з абурэньнем у голасе Янук. - Гэтыя-ж нячысьцікі, каб іх зямля ні насіла, нашых людзей б'юць! Каб на вас гром! Ці-ж вам ні відаць, што калёсы саўсім у пяску захрасьлі, што ня выбрацца?

- А што яны тых мяхох вязуць? - пыталася дзяўчына.

- Як то што? Зярно, пэўня, от што.

- Дык цяперака-ж, перад жнівамі, людзі ў прогаладзь жывуць. Дзе яны маглі так многа зярна набраць?

- А дзе, ты думаеш, дзелася збожжа з маёнткаў, каторыя бальшавікі саўхозамі парабілі, га? От пэўня каторы маёнтак абчысьцілі й вязуць, можа на млын, ці куды, - тлумачыў Янук. - Мяне толькі

цікавіць, чаму яны сваімі грузавікамі не вязуць, а мужыкоў пазганялі... І хто гэта відзіў каб на вазы так многа накладаць?

Прыглядаліся дарэмным натугам вужа хурманак узьлезьці на ўзгорак. Вэрхал і біцьцё прадаўжалася.

- А хто гэта казаў, што Неміц ні такі дзікун, як Маскаль, што людзей так ня душыць! Паглядзі во, як нячыстая сіла, каб цябе зімля ні насіла, як б'ець людзей, як быдла якое! Каб цябе, каб цябе! Што ты зь яго выб'еш, сукін сын?! - злаваўся Янук.

- Лепі пойдзем, Янучок. Глядзі, нас яшчэ ўвідзяць дык і нам пападзець.

- За што?

- Як то за што? Ці ім многа трэба? Возьміць у прыпрэжку, а тамака разьбірайся.

- Чорт яго, гэтага Немца, знаіць. Можа праўду кажаш...

Гулкі вэрхал, скрып вазоў, рыпеньне гужоў, хрып коней і цяжкое дыханьне людзей ня спыняліся. Нязвычайны вобраз прыкаваў юнакоў да зямлі. Стаялі, як заварожаныя. Напятыя да адказу мускулы, акрываўленыя й спацелыя твары, енк і стогн ад удараў, запененыя коні, - жах! Трэснуў гуж ад хамута й сівы пярэдні конь, зрубцаваны пугай, увесь дрыжачы ад перапалоху, задам выступіў праз аглоблю. Немцы ззаду падбеглі да пярэдняй хурманкі й пачалі нешта гергятаць. Сяляне, усё яшчэ ўпёршыся ў воз, звольнілі натугі. Зноў пачуліся крыкі загадаў і некалькі мяшкоў з возу паляцела на дарогу. Рукі зьвязалі парваны гуж.

- Ну вось так і навучацца, - заўважыў Янук.

- Чаго навучацца?

- Паськідаюць мяшкі з вазоў, каб лягчэй было, узьедуць на гару, а тады мяшкі паднясуць і зноў наладуюць. Так усім лягчэй будзіць.

Загад, чуваць было, пайшоў па ўсім вужы нязвычайнага абозу, бо зь іншых калясак мяхі пачалі ськідаць.

- Пойдзем! - спанукала Дуня. - Даволі нагледзіліся.

Ішлі воддаль ад дарогі між кустоў, каб далей ад вока няпрыяцеля, каб, барані Божа, азьвярэлым чужынцам у рукі ня трапіць. Доўга стаяў яшчэ збоку вэрхал. Рэдка перакідваючыся словамі, думаючы пра толькі што пабачанае, прайшлі немалую адлегласьць. Невялікі лес абступіў рэчку, што пятляла між пяшчаных берагоў. Зьвярнулі ў лес. Гэтта зусім іншы сьвет, быццам і ня было таго жахлівага на дарозе пад узгоркам.

Паглынулі іх трэлі птушыныя, ціхі шум-гамана дрэваў і расьлінаў, што летам і сонцам цешыліся.

- Ты адчуваеш, як парыць? Можа што нацягніць, - сказаў Янук.

Дуня маўчала. Яна падняла падол шаўковай сукенкі аж за калені й пабегла на сярэдзіну вады. Рэчка гэта плыла зусім паволі й дзяўчына боўтала ваду нагамі, падымаючы то адну то другую, круцілася, усьміхалася, прыглядалася спакойнай тоні. Яна нахілілася, распусьціла валосы, прыглядалася сабе ў вадзе, быццам у люстры. Янук забыўся ўжо пра Іцку, біцьцё сялянаў ды вэрхал Немцаў, ён уважна сачыў дзяўчыну.

Далібог, русалка! Кажуць, што ёсьць такое дзіўнае стварэньне з рыбіным хвастом, гібкім дзявочым станам, даўгімі, пышнымі валосамі, чароўным тварам. Можа гэта адно для дзяцей казкі... А ягоная, Янукова, русалка во тут, перад ім, у вадзе. Зірніце, людцы мае, зь якой грацыяй, спрытам ахарашваецца, любуецца яна, сама ў сябе ў спакойным водным люстры ўзіраецца. І шкадаваў хлапец, што маляром-мастаком ня быў. Пастараўся-б, абавязкова намагаўся гэту істоту на палатно перадаць, назаўсёды ўвекавечыць яе ў поўнай грані колераў. Няхай-бы побач італьянскіх мадонаў яе паставілі. А чым яна за тыя мадоны горшая? І падпісаў-бы так: «Мая русалка Дуня». Не. Мусіць накш: «Вясковая русалка». Во так. Гэтак абавязкова было-б лепш. Няхай-бы адгадвалі, чаму «вясковая» і чаму «русалка». А якая каму да гэнага справа? Ён, Янук, - мастак і ён яе так бачыць. Чуў-жа пра тое, што розныя мастакі бачаць аб'екты па рознаму.

Ды не, чакайце. Мастак Янук Бахмач дарабіў-бы да гэтай «вясковай русалкі» вялікі й гнуткі рыбін хвост. Такі із двумя пругкімі плыўкамі з бакоў. Пакінуў-бы бадай так, як ёсьць, верхнюю часьць фігуры ад каленяў аж да кончыкаў доўгіх валосаў. Але чакайце, людцы добрыя, тут ня ўсё ў парадку...

Януку давялося некалі ілюстрацыі русалак у кніжках бачыць. Хвост, вядома, як кажны рыбін хвост. Але-ж рэшту гэтага цудоўнага стварэньня ніколі ў шаўковую сукенку, здаецца, ніякі мастак не апранаў. Дык як быць? Пачаў тады ўважней дзяўчыне прыглядацца. Грудзі зусім няцяжка ўявіць было. Некалі-ж навет прыпадкова тыя пупышкі бачыў, а цяпер яны празь мяккі, пэўне-ж яшчэ ў панскім палацы камбедам зрабаваны шоўк зусім выразнымі абрысамі ўвыдатняліся. А што-ж далей, калі ўяўляць і вандраваць зьверху ўніз?

У меру плённага падарожжа Януковага ўяўленьня чырваньню загарэўся ягоны твар. Фантазіі нядрэнна памагаў сам аб'ект юнаковага зацікаўленьня, што падкасаўшы вышэй каленяў прыгожую сукенку бэрсаўся ў рэчцы. Фактычна для ўяўленьня пакінула дзяўчына зусім нікчэмны кавалак тэрыторыі, дый там пырсканьнем абмочаная сукенка шчыльна лашчыла гібкае цела. І хто ведае як далёка забрыў-бы ў сваіх мастацкіх вандроўках Бахмач, калі-б «вясковая русалка», зачэрпнуўшы з рэчкі паўнюткія прыгоршчы вады, ня плюхнула яму ў твар. За вадой паліўся раптоўны звонкі рогат.

Хлапца, што быццам прачнуўся ад чароўнага сну, салодкіх мастацкіх падарожжаў, сустрэла ўцелаўленьне «вясковае русалкі»: скакуха-рагатуха. заліваючыся гулкім сьмехам, набірала зноў у прыгоршчы вады ды, добра прыцэліўшыся, яшчэ раз плёхнула ў наліты румянцам Янукоў твар.

- Ах ты, жаба, я-ж табе пакажу!

Забыўшыся пра той скарб солі ў торбачцы, Янук раптоўна скочыў у рэчку. Макатунішка, як сарна, шмыгнула ў зарасьнікі на процілеглым баку, суправодзячы свае ўцёкі гулкім сьмехам і піскам. «Жабу» нялёгка было знайсьці, а яшчэ цяжэй злавіць. Ведаў Янук ейную паваротлівасьць і вынаходлівасьць. Дзіва няма, што неўзабаве дзяўчыну страціў. Спыніўся, заклапочана калупаў у носе, прыслухоўваўся дрыжэньню й дыханьню лесу, вакол сябе разглядаўся. Мяркаваў, што неўзабаве, як тыгрыца, скоча на яго «вясковая русалка», пазводзіць, прынадзіць, каб яму, чырвонаму ад сораму й нязручнасьці, яшчэ больш запякло і ў сэрцы заскрабло.

Ззаду дзьве рукі аблапілі шыю і ў той-жа момант войстры штуршок падбіў правае калена, а ўжо ў наступную часіну хлапец ляжаў на траве. Рагатлівы голас, із гарачым дыханьнем ля правага вуха, зьдзекваўся: - Ага, даганяў і даганяў, аж пакуль я цябе злавіла! Ха-ха-ха! Я-ж табе цяпер пакажу!

Ашчаперыўшы яго ззаду, яна прыціснула хлапца да густое гэтта й мяккае, як шоўк, травы. Адылі тое нядоўга трывала. Спрыт - адно, а сіла - іншае. Янук лёгка разлучыў Дуніны рукі, ашчаперыў яе і неўзабаве дзяўчына пад ім апынулася.

- Даруй, міленькі, да душы, ня буду! - сьвяціліся шчырасьцю гарэзьлівыя вочкі. - Я ні такая благая, як ты думаеш. Ня буду, Янучок, выбачай!

Такая непасрэднасьць бянтэжыла. Юнак мала разумеў дзявочыя шыканы. Дый Дуня, якая-ж там зь яе дзеўка? Падлётак. Дык што гэта? Гарэзьлівасьць ці шчырасьць? Мусіць юрлівасьць, пра якую ніколі ня думалася, замінала думаць. Дый дзе там рацыянальна думаць будзеш, калі побач такая прынада-спакуса ляжыць: запрашальна прыадчыненыя вусенкі, жыўчыкі аганькі ў вачанятах танцуюць.

Янук няўклюдна агарнуў рукой дзявочы стан ды прагавіта прылёг да сакавітых вуснаў. Дунін роцік разьмяк, гарэньнем і пажаданьнем суцэльна зь ягоным зьліўся. У лесе спынілася, замерла ўсё жыцьцё. Ім, маладым, у цалунку злучаным, прыглядалася й зайздросьціла, мабыць, уся прырода.

Паскорылі тэмпа малаточкі ў скронях, аслаблі калені. Салодыч цягнула, паглынала, у вір ненасытнасьці валачыла. «Вясковая русалка» пружынілася, вілася ля яго й вакол яго, зручна выштурхнулася спад юнака і ўжо наверсе была, выцягваючы зь яго, здавалася, рэшткі энэргіі. Нейкім чынам рука Янукова завандравала ў тое месца, дзе, згодна ранейшага Януковага ўяўленьня, гнуткі русалчын хвост з рэальнай Дуняй меў злучацца. І тады, калі прагавіта й ненасытна, ледзь не да страты прытомнасьці ўпіваўся Янук у Дуніны вусны, калі забракла паветра, дзяўчына зручна адштурхнула яго, адскочыла і ўжо стаяла на нагах.

Зачырванелы, Янук ляжаў плячмі на траве. Ня сьціхалі малаточкі ў скронях і яшчэ трымала млявасьць ля каленяў. Спачатку без развагаі, ледзь ня кінуўся за дзяўчынай, але стрымаўся. Дарма. Яе не дагоніш.

Там высака, над верхавінамі бярозаў і хвояў зацягвала хмарамі неба. Парыла. Пахла мятай і аерам. Над Глыбокім, суправоджаныя раскацістым громам, мільгалі маланкі. Тут, зусім над ім, расставіўшы ногі, у поўнай сваей пышнасьці стаяла Дуня. Прыскорана варушыліся пад мяккім шоўкам грудзі, чырваньню наліўся твар і не пачалі яшчэ стынуць цалункам разагрэтыя пунсовыя прыадчыненыя вусны. Як ніколі ў жыцьці, уважна ўглядаўся ў яе Янук, проста ўпіваў у памяць самыя нязначныя драбніцы. Прыкладна гэна пасма валосаў, што наўскасяк апусьцілася праз левае вока. Яно, - зірнеце самі, - дадае «васковай русалцы» нейкай прынаднасьці, заманьвае вас, спакушае.

Калі-б ведаў Янук якіх прыгажуняў з палотнаў сусьветных ці хаця-б і сваіх мастакоў, пэўне-ж знайшоў-бы нейкае, адпаведнае Дуні,

параўнаньне. Яна такая блізкая й зусім недасяжная. Рэальнасьць і ўява. Дурман юрлівасьці адходзіў, думкі ясьнелі. Верх брала злосьць.

- Чаго зводзіш? - шорсткім голасам спытаў хлапец.

Дзяўчына ціха ўсьміхалася. Быццам пышны матыль на цудоўнай кветцы. Насалоджвайся зрокам, але не чапай. Выцягнеш руку - пырхне й зьнікне.

- Пытаюся, чаму зводзіш?

- Янучок, я-ж цябе люблю... Ці ты ні знаў?

Самае горшае, - магчымасьць зусім ня выключаная, - што Дуня зь яго кепікі строіць. Зашчымела сэрца. Як праверыш, ці яна жартавала ці запраўды яго любіла? І ня мог далей пазіраць у васільковыя вочы. Ня было сумлеву, што моцна яе кахаў.

Устаў. Спасьцярогшы ў Януковым твары перамену, дзяўчына чакала, маўкліва пазіраючы на яго. Янук узяў Дуню за руку, перайшлі рэчку, дзе хлапец забраў сіратлівы між зелені кужэльны мяшочак з соляй. І доўга маўчалі падарозе дамоў.

12

У лянівы, сонечны васеньні дзень, адзін з тых, пра якія адвечна з натхненьнем сьпяваюць паэты, станцыя Гаці пульсавала буйным, гулкім жыцьцём. Цягнікі з ваеннымі матар'ямі й жаўнерамі сьпяшылі на ўсход, дзесьці на той пераможны, як гарлапаніла радыё, фронт пад Масквою. А ля чыгуначнага пад'езду, дзе ад бамбардаваньня цэлым і непашкоджаным захаваўся стары склад, завозна было ад сялянскіх вазоў. Там, - гэта бачыў Янук, - звозілі людзі па загаду новых гаспадароў збожжа. Падаткі... Лягчэйшыя, значыцца колькасна куды меншыя, чымся падчас панаваньня таго ўсходняга маскоўскага «вызвольніка». І збожжа, мабыць, ссыпалася ў вагоны й ехала на захад.

З будынку школы шнурам высыпалі дзеці і юнакі. Янук паволі йшоў побач свайго двуроднага брата Ўладзімера й шкадаваў, што няма побач Дуні. І мяркаваў, якой-бы гэта тэмай раскатурхаць гэтага маўклівага юнака.

- А ты-ж казаў мне некалі, што дзесяцігодку скончыў? - пачаў Бахмач.

- Ты ўсяму верыш? Я хлусіў...
- Дык колькі ты клясаў там скончыў?
- Угадай.
- Ну ты-ж запісаўся ў шосты. Дык як гэта разумець?
- Няма чаго рабіць...

Янук зірнуў на Ўладзімера й зьбянтэжыўся. Юнак жыў з маткай у тым самым доме, дзе іх некалі наведалі Бахмачы. Маці ўладзілася на працу ў кухні пры вакзале й здавалася, што будучыню мела забясьпечаную, прынамся на бліжэйшую адлегласьць.

Калі Антось Дзяркач наказаў Януку ад Падгайскага, што пачнецца ў Гацях навука, юнак параіўся з бацькам і зь ягонага дазволу пайшоў пацікавіцца «біларускай» школай.

Пагалоскі пра беларускае школьніцтва кружылі даўно. Пацьвердзілі іх першыя беларускія ластаўкі - газэты зь Менску. Стараньнямі агранома Падгайскага траплялі ў Гаці менскія й віленскія беларускія газэты. Дастава тымчасам, кульгала, пошта яшчэ не наладзілася й газэты развозілі беларускія патрыёты саматугам. А з тых газэтаў можна было сёе-тое вымяркаваць пра намеры акупанта.

- Падгайскі казаў, каб ты ў школу йшоў. Нам свае ўчоныя людзі назарэз трэба, - навучаў Янука Дзяркач, перадаючы вестку пра пачатак школьных заняткаў.
- Гэта Падгайскі казаў, што свае ўчоныя людзі трэба?
- Няўжо-ж... А ты думаеш, ня трэба?
- Ну, ну, чаму-ж не...
- Дык што, пойдзіш?
- Ні знаю. З бацькам параюся.
- Думаіш, ня пусьціць?
- Чаму-ж... Самадумам ні пайду.

Гэткія Антосевы пытаньні Янук лічыў нармальнымі пасьля збліжэньня зь ім і асабліва тэй расправы із Шпунтам у лясьнічоўцы. Забегся да Дуні, каб перадаць навіну й падахвоціць яе прадаўжаць навуку. Дзяўчыны ня было дома, ці не пабегла да Клавы, а бурклівая маці збыла яго паўсловам.

Вайна аддалялася на ўсход, а ўладу на занятых землях брала ў свае рукі цывільная адміністрацыяш. Як выбралася адтуль войска, апусьцеў на некаторы час і школьны будынак сямігодкі. Але ненадоўга. Занялі яго чыгуначнікі й працаўнікі Тодт'а.

Галоўна дзякуючы Кастусю Падгайскаму, на войта Немцы згадзіліся вызначыць руплівага й разважнага Беларуса Адама Бабра. Як адным з найважнейшых і неадкладных заданьняў, новы войт зацікавіўся асьветай. Зьвязаўся зь мясцовым беларускім актывам, нямецкімі ўладамі, а пасьля і зь беларускай управай раёну, дзе школьным інспэктарам назначаны быў стары й здольны настаўнік Барыс Воран, які неўзабаве падтрымаў Бабра й памог адкрыць у Гацях сямігодку. Праўда, галоўнай прычынай адвалокі былі нямецкія чыгуначнікі, што яшчэ ў школьным будынку гаспадарылі. Хутка й спраўна вырасьлі пры чыгунцы баракі й неўзабаве туды перабраліся Немцы. Нарэшце будынак школьны ў беларускіх руках апынуўся. Ды ён патрабаваў немалога рамонту. Каго просьбамі, а каго навет і пагрозамі, войт Бабёр мабілізаваў даволі мясцовых людзей і неўзабаве клясныя пакоі засьвяцілі сьвежай вапнай, а школа зазьзяла чысьцінёй.

Не хапала належных падручнікаў, паперы, алавікоў, чарніла. На скорую руку не падбярэш кваліфікаваных беларускіх настаўнікаў з тых, што былі ўзгадаваныя акупантамі й асталіся на месцы. Як на дзіва, астаўся калішні дырэктар Якаўлеў, які меў і адпаведныя кваліфікацыі й надзвычайна ведаў беларускую мову. Быў беспартыйным пры бальшавікох і спадзяваўся, што Немцы, якія тымчасам сур'ёзна не зацікавіліся яго мінулым, апрабуюць яго на дырэктарскую пазыцыю. Тымчасам Беларусы пакінулі яго дырэктарам.

«Свае ўчоныя людзі трэба».

Словы гэтыя глыбака ў Януковай памяці заселі. Так. Сумлеву быць не магло. Без сваіх вучоных нічога не здабудзецца, не наладзіцца, адно чужнік будзе верхом на табе ехаць...

Нейкае дзіўнае адчуваньне. Навокал гучэлі галасы, якія даўно пачуць хацелася й прыйшлі зьмены, пра якія некалі марылася... «Беларусы, вас чакае зямля!»... «Уцякла жыда-бальшавіцкая хэўра й больш ня вернецца»... Ці-ж тут дзе хвальшывая нотка? Як гэта чуецца чалавек чадам ці іншай трасцай адурманены, якому паволі, паступова, тымчасам хаатычна праясьняецца ў галаве?

Гісторыя Беларусі... Такі прадмет у галаве ня месьціўся. Гэта ня тое, што, прыкладна, гісторыя Польшчы ці Расеі. То былі вялікія і, як іх польскія й расейскія цівуны выхвалялі, моцныя гаспадарствы. Але госторыя Беларусі? Калі яна, тая Беларусь, была? Курам, відавочна,

такі прадмет на сьмех, выдумка нейкая нікчэмная... Ну вядома, народжа жыў-быў, а значыцца...

Так разважаючы, Янук сябе ў тупік загнаў. Ці-ж не апавядаў некалі стары дзед Якуб пра вялікае паўстаньне Кастуся Каліоўскага, ці-ж ня сам ён, Янук, некалі магілу паўстанцаў у Гаравацкай пушчы адкрыў? А калі народ жыў і за свае правы змагаўся, дык ці ня меў ён дзяржавы сваей? Янук прыгадаў, як некаторыя вучні, пачуўшы пра прадмет гісторыі Беларусі, спантанічна разрагаталіся. Былі гэта ня нейкія там мясцовыя «пшэкі» ці панкі, што адважыліся парог школы пераступіць, хоць напалоханымі зайцамі трымаліся. Рагаталі свае, дзеці пакрыўджанага народу сялянскага.

Нясумяшчальнасьць двух паняцьцёў - Беларусь і гісторыя яе, як прадмет школьнае праграмы. Пра такое ня толькі ня думалася, але й існаваньне такога школьнага прадмету не падазравалася. Чужнікі быццам таўкачы ў ступе, заўсёды адно таўклі: вы - пагной для тых, што над вамі пануюць, вы - хамы да нічога няздатныя, адно цяглавая сіла. Так з аднаго боку. А зь іншага цябе заўсёды вызвалялі, каб ты, - калгасная нікчэмнасьць, або падаткамі й «культналогамі» аднаасобнік прыгнечаны, - гадаваў, вырошчываў і цягнуў... Мяса - дзяржаве, малако - дзяржаве, яйкі - дзяржаве. Сабе - фіга! На поліўцы праз «шчасьлівае жыцьцё» лындай. Палітручая заедзь на «міцінгах» бясконцымі гутаркамі марыла, падганяла, заўсёды тое «вызваленьне», каб яно спарахнела, прыгадвала.

А гэтта во «вас чакае зямля», школы свае ў беларускай мове. Сяляне аднагалосна прывіталі вестку пра ліквідацыю калгасаў. Ды тымчасам гэта адно пачаткі, а далей відаць будзе. Няўжо-ж і тут за прынадай бізун? А мо й горш? Сяляне ўздыхнулі з палёгкай, падаткі куды меншыя...

Усё-ж, хто мог падазраваць, што існуе гісторыя Беларусі?

Сьмех...

Нясумяшчальнасьць!

Гісторыя і Беларусь!

Згадваліся першыя мамэнты асьведамленьня. Як яны казыталі, лашчылі, паднечвалі сэрца! Гэта ўжо на наступных лекцыях прыйшло. А пачатная лекцыя - быццам цябе абухом па галаве!

Апынуўся Янук у тым самым пакоі, дзе некалі падобны на сьвятара бальшавік паходжаньне чалавека «от обезьяны» тлумачыў. За

вакном добра знаёмая двухшляховая чыгунка, па якой некалі «доблісная» ваеннае знарадзьдзе бесьперапынна на захад перакідвала. Цяпер цягнік ізь іншым ваенным знарадзьдзем, куды магутнейшым, сьпяшылі недзе пад Маскву. Воддаль, на машце, перад будынкам нямецкае паліцыі вецер то выпростваў, то скручваў сьцяг із павуком-свастыкай. А на франтавой сьцяне кляснага пакою, над пагоняй, з рамак партрэту глядзеў чалавек з чорнымі вусікамі пад носам, у шапцы з даўгім, нізка на лоб насунутым казырком і ў такім-жа рудым мундзіры, як насілі некаторыя нямецкія ўраднікі. Адно пазьней даведаўся Бахмач, што ня ўсе Немцы, а адно сябры Нацыянал Сацыялістычнай Нямецкай Рабочай Партыі такія мундзіры насіць мелі права.

Дзьверы адчыніліся. Энэргічным крокам у клясу ўвайшоў лысы, як калена, пуцаты ў твары, сярэдняга росту, у акулярах чалавек, апрануты ў даматканую сьвітку, сінія порткі, напушчаныя на рудыя боты. Чалавек затрымаўся, зірнуў на вучняў паўз верх рамы акуляраў, падняў уверх правую руку й голасным, цьвёрдым, амаль энтузіястычным голасам скажаў:

- Жыве Беларусь!

У агульнай маўкліні пачулася хіхіканьне. Зь няўцямнасьцю зірнуў на Янука двуродны брат Уладзімер. Чалавек у даматканай сьвітцы падыйшоў да стала й, пільна ўглядаючыся ў вучняў, сказаў:

- Сядайце. Жыве Беларусь! Кажны дзень вы будзеце чуць такое прывітаньне, заміж «добры дзень» ад настаўнікаў сваіх. Ваш адказ - жыве! Я кажу: жыве Беларусь, а вы адказываеце - жыве! Зразумела?

Выразны, павольны, цьвёрды, зраўнаважаны голас. Паважны, зь ледзь заўважнай лагоднасьцю, твар.

- Прашу ўстаць!

Заскрыпелі лаўкі.

- Жыве Беларусь! - голасна і ўрачыста, выцягнуўшы наперад, на ўзровень ілба, даланёй уніз, правую руку, сказаў чалавек у даматканайа сьвітцы. Пару вялых галасоў адказала - жыве!

- Ня чую!

- Жыве!

- Яшчэ мацней!

- Жыве!

- Сядайце!

Чалавек роўнамерным вайсковым крокам падыйшоў да вакна й спыніўся. Кляса сідзела, быццам спараліжаваная, а ён доўга пазіраў праз вакно. Па чыгунцы звольненым тэмпам каціўся даўгі ланцуг плярформаў з панакрыванымі брызентам танкамі, гарматамі, грузавымі аўтамашынамі. Чалавек адыйшоў ад вакна, пачаў спацыраваць перад фронтам лавак.

- Тут на пярэдняй сьцяне, - кіўнуў галавой у бок сьцяны, - наш нацыянальны гэрб пагоня павінен павінен вісець побач Гітлера, а ня ніжэй яго. Няхай старшыня клясы падбае пра гэта.

Настаўнік памаўчаў.

- Называюся Антон Сабалеўскі й буду выкладаць у вас гісторыю Беларусі.

Настаўнік уважна разглядаў твары вучняў, быццам запярэчаньня чакаў.

- Вы, калі будзеце да мяне зьвяртацца, то называйце мяне «спадар настаўнік». Слова спадар адпавядае польскаму пан ці расейскаму гаспадзін. Зразумела?

Усё гэта было надзвычайна новае. Вучні пільна слухалі.

- Ведаю, ведаю, - прадаўжаў Сабалеўскі, - што ў некаторых галовах вашых проста не зьмяшчаюцца побач сябе гэтыя два словы - гісторыя Беларусі. Ад няпамятных часоў чужнікі казалі нам, што мы не народ, што ніколі й нічога ня мелі, што мусім толькі на іх працаваць. І зусем зразумела: калі мы не народ, дык якая-ж тады ў нас гісторыя... Але паслухайце, што сказаў вялікі наш паэт Алесь Гарун:

А даўней Беларус непадданы
Гаспадарыў, быў сам над сабою,
І далёка у сьвеце быў знаны
За Літоўскай і Ляскай зямлёю.

Так яно й было. Беларусы самі на сваіх землях гаспадарылі. Спачатку мелі вялікае Полацкае Княства, ды іншыя, а потым ужо й сваю магутную дзяржаву - Вялікае Княства Літоўскае. Чужынцы, бязумоўна, ня толькі што скрывалі ад нас нашае слаўнае мінулае, але калі гаварылі пра нас наагул дык толькі дзеля таго, каб нам, малаадукаваным, сваей мінуўшчыны нясьведамым, убіць у галаву, што яны нам заўсёды дабро прыносілі, што яны намі старанна апякаваліся,

адзін ад другога вызвалялі ды пра нашае дабро дбалі. Так, вызвалялі, апеквaліся...

У голасе Сабалеўскага пачуўся выразны сарказм.

- І вось, дарагія мае, - пачаў, роўнамерным крокам ходзячы перад лаўкамі Сабалеўскі, - нам абавязкова трэба пазнаць, хто-ж мы ёсьць. Ці мы запраўды «хамы» й парабкі, ніжэйшыя істоты, гной для росту чужынцаў, рабы паслухмяныя без нацыянальнае прошласьці, свайго собскага «я», ці, наадварот, - мы - стары ў гісторыі, слаўны народ, зь вялікай і пакутлівай, цяжка пройдзенай дарогай, са старой і багатай культурай, слаўнымі традыцыямі, але часова чужой брутальнай сілай на калені пастаўленыя, але не заламаліся яшчэ таму, бо ня гледячы на ўсялякае ліха, годнымі й непакорнымі ў сваіх душах і сэрцах засталіся. Так...

Вандруючы перад лаўкамі, Сабалеўскі схіліў чало й перазь верх акуляраў уважна зрокам абвёў клясу. Хіхіканьне даўно прапала. На яго пазіралі сур'ёзныя, зацікаўленыя, задуманыя юначыя твары.

- Нам трэба пазнаць, хто мы такія, бо, - як сказаў ні раз і ні адзін філёзаф, - каб ведаць куды йсьці маеш, даведайся спачатку адкуль ты і як прыйшоў. І таму, дарагія мае, мы й даведаемся адкуль прыйшоў наш народ. Супольна павандруем у далёкую мінуўшчыну і адтуль, ад карэньня, праверым зь якое глебы расьце нашае нацыянальнае дрэва. А падарозе, вандруючы, правяраючы, распытваючы, параўноўваць будзем праўдзівыя гістарычныя факты із тымі, што ўбівалі нам у галаву чужынцы. Толькі тады, шляхам праверкі й параўнаньня, мы нашу родную, дарагую нам, праўду знойдзем.

- Такім чынам перш за ўсё даведаемся, што з асноўных трох плямёнаў, - Крывічоў, Дрыгавічоў і Радзімічаў, злажыўся на працягу стагодзьдзяў наш народ і што першым нашым магутным гаспадарствам было Полацкае Княства, з калыскай нашай дзяржавы ў недалёкім ад нас і слаўным горадзе Полацку. Пазнаем мы падарозе князёў полацкіх ды вялікую жанчыну, слаўную палачанку, асьветніцу й патронку Беларусі, сьвятую Афрасіньню Полацкую.

- Мы заглянем у Наваградак, стары й ведамы горад у цэнтры нашае зямлі й першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага. У ходзе навукі пра Вялікае Княства Літоўскае мы пазнаем, - што Ліцьвіны ці Літоўцы гэта і ёсьць мы, пазьней чужнікамі Беларусамі празваныя, а ня тыя каторыя сяньня сябе Літоўцамі, а краіну сваю Літвой

называюць. Яны былі й ёсьць Жмудзіны, Жамойцы, а паіхнаму - Жэмайцісы. Такімі былі яны ад веку, а назоў наш гістарычны - Літва, прысабечылі сабе зусім нядаўна, а гэта пасьля таго, як народ наш страціў сваю незалежную дзяржаву ў 1919-ым годзе.

- Павандруем мы пасьля ў сталічнае, старое беларускае места Вільню, заглянем на княскі двор, пачуем на двары Вялікага Князя й іншых літоўскіх магнатаў беларускую мову. Зацікавімся мы польскімі панамі й ксяндзамі ды іхнымі дзяржаўнымі мужамі, якія выдалі сваю Ядвігу за нашага Ягайлу й пасадзілі яго на свой пасад у Кракаве толькі таму, каб пасьля выцягнуць сваю сквапную руку ня толькі па нашыя землі й багацьці, але - што найважнейшае, - па нашы сэрцы й душы.

- Падарозе пачуем вялікі розгалас бітвы пад Грунвальдам, дзе Крыжацкі Ордэн выступіў сваімі мячамі супраць вояў супольнае арміі Літвы й Кароны. Наўсуперак цьверджаньня гісторыкаў Польшчы, што для сваіх мэтаў схвальшавалі факты, мы ўбачым, што галоўным камандзерам арміяў з нашага боку быў не кароль Ягайла, што із сваім дваром сядзеў ззаду. Бітвай кіраваў наш вялікі й слаўны князь Вітаўт. І ў крытычную хвіліну, калі трэба было ня толькі маланкава думаць і стратэгічна ці тактычна плянаваць, але й вояў адпаведных мець, тады Вітаўт кінуў у бой Беларусаў Смаленшчыны. Гэтак наш Вялікі Князь і нашы з крыві й косьці браты са Смаленшчыны перамаглі Крыжаносцаў, выратавалі Літву й Карону ды на стагодзьдзі затрымалі нямецкую пагрозу. Гэтага, са зразумелых прычынаў, не казалі нам польскія гісторыкі. Факты яны схвальшавалі, а славу, што нам належылася, сабе забралі.

- Заглянем мы з вамі і ў Прагу, цяперашнюю сталіцу Чэхаславаччыны, дзе наш слаўны доктар Франьцішак Скарына, сын Лукаша «са слаўнага места Полацку» ўжо ў 1517 годзе выдаў і сам надрукаваў першую кнігу бібліі старой беларускай мовай. Скарына, такім чынам на цэлага паўстагодзьдзя апярэдзіў у друку сваей мовы іншых усходніх Славянаў, перадусім Маскалёў. Ён-жа ўжо ў 1525 годзе залажыў першую друкарню на роднай зямлі ў Вільні. А хіба-ж ня трэба вам гаварыць, што ў той час друкаваная кніга азначала вялікі крок поступу асьветы для народу. Далей даведаемся, падарожнічаючы ў мінулым, што наша бацькаўшчына, вялікая тады й магутная Літва, мела свае, пісаныя ў роднай мове правы, і ўжо ў 1529 годзе быў прыняты для ўжытку зборнік гэных правоў. Называўся ён Статутам

Вялікага Княства Літоўскага і быў адным зь першых кодэксаў правоў у тагачаснай Эўропе.

- Гэну пару, асабліва шаснаццатае стагодзьдзе, называюць некаторыя залатым векам беларускай культуры. З пашырэньнем друку, - а неўзабаве, пасьля Скарынавай у Вільні, паўстала ў Беларусі яшчэ некалькі друкарняў, - друкаваная кніга сталася даступнай многім людзям, што раней аб пісанай кнізе й марыць не маглі. Пашыралася асьвета, разьвівалася культура. У Беларусь пачалі пранікаць рэфармацыйныя ідэі з Захаду. Яны йшлі праз Польшчу. Самай Польшчы, зразумела, залежала, каб апанаваць нашу бацькаўшчыну. Рабілася гэта галоўна праз рэлігію й асьвету, больш канкрэтна праз каталіцкі ордэн Езуітаў. Пра гэта мы будзем разважаць даволі падробна.

- Заглянем мы ў 1569 годзе ў Люблін, прыслухаемся да нарадаў літоўскіх, значыцца нашых і польскіх магнатаў і шляхты. Прасочым якімі махінацыямі, наўсуперак жаданьням нашых прадстаўнікоў, Палякі ўбілі першы цьвік у дамавіну нашага нацыянальнага, незалежнага ад Польшчы, жыцьця, стварылі акт, званы Люблінскай вуніяй, значыцца фактычна на векі вечныя прылучылі нашую бацькаўшчыну да Кароны. Трэба вам ведаць, што перад Люблінскай было некалі падобных умоваў-вуніяў на працягу папярэдняга стагодзьдзя. Мэта Палякаў - цалком праглынуць і спаланізаваць нашу бацькаўшчыну. Нашыя кіруючыя магнаты такой вуніі не жадалі. Аж па шматлікіх спробах у Любліне Палякі нарэшце асягнулі сваё. Прасочым далей, што рабіла польская палітычная вярхушка, пабачым там гніль і парахно, спасьцеражэм ненасытную прагавітасьць і поўны маральны расклад пануючага там элемэнту. Убачым тыя катастрофы, што гэткія гаспадары сьцягнулі на сябе й нашу краіну, доўгія войны з Маскоўшчынай, зьнішчальную швэдзкую навалу ды руіну вялікага, багатага й магутнага гаспадарства.

- У гэны час, з багаславенства й пры помачы Ватыкану, польскія Езуіты, быццам краты, тачылі беларускую душу. Са сваіх касьцёлаў, манастыроў і школаў пачалі яны запраўдную афэнзыву. Першая іх мэта - апанаваньне вялікіх беларускіх магнацкіх родаў. Пад такім заядлым напорам нашыя магнаты прыймалі чужую, значыцца каталіцкую веру, пакідалі свой народ. Яны сталіся тымі, пра якіх пазьней ведамы

кашталян Мялешка сказаў, што «костка наша, але чужым мясам абрасла й ваняе».

- Мы далей пабачым, як безгаловая польская палітыка прынесла для нашай бацькаўшчыны катастрафальныя вынікі. У другой палове васемнаццатага стагодзьдзя Рэчпаспалітую падзялілі суседзі - Прусы, Аўстрыя й Расея. Запраўды, у гісторыі народаў гэта рэдкі выпадак, каб безгалоўе й безгаспадарлівасьць кіраўнікоў зруйнавалі ўсю сваю дзяржаву, а разам з тым і нашу бацькаўшчыну Літву ў пропасьць маскоўскае няволі пацягнулі.

- Уважна прыгледзімся, як маскоўскія вяльможы, салдаччына і ўраднікі, з волі насамперш Кацярыны Другой, а пасьля іншых цароў як п'яўкі ўсысаліся ў мякаць беларускую, пачалі піць жывыя сокі нашага цела, рабаваць народныя й прыватныя скарбы нашыя. Моладзь гналі ў маскалі этапамі на Сібір, дома-ж сялян упраглі ў ярмо зьдзеклівага й бязвыхаднага прыгону. Пабачым, як народ наш ні раз паўставаў супраць Расеі, стараўся вярнуць зрабаванае маскалямі. Кстусь Каліноўскі, наш выдатны нацыянальны правадыр-рэвалюцыянер, падняў супраць Маскоўшчыны вялікія народныя масы ў паўстаньні 1863-га году. Залатымі літарамі ўпісаныя ў гісторыю нашу словы Каліноўскага зь ягона «лісту спад шыбеніцы»:

«Ваюй, народзе, за сваё чалавечае й народнае права, за сваю веру, за зямлю родную. Бо я табе спад шыбеніцы кажу, народзе, што тады толькі зажывеш шчасьліва, калі над табой маскаля ўжо ня будзе».

- Мэтэорам праляцеў Кастусь Каліноўскі празь беларускае, завалочанае маскоўскімі хмарамі неба, паказаў нам шлях да волі. Але паядынак быў надта няроўны, бо маскоўскія сілы празь меру вялікія. Сам гэрой меў усяго 26 год, калі павесілі яго ў 1864-ым годзе на Лукіскім пляцы ў Вільні.

Сабалеўскі гаварыў з выразнай насалодай, інтанацыйна падчырківаў словы й цэлыя сказы. Цьвёрда-мілагучны нізкі бас вызначаўся аўтарытэтнасьцю й фінальнасьцю, якую звычайныя слухачы рэдка калі адважацца аспрэчваць. Настаўнік вандраваў перад лаўкамі, часта з-над акуляраў пазіраў на вуйняў, спыняўся перад вакном і задумана стаяў па некалькі часін. Выняў зь кішэні настаку, выцер шырокі, бліскучы лоб, паправіў акуляры. Зачараваная ягоным дарам мовы, зьдзіўленая зусім іншым насьвятленьнем некаторых

гістарычных фактаў, чымся рабілі некалі акупанты, кляса застыла ў задуме.

- Спынімся над працэсамі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэньня. Пазнаёмімся з Дуніным-Марцінкевічам, што ўжо ў палове дзевятнаццатага стагодзьдзя шмат пісаў пабеларуску. Пачуем голасны кліч бацькі беларускага адраджэньня Францішка Багушэвіча: «Не пакідайце мовы роднай, беларускай, каб ня ўмерлі!». Паўсталая ў Вільні ў 1906-ым годзе беларуская газэта «Наша Ніва» клікала народ да асьветы, бараніла ягоных нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў. На яе старонках чытаем першыя творы будучых волатаў літаратуры: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча й цэлага шэрагу іншых.

- У сваім вершы Янка Купала, ведамы як беларускі народны прарок і правадыр, заклікае:

«На сход, на ўсенародны, грозны, бурны сход
Ідзі аграблены, закованы народ!»

Галадаўшаму доўгі час нельга, да ежы дабраўшыся, аб'ядацца, бо страўнік ня справіцца. Прагавітым ведаў пра сваё й роднае вучням нельга было адразу зашмат даваць. Раптоўная лявіна вестак з вуснаў таленавітага настаўніка магла быць няперадуманай, астацца няпераваранай. Яна ашаламляла сваей праўдзівасьцю, эмацыянальна ўзбуджала кволыя маладыя сэрцы.

Сабалеўскі затрымаўся пасярод клясы, доўга і ўпорна глядзеў на зьзяючыя вочы й твары.

- Ведаю, дарагія мае. Тое, пра што я тут сягоньня так павярхоўна гаварыў, ёсьць для бальшыні з вас неспадзеўкай. Дзіва няма, калі некаторыя з вас проста ашаломленыя.

Перад вучнямі цяпер стаяў ласкавы, дбайлівы бацька. Ён усьміхаўся, быццам па галоўках іх гладзіў.

- Гэта зусім натуральна. Некалькі хвілін таму назад, - настаўнік выцягнуў зь кішэні сярэбраны гадзіньнік «цыбуліну», адкрыў яго, уважна паглядзеў на стрэлкі, некаторыя з вас рагаталі з таго, што ёсьць гісторыя Беларусі, гісторыя не як прадмет, так сказаць, а запраўдная. Я наўмысна ўзяў вас за руку й паказаў некаторыя мамэнты з машай слаўнай тысячагадовай прошласьці. Самі бачыце, што ніва гэта прасторная й па ёй мы пастараемся прайсьціся як дбайлівы й руплівы

гаспадар. Але вы ўжо, здаецца, уявілі, што Беларусь была вялікая, змагарная і слаўная. Змагарная, непакорная й нязломная яна й асталася.

- Да прадмету гісторыі раю вам адносіцца з найбольшай сур'ёзнасьцю. Вывучаючы факты ў іх праўдзівым, нашым, беларускім асьвятленьні, паволі адчыняцца вашыя вочы. Ня толькі пазнаеце адкуль мы прыйшлі, хто мы ёсьць і куды, мусіць, ісьці,але настолькі пабагацееце духова, што стане ў вас сілаў для тэй далейшай і нялёгкай дарогі. Пазнаньне сваей прошласьці ўзбагачае ўсіх нас разам і кажнага паасобку. Параўнальна гаворачы, наш рост у няволі пад чужым ярмом можна ўявіць як вэгэтацыю кволае расьліны дзесь у глухой засені або змроку. Тая-ж самая расьліна, няхай і кволая, узбуйнее й наліецца сокамі, набрыняе, успышнее, умацуецца ўсімі свайміклеткамі калі толькі даць ёй даволі сонца й добры корм. У даным выпадку сонцам для нас ёсьць воля й праўдзівае асьвятленьне нашае прошласьці дый прошласьці нашых суседзяў, што нас сілаю, глумам і маною ў ярме й галечы трымалі.

- Я спадзяюся, што вы будзеце сур'ёзна адносіцца да прадмету гісрорыі яшчэ й таму, бо патрабуе гэтага цяперашні час, так сказаць гісторыя, што на нашых вачох творыцца. Я-б устрымаўся ад спасьцярогаў адносна цяперашняе сытуацыі беларускага народу, у тым ліку й кажнага з нас, калі-б ня лічыў гэта абсалютна неабходным. Бачыце ня зьбіраюся прадказаць будучыні, адно можна з пэўнасьцю ўжо цяпер сьцьвердзіць, а гэта тое, што завіруха, - даруйце, магчыма ўжываю занадта клагоднае слова, - значыцца, што завіруха будзе патрабаваць шмат ахвяраў, праліецца многа крыві, у тым ліку й нашай. Мейце на ўвазе, памятайце адно, што чужнікі, якія цяпер ёсьць на нашай зямлі, якія валодаюць зброяй, ня будуць нас пытацца, што рабіць маюць, ня будуць нас па галоўках гладзіць, а пэўне зусім наадварот...

Апошні сказ Сабалеўскі вымавіў наўмысна павольна, нізкім, сур'ёзным, здавалася, што прарочым голасам. Спыніўся й доўга прыглядаўся юнацкім тварам перазь верх акуляраў. Ці хацеў перадаць нясказанае?

- З гэтага выснаў, - зноў пачаў, ходзячы паволі, настаўнік, - што нам трэба за сваіх, значыцца адзін за аднаго пастаяць, падтрымаць адзін другога, самім сабе памагаць. Параўнайце сытуацыю да пажару

вялікае вёскі, дый не абавязкова ў ветраны дзень. Калі адна хата загарыцца, усё, што жывое, сьпяшыць тушыць яе. Тут дзеіць можа ня так звычайная людзкая даброць, як патрэба самазахаваньня. Практычна й проста справа зводзіцца да таго, што калі вяскоўцы не патушаць агня, што жарэ тую першую хату, дык ён зь ветрам ці безь яго можа перакінуцца на далейшыя гасподы ці будынкі й зглуміць усю вёску. Зразумела? Гарыць маё, а ты будзеш разінькай ці зь іншых прычынаў не паможаш тушыць, дык можа й тваё згарэць. Выбару тут няма.

- Гэтаксама і зь цяперашнім вялікім сусьветным пажарам. Ужо ясна, што гарыць наша бацькаўшчына, наша адвечнае дабро й багацтва й калі нам нічіога не рабіць, стаяць рукі апусьціўшы, дык агонь можа выкаціць вялікія полаці нашых ніваў, загубіць людзей нашых. Вось чаму трэба вам як мага шпарчэй саміх сябе пазнаць, значыцца добра гісторыю народу свайго вывучыць, а там ключ знойдзеце, як дзьверы ў свой, у новы сьвет адчыніць... Тады, каб жыць і выжыць, змагацца й перамагчы, супольна й дружна за свае інтарэсы, за волю дарагое бацькаўшчыны Беларусі станеце!

Януку здавалася, што гэтага чалавека можна было-б слухаць без канца. Прыгожая, багатая, лёгкая мова роўным патокам, без найменшых намаганьняў бурліла. Гэтак гаварыў пястун, руплівы гаспадар, што кажнае слова цаніў-узважаў і ашчадна, як грошы выдаваў. А якія важныя, заўсёды абаснаваныя, закругленыя й падсумаваныя думкі! Так мог гаварыць чалавек, што палка, усім сэрцам, бязь ніякіх засьцярогаў свой народ любіў.

Пра гэта ўсё, што зь вялікай мастацкай сілай у ягонае ўяўленьне ўляглося, думаў цяпер, па дарозе са школы, Янук. Побач крочыў маўклівы й журботны Ўладзімер.

- Ці табе падабалася лекцыя гісторыі? - спытаў Янук.

Уладзімер маўчаў.

- Чуеш, што кажу?

- Чую.

- Ну дык?

- Пусьцяк, - буркнуў двуродны брацішка.

- Гэта значыць што такое пусьцяк?

- Да нічаво...

Янук, зьдзіўлены, доўга і ўважна глядзеў на свайго нядаўна прыдбанага сваяка. Праходзілі перад будынкам, дзе ляніва ў вялым васеньнім ветрыку, на машце перад уваходам трапятаўся чырвоны сьцяг зь вялікай чорнай, на белым крузе, свастыкай пасярэдзіне. Калішняе «ортскоммандатур» на дошцы перад сіняй, аблезлай з хварбы, брамай замяніла цяпер «ортсполіцай». У гэтым будынку із тэй прыбудоўкай ззаду, дзе Адась Вадзімскі зь вялікай насалодай адбіваў Пракопу Бахмачу нутро, некалі мясьцілася польская паліцыя. Ужо ўвайшло ў звычай, што мясцовыя людзі, а ў іх ліку і Янук, калі трэба было мінуць будынак, дык на другі бок вуліцы пераходзілі. - Далей ад чарцей, каб яны галовы скруцілі! - казаў каторы селянін, адчуўшы бізун акупанта. Пра гэтых найнавейшых «чарцей», што прыйшлі на зьмену вайсковай камандзе нямецкага гарнізону, яшчэ мала вядома было. Насілі яны вопратку бледна-зялёнага колеру. «Ортсполіцай» на дошцы нешта-ж выясьніла. Нехта, - а было-ж навокал шмат розных «дойчаў», як грыбоў пасьля дажджу ў лесе, - пераглумачыў, што гэта - метсчковая паліцыя, пасьля яшчэ нехта далажыў «эсдэ». А апошнім часам нарадзіліся весткі, быццам нямецкія ўлады арганізуюць паліцыю зь мясцовых людзей.

Калі-б Янук сваім уяўленьнем ня прысутнічаў на гэнай надзвычайнай лекцыі гісторыка Сабалеўскага, пэўне-ж пастараўся-б перад паліцыйным будынкам на другі бок вуліцы перайсьці. Побач крочыў маўклівы, панурый Ўладзімер. Задуманаму юнаку, як праз туман, прадставіліся воддаль ад брамы, перад галоўнымі прачыненымі дзьвярмі будынку дзьве постаці - адна ў шэра-мышыным колеры, іншая ў чорным. І можа-б далей ня ўзяў Янук іх на ўвагу, калі-б ня згадка. Адзін міг... Перад занятым глыбокімі думкамі падарожнікам у натоўпе ці на дарозе мільгне сілуэт... Кароткі момант, дроб часіны. Але памяць, упартая і як-жа часта ненадзейная, здаецца незалежна ад цябе, стараецца на гэтым дробе-макулінцы цэласьць пабудаваць. Фігура ў чорным, каржакаватая, зь пілёткай набок на галаве, рыжымі валасамі, малой гарбінкай на носе, гаварыла нешта чалавеку ў зялёным мундзіры. Правая рука ў кішэні, а левая разложанымі пальцамі нешта падчырківала энэргічным рухам.

Янук раптам спыніўся. Людзі ў мундзірах стаялі крокаў дваццаць воддаль, бокам да хлапцоў.

- Ты чаго? - спытаў просты Ўладзімераў голас.

у гэны момант чалавек у чорным зірнуў у гэты бок. Рудыя, калючыя, няпрыязныя вочы. Янук пазнаў яго. Не, сумлеву не магло быць. Аслаблі ногі. Мурашкі ў паніцы пабеглі па целе... Сустрэча вачэй трывала часінаў пяць. Янук схапіў Уладзімера за руку.

- Хадзі, скарэй!

- Што такое?

Янук не адказаў. Імкнучыся якнайскарэй адыйсьці, Бахмач азірнуўся. Здавалася, што гэны ў чорным уважнас пазіраў за ім усьлед. Спыніліся воддаль, паза засягам вока паліцыі.

- Што стаклася? Чаго цябе, як падарвала? - зацікавіўся цяльпукаваты Ўладзімер. - Ты зьбялеў, дрыжыш...

- Знаіш... знаіш, каго я там увідзіў, таго ў чорным? - гаварыў дрыжачым голасам Янук.

- Кажы.

- Чалавека, што маю матку забіў...

Наступіла доўгае маўчаньне.

Дзесьці з захаду ад сьветафору падпаўзаў вуж вагонаў і плятформаў, наладаваных гарматамі, танкамі, горамі скрыняў з амуніцыяй. Паравоз звольніў, незадаволена чмыхнуў, прарэзьлівым тоненькім сьвістком сьцебануў васеньнюю млявасьць. Гэны сьвіст быццам крапіва-джгучка апёк Янука, што ля рухліва-бразгатлівае майстэрні да Падгайскага сьпяшыў. Буркнуўшы пад носам адчэпнага, што рупіць яму некуды, Уладзімера ззаду пакінуў. Пагутарыць, параіцца трэба. Пэўне-ж, Падгайскі можа больш пра гэтага польскага недабітка ведаць...

13

«Дзіравы шляхціц» Паўлоўскі незадаволена пазіраў на зморшчаны й заплаканы Вульлянін твар. Жанчына цёрла парэпаныя ад працы далоні, манатонным голасам пра бяду сваю барабаніла. А Паўлоўскаму ў галаве ад учарашняга яшчэ не адшумела. Чаго яе сюды ў такі час трасца прыгнала? Сядзіць і хныкае, увесь добры й пагодны настрой сапсула. Із Вульляніных слоў і нязьвязаных фразаў ясна было, што ў Гацях на паліцыі сталася.

- ... дык ён, каб яго пранцы, каб яны яму бокам вылезьлі, і мае яйкі забраў. Жарцікі, колька часу гэта іх ад нясушак зьбірала, сабе ані ў рот, знаіш як нялёгка... Дык гэта брыда й той дзісятак яек забраў і нічога мне пра маіх сыноў-галубкоў ні сказаў.

- Які гэта брыда? - пытаўся Паўлоўскі, а думкі яго ўчэпіста на ўчарашняй «гавэньдзе» трымаліся. «Усё-ж маладзец гэты Бжончэк-Бронхэр... фальксдойч. Хто-б гэта й падумаць мог!»

Паўлоўскі падыйшоў да вакна. Дождж дробнымі кроплямі сьцёбаў па шыбіне. У мухалоўцы на стале мокрая муха намагалася вылезьці на сухі бераг, яшчэ бзыкала крыльлямі, падала. Вульляна сядзела на лаве ля стала. За перагародкай, у кухні жонка ля катлоў бэрсалася, выходзіла ў сенцы, ці ні паранку для падсьвінкаў таўкла. Разьбягаліся Паўлоўскага думкі. Яшчэ ня зусім з новай уладай і сваім удзелам у ёй асвоіўся.

- Ды гэты-ж, каб яму тыя мае яйкі ў трыбуху камнем заселі, Неміц, начальнік іхны!

- А ты, цётка, зь ім гаварыла?

- Ды як там гаварыць будзіш, - махнула зьняможаная жанчына рукой. - Ён-жа пасвоему гяргечыць, дык дзе там мне... Ды тамака ў іх нейкая польская паненка, нейкая пірда вымазаная сядзіць, папольску да мяне пшэкала. Я гэта ёй пра сваіх сыноў-галубкоў так і гэтак, што ў палон папалі, што можа-б гэты начальнік мне як іх вярнуць памог, ну знаіш... Тая пані пірда яму, мусіць, так і нагіргітала. А я ў руках кошычак зь яйкамі дзяржу, ну гэты самы найпякнейшы, каторы мне старэйшы сыночак Васіль некалі сплёў. Яйкі накрытыя вышываным ручніком былі. Той начальнік слухаіць тэй пірды, ды сабе пад носам вурчыць - я, я, яволь, і на мяне паглядаіць. А тады да мяне падыходзіць, кошак бярэць і на стол ставіць. Адкрыў ручнік, гляджу - на твары прагавітасьць, вачмі яйкі зьеў-бы. Тады нешта нагіргятаў тэй пірдзе, а яна кажыць мне, што Неміц яйкі забярэць, пра маіх сыноў даведаецца. Прыйдзі, кажыць, яшчо яек прынясі. От як! Я гэттака-ж прасіць хацела, каб мяне, бедную, ня крыўдзіў, што я і спрацаваная, і адзінокая, а той як скочыць як крыкніць. Дык гляджу, адкуль ні вазьміся ён, - от, далібог не паверыш браток, Пётра, - гэны-ж самы чорт лясьнік, што ўсе яго падлам называлі, што некалі цяжарную Бахмачыху Алену ў лесе панскім за маліны застрэліў. У чорным ён

быў, у паліцыйным надзеты. Дый той таксама гяргеча. Мяне за руку, дый выкінуў, падла... Ну от... І адкуль гэты самы чорт там узяўся?

Вульляна пачала ў нос хліпаць. Паўлоўскі стаяў і церабіў раськіданую чупрыну. На твары нецярплівасьць і злосьць. Жаночага плачу ніяк цярпець ня мог. Няхай-бы гэтыя бабы лепш крычалі ці лаяліся, але ня сьлінілі.

- А чаго-ж ты, цётка, туды паплялася? Чаму ты да сваіх спачатку ні пайшла? Як гэта ты бізь языка і зь яйкамі адразу да Немца?

- А як бізь языка? А тая пірда, паненка нейкая напудраная і напэцканая, што пры іх сядзіць і піраводзіць?

- Ну так... Яна то там ёсьціка, і піраводзіць. Ну але гэтага мала. Цябе яна знаіць? Тут піраводу мала, тут трэба, каб табе памагчы хацелі.

«Як яна замінае», - думаў Паўлоўскі. - «Неяк ведзьмы пазбыцца трэба. Чаго яе чорт якраз цяпер прынёс?»

- Ну дык во памажы, да цябе-ж прыйшла. Ты-ж зноў во начальнік нейкі. Цябе можа скарэй паслухаюць.

- Знаеш што, цётка, - пацерабіў галаву Паўлоўскі, - я табе пастараюся памагчы. Папрашу Бабра, войта значыцца, каб у Немцаў разьведаў, як табе даведацца пра сыноў. Дый чаму толькі табе? У вёсцы-ж ёсьць многа хат, зь якіх дзяцюкоў на вайну ўзялі. Дык усім варта памагчы. Значыцца, можа скажуць як сьпісацца зь імі, дзе яны ёсьць можа ў лягерах палонных, ці што... Так, так, напэўна гэтак зраблю, пагавару з войтам. Так і будзіць.

Гэтак гаворачы, Паўлоўскі прайшоўся па пакоі, зноў стаў пры вакне. Праз імглістае надвор'е ледзь шарэлі чубы сёстраў-соснаў на могільніку. Добра прыдумаў. Цяпер Вульляна, пэўне-ж, зараз падзякуе й пойдзе. А тады ён з думкамі зьбярэцца, пра ўчарашняе памяркуе. А было пра што. Божа, ты мой, як усё дагары нагамі перавярнулася! Але цётка, відаць, дахаты ня зьбіралася.

- А калі-ж ты пагаворыш, Пятрусь?

- Ну на днях, калі выпадаць будзіць.

- Як на днях? Заўтра ці пасьлязаўтра?

- Алі-ж ты, цётка, такая... ні адчапіцца ад цябе. Ну кажу, што на днях. Тады тоя й будзіць...

- Ну а калі пагаворыш, то як я знаць буду? Ці да мяне зайдзішся ці што?

- Ды ўжо ня бойся, забягуся, раскажу.

- Ну дзякую, Пятрусёк, дзякую-ж надта. Дый пайду-ж я ўжо, бо, мусіць, надакучыла табе. Знаю, што ты бязь дзела ні сядзіш. Дык так і зрабі, з войтам пагавары. Як гэты чалавек, Бабёр? Добры, ці благі?

- Наш чалавек. Добры. Паможыць ён, далезіць куды трэба. Ні бядуй, цётачка, ён даведаецца што трэба.

- Ага, ну дык гэта надта добра, - адыходзячы, ужо да дзьвярэй адабрыла Вульляна. - Але-ж ні забудзься, Пятрусёк, скажы маіх сыноў галубкоў імёны й фамілії, каб ведалі. Добра?

- Скажу, чаму-ж-бы ні сказаць...

- Дзе-ж яны, бедненькія, каб іх Бог сьцярог, каб гэта ўжо як скарэй пра іх якую вестачку дастаць. Божа мой, Божа! Ну дык я ўжо й пайду. Дай табе Божа здароўя, Пятрусёк.

Нарэшце. Паўлоўскі ўздыхнуў, калі працягла скрыпнуўшы, зачыніліся за Вульлянай дзьверы. Зірнуў напокуць. Там на іконе «найсьвентша Марыя Панна» красавалася, тая самая, што некалі «непоколянэ почэньце» мела. Чаму цяпер яму гэнае «непоколяно почэньце» згадалася?

Даўно яно, яшчэ ззамоладу было. Ня ведаючы польскае мовы, Паўлоўскі таго «непокалянага», пра якое тоўк на лекцыі рэлігіі мурлаты ксёндз, уцяміць ня мог. Прызнавацца стыдна было. Можа ў ксяндза спытацца? Лепей не, не асьмеліўся. Але спытаўся ў Палякаў падлёткаў. А тыя «недавяркі» такім зусім простым і грэшным словам вытлумачылі. І разрагаталіся. А Пятрусю быццам хто варам у твар.

Але чаму цяпер яму «непокалянэ» ў галаву прыйшло? Вунь пра ўладу трэба думаць. І прыгадаўшы ўчарашні сход, Паўлоўскі зьедліва ўсьміхнуўся. Цяпер-жа ён гэтым вясковым хамутам, небаракам, пакажа. Праўда, у солтысы зноў трапіў прыпадкова, можна сказаць. Або таму, што нейкія плечы меў. Гэнымі плячмі розныя бальшавікамі непавывожаныя панкі былі. І сталася гэна зусім простыа, аж паверыць цяжка было. Параілі яму да войта Бабра зьявіцца, бо быццам нейкая новая ўлада на ногі становіцца. Пайшоў. Бабра здалёк знаў. А той, чалавек даверлівы, шмат клопатаў маючы, папрыяцельску пагутарыў і солтысам яго назначыў. - Ідзі й рабі, а там разгледзімся, - сказаў.

Прыйдзе, ці ня прыйдзе тое «разгледзімся» - іншая справа. У вёсцы-ж даведаліся, што войт Паўлоўскага солтысам назначыў дый ніхто ня пярэчыў. Праўда, некаторыя крывіліся, прыгадаўшы яго

некалі ў асобе польскага ўрадніка. Але сяляне народ сьціплы. Мотто жыцьця: не чапай мяне, то й я цябе не зачаплю.

На сходзе гэным... Але ці яго сходам льга назваць? Нейкая кансьпірацыйная сустрэча. Зь Вільні зьявіўся нехта Гжмот, мужчына з вайсковай вытрымкай. Прадставілі яго як упаўнамочанага на «гэтыя тэрэны» з самюсенькага верху, значыцца ці ні аж ад лёнданскага ўраду Рэчыпаспалітай... А якія «гэтыя тэрэны» былі? Ніхто ня зьбіраўся тлумачыць. Само разумелася, што пэўная часьць «крэсаў»... Зусім ясна, што Гаці й ваколіца. Як-ніяк, станцыя важная. Адным словам, цікавая гутарка была. Колькі ўжо разоў перадумваў яе Паўлоўскі.

Дый найважнейшае, - ах як міленька ад такой думкі на сэрцы было, - што на ягоную, значыцца Паўлоўскага, асобу й вартасьць ацанілі, туды, на акраіну мястэчка ў хату аднаго быўшага ўрадніка запрасілі. Няцяжка было здагадацца, хто адудзячыўся. Хоць самога фольксдойча Бронхэра й ня было, але-ж нейкалі шмат гарэліцы зь лясьніком прыйшлося зглуміць. Сябры, значыцца. Той дзесь у «гініральнай губэрніі» (чэрці! як яны Польшчу перахрысьцілі!) два гады аціраўся. З быўшага польскага лясьніка ў Гаравацкай пушчы на каманданта мясцовае паліцыі ў Гацях узьлез. Маладзец!

А ці-ж ён адзін? І тая самая «пірда», як Вульляна казала, гэта-ж тая самая Марыська Закшэўская, цаца-патрыётка польская. З тых самых Закшэўскіх, што некалі на галоўнай вуліцы, насупраць электрастанцыі мясную краму мелі, «файныя й пекныя» кракаўскія каўбасы рабілі. Эгэ, хлёсткія каўбаскі былі! Эх, часы, част! Дзе вы падзеліся? Марыська Закшэўская пры самым нямецкім каманданце паліцыі прымасьцілася. Хто яе ведае як, свае пэўне-ж падсунулі... Ды сьціпласьці ў яе з макулінку, а да дзяцюкоў надта падкая... Немцу, ведама-ж, што трэба. Марыська-какетка, ей адно давай і давай! Сам на яе ахвоту меў. Пародзістая кабыла. Эх, як прыцісьнеш, дык аж кроў гарыць-варыцца. Але ці гэта важна цяпер? Гэта-ж там, пры самым вяршку ўлады мясцовай ёсьць свае вочы й вушы, апарат да дзеяньня гатовы! Во як!

Паўлоўскі зморшчыўся, пацягнуўшы носам. У хаце пахла кіслай бульбай і паранымі буракамі. Жонка далей бэрсалася дзесьці із свайміі катламі, цэбрамі ці даёнкамі. Непаседа працавітая. Зь яго-ж, начальніка, ганарылася. І вось цяпер, пад малы руды вусік

усьміхаючыся, шпацыраваў Паўлоўскі, на Марыю Панну, шо «непокаляная» пачала, глядзеў і соладка далей згадкі рабіў, думаў.

Падумаць, падумаць толькі! Бальшавіцкая басота ледзь яго не загарнула. Сібірррр-брррр! Жах! Там капцы яму й жонцы былі-б, як піць даць. Бальшавікі на злом галавы, - каб яны яе скруцілі! - уцякалі, дык навет і вывазныя сьпіскі пакінулі. А там і ён, Паўлоўскі, на вываз фігураваў. Спазьніліся-б Немцы на тыдзень ці два й крышка яму была-б. Мусіць ёсьць на сьвеце Бог, - думаў далей «недавярак» Паўлоўскі. Калі-б не, дык хто за яго, такога залатога й сумленнага чалавека, заступіўся? Хіба-ж Марыя Панна?

Солтыс уважней на «непокаляную» зірнуў, рука мэханічна знак крыжа перад тварам і жыватом зрабіла. Здавалася, што ажыло сухое й падоўжанае аблічча на іконе. - Непокаляна, найсьвентша Матыя Панна, - прамовіў новасьпечаны солтыс, - дзякую Табе! Алі-ж, чорт, золь якая! - адразу вылаяўся Паўлоўскі.

«Самыя найважнейшыя навіны пра генэрала Сікорскага. Із Сталіным перагаворы вядзець. Гэты абібок, калі-б яму Гітлер у бакаціну не заехаў, гаварыў-бы ён з Палякамі, га? А от цяперака, кажуць, Сікорскага прыняў, армію польскую ў Саветах рабіць будзіць. Бальшавіком Немцаў біць Палякі будуць памагаць. Генэрал Сікорскі маладзец!»

Думка кульганула ў солтысавай галаве, у бок пашкандыбала.

«Як гэта мы ім, нашым ворагам на помач? Гарлапанам, забойцам, басякам гэтым? Але-ж яны, гэтыя нашыя ворагі й мучыцелі, яны-ж хаўрусьнікі нашых хаўрусьнікаў. Тады яны, мусіць, нашыя прыяцелі. Так яно выходзіць. Чэрці, гэта курам на сьмех! Ды тамака-ж нашы зьверху, пэўне, знаюць, ім куды відней. На тое-ж яны маюць вучоныя й разумныя галовы. Дзе ўжо мне, задрыпанаму Пятрусю, што на гэтых сьмярдзючых «крэсах» вырас, у вялікай палітыцы разьбірацца?»

І запраўды, цеснаватая на ўяўленьне солтысава галава далей у вялікую палітыку не сягнула. Мясцовай па вушы хапала. Сама найважнейшае - сьлядзіць за ўсімі хамамі. Сказана зусім нядвузначна: дзе каторы хамуйла наверх да ўлады будзе лезьці - цап яго й па галаве!

«Але-ж і тут нясумяшчальнасьць нейкая. У раёне й гміне Немцы Беларусам пасады далі, уладу значыцца. Навіт усё зь языкім іхным, школы таксама. А яны, Палякі, гэта ліквідаваць маюць. Нямецкімі

рукамі. Здорава! Учора саўсім ясна й нядвузначна сказана было. Свайміі людзьмі паліцыю абставілі, значыцца лёгка будзіць».

Праўда мэханіка такой работы ня зусім ясная Паўлоўскаму была, хоць рацыянальнасьць зусім простая. Яны, а ня Немцы ці Беларусы, гаспадарамі гэтай зямлі былі. Значыцца лёнданскі ўрад Рэчпаспалітай ведаў, што рабіў: адных ворагаў рукамі іншых вынішчаў.

«Алі-ж з гэтымі ворагамі, - адклікаўся ў солтасавых думках іншы, супярэчлівы голас, - бальшавікі унь якія зьвяругі, колькі народу вынішчылі. А цяперака яны нашы прыяцелі. А гэтыя во мясцовыя хамы, ледзь ні браты родныя, дык, выглядаіць, што іх трэба нямецкімі рукамі забіваць. Чэрці, як гэта ўсё разумець?»

Паўлоўскі пачаў церабіць сваю русую чупрыну, заклапочана тупацль па абшырным пакоі. І рука, амаль мэханічна, палезла ў шупляду ў куце, выцягнула літроўку з настойкай. Дзякуй Богу за добрых людзей! Ня былоб іх, дык ня было-б чым і пахмяліцца! Зь вялікім набажэнствам солтыс узяў з паліцы кілішак, уважна прыгледзіўся кміннай зеленаватай настойцы й ашчадна, каб, барані Бог, кроплі ня страціць, напоўніў невялікую, пуцатую, круглую чарку. Затым, сквапна гледзячы на чарку, старанна ўлажыў корак у пялшку, паставіў літроўку ў шуплядку. Зірнуў яшчэ раз на «непокаляную», весела падмігнуў іконе левым вокам і адным кіўком пераліў зялёную вадкасьць у рот. Гэты ківок - тонкае, мэханічнае майстэрства, практыкаванае доўгімі гадамі. Малышы, бачачы такі рух, няпэўныя, ці чалавек запраўды чарку выпіў, ці адно вуснамі прылажыўся. Звычайна на вясельлях госьці, што такім майстэрствам валодаюць, агульную пашану маюць.

Паўлоўскі ўказальным пальцам выцшер рудыя вусікі, уважна паглядзеў на пустую чарку, быццам мяркуючы, ці не наліць другую, ды паставіў яе ў шупляду й борзда пачаў хадзіць па пакоі. Трэба было нешта рабіць, але, каб рабіць, трэба спачатку мець пляны. А ўчора зусім ясна сказалі за каго ўзяцца. Праўда, ня далі зусім дакладных інструкцыяў, як і што. Але навошта яны, указаньні тыя. Ці мала ў яго, Паўлоўскага, глузду? Не дарма-ж яму даверылі, дый практыкі хапала. - Так, так, Бабра слухайся, зь ім працуй, для вока людзкога. За ім нашы сачыць будуць і як толькі што, дык прыбяруць яго... Ты тамака сваіх вясковых і суседніх актывістаў, пакуль што... А далей, калі трэба, скажам.

Вясковых актывістаў? Пятрусь пачаў перабіраць у думках людзей і гэтта ў тупік залез. Якіх гэта актывістаў? «Пра Лявона хадзілі весткі, што ў лес зыйшоў, ці што... Канец згубіўся... Ці старыя Шпунты чаго не даказваюць? Цяперака во, нейкую ўладу маючы, трэба да іх забегчыся, распытацца. Скажуць, ні скажуць, а за язык пацягнуць можна. Паваліцкі Хвёдар як у ваду кануў. Ходзяць слухі, што з разьбіткаў Чырвонай арміі й мясцовых падонкаў нейкая партызанка арганізуецца. Чорт іх знаіць, разьбярыся тут дзе праўда, а дзе плёткі. А калі ў тым зерне праўды ёсьць, дык такія галадранцы, як Лявон Шпунт і Паваліцкі Хвёдар пэўне-ж туды пацягнуцца. І чаму іх, гадаў, у свой час ня прыхлопалі? Цяпер-жа, калі генэрал Сікорскі із Сталіным дагаворацца, дык із гэтай брыдой, далібог, трэба будзе працаваць разам. Камічная сітуацыя! Цьфу!»

Пятруся Паўлоўскага ногі больш энэргічна па пакоі заварушыліся. Часта пазіраў на «непакаляную» але думкі ягоныя былі дзесь далёка, на вярхох. «Як яны, чэрці, там хітраць, - думаў. - А тут на нізе ведай куды й як павярнуць. Але-ж... Ягонае заданьне перадусім сьлядзіць, быць вушамі й вачмі Рэчыпаспалітай, інфармацыю наверх падаваць. Ліквідаваць, у выпадку патрэбы, будуць нямецкімі рукамі... А Немцы, чэрці, доўга ні цацкаюцца. Данос ёсьць, што камуніст? Цап яго, бабах! - і чалавека няма. Ну а данос такі зьляпіць - дзіцячая забаўка. Учора адзін пан пра гэта расказваў. Ён яшчэ з польскіх часоў судовыя сьпіскі й некаторыя акты захаваў. Для нагоды, - кажа, - судовыя дакуманты прадставіць можна. За што судзілі? За камунізм. А для Немцаў камунізм гэта тое, што для гішпанскага быка чырвоная шмата. Як проста й хітра!»

Солтыс спыніўся ля замурзанага вакна. Над могільнікам расьсеялася імжака й выразьней паказаліся ў абдымках сястрыцы сосны. Чарка настойкі апэтыт нарадзіла. Учора мала піў. Між тых паноў ня зусім удома адчуваўся, хоць і рэкамэндаваў яго Бжончэк, цяпер гэр Бронхэр, з самага верху значыцца. З тымі людзьмі бліжэй зьнюхацца трэба. Тымчасам... Ага, актывістаў сачыць.

Перад солтысам паўстаў звычайна паўстрыманы, загадкавы, на язык войстры Антось Дзяркач. З гэтым дзяцюком ніколі надта блізкіх адносінаў не ўдалося наладзіць. І не ягоная-ж, Паўлоўскага, гэтта віна. Вось Дзеркача на воку трымаць трэба. Ад польскае арміі ўцёк і ад бальшавікоў ледзь не з таго сьвету вярнуўся. Хітранькая цаца. Слова

лішняга зь яго ня выцягнеш. Да Бураковай Ніны прылізаўся. Вось пра гэтага трэба пранюхаць. Пакуль Немцы якімі паперкамі заваляць, трэба многа пра каго й шмат чаго праведаць.

Ад такой канкрэтнай думкі Паўлоўскаму аж на сэрцы палягчэла. Ня схільны быў да вялікіх роздумаў. Згадалася тая абшмуляная, некалі за польскіх часоў аж па бакох працёртая «тэчка» й зухаваты, фанабэрысты капялюш. Гэныя атрыбуты калішняга мясцовага аўтарытэту дзесьці ў клеці, на дне жончынага пасажнага куфра ляжалі. Трэба паглядзець, можа чэрці мышы дабраліся, ці моль якая. Спатрэбяцца яны, ці не?

Пры гэткіх думках Паўлоўскі ўзяў зь цьвіка ўжо засаленую, як казалі «абнародаваную» савецкую кепку, каторую зацягаў пры нядаўняй уладзе, калі наўмысна апусьціўся, незаўважным стараўся быць, нізкага профілю трымаўся, на вочы людзям мясцовым рэдка паказваўся, каля гаспадаркі бэрсаўся, розныя «кулі» й «налогі» цягаў.

Націснуў кепку на лоб. Скрыпнулі дзьверы. На дварэ праз васеньнюю імжаку намагалася выглянуць сонца. Весялей, здавалася, дзерлі глоткі на чубе Архіпа празяблыя вароны. З будкі выскачыў Мурза, кінуўся Паўлоўскаму на жывот. Гаспадар пагладзіў сабаку. Пастаяўшы на ганку, памяркаваўшы, Паўлоўскі наважыў заглянуць да Зянькевіча. У лекара, як заўсёды, ня спынялася чарга нямоглых. А разам зь імі плылі ў хату й навакольныя навіны. Калі ў каго, дык у дзядзькі Зянькевіча можна масу чаго даведацца.

14

Сьцюдзёнае, валавянымі хмарамі засланае, неба як мага хавала дзесь на паўднёвай акраіне Гаравацкай пушчы зьняможанае сонца. Сыпала дробнай белай пацярухай, а тонкі лёд намагаўся пакрыць разводзьдзе на лугах. Зазімак выпрабоўваў сілы. З усходу дзьмухаў пранізьлівы золкі вецер.

У гэткае надвор'е гаспадара знойдзеш пры познай малацьбе ў гумне, пры мяліцы зь лёнам або іншай хатняй працы. Трэба-ж абставіць кулямі саломы, - каб ня ўлез зімою ў хату нягоднік вецер, - драўляныя сьцены хаты, абсыпаць кастрай ніз, пазатыкаць дзіркі ў

падстрэшшах хлявоў, даць новы насьцвіл саломы для статку, упарадкаваць гаспадарскае земляробнае знарадзьдзе дый ці мала яшчэ чаго.

Жорны пайшлі ў рух незадоўга пасьля бальшавіцкага «вызваленьня» й выглядала, што ня будзе ім супыну. Млыны, некалі адабраныя бальшавікамі ад сваіх уласьнікаў, пераважна Жыдоў, цяпер апынуліся ў руках новага акупанта, якому селянін ня зусім давяраў. Рызыкоўным стаўся і давоз на млын зярна. Як ніколі раней, селянін палягаў на сваю кемлівасьць і прымітыўныя прылады працы.

Амаль парвалася гандлёвая сувязь із горадам. Жыдоў з Гацяў выгналі ў Глыбокае й прыйходзілі весткі, што ўсіх глыбоцкіх і вакольных Жыдоў паселяць у аднэй часьці места, якое будзе называцца «гетта», каб выпаласкаць рэшткі золата ці іншых каштоўнасьцяў.

Адсутнасьць прадуктаў першае патрэбы, перадусім солі, цукру й нафты, хоць надта-ж дакучлівая, ня была неперамагальнай. Чаго добрага, на бяду чалавек мог абыйсьціся й бяз гэтага. А праныры рабілі абмен тавараў на чорным рынку, за якім акупант, заняты ваеннымі справамі, ня меў часу сачыць. На паўдзённым баку Гацяў, ля двух адножных чыгуначных шляхоў людзі знайшлі ўкопаныя ў зямлю цыстэрны, напоўненыя неачышчанай чорнай нафтай. Паспрабавалі паліць у лямпах. Капціла надта, але гарэла. Асабліва хутка згараў прасякнуты смалой кнот. Дый гэтаму далі раду. Пакуль агледзіўся акупант, мясцовыя сяляне бочкамі й вёдрамі выцягалі тую чорную нафту й толькі таму доўгімі васеньнімі вечарамі па вясковых хатах гарэлі лямпы.

У гэну суботу, абложаная алавянымі хмарамі, прыцярушаная сыпкай халоднай маннай вёска Літоўцы жыла гукам жорнаў, стукам набільніц на кроснах, вурчэньнем калаўротаў. Вёска ведала, так як і ўсе навакольныя вёскі, што й сяньня могуць зь мястэчка зьявіцца людзі, прывалачы якіясьці транты-абноскі на харчы мянаць. І можа ня так з разьліку, як зь літасьці, - не галадаць-жа тым у горадзе! - літоўскія зробяць зь імі якісь «гяшэфт» і далей будуць прадаўжаць прасьці, ткаць, малоць, малаціць, мяць, каб на нікога іншага не спадзявацца, каб незалежнымі быць.

Гандляроў з трантамі спадзяваліся, як калісьці таго аднавокага Жыда із надта скрыпучым і доўгім возам, што за рызьзё жанчынам ігольлкі, мыла, гузікі, стужкі й хусткі суліў. Але ніколі не чакалі такіх

наведвальнікаў, што набліжаліся з Гаравацкае пушчы, ды ў такой колькасьці.

Ці мала чаго бачыў літоўскі гасьцінец! Калі пайсьці далёка назад, дык бадай ці ня ўсе ваякі, што за гэту зямлю змагаліся, - пераможцы й пераможаныя, - гэтта праходзілі-валачыліся. У пазьнейшыя часы маскоўскі штык у далёкую й зьненавіджаную Сібір сыноў гэтае забранае зянлі тут гнаў... Дзіва няма, што такую прошласьць за сабой меўшы, нічым, здавалася, таго гасьцінцу ня зьдзівіш. Кагадзе «вызвольнікі» бравурна й фанабэрыста з крыкам «да здравствует» на захад імчаліся. Пазьней заходнія «вызвольнікі» дзесьці верхам прагудзелі-праляцелі, а гэтта адно сьціплая колькасьць машын праехала. Падбітыя шыпамі боты нямецкіх жаўнераў зямлі гасьцінцу бадай не дакраналіся. Але ці спадзяваўся, калі-б споадзявацца мог, гасьцінец такога, што нахлынула на яго ў тую сыботу?

Іх пачулі й спасьцераглі тады, калі пры бесьперапыннай лаянцы канвойных, браханьні сабак-ваўчараў і стрэлах для пастраху высыпалі яны тысячамі зь зяпы Гаравацкае пушчы. Ведама, пачулі-б і ўгледзілі-б іх і бяз вэрхалу канвойных гарлапанаў. Не пачуць нельга было.

Ці даводзілася вам калі, у вандраваньні па нашай грэшнай плянэце, зьведаць блізкасьць мора тады, калі яно ад вас яшчэ аддаленае? Магчыма вы першы раз асэнсоўвалі прысутнасьць нечага ледзь не бязьмежнага, стыхійнага й магутнага, хоць фізычна вы былі яшчэ воддаль. Літоўскія сяляне маглі-б пасьля даводзіць вам, што яны здалёку пранюхалі прыбліжэньне масы савецкіх палонных, што ледзь не спантанічна выбеглі тады да гасьцінцу, але здарылася гэта куды прасьцей.

Занемагла Піліпава Аксеня. Пярыў яе, як у дошку, сухі кашаль. Папрасіла яна сына Арсеня, каб зьбегаў ды папрасіў зёлак у бабкі Апрасіньні, што на другі бок гасьцінцу на ўзьлесьсі Гаравацкае пушчы жыла. Гэтак шустры Атсень, - аж дрыгаў яму зь вялікага імпэту чуб, - сьпяшыў дадому на помач матцы. У руцэ трымаў шэры кужэльны мяшочак. Хуткі ягоны крок спыніў шырокі й разьліўны гоман, што пачуўся зь нетраў пушчы. Не, гэта ня быў гоман, а нешта іншае. Галасоў, як такіх, ня чуваць было, а магчыма яны зьліліся ў адзін прыдушаны, прыглушаны гул... Арсень пабажыўся-б вам, што такога ніколі ня чуў і ня мог-бы, пры найлепшым жаданьні, навет яго акрэсьліць. Адно пэўнае: у адзін момант юнак зразумеў, што на

гасьцінцы тысячы людзей і што яны ў руху. Тады пачуў браханьне сабак, адзін, другі, трэці стрэл рэхам ускалыхнулі пушчу. Гвалтоўна білася сэрца, зь перапалоху дрыжэлі лыткі. На гасьцінцы паказаліся дзясяткі, сотні твараў. Шэрых, змучаных. Як прывязаны, трымаюэчыся за камэль дрэва, з-за гольляў пазіраў на гэты дзіўны вобраз юнак. Крыкі канвойных, як нажы. І сабакі... Адзін зь іх, здалося Арсеню, спасьцярог яго. Больш інстынктам, чымся развагай, хлапец літаральна нырнуў у гушчу дрэў. Ззаду пачулася заўзятае браханьне. І крыкі... І стрэлы... Галіна куста балюча сьцёбнула па твары. Пальцы нешта ліпкае намацалі. А ногі на злом галавы нясьлі. Адно каб гасьцінец перабегчы. Перад гэным жахлівым вужам, каб ня выпаўз наперад, не паглынуў... Такога перапалоху ня ведаў хлапец, як жыве.

Душаная кашлем Аксеня, чакаючы хлопца, закіпяціла ў малым кацялку ваду, адставіла яго на прыпечак і паставіла вілы ў качарэжнік. Гвалтоўна рашчыніліся дзьверы, ветрам уварваўся ў хату сын.

- А божачкі мае, сыночак! Што з табой, хто цябе? - жахнулася матка.

Сын, з закрываўленым тварам, дрыжэў, ня мог злавіць паветра. Ён шпурнуў мяшочак зь зельлем на стол і асунуўся на лаву. У куце, заваленым хламам абноскаў, на нізкім табурэце, над калодай Піліп падняў галаву.

- Дай..., - сіліўся Арсень, - дай, мама, духу злавіць.

Аксеню зноў узяў кашаль. Яна зграбла мяшочак са стала, разьвязала яго, падыйшла да прыпечку й сыпала ў вар зельле.

- Ідуць... тысячы йдуць, мусіць! - голасна выбухнуў Арсень.

- Хто йдзець? Што з табой? Хто табе твар падзёр, што ўвесь у крыві? Ты ў люстэрка паглядзіся.

Аксеня намачыла канец ручніка ды падбегла да сына, узялася выціраць закрываўлены твар.

- Гэта я, мусіць, у лесе, калі на іх глядзеў, а пасьля ўцякаў ад сабакі ды мне нейкі куст падзёр...

- На каго ты глядзеў?

- Бальшавікоў... Неміц гоніць. Тысячы, тысячы іх, ні канца, ні краю. Я надта спужаўся...

Пах звараната зельля прыемным араматам напоўніў паветра.

- Я цяпер, мамачка, пабягу! - нагліў Арсень.

- Куды ты, сынок, пабяжыш? Ай-яй, божачкі мае! Што ты гэта гаворыш? Пярхі-пярхі! - кашаль напаў на Аксеню. - Раскажы, што ты відзіў.

- Ну што там расказваць? Кажу-ж, Неміц па гасьцінцы бальшавікоў гоніць. Як сьцяна, на зьлічыць, ні канца, ні краю. А Немцы па бакох із стрэльбамі і аўтаматаміды ваўчарамі сабакамі. І страляюць. Ох, як страху нагналі, яж лыткі дрыжаць, як я ходу даў!

- Гэта, мусіць, палонных. А куды ён іх?

- Ды ў Гаці. Чорт яго знаіць, куды. Ну дык, мамачка, я пабягу.

- А куды ты пабяжыш? Стой, шрам трэба во ёдам замазаць. Жарцікі, гэтак разадраў.

- Пабягу людзям наказаць, каб паглядзець ішлі.

Юнак не чакаў, пакуль маці ёдам памажа той шрам, яго ногі несьлі ў дарогу. Вышмыгнуў за дзьверы. Аксеня паволі падыйшла да прыпечку, зірнула на маўклівага Піліпа, што пры калодзе выкалупваў зь люлькі гар тытуню. Наліла ў гліняны кубачак завару зёлак і прыемна пацягнула носам ды пачала студзіць. - Божа мой, што гэта робіцца! - прамовіла. - А ты куды? - спытала Піліпа, які ўстаў ад калоды ды браў з крука на сьцяне тужурку.

- Пайду паглядзець што там такое.

Рэха таго вужа бясконцае калёны палонных ужо дабегла да Літоўцаў у той самы час, калі звонкі голас задыханага Арсеня пятае празь дзесятае паведамляў людзям пра нязвычайнае на гасьцінцы. Аціхалі жорны. спыняліся калаўроты й набільніцы ды падганяныя зазімкавай пацярухай вяскоўцы сьпяшылі на гасьцінец.

Наперадзе шырокай на ўвесь гасьцінец, у дзесяць радоў, калёны паволі бурчэў матацыкл з прычэпкай-лодкай, у якой з аўтаматам наперадзе сядзеў, выгадна разваліўшыся, маёр Вэрмахту. Зараз-жа за камандзерам ішоў шэраг жаўнераў, з аўтаматамі напагатове, перад фронтам калёны. Як вокам сягнуць, па двух бакох калёны, у шлёмах, з хуткастрэльнай зброяй, у водступах прыблізна пятнаццаці мэтраў адзін ад аднаго, валакліся канвойнікі. Некаторыя вялі на павадкох дужых шэрых, часта зубы на палонных скалячых, сабак-ваўчароў. Жаўнеры трымалі на палонных зыркае вока.. Воддаль, у Гаравацкай пушчы, суправоджаныя браханьнем сабак, юачулася аўтаматная чарга.

Як і некалі, падчас таго параднага «вызваленьня», літоўскія сяляне нясьмела падыходзілі да гасьцінцу. І вачом іхным паказаўся

незабыты вобраз. Палонныя ішлі ціха. Колеру зямлі, аброслыя худыя твары, шмат дзе перавязаныя бінтамі рукі, галовы. Іншыя брылі свайміі сябрамі ўспамаганыя. Шматнацыянальная вязьніца-эсэсэсрыя рэпрэзэнтавалася тут усімі колерамі й расамі, зь вялікім працэнтам плоскатварых Азіятаў.

Побач гасьцінцу зьявіліся сярмягі, сьвіткі, кажухі, тужуркі, працінаныя ветрам і густой сьнежнай пацярухай. Перад імі, пад пагрозай агня аўтаматаў, глухая стыхія. Паабкручаныя шматамі ногі, закрываўленыя бінты, часта голыя сьсінелыя ад холаду грудзі, шэрыя, як зямля, твары. Два таварышы падпіраюць, цягнуць на руках трэцяга. Каб ня ўпаў. Бо канец яму будзе, капут!

Зглумленае нутро антычалавечай, можа найбольш жахлівай з усіх зьненавіджаных імпэрыяў. Пераможаныя, зьняможаныя. Ня зброяй, насустрач якой рукі паднялі. Безнадзейны адчай у вачох. У адчаі і маўкліні сваей жахлівыя. У гэтай шэрай, паўзучай масы яшчэ ёсьць пружыністыя мускулы й зьвярыная свомасьць самазахаваньня ды здольнасьць ісьці напралом.

Калі-б знайшоўся голас-сыгнал...

Што ўва ўсіх у адзін момант адгукнуўся-б...

Тады...

Не, за ўсякую цану нельга да гэтага дапусьціць. Спыніць усялякія гутаркі. Каб ізаляваныя ў гэтай шматтысячнай масе былі адзін ад другога. Таму стрэлы ўверх. Для пастраху.

Наперадзе гайдалася каляска-прычэпка. Афіцэрская рука спыняе шофэра, паклікае сяржанта.

- Генкэ, перадайце ў канвой: людзі каля дарогі зьбіраюцца. Узмоцніць пільнасьць. Страляць толькі ўверх!

- Яволь, гэр маёр!

Па ланцугу йдзе загад. Насьцярожваюцца вочы пад нізкімі, зусім на лоб, шлёмамі. Лашчаць куркі аўтаматаў указальныя пальцы ў пальчатках.

Вырасла пры гасьцінцы панурая сялянская сьцяна. Уся вёска, хіба за выняткам патрыярха Якуба ды некаторых нямоглых. Вёска маўчыць. Відовішча настолькі няверагоднае, яно параліжуе. Праўда, між палонных няма сваіх. Палякі моладзь на сваю вайну выцягалі, а бальшавікі ня ўсьпелі рэшты падабраць. Вось яна магутная,

няпераможная - твары двух кантынэнтаў. Гляньце, колькі вунь плоскіх ды касавокіх. А што яны? Ваявалі?

Сотнямі тысячаў, міліёнамі ў палон бяз выстралу. Наплявaць на ледзянавокага-васпаватага. Думалася, што іншы дыктатар за зьненавіджанага свайго лепшы. Абы далей ад калгасаў-прыгону, ад забойчай рабаўнічай працы ў хвабрыках. І бадай ня было між імі ніводнага, які ня страціў-бы сваякоў у канцлягерах.

Грозна прыглядалася доўгаму чалавечаму вужу акалелая, голая, мясцамі зеленьню хвояў пераплятаная Гаравацкая пушча. Размашыста плылі над ёю цьмяныя хмары. Дзесь на сухастоіне на ўсю шырокую сваю зяпу марудна каркала варона. Скрыпеў пад нагамі канвойных лёгкі сьнег. Шуршэў-грымеў пад змучанай масай грунт гасьцінцу. Напружваліся павады на навучаных да нападу сабаках. Няпрыхільныя вочы спад шлёмаў коўзалі па вясковым гурце.

Пад сярмягамі й кажухамі жвавей біліся сэрцы. Яны із звычайнай, штодзённай бядой зжыліся. На тысячах твараў жахлівая, неапісаная роспач. Такая сіла людзей. Куды іх гоняць? Госпадзе мой! Дзесьці свае вясковыя дзяцюкі ў такім самым палоне. Ад праклятага верасьня адзін імглісты ўспамін астаўся. Як іх хто ў пропасьць! Кроплі дажджу на пыле дарожных сьлядоў. І ўсё. Ні слыху, ні водгуку. Куды іх загналі? Колькі зь іх выжыла? Як гэтых во, пакалечаных і зьняможаных па чужым гасьцінцы пагналі... Хвалявaліся пад сярмягамі й сьвіткамі грудзі. Кароткімі, абрывістымі словамі перагукaліся вусны. Сьціскaліся парэпаныя, каравыя ад кастры, жорнаў. ад цэпаў рукі.

Гора, зьбянтэжаньне, параліж. Учарашняя магутная армія - сяньня зьмерзлая, галодная галеча. Вунь адзін упаў пад адхон. Брэх сабак, адрывісты, ядавіты крык і кароткая чарга з аўтамату. Так проста й раптоўна. На вачох цэлае вёскі.

Як так льга? Чалавек - быдла. Націск курка. Пару часінаў... І няма. Здрыгануліся пад сярмягамі сяляне. А вуж? Яму хоць-бы што. Ніякае рэакцыі. Як поўз так і паўзе. Быў чалавек - няма чалавека. А можа ён, гэты вялізарны, шматтысячны вуж-пачвара, ужо й да гэтага прывык? Вуж мучыўся пустымі жыватамі, сьмяглымі вуснамі, дрыжэў з холаду, цярпеў ранамі.

- Матушка, хлеба!

Стогн чалавека, просячага збаўленьня... Каб прывід шчарбаты з касой аддаліць-адпіхнуць.

Гэтта некалі горда, на прывітаньне «добліснай», з партрэтам ледзянавокага-васпаватага вырасла трыюмфальная брама. А пасьля на пятлі гойдалася старэйшая Макатунішка. Бадзёра імчаліся «вызвольнікі». Ці гэта тыя самыя людзі?

- Людзі добрыя, памілуйце! Хлеба!

І выцягнутыя рукі.

- Швайгэн, унтэрмэнш!

Голас, як кінжал. І чарга з аўтамату ўверх.

- Кідайце, бабы, у іх хлебам! Што яны нам зробяць? Страляць будуць?

Выразны й бойкі голас Бураковай Ніны. У ейнай памяці свая Гальгота. Каб ня гэтыя чужыя людзі, з аўтаматамі, не вярнуцца ёй дахаты.

- Бабы, у каго ёсьць бульба, ці хлеб, кідайце!

У калёну паляцелі акрайцы хлеба, бульбы. Захваляваўся вуж. Рукі лавілі харчы на хаду.

І тады, пад заядлае браханьне сабак, нізка над галовамі разрагаталіся аўтаматы. Немцы, - трэба ім справядлівасьць аддаць, - трымаліся загаду, сваіх месцаў, рэагавалі на той палёт харчоў ледзь не механычна. Шнурам незразумелых праклёнаў адкрыліся глоткі. Вясковыя сабакі, каторыя з натоўпам былі, сьцяміўшы нязвычайнае, на адлегласьць зьнюхаўшы грозных ваўчароў, заядла зьвягалі, хвасты падціснуўшы. Піснулі зь перапалоху некаторыя жанчыны.

- Дарэмна вы! Такой масы не накорміце. Дражніць ня трэба!

- Чаго добрага, пастраляюць іх, бедных!

- Або за хлеб падушацца.

Звычайная, чэрствая, практычная жыцьцёвая развага верх брала. І доўга яшчэ, доўга прыцярушаныя сьнегам, калеючы на сьцюжы, стаялі пры дарозе літоўскія сяляне.

Вуж поўз гадзіны дзьве. На зьмярканьні панурыя, маўклівыя людзі разыходзіліся па гасподах. Было пра што гаварыць. Але скупая, ашчадная мова гаротнікаў ніяк не магла-б узнавіць ці перадаць таго, што стаяла перад вачмі. Вечарам Гараватка пабагацела яшчэ аднэй сьвежай магілай. На парозе Літоўцаў вайна скрывіла свой агідны твар.

15

Рэдка даводзілася Януку быць у гэтым месцы Літоўскага балота. Яшчэ змалку вынырнуў у ягоны сьвет таямнічы Марылін Горб. Побач Гараваткі ўжыўся ён у мясцовы фальклёр.

- На Марылін Горб змыўся ўсякі чорт, - гаварылі людзі.

Адкуль тое ўзялося? Можа спытацца дзеда Якуба? Можа-б ён расказаў пра Марылін Горб так, як калісьці пра Гараватку? Дзеда побач ня было, адно маўклівая касалапая хвоя ў групе такіх-жа самых хвояў і Янук мяркаваў як дабрацца адгэтуль да Антося Дзеркача, які гэтта недзе чакаў яго.

Сыбота, перад Пакровам. Учора мімаходам пры Пятуховай клеці Антось сказаў яму коратка й загадна: - Заўтра рана прыхадзі на Марылін Горб! Надта, надта важнае! Хачу цябе відзіць. Глядзі-ж, ня бойся!

«Добра сказаць, ня бойся! А мне, малому шышу, каторы гэта месца абмінаў раней...» - думаў Янук, якому дзесь воддаль здані чарцей маячыліся.

У таямнічасьці Антосевага голасу і ў загадкавым выразе ягоных праніклівых вачэй адказ быў захаваны. Зь іншага боку Янук верыў, што чалавек яго ня зводзіць. Калі ўжо сюды паклікаў, дык прычыну меў. Пра нейкую дрэнь мог-бы мімаходам, на тын абапёршыся, сваім жартаўлівым, зроўнаважаным голасам сказаць. «Надта, надта важнае». Ды яшчэ «ня бойся».

Хвоі быццам карагодам, адна пры аднэй, да скокаў сабраліся. А вышэй іх, у празрыстым бязьмежным небе панавала сэрца гоючая, мары натхняючая цішыня. Замаразіла. Лёд сьцяў балота, а гэтта пад хвоямі трашчэла суччо, валяліся палушчаныя вавёркамі шышкі. Залаты супакой, слава прыроды.

З паўднёвага ўсходу праз густыя хвоі прабілася сонца. Крыху лявей, на поўнач, грукацеў-тарахцеў цягнік. Ад часу, як новы акупант звузіў рэйкі чыгуначных шляхоў, сіпатыя паравозы замянілі пісклівымі. Недзе бліжэй, быццам хлёсткай пугай, сьцебануў паветра ёмкі выстрал. І амаль у тойсамы момант нешта стукнула Януку па галаве. Хлапец зірнуў уверх. У конуснай верхавіне хвоі, быццам памяло, шмыгнуў хвост вавёркі. - Эх ты, гуляка! - засьмяяўся Янук.

Прабраўшыся праз густыя хвоі, Янук прайшоў празь невялікую прагаліну і апынуўся між гонкіх, быццам на якую ўрачыстасьць

зграмаджаных, бярозаў. Пад старымі, растрапанымі, бацькавымі ботамі шалясьцела лісьцё.

- Чорт знаіць, дзе цябе шукаць! - вылаяўся хлопец. - Адгадай, дзе ты падзеўся. І чаму я не распытаўся болей пра гэты Марылін Горб?

Заклапочаны, Янук спыніўся. І прыгадаў сяньня рана з пасьцелі ўстаўшага бацьку.

- Куды-ж ты, сынок?

- Схаджу, прабягуся.

- Непаседа. Можа-б во пры гаспадарцы памог? Мікола ўсё сам. Ці-ж ты ня відзіш?

Чаму-ж ня бачыў... Ды ў сэрцы ягоным загнязьдзілася нешта, чаго не спанатрыць бацьку. Таямнічае, трывожнае. Тое, супраць чаго сам устаяць ня мог. Прыйшоў новы, зусім накшы час - нарадзіны Беларусі, - тое, чаго бацька, некалі пісар пры восьмым ці каторым там стале ў Пецярбургу, зразумець ня мог. І было ягонае собскае, Янукова жыцьцё, новае, ад бацькавага зусім адменнае. Маладое. І было яшчэ нейкае сваё, Янукова «я». На сутыку двух розных сьветаў. Там, дзе трухлеюць, канчаюцца, распадаюцца імпэрыі й парасткамі, у агні вайны, у муках нараджаецца, да сонца прабіваецца дагэтуль заглушанае, стоптанае, паняволенае. Можа й сам Янук парастак гэткі, што доўгі час спад нейкага паваленага пня наверх, да сонца хацеў вылезьці... Нехта зрушыў трухлявы пень і ён, Янук-парастак, да новага жыцьця імкнецца-натужваецца. І пры чым тут бацькавы настаўленьні? Бацьку сваё жыць-аджыць, а Януку ягонае.

Вялікая ты, воля. І незраўнальна магутны той, хто стварыў цябе. Хораша, прыгожа, цудоўна дыхаецца табой. На нагах бацькавы зношаныя боты, але сын ня крочыць у бацькаў сьлед. Пракладаць трэба сьцежкі новыя. Ад каго чуў Янук такое, ці падобнае? Ці ня ў школе ад Сабалеўскага?

Так, меў Янук нейкую сваю, аднаму яму наканаваную, дарогу. Адчуваў гэта. Калі-б яго, гэнага асаблівага свайго прызначэньня ня меў, ня клікаў-бы яго праныра-жартаўнік на Марылін Горб. Як ня дзіўна? Усе такія юнакі, як ён, равесьнікі й блізкіх гадоў хлапцы дзесьці нейкія бібікі зьбіваюць. А ён вось тут, на таямнічым Марыліным Гарбе, толькі таму, што ёсьць нешта «надта, надта важнае»!

Цікава, чаму гэткія нязвычайныя думкі новыя якраз цяпер назойліва свайго абмяркаваньня жадаюць? Чаму якраз тут, пры гэткіх стройных, быццам на параду прыгажосьці гатовых, бярозах? Спыніся, зірні на гэтыя цацы. Голенькія, на зіму яны падрыхтаваліся. Чалавек на холад апранаецца, а гэтыя наадварот. Кантраст. І вакол маестатычная цішыня, адно ледзьве чуваць далёкія адгалоскі вёскі. Ды павёз некуды прылады вайны пісклівы паравоз.

Дамагалася праслуханьня загнеджаная ў неспатольным юнацкім сэрцы й віна перад бацькам. Стары, жыцьцём падбіты, часта нямоглы чалавек. Трэба было-б яму больш пры гаспадарцы пасобіць. Кагадзе зноў схапіліся. Ня першы гэта раз. Надта-ж войстра. Янук сам сябе ледзь пазнаваў. Седзячы на печы, апусьціўшы на пяколак босыя ногі, гаварыў Пракоп Бахмач.

- Куды цябе нячысьцік гоніць? Ня відзіш во якая нясусьвеціца? Чорт знаіць, што выраблеецца. Прападзеш, скруціш галаву, кажу...

- Тата, сам ты ня відзіш, што робіцца. Біларусь во расьцець. Яна такіх, як я, патрабуіць. Я малады. Мне другая дарога, чымся табе. Твой сьвет аджыў...

- Калі яна расьцець, гэта такая твая Біларусь, дык і бізь цябе вырасьціць. І якая табе другая дарога? Куды цябе? Чым ты занімаішся? Вайной бліжэй свайго кута дзяржыся... ато галаву скруціш. Нашто табе гэты Дзяркач? Вунь пакуль вы каго, дык яны вас перш...

- Галавы я, тата, ні скручу. Ты сваё жыцьцё жыў, а я сваё ды сваім розумам жыць буду. Ці ты, тата, гэтага ні разумеіш?

- Жабянё! Цьфу! Яйцо курыцу вучыць узялося. Ня будзеш мець куска хлеба дык з голаду прападзеш. Біларусь выдумаў... Дзе яна, тая твая Біларусь?

- Я яе ня выдумаў, тата. Яна была й ёсьцека!

- Дзе хто пра яе чуў, тую Біларусь? Каму яна трэба?

- Дык вось я табе, тата, скажу: Біларусь - гэта ты і я, гэта ўсе мы. І гэта наша зямля, а ні Маскалёва, ні Немцава, ні Палякова. Каб некалі нашы продкі не даліся чужынцам абдурыць, дык даўно-б сваю дзяржаву мелі, а чужыя злыдні-кравапіўцы нас жабракамі на сваіх нівах не парабілі-б...

- Што ты вярзеш, ёлупень! Каля гаспадаркі во цябе, нябось, німа. Як во ня будзіць чаго есьці й голы пуп прыкрыць чым, дык ты, такі разумны, згінеш!

Апошняе, зь вялікім націскам выказанае «згінеш» лягло мяжой. Пасьля гэтага бацька ня выказваў талеранцыі да сынавых разважаньняў, прост-напраст ня меў намеру слухаць. І ўсё гэта трывала дзесьці да першае гадзіны ночы, пад роўнае дыханьне непрабуднага Міколы. Адчуваў Янук, навет дакладна разумеў, што магла бацьку інтрыгаваць ягоная мова. Гэта быў нанос зь лекцыяў гісторыі, якую ў школе вучыўся й мо недасягальная вышыня для чалавека, які за жыцьцё сваё сотні кілямэтраў за поручнямі плуга й за бараной зрабіў. Але як накш выкажаш свае думкі? І адчуваў Янук, ведаў добра, што ня звычайная была з бацькам спрэчка. Навокал тварылася шмат большае за яго й бацьку. Зьвяруга вайна можа падхапіць і панесьці яго ў сваей зьнішчальнай плыні і кінуць стоць у нейкі небясьпечны вір.

Янукоў нос пранюхаў гар дыму. Лагодна дзьмухнуў вецер і недзе ўверсе нудна скрыпнула надломанае дрэва. Прыслухоўваючыся, Янук паволі ступаў між бярозаў. Неўзабаве густая іх чарада ўступіла месца радзейшым кустом і воддаль між галінаў Янук псасьцярог рэдкі сіняваты дымок. Непадалёк вялікае, падоўжанае кучы хворасту й ацяробкаў на калодзе ля вогнішча сядзеў чалавек. Па чырвоным, добра-ткі ўжо падношаным кажушку, кепцы, на правы бок галавы насунутай ды цёмных валосах Янук пазнаў Антося. Неадступным бярозавым кіем пароў ён вогнішча.

- А, гэта ты! - адвярнуўшыся, усьміхнуўся дзяцюк. - Добра, што прыйшоў. Я сяджу во й думаю, што ты мог-бы й пабаяцца...

- Во, а чаго? - бадзёра спытаўся Янук.

- Ну дык як гэта чаго... Пра гэты-ж во, пра Марылін Горб дык ці мала чаго навыдумлялі. Нібы тутака самыя чэрці рагатыя. Пэўне-ж і сам наслухаўся!

- Чаму-ж не.

- А ты знай, што чарцей людзі стварылі. Ня веру я ў іх ды людзі, на маю думку, страшнейшыя за чарцей бываюць.

Ніколі не даводзілася Януку на паважныя жыцьцёвыя тэмы з Антосем гаварыць і ня ведаў ён чаго спадзявацца ад Дзеркача пасьля ўчарашняга.

- Ні стаі. Бяры во якую калоду ды сядай.

Янук азірнуўся, выцягнуў з кучы чурбан дрэва й сеў на ім ля вогнішча, насупраць Антося.

- Нехта тут во добра пры бальшавікох паласаваўся. Бярвеньне сьцягнуў а суччо й ацяробкі пакінуў.

- Ага, - згадзіўся Янук.

- Ды пачакай, ніхай во балота ўмерзьніць, от сякеры й пілы пойдуць у работу.

- Думаеш?

- Людзём трэба дрэва. Пакуль там хто агледзіцца... От увідзіш...

- Можа быць, - згадзіўся Янук. - Але-ж і прыгожы дзень.

- Дзень нішто сабе мы выбралі.

Антось упарта ўглядаўся ў вогнішча, дзе найбольш дыміў смаляк і тлела суччо, аддаючы прыемне цяпло. Дзяцюк пароў смаляк кіем. Дым ішоў амаль стоць уверх.

- Вытрубілі мы ўчора ў Паўлоўскага бутэльку сівухі ды яшчо кміноўкай паправілі. Дык, халера, галава цяжкая сягоньніка. Але трэба было.

Гэнае «трэба было» нейкім вінаватым голасам сказаў і дзесьці ўбок зірнуў.

- Во, я ня думаў, што ты п'яніца. Ды яшчо зь кім? Зь дзіравым шляхціцам! - абвінавальна кінуў юнак.

- Чакай ты, паволі! - пагарачыўся Антось. - Ужо ты так адразу п'яніцу зь мяне робіш, а нічога ні знаіш. Калі-б ня трэба было, дык я-б да гэтага самага шляхцюка дзіравага й на парог нагой ня ступіў.

Пры апошніх словах бразьдзей стукаў па смаляку ў вогнішчы Антосеў кій. Іскры падскаквалі ўверх.

- Ты, гэта самае, чуў, што Немцы нашых восем чалавек у Глыбокім расстралялі? І твайго дырэктара Якаўлева? Ды нашага войта Бабра?

Янук анямеў. Што выпіўка літроўкі ў Паўлоўскага з гэтым супольнага мела? Цяпер згадалася ўчарашняе «надта важнае». Дырэктара ў школе некаторы час ня бачыў. Казалі, што захварэў, а ягоныя лекцыі зь геаграфіі й матэматыкі вялі іншыя настаўнікі.

- Як гэта расстралялі? Калі й за што?

Антось адказаў не адразу.

- Найболі гэтых, якіх расстралялі, як кажуць, за камунізм, дык гэта нашыя добрыя людзі. Некаторыя былі ў Грамадзе й Палякі іх судзілі. А Немцы ў Гацях як вады ў рот набралі. Ад іх нічога не даведаешся. Камуністы капут, ды і ўсё! А было гэта зроблена так

шыта-крыта й скора, што пакуль людзі спасьцераглі дык тых, найболі з Гацяў арыштавалі, адвезьлі ў Глыбокае й забілі. І разам зь імі надта важнага для нас чалавека, войта Бабра. Бандзіты! І толька таму, што наш Кастусь Падгайскі маіць у Гацях у паліцыі свайго чалавека, таму мы й знаем як і хто гэта зрабіў...

- Паляч'ё? - спытаў Янук.

- Ну а хто-ж...

- От нячыстая сіла!

Настала доўгае маўчаньне. Антось упарта пазіраў у тлеючае вогнішча. Моцна сьціснула бярозавую палку рука. Канец яе колькі разоў па смаляку ўдарыў, узьляцелі ўверх іскры.

- От, братка ты мой. Пакуль мы агледзіліся, дык паляч'ё нашых самых лепшых восем чалавек зьліквідавала. І то не свайміі, а нямецкімі рукамі. Падумаць, падумаць толька! Усё, што нам астаецца, дык гэта сядзець, як старыя кажуць, ды «ніхай хоць сам чорт пануіць, абы добра жыць было». А нас па аднаму, па два, па пяць, па дзесяць так і выдушаць. І чорт панаваць будзіць на касьцях нашых!

Нешта ня зусім укладалася ў Януковай галаве. Былі складнікі, але не атрымлівалася сумы. «Немцы, - думаў ён, - гэта нашыя прыяцелі. А хто-ж гаспадарыў?»

- Дык пры чым тут твая выпіўка зь дзіравым шляхціцам?

Трэба было бачыць у гэны час Антося, а асабліва назіраць за ягонай бярозавай палкай. Ніколі Янук Дзеркача ў такім сьвятле не разглядаў. Зямля ад зямлі. І нешта самабытнае, наскрозь здаровае, любоўю да роднага, жаданьнем справядлівасьці да людзей прасякнутае. Вясковы жартаўнік, такі сабе, быццам просты дзяцюк, што, здавалася, нікому вока не запарошыў. Людзі, відаць, ня зусім яго разгледзілі. Цяпер Янук быў упэўнены, што гэта ня хто іншы, а толькі Дзяркач той Шпунтоў лёзунг на вясковай школе спэцкаў ды бальшавіцкага гарлапана як на далані людзям, ледзь не нагала разьдзетага, паказаў.

- Пытаешся, пры чым тут выпіўка зь дзіравым шляхціцам. Зараз увідзіш, - злосна скрывіўся Антось. - Гэта мне Кастусь Падгайскі расказваў, што гэты самы дзіравы шляхціц да гэнай разбойніцкай шайкі паляч'я належыць. А ці ты ведаеш, ці кумекаіш, што гэта за банда?

Янук ня ведаў, што на гэта адказаць. Бярозавая палка зноў пачала заўзята біць па смаляку. Адчуваў юнак, што яшчэ найважнейшае ня было сказана, што яно наперадзе. І ажно баяўся, дрэннае прадчуваў.

- Аказваецца, што яны маюць зьвязь зь лёнданскім урадам польскім. А ўрад той, як відаць, галоце гэтай загадваіць як і што рабіць. Ты чуў такое? Галота наша маіць і іншыя зьвязі добрыя: людзі на паяздах машыністамі й на зялезнай дарозе працуюць, дык празь іх зьвязаныя зь Вільняй, Варшавай, а тамака з Варшавы ўжо яны неяк зь Лёнданам кантакт дзіржаць. Ды гэтыя-ж панкі, што ад бальшавікоў і Немцаў за граніцу паўцякалі, дык яны нашую зямлю сваей лічаць. Дык тыя панкі й зрабілі такую арганізацыю, у іх кантакты й грошы. Пачынаючы во ад гэтай пірды курвы Марыські Закшэўскай, што пры самым каманданьце нямецкай і чорнай паліцыі ў Гацях прымасьцілася, ды шпрэхаіць... Ці-ж гэта ня хітра? Ноччу зь імі ў пасьцелі, а пасьля разам нашых «камуністаў» майструюць, заразы! Паліцыя ў іхных руках, дый другія нямецкія канторы абсаджваюць. Закружылі яны каля Немцаў, як мухі ля гною, от як... Ну й дзіва німа, што нашых найлепшых людзей, як ваўкі авечак, цягаюць. Тут во й сядзі, рукі злажыўшы...

Шмат болю. горкага як той смаляны дым з вогнішча, было ў Антосевым голасе. Януку цэлы новы сьвет адкрываўся. Уяўленьне рысавала жахлівую сытуацыю, тым больш, што што ці не самай галоўнай спрунжынай у польскай баньдзе быў каржакаваты забойца ягонае маткі.

Антось, быццам злавіўшы Янукову думку, пільна зірнуў яму ў твар.

- Ты можа каторы раз і думаў, навошта я цябе раз пазваў, каб расправіцца з тым ханжой Шпунтам, каторы памагаў Косьціку твайго бацьку катаваць. А цяперака можа зноў думаеш, чаму я цябе сягоньніка другі раз выклікаў, дык можаш дагадацца. Чалавек, каторы стаіць як-бы ў самым цэнтры, а калі ні ў самым дык блізка сярэдзіны гэтай банды басякоў і забойцаў, гэты чалавек...

- ... забіў маю матку, - горкім голасам дакончыў Янук.

- Так. А цяперака ён із сваей кумпаніяй нямецкімі рукамі забіў нашых восем чалавек. І гэта, пэўне-ж, пачатак толька. Паглядзіш як гэта яны, як кажуць, у пер'е абрастуць, нажывай абсмакуюцца, за нямецкімі плячмі разгуляюцца. Гэты басяк Бжончак пры Польшчы

забіваў, дык яму ні навіна. Хто ведаіць ці яшчо да цябе й тваіх ні дабярэцца...

- Да мяне й маіх? А за што?

Антось засьмяяўся калюча-злосным сьмехам.

- Якоя-ж ты дзіця! Бандыцкай натуры ні знаіш, от што... Бандыт, калі ён раз забіў, дык ягоная рука ўжо да крыві й цягніцца. І бандыт ніколі таму ні даруіць, каторы на яго за што злосьць маіць. А ці-ж ён, ты думаеш, пра вас забыўся? Ён-жа во тут каго толька ні знаў, а вас найболі...

Ці раз марыў Янук пра помсту. Мала, што марыў, але навет пастанавіў. Калі падрасьце... А гэтта, выглядае, справа ня так простая. Ён ніколі ня думаў пра пагрозу для яго сям'і з боку гэнага самага забойцы. Антось прадставіў небясьпечную сытуацыю. Бо й запраўды, калі падумаць, дык ці-ж можаш запярэчыць яму, што «забойцы рука да крыві цягніцца»?

- Я гэтак ня думаў, - сказаў ціха.

- Як ня думаў? - спытаў Антось.

- Ды што Бжончак можа на нас усіх пакваціцца.

- Во, чаму-ж-бы не? Як відзіш, цяперака тут вайна. Яны, відаць, маюць свае пляны, гэта значыць, каб нашых людзей, каторыя за сваё стаяць, ліквідаваць. Ну а калі Бжончак у іх там верх вядзець, дык, пэўне-ж, апроч агульных плянаў ён зробіць і свае парахункі. Гэта, братка, каб я з гэтага месца ні зыйшоў, напэўна так і будзіць.

- Дык што-ж мне рабіць? Бацька мой, - сам знаеш нашых людзей - думаіць, што калі будзіць ціханька сядзець і за бараной і плугам хадзіць, дык нікому на мазыль ні наступіць, дык і яму аніхто. Але я? Ты праўду гаворыш. Дык ці-ж мне чакаць, пакуль гэты бегамот да нас із стрэльбай прыйдзіць?

- Во цяпер ты добра думаеш, цяперака віджу, што кумекаеш. А калі так, дык нам трэба добра падумаць, што рабіць. Адно ясна, што таўчыся на месцы, як тыя авечкі ды чакаць, пакуль воўк прыйдзіць і нас пацягніць, мы ня можам. Дык што тады?

У Януковай галаве хаос паўстаў. Там вучань школьны, а тут чорт ведае што... На нейкую вайну з Бжончкам ісьці? І як ён, падлётак яшчэ, можа што зрабіць?

- Згода, ці не? - спытаў Антось.

- Гэта ты пра што?

- Пра тое, што так сабе, рукі злажыўшы, сядзець ня трэба.

- Згода. Але як і што? Трэба добра падумаць.

- Падумаем.

- Ды ты мне расказваў, што наш дзіравы шляхціц да гэных пшэкаў галаварэзаў належыць. Гэта разумею. І як гэта нашы людзі яго, нікчэмніка, пашкадавалі, бальшавіком ня выдалі, каб ён да белых мядзьведзяў на Салаўкі паехаў... Алі гэта ні да рэчы. Ты мне ўсё-ж ні сказаў чаму ты ўчора зь ім столькі гарэлкі вытрубіў, хоць я знаю, што цябе да чаркі ні цягніць. Нейкая-ж прычына была?

- Ага, была. Віджу, што кумекаеш. Дык от гэты самы Падгайскі Кастусь перасьцярог мяне. Ён, кажыць, гэты наш Паўлоўскі, ад сваей банды заданьне атрымаў, работу для іх робіць. А якая гэта работа? Ну падумай.

- Даносы? - спытаў Янук.

- Во, во, даносы. Ён маіць пра ўсіх нашых людзей ім даносіць, значыцца як, хто й што думаіць, што робіць, зь кім руку дзяржыць. У іх пэўне сьпісак ёсьць. Як толька што, дык яны тады Немцаў на цябе, што ты камуніст, значыцца. А Паўлоўскі-ж пэўне ні мяне аднаго на воку дзержыць. Гэта ці раз ужо ён са мной пра ўсякае цікавае гутарку пачынаў. Як от, Антось, думаіш пра тоя й гэтае й так далей? Ну а я, - сам-жа ведаеш, - ня ўчора зь пялёнак. Думаю сабе, калі ты, басяк, хочаш мяне за язык пацягнуць, дык пэўне-ж прычыну маеш. Сам знаеш, што я ад Палякаў і бальшавікоў высьлізнуў, дык значыцца ня ёсьць ламака нейкі. А ці-ж Паўлоўскі гэтага ня відзіць? Ну але, чорт ты рагаты, прастытутка шляхоцкая, ні табе Дзіркача Антося абхітрыць. Як я тваіх паноў абхітрыў, дык цябе й пагатове. Дык як ён мяне за язык цягнуць узяўся, то я яму такія жарцікі й цымусы... Скулу, думаю, пазадак панскі, да майго нутра дабярэшся. Добра, аказваецца, рабіў, бо мне на днях тоесамае й Падгайскі раіў. І яшчо, казаў Падгайскі: пастарайся, кажыць, добрую руку зь ім дзяржаць, каб ён цябе за свайго чалавека лічыў, каб на цябе ў яго ніякага падазрэньня ні было. Проста, кажыць, якога прыдурка Ваньку йграй. Я тое перадумаў, што Кастусь казаў, і ягоную праўду віджу. Цяперака-ж, знаеш, мы ніякай сілы ня маем, дык навошта на ражон лезьці? Во, забыўся, чорт вазьмі, трэба палажыць, каб сьпякліся!

Антось выняў зь кішэні некалькі бульбін, старанна разгроб прысак, паклаў туды бульбу й засыпаў жарам.

- Пакуль мы з табой што скумекаем, дык і бульба сьпячэцца.

Янук маўчаў, спакойна ўдыхаючы сьвежасьць ляснога паветра. Ляніва, у сьцюдзёных праменьнях сонца, драмаў лес.

- Дык от, знаеш, братка, нівялікая мне пацеха да гэтага панскага брыды падмазвацца. Рука сьвярбіць, каб добра ў рыла чахнуць. Ну алі прыйдзіць яшчо й на маю ніву сьвята! Ды ты-ж знаеш, як гэты ёлупень пахвальбу любіць, які зь яго нягоднік і пусты фанабэра. Дык я яго і ўчора ці раз пахваліў. Ты, кажу, Пятрусь, усё-ж маладзец, сваім людзям пасабляеш. Табе ад іх павага й падзяка будзіць. Каб ты відзіў, як ён, брыда, падрос! Ні дай, Божа, які басяк самалюбны. Ды я й давай на гэным яго самалюбіі йграць. Адным словам, думаю, што ён мяне цяперака за свайго чалавека маіць. А мне толька гэтага й трэба, а тамака паглядзім...

- Ні знаю, што табе на гэта сказаць. - заўважыў Янук. - Так выглядаіць, што ты яму хочаш паддабрыцца.

- Ну не, - запярэчыў Антось. - Я баяўся, што ты мяне ні зразумееш. Я-ж ні паддобрываюся яму, а толька хачу паказацца, - як табе сказаць гэта? - ну другім, ні такім як я ёсьціка. Ты-ж от сам цяпер відзіш, што ёсьць два Антосі: адзін такі няшкодны й вясёлы, ці, як нашы кажуць, - Антось прыдурак, а другі - гэта той, каторы з табой гаворыць. Ну праўда гэта, ці не?

- Ага.

- От відзіш. Дык мне тутака залежыць, каб Паўлоўскі, гэты вораг і басяк, катораму некалі трэба будзіць шыю скруціць, каб ён мяне лічыў за нейкага ніважнага дурня, які ня відзіць, дзе што робіцца й хто ў што пальцы мачаіць. Ён падумаіць, што я няшкодны. Проста гаворачы, ідзець пра тое, каб ён ні знаў мяне такога праўдзівага, сур'ёзнага, як ты знаіш. Тады мне ён нідзе нагі ні падставіць, а значыцца й даносу на мяне ня зробіць, дык можа будзе нешта рабіць. Кумекаеш?

- Усё гэта надзвычайна цікава й я цяперака віджу, што ты, за парадай Кастуся Падгайскага, добра робіш. Ты думаіш, што гэты самы ёлупень Паўлоўскі цябе ні прагледзіў?

Антось падумаў.

- Як табе сказаць? Я ні магу пабажыцца, ці прысягнуць... Думаю, што ён ні дагадваецца. Дурны ён ня ёсьціка, але нідаверлівы, сукін сын. Ну алі як мне быць? Каб от так раней ужо рот адкрыў, дык, - хто знаіць? - можа мяне ўжо зьбяёдалі-б... Таму я думаю, што тутака трэба

час выйграць, ды можа, пакуль там якая трасца, і ў ласку да яго ўбіцца. Ніхай навіт думаіць, - і гэта я буду памалу яму ў вушы ўводзіць, - што я ў іх свой, што Палякам на руку... Кумекаеш?

Антось устаў, налажыў на вогнішча сухога хворасту, які ўміг заняўся буйным полымем. Янук адсунуўся ад вогнішча й пазіраў на прагавітыя чырвоныя языкі, што сквапна ахоплівалі новую пажыву. І ў ягоным уяўленьні полымя пашырылася, узбуйнела, вырасла, шугала й ахоплівала вялікія прасторы роднай зямлі, пагражала ўсеагульным зьнішчэньнем. А блізка яго й ягонай сям'і спыніўся, напагатове, каржакаваты забойца.

- Толька от што, Янук, - даляцеў да сьведамасьці сухі голас зьверху, - калі я, з патрэбы, завяду гэтае самае, якую дружбу з Паўлоўскім, дык, сам знаеш, вясковыя языкі вярзіць пачнуць. Дык от тады не забывайся чаму я так рабіць буду. Калі што пра мяне пачуеш, нічога нікому ні расказвай. Язык за зубамі дзяржы. Кумекаеш? Ня выдай мяне. Добра?

- Добра, - адказаў Бахмач.

- Бо калі, ні дай, Божа, гэты басяк маю гульню спанатрыць, то мне капцы могуць быць. А нам-жа час трэба. Кумекаеш?

- Кумекаю, - адказаў Янук Антосевым словам.

Дзяцюк зірнуў на юнака і ўсьміхнуўся.

- Я табе саўсім давяраю. Калі-б ні давяраў, дык ні пазваў-бы на Марылін Горб і ні расказваў-бы сваіх тайнаў. Глядзі-ж, каб апраўдаў сябе, бо мы ў аднэй лодцы й мусім адзін аднаму пасобіць.

Антось разгарнуў прысак, перавярнуў бульбу, заўзята цягнуў носам.

- Ужо пачынае прыпякацца. Але-ж і люблю запах такі!

Гэты дзяцюк ня пераставаў зьдзіўляць юнака. Ажно ніякавата было. Той раскрыўся перад ім, як перад нікім іншым зь вёскі. Што гэта значыла? Мусіць ён, сын гаротніка Пракопа, не апошнім нулём быў. Халерная думка. Гэтта вось пад бокам, начупыраны, быццам індык, ахарашваўся-зьвярэў у Гацях забойца ягонае маткі, зь якім ужо некалі пастанавіў некалі рахункі зьвесьці. Дзіва, што Антось яго выбраў, утаямнічыў у свае сьцежкі-дарожкі, руку падаў. Калі так, што-ж у яго глыбей у думках гнязьдзілася?

- Антось, - пачаў нясьмела.

- Га? - адвярнуўся той.

- Дык ты можа да канца чаго ні даказаў, знаеш? Я цяпер ведаю ўжо пра гэтага дзіравага шляхціца. Дзякую, што вытлумачыў. Ну але другое: Што рабіць з гэтым Бжончкам, што ты думаеш?

- Забіць.

Януку дыханьне заняло. Вось перад вогнішчам, зь неразлучнай бярозавай палкай, порачы смаляк, стаяў бездапаможны, здавалася, вясковы дзяцюк. А ў Гацях, абкружаны свайме галаварэзамі, запусьціўшы сеці на ўлоў мясцовых «камуністаў», валадарыў Бжончак-Бронхэр. У таго ў руках мясцовая ўлада, а ў гэтага - бярозавая палка. А на вуснах прыгавор - забіць! Сьветкамі - касалапыя хвоі й стройныя бярозы. І Бахмач Янук.

- Як? - спытаўся юнак.

- Проста. Надта проста. Відзіш Янук, ты малакасос яшчо, многа чаго ні знаіш. А тутака німа нічога такога надта скамплікаванага. Трэба табе ведаць, што кажны чалавек маіць свае слабасьці й гэны брыда таксама маіць свае. Трэба іх толька нам знаць. І я пастараюся даведацца. Перш за ўсё трэба ведаць дзе фольксдойч Бронхэр гуляіць, як і колькі п'ець. Я пра яго многа чуў. Таксама ведаю, што ён із гэтай курвай Марыськай Закшэўскай... Чуў, што гэныя «хлопакі» ягоныя з паліцыі ох якія ахвотнікі пагуляць. А калі так, дык недзе-ж яны гуляюць. І вось, знайшоўшы ўтоптаныя імі сьцежкі, трэба падпільнаваць. А тады... Адзін момант, адзін удар нажа, каб ціха, каб ня чуваць было, от так, здалёку.

Антосева рука маланкава выхапіла з-за пазухі нешта прадаўгаватае і зьзяючае, і ня ўсьпеў Янук навет разгледзіць, што робіцца, як нож крывуляй сьвіснуўшы ў паветры, крокаў пятнаццаць воддаль уеўся ў камель бярозы. Антось падыйшоў да дрэва, выцягнуў нож, выцер зьзяючае лязо, ды зь любоўю, здавалася, паглядаў на яго й падаў Януку.

- На, паглядзі. Цяпер кумекаіш?

Янук трымаў і ўважна абглядаў паляўнічы нож з прыгожымі касьцянымі чыранкамі.

- Пекны нож. Знаеш, я некалі такі ў Лазоўскага відзіў. Ягоны?

Антось не адказаў на пытаньне.

- Спрабуй, пацэль так у дрэва, як я, - запрапанаваў дзяцюк.

Янук паглядзеў на забойчую прыладу, памяркаваў, зірнуў на Антося, нацэліўся і зь вялікім размахам кінуў нож у бярозу. Нож

крутнуўся ў палёце, збочыў, бразнуўся аб камель і ўпаў.

- Ні так лёгка, як здаецца, га? - суха ўсьміхнуўся Дзяркач. Ён узяў прыладу зь Януковай рукі й пакуль юнак азірнуўся, яна дакладна, як раней, сьвіснуўшы ёмка ў паветры, уелася ў камель дрэва.

- Каб табе гусак на нагу наступіў! Як ты гэта робіш спрытна! - крыкнуў з захапленьнем Янук. - Навучы мяне.

- Яно ні так проста, як выглядаіць. Трэба перш ацаніць адлегласьць, а як кідаеш нож дык знаць яго цэнтар вагі; от кідаеш ручкай і мусіць перакруціцца, каб упіўся ў дрэва носам. Кумекаеш? Алі гэта найболі практыкі трэба. Мусіш ужо мець так руку набітую, каб яна сама, як кажацца, пранюхала... вока глянула, ацаніла, а рука ўжо й знаіць як... от. Практыка вялікая трэба.

- А ты доўга кідаў, пакуль навучыўся?

- Эх, гадамі. І многа залежыць яшчо, што кідаеш. От гэты нож я па вазе выбраў, якраз на маю руку. Знаеш, ты пэўня чуў, што Цыганы, Гішпанцы й паўднёвыя народы, як Італьянцы, яны ў гэтай штуцы вялікія майстры, добрыя, прыгодныя для кіданьня, паляўнічыя нажы маюць.

- А ў цябе яшчо болі такіх нажоў ёсьціка?

- Казаў табе: як многа будзеш ведаць то скора састарэешся.

Янук зморшчыўся.

- Ну ня крыўдуй на мяне, - усьміхнуўся Антось, - што я пажартаваў. Пэўне-ж у мяне ёсьць яшчо... Калі-небудзь пакажу, калі цябе зікавяць.

Запахла печанай бульбай. Антось разгарнуў прысак, выхапіў бульбіну, памацаў яе, абцёр попел, разламаў.

- Вяры, гатовая.

Янук узяў бульбіну, пачаў хукаць на яе, абіраць ды сеў на чурбан дрэва.

- От каб яшчо шчыпці солі да гэтага.

- А во, на, - выняў Антось зь кішэні закручаную ў шматцы соль. - Бяры на руку.

Воддаль, на нязусім яшчэ добра ўмерзлых, сьнегам прыцярушаных купінах ля кустоў лазьняку нешта заварушылася. Янук спасьцярог яго першы. Гэта быў высокі, з шырокай, разьлеглай, сукаватай каронай лось. Ён спакойна разглядаўся.

- Глянь, Антось, тамака, пад той стажок!

- Іш ты яго! - захапіўся Дзяркач. - Даўна-ж я такога ня відзіў. От каб добрую дубальтовачку ў рукі!

- І ты забіў-бы яго?

- А чаму-ж не?

- Шкада. Я такога першы раз на свае вочы віджу. Раней толькі ў падручніку прыроды з прыроды спатыкаў, - зьдзіўляўся Янук.

Разгледзеўшыся ды, мусіць, наважыўшы, што небясьпекі зьнікуль няма, лось паволі наблізіўся да стага й пачаў скубсьці сена.

- Калі ні я дык нехта другі заб'ець. Цяперака, вайной, знаеш...

Антось устаў, улажыў у рот пальцы й моцна сьвіснуў. Лось падняў галаву, зірнуў у гэты бок і, не марудзячы, накіраваўся ў гушчар.

16

Пры яркім сьвятле электрычнай лямпачкі Падгайскі пільна прыглядаўся Антосю Дзеркачу, Здавалася, што пытаньне, павіслае ў паветры, адказам сьвяцілася ў вачох агранома.

- Дык як табе гэта ўдалося?

Тыдзень перад тым, у глухую васеньнюю ноч, калі золь трымала людзей на запеччах, калі, згодна народнае мудрасьці, «добры гаспадар скаціны на такую непагадзь ня пусьціць», у ноч цёмную, «як пальцам у вока», нехта нарэшце справіўся з камандантам Бжончкам-Бронхэрам. Крывёю сьцёкшага, апруцянелага, знайшлі яго на сьцежцы ля жываплоту й прысадаў ля дому на водшыбе ад Гацяў. У кабуры - нязакрануты пісталет, а пры трупе - ніякае прылады забойства. На мясцовым мэдпункце жандармэрыі вымяркавалі, што быў забіты ззаду, доўгай прыладай, якая спад левае лапаткі дастала да сэрца. Паводля пазыцыі, у якой ляжаў, сьледчыя вымяркавалі, што каманданта забілі й неспадзеўна, бо пазыцыя, - тварам уніз, з аднэй падкорчанай рукой, - не паказвала, каб бараніўся ад нападу.

Дом, ля якога скончыў няслаўны жыцьцёвы шлях «фольксдойч» Бронхэр, мяшчане называлі забягалаўкай, калі не хацелі папулярна-брыдкім словам карыстацца. Паненкі забаўлялі там паліцыянтаў, а больш дападлівыя пахатухі апавядалі, што шырока ліліся там самагонка й шнапс, ніколі не бракавала шчодрай закускі. Ведама было

таксама, што «гандэлькам» загадвала Бронхэрава маці, удава, жанчына, ведама-ж, немаладая, узнагароджаная ў гэтым кірунку, відаць, немалымі здольнасьцямі.

Падчас нямецкае акупацыі такія, ніколі нярэкламаваныя, дамы йснавалі навет у малых мястэчках, дзе было войска й паліцыя, згодна, відаць, старога гандлёвага права - дзе ёсьць патрэба там знойдзецца й тавар. Цывільным ня было туды не патрэбы, ні доступу.

У час, калі забіты быў Бжончэк-Бронхэр, ня існавала яшчэ й ценю якое-небудзь небясьпекі ад чырвоных бандаў, а людзі ў мундзірах, што сьцераглі «новага парадку», сьмела хадзілі начамі, пераклікаліся свайміі, адным ім ведамымі, паролямі. Нікому з уладаў, відаць, ня прыйшло ў галаву, што самое палажэньне «дому пацехі», у якім калісьці жыло «тоўстае» бальшавіцкае начальства, магло прадстаўляць нейкую небясьпеку. Часы забясьпечаныя ці абаронных пунктаў, калі ноч падпільноўвала акупантаў, былі яшчэ далёка наперадзе. Дык ніхто, відаць, не зьвярнуў увагі на доўгую, аброслую жываплотам, клёнамі й бэзам дарожку, дзе глухой ноччу можна лёгка скрыцца й асачыць пажаданую ахвяру.

Бронхэра з гонарамі пахавалі на мясцовым могільніку, а Немцы жандармы ня надта рупіліся расшукаць забойцаў і задаволіліся павярхоўным сьледзтвам. Чалавек быў «фольксдойчам» і за забойствы такіх, дзе няведама хто падняў на яго руку, ня ўжываліся тады рэрэсіі як за самых «обэрмэншаў». Палякі-ж, што абсадзілі мясцовы гарнізон паліцыі, трымаліся іншае думкі... І вось пра гэта цяпер адбывалася гутарка.

Вечар дзёгцем чарнеў у вокнах. Падгайскі зусім ня зьдзівіўся, ведаючы ранейшыя Антосевы «прыгоды», калі той, ціха пастукаўшы ў дзьверы, зьявіўся на ягоным парозе.

- Што-ж, умеючы нядоўга, - адказаў Дзяркач на тое пытаньне.

Аграном прыкінуўся зусім абыякавым, адно пільна зірнуў Дзеркачу ў вочы і ўбачыў там пацьверджаньне. Так, відаць, навет ён не дацаніў гэтага праныры. Пакуль мяркаваў, як пазбавіцца зьненавіджанага легіянера, Дзяркач яго ўжо на той сьвет адаслаў. Устаў і завесіў фіранкі на вокнах.

- Вып'ем? - спытаўся.

- Налівай, - адказаў Антось.

Нямецкі шнапс абліў Антося прыемнай гарачынёй. Забыўся пра зяб, што яго па дарозе праняў.

- Ну як там твая Ніна? - зьмяніў тэму аграном.

- Эт, нічога сабе, - зірнуў Антось таму пільна ў вочы.

- Жывеш зь ей?

- А чаму-ж не..., - неахвотна адказаў Антось. Пра свае любошчы Дзяркач не жадаў расказаць дый мяркаваў, што яны ня надта цікавілі Кастуся.

- Вось што, братка, - паволі, думаючы, гаварыў Падгайскі. - Зрабіў ты гэта на сваю руку, проста наперад нам забег. Ну але што-ж, добра. П'ю за тваё здароўе.

Паднялі чаркі. Пілі мала, адно вусны памачылі.

- Раскажаш? - пытаўся гаспадар.

- Як гэта? Падробнасьці хочаш?

- Як сам знаеш...

У вадказ Антось вынуў з-за пазухі паляўнічы нож, тойсамы, каторы некалі аглядаў на балоце Янук, ды палажыў яго на стол. Падгайскі асьцярожна, каб быццам крывёю не запэцкаць рук, падняў двумя пальцамі, прыглядаўся.

- Пекны, што й казаць... І гэта ты зь ім цэлы час за пазухай ходзіш?

- Чаму-ж, навошта...

- Глядзі, барані, Божа! Як задзержуць то абшукаюць.

Антось маўчаў. Ён узяў нож і зручным рухам улажыў яго ў похву пад левай рукой.

- От што... Паляч'ё цяпер пільней нюхаць будзіць. Мне чалавек ужо даносіў. Праўда, яны камуністаў падазраюць, але-ж сам ведаеш каго яны камуністамі лічуць. Дый тое, што аднэй брыды ў нас паменшала, нічога ні вырашаіць. Нам трэба думаць, як іх усіх ліквідаваць. Як ты з Паўлоўскім?

- Добра.

- Зьмен німа?

- Нічагусенькі. У домыслах ён губіцца. Дый можа зьверху яшчо наказу ні маіць.

- А ці думаў ты, каб у паліцыю паступіць?

Антось скрывіўся й няўцямна пазіраў аграному ў вочы.

- Ты гэта што, кепікі зь мяне строіш?

- Ды не, я саўсім паважна.

Разумеліся з паўслова. Антось адразу вымяркаваў, чаму Падгайскі такую думку кінуў. А можа яна ў яго й даўно нарадзілася; меў-жа там некага свайго, пра якога адкрыта не гаварыў, значыцца пайменна не называў.

- Агідна! - плюнуў Антось. - Каб у сваю, дык яшчо-б...

- Зробім зь яе сваю. От ты паступіў-бы, там ужо нашых двух было-б. Сваіх болей цягнулі-б. А там зробім нейкі плян. Трэба са свайміў другіх гарадох трымацца. Там-сям нашы верх узялі. Адзін-аднаму памагаць трэба. Гадаўё, нашых людзей найлепшых вынішчаюць. Каб мы верх узялі, дык табе ці каму другому ня трэба было-б пабандыцку ноччу падпаўзаць, а калі дзе які мярзотнік галаву падняў-бы, дык можна было-б яго легальна. Кумекаіш?

- Ага.

- Ну дык як?

- Падумаю.

- Падумай.

- А ці прынімаюць яны цяперака? - спытаўся Антось.

- Ні чуваць каб... Як будуць, накажу.

- Добра.

Падгайскі ўстаў, выйшаў за дзьверы й па нейкай хвіліне вярнуўся. На стале перад Антосем палажыў «Беларускую газэту».

- Сьвежая?

- Ага.

- Ведаеш, што я пабеларуску слаба чытаю. Пры бальшавікох трохі наламаўся.

- Дык як умееш э, памаленьку, - адказаў аграном.

«Вялікая перамога нямецкай зброі» - паволі й з натугай прачытаў дзяцюк.. - Усё пра вялікія пірамогі. Нешта ці ні захрасьлі яны пад Масквой. І тут многа прапаганды, - спасьцярог Дзяркач.

- Вядома-ж, усей праўды ня скажуць. Але як паслухаеш з двух бакоў,дык сярэдзіну можна выбраць.

- А ты чуеш з другога?

- Чаму-ж не, - сьціпла адказаў Падгайскі. - У мяне-ж радыё ёсьціка.

Антось дапіў сваю гарэлку, закусіў агурком.

- Як гэта ёсьць? Загадалі-ж здаць, здаецца... А ты што, не баішся? Ты галасьнік маеш?

- Галасьнік. Адно здаў і квіт маю. А хто там знаіць, што ў мяне два былі...

«І праўда, - думаў Антось, - проста й спрытна. Улада ні прычэпіцца, бо радыё здаў».

- Дык можа паслухаем?

- Падгайскі выцягнуў кішэнны гадзіньнік, зірнуў на яго.

- Яшчо Лёндан навінаў папольску ні пірадаець, ажно за гадзіну. А Маскву які чорт будзіць слухаць. Пазьней.

- Дык ты кажаш, што зь Лёндану папольску? Як-жа яны, гэтыя пшэкі чэрці туды залезьлі?

Аграном адказаў не адразу. На ягоным шэрым твары ледзь заўважна зарысавалася грымаса.

- Ты, Антось, як цябе знаю, кемлівы й спрытны, а гэттака як дзіця ўсёроўна. А чаму-ж зь Лёндану ні маюць папольску гаварыць? Англія, сам знаіш, хаўрусьнік Польшчы. Там і ўрад польскі, што адгэтуль уцёк, сядзіць. Народ-жа польскі пад акупацыяй...

- Ну добра, добра, я пасьмяяўся, - спыніў Антось Кастуся. - Ведаю сам. Толькі раскажы што яны праз радыё гавораць. Ці гэтапраўда, як тутака пшэкі раструбілі, што Сікорскаму Сталін у Расеі пазволіў польскую армію зрабіць?

Падгайскі ўстаў.

- Хочаш чаго лепшага піракусіць? Кілбасы можа? А гарэлкі ў мяне ёсьціка, ні бядуй. Нямчура прыпрэцца, каб ім то тога, то гэнага, дык гэтага дабра прывалакуць.

- Ты-ж знаіш, што я за гарэлкай ні прападаю. А піракусіць? У цябе-ж кілбаса добрая, дык давай, - усьміхнуўся Антось.

Калі Падгайскі нарэзаў пахучай вэнджанай каўбасы, зноў выпілі й закусвалі. Аграном паволі, паясьняючы пра дыплямацыю, расказаў Дзеркачу пра ўмову Сікорскі-Майскі, на аснове якое творыцца ў Савецкім Саюзе польская армія для змаганьня зь Гітлеравай Нямеччынай. Ён адказаў на некаторыя Антосевы пытаньні і ў тых адказах назваў людзей і факты, пра якія ніяк ня мог ведаць чалавек, што ня слухаў навінаў з варожага да Нямеччыны боку. І слухаючы агранома, Антось аж зьдзівіўся, што ён, - дарэчы, як і бальшыня мясцовых, - прост-напраст заглох, часта не разумеў таго ці іншага

сьвету, пра які гаварыў Падгайскі. Ледзь не два гады савецкае акупацыі, бесьперапынная барабанная савецкая прапаганда зрабіла сваё. Чалавек накш думаў. Перакруцілі, сьвет дном уверх у галаве перакулілі. Чалавек забыўся як тыя ў вольным сьвеце думаюць, якімі катэгорыямі разважаюць.

Пасьля Падгайскі завёў Антося ў сваю бібліятэку. Дзьве сьцяны полак былі застаўлены кніжкамі, пераважна з аграноміі, аж у чатырох мовах. Побач іх вялікае месца займала клясычная літаратура, у арыгіналах і перакладах. Багатай была й сэкцыя ў беларускай мове. Зь ніжняй полкі ў куце Падгайскі адлажыў набок некалькі кніг. Паказалася маляваная на зялёны колер кардона. Аграном лёгка папхнуў кавалак яе і ў сьцяне паказаўся радыёпрыёмнік. Гэта быў адзін з апаратаў фірмы Тэлефункэн, каторыя Антось некалі бачыў у краме ў Глыбокім. Але не па ягонай кішэні той апарат быў. Падгайскі ўключыў радыё. Пасьля шуму й трэску, - былі гэта, вядома, кароткія хвалі, - пачуўся стук, як быццам хто дзесьці лёгка па бочцы стукаў, аж чатыры разы. Гэта паўтарылася яшчэ два разы. Выразны голас папольску аб'явіў: «Тут гаворыць Лёндан. Перадаём апошнія навіны зь БіБіСі. Учора, у сувязі з апошнім асьветчаньнем прэзыдэнта Рузвельта, прэм'ер-міністар Чэрчыль заявіў...»

Голас далятаў, здавалася, зь недасягальнае адлегласьці, быццам марскімі хвалямі, то прыбліжаўся, мацнеў-магутнеў, а пасьля зусім кволенькі, ледзь-ледзь ліпеў. Агулам чуваць было ўсё. І апавядаў пра баі на морах і акіянах, у краінах заходніх і ўсходніх, гаварыў пра палітычна-прапагандовую вайну. А пасьля галоўных навінаў нямала ўвагі прысьвяціў падзеям у акупаванай Польшчы. У пяршыню пачуў Антось і новае слова «гетто» ў адносінах да Жыдоў у Варшаве. Пасьля праслуханьня навінаў Кастусь старанна засунуў назад зялёны кардон, які залажыў кнігамі.

- Ну от, братка, чуў?

- Ну ты й маладзец! - адказаў Дзяркач. - Дык навошта табе плёткі слухаць, калі з таго боку чуеш?

- Ды чаму-ж... Яно-ж варта слухаць адно й другое...

- Цяпер буду знаць каго за язык пацягнуць калі захачу праўды даведацца.

- Толька-ж, братка, глядзі ні прагаварыся, хаця-б Паўлоўскаму, - перасьцярог аграном.

- Ты што, жартуеш?

Антосеў зрок наліўся дакорам.

- Выбач, я ні падумаўшы сказаў, - спахапіўся Кастусь.

Прасядзелі за поўнач. Паволі, упоцемку, ледзь ня вобмацкам выбіраючы аднаму яму вядомыя сьцежкі, да свае Ніны, пад нагрэтую коўдру Антось сьпяшыў. На чыгуначнай станцыі Гацяў цьмяныя сьвётлы змагаліся зь цемрай і станцыя, як-бы ўсё на сьвеце мірна й нармальна, жыла сваім руплівым жыцьцём. Марасіў дробненькі дожджык і з захаду дзьмухаў лёгкі ветрык. Антось думаў і перадумваў пра той заморскі «варожы» сьвет «плютакратаў і падпальшчыкаў».

Трэба будзе, устаўшы заўтра раніцай, усё новапачутае ў лад прывесьці, падсумаваць, абмяркаваць, пражваць ды мо неяк і выкарыстаць...

17

Гучна-гарластае «Москаў капут!» хрыпам захрасла ў выцьці вясеньняга ветру й сьнежнае віхуры ды пасьля зусім заглохла ў гуле гарматаў першай вялікай бітвы, каторая «Даёш Берлін!» нарадзіла. Вестка пра першую вялікую паразу «Дранг нах Остэн» маланкай абляцела захутаныя ў глыбокія сьнягі палі й гасподы, закаваныя ў лёд воды ды перабралася на захадні бок фронту. Зусім абыякавы да лёсу чужой і няпераможнай дагэтуль арміі селянін зьдзіўлена ківаў галавой, поўны недаверу.

- Такая сіла, Божа мой! А глядзі во!

Наўздагон нечаканай вестцы перапаўзьлі на захадні бок агнявое лініі й дэталі вялікае бітвы. Выявілася, што шчодрыя дый ці не найбольшыя заслугі ў тым дужаньні прыпісваліся гэтта ведамаму яшчэ з налеонаўскіх часоў генэралу Марозу. Гэта ён, казалі, а ня хто іншы спараліжаваў магутную ваенную машыну, гэтак дбайна сплянаваную й выпрадукаваную там, дзе некалі змайстравалі вялікую Бэрту.

Зусім накш выглядаў вялікі паядынак асілкаў паводля галасоў з таго боку, што апавядалі пра яго па радыё. Ішло тое тлумачэньне, вядома, калі не ад самой «Стаўкі» дык ад прапаганднага палітадзьдзелу. Генэрала Мароза зусім ня згадвалі, быццам ён у гэнай

мясасечцы ўдзелу ня браў, затое перамога, як мага пераўвялічаная, прыпісвалася заслугам «добліснай» Чырвонай арміі дый перадусім ніколі ані на каліва «непамыльнаму й геніяльнаму айцу народаў», таму самаму, каторы на працягу апошніх пару гадоў вялікі хаўрус із «саюзнай Вялікагерманіяй» дзяржаў і народнае дабро дзень і ноч туды пхаў. Такой інтэрпрэтацыі вялікай бітвы денэрал Мароз, з прычыны натуры свае, ніяк ня мог запярэчыць, але гэта не азначала, што маўчаньне ягонае знакам згоды было.

Няпрытарнаванай да зімовай вайны зброяй надта не наваюеш, дый акалелыя ўжывальнікі яе мелі-б мець цёплыя плечы й непадмарожаныя канцавіны. І тады пільны зрок нямецкіх ваенных верхаводаў спыніўся на мясцовых жыхарох і спасьцярог кажухі. Уміг нарадзіўся кліч: кажухі на ратунак! А мясцовыя, як рэха гэнаму клічу: кажухамі адбой генэралу Марозу!

Апрануўшыся ў адопаведную канцылярную хворму, загад разросься й расплыўся па занятай зямлі. Ніякае ўзнагароды за кажухі акупант ня суліў. Вынікамі таго найлепшыя й найнавейшыя кажухі з рэкорднай хуткасьцю зьнікалі ў зусім тайных і бясьпечных месцах, быццам-бы да часу, пакуль распагодзіцца. Народ пераапранаўся ў латанае, абношанае-абшмулянае стар'ё.

Нашто ўжо кемлівы й выпрабаваны селянін, але гэтта, казалі, крыху падшванкаваў, бо ўсё-ж даўся чужынцу скубануць. А на пацьверджаньне ў Літоўцах апавядалі, што быццам ня хто іншы, як сама дападлівая пахатуха Кмітава Аўдоля бачыла, як «на хронт» кажухі вязьлі. Ляцеў, бачыце, зусім нізка-нізенька пузаты нямецкі самалёт якраз тады, як Аўдоля не за чапялу ці качаргу трымалася, а выбегла на двор паглядзець чаго доктараў сабачонак упрысядкі аж разбрахаўся. І трэба-ж... - Павер, мілая ягодка мая, гэта-ж ляціць, каб яго пранцы, гэты іраплан гэтак саўсім нізка. Дык віджу, матляецца так, высунуўшыся праз вакно, рукаво ад кажуха. Гэта-ж Неміц, знаеш, на хронт назьбіраныя нашы кажухі павёз.

Разумнікі кпілі, што акупанту ўдалося надта мала, дый то старых і палатаных кажухоў вымантажыць і што гэна стар'ё нянадта пасобіць «Дранг нах Остэн» пхнуць.

Янук і Дуня ўжо добра пратоптанай лясной сьцежкай са школы дадому йшлі. На заходнім небакраі вынырнула з-за хмараў сонца, уміг

ператварыла сьнег і вакольную пушчу ў яркую, зьзяючую, цяжкую на вочы бель. Мароз прыемна скрыпеў пад падэшвамі. Сьцюжа праймала Янука праз палатаную, парудзелую тужурку-абносак. Адно прыемным цяплом трымалася на галаве паліняная вушанка. «Як разумна зрабіў, - думаў юнак, - што накруціў на ногі ў дзіравыя боты болей анучаў». Забясьпечаная некалі камбедам Дуня Макатунішка вызірала зарумяненым марозам носікам з башлыка цёплай, суконна сіняй тужуркі. А на нагах мела цёплыя валёнкі.

У Януковым уяўленьні стаяў гісторык Сабалеўскі. - Для Палякаў, - тлумачыў настаўнік, - Люблінская вунія трыюмфам завяршыла дзясяткі гадоў натужанай працы іхнага клеру, магнатаў і шляхты. Як пасьля народ беларускі агледзіўся, для яго тая-ж вунія, прымусам яму накінутая, дамавінай сталася. Яна шырака адчыніла Палякам дзьверы да калянізацыі нашай бацькаўшчыны. Па ўсей зямлі нашай паступова й няўхільна пачалі гаснуць агні беларускай культуры, самастойнасьці, нацыянальнага жыцьця, якое тады было...

«Дамавіна». Слова настырліва паўтаралася, пагражала.

Вось дзе й калі яно пачалося. Адчыніліся вочы, перад якімі вырастала трагічная панарама ўпадку вялікага народу. Відаць, што заходнія хіжакі доўга й старанна плянавалі й капалі магілу, рыхтавалі дамавіну. Дый ці толькі заходнія? Сабалеўскі-ж адно цяпер да Люблінскае вуніі дабраўся. А там далей з усходу дзяржыморда неўзабаве абаронныя ўмацаваньні Вялікага Княства Літоўскага праломіць. Пад нагайкай «чужака-дзікуна» паўстане нязносны прыгон і павядуць на сьмерць гордых і непакорных найлепшых сыноў і дачок.

- А чаго-ж ты, Янучок, так задумаўся?

Заўсёды прыемны й мілы голас Дуні, тут-жа праз вушанку, вярнуў яго да рэальнасьці. Дзяўчына ўзяла яго пад руку, прыхілілася, а васількі вачаняты із затоенай іскрынкай гарэзьлівасьці сквапна шукалі на Януковым твары прычынаў ягонай задуменасьці.

- Ды нічога, - буркнуў адчэпнага Янук.

- Ну скажы, скажы пра што думаў! - налягала дзяўчына.

Блізка былі ейныя вусны, тыя самыя, каторыя некалі ў канюшыне яго спакусалі. Але цяпер яны ня прынаджвалі, а быццам загадвалі.

- Думаў аб Люблінскай вуніі, - адказаў Янук. - А яшчо болі пра дамавіну.

- Ха-ха-ха! - разрагаталася дзяўчо. - А я думала, што ён... А чаму пра дамавіну?

- Ну знаеш як Сабалеўскі казаў. Ты-ж на лекцыі была, мусіць-жа слухала.

- Янучок, Янучок, я-ж табе казала, што як будзеш надта многа думаць, дык скора састарэешся.

Голас лёгкі, жартаўлівы, тварык ясны, марозікам зачырвонены-прыкрашаны. Гэта ня тая частая надзьмутасьць і ня колкасьць у вачанятах-васількох. Здаецца, што знаеш яе ўсю, наскрозь, але вось адкрываеш новае ў наступным павароце...

- Ты, Янучок, ня чуў колькі дзіравы шляхціц кажухоў сабраў?

Ад дамавіны да кажухоў. Зручны скок. Цяперашняе, калі навет і ня грэе, дык усё-ж цела бліжэй чымся халодная, даўная, з выразным прыціскам Сабалеўскага, дамавіна. Роўным скрыпам гаманіў пад нагамі мароз, брылянтамі расьцьвіталі на галінах азяблыя сьняжынкі. Абліваючы ягоны твар цёплым дыханьнем, штурхала ў плячо Дуня.

- Ні знаю. Відзіў, як зь нейкім Немцам на развалках жабраваў. Да нас заходзіліся, фігу дасталі. А навошта мне ведаць?

- Я ўчора да цёткі Вульляны забеглася, маці мяне была па нешта паслала. Казала Вульляна, што ад яе адзін кажух вымантажылі. Ды знаеш як? Прывёз ёй дзіравы шляхціц паштоўку, што праз Чырвоны Крыж прыйшла, пра ейных сыноў-галубкоў.

- Што ты кажаш? Дзяцюкі жывыя, абое?

- А як-жа, жывыя. Дый разам яны сядзяць, значыцца ў адным абозе. Дык Вульляна так узрадавалася, - ні жарцікі гэта, яна-ж вочы сабе за гэтыя гады выплакала! - што чаго таго Немца й дзіравага шляхціца з радасьці ні расцалавала. Таму, мусіць, лёгка было ад яе кажух вымантажыць.

- Няўжо-ж...

- Казала, што кажух гэны Паўлюкоў, ужо падношаны. Наце вам, кажа, кажух майго сына-галубка, ніхай вам Бог здаровейка дасьць за такую вестачку.

- А ты паштоўку гэну чытала?

- А як-жа. Зьверху нейкі «сталяг» і нумар яго, гэта значыць абоз палонных зазначаны. А пасьля якіх пятнаццаць слоў усяго, мусіць болей пісаць ні даюць. «Дарагая мама. Мы твае сыны Антон і Паўлюк

цяпер у лягеры пленных. Добра маемся, здаровыя, есьці досіць. Ні бядуй, вернемся» Дый падпісаліся. От і ўсё.

- І напісана, што «добра маемся»?

- Ага. Я тры разы перачытвала, а Вульляна дык напамяць знаіць.

- Можа так добра маюцца, як гэтыя ў Бярэзьвечах?

- Што ты! Ні дай, Божа! Кажу, што чытала. Ды гэтыя-ж савецкія, дык іх голадам мораць і страляюць, а яе-ж сыны былі ў польскай арміі. Казаў яшчо дзіравы шляхціц Вульляне, што польскія палонныя ў нямецкіх лягерах каторыя, дык ім пасылкі зь ежай Чырвоны Крыж з Англіі прысылаіць...

- Дзякуй Богу за гэта. Кажаш, пішуць, што вернуцца?

- Ага, сама чытала.

18

Пазіраючы на «дзіравага шляхціца» й Левандоўскага, што сядзелі на лавах пры стале ў Нінінай хаце, Антосю Дзеркачу навет ня трэба было ўгадваць, што яны, пэўне-ж, «ні так сабе ходзяць». Без патрэбы не завіталі-б да яго ў гэты засьнежаны пасьлякалядны дзень. Прыехалі собскай брычкай Паўлоўскага каля абеду. Значыцца, солтыс мусіў у Гаці паехаць, забраць новага фэльдфэбэля-каманданта, што на месца Бронхэра прыйшоў. Як і папярэднік, гэты таксама фолькдойчам быў, папольску нядрэнна гаварыў, дзесьці з Памор'я паходзіў.

Чаго яны прыехалі? Хутка шыла зь мяшка вылязе, разважаў Антось. А вылезьці яму паможа вунь тая пляшка сівухі, якую Антось на стол паставіў. Хоць сам на гарэлу не ляцеў, жыцьцёвая практыка падказала, каб яе на ўсякі выпадак трымаць, як мясцовыя казалі, - «каб калі ад чарцей адкупіцца»...

Ніна ўвіхалася ля пліты, пад якой буйным агнём заняўся хвораст. Жанчына вялікімі скрылямі рэзала сала, што вось неўзабаве засквірчыць на патэльні, прыемным пахам будзе дражніць моздры. Ад таго часу, калі Ніна й Антось цудам вырваліся з бальшавіцкіх лапаў і вярнуліся дамоў, яны жылі разам, загаспадарыліся. Антось узяў ад бацькі невялікае сьвінчо, якое пры доглядзе руплівай гаспадыні выросла на добрага парсюка. Перад Калядамі яго закалолі й такім

чынам завёўся рэдкі ў гэны ваенны час «шпэк», за якім бесьперапынна валачыліся па вёсках чужыя прыблуды.

- Але й баба ў цябе прыгожая! - усклікнуў Левандоўскі й зусім бясцырымонна прыглядаўся жанчыне.

Ніна належала да тых вясковых красак, якія часта ў зарослым лебядой агародзе не дагледзіш. Яна ўвыдатнялася сьціплай, упарадкаванай, утрыманай красой. Не дарам-жа некалі Паўлюк Бурак на яе палакоміўся. Колькі разоў мяркаваў Антось як выглядала-б жанчына, калі-б прыаздобіць яе ў нешта запраўды дарагое, зьзяючае, скажам у які які цэнны шоўк ці дыяманты. Адылі бачыў, што што прынаднасьць ейная ў сьціпласьці ляжала. Недарагое й простае, - трант ці неданосак, - умела перашыць, дапасаваць да свае фігуры, якую запраўды маглі-б песьнямі вялічаць паэты красы. Жанчына зь дзявочаю постацяй, яна ўсё яшчэ пра першае дзіця марыла. Схавайцеся перад ёю непадстрыжаныя авечкі: хвядосавы манькі, бруніські, макатунішкі. Не дарма за ёю бесьперапынна дзяцюкі цікавалі. Зірні хаця-б на гэныя пушыстыя мяккія каштанавыя валосы, ружовай касынкай перавязаныя ды зірні на румяныя шчокі ці вусны, быццам для пяшчоты створаныя. А ў тых сіня-шэрых, вялікіх і праніклівых вачох часамі паказвалася цьвёрдасьць, мяжуючая з крыўдай. Гэта, пэўне-ж, спадчына цяжкое дарогі, якая, калі-б ня перашкодзіла вайна, прывяла-б праз бальшавіцкія вязьніцы й канцлягеры да магілы. Але на зьмену цьвёрдасьці прыходзіла лагоднасьць і тады Антось пазіраў у вочы каханай жанчыны й жыў асалодай гаючага супакою.

Пакуль Дзяркач удумках зарэагаваў на словы новага каманданта, той борзда ўстаў з лавы, падыйшоў да Ніны ля прыпечку, правай рукой прыгарнуў яе да сябе, нахіліўшы сваю галаву да ейнае. Чорныя вусікі апынуліся зусім блізка Нініных вуснаў.

- Гавару, што пані вельмі прыгожая. Як завешся?

Такое неспадзяванае панібрацтва зьдзівіла гаспадыню, але яна зусім не зьбянтэжылася. У сваім жыцьці, бяз сумлеву, бачыла ці мала нахабнікаў і гэты чарнавусы ня быў навіною. Яна спрытна крутнулася, вышмыгнула з учэпістай паліцыянтавай рукі. У левай руцэ трымала кавалак сала, а ў правай вялікі нож і пазірала Левандоўскаму проста ў вочы.

- Паночак, вы што гэта? Рукі пры сабе дзяржыце!

Голас цьвёрды, войстры. Зірнула на Антося і ў гэным позірку, здаецца, дакор: паглядзі як ты на такое дазваляеш!

Антось зьбянтэжыўся. Як ты спыніш дзікуна, калі ён - улада, ды ў тваей хаце да тваей каханай дабіраецца?

- Але-ж пані мае й характар, фу! Агонь! - зьдзівіўся, як апечаны, паліцыянт. Ён адыйшоўся ад Ніны й пачаў спацыраваць па хаце. Наступіла нязручнае маўчаньне, адно Ніна, уміг паспакайнеўшы, падыйшла да прыпечку і ўзялася за перапыненую паліцыянтам работу. Дзяркач мяркаваў, што не да яго належала ініцыятыва гутаркі, таму ўважна прыглядаўся новаму камандану.

Быў гэта чалавек сярэдняга росту, шчуплы, з вайсковай вытрымкай і крокам, які вандраваў, відаць, шматлікімі й далёкімі дарогамі. Ведаў, добра ведаў Антось гэты крок. Ды ён-жа й сяржантам, ці, як панямецку, фэльдфэбэлем быў. Ці мала мог новабранцаў паганяць. З выгляду яму трэба было саракоўку, - дадай ці аднімі год, - даць. Пад носам разьмясьціўся цёмны паясок каротка абстрыжаных вусаў, а на дробным твары найбольш рухлівымі былі вочы. Яны рэдка спыняліся, здаецца, на адным пункце. І выглядала, што рэдка калі на цябе пазіралі, а заўсёды абміналі твае вочы. Спад чорнае пілёткі тарчэла густая чорная грыва валасоў. На гэтым шчуплым, худаватым чалавеку гладка ляжаў добра дапасаваны чорны мундзір. Відаць, што камандану на добрага краўца пашанцавала. На нагах у яго былі абшытыя скурай, зграбныя, лепшай якасьці валёнкі, магчыма, што «трафейныя».

У яго жэстах, паваротах і гутарцы вычуваўся аўтарытэт, упэўненасьць у сябе й няведама колькі да гэтага спрычыняўся ў чорнай кабуры Люгер.

- Пан солтыс расказаў мне пра вас, - гаварыў Левандоўскі, спацыруючы. Выцягнуў зь кішэні залатую папяросьніцу, паважна, быццам нешта абмяркоўваючы, выняў папяросу й круціў яе між пальцаў. Пстрыкнуў запальнічкай і зацягнуўся першым глытком табачнага дыму. - Так, пане, я вас крыху знаю. Вы дэзэртыравалі з польскага войска?

Пытаньне зусім неспадзяванае. Левандоўскі спыніўся насупраць Антося, а рухлявыя вочы затрымаліся на Дзеркачовай барадзе.

- Ні дызыртыраваў я, - спакойна адказаў Антось. - Проста ў войска ні папаў.

- Гэта як так?

- Падарозе ў войска згубіўся, - тлумачыў дзяцюк.

- Гэта значыць, што вы за Польшчу не хацелі ваяваць, калі вас мабілізавалі? Ці-ж ня так?

Цяпер камандант пільна ўзіраўся ў Антосеў твар. Дзяркач, быццам тое не да яго адносілася, тупа пазіраў на гэтага чалавека ў чорным, адгадваючы што можа скрывацца ззаду за такімі пытаньнямі. Ён нічога не адказаў на апошняе пытаньне й Левандоўскі падыйшоў бліжэй. Ад яго несла адэкалёнам.

Пах скварак і яек квяліў насы. Ніна застаўляла стол пасудай, прынесла хлеб, шыткаваную капусту, агуркі.

- Запрашаю за стол, - зьвярнулася яна да камандантa й солтыса.

Не чакаючы прынукі, Паўлоўскі падсунуўся да краю стала, Левандоўскі зірнуў на недакурак у руцэ, падыйшоў да печы і ўкінуў яго ў прысак, а пасьля ўсеўся ля стала пад абразамі. Антось адразу прапанаваў выпіць. Запрашаць два разы ня трэба было. Левандоўскі піў нагбом, нават ня моршчачыся для чужога вока. Самагонку пахваліў, але ня пытаўся чыей была прадукцыі. Надзіва маўкліва трымаўся Паўлоўскі, што здалося Антосю крыху нязвычайным.

- Дык ня хочаце мне сказаць? - зноў спытаў Антося камандант. Ён са смакам жваў уложаную ў рот вялікую скварку й напхаў туды шыткаванае капусты. Вочкі бегалі па вянках цыбулі на жэрдках пад столяй, папрыгожа засланым, із стосам падушак, саматканым дываном ложку ды па Нініных грудзёх. Гаспадыня якраз да стала прысела.

- Што сказаць? - няўцямна перапытаў Антось.

- Ці вы хацелі, ці не хацелі за Польшчу ваяваць?

Небясьпека. Спрабуй адгадай куды гэты няведамы чалавек вядзе. Ці спрыяе ён больш Немцам, ці польскаму падполлю? Трэба будзе Падгайскага й Паўлоўскага распытацца. «Чэрці, чаму мяне да гэтага часу не паінфармавалі?» - злавіў сябе ў думках Антось. - «А гэты во кручкі закідаіць, злавіць мяне стараецца».

- Я думаю, што пан каміндант ужо ад солтыса пра гэта знаіць, - асьцярожна адказаў Дзяркач.

Левандоўскі трымаў у руках усе карты. Пра Антося быў нядрэнна паінфармаваны, а Дзяркач чуўся, быццам у тупіку. І вінаваціць некага было. Да агранома трэба было даўно схадзіць, распытаць і разьведаць хто, што й дзе робіць. Нядбайла, у Нініных абдымках пра сьвет

забыўся. Гэта ня зусім так. Але рэальнасьць у чорным мундзіры за ягоным сталом сядзела, яго самагонку піла й намагалася ў нейкую, няведамую яшчэ, пастку загнаць. Цьфу, чорт лазаты!

- Так, ня скрыўлю душой, пане Дзяркач. Пан Паўлоўскі казаў мне пра факт, а ня прычыны. Дык можа вы дапоўніце?

- А калі не? - упёрся зрокам у чорныя вусікі Антось.

На шчацэ побач вусікаў ледзь зьявілася зморшчына, магчыма адзнака нецярплівасьці. Камандант напорна ўзіраўся ў Антося, але сам выдатна маскаваўся, бо з твару ягонага цяжка было дагадацца пра думкі. Пустая маска бянтэжыла.

- Я вам магу загадаць, - ледзь усьміхнуўся начальнік.

Антось трымаўся спакойна. Ударыўшы яго па плячы, камандант разрагатаўся.

- Ня бойся, пане Дзяркач, жартую. От спалохаўся. Завіталі-ж мы да свайго чалавека, праўда ці не, пан солтыс? Пасядзець, пагаманіць, ну й пазнаёміцца. Ці-ж гэта, пане Дзяркач, дрэнная рэч, калі сам камандант паліцыі вам гонар робіць, у хату загляне?

Голас быццам сяброўскі, але напружаны. Асьцярожна!

- А гэта-ж нам гонар зрабілі, праўду кажаце, пан каміндант, - сказала Ніна проста й натуральна, пагасьціннаму. Левандоўскі ўсьміхнуўся да яе.

- От бачыце, пане Дзяркач, і вашая пані са мной згаджаецца. Асьцярожнасьць - залатая рэч, - прадаўжаў Левандоўскі. - Бачу, што цяжка за язык вас пацягнуць, лішняга слова ня скажаце. І цяпер у гэты момант вы пэўне абмяркоўваеце прычыну, чаму мы да вас заглянулі... Няпраўда?

Камандант спыніўся, роўна й напорна глядзеў Антосю ў вочы. У тым позірку было нешта няпрыемнае, халоднае, як коўзкі рух гадзюкі. Гэтак вось, бязь ніякае эмоцыі, звычайна разглядаецца нейкую рэч, няжывы аб'ект.

На дварэ зазьвінеў ланцуг і завішчэў Ромак. Ці ня пах скваркі квяліў ягоны нос.

- Ніна, ты Ромку сягоньніка карміла?

- Ага, раніцай.

- Дык чаго ён вішчыць?

- Можа пабегаць прырупіла?

- Ідзі во, кінь яму якую бульбіну ці кавалак хлеба.

- Ладнага сабаку маеце. Як завуць? - спытаў Левандоўскі пасьля таго як Ніна выйшла.

- Ромак.

Камандант пазіраў на Дзеркача, спадзяючыся пачуць пра «ладнага сабаку» больш, але Антось маўчаў.

- А чаму ты сягоньня вады ў рот набраў? - зьвярнуўся Дзяркач да «дзіравага шляхціца».

Ніна вярнулася ў хату й прысела каля стала.

- Набраў, ці ні набраў, - пачаў Паўлоўскі, - а калі мне трэба дык ніхто мяне на дробную манету ні разьменіць, сам знаіш. От быў у мястэчку, пан каміндант захацеў праехацца, ну от і да цябе заехаліся.

Было ўсё гэта сказана зь вялікай натуральнасьцю й самаўпэўненасьцю. А яшчэ важней тое, чаго «дзіравы шляхціц» не сказаў. Напрошвалася галоўнае і асноўнае пытаньне, на якое, памяркаваўшы, Антось не адважыўся. Лепш памаўчаць, пачакаць.

- Пэўне-ж, вы падазраеце, - быццам у вадказ на ягоную думку пасьпяшыў Левандоўскі, - што для прыезду да вас у нас мусіла быць нейкая надзвычайная, страшна важная прычына. А прадстаўце сабе зусім адваротнае, скажам, што ніякай такой важнай прычыны і заваду ні было. Як тут пан солтыс проста сказаў: «пан каміндант захацеў праехацца», ды ўсё. Ці можа вы думаеце, што я проста ня мог захацець праехацца? А ці от так падарозе да вас ці да каго іншага забегчыся нельга, каб людзей пазнаць, га? Ну як вам здаецца?

Літроўка апусьцела напалову. Антось усьміхнуўся з такога павароту камандантавай гутаркі ды ўзяўся наліваць чаркі.

- Пан камандант ёсьць гаспадаром свайго часу й калі яму захацелася праехацца то няхай сабе езьдзіць на здароўе.. А цяпер можа за гэта і вып'ем? - прапанаваў Антось, падняўшы чарку.

- За камандантава здароўе! - падтрымаў солтыс.

Выпілі.

- Закусвайце, калі ласка, пан камандант, - прапанавала Ніна. - Бярыце, калі ласка, - падсунула яму яечню.

Камандант узяў скварку на відэлку, уважна ёй прыгледзеўся і ўлажыў яе ў рот.

- Мне здаецца, - і вы з гэтым, пане Дзяркач, бяз сумлеву, згодзіцеся, - што для мяне, як каманданта паліцыі, вельмі важна пазнаць людзей, дый ня толькі ў мястэчку, але й навокал. Ці-ж ня так?

- Але.

- Ну дык вось. Я бачу, што калі-б вы былі на маім месцы, дык можа таксама думалі-б?

- Але.

- Вы-ж, пэўне, знаеце, пане Дзяркач, што майго папярэдніка нехта замардаваў і што яго, таго забойцы, не знайшлі. А як вам здаецца, пане знайсьці трэба, ці не?

- Гэта дзела ваша, - проста адказаў Антось.

- Ага, ну бачыце. А калі гэта мая работа, дык ясна, што я яе пастараюся сумленна й добра выканаць. Ну але знаеце, я такі чалавек, што от люблю з разумнымі людзьмі параіцца, як і што рабіць. Давайце мы цяпер і падумаем над гэтым супольна. Значыцца спачатку возьмем факты: чалавек, каторы Бронхэра забіў, не пакінуў па сабе ніякіх сьлядоў. Усё шыта-крыта. Немцы навет стараліся сабак па сьлядох пусьціць і то нічога ня выйшла.

Сказаўшы гэта, паліцыянт упіўся рудымі вачмі ў Антося. Дзяцюк добра вытрымаў гэткі наступ.

- Сабакі, кажаце, па сьлядох ні знайшлі? Ай-я-яй! Можа гэныя сабакі ні знаюць як шукаць?

- Мяне запэўнілі, што сабакі надта добра вымуштраваныя, але-ж я там ня быў. Адным словам, забойца як пад зямлю кануў, а цяпер ты шукай яго. І ўсё-ж знайсьці трэба.

У хаце было ціха, адно цікаў на вакне малы будзільнік. Антось мяркаваў, што паляіцыянт тропіць так, як яму падказвае ягоны, паліцыянтаў абавязак. Няхай сабе. Ні такі ён, Антось, дурны, каб дацца гэтаму чужому прыблуду на які хітры кручок.

- От як-бы вы, пане Дзяркач, калі-б вы былі на маім месцы, пачалі расьсьледаваць? Падумайце.

- Ня ведаць мне, - ціха адказаў Антось, - як рабіць паліцыйную работу. Знаеце самі, панок, што я - цёмны мужык, дык дзе мне там у чым мудрым разьбірацца.

- Ну гэта ўжо вы крыху ў перабор. Па сьвеце-ж бывалі, у войску былі, у вязьніцы таксама, дык вунь чаго на сьмерць вас не загналі. Дык галаву, відаць, маеце.

Антось уважней «дзіраваму шляхціцу» прыгледзеўся. Той варушыў вуснамі, відаць, што ня мог скваркі пережваць, бо кагадзе на зубы скардзіўся. Быццам злоўлены, спадылба зірнуў на Антося й неяк

надта-ж скора вочы ўбок адвёў. Здалося Дзеркачу, што ў тых вачох пробліск віны спасьцярог. Ды ці не памыліўся? Дроб часіны. Мог памыліцца. А знаў-жа гэтага чалавека, як разьдзетага. Нешта крылася за гэтым прыездам. Звычайна гаваркі й фанабэрысты солтыс сяньня вады ў рот набраў.А гэта-ж яму нялёгка далося. Любіў язык у падарожжа з прывязі спусьціць, ой як любіў! А гэтта... Трэба быць асьцеражней... А можа Паўлоўскі спэцыяльна маўчыць, каб чаго лішняга не сказаць?

- Вы гэтага самага Бронхэра добра зналі? - проста спытаў Антося Левандоўскі.

Антось скончыў жваць скварку, паволі абцёр рукою вусны, зірнуў на каманданта, каб што вычытаць на ягоным твары. Там як-бы распагодзілася. Здаецца, што пытаньне сяброўскае.

- Знаў, чаму-ж не... Лясьніком быў, дык усе яго зналі. Здалёку, значыцца...

- А як да яго людзі, як да лясьніка, адносіліся?

Антось зноў зірнуў на паліцыянта, але не сьпяшыў з адказам. Запавольваў наўмысна.

- Гэта мяне пытаецеся? - перапытаў.

- Так, вас.

- Ну дык як вам гэтта сказаць, ні знаю. Людзі, як да лясьніка, значыцца служачага... А каторы служачы, дык ён-жа, вядома, свайму пану служыць. Дык от так і адносіліся, значыцца...

- Як? Добра, ці дрэнна?

Пытаньне было кінута зручна. Яно, гэтае пытаньне, здаецца такое нікчэмнае й звычайнае, але да чаго яно вядзе? Быў Дзяркач ужо ў руках добрых інквізітараў і ведаў небясьпеку аднаго намёку, аднаго неасьцярожнага слова, навет позірку. Найлепш паволі языком баранаваць, старацца як мага праціўніку наперад забегчы.

- Знаіця, ні нам яго судзіць. Спытайцеся, каго хочаце...

- Я вас пытаюся, - насядаў Левандоўскі.

- Ну дык я вам скажу гэтак: ён мне мяжы ні пірааряў, куры ягоныя мае лехі ні падзерлі, ані за дзеўку якую мы зь ім узагрудкі ні браліся...

- Што гэта значыць? - спытаў камандант солтыса.

- Пане камандант, гэта тут у нас так гавораць. Значыцца калі чалавек табе ворагам ня быў.

Фольксдойч хітравата ўсьміхнуўся, палез у папяросьніцу, прыкурыў. На твары ягоным зьявіўся цень.

- Ну а калі камандантам паліцыі яго паставілі, то таксама вам ворагам ня быў?

Антосеў твар наліўся нявінна-наіўным зьдзіўленьнем.

- Што гэта такое вы пытаецеся? А чаму ён меў мне ворагам быць? Гэта што, я якія парахункі зь ім меў мець, ці абакраў каго?

Гаспадароў голас гучэў абурэньнем. Камандант зварухнуўся на лаве, зірнуў на Ніну й «дзіравага шляхціца», усьміхнуўся.

- Ну што вы, пане Дзяркач, хвалююцеся. Я-ж от так папрыяцельску спытаў. Анічога дрэннага пра вас ня думаў. Здавалася мне толькі так, што калі чалавек сьцярог урадавага дабра, значыцца лясьніком быў, дык мог каму на нагу наступіць. Ці пасьля, як камандантам быў... Нехта-ж меў прычыну яго забіць. Ну як вы думаеце, была прычына ці не?

- Ясна, што бяз прычыны ня было, - вялым голасам згадзіўся Антось. - Лес лесам... Трэба каму якая жардзіна, ці што, дык што-ж бывала, што каторы паедзіць і высячыць, а лясьнік яго паганяіць. Каторы-ж папаўся дык пэўня-ж, што лясьніку за гэта ў рукі ні цалаваў. Ну а каміндант зноў-жа каміндантам. Ня ўсе яго любяць, але-ж каб забіваць за гэта чалавека, дык дзе тамака...

- Значыцца, - падхапіў Левандоўскі, - вы гэтым кажаце, што людзі маглі крыўду мець, але не такія вялікія, каб за іх чалавека забіваць?

- Яно так выглядаіць, - згадзіўся Дзяркач.

Камандант зацягнуўся папяросай, пусьціў кружкі дыму й глыбока задумаўшыся, паволі прыглядаўся ім аж пакуль расплываліся пад шэрай столяй. Ніна ўстала з-за стала, села на табурэце ля вакна і ўзялася цыраваць шкарпэтку.

- З нашай гаворкі тады выходзіць, што чалавек мог мець ворагаў, але не такіх вялікіх, каб яго каторы забіў. А вам пэўне-ж вядома, што яго абскардзілі, што ён тут адну жанчыну з вашай вёскі ўлетку нібы за ягады застрэліў.

- А гэта..., было такое. Ды гэта ні даказана за што. Казалі, што выпадак быў. От ніхай солтыс скажыць...

- Бжончэк старую Бахмачыху застрэліў, - сказаў Паўлоўскі. - Але гэта так сталася, што яна нібы за лясьнікову стрэльбу схапілася, каб за мужа заступіцца. Знаеце, выпадак такі няшчасны...

Левандоўскі зноў падумаў, зірнуў на недакурак, устаў ад стала й занёс ды выкінуў у прысак пад плітой.

- А ў гэтых Бахмачоў якая сям'я?

- Пракоп Бахмач, удавец цяперака ну й два сыны.

- Якія сыны?

- Адзін малады, цяперака ў школу ходзіць, а другі старэйшы. Той на нагу кульгавы, ён за шаўца вучыцца.

- Вы думаеце, што каторы зь іх хацеў адпомсьціць?

- Што вы! Стары Пракоп, ён нядужы, а гэтыя-ж адно яшчо дзіця, лічы, а другі калека... Спытайцеся от пана солтыса.

- Бахмачы ні такія людзі, каб каго забіваць асьмеліліся, - аўтарытэтна адказаў Паўлоўскі.

- Ага... Ну што-ж, мне трэба будзе зь імі пабачыцца. Калі вы кажаце, што ня меў ён тут ворагаў, дык пытаньне астаецца пра матыў. Хто меў прычыну, каб яго забіць? Палітычнае забойства, ці што? Яно так выглядае.

Левандоўскі зноў упёр свае рухлівыя вочы ў Антося. Дзяркач трымаў наіўны выгляд.

- Як самі кажаце, яно так выглядаіць. Але калі думаеце, што каторы з нашых за палітыку, дык гэта курам на сьмех. Нашы ніколі ў палітыку ня лезьлі, з боку дзіржаліся, а ня тое, каб каго яшчо за палітыку забіваць.

- І камуністы таксама?

Антось адразу спахапіўся.

- Ад якога часу раўняць нашых з камуністамі? Вы што, ня відзіця, што нам камуністы нарабілі? Я сам во ледзь вырабіўся. Каб ня Немцы, дык косьці недзіка на Сібіры зямлю парылі-б...

- Знаю, знаю, - пасьпяшыў згадзіцца камандант.

- Ведаеце, каміндант, давайце во яшчо па чарцы вып'ем. Можна? - спытаў Антось, бяручыся за літроўку. Ён прыгледзеўся пляшцы й мяркаваў, што яшчэ па чарцы выйдзе. Госьці былі зусім цьвярозыя, а другой пляшкі не хацелася даставаць. Камандантавы пытаньні былі яму не на карысьць. Начальнік намагаўся лавіць Дзеркача за язык. Важна, каб ніводнага слова лішняга не сказаць.

- Ну дык за ваша здароўе, - запрапанаваў Антось.

- Вы думаеце, што тут нідзе камуністаў ужо няма? - выпіўшы самагонку, вярнуўся да спыненай тэмы Левандоўскі.

- Чорт іх ведаіць, - адказаў Дзяркач. - Можа дзе ў якія дзіркі й пазалазілі. Вам лепі пра іх ведаць. Мне толька плуг ды каса, а палітыка мне, як кабыле пятая нага.

Левандоўскі спасьцярог, што на гэну тэму нічога ад Антося больш не даведаешся й таму да яе не вяртаўся. Выходзячы з хаты, паны начальнікі ветліва дзякавалі гаспадыні за пачастунак. Антось стаяў ля вакна й прыглядаўся засьнежанай дарозе аж пакуль брычка за паваротам зьнікла.

- А ўсё-ж цікава, хто таго Бжончка забіў, - сказала Ніна, крыжуючы ваўняную нітку ў пяце шкарпэткі й ня гледзячы на Антося. І Антось удзячны быў ей, што блізка і ўважна ў вочы яму ня зірнула, бо магла-б там штосьці непажаданае спасьцярэгчы.

- Так, цікава, - адказаў Дзяркач.

Ён выйшаў на двор. За бальшаком, ля школы чуваць былі дзіцячыя звонкія галасы. Відаць, што дзеці кончылі заняткі. Вучыла іх старая Плясьневічыха, удава нейкага польскага ўрадніка. Як вучыла! Даўно трэба было-б свайго настаўніка, каб гэта недалуга дзяцей не калечыла.

19

Хваля апэрацыі «Барбароса», што летам хлынула з захадніх «сьвяшчэнных» межаў каляніяльнае імпэрыі на ўсход і якую мела ўстрымаць абсьпяваная і ў песьнях ніколі няпераможаная Чырвоная Армія, нястрымным імклівым імпэтам разьлілася па аграмадных раўнінных прасторах ад Чорнага мора да Мурманску. Хуткасьці хвалі, як тады выглядала, ня будзе супыну. Калішні Банапарт, што із сваей Гранд Армэ спаласаваў Беларусь у паходзе на Маскву, такой сіле пазайздросьціў-бы.

Хваля кацілася і паветрам, і галоўнымі ды меншымі, утоптанымі ці ўежджанымі шляхамі. У сваім магутным імкненьні ў Беларусі яна выпаласкала ўсю зямлю апроч вялікіх лясных масіваў. А пазьнейшыя падчышчальныя апэрацыі, што сітам мелі прасеяць-вычысьціць занятыя землі, у васноўным не закранулі занесеных нетраў краіны. У вярхоўях Бярозы-ракі, узяўшы з Захаду ад Докшыц, праз

Бягомельшчыну, Вушаччыну, Лепельшчыну й Лагойшчыну, мятла акупанта адно пабэрсалася па акраінах пушчаў. На вялікай залесенай прасторы, калі-б яны наважылі сядзець ціха, маглі-б скрыцца большыя вайсковыя адзінкі. У запраўднасьці-ж ваенны хаос прытуліў гэтта малыя групы ваенных недабіткаў, якіх, зважыўшы асаблівыя акалічнасьці поўнага разгрому бальшавіцкіх сілаў, нельга навет было назваць дэзэртырамі. Завязваныя пераможцамі ў паходзе на ўсход мяшкі як мага хутка ліквідаваліся, але залесенасьць ня спрыяла поўнаму ачышчэньню занятых земляў.

Тое, што высьлізнула зь мяшкоў і пасьля ўцякло спад мятлы, зашывалася ў глыбінях пушчаў. Ашаломленае магутным ударам, паадзінотна й невялікімі групамі трываючы, яно залізвала сьвежыя раны. Будучыня - цьма, а цяпершчына дакучала патрэбай палагоджаньня звычайных цялесных патрэбаў. З гэтай простай прычыны прысутнасьць ваенных недабіткаў насамперш адчулі мясцовыя сяляне. Прыгоньнікі зьненавіджанага й кагадзе зьліквідаванага ладу праціралі вочы, выпроствалі сагнутыя дагэтуль сьпіны, аглядалі свае цяпер запраўды ўласныя нівы. Трывала й дужэла «новым парадкам» народжанае спадзяваньне.

«Беларусы! Вас чакае зямля!»

Дачакаліся. Адыйшла ў нябыт зьненавіджаная й праклятая, міліёны найлепшысх сялян на глум у Сібір загнаўшая, калгасная брыда. Новы гаспадар, хай характарам ня менш дзярлівы й нажывы прагны чымся ад веку зьненавіджаны Маскаль, тымчасам зубоў яшчэ не ашчэрыў.

Прысутнасьць у лясох чужых людзей, што часта прасілі ці дамагаліся хлеба, тымчасам ня выклікала трывогі ў гэтай, зь няпамятных часоў гасьціннай краіне. Пакінь селяніна ў супакоі й калі ўсё ўляжыцца-утаўчэцца, калі будуць да працы рукі, усім хлеба й да хлеба хопіць. Абы не папялілі дабра ваенныя пажары, абы далей адсюль тую хвалю-навалу, глум і сьмерць.

Лясныя людзі, загаіўшы раны, пачалі разглядацца, пасьмялелі, вылазілі з зашытых у гушчарах бярлогаў і нораў, абівалі парогі навакольных сялянскіх гасподаў. Неўзабаве просьбы зьмяніліся дамаганьнямі й рабункамі.

- Бандыты грабяць! - з трывогай паўтаралі пад сялянскімі стрэхамі людзі. І ўжо пазьней слова «бандыты» ператварылася ў «партызаны».

Ніколі ня перастане трывожыць гісторыкаў пытаньне: як павярнулася-б на ўсходзе вайна, калі-б Гітлер палюдзку абыходзіўся з палоннымі? Запраўды, што было-б? Адно ведама, што сталася. Вялікі абоз ваеннапалонных у Бярэзьвічах, ведамы пасьля як «лягер сьмерці», стаяў гэтта-ж усім на вачох. Людзей марылі голадам, холадам і хваробамі пад адкрытым небам. Ды было-б поўбяды, каб неба гэнае, як прывыклі казаць, было голае. Дык-жа не. Зь яго часта падаў дождж ці сьнег. Даведзеныя да адчаю людзі рваліся на калючыя драты пад кулямі варты, амаль пагалоўна гінулі, а шчасьлівыя адзінкі, што пасьля траплялі ў лясы, апавядалі розныя жахі пра людаедзтва й суцэльны мор. Нялюдзкасьць сваю акупант як-бы наўмысна, паказваў штодзённа і ўсюды. Жахлівае рашчараваньне «новым парадкам» дыханьне адбірала.

Зь меншых мястэчак Жыдоў зганялі ў Глыбокае, дзе ў заходняй частцы гораду стварылі «гетто». Людзей гэтых, што апынуліся паза правамі, мясцамі ліквідавалі меншымі групамі, але пра лёс іхны ў рамках «канчальнае разьвязкі жыдоўскага пытаньня» мясцовыя жыхары не маглі нічога ведаць. Жыдоўскіх рамесьнікаў ганялі на працу ў мясцовых прадпрыемствах, што абслугоўвалі й забясьпечвалі акупацыйны апарат і ўзбагачалі Райх.

Зусім накш павялося Цыганом, якіх лавілі, адразу забівалі як непрадуктыўны элемэнт. Гэтак ужо першай восеньню пад новай уладай былі ліквідаваныя некаторыя банды Цыганоў, а апавяданьні пра нялюдзкі спосаб іхнае ліквідацыі кружылі па краіне.

Бітва пад Масквой пахіснула міт пра няпераможнасьць Нямеччыны. Гэтага хапіла чырвоным, каб пусьціць у рух іншыя, дагэтуль нявыкарыстаныя ў вайне сілы. Людзі ў лясох паднялі галаву, сквапна лавілі ў радыёпрыёмніках натхнёныя галасы зь «вялікай зямлі». Вэрхал у радыёвых хвалях мацнеў з ходам часу і ў меру ўсьведамленьня, што кагадзе шырака адчыненыя ў Маскву дзьверы вогненным шквалам першае вялікае абароннае бітвы наглуха зачыніліся, а агонь гэны адкінуў перадавыя калёны «Барбаросы» на дзясяткі кілямэтраў на захад.

Павыкіданых зь цёплых, наседжаных у Беларусі гнёздаў цівуноў бальшавіцкага прыгону, што панаваў гэтта пад фірмай БССР, першая перамога спанукала, каб падпрэгчыся ў маскоўскую калясьніцу ды як-небудзь памагчы зрушыць яе на захад. Прыпрэжка гэная, загадам зь

верху, вылілася ў розных хвормах, а на Беларусі заангажавала сілы ў лясох. Зірнуўш на мапу акупаванай краіны й вызначыўшы, пры помачы існуючай разьведкі, колькасьць і якасьць нямецкіх ваенных гарнізонаў, адно выразна кідалася ў вочы: у вялікіх, асабліва залесеных, полацях краіны чужнік расплыўся, валодаў адно мінімальна ды для ўтрыманьня парадку абапіраўся на чужы элемэнт у паліцыі. Дарогі-ж, як ведама, у бальшыні дрэнныя, ня спрыялі хуткаму перакіданьню матарызаваных сілаў з пункту А ў Б ці В. У гэных раёнах асноўны цяжар транспарту й камунікацыі меў трымацца на конскім хрыбце. Лёгка зрываць тэлефонную й паштовую сувязь. Добра расплянаваўшы, выкарыстоўваючы мясцовыя гаспадарчыя й людзкія багацьці, можна распаліць там вайну ледзь не на прымітыўных асновах, параліжаваць даставы на галоўны фронт, зьвязаць праціўніку рукі, адабраць у яго масу сілаў для змаганьня з партызанамі. Беларус, як Маскалём было ведама, ніколі ня зрокся гону да волі й самастойнасьці і, як гаворыць ягоная-ж народная мудрасьць, «заўсёды ваўком у лес глядзіць», але гэтта трапіў ён у пастку і яго можна было-б выкарыстаць.

Плянаваньне вялікіх ваенных мерапрыемстваў, асабліва-ж тых, што з палітыкай вяжуцца, вымагае дбайлівага абгрунтаваньня. Таму Маскалі зірнулі ў гісторыю, а тая, - яшчэ не такой вялікай даўнасьці, падказала ясную разьвязку. Гэта-ж пад провадам Кастуся Каліноўскага, падчас усенароднага антымаскоўскага змаганьня, Ліцьвіны (Беларусы) дасканала выкарыстоўвалі свае лясы, скрывалі там колькасна вялікія атрады паўстанцаў. Краіну трэба было амаль суцэльна войскам заліць, агідна зьдзекваццa, каб пасьля гадоў змаганьня зь сялянамі, пераважна ўзброенымі сякерамі, косамі й віламі, зламаць фізычны супраціў, але не дух гэтага народу. А што-ж было-б, калі-б паўстанцы былі добра ўзброеныя?

Адказ, як цаца! Узброіць людзей у лясох, наладзіць сувязь, выслаць спэцыялістых з карных і палітычных ворганаў для вышкаленьня й кантролі ды каардынаваць іх дзеяньні. Праціўнік ніколі не адгадае, што яму рыхтуецца. Бальшыню забранай ім зямлі такім чынам перавесьці пад сваю кантролю й адтуль націскаць. Разьвязка сама напрашвалася. Адно пытаньне: ці тойсамы народ, які некалі так гэраічна супраць цярскага глуму паўстаў ды ня так даўно сваю

дзяржаву аднавіў, якую сілай разбураць давялося, ці народ гэты стане на ўслугі скампрамітаванай і зьненавіджанай ім улады?

Наплявaць! Ня стане сам дык сродкі для падахвочаньня знойдуцца, гэтак як ад Івана й Пятра ды пазьнейшых «спадкаемцаў» Рыму й Бізантыі завялося. Паставіць нярод перад выбарам, а выбар даць толькі адзін.

Нямецкі акупант, каб забясьпечыць зад фронту, яшчэ ня ўзяўшыся за свае амбітныя пляны масавага вынішчэньня мясцовага насельніцтва для будучай калянізацыі гэтых земляў, спачатна прыняў элемэнтарныя меры аховы шляхоў сувязі, транспарту й базаў на занятых тэрыторыях. На чыгунках і пры ваенных аб'ектах зьявіліся вартавыя й рэгулярныя вайсковыя патрулі. Адылі хутка выясьнілася, што для ўтрыманьня ўлады ў гэтай краіне сваіх сілаў ня хопіць, а таму давялося ў нябыт аддаць ці ні самае галоўнае, што некалі вызначыў Адольф Гітлер: «Ніхто, апроч Немца, не атрымае права насіць зброі». На помач была пакліканая мясцовая паліцыя, намінальна для аховы парадку й ніхто не ўяўляў тады, што з часам, калі полымя вайны, што выйдзе зь лясоў, дабярэцца да шляхоў і базаў, роля ахоўнае паліцыі зусім зьменіцца.

Вайсковыя патрулі на двухшляховай чыгунцы побач Літоўцаў ужо ўжыліся ў быт сялянаў, зрок звыкся зь імі так, як прыкладна з гаравацкім гігантам Архіпам ці тымі сястрыцамі соснамі на могільніку. Бачыш вунь далекавата на чыгунцы дзьве постаці, шлёмамі завершаныя. Ледзь-ледзь рухаюцца роўнамерным крокам. Дый ці толькі днём. Літоўскія даўно вымяркавалі навет, як часта патрулі праходзілі. Ведама, што чыгунку сьцерагчы трэба. Ад каго? Гэта, ведама-ж, ваенная справа.

У вадну зімовую раніцу патруль наскочыў на нешта дагэтуль нябачанае. На ўсходнім шляху знайшлі разьвінчаныя й зрушаныя рэйкі. Зараз за паваротам, з лагодным нахілам уніз, значыцца там, дзе машыністу цяжка ці немагчыма ў час спасьцерагчы шкоду й затрымаць цягнік. Патруль неадкладна заалярмаваў базу і ўдалося спыніць надыходзячы, наладаваны войскам і запасамі цягнік, ухіліць катастрофу. Пасьля направы, цягнік спозьнена рушыў на ўсход, а мясцовыя ваенныя ўлады пачалі сьледзтва. Сьляды злачынцаў згубілі на ўежджанай дарозе, а роспыты ў прылеглых да чыгункі хутарох і вёсках, у тым ліку і ў Літоўцах, нічога не далі. Патрулі на чыгунцы ўзмоцніліся.

Ішоў час і цішыню лясоў начамі пачалі трывожыць гукі матораў у небе. Зь «вялікае зямлі» прывозілі й ськідалі апэргрупы спэцаў, інструкцыі, зброю. У лясох пацясьнела ваўком, сарнам, ласём і зайцам. Банды арганізаваліся й пачыналі выяўляць прэтэнсыі на ўладу, нападалі й нішчылі мясцовую нізавую беларускую адміністрацыю, школы, зьдзекваліся зь сялянаў, якія супраціўляліся рабункам. І тады дайшла да Антося Дзеркача вестка пра Лявона Шпунта. Прынёс яе непаседлівы Захарук. Кагадзе езьдзіў ён у Докшыцы, захапіўшы з сабой пару мяшкоў зярна на млын.

- Змалоў? - спытаў яго Антось, сустрэўшы на вуліцы.

- Ды дзе тамака... прывёз назад. Млын той для войска й нямчуры меліць і фігу ўлезіш. Трэба далей над жорнамі пацець. І я думаў, знаеш, Антось, трэба было-б нам да войта, каб як дзела з млынам папхнуць. Ніхай-бы яны, наша начальства значыць, зь імі пагаварылі. Вайна вунь куды адсунулася, дык навошта-ж жорны круціць? Падаткі ад нас бяруць, млыны забралі й сабе мелюць, дык чаму-ж нам ня могуць?

Гутарка адбылася на засьнежанай вуліцы сонечным днём. Бярозавым кійком, па старой звычцы, Антось ёрзаў па выгладжанай палозьзем, зьзяючай сонцам, дарозе. Збоку ў сьнезе ляжала вялікая галіна хвоі, згубленая некім па дарозе зь лесу.

- Ды маглі-б, чэрці, - адказаў Антось. Як правіла, трымаўся цяпер Антось з гэтым чалавекам асьцярожна, гаварыў у вабрэз, больш распытваў і слухаў. Часы няпэўныя. - Ну а што тамака ў Докшыцах чуваць?

- Эт, знаеш, калісь гэта быў кірмашны дзень, людзей, бывала, наедзіць поўна-паўнюсенька. Але ні цяпер. Сёй-той, па старой прывычцы, прыклыпаіць. От, знаеш, маю для цябе нешта цікавае. Чуў, можа, дзе цяперака Лявон Шпунт?

Бярозавая палка спыніла пісаць крывулі па спалазаваным сьнезе. Антось уважна зірнуў Захаруку ў вочы.

- Лявон? А хто яго знаіць? Ты што чуў?

Захарук спачатку скруціў папяросу, уважна абгледзіў яе з двух канцоў і паволі прыкурыў. На твары хітрасьць. Зноў Антось надта добра той твар і гэту хітрасьць і чакаў нечага важнага.

- Відзіў я з Тумілавічаў Янку Барабоську. Знаіш яго?

Бліжэйшыя вёскі, асабліва іх моладзь, Антось ведаў нядрэнна. Далейшыя адлегласьцю Тумілавічы амаль ня ведаў.

- Ды не. Дзе тыя Тумілавічы! Ні знаю.

- Ну дык, гэтае самае, - зацягнуўся Захарук самасейкай, - дзядзьку гэтага я знаю вунь як даўно. А тут на Докшыцкім рынку мы зь ім нос у нос стукнуліся. Значыцца, здароў, як жывеш, і разгаварыліся. А тады ён мне гэтак і кажыць: калі будзіш відзіць Антося Дзіркача, дык пірадай яму прывет ад Лявона Шпунта й скажы, што лясьнічоўка яму бокам вылізіць. Так і скажы, кажыць мне гэтысамы Барабоська.

- Лясьнічоўка бокам вылізіць? - перапытаў Антось.

- Ага. Пірадай, кажыць, Антосю Дзіркачу ад Лявона Шпунта й скажы, што лясьнічоўка яму бокам вылізіць. Што гэта значыць?

Антось маўчаў.

- Я тады, гэтае самае, пытаюся, а дзе-ж той Лявон Шпунт ёсьць цяперака. У партызанах, кажыць мне гэты самы Барабоська. А дзе-ж тыя партызаны? - пытаюся. - У нас, а найболі дык туды ў бягомельскіх лясох, - кажыць ён мне.

- Дык яны да іх у вёску прыходзяць?

- Ды няўжо-ж... Павесілі, кажыць, солтыса, разагналі школу, дзяўчат пагвалцілі, а колька над людзьмі назьдзекваліся! Аграбілі, кажыць, цэлую вёску, так падчысьцілі ўсё пабальшавіцку, зладзеі. Маладых каторых дык з сабою ў парцізаны забіраюць. І кажыць мне гэтысамы Барабоська, што сам ні знаіць што рабіць, ці ў паліцыю, ці ў парцізаны йсьці. От і выбірай!

Яшчэ шмат апавядаў Захарук пра нялюдзкасьць бальшавіцкіх бандытаў і мясцовага хламу, што пераказваў яму Барабоська. Антось слухаў дзядзьку вельмі ўважна. У ягоным уяўленьні трываў вобраз: акрываўленыя чалавек пад нагамі на падлозе, недарэчнае шкляное вока ў ласінай галаве і Янук побач із стрэльбай.

- Дык што гэта такое? Чаму ён так казаў, што лясьнічоўка табе бокам вылізіць?

Антось паволі мацаў сваю чорную бародку, уважна зірнуў на Захарука, але дзядзькі гэтага ня бачыў. Перад вачмі стаяў вобраз зь лясьнічоўкі. Маўкліва рушыў дахаты.

- Што-ж гэта ня хочаш сказаць? Нешта скрываеш, ці што? - дамагаўся свайго Захарук.

- Мне німа часу, - кінуў праз плячо Дзяркач.

20

Дзень сяньняшні, сераду 25-га сакавіка, - ведаў Янук, прыгадваць будзе доўга. Вось неўзабаве, мо за якую гадзіну, узыйдзе ён на гэну рудую, што даўно па хварбе зажурылася, сцэну, стане перад гэтымі, цяпер гаманлівымі, як пчолы ў вульлі вечарам, людзьмі ды прадэклямуе свой, не бяз поту напісаны верш, прысьвечаны таму далёкаму гістарычнаму здарэньню, што адбылося некалі ў Менску Беларускім. Сотні сялянскіх вачэй уп'юцца ў яго, спасьцерагуць кажны ягоны рух, а міліёны мурашак распаўзуцца па целе, ды ці не перасохне ў горле. Узварушыцца й некуды пасьпяшыць сваім пампаваньнем сэрца, а ў скроні пачнуць татахкаць рытмічныя малаточкі. Млосна. Памажы, Божа!

Што гэта раіў яму дырэктар Сабалеўскі, калі на школьным конкурсе, у якім узялі ўдзел найвыдатнейшыя вучні, каб напісаць верш, прысьвечаны 25-му Сакавіку, узяў ён першае месца?

- Перад самым выступам, калі маеш выйсьці на сцэну й асабліва калі ўжо станеш тварам перад людзьмі, будзеш моцна хвалявацца. Усе хвалююцца перад выступамі, навет уежджаныя артысты й прамоўцы, каторыя ўжо многа практыкі знаюць. Я таксама, калі маю выступаць перад вялікай аўдыторыяй, спакою не магу ўтрымаць... А каб не хвалявацца, дам табе добрую раду: зусім ня думай пра тое, што маеш выступаць, а думай пра нешта табе мілае, навет сьмешнае выпадак-абразок із свайго жыцьця. Во гэтак...

Янук намагаўся пра нешта зусім адменнае думаць, але яно, як на злосьць, уцякала й траціласяў тым страхоцьці, што наступіць мела. А сьмешнага прыгадаць ніяк нельга. Побач сідзела прыхарошаная, прыгожа зачэсаная румяненькая Дуня.

- Янучок, табе ня страшна? - шапнула яму на вуха.

- Лыткі дрыжаць, мурашкі па целе бегаюць, - перасаліў юнак.

Зірнуў у ейныя блакітныя, крыху прыжмураныя вочы, мусіць спадзяючыся там бадзёрасьць знайсьці, але заміж яе ў дапытлівых вачох-васількох спасьцярог ледзь заўважны цень трывогі. І блізкасьць Дуніна ня спрыяла ўспакаеньню. Гэныя ўяўныя мурашкі цяпер,

здаецца, інвазіяй хлынулі на галаву. Вось-вось да самых мазгоў дабяруцца.

- А табе? - спытаў. Ледзь зварухнуўся перасохлы язык.

- І мне таксама, - кіўнула галавой дзяўчына.

Янук моцна ўздыхнуў. Недзе ззаду хтосьці глуміў самасейку, бо нос едкі смурод трывожыў.

- Што табе! - хмыкнуў Янук. - Прачытаеш напісанае, а ты-ж выдатна чытаеш. Абы адвага. От мне... Гэта-ж трэба свой верш казаць. А калі забудуся? Абсьмяюць.

Дуня мела вельмі ўрачыста прачытаць тэкст Акту 25-га Сакавіка. Яе выбралі, як найлепшую, пасьля чытаньня ў школе. А выступіць яна мае калі дабярэцца да таго ў сваім дакладзе дырэктар.

Як гэта адважыцца? Дух займала. Ніколі-ж раней перад людзьмі, апроч вучняў у клясе, ня выступаў. А там на залі ў гэнай гушчы нагамі на падлозе шоргаючых і насамі сморгаючых сялян сядзеў недзе ззаду ягоны бацька, а ў іншым месцы й смаркуль Стась і ўжо дзяцюк Уладзік, і брат Мікола. Няхай адно запнецца, ці ня так добра скажа, дык ужо хто як хто, а Стась на ўсю глотку зарагоча.

Дзесьці ў куце чуліся вясёлыя дзявочыя галасы, і агульна ледзь прыцішаны гоман, які не нагадваў таго, што некалі чуў на калгасных сходах. Гэтта - весялосьць і вольнасьць, там прыдушаная асьцярожнасьць, адсутнасьць сьмеху. Перад тымі сходамі зьнеахвочаных і працай змучаных людзей навінчывалі розныя цівуны, наводля Сабакевіча ці Лявона Шпунта, а сюды людзі прыйшлі з добрай волі й зь вялікім зацікаўленьнем. Як-ніяк, маюць сьвяткаваць сваім-жа народам, такімі, як яны, цёткамі й дзядзькамі, створанае нацыянальнае сьвята, вялікі гістарычны дзень. А праграму сьвята таго стварылі, пад кіраўніцтвам дырэктара Сабалеўскага, вучні гацкай сямігодкі. Тут маюць быць і сьпевы, і вершы, і даклад. І ўсё гэта ў роднай, усім зразумелай мове, бяз прымусусу зьненавіджаных чужых палітрукоў.

- Янучок, ня бойся. Табе трэба ганарыцца, што ты паэта. Із цэлай школы цябе сам дырэктар выбраў. Ты саўсім сабе не пашкодзіш, калі якую слабасьць пакажаш...

Дзяўчына ў чулае месца трапіла. «Слабасьць пакажаш...» І запраўды, жах падумаць, каб такое сталася. Паказаць слабасьць перад кім? Дзякуючы сваім здольнасьцям, пільнасьці й працавітасьці, ён выбіўся ў школе на перадавое месца. А гэтыя руплівыя, простыя,

жыцьцёва падбітыя, у Бога веруючыя людзі прыйшлі сюды бяз прынукі сьвяткаваць дзень уваскрошаньня сваей бацькаўшчыны. Бальшыня зь іх, пэўне-ж, пра акт абвешчаньня незалежнасьці Беларусі ня чула. Сяньня ў гэтым, вайной абшарпаным, вялікім будынку калішняга клюбу чыгуначнікаў найлепшыя сілы гацкай сямігодкі маюць гэтым суродзічам у свой спосаб адтварыць той адлеглы дзень народнага ўваскрошаньня. Песьні з вуснаў школьнага хору, даклад дырэктара, дэклямацыі, прачытаньне самога Акту 25-га Сакавіка, - усё гэта мела перанесьці прысутных у іншае месца й час, ды ня толькі паінфармаваць іх, а як мага найлепш паказаць, што сталася, каб сэрцам маглі адчуць, уяўленьнем злавіць дух часу, спалучыць ізь сяньняшнім днём. Неабходна, каб перажылі і ўгледзілі, як вялікі й магутны, а пасьля пакораны й зганьбаваны народ, дзякуючы ахвярнасьці й празорлівасьці сыноў і дачок сваіх, падняўся на ногі, стануў на поўны рост, заявіў сьвету, што ад гэнага часусам на нівах сваіх будзе гаспадарыць, бязь ніякіх апякуноў-паразітаў сваю долю возьмецца будаваць, сваіх правоў зброяй будзе бараніць.

І ў працэсе пераносу гэтых людзей у іншую эпоху Янук заняў адно з ключавых месцаў. Значыцца, як гэта «слабасьць паказаць»? Важна й тое, што ягоны верш, паводля пляну, апынуўся тут-жа пасьля галоўнага дакладу самога дырэктара школы, значыцца, як-ніяк,мусіць прадоўжыць тон цэлае ўрачыстасьці. Вучань Бахмач надзвычайна добра ведаў прыгожую мову дырэктара. Увага людзей будзе на высокім узроўні, трэба не падкачаць. Вось што...

- Адно памятай, - навучаў яго кагадзе Сабалеўскі, - што калі навет і памылішся, якое слова ці радок забудзешся, глядзі, каб ня дрыжэў голас. Гавары бадзёра, бойка, упэўнена, калі-ж памылішся, ня чырванейся, як сасунок нейкі. Гавары голасна, каб цябе кажны глухаваты дзядзька й цётка пачулі. Разумееш?

Вялікая сцэна сваёй голасьцю запярэчвала ўрачыстаму настрою залі. У будынку гэтым першы раз давялося Януку быць тады, калі ў нябыт адыйшоў вусаты, із надта ваяўнічым тварам, «маршалак». У юнацкую памяць добра ўлёгся вобраз: разьдзялілася пасярэдзіне й паволі папаўзлаў два бакі сіняя бархатная занавеса. На задняй сьцяне, пад крыжам і дзярлівай птушкай, абрамаваны чорным крэпам, вісеў партрэт праслаўленага «маршалка». На сцэну выйшла нафуфыраная

цаканька, вучаніца шостае клясы Гэлька Сьвёндруўна і заінтанавала нейкі, прыдворным паэтам згарушчаны верш:

Marszałku!
To nieprawda że Ciebie już niema,
To nieprawda że już jesteś w grobie.
Chociaż cała Polska jest w żałobie...

Калі зьмянілася ўлада, на задняй сьцяне сцэны павесілі лысуна з жулікаватым выглядам, а ля яго «важджзя» зь ледзянымі вачмі й васпаватым тварам. А на сьценах залі, на чырвоных палотнішчах, белымі літарамі, паразьвешвалі ці ня вытрымкі із самае «сьветлае сталінскае канстытуцыі», тае, што сонцам звалі:

В СССР женщины, наравне с мужчинами, имеют права...

Граждане СССР имеют право на отдых...

Калі прапала занавеса? Пры бальшавікох яшчэ была. Пасьля «будаўнікі новай Эўропы» на некаторы час тут войска разьмясьцілі. Добра, што крэслы й лавы не папалілі.

Сяньня сьпераду, на машце перад галоўнымі дзьвярмі лунаў бел-чырвона-белы сьцяг, а вышыты белым колерам на чырвоным палатне рыцар пагоні аздабляў цэнтральнае месца сьцяны за сцэнаю. Гэта-ж ці не настаўніца ручных работ паклапацілася. Трэба й пэўне нялёгка было знайсьці палатно, чырвоныя й белыя ніткі. А пад пагоняй, чырвоным на белым напіс:

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!
1918 - 1942

Адно кантрастам, з малымі чорнымі вусікамі, насупленым тварам вісеў над пагоняй партрэт новага гаспадара. Як-жа безь яго? Паспрабуй. І ці гэты чым розьніўся ад ад тых з пэйсамі карлаў, жулікаў-ілычоў ці іншых ёсіпаў?

Пагоня й «жыве Беларусь» на месцы. Яна тут жыла, цяпер жыве й усіх перажыве. Але што пра гэтых, найнавейшых? Калі адкоцяцца іхныя колы? Сьпераду сцэны, над рампай Янук прачытаў:

Rader müssen rollen für den Sieg!

Будынкам гэтым і цяпер загадвалі чыгуначнікі, але гэтыя крыху ад папярэдніх розьніліся. Іхныя «колы да перамогі мусяць каціцца». Значыцца, ня толькі тавары й людзей, ці зброю перавозіць. Здорава!

Заля крыху аціхла. Увайшлі два Немцы ў суправодзе войта. Адзін - сяржант жандармэрыі СС, а другі - «зондэрфюрэр». Што за назоў і функцыя? У гэных «зондарах», і хто якім быў «фюрэрам», апроч галоўнага, з чорымі вусікамі й калючымі вачмі, Бахмач не разьбіраўся. Адно чуў, што «зондар» займаўся гаспадаркай, значыцца пэўне-ж зьдзіраў падаткі, ці глядзеў за прадпрыемствамі працы. А жандарм быў галоўным шпянём мясцовае, абсаджанае пакуль што Палякамі, паліцыі. Казалі, што й гэты быў фальксдойчам, значыцца Левандоўскаму добры кумпан.

Немцаў і войта пасадзілі на пярэднім радзе, між настаўнікаў. Шмат хто пакланіўся войту, чалавеку свайму, які заняў урад пасьля Бабра. Гэты больш высьцерагаўся, бо ведаў адкуль ідзе небясьпека.

З двух бакоў вучні пачалі выходзіць на сцэну, станавіліся ў тры шэрагі. За імі нехлямяжым крокам з правага боку выйшаў высокі, цыбаты, худы, сьветлавалосы, зь вялікімі залысінамі на шылаватай галаве стары дзяцюк Іван Скараход. Сын мясцовага, абруселага псаломшчыка, да «помашчы меснаму патрыяцізму», як ён казаў, энтузіязмам не гарэў. У школе вучыў сьпеву, а на гэту нагоду загадалі яму падабраць адпаведны сьпеўны рэпэртуар. Сам валодаў добрым тэнарам. Ласкавыя й мілагучныя мэлёдыі надта спадабаліся харыстам і Скараход, нашто ўжо пагардліва адклікаўся пра «местны патрыяцізм», ня мог астацца абыякавым да прыгожай беларускай песьні. Заля зусім аціхла, а высокі цыбаты настаўнік, апрануты ў добра апрасаваны чорны касьцюм, пад гальштукам на штыўным каўнерыку, колькі часін прыглядаўся залі, пакланіўся, адвярнуўся да хору й падняў абедзьве рукі.

Люблю наш край, старонку гэту,
дзе я радзілася, расла...

Мэлёдыя, на два галасы, палілася ціха й некаторыя ледзь спасьцераглі, як вучні сьпяваць пачалі. Галасы-ж пачалі буйнець і адразу быццам шырокай ракой лінулі ў перапоўненую залю. Скараход,

із сваей доўгай шыяй, у гэнай пазыцыі нагадваў чорнага бусла, лёгка й плаўна, быццам крыльлямі, узмахваў рукамі. Мэлёдыя заваражыла людзей. Зірні на зморшчаныя, сіверам абсьцябаныя твары, якія рэдка калі ў непраглядным жыцьці распрамяняла ўсьмешка. Бачыш як загарэліся вочы? Сэрцы ўскалыхнула блізкая душы мэлёдыя, ці не радня тэй, што плыла зь бяроставай трубы пастуха Хвядоса зь Ліпавіч і тэй, што цягнулі згорбленыя, на захадзе сонца сьпіны выпрастаўшыя жнейкі на хутары Лазоўскага, радня сьпевам жаўранка й кукаваньню зязюлі ў Гараватцы, рэха неўгамоннага шорхату лісьцяў гіганта Архіпа й журботнага суму сястрыц хвояў на літоўскім могільніку. Гімн любові да роднае зямлі, яе незаменнай прыроды, споведзь вечнае прывязанасьці чалавека да свайго роднага гнязда...

Калі пасьля канца песьні цыбаты Скараход адвярнуўся да залі й паволі пакланіўся, громам паліліся воплескі. Вучні, так як увайшлі раней на сцэну, цяпер павярнуўшыся шнурамі, пайшлі ў бакі. Апошні выйшаў дырыгент, але воплескі ня сьціхалі й пачуліся крыкі: - Яшчэ! Тады зноў зьявіўся Скараход, паволі, паважна выйшаў аж на сярэдзіну сцэны, усьміхнуўся, пакланіўся ды завярнуў назад.

Дырэктар Сабалеўскі, узыйшоў на сцэну бадзёрым жаўнерскім крокам. І дзівы дзіўныя, апрануты быў у прыгожы цёмна-шэры касьцюм, з гальштукам, а ня так, як у школе - боцікі з халяўкамі ды нейкі цёмны пінжак. І ведамы позірк з-над верхняй рамы акуляраў. Цяпер чалавек гэты стаяў пасярод сцэны. Перад ім ня было століка ніякага, а ў руках - ніякае паперыны, значыцца, як выглядала, меўся гаварыць з памяці.

- Вяртайцеся цяпер у вашы вёскі, сёлы й гарады, у далёкія й блізкія куткі бацькаўшчыны сваей роднай і скажыце народу нашаму, што надыйшоў дзень ягоны абяцаны, бо скончыліся цярпеньні й мукі ягоныя. Абвясьціце яму, што адвалены й далёка адкінуты цяжкі камень зь яго магілы й што да новага вольнага жыцьця ўваскрэсла Беларусь! Абавязкова дапільнуйце, каб усе пачулі й зразумелі радасную вестку пра тое, што нарэшце ўзыйшло доўгачаканае яркае й сьветлае сонца над прыгнечанай і зморанай краінай і што ад дня ейнага ўваскрошаньня пачынаецца жыцьцё новае: сам народ наш, бяз чужых махляроў, гаспадаром будзе ў хацей на ніве сцаей і што ўжо ня будзе валадарыць ім і загадываць яму чужнік. І скажыце ўсім, каб мацаваліся духам у гэты вялікі дзень радасьці і славілі Бога Ўсемагутнага за

збаўленьне ды няхай памоляцца за тых, што змагаліся й аддалі жыцьцё свае за тое, каб уваскрэсла й жыла Бацькаўшчына!

- Гэткімі словамі гаварыў у менскім гарадзкім тэатры да дэлегатаў Усебеларускага Кангрэсу адзін з удзельнікаў таго ўрачыстага паседжаньня, што 25-га сакавіка 1918-га года абвесьціла незалежнасьць Беларусі ў хворме Беларускай Народнай Рэспублікі.

Сабалеўскі гаварыў узьнёслым, чыстым, цьвёрдым голасам і ўміг уся заля ператварылася ў слух. У тую абсалютную, напружаную цішу ўрываўся лязгат-бразгат няспыннага руху са станцыі. Чыгуначным шляхам, быццам пупавінай, лучыўся аграмадны ваенны апарат з фронту на ўсходзе із сваей маткай-Райхам, што корм і прылады сьмерці яму дастаўляла. З-за сьценаў клюбу, такім чынам, даляталі адгалоскі руху, народжанага вялікім змаганьнем тых самых дзьвюх сілаў, што ходаліся й тады, калі сакавік нарадзіў Беларускую Нардоную Рэспубліку. Праўда, сілы гэныя зьмянілі свае маскі, але ня сутнасьць тытанічнага змаганьня. Павялічылася варварства. А ў гэтай залі красамоўны дырэктар простымі і ўсім зразумелымі колерамі маляваў карціну змагарнае гісторыі народу для людзей, што рэдка ў кніжку заглядалі, адно прымітыўна-цяжкія прылады працы ведалі, людзей, якім чужынцы ўжо на працягу стагодзьдзяў намагаліся забраць душу, апляваць іх, зьнявечыць, каб пасьля нявольнікамі ў ярмо сваё запрэгчы. Як пакажаш скамплікаваную гісторыю людзям, што так даўно сьвятла ня бачылі, якім білі-таўклі ў галовы, што яны - найніжэйшыя істоты, паўзуны, нявольнікі, пагарды нявартыя? А апошні, найбольш крывадушны акупант і варвар узяў чыстае, як крынічная вада, слова й пераніцаваў ягонае значэньне... Ведаў усё гэта дырэктар і таму гаварыў як мага проста.

- Кастусь Каліноўскі, - прадаўжаў Сабалеўскі, - зьвярнуўся да народу сваей роднай беларускай мовай, выдаваў газэту «Мужыцкая Праўда», у якой паясьняў сялянам хто іхныя прыяцелі й ворагі ды што трэба рабіць, каб нянавісны прыгон ськінуць і вольнасьць здабыць. Разам із Палякамі ён падняў паўстаньне супраць Маскалёў. А ў сваім ведамым звароце да народу, напісаным у турме, ён так і казаў: «Як дзень ня ходзіць побач з ночай, як сьвятло ня мірыцца зь цемрай, так ня йдзе праўдзівая навука побач зь няволяй маскоўскай. Бо дзе маскаль пануе там няма ніякай навукі, толькі глум і зьдзірства».

- І вы нядаўна пераканаліся, што маскаль зусім не зьмяніўся. Дзетак вашых бальшавікі кармілі сваей атрутай, а ад вас забіралі зямлю й гналі ў калгасы, глумілі ды абдзіралі вас. Таму й казаў далей наш вялікі й слаўны Кастусь Каліноўскі: «ваюй, народзе, за свае правы, за волю, за веру...»

- Так, ваюй, змагайся, бо як сам не пастаіш, то ад маскаля нічога добрага спадзявацца ня трэба. Кастусь Каліноўскі падняў наш сялянскі народ супраць Расеі, супраць прыгону, зьдзеку й гвалту, чужой школы й чужой веры. Народ пайшоў на змаганьне із стрэльбамі ў руках, а калі іх ня было, дык із косамі, сякерамі й віламі. Ды народ наш быў нядужы, каб перамагчы маскоўскую армію, што затапіла ўвесь наш паняволены край. Вялікі й слаўны сын ягоны, Кастусь Каліноўскі, павешаны быў у Вільні на шыбеніцы царскай. Кроў паўстанцаў і іхнага слаўнага правадыра не прапала, а на зьмену ім прыйшлі іншыя, што прадаўжалі змаганьне. Прыйшло адраджэньне.

Схарактыразаваўшы бацьку адраджэньня й нашаніўскі пэрыяд, дырэктар дабраўся нарэшце, гаворачы павольна й голасна, да пэрыяду, калі народ абвясьціў Беларусклую Народную Рэспубліку.

- Актам 25-га Сакавіка, 1918-га году Беларусь была абвешчана незалежнай дзяржавай у тых межах, дзе жыў тады наш народ. Акт гэты ёсьць надзвычайна важны. Прашу яго вельмі ўважна праслухаць. Прачытае яго вучаніца шостай клясы нашай школы Дуня Макатунішка.

Дуня ўскочыла з лавы, шпарка рушыла да сходаў. Ужо на сцэне запаволіла крок, спынілася. У белай блюзцы, з вышываным у кветкі каўнерыкам, у зялёнай спаднічцы, ускоснай хваляй старанна прычэсаных валасоў, яна прадстаўляла абраз сьціпласьці, наводля нейкага польнага рамонка.

- Год таму назад народы Беларусі, разам з народамі Расеі скінулі ярмо расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь..., - пачала дзяўчына.

Дзесьці ў Менску Беларускім, пасьля ўсяночнае тузаніны й спрэчак, калі нарэшце сакратар прэзыдыюму, пэўне-ж манатонным голасам, якім звычайна характэрныя скаратары, чытаў тойсамы дзяржаўны акт, уражаньне было куды накшае. А гэтта пастанова веча народнага, за якую шмат людзей ахвяравала раней і пэўне-ж ахвяруе яшчэ сваё жыцьцё, гэтта таясамая пастанова гучэла вытрыманым,

урачыстым, хоць і мяккім дзявочым голасам. І цяпер Бахмач яшчэ адно зразумеў, чаму Дуня перасьцерагала яго, каб слабасьці не паказваў. Звонку гарэзьлівая і, здавалася, лёгкадумная дзяўчына запраўды паказалася яму стойкай, трывалай, адважнай. Але ці поўнасьцю ўсьведаміў тады гэта Янук? Мусіць не, бо думкамі забягаў наперад да таго, што вось зараз мае адбыцца, дзе ён цэнтрам агульнае ўвагі будзе...

Скончыўшы чытаць, Дуня прыгожа пакланілася. Пасыпаліся гучныя воплескі. Ня толькі плёскалі вучні, што папрыводзілі сваіх бацькоў, сяброваk і сяброў, але й узрослыя. Адно ў самым цэнтры вялымі рукамі варушыў войт, а побач нярухома сядзелі два прадстаўнікі акупацыйнае ўлады.

- Куды вы, цёмныя, дурныя, адсталыя мужыкі, лезеце? Дзяржавы сваей вам захацелася? У вас няма ні нафты, ні солі, ні вугля, ні жалеза. Як жыць будзеце? - пачаў падсумоўваць дырэктар. - Гэткімі вось нападамі ворагі народу нашага, апякуны няпрошаныя, накінуліся адразу на нас, каб затукаць-загукаць і зруйнаваць новастворануюдзяржаву. А цяпер падумайце самі: калі-б наш край быў сапраўды такой праклятай Богам плямай на зямлі, калі-б у нас зусім нічога ня было, як яны цьвердзяць, дык чаго тады гэтыя людзі лезуць да нас цьма-цьмой, апякунамі нашымі хочуць быць, што як ад заядзі сьляпнёў ад іх абараніцца цяжка?

Ціха прысела побач Дуня й зірнула Януку ў вочы.

- Ну як я?

Задуманы, Янук не адказаў.

- Чаго маўчыш? Скажы, ці добра я прачытала.

Хлапец зірнуў на мілы тварык, на якім вялікімі колерамі задавальненьне зьзяла. Усьмешка шмыгнула ля вуснаў.

- Выдатна. Давай, пацалую цябе за гэта.

Ня думаў так сказаць. Само вырвалася. Зачырванеўся. Макатунішка ўсьміхнулася.

- Пасьля. Добра?

Ня ведаў ці дзяўчына жартуе, ці што. Уважна зірнуў у ейныя вочы. Зьбянтэжыўся. Тымчасам Сабалеўскі канчаў.

Янук узыйшоў на сцэну паважна, не сьпяшаючыяся і, як раней ужо меў намер зрабіць, паволі акінуў зрокам залю, зірнуў уздоўж і ўпоперак на падвязаныя пад жаночыя падбародкі хусткі, на школьных

сяброў і прадстаўнікоў ад уладаў у крэслах на самым перадзе. А ў вушах гучэў яшчэ голас Сабалеўскага:

- Малады паэт, вучань нашай школы Янук Бахмач цяпер прадэклямуе свой верш, прысьвежаны вялікаму дню Сакавіка!

І ў гэны момант ведаў Янук, што страх прайшоў, што на залі зацікаўленьне. Вярнулася пэўнасьць. І пачаў гучным голасам:

Сакавік ладзіць слаўнае веча,
а ў тэатры гудзе, бы ў вульлі,
пазьяжджаліся зблізку й з далечы
пасланцы беларускай зямлі.

Каб палепшыць свой лёс, сваю долю,
селі побач сяўбіт і жаўнер -
Вон чужынцаў! Зямлю нашу й волю
аддаём мы народу цяпер!

Затаіў Менск сталічны дыханьне,
сустракае народжаньня дзень.
І зазьзялі зарніцы сьвітаньня, -
у нябыт адыйдзе ночны цень.

Прэч Расею, прыгон і няволю!
Беларус стане сам гаспадар,
прыйдзе шчасьце на месцы нядолі,
запануе свабодны ўладар.

Спасьцярог Бахмач, дэклямуючы, што навет смаркаты Стась рот разявіў, зацікавіўся. Але думка сканцэнтравалася на наступных радках, а ў такой сытуацыі амаль нічога, апроч агульнае масы людзей, ня бачыш. Верш канчаўся. Апошнюю зваротку Янук запаволіў, із смакам, галасьней, падчыркнуў:

Сьцеражы, Беларус, сваю долю,
каб чужу не вярнуўся прымус, -
няхай згінуць кашмары няволі,
хай заўсёды жыве Беларусь!

Вялізная бура воплескаў. Янук нязграбна пакланіўся й зь вялікім паднечаньнем зыйшоў са сцэны. І ў момант зыходжаньня зірнуў на Стася. Той плёскаў у далоні, а ў вачох яго шэрых, такіх звычайна нянадта кемлівых, здалося Януку, паказалася іскрынка зьдзіўленьня. Перад Януком стаяла Дуня й ейныя вочы сказалі ўсё.

- Маладзец. За гэта цябе варта пацалаваць.

Дзяўчыніна рука моцна сьціснула ягоную далонь і дрыжыкі разьліліся па юнацкім целе. Цяпер тое нецярпеньне й страх, што поўніў яго перад дэклямацыяй, адыйшоў, адплыў... замяніўся першай гарачай усёпаглынаючай хваляй пахвалы. Яна была тымбольш значная, бо прыйшла ад самых блізкіх людзей. І калі першая хваля адыйшла, Янук, задаволена сьціскаючы Дуніну руку, разглянуўся навокал. Дырэктар яшчэ штосьці гаварыў на сцэне. І потым зноў былі харавыя песьні, і наапошку гімн «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

Задаволеная грамада доўга яшчэ не разыходзілася дамоў. Адно не хапала музыкі. Нехта раней прапанаваў, каб пасьля ўрачыстасьці патанцаваць пад сваю школьную аркестру, але замінаў гэтаму вялікі пост і забарона хадзіць вечарамі. Хаця-нехаця людзі разыйшліся. А Дунін пацалунак падарозе дадому доўга помніўся Януку.

21

Асьвеньцым, Гулаг, Бухэнвальд, Дрэздэн і Ковэнтры, Катынь, Хатынь і Лідычэ... Гірашыма... Нагасакі... Апэрацыя «Кілгол»...

Пералік можна прадоўжыць...

Выдатныя помнікі варварства цывілізаванага, «прагрэсыўнага» чалавека 20-га Стагодзьдзя. Помнікі, што так ці накш у нашу сьведамасьць уеліся. Вобразы пакут, суцэльнага зьнішчэньня, нэгацыя Бога й Ягонае навукі. А дзе ў параўнаньні з гэтымі гістарычнымі гігантамі дробненькая макулінка попелу, што звалася Залатухай?

Гэта не праслаўленыя Лідычэ й не разбарабаненая ліхой варожай прапагандай Хатынь. І ў тэй Хатыні, у сьпіску ймёнаў вёсак, спаленых на нашай бацькаўшчыне двума напасьнікамі разам з жыхарамі іх, Залатусе паміну няма. Здавалася-б, гісторыя з памяці яе вымазала. Ня

згадваецца яна і ў Беларускай Савецкай Энцыкляпэдыі, што называе зьнішчаныя вайной акупантамі мясцовасьці, у якіх было больш чымся па пяцьдзесят жыхароў.

Пацікаўцеся раёнам, дзе Залатуха была. Спытайцеся старых. І там Залатуху на першае месца не паставяць. Хутчэй пачуеце пра вялікія Азярцы, што па дарозе з Докшыц у Пархвенава былі. Удзень на гасьцінцы ля вёскі пад нямецкай ваеннай аўтамашынай міна ўзарвалася. Акупант пастанавіў, што ўдзень бальшавіцкая банда міны не магла падлажыць. Сьцягнутыя карнікі мэтадычна вымардавалі ўсіх жыхароў вёскі й спалілі ўсе будынкі. Яшчэ пачуеце пра Шунеўку, а нехта іншы згадае як карнікі Латышы палілі Торгуны ці Ластавічы.

Гэта ўсё было, але куды пазьней. Спачатку-ж у тым раёне спалілі, разам з жыхарамі, Залатуху і ў той раньні пэрыяд ліквідацыя яе голасным рэхам расплылася па ваколіцы, урэзалася й назаўсёды асталася ў памяці асобаў з нашага апавяданьня.

Ляжала яна ў суседзтве вёскі Вярэнькі, на поўдзень ад двухшляховай чыгункі між Пархвенавам і Будславам, бліжэй да апошняга, дзе стаялі немалыя вайсковыя адзьдзелы Немцаў і Ўкраінцаў. Апошніх мясцовыя жыхары называлі ўкраінскай паліцыяй. У вадрозьненьне ад мясцовай, чорнай паліцыі, якой у Будславе тады ня было, Украінцы насілі зялёную вопратку.

У Залатусе было ўсяго сем гаспадарак, усе жыхары каталікі. У той вясеньні вечар залатускі селянін думкамі да касавіцы рыхтаваўся, пазіраў на свае мазолістыя рукі, мяркаваў зь якога кута, яшчэ перад усходам сонца, войстрая каса пачне ў сакавітую асаку ўядацца. І якім чынам мог спанатрыць, старанна клепячы на бабцы зьлізанае лязо касы, што заўтра ўпоперак дарогі на сенажаць стане вогненная, што ўсё да тла спаліць, Садома?

У гэны лагодны, цёплы вясеньні вечар перагукаліся ў калішнім панскім лесе нястомна-галасістыя зязюлі й лічыла залатуская малеча дый старэйшыя колькі адна ці другая шэрая, нявыглядная птушка накукуе гадоў...

У той дзень на захад сонца ля бусьлянкі кружыў прыгожы птах. Бусьліха на яйках драмала. І ці нейкім няведамым спосабам магло памясьціцца ў бусловай галаве, што заўтра й бусьлянку, што на баране, дый самае гумно, на страсе якога яна знаходзілася, спаліць пражорлівы

агонь, а яму з абсмаленай бусьліхай няведама куды ўпрочкі трэба будзе з гэнага папялішча адлятаць?

І шмат звычайных і простых, нармальнага будзённага парадку, рэчаў адбывалася ў гэны вечар у невялікай вёсцы Залатусе. Навокал буйнела й красавалася шматколерная сакавітая прырода. Неадкладнае ўвагі вымагалі нікім непалічаныя дробязі пярэстага сялянскага жыцьцця. Каму было ведаць, што іхная маленькая мясьціна, у сілу нейкіх чужых ідыёцкіх правоў, апынулася на мапе мясцовых уладаў у так званай чырвонай зоне?

Верхам і бокам рынула й міма прайшла на ўсход вайна. Туды ёй і дарога. Праўда, яшчэ раней, напярэдадні гэтай навалы, што абрушылася й сюды але, на вялікае шчасьце, іх мінула, змабілізавалі з Залатухі ў войска Палякі пару дзяцюкоў. Унармаванага кроку вясковага жыцьця не зьмянілі за куртаты час свае акупацыі і ўсходнія «вызвольнікі».

Няхай сабе й гэта надта вялікая, ужо куды, як выглядала, большая за папярэднія войны. Ім, да зямлі ад веку прывязаным, адно араць, сеяць, плёны зьбіраць, статак гадаваць, сем'і даглядаць, сыноў жаніць і дачок замуж аддаваць ды памагаць ім на свае ногі станавіцца. Дзіва няма, што і ў гэны вечар адно ўмеру пра вайну думалася.

Праўда, побач чыгунка. Па ёй едуць гарматы, танкі, амуніцыя, харчы, войска. Яе вартуюць і ў роўных прамежках часу ходзяць па ёй у шлёмах узброеныя вартавыя. Не бяз прычыны. Кагадзе побач цягнік на міну наехаў, загарэўўся, былі ахвяры. Але-ж і раней, калі іх тыя з усходу «вызвалілі», надта часта йшлі па чыгунцы цягнікі. Тыя валаклі ўсякае дабро й зброю на захад, а гэтыя на ўсход.

Ведама-ж, вайна. Чуваць было, што ў Будславе ад войска аж кішэла. Ці раз ужо й сюды заглядалі. Дзіву даешся, зьявіліся нейкія, у зялёным, Украінцы. Гаварылі-ж неяк у нос, націскалі на «і» і «лы», але-ж зразумець нешта можна было.

А аднойчы, - гэта дык ужо дзівы-дзівосы, - да сяржаньціхі Юргяліхі, што мела двух, у школьных гадох, хлапчукоў і муж якое дзесьці за Польшчу ваяваў, дый якога сьлед даўно прапаў, вечарам зайшлі вайсковыя ў польскіх мундзірах. Аж чатыры. Павіталіся, з парогу «Езус пахвалёны» сказалі. Надзвычайна прызваіта захоўваліся. Сяржаньціха, жанчына сярэдніх гадоў і яшчэ ў поўнай красе, крыху зьдзівілася й надта ўсьцешылася, нечаканых гасьцей навет угасьціць

манілася. Тыя ветліва адмовіліся, а ў гутарцы, быццам мімаходам, пыталіся, ці больш яна любіць Немцаў ці Палякаў. Ня скрываючы свае радасьці й ня маючы ніякіх прычынаў да падазрэньня, сяржаньціха асьветчыла, што, бязумоўна, яна любіць Палякаў. Тужлівы па страчаным калісьці добрым жыцьці «за польскіх часоў» голас поўнасьцю пацьвердзіў кірунак сяржаньцішынай ляяльнасьці.

Праўда, крыху зьдзівіла яе стрыманасьць, нейкая зьвязанасьць наведвальнікаў. Суседзі-ж вымяркавалі, што недзе ў ваколіцы зьявіліся польскія банды. Дый ці яны адны ў лесе сядзелі? Працаваў-жа раней у гэтай самай сяржаньціхі прыдзелены воласьцю савецкі палонны. Той, каб яго трасца, зіму адзімаваўшы, адпасьвіўшы жывот, да нейкай бальшавіцкай банды ў лес павалачыўся. Ваўка, як кажуць, як ні кармі, усяроўна ў лес цягне.

Здарылася пасьля адыходу таго Ванькі ў лес нешта нязвычайнае. Ні раз і ня два, а ажно тры разы нехта ноччу раськідаў у вёсцы бальшавіцкія афішкі. «Сьмерць фашыстам» сулілі. Як на зло, якраз у наступны дзень тыя вайсковыя з Будслава ў Залатуху зьявіліся дый распытвалі чыіх рук гэта работа. Вядома-ж, ніхто ў вёсцы такой брыдотай не займаўся. Сумлеву ня было. Хто гэта каго ў такой малой вёсцы ня ведаў? Як і ўсюды ў Беларусі, былі тут і свае пахатухі, якія чамусьці лічылі абавязкам даведацца кажную макулінку: што хто еў на харчаваньне, які хлапец на якую дзеўку зірнуў, ці што гаварыў, чыя авечка зараньня акацілася, хто й чаму яшчэ падаткаў не заплаціў. Шмат мякіны ператрасалася, каб адно зярнятка дзе якое знайсьці.

Візыты чужынцаў выклікалі трывогу й страх. Немцы зьбіралі на вуліцы ўсіх жыхароў, доўга трымалі пад зброяй, распытвалі пра афішкі й бандытаў у лесе дый рабілі розныя, здавалася зусім недарэчныя, пагрозы. Асабліва да моладзі прыставалі. Але што гэтым простым сялянам было да таго, што нейкія мярзотнікі ноччу афішкі параскідалі, ці тое, што збоку грымела пераладаваная ваеннымі цацамі чыгунка, або тое, што да сяржаньціхі Юргяліхі людзі ў ваенных польскіх мундзірах прыходзілі? І думалася, што паколькі яны зусім нявінаватыя, дык у найгоршым выпадку прыедуць з Будслава раз ці другі вайсковыя, зьберуць іх, пачнуць распытваць, пагражаць. Ну не павесяць-жа!

Аднае ночы бальшавіцкія бандыты забралі й пагналі ў лес двух дзяцюкоў. Калі адзін зь іх уцёк дамоў, за пару ноч па яго прыйшлі.

Змусілі людзей выдаць яго сховішча й пагналі назад у лес. Такім чынам у ваколіцы ўстанавіліся дзьве ўлады. А залатускія не зьвязалі ўсіх гэных выпадкаў і фактаў на адну нітку, не падсумавалі й не зрабілі належных высновaў. Вы ваюеце, дык ваюйце... Вам, вайсковым, вайной, а нам, сялянам, зямлёй займацца. Нас кліча поле й луг, і лес, і сад, і город.

І ў тую кароткую вясеньнюю ноч, зьняможаная працай, ціха адпачывала Залатуха. Супакой трывожыў адно рэдкі брэх сабак і тая-ж самая чыгунка. Скрыпучы канцэрт пеўняў пад раніцу будзіў старэйшых. Пазяхалі, дый задаволеныя, што яшчэ ўставаць ня трэба, засыналі. І ўжо калі на ўсходзе зазьзялі зарніцы, усхадзіліся канцэртам у кустах салаўі. Цёхкалі, тахкалі, высьвістывалі, ёхкалі, ахкалі ды быццам на цымбалах трымкалі. А з сонцам вітала новы дзень Залатуха.

Першыя спасьцераглі людзей у зялёным, із зброяй напагатове, пастухі. Выглядала. што жаўнеры абкружылі вёску й відаць, што ім ня рупіла, бо стаялі. Тут-жа побач трымалі запрэжаных у каляску коняў. Ці не на якія манэўры выбраліся? Некалі тыя «манэўры» ўеліся бокам сялянам. Пры Паляках гэйсалі на конях уланы, часта вунь якое шкоды на полі нарабілі. Ды тады-ж і вайны, як цяпер, ня было. Залатускіх сялянаў, каторыя ўмелі глядзець, зьдзівіла ня самая прысутнасьць войска, а нешта іншае. Гэтыя жаўнеры чамусьці нічога не пачыналі, а наадварот - пілі нешта з пляшак, закусвалі, нечага ці некага чакалі. Галасы іх, спачатку стрыманыя, набіралі сілы, якраз як гоман падпіўшых людзей.

Сонца ўжо паднялося, што качаргой яго не дастаць, калі ў некалькіх мясцох каля вёскі гаркнула каманда й пачуліся сьвісткі. Із зброяй напагатове, ланцугамі, жаўнеры набліжаліся. Такому няштодзённаму зьявішчу прыглядаліся затрывожаныя сяляне. Зноў усіх зьбяруць і гадзінамі будуць трымаць пад зброяй, выпытваць? Напалоханыя пастушкі, дабегшы да сваіх хатаў, паднялі алярм. Жаўнеры зганялі статак у вадно месца. Такога яшчэ ня было.

На полі чуліся стрэлы. Каторыя людзі ўжо выйшлі на працу, тыя, пакідаўшы прылады ў вёску сьпяшылі. Павыбягаўшы з хат, на вуліцы гаманілі няўцямныя жанчыны й дзеці. Брахалі сабакі, кудахталі куры.

- А людцы мае, чаго-ж гэта ім?

- Матка Боская Чанстахоўская, ратуй нас!

Мужчыны ўспакайвалі жанчын.

- Ціха ты, Адэля, ні лямантуй. Падзіржаць ды пусьцяць.

- Ня відзіш, што нікаторыя зь іх п'яныя? Каб вас гаручка, чаго вам яшчо трэба!

Стрэлы грымнулі збоку, блізка напалоханых людзей. Па сабаках. Бялявы хлопчык падбег да чорнага сабакі, які бэцнуў вобземлю.

- Так тобі, чорт, і надо...

Каржакаваты цёмнавалосы ваяка сакавіта вылаяўся.

- Шнэль, шнэль! - дзёр горла нямецкі афіцэр.

Было іх, відаць, два зьвязы. Калі адна група абкружыла на вуліцы людзей, іншыя пабеглі па хатах. Дзьверы адчынялі ўдарамі ботаў і прыкладамі стрэльбаў. Дзесьці трэснулі рамы ў вакне й пасыпалася шкло.

- Божачкі, чаго гэта яны? Мусіць канец...

- Якая ім трасца трэба, каб іх зімля ні насіла!

Маткі ўспакайвалі перапалоханых дзетак. Чарга стрэлаў загрымела над галовамі.

- Швайгэн, унтэрмэншэн!

Войстры, як брытва, голас. Навокал дрыжачых ад нечаканага нападу сялянаў пагрозьліва тарчэлі настаўленыя рулі стрэльбаў і аўтаматаў. Вочы карнікаў не варажылі добрага.

- Тыхо! - крыкнуў побач Немца падафіцэр. - Зыбралы вас, шчоб поговорыты. Давайтэ спокійно!

Крыху апанаваўшыся, людзі маўчалі, адно скуголілі дзеткі. Сяржаньціха Юргель не магла сваім вачом паверыць. Так, сумлеву ня было. Тойсамы шрам наўскасяк левае шчакі, вочы, што ва ўпор глядзелі. Але тады яны, здаецца, больш лагодныя былі. І тады на ім быў польскі мундзір з адзнакамі афіцэра, дый ласкавы, хоць стрыманы голас. Жанчыне ў вачох пацямнела.

Жаўнеры цягнулі з хаты лысага, сівога мужчыну. У зрэбнай бялізьне, ён стагнаў і баранаваў па вуліцы нагамі.

- А каб вас... Ён-жа хворы!

Старэйшая жанчына кінулася да жаўнераў, што цягнулі хворага.

- Цікай, курво!

З гэткімі словамі адзін зь іх з усяе моцы стукнуў сялянку прыкладам стрэльбы ў грудзі. Яна ўпала, кінулася ў мольбы й

праклёны. Вывалаклі з хатаў яшчэ пару чалавек. І тады рэзка сьвіснуў нямецкі падафіцэр.

- Марш!

Карнікі пачалі насядаць на сялян. Маршы трываў нядоўга, Прыгналі на край вёскі ды напіраючы рулямі зброі, загналі ў гумно, тое, самае, на страсе якога стаяла бусьлянка. Закрылі скрыпучыя вароты й злажылі іх жардзінай. Гэтта-ж з пад'ехаўшай хурманкі жаўнеры хапілі каністры й аблілі сьцены бінзінай. Іншыя клалі побач снапы кулявой саломы.

Сьцяміўшы, як выгладала, найгоршае, рос у гумне трывожны гоман і лямант. Успыхнула салома й агонь вялізнымі языкамі ахапіў сьцены. Зь сярэдзіны выбухнуў марозячы кроў у сэрцы крык і енк.

- Так вам, вражы ляхі! - адказаў з гэтага боку карнік.

Магутным напорам людзі намагаліся выпхнуць з гумна вароты. Яны ўжо трашчэлі, вось-вось меклі рашчыніцца. І тады гаркнулі кулямёты. Пачуліся прыглушаныя стогны, кашаль. Пісклівыя дзіцячыя галасы мяшаліся з трэскам дрэва й праклёнамі старых. Над страхой распрасьцерліся крыльлі, бусьліха пакінула гняздо. Полымя з дымам раптоўна паглынула гумно. Калі абвалілася страха, дзьве фігуры, з палаючай вопраткай, выкуліліся пераз зруб у бульбоўнік з другога боку. Карнікі іх не заўважылі.

Пакінуўшы колькі людзей пры дагараючым гумне, карнікі цяпер рассыпаліся па вёсцы, зьбіралі ў месца хатнюю жывёлу й птушку ды неўзабаве пачалі падпальваць усе будынкі. У гэны час па чыгунцы імчаўся наладаваны аграмаднымі танкамі цягнік.

Пад вечар ля папялішчаў Залатухі хадзілі людзі з суседніх вёсак. З усіх жыхароў невялікай вёскі ўцалелі мужчына й жанчына, што пераз зруб гумна выскачылі ў бульбоўнік, ды пасьля вылячыліся ў Даўгінаўскім шпіталі. І яшчэ ўцалелі дачушка й сынок Юргяліхі, якіх жанчына шмат раней чым патрэбна выслала ў школу ў Вярэнькі, загадаўшы, каб падарозе з патрэбай да сваякоў заглянулі.

Жудасны, навет для ўяўленьня цяжкі, злачын напоўніў жахам ваколіцу. Доўга не змаўкала пад саламянымі стрэхамі гутарка. Злачын абмяркоўвалі на розныя лады. Шмат дакладалі самі апавядальнікі. Янук пачуў пра Залатуху ад Антося Дзеркача, які скупіўся на словы.

Магчыма, што ня ладзіў зь Нінай бо тая, як выявілася, дамагалася шлюбу, а жанчыны казалі, што зацяжарыла.

Антось расказаў Януку самае галоўнае. І ў гэны дзень Янук, быццам адурманены, хадзіў-блудзіў па гародзе, садзе, нідзе не знайходзіў супакою. Навокал у самую сілу ўбралася лета. Буйнела, цьвіла ўся прырода. Як і кажны дзень, гулі ля вульлёў працавітыя пчолкі. Усё, здавалася, як нармальна. Ды не... Дзесьці ў вагні спапяліліся нявінныя ні ў чым жыхары аднэй вёскі. Што яму да іх? Ці ён іх знаў, ці што?

Як мог, супакойваў сябе, выдумляў ці адно апраўданьне, але раўнавагі не знайходзіў. Чаму? Ужо із школы ды зь беларускіх газэтаў неяк улажыўся погляд, проста прыняўся ды здабыў права грамадзянства факт, што Немцы ёсьць прыяцелямі Беларусаў. Папростаму гэта тлумачылася, што яны далі Беларусам правы, якіх апошнія даўно ня мелі, гэта значыць далі школы ў роднай мове, мясцовую ўладу ды яшчэ сёе-тое.

Калісьці для Януковай наіўнай галавы падзел на сваіх і чужых, ворагаў і прыяцеляў быў куды прасьцейшы. Маскалі й Палякі былі ворагамі. Ад іх беларускі народ дазнаў найбольш крыўдаў і ганьбаваньня, зь імі вельмі доўга змагаўся за волю. Ад няпамятных стагодзьдзяў, як нейкая ненажэрная й прагавітая хэўра, лезьлі яны на зямлю, прасякнутую крывёй і потам беларускім, умошчаную касьцямі нашых продкаў. Быццам свайго ім было мала, мусіць не маглі пражыць на сваіх Мазурах ці Памор'і, Тамбоўшчыне ці Разаншчыне. Відаць, што ў гэтых народаў пераважна рабаўнічы нахіл хі яшчэ што ў нацыянальным характары. А такія сумежныя народы, як Латышы, Летувісы ці Ўкраінцы былі прыяцелямі. Здавалася, што яны таксама жылі пад пагрозаю Масквы ці Варшавы. Праўда, Летувісы заўсёды гарлапаняць, што беларуская Вільня - гэта іхны горад. Дык тут, - ці яны нашы ворагі, ці прыяцелі, - на двое бабка варажыла.

Зусім што іншае - Немцы. Яны й супраць Маскалёў і Палякаў. Адных на лапаткі палажылі, а зь іншымі цяпер змагаюцца. Значыцца, калі згадзіцца з аксіёмай, што вораг твайго ворага ёсьць тваім прыяцелем, дык Немцы, бязумоўна, маюць быць хаўрусьнікамі Беларусаў. І ці-ж ня доказам гэткае дружбы было тое, што яны далі Беларусам мясцовую адміністрацыю, дазволілі адкрыць беларускія

школы? Паадчыняліся вунь беларускія бібліятэкі, выходзяць амаль бяз цэнзуры беларускія газэты й часопісы.

Праўда навокал такое, здавалася-б, простае аксіёмы, грамадзіліся некаторыя сумлевы. Як вытлумачыць тое, што Немцы, ворагі Палякаў, пусьцілі столькі Палякаў у мясцовую, ці, як яе завуць, чорную паліцыю? Чаму гэта паліцыя, з помачай Немцаў, вымардавала так шмат найлепшых, навет выдатных Беларусаў? Чаму пры такіх начальніках, як акруговы камісар ці камандanты жандармэрыі загнязьдзіліся польскія прастытуткі наводля тае «пірды» Закшэўскай у Гацях, што супольна з паліцыяй намагаюцца вынішчаць Беларусаў?

Ці-ж льга паверыць, што гэта ўсё сталася прыпадкам? Бяручы на ўвагу ведамую нямецкую плянавасьць, грунтоўнасьць і дысцыпліну, як гэта ўсё вытлумачыць? Ці-ж магчыма, што ўсё вышэйзгаданае было Немцамі плянаванае й прадугледжанае? А можа... Не, немагчыма... Жах падумаць! Але як вытлумачыць Залатуху? Чым завінілі тыя сяляне? Пры чым тут жанчыны, старыя й дзеці? Як гэта можна так усіх, цэлую вёску ў вагонь?

Няхай сабе, па праву прыроды, няма роду бяз выраду. Пэўне-ж, у лесе лындаюць бальшавіцкія баньдзюгі, рабуюць вакольных сялян, сілай забіраюць у банды людзей, начамі раськідаюць афішкі, у якіх страшэнна адважна «змагаюцца з фашыстамі». Калі ў вёсцы ёсьць іхныя памочнікі дык трэба іх знайсьці й пакараць. Але навошта тут масавая адказнасьць? Няхай сабе, як чуваць, бралі ўдзел у тым злачыне Ўкраінцы... Але-ж яны дзеялі не на сваю руку, а пад загадам Немцаў. Дык чаму Немцы так робяць?

Янук забрыў аж на Гараватку, спыніўся пад дубам Архіпам. Магутны дуб - самы надзейны сябра. Пад ім так добра думаецца. Зірні ты, Архіп, як сэрца юнака поўніцца горычай, зрок ягоны блудзіць у цемры, а розум ніяк ня можа натрапіць на нітачку, каб разматаць прыказачны клубок. Патрэбны новы падыход. Адносна аднаго ня было сумлеву: зьнішчэньне Залатухі не прыпадковае. Злачынная рука дзеяла ў сілу нейкага закону. Якога? Трэба, здаецца, пачаць разважаць ад элемэнтарнага. Значыцца, перш за ўсё трэба адказаць на пытаньне: на якім практычным праве аснована жыцьцё? Гэта ведама ўжо кажнаму дзіцяці, хаця й не асэнсавана яшчэ ім. Права сілы бачыш на кажным кроку; яно тарнуецца ўсюды, ад найменшай да найбольшай істоты, што ходзіць, лётае, поўзае ці плавае. Чалавек, спрабаваў замяніць гэтае

прыроднае права сілы правам маралі, значыцца душы й сумленьня. Вядома, на помач тут прыйшла рэлігія, няважна ці хрысьціянства, мусульманства, буддызму ці гэбрайства. Усе яны блізкія ў сваіх прынцыпах. Але колькі людзей карыстаецца імі?

А нагласьць сілы відаць на кожным кроку, асабліва-ж вайной, бо вайна ёсьць ня што іншае, як паядынак дзьвюх ці некалькіх фізычных сілаў. Гэтта выяўляецца максымальнае практычнае права жыцьця й суадносінаў між людзьмі: хто дужэйшы, той возьме. Дарма, што церпяць нявінныя. Як права, дзе два дужыя б'юцца, там абавязкова слабому пападзецца.

Янук паставіў пытаньне накш: калі той, што мае сілу, стараецца яе ўжываць, дык ці-ж ня кіруе ён ею? Ён-жа ня зьнішчае ўсё і ўсіх безаглядна; ужыцьцё сілы мае сваю мэту й накіраванасьць. Згода. Дык калі ўзяць,што Немцы лічаць Беларусаў нейкімі свайме хаўрусьнікамі, даюць ім мясцовую ўладу й свае школы, дык навошта яны спалілі Залатуху? У вёсцы-ж жылі іхныя хаўрусьнікі, што прыязна да іх адносіліся, плацілі падаткі, стараліся памагчы як мага. Дык пытаньне практычна зводзілася да наступнага: чаму Немцы, хоць у даным выпадку й рукамі ўкраінскіх наймітаў, паляць сваіх хаўрусьнікаў, мардуюць прыяцеляў?

І вось перад такім, здавалася зусім ясным, пытаньнем Янук стануў у тупіку. Пакуль дайсці да найважнейшага, мусіў узважыць, абмяркаваць і адкінуць шмат другараднага й наіўнага. Дый запраўды ў ягоных гадох навет дабрацца да такога галоўнага пытаньня ўжо было немалым асягненьнем. Ягоныя равесьнікі, хаця-б гэны Стась ці навет старэйшы Ўладзік, ніколі-б такімі катэгорыямі не патрапілі думаць. Ім навет у галаве не мясьцілася думка пра нейкія глыбейшыя разважаньні. Працэс сялянскае думкі быў просты: калі аднекуль зьяўлялася вестка, перш за ўсё чалавек хацеў дакладна ведаць «што», а ўжо радзей каторы селянін запраўды намагаўся адказаць на пытаньне, як сьлед грунтоўна, «чаму» нешта збылося ці здарылася. А гэтта Янук разважаў пра адну з найцяжэйшых праблемаў жыцьця: суадносіны сілы з мараляй, дабра із злом і з гэтага выводныя. Дык канкрэтна: чаму Немцы мардуюць і паляць сваіх прыяцеляў і хаўрусьнікаў?

Калі гэта запраўды так, дык выходзіць, што Немцы або павар'яцелі, або зусім ня ведаюць, што яны робяць. І адно й другое выключалася. Калектыўна Немцы ня былі вар'ятамі дый ведалі яны,

відаць, што рабіць. На пытаньне аніяк нельга было адказаць. А можа пытаньне дрэннае? Давай, разваж па слоўцу: Немцы мардуюць сваіх прыяцеляў... Два ключовыя словы: Немцы й прыяцелі...

Янук пачаў з заклапочаньня церабіць свае вясной ужо пабялеўшыя валосы, прадчуваючы, што бліжэй да карэньня дабіраецца. Немцы й прыяцелі, Немцы й прыяцелі... Немцы і... Нешта тут не ў прадку. Немцы абапіраюцца на безагляднай сіле. А ці чалавеку, ці народу, які базуе ўсё на сіле, надта на прыяцелях залежыць? Скарэй слабому сябра патрэбны, а моцны, значыцца дужы, ён сам чуецца як Бог. Згода. Дык ці адпавядае гэтта слова прыяцель ці навет хаўрусьнік? І хто яму сказаў, што Немцы прыяцелі ці хаўрусьнікі Беларусаў?

Раптам нарадзілася думка. Падсьведама адчуваў Бахмач, што гэта й быў той асноўны, галоўны адказ, да якога вобманцкам, саматугам дабіраўся. Запраўды, калі прыняць мяркаваньне, што Немцы, як Палякі ці Маскалі, прыйшлі на гэтую пакрыўджаную зямлю як рабаўнікі, новыя паны, махляры, прыгнятальнікі, дык усё, што навокал адбывалася становіцца ясным, як сьветлы сонечны дзень. Немцы ў ліку ворагаў! Жахлівая, але праўдападобна добра абаснованая, думка. Адно якая-ж будучыня? Цяпер во спалілі, разам з жывымі людзьмі, Залатуху. А можа гэткіх злачынаў будуць яшчэ сотні ці тысячы?

Жах, жах!

У вабліччы такога нячуванага варварства якое значэньне мае тое, што народ атрымаў права навучаць дзетак у школах у сваей мове, ці тое, што ёсьць пару газэтаў ці часопісаў беларускіх? Якую вагу мае беларуская ніжэйшая адміністрацыя? Ці калі які шваб зьбярэ сваюэ здысцыплінаваную банду, возьме на прыпрэжку якіх Украінцаў, як у Будславе, ды задумае паехаць і спаліць цэлую вёску разам з жыхарамі, у тым ліку дзеткамі, жанчынамі й старымі, - усімі зусім безбароннымі й нявіннымі людзьмі, - дык ці яго спыніць які старшыня вёскі ці старшыня воласьці зь беларускай адміністрацыі? Няхай адно пікне, сам першы кулю ў лоб дастане. Гэта хто калі чуў ці бачыў, каб Немец слухаў якога чужога задрыпанага старшыню воласьці?

А калі так, дык значыцца гэта мясцовая, свая адміністрацыя ня мела ў вачох акупанта зусім ніякая вагі. Ды не, пачакай-жа. Нейкую вагу мела бо для нечага-ж яму была патрэбная. А для чаго? Зусім ясна: яна памагала акупанту зьбіраць харчы, падаткі, гнаць людзей на працу,

іншымі словамі - ссаць жывыя сокі з паняволенага народу. Няйнакш, так яно й было.

І на пацьверджаньне гэткіх сваіх выснаваў Янук пачаў згадваць нямецкія зьдзекі над свайміі людзьмі, якія ён сам бачыў. Амаль ня было чаго згадваць, адно хіба той вуж хурманак, што на гару глыбоцкага пяшчанага гасьцінцу ня мог з наладаванымі вазамі ўзабрацца, а ён із Дуняй задалёку прыглядаліся як Немцы сялянаў лупцавалі. Мо й шчасьлівы, што большага ня бачыў. Ня дай, Божа, бачыць якую Залатуху, ці трапіць у рукі польскай, пад нямецкай камандай, паліцыі, ды стануць перад руляй стрэльбы на расстрэл. Або цярпець ці гінуць разам з Жыдамі. Жыды, якія-б яны ня былі, усё-ж гэта людзі. І калі гэта праўда, што Немцы пагалоўна іх вынішчаюць, дык ганьба Немцам! Што гэта за народ такі? Немец - вораг! Немец - кат беларускага й іншых народаў. Значыцца, як выглядала, найбольш зьдзеклівая сіла на сьвеце ўзьлезла нам на плечы. Вось адкрыцьцё!

Янук і задаволены быў з таго, што ён сам, бязь нічыя помачы, дайшоў да разгадкі такое тайны. Не сказаў яму пра гэта простымі словамі ані Антось Дзяркач, ані Кастусь Падгайскі, ані хто іншы. Пэўне-ж, яны пра гэта ведалі, але чамусьці яму, проста ў рот, пажваўшы, улажыць не хацелі. Хто-ж іх ведае... Цяжка было сумлявацца, што такія разумныя й пранырлівыя дзядзькі ня бачылі таго, што яму, як-ніяк, наіўнаму юнаку, раптам стала зусім зразумелым. Трэба будзе калі, як кажуць, проста з мосту спытацца іх пра гэта.

Тымчасам, думкі вялі далей. Калі Немцы ёсьць нашымі ворагамі, дык на іх палягаць нельга. Наадварот, каб свайго дамагчыся, дык мо калі змагацца зь імі прыйдзецца. Але як і чым? І каго на помач клікаць? І як змагацца з такой магутнай, няпераможнай сілай?

Рад і ня рад быў Янук з прычыны такога жахлівага адкрыцьця. І ў гэныя юначыя гады падсьведама адчуваў, што яму наканавана было не стаяць бязьдзейна з боку. Ясна, можна было рабіць і так, як захоўвалася вунь бальшыня людзей: пасыўна прыглядалася ўсей гэтай разьні, забойствам, вынішчэньню свайго насельніцтва. Абы іх не краналі. Ого! Што не, дык не! Янук да такіх авечак сябе не залічаў. Ужо калі прыйдзе момант, што да сьцяны прыпруць, дык ён бяз супраціву ня дасца. Але, цьфу! Усё-ж, якая дурніца зь яго: перш, - і

самае галоўнае, - трэба ня дацца, каб які чужы ці свой нячысьцік да сьцяны цябе прыпёр. Гэта самае галоўнае!

Што, прыкладам, сталася-б, калі-б вораг наважыў зрабіць зь Літоўцамі тое, што зрабіў з Залатухай? І гэтта-ж недалёка чыгунка, і тут можа бальшавіцкая галота вылезьці з Гаравацкае пушчы й падлажыць міну на чыгунку, раськідаць у вёсцы якія афішкі ці каго сілай забраць у свае банды. Могуць справакаваць Немцаў, каб і ў вадносінах да Літоўцаў ужылі меры ваеннае адказнасьці. А калі спосаб пакараньня нявіннае Залатухі быў ня прыпадковым, а нейкай нормай ваеннага часу, дык колькі беларускіх вёсак і колькі людзей можа пайсьці яшчэ з дымам?

Янук пазіраў на сваю мірную, залітую летнім сонцам, вёску. Танула яна ў садох і прысадах. Нівы палавелі жытам, зелянелі ярыной, а дзьве сосны шапталі сабе сакрэты на могільніку. І тады спрабаваў Янук уявіць, што аднаго дня ягоную родную мясьціну, як нядаўна Залатуху, возьмуцца языкі агня папяліць... Ды не! Адганяў думкі, як статак назойлівых аваднёў.

Гэтак, заглыбіўшыся ў бязвыхаднае, Янук зыйшоў з Гараваткі й адно ля гумна пачуў бацькаў голас: - А ты дзе гэта бадзяешся? Бяры во граблі, пойдзем у Пральлю пракосы варочаць.

22

У Гаравацкай пушчы часта пераклікаліся совы, а ў вёсцы не гарлапанілі яшчэ першыя пеўні. На чыстым зорным небе рагацінай вырысоўваўся гігант Архіп. Лагодны заходні ветрык ледзь варушыў лісьцямі дрэваў. Паважна й таямніча пахіліўся паточаны шашалем крыж. Дзесьці на гасьцінцы ў лесе затарарахалі па карэньні калёсы, а ў Літоўцах спрасоньня лена загаўкаў сабака. Хто там на гасьцінцы ў гэту пору ехаў? Паліцыя, ці хто? На станцыі ў Гацях, як заўсёды, кіпеў ніколі няспынны рух. Калі мясцовае насельніцтва спала за пазачыняными загадам дзьвярмі, на вуліцах, чыгунках і дарогах гаспадарылі людзі ў мундзірах.

Апрануты ў летнюю сьвітку, Антось абмацаў нож за пазухай, выцягнуў зь кішэні й пачаў смактаць сакавітую, што проста таяла

роце, ранэтку ды цэлы час пільна ўзіраўся ў адзін пункт. Калі гэты недабітак задумае наведаць бацькоў, дый калі мае прыйсьці па яго, каб яму «лясьнічоўка бокам вылезла», дык гэта, здавалася, адзіная дарога, на якой яго неспадзеўкі можна злавіць. Знаў Антось гэту Гаравацкую сьцежку, што вяла ў пушчу, як сваю даланю. Ведаў на ёй кажны гарбок, ламень, ямінку, кажную пахільнасьць ці зьмяіную крутасьць. А месца сабе выбраў такое, што падарожнік ніяк не спасьцеражэ. Прылёгшы-ж збоку, яго можна вельмі лёгка асачыць. Іншая рэч, калі-б чалавек з сабакам зьявіўся. Тады небясьпечна. Але ў запасе меў наган. А тымчасам сядзеў на камяні, кусаў ранэтку й думаў.

Насамперш - Ніна. Калі-б зацяжарыла, ці ня прызналася-б яму? Дый відаць было-б, як папаўнела-б. А жанчына дамагалася, каб шлюб узяць ды ўжо не намякала, а проста патрабавала, каб дзіця мець.

- Я з гэным старым лунем колька пражыла... Ён, аказваецца, толька сілу цяглавую хацеў мець, а не сям'ю. А ты што? Дзяцей баішся?

Нязручнае становішча. Трэба было тлумачыць тое, пра што Ніна слухаць не хацела.

- Ніначка, любая мая, - пачынаў лагодным, ціхім голасам. - Ці ты ўжо забылася, як мы проста зь пекла выратаваліся? Ці цяперака той час, каб дзяцьмі абзаводзіцца?

- Што гэта ты ўсё не перастаеш пра гэна пекла? Выратаваліся, ну й дзякуй Богу. Але-ж цяперака жыць ды дзяцей мець трэба.

Жанчына ў сьлёзы кідалася. «Бабы, дурасьць. Як гэта да вас гаварыць, каб вы ладам жыцьцё скумекалі?» - разважаў у думках Антось.

- А ці ня відзіш ты, што робіцца? Як гэта цяперака дзіця на сьвет пушчаць? Сабе рукі зьвяжаш. Навалач нячыстая людзей б'ець, спакою ні даець, жыўцом паліць. Самім можа яшчо прыйдзецца гняздо пакідаць... А тады як зь дзіцём?

І намагаўся спатоліць каханую жанчыну цалункамі, абяцанкамі. Цяжэй было вытлумачыць ей, чаму ад некаторага часу, даведаўшыся ад Захарука пра Лявона, у гумно спаць хадзіў. Справа простая. Таго шалапута, самога ці зь кім, помсты прагнага, калі зьявіцца ў двор зь візытаю, прывітае Ромка. Антось, каторага Лявон будзе спадзявацца знайсьці з жонкай у пасьцелі, атрымае ў рукі ініцыятыву. Ніна зразумела й больш ня ліпла з назойлівымі пытаньнямі.

- Ну а калі ён, ці яны прыйдуць у хату, тады мне што рабіць?

- Ромка разбудзіць. Ня бойся. Старайся задзержыць іх, у плач кінься, ці што, займі іх. А я, - увідзіш, - прылаўллю іх сукіных сыноў.

Неўзабаве Антосю ў галаву зусім іншая думка прыйшла. Калі Лявон не жартаваў, - а на такія жарты ён быў зусім няздольны, - ды ляпнуў там нейкаму Барабоську пра свае намеры, дык усё-ж ня мог ён зусім уцёмную ў Літоўцы йсьці. Найлепш, - разважаў Дзяркач, - каб спанатрыць Шпунта, трэба паставіць сябе на ягонае месца. Ведаў таго як сваю пецярню. Значыцца, першае, Лявон Шпунт хоча мець Дзеркача ў сваіх руках. Калі пайсьці ў Літоўцы, трэба ведаць што там робіцца, дзе жыве Дзяркач і што ён робіць. Як здабыць неабходныя весткі? Літоўцы не ляжалі ў бандыцкай зоне. Адылі пушча падходзіла да самага калішняга хутару Лазоўскага, а адтуль, пераз Гараватку, да бацькую як рукой падаць. Дык чаму не пачаць некалі топтанымі сьцежкамі? Асабліва для маткі вялікая радасьць была-бы. Ня бачыла-ж дарагога сынка ад таго часу, як некалі ў лес есьці яму насіла. Магчымасьць адведаньня Лявонам бацькоў была зусім праўдападобнай. Гэткую думку быццам Паўлоўскі пацьвердзіў.

- Ты ведаеш, Антось, дзе цяпер Лявон Шпунт? - спытаўся не такі, як раней фанабэрысты солтыс.

- Лявон? - пацерабіў галаву Дзяркач. - Дык-жа казалі, што прапаў недзіка. А чаму я маю ведаць?

- Так сабе, можа што дзе чуў. Неяк мне здаецца падазроным, што быў-жыў чалавек і раптам яго ні стала, як пад зямлю прапаў...

- А чаму ён табе ў галаву прыйшоў? Калі хочаш што знаць пра яго то чаму табе старых Шпунтоў за язык ні пацягнуць?

- Стараўся ці раз раней, і ўчорака. Кажуць, што недзе зыйшоў ды ўсё. А пасьля сьцяной маўчаць. Вы-ж, пэўне, можаце дагадацца, кажу, дзе ён ёсьціка. Дык скоса паглядаюць, як-бы ўквяліў я іх.

- Дык ты і ўчорака да іх хадзіў?

- Ага. Ведаеш, цікава. Пазаўчорака за поўнач гэта было. Выйшаў я на двор, ня спалася мне, ды чую, што Шпунтоў сабачонак забрахаў. Брэшуць сабакі, вядома, на тое яны сабакі, каб брахалі. Але гэтта нешта ня тое. Брахаў гэты самы Шпунтоў сабака, а пасьля чую, што саўсім голас пірамяніў. Гэтак радасна пачаў пішчэць, якраз так, як сабака робіць, калі некага блізкага ўвідзіць. Я тады й падумаў, што

каго-ж такога свайго ён так позна ўночы спаткаў. Чаго ён так з радасьці пішчэў.

- Дык от, можа дзе стары Шпунт быў, ды дамоў вярнуўся? Кумекаіш?

- Стары? Куды яму ноччу цягацца? Ды я-ж знаю, што немач у яго.

- Немач, ці прытворы? Ну а калі ні старога Шпунта, дык каго сабака мог з радасьцяй вітаць?

- Ты-ж сам падумай.

Мужчыны разумеліся з паўслова. Паўлоўскага пераказ пра сабаку паставіў Антося перад аднэй рэальнай магчымасьцю зь непрадбачнымі насьледкамі. Але чаму Лявон хваліўся, што адпомсьціць яму? Няўжо-ж мяркаваў, што гэта да Антосевых вушэй ня дойдзе? А можа п'яны быў?

Не давяраў Дзяркач Паўлоўскаму. Дзіравы шляхціц мог нешта лёгка прыдумаць, каб яго, Антося, за язык пацягнуць. Усё-ж магчымасьць адведзінаў бацькоў Лявонам цяжка выключыць.

Вярталіся старыя й назойлівыя думкі. Усе добрыя людзі сьпяць. Ды ці толькі людзі. Сьпяць вунь і жывёлы, і птушкі й паўзуны ўсялякія. Даў Бог час працаваць, даў і пару адпачываць, ці забаўляцца. Дык чаму-ж ён, Антось Дзяркач, ня сьпіць а падпільноўвае на Гараватцы хлыста нейкага? Ды не, няпраўда, ня ўсе сьпяць. Вунь там у гэтай разьлеглай пушчы варушацца помсты прагныя, народнай бядой ненасытныя нікчэмнікі. Тыя, што кагадзе сябе «народнай уладай» называлі. А цяпер плянаваньне новых зьверстваў, рабункаў і забойстваў зганяе ім сон з павекаў. Тымчасам, відаць, над сваімі адно ўмеюць зьдзеквацца, бо ня чуваць, каб яны дзе зь Немцамі ўдужкі браліся. Быццам выкліканы, у ўяўленьні стануў перад ім Кастусь Падгайскі, з каторым кагадзе даўгую гамонку меў.

- Памятай, Антось, Залатуху. Знаеш, што сталася. Вёску спачатку банды наведалі, пару дзяцюкоў да сябе сілай забралі. Пасьля чыгунку ўзарваклі. Вёска ў чырвонай зоне ляжала. Неміц свае пляны маіць. А ці ты думаеш, што вашым Літоўцам ні пагражаіць такая самая ці падобная небясьпека? Яны-ж таксама пры самай зялезнай дарозе, значыцца ў чырвонай зоне ляжаць. І вось прадстаў сабе, што спачатку гэты Лявон Шпунт прыйдзіць да бацькоў. Нехта даведаецца. У вас-жа гэты самы дзіравы шляхціц, значыцца даношчык пад бока. Ён, пэўня, вушамі стрыжэць, а для каго працуіць то гэта я табе ўжо казаў. Дый каля вашай вёскі нідалёка ўжо раз рэйкі разьвіньцілі Раз ці два

прыйдуць цэлай бандай, вёску абрабуюць, можа міну пад цягнік падложуць, а там яшчо свае афішкі параськідаюць ці папанаклейваюць. Тады й хвашчыся. Яны ўжо пастараюцца, каб паліцыя на наступны дзень знала. І вось вёска трапіць у два агні. А там ужо далей сам уяві што быць можыць.

- Ты думаеш, што такое можыць быць?

Падгайскі спахмурнеў, некаторы час маўчаў, а пасьля зноў пачаў роўным, зраўнаважаным тонам:

- Браток, Антось, я многа думаў пра тое, што можа быць. Уключу радыё на Маскву й што ты думаеш адтуль барабаняць? Яны цэлы час пра народную партызанскую вайну, от пра што. А ці ты знаеш што гэта паіхнаму значыць народная вайна? Гэта ня тое, што наськідаць сваіх чэкістаў, ці прывязуць якія гатовыя палкі на парашутах, каб Немцаў білі. Не! Саўсім не! Вядома-ж, спэцыялістаў і палітрукоў то яны ўжо ськідаюць і вунь колька наськідалі. Але заданьне іхнае, - і з гэтым яны ня скрываюцца, - змабілізаваць усіх нашых баяздольных людзей, значыцца ўсякага, які стрэльбу можыць у руках дзіржаць. От як. А як гэта, ты думаеш, яны мабілізаваць будуць? Ты знаеш як бальшавікі робяць. Ня пойдзеш дык кулю ў лоб. Ім на наш народ напляваць. Ці тое, што яны справакуюць Немцаў, каб нашы вёскі палілі разам зь людзьмі, ці тое, што Немцы будуць за аднаго свайго па сто нашых расстрэльваць, гэта, думаеш, іх абыходзіць? Наадварот. Кажу-ж, ім на нас напляваць. Мы чулі колька Сталін людзей у Сібір на сьмерць пазаганяў пакуль свае праклятыя калгасы пазакладаў. А цяперака вайной, калі яго самога Неміц за горла схапіў...

Доўга сядзелі, разважалі, думалі.

- Што-ж рабіць? Трэба неяк арганізавацца, бараніцца, - сказаў Антось.

- А ты думаеш, што нашы над гэтым ня думаюць? Вось хацеў табе расказаць, што нашыя ў Менску стараюцца самаахову арганізаваць і даўно ў Немцаў парогі абіваюць. Самаахова, - як самое слова гаворыць, - значыць сваё войска для аховы, для абароны саміх нас. Я ўжо чуў, што быццам нашы атрымалі дазвол арганізаваць свае батальёны самааховы, разумеецца пад нямецкай камандай. Недзе мусім пачынаць, сваё войска трэба. А я спадзяюся, што як напор бальшавіцкіх бандаў узмоцніцца дык Немцы ня дзе ні дзенуцца, нам і большую армію дазволяць і аружжа дадуць. І тады такому, як табе,

трэба туды было-б... Ну а да гэнага часу, сам ведаеш. Той Шпунт, каторага ты ня выканчыў, як у сваіх руках меў, табе, пэўня-ж, ні даруіць. Сам відзіш, што ня можаш у шапку спаць...

Упоцемку, сочачы за сьцежкай, Антось прыгадваў тую гамонку. Найцікавейшае было пра самаахову. Калі-б яна зарганізавалася, прыкладна, у Глыбокім... Што тады? Пайсьці? А як-жа зь мясцовай паліцыяй? Левандоўскі больш да яго не заглядаў. Мусіць ня было за што зачапіцца. Але што рабіць з гэтым Лявонам? Пагайскі слушна яму ўпікнуў, што тады ў лесе басяка ня выканчыў. Як гэта сталася? Усяго адзін патрон... Ніхто, апроч Янука, ня ведаў-бы, а гэты хлопец зусім надзейны. Дык-жа не, у апошні момант рука задрыжэла. Больш таго, яшчэ стрэльбу Лявонаву аб пень раструшчыў, плюнуў. Няйнакш нейкая нянавісьць да гвалту, да прылады забойства на такі крок таўханула. А можа што глыбейшае, што ў беларускай сялянскай натуры сядзела. Памылка. Цябе за гэта ворагі не памілуюць. Навет свае выродкі сваймі-ж рукамі задушаць... І што рабіць з гэтым брыдой Лявонам, калі ў рукі трапіць? Ці яго паліцыі ў Гацях аддаць? І што з гэтага? Падзяку ад Левандоўскага атрымаеш? Фігу. Падумае сабе, што калі ты гэтага басяка ўночы дапільнаваў, дык чаму дзядзька такі спрытны, як ты, ня мог некалі Бронхэра забіць? Яшчэ прычэпіцца... Не, гэта выключана.

Каля Шпунтовага двара было ціха. Усьведаміўшы, што ўжо ноч на зыходзе, Антось устаў і мяркаваў, ці йсьці дахаты. І тады раптоўна, амаль зьнікуль, зьявілася выдатная думка. Здалася такой надзвычайнай, што Антось аж зьдзівіўся, як гэта яна раней яму ў галаву ня прыйшла. Ня трэба будзе болш спаць у гумне ці падпільноўваць таго Шпунта ў Гараватцы. Нармальнае жыцьцё зноў пачнецца. Ня трэба будзе баяцца, што Шпунт ці іншая брыда якая яго ў пасьцелі зь Нінай знойдзе. А кажны дзень, не ўкараціўшы вартаваньнем злыдняў ночы, можна будзе спарней ля гаспадаркі папанатужыцца.

І зьдзівілася на наступны дзень Ніна, калі Антось, памяркаваўшы й расплянаваўшы ўсё, як належылася, дзірку ў падлозе праразаць узяўся.

- Гэта што такое? - спыталася спакойна, бо ведала Антосеву разважлівасьць.

- Нару рабіць буду, - усьміхнуўся Дзяркач.

- Нару?

- Ага.

Ніна пазірала на шчацінай аброслы Антосеў твар і намагалася нешта вымяркаваць.

- Відзіш, як зраблю нару, тады пачну спаць з табой, у гумно на сена болей ні пайду. Калі сам ён ці зь кім прыдзіць, тады я яго ў руках маю.

Ніна падумала і ўсьміхнулася.

- Калі ён прыйдзіць, дык ты шмыг, як мыш, у нару?

- Ніхай сабе як мыш, - усьміхнуўся Антось, але ні ад ката. І мая нара два выхады будзіць мець.

Колька ночаў, асьцярожна, каб ніхто зь вясковых не спасьцярог, Антось добра папрацаваў. Пры гэтым трэба было вырашыць ці дну праблему, як, прыкладам, куды падзець выкапаную зямлю, або куды адвесьі сьцёк на ваду. Трба-ж, каб нара была сухая, калі лівень здарыцца. І як-жа тады дзякаваў Антось будаўніку гэнай хаты, што калісь паставіў яе на высокай каменнай аснове.

23

На шэрым, даўгім і мясцамі абсмаленым да пашкоджаньня будынку менскага вакзалу, пасярод, на шэрай дошцы віднеўся цьмянымі лацінскімі літарамі напіс: МІНСК. Янук выціснуўся з грамады віленскіх спэкулянтаў, саскочыў на жвір ля шпалаў і разглядаўся, праціраў заспаныя вочы. Навокал - жаўнерскі гармідар, які, відаць, ніколі ня сьціхаў. Гудзела ў вушах. У цяжкой ад бяссоньніцы галаве пераклікаліся адгалоскі начнога, павольнага грукату цягніка, гамонкі спэкулянтаў, што абложаныя добрадаходным таварчыкам, частаваліся «шнапсам», вяндлінай, сітнім хлебам, каўбасамі.

Перасядаў ля поўначы ў Маладэчне. У таварным вагоне, куды трапіў пасьля праверкі «райзэшайну», было цесна й цёмна. Ня ўсьпеў Янук ім кроку ступіць, як пасыпалася сакавітая лаянка.

- Пёруне, скру..., гдзе лезеш?

Зьдзівіў юнака сіпаты, пракураны жаночы голас. У ім апроч басяцкае лаянкі, ледзь далося жаночае распазнаць. Нехта ў куце засьвяціў ліхтар. Выпучыўшы жывот, абкружаная клункамі й карзінамі, быццам сьвіньня парасятамі, цётка з пракураным голасам тут-жа ля дзьвярэй разьмясьцілася. А там з паўцемры чуліся іншыя басы, тэнары й альты, хрыпатыя й войстрыя. І то ўсё на аднэй мове.

«Куды гэта я трапіў?» - падумаў Янук.

Прымасьціўся ля дзьвярэй, бо далей ня пусьцілі. Найбольш аўтарытэтныя галасы, чуваць, па кутох разьмясьціліся. Трахнулі дзьверы, ледзь ногі ўсьпеў падцягнуць. І тады пачалася, пад лякатаньне колаў, адлеглую дзесь на станцыі нямецкую лаянку, свая, ці не кансьпіратыўная «гавэнда». Пра Збыськаў, Марыськаў, кур..., пёрунаў, гжмотаў і іншае.

Нос пратэставаў супраць часнаку, поту й табакі. Мелася ўражаньне, што народ гэты сустрэўся ня прыпадкова, а вырас недзе ад аднэй атожалкі і ён, Янук, быццам непатрэбны мазоль, ім на рукі сеў. Ад няшчыльных дзьвярэй, калі разагнаўся цягнік, цягнуў халодны скразьняк, а там нехта ў куце, засьвяціўшы ліхтаром, «высьменітэ пане», ўзяўся кагосьці частаваць. Задаволеннае цмоканьне, адабрэньне самагоннага майстэрства.

І раптам дзесь у куце - плясь!

- Гдзе лезеш, холера!

Жаночы голас. І агульны рогат. Вясёлая кампанія, ці што?

«Чэрці, апэтыту наганяюць».

Дзесьці ў кішэні, у маленькай торбачцы чарсьцьвела луста разовага хлеба, скрылёк сала. А асобна, у корабе, вёз сыр, масла й хлеб для Рашкевічавай сваячкі, у якой затрымацца меў.

Трэба было-б паспаць, але як тут ляжаш? Калі гэтыя людзі сьпяць? Можа ўдзень? Што гэта за яны? Раптам нешта ў галаве праясьнела. Пэўне-ж, гэта «дарабкевічы». Яны ў часе вайны, можа патрэбную функцыю выконываюць. Калі-б не яны, дык ня было-б чорнага рынку. А між іх, пэўне-ж, і тая сувязь польскае разьведкі, пра якую Антось Дзяркач гаварыў. Нітачкі, дзесь там аж уверх да Лёндану цягнуцца. А ў гэтых двух ці трох, перапоўненыхво такімі людцамі, вагонах, ёсьць ці адзін чалавек, які па сваіх палітычных і разьведчых заданьнях езьдзіць. У Менску мае нейкі явачны пункт, дзе сядзіць

якісьці Зьдзісек ці іншы «гжмот», а можа й мясцовы дзядзька Савось... Пэўне-ж ёсьць і ўмоўны пароль (фраза ці слова) ды ўсё іншае.

Ніхто зь іх Янука ня спытаў - адкуль, хто, куды й чаго... Як гэта яны ўпоцемку разспазналі, што не да іхнае кабалы наллежыць? Можа па вопратцы? Быў супынак. Шырака з грукатам адчыніліся дзьверы, уварвалася знаёмае нямецкае гарканьне: - Райзэшайн, шнэль, шнэль! І ніводнага «біттэ».

Янук сама першы. Ужо ня дрыжэла рука. Думаў: «Калі-ж гэты народ, абложаны клункамі, што піў «высьменітэ, курды крэў», меў чыгуначныя пропускі, дык я, Янук Бахмач, ад самага Вітвіцкага дастаў. А ён-жа - ўлада!»

Аж дзівіцца трэба было, што ўсе пропускі мелі. Немец сьвяціў ліхтарыкам, праходзіў між карзін, кашалёў, хатулёў. І чым далей, то цішэў ягоны голас. Дзесьці, у цьмяным сьвятле ліхтарыка, цурчэла вадкасьць, навет пачулася Немцава «данкэ шэн». Мужчыны й жанчыны, - цяпер Янук мог ім прыгледзіцца, - апранутыя паместачковаму сьлядзілі начальніка. І ня было ўжо крыку. Пасьля якіх пятнаццаці хвілін, выпіўшы добрую чарку, закусіўшы, Немец вылез. Хляснулі дзьверы й пад знаёмыя ўжо гукі рушыў цягнік.

МІНСК.

А чаму ня Менск?

Вылезшы з вагону, Янук затрымаўся на баку, пазіраў на начных суседзяў. Рух пачаўся адразу. Усе, зусім цьвярозыя, пакідалі вагоны валочачы цяжкі багаж, станавіліся ў чаргу перад вйсковымі жандармамі з нагруднымі бляшкамі, што стаялі ля ўваходаў у вакзал. Усюды напісы «нур фюр Дойчэ». Поўна войска. А гэтта вось праход для цывільных. І здавалася, што гэтыя, абладаваныя пакункамі людзі не марыліся бяссоньніцай і ня пілі «высьменітэ, пане». І выглядала, што яны ня былі тымі ахвярнымі й гэройскімі патрыётамі, якіх некалі літоўская настаўніца, пані Раманоўская, так прывабна малявала на лекцыях гісторыі.

На ўсходзе сонца паднялося над шчарбатымі руінамі гораду. Янук стануў у чаргу, разглядаўся. З захаду ўкаціўся й спыніўся воддаль цягнік. Адчыняліся дзьверы пасажырных і таварных вагонаў. Жаўнеры сьпяшылі на кухню-сталоўку. Але... Гэта ня былі Немцы. Эсэссаўская форма. Французы. Пра гэта гаварылі на рукавох шчыткі з напісамі. Чаго тут Французы? І яны Гітлеру на помач? Разважаць ня было часу.

Якісьці «пёрун» таўхануў ззаду і Янук сунуўся наперад, да кантролі, трымаючы ў руцэ свой «райзэшайн».

На шырокім пляцы ззаду за вакзалам грузавікі з адкрытымі бартамі паглыналі нямецкіх жаўнераў. А цывільныя, як спалоханыя зайцы, трымаліся боку.

- Гэр, шус пуцэн?

Малады дзіцячы галасок. Падлётак гадоў дзесяці, ня больш, прапанаваў Немцу боты пачысьціць. Гэткіх чысьціботаў было гэтта некалькі. Трымаліся яны кута вуліцы, там, дзе найбольш жаўнерні валачылася.

Вось адзін зь іх, дробненька-мізэрны ў твары, мокра пад носам, з рабаціньнем, у занадта вялікай, можа пазычанай у брата шэрай сьвітцы, ды ўпоперак на галаве надзетай пілёрцы, скончыў жаўнеру чысьціць боты. Яшчэ лішні раз пацягнуў чырвонай бархатнай шматай па наскох ботаў, праверыў глянец. Боты зьзялі, асабліва-ж самыя наскі дый навет кароткія шурпатыя халявы.

- Фэртыг, майн гэр, - сказаў хлопчык.

Жаўнер уважна агледзіў боты, задаволена ўсьміхнуўся.

- Віфіль? - спытаў.

- Айн гальб марк, - бойка адказаў хлапец.

Немец выцягнуў зь кішэні жмут акупацыйных марак, дбайліва адзьдзяліў адну паперку й даў замурзанаму хлапчуку. Той схаваў грошы ў кішэню патрапаных портак і ўсьміхнуўся да жаўнера. А Немец выцягнуў руку й варушыў указальным пальцам, проста хлапчуку ў вочы пазіраючы.

- Айн гальб марк! - дамагаўся шорсткі, як жвір, голас.

- Іх габэ кайн гальб марк, - апраўдваўся хлопец.

Немцаў твар ператварыўся ў чорную хмару, а рудыя вочы - у калючыя цьвікі. Жаўнер спрытна прысеў і схапіў хлопчыка за правае плячо. У гэны самы час ягоная рука пачала абкладаць дзіцячы твар аплявухамі. Гэтаму спадарожнічала сакавітая крыклівая лаянка.

Хлапчуковы прылады для чышчэньня ботаў, - скрынка, шчоткі, паста й шматы, - паляцелі ўбок, калі ён, баронячыся левай рукой ад удараў па твары, пачаў босымі нагамі малаціць Немцаў жывот. Магчыма, што трапіў жаўнеру ў чульлівае месца, бо ў таго твар скрывіўся ад болю й хлапец вызваліўся зь ягоных рук.

- Фарфлюктэ фашыст швайн! - крыкнуў хлопец.

Сабраная грамада такіх-жа чысьціботаў прыйшла хлопцу на помач.

- Швайн, швайн, фашыст!

Узлаваны Немец схапіўся за штык, што вісеў ззаду на шырокім пасе ў похве, але рука спынілася. Ён плюнуў, сакавіта вылаяўся й пайшоў у бок вялікіх шэрых будынкаў і кучаў цэглы.

Быццам заварожаны, прыглядаючыся гэнаму выпадку, стаяў Янук. І што было-б, калі-б ня вырваўся зь Немцавых рук той падлётак? Цяпер Бахмач,ня ведаючы куды, ішоў. Скруціў налева й неўзабаве стаяў перад аграмаднымі шэрымі, зусім уцалелымі ад бомбаў, высокімі на паверхаў сем будынкамі. Перад імі - вялікая плошча. Пачаў прыгадваць. Некалі ў савецкім падручнуіку геаграфіі бачыў здымку. Але-ж. Дом Ураду. Вось ён.

Нечага бракавала. Дом домам, але было ў гэнай здымцы, супольна з гэтым домам нешта няменш манумэнтальнае. Але што? Янук змалку меў дасканалую зрокавую памяць і яна нарысавала ў іншай, мазгавой памяці гіпсавую фігуру.

- Так, гэтта быў помнік... а цяпер яго німа, - сказаў сам сабе хлопец. - Узарвалі, мусіць.

Там, у гэным савецкім падручніку цьмяная здымка на дрэннай паперы не магла даць ўяўленьня пра вялічыню гэтай грамады будынкаў. Трэба было нешта да параўнаньня. А з чым меў Янук параўновываць? З Габішынай гарбатай, нізкой, апоўзлай крамай ці, можа, з Макатунішынай хатай?

У вачох яшчэ стаяў зьвярыны, бяздушны твар Немца й вялізны перапалох на замурзаным, у рабаціньні, твары хлапца, што ня меў паўмаркі рэшты... Янук зьбянтэжыўся. Куды йсьці? Дзе тая Камароўка, дзе рэдакцыя газэты? Каго спытацца? А якраз во такі малы хлопец чысьцібот, ён-жа зусім мясцовы, ён і ведаць будзе. Ды дзе яго знайсьці? Тыя ля вакзалу разьбегліся. Але-ж іх, пэўне, больш на вуліцах. І не памыліўся. Адно нягледзеўся «дому ўраду», павярнуў на першую сустрэчную вуліцу направа, як пабачыў двух чысьціботаў.

Было ў гэтых хлопчыкаў нешта, чаго Бахмач, сын палёў жытніх і лёну са званочкамі блакітнымі, не спасьцерагаў у вясковых падлёткаў такога ўзросту. Ня вопратка, якую льга было-б назваць калекцыяй ваеннага часу: завялікая шапка на нястрыжанай галаве, кашулёнка, што даўно за мылам зажурылася, сьвітка не ў разьмер, шэрыя

працёртыя порткі, шчарбатыя чаравікі, або босыя й карэлыя ногі. Не, ня вопратка. Ваеннае ліха загнязьдзілася ў зараньня пастарэлы дзіцячым тварыку, асабліва-ж у вачанятах. Ім яшчэ трэба было-б сьмяяцца з розных дзіцячых блазнотаў, а ў іх ужо цьвёрдасьць, рашчараваньне, боль. Яны во гэтта, як спрактыкаваныя, гора бачыўшыя, спад насунутых, нахмураных броваў падпільноўвалі й ацэньвалі цябе, недаверліва насьцярожваліся, намагаліся прадбачыць. І ў полі тых вачэй была ўся тэрыторыя заработку.

Прылады заработку, - драўляная скрынка, шчоткі, паста й шматы, стаялі на парэпаным, ад гарачыні ваенных пажараў патрэсканым ходніку. Тэрыторыяй быў засяг зроку, а галоўным апэрацыйным пунктам - рог вуліцы. Кліентаў, выключна вайсковых, было даволі. Калі на тэрыторыі паказваўся чалавек у ботах, звычайна нямецкі радавы ці афіцэр, хлопцы сустракалі яго сьціплым запасам чужой мовы. Для параўнаньня вазьмі кагось з Бахмачовай вёскі, зь літоўскае малечы, пасадзі яго на гэта самае месца, дай такія-ж прылады працы. Ці зарабіў-бы ён і ці пражыў-бы з такога заробку? І ці змог-бы памагчы сваяком, як гэтыя во памагаюць?

Янук спыніўся ля хлапчукоў. Воддаль на ходніку відаць былі жаўнерскія мундзіры, вуліцай праяжджалі й пылілі грузавікі. А недалёка, на ўцалелай часьці будынку, над дзьвярмі, - вось увайшоў туды чалавек, - вісеў напіс: Гарбата. І нешта меншымі літарамі, чаго Янук ня мог адсюль прачытаць.

Што кажух, то ня вата,
а што капуста, то не гарбата...

- прыгадалася Януку зь нейкага апавяданьня. Але чаму «гарбата»? Ці-ж гэта беларускае слова? Яму заўсёды здавалася, што пабеларуску «чай»...

- Бацінкі пачысьціць...?

Дзіцячы голас вярнуў яго ад «гарбаты» да запраўднасьці. Чысьцібот ня ведаў, відаць, як зьвярнуцца да яго.

- ...дзядзька, - дадаў хлопец, не зьбянтэжыўшыся.

- Які я табе дзядзька? - усьміхнуўся Бахмач.

Хлапчукі пазіралі на яго ўважліва, ацэньвалі. «Не, не ўгадаюць», - думаў юнак. Але ня было часу. Дзесь на Камароўцы жыла жанчына,

адрас якое трымаў у кішэні, а дзесь ля Пляцу Волі гнязьдзіўся новы беларускі Парнас, на які Янук можа дабярэцца яшчэ сяньня. Няма часу на падшыванцаў.

- Скажыце, хлопцы, дзе тут Камароўка й як да яе дабрацца?

- Камароўка? - адказаў старэйшы выглядам. - Дык яна от там, - паказаў дзесьці ў кірунку на ўсход. - Ідзі во гэтай вуліцай проста туды й як дойдзеш да радыёзаводу, там яна й ёсьць.

- Далёка?

- Ды не, кіламетры два...

Падыйшлі жаўнеры й зноў пачулася «шус пуцэн». Янук рушыў паволі, разглядаўся. Бакі вуліцы, як вокам сягнуць, абступілі руіны. Адно зь левага боку ўзвышаўся зусім цэлы, з чырвонай цэглы будынак нейкай сьвятыні. Паводля Януковай ацэны гэта мог быць касьцёл, а каб хто яго папрасіў апісаць стыль будовы, ня змог-бы.

Мінуўшы некалькі скрыжаваньняў вуліц, вачом юнака паказалася вялізная, адкрытая панарама зруйнаванага гораду. Хлапец спыніўся, зыйшоў на бок ад вуліцы, прысеў на кучы цэглы, выняў з торбы чэрствы хлеб і сала, паволі жваў і разглядаўся. Воддаль, наўскасяк налева, як быццам нейкі вялізны, круглы, шэры маўзалей на суцэльным могільніку, шарэў у раньнім сонцы тэатр опэры й балету. Магчыма, што ў нязьнішчаным, забудаваным горадзе будынак гэты, - навет з маста на Сьвіслачы можна было заўважыць яго вялікі разьмер, - ня быў ніякім кантрастам. Пэўне-ж, калі ўжываць тэрміну будаўнікоў, мог быць ён некалі арганічна ўпісаныў ансамбль вакольных будынкаў. Хто яго ведае... Чаму ўцалеў? Навокал, відаць, мора агню шалела. А гэты во, - зірніце на яго! - быццам, каб пратэставаць супраць зьдзекаў зямных і нябесных, стаіць бадзёра, усім і ўсякаму на выклік. Помнік на могільніку.

Янук зірнуў вышэй налева, туды на Верхні горад. Перад прыездам сюды прыглядаўся старой мапе Менску й агульна ар'ентаваўся. Там воддаль шарэлі вежы барокавае сьвятыні. Сьвіслач плыла быццам у парэпаных па берагох начоўках, зямля апускалася да ракі з абодвух бакоў лагодным нахілам. Вада абмывала розны хлам, а пры беразе босыя дзеткі вазіліся із чэрапам старога чаўна.

За тэатрам уцалеў вялікі, чатырох- ці пяціпаверхавы зялёны будынак. У ягоных зашклёных вокнах адбівалася сонца. Там, мабыць, жылі людзі. А з правага боку галоўнай вуліцы, у тым баку, дзе

чысьцібот казаў была Камароўка, але далекавата ад яе, залаціліся купалы сьвятыні, налева-ж чарнелі стрэхі хатаў. А што, калі тая часьць Камароўкі, куды ён ідзе, ды хата тае жанчыны не ўцалелі?

Хлапец доўга стаяў і пазіраў на вуліцу, быццам у памяці зрокавай і ў галаве на векі вякоў хацеў утрываліць вобраз дашчэнту зруйнаванага гораду. Як гэта там пра яго ў «Слове аб палку Ігаравым»?

Ня Нямізе снапы сьцелюць галовамі,
А малоцяць-жа стальнымі іх цапамі,
На таку жыцьцё кладзецца неспадзеўна,
І душу ад цела веюць безнадзейна.
Берагі ў крыві Нямігі па калені...

Янукова памяць адтварыла радкі, якія з такім смакам дэклямаваў ягоны настаўнік, гісторык Сабалеўскі...

Калі стары летапісец гаварыў пра «снапы, што сьцелюць галовамі» й «малоцяць стальнымі цапамі», дык што сказаў-бы ён, як-бы ацаніў гэты нядаўны вогненны глум?

Мясцамі стаялі абгарэлыя цагляныя сьцены, тарчэлі коміны. Некаторыя зь іх, здавалася, лёгка было-б паваліць. На ўзьбярэжжы ракі лапікламі й палоскамі зеклянела трава, асірацела стаялі абгарэлыя й шрапнэлем пашарпаныя дрэвы. Пышнела на руінах лебяда, пырнік і дзядоўнік. Дзесьці ў завалах хламу спрэчку вялі вераб'і. Мясцамі тут тлела жыцьцё: вунь на скупенькім, малым лапіклу гароду сагнулася над матыкай жаночая фігура. Такіх лапіклаў - аазаў жыцьця ў гэтай пустэчы, юнак спасьцярог больш. Яны - быццам кволыя першыя завязі скуры, першага гаеньня аграмаднае раны.

Здавалася, што бомбы ў Гацях шмат зьнішчылі. Янук першы раз бачыў такое разбурэньне. А як-жа ашаламляе, прыгнятае бянтэжыць вялікі зруйнаваны горад. Але маладосьць сваімі крыльлямі лунае, да жыцьця няспынна імкне-цягне. Янукова прыгнечаньне хутка зьмянілася цікавасьцю, асабліва-ж калі ўзыйшоў крыху вышэй паказанай чысьціботам вуліцай і адтуль пазіраў на тое месца, дзе быў Пляц Волі, «беларускі Парнас» і яшчэ гэныя калішнія «берагі ў крыві»...

Гэтта-ж непадалёк, ля ўсходняга боку вуліцы цягнуўся часткова зьнішчаны будынак з высокім комінам, што нагадваў нейкую

хвабрыку. Магчыма, што гэта й быў той радыёзавод, пра які чысьцібот гаварыў. А калі так, дык тут-жа была й Камароўка. Цяпер Янук уважна разглядаўся навокал. Заходні бок вуліцы абселі малыя, уперамешку з большымі, хаты. Гэты раён нагадваў вёску. І калі Янук пайшоў у той бок, каб знайсьці адну, яму патрэбную, хату дык і запраўды, на мілае сваё зьдзіўленьне, быццам у вёсцы апынуўся. Стрэхаў саламяных, праўда, ня бачыў, але з-за парканаў усьміхаліся сланечнікі, садовыя дрэвы, а пад вокнамі бушавалі астры, чаравікі, вяргіньні й півоніі. Над плотам распусьціла свае косы стройная бярозка. Даўно выліняла шалёўка сьценаў, пакрывіліся вокны, пахіліліся тыны й парканы. На нябрукаванай вуліцы стаялі лужыны вады, ля якіх дзеткі басанож рабілі свае дарожкі, дзяўчаткі забаўляліся ў чарапочкі. Каб дапоўніць тутэйшы вясковы пэйзаж, трэба яшчэ колькі курэй ці гусей, у сады - вульлі з пчоламі ды можа пару кароў ці козаў...

Янук чуў, што Камароўка - старая часьць гораду. А перад ім паказалася вялікая вёска, якую горад, як выглядала, апошнімі часамі аброс і абкружыў і адно вось разінуў свой прагавіты рот, каб яе глынуць, як перашкодзіла вайна. Магчыма, што некаторыя з гэтых хатак свайміі, тады-ж новымі й простымі вокнамі праводзілі некалі на этап у Сібір Маскалямі гнаных літоўскіх паўстанцаў.

І як яна, гэтая вёска, ўцалела? Мясцамі й тут чарнелі пагарэлішчы. Але-ж... Янук выняў зь кішэні свой нататнік, зірнуў на адрас. Неўзабаве стаяў перад нізкай, у два вакны на вуліцу, шэрай, абшаляванай і даўно немаляванай хатай. Скрыпнуў весьнічкамі ў двор, асьцярожна зашчапіў іх і пастукаў у бакавыя дзьверы. Ніхто яму не адказаў. Дзесьці ззаду, за хатай, чуліся галасы й дзявочы сьмех. Янук пайшоў на тыя галасы й трапіў ў невялікі садзік. Ля платоў - густы маліньнік. Пад яблыняй, над нізкім сталом, над абрэзамі матар'ялу стаяў лысы, сярэдняга росту дзядзька, нешта адмяраў і значыў, ды гучна гаварыў парасейску. Збоку, у плеценым крэсьле, сядзела чарнявая, Януковых гадоў (як даведаўся пасьля, звалася Галька), надта прывабнага выгляду, смуглявая ў твары дзяўчына. Яна трымала ў руках кніжку. Старэйшая, таўстая жанчына сядзела ў плеценым крэсьле, бокам да Янука. У руках трымала нацягнутае на драўляныя абручы кужэльнае палатно, вышывала. Усе гэтыя галоўныя дэталі Янук спасьцярог адразу. Здалося тут надта ўтульна й ціха, быццам вайны на сьвеце ня было.

Першы спасьцярог Янука мужчына, спыніў нейкую гутарку й ягоныя вочы ацэньвалі наведвальніка. Неўзабаве й ягоныя суседзі адвярнуліся й зь цікавасьцю пазіралі на хлопца. На круглым твары мужчыны мільганула нешта наводля зразуменьня й лёгкай усьмешкі. Старэйшая жанчына, тоўстая, пульхная ў твары, пазірала лагоднымі, цёплымі блакітнымі вачмі, адно чарнявае дзяўчо, - аганькі ў вачох, - здавалася, што ня ведала, ці сьмехам пырснуць, ці пабожна, зьмірэнна прыглядацца. І ці раз пасьля думаў Янук, сам зь сябе ў галаве кпіны робячы, якім сьмешным мог ён гэным людзям на першы зірк вока паказацца: няўзрослы бляндын, кепка на галаве, самаробная вясковая сьвітка й кораб зь вечкам праз руку наперавес. Проста дзядзька на рынак выбраўся, адно што дзядзьку гэтаму толькі сямнаццаць споўнілася. Але, самае галоўнае, што ўваколіцах Менску ў гэны час такой хатняе прадукцыі вопраткі ў былых калгасьнікаў і заваду ня было. Дык пытаньне: адкуль гэты «дзядзька» на рынак зьявіўся?

- Добры дзень. Прабачце, я - Янук Бахмач з Гацяў. Мне Ніна Рашкевіч гэты адрас дала, казала, што ў яе сваячка тутака...

- Ага, дык вы той западнік? Мне Ніна пра вас пісала. Калі ласка заходзьце й сядайце, - прыемным павольным альтам прывітала старая жанчына.

Янук спыніўся, ня ведаючы што далей рабіць.

- Дык вы Беларус? - спытала жанчына. - Ну добра. І я таксама Беларуска і Галька, мая пляменьніца, таксама. А гэта во ў нас кравец жыве. А я сама гадавалася на поўнач ад Лагойска. Але-ж, сядайце, - паказала яна на незанятае плеценае крэсла.

Янук падбадзёрыўся такім ласкавым тонам гаспадыні, усьміхнуўся да прыгожай чарнявай Галькі, якая сачыла ягоны кажны рух і ўсеўся ў крэсла, паставіўшы побач свой кораб. Ведаў, што знайшоў часовы прытулак у вялікім разбураным горадзе.

24

Настаў вялікі й незабыўны для Янука дзень. Кавалак сьвету стаптаўшыя Пракопавы чаравікі цяпер на Януковых нагах ашчэрыліся на парэпаны вайной ходнік, калі іхны новы ўласьнік па галоўнай

менскай вуліцы ў летні дзень роўнамерным крокам у рэдакцыю «Беларускай Газэты» йшоў. З трывожным біцьцём сэрца ён яшчэ й яшчэ раз намагаўся ўявіць як стане перад галоўным рэдактарам газэты й што з таго выйдзе. Ці-ж ня пісаў у газэце нехта Вяршынны ў даўгім, - аж на два абшырныя падвалы, - артыкуле, нарыс пра «сакавітую рунь» паэтаў і пісьменьнікаў, што зазелянела на ніве пагвалчанай краіны? Ці-ж не называў ён тую рунь шматабяцаючай надзеяй на будучыню новае беларускае літаратуры? А ў руні тэй ці-ж ня быў і ён, Янук Бахмач, пышным парасткам, што некалі мае буйна ўскаласіцца?

Янукова буйнае ўяўленьне малявала вобраз таго, што мае адбыцца ў рэдакцыі. Вось уваходзіць ён у вялікае, выдатна абсталяванае бюро. Спачатку адчыняе ён салідныя й няскрыпучыя дзьверы, але зусім ціхія дзьверы і ўва ўсім маестаце свае літоўскае сьціпласьці, задаволены, што нарэшце калі не на Парнас дык абавязкова на нейкі там іншы Алімп узьлез, стаіць перад найгалаўнейшым рэдактарам. Навокал клепяць нешта машынапіскамі дзяўчаты, а рэдактар, каторага Януку карціць бачыць, задуманы нешта дыктуе сваей сакратарцы. Гэны спадар падобны на настаўніка Сабалеўскага, адно маладзейшы ды яшчэ з буйнай чупрынай. Твар ягоны - люстра заклапочанае мэлянхоліі й ледзь стрымліваных творчых парыванняў. Гэта наскрозь - зірніце вунь на яго народу адданы працоўны інтэлігент, абавязкава й зусім бяз рэзэрвы руплівы гаспадар гэнае руні. Апрануты ён у прыгожы, хоць і сьціплае якасьці, касьцюм, а на твары муза-натхненьне. Янук цікуе, калі-ж яго спасьцерагуць, але дарма, усе страшна занятыя. Хлапец спакойны, бо трапіў да найважнейшых на беларускай культурнай ніве дык можа хвілінку ці дзьве пачакаць. Дзіва няма, што спасьцерагуць не адразу, не паведамляў-жа, што прыедзе.

І вось, зірні. Сам рэдактар быццам прачынаецца з задуменага творчага дурману і неяк адразу сьцяміўшы, што на парозе зусім нечакана вырасла сьцяблінка з тае «сакавітае руні», твар адданага народу й творчасьці інтэлектуала праменіцца вясной радасьці. Кіўком галавы спыняе сакратарку, устае й бяжыць насустрач Януку.

- А братка, заходзь, сядай. Здароў, як цябе... Вітаем, вітаем...

Постаць насычаная суцэльным бацькоўскім клопатам, сяброўская рука цёпла сьціскае нязграбную юнацкую далонь. Гледзячы проста й шчыра юнаку ў вочы, чалавек гарне хлапца да грудзей. І здаецца тады Бахмачу, што гэтага выдатнага перадавіка беларускае культуры ён

мусіў даўно аднекуль знаць, такі ашаламляючы эфэкт ад цёплага й простага бацькоўскага прывітаньня. І асабліва да сэрца ліпне той блізкі, на «ты», зварот, быццам-бы літоўскі шыш нечым раўня яму.

- Дык як-жа завуць цябе? - апамятаўся рэдактар.

- Янук Бахмач.

- Бахмач? Ага, чытаў, чытаў... А як-жа ня чытаць... Такія выдатныя творы. Пясьняр таленавіты зь цябе будзе, але-ж. Адразу мы цябе спасьцераглі. Няштодзённы такент. Але-ж дазволь...

Гэтта рэдактар спыняецца, просіць хвілінку ўвагі. Замірае кляпаньне машынапісак, а дзяўчаты з запытальнай цікавасьцю ўзіраюцца ў чубатага, блакітнавокага бляндына.

- Зьявіўся да нас во новы, выдатны беларускі песьняр, - урачыста й паволі гаворыць рэдактар. - Вялікія надзеі на яго пакладаем. Я рад прадставіць вам яго: паэт і пісьменьнік Янук Бахмач.

Радасьць цісьне Януку з вачэй сьлёзы. Ён задаволена трасе рукі, што цягнуцца да яго, а рэдактар кліча яго зайсьці ў сваё прыватнае бюро.

Нікчэмнасьць думак юнацкіх, спадзяваньняў на наіўнасьці аснаваных, салодкасьць лятуценьняў. І добразычлівыя чытачы прабачаць, пэўне-ж, нашаму нефартуннаму Януку Бахмачу, што на свой апрычоны лад уяўляў беларускае культурнае ўзвышша. Бо як-жа накш? Ці-ж мог падазраваць наш гэрой, што гарачы патрыятызм ня мог апраўдаць няведаньня суровых законаў жыцьця асабліва ў той час, калі вялізная навала сілаў гвалту перачыркнула ўсякую рацыянальнасьць?

На зьмену таму, лятуценнаму, прыйшоў іншы Янук, гэны канкрэтны, каторы цяпер во крочыць па ходніку, абмінае бомбавыя варонкі, блукае ў зруйнаваным вялізным горадзе. Прыгарнула яго на Камароўцы добрая жанчына. І ўся вопратка на ім бацькава, адно ня бацькавы думкі ў галаве. Думкі... Хто ведае, калі-б бацька быў цяпер у ягоных гадох, ці ня думаў-бы ён так, як Янук. Ці-ж ня хваліўся сыну якім гэроем калісьці ў Пецярбургу быў? Ці ня ён гэта на Неўскім дзевак падпільноўвываў, Шаляпіна ў «Дэмоне» слухаў, або кадрылю тады модную танцаваў? Ого, - паслухай яго, - які фарсун-шчыгілянт зь яго быў. «Госпадзе, выбач мне. Ня мне судзіць яго».

У сям'і даўно нядоля й над усім, каб неяк утрымаць, каб жывот напоўніць і цела пакрыць, трывае бацькава вока пільнае. Ці гэта той-

самы чалавек, які меў калісьці можа большыя лятуценьні, чымся Янук? У думках юнацкіх «адвечная песьня» прадаўжалася: бацька-сын, канфлікт, над якім многа думалі філязофы, пра што пісалі пісьменьнікі. Аналізавалі, рацыяналізавалі, пад нейкі агольны назоўнік падганялі.

Вось цяпер, у гэты прыгожы дзень, прыгорблены Пракоп Бахмач, сквапна граблі аблапіўшы, пракос сена варочае. Спыніцца, рукою навотмаш абатрэ пот са лба, разгледзіцца навокал, што дзе суседзі робяць і зноў на граблі налягае. А сэрца яму па жонцы баліць. Куды ня кінься, а ўсюды сам. І на пустым месцы паўстае яна, такая стройная, але спрацаваная гаротніца. Вось у руках ейных вязьмо, а на плячы серп. І ўздых: - Божа мой, Божа! Працуеш во й стараешся, ізь сілаў апошніх выбіваешся, а як памрэш дык ці хто калі цябе ўспомніць...

А пасьля, - гэта ўжо ад бацькі, доўгім вечарам увосень. На пяколку падкорчаныя бацькавы босыя ногі, а гэтта-ж побач - Януковы й Міколавы. І дзьве, авечымі нажніцамі ў пасы пастрыжаныя, галовы побач вусаў, што вось цяпер варушыцца пачалі.

- Эх, сынкі! Гэта-ж як прыпомню маладыя гады й Піцярбург!

І літоўскія падлёткі падарожнічаюць з бацькам над Нявой, даведваюцца пра нейкую самарынскую, падцягваюць з бацькам «каробушку», або навет пачуюць рэха пра тыя «арудзія ў рады» і «геройскую гібель Варага» зь японскае вайны...

Дзе было спалучэньне? Той - чалавек зь іншага сьвету, самародны інтэлігент, якога безьзямельле на чужы бераг некалі выплюнула... Ліпеў пры пісарскім, ці не апошім, стале слаба аьветленай канторы. І ўпарта, кажны дзень пяром акуратна выводзіў свой надта-ж прыгожы почырк. А потым вечарам, пасьля таго пісарскага стала, апрануўшы новы касьцюм із такімі сьмешнымі цяпер порткамі, - калошы як тонкія дудкі, - вандраваў можа тымі самымі завулкамі, дзе калісь валачыўся, баючыся чарговае трасцы, тварэц Раскольнікава й сквапнае старое... І сын... Бадзёры юнацкі крок на менскім ходніку, а ў галаве поўна гарачага патрыятычнага пылу. Перад ім Верхні горад, Пляц Волі й ягоны, новы Парнас. У таго былі немалыя жыцьцёвыя прыгоды. З імглістага гораду, пад градам куляў рэвалюцыі вярнуўся да родных гоняў. Высокалётныя мары, жаданьне нейкім чынам перабудаваць сьвет уперліся нарэшце ў вузкую палоску зямлі. Зірнеце на яго сяньня: згорблены, зьняможаны, ён усё трывае, упарта валочыць жыцьцёвы

цяжар. Ахвяра незалежных ад яго абставінаў, яму не дадзена было нічога зьмяніць, як ні намагаўся. Але чаму з такім жарам стараўся запярэчваць поглядам сына? Ці таму, што адвечная галеча назаўсёды сьвятло засланіла? А калі-б навет і так, дык ці гэта давала яму права не спанукаць сына да росту, да сьвятлейшае будучыні? Ці ня лепш было-б заміж таго «сынок, скруціш галаву», добрым словам сына ў дарогу праводзіць?

Думкі Януковы пераключыліся. Перад ім станулі незнаёмыя да ўчарашняга людзі з Камароўкі, пра існаваньне якіх кагадзе зусім ня ведаў. Перадусім добразычлівая й гасьцінная гаспадыня з лагоднымі мацярынскімі вачмі. І клопаты: а што, а як, а куды пойдзеш? Як удома. Апавяданьні пра яе родную, прыгожую Лагойшчыну. Удава з суседамі Бахмачовымі нейкай тонкай ніткай зьвязаная. Апавяданьне пра копныя суды, што ад свайго дзеда яшчэ чула. А пасьля пра бомбы й полымя, што слаўны горад над Нямігай жэрла.

Уражаньні, уражаньні! Колькі сьветаў. У кажнага свой. І цяпер перад юнаком зусім новы, няведамы, нязьведаны, чыста ягоны сьвет распрасьцёрся. «Дуня, дарагая сяброўка мая! Каб ты цяпер са мной была», - зьвярнуўся Янак у думках да мілай дзяўчыны. - «Узяў-бы я цябе за шурпатую ад зьбіраньня зёлак руку, прыгарнуў-бы, і пайшлі-б мы супольна гэты няведамы сьвет пазнаваць». Шчымлівае юнацкае сэрца, ты зноў да лёту паэтычным імпэтам акрыляешся. Колькі-ж тваё хваляваньне й цярпеньне й колькі юнацкае галавы трызьненьне на розныя лады паэты апісвалі.

Хацелася прысесьці на гэнай сіратлівай, пад абсмаленым дрэвам, лавачцы, за алавік узяцца. Але вакольныя руіны, рэдкія прахожыя, што як перапалоханыя сабакі аглядаліся, вайсковыя машыны, што за сабой хмару пылу ўзьнімалі, - усё гэта руйнавала натхненьне. У грудзе цэглаў ляжала пажоўклая, абарваная, відаць, тэатральная афіша:

...тэатры. Тодара Лебяды
ЗАГУБЛЕНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Загубленае жыцьцё, амаль дашчэнту зьнішчаны горад. Пусьцее Пляц Волі. Яшчэ ўчора кінулася юнаку ў вочы, што мала цывільных па вуліцах бачыў. Дый дзе-ж ім было быць? Пэўне-ж, шмат перабілі, а

многа паўцякала. А ўсё-ж... Ці тыя, што жылі, баяліся па вуліцах хадзіць?

І вакол гэтае плошчы мала чаго ўцалела. Зь левага боку высілася абшарпаная, асколкамі пабітая сьвятыня зь дзьвюмя барокавымі вежамі, падобная на тыя, што бачыў у Пархвенаве, Будславе ці Бярэзьвічах. Мусіць усе яны, - і гэта, і тыя таксама, - будаваліся ці не ў адным стагодзьдзі. На помач, мабыць, паклікалі з далёкае Італіі нейкага Манджэлётты ці іншага Сквіранчэлі. Магнаты машнамі золата мералі, а за таннымі мясцовымі рамесьнікамі затрымкі ня было.

Гэтта дзесьці ад плошчы адходзіла тая жаданая, - так і стаіць у вачох, як магніт прыцягвае, газэтны радок з адрасам, - вуліца Алеся Гаруна, Менск. І сама рэдакцыя ледзь не на рагу вуліцы пры Пляцу Волі. Янук стаяў задаволены, разглядаўся. Вузкаватая вуліца, амаль зусім ад вайны ўцалеўшая, пахіла зьбягала ўніз. Воддаль відаць нейкія майстэрні, групы людзей. А дзе людзі, там і жыцьцё. На рагу прыбітая да сьцяны дошчачка ізь сьвежым, не такім ужо, як на ваенную бяду, аматарскім напісам: вуліца Алеся Гаруна. Янук ледзь не падскочыў з радасьці. А колькім вуліцам у Менску дадзены беларускія назвы? А колькі зь іх наагул напісы мае на рагох вуліцаў і на дошчачках? А гэтая ня толькі названая, але й пазначаная. А далей, ужо зусім асьцярожна ступаючы, Янук падыйшоў да двухпавярховага будынку й затрымаўся перад дзьвярмі.

«Беларуская газэта» і «Голас Вёскі».

Вось яны абедзьве разам, пад адным дахам. Мілыя сястрыцы, ці як іх назваць? Ужо калі ня тут Парнас, дык дзе тады? Моцна стукала Янукова сэрца, калі дрыжачая рука адчыніла дзьверы. Трапіў у нейкія сені, ці пусты пакой. Было тут змрочна, неяк сыра й дзіка. А пад цёмнай стольлю млява сьвяціла адзіная электрычная лямпачка. Янук стаяў і разглядаўся. Спасьцярог двое дзьвярэй. За аднымі зь іх нехта нешта пільнаваў, а за другімі роўнамерна стукала машынка. Янук, памяркаваўшы, адчыніў дзьверы. Пры стале, бокам да яго, сядзела маладая стройная дзяўчына, а пальцы ейныя хутка танцавалі па кнопках машынапіскі. Пальцы спыніліся й дзяўчына зірнула на хлопца.

- Скажыце, калі ласка, дзе рэдакцыя? - спытаў дзяўчыну Янук.

- А там наверсе, ідзіце па сходах, - адказала яна службовым голасам і адразу-ж зноў узялася пісаць.

Скрыпучыя драўляныя сходы прывялі Янука на другі паверх, дзе ў калідорчыку пабачыў аж трое зачыненых дзьвярэй. На іх ня было ніякіх напісаў і юнак мяркаваў куды далей пайсьці. Доўга ня думаючы, адчыніў сярэднія дзьверы й апынуўся ў вузкім пакоі, які, як яму здалося, быў з боку вуліцы, бо ў сьцяне было адзінае, даволі вялікае вакно. Ля сьцяны з правага боку за доўгім сталом, нагнуўшыся над паперамі сядзела двое: жанчына з каўказкім тварам, а побач яе з правага боку, - чалавек сярэдніх гадоў, з падоўжаным тварам, яснымі валосамі. Выглядала, што людзі гэтыя былі занятыя. Жанчыну Янук ведаў зь нейкае здымкі й чытаў ейную паэзію. Яе не спадзяваўся тут бачыць, а мужчыны зусім ня ведаў.

Каля левай сьцяны стаяла вялікая шафа, а тут-жа побач - даўгая лава. На сьцяне вісеў гэрб пагоні, мапа Эўропы, а на другім стале пры вакне ляжалі газэты, кніжкі, розныя паперы, прылады да пісаньня. Стол гэны, відаць, пакінуў гаспадар, які неўзабаве вернецца.

- Добры дзень, - сказаў Янук, зьдзеўшы шапку.

На ягонае прывітаньне людзі за сталом не адказалі, толькі паэтка ледзь заўважна галавой кіўнула.

- Ці мог-бы я бачыць рэдактара? - спытаў Янук.

Пытаньне павісла ў паветры без адказу, а двойка за сталом прадаўжала ціхую гутарку. Зусім зьніякавеўшы, Янук ня ведаў, што далей рабіць. Ён аглянуўся навокал, пастаяў некалькі часінаў і сеў пры сьцяне на лаву.

Абмяркоўвалі архаічныя словы, выражэньні, што былі часткай нейкай гістарычнай драмы. Турбуючыся сытуацыяй, у якой апынуўся, Янук усё-ж вымяркаваў, што людзі гаварылі пра лібрэта опэры «Усяслаў Чарадзей», якое, мабыць, апрацоўвала паэтка. Даволі павярхоўнае знаёмства зь ейнай творчасьцю падказвала хлопцу, што і ў гэным жанры яна мела набітую руку. У нянадта спрыяльных умовах менскі тэатр абнавіў працу, ставіліся драмы й опэры, аднаўлялася старое, некалі бальшавікамі зьнішчанае, тварылася й новае. Цяпер гэтая пара ператрасала твор, аснаваны дзесь на далёкай мінуўшчыне. Роўныя галасы й поўная канцэнтрацыя падказалі, што людзі гэтыя думкамі жылі ў адлеглым сівым стагодзьдзі, а зусім ня тут, у рэдакцыі менскай на вуліцы Алеся Гаруна. Магчыма, што яны й не заўважылі юнака ў паўсуконнай шэрай сьвітцы, зялёных штанох, а калі й спасьцераглі, дык, бяз сумлеву, зусім яго на ўвагу ня бралі.

Ішоў час, а Янук сядзеў. У гэткім становішчы ніколі Бахмачу не даводзілася раней быць. Пад ім гарэла лава, нэрваваўся. Ведаў, што назаляць гэтым занятым людзям не павінен, што, відаць, трэба было-б устаць, перапрасіць іх і выйсьці. Ды простай адвагі не хапала. Людзі гэтыя раней яго не спасьцераглі, а што будзе цяпер? Упікнуты іхнай абсалютнай няўвагай да яго, юнак так зьбянтэжыўся, што ніяк наступнага кроку ня мог вымяркаваць. Гэтта-ж ясна бачыў, што гэтым людзям перашкаджае, што ён тут зусім непажаданы. Гэтак бывае, калі чалавек, зьбіты з нармальнага тропу ў жыцьці, сам сябе заганяе ў тупік, калі самая звычайная дзейнасьць, нейкая лёгічная акцыя магла-б зьмяніць сытуацыю. Колькі пасьля ня думаў Янукк пра той выпадак, бачыў свю звычайную дурноту. Чаму ня ўстаў, зусім проста не адчыніў дзьверы й ня выйшаў? Але ніяк ня мог рацыянальна вытлумачыць таго, што ён тады зрабіў. А справа ў тым, што зрабіў абсалютны ноль. Проста сядзеў, быццам прыкаваны да тэй лавы й зьбянтэжанымі вачмі паглядаў на двойку людзей, каторыя яго бачылі й ня бачылі.

Мужчына зіркаў на Янука ўсё часьцей і ў ягоных шэрых вачох, як здалося юнаку, скакалі іскры нецярплівасьці. Падпершы рукой падбародак, ён часьцей торгаў галавой. Жанчына разважала над старымі словамі й фразамі зь бястурботнай флегмай. Але раптам шэрыя мужчынавы вочы зрабіліся калючымі іголкамі, зірнулі проста на Янука, а тут-жа загрымеў рэзкі загадны голас:

- Во-о-о-он!

Януку як быццам хто варам у твар лінуў. Застукала раптоўна сэрца, млоснасьць разьбеглася па целе, закружылася галава.

- Вон, кажу! Чаго тут сядзіш? Ня бачыш, што перашкаджаеш?

Мужчына прыўстаў за сталом і хлопцу здалося, што вось-вось на яго кінецца. Янук хуценька ўстаў з лавы і неўзабаве апынуўся за дзьвярмі. Моцна білася сэрца. Стаяў у слаба асьветленым калідоры й ніяк ня мог наважыцца што далей рабіць. Здавалася, што ляпей-бы залезьці ў нейкую нару, каб людзі яго ня бачылі. Які сорам! Зрабіў непрабачальнае зло й за гэта атрымаў зусім заслужанае пакараньне. Якая дурнота! А з другога боку, гэтта нейкі голас кпіў зь яго: «вось табе як на Парнас узабраўся! Так табе й трэба! Куды лезеш? Ці ты ім раўня? Мужык дурны!»

Добра не ўяўляючы куды пойдзе й што будзе рабіць, Янук зыйшоў па сходах уніз. За зачыненымі дзьвярмі прадаўжалася рытмічнае

кляпаньне машынапіскі, а за другімі - стук малатка. Янук выйшаў на вуліцу й спыніўся. Некуды трэба было йсьці, абы не стаяць, абы сабрацца з думкамі. Здавалася яму, што й гэтысамы будынак, каторы вось нядаўна знайшоў з такой вялікай радасьцю, ды з такімі вялікімі спадзяваньнямі адчыніў яго дзьверы, цяпер стаўся варожым, халодным, адпіхаў яго.

Ішоў вуліцай уніз да Нямігі, зусім не бачачы што робіцца навокал. На рагу вуліцы спыніўся перад кучай газэтаў, якія прадаваў малы хлапец. Вялізны загаловак на першай бачыне «Беларускай газэты» крычаў: «Новыя вялікія перамогі Вяліканямеччыны». Зайшоўся ў рэстаран, замовіў чай і булку. Сядзеў і доўга думаў. Пасьля блудзіў па горадзе, але мала вакол сябе бачыў. Каторы ўжо, дзясяты ці соты раз, паўтаралася ў уяўленьні сцэна з рэдакцыі: чалавек з калючымі вачмі торгае падбародкам, знэрвавана корпаецца рукой у сваіх рэдкіх валосах і, раптам, гюэнае гнеўнае слова! Чырвань залівае Янукоў твар. Як гэта магло здарыцца? Што цяпер? Пайсьці назад, ці што? Але дзе ўзяць сьмеласьць?

Янук заўсёды намагаўся абаснаваць выпадкі, адказаць на пытаньні: што, як і чаму сталася? Ня спыняўся з адказамі на «што», асабліва важнымі былі «як» і «чаму». Цяпер-жа, як ні намагаўся, ня мог рацыянальна таго здарэньня вытлумачыць. Зашмат няведамых. Хто такі той дзядзька з калючымі вачмі? Якую выконываў у рэдакцыі функцыю, ды які сам быў чалавек, або, - як звычайныя людзі вызначаюць гэта, - які меў характар? Дый адкуль такі аўтарытэтны й крыклівы ў яго голас?

Тымчасам Янук вінаваціў самога сябе. Але ў чым ягоная правіна? Калі там была рэдакцыя, калі газэта выдавалася для народу, калі шматлікія чытачы пасылалі туды матар'ялы рознага роду, дык ці-ж рэдакцыя не жадала бачыць наведвальнікаў? Ці-ж рэдактарам і супрацоўнікам няцікава было бачыць аднаго ці другога дзядзьку з правінцыі, пагутарыць зь ім, памацаць яго, так сказаць, пацягнуць каго за язык, каб чуць-чуваць, праведаць, што ў гушчы народнай дзеіцца? А калі адведзіны забараняліся, дык чаму тады пра гэта не абвесьціць ну, скажам, хоць бы й на дзьвярох напісаць, або ўстанавіць час для наведвальнікаў?

Валочачыся па менскіх вуліцах, Янук бесьперапынна стаўляў сабе новыя, вельмі нязвычайныя пытаньні й намагаўся на іх суладна

адказаць. І з прагрэсам такіх разважаньняў у дзьвёх асобах прыходзіў да выснаву, што, магчыма, сам зрабіў памылку, якую яму можна было выбачыць. Здавалася, што наляцеў на нейкага калі не дзікуна, дык карантыша-нелюдзя, які зь няведамых прычынаў забыўся пра звычаўную ветлівасьць. А можа гэта першы раз такое здарылася, што прыйшоў да іх такія нясьмелы юны наведвальнік, які, не папрасіўшы дазволу, расьсеўся на лаўцы ды патрабаваў адказу на простае пытаньне? Дык чаму-ж тады не сказалі яму, што, прыкладна, рэдактара цяпер няма, што прыйдзе пазьней, ці як? А гэтта проста не заўважылі яго, а пасьля... вон!

Як-ніяк, балела! Яшчэ больш крыўдна, калі прыраўнаць тую сакавіта ўяўленую Януком сустрэчу з гэтай рэальнай. Праўда, у фантазіі гон вялізны. Магчыма, яна пераацаніла вагу інстытуцыі газэты ды асабліва ейныя матар'яльныя абставіны ў часе вайны. Прыгожае, вялікае, добра абсталяване бюро, камфорт! Шыш, дудкі, браце! Напэўна курылі яшчэ навокал гарам руіны, а руплівыя вочы патрыётаў ужо сачылі дзе, у якім уцалелым будынку зьвіць гняздо для гэтай абсалютна неабходнай працы, каб народ на духу падняць, каб клікаць да еднасьці й змаганьня, да новых намаганьняў, да вялікага ўваскрошаньня. І ўсё-ж, пэўне, было накш, чым уяўляў літоўскі юнак. Знайшлі будынак, сьцягнулі дзе што далося з мэблі, і пачалі... Газэта, ці фактычна дзьве адразу, нарадзіліся недзе ў жнівені, значыцца на зусім яшчэ сьвежым папялішчы. А колькі-ж трэба было намаганьняў, каб зарганізаваць ня проста працаздольных, але найлепшых і перадавых, калі вораг ад няпамятных часоў глуміў беларускую ніву, вынішчаў найбуйнейшае й плённае, а пакінуў самы асот і гірсу? Ды адкуль там і хто, дый за якія сродкі мог абсталяваць якую добрую кантору й друкарню, тым больш, калі на ўсё патрабаваўся дазвол новага й ненажэрнага акупанта?

Із тэй сьціплай колькасьці школьнае літаратуры, якую некалі чытаў, намагаўся Янук знайсьці гэроя ў падобнай сытуацыі. Выбар невялікі. Магчыма, што Дыкэнсаў Алівэр Твіст, зь ягоным «яшчэ». Але там, здаецца, больш сарака такіх самых галодных, як ён, перапалоханых, маўчала. Адзін ён, наіўны, з растрывожаным апэтытам сустрэў азызлы падбародак і заплыўшыя тушам вочы. І само яно, тое слова вырвалася неяк. А гэтта?

Янук, сьцяблінкай з гэнай «сакавітай руні» асьмеліўся на вялікага сейбіта зірнуць, паглядзець што ў гумне дзеіцца. Вон!

Хто ён такі, той дзядзька з калючымі вачмі? А ці ён, Янук Бахмач, гэта новы Алівэр Твіст у новым часе, каторы ня крычаў «яшчэ», але патрабаваў да сябе ўвагі? Дыкэнса чытаў яшчэ ў польскім перакладзе й запомніўся яму малы Алівэр. Ды не. Мусіла дзесьці ў мастацкай літаратуры быць апісаная больш адпаведная сытуацыя. Дзе? Хто? Ці было штосьці падобнае ў беларускай літаратуры? Ня ведаў. А калі ня было апісана, то, пэўне-ж, магло ў жыцьці здарыцца. Вазьмі Янку Купалу, Якуба Коласа, Цётку, Багушэвіча, Багдановіча. Ці ня было ў іх чагосьці падобнага, калі бяздушны ўраднік каторага за дзьверы выгнаў? Магло быць. Адно, што ніхто гэтага не апісаў...

Назаўтра Янук сядзеў перад маладжавым з выгляду, гадоў мо сарака, з чубам у складкі, Вяршынным, тым самым, каторы пра «рунь» пісаў. Вяршынны гаварыў роўным і ціхім голасам:

- Узяць вось ваш першы верш «Каб быў я арлом»... Першая спроба нядрэнная...

Вяршынны разлажыў перад сабой папку гадавіка газэты й нарэшце знайшоў верш.

- Вось чытаем першую зваротку:

Калі я учора на сонца глядзеў,
Жадаў, каб у высь я арлом паляцеў,
Над роднай краінай кружыў-бы кругом,
Ох, як было-б добра, каб быў я арлом!

- Ну, што пра яе можна сказаць? Рытм і рыфмы ўпарадку. Думка ёсьць. Паэзіі, быццам, няма. Але, што-ж, як першую спробу, яно пайшло. І то, паколькі помню, нехта з нас папраўляў, можа навет і я. Бачыце, два першыя радкі дзеясловамі канчаюцца. Гэта нядобра. дзеясловы рыфмуюцца надзвычайна лёгка, кажнае дзіця гэта здолее, а таму ў творчай працы трэба гэтага высьцерагацца. Пачытайце хаця-б Багдановіча ці Купалу, самі пераканаецеся. Цяпер-жа ў двух першых радкох у ваз займеньнік «я» аж два разы. Абыйшлося-б адным. Калі-б, прыкладна, замяніць «у высь я» на «пад неба», дык глядзіце што выйдзе: «жадаў, каб пад неба арлом паляцеў». Верш адразу ўзбагаціўся, а сэнс не мяняецца. Дый наагул, як сказаў я, у гэтай

першай зваротцы паэзіі ў вас няма, хаця ў далейшыых ёсьць яе праблiскі. Паўтараю: праблiскі. Разумееце? Паэтычны палёт у вас таксама ёсьць. Ня турбуйцеся, не сьпяшыцеся. Вам трэба добра жыцьцю прыглядацца, а яно перапоўнена паэзіяй, горкай і салодкай... Справа ў тым, што запраўднай і прыгожай паэзіі сілай з сэрца ня выдушыш... Цяпер узяць вашу другую зваротку, дзе далей арлом сваё падарожжа прадаўжаеце...

Вяршынны гаварыў павольна, сяброўскім тонам. У пакоі, сумежным з тым, адкуль учора дзядзька з калючымі вачмі Янука вон выгнаў, нікога, апроч іх ня было. Янук уважна слухаў і зайздросьціў гэтаму экспэрту такіх ведаў з паэзіі. Вяршынны на хаду рэарганізоўваў Януковы радкі, каб ілюстраваць свае думкі.

Пасьля паўгадзіннай гутаркі крытык пажадаў Януку плённае творчасьці, моцна паціснуў руку ды параіў схадзіць да сакратаркі па ганарар. Крыху пазьней Янук выхадзіў з рэдакцыі і з задавальненьнем сьціскаў у кішэні атрыманыя сорак тры маркі. Першы ганарар! А ў вушах зроўнаважаны й аўтарытэтны голас раіў як пісаць. Горкая праўда. Ня было ў ягоных вершах паэзіі, адно проблескі яе. Чырванеўся юнак, намагаўся прыгадаць кажнае слова Вяршыннага.

- Агулам, яшчэ раз добра прачытайце й прадумайце мой артыкул пра «рунь», - гаварыў крытык з «Парнасу». - Там многа парадаў, зь якіх трэба было-б вам скарыстаць...

«Трэба будзе», - думаў Янук, пакідаючы пасьля зруйнаваную сталіцу.

25

Янук сядзеў на абшырным бальконе ў выгадным, плеценым з лазы, крэсьле. Перад ім зграмазьдзіліся малыя, з чырвонымі чарапічнымі й шэрымі гонтавымі дахамі, хаты. Вакол іх - невялікія агародчыкі, дзе ля парканаў усьміхаліся сланечнікі, а на лехах - буйнае варыва. Дзесьці на вішні тарарахала сарока. Далей ляніва плёскала ў берагі марудная Вяльля, а за ёй, пад прапаласканым небам, узвышалася Замкавая гара. Калісьці спад Януковага, нянадта спрактыкаванага, пяра нарадзіліся радкі:

Грозна, думна з гары пазіраюць муры -
Помнік слаўных часоў Гедзіміна.
Шмат пражыў чалавек, не адзін прайшоў век,
Сьлед пакінуў на шэрых руінах.

Муроў тых замала асталося, каб яны «грозна, думна» пазіралі, адно адзін, зьлізаны часам, лабаты кутавы сэктар. Адылі здалёку гэны кут натхняў Янука да палёту ў вунь якую буйную фантазію. І чамусьці ў сувязі з гэным вершам прыгадаўся яму іншы, напісаны зараз-жа пасьля прыезду на навуку ў Вільню:

Прывітаньне табе, Вільня,
Слаўны горад Крывічоў,
Места памятак магільных
Нашых прадзедаў, дзядоў.

Зь вершам на пяць зваротак, адно на гарачую руку змайстраваным, і нянадта адшліфаваным, пасьпяшыў Янук у «Беларускі голас». Там сустрэў яго сівы, кволы з выгляду рэдактар Аляхновіч, што некуды сьпяшыўся й таму не папрасіў студэнта навет у канцылярыю ці пакой а зараз-жа, тут на сходах, перайшоў да роспытаў:

- Студэнт? Адкуль?

Янук назваў мясцовасьць.

- Ага, знаю, знаю. Вельмі добра зрабіў, што прыехаў вучыцца. Трэба нам найбольш сваей інтэлігенцыі. Вельмі, вельмі добра зрабіў.

Янук нясьмела пазіраў на розавы твар і цяжка яму было паверыць, што перад ім стаяў аўтар даўгога й надзвычайна цікавага нарысу «У кіпцюрах ГПУ», якім некалі ўзахлёб цэлыя гадзіны зачытваўся. А былы гаротнік пытаўся:

- Дык што скажаш мне, студэнт?

- Ня ведаю як пачаць... Маю тут верш на прывітаньне Вільні...

- Ага, дык ты й паэт, аказваецца... Ну што-ж... Маладзец. Давай што маеш, калі добры дык зьмяшчу. Але, братка, я моцна сьпяшу. Зайдзіся калі... пагаворым...

З такімі словамі Аляхновіч, не разьвітаўшыся, рушыў сходамі ўніз. Верш, бязь першае звароткі, зьявіўся ў газэце на наступны тыдзень. Цэнзар, як выглядала, не згаджаўся, што «Вільня - слаўны горад Крывічоў». Аўтар і сам ня быў пэўны ці Вільня паўстала на засягу зямлі калішняга асноўнага племя пазьнейшага беларускага народу. Адылі ясна, што горад пазьней быў літоўскі, а не жамойцкі.

Апроч адрэзанае галавы, у далейшых зваротках загнязьдзілася колькі друкарскіх памылак. Не ўяўляў аўтар, што верш можна аж так сапсаваць у друку. Другой звароткай ён выказаў захапленьне старой літоўскай сталіцай:

Ты разьлёг перада мною
У васеньнім тумане,
Быццам кветкай маладою
На зялёным дыване.

Янук прыгадваў першы від гораду, дакладней - тае зелені, што ўсьміхнулася яму ў імглістую раніцу. Такім дэбютам у газэце, што друкавалася лацінкай, якое Янук ня любіў ужываць у беларускай мове, скончылася ягонае супрацоўніцтва зь «Беларускім голасам». Пасьля пісаў пра беларускае жыцьцё ў Вільні й вершы ды пасылаў у Менск.

Вершы, вершы-лятуценьні...

Дзесь далекавата налева, на Антокалі бялелі вежы высокай сьвятыні і гэтта-ж амаль перад носам, з-над дахаў пазіралі вежы іншых касьцёлаў. Адсюль, як на далоні, красаваліся й калёны фасаду віленскае катэдры. Янук яшчэ раз прыгадаў сабе, што трэба пацікавіцца, ці запраўды ў склепе ейным ёсьць магілы вялікіх літоўскіх князёў.

Пляны, намеры... Колькі іх было.

Сябра Загорны намовіў гімназістку Рандуўну паехаць па абедзе ў Вэркі, куды, казаў, хадзіў рачны параплаў. А Янук, расьсеўшыся ў гэну нядзелю на бальконе, прыслухоўваўся як воддаль, на Кальварыйскай вуліцы цікалі конскія падковы. Прыграваны васеньнім сонцам, зноў думкамі вярнуўся да пачаткаў свайго віленскага жыцьця.

Хто ведае, ці ўдалося-б Януку дастацца ў беларускую гімназію, калі-б не ягоныя паэтычныя спробы. У шэрым, з паападаўшай са сьценаў тынкоўкай, двухпавярховым будынку на Вострабрамскай

вуліцы, гэтта-ж непадалёк станцыі, паспрыяла яму адразу пабачыцца з дырэктарам Францішкам Грышкевічам. Чалавек сярэдніх гадоў, бляндын, з прыязным адкрытым тварам, даверлівымі вачмі, ён адразу разьвязаў юнаку язык. Бахмач прыйшоў у канцылярыю дырэктара з большай упэўненасьцю, чымся калісьці да Раманоўскага ў школу ў Гацях. Меў-жа за сабою не абы-які школьны багаж. Пасьля году ў беларускай школе ў Гацях, скончыў шасьцімесячныя настаўніцкія курсы для настаўнікаў пачатковых школаў у Глыбокім. Усё-ж адрыў ад дому ў часе вайны, якая ўсё разгаралася, ды паўгалоднае студэнцкае жыцьцё ў далёкім горадзе прадстаўлялі немалую рызыку. Колькі ваганьняў і роздумаў, пакуль адважыўся на гэты вялікі крок, а пасьля яшчэ пацягнуў за сабой сябру Лявона Загорнага. Можа й не асьмеліўся-бы, калі-б ня пераконлівае слова агранома Падгайскага:

- Едзь, Янук, і цягні майго пляменьніка. Ні траць нагоды. Ніхай тутака ў пачатковых школах іншыя вучаць. Ні забывайся, што нам патрэбная свая, вельмі добра адукаваная, інтэлігэнцыя. Віленская гімназія гэта сапраўдная кузьня беларускасьці. Навука - найбольшы капітал у жыцьці й твой будучы хлеб. Ты вельмі таленавіты юнак і добры патрыёт. Маючы навуку, зможаш шмат зрабіць для свайго народу. Паглядзі, колькі нашых найлепшых людзей Палякі, бальшавікі й Немцы вымардавалі, каб іх зімля ні насіла! Араць і касіць у нас будзіць каму, а хто народам кіраваць будзіць? Нам-жа трэба сваю дзяржаву будаваць.

- Ня ведаю, - адказаў Янук. - Як-жа вучыцца, калі ў бацькі бяда? Што надзену, што буду есьці?

Падгайскі задумаўся.

- Слухай, я табе што-небудзь з вопраткі дам дый памагу грашмі. Яшчэ дам пару адрасоў сваіх сяброў у Вільні. Ты да іх зайдзіся. Нехта зь іх будзіць кватэру мець. Гэта я табе ўсё раскажу й дам пісьмы да іх. Ды не забывайся, што ў Вільні ёсьць наш біларускі камітэт, які, мне здаецца, таксама можа памагчы студэнту ў выпадку патрэбы. Адным словам, з голаду й холаду ні памрэш. Мне здаецца, што ўдома ў вас нінадта піразь бірагі піраліваецца - капусты ды крупы. Дык і ў Вільні нейкая там капуста будзіць.

Дырэктар Грышкевіч запрапанаваў сесьці й распытваўся адкуль Янук з дому. Ён ужо ведаў ягоную школьную кар'еру з тых дакумантаў, якія Янук учора пакінуў у канцылярыі разам з заявай, а цяпер у руках

сшытак зь сіняй вокладкай, першыя плёны Януковай паэзіі. Ня прыпадкова Янук учора пакінуў разам з заявай і гэны сшытак.

- Пясьняр, значыцца? - сказаў дырэктар бацькоўскім тонам. - Прачытаў пару вершаў. Добрыя. Хочаш вучыцца? Вайной ды аж за дзьвесьце кілямэтраў ад дому? Гэта - адвага! Я пастараюся даць магчымасьць. Адносна ўступных іспытаў...

Гэтта дырэктар паясьніў, што вымагалася. Пытаньнем была лацінская мова, якой Янук ніколі ня вучыўся. У працягу наступных пару дзён ён спасьцярог, што іспыты гэныя былі нецяжкія, хоць, праўда, ягоная ранейшая падкаванасьць ува ўсіх прадметах добра памагла. І такім чынам неўзабаве зьявіўся ён між вучняў сёмае, значыцца перадапошняе клясы гімназіі.

Усё пачынаецца ад жывата. Даведаўшыся, што ў ціхай і прыгожай Вільні харчы прадаюцца адно на карткі, параілі сябры Януку й Лявону пайсьці ў адну «вальдзіс», значыцца мясцовы лятувіскі гаспадарчы ўрад, дзе выдаюць харчовыя карткі. Кантору тую знайшлі хлопцы тут-жа побач вуліцы Міцкевіча, недалёка Зялёнага мосту. У канцылярыі было пару ўраднікаў і ўсяго адна наведвальніца. Яна хутка выйшла й хлопцы падыйшлі да старэйшай, тоўстай, з выгляду надта занятай жанчыны. Зьвярнуліся да яе панямецку:

- Мы хацелі-б харчавыя карткі атрымаць.

Жанчына падняла галаву з-над ліста паперы, уважна зірнула на студэнтаў і нешта адказала палятувіску.

- Мы палятувіску не разумеем. Але-ж вы, пэўне, панямецку мусіце гаварыць. Дык мы просім вас выдаць нам харчовыя карткі.

Гэтым разам на жанчыніным твары мільгануў выразны цень незадавальненьня, язык ейны больш разьвязаўся, але ў тэй самай мове.

- Што гэта такое? Ня можа быць, каб яна панямецку ня ведала. Чакай, а можа пабеларуску?

Янук зьвярнуўся да ўрадніцы пабеларуску.

Із трэцяй спробы нічога не атрымалася. Жанчына ня скрывала сваей няпрыязьні. Яна навет адвярнулася ад хлопцаў. За другім сталом шлёпала на машынцы маладая дзяўчына, а за дзьвярмі чуваць былі мужчынскія галасы.

- Што будзем рабіць? Гэта яна хіба-ж наўмысна? - сказаў Янук.

- А можа панямецку ня ведае? - сказаў Лявон.

- Кінь ты. Дык чаго тады яна тут сядзіць? Цьфу, што за народ.

З гэткімі словамі хлопцы выйшлі. Давялося йсьці ў Беларускі Нацыянальны Камітэт, што быў тут-жа недалёка, і прасіць помачы. Пару дзён пасьля, карыстаючыся перакладчыкам, ды прадставіўшы дакуманты, што яны ёсьць студэнтамі, хлопцы атрымалі харчавыя карткі. Гэткім чынам першы кантакт з Жамойцамі, якія пад крылом акупанта загнязьдзіліся ў старой літоўскай сталіцы, паказаў юнаком твар яшчэ аднаго ворага. Калі-ж выпадак з нашымі студэнтамі сьветчыў пра адносіны Жамойцаў да бальшыні жыхароў гораду, якія лятувіскае мовы ня ведалі, то Жамойцы мусілі нажыць сабе шмат ворагаў.

З кватэрай студэнтам пашанцавала. Сябра Кастуся Падгайскага, аграном Казьляк меў двухпавярховы дом з абшырным нізам і трыма пакоямі на другім паверсе. Два пакоі далі студэнтам. На пытаньне пра плату, аграном Казьляк, мужчына скорагаворкі й энэргічны, махнуўшы рукой, сказаў:

- Разьлічымся. Пажывеце, вучыцеся. Далей будзем бачыць. Сам я вунь некалі вучыўся ня ўлегцы, дык ведаю, як вам нялёгка, асабліва вайной.

Жонка Марыля аказалася надта ветлівай і добрай гаспадыняй. Замуж яна выйшла, як пасьля хлопцы даведаліся, позна і ў сям'і быў адзін дзесяцігадовы сын Янка. Так пасьля й злажылася, што аграном памагаў навет харчмі, бо сам працаваў у нейкім сельскагаспадарчым «штэле», калішнім бальшавіцкім саўгасе, адкуль нярэдка валок дадому гародніну, садовіну й навет мяса.

У гэнае нядзельнае паабедзьдзе ўся Казьлякова сям'я пайшла да некага ў адведзіны, а Янук сядзеў на бальконе й згадваў нядаўную прошласьць. Яшчэ раз пабег у пакой і выцягнуў з шупляды Дунін ліст. Атрымаў яго мінулага тыдня й ня мог ім яшчэ ўволю нацешыцца.

«Янучок», - пачынала Дуня. Не напісала «дарагі» ці які, а проста «Янучок».

«Дзякую за тваё пісьмо, якое прачытала зь вялікай цікавасьцю. Усё, што ты пішаш пра Вільню, надта захапляе мяне. Каб я калі магла пабачыць гэты слаўны горад!

Як маешся? Пра сябе, мой любы Янучок, ты пішаш скупа. Не зажурыўся ты ўжо па роднай хаце: Мяне цікавіць кожная драбніца твайго жыцьця. Дык наступным разам не ашчаджай чарніла. Яго-ж, пэўне, у Вільні хапае?»

Ня ведаў юнак чаго ад дзяўчыны чакаць, асабліва пасьля нязвычайнага разьвітаньня.

- Янучок, ты здурэў? У Вільню? Толькі курсы скончыў, а настаўнічаць ня хочаш? І што табе з тэй гімназіі? Ці ты забыўся, што вайна цяперака? Чаго так далёка ад дому адлучацца?

Гаварыла на адхоне побач чыгункі стоячы. Янук забегся да Макатуноў зь цягніка, калі прыехаў зь Вільні, каб забраць свае рэчы.

- Як гэта, чаму я здурэў? Дуня, што ты гаворыш? Я вучыцца хачу. Нагода, ведаеш...

- А я думала, што мы можа ў ваднэй школе з табой дзетак вучыць будзем. Так марылася, жадалася...

Ейны голас завагаўся, твар абліўся чырваньню. Янук чакаў нямаведама чаго, намёкаў ці абяцанак. Дзяўчына набрала ўпэўненасьці, расьцьвіла, разбуйнела, дзіва няма, што на настаўніцкіх курсах хлопцы праходу ёй не давалі. Фліртам не абы якім сталася. Неўзабаве яна, - прадчуваў гэта Янук, - выпырхне зь цеснай і смуроднай Макатунішынай хаты й зусім ператворыцца ў кампэтэнтную, практычную й перадусім прывабную настаўніцу. А далей? Янук баяўся думаць.

І тады, пры гэнай апошняй сустрэчы, Янук ад Дуні нечага чакаў. А яна на захадзе сонца, з праменьнямі пазалочанымі пышнымі валосамі, зажуранымі васількамі-вачмі, расьцьвіла выдатнай красой. А з вуснаў што?

- Здурэў ты, Янучок мой любы. Чаго табе ў Вільню, калі ты ўжо наўчыўся? Які цябе чорт туды нясець?

Дзяўчына раптам спахапілася. Твар ейны спаважнеў, а пасьля распагодзіўся вінаватай, шчодрай усьмешкай, а вочы васількі пазіралі на яго задумана й абяцаюча.

- Знаеш, Янучок, гэта ня ты дурань, а я. Чаму й завошта я цябе лаю? Едзь, едзь, мой саколік, я цябе ні дзяржу. Едзь і вучыся. У цябе-ж і галава не абы-якая, у цябе заўсёды быў вялікі палёт. Ты-ж і паэт і пісьменьнік...

Янук зачырванеўся. Цяжка сказаць, ці дзяўчына гаварыла цяпер сур'ёзна, ці цыганіла. І ейныя ласкальныя «Янучок», «саколік», «любы» зьбівалі яго з тропу. Гэтак да малодшых дзяцей гаварылі старэйшыя, радня ці чужыя. А Дуня-ж - ягоная аднагодка. Што гэтым ласкальным сказаць хацела? Лепш-бы гаварыла да яго як сябры. Ато

адным разам, як ужо раней бывала, уводзіла яго ў фізычны азарт. а пасьля пакідала, зрывалася, а цяпер гэтай сваей ласкальнасьцю, быццам яна яго, ці што...

- Лепш раскажы мне пра віленскую беларускую гімназію. Кожную драбніцу, усё, што ведаеш. Сядзь во тут, каля мяне.

Яна сьцягнула яго зусім пад адхон, дзе пахла верасам і мятай. Дзесьцві воддаль над балотам раскрычаліся вароны, а недзе бліжэй заскрыпела сарока. Адсюль, з упадзіны між насыпам і чыгункай, адно чыстае лёгкаблакітнае, з рэдкімі ваўнянымі хмаркамі на ім, неба натхняла спакоем і задуменнасьцю. Даўжэў цень бярозы, што ляніва шаптала лісьцямі з другога боку чыгункі.

Нешта, - ці то агрэсыўнасьць дзяўчыны, ці то нейкая ейная зьверхнасьць, - зьвязала Януку язык.

- Што там казаць пра Вільню... Прыехаў, здаў акзамін, прынялі, ды і ўсё...

- Вось яно як! Як пугай стрэліў: прыехаў, здаў акзамін, прынялі. Як той рымскі палкаводзец: прыйшоў, убачыў, перамог!

Дунін голас, здавалася, кпіў зь яго й квяліў яго. Юнак зірнуў на яе коса.

- Пры чым тут рымскі палкаводзец? Так было.

Не, ня тое тады сказаць хацелася. Цяпер на бальконе Казьляковай хаты, з гарой Замкавай перад вачмі, шчымела сэрца. Стаяла перад ім яна, усімі адценьнямі сакавітага хараства распраменіўшыся, а ў задуманых і журлівых дый гарэзных вачох загараліся й танцавалі вясёлыя агеньчыкі. Вусенкі абяцалі пяшчоту, салодычы. І ў галаве ягонай гнязьдзіліся словы, проста паэзія-малітва да дзяўчыны, якую ніколі-б не асьмеліўся выказаць:

«Дунечка, каханая цацанька мая! Прыгарні, абдымі мяне, сьцішы пажар у сэрцы маім. І адно намякні. Сьледам за табой пайду, разам дзетак будзем вучыць, можа лёс свой зьвяжам»...

«Не, гэта занадта празаічна. Тут трэба было-б прыгожай Купалавай ці Багдановічавай паэзіяй» - думаў Янук. Сама важнае, што карціла яму, каб неяк зусім канкрэтна выказаць дзяўчыне свае пачуцьці. Ня мог адважыцца, проста забірала дыханьне. І прыгадвае, што стаяў, хоць і прасіла побач яе прысесьці. І пазіраў на яе зь пяшчотаю, сіліўся думкамі, мабілізаваў адвагу, каб сказаць нешта надзвычайна важнае, прост-напраст манументальнае, такое, чаго зусім

не абдумаў, але што абвязкова мела быць сказанае. А заміж гэтага выйшла простае і ў гэным часе й месцы навет недарэчнае:

- Знаеш, Дуня, я табе пісьмо зь Вільні напішу, добра? Адпішаш?

Дзяўчына ўважна зірнула на яго. Ці здалося яму, ці ў тых каханых вачох кпіны?

- Ага, добра, адпішу, - буркнула.

І маўчаньне. Яна нахілілася, сарвала галінку верасу й разглядала яе. Калі-б Янук мог тады пасяброўску неяк выказаць тое, што хацеў ці думаў. Эмоцыя замінала. Час ляцеў і Янук бачыў, што дзяўчына чакала пачуць ад яго нешта больш значнае, калі ўжо ня зусім урачыстае. Гэта-ж, як-ніяк, расставаньне. Ужо шарэла. На захадзе выразна зазьзяла Мілавіца, калі Дуня ўстала. У вачох яе ані ценю звычайна прысутнае там гарэзьлівасьці. Васількі пазіралі проста, напорыста, быццам хацелі Януку дзесьці ў душу зазірнуць.

- А я думала...

На твары зьявілася заклапочанасьць, расьцярушанасьць.

- Думала, што ты і я... Дык не. Ну едзь. Так і трэба, Янучок. Едзь! Скора тамака пра мяне забудзешся й якую гарадзкую паненку знайдзеш... Ніхай сабе...

І яна раптам зьнікла. Апошнія словы, сказаныя зь вялікім націскам, тонам нейкай фінальнасьці. Дзяўчына зьнікла з вачэй, а Янук, гарачынёю твар заліты, ногі аслабелыя, стаяў і дрыжэў, ня ведаючы ці дагнаць Дуню й прасіць прабачэньня, і... Пазіраў на выседжанае ў траве месца, хацелася стануць на калені, пацалаваць яго... Або бегчы за ёю ззаду... Хацелася й тое й гэна, а ён стаяў у ненаважанасьці, і прадчуваў, што ня зыйсьці яму з наканаванай дарогі. Дзесьці збоку ў міражы памяці стаяў Падгайскі й Грышкевіч, і хлапец больш адчуваў чым усьведамляў, што пойдзе за іхнай парадай. Праўда, Дуня выразна сказала, што хацела-б разам зь ім дзетак вучыць. Як шкада! Прыгожа выглядала-б ягоная будучыня..

Вялікая вёска, у якой шмат дзетак. Школа, абавязкова прасторная, зь вялікімі вокнамі ўва ўсіх чатырох сьценах. Яе абступілі навокал стройныя бярозы. Школа поўніцца шчабятлівымі звонкімі галасамі, гудзе магутнай песьняй. А ў пагодныя надвячоркі яны, Янук і Дуня, напоўненыя шчасьцем каханьня, вандруюць па нівах побач сьпелага збожжа, або блудзяць у бары. Так сабе павольна, бязь сьпеху, насалоджваюцца плённаю восеньню. Сядаюць на мяжы пад волатам

дубам і Янук чытае дзяўчыне свой апошні верш, ёй прысьвечаны. Дуня сквапліва ловіць кожнае слова.

І васількамі расьцьвілі
каханай маей вочы,
якога шчасьця на зямлі
ня сталі мне прарочыць?
Узьлёт парываў, маладосьць,
і шал нязбытых мараў...

- Ты гэта пра мае вочы, Янучок?

- Ага, пра твае...

Так магло-б быць. Але ў Януковых руках, на бальконе віленскай Казьляковай хаты, ліст ад Дуні. Яна там далёка, у нейкай Бярозаўцы ля Докшыц, а ён тут, адзін, самотны. І да яго дзяўчына цяпер прамаўляе буйным, размашысты, крыху налева нахіленым почыркам:

«У мінулую нядзелю заяжджаўся да мяне франьцік Вайцяхоўскі. Прыпхнуўся на сваім неадлучным ровары. Ня люблю гэтай рыцыны-нахаба, ледзь адвязалася».

Такой весткай Янук не на жарты затрывожыўся. Радкі пра Вайцяхоўскага ў лісьце даволі скупыя. А што там запраўды сталася? На настаўніцкіх курсах называлі яго аблізанай авечкай таму, што часаў свае блёнд валосы так, быццам яго авечка цэлую ноч лізала. Паходзіў недзе із старой засьценкавай шляхты, заўсёды франьціўся, голасна рэклямаваў свой беларускі патрыятызм і заўсёды хваліўся вялікімі посьпехамі ў дзяўчат. Паважнейшыя дзяўчаты адганялі яго, як назойлівага авадня, але гэта ніяк шляхцюка не ўтаймоўвала. На кпіны хлопцаў, зусім не пакрыўдзіўшыся, адказваў:

- Якія вы, хлопцы, малакасосы! Дз дзяўчат трэба проста дабірацца. На тое-ж яны й дзяўчаты.

І звычайна Вайцяхоўскі адыходзіў ад «малакасосаў», паідыёцку распраменьваўся ягоны твар, калі засьценкавы Дон Жуан пачынаў загаварваць зубы наступнай сустрэчнай дзяўчыне.

Трывогай поўнілася Янукова сэрца. На колькі быў ён пэўны сваей Дуні? Вайцяхоўскі, бяз сумлеву, із сваім «неадлучным роварам» разьведаў ужо ўсё навакольле. І напэўна не паехаў да аднэй ці другой

звычайнай і неадукаванай вясковай дзяўчыны, ці, як ён называў, паненкі, а насамперш аб'езьдзіў усіх настаўніц у ваколіцы.

Прыгадваў Янук як засьценкавы шляхціц да жаночага полу падыходзіў: стаіць Аблізаная Авечка амаль упрытык да дзяўчыны, упорыста зазірае ў ейныя вочы, празь ледзь адкрыты рот цэдзіць перабольшаныя лісьлівыя камплімэнты. Дзяўчынін твар пакрываецца чырваньню, а заварожаная галава ня ведае ці гэты нахабнік усур'ёз языком меле, ці адно для пацехі забаўляецца. І вось у такі момант Аблізаная Авечка, бязь ніякага папярэджаньня, цапне дзеўку за грудзі. Часта тады чуваць ёмкі плясь. Але дзяцюк, анічуць не зьбянтэжыўшыся, без малейшага сораму прадаўжае далей расхвальваць дзяўчыну.

Прыгадалася Януку казка пра лісіцу й варону з сырам у дзюбе. Ці Дуня можа даць такому чалавеку належны адпор ды ня станецца казачнай варонай? Ня дай, Божа! Янук пачаў дрыжэць, прачытаўшы далей:

«І што за чалавек! Ты на яго с..., а ён кажа, што дождж ідзець. Ты яму па мордзе, а ён, бязь ніякага сораму, падзякуе й далей да цябе дабіраецца. Хацелася-б калі, Янучок, закінуць яму на галаву спадніцу ды накамшыць, накамшыць...»

Так, Дуня магла-б такое зрабіць. Бяда, што Аблізанай Авечцы вельмі паспрыяла-б закінутая на галаву спадніца... «Чорт лазаты, - думаў Янук, - ён тамака да маей мілай дабіраецца, а я тутака сам сяджу. Што рабіць?» Зайздрасьць і злосьць. Злосьць на свой, можа ня зусім прадуманы, крок, аграмадня злосьць на Аблізаную Авечку. І чаму пакінуў Дуню? А што будзе, калі Авечка дабярэцца? Бываюць-жа ў дзяўчат часіны слабасьці...

Нечакана думкі зьвіхнуліся ў зусім іншы бок. Пазаўчора ягоны сябра Лявон Загорны, немалы гуляка, што апынуўся ў шостай клясе гімназіі, адважыўся пайсьці ў ведамы дом на вуліцы Субач. Намаўляў і Бахмача, але хлапец адмовіўся. Адзіны сын багатага гаспадара, Лявон меў на гэта грошы. Дадому вярнуўся распраменены, зьзяў задавальненьнем.

- Ну і як, разгавеўся? - падняў Янук з-над кніжкі галаву.

Загорны зірнуў на Янука зь нейкай, здавалася, недасягальнай адлегласьці, адтуль, дзе Бахмачу ніколі не давялося яшчэ бываць.

- Золатца, а ні баба! Трохі старэйшая за мяне, але якая пекная і фігурная! А як яна ўмеіць, - каб яе халера! - як паддасьць, як падкініць, ай-яй-яй!

Янук адно нарыхтаваўся сквапна лавіць кажнае слова пра тое, чаго сам ніколі ня зьведаў, як Лявон спыніўся, дзесьці ў уяўленьні бачачы тое «золатца».

- Ну і?

- І шэпчыць мне, знаіш, - я так цешуся, бо так даўно Паляка ўжо ня мела...

- Як гэта Паляка? Дык хто-ж туды прыходзіць?

- Найболі Немцы.

Янук задумаўся.

- Дык калі тамака Немцы, то як цябе пусьцілі?

Лявон распрамяніўся шырокай, задаволенай усьмешкай. Глядзі, маўляў, які зь мяне хітрун.

- Дудкі, браце! Папершае я там ніводнага Немца ня відзіў. Байзальмама хацела мяне за дзьверы, дык я ей паперку ў руку, некалькі марак значыцца... Грошы-ж ні сьмярдзяць, знаеш. Дык яна мне ня толькі дзьверы шырака адчыніла, але й гэту самую лепшую бабу...

Лявон змоўк, зноў, відаць, заварожаны згадкамі пра салодыч побыту ў доме на Субач.

- Казаў-жа табе, - хадзі разам. От і паспрабаваў-бы...

Янук зачырванеўся, маўчаў. Гэта здарылася пазаўчора, а цяпер ягоны сябра Лявон дзесьці з Рандуўнай у Вэрках. Хто ведае, можа зноў у вабдымках.

Бальшыня вучняў віленскай Беларускай гімназіі выводзілася зь мясцовага польскага насельніцтва. Беларускую мову адно ўжывалі на лекцыях, калечылі яе на ўсе лады. У школы зь лятувіскай мовай навучаньня ня йшлі, пабеларуску ім лягчэй было. Гэтта-ж усё-ж пятае перазь дзесятае нешта зразумееш. Янук адносіўся да іх холадна, гаварыў выключна й дэманстрацыйна навет пабеларуску, каб іншыя вучні зь сялянаў, якіх было можа з чвэрць усяго ліку, чулі й насьледвалі яго.

Выключэньнем мо была цёмнавалосая, грацыёзная ў рухах, прыгожая Рандуўна Яніна. Заўсёды вельмі акуратная, з смакам апранутая, прыгожа прычэсаная, яна адразу зьвярнула Янукову ўвагу. Мяркаваў, што ў такую мог-бы надта лёгка закахацца, бачыў, што

іншыя хлопцы дарылі яе асаблівай увагай. І ці раз падчас лекцыі, - сядзела ў трэцім радзе зьлева ад яго, у тым-жа шэрагу, - забыўшыся пра выкладчыка, сквапна пазіраў на яе сілуэт, роўны носік, кругленькую шчочку, поўныя вусны, ледзь завойстраны падбародак, буйныя мяккія валосы й добра аформленыя, поўныя грудзі. Падпёршы левай рукой шчаку, Яніна, здаецца, уважна слухае, жыве тэмай творчасьці Казіміра Сваяка. Але, быццам рэагуючы на Янукову ўвагу, яна лёгка паварочвае свой прыгожы падоўжаны тварык у Янукоў бок. На ім спакусьлівая ўсьмешка.

- Ага, злавіла я цябе, такога зуха! - гавораць яе вочы. У карых, вымоўных, крыху прыплюснутых, пад дугамі доўгіх расьніц, вачох гнезьдзяцца нейкія, выклікаючыя на паядынак, жыўчыкі.

Паядынак адбыўся зусім неспадзявана. З прычыны, што дзяўчына была даволі, як студэнты гаварылі, папулярнай, ды з прычыны для Янука куды важнейшай, - што пабеларуску слаба гаварыла, а пасьля лекцыяў карысталася выключна польскай мовай, - Янук любаваўся ёй адно здалёку й намагаўся ігнараваць, хоць і нялёгка было.

Аднойчы, пасьля скончаных заняткаў, Янук замарудзіў у клясе.Выбег на калідор, каб дагнаць Лявона, зь якім мелі зайсьці падарозе дахаты ў рэстаран, дзе часта, пахлёбаўшы нейкае таннае стравы, запівалі яе мясцовым горкім півам. Янук прысьпешыў крок і тут-жа на павароце, не спасьцярогшы, стукнуўся носам у нос зь дзяўчынай.

- Ох, які ты неасьцярожны! - крыўдным голасам усклікнула Яніна. Яна стаяла задыханая, румяная, прыгожая. Таксама, відаць, бегла.

- Прабач, я ненаўмысна, - зачырванеўся Янук. У напаўзмрочным калідоры, - вайной не хапала электрычных лямпачак, - ён разглядаў зусім зблізку, проста ўпрытык стоячы, дзяўчыну, якой так даўно любаваўся з адлегласьці. Румяны тварык, ледзь прыадчыненыя ружовыя вусны, сіняя, з воўны вязаная, шапачка на галаве, шэры, добрай якасьці цёплы свэтар, а карыя вочы зь нейкім капрызам разглядалі юнака. Дзяўчына цёрла нос.

- Прабач. Я моцна стукнуў цябе? - нясьмела спытаў Янук. - Я ненанўмысна.

- Нічога, - сказала Яніна і ўсьміхнулася. - Я бегла ў клясу, нечага забылася.

Янук гаварыў пабеларуску, а Рандуўна папольску. Ён ужо меў пакінуць яе, калі тая раптам спытала:

- Скажы ты мне, хлопча, чаго ты так часта свае вялікія сінія вочы ўтаропіш у мяне так, што, здаецца, гэтымі вачмі хацеў-бы мяне зьесьці?

Паблажлівы тон, капрызна скрыўленыя вусны. Янук уськіпеў.

- А што-ж, на цябе паглядзець нельга, цаца такая?! Усе хлопцы на дзяўчат глядзяць, - адказаў шорстка.

Цяпер адно ўсьведаміў, што ад дзяўчыны нясло лёганькім, ледзь прыметным запахам пэрфумаў. Ейная блізасьць, - яна не зрабіла найменшага намаганьня, каб хоць на крок адыйсьціся, - бянтэжыла хлопца. Быццам сьведамая свайго чару на Янука, карымі, - здаецца, ці ня зьдзекваліся яны? - вачмі пільна й цікава ўглядалася ў Бахмача. Гэтак, здавалася хлопцу, магла зводзіць мужчыну ці адна какетка, сьведамая сваей прыгажосьці, пра якіх чытаў у ваповесьцях.

- Паглядзець і што? Ацаніць? - спытала.

- Можа, - адказаў Янук. Ён адыйшоўся на крок назад, але Яніна, як на дзіва, зноў прыблізілася да яго.

- Ну і якую цану даў ты мне?

Гэтага юнак зусім не чакаў. Ён бянтэжыўся. Дзяўчыніна блізкасьць кружыла галаву, не дазваляла ясна думаць.

- Ты... прыгожая, - адказаў.

- Ага, бачыш, - усьміхнулася Яніна, - усё-ж ты шчыры хлопец. Значыцца, я прыгожая, кажаш...

Яна грацыйна павярнулася, прыперлася плячмі да сьцяны й задаволеная, пазірала на юнака.

- А калі я прыгожая, калі табе падабаюся, дык чаму ты мяне ігнаруеш, заўсёды так холадна да мяне адносішся? Я-ж цэлы час бачу, што вачмі мяне зьеў-бы...

Янукова сэрца прыскорыла тэмпа. Яна стаяла ўпрытык, сваім сьпеўным альтам гаварыла пра тое, на што яму нязручна было адказваць. Нарадзілася думка, што вось тут, у пустым калідоры, прыгарнуць-бы яе моцна ды паспрабаваць солад ейных вуснаў. Што-б яна зрабіла? Ці прыльгнула-б да яго, ці адштурхнула? Ясна, - гэта Янук усьведаміў ужо куды раней, - гарадзкія дзяўчаты былі сьмялейшыя, не такія сьціплыя, як вясковыя, каля якіх дагэтуль аціраўся. А гэта вось цнотка можа яшчэ іншых апярэдзіла.

- Многа хлопцаў на цябе паглядае, за табой бегае, - адказаў.

Дзяўчына ўсьмінулася спакусьлівай, задаволенай усьмешкай.

- Так табе здаецца? А ты?

- Я не магу. Ня зводзь.

Але Яніна не здавалася.

- Не магу, ці не хачу? Як то так? Чаму?

Янук спасьцярог, што ўпікнуў дзявочы эгаізм. Калі Яніне ўсе хлопцы даніну складалі, калі ёй здавалася, што магла адно галавой кіўнуць, пальцам паварушыць і кажны за ёй пабяжыць, дык як-жа так, што вось нейкі новы «мужык», прыгожы паглядам. што паводзінамі дэманстраваў сваю беларускую годнасьць, мог яе ігнараваць? Недзе ўнутры тачыў яе чарвячок уквеленай самалюбнасьці. Іншых магла адштурхоўваць з высока паднятай, сьведамай сваей прыгажосьці, гордай галавой, а гэты вось, хоць і вачмі яе зьядаў, як казала, трымаўся воддаль.

- Бо ты..., - зацяўся Янук.

- Бо я што?

- Ты... Полька, - ужо сьмела адказаў Янук.

Яму здалося, што дзяўчыне забрала мову. Як-бы хто яе пчаліным джалам джгнуў, яна страпянулася, адскочыла ад Янука на крок, а ў карых вачох зьявілася пакрыўджаная няўцямнасьць. Такое, мусіць, ды ў такой сытуацыі чула ўпяршыню.

- Ты што... Я знаю, я бачу, што дэманструеш сваю беларускасьць. Але..., але які-ж ты хам!

На гэтым паядынак і скончыўся. Рандуўна рыўком, ужо не азіраючыся, кінулася ў клясу, а Янук, зірнуўшы на ейны зграбненькі зад ды нібы майстрам адточаныя ножкі ў цёплых рудых боціках, быццам цяпер усьведаміўшы якую крыўду мог ёй зрабіць, пастаяў нерашуча колькі часінаў ды, прыгадаўшы Лявона, хутка выйшаў.

Ад гэнага часу Яніна Рандуўна, здавалася Януку, куды пахаладнела ў вадносінах да яго. Ды ўсё-ж не магла юнака камплетна ігнараваць. Гэтак, ці раз на лекцыі лавіла на сабе Янукоў позірк. А раз зусім сьмела падыйшла да яго й пачала спрачацца пра беларускасьць. Вельмі была зьдзіўленая, слухаючы Януковы довады, што Вільня й яе ваколіцы былі й ёсьць беларускімі, што хаця ў самым горадзе ёсжьць шмат наплыўшага. - Янук падкрэсьліў гэтае слова, - элемэнту, як Палякаў, дык ваколіцы Вільні ў бальшыні Беларусамі заселеныя.

Неяк у панядзелак, выходзячы са школы, наўмысна затрымалася ля Янука й сказала, як быццам іхная дыскусія пра Беларусаў і Палякаў вось адно скончылася:

- А ты знаеш, Беларус, я ўчора за Вільняй у вёсцы была. Ты казаў, што па вёсках Беларусы жывуць. Гэта няпраўда. Усе там Палякі й гавораць папольску. Толькі як на быдла крычаць, дык тады кажуць: - Ку-у-у-у-уды ты пайшла, каб ты згарэла!

Яна зарагатала. Януку здалося, што хацела ўпікнуць яго.

- Дык ці-ж ты ня бачыш, дурачка ты, якая беларуская мова прыгожая, калі яе навет карова й іншае быдла разумее? А ці ты чула, як у тэй вёсцы людзі між сабой гавораць?

Дзяўчына зачырванелася, хмыкнула й пабегла. Пэўне-ж, не бяз прычыны, неўзабаве адкрыла Януковага сябру Загорнага. Той-жа, як заўсёды, падкі да дзяўчат, пачаў выхваляцца перад Януком. І аднойчы, падчас такога выхваленьня, кажа:

- Не магу толькі зразумець, чаму яна цэлы час пра цябе распытваецца, як-бы ты невядома якой цацай быў.

- Можа таму, што я ёй нос падцёр? - сказаў Янук уважна выслухаўшы сябру.

- Як то падцёр? У вас што было?

- Ні знаю, ці што, ці нічога? Яна страшна ўвагу любіць, вялікай прыгажунькай-цацанькай сябе лічыць.

- Яна вельмі прыгожая, - адказаў Лявон, разважаючы як-бы пасмакаваць тае красы.

- Ніхай сабе. Ты знаеш, раз мяне ў калідоры прыперла й кажа, чаму я на яе заўсёды пазіраю ў клясе, а так надта холадна й здалёк трымаюся, ігнарую яе, хоць і відаць, што гэта ўсё з намаганьнямі. Проста ледзь не сказала што чаму я, як іншыя хлапцы, ня бегаю за ёй. Яна прывыкла каб за ёю бегалі.

- Ну а ты што?

- А я проста з мосту кажу: не магу й ня буду. Чаму? - пытаецца. Таму, кажу, што ты Полька. Каб ты бачыў, як яна ўзгарэлася, пакрыўдзілася і ўцякла. І з тэй пары цябе падлабуньвае.

- Дудкі, браце, - кпіў Лявон. - І што за розьніца, Полька ці Беларуска? Закасай аднэй ці другой спадніцу дык пабачыш, што розьніцы ніякай няма.

- Цьфу на цябе! - узлаваўся Янук. - Табе толька, мусіць, спадніца ў галаве. Як табе ня грэх, у бардак паплёўся! І натрапіў на цацу. А тая: «каханенькі мой, я так задаволеная, бо так даўно Паляка ня мела». Ну а ты-ж ужо там, відаць, самым запраўдным пшэкам прытварыўся! Як табе ня сорам! І каб было за што? Ты, я бачу, лёгка сваю нацыянальнасьць за спадніцу прадаў-бы.

- Слухай, ідзі ў манахі, як хочаш. І пэўне-ж, я малады, дык мяне спадніцы й цікавяць. І пры чым тут нацыянальнасьць? Я трымаюся таго, што Скараход сказаў: усіх дзевак не перабярэш, але старацца трэба. Га-га-га!

- От-жа знайшоўся Дон Жуан. Маці недзе дома трывожыцца, як там мой бедненькі сынок у Вільні, ці даволі яму есьці, ці чаго яму не бракуе, напэўна Бога просіць у царкве, каб памог. А сын што выробляе? Знаеш, Лявон...

- Слухай, кажу табе, што дудкі, ды ўсё. У цябе гэта, мусіць, зайздрасьць гаворыць, калі я ў дзяўчат посьпехі маю...

- Давай, ведаеш што, лепш перастанем. Знайшоў чым хваліцца. Скажаш яшчэ, што табе дзеўкі праходу ні даюць.

- А можа й ні даюць...

Седзячы й разважаючы, Янук прыгадаў, што гутарка такім чынам зайшла ў тупік. І як-бы не рацыяналізаваў свае паступкі, як-бы не апраўдываў іх, а факт быў фактам, што ягоны сябра Лявон недзе пэўне трымае цяпер у вабдымках прыгожую Яніну Рандуўну, насалоджваецца ейнымі вусенкамі, а вялікі цнотка Янук Бахмач сам на бальконе, чытае ад дзяўчыны ліст і трывожыцца, каб да яе не дабраўся Аблізаная Авечка. Для Дуні захоўвае сваю чысьціню, баіцца саграшыць, з прычыны нацыянальнасьці адкінуў Яніну. «Іж, які ты, браце, гэрой! - пачаў Янук у думках прамаўляць да сябе самога. - Глянь, вунь усе маладыя гуляюць, насалоджваюцца жыцьцём. Хто зь іх цяперака, вайной, глядзіць на якую мараль ці баіцца якога граху? Яны выкарыстоўваюць час, бо, ведаеш, вайна. А гады-ж лятуць. Ну добра, добра! Можа ты й задаволены сваей чысьцінёй, бо ты-ж разам зь Лявонам у бардак не хадзіў. Але падумай, хлопча, - я табе раю: запраўды добра падумай, - што, калі твая цацанька-васілёчак Дуня ў вабдымках Вайцяхоўскага? Га? Што, калі яна яму аддасца? Ты-ж яе пакінуў, а яна-ж - дзяўчына крыві гарачай, ведаеш зь якой сям'і. І што, калі Вайцяхоўскі задумае яе сілай узяць?»

Гэткая апошняя праўдападобнасьць поўніла хлопца жахам. Дуня ня пісала, ці яна сама настаўнічае, ці зь кім іншым. А можа ў тайніцы трымае? Ну й калі, прыкладна, Аблізаная Авечка сілай захоча яе ўзяць, то тады што? Можа? Але. Зусім лёгка. Дзе-ж Дуня ад яго абароніцца? Праўда, некалі ад Лявона Шпунта ў лесе абаранілася, ну але той проста напаў на яе. А гэты прыкінецца хітранькім і лісьлівым, як лісіца, подступам спрабуе. Тады як?

Як не намагаўся ўспакоіць сябе Янук, у галаву паўзьлі самыя найбрыдчэйшыя думкі. Пачаў уяўляць савю даражэнькую Дуню, свой мілы васілёк у вабдымках Аблізанай Авечкі. Як на загад, малаточкі прысьпяшылі тэмпа ў скронях, млявасьць распаўзлася па целе, бездапаможна сьціснуліся кулакі. Можа лепш плюнуць на гэту ўсю гімназію, сесьці на цягнік і назад, да Дуні... Што мне з тае навукі, калі магу яе нейкай брыдзе страціць? Я во тутака пільнуюся, дзевак ад сябе навет з думак адганяю, а яна там, хто ведае...

Іншы голас падказаў,што ня рушыць яму зь месца, бо пасьля не дараваў-бы сабе за такі паступак. А што сказаў-бы аграном Падгайскі, ці Антось Дзяркач, ці навет бацька й брат? Ён-жа ўсім абяцаў, што вытрывае й вытрымае. Дык як-жа трусом паказацца? Ці хто зь іх ведаў пра ягоныя пачуцьці да Дуні Макатунішкі? Дудкі, як казаў той Лявон Загорны...

Ужо зусім на зьмярканьні той прыклыпаў дахаты. Зірнуўшы на сябраў твар распраменены й задаволены, Янук добра ўцяміў, што магло стацца. І баяўся. Зараз адчыніцца Дон Жуанаў рот і пачне ён расказваць пра тое, што было й чаго ня было. Знаючы Лявонаву шырокую фантазію, нахіл да перабольшаньня дый вузкаваты запас словаў, Янук мог і за Лявона расаказаць-бы. Ён хацеў выйсьці на вуліцу, але ўночы хадзіць цывільным было забаронена.

- Ну й што, пагуляў? - спытаў Лявона й адразу прыкусіў язык.

- Эх, брацец, каб ты ведаў, што за дзяўчына!

- Ну ладна, ашчадзі мяне. Уяўляю.

26

Добра спалася пад цёплай пярынай. Ніна некалі ў пасаг Паўлюку Бураку яе прынесла. Антось мяркаваў, што стары скнэра, пэўне-ж, многа з жонкай пад пярынай не ахарошваўся, бо яму не да любошчаў было, маладую жанчыну цяглавай сілай лічыў. Ніна пра Бурака неахвотна згадвала, але то там то гэтта ў гутарцы слоўца прыкінецца, сказ выскачыць, быццам вясной вада спад лёду праб'ецца. Памалу зьбіраючы факты й падсумоўваючы пачутае, Антось вобраз жыцьцё Ніны з Бураком стварыў. Выглядала, што жыцьцё із старым скнэрам было абсалютна нязноснае, пра нейкае каханьне ўжо не гаворачы.

Кагадзе Антось зь Нінай шлюб узяў. Збоку, роўна дыхаючы, спала жонка. Солад сну пасьля буйнага вычарпаньня. Ведаў ў сваім жыцьці Антось ці адну жанчыну. Галярэя характараў, нораваў, фізычных прывабнасьцёў. дзевак навокал хапала. Чужнікі пазабіралі дзяцюкоў у войска, а бедныя дзяўчаты гарэлі й тлелі нязбытымі марамі. У гушчы дзявочага лесу, які Антось пазнаў, на першым месцы паставіў-бы Ніну. Ці ня страчанае надрабіцць намагалася... У пасьцелі гэта была зусім ня тая жанчына, якую ведаю ўдзень. Аддавалася поўнасьцю, бязь ніякае рэзэрвы. Гэта надзвычайна прыгожая, сьціплая, чароўная жанчына ўночы замянялася ў нешта іншае, непамяркоўнае, дзе забывацца трэба было пра ўсялякія межы й рацыянальнасьць. Як мага старалася дагадзіць Антосю, камбінавала час спалучэньня плоці так, каб асягнуць максімум эротычнае экстазы.

- Ніначка, дарагая, ты ці ні занадта! - шаптаў Антось між цалункаў.

- Антоська, саколік мой, любіш мяне?

Голас пяшчотны, задыханы.

- Чаму-ж не... Можа й люблю...

Нініны зубы ўпіліся ў шыю. Гуляючы, кусаюць.

- Гэй, ты ня кусайся!

У цемры гучны плясь. Растрывожаны, з адценьнем прагі, Нінін голас:

- Ну ня біся ты, мой саколік. Як гэта ты ня хочаш прызнацца, што любіш мяне? Прызнаваўся, ато ўкушу!

- Ня люблю.

- Што-о-о? Я-ж цябе! За такі абман буду караць аж да раніцы. Ты ведаеш як?

- Ну як?

- Замянюся ў тую грэцкую ці якую там багіню, - ты чуў пра яе? - якая із сваіх любоўнікаў жывыя сокі выцягвала. Так і зь цябе я ўсё выцягну.

- Ай-я-я, ай-я-я! Ніначка, навошта гэта? У нас-жа цэлае жыцьцё наперадзе. Я-ж ужо з табой кажную ноч, бо таго басяка на Гараватцы ня пільную. Знаіш...

- Усёроўна, Антоська, усёроўна. Я цябе люблю сягоньня, буду любіць і заўтра. Але-ж сягоньня - гэта цяперака, гэта ўжо ёсьціка, а заўтра - хто ведаіць... Кумекаеш?

- Кумекаю. Любі мяне.

- А ты мяне?

- І я цябе...

Салодкія ночы, каб ім канца ня было. Яна ўмела поўнасьцю авалодаць табою. Ты чуеш, што п'е твае сокі самыя жывучыя - жыцьця нэктар. Абшукае цябе, знойдзе дрымотнае і, здавалася-б, неактыўнае, ды змабілізуе і заангажуе. А пад дотыкам рук тваіх пружыніцца ейнае, як у тыгрыцы, цела й пульсуе ў ім кожная клетка. Перазь берагі поўніцца, плешча, выліваецца кіпень. І здаецца, што нічога не траціцца. Кажны спакусны ўсплёск знаходзіць водклік. Поўная й плённая гармонія. Бушуе спозьненая, у свой час дасьпелая й ледзь не перасьпелая, да гэтага часу нікім на паядынак ня выкліканая маладосьць. Рагнеда наадварот. Тая, каторую не паланілі й не насілавалі, а каторая цярпліва, утаймоўваючы наплыў энэргіі, чакала абяцанага дня. Прыліў, што на спакойным беразе водклік, спачуваньне й поўніцу знайшоў. Апагэй зьліцьця. І яшчэ неўтаймаваная, галодная й ненасытная прагавітасьць, сквапнасьць кажнае неспатоленае клеткі цела, што імкнецца да суцэльнасьці даўно жаданага сымбіёзу. І часта трывала так аж да раньніх, на зарніцах, салаўёў, што звонам галасоў у кустарніках весьцілі новы дзень. Ап'янелы хмель. А пасьля млоснае вычарпаньне, нявыразнасьць абрысаў істотнага з уяўленым. І збоку, пад пярынай, спакойнае рытмічнае дыханьне. У паўзмроку рыса прывабнага мілага твару, хваля пышных, мяккіх валасоў на шыбіне вакна перад золакам. Напоўненая чарка, да адказу выпітая. Фізычны спакой, падзяка заплодненае краскі. Пчолка, нэктарам абцяжаная.

Гэта былі ночы, пра якія Антось, чалавек наскрозь практычны і, як пра яго казалі, вельмі зубасты, ня мог раўнадушна думаць. Яны, гэныя ночы, нанізаныя на пацеркі памяці, маячылі дзесь у буйных

хвалях вялікага, паглынутага каханьнем прыліву. Іх нельга было згадваць бяз дрыготнай млоснасьці ў сэрцы. І няспынна йшлі наступныя. Такія самыя, зь вялікім абяцаным спаўненьнем, поўнае камплетнасьці. Два арганізмаы як мага каардынаваліся, адзін дапаўняў другі, адзін угадваў іншы, бег яму насустрач. Час апазнаньня, абмацваньня, разьведкі, абнюхваньня мінуў. На дарозе стаялі вехі. І па іх, ужо поўнасьцю сьведама йшлося далей. І адчуваў Антось, што «тыгрыца» ягоная ўзводзіла яго на нейкія й нязьведаныя яшчэ вышыні, бо, выглядала, далекавата было ей яшчэ да спатоленьня сваей прагнасьці. І прыходзілі ў Антосеву галаву дваякія думкі. Першая: сьцьверджаньне вялікага шчасьця. І задавальненьне з таго, што сталася ўсё амаль прыпадкова. Хто ведае, як павяло-б, у які бок пайшло-б жыцьцё, калі-б не ваенныя падзеі. Ніне Бурачысе прыглядаўся ён і раней, навет сьвістаў на яе, сустракаючы. Але ня будзь тэй Гальготы, трывала-б у цярпеньні й марнавалася-б Ніна пры старым скнэры, што гледзячы на ейныя рукі, думаў пра серп, а спасьцярогшы ейны стан, думаў пра мяхі бульбы на яе плячох.

І другая думка: сядзеў ён, Антось, колькі на Гараватцы, таго злодзея падпільноўваючы, або валачыўся па нача, разьнюхваючы як да Бронхэра падпаўсьці. А ў гэты час ягоная дарагая Ніна сама ў пасьцелі. Нарэшце выкапаў нару, забясьпечыўся. Цяпер ён кажную ноч зь ёю. Ніна сталася для яго найлепшай, найбольше шчодрай узнагародаю. На яе грудзях забываўся пра вайну, пра мінулыя й цяперашнія нягоды, успыхаў поўным і плённым гарэньнем. І дальбог, часамі здавалася навет чалавеку, што гэта ўсё крышку занадта добра, навет мо нейкі трык лёсу, штосьці нярэальнае. Але хапіла адно прыгарнуцца да яе й зьнікалі найменшыя сумлевы. Так. Гэта ўсё праўдзівае. І яно адбываецца ня ў нейкіх апавяданьнях ці раманах, яно вось тут і яно цяпер. Адно часамі дакараў сябе Антось, што спакуса, выклікаючая яго кажную ноч на паядынак,замінала думаць пра тое галоўнае, што абавязкова мае прыйсьці.

Ведаючы Лявона Шпунта, Антось зусім ня сумляваўся, што стары ліс і валацуга недзе плянуе па начах, камбінуе як да яго, Антося, падпаўзьці. І шкада, што ні солтыс Паўлоўскі, ні хто іншы не злавіў яго ў бацькоў. Былі-ж ночы, калі радасна сустракаў некага Шпунтоў сабака. Каго-ж, апроч Лявона? І чакаў Антось нямінучае сустрэчы, тае, што была наканавана. І разважаў пра пазыцыі Лявонаву й сваю.

Ініцыятыва належала да Шпунта. І выбар часу, і сіла ўдзельнікаў, - усё было ў Шпунтовых руках. Адно было ведама, - месца паядынку. І цяпер, пасьля чароднага вычарпаньня, - было ўжо позна, дзесьці паьля поўначы, - прыгадаў Антось, змагаючыся з дрымотай, пра сваю зброю. Апусьціў руку й гэтта-ж ля ложка на падлозе намацаў кужэльную торбу. А ў ёй быў нож і наган. Нож, - кавалак адточанага мёртвага зялеза. Без Антося ён няпрыдатны. Адно як схопіць яго Антосева рука ды кіне спрактыкаваным рухам, тады нож становіцца сьмерцяноснай зброяй. Даўно нож бачыў кроў. Ці давядзецца яму ўпіцца ў Лявонаву мякаць? Гэтым разам не паўторыцца тое, што лясьнічоўцы. Забавы мінулі.

Дзіву даешся, што за недарэчная вайна, - думаў Антось. Гэткай ня толькі раней ня было, але чалавек такой навет уявіць ня мог. «Галоўная каманда Вэрмахту паведамляе» - пачыналася ваенная хроніка ў друку. Дзесьці на фроньце дужаліся дзьве магутныя сілы. Як там ня было-б жаўнеру, ён выконываў загад, спанатрыў дзе хаваецца праціўнік ды страляў. Проста - ты яго або ён цябе. А тут, ззаду? Ворага ня бачыш, адно пра яго мяркуеш. Пакуль агледзішся, ён да цябе, як злодзей, падпаўзе, накінецца. Нялёгка. Адны бандыты гаспадараць у лясох, іншыя ў гарадох. Абое рабое. Іхная над табой улада, адных ноччу, другіх днём. От і будзь мудрым, бараніся безабаронны. Гэта не вайна, а нейкая сячкарня, ненажэрная пачвара. Узяць хаця-б тую Залатуху. За што спалілі вёску й людзей? Чым тыя ціхія й працавітыя сяляне, што любілі прыроду й Бога, саграшылі перад аднымі ці другімі? Няўжо-ж Залатуха гэта прыклад таго, што наканавана ў будучыні, што ніяк не абміне краіны й людзей? Жах. Азьвярэў чалавек, розуму пазбыўся, страціў усялякую меру й прапорцыю.

Вайна, пэўне-ж, да гэтага часу свае законы мела. На гэтай, ці не праклятай Богам, зямлі меч і полымя ўядаліся ў людзей і іхны набытак ад няпамятных часоў. Няма чаго маралізаваць. Сіла панавала. Спытайся вунь хаця-б дзеда Якуба. Нялёгка было прыгоннаму, цёмнаму, зганьбаванаму народу брацца за косы, вілы ды нешматлікія стрэльбы супраць суцэльнае маскоўскае навалы, што затапіла бацькаўшчыну. Але й тады людзі, відаць, ведалі дзе вораг і як мага рыхтаваліся да нямінучых бітваў. Было відаць каго біць. І галоўнае: мелі свайго правадыра, каторы плянаваў, арганізаваў, каардынаваў сілы. Былі апаразы й перамогі. Ведаліся ворагаў і прыяцеляў, сваіх і

чужых. Калі йшлі мужыкі ў бой, дык ішлі дружна, плячо ў плячо, сьцяною, ня тое, што цяпер.

Узяць хаця-бы й гэну пазьнейшую, як тады здавалася, апошнюю бойню. Як і цяпер, Немцы схапіліся з Маскалямі. Дашчэнту нішчыліся ў ваеннай паласе вёскі, а людзі ўцекачамі, далёка ад дому, голадам і іншай трасцай марыліся. Такі ўжо закон вайны. Адылі войска не нападала, як цяпер, на безабаронных жыхароў, не паліла без разбору людзей, ня зьнішчала да рэшты цяжка нажытага дабра. Нясусьвеціца, што й гаварыць. Полымя шырылася й пагражала суцэльным зьнішчэньнем. Масква, што бясьперапынна барабаніла пра «вялікую айчынную», мела мабілізаваць усё мірнае насельніцтва. Ды ў вачох ненасытнага хіжака не магло быць нічога «мірнага», а насамперш людзей. Для ўсіх плянаваўся адзін кацёл зялеза й масы, пад ведамым сьцягам і пад загадамі падрыхтаваных спэцаў.

Заходні напасьнік даў гэтай вайне зусім дагэтуль нячутую ў гісторыі функцыю: ачысьціць «лебэнсраўм» для будучага пасяленьня Немцаў. Антось Дзяркач парознаму выглядаў у вачох хіжакоў, што за ягонную зямлю змагаліся. У вачох адных - маленькая пешка, чалавек без аблічча, адзін зь міліёнаў, што тварылі масу, якую трэба падпрэгчы ў калясьніцу «вялікай айчыннай». У вачох тых з захаду - ён ёсьць лебяда, якую трэба выкараніць, пакінуўшы адно даволі на абслугу, каб на паноў новых дабра ўсялякага прыдбалі. А паны гэны пасьля вялікай перамогі над Маскалямі, засядуць тут на панаваньне вечнае. Тое, што на гэтай гаротнай зямлі ад веку жылі й трывалі яго, Антосевы, продкі ня мела ніякае вагі ні для аднаго ні для другога хіжака. Карэньне падразалі й раней, але міліёны Антосяў зноў атожалкамі прырасталі, буйнелі, трывалі. Ды ці вытрымаюць, ці перажывуць гэту апошнюю пошасьць? Як прыжывеш у пустыні? І ці пакінуць якія атожалкі, каб зноў укараніцца?

Людзі людзьмі. Напалоханыя, зьбянтэжаныя цені па кутах. Спадзяваліся, што іх не зачэпяць, што ўдасца неяк наводля таго «ніхай хоць чорт пануіць, абы жыць можна было». І як можна так думаць, калі ўсё было ясна, адно трэба было ўмець бачыць?

Антось зноў абмацаў сваю зброю, быццам хацеў упэўніцца, што ня зусім-жа безабаронны, уздыхнуў, выпрастаўся ў пасьцелі, зірнуў на Ніну. Яе грудзі агаліліся, пярына спаўзла зь іх. Ды не яны цешыліся цяпер Антосевай увагай. Думкі нахлынулі хвалямі й часта не

знаходзілі канкрэтнага пункту апоры. Адчуваў, што нечага не дадумаў, нешта ці ня самае галоўнае асталося збоку. Была-ж у гэтай нярэальнасьці й зьбянтэжанасьці, недарэчнасьці свая нейкая простая праўда. Ня можа быць, каб хіжакі запрудзілі ўсе шчыліны, разбурылі ўсе грэблі і міліёнам безабаронных людзей адрэзалі шлях да ратунку. Пра які выбар была мова?

Адчуваў Антось, што ён прыблізіўся да разгадкі, да ўсьведамленьня нечага вялікага й простага, што дало-б магчымасьць, зарганізаваўшыся, сьціснуць кулак і прыняць бой. Вось дзе сэнс - бой! Гэтта й будзе выхад. Антось затрывожыўся. Пра бой думаў-жа і раней. Дык што тут новага? А мусіць тое, што заўсёды плянаваў на аднаго сябе. Больш таго, ужо сёе-тое рабіў: сядзеў у Гараватцы, каб прыпільнаваць таго бандзюгу, выкапаў пад хатай сховішча, каб у выпадку патрэбы мець задні ход. Ну й што? Скажам, калі-Шпунта ці яшчэ пару бандзюгаў удалося яму забіць, дык ці нагэтым канец? Прыйдуць іншыя, заб'юць, спаляць.

Балазе да канца прадумаць. Антось устаў, упоцемку памалу нацягнуў на ногі боты, накінуў паўшубак, асьцярожна скрыпнуў дзьвярмі. Золкі вецер сьвежасьцю хлынуў у твар. Ромак ляжаў ля парогу. Ён мігам устаў, тыцнуў Антосю ў руку сваю пысу. Антось гладзіў сабаку, прысеўшы на прызьбе.

- Ну памалу, ня трыся так.

Сабака быццам зразумеў, прылёг ля Антосевых ног. Холад уміг разьвеяў дрымоту, пасьвяжэла галава. Дзяркач ледзь разгледзіў грэбень дрэў у недалёкім балоце, зірнуў у бок Гацяў. Над станцыяй сьвятлела зарыва. Там, як заўсёды, жылі рухам і лязгатам чыгункі.

І раптам праясьнілася ў галаве. Гэта-ж ці раз гаварылі з Падгайскім пра патрэбу арганізаваньня сваіх сілаў. Немцы-ж дазволілі нейкую самаахову, хоць ня відаць, каб надта там што наперад рухалася. Пачаткі, відаць, цяжкія. Але варта больш разьведаць, спанукацць, каб найбольш свае зброю ў рукі бралі. Найважнейшае, каб камандзеры ня толькі добрыя й разумныя галовы мелі, але перадусім каб сваей справе наскрозь адданыя й ахвярныя былі. Абавязкова. Галоўнае-ж, каб разам. Лягчэй выстаяць будзе.

Яшчэ падумаўшы, Антось пагладзіў сабаку й пайшоў у хату.

- А дзе-ж ты, Антоська, па начах ходзіш?

Ніна сядзела на ложку.

- Ды нідзе надта. Во на двор выйшаў.
- Ня сьпіцца, ці што?
- Ня сьпіцца. Усякія пранцы ў галаву лезуць.
- Гэта пра што?
- Ды пра гэту навалач. Знаеш...

27

У кухні Падгайскага пад абажурам ярка гарэла электрычная лямпачка, а вокны былі суцэльна закрытыя цёмнымі занавескамі. За сьцяной дзесьці стукаў аканіцай вецер. За сталом сядзеў Антось. Ён узяў да паловы рудой вадкасьцю налітую аграномам шклянку.

- Выпі, Антось, адным глытком. Разагрэешся. Цябе, мусіць, добра вецер прабраў.

- Дзякую, - адказаў Падгайскаму Дзяркач. Выпіў, зморшчыўся. Шнапс прыемнай цяплынёй расплыўся па жываце.

- А ты ня вып'еш? - спытаўся Антось гаспадара.

- Ня буду. Калі ласка, закусвай, - падсунуў аграном Антосю накроенае на талерцы сала й прыемна пахнучыя кіслыя гуркі.

- Цябе ніхто па дарозе ня відзіў?

Антось зірнуў Падгайскаму ў вочы, падумаў улажыў у рот кавалак адрэзанага гурка.

- А хто-ж мог відзіць? Полем ішоў. Знаеш, што вечарам ці ноччу хадзіць німа як.

- Знаю.

- А чаму пытаешся?

- Таму, што лепі паціхоньку... Каб вораг ня ведаў. Але можа пра гэта пасьля скажу. Хваліся, што там у цябе.

- Нічога, усё пастараму.

Падгайскі ўважна зірнуў субяседніку ў вочы, устаў з-за стала, прайшоўся па кухні.

- Ты, Антось, гэтае самае, ня дуры галавы. Каб нічога ня было, ты-б сядзеў дома, бяз прычыны ня швэндаўся-б.

Антось усьміхнуўся.

- Старога ваўка, як кажуць, авечка ні правядзець. Знаеш, думаў я й думаў, а гэтыя думкі, каб іх пранцы, у сваім сагрэтым кутку пасядзець ні даюць. Я гэта ўсё пра тое, што трэба рабіць, каб злажыўшы рукі ні сядзець. Знаеш, што вытвараецца.

Антось гаварыў паволі, упэўнены, што аграном цярпліва выслухае яго, а пасьля сваё скажа. Як умеў, апісаў свае роздумы, аграмадную трывогу ня толькі за свой лёс. Падгайскі хадзіў па кухні, церабіў валосы.

- Ты ўжо скончыў? - спытаў аграном занадта рэзка.

- А што? - зырка зірнуў на яго, спасьцярогшы нецярплівасьць гаспадара, Антось.

- Ды тое, што ты, братка, мусіць, забыўся. Таўклі мы раней гэты мак у ступе. Дый ня толькі таўклі, але й згадзіліся, што няма чаго нашым па завугольлях хавацца, манны зь неба чакаць, а трэба за зброю брацца. Я табе ў паліцыю ісьці суліў, а ты адмовіўся. Сказаў мне, што ў чужую паліцыю ня пойдзеш. Воля твая. Рупіць табе ў сваё беларускае войска і ты, як віджу, вінаваціш нашых, каторыя дзе-небудзь там пры ўладзе, але ні стараюцца ў Немца дазволу, ці можа й дамагаюцца, але замала. Так ці не?

- Яно-ж так...

- Ты, Антось, ужо чуў, што нашы ў Менску ўжо даўно дамагаюцца й што нібыта ёсьць нейкія рэзультаты. Немцы дазволілі самаахову зарганізаваць, але ні так, як Беларусы хацелі. А нашы хацелі, каб паставіць на ногі тры добра ўзброеныя дывізіі, пад нашай камандай. А Немцы сказалі, што па акруговых гарадох можаце мець батальёны, а ў паветавых толькі роты. Дый то Немцы маюць імі камандаваць, а нашыя афіцэры й падафіцэры на іхных паслугах быць. Што-ж гэта за войска беларускае? Дрэнь, братка. А апранаць і карміць мае Беларуская Народная Самапомач, значыцца мы самі. Немцы зброю дадуць. Дык вось што сталася: у Мінску закончыўся курс перашкаленьня афіцэраў і падафіцэраў самааховы. Было паўтары сотні ўдзельнікаў, ад былых царскіх прапаршчыкаў пачынаючы да калішніх польскіх падхаронжых, а гадамі ад дваццаці пяці да шасьцідзесяці. Ну й што-ж? Кушаль Францішак вёў той курс і сам выкладаў. Яму, ведама-ж, памагалі іншыя перадавыя нашыя Беларусы. Але, атрымаўшы ўсе патрэбныя веды пра новую зброю й беларускі вайсковы рэгулямін, людзі разьехаліся па гарадох, пачалі арганізаваць самаахову. І ўжо

сабралі ахвотнікаў, пачалі муштраваць, школіць падафіцэраў, ды што-ж, братка, людзі ў лапцёх, ботаў няма, вопраткі ні хапаіць, ды Немцы навет зброі ні далі. Нікаторыя здабылі сабе старыя савецкія ламачыны... Гэта, братка, ня войска, хоць у нашых ахвота ёсьціка. Але прыгнечаныя. Баюся, калі не папаравіцца палажэньне, дык дамоў разьбягуцца. Вось табе й самаахова...

- Думаеш, што паправіцца?

- Трэба спадзявацца. Нікаторыя цьвердзяць, што Неміц памякчэў, ужо ні разяваіць з крыкам ляпы, як раней. Бальшавікі, відаць, яму ў азадак трошкі далі. А бандыты яму як пачнуць дапякаць, Немцу значыцца, дык зброю дасьць, ня дзе дзеніцца. Сам-жа на фронце і з бандытамі ня дасьць рады. Але калі тое што будзіць? Я ўсё казаў, - сам помніш, - што трэба нашым было адразу ў паліцыю пхацца. Цяпер мы былі-б у сваім доме гаспадарамі, а ні праклятыя Палякі.

- Ну а ці ёсьць самаахова ў Докшыцах ці ў Глыбокім?

- Такая во лапцёжная, як я табе казаў. Што зь яе... Вып'еш яшчэ?

- Давай.

Падгайскі наліў Антосю й сабе. Выпілі.

- Я то трывожуся, - працягваў аграном, - каб ня было для нас запозна ні таму, што заўтра ці пазаўтра бальшавікі гэтых у Бэрлін загоняць, а таму, каб нашых бальшавіцкія й польскія банды й гэтая басота з паліцыі ні перадушылі. Ты знаеш, што тутака ў Гацях гэта нечысьць рабіла. Але ці знаеш ты тое, што падобна адбываецца па ўсей Біларусі? Я чуў, што ў Міры паляч'ё, каторае гэта было на пасадах у дварох і маёнтках, дык цяперака абсадзіла нямецкую камандатуру. У даносах Немцу падалі сьпіскі нашых, каторых некалі судзілі, знаеш, - людзі-ж судзіліся й за зямлю й за што другое, - дык падалі Немцам сьпіскі, што судзілі за камунізм. Ну а Неміц, кумекаеш, пакуль там разабрацца, бабах і людзей німа! Вось так Палякі масу нашых найлепшых людзей нямецкімі рукамі вымардавалі. Пад арышт у Стоўбцах папаўся лейтэнант Чабатарэвіч, добры наш чалавек і надта цэнны, што вайсковы. Ён-жа пасьля не адны лапці стаптаў, дамагаючыся ў Немцаў, каб дазволілі самаахову нам арганізаваць. І Кушалю ён пасьля многа памог. Значыцца, апроч гэтага Віктара Чабатарэвіча, арыштаваны быў і Сабалеўскі, ранейшы пасол у польскі сойм. Многа іншых было пад арыштам, але гэтых нашым удалося выратаваць. А ці чуў ты, што польская банда напала на Жодзішкі, гэта

месца, што за Вялейкай? Выбілі ня толькі Немцаў, але й цэлы беларускі актыў. А напад падрыхтавалі Палякі, каторыя служылі ў біларускай паліцыі. Яны навет паказалі бандытам дзе ў якіх хатах жывуць нашыя актыўныя людзі. Мы тамака многа цэнных людзей страцілі. Вось, братка, як паляч'ё робіць. Арганізацыя ў іх, разьведка, акцыя!

- Калі тое было?

- Улетку. Ды чакай, раскажу табе яшчо, - гарачыўся аграном. - Ты чуеш што робіцца ў нашай ваколіцы, а я чую што вытвараецца многа па цэлай Беларусі. Найболі зьверскія банды ў Шчучынскім, яны над нашымі сьвятарамі зьдзекуюцца. У вёсцы Туры за беларускую дзейнасьць польская банда замардавала сьвятара Ігнатовіча й ягоную матушку. Паабразалі ім вушы, насы, вочы павыколвалі, а матушцы адрэзалі грудзі. Нараны лілі бінзін, падпальвалі й п'яныя рагаталі зь людзкіх мукаў.

- Госпадзе мой, Матка Боская! - жахнуўся Антось.

- Тамака яшчо недзе, - забыўся мясцовасьць, - дык нашага сьвятара, каторы ладзіў праваслаўную царкву, што Палякі адабралі й замянілі на касьцёл дваццаць гадоў назад, дык яго жыўцом закапалі ў зямлю, толькі галава тарчэла. Разлажылі вогнішча й калі чалавек у страшных муках паміраў, вакол таго агня, як дзікуны, танцавалі... Мог-бы доўга расказаць усё тое, што да мяне даходзіць. Па цэлай Заходняй Беларусі Палякі стараюцца гаспадарыць, паліць і рэзаць. А рэжуць нашых у корань. Дык ці думаеш, што сам адзін па начах ня сьпіш і рупішся, каб сваіх пад зброю на абарону паставіць?

Падгайскі змоўк. Зірнуў на ручны гадзіньнік. Відаць, што быў змучаны.

- Можа спаць хочаш, а я замінаю?

- Ды не, сядзі. Я рад, што забегся, хочацца са сваім чалавекам душу адвесьці. Знаеш, тутака на месцы я асьцярожненька мушу.

- А што чуваць?

- Я й хацеў расказаць пра гэта, але яшчо раней пра бальшавіцкія банды. ты сам чуеш, што яны ад Палякаў анічуць ззаду не астаюцца. Цяперака, відзіш, ужо пачынаюць школы паліць. Нашым удалося на курсах маладых настаўнікаў на скорую руку падрыхтаваць, каб дзіркі пазатыкаць, а гэтыя ўжо разганяюць. За Докшыцамі нідаўна ў Малінаўцы школу спалілі. Чуў? Ды і другіх мясцох паляць, асабліва

дзе бліжэй да лясоў. Настаўнікаў калі не забіваюць дык напалохаюць, што самі паўцякаюць. Чакай-жа, здаецца зь Літоўцаў там недзіка настаўнічае Янука Бахмача дзяўчына?

- Ага, Дуня Макатунішка, у Бярозаўцы.

- Гэта бліжэй гораду. Можа туды ні дабяруцца. А хто ў вас у Літоўцах вучыць?

- Ды гэта старая дырда Плясьневічыха. Якая там зь яе вучыцелька... Бэ і мэ можа навучыць, а так яна слаба пабіларуску...

- Што за яна?

- Старая ўдава з гэтых нашых пшэкаў-шляхты. Як помню, ліпела там на хутары пры Літоўцах. Мы некалі, малеча, калі ўскапышымся й бяжым Плясьневічых дражніць. Яны дзьве з катамі жылі. Мы пад вакно падыйдзем ды як зачнём на розныя галасы! Старэйшая, як ведзьма, зь мятлой празь дзьверы да нас: - Я вам, лайдакі, ногі паперабіваю! Тая старэйшая даўно памерла, а маладзейшая цяперака дзяцей нашых вучыць. Гадоў, мусіць, шэсьцьдзесят ей.

- Гэта зьдзек над нашымі дзеткамі, каб такую вучыць паставілі.

- Мусіць няма каму.

- Дык калі-б тэй Януковай дзяўчыне горача там стала, чаму яе ў родную вёску ні вярнуць?

Антось нічога на гэта не адказаў. Дуню ён паважаў, але ня ведаў як там у Бярозаўцы ўложыцца й ці Дуня дома вучыць згодзіцца.

- Ну дык што там у цябе з паліцыяй і Немцамі? - спытаў.

- Левандоўскі да цябе ня чэпіцца? - пытаньнем на пытаньне адказаў Падгайскі.

- Ні заглядаў.

- А як дзіравы шляхціц?

- Нічога. Ён сьлядзіць за Шпунтамі. Хочыць Лявона прыпільнаваць і падсьцерагаіць як Шпунтоў сабака ўночы брэшыць.

- Кпіны строіш?

- Ды не. Сам мне расказваў.

Падгайскі запрапанаваў яшчэ выпіць.

- Я гэттака, ведаеш, - працягваў аграном, узяўшы малы кавалачак гурка, - ролю абжытага й багатага прыяцеля Немцаў і Палякаў іграю. Гаспадарка мая да гэтага рыхтык падходзіць. І адны й другія, значыцца Немцы й паліцыя да мяне заглядаюць. Ёсьць варыва, садовіна, ёсьць

яшчо тое-сёе. Курэй, сьвіней, карову трымаю. Прыходзіцца да працы наймаць, знаеш. Яшчо трымаю добры запас гарэлкі...

Пра характар гаспадаркі сваей аграном не патрабаваў Антосю гаварыць. Падгайскі практыкаваў так неабходны вайною тавараабмен. І гарэлку, значыцца шнапс, пэўне-ж, ня сам гнаў, а даставаў з ЦТО ці дзе там. Калі-ж мясцовым уладам чаго патрэбна было, а Падгайскі ня меў, дык ведаў дзе і ў каго дастаць можна. Нямецкая ваенная гандлёвая кантроля мела шмат дзірак, празь якія можна было лёгка пралезьці, асабліва калі з уладамі руку трымаеш. Бязумоўна, - ды пра тое навет не гаварылася, - Падгайскі, як мага, мусіў ладзіць з падобнымі, як ён, гаспадарамі ў мястэчку, якія супольна маглі рабіць «гяшэфт» для свайго дабра й нажывы дый для частага ратаваньня іншых, што зубы палажылі-б на полкі, калі-б трымаліся правоў акупацыйных уладаў. Антосю ведама было, што Падгайскі не рабіў гандлю на вялікі маштаб, а адно даволі, каб самому ўтрымацца, наймітаў аплаціць ды, - самае галоўнае, - утрымаць сваю стратэгічную пазыцыю, зусім неабходную для помачы загрожаным Беларусам.

- Ты можа й чуў, - усьміхнуўся аграном, - нікаторыя сьмяюцца, што ў мяне забягалаўка, толькі от што баб німа, ато чыста бардачок быў-бы... Ха-ха-ха! Гэтам браток, злыя языкі, перцу на іх. Прыходзяць гэтыя самыя, як я іх называю, свае, значыцца й пазаўчорака нямецкі камандант і гэты фрыц, каторы во па гаспадарскай часьці ад зондэрфюрэра з Докшыц, пару гадзінаў тутака прабарабанілі. Знаеш, выпіць, адыйсьціся ад сваіх хочацца. Куды-ж ім? Выпіць то, пэўна-ж, яны маглі-б і ў сябе ўдома, шнапсу ў іх даволі, але ўсяроўна ім рупіць далей ад непакліканага вока. От як... Яны такое месца на водшыбе, як маё, любяць. А мне, сам знаеш, калі катораму з нашых на хвост наступяць, дык іхныя дзьверы тады адчыненыя.

- А ці заплацілі яны табе за ўсё тое дабро, што войска брала ды квіткі давала?

Падгайскі падумаў, пачухаў рудыя валасы, скрывіў твар.

- Як там заплацілі... Па нейкай сваей дзяржаўнай цане, акупацыйнымі маркамі. Ну але-ж, заплацілі. Ёсьць тутака ў мястэчку каторыя на чыгунках працуюць, значыцца цягнікамі маюць праезд у Вільню ці Менск. Гэтыя людзі вечна назаляюць, каб ім сала ці яек прадаў. Яны там маюць свае кантакты й сам ведаеш, што ў вялікіх гарадох людзям вайной пражыць куды цяжэй. Я ім часам чаго

адчэпнага, але найболі адмаўляю, бо нажыва мяне ня цікавіцць а, барані Божа, каго ўкверліш, дык тады адно глядзі...

- Ну а як Левандоўскі? - цікавіўся далей Антось.

- Спачатку ён, гэтае самае, дзікавата крыху да мяне ставіўся. Ды пасьля ўвідзіў, што нямчура сюды заглядаіць дык і ён асвоіўся. Адным словам, злажылася добра. Левандоўскаму, знаеш, давялося часамі чым-небудзь руку пагрэць. Кумекаеш? Нівядома як далей будзіць, але цяперака лепі мне, значыцца нам, мець іх прыяцелямі чым ворагамі. Гэтак і таньней абыйдзецца, калі часамі сваіх ратаваць трэба. Знаеш, тымчасам улада ў іхных руках. Гэта праблема старая, як сьвет: калі ты слабы, ня рыпайся, мацуйся, чакай свайго моманту, а тымчасам глядзі, каб зь цябе пер'я ня выскублі. Я Левандоўскаму ці раз сказаў, што ўжо час перастаць з нашых людзей камуністаў фабрыкаваць. Ён зразумеў. Цяперака ўжо з нашых тутака камуністаў ня робяць хоць, як я табе ўжо казаў, у іншых месцах гэта яшчэ прадаўжаецца. А ты во паглядзі як дырэктар Сабалеўскі сьвята біларускіх угодкаў нізалежнасьці дваццаць пятага сакавіка ў чыгуначным клюбе арганізаваў, зь якім шыкам і патрыятызмам. Цымус, браце! І што-ж ты думаеш, ці гэта не калола нашым ворагам у вочы? Ого, як калола! Але-ж нікога з нашых ні зачапілі.

- Можа зьмяніліся? Я ім ня веру, - адказаў Антось.

- Ведаеш, Антось, ня ўсе Палякі сволачы дый ня ўсе нашы - ангелы.

- Ды не, але бальшыня Палякаў якраз і ёсьціка сволачы й бандзіты. А нашыя? Сам ведаеш, свая кашуля бліжэй цела.

- Ня ведаю як табе вытлумачыць, - пасьля хвіліны роздуму пачаў Падгайскі. - Можа лепі прыпомніць, - ты-ж, пэўня, чуў... ды чаму-ж ня чуў? Усе чулі, - прыпомніць, што ў трыццаць дзявятым, як развалілася Польшча, рабілася на Ўкраіне, значыцца ў Галіччыне й на Валыні. Страшна, як расказваюць. Украінцы рэзалі «ляхіў» без разбору. Пасьля дабраліся й да сваіх сем'яў, мяшаных значыцца. Маці - Украінка, а бацькка - Паляк, ці наадварот. От і пашло. Муж рэзаў жонку, ці жонка мужа. І дзетак ні шкадавалі. Ведаеш, народ проста да абсурду скаціўся, зусім розум страціў. А цяпер прыгадай сабе, глянь навокал нас: колькі ў нас сем'яў мяшаных? Мясцамі мы вельмі з Палякамі зьліўшыся, ды яшчо ў нас вялікая цемната: рэлігію лічаць нацыянальнасьцяй, значыцца каталікоў - Палякамі, праваслаўных - Расейцамі, а рэшта

хто? Мы, Беларусы, - гэта тутэйшыя. Ды што было-б, калі-б мы, як Украінцы, разьню зрабілі? Бойся Бога, што было-б... Калі-б у цябе была жонка Полька й за польскіх часоў выгадавала дзяцей палякамі, дык што-б ты рабіў, рэзаў-бы іх?

- Ну ты ўжо занадта...

- Ды не, ні занадта. Хачу ілюстраваць табе, як на Ўкраіне было. Людзі саўсім з глузду зьехалі. Ты ведаеш, чаму нам трэба з камунізмам змагацца й чаму зь Немцамі нам не падарозе?

- Бо камуністы прынесьлі нам прыгон калгасны, а Немцы хочуць нас усіх выкараніць, каб пасьля самім тут загнязьдзіцца.

- Праўда твая, ды ня ўся. Гэта толькі вынікі іхных палітычных таталітарных сыстэмаў. І камунізм і нямецкі фашызм - абое рабое. Партыя, дзяржава, дыктатура - гэта ўсё, а чалавек у іх ноль. Ён ні маіць голасу й права, а толькі тыя маюць, каторыя да ўлады дабяруцца. А чалавек маіць душу й сэрца і каб ён разьвіваўся, каб дабро рабіў, мусіць быць вольным. Гэта ведама думаючым людзям ад пачатку сьвету. Каб трымаць нявольнікаў у послуху, тыя басякі, што ўладу маюць, мусяць ужываць сілу. Галоўная зброя таталітарнага рэжыму супраць людзей, яму падпарадкаваных, ёсьць суцэльная, значыцца груповая адказнасьць. За мужа адказваіць жонка й наадварот, за бацькоў адказваюць дзеці, навет сусед за суседа. А рэлігія наша хрысьціянская вучыць, што кажны за свае грахі мае адказваць. Кумекаеш? А цяпер паглядзі што робіцца. У Менску за забойства аднаго Немца робяць аблаву й расстрэльваюць па сто саўсім нявінных людзей. Бальшавікі за грахі - гэта значыцца за грахі ў іхным антычалавечым паняцьці, - аднаго чалавека высылалі на Сібір цэлыя сем'і. Гітлерава сыстэма такая самая, як і Сталінава. А ці-ж тая думка, якой кіраваліся Ўкраінцы, выразаючы нявінных ні ў чым Палякаў, гэта ня тое самае? Чаму ў паняцьці тых разьнікоў нейкае польскае дзіця ці жанчына на Валыні была вінавата за грахі быўшай польскай дзяржавы? Я-ж кажу, ні дай Ты, Божа, каб мы рабілі тое, што зрабілі Ўкраінцы. Нашае заданьне, каб выйсьці з гэтае вайны ня толькі з найменшымі стратамі, але каб і захаваць сваю душу, каб ня зьдзічэць, не асьлепнуць. Бо калі-б мы прынялі аснову суцэльнае адказнасьці, - найбольш нялюдзкае й д'ябальскае, што ў камунізьме й фашызьме, - дык які тады з нас народ? Навошта тады змагацца за волю, калі мы самі адкінем сваё найлепшае, беларускае, на чым наш народ базаваў

сваё жыцьцё тысячу гадоў: глыбокую веру ў Бога, любоў да волі, індывідуальная адказнасьць і ініцыятыву, любоў да бліжняга, помач слабейшым і гэтак далей? Мы-ж тады былі-б няздольныя да сапраўднае волі, бо самі сябе паняволілі-б гэтым антычалавечым дзікунствам. Кумекаеш?

Антось прыглядаўся аграному, нічога не адказаў.

- Вядома, няма роду бяз выраду, але ня ўсе Палякі - лайдакі, як і ня ўсе Немцы - фашысты. Трэба адзьдзяліць народ ад сыстэмы й надта небясьпечна абагульняць, асабліва вайной.

- Дык чаму тады Палякі нас так суцэльна стараюцца вынішчыць, нашых найлепшых людзей закопваюць жыўцом, паляць, мардуюць?

- Яны б'юць па нашай галаве, значыцца па людзях, якія ў галаве стаяць, народ вядуць. Наша заданьне - ня дацца, а змабілізавацца, ды біць па тых Паляках, каторыя іх вядуць, ды па іхных зарганізаваных групах, асабліва збройных. Вось як. Кумекаеш?

- Яно так. Ну але мне, мусіць, трэба пад дом, - сказаў Антось.

Пагаварылі яшчэ пра драбніцы й разьвіталіся. Падарозе дадому, шчуруючы сваймі сьцежкамі, высьцерагаючыся, каб дзе не натрапіць на які вайсковы ці паліцыйны патруль, Антось доўга пераможваў тое, што так спрытна вытлумачыў аграном.

28

«Якая недарэчнасьць», - думала Дуня, пазіраючы на сухія сьцёблы кветак перад зялёным плотам за вакном. - «Саўсім ня так, як у Коласавага Лабановіча. Час ня той. Ваенная гаручка зямельку трасець».

Казала матка, выпраўляючы Дуню ў гэту вёску:

- Едзь-жа, дачушка, на свой хлеб.

Адно цяпер відаць было, што простае, звычайнае матчына пажаданьне сталася сарказмам. Запраўды, які-ж тут хлеб, не гаворачы ўжо пра заробак. Гэтага заробку, хаця й далі ў раёне наперад грошы, ледзь на харчы хапала, даводзілася й галадаць.

У першы дзень Дуня мела магчымасьць зірнуць на сябе вачмі суседкі сваей гаспадыні Кацярыны, у якой на кватэру згадзілася.

Выйшла ў гарод, што ззаду. Яе, відаць, не спасьцераглі куды падзелася. Чуе ля паркану:

- Кацярына. Га, Кацярына!

- Што хочаш, Ганна?

- Што гэта за дзяўчо да цябе прыехала?

- Гэта во? Дык гэта-ж новая вучыцелька.

- Вучыцелька, кажаш? - перапытаў гучны, зьдзіўлены Ганьнін голас. - Гэткая жаба, сама дзіцё яшчо і ўжо вучыцелька?

- А як-жа. Ну маладзенькая саўсім, але з раёну прывезьлі.

- Дык як-жа яе, такую жабоцьку, дзеці будуць слухаць?

- Як, кажаш, слухаць будуць? А ці-ж мне ведаць? Чорт іх знаіць, дзе яны во такіх набралі. Ну алі-ж яна будзіць ні сама, а з гэтым нашым старым вучыцелем.

- Во як.., - дзівілася далей Ганна. - Дык і гэны стары п'яніца будзіць вучыць. Ну, калі так... А адкуль-жа яна сама, ні пыталася?

- Пыталася. Зь Літоўцаў, кажыць.

- Гэта з тых, што ля Гацяў?

- Ага, Ганна, зь іх самых, казала.

Хто ведае, якую яшчэ ацэнку далі-б ей Кацярына з Ганнай, калі-б Дуня, усьміхаючыся да жанчын, не паказалася на сьцежцы. Дзябёлая Ганна адчыніла рот, каб яшчэ нешта сказаць, але першая спасьцерагла «жабоцьку» й папярэдзіла Кацярыну.

«Старым вучыцелем», якога згадалі жанчыны, аказаўся лысы, з прышчамі на твары, кароценькімі нагамі й чырвоным, наводля бульбіны носам Міхал Капышынскі. Стары польскі настаўнік, дырэктар Бярозаўскай чатырохклясавай пачатковай школы, Дунін шэф. Першая, сухая гутарка зь ім не належала да прыемных. Гэты стары і, як пасьля даведалася Макатунішка, бязьдзетны ўдавец, п'яніца, гаварыў паволі, з хрыпам. У гутарцы пракідвалася польская мова.

- Сама пані кажаш, іле лят..., значы сколька гадоў маеш?

Ягоная зялёныя, глыбока ўпаўшыя, на азызлым твары вочы абмацвалі, распраналі Дуню. Ёй стала вельмі нявыгадна быць з гэтым чалавекам у занядбанай канцылярыі. Крутнулася на цьвёрдым, абдзёртым драўляным крэсьле, зірнула на шэрыя голыя сьцены, што даўно за вапнай тужылі.

- Прабачце, - змусіла сябе ўсьміхнуцца Дуня, - я ніякая ня пані.

- А як вас называць?

- Спадарычня.

- Спа-да-рыч-ня..., спа-да-рыч-ня. Ладнэ слова. Новае.

- Падругое, калі цікавіцеся мною, можаце заглянуць у папку. Хіба-ж інспэктар прыслаў?

- Ага, ага, прыслаў, а як-жа, - хрыпеў Капышынскі, а зялёныя вочы ўсё распраналі Дуню.

Гутарка пра праграму й распадзел прадметаў паказала, што гэты, з ласкі нязвычайных часоў, дырэктар, застаўся дзесьці ззаду ў часе. Дуня падказала яму дзе што магла й хутка спанатрыла, што лепш ёй узяць беларусую мову, гісторыю й геаграфію Беларусі, каб хрыплы дырэктар дзяцей не калечыў. Дзядзька з радасьці ледзь у руку Дуні не пацалаваў.

- Спадарычня... Так, спа-да-рыч-ня, - яшчэ раз разьбіў на склады новае для яго слова Капышынскі, - спадарычня Макатун, я думаю, - ках, ках! Прабачце, прастудзіўся, псякрэў, - я думаю, што мы добра будзем разам працаваць. Вы бярыце беларускі ензык і гісторыю, бо, знаеце, чаго там крыцца, пані, - ках-ках, значыцца, спадарычня. Як повядам, чаго там крыцца, я сам гісторыю Бялорусі добра ні знаю і прасіў інспэктара Ворана, каб даў каго на гэты прадмет, а таксама не знаем бялорускего ензыка. Цяпер віджу, што ён мяне паслухаў.

Дуня думала зь якой бачыны, якой аповесьці і якога аўтара зьлез гэты чалавек. Анахранізм, зжытае-аджытае, з парахном усярэдзіне. Пярхікае, хрыпіць, а вочы, - ненасытныя вочы, душы здраднікі, цешацца новай цацай, што перад ім расьселася. І думала яшчэ Дуня, чым матываваўся беларускі школьны апарат, вызначаючы вось такое парахно дырэктарам школы. Можа гэты самы Капышынскі, спалянізаваны некалі шляхцюк, які беднасьць, магчыма, прыкрываў нейкім напышаным шляхоцкім гонарам, можа вось гэты дзядзька ў думках і пасьмейваўся зь беларускай мовы, гісторыі Беларусі, а можа й пляваў на іх. Калі яго далі дырэктарам школы, дык якое-ж тады мела быць становішча з кадрамі? Дырэктар! Гэтаму ханжы, анахранізму трэба было залезьці ў нейкую шчыліну. Як яму даверылі ўзгадаваньне беларускіх дзетак? Што яны там наверсе падурэлі?

Неўзабаве спраўдзіліся найгоршыя Дуніны прадчуваньні. Капышынскі пра школу ня дбаў. У кампаніі зь мясцовым гуртам падобных, як сам, дзядзькоў вудзіў сівуху, часта пазьніўся на лекцыі. Дуня мусіла зьбіраць разам усе чатыры клясы і, ня могучы даць рады,

бралася нешта чытаць ці апавядаць зь гісторыі. Мяшок бульбы з чырвоным носам паказваўся на якія дзьве гадзіны пазьней, лыпаў зялёнымі асмужанымі вачмі й на Дуніны пратэсты адказваў аднэй, - дзе гэта ён яе выкапаў? - мудрасьцю. Браў сьмешную позу: кароценькія ножкі, да мяшка бульбы прывязаныя, адна-адзіная памятая сівая сьвітка, сіняя расшпіленая кашуля. Цень нейкае імглы паглынае зеленкаватыя вочы. Руды, абсмалены самасейкай, тоўсты ўказальны палец, падняты ўверх. І ўрачысты, хрыплы голас:

- Пані... ках-ках! Спа-да-рыч-ня Макатунова непотшэбне се мартві. Я вам скажу адну харошанькую, да, харошанькую мудрасьць.

Пасьля такога трыюмфальнага ўступу хрыплы, прапіты голас зьніжаўся прынамсі на адну ноту і ўрачыста абвяшчаў:

- Яшчэ нігды, ніколі на гэтым сьвеце ня было, жэбы ніяк ня было. Заўшэ неяк будзіць. Ха-ха-ках-ках! Праўда.

Пачуўшы такое першы раз, Дуня разрагаталася. Запраўды ў гэных словах вялікая мудрасьць была. Але хрыплы мяшок бульбы паўтараў тое самае колькі разоў. І здаралася тое часта пасьля ягонага паругадзінннага спазьненьня. Здэнэрваваная Дуня, праклінаючы яго, бегла ў канцылярыю. А гэтта сустракала дырэктара, які ўсьміхаўся, рабіў ведамую позу й паднімаў уверх пульхны палец.

- Ведаю, ведаю, спадар дырэктар, - забягала яму наперад Дуня выкрыўляючы ўрачыстую позу. - Яшчэ ніколі так ня было, каб ніяк ня было. Заўсёдты неяк будзе.

- Браво! - рагатаў пан Капышынскі. - Маладзец. Заўшэ...

- Ня заўшэ, а заўсёды, - папраўляла яго Макатунішка.

Аднойучы, спазьніўшыся, як часта бывала, дырэктара паўтараў сваю мудрасьць. Азызлы твар прыблізіўся да Дуні, а ў зялёных вачох на міг успыхнула нейакя недагарэлая іскра юрлівасьці. З роту нясло гарам самагонкі. Бязь ніякага папярэджаньня, Капышынскі схапіў настаўніцу за грудзі. Адскочыўшы крок назад, Дуня зь вялікім размахам ударыла яму па твары. Якраз у гэны момант адчыніліся дзьверы й двое крыклівых хлапчукоў беглі на нешта скардзіцца. У аднаго зь іх цякла носам кроў.

- Спадар настаў..., - пачаў крыўдны дзіцячы голас, але спыніўся, пабачыўшы як Дуня аплявушыла дырэктара. Зачырванеўшыся, Дуня выбегла з канцылярыі. У гэны вечар цэлая вёска апавядала, як «маладая вучыцелька сягоньніка Капышынскага набіла».

Маладой настаўніцы відаць было ясна, што ў гэтай вёсцы ёй будучыні няма. Апроч клопатаў з дырэктарам, назаляла яшчэ й тое, што ня мела кантакту зь мясцовай моладзяй. На настаўніцкіх курсах навет выдатны пэдагог Васько, што выкладаў мэтодыку, ня мог прысьвяціць, магчыма ў праграме ня было, - часу зусім неабходнай праблеме: як малады настаўнік мае захавацца ў новым асяродзьдзі, як ужыцца ў яго. Таму, што настаўнікамі станавіліся пераважна юнакі і юначкі, зялёненькія ў жыцьці, амаль бязь ніякае жыцьцёвае практыкі, а некаторыя зь іх маглі быць тымі першымі аладкамі, што ўдаюцца комам, настаўніцкія курсы мусілі-б зьвярнуць увагу на прыстасаваньне новых настаўнікаў да чужых асяродзьдзяў. Час дыктаваў усё: і некамплектнасьць настаўніцкае асьветы, якую давалі шасьцімесячныя курсы, і жыцьцёвую непадрыхтаванасьць, зялёнасьць маладых настаўнікаў. Навет на пасьветках, што выдаў «Шульвэзэ, Камісарыят дэр Глебоке», а падпісаў побач нейкага нямецкага ўрадаўца і дырэктар курсаў, нейкі русафіл Субботин, было ясна сказана, што пасьветка дае права часовага навучаньня ў першых чатырох клясах пачатковых школаў і што пасьля нейкага вызначанага пэрыяду вымагалася, для атрыманьня права далейшага навучаньня, здабыць грунтоўную настаўніцкую адукацыю.

Часовая адукацыя, часовая пасьветка, часовая праца. Не знайшлі навет часу расказаць, - што асабліва важна вайною, - як гэтыя юнакі мелі ўжыцца ў мясцовае асяродзьдзе. І Дуня ня ўжылася. Нельга сказаць, каб не старалася. У гаспадыні, дзе кватэравала, была дачка Антаніна. Гадоў каля дваццаці пяці, сьціплая ціхоня, у сябе замкнутая, такая, што й на вясковым ігрышчы ў цені трымаецца, дзесьці ў кут зашываецца, якую да танцаў намаганьнем за руку цягнуць трэба.

І пайшла зь ёй Дуня аднойчы, перад калядным запустамі, на вясковую вечарыну. Моладзь для Дуні незнаёмая. Спасьцярогшы маладзенькую, прыгожую «жабоцку вучыцельку», дзяцюкі ня ведалі як да яе падыйсьці. Нарэшце адважыўся здаравяка Яўхім. Дзяўчына пасьля даведалася, што зь нямецкага палону ўцёк, а пасьля бальшавіцкія банды яго паглынулі.

- Хадзі, пані, на покуць, - сказаў дзяцюк загадным голасам і, не чакаючы Дунінай згоды, узяў яе за руку ды пасадзіў амаль побач з кучаравага, сярэдніх гадоў, дзядзькі, што пілікаў на трохрадцы.

Неўзабаве стаяў Яўхім перад Дуняй, якая намагалася ажывіць пасаджаную побач Антаніну, што зусім ніякавата чулася напокуці.

- Хадзі, вучыцелька, танцаваць.

Пасьля такога запрашэньня, пакуль Дуня наважылася як на яго рэагаваць, здаравяка Яўхім літаральна падняў яе на ногі. Ігрышча ня розьнілася ад падобных у хаце Кмітавага Тодара ў Літоўцах, адно твары навокал іншыя былі. Дуня ня ведала, як захоўвацца між гэтых людзей, што пачалі зь ёй адразу на «ты».

Палажэньне «жабы», як яе дзябёлая Ганна ахрысьціла, было няпростае. У Беларусі настаўнікі былі некалі паважанымі аўтарытэтамі, хаця й гаварылі мовай акупанта, палянізавалі ці русыфікавалі народ. Навет з дозай казённага яду, настаўнік усё-ж вёў дзетак «у людзі», недзе ў сьвет лепшага жыцьця. І калі ведамае «бацька бяз школы араў і ты будзеш араць» яшчэ ня выкаранілася, дык спадзяваліся, што школа можа адчыніць дзьверы ў лепшы сьвет, дзе для пражыцьця не абавязкова араць. Настаўнік быў мясцовым аўтарытэтам, што не абавязкова за пару яек ці якую скварку мог параіць людзям як далезьці ў шырэйшы, мудрэйшы й лепшы сьвет ды па якіх ступеньках пачынаць. Настаўнік меў нейкі арэол мудрасьці, навет улады. Дзіва няма, што так званыя вясковыя інтэлігэнты, часта духовыя дзікуны з вонкавай палітурай, - «культурныя людзі», гарнуліся да настаўніка, намагаліся трымаць зь ім кантакт, аціралца каля «культурнага чалавека».

Некалі ўстаноўленыя нормы жыцьця крушыліся ў паядынку двух тытанаў. А на тых лапіклах краіны, дзе таптуны тымчасам яшчэ не тапталіся, старалася прыжыцца і ўкараніцца адвечнае мясцовае. Сейбітамі яго сталіся юнакі й юначкі з часта хаатычнымі запасамі практыкі й ведаў, нясьмелыя, мо спалоханыя. Асаблівай была сытуацыя на ўзьлесьсях, недалёка логавішчаў бандаў, што перш, чым схапіцца ўдужкі із сваякамі па ідэялёгіі, тапталі й вынішчалі ўсялякія парасткі мясцовага, што імкнулася аднавіць роднае й дарагое. Пастаўленыя капрызам лёсу ў такое цяжкое становішча, маладыя настаўнікі часта йшлі вобмацкам, амаль без падтрымкі й заплечча. Перапалоханыя нагласьцю бандытаў, што служылі Молаху зь «вялікай зямлі», яны часта зрываліся зь ненагрэтых яшчэ гнёздаў.

Здаралася, што начамі Дуня доўга сьлязьмі мачыла падушку. Гарту для вытрываньня мела даволі, але куды лягчэй было-б, калі-б

побач яе быў міленькі Янучок. Дзе ён, любы, злаценькі, чаму ня йдзе побач яе на ўзьмежжы, ня дэклямуе насычанай каханьнем паэзіі? Чаму, заміж яго, нейкая порхаўка, п'яніца, свайго роду Квазімодо? І яшчэ збоку, за кілямэтры чатыры адлегласьці, быў «рыцына», Аблізаная Авечка, што ці раз, пасьвістываючы, на сваім ровары-самакаце (дзе ён такі навюсенькі дастаў?) да яе заглядаў. Заходзіў у хату, быццам яго хто прасіў, а Кацярыне, Дунінай гаспадыні, прадставіўся як Дунін дзяцюк. Прагнала яго раз, за тыдзень прыехаў зноў. Ты яго выганіш празь дзьверы, ён улезе праз вакно, а калі-б і вокны пазачыняць, дык ці ня ўлез-бы, як той Дзед Мароз, праз комін.

Можа-б і трывала далей Макатунішка, калі-б не падзея ў Малінаўцы, што ляжала зусім побач калішняй польска-бальшавіцкай мяжы. Школу, што абслугоўвала тры вёскі, там кагадзе нейкія «гэройскія» перадавікі зь «вялікай айчыннай» з дымам пусьцілі. Настаўнікам, - аднаго зь іх Дуня ведала, - удалося выратавацца. Камень быў кінуты, кругі ўсё шырэй расплываліся па вадзе. Вялікі лік школаў Докшыцкага раёну стаяў пад пагрозай ліквідацыі.

Выпрасіўшы ў солтыса фурманку, не паведаміўшы навет Капышынскага, Дуня спакавала ўсё сваё дабро ў адну валізу і ў сьнежаньскі дзень пакінула Бярозаўку ды загадала адвезьці сябе ў школьную раённую ўправу ў Докшыцах. Інспэктар Воран, сухі, высокі, чэрствы ў твары дзядзька, змораным зрокам зірнуў на дзяўчыну з-за заваленага паперамі стала ў канцылярыі.

- Не, не кажыце мне, спадарычня Макатун, знаю, знаю, чакаў на вас.

Інспэктар устаў з-за стала, пачаў хадзіць па халодным пакоі. Рассыпаныя пасівелыя валосы, што даўно з ножніцамі бачыліся, крыху прыгорбленыя плечы. Патрапаныя боты, паўсуконная сьвітка й порткі. Няўклюдны крок. Здалося Дуні, што дзядзька Воран лепш выглядаў-бы й чуўся за бараной і зь лейцамі ў руках. А вярхоўны аўтарытэт раённае асьветы гаварыў цьвёрдым голасам:

- Пачаткі. Плянавалі, будавалі, камбінавалі, каб паўстала, вырасла, ажыло, як Фэнікс з папялішча. Пры немагчымасьцях, пры ўсім запярэчаньні жыцьця. Там, дзе прадказана тымі, што ўладу й сілу маюць, што жыцьця тут не мае быць, толькі гвалтоўнае, наглае і камплетнае разбурэньне. А мы, - ох, Божа мой! - наўсуперак гэтаму рупіліся пра родную зямельку, пра дзетак і пачалі сеяць зерне. Вас,

маладых, нявыпрабаваных, як належыцца непадкованых і ненавучаных кінулі, можна сказаць, на пярэднюю лінію. Адвага! Не, няправільна. - Гэта - не адвага, то роспач. Выхаду ня было. Можа там, дзе спакайней, дзе ня стопчуць, можа будзе ўражай які... Калі не заглушыць гірса, асот. сьвірэпка, пустазельле... А тут? Прапала. Ужо відаць, што набліжаецца. Госпадзе мой, каб хоць пару гадкоў гэтыя злыдні далі. Ці-ж і гэтага мы нявартыя?

Дуні ўміг стала ясна: і анахранізм - мяшок бульбы, і тое, што сама галадала, і многа, шмат чаго іншага, дый навет і тое, чаму народ ня мог вытлумачыць узросту «жабоцькі-вучыцелькі». Гледзячы на інспэктара Ворана, сьціснулася ёй сэрца. Хацелася-б прыгарнуць яго к сабе блізка-блізка й сказаць зь пяшчотай, быццам бацьку: «Тата, ня трэба. Сядзь, даражэнькі, успакойся. Трэба верыць і змагацца. Мы маем сілы, мы маладыя, мы яшчэ вырасьцем і паможам, пераможам».

Камяк у горле замінаў дыханьню.

Воран скончыў гаварыць, стаяў перад вокном, задам да Макатунішкі й глядзеў у нейкі пункт. А можа нічога ня бачыў, ці ўяўляў папялішчы ўжо там, дзе сяньня яшчэ чуваць звонкія дзіцячыя галасы... Вакно, у якое глядзеў Воран, ня мела фіранак і даўно, мусіць, ня ведала дбайлівае рукі гаспадыні. Інспэктар памалу сеў, выцер чыстай насаткай твар і проста зірнуў на Дуню.

- Едзь, дзяўчына, дадому. У вас там Плясьневічыха дзетак калечыць. Ты на яе месца. Згода?

Голас з прыціскам фінальнасьці, ледзь не загад, калі-б не апошняе слова. Дуня добра ведала Плясьневічыху й нядрэнна ўяўляла як яна магла вучыць дзетак. Але што сказаць інспэктару? У чужой вёсцы людзі жабай ахрысьцілі, а што ў сваей будзе?

- Спадар інспэктар, як мне працаваць у сваей вёсцы? Людзі мяне змалку зналі... Як яны будуць паважаць мяне, такую маладую, якую ў Бярозаўцы жабай празвалі?

Воран падпёр твар рукой, уважна пазіраў на Дуню.

- Спрабуй. Вучыць патрапіш, добра раду дасі, дык і людзі да цябе з пашанай пачнуць адносіцца. А калі помач трэба, зьвяртайся да мяне, памагу. Цяпер-жа я не магу Плясьневічыхі там пакінуць.

І пасьля, прыгадаўшы гэны момант, дзівілася Дуня, чаму проста й спакойна адказала: - Добра, спрабую.

Можа таму, што гаварыла ейнае растрывожанае пачуцьце й хацелася памагчы гэтаму зморанаму дзядзьку.

29

Задняя вайна прыйшла ў ваколіцы Літоўцаў у жнівені трэцяга лета. Задняя таму, што пярэдняя адбывалася яшчэ далёка на ўсходзе, хоць ужо й набліжалася. А ў вёску раней заглядалі бальшавіцкія банды для рабунку й радзей падарозе на чыгунку. Вёска баялася, што апынулася ў чырвонай зоне й што чакае яе лёс іншых вёсак, ад якіх асталіся абгарэлыя коміны й лебяда на папялішчах. Вёска тапталася яшчэ па вытаптаных сьцежках і ў ненармальным становішчы намагалася ўтрымаць сваю нейкую нармальнасьць. Вёска, у якой певень, асабліва той на золаку, быў яшчэ аўтарытэтам, трымалася як магла. Людзі бачылі, што навокал адбываецца вялікае ліха, якога не маглі вытлумачыць ня толькі пахатухі, але й мясцовыя «культурныя людзі». І вёска спадзявалася, што яе міне нейкая свая садома. І ўсё-ж, калі прыйдзе якое страшнае ліха, дык адкуль і ў якой хворме? Хто-ж мог ведаць... Ніхто навет ня раіўся зь дзедам Якубам, які ў немачы больш ляжаў пад коўдрай, або грэўся на печы.

- Хто знаіць, якая бяда будзіць, каб яе макарэц! - крактаў дзед.

Новы акупант ня душыў такімі падаткамі, як некалі бальшавікі. Гэта ня прыносіла вялікае пацехі. У сумежных лясох была адна ўлада, а ў Гацях другая. Лясная, або начная ўлада таксама брала падаткі, значыцца рабавала налётамі. Праўда, у параўнаньні зь іншымі вёскамі, Літоўцам даводзілася лягчэй, але гэта ня значыла, што іх нагала ня абчысьцяць заўтра ці пасьля.

З двух бакоў чыгункі, на якіх мэтраў сто ці болей, павысякалі лес. Гэтта добра папрацавалі прымусова сагнаныя вакольныя сяляне. Цяпер вочы ахоўнікаў мелі далейшы засяг. Усё-ж банды падпаўзалі начамі да самае чыгункі, узьбіраліся на яе ціха, як зладзеі ды бязь ніякіх «ура за родзіну» прадаўжалі рэйкавую вайну. Кажнае раніцы нямецкія патрулі, як мага, дакладна правяралі зялезны шлях, цікавалі за рэйкамі й шпаламі, асабліва сьлядзілі, ці не раскапаны дзе жвір, абяззбройвалі міны. У стратэгічных мясцох Немцы пабудавалі добра абкладзеныя

зямлёй і бярвеньнем бункеры. Сяляне, ведама, і блізка да іх не падыходзілі.

Ужо ад нейкага часу хадзілі весткі пра розныя расейскія адзьдзелы на службе Немцаў, асабліва Расейскую Вызвольную Армію (РОА) пад камандай генэрала Ўласава, утвораную з быўшых савецкіх ваеннапалонных. Як дайшло да Літоўцах, адзін такі адзьдзел знаходзіўся ў мястэчку Лужкі, па той бок Глыбокага. Гаварылі яшчэ, што войска тое надта нікчэмнае, бо рабуе мясцовае насельніцтва й больш гуляе, чымся змагаецца з бальшавіцкімі бандамі. Пацьвярджалася мясцовая прыказка: - Навошта араць і сеяць, калі грабіць Расея?

У вадрозьненьне ад РОА, якая быццам мела стаяць гарнізонам у Лужках, апошнім часам прыйшлі весткі, што з таго-ж боку на поўдзень пасоўвалася зусім нейкая новая расейская фармацыя й называлі ейнага камандзера Гіль-Радыёнава. Куды ён цягнуў сваё войска й для якога заданьня, ніхто напэўна ня ведаў. Некаторыя мяркавалі, што ў сувязі з апаразамі Нямеччыны на ўсходнім фронце, гэты камандзер зь нейкай там сваей брыгадай мог накіроўвацца на ўзьмежжа засягу бальшавіцкіх бандаў у Докшыцкім раёне. Дзесьці ў глыбі Бягомельшчыны, як чуваць было, бальшавікі стварылі моцную базу. Зразумела, літоўскія й вакольныя сяляне ня ведалі й дый не маглі ведаць хто й якімі раёнамі на поўдні кантраляваў, але для іх ня было таямніцай, што Докшыцы сталіся косткай у горле бальшавіцкім бандам.

Гаці лічыліся бясьпечнымі. Гэтта злучаліся тры чыгункі й заўсёды праяжджала многа войска. Тут працавалі нямецкія чыгуначнікі, работнікі будаўнічае арганізацыі Тодта, гэтта ўрэшце быў і галоўны пункт нямецкіх адзьдзелаў, што ахоўвалі чыгункі. Слаба ўзброеная мясцовая дапаможная паліцыя істотнай сілай ня лічылася.

Вярнуўшыся зь Вільні, у тое лета Янук Бахмач, як мага, пасабляў бацьку пры гаспадарцы. Помач была надта за руку хваравітаму Пракопу Бахмачу, бо кульгавым Міколам вельмі не паддапрэшся. Януку-ж ня трэба было казаць, што мае зарабіць на харчы на наступны год навукі. Жыцьцё ў вялікім горадзе дало Януку накшы погляд на цэннасьць працы ўдома. Хлапец падрос, уздужэў, жыцьцёвае практыкі набраўся й таму ўлетку стаўся галоўнай сілай на гаспадарцы Пракопа Бахмача. Калі раней даводзілася яго да працы падганяць, дык цяпер

намагаўся бацьку наперад забегчы, вельмі рана ўставаў і позна клаўся спаць. Далёкая Вільня навучыла яго цаніць хлеб і цешыўся з нагоды аддаць бацьку належнае за помач.

- Ты-б, сынок, - казаў бацька, - ня ехаў увосень назад у тую Вільню. Нашто яна табе цяпер? Відзіш, вуньдзіка вайна, хто ведаіць што яшчо будзіць. Глядзі во Дуня вучыць у школе й добра, кажуць, рады сабе даець. Чаму-б і табе ня вучыць? Усё-ж заработак нейкі...

Бацькавы словы вялікую вагу мелі. Дуня прынадай была. Тужыў па ёй хлапец. Як-жа было-б добра працаваць дзесьці пабач яе. Ды ўсё-ж шкада было пакідаць распачатую сярэднюю асьвету. Пры школе Дуня атрымала паўгактара зямлі. Апроч сьціплае грашовае платы за працу, воласьць гэткім чынам памагала настаўнікам. Дуніну дзялку Макатуны засадзілі гароднінай і бульбай. А пасьля «навукі» Плясьневічыхі, Дуня сталася мясцовай зоркай-настаўніцай. Першы недавер да «жабоцькі» ў бацькоў вучняў хутка зьнік і замяніўся пашанай яе.

Часта цяпер бачыўся з Дуняй Янук. Скупавата было часу на паэзію, але юнацкая любоў трывала й мацнела. Вёска даўно абжылася з тым, што два новасьпечаных інтэлігенты трымаліся разам. Навет рыжавусы Захарук, кагадзе сустрэўшы Янука, ня вытрымаў:

- Іш ты, які зь цябе дзяцюк, як за Макатунішкай бегаеш! А ці забыўся ты, як некалі камшыў яе, га?

Тыя часы даўно-даўненька ў нябыт адыйшлі. Як ніхто іншы зь юнакоў у вёсцы, Янук дасьпяваў вельмі хутка. Падарожжа ў Менск, навука й нялёгкае жыцьцё ў далёкім горадзе далі яму куды шырэйшую практыку, расшырылі гарызонт розуму. Пэўне-ж, нейкі там доктараў Сатась, ці Ўладзік, ці кавалёў Лёнька яму цяпер раўнёй ня былі. Асабліва пасьля настаўніцкіх курсаў і Вільні ніхто ня сумляваўся, што Янук Бахмач ужо «ў людзі» пайшоў. Задаволены такой сваей новай пазыцыяй у вёсцы, дзе яшчэ некаторыя называлі яго паэтам, Янук спадазяваўся спакойна пражыць і плённа папрацаваць аж да першага школьнага дня. Але...

Навала нахлынула раніцай. Гул пачуўся здалёку, ужо як чыгунку бальшаком пераяжджалі. Людзі ў зялёным, шмат наладаваных розным дабром хурманак, коньнікі, пешыя. Час ад часу стрэлы ўверх, ці не для пастраху. Ці гэта ўжо на раньні каторыя панапіваліся, або стралялі здуру. На некаторых вазох сядзелі «трафейныя» дзяўчаты. Зброя

пераважна лёгкая, відаць былі й кулямёты. Шматлікія ваякі паабчэплівaліся нямецкімі гранатамі «балдавешкамі». Даўгая, здавалася, бясконцая калёна нечым нагадвала цыганскі абоз. Нехта жартам празваў іх цыганскім войскам.

Завіталі... Не, хіба гэта неадпаведнае слова. Уварваліся ў Літоўцы з бальшака й пакуль сяляне вымяркавалі хто, што й чаго, навала пачала распаўзацца па хатах, сьвіранах, хлявох. Чуліся крыкі, лаянка, страляніна. Людзі ў зялёным гаварылі парасейску і адразу пачалі шукаць нажывы. Відаць, што мелі ў гэтым набітыя рукі, бо ведалі ў якія куткі заглядаць. Ламалі дзьверы, страляньнем нішчылі замкі. Вёска ці раз ужо рабавалася бальшавіцкімі бандамі, рук тут надта не пагрэеш. Нойбольшы быў спрос на самагонку. Кмітаваму Тодару давялося расстацца із сваім запасам. Не памаглі ягоныя праклёны й Аўдоліны заклінаньні. Другім ходкім таварам аказаліся коні й сяляне, хутка спанатрыўшы, хавалі іх у лесе.

Антось Дзяркач загадаў Ніне мігам завесьці каня ў балота, туды на Марылін горб, а сам, што лепшае, як сала, хлеб, мяса, яйкі й масла схаваў у сваю нару, якую апошнім часам ладна пашырыў і ўмацаваў. Ён-жа наказаў і бацьком, каб пахавалі харчы. Такім чынам, калі тры «цыганы» прыйшлі да яго на двор, Антось стараўся спатоліць заядлага Ромку. Згорбіўшыся, казырок на лоб, сядзеў на прызьбе й гладзіў сабаку.

- Хадзяін дома? - спытаўся старэйшы, з двумя паскамі на пагонах.

- Я хазяін, - спакойна, прыглядаючыся яму, адказаў Антось.

- Лошадзь імееш?

- Німа.

- Как то на хадзяйстве і лошадзі ня імееш?

- Учора парцізаны забралі.

- Ані зьдзесь былі?

- Ага, былі. Паласаваліся.

«Ваяка» стаяў на нагах няроўна, але трымаўся зухавата. З кішэні портак тарчэла ручка нагана. Ягоныя сябры наперавес трымалі савецкія стрэльбы.

- Что значыт паласаваліся?

- Значыць усю вёску абабралі.

«Ваякі» пераглянуліся.

- А водку імееш? - пытаўся старэйшы.

- Ды не, німа. Адкуль яе мець, тую водку.

- Будзем іскаць.

- Шукайце.

Аббегалі хату сьвіран, кладоўку й нідзе не палакаміліся нічым.

- А ты пачаму ні ў парцізанах? - спытаўся зноў старэйшы Антося.

- А чаму мне там быць? Вы-ж зь імі ваюеце?

- Ну эта наша дзела.

Ромак вурчэў. Антось стрымліваў сабаку. Адно адшпілі яму зашчапку ад скуранага каўняра, адразу кінецца на чалавека, саб'е яго з ног. Пры помачы Ромка мог-бы Антось із трымя справіцца, але што будзе, калі іншыя налятуць? Лепш не.

Бацька загадаў Януку ўцякаць із кабылай у ліпавіцкі лес.

- Не марудзь, жыва!

- А нашага здыхляка таксама забіраць?

- Якому чорту ён трэба? Жыва, уцякай!

Янука не давялося спанукаць. «Здыхляком» называлі недалужнага каня, якога зацяганая й зьняможаная кабыла перадчасна прывяла на сьвет незадоўга пасьля вывазу лесу «па трыццаць кубаметраў ад лошадзі». Конь і еў неахвотна, рос худы, ледзь валюхаўся з нагі на нагу. Калі хто стараўся падганяць яго да працы, пазіраў на яго крыўднымі вачмі. І запраўды жаль яго, недалужнага, было.

Янук з кабылай прабыў у калішнім панскім ляску, на самым краю яго, можа пару гадзінаў, назіраючы што ў вёсцы робіцца. Гэтак, як ён, апынуўся тут і Стась доктараў із бацькавым канём. Стась малоў усякую нясуладзіцу, якую Януку надакучыла слухаць. Таксама тут-жа, у ліку некаторых іншых гаспадароў, апынуўся й сам солтыс Паўлоўскі з канём. Лясок гэты ляжаў з боку вёскі супрацьлеглага ад бальшаку, таму людзі мелі час уцячы сюды з коньмі.

Калі Янук вярнуўся дадому, задаволена зірнуў на бацьку, але адразу вымяркаваў, што нешта дрэннае сталася.

- Што такое, тата?

Бацька адказаў не адразу. У яго дрыжэла ніжняя вусьніна.

- Ты-ж падумай, сынок, што за зладзюгі! Забралі здыхляка й Міколу. Ну й навошта ім два калекі?

- Із возам?

- Няўжо-ж...

- Дык што на воз нагрузілі?

- Ды ніхай іх трасца, ніхай яны тым падавяцца. Нагрузілі што награбілі.

- Людзі, мусіць, коні пахавалі, дык нашага, нядошлага, забралі.

- Алі што зь іх, з двух калекаў.

- Ні пацягніць, дык прыстрэляць. А куды яны паехалі?

- У Гаравацкую пушчу. Няўжо-ж яны на гэтых бандытаў?

На падходах да Докшыцаў, у лясной паласе, што была пад кантроляй «начных уладаў», якія гэтта панавалі і ўдзень, адбылося злучэньне «цыганоў» Гіль-Радыёнава з бальшавіцкімі бандамі Жалязьняка. І наступнага дня раніцай яны заатакавалі Докшыцы. Калі выразіцца дакладней, гэта ня была ніякая атака, а паглынаньне малога й слаба ўмацаванага раённага мястэчка вялікімі масамі зьдзічэлых людзей, што нарэшце набраліся адвагі, каб вырвацца зь лесу. Докшыцкі гарнізон паліцыі й Немцаў доўга ня вытрымаў ціску навалы й мала каму зь іх пашанцавала выратавацца. У гэны дзень пачынаючы ад старшыні раёну Пархвяновіча й школьнага інспэктара Ворана, загінула ўся беларуская адміністрацыя. Зьдзічэлая «армія», пасьля ліквідацыі ўраднікаў, налётам рабавала ўсіх мясцовых жыхароў. Хто супраціўляўся, таму прыпісвалася супрацоўніцтва з фашыстамі. Тут-жа й кара.

Пасьля захопу Докшыцаў, гэтае «гэройскае» войска накіравалася ў Гаці. Падарозе нагала абчысьцілі колькі вёсак, моладзь забіралі «на службу», зь якой бальшыні ня было паваротнага шляху. Гэтым разам нешчасьлівыя сяляне, што крыху абжыліся пад нямецкай акупацыяй, ня ведалі куды хаваць хатні статак ці якое іншае дабро, куды самім ад гэтае навалы скрыцца. У лес не ўцячэш: там-жа яны, а ў горад, ведама, ня пойдзеш.

На Гаці напалі раніцай каля гадзіны дзявятае, ад вёскі Бабічы, што прылягала да мястэчка з паўдня па дарозе з Докшыц. Гэнае раніцы Янук Бахмач араў папар. Калі пачуліся стрэлы й шугануў дым зь першага пажару, ён спыніў кабылу, абапёрся на поручні плуга. Зьдзіўлены, прыглядаўся пажару й чуў страляньне, ня ведаючы як гэта вытлумачыць. Думка прыйшла сама сабой: ці ня тыя зь лесу спрабавалі свае мускулы. А зь імі, пэўне, і гэтыя «цыганы», што кагадзе Літоўцы абчысьцілі. І адразу-ж згадаў брата Міколу. Дзесьці між тае масы «цыганоў», напэўна галодны, зьняможаны, брат Мікола й

недалужны конь. Два калекі. Што зрабіў-бы ён, Янук, апынуўшыся разам з гэтай бандай на бальшавіцкім баку? Цяжка сказаць.

Страляніна мацнела, цяпер чуваць было й цяжэйшыя выбухі. І тады, зьбянтэжаны гэтай нечаканай вайной, Янук зірнуў на вёску. Людзі беглі на Гараватку, бо адтуль можна было бачыць некаторыя аб'екты станцыі. Стараючыся адагнаць аваднёў, кабыла заядла махала хвастом, тэпала ў гужох, павярнула налева галаву й быццам зьдзіўлена пазірала на юнака пры ручках плуга. А Янук назіраў, што рабілася на літоўскім полі. Некаторыя людзі, перапалохаўшыся, беглі ў вёску, гналі з сабой статак. А страляніна ўзрастала. Над станцыяй ужо ў многіх мясцох клубіўся чорна-блакітны дым. Прыпякала сонца й лёгкі вецер нахілам нёс дым у паўночны бок. Крыху падумаўшы, Янук выпраг кабылу, асядлаў яе, спацелую, і трушком паехаў дахаты. Пры весьнічках сустрэў яго бацька.

- Сынок, напаі кабылу, завядзі й прывяжы яе каля пуні. Хто ведаіць, што будзіць. Можа трэба й карову забраць з загарадкі, чорт іх ведаіць... Я сам пайду...

На Гараватцы Янук пабачыў шмат людзей. Дуня адразу падыйшла да яго.

- Што ты думаеш, Янучок? Здаецца, вайна?

- А чорт іх ведаіць. Мусіць гэтая басота зь лясоў. а зь імі, можа, тое цыганскае войска.

- Каторае? Што тут у нас было?

- Якое-ж яшчо...

І, памаўчаўшы, Янук дадаў.

- Недзе-ж тамака зь імі й наш Мікола.

- Дык ты думаеш, што гэтыя да бандаў пайшлі?

- Ну а куды-ж? Адна басота. Ваўка як ні кармі, ён у лес глядзіць.

- А што гэта будзіць, як гэтыя Гаці забяруць і да нас прыйдуць?

Гэткае голасна сказаў солтыс Паўлоўскі. Ніхто яму не адказаў. Ведалі, што калі раней бальшавіцкія банды вёску рабаваць прыходзілі, солтысу неяк заўсёды шанцавала скрыцца. Ніхто ня ведаў, як гэта яму ўдавалася. А справа зусім простая. Пад хатай Паўлоўскі меў досыць абшырны склеп, зь якога праз спэцыяльны выхад, раней дароблены, - нешта падобнае, як у Антося Дзеркача, - ён мог выпаўзьці, нікім незаўважаны, на двор і перачакаць. Аднойчы «ваякі» зь «вялікай

айчыннай» спрабавалі даведацца ў жонкі, дзе мясцовы начальнік, білі яе, але старая ня выявіла мужавай тайніцы.

Солтысава пытаньне нарадзіла шмат у каго трывогу. І запраўды, калі Гаці заберуць, чаму-ж ім у Літоўцы, гэтта зусім пад бокам, не заглянуць? Хто-ж іх спыніць? Тымчасам рэха бою ўзмацнялася. Маўклівыя сяляне прыглядаліся дымам пажараў. Аксенінага Арсеня падсадзілі на Архіпа. Добры назіральнік, ён зьверху крычаў:

- Школа гарыць, вялікая школа гарыць!

І яшчэ крышку пачакаўшы, калі чорны дым густымі клубамі паказаўся непадалёк, з правага боку.

- Мусіць паравознае дэпо, яй-Богу яно!

Калі гарэла тая вялікая школа, у якую некалі хадзіў Янук, што стаяла зарз пры Бабічох, дык калі полымя ўзялося ўжо за чыгуначную майстроўню, дык, відаць, напасьнікі пасоўваліся наперад.

- А што, калі яны й да станцыі дабяруцца?

- Дык тады лічы, што мястэчка ў іхных руках.

Чыгуначная станцыя ляжала ў цэнтры мястэчка. Перш, чым дайсьці да яе, трэба было здабыць галоўную пазыцыю - паліцыйную станцыю і тут-жа побач баракі нямецкае жандармэрыі. Апроч таго, як заўсёды, праездам на чыгунцы было нейкае войска. Цяпер чуваць былі частыя чэргі з аўтаматычнае зброі і гулкія выбухі.

- Гэта, відаць, гарматы, - сказаў Уладзімер Пятух.

- Не, мінамёты, - адказаў Антось Дзяркач.

- А як пазнаеш?

- Калі ня чуў, ці ня відзіў, дык і ні пазнаеш.

У паветры пачуўся сьвіст куляў. Хто мог сюды страляць? Ці хто зь лесу, або з дарогі? Людзі ўстрывожыліся. Нікога нідзе ня відаць. Калі-б гацкаму гарнізону мела надыйсьці помач, дык хіба з другога боку, адтуль з Глыбокага. І запраўды, ужо далёка за поўдзень з Глыбокага пасьпяшылі панцырныя машыны. Дзякуючы ім ды сьвежаму войску цэнтр акцыі ў Гацях пачаў паступова аддаляцца ў той бок, адкуль пачаўся, значыцца ў раён Бабічоў. Над вечар бой скончыўся, людзі ўзяліся гасіць пажары.

Назаўтра раніцай некаторыя літоўскія, у іх ліку Янук і Антось, пасьпяшылі ў мястэчка. Па вуліцах ляжалі пабітыя коні, трупы людзей. Антось і Янук ішлі памалу, разглядаліся. Воддаль пабачылі групу

людзей, што пад наглядам Немцаў сьцягвалі хлам. У паветры яшчэ стаяў смурод гару, паленага мяса.

- Глядзі, каб нас да такой работы ні забралі, - перасьцярог Антося Янук.

- Ты праўду кажаш, - згадзіўся Антось. - Давай лепі ля гародаў пойдзім.

- А куды гэта?

- Да Падгайскага.

Здавалася, што Антось добра ведаў усе сьцежкі паўз агароды. Наўмысна пайшлі з паўночнага боку, бо калі-б стаялі вайсковыя нагляды, дык хіба-ж з паўдня. Адсюль відаць былі абгарэлыя сьцены чыгуначнае майстроўні, а за ёй у вадлегласьці тарчэлі два коміны й сьцены калішняе школы. У тым раёне згарэла некалькі хатаў. Найбольшы рух адбываўся на чыгунцы, патрэбнай для забясьпечаньня галоўнага ўсходняга фронту. Спаленыя вагоны сьцягвалі на бочныя шляхі. Гоман, стук лязгат. Перад сьветафорамі нецярпліва пыхцелі цягнікі.

Падгайскага ў дварэ знайшлі. Ён гаварыў да дзядзькі з запрэжанай каляскай, на якой сядзела жанчына й стаялі кошыкі.

- Едзьце на памідоры й пачынайце зьбіраць ад чыгункі. Тамака вышэй дык сьпялейшыя. А чаму Юхневічаў няма?

- Казаў, што із бабай посьля прыйдзіць. Учорака бандзіты чаго швагру ні закатавалі, дык ён у яго...

Падгайскі пабачыў літоўскіх. Змораны аграномаў твар распрамяніўся і ён хутка сказаў селяніну: - Ну дык едзьце.

- Антось, Янук, як я рад вас відзіць.

Прывіталіся, мацней чым звычайна, сьціскаючы рукі.

- Добра, што прыйшлі, хоць і час ня той, знаіця... Прысядзьце.

Селі на лаўцы пад кустамі бэзу.

- Дык апавядай, - сказаў Антось.

- Быў у мястэчку, ці полем ішоў? - спытаў Падгайскі.

- Быў і ня быў, ішлі ля агародаў, - адказаў Антось.

- Дык вось, як я мяркую, хацелася бандытам узяць вакзал, але заміж, каб проста ўдарыць па ім з другога боку чыгункі, дык яны прыйшлі гэтта праз Бабічы, разьбілі школу, пасьял дэпо й на паліцыю напалі. Я чуў ужо ад свайго чалавека, што тамака многа паліцыі пабілі. І знаеш, нямнога ім аставалася, каб на вакзал прарвацца і цалкам

станцыю зьнішчыць. Але-ж, ведаеш, як мне расказвалі, ідуць кучай, многа зь іх п'яных. Дык Немцы зайшлі ім з двух бакоў ды як упсяюрылі зь мінамётаў, от-жа налажылі іх, як гною. Усіроўна, мусіць, занялі-б яны тут і станцыю ўсю й вакзал, надта-ж многа іх было, проста цьма-цьмушчая... Але-ж з Глыбокага падасьпелі панцыры ізь сьвежым войскам, ды яшчо праездам стаяў гэтта эшалон гарматаў і танкаў, дык і тыя мяса налажылі.

Падгайскі спыніўся пасьля на разных цікавых дэталях.

- Дык гэта гэныя цыгане, як іх у нас называлі, ці радыёнаўцы з бальшавікамі злучыліся? - спытаўся Антось.

- Ага, злучыліся. Яны-ж пазаўчорака Докшыцы забралі й нашых усіх там перабілі.

- І нашага Міколу з канём забралі.

- Міколу й Захарука, - паправіў Антось. - Я дык дзіўлюся, як Захарук папаўся. Праўда, ён зараз каля бальшака, дык, мусіць, ня меў часу ўцячы. Ну а дзе ты быў у часе бою?

- Каля дому, - адказаў аграном. - Ведаеш, я-ж тут на водшыбе. Праўда, думаў, што вось-вось налятуць, ажно не. Відзіў, як Немцы акапаліся з кулямётам на маей мяжы, каб падыход адрэзаць...

- А Докшыцы яшчо ў іхных руках?

- Чуў, што ўчора іх адтуль выбілі. Праўда, там нашых усіх, значыцца з нашых управаў, перабілі.

Гаварылі спакойна, бязь ніякага паднечаньня ці зьдзіўленьня.

- Слухай, Антось, я цяперака ўжо сёе-тое думаў. Самааховы тутака нам ніяк ня ўдасца сарганізаваць, сам знаіш. Німа сваіх афіцэраў. А от цяперака паліцыю пераняць у свае рукі можна. Іх многа выбілі. Кумекаіш?

- Ты, мусіць, тое думаеш, што і я думаю.

- Ага.

- А як Левандоўскі? Уцалеў?

- Ніякі чорт яго ні ўзяў.

- А калі яны будуць людзей набіраць?

- Ды хоць і зараз. Начальнік быў сягоньніка раніцай у мяне й казаў, значыцца пытаўся, ці магу каго пасуліць яму...

- От як, - дзівіўся Антось.

- Падумай, ды не марудзь. Найболі пару дней. Я яму параю сваіх людзей. Хачу, каб і ты там быў.

- Буду. Але яшчо зь Нінай пагавару.

Аграном сьпяшыўся. Антосль і Янук хутка разьвіталіся зь ім.Назад ішлі ўжо вуліцай і дакладней прыглядаліся сьлядом учарашняга бою.

На трэці дзень вярнуўся дамоў Мікола. Без каня. У хату прынёс вялікую радасьць. Зморaны, галодны, ён сьпярша пад'еў, а тады цэлы вечар апавядаў пра свае прыгоды, як «цыганскае войска» злучылася з бальшавікамі, ды як падчас наступленьня апынуўся ён у хвасьце «баявой» арміі. Як Немцы пачалі націскаць, а «цыгане» й «тая брыда» завярнулі ў лес, удалося яму зноў застацца ў хвасьце. Каня застрэлілі. За дзень прыкульгаў дадому. Захарук вярнуўся дадому назаўтра, таксама без каня. Апавядаў, што зацягнулі яго далей у пушчу, але, ведаючы, што з возам уцячы ня ўдасца, пакінуў каня й сам абхітрыў «начныя ўлады».

Які тыдзень ці два пасьля баёў у Докшыцах і Гацях, у Глыбокае наехалі спэцыяльна вышкаленыя для забіваньня безбаронных людзей латыскія адзьдзелы. На працягу двух дзён яны ліквідавалі ўсё насельніцтва жыдоўскага «гетто». Жыды спрабавалі адбівацца зброяй і тады латышы пачалі іх выпальваць. Гэткім чынам выгарэў вялікі кут гораду побач Віленскай вуліцы на захад ад галўнага рынку. Жыдоўскае пытаньне ў Глыбокім было «канчаткова разьвязана».

30

Swiatu krętactwo się dzisiaj śni
gdzie tyzlko spojrzysz wkrąg,
i jesteś sam i smutno ci,
życie twe drży od mąk.

Hej w gorę szklanice,
niech szybko płynie czas,
nigdy, przenigdy
nie zgniębią nas!

Песьня прылятала дзесьці зь левага боку, з трэцяй ці чацьвертай камэры. У маладым мужчынскім тэнары - зьнямога й разам сквапнасьць нязьведанага, бадзёрасьць і сумлевы. І песьні гэнай, і тэнару таму цесна ў менскай вязьніцы таксама, як цесна там і Януку. Усё ягонае цяперашняе навакольле - чатыры, некалі зялёныя, а цяпер шэрыя, запэцканыя сьцены камэры й круглы «ваўчок» у дзьвярох. А з другога боку. пад самай стольлю, пядзя неба праз краты.

Зьняможаны, - так хацелася піць! - сядзеў у камэры сам, на чужых нарах журыўся. Усе пайшлі на працу, пад канвоем, дзесьці ў нейкіх менскіх развалінах падбіраюць хлам. А ён, Янук, яшчэ да суду павінен у камэры сядзець. Пасьля мо й яго на працу пусьцяць.

Дзесьці на змроку, з бойкім голасам, у ліку іншых, прыйдзе з працы пензенскі злодзей Мішкін, ён-жа камэры гаспадар. Яго ўлада. Спрабуй, не паслухай. Ля яго аціраецца мянчанін, пабіты воспай твар, чырвоны п'яніцы нос, Кабылкін. Ён вечна ў той чырвоны нос нешта гугнявіць. І яшчэ прыйдзе некалькі людзей, а можа навет і хто з «новабранцаў» зьявіцца. На нарах даволі месца для чатырох, а рэшта на халоднай цэмантовай падлозе сьпіць. Найнавейшыя пачынаюць ад парогу, ад гадкай сьмярдзючай парашы, каторую ачышчаюць раз на дзень.

Праўда, ніхто не пачынае ад парашы два разы, а Янукова пачынаньне даўно мінула. Першую ноч прачнуўся, як у камэры, перапоўненай да адказу, нехта ня трапіў у мэты й яго абмачыў. Цемра. Юнак вылаяўся, стукнуў чалавека ў балючае. У вадказ - праклёны Мішкіна, адтуль, зь верхніх нараў, дзе ён побач сваіх падачак спачываў. Трохпавярховы мат і пагроза: - Не перастанеш, сукін сын, так я тебе сейчас носом!

Hej w gorę szklanice,
Niech szybko płynie czas...

Голас Паляка крыху аціх. Цікава, што за чалавек. Пэўне-ж за нейкую палітыку, а можа за спэкуляцыю сядзіць. Скарэй за апошняе. Іх, гэтых спэкулянтаў-анткаў на шляху Вільня-Менск маса. Зь імі й Бахмач сюды трапіў. Мусіць і яго за спэкулянта палічылі, хоць яны й ня пыталіся.

У канцы лістапада Лявон і Янук, падарозе зь Вільні дамоў, каб прывезьці харчоў, наважылі ў Менск заехацца. Нельга сказаць, каб Менск падарозе ляжаў, але юнаком, зь іх прыгодніцкай натурай, як-жа яго абмінуць. Да гэнага часу Загорны ніколі ў сталіцы ня быў і, наслухаўшыся пра яе ад Бахмача, загарэўся ахвотай.

Цягніком ехалі «на зайца». У Вільні проста амаль немагчыма было дастаць дазвол на праезд чыгункай ад мясцовага нямецкага камісара. Злажы заяву, пачакай два ці тры месяцы й пасьля таго яшчэ на двое бабка варажыла. Спэкулянты падкуплівалі ўраднікаў за грошы й прадукты, а бедныя студэнты мусілі галадаць. Ехаць «зайцамі» небясьпечна. Нямецкія кандуктары, часта пры помачы жандармаў, праводзілі дакладную кантролю пасажыраў з таварных вагонаў, бо ўсе асабовыя вагоны займала войска.

Маладосьць і рызыка, - між імі трэба было-б знак роўнасьці паставіць. Паколькі ў нашых гэрояў хапала аднае і было ўволю другога, у канцы лістапада, далёка ўбок ад свае радзімы, яны ў Менск заехаліся. Прыехалі раніцай, найперш зайшліся да Ніны Рашкевічыхі на Камароўцы, заглянулі ў рэдакцыю беларускіх газэтаў, дзе Янук атрымаў сьціплы ганарар за свае вершы й карэспандэнцыю зь Вільні. Пасьля аблазілі й авгледзілі цэнтар гораду, зазірнулі на Чэрвеньскі рынак, зайшліся ў рэстаран, дзе наеліся смачнай капусты й бульбяных аладак з лоем.

Як на дзіва, вечар быў цёплы й ціхі, шамацела яшчэ пад нагамі лісьце ля калішняга ўнівэрсытэцкага гарадка й не спраўляў хаўтураў між руінаў вецер. Хлопцы былі ў добрым настроі, жартавалі воддаль ад вакзалу ля «таварняка» із спэкулянтаў, якія, абладаваўшыся рознымі валізамі, мяхамі й іншымі кошыкамі, ужо сплываліся сюды на падарожжа ў Вільню. Да адходу цягніка заставалася даволі часу. Руіны гораду расплываліся ў змроку, ніхто сьвятла не паліў, адно гучным жыцьцём кішэла войска ля сваіх «нур фюр дойчэ» кухняў і цягнікоў. Анткі, збыські й іншыя малгосі, быццам куры на курасадню, усаджваліся ў таварныя вагоны, дзяліліся апошнімі навінамі пераклікаліся розныя знаёмыя. Сярод іх юнакі чуліся быццам дома. Як-ніяк, гэта была гамонка («гвара») так добра ім ведамага віленскага рынку.

Янук, як пасьля шмат каму расказваў, улез аж дзесьці ў сярэдзіну вагону й толька пачаў разглядацца, дзе падзеўся сябра, як сталася

нешта нязвычайнае. Пачуліся крыкі і з двух бакоў вагонаў зьявіліся зялёныя мундзіры. Янук намагаўся клікнуць сябру, але той ужо недзе зьнік. Неўзабаве вайскоўцы сілай пачалі выкідаць людзей з вагонаў і зусім іхным багажом, ставілі іх ў калёну, абкружылі канвоем і загадалі йсьці. Янука быццам маланка сьцебанула. Арыштавалі!

Побач чыкільгалі анткі й малгосі, праклінаючы пад нос, валачылі цяжкі багаж, якога заўтра раніцай чакалі на віленскім рынку людзі. Адно Янук трымаў рукі ў кішэнях і прыглядаўся мурлатым людзям у зялёным. Усе яны шырокаплечыя, як-бы хто на адну мерку іх выбраў. На рукавох Бахмач спасьцярог чырвона-бела-чырвоныя шчыткі. «Латышы, каб вы пагарэлі. Поскудзь. Пэўне-ж зь мясцовага СД». Маладому юнаку давялося ўжо бачыць розных акупантаў і паразітаў, а такіх вось сустрэў упяршыню. Што гэта за народ? Калі ён быў, адкуль узяўся? Казалі людзі ў Літоўцах, што гэта яны вымардавалі ўсіх Жыдоў у глыбоцкім «гетто». І прыгадалася іншае. Зь іншага часу й тэрыторыі: латыскія стралкі на стражы кастрычніцкай рэвалюцыі. Калі зьняможаныя вязьні з турмы народаў ськінулі ярмо, пачалі на ногі станавіцца, свае нацыянальныя дэмакратычныя дзяржавы будаваць, бацькі во гэтых мурлачоў узялі зброю, каб стануць на старожы ленінскае брыды-пачвары, што тады ледзь пры жыцьці ў пялёнках ліпела. Гэтыя нелюдзі памаглі пачвары ўздужэць, клыкі выгадаваць, каб пасьля міліёны нявінных спажываць магла.

Янук ня скончыў яшчэ сваіх разважаньняў на латыскую тэму, а ў галаве стаяў Лявон. Дзе-ж ён падзеўся? Можа дзе йдзе з боку, прыглядаецца куды вядуць іх. Калёна, чалавек больш сотні, затрымалася перад высокім зялёным плотам, адчынілася недзе сьпераду брама й людзі ўвайшлі ў абшырны двор, які з трох бакоў замыкаў грозны ў цемры, двухпавярховы будынак. Краты ў вокнах. Вязьніца!

Час першай сустрэчы зь вязьніцай заўсёды пасьля згадваўся Януку з дрыготкай жаху. Холадам праймала. Да гэнага часу пра вязьніцы чыталася нешта ў літаратуры, іх бачылася ў кіно, пра іх чулася ў апавяданьнях старых людзей, пра іх сьпявалася ў тужлівых, на тэму «дайце мне волю й сонца» песьнях. Ведалася, што людзі пры ўладзе трымалі за кратамі тых праціўнікаў, якія іхнай уладзе не хацелі падпарадкоўвацца з палітычных ці грамадзкіх мяркаваньняў. І яшчэ здавалася, што за кратамі сядзелі людзі дрэнныя, пэўне-ж вінаватыя,

што кары нейкае заслужылі. Янук ніколі ня мог уявіць, што гэтая страшная будыніна стане ўпоперак ягонай, Бахмачовай, дарогі, што паглыне ў сваё цёмнае й сьмярдзючае нутро яго, наіўнага й нявіннага юнака.

Першы раз вязьнічныя дзьверы зачыняюцца за табой зь нейкай жахлівай фінальнасьцю. Нешта зрываецца з упарадкаванага пульсу твайго нутра. Глухі скрыгат завесаў ці ўдар дзьвярэй адразае цябе ад дарагога, незаменнага вольнага сьвету, дзе як-ніяк ты сам сабой загадваў. Апынуўся ты ў дзіўным, цесным, што цябе душыць, затхлым, брудным лябірыньце. Там нехта, табе зусім недаступны, камплетна табой валодае, сочыць кажны твой рух, кажны крок. Спачатку вобмацкам і наўгад пачынаеш усьведамляць новую існасьць. У гэтым, табе новым, для цябе нярэальным сьвеце ты ёсьць абсалютнай нікчэмнасьцю, макулінкай пылу, якую можа дзьмухнуць, падхапіць і панесьці ў нябыт які хочаш вецер. Усьведамленьне свае нікчэмнасьці тым больш усёпаглынаючае і ўсёзьнішчальнае, калі ўявіш сваю поўную бясьсільнасьць навет перад гэтым вартавым, што сочыць за табой як пастух за статкам вунь праз гэнае «воўчае вока», або й перад тым вунь мурлом, што налівае табе ў бляшанку баланду. Папрасі ў яго больш, дык палонікам па лбе атрымаеш. Усьведамленьне нікчэмнасьці ўзмацняе й веданьне таго, што ўсе духоўна-маральныя вартасьці, на якіх ты ўзгадовываўся ад малога, у гэтым будынку ня маюць ніякіх правоў грамадзянства, значэньня, зусім ня існуюць. Слабасьць вядзе да роспачы, а тая родзіць сумлевы, што ў чалавечай душы побач дрэннага існуе й добрае.

Усьведамленьне нявіннасьці нараджае пратэст. Калі-б Янук думаў рацыянальнымі катэгорыямі, хутка прыйшоў-бы да выснаву, што паланеньне яго зьявілася зьбегам розных непрадугледжаных абставінаў. Вайна й хаос, ці навет, калі хочаце, панаваньне безагляднай сілы, ствараюць дасканалыя для гэтага перадумовы. Спэкулянты, каторых пару вагонаў на нейкі загад забралі й пагналі ў вязьніцу, таксама пэўне-ж былі няміла зьдзіўленыя такой выпадковасьцю. Як-ніяк, пропускі каштавалі ім. За гэны кошт яны, мусіць, спадзяваліся мінімальнай бясьпекі. Але з гэнымі ўладамі, наверсе, што абсалютную сілу маюць, цацкацца нельга. Ім вось уздумалася, зь нейкай прычыны, узяць усіх збыскаў, анткаў і малгосяў ды завалачы ў вязьніцу й бясьсільнымі аказаліся тыя чыгуначныя «райзэшайны». Дарма, што да

гэтага часу знаў ты чыгуначную ўладу, грэў рукі кандуктару. У абдымках гэтай маленькай, капрызнай хвалі апынуўся й зусім нявінны юнак зь Літоўцаў. А Лявону, каторы, відаць, спасьцярог Латышоў, як прыбліжаліся ды мо й ня мог сябру перасьцерагчы, удалося ўцячы.

Пратэстуе запертая ў клетку птушка. У яе, як вядома, птушыны, значыцца ніякі розум. Яна б'ецца крыльлямі аб сьцены, ці вокны, часта на сьмерць забіваецца. Чалавек накшы. Ён разважае. І пратэст яго можа быць больш ёмкі, калі розум падказвае, што цябе вязьняць бязь ніякае прычыны.

Сьцьвердзіўшы сваю нявіннасьць, Янук узяўся пісаць просьбы вязьнічным уладам, каб яго звольнілі, што ён, відаць, трапіў сюды праз памылку. Пісаў, калі паперы мог ад вартавых атрымаць, панямецку, муштраваў свае мазгі, рацыянальна тлумачыў выпадак, дзякуючы якому тут апынуўся. Лісты ці просьбы гэтыя аддаваў вязьнічным сторажам, якія звычайна абяцалі перадаць іх начальству вязьніцы. Ці перадавалі, ці не, невядома, але Янук ніколі ніякіх адказаў на іх не атрымліваў. І тады паўтараўся цэлы працэс. Янук пачынаў пісаць новую просьбу. Яму адно сказалі, што каб сядзеў да суду, а калі суд адбудзецца то яму скажаць за што ён сядзіць і колькі тэрміну зьняволеньня мае. Адылі ніхто не сказаў яму як мае адбывацца суд. Гэта значыцца вязьні махалі рукамі й гаварылі, што ніколі нікога на суд ня выклікаюць, што калі й запраўды такі ёсьць, дык ён, мусіць, тайны. Януку раілі сядзець спакойна й чакаць свае долі, якая-б яна ня была-б.

І Янук сядзеў, біў вошы, якіх тут, відаць, завяліся міліёны. Прасядзеўшы ўжо амаль месяц, хлапец вельмі зьдзівіўся, што не атрымаў ніякіх вестак ад свае радні й сябраў звонку. Ці-ж нельга было якім чынам якую вестку пераслаць? А гэты новы вязьнічны сьвет быў настолькі для яго таёмны, што каб даведацца дзе й што робіцца ды як робіцца, ня ведаў-бы каго пра гэта спытацца. Вартавыя зь вязьнямі не гаварылі, на ніякія пытаньні не адказвалі. Да каго зьвернешся?

Памяталася, калі адно яго пасадзілі, Янук адразу заявіў, што гэта, пэўне, нейкая памылка, што вось тут адразу, ледзь не ў наступную хвіліну, разгледзяць яго справу й абавязкова выпусьцяць. Прысутныя ў камэры, - было гэта вечарам упацёмку; навокал цябе маса твараў, цела й смуроду, - голасна разрагаталіся.

- Ты что, западнічок, верно? - пачуўся голас зь верхняе нары.

- Як гэта?

- Ну да ты із западнай?

- Ага.

- Відно ты зелененькій... Сколько цебе лет?

- Васемнаццаць. А чаму?

- Да, відно. От сматры, сейчас раскроецца дзьвер і цебя выпусьцят. Га-га-га.

Дружны голасны рогат.

Лепш было-б, каб той Мішкін ці Кабылкін пакінулі цябе ў супакоі. Яны - прафэсыянальныя зладзеі, а можа й забойцы. Паслухай іхную гутарку, калі пачнуць мілую мінуўшчыну згадваць. Ці ня «ўсесаюзнага стажу» гэтыя зладзеі? Як вэтэраны войнаў, успамінамі свайго запраўднага ці ўяўнага гэройства зьняможаныя душонкі лашчаць, гэта яны апавядаюць пра свае «подзьвігі»: калі й як ды каго абакралі, якія, маўляў, зь іх спэцы, хто й каму ды калі горла перарэзаў. Пасьля перабіраюць ведамых прастытутак, якая зь іх і як... Аж млосна пабочнаму слухачу ад такіх апавяданьняў становіцца. Некаторыя «барышні» й цяпер ім «падачкі» валакуць. Такія людзі, як гэтыя два, у вязьніцы быццам у гатэлі жывуць. У іх і добры хлеб, і сала, і масла, і табакі ўволю, і гарэлка навет. Ёсьць у іх сувязі із такімі кабылкінымі й мішкінымі ў іншых камэрах. Вартавы, мясцовы менскі Беларус, што шэсьць чалавек на працу кажны дзень із стрэльбай водзіць, не баіцца, што Мішкін уцячэ. У іх паразуменьне. Вартавому-ж неяк жыць трэба. У яго, магчыма, ёсьць дзесьці жонка й дзеці, ці яшчэ хто, каторых карміць і апранаць трэба. А Мішкіна добра ягоная зладзейская сетка забясьпечвае. Там нешта й вартавому перападзе.

Каб даведацца нешта пра вязьніцу ці якія верхнія спрунжыны начальства, або суды, - разважаў Янук, - дык трэба было-б Мішкіна ці Кабылкіна пытацца. Але як ты да іх у давер улезеш, калі для іх ты - «шпана», ды каб яшчэ якая мясцовая, дык не, «западная». Чорт знае, што за шпана гэта, - ні рыба, ні мяса. Янук хутка спанатрыў, што між гэнымі зладзеямі «усесаюзнага значэньня» і іншай «шпаной» утварылася нябачная, але зусім рэальная сьцяна. У зладзеяў свае, Януку няведамыя нормы. І мова іх іншая, чым Янукова, і із звычайных людзкіх адносінаў яны кепікі робяць.

Вязьнічны сьвет цікавы, адно яго разглядаць умець трэба. Апроч антыграмадзкага элемэнту, колькі-ж прыпадковых людзей сюды трапляе! Вунь гэны дзядзька ў лапцёх і палатняным армяку - сеянін-

калгасьнік спад Заслаўя. Укінулі яго кагадзе і да адказу напханую камэру, а ён, ня гледзячы на свой паважны век, расплакаўся..

- Пайшоў я гэта ў лес, каб якога сучча наламаць, - казаў дрыжачым голасам, празь сьлёзы. - Чым-жа хату нагрэеш? А тутака, чорт вас ведае адкуль, каб вы галовы паскручвалі, паліцаі й Немцы наляцелі. Ну й да мяне: ты парцізан! Вы жартуеце, мусіць, кажу я ім. - Які зь мяне парцізан, я во прыйшоў сукоў якіх насеч, бо ў хаце мерзьнем. У мяне во толькі, кажу, тапор, прыйшоў якую сухастоіну сьсеч ці што. А яны, каб іх трасца, слухаць ня хочуць, мяне каленкам у зад дый пагналі. От вам і партызана знайшлі. Гы-гы-гы.

Вёска беларуская, простая й няхітрая, у менскую вязьнічную камэру заглянула. Пабачыўшы такую, нічым няпрыкрытую, наіўную шчырасьць, вязьні змоўклі.

- Так есьлі ты працізан, так прызнавайся, сукін сын, такую тваю! - раўнуў Мішкін.

Гэты дысананс у агульным настроі, калі людзі ў адзін момант спалучыліся пачуцьцём перад нейкай, хвалюючай іх зьявай, выклікаў дзёркую рэакцыю з кута:

- Змоўк-бы ты, басяк нензенскі! Ці ня відзіш, што дзядзьку нізашто ў турму ўпяклі?

Мішкін злосна зірнуў у кут, але нічога не сказаў.

Nigdy, przenigdy
nie zgniębią nas!

Голас бадзёрыўся. Цікава, ці гэтаму сьпеваку хто калі звонку памагае. Калі ён спэкулянт, дык яго напэўна забясьпечваюць сябры, а калі які палітычны, дык можа забярэ калі яго той зялёны грузавік, што кажную раніцу ў вязьнічны двор прыяжджае, набірае палітычных вязьняў і пад зброяй вязе некуды, адкуль ім павароту няма.

Нейкі тыдзень ці што пасьля арышту, апынуўся Янук, у ліку вялікай грамады людзей, у лазьні. У прасторнай, пустой, сьцюдзёнай залі з цамантовай падлогай, сабралі разам мужчын і жанчын ды загадалі распранацца. Ніколі раней у жыцьці ня бачыў Бахмач так шмат голых людзей у адным гурце. Стрыглі ўсім валосы, дый ня толькі на галовах. Згаладалы й слабы целам, Янук з поўнай абыякавасьцю разглядаў жаночыя постаці. Закрываліся, як маглі, маладыя дзяўчаты.

Магчыма між іх ёсьць «праступнікі» наводля таго дзядзькі спад Заслаўя, магчыма і іх «партызанамі» зрабілі...

Шэра й агідна! Жаночая постаць - краса, якую свайміпамазкамі ўвекавечнілі майстры «мадоннаў», якую абсьпявалі выдатныя мастакі слова, станула перад Януком, бяздушным Молахам сапхнутая на дно нядолі. Тое, што іншым натхненьне стагодзьдзямі прыносіла, Януку паказалі зганьбаванае й шэрае. Ці-ж гэта ня кара найбольшай меры? Некалі юнак спрабаваў свае крыльлі ў паэзіі. Мілы быў яму кажны, удала створаны вобраз жанчыны ці то ў Купалы, Коласа, Байрана ці Багдановіча. І наводля тых, удалымі майстрамі слова створаных вобразаў, юнак уяўляў сабе жанчыну ня толькі духова, але й фізычна. Пра фізычны выгляд такіх, як Дуня, думалася накш. Але-ж жах падумаць, што й тут, у гэтай празяблай «лазьні», магла быць тая самая, як ягоная, нечая Дуня.

Думкі й думкі, удзень і ўночы. Сьвету агідны твар! Ён, гэты сьвет, так раптоўна й нечакана павярнуўся да Янука сваім балючым, змораным тварам. Ад яго цяпер, а можа ніколі ўжо не ўцячэш. Моцна і ўчэпіста цябе ў сваіх абдымках трымае, на самае пакутлівае дно валачэ. Сьвет у якім навет Бога трохпавярховым матам лаюць, дзе канчаецца ўсялякая людзкая годнасьць, пашана, прызваітасьць.

Некалі ў савецкай школе давялося Януку наслухацца, як Якуба Коласа пасадзілі ў менскую вязьніцу за нейкую настаўніцкую нелягальную рэвалюцыйную акцыю. Гэтак бальшавікі цьвердзілі. Хто ведае, як там запраўды было. Ну але-ж сядзеў той Якуб Колас ці ня ў гэтай самай вязьніцы некалі. Можа й якія вершы выдумляў тут. Цікава, дзе і ў якой камэры... Янук спачатку трапіў у 83, а пасьля ў 102 і іншыя. Ну й што з таго, калі дзядзька Колас гэтта сядзеў, калі во навет у гэтай самай камэры ды ў гэтай самай пазыцыі, што й ты, Янук? І што табе, Янук, ад веданьня таго палягчае? Сьмешна!

У галаве два галасы спрэчку вялі. Адзін - дзіцячая, зялёная, вялікая наіўнасьць, пылка-імпэтны рамантызм, што ўва ўсім нечага нязвычайнага й важнага шукаў. Іншы - рашчараваньне, скептыцызм, народзіны цынізму. Гэты апошні - прадукт цяжкой і балючай жыцьцёвай рэальнасьці. Праўда, яшчэ празь яго часта прабівалася нотка аптымізму. Відаць, што гэты другі голас цяпер больш адпаведны, ён пазбаўляе небясьпечных для жыцьця ілюзіяў. Два галасы спрачаліся

й змагаліся, удужкі браліся. А галодны й аслабелы юнак на сьценах камэры, дзе вольнае месца было, «Жыве Беларусь!» пісаў.

Змаганьне за жыцьцё - гэта змаганьне за тое, каб Беларусь жыла. Кажнае ейнае дыханьне, кажны ўздрыг, кажны рытм пульсу ўлівае ў цябе сілу, бадзёрыць, да акцыі кліча. Яна - твая альфа і амэга, сьвятая сьвятых. Насамперш Бог, а пасьля яна, Матка. І ў брудных сьценах камэры лягчэй трываць, ведаючы, што навет у крывавых ваенных муках яна жыве, церпіць і змагаецца. І расьце. Думка пра Беларусь - гэта праменьчык сонца ў душы тваей, як вунь той, што праз гэнае маленькае, закратаванае ваконца ў вязьніцу загляне.

Ды не! Прамень сонца адтуль не загляне ў камэру. Каб вас чэрці! Акно тое-ж з паўночнага боку. Людзі, што плянавалі вязьніцу, забаранілі ў яе доступ сонцу. З паўдзённага боку, кажуць, суцэльная сьцяна. Чаго добрага, сонца думкі пра волю нарадзіць можа. І тады небясьпечна.

Не, не пакарыць вам ужо яе, гэтай новай, Януковай, Беларусі. Яе юнак сустракаў у вясковай школе, у Віленскай Беларускай Гімназіі, чуў яе ў дрыжачым сьвятаровым голасе на фэсьце Яна ў Гацях, распазнаў у дыдактычна-практычным голасе Антося Дзеркача і ў бацькоўска-сяброўскай гутарцы агранома Падгайскага, захапляўся ёю ў гістарычных вандроўках настаўніка Сабалеўскага. Але найлепш яе пазнаў і з захапленьнем прывітаў, - ох, як моцна з радасьці тады сэрца білася! - у маршы юнакоў і юначак з Саюзу Беларускае Моладзі на менскім бруку. Улетку, пасьля паўдня, ішлі калёнай па вуліцы 25-га Сакавіка. Ізь песьнямі. Юнакі сьпераду, юначкі ззаду. Куды ішлі? Ці гэта так важна ведаць? Прыгледзься ім. Ці не яны, як паэт казаў:

ад гоману бароў,
ад казак вечароў...

Зялёна-шэрыя, з хатняга саматканага палатна, мундзіры. На шапках - пагоні. Палатно, пэўне-ж, Беларуская Самапомач сабрала й вопратку пашыла.

Як шырока і далёка
Беларуская зямля,
Заклікае вёску горад, -

Кліч магутны юнака.

Звонкія юнацкія галасы й роўны маршавы крок. «Кліч магутны юнака» глохне ў бясконцых руінах. Пад нагамі, на бруку абвестка: Тодар Лебяда. Загубленае жыццё. Менскі Гарадзкі Тэатр. Яе, мусіць, вецер сарваў. Жыццё было загубленае. Іхных бацькоў і матак, і сваякоў, і ім самім рыхтавалася. А якое яно заўтра будзе? У гарне ваеннага ліхалецьця наліваюцца й буйнеюць маладыя галасы:

Гэй, з намі, гэй, з намі радамі!
Юначка, юнак!
Бяры ты, бяры ты, нясі ты,
Сяброўскі наш знак!

Дарма, што навокал руіны, дарма, што й цяпер зьнялюдзелыя чужакі тузаюць і рвуць на кавалкі беларускае цела. Там, дзе жыццю наканавалі сьмерць, нешта ўсё-ж прыжываецца. Цьвёрды крок, упэўненыя галасы, мэлёдыя бадзёрасьці й лёту да сонца, да новага жыцьця. Насуперак волі варвараў, мэлёдыя прарываецца, трывае, стараецца прыжыць, каб нязломнай волі жыцьця аддаць належнае. Як міла, пазіраючы на гэтых юнакоў, табе на сэрцы!

Сяньня сілы маладосьці
Сорам дома марнаваць...

Вялікая й магутная ты, Матка Літва. Тваей крывёй чужакі стагодзьдзямі ўпіваліся й дурманелі. Гнёзды тваіх дзетак раскідалі, жылы з твайго цела выцягвалі. Аднаго часу, навет без паніхіды, мёртвай цябе абвесьцілі й імя тваё забаранілі памінаць. А ты, у муках страшэнных, змагалася, перараджалася-адраджалася й выжыла. Колькі разоў ты ярмо намагалася ськінуць, аковы няволі парваць! Наперакор чужым варварам, ты не памерла. Наадварот. Вунь па менскім бруку йдуць вястуны новага жыцьця.

Трэба шчыльнымі радамі
Йсьці радзіму будаваць!
Гэй, з намі...

Юнакі тыя ў Януковых гадох. Яны й цяпер дзесьці на занятках, ці ў школе. Із тым ведамым клічам: «галоўнае - не хвалявацца, а спакойна пражоўваць страву». Ёмка сказана. «Пражоўваць страву», каб «радзіму будаваць». А Янук, іхны аднагодак, мог-бы быць разам ізь імі, у тым самым супольным узьлёце да сонца. Але цяпер ён сам. Капрыз лёсу закінуў яго ў камэру вязьніцы. А можа гэта Бог яго спэцыяльна выпрабоўвае? Для чаго? Гэта хіба Яму, Богу, ведама.

Дзесьці ў школе ў Літоўцах зроўнаважаным крокам, сканцэнтраваная, маршыруе перад дзеткамі Дуня. Значыцца не маршыруе, але паволі ходзіць. Дуня любіць перад вучнямі хадзіць. Хада памагае думаць і ўсіх на воку трымаць. А ейны спакойны голас апавядае дзеткам пра Нёман і Дняпро, Вяльлю й Нарач, і Заходнюю Дзьвіну. Часьць дзяцей мае пісьмовую лекцыю. Як-бы хацелася Януку, каб нейкі дыван-чарадзей перакінуў яго зь менскай вязьніцы ў Дуніну школу, каб хоць на момант зірнуць на мілы тварык, пацешыцца васільковымі вачанятамі, глянуць на пяшчотныя вусны.

У вязьніцы шмат чаго й каго ідэалізуецца. Для Янука Дуня Макатунішка гэта ўжо ня звычайная рагатуха гарэзьніца, а нейкая зусім недаступная сьвятоша, ледзь ня ангел. Як казаў у іншым зьмесьце вялікі паэт: колькі цаніць цябе трэба, адно той спазнае, хто цябе страціў...

«Няўжо-ж, няўжо я Дуню страціў?» - думаў Янук.

Горкія сьлёзы хлынулі раптоўна на бледны й сухі твар. Глыбокі плач пачаў тузацць грудзьмі. Воля сьлёзам. Але яны хутка перасохлі й асталося зьняможанае ўздыханьне.

На калідоры пачуліся крокі й галасы спыніліся ля дзьвярэй. У замочыне заскрыгатаў ключ. Людзі вярталіся з працы. Янук мігам ускочыў з нараў.

31

Дуня Макатунішка й Ніна Бурачыха (цяпер Дзеркачыха) дрыжэлі ў нары ад холаду й страху. Выскачылі проста з нагрэтай пасьцелі. Добра, што абутак і вопратку схапілі, якая, дзякуючы Антосевай

мудрасьці, якраз такой нагоды пры ложку чакала. Цяжка было-б сказаць, ці дрыжэлі больш з холаду ці перапалоху. І адна, і другая ня толькі баяліся слова вымавіць, каб, барані Божа, бандыты наверсе не пачулі, але турбавала кажную зь іх занадта раптоўнае, з паднечаньня, біцьцё сэрца. А тыя, наверсе спыніліся й перасталі пад нагамі рыпець масьніцы.

- Глядзі, Лявон, коўдра адкінутая, пасьцеля цёплая. Яны, гэтыя фашысцкія блядзі, недзіка саўсім нідалёка.

Голас памяркоўна-разважны, ядавіты, помсты прагны.

«Хто-ж гэта такі? Ці ня Паваліцкі Хвёдар?» - думала Ніна.

- Дык дзе-ж яны могуць быць, калі з хаты не ўцяклі?

Жанчыны, здавалася, зусім спынілі дыханьне. Так добра ім ведамы Лявонаў голас гэтта-ж над падлогай, проста над іхнымі галовамі азначаў нямінучую загібель, калі бандыты будуць кемлівымі й спасьцерагуць пад ложкам, закрыты дзьверцамі, прарэз, што вядзе ў склеп. Амін усяму. Ніна, дрыжачая, зубы сьціснула: «Антоська, родненькі мой саколік, дзе ты? Пастку-ж ты на іх змайстраваў. Зьявіся во цяперака, памажы нам. Божа, зьмілуйся, памажы!»

Упоцемку Дуніна рука аблапіла й моцна сьціснула ейную далоню і як-бы новай і спорнай сілай ў Дзеркачыху ўлілася. Збоку-ж сяброўка... Можа як парадзяць з гэтай пошасьцяй... А можа там, - быць-жа ня можа, каб ніхто не пачуў і ня бачыў іх, як сюды йшлі, - можа як перададуць паліцыі ў Гацях. Быць ня можа, каб ратунак ня прыйшоў.Гэты басяк, пэўне ў лесе зусім зьдзічэў. Колькі пазьдзекуецца, пакуль Богу душонку сваю аддасі...

А тыя наверсе стаялі, разважалі нешта, Каб іх чорт узяў! У гэны дзень, пасьля раньняга зьмярканьня, Дуня доўга працавала над школьнымі сшыткамі, пры мізэрным сьвеце лямпы. Зусім бяз практыкі навучаньня адна на чатыры клясы ў школе вёскі, дзе некаторыя старэйшыя вучні й цяпер яе «Макатунішкай жабоцькай» называлі ды не хацелі слухаць, Дуня цягнула, як магла. Патрабавалася надзвычайнае адвагі й вытрываласьці. Ня гледзячы на кусьлівыя языкі некаторых вяскоўцаў, Дуня ўцягнулася, дысцыплінай і пасьлядоўнай працай пачала здабываць зусім заслужаны аўтарытэт. А працы ўсё прыбывала.

І ў той зімовы вечар, школьнае скончыўшы, Дуня разгаманілася зь Нінай. Разважалі насамперш пра сваіх дзяцюкоў. Бядуючы па сваім

Янучку, які, быццам у ваду, недзе ў Менску ў вязьніцы прапаў. Дуня аж сьлязу пусьціла. А Ніна наадварот, - сама бадзёрылася й Макатунішцы памагала.

- Ці помніш, Дунічка, як ты да нас першы раз жыць прыйшла? Казала-ж я табе тады, што ўсё на добры лад пойдзіць. Так і было. Ні бядуй і па сваім саколіку, бо надта-ж малады ён і тую цюрму піражывець ды да цябе верніцца.

І прыгадала Дуня час, як да Ніны перабралася.

- Хадзі, Дунічка, да мяне, - сказала добразычлівая Антосева жонка, калі аднойчы Дуню на дарозе са школы спаткала. - Як-жа табе там быць, як-жа ты на лекцыі прыгатаўляішся? Ці-ж я ні знаю, як цесна ў вас? Дык хадзі, во ў мяне лепі табе будзіць, дый мне куды вісялей... Знаеш, як мой Антоська ў паліцыю пайшоў, сама-ж я. Кажыць мне, што мяне ў Гаці забярэць, ну але пакуль тое будзіць, дык мне маркотна самой...

І Дуню ня трэба было доўга спанукаць. Сама ведала, што з маткай, сёстрамі ды дзяцьмі ўдома ёй ня месца. А пры школе жыць ня было дзе. Дык гэтта Ніна, - няхай Бог ёй здароўя прыспорыць, - як на выручку выбегла. Ужыліся скора. Дуня абяцала Ніне за харчы плаціць, але тая замахала рукамі.

- Знаеш, даражэнькая, жыві во й ні бядуй. Есьці ў нас уволю, дзякуй Богу, назапасілі й гародніны й садовіны, дый мяса не зьвялося, а ад каровы малака хапаіць. Дык во жыві, а там неяк палічымся. Што там гаварыць пра тыя твае маркі, што за іх купіш цяперака...

Дуня накш на свой заробак глядзела. Праўда, за яго надта не разгуляешся, але-ж на бяду магло хапіць. Ясна, Дуня крыху й ганарылася, што вось яна першы раз у жыцьці магла нейкім сталым і навет наводля мясцовых мерак салідным заробкам пахваліцца. І таму Нініна заўвага, што «за тыя твае маркі» нічога амаль ня купіш, крыху ўквяліла яе.

Спалі на падвойным ложку. А ў той вечар, калі Дуня супакоілася ў першым салодкім сьне роўным дыханьнем, Ніна, быццам прадчуваючы нешта, не магла заснуць і прыслухоўвалася як гаманіў нешта ля вокнаў вецер; мяркавала, ці не ўскапышыцца ён, ці не распрастае свае шырокія крыльлі ды ці не пачне ізь сьнегам у коньнікаў забаўляцца. І думала, ужо ў паўдрымоце, яшчэ пра Антося, гадаючы ці дзе ноччу на варце стаіць, ці можа зь ягоным удзелам які

выезд на бандытаў плянуецца. Апошнімі часамі гэтыя пасьмялелі, ці не таму, што свае з усходу бліжэй падбіраюцца. На чыгунцы было ўжо колькі мінных узрываў, хоць безь вялікіх стратаў для едучага войска.

І ў гэткай дрымоце, дзе рэальнасьць траціць свае выразныя рысы, каб замяніцца першым, моцным і надта-ж салодкім сном, раптоўнае й наглае браханьне Ромкі вярнула яе да поўнае прытомнасьці. Сабака, залямантаваўшы на ўсю шырыню горла, кідаўся на прывязі, шалёна зьвінеў ланцуг. Хто-ж гэта там, такой познай ноччу ганяе?

Сталася нешта надзвычайнае. Пачуўся выразны сьвіст, якраз на той лад, якім некалі адно Косьцік Сабакевіч мог свайго гадунца клікаць. Сабакаў голас перамяніўся. Ромка ўсё яшчэ брахаў, але голасам няпэўным, быццам ня мог пастанавіць, ці той, што сьвішча, прыяцель ці вораг... Ніна села ў пасьцелі, заклапочаная, затрывожаная. Хто гэта такі той, што мог так высьвістываць да Ромкі як калісьці Косьцік і які чорт яго тут познай ноччу ганяе?

Няўцямнасьць і зьбянтэжаньне. А за імі перапалох. А калі гэта вораг, то як бараніцца? Пакуль Ніна змагла сабрацца з думкамі, з двара пачуўся моцны, прыдушаны сабакаў енк і голас яго пачаў слабець, быццам яго хто раптоўна ножам пад сэрца саджануў. Ніна з усей сілы зварухнула Дуню:

- Дунічка, чуеш?

- А што? - адказала, ужо зусім прачнуўшыся, дзяўчына.

- Ромка... Нехта Ромку забіў. Скарэй хаваемся!

Паўтараць ня трэба было. У Нініным устрывожаным голасе ўвесь зьмест. Раней Дзеркачыха навучыла Дуню што рабіць у выпадку небясьпекі. А той ці тыя, што забілі сабаку, ужо грукалі ў дзьверы ў сянёх. Быццам узгарэўшыся, жанчыны накінулі на сябе вопратку, надзелі абутак, адсунулі пасьцелю й адкрылі дзьверцы ў нару пад падлогай. Ніна ведала, што дфзьверы ў сянёх ня толькі на моцнай засаўцы, але яшчэ й замку. Калі хто запраўды пачне сілай у хату ламацца, то павінен разьбіваць дзьверы. Усё-ж улезьці ў нару ня было так проста. А галоўнае, улезшы, трэба было пасунуць ложак, каб закрыць у падлозе квадратовае вечка, дзьверы ў тайнае сховішча.

- Адкрывайце, блядзі фашысцкія!

Голас з-за дзьвярэй хоць глухі, але загадны. Моцны грукат страсануў хатай. Выглядала, што білі ботамі, аж завесы скрыгаталі. Ніна памагла Дуні ўсунуцца ў адтуліну а сама, гарачкава, улезшы за

дзяўчынай, намагалася насамперш, - і гэта патрабавала немалой сілы, падсунуць ложак, каб закрыў тайны ход ды пасьля, ужо больш асьцярожна закрыла дзірку квадратовай покрыўкай.

Неўзабаве пасьля гэтага пасыпаліся зь нейкага вакна бітае шкло й трэск рамаў. Відаць, што бандыты, сьцяміўшы як цяжка выламаць дзьверы, наважылі ўлезьці ў хату праз вакно. І цяпер, відаць, стаялі пры цёплай пасьцелі ды разважалі пра тое, куды ім спад носу ўцяклі «фашысцкія блядзі». Зноў пачалі рыпець масьніцы.

- Давай пашукаем, яны-ж недзіка тут ёсьць.

- Чуеш, Дуня? Гэта-ж голас Паваліцкага Хвёдара, - шапнула Ніна. - А мы-ж і ня ведалі дзе басяк падзеўся. Дык от, знаеш цяперака што за госьці тамака да нас праз вакно ўлезьлі. Божачка мой, прышлі Антоську сюды, ратуй нас..

- Ніна, ціха ты, ато пачуюць.

Дуня зусім апанавала першы ўструс перапалоху й цяпер, стоячы ўпрытык да Ніны ў вузкай нары, адчувалася зусім ніякавата. Калі раней думала пра сваю будучыню, - а было гэта даволі часта, - дык уяўляла сябе ў розных сытуацыях, адно не ў такой як цяпер. Ад гэтых, пэўне-ж цяпер вельмі зьдзічэлых дзьвюх дзяцюкоў, адзьдзяляла яе й Ніну ўсяго некалькі мэтраў. Тыя, прагныя зьдзеку й нажывы, спасьцярогшы цёплую яшчэ пасьцелю, дзесьці аглядалі ўсе куты, каб вымяркаваць куды ім спад носу ўцякла такая вялікая ўзнагарода за нейкія баявыя заслугі. Перад Дуняй, у найчарнейшых колерах, зьяўлялася жахлівая рэальнасьць. А што будзе, калі бандыты іх знойдуць? Вельмі непраўдападобна. Ніна пазнаёміла яе раней з нарой і дакладна вытлумачыла, як і што ў выпадку небясьпекі рабіць, ды дзе выхад з гары на двор. А быў ён воддаль ад хаты, на дрывотні, заалены зьверху хламам, каб ня бачыла непажаданае вока.

І цікава, што думкі Дуніны, - як выразна прыгадвала пасьля, - заміж таго, каб канцэнтравацца на вялікай небясьпецы, спанукалі яе ў зусім іншы бок, да свайго каханага, што недзе, калі ён жывы яшчэ, сядзеў у нейкім катушку страшнай вязьніцы. Прыгадала, як нядаўна наведала сям'ю Бахмача. Янукоў бацька й кульгавы Мікола сустрэлі яе ветліва, запрасілі сесьці пры стале.

- Ну й што ты, Дунечка, чула пра Янука? - спытаў стары зьняможаны Бахмач.

- Нічога я, дзядзя, ня чула. Прыйшла да вас, думала можа што ад вас даведаюся.

Пракоп нічога не адказаў. Ён хадзіў па хаце. Дуня мяркавала, што бацька выдатна ведаў пра яе зносіны зь ягоным сынам, а сьветчаньнем гэтага была можа й пашана ў ягоным ласкальным «Дунечка», заміж раней ім ужыванага «Макатунішка». І відаць, - зірні вунь на ягоны заклапочаны й балючы твар, - ён вось-вось захоча шырэй выказацца. Чалавек гэты шмат перацярпеў і перажыў, а ў вёсцы шанавалі яго як інтэлігэнта першае рангі: разважнага, памяркоўнага, з добрым і вялікім сэрцам, глыбока ў Бога веруючага, наскрозь практычнымі жыцьцёвымі мудрасьцямі прасякнутага, якраз такога, каторы ў бядзе на помач іншым сьпяшыў.

- Каб во мяне паслухаў, дык дома, а можа навіт блізка недзіка з табой разам дзетак вучыў-бы. Ато...

Стары зрэзыгнавана махнуў рукой, а твар перасмыкнуўся балючай крыўдай.

- Які чорт пагнаў яго ў тую Вільню? Гэта-ж, каб ні вайна, дык чаму-ж... Бег вучыцца, патрыятызмам загарэўся, а цяперака недзя ў цюрме здыхаіць...

Зьняможаны голас абарваўся. Пракоп падыйшоў да крука ў сьцяне, на якой вісела барада пянькі, зь якой плёў лапці для працы на сенажаці ці на балоце, узяўся круціць пяньку. Рукі ягоныя хадзілі няпэўна й Дуня мяркавала, шыо Бахмачовы думкі не пры пяньцы былі.

- Што-ж, думаў я, думаў ды сабраўся паехаць аж у Менск сына пашукаць. Хоць і злосьць у мяне на яго, але-ж сэрца ні камінь. Знаеш, кроў свая. Дык паехаў у Глыбокае да камісара, каб бялет на дарогу як выпрасіць. А гэтыя-ж ураднікі, каб іх гаручка, мяне да камісара саўсім ня пусьцілі. Нагіргаталі нешта, а тады пераводчыца кажыць, каб на другі тыдзень у ваўторак прыйшоў. Дый толькі шапнула, што калі хачу бялет, то каб з пустымі рукамі ні прыхадзіў. А піраводчыца тая, мусіць, з пшэкаў, бо папольску гаварыла. Ну што-ж, думаю, ніхай сабе, і ім-жа жыць трэба, а сына трэба за ўсякуюэ цану знайсьці. Дык во й паеду ў ваўторак, як сказалі, дый нешта вазьму, каб у лапы ім...

- Дык вы, дзядзя, аж у Менск задумалі ехаць?

- Ага, а як-жа...

- А вы ці ведаеце, дзе Янук?

- Хадзіў-жа я да гэтага самага ягонага прыяцеля Загорнага, ну ты яго знаеш. Праўда таго ня відзіў, бо Янук-жа яго аж у Вільню зацягнуў, але бацькі пірaказвалі што іхны сын гаварыў. Дык ён, значыцца Янук у нейкай там зялёнай вязьніцы сядзіць. І яшчэ цікавае, што мне сказалі Загорныя дык гэта тое, што іхны сын, зараз-жа як наш Янук трапіў у цюрму, дык Лявон Загорны пайшоў прасіць помачы ў камандзіра біларускай самааховы, нейкага там палкоўніка ці што... Ну ён самы вышэйшы начальнік над біларускім войскам...

- Ну й што той?

- А той кажыць: чаго гэта тут валочыцеся, чаму ні сядзіце на месцы ды ня вучыцеся? Гэтак сярдзіта накінуўся на Загорнага. І яшчо кажыць яму: уцікайце з маіх вачэй, бо я і вас арыштую, пасядзіцё разам із сваім сябрам.

- От сукін сын, каб яго зімля ні насіла! - праклінала няведамага ёй чалавека Макатунішка. - А вы, дзядзя, знаеце дзе тая зялёная вязьніца й як да яе дабрацца?

- Ні знаю, дачушка. У Менску-ж я ніколі ня быў, адкуль мне што знаць... Праўда, ў Глыбокім заходзіўся ў Біларускую Самапомач, дык далі мне адрас такой самапомачы ў Менску, у каторай, казалі, табе раскажуць што рабіць, а можа й памогуць Янука звольніць...

- А за што яго пасадзілі? Што ён зрабіў?

- Адкуль-жа мне ведаць... Лявон Загорны казаў сваім, што яны цэлыя два ці тры вагоны віленскіх спікулянтаў адразу ў вязьніцу забралі, дык і Янук трапіў сярод іх... Загорны спад рук Латышоў высьлізнуў, а Януку ні ўдалося.

- Вы, дзядзька, добра робіце, што стараецеся, - пахваліла Бахмача Дуня.

Мікола сядзеў пры стале, у гутарцы ўдзелу ня браў, адно прыглядаўся маладой, сьціпла але із густам апранутай настаўніцы. Дуня заўважыла раней, што адносіўся да яе з пашанай. Здалёк ад яе траымаліся некаторыя вясковыя падлёткі ад часу, калі пачала вучыць у вясковай школе. Як-ніяк яна цяпер займала месца некалі чужой, прысланай з глыбі Польшчы «панічкі вучыцелькі». Пасьля візыты да Пракопа Бахмача надзея на Янукова вызваленьне салідна загнязьдзілася ў Дуніным сэрцы.

- Німа, каб іх халера, як пад падлогу прапалі! - пачуўся злосны Лявонаў голас недзе наверсе ў Дзеркачовай хаце.

- А што, калі яны пад падлогай?

Такое пытаньне Паваліцкага Хвёдара моцна ўстрывожыла жанчын.

- Дык дзе-ж... Я-ж раней у гэтай хаце бываў, німа ў іх пад падлогай склепу.

Прайшло пару напружаных хвілінаў. Зьверху пачуўся гук бітай пасуды.

- Ты чаго шукаеш?

- Думаў, можа гэты праклятый бобік дзе самагонку маіць.

- А добра было-б пацягнуць. Але калі самагонка й ёсьць, дык ты думаеш, што ён яе ў шафе дзержыць?

- А чорт яго, бобікавага бацьку, знаіць...

- Ніхай шукаюць, фігу ім знайсьці, - шапнула Ніна Дуні. - Добра, што ні пачалі нас пад палогай шукаць. Задурны гэты Шпунт.

Зьверху гракнуў аўтамат. Кароткімі сэрыямі. Некалькі разоў.

32

Антось Дзяркач узіраўся ў цемру. Ясныя, месячныя ночы мінулі. Як на тое, яшчэ захмарылася неба, і зорак ня відаць было.

- Вецер, здаецца, не зьмяніўся. Каб ён ні задумаў пагуляць... Тады хоць ты адразу на базу вяртайся.

Сядзелі на сугры ў кустох, побач літоўскага ўзбалотку ля бальшака, што непадалёк перасякаў чыгунку. Апрануліся цёпла. Максім Баравік, зь Дзеркачовага зьвязу, маўчаў. Чалавек негаваркі быў.

- Ага, - абмежаваўся Баравік адным словам.

Ён паправіў рукавіцы, пагладзіў стрэльбу. Вецер дзьмухаў з захаду, а перад імі, у начоўках упоцемку спала вёска Літоўцы. Антось часта паглядаў на нявыразныя зарысы свае хаты й пуні, думаў пра тое, што Ніна й Дуня соладка храпуць у цёплай пасьцелі. Там, заміж Дуні, трэба было-б яму быць.

Дзяркач ведаў, што больш надзейнага сябры, чымся Максім Баравік, яму не знайсьці. Калі, з дазволу Левандоўскага, выбіраўся «на паляваньне», заўсёды жадаў мець з сабой гэтага малагаманлівага, але шустрага й вынаходлівага жаўнера. Гэта-ж у ягонай лазьні ў

Ластавічах аж трох бандзюгаў накрылі. Не дарма-ж бандыты ваўкамі іх празвалі. Гэты Антосеў нямецкі шмайсар як трафей яму тады ў Ластавічах дастаўся. Бандыты некалі здабылі яго ў Немцаў, а ён, Антось Дзяркач, захапіў у іх. Палявалі тады на яго, «фашысцкага ваўка», а Антось з Максімам аж трох упалявалі.

Ластавічы ляжалі непадалёк чыгункі, на ўсход ад Літоўцаў, і вёску ўжо некалькі разоў абчышчалі бандыты, хоць гацкія «бобікі» лічылі яе сваей тэрыторыяй. Пасьля жнівеньскага нападу на Гаці й вынішчэньня ў паліцыі польскага элемэнту, апошняя, галоўна дзякуючы стараньням Кастуся Падгайскага, папоўнілася Беларусамі. Хаця інтрыгі з боку Палякаў ня спыняліся, фальксдойч Левандоўскі адносіўся да Беларусаў талерантна й здавалася, што ў нябыт адыйшоў той час, калі рукамі сваіх басякоў і Немцаў польскія шавіністы ліквідавалі мясцовых, найбольш нявыгадных ім Беларусаў. Пранырлівасьць і практыка, добрае веданьне людзей і ваколіцы прынесьлі Антосю ў ягонай службе выдатныя плёны. Адылі ён і далей ня спыняў пошукі добрых людзей для папаўненьня адзьдзелу.

Максіма Баравіка пазнаў у бальшавіцкай калёне вязьняў. Баравікову жонку энкавэдысты замардавалі, а сам ён неяк выратаваўся. Вярнуўшыся да хаты, бязьдзетны, як цень бэрсаўся каля зруйнаванай гаспадаркі, за зброю брацца не сьпяшыў, але ня бачыў перад сабой ніякае будучыні. І што будзе, калі вернуцца тыя? Пагоняць туды, адкуль раз удалося, дзякуй Богу, уцячы. Дык што рабіць? Маўклівы й зацяты, цяпер бязрадна прыглядаўся, як бандыты начамі вылазілі зь лесу й забіралі ў людзей апошні хлеб. Колькі разоў сьвярбелі рукі каб якую сякеру схапіць. А там будзе, што быць мае...

Прыпадкова сустрэўшы ў Гацях Антося, у скупых словах пераказаў, што на сэрцы накіпела.

- Як-бы гэта, каб з табой разам?

Антось задумаўся. Набіраць людзей у паліцыю перасталі, відаць, аж да новых стратаў.

- Ты знаеш што? - казаў ён Максіму. - Я маю такі плян... Калі нам гэта ўдасца, дык Левандоўскі й Немцы нідзе ні дзенуцца, возьмуць цябе. У вас часта гэтыя басякі зь лесу бываюць?

- Часьценька.

Антось у агульных рысах пераказаў Максіму свае намеры.

Гэтак неўзабаве пасьля гэтага, калі Максім двума вёдрамі на каромыслах насіў ваду ў лазьню, адазвалася цікавая суседка:

- А чаму-ж ты, Максімка, лазьню тапіць надумаўся? Што гэта, якое вялікае сьвята, ці што?

- А чаму-ж і не, Настачка? Ды я-б можа й ні рабіў, сама знаіш, адно пірад сьвятам, алі-ж госьць папрасіў.

- Дык у цябе й госьць маіць быць?

- А як-жа...

- А хто-ж такі, калі можна ведаць?

- Ну Настачка, скажы табе дык ты па ўсей вёсцы разьнясеш-раструбіш.

- Ды што ты, што ты, Максімка, нікому я ні скажу, вер мне.

- Нікому ані гу-гу?

- Дальбог, каб я з гэтага месца ні сыйшла, от бажуся.

Баравік, ведама-ж, «пад вялікім сакрэтам», назваў прозьвішча свайго гасьця й яшчэ раз прасіў Настачку, каб нікому ні казала. Цяпер быў упэўнены, што жанчына вестку неадкладна па языках пусьціць. А лес мае свае вушы.

Антосю давялося нялёгка, пакуль пераканаў Левандоўскага. Той ар'ентаваўся ў ваколіцы куды Дзяркач выбіраўся, яму даўно карціла пастрашыць там бандытаў, паказаць і Немцам, што ён ня страціў ініцыятывы. Усё-ж ён ня бачыў ніякага сэнсу высылаць туды аднаго чалавека й намаўляў Антося, каб узяў з сабой пару памочнікаў. Калі-ж той тлумачыў, што знайдзе мясцовую помач, камандант махнуў рукой:

- Едзь! Калі правалішся, мяне ня вінаваць.

Далёка да зьмярканьня, пад'яжджаючы ў развалках да Ластавічаў, апрануты ў цывільнае, Дзяркач трымаў зыркае вока на кажным прыдарожным аб'екце. Што, калі засаду зробяць? Антось даўно перастаў баяцца й турбавацца. Пасьля таго, што перажыў і перад тым, што мела надыйсьці, - а ўжо добра відаць было ў які бок хілілася вайна, - чаго там многа разважаць... Абыякавасьць брала сваё, хоць рэзагнацыя ў змаганьні яшчэ не наступіла й далёка-далёка было да апатыі. Дзяркач нічога із свайго духоўнага стану, відаць, не патрапіў-бы вытлуначыць, як казаў, моднымі словамі. Думаў простымі катэгорыямі. А цяпер галоўнае, каб не зрабілі засады. Пакуль ён іх, каб не яны яго. Чамусьці быў упэўнены, што праціўніка разгадаў.

Пакуль не разрабавалі яе «вызвольнікі» дый самога ледзь не замардавалі, гаспадарка Максіма Баравіка была аднэй зь лепшых у вёсцы. Хата, іншыя будынкі - на зайздрасьць суседзям. А зухаватая з выгляду лазьня, собскімі Максімавымі рукамі пабудаваная, вясёла вызірала з грамады вольхаў на аселіцы, воддаль ад хаты.

Ужо зусім цямнела, калі мужчыны, у бурках, з ручнікамі й бялізнай пад пахамі, паволі накіраваліся ў лазьню. У сенцах запалілі ліхтар. Антось павесіў на кругу на сьцяне асобна прынесены паліцыйны мундзір, шапку. У куце на лаву палажылі бялізну, на падлогу паставілі захоплены Максімам стары абутак. Каб усё выглядала, што людзі распрануліся й пайшлі хвастацца-парыцца. Антось даў Максіму стрэльбу, якую той узяўся заладоўваць, а сам выцягнуў зь кішэні буркі дзьве гранаты, а з запазухі нож, якому прыгледзеўся зь пяшчотай, пагладзіў лязо. Адчынілі дзьверы ў лазьню й Максім лінуў на каменную печ пару чарпакоў вады. Пара бухнула ўверх пад столь і ўдарыла ў твары сяброў.

- А знаеш, тады добра было-б папарыцца. Як думаеш? - сказаў Максім.

- Мусіць нам болі ня прыйдзецца ў тваей лазьні.

Спад страхі на двор. з сыкам ад нагрэтых каменьняў, валілі клубы пары. Максім паставіў ліхтар у лазьні на лаве. Мужчыны вызірнулі на двор праз прыадчыненыя дзьверы. Дзесьці брахалі сабакі. У некаторых хатах млявым сьвятлом замагаліся зь цемрай каганцы. Вёска прытаілася, устрымала дыханьне, чакала. І Антось меў ураджаньне, што сочаць іх дзясяткі вачэй.

- Ты, Максім, дзяржыся кута. Я буду тут напроці дзьвярэй. Калі яны акружаць лазьню, цяжэй будзіць іх узяць. Адным словам, глядзі на мяне й ні зявай. Кумекаеш?

- Кумекаю.

Самі ў шэрых бурках, пэўныя, што калі-б і сачыла здалёку пільнае вока дык цяжка іх убачыць, хутка кульнуліся празь дзьверы ў сьнег і папаўзьлі ў алешнік. Замяніўшыся цяпер у максымальную пільнасьць, Антось лёг на жываце за здаравенным, што выставаў з гурбы сьнегу, каранём вольхі. Максім пайшоў направа ад яго і крокаў пятнаццаць воддаль прытаіўся за камлямі й галінамі густых вольхаў.

Чакаць давялося нядоўга. Антось пасьля зьдзівіўся, як мог так правільна ўсё разьлічыць. Ажно павертыць цяжка было. Тройка

паказалася зь кірунку тае самае суседкі, якой Максім пра «гасьця» пад «сакрэтам» расказаў. Прыгнуўшыся валюхаліся па сьнезе. Упоцемку ў меру іх прыбліжэньня, можна было іх разгледзець адно з большага. Адзін зь іх, ці не правадыр, у нечым наводля фуфайкі, трымаў правай рукой наперавес праз плячо аўтамат, іншыя - стрэльбы. Намагаючыся разгадаць іх і іхную тактыку ліквідацыі гаспадара й «госьця», Антось яшчэ раз праверыў сваю зброю - нож, наган і гранаты. Ён зірнуў туды, дзе скрыўся Максім. Нічога, што паказвала-б там на прысутнасьць чалавека, ня відаць было.

Трапіўшы на ўтоптаную Баравіком сьцежку, людзі цяпер яшчэ больш прыгнуліся. Прыбліжаліся борздым крокам. Ужо можна было іх добра разгледзець, але Антося цяпер перасталі цікавіць твары. Чалавек з аўтаматам махнуў аднаму спадарожніку рукой і той падаўся наперад, да кута лазьні, бліжэй да засеўшага там Баравіка. Апошнія два станулі па двух бакох дзьвярэй, прыслухоўваліся. Паволі, аж занадта паволі цяклі часіны. Антось ведаў, што ад наступнага іхнага кроку шмат залежыць. Калі-б меў з сабой ручны кулямёт, мог-бы й цяпер пачынаць. Скажам, вось хоць-бы й такі, як гэны бандыт мае. Запраўды, ці не нямецкі, трафейны гэта? Антось ацаніў свае й Баравіковы шансы на перамогу: вельмі малыя. А гэтыя, пільна наставіўшы вушы, прыслухоўваліся. І маўчалі. Баяліся, відаць, каб іх не пачулі. Усё залежала ад іх наступнага кроку. І важна яшчэ тое, што зробіць Максім, калі трэба змагацца.

Чалавек з аўтаматам насамперш, а пасьля ягоны спадарожнік прыселі перад парогам у лазьню й першы паказаў другому кіўком галавы ў сярэдзіну. Той мігам, адчыніўшы дзьверы, кульнуўся праз парог. Чалавек з аўтаматам зірнуў навокал, - цяпер Антось мог лепш разгледзець ягоны аброслы чорнай шчацінай, шырокі твар, - паказаў таму трэцяму, апісаўшы рукой паўкольле ў паветры, каб, мусіць, сачыў за ўсім навокал і сам перакуліўся праз парог. Антось наўмысна зачыніў на клямку дзьверы зь сенцаў у лазьню, каб, ведама, пара не ўцякала, дый магчыма прадугледзеў тое, што цяпер адбывалася. Ведаў, што неўзабаве трэба пачынаць, пакуль тыя, асьцярожныя, паслухаюць, а пасьля агледзяцца, што ў лазьні нікога няма. Трэба было мяркаваць, што гранатамі яны не пачнуць раскідацца, бо, пэўне-ж, ня маюць іх уволю, дык аставалася іншая магчымасьць. Трэба было неадкладна дзеяць.

Бандыт, што стаяў ля кута лазьні, насамперш абвёў позіркам вакол сябе, а цяпер глядзеў недзе ў бок аселіцы. Хутка ськінуўшы зь сябе бурку, Антось маланкай выхапіў нош, стануў на поўны рост і кінуў нож у плечы вартавога. Зараз-жа з з правага боку бабахнула стрэльба. Антось кінуўся да дзьвярэй лазьні, пацягнуў шнур у гранаце, кінуў яе ў сенцы лазьні й як мага стараўся адкаціцца ад парогу. Ля кута, дзе стаяў вартавы, мільганула фігура. Гэта Максім.

- Кладзіся! - крыкнуў Дзяркач.

Гучны выбух страсануў лазьняй і паветрам. Але Антось, заўсёды апанаваны, ужо трымаў напагатове свой наган. Зь сярэдзіны пачуліся стогны. Прайшло колькі часінаў. Праз парог карабкаўся чалавек. Дзяркач выстраліў раз, тут-жа бабахнуў стрэльбай Максім. Полымя асьвятліла нутро сенцаў. Антось хутка падбег да дзьвярэй, нагой стукнуў ужо няжывога бандыта. Той перакуліўся, раськінуўшы рукі, праз парог. І гэтта-ж пад ім Антось спасьцярог у праблісках полымя ручны кулямёт. Ён адапхнуў трупа, выхапіў аўтамат і крыкнуў Максіму:

- Не марудзь!

Сам кінуўся на кут лазьні, дзе ляжаў вартавы. Памяркаваўшы, выцягнуў у яго спад правай лапаткі свой заслужаны ўжо нож, глыбака ўсадзіў яго ў сьнег і абціраў сьвежую кроў.

- Алі-ж ты, братка, здорава! - дзівіўся сябра. - Ну а лазьня мая згарыць, каб іх халера.

- Дык што, ратаваць можа будзеш? Давай, сьпяшымся, бо нас тут ля вагня лёгка ўвідзіць. Хто ведаіць, колька іх тутака бадзяіцца... Давай бягом!

Збораў як і ні было. Дабегшы да двара, Баравік ускінуў на развалкі пару хатулёў, палажыў стрэльбу.

- На й гэту качаргу, трымай напагатове. Ведаеш, як зь яе страляць? - перадаў Антось яму здабытага шмайсарам, а сам пагнаў каня.

Калі пакідалі Баравікоў двор, спасьцераглі людзей, што беглі да ахопленай суцэльным полымем лазьні.

Распытаўшыся дакладна пра ягонае «паляваньне», Левандоўскі прыняў Максіма Баравіка ў паліцыю, а сам далажыў Немцам пра новую перамогу над бандамі. І цяпер вось разам два сябры ўважна разглядалі цемру, у якой, ведалі, выпаўзаў зь лесу й падпаўзаў да мірных людзей, каб рабаваць, ненавісны вораг. Сядзелі на сугры,

трымалі на воку сьцежку на ўзбалотку й бальшак. А там, крыху далей, дзе ледзь відаць на фоне сьнегу асьвер калодзезя, чарнела Антосева хата.

- А што там робіць Ніна з Дуняй? Няўжо маё прадчуваньне мяне падвядзець? - думаў Антось.

Паволі поўз час. Магчыма Антосю здавалася, што гэтым разам чакаў нечага асаблівага. Амаль быў пераконаны, што Лявон, ня гледзячы на сваю трусасьць, яму не даруе й выдумае нейкую расплату. Рызыкоўна было пакідаць жонку ў вёсцы, лепш было-б забраць яе ў мястэчка. З другога-ж боку ўпікала сама думка, калі-б самую вёску Літоўцы, ягоную радзіму, аднесьці ў зону бандытаў зь лесу, баяцца іх. І што сказалі-б вяскоўцы, у бальшыні яму зычлівыя, калі-б даведаліся, што ён, Антось Дзяркач, наважыў забраць жонку да сябе, пабаяўся яе тут пакінуць. Можа што й сказалі-б, а можа й не. Ведама-ж, жонка з мужам мае быць. Антось адкладаў, абяцаў Ніне, што вось лепш у мястэчку ўладзіцца, нейкую выгадную квартэру знойдзе. А баяўся прызнацца, што жонку як прынаду для Лявона пакідаў. Той-жа, пэўне, даведаецца, што Ніна сама жыве. І як-жа лепш адпомсьціць Дзеркачу, чымся маючы ў сваіх руках ягоную прыгажуню?

Раптоўна забрахаў Ромак і Антось насьцярожыўся.

- Чуеш? - сказаў Максіму. - Мой сабака брэшыць.

Але тут сталася нешта нязвычайнае. Ромкаў голас зьмяніўся. Быццам сабака ня ведаў, ці вітаць візытара, ці на яго далей брахаць. І тады вецер прынёс да Антосевых вушэй лёгкі, ласкавы сьвіст, якраз такі, якім некалі Сабакевіч свайго гадунца лашчыў. Хто-ж мог так сьвістаць? Той, хто добра ведаў Ромку й Сабакевіча. Ды неўзабаве няпэўнае сабакава гаўканьне зьмянілася ў прыдушаны хрып. Ці яно так, ці толькі здалося? Яшчэ за хвіліну сабака зусім сьціх. Антось жахнуўся. І адно пачуўшы выразны стук, устаў на поўны рост.

- Нехта сабаку забіў і дзьверы ломіць. Бяжым!

Выбеглі на бальшак і пасьля павярнулі на сьцежку, якой вучні ў школу хадзілі. У гэнай шпаркай хадзе, здалося Антосю, пачуў нейкі трэск і звон шкла, быццам хто па вакне стукнуў.

«Каб-жа скарэй, каб не запозна!» - нагліў сябе задыханы Антось. Зь іншага боку ўспакойваў сябе тым, што калі навет бандыты ў хату ўжо ўлезьлі, дык адразу жанчын не пачнуць мардаваць. Ды ці ў гэтым справа? Разважаць было некалі. Бо што з таго, калі яны апынуцца ў

такім палажэньні, што выратаваць жанчын нельга будзе? Казаў-жа Ніне, каб трымала ўсё напагатове, каб у выпадку небясьпекі ў тую нару пад падлогу лезьлі.

Па дарозе, засопшыся, Антось, а за ім Максім, паськідалі зь сябе пальты. Калі ўсё будзе ў парадку, тады іх можна падабраць будзе. Добра прывыклыя да цемнаты вочы абшуквалі навакольле хаты, каб на якога вартаўніка не нарвацца. Але ззаду хаты, куды яны асьцярожна падбеглі, - дзякуй Богу, гэтта была сьнежная выемка, - нікога ня было. Цяпер асьцярожна, пры сльцяне ніжэй вокнаў, Антось рухаўся, каб зайсьці на перад будынку. Вызірнуў з-за куста. І сьпераду нікога ня бачыў. А тады Дзяркач спасьцярог Ромкаў абвіслы ланцуг і на вытаптаным двары нярухомае цела сабакі. Дзьверы ў сені былі зачыненыя, але затое, - і гэта добра было відаць, - нехта пабіў шыбы й выламаў раму ў вакне.

Зусім прыгнуўшыся ля сьцяны, Антось зірнуў на Максіма, што сьледаваў яму па пятах і паказваў рукой, каб астаўся на месцы, а сам, як мага асьцярожна, падпоўз да пабітага вакна. У хаце нешта бліснула, магчыма, што сьвятло лятаркі, і зноў пагасла. І тады пачуў Антось Лявонаў голас:

- Німа, каб іх халера, як пад падлогу прапалі.

У голасе была злосьць і рашчараваньне. Уздрыгнуўшы, Антось адразу ўсьведаміў, што жанчыны схаваліся. Але яшчэ больш узрадаваўся, што чалавек, які расплату яму абяцаў, цяпер знаходзіцца тут, у яго хаце. А хто-ж зь ім? Да каго Лявон гаворыць?

- А што, калі яны пад падлогай?

Крыху зьдзівіў Антося голас Паваліцкага Хвёдара. Гэтага падонка не спадзяваўся тут знайсьці. І тады зноў Лявон у вадказ:

- Дык дзе-ж, яж раней у гэтай хаце бываў. Німа ў іх пад падлогай склепу.

Сумлеву ня было. Жанчыны схаваліся, а гэтыя так і ня ведалі пра Антосеву тайну. Трэба было дзеяць. Але было пару невядомых. Як гэтыя людзі былі ўзброеныя й дзе ў пакоі яны знаходзіліся? Якраз тады даляцеў да Антосевых вушэй трэск бітай пасуды. Добра. Адзін быў ля шафы. А дзе другі? Можа пасьвяціць лятаркай? Антось перачакаў яшчэ пару хвілін і ўжо пачуўшы гутарку пра самагонку, добра ўяўляў дзе бандыты знаходзіліся.

Дзяркач устаў на поўны рост і зарагатаў у ягоных руках аўтамат. Перш даўгую сэрыю пусьціў у ваколіцу ложка, пасьля туды пад шафу, а трэцюю ў ваколіцу стала. І яшчэ пару кароткіх. Веялкай. Прысеў і слухаў. З хаты чуліся стогны. Антось моцным штуршком рынуўся праз вакно ўсярэдзону, упаў на падлогу, адкаціўся. Упоцемку, ледзь відаць, спасьцярог тых, што прыйшлі паляваць на яго. Фігуры ля шафы, ля бітай пасуды ня рухалася, а побач ложка нехта стагнаў.

Праз вакно ўскочыў Максім.

- Максім, пасьвяці.

Сьвятло лятаркі каўзанула па пакоі. Раськінуўшы рукі, ляжаў пры шафе Паваліцкі Хвёдар, а Лявон, з правай рукой ля курка стрэльбы, варушыўся на падлозе пры ложку.

- Ня сьмей, сабака! - гаркнуў Антось і яшчэ раз шмайсарам перавёў драгамішча па грудзях.

- Ніна, Дуня! Дзе вы? Вылазьце!

Антось адсунуў ложак, адкрыў покрыўку.

- Антоська?

- Вылазьце.

Дзяркач запаліў і паставіў напокуці каганец. Бледныя жанчыны, дрыжачыя з холаду, вылезьлі з нары. Антось ботам, з агідай, адпіхнуў пад парог Шпунтоў труп, падняў савецкую «вінтоўку», паставіў яе ў кут.

- Ня трэба яна табе болі, сабака!

Ніна кінулася мужу на шыю, узнагароджвала яго цалункамі.

- Антоська, саколік мой.

Сьлёзы радасьці паплылі па бледным твары. А Дуня, таксама дрыжачая, стаяла збоку, пазірала на Дзеркачоў і Максіма, ня ведала, ці браць ёй удзел у гэтай радасьці, ці што іншае рабіць. Яна пазірала на двух забітых на падлозе і яе пачынала яшчэ больш трасьці. Гэтыя дзьве брыды, каб не Антось і Максім, маглі-б во так стаяць над яе і Нініным трупам. Адно яшчэ перад тым пазьдзекваліся-бы.

- А што зь імі? - спытала Дуня.

- Давайце вон гадаў гэтых.

Ужо на двары, калі выцягнулі й палажылі іх непадалёк ад Ромкавага трупа, Антось, пасьвяціўшы, яшчэ каб быццам упэўніцца, што ён упаляваў паляўнічага, сказаў:

- Так вам трэба, сабакі! Але што я гавару? Вы нявартыя сабакі Ромкі, вы гады! Цьфу! Шкада Ромкі...

- Антось, гэта ты? - пачулася зь цемры.

Голас Дзеркачовага бацькі.

- Усе цэлыя? Каго гэта чорт да вас прыгнаў?

Стары, захутаныў кажух, прыбліжаўся. Ад варот ішлі й іншыя людзі.

- Каго чорт прыгнаў, таго й забраў, тата, - адказаў Антось. - Болі ён зьдзекваццa над намі ня будзіць.

33

Ідучы па менскай вуліцы пад канвоем, у ліку пяцёх чалавек з групы, якую пасылалі на рашчышчаньне хламу й руінаў ля будынку камісар'яту. Янук ледзь цягнуў слабыя ногі. Яшчэ кружыла ад сьвежага паветра галава й ён моцна высьцерагаўся каб не спаткнуцца на якую няроўнасьць, выбоіну, каб ня ўпасьці. Тады будзе канец, - гэта ведаў. І так ледзь ня скончыўся. А цяпер - вытрымаць! Адзіны ратунак. Сьвежае паветра, можа пры працы якая лішняя крошка хлеба ў рот трапіць. Усё-ж праца - дабраслоўлены Богам занятак.

З жахам прыгадваў, што магло стацца. Яшчэ адзін дзень, яшчэ тая жахлівая камэра, дзе з ложка ўжо ледзь мог падняцца. У галаве шматкаляровыя кругі. Насела на яго кароста. З рук перакінулася ў рот, амаль залажыла яго. Ня мог таго сьціплага кавалачка хлеба сажваць і праглынуць. Адно, - і гэта зь вялікім болем, - ледзь удавалася тую жыжку, што называлі супам, у рот уліць. І так дзён пяць, сем, - пасьля страціўся лік, - без харчоў. Далі сьмярдзючую мазь Вількінсона. Намазаўся. Колькі раз прасіўся да лекара, усё абяцалі. Зьняможаны, згаладалы, ляжаў на ложку, сам у камэры, ня мог устаць. Прыйшоў новы сьвет: канчальная нямогласьць, сілы таялі. Слабасьць узяла ў свае абдымкі. І была яшчэ воля жыць, але ня было сілы. Праз заложаны каростай рот цяжка было дыхаць. Усьведамленьне гаварыла, што прыходзіць канец. І дзіва дзіваў! Як лёгка памерці. Цела ўжо здалося. Трэба адно нічога не рабіць, зусім не намагацца, ня перашкаджаць таму няўхільнаму працэсу, які прывядзе да сьмерці. І

яшчэ адно: зусім нічога ня думаць. Аддаць сябе ў рукі Богу. Ён, пэўне-ж, вызначыў Януку свой шлях, а воля Ягоная - гэта пачатак і канец.

Але ў зусім аслабленым, схудзелым целе ня спыняў сваей дзейнасьці ягоны загадчык - заўсёды няўтомны й вытрывалы й заўсёды актыўны мозг. І гэты загадчык цягнуў Янука да жыцьця. Уяўленьнем вёў яго да родных гоняў, туды, дзе буйнее шматгранная прырода, дзе як сымбаль няўміручасьці стаіць на сугры Гараваткі гігант Архіп; у кусты, дзе салаўі вяжуць цудоўнай прыродзе свае хаваласьпевы, дзе сьпяваюць жнейкі, у вабдымкі каханай дзяўчыны, у муры віленскай гімназіі, у пабожную грамаду перад Вострай Брамай. І блукаў зьняможаны юнак па ўсіх месцах роднае зямлі, дзе спазнаў соладзь і горыч жыцьця, якое вось адно ўзялося, каб расьцьвісьці, каб завязацца пасьля нейкай асаблівай завязьзю.

А была перад ім шэрая, патрэсканая, цёмная сьцяна й слабасьць. Калі намагаўся ўставаць, напружваў апошнія сілы. Галава важыла некалькі тонаў. Цьмянае сьвятло й чырвоныя, сінія, жоўтыя, шэрыя, зялёныя кругі ў галаве. Ох Госпадзе, колькі людзей спазнала, якая цяжкая можа быць галава! Яшчэ дзень, яшчэ вось няшмат часу так паляжаць, капітуляваць, нічога не рабіць... Сілы таялі, быццам воск. Дзесьці коцішся ўніз па пахілай, а можа й стоць падаеш. І ведаеш, што ўжо ня будзе супыну аж пакуль ахутае цябе поўная й вечная цемра. А пасьля труп твой выкінуць у нейкую агульную яміну.

Ратунак прыйшоў зусім неспадзявана. А ім сталася Янукова чарга ў лазьню. Ледзь давалачыўся. Нехта памог. Нехта вытлумачыў, што кароста баіцца чысьціні, што пасьля мазі Вількінсона трэба добра выпарыцца, вымачыцца. І зірні: вунь за пару дзён пасьля лазьні кароста пачала раптоўна зьнікаць, шырэй адчыніўся рот. Аздараўленьне аслабленага цела йшло паволі, але кульмінацыйны крок зроблены, працэс дужаньня пачаўся.

Неякі тыдзень пасьля тэй лазьні Янука паведамілі, што суд пакараў яго на чатыры месяцы вязьніцы за нелегальны праезд чыгункай. Гэткае паведамленьне пачуў у канцылярыі вязьніцы. Сухі ўрадніцкі язык сказаў яму пра суд, але адмовіўся паінфармаваць Янука дзе й калі той суд адбыўся й чаму яго, Янука, на суд не паклікалі. Калі загадалі вяртацца ў камэру, Бахмач паслухмяна паплёўся за вартавым. Чатыры месяцы! І за што? За праезд чыгункай. Усё-ж адкрылася нейкая шчыліна, прадушына, відаць быў наперадзе нейкі рубеж. Ужо

падарозе ў камэру Янук аблічыў, што калі нічога ня стане ўпоперак дарогі, то павінен апынуцца на волі 24-га сакавіка.

І назаўтра пасьля таго прыгавору выслалі Янука на працу. Вёў іх мясцовы, у цёмна-зялёным шынялі, із доўгай савецкай стрэльбай, менскі Беларус. Ішлі на правым баку вуліцы й вартавы часта аглядаўся, мусіць, каб групу ягоную ня пераехала якая вайсковая машына. Прайшоўшы некалькі кварталаў, спыняліся ля новабудаванага, у вадным крыле незакончанага высокага будынку з чырвонай цэглы. Навокал - хлам і руіны. Раніцай, калі добра цяў мароз, раскладалі вогнішча. Навокал будынку, прынамсі з фронту яго, стаяў высокі драцяны плот. Вартавы вязьняў не падганяў, адно спанукаў каб выглядалі вельмі занятымі, калі працавалі пры тачках з кіркамі й лапатамі. Ведама-ж, пасьля жыжкі, прысалоджанай цукарынай і маленькага кавалка цьвёрдага, як цэгла, хлеба на сьнеданьне, многа не напрацуеш.

- Давайце, рабяты! На хлеб мусіце зарабіць! - усьміхаўся вартавы.

«Рабяты» разумелі колькі й як мусяць яны на той нікчэмны хлеб працаваць. І гэтак, стоячы ля вогнішча, пакуль узяцца за кірку, тачку ці лапату, Янук адразу пачаў разглядацца. Па суседзтве ўзвышаўся цікавы будынак. Сьпераду, паўколам, стаялі высокія, круглыя слупы, а корпус ягоны, вялізных разьмераў, быў, відаць, адно часткова пашкоджаны. Што ў тым будынку месьцілася падчас савецкае акупацыі, Янук ня ведаў. Адно цяпер там, як выглядала, важная была ўстанова. Будынак быў абгароджаны плотам, а ў браме стаяў вайсковы вартавы. На машце лунаў бел-чырвона-белы сьцяг. І вось раніцай, дзесьці каля гадзіны восьмай, праз слверык нацянькі, да гэтага будынку йшлі цывільныя й вайскоўцы.

За некалькі дзён. прыглядаючыся ім, Янук ужо распазнаў некаторых афіцэраў Беларусаў, што да гэнага часу ўжо вымантажылі ў Немацаў права на арганізаваньне некаторых вайсковых адзьдзелаў. Гэтак, кажнае раніцы бачыў ён высокага, із прыкладнай вайсковай вытрымкай афіцэра, што бадзёра, ізь цёмнарудой тэчкай пад пахай, крочыў на працу. Гэтага Янук бачыў некалі ў Вільні, калі прыяжджаў на сьвята выпускнікоў Віленскай Беларускай Гімназіі. Гэта тады, прыгадаў Янук, ізь вялікай зайздрасьцю пазіралі на яго віленскія студэнты. Як-жа! Беларус і ў чыне маёра. Гэта не абы-што. І адно пасьля даведаўся Бахмач, што да яго пабег з просьбай Лявон Загорны,

калі ён, Янук, трапіў у вязьніцу. А афіцэр гэны, што выглядаў надта заняты, прагнаў Лявона, як назойлівага авадня.

- Выходзьце адсюль! - крыкнуў, - бо калі будзеце дакучаць, дык і вас загадаю арыштаваць!

Калі бачыў Янук раніцай гэных беларускіх афіцэраў, што йшлі на працу ў будынак, дзе, як пасьля, даведаўся, месьцілася Беларуская Цэнтральная Рада, хацелася выскачыць катораму насустрач, схапіць яго за руку, ды прасіць: - Даражэнькі, памажы мне! Я-ж беларускі патрыёт, студэнт віленскай беларускай гімназіі. Мяне нізавошта пасадзілі ў вязьніцу. Я прйду вам памагаць, пайду ў беларускае войска, бо нам трэба супольна за Беларусь змагацца. Памажыце мне, дарагія!

У Януковым уяўленьні складваліся словы просьбы, кароткай і абавязкова драматычнай, каб зьвярнуць увагу гэтыцх людзей, якія, пэўне, будучы пры ўладзе, маглі-б сваімі, ведамымі ім сьцежкамі, спрычыніцца да таго, каб Янука пусьцілі на волю. І ледзь-ледзь ці раз Янук ужо ня кінуўся да іх. Але... Добра, што не адважыўся. Бо калі той маёр Чмель пагражаў арыштам ягонаму сябру Загорнаму, каб не дакучаў, дык як-бы ён зрэагаваў, калі-б з групы вязьняў, што працавалі пры ачышчэньні руінаў, выбег яму насустрач схудзелы юнак ды пачаў вярзьці нешта зусім нясумяшчальнае з тымі думкамі, якія ў той час мог мець важны афіцэр падарозе да сваіх дзённых, пэўне-ж вельмі важных заняткаў? Ён-жа ў той час мог разважаць пра хады й пералазы для пабудовы вялікай беларускай арміі, мог укладаць якія вялікія пляны. А тут, раптам, насустрач, із крыкам - ратуйце! - вязень, які ўцёк спад аховы вунь таго вартавога. Чаго добрага, афіцэр мог-бы выцягнуць з кабуры пісталет і тут-жа юнака застрэліць.

А ў гэты чырвоны будынак плыло што іншае: у рудых, партыйных мундзірах і пераважна з шафёрамі на аўтамабілях, прыяжджалі запраўдныя валадары паняволенай зямлі. Пры ўездзе таксама правярала іх варта. Гэтта, відаць, быў гэнэральны камісарыят Беларусі. Але адкуль Януку было тады пра гэта ведаць? Каго спытаешся? Спрабаваў пацягнуць за язык свайго вязьнічнага вартаўніка.

- А табе што да таго, хто тут працуе? - буркнуў той.

І запраўды, якая розьніца? Вось перад табой тачка, кірка, лапата. Разьбівай побач мёрзлы мур, кладзі на тачку, адцягвай вунь далей у гэну кучу. Трывай. Даваццаць чацьвертага сакавіка будзеш вольным. А да таго часу трывай. Падзякуй Богу, што ад каросты выжыў, што

дыхаеш цяпер сьвежым, а ня смуродным удушлівым вязьнічным паветрам.

А ў тым чырвоным будынку, чуваць, званілі тэлефоны, скрозь гучэла нямецкая мова. Розныя таўстапузыя партыйныя валадары гэтай паняволенай краіны наматвалі й разматвалі ўсялякія, Януку няведамыя, клубкі, дзякуючы якім павінен быў жыць, мардаваць і дзеяць акупацыйны апарат гэтай зямлі.

Перад абедам да вушэй вязьняў далятаў бразгат пасуды із сталовай, а насы казыталі пахі страваў кухні. Пахі тыя, асдабліва мясныя, дражнілі вычарпаныя арганізмы. А галава марыла пра тое, каб калі-небудзь сесьці за добра застаўлены стол, убачыць перад сабой чыстую талерку, з ножам і відэльцам побач, спажыць чыстую й нармальную страву, абавязкова ізь нейкай добрай скваркай ці кавалкам мяса. Якая гэта вялікая мара! Нешта недасягальнае.

Дзесьці пасьля таго, як зьбіраліся на абед нямецкія вяльможы, калі грала ў сталовай музыка й даляталі на руіны вясёлыя галасы, лёгкі жаночы сьмех, дзесьці ў той час вязьням прынасілі зь нейкай, а можа і з гэнай кухні вялікі гаршчок духмянага гарохавага супу. І кажны дзень, і абавязкова гарохавага. Суп той пахнуў мясам, быў надта густы і яшчэ адно важнае: быў вельмі й надта гарачы. А маладому, дарэшты зьняможанаму арганізму, які прагнуў нечага тучнага, якраз тая гарачыня была найбольш патрэбная. І хоць скупая порцыя супу з бляшанай круглай банкі занадта скора апыналася ў бурклівым жываце, тыя некалькі хвілінаў, калі яго спажывалася, здаваліся найбольшай насалодай на сьвеце. Усё-ж гарачы густы гарохавы суп - гэта ня тая турэмная баланда, дзе «крупіна за крупінай ганялася з дубінай».

У вадзін зімовы дзень далёка перад полуднём, да плоту, што перад будынкам камісарыяту, прыблізіўся апрануты ў чырвоны, даволі палінялы ў ужытку паўшубак, сівыя паўсуконныя штаны, упхнутыя ў рудыя боты й баранкавую шапку на галаве высокі ростам чалавек. Пад рукой трымаў кужэльную торбачку. Затрымаўся, здалёку разглядаў групу вязьняў. Ягоны прадаўгаваты, з рудынмі вусамі, пабіты ў разоры твар паясьнеў, а ў блакітных вачох зьявіліся іскры радасьці.

- Янук!

Голас, здаецца, знаёмы, даляцеў да Януковых вушэй разам з гукам кіданай у тачку цэглы. Што за капрыз гукаў. Хлапец нагнуўся, каб прадаўжаць працу, але кліканьне паўтарылася. Воддаль крокаў дзесяць

вартавы спакойна круціў з газэты й самасейкі чарговую папяросу. Янук перш зірнуў на яго, а пасьля спасьцярог куды той пазіраў. Ля плоту стаяў чалавек, што пільна ўзіраўся ў яго. Хлапец ня верыў сваім вачом. Ён кінуў працу, падыйшоў да вартавога.

- Гэта мой бацька, - сказаў ледзь чутна, з хваляваньнем.

Вартавы ўлажыў ў рот скручаную папяросу.

- Ага, - адказаў юнак і ўсьміхнуўся да дарагога яму чалавека.

- Ты-ж знаеш, што на рабоце візітаў няма, - адказаў вартавы.

Янук ня верыў сваім вушам. Няўжож гэты мянчанін не дазволіць яму сустрэцца з родным бацькам? У голасе вартавога ня было фінальнасьці.

- Бацька прыехаў з дому за дзьвесьце кілямэтраў... Як-жа так ні спаткацца?

Канвойны стаяў і думаў, пазіраў то на бацьку, то на Янука.

- Хадзі сюды, - кіўнуў ён галавой Пракопу Бахмачу. - А вы чаго вочы паказелілі? - зьвярнуўся да чатырох іншых вязьняў, што спынілі працу й прыглядаліся візытару. - Прадаўжайце!

- Няхай сабе, спаткайцеся, але каб начальства ня бачыла, - сказаў вартавы, праводзячы Янука далей ад чырвонага дому. Пракоп абыйшоў плот і воддаль, у засягу зроку вартавога прыблізіўся да сына.

- Тата, як ты тут? - спытаў юнак. Пасьля дакараў сябе за тое, што ня кінуўся бацьку на шыю, не расцалаваў яго з радасьці. Але, відаць, заміналі гэтаму ранейшыя суадносіны, тыя даўгія спрэчкі, бацькава неразуменьне новага пакаленьня. Абое прыселі на кучы цэглы й бязь ніякае цяплыні, быццам учора бачыліся, пачалі гаварыць.

- Як я во тут? Прыехаў во, дый усё, - адказаў Пракоп.

- Тата, ня трэба было, такую даль...

- Сынок, ты ня ведаеш бацькавага сэрца. Начамі ня мог я спаць. Нялёгка гэта. Колька разоў езьдзіў у Глыбокае, каб білет далі. Нялёгка мне...

Бацькаў голас раптам абарваўся, а Януку нейкі камяк залажыў горла. Колькі цяжкасьцяў мусіў перамагчы гэты гаротнік, каб знайсьці яго ў так далёкім горадзе, ды яшчэ ў вязьніцы! Але Янук, згодна раней засвоенага ім правіла, намагаўся, каб не паказаць слабасьці, хоць куды лягчэй было-б расплакацца.

- Ты, тата, быў у турме?

- Ага, быў.

- І яны табе сказалі, дзе я ёсьць?

- Ды дзе там... Сказалі прыйсьці заўтра вечарам на візыту.

- Калі тое было?

- Ды ўчора сказалі.

- А як-жа ты мяне знайшоў тут?

- Рашкевічыха сказала.

- А яна ведала?

- Ну ей-жа Лявон Загорны гаварыў куды ты папаўся. А пасьля яна колька разоў даведвалася ў цюрме, дый мусіць неяк вынюхала куды цябе на работу ганяюць.

- Глянь ты, гэта-ж залатая жанчына, - дзівіўся Янук. - А сама ні прыйшла мяне адведаць.

- Ні здаровіцца ей, можа й прыйшла-б.

- Добрая вельмі жанчына. Ты ў яе задзержыўся?

- Так. Ды от знаіш, прывёз табе кавалачак сала, але як увідзіў, што ў бядзе Рашкевічыха жывець, дык ей трошкі даў. Ну за гэта прабач.

- Німа за што прабачаць. Добра зрабіў.

Калі бацька пасьля перадаў яму торбачку, знайшоў там Янук паўбохана чэрствага хлеба, кавалак сала, некалькі сухароў, ды яшчэ добра адлежаных на гарышчы ў кастрыцы сочных пахучых антонавак. Пах тых харчоў, асабліва-ж антонавак, прынёс яму ў няволю духмянасьць родных гоняў.

Янука як апякло, калі бацька сказаў яму, што Лявон Загорны бегаў прасіць маёра Чмеля, каб памог вызваліць Янука. Гэты Чмель, тойсамы, каторага бачыў раніцай як сьпяшыў на працу, каторага, - ох, жах! - думаў сам прасіць, каб зь няволі выратаваў, гэты самы маёр Чмель прагнаў Загорнага з канторы, пагражаючы яму арыштам.

Янук распытваўся пра вёску, знаёмых, асабліва пра Дуню. Бацька перадаў яму Дунін ліст, які юнак зараз-жа схаваў у кішэню. Ён расказаў бацьку агульна пра жыцьцё ў вязьніцы, ды паведаміў, што за два месяцы будзе на волі. Янук пазіраў на вартавога. Той спакойна рзглядаўся навокал, ды неўзабаве падыйшоў і сказаў: - Даволі. Я й так рызыкую.

- Відзіш, сынок, каб слухаў мяне, - пачаў яшчэ бацька на разьвітаньне, але тут Янук раптоўна перарэзаў яму:

- Тата, ня трэба. Знаю, што хочаш сказаць. Ня трэба. Я выжыву.

- Ну давайце, даволі, - налягаў вартавы.

- Бывай, тата. Дзякую за ўсё. Прывітай ад мяне Дуню і ўсіх...

- Бывай, сынок. Глядзі-ж, як выпусьцяць, то едзь адразу дамоў.

Разьвітаньне такое-ж сухое, як і сустрэча. Дзесь між імі была мяжа, а што за яна - абое добра ведалі. І пераступіць яе ніводзін не хацеў. Стары, змучаны горам селянін, і малады, цяпер фізычна зьняможаны сын. Але мяжа асталася мяжой. Павольным крокам крышку ўжо пахіліўшыся наперад, бацька спакойна, яшчэ раз яглянуўшыся, пайшоў праз малы пляц. Янук вярнуўся да працы.

- Ну что, ацец падачку прынёс, западнік? - зьвярнуўся да яго пензенскі злодзей.

- А табе што? - суха адказаў Янук.

У гэны дзень ён пільна сьцярог свае торбачкі. Але найбольш пёк яго Дунін ліст, які толькі падчас абеду, зьеўшы гарох, адыйшоўся ад іншых вязьняў, пачаў чытаць.

«Дарагі Янучок,

Каб ты ведаў, як я ўзрадавалася, калі даведалася, што ты знайшоўся й што твой тата адведае цябе» - пачала мілым почыркам каханая дзяўчына.

«Я малюся Богу, каб ты як найскарэй вярнуўся на волю. І як-жа ты, дурненькі, папаўся? Ты мне прабач, што пішу «дурненькі», - гэта так сабе ў мяне вырвалася. Ты знаеш нашыя адносіны. Калі я даведалася, што ты недзе аж у Менску ў вязьніцу трапіў, дык моцна перажывала. Вайна прыносіць розную небясьпеку, але кажны спадзяецца, што бяда яго абміне.

Знаю што ты можа ня будзеш мець магчымасьці адпісаць мне, але твой бацька раскажа мне пра цябе.

А цяпер раскажу крыху пра сябе. Вучу я ў сваей школе ў Літоўцах...»

Ліст даволі даўгі. Зь яго даведаўся Янук, што Антось забіў двух вясковых бандзюгаў, прачытаў і пра нялёгкасьць Дунінага настаўнічаньня ў вясковай школе. І пажаданьне, каб вярнуўся ён, каб разам настаўнічалі. Даведаўся й пра тое, што Дзеркачыха Ніна перабралася да мужа ў Гаці й забрала навет з сабой усю хатнюю жывёлу. Сама-ж Дуня пражывае цяпер у старых Дзеркачоў, бо дома няма як працаваць.

І наапошку:

«Чакаю цябе, міленькі. Вяртайся да сваей гарэзьніцы-рагатухі. Хоць ад часу нашага расстаньня мінула некалькі месяцаў, я зусім мала зьмянілася, а ўжо сам ты скажаш, як спаткаемся, ці папрыгажэла ці пабрыдчэла. Чакаю цябе на волі. Цалую цябе.

Адданая табе Дуня.»

Патрэбныя былі Януку гэныя цёплыя словы, як сонца й паветра. А яшчэ больш цэннынм стаўся лёгкі гумар «гарэзьніцы». Ім, як можа больш нічым іншым, падмацаваўся юнак, каб ператрываць рэшту часу ў вязьніцы й дажыць да ўжо ня так далёкага дня.

34

Дзень усьміхаўся ласкавым сонейкам, чыстым чысьцюсенькім, дзе-нідзе воўнай лёгкіх хмарынак засланым небам і зусім умеру марозным, слабым ветрыкам. Дзень, як на замаўленьне. І зьзялі ў руінах сьвежыя, рассыпаныя ноччу сьняжынкі, куды весялей спрэчкі вялі вераб'і. Асабліва гэты дзень для беларускай сталіцы, а ўжо зусім адмысловы для Янука - першы дзень волі.

Учора, калі выпусьцілі, ня ведаў як ісьці без канвою, па бакох аглядаўся. Ня верылася, што вось ён сам ставіць свае крокі ў які хоча бок. Цэлы вечар у Рашкевічыхі, быццам губка ваду, піў-глытаў усё новае, яму яшчэ кагадзе зусім недаступнае: што на вайне, што ў горадзе й на Беларусі наагул, што на шырокім сьвеце. Дзе фронт, хто каго й як? І даведаўся, што сяньня мае на Пляцы Волі быць. Кажную драбніцу пачутага абмяркоўваў, ацэньваў-узважываў, з большай развагаю ў сьвятле практыкі перажытага прымерваў...

На Пляцы Волі сабралася ўжо шмат цывільных. Прыйшло й войска. У чорным... Паставілі ў казлы зброю, фармаваліся прастакутнікамі пад крыклівую каманду. Казалі па радыё, што мае быць выпуск афіцэраў і падафіцэраў Беларускай Самааховы. Дык чаму яны ў чорнай вопратцы? Можа пасьля ім зялёную дадуць? Ня ведаў юнак, што згодна волі акупантаў Самаахова мела быць апранутая стараньнямі Беларускае Самапомачы, значыцца ў нейкі самаробны кужаль, а ўжо куды лепш, калі ў паўсуконьнік. Кужаль, пахварбаваны нейкай альховай карой... Дзе-ж фарбу возьмеш?

На загадцы колеру вопраткі гэных стройных і добра падабраных, ужо навучаных вайсковага рамясла людзей, Бахмач затрымаўся адно мімалётам. Хоць жывот ягонны, дзякуючы Рашкевічысе, папаўнеў, хлапец адчуваў нейкую слабасьць, быццам вольнасьць і прыліў усяго новага, што ашаламіла яго пасьля вязьніцы, пахіснула на нагах.

Перайшоў нейкі Рубікон. Ня сам із свае волі. Яго на другі бераг, бадай, сілы лёсу перакінулі. А там, дзякуючы цярпеньню й роздумам, адкрыўся і ўстаў перад ім зусім новы, да гэтага часу практыкай нязьведаны сьвет. Апынуўся на самым доле таго сьвету, безаглядымі валадарамі якога былі вунь гэныя, што цяпер гаспадараць на сьцягамі абвешаным, шчодра ахвярнай крывёю палітым Пляцы Волі.

І прыносіць, і здаюць ім рапарты людзі ў чорным. А самі гаспадары - нейкія шрубкі ці шасьцярні збліжэй неапазнанае Януком машыны, каторая ня ведае любові, дый наагул ня мае ніякае эмоцыі. Машына тая - аграмадная гаргарына, а рухавік яе - суцэльная й безаглядная сіла. Для сьмерцяноснай машыны нічога на сьвеце, апроч сілы, ня існуе. Што з таго, што вось гэныя малыя шрубкі прыкідваюцца твайме прыяцелямі, ці - як некаторыя маўлялі, - хаўрусьнікамі па зброі супраць бальшавіцкае агіды? Ты-ж ведаеш, што яны - гэта звычайныя смактуны, што павалілі твой народ і смокчуць-цягнуць зь яго асноўныя жыцьцёвыя сокі. Чаму яны называюць сябе твайме прыяцелямі? Пэўне-ж, гэта - людзі ў масках. Тыя самыя, што спалілі, разам зь дзецьмі, жанчынамі й старымі Залатуху, Азарцы, Шабуні, што зьнішчылі сотні іншых Азарцаў. Яны з таго кодла, што закрывавіла й спапяліла не адзін пляц волі, можа пачынаючы ад Варшавы, праз Ратэрдам і Лёндан, а можа яшчэ яшчэ раней падчас гішпанскае вайны. Вышчарбіўшы пару зубоў у Сталінградзе, гэта ненажэрна-прагавітая пачвара ўсё яшчэ трывае, бо ня пераламалі ёй яшчэ хрыбетніка.

А хто гэныя людзі ў чорным? Патрыёты, ці пазадкі? Чым матываваліся яны, калі йшлі на службу? Няўжо-ж адным патрыятызмам? Які гэта патрыятызм? На Янукоў юнацкі, да чырвана, здавалася, распалены патрыятызм гэныя тучненькія «обэрмэншы»-таптуны халоднай вады лінулі. Праўда, тлела ў сэрцы іскра. А вунь, між афіцэраў на Пляцы Волі спасьцярог Янук і высокага, стройнага, прыкладна-вытрыманага ў рухах маёра Чмяля. Твар яго спакойны, самазадаволены, жэсты вывучаныя. Сямейка ягоная на Пляцы Волі

сабралася. Гаспадар паклікаў. Як выглядаў гэты маёр Чмель, калі громам абрушыўся ў сваім бюро на Лявона Загорнага, пагражаючы яго арыштаваць, калі той прыйшоў помачы Бахмачу шукаць? Зірні, які ён паслухмяны-гібкі перад гаспадаром. Што гэта за чалавек? Ці можна яму даверыць свой лёс, як камандзеру, які павёў-бы цябе на змаганьне на сьмерць і жыцьцё з ворагам? Ці дзяліў-бы ён з табой гразь і золь у вакопах, ці перавязаў-бы табе рану, ці падаў-бы табе міску гарачае стравы, ці спатоліў-бы цябе цёплым словам?

Парываньні, натхненьне, патрыятызм... Яны можа яшчэ былі, але агідны сьвет няволі, у якім Янук амаль не загінуў з голаду й хваробы, узброіў, насьцярожыў, пасеяў недавер да раней высокіх, у юнацкім уяўленьні беззаганных аўтарытэтаў. Яшчэ аставалася вера, хоць і яе разьядаюць сумлевы...

Калі гэта, што маладому Януку давялося спазнаць, пабачыць, пачуць, - рэальнасьць, дык чым тады займаецца Бог? Чаму народ, які даў сьвету Сьвятую Афрасіньню Прадславу Полацкую, Сьвятога Кірылу Тураўскага, Скарыну, Дастаеўскага, Каліноўскага, Багдановіча, Купалу й шмат іншых выдатных людзей, чаму народ, які амаль зьліўся з прыродай і нікому крыўды не рабіў, пакінуты сіламі нябеснымі на зьдзек і глум іншых? Чаму тапталі яго ўсе, як той прыказачны гарох пры дарозе?

Побач касьцёл. На яго дзьвярох, зьедзеныя непагодай, парваныя ветрам, шматкі паперы. Ледзь разьбярэш:

...нядзелі адбываюцца служ...
...ксёндз Вінцук Гадлеўскі
.....

Калішні Генэральны Інспэктар Беларускіх Школаў. Родная школа - вялікая кузьня беларускасьці, аграмадная работа для вялікага чалавека. Чалавека зь вялікай літары. Гаротніка-апостала, што пехатой прывалокся дзесь з Варшавы тады, як яшчэ курылі руіны спаленых гарадоў... каб «будаваць беларускі дом». Мусіць з занадта вялікім размахам браўся будаваць. Вырас, узмужнеў, народным, нявыгадным для акупанта аўтарытэтам стаўся. Молах загадаў яго прыбраць. У руках латыскіх забойцаў-эсдэкаў, сваякоў калішніх бальшавіцкіх

стралкоў, ці ня ў Рызе ахвярнае й пакутнае жыццё скончыў. Гэта - рэальнасьць.

Колька можна вырасьці за чатыры месяцы? Ці льга аж на столькі перайначыцца, каб запярэчыць самому сабе, ранейшаму? Выглядае, што так. Юнак у шэрай, паўсуконнай сьвітцы, бледны, слабы, худы, што цяпер стаіць пры дзьвярох касьцёлу на Пляцы Волі й прыглядаецца войску, ведае горыч рашчараваньня, безнадзейнасьць няволі, пагрозу цёмнае пропасьці, што магла праглынуць яго ў нябыт. Вытрымаў. Цяжка сказаць, як гэта ўсё адаб'ецца на ягонай душы: ці прывядзе да моцнага й трывалага гартаваньня характару, ці - ня дай, Божа, - да ўпадку. У сэрцы - сумлевы, недавер. Цяжар усьведамленьня, што свой чалавек не абавязкова зьяўльяецца тваім памочнікам. Можа быць і ваўком. Іржа сумлеву разьядае кволую тканіну маральнае асновы юнацкага характару.

Дзесьці над Дняпром тысячамі вогненных зяпаў выпальвае сабе дарогу другая пачварная машына.

«Даёш Бярлін!»

Тая, што зглуміла міліёны людзей на Салаўках, у Сібіры, Беламорканале, Калыме. Ледзянавокі, з васпаватым твара, таксама як і «обэрмэншы», дзеіць правамі прыроды. Ён - абсалют, пачатак і канец, і найвышэйшы судзьдзя, і пракурор абвінавальнік, ён і прысуд. Ён - альфа й амэга ўсяго, што пад ягонай уладай дыхае й варушыцца. Ён разьвяжа ўсе Гордыевы вузлы, усе складаныя пытаньні жыцьця ў якіх блыталіся мудрацы ўсіх народаў і пакаленьняў ад пачатку сусьвету. Непакорным прынясе вечны супакой... у магілах, а апрычнікам дасьць прылады забойства й шчодра ўзнагародзіць іх, каб прадаўжалі сваё нікчэмна-подлае існаваньне на ягонай службе. І міліёнамі распаўзуцца забойцы па цэлым сьвеце, каб гордае, вольнае й непакорнае выкараніць, а падатнае пад сваю ўладу ўзяць.

Нікчэмнік тыран прыпрог у сваю калясьніцу найбольш агіднае, антычалавечае, антыбоскае. Вунь ягоныя пасланцы, перапоўненыя гневам і нянавісьцю да высокага й шляхотнага, забіваюць у менскіх руінах. Калі не сваімі рукамі, дык правакацыямі, рукамі праціўнікаў. Колькі Беларусаў перабілі! Цяпер вайна, што ня ведае ніякае меры й літасьці. Цяпер бандыты страляюць ва ўпор. А раней? На «мірным будаўніцтве» выдушылі цьвет беларускае інтэлігэнцыі, моладзі. Каб больш ніяк і ніколі ня змог на ногі падняцца зьняможаны, зьнявечаны,

зганьбаваны народ. Душу яму адабраць і так адурманіць, каб рабом, для заваяваньня іншых, у тую вялікую калясьніцу падпрогся...

Лявіна агня з-над Дняпра ўжо ў недалёкай будучыні пракоціцца праз усю зганьбаваную й стоптаную краіну. Каб спыніцца дзесь на райхстагу, яна па дарозе падмяце ўсю моладзь. Пагоніць яе на штурм. Бальшыня моладзі ніколі ў родныя куты ня вернецца. Колькі дзясяткаў гадоў займе народу, выпаласканаму з асноўнае сілы, каб на ногі стануць? Дваццаць, пяцьдзесят? Колькі рэк ці мораў напоўняць сьлёзы радні, якая будзе іх аплаківаць? І навошта тыя аграмадныя ахвяры? Каб задаволіць ненажэрны апэтыт някчэмніка-тырана?

Народ мой шматпакутны, «пан сахі і касы», якімі мяркаваньнямі Ўсявышні табе такі лёс наканаваў? Ці даў табе на зямлі месца, каб ты стаўся спажывай зьдзічэлых, тых, што запярэчылі Ягонае існаваньне й адракліся Валадара Нябеснага?

Над плошчаю, дзе гаркаюць вайсковыя каманды, лунаюць у лагодным ветрыку й перадвясеньнім сонцы сьцягі. На адных - крыжы зь пераломанымі канцамі. Свастыкі. Быццам павукі. А побач бел-чырвона-белыя. Тыя, што нясьлі ў бой слуцкія гэроі, каторыя «пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына». Тыя, пад якімі першы раз, на поўны рост, пасьля сотняў гадоў няволі, устаў на хісткія ногі аджылы народ. Колькі яшчэ пройдзе часу, пакуль гэтыя сьцягі, як бясспрэчныя гаспадары, будуць горда й пышна паласкацца ў ветры на менскім доме ўраду, на віленскай Замкавай гары й катэдральнай плошчы, на маштах перад урадавымі будынкамі ўсіх беларускіх гарадоў ды ўсіх амбасадаў вольнае дзяржавы па ўсім сьвеце? Калі тое збудзецца, што сказаў Вялікі Прарок:

Занімай, Беларусь, маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі!?

Гук агульнае каманды «Зважай»! Выцягнулася, замерла новавышкаленае войска. Кульгаючы, абапіраючыся на ляску, чыкільгае перад фронтам калёны групэнфюрэр СС фон Готбэрг. Зь ім, крыху ззаду - нямецкія афіцэры, а ў іх ліку й пара беларускіх, адзін зь іх маёр Чмель. Групэнфюрэр высокага росту, на левай грудзіне - мэдалі й крыжы. Даўгая, бусьляная шыя, круглы, пульхны твар, зьверху закончаны шапкай з высокай стрэшкай і чэрапам сьпераду. Спад

насунатага на лоб казырка праз акуляры поўзаюць па жаўнерах халодныя й разважныя вочы. Ці групэнфюрэр СС ацэньвае патэнцыял гэтых людзей, што вось маюцца разьехацца ўсіх кутох Генэральнага Камісарыяту Вайсрутэніі, каб рыхтаваць і школіць мясцовыя сілы, ці ўжо, чуючы рэха гарматаў з-над Дняпра, думае пра дылему капітана тонучага мараплаву?

Агляд войска скончыўся й вышэйшыя афіцэры спыняюцца ля правага крыла даўгое калёны. Гаспадар аддае загад камандаючаму парады й той гучным, дзёрзкім голасам перадае каманду. З калёны выходзяць на цэнтар плошчы чатыры афіцэры. Спыняюцца, паварачваюцца тварамі да сябе, стаяць накрыж, у вадлегласьці пару крокаў адзін ад аднаго. Да іх парадным крокам падыходзіць нямецкі афіцэр. Гэта пяцёрка фармуецца на даўжыню рук, а Немец трымае парадную шпагу й ліст паперы з тэкстам прысягі, да якіх усе чатыры дакранаюцца. Ідзе каманда й усе прысутныя ў калёне, стоячы на «зважай», трымаюць левыя далоні на швах штаноў, а правыя рукі, сагнуўшы простым кутом у локцях, падымаюць уверх, далоні на вышыні сваіх пілётак. Пачынаецца прысяга.

Нямецкі афіцэр з салютам чатырох беларускіх афіцэраў у цэнтры плошчы голасна чытае нямецкі тэкст, а за ім прысутнае на плошчы войска паўтарае. Ёсьць у гэнай прысязе й пра «Гросдойчлянд», і пра «Вайсрутэнію», і пра жаўнерскую цноту, і гонар, і адданасьць, якой прысягаючыя абяцаюць гарэць у будучыні.

Пасьля сканчэньня ўрачыстае прысягі, афіцэры з Готбэргам ідуць у дом на паўночным баку плошчы і ўзыходзяць на абшырны балькон на другім паверсе, удэкараваны сьцягамі двух народаў. У гэты час войску даецца каманда павярнуць направа й стаць вольна. У групе вайсковых на бальконе наперад выходзіць куды меншы за Готбэрга ростам, чарнявы, у акулярах, чалавек у цывільным.

- Глядзіце, Астроўскі! - чуваць у натоўпе.

У прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады, - гэта добра відаць дападліваму воку зьнізу, - вялікія грудзі. Ці ня зялезную ахоўную жылетку пад касьцюм апрануў? Чаго добрага, каб хто з прысутных, - а між натоўпу можна скрыцца, ня стрэліў у гэты «сымбаль беларускай дзяржаўнасьці». Чалавек гэты, што, згодна ацэнкі памяркоўных людзей, ратаваў шмат сялян ад забойчых рук бальшавіцкіх бандаў, што запраўды стараўся памагчы, як мог, Беларусам, што апынуліся ў

скрыжаваньні агнёў, карыстаўся між сваіх немалой папулярнасьцю. І не дарма гоман у натоўпе сьціх. Прысутныя хацелі паслухаць пра пляны прэзыдэнта БЦР і нямецкіх акупантаў.

- Афіцэры й падафіцэры Беларускай Самааховы, грамадзяне Беларусі! - пачаў Астроўскі гучным, нізкім голасам. - Сягоньня мы, тут сабраныя, а з намі і ўвесь беларускі народ, сьвяткуем вялікі й сьветлы гістарычны дзень. 25-га сакавіка 1918 году ў Менску, вуснамі прадстаўнікоў беларускага народу была абвешчана вольная й незалежная беларуская дзяржава. Вуснамі сваіх выбраных сыноў і дачок наш народ заявіў, што ад гэтага часу ён зрывае ўсякія сувязі з Расеяй, якая, ня пытаючыся яго, кінула наш народ у полымя жахлівай, чужой і непатрэбнай яму вайны. Беларускі народ сказаў, што Расея, дбаючы толькі аб сваіх імпэрыяльных інтарэсах, давяла нас да найбольшай галечы, адабрала ў нас усе вольнасьці, запрэгла ў найбольш жахлівае й непасільнае рабства. І вуснамі сваіх выбраных прадстаўнікоў наш народ заявіў на цэлы сьвет, што ад гэнага часу Расея ня мае ніякага права гаварыць ці рабіць якія-небудзь умовы ад яго імя, што ад гэнага часу Беларусь абвяшчаецца вольнай і незалежнай дзяржавай! Наш народ ты самым сказаў, што ад гэнага часу ён сам, і толькі ён, будзе ў сваей хаце гаспадаром!

Пасыпаліся з плошчы гучныя воплескі. Астроўскі, які гаварыў павольным гучным і ўзьнёслым голасам, усьміхнуўся, зірнуў на побач стоячых афіцэраў, і ўпэўнена прадаўжаў:

- На вялікі жаль, нашыя ворагі ніяк не хацелі разлучыцца із сваімі плянамі панаваньня над нашым народам; зладзеі й гвалтаўнікі не маглі дараваць таго, што вось вышмыгнула зь іх рук ахвяра й намагаецца стаць на свае ногі, гаспадарыць у сваім доме. Таму, пасьля мабілізацыі новых сілаў, яны зноў напалі на маладую беларускую дзяржаву і, як вам ведама, гэтым разам на помач новапаўсталаму ў Расеі жыда-бальшавізму, што захапіў уладу, прыйшоў і выкідыш Вярсальскага трактату - шляхоцкая панская Польшча. Трактатам у Рызе яны разрэзалі на дзьве часткі жывое цела Беларусі й кінулі наш край у новую няволю. Каб поўнасьцю ашукаць наш народ і падпрэгчы яго сабе на помач, маскоўскія жыда-бальшавікі ўтварылі Беларускую савецкую рэспубліку, а Палякі ў сваей часьці акупаванай Беларусі ліквідавалі наша школьніцтва, арганізацыі, праводзілі агульны й пасьлядоўны плян асыміляцыі. Жыда-бальшавікі забралі ад нашых

сялян зямлю, загналі іх у калгасны прыгон, адабралі ад людзей права ўласнасьці, ад работнікаў адабралі права страйкаў. Яны вынішчалі ў Сібіры міліёны нашых сялянаў і інтэлігенцыі, найлепшых сыноў і дачок нашых. Толькі дзякуючы Другой сусьветнай вайне мы здабылі магчымасьць жыць без апекі ворагаў. Вялікая нямецкая армія, пад правадырствам фюрэра Адольфа Гітлера, выгнала з нашай зямлі жыда-бальшавіцкую хэўру й дала нам магчымасьць будаваць сваё беларускае жыцьцё!

У гэтым месцы Астроўскі крыху затрымаўся. Вялыя воплескі зараз-жа й аціхлі. Яны выразна выявілі тое, што думалі сабраныя грамадзяне пра гэтага апошняга «вызвольніка». Прэзыдэнт БЦР прадаўжаў:

- Мы, Беларусы, удзячныя правадыру вялікага нямецкага народу Адольфу Гітлеру за тое, што вызваліў нас ад нянавіснай жыда-бальшавіцкай няволі, даў нам магчымасьць свабодна жыць...

«Астроўскі, пэўне-ж, так павінен гаварыць, - думаў Янук, прыпёршыся да дзьвярэй апушчанай сьвятыні. - Якая тут свабода? Ці-ж ён ня бачыць, што за свабоду гэтыя галаварэзы прынесьлі? Ці-ж каму ня відаць, як карнікі вынішчаюць вёскі, жывымі паляць жанчын, дзяцей і старых, а моладзь вывозяць на рабскую працу ў Нямеччыне? Гэта свабода? Так, Астроўскі, пэўне-ж, гэта бачыць, але што ён можа зрабіць... Нашто ён? Яго ня пытаюцца, яму загадваюць. Калі можа сваей працай ён і ягоныя памочнікі палегчаць цяжкую долю беларускага народу, выратуюць каго ад глуму бальшавіцкіх бандзюгаў, эсэсаўцаў і Латышоў або польскіх бандытаў, дык тое й трэба. Хто бяз зброі, той прападзе...»

- Афіцэры й падафіцэры Беларускай Самааховы! - прадаўжаў прэзыдэнт БЦР. - Я віншую вас з заканчэньнем ваенных курсаў і з прысягай якую вы злажылі на вернасьць беларускаму народу й нашаму нямецкаму хаўрусьніку. Сягоньня й вы перажылі гістарычны дзень. Будзьце-ж верныя гэтай прысязе, высака трымайце ў сваіх сэрцах бел-чырвона-белы сьцяг і йдзіце бараніць беларускія вёскі ад маскоўскіх жыда-бальшавіцкіх бандаў. У вашых руках цяпер бясьпека нашага сялянства. Вышкаліўшы кадры на месцах, вы станецеся фундамантам новай беларускай арміі, у вашых руках будучыня беларускага народу. Маскоўская жыда-бальшавіцкая хэўра рукамі сваей партызанкі намагаецца вярнуць на нашай зямлі ненавісную калгасную ўладу, зноў

паняволіць наш народ. Біце бандытаў, каб і сьледу іх у Беларусі не засталося. Ганіце маскоўскую хэўру з нашых лясоў. На вас спадзяваецца беларускі народ і я веру, што вы яго спадзяваньні апраўдаеце!

«Словы, словы, мора словаў, - думаў Бахмач. - Колькі тут таго «фундаманту» новай беларускай арміі... Але пачатак павінен быць...»

Ізь зьмешаннымі пачуцьцямі йшоў Янук з Пляцу Волі. Зайшоўся ў рэдакцыю «Беларускай Газэты», дзе пастукаў у зачыненыя дзьверы. Сьвята. Шкада. Ад апошняга разу, калі ў іх быў і атрымаў колькі марак, больш нічога не атрымліваў. А цяпер яму, слабому й худому, нейкія грошы вось як памаглі-бы. Вечарам, пасьля доўгага чаканьня, Бахмач ад'ехаў цягніком зь Менску.

35

Стук у дзьверы хаты Падгайскага ня выклікаў ніякага водгуку й Бахмач пачаў разважаць ці пайсьці дадому нацянькі праз пушчу, ці лепш гасьцінцам. Зьлез зь цягніка вельмі галодны й наважыў забегчыся да агранома, каб есьці папрасіць. Балазе, ноччу, перамагаючы розныя нявыгады, нядрэнна выспаўся, навет пра бурклівы страўнік забыўся. Праўда дакучалі вошы, і іх, у вязьніцы нажытых, трэба будзе пазбыцца адразу, дахаты вярнуўшыся. Крышку ў цягніку скразьняк дзесьці із шчыліны прабраў. Каб, ня дай Божа, якая трасца-хвароба на хрыбет ня ўзьлезла!

Вылезшы зь цягніка, доўга прыглядаўся, як жаўнеры, быццам мурашкі шнуравалі ля мясцовай кухні. У носе казытаў запах нейкай эрзац-кафэ, маргарыны, чорнага хлеба, мармаляды. З лакомасьцю пазіраў у той, на хуткую руку да будынку вакзалу дабудаваны драўляны трысьцен, куды войска на «фрыштык» сьпяшыла. Там недзе, - прыгадаў Янук, - Марыя Іванаўна, калі нічога нязвычайнага зь ёю не здарылася, пры працы пыхцела. Пісала Дуня яму яшчэ ў Вільню, што «гэны абібок у партызаны пайшоў, каб яго трасца!» Гэта яна пра Януковага сваяка Ўладзімера. Якая гаручка яго, дурня, туды панесла? Кажуць, што яблыка далёка ад яблыні не адкоціцца. Ваўка ў лес цягне. Узгадаваны ў савецкім духу юнак так і астаўся лёяльны атруце, яму

змалку ўложанай. Што зробіш... Што з Марыяй Іванаўнай? Як гэта гаротніца, сама-самюсенькая цяпер церпіць? А можа яе немцы за сына пакаралі? Варта было-б да яе зайсьціся. А ці мае яна што есьці? Можа й ёсьць якія нямецкія, прывалочаныя з кухні, аб'едкі... Не, Янук, цяпер уздужэлы сьвежым паветрам, адразу цэлага барана зьеў-бы. Няпераможная маладосьць свайго дамагаецца. Лепш да Марыі Іванаўны ня йсьці. Калі ўсё ў парадку дык яна напэўна на працы. А калі не... Лепш пайсьці да Падгайскага. Гэта надзвычайны чалавек, ён, пэўне-ж, дома а харчоў у яго заўсёды ўволю.

Але чаму-ж ён дзьвярэй не адчыняе? Рашчараваны хлапец раптам прыгадаў, што чалавек можа быць дзесьці працай заняты. Дзень удаўся, як золата: адліжны, пагодны. Глядзі, неўзабаве жаўранкі над польнымі праталінамі зазьвіняць. Цудоўная вясна наперадзе. І ў такі час у агранома працы столькі, што не пакладай рук.

Знайшоў яго Янук у цяплярні між кучаў кампосту, ускапанай зямлі. З памочніцамі. Дзьве жанчыны, якіх Янук ня ведаў, корпаліся пры нарыхтоўцы глебы. У гэным сэктары цяплярні, дзе ня было зусім зелені, аграном, відаць, маніўся сеяць нейкую расаду. Янук увайшоў праз шырака рашчыненыя дзьверы, разглядаўся. Ягоную ўвагу зьвярнулі пышныя кветкі ў вазоніцах на сонцы. Каму аграном цяпер прадаваў гэтыя вазоны? Падгайскі, абапёршыся на вілы, якімі перакопваў чорную глебу, спыніў працу. На твары ягоным зьявілася няўцямнасьць.

- Янук? - спытаў ён із сумлевам у голасе.

- Памажы, Божа, у працы! - адказаў, як мага бойка, юнак.

- Дзякую, дзякую, браток, - распрамяніўся аграномаў твар. У кашулі бязрукаўцы, твар рыжай шчацінай аброслы, мускулістыя рукі, аграном зьзяў радасьцю й сілай.

- Яй-Богу ні пазнаў! А Госпадзе мой, ці ты, юнак, відзіў, як ты выглядаеш? Скура ды косьці. От шэльмы, гэтак хлапца высушыць! І абстрыглі-ж, баньдзюгі! Але чаго гэта я языком траплю? Ты толька цяпер зь цягніка? Калі так, дык ты пэўне страшна галодны... Хадзі, братка, хадзі, дарагі мой госьцік. Вялікую радасьць прынёс ты мне ў хату. Хадзі, брацец, зараз мы цябе падлечым.

Гэтак гаворачы, Кастусь Падгайскі аж да болю сьціснуў Янукову далоню, прытуліў хлопца да сябе.

- Братка дарагі, як я рад цябе бачыць! Хадзі-ж, хадзі!

Нейкай паўгадзіны пазьней Янук сядзеў за шчодра харчамі застаўленым сталом. Галоўнае месца на ім заняла сьвежа сьпечаная яечня, побач яе вяндліна, розная квашаная гародніна, малако, сыр, мёд, хлеб. Аж у галаве ў хлапца ад запаху харчоў закруцілася.

- Не, не, не гавары, перш добра пад'еш. Еш, братка, пасьля пагаворым, мне свае прыгоды раскажаш. Цяпер, як кажуць, чарвяка замары. Гэта-ж падумаць, шэльмы, што з хлапца зрабілі! Ах нягоднікі, каб вы прапалі!

Сам аграном, прысеўшы зь Януком, толькі прыкідваўся, што есьць, адно трымаў сяброўства.

- Бяры, братка, вяндліны паспрабуй. Яшчо, яшчо. Бяры памідоры квашаныя. Цяпер табе ўсякія вітаміны трэба. Яшчо хлеба бяры, сыр, мёд, пасьля малака добра напіся. Ні стыдайся, ні бядуй, у мяне ўсяго хапаіць.

Спанукаць юнака ня трэба было. Пабыўшы «у людзях», - як пасьля любіў жартаваць, - ён пазбыўся ведамай вясовай сарамлівасьці. Дзякаваў і еў. І наеўшыся зноў дзякаваў.

- Ня дзякавай, а бяры во яшчо, - спанукаў Падгайскі.

- Дзякую, ужо больш не магу, яй Богу!

- Ну добра. Калі ўжо так, то ніхай сабе. Цяпер апавядай, - зірнуў глыбака Януку ў вочы аграном.

- Што апавядаць? Перш можа скажыце, як там мае, як Дуня?

- Вёска стаіць, ні спалілі шэльмы. Усе твае ўпарадку, Дуня таксама. Скора ўвідзішся. Нічога ў іх новага німа. А Дуня малайчына, сама ў школе сабе раду даець.

- Як Антось Дзяркач?

- Гэты, братка, гярой. Часта яны на партызанаў выяжджаюць, даюць ім у хвост і грыву. Ну але пра гэта пасьля. Ты пра сябе што раскажы.

- Ну што расказваць? Быў у вязьніцы, адседзеў чатыры месяцы за дурніцу, - самі знаеце, - а цяпер звольнілі й маей прыгодзе, як сам ведаеш, канец.

- Ды не, ты, братка, так лёгка з маіх рук ня вышмыгнеш. Расказвай як там было.

- Бачыце па мне, не ў дабры-ж, мусіць, - церабіў у галаве Янук. - Во гэта трасца яшчо, цьфу!

- Вошы?

- А як-жа.

- Ну гэта ні біда. Удома дасі ім раду. Цяпер апавядай.

- Што апавядаць?

- Я хачу проста, каб ты выгаварыўся, можна сказаць, - калі лепшага слова німа, - каб выспавядаўся. Праўда, я ня поп, каяцца за грахі ня будзеш. Але выгаварыся. Я ня помню хто такі, - ці не Бакачыё, - некалі сказаў, што калі аднаму чалавеку пра сваю крыўду раскажаш, дык табе адзін раз палягчэіць, а калі тром, дык аж у тры разы лягчэй станіцца. Кумекаіш? Ты-ж цяперака, пэўне, крыўду ў сэрцы носіш. А каб табе палягчэла, дык трэба тым цяжарам са мной падзяліцца. Ты-ж - паэт, палымяны патрыёт. Ты тамака, у цюрме, палюючы на паразітаў, напэўна многа чаго перадумаў. Ты ня той чалавек, каторы чатыры месяцы таму назад быў. Ды за табой яшчо й Вільня. Адным словам - ты для мяне саўсім новы чалавек, ня той, каторага я некалі знаў. Кумекаіш? От і хачу пазнаць гэтага новага чалавека.

- Выглядае, вас цікавіць, што я думаю, а не асабліва тое, што я перажыў? - спытаў Янук.

- Ведама, думкі й выснавы нараджаюцца зь перажытага. Таму цікавіць мяне адно й другое.

Пасьля ўсяночнага падарожжа зь Менску, зусім новых уражаньняў на волі, а цяпер яшчэ да адказу наладаванага жывата такімі харчамі, якіх даўно не спажываў, Янук чуўся ня зусім добра. Быццам ад усяго гэтага пацяжэў ягоны язык. Таму й пачаў зь лёгкага, можна сказаць, з прыгодніцкага, з таго, што спад нагляду менскае вязьнічнае аховы могбы ці раз шмыгнуць у руіны, уцячы. Адно яго стрымлівала: уцёкшы, што будзеш рабіць без дакумантаў, калі натрапіш на які нямецкі, ці беларускі патруль? Могуць палічыць цябе бальшавіцкім бандытам. І што тады? А як дабярэшся зь Менску дамоў? Па дарозе падчас вайны, бязь ніякіх сродкаў да жыцьця, падсьцерагае цябе тысяча небясьпекаў.

Распытаўшы пра турму, Кастусь Падгайскі, зусім не спанукаючы юнака, відаць таму, каб той чуўся ў яго за сталом як у гасьцях, свабодна й паволі распытваў пра навуку ў Вільні, пра беларускі актыў, а пасьля й пра менскіх Беларусаў. Падгайскага цікавілі ня толькі выпадкі й людзі, пра якіх Янук апавядаў, але й Янукова апінія пра іх. Аграном уважна сачыў хлапца, яго рухі, мову, зручна дзе ўставіўшы ў гутарку колькі слоў ці якую ключовую фразу, каб памагчы юнаку выказацца. Гэтак спрактыкаваны й таленавіты пэдагог лёгка й амаль

незаўважна памагае выказацца нясьмеламу вучню. Асаблівай цікавасьцю загарэўся аграномаў твар, калі Янук у глыбокім роздуме пачаў апісваць цырымонію прысягі новаперашколеных камандзераў Беларускае Самааховы на Пляцы Волі, прамову Астроўскага ды свае пра гэта разважаньні. Падгайскі яшчэ й яшчэ раз перапытваў юнака, каб упэўніцца, што так а ня йнкаш пачуў адну ці іншую яго думку.

- Я падазраваў, што шмат цікавага ад цябе пачую, - пачаў нарэшце, устаўшы з-за стала й спацыруючы па абшырнай кухні, аграном. - Тое, што пачуў, мяне зацікавіла зь некалькіх прычынаў. Адна, ясна, проста людзкая цікавасьць. Хоць я павярхоўна ведаў пра твае, так сказаць, прыгоды, мяне вельмі цікавілі дэталі. Сам ведаеш, што хоць я й зьвязаны з нашымі ў Вільні й Менску, але ў Вільні я даўно ня быў, а ў Менску саўсім ніколі ня быў. Вось чаму цікавае гэта ўсё. Часы зьмяніліся. Таксама й Вільня, пра якую ты расказваеш, гэта ня тая, якую я знаў, не гаворачы ўжо пра людзей. Але мяне, - і то можа болі чым твае прыгоды, - зацікавілі твае разважаньні. Віджу з гэтага, што ты ня толькі навучыўся глядзець, але й бачыць. Ты-ж знаеш, што многа людзей глядзець то яны глядзяць, але бачыць ня ўмеюць. І я тут, - прызнаюся табе шчыра, браток, - на вялікае свае задавальненьне спасьцярог, што ты ня толькі ўмееш глядзець, але навучыўся й бачыць. Вось гэта, так сказаць, самае асноўнае.

- Ды ў цябе, аказваецца, яшчэ больш нешта. І гэта надзвычайна важнае: пасьля таго, што ты бачыш, ты навучыўся бачанае аналізаваць, па костачках разьбіраць. А гэта, трэба прызнацца, ужо нямногім людзям дадзена. Бо, ясна, кажуць, што кажны чалавек разважае. Ну што-ж, яно-ж так... Але... І гэта вялікае «але»: разважаць і разважаць - гэта дзьве розныя вялічыні. Адзін, - і гэта адносіцца да бальшыні людзей, - мерыць усё на сваю мерку, ці, інакш гаворачы, на свой капыл. У цябе, дзякуй Богу, гэтага недахопу няма. Бо гэта, - што тут будзем скрываць? - мерка на свой капыл ёсьць адсутнасьцю аб'ектыўнасьці. Адныя людзі толькі бачаныя пераказваюць, іншыя-ж разважаюць, але толькі са сваей суб'ектыўнай пазыцыі. Гэткае разважаньне зламаны грош варта. Яно ня прыводзяць да правільных высноваў. У цябе, я бачу, выступае самае найлепшае, бо намагаешся разважаць аб'ектыўна, а гэта ўжо больш, чым у іншых.

- Ня ведаю якія там настаўнікі былі ў цябе ў віленскай гімназіі. Зрэшты, ты там коратка быў. Мусіць, на цябе найбольшы ўплыў зрабіў

наш мясцовы, - дай Бог яму здароўя, - гісторык Сабалеўскі. І яшчо, ведаючы, што ты начытаўся многа й нешта пішаш, дык ты, магчыма, прыдбаў гэту аграмадную цэннасьць аб'ектыўнага разважаньня сам сваймі намаганьнямі. Як-бы там ні было, выслухаўшы цябе ўважна, як толькі мог сьцьвярджаю гэты факт зь вялікім задавальненьнем. Ня думай, што я стараюся цябе пахваліць. Нашто гэта? Я проста сьцьвярджаю гэты факт, вельмі й надта пазытыўны. Цяпер-жа, калі можна, затрымацца над твaймі думкамі, асабліва тымі, як ты выказаўся, што прыйшлі табе ў галаву калі ты назіраў прысягу камандзераў Беларускай Самааховы на Пляцы Волі, а пасьля слухаў прэзыдэнта Астроўскага...

Падгайскі затрымаўся, стануў пасярод кухні, прыглядаўся Януку, нешта доўга думаў.

- Можа вып'еш чарку? - раптам спытаў Бахмача.

Янук ня ведаў, што адказаць.

- Я, самі ведаеце, амаль ніколі ня піў, але... можа пры такой нагодзе: першы раз на волі пасьля чатырох месяцаў катушка... Можа й вып'ю...

- Вось, вось яно, - падтрымаў Падгайскі, - вып'ем за тваю волю, ці лепш сказаць, вызваленьне. Ты прабач, што я табе раней выпіць не пасуліў, але гэта я з прычыны. Відзіш, ты згаладалы, дык на пусты жывот гарэлка шкодзіць. А цяперака, пасьля таго, як ты чарвяка першага замарыў, то можыш. Ды яшчо, братка, вазьмі й добра закусі. Гэта табе на здароўе пойдзіць.

Пасьля такое прамовы гаспадар выняў з шафкі шнапс і напоўніў дзьве чаркі.

- Прызнаюся табе, што ў мяне ёсьць і другая прычына, каб ты выпіў, - сказаў аграном.

Янук зірнуў на яго зь цікавасьцю.

- А гэта тое, што як ты сказаў, у вагоне цябе скразьняк праняў. Дык шнапс - гэта добры лек. Ня турбуйся. Вып'ем па чарцы, дам табе яшчэ й другую. Гэта табе на карысьць толька пойдзіць. Вось так. Значыцца, за тваё вызваленьне! - завяршыў аграном сваю прамову.

- Дзякую. За маё вызваленьне! - усклікнуў весела Янук і адным глытком выпіў рудую вадкасьць.

- А цяперака адразу другую чарку, - наліў зноў Падгайскі. - Гэту прапаную за тваё здароўе.

Пасьля другой чаркі Янук спыніўся. Рэзкі пах гарэлкі зрабіў немалую сэнсацыю ў няпрывыклым да яе юнаковым носе, а цяпер суцэльным прыемным цяплом разьліўся па ўсім жываце.

- Бяры, братка, адразу закусвай, - спанукаў аграном, падсоўваючы да юнака тарэлку з вяндлінай, сырам і хлебам. - Бяры, ня бойся, братка.

- Дзякую, дзякую, спадар Падгайскі. Вы за мной лепш глядзіцё, чымся некалі родная матка. Я да такой ласкі аніяк ня прывык, - гаварыў хлапец, бяручы мяса.

І далей, прадаўжалася, цікавая гутарка. Адно Янук пасьля дзьвёх чарак куды пасьмялеў, пажвавеў ягоны язык. І запраўды шнапс падзеяў векльмі дадатна на ягоны настрой. Хоць і сьціплай колькасьці, ён сагрэў юнацкае цела, што амаль ніколі, за выключэньнем дрэннага віленскага піва, ня мела магчымасьці пазнаёміцца з алькаголем.

- Дык вось, прадаўжаем. Гэта я ўжо на тэму тваіх выснаваў, якія як ты мне апавядаў, зрабіў ты на Пляцы Волі, - пачаў зноў аграном. - Прызнацца табе, я тут крышку зграшу, што ня буду скромным у сваей ацэне гэных тваіх выснаваў. Што-ж, прызнаюся табе, я імі захоплены. Глыбіня думкі, абгрунтаванасьць. Ды гэта яшчо ня ўсё. Твае выражэньні, параўнаньне дзьвюх, варожых нам, сілаў да нейкіх машынаў ці сячкарняў, тых, што падпарадкоўваюцца толькі аднаму прыроднаму элемэнту - сіле. Вось гэта нешта! І гэта ўсё я чую з тваіх маладых, высушаных гэтымі бандытамі, вуснаў... Гэта, братка, на твае гады надта, надта многа!

- Ты помніш, што я на пачатку гутаркі табе сказаў, а гэта тое, што я хачу твае думкі пачуць, пазнаёміцца з новым Януком Бахмачом. Папросту гаворачы, я хацеў цябе памацаць. Апроч таго, яшчэ адно. Ты, братка, ня крыўдуй за гэта, але сказаць я мушу. Вось яно: думаю, што вязьніца табе гэна многа табе дала. Цяпер магчыма ты гэтага яшчо ні бачыш, можа навет зь нейкіх другарадных прычынаў не ўсьведамляеш, але ўсё-ж пасьля, калі пыл асядзіць, тады прызнаеш мне слушнасьць. Гэта вязьніца была для цябе першакляснай жыцьцёвай школай. За яе, - шчыра гавару, - некалі Богу падзякуеш. Не, не, ня спыняй мяне. Я ўжо хачу да канца дагаварыць. Ты яшчо расказаў мне адзін, вельмі важны момант. Гэта я маю на думцы, што мой пляменьнік Лявон бегаў да маёра Чмяля прасіць, каб ён памог табе зь вязьніцы вызваліцца. Я можа пасьля, з твайго дазволу, спынюся на гэтым маёры Чмялі. Знаю

яго асабіста й ад іншых людзей пра яго чуў. Ну, але гэта, як кажуць, напітак зь іншае бочкі.

- Хоць мяне, праўду кажучы, ня вельмі зьдзівіла тое, што зрабіў Чмель, я найбольш задаволены, што ты выцягнуў з таго правільны выснаў. От што мяне цешыць. Ты - рашчараваны, пакрыўджаны, тойсамы, які там пры генэральным камісарыяце разважаў, ці выбегчы ці ня выбегчы насустрач маёру Чмялю й прасіць ягонай помачы, ты паміма ўсяго перажытага, - а можа якраз таму, што перажыў, - на тым самым Пляцы Волі прыйшоў да адзінаправільнага выснаву. Ты сам сабе ясна здаў справу, паміма тваей вялікай эмацыянальнай заангажаванасьці, паміма таго, што ў такіх выпадках, як было з табой, ты мог-бы, - і дадам, поўнасьцю апраўданы быў-бы, - кіравацца толькі сваімі эмоцыямі, але ўсё-ж ты змог стануць вышэй, глянуць на рэчы саўсім рацыянальна й прыйшоў да такога, сказаць-бы, глыбокадумнага выснаву, што ёсьць і свае юды-нікчэмнікі. Я не хачу пра гэта доўга гаварыць, бо яшчэ ў мяне наперадзе адна тэма, якую хачу з табой закрануць, але гэта сказаць мушу. Ня кажны, - паўтараю, далёка ня кажны, - будучы на тваім месцы, такое зрабіў-бы. Гэта ўжо нешта большае. Гэта - развага, рацыянальнасьць. Відаць, што ты меў школу, што час свой у ей не растраціў, што добра людзей ацэньваеш. Аднаго, ты, братка, можа ня знаеш, ну але гэта што іншае. Гэта ты не падумай можа, ці гэты самы маёр Чмель меў да свайго такога, на тваю думку агіднага, кроку якія там-небудзь свае прычыны. Ну але я не хачу над гэтым задзержывацца. Можа пра гэтае яшчэ пагаворым. Давай цяпер пра што іншае...

Пакуль Падгайскі пачаў пра штось іншае, Янук пастанавіў яму наперад забегчы. - Як сытуацыя на франтох? - спытаў.

- Маючы намер гаварыць пра адну важную справу, я якраз і хацеў зрабіць агляд сытуацыі на франтох. Так, што выслухай. Бальшавікі, як таран, напіраюць на ўсходнім фронце. Некаторыя раёны Беларусі, як паўдзённа-ўсходні, значыцца часьць Гомельшчыны, заняты імі яшчо летась перад Калядамі. Стаяць яны дзесьці на Дняпры, падбіраюцца пад Віцебск, а там далей на поўнач націскаюць на балтыцкія краіны. На поўдні яны ўварваліся глыбака на Ўкраіну; Данецкі басэйн і Харкаў у іхных руках... Цяпер, відаць, яны рыхтуюцца да вясеньняй афэнзывы й фронт рухне на цэлай даўжыні з поўначы на поўдзень. Разумееш, што Беларусь - гэта аўтастрада на Варшаву й Бэрлін, дык тут будзіць

галоўны ціск. Кумекаеш? Трэба лічыцца з тым, што сёлета вясной Беларусь зноў апынецца ў крывавых бальшавіцкіх лапах. Да гэтага часу, можа быць, захаднія хаўрусьнікі адкрыюць другі фронт, можа дзесьці ў маі, так што Немцам надта туга прыйдзецца. Прынамсі, паводля радыя зь Лёндану, выглядаіць, што там гатовяцца да інвазіі Францыі... А Немцы із свайго боку яшчо спадзяюцца на нейкую «вундэрваффэ», значыцца дагэтуль няведамую, чорт ведаіць якую новую зброю, якая маіць саўсім запэўніць перамогу. Ня кажуць, што гэта за зброя маіць быць. Тайніца. Адным словам, сёлета на франтах будуць вялікія зрухі, а ўся наша бацькаўшчына напэўна апынецца ў маскоўскіх лапах...

Падгайскі спыніўся. Ужо другі раз зазначыў, што Маскалі сёлета Беларусь могуць заняць. Абое маўчалі. І сустрэліся іхныя вочы. А ў тых дзьвёх парах вачэй адчынілася ўся глыбіня вялікага пытаньня, на якое страшэнны жах перашкаджаў даць які-небудзь адказ. Да гэтага часу Янук думаў пра такую магчымасьць, навет у менскай вязьніцы, але жахлівую думку адпіхаў на задні плян, адгароджваў яе. Так, яно магчыма, навет праўдападобна, але-ж проста жахліва пра гэта думаць. Няхай, можа пасьля. Неяк адпаведны момант прыйдзе, калі трэба будзе, хаця-нехаця, стануць на парахунак з рэальнасьцю. Але ўсё адпіхалася. А цяпер?

Спасьцярог перапалох і ў аграномавых вачох. У крыху памутнелай ад шнапсу галаве нагальванізаваліся цяпер усе пытаньні, спалучаныя з болем сэрца. Як гэта можна было ўявіць, што бацькаўшчына зноў апынецца «у бальшавіцкіх крывавых лапах»? І цяпер вялізная часьць яе, прынамсі там, дзе гаспадарылі маскоўскія бандыты, знаходзілася пад іхнай уладай. Але галоўная, уцалелая ад вайны часьць, - а да гэтага й зруйнаваныя гарады, - ня была ў руках бальшавікоў. А тады-ж уся-ўсенькая ў іх ярме апынецца. І наступіць новае крыві пусканьне. Усю моладзь, як мятлой падмёўшы, пагоняць на «даёш Бярлін!» Жахліва!

- Так, а трэба, трэба пра тое падумаць. Значыцца, што рабіць..., - сказаў ціхім голасам Кастусь Падгайскі, як-бы прадаўжаючы Януковы думкі. І відаць, што думкі іхныя былі наладжаны на адну хвалю.

- Вы думаеце, што іхны прыход нямінучы? - спытаў Янук.

- Хіба-ж які цуд стаўся-б, чорт іх знаіць... Але, знаеш, Амэрыка й Англія зь імі. Як адкрыюць другі фронт, тады Немцам капут.

- А як наша Беларуская Самаахова? - прадаўжаў Бахмач.

- Агульна сказаць, дрэнь. Ахвотнікаў прышло многа. Так от сідзяць, ладу з таго мала. Немцы навет вопраткі ні далі, значыцца Біларуская Самапомач мусіць забясьпечыць іх. А зброя - што папала. Пераважна савецкія стрэльбы, дый тых мала. Я гэта гавару пра глыбоцкую... Мусіць, таксама і ў іншых гарадох. Да таго-ж Немцы не дадуць права на адзінкі большыя, чым батальён, ды яшчо самі будуць імі камандаваць, а значыцца нашыя афіцэры мусяць слухаць нямецкіх. Адным словам пацеха для нас невялікая. Можа сям-там, бандытам дзе на хвост наступяць, дый толькі й таго. Таму я й раіў Антосю Дзеркачу йсьці ў паліцыю, пераняць ад Палякаў, а там будзе відаць... Ведама, што цяперака бэцээр робіць стараньні, каб Немцы дазволілі стварыць беларускую армію й змабілізаваць дзяцюкоў. От, гэта калі ўдасца. Хаця... Усё гэта запозна. Нам трэба далей наперад глядзець, плянаваць...

Янук з пытальнікам у вачох зірнуў на агранома й ведаў, што той скажа нешта надзвычайна важнае, дагэтуль ім ніколі нячутае. Падгайскі зірнуў Януку проста ў вочы. І ў шэрых аграномавых вачох Бахмач знайшоў поўны давер, а твар ягоны пабацькоўску ласкавы. Так глядзелі сабе ў вочы людзі, якія доўга шукаюць адзін аднаго на жыцьцёвых шляхох і нарэшце знаходзяць абяцаную гадзіну й абяцаную сустрэчу. Ад таго моманту Янук ведаў, што лёс ягоны ў нейкай ступені будзе доўга зьвязаны з гэтым чалавекам. Магчыма Падгайскі й зьявіўся тым чалавекам, што замяніў-бы духовага бацьку, выцягнуў-бы яму руку, павёў-бы ў тую грамаду, якая, - падсьведама прадчуваў юнак, - мела-б існаваць у цэлым гэным хаосе, якая-б ведала сваю мэту й цьвёрда вяла-б да яе. Пасьля горкага рашчараваньня ў рэдакцыі ў Менску, пасьля горычы-рэалізацыі, калі прыйшлося зразумець, што ня ўсе з назову Беларусы, навет на высокіх пазыцыях, такія, як маёр Чмель, могуць і хочуць табе памагчы, юнацкае сэрца спадзявалася, што ёсьць недзе чалавек, які можа ведаць тую запраўдную, нутраную беларускую клетку, дзе перапоўненае патрыятызмам сэрца маладога юнака знойдзе прыстанішча, сяброў, дзе будзе крочыць побач іншых, такіх самых адданых, як ён да агульнае мэты.

- У нас ёсьць свая арганізацыя, - пачаў цішэй, амаль кансьпірацыйна, Падгайскі. - Гэна арганізацыя незалежная ад ніякіх

Немцаў ці іншых так званых вызвольнікаў; яна створаная самымі чыстымі й адданымі беларускімі патрыётамі, каб змагацца за вольную й незалежную Беларусь. Гэта арганізацыя, з практычных мяркаваньняў, кансьпіратыўная. Яна апіраецца на свае беларускія сілы. Да яе належаць людзі, што ёсьць і ў цяперашняй беларускай цывільнай адміністрацыі, і ў войску. Яны аб'яднаныя адным жаданьнем - здабыць незалежнасьць Беларусі. У людзей гэтых адна й вельмі простая ідэя: выкарыстоўваючы ўсякія магчымасьці, стварыць свой моцны кулак, зьвязацца з заходнімі хаўрусьнікамі, каб іх выкарыстаць у будучай вайне за вызваленьне Беларусі. Вызваленьне, трэба сказаць, абапіраючыся на свае сілы. Гэтыя людзі - абсалютныя рэалісты. Яны зрабілі выснаў, што нельга пакладаць надзеяў, як да гэтага часу розныя беларускія палітычныя групы ці партыі рабілі, на тое, што нам якія-небудзь чужынцы памогуць стануць на ногі, збудаваць сваю дзяржаву. Гэта арганізацыя цьвердзіць, што мы павінны вучыцца на нашых гістарычных памылках. А гісторыя гаворыць, што дагэтуль нашыя спадзяваньні на помач каго-небудзь чужога ніколі не апраўдаліся. Я не хачу табе даваць прыкладаў. Сам вучыўся гісторыю Беларусі, значыцца іх ведаеш. Коратка гаворачы, ідэялёгія гэтай арганізацыі зводзіцца да наступнага: ані Палякі, ані Маскалі, ані Немцы ніколі нам вольнай Беларусі ні дадуць. Мы мусім, выкарыстоўваючы ўсё, мы можам здабыць вольную Беларусь самі. Гэта зусім проста й ясна. Згаджаешся?

- Здаецца, - адказаў нясьмела Янук. - Але як, якімі сіламі? Вы прабачце, спадар Падгайскі, я ня вельмі гэта ўсё разумею.

- Ня турбуйся, што адразу не зразумеў. Гэта цяжка зразумець навет некаторым старым і спрактыкаваным нашым дзеячом. Відзіш, у навейшай беларускай гісторыі да гэтага часу ніхто так проста й ясна гэтага пытаньня ня ставіў. А яго ня так лёгка зразумець. Перш за ўсё, у бальшыні нашых людзей, навет самых перадавых і беларускай справе адданых, ёсьць комплекс народнай ніжэйшасьці. Ворагі выпаласкалі нас духова, на працягу стагодзьдзяў ўбівалі нам у галовы, што мы - гэта мужыкі, пагной, толькі здатны ім служыць. Гэтым часам яны адабралі ў нас веру ў свае сілы, паняцьце, што мы ёсьць ня толькі ня горшыя, а ў некаторых адносінах навет лепшыя за іх. Яны зруйнавалі ў нас чалавечую годнасьць, значыцца зламалі нам хрыбетнік, на якім трымаецца ўся нацыянальная й духовая вартасьць чалавека. Яны

нішчылі нашыя духовыя вартасьці, ганьбілі нас маральна стагодзьдзямі. Першы крок, - стануць на свае ногі, - мы зрабілі ў васемнаццатым годзе, калі абвесьцілі дэмакратычную незалежную Беларускую Народную Рэспубліку. Гэта быў вялізарны зрух, улічваючы, што бальшыня народу знаходзілася тады ў летаргу, як-бы ў сьне; была нацыянальна нясьведамая, толькі адзінкі бачылі куды вядуць і што рабіць трэба. Гэныя адзінкі, гэта, - як Палякі гавораць, і ты пэўне тое чуў, - гэта страцэньцы, значыцца згубныя. Праўда тварцы акту дваццаць пятага сакавіка былі рэалістамі; яны ведалі, што незалежнасьці Беларускай Нардонай Рэспублікі ня ўдасца ўдзержыць, але ўсяроўна трэба распачаць працэс, палажыць першыя вянцы свайго дзяржаўнага дому, або глыбака закінуць у народ ідэю, што ён зможа, калі напружыць свае сілы, стануць на свае ногі. Кумекаеш?

- Разумею, ды нешта ні саўсім. Як гэта нам самім здабыць нізалежнасьць удасца, ды цяперака гэткай страшнай вайной? Дзе мы возьмем зброю? Дый што, будзем на два франты біцца?

Падгайскі адказаў не адразу. Ён зірнуў з адценьнем нейкай загадкі на твары, быццам хацеў сказаць нешта зусім знамянальнае.

- Зусім ня дзіўлюся, што так гаворыш. Гэта нармальная рэакцыя. Іншага ад нашых цяжка спадзявацца. Мне самому не давялося лёгка, пакуль зразумеў усю веліч ідэі й цьвёрда стануў на яе грунт. Гэта тая самая ідэя, каторай карыстаюцца ўсе духова вольныя народы. Нам зразумець яе нялёгка таму, бо, як я ўжо раней казаў табе, нам чужынцы стагодзьдзямі ўбілі ў галаву думку, што мы чамусьці горшыя за іншых, што мы прыдатныя толькі на нейкіх пахолкаў, значыцца можам тольклі іншым служыць. І гэтай, вось такой нявольніцкай атруты нам цяжка пазбыцца. Трэба пераўзгадаваньне.

- Трэба ўбіць нашым людзям у галовы простую праўду, што яны маюць на гэтым сьвеце такія самыя правы, Богам ім даныя, як і ўсе іншыя народы, што няма народаў-паноў і народаў-рабоў. Мы маем тутака такое самае Богам дадзенае права быць і вольна жыць, як усё іншае, Богам створанае. Як і ў прыродзе: зірні, усе расьліны, усе зьвяры, кажнае самае наймалейшае мае права быць і разьвівацца й выкарыстоўваць усё навокал сябе. Праўда адно зь іх слабейшае, а другое мацнейшае. Таму йдзе вечнае змаганьне.

- Ты-ж сам гаварыў, выказаў свае думкі, што меў на Пляцы Волі, што гэныя дзьве машыны-аграмадзіны дзеюць правамі прыроды, яны

не прызнаюць ніякай духовай маралі, жывуць прынцыпамі чыстай сілы. Нам такі прынцып трэба ўзяць за аснову, значыцца дзяць сілай. Пачакай, пачакай, не сьпяшы. Я ўжо магу ўгадацль тваё наступнае пытаньне. У тым то й справа, што пытаньне гэта будзе памылковым. Яно заўсёды і ўсюды выплывае ў нашых людзей, калі перад імі такую праблему паставіш. Дзе-ж наша сіла? Дзе наша армія? Мы-ж слабыя, мы ў няволі.

- Гэта праўда. Але ты прыпомні гісторыю, вазьмі хоць далёка адлеглага ад нас Спартака. Кім ён быў, пакуль на ногі ўсіх гладыятараў падняў? І прызнаеш, амаль Рым не паваліў. Крышку яму паспрыяла-бы развалiў-бы найбольшую імпэрыю на сьвеце. Значыцца наша першае заданьне - перамагчы сябе. Паверыць у свае сілы й абсалютную правільнасьць нашай ідэі. Зрабіўшы гэта, мы можам стварыць моцны кулак. Пасьля спалучыўшыся зь іншымі паняволенымі народамі, такімі, як Украінцы, балтыцкія народы, навет Палякі, - бо цяпер і яны ў падобнай да нашай сытуацыі, - мы створым вялікі й сільны кулак. Значыцца сілу. Кумекаеш? Супольнымі сіламі, з помачай захадніх дзяржаў можам маскоўскую гаргарыну разваліць і вызваліцца.

- Знаю, што гэта можа занадта новае для цябе. Запомні тое, што гэту ідэю наша арганізацыя ўжо сягоньніка праводзіць у жыцьцё. На цябе яна можа проста неспадзявана звалілася. Трэба табе часу, каб такое перадумаць, аналізаваць, і прыйсьці да правільных высноваў. Я веру, што ты гэта зробіш. Таму цяпер і ня буду далей ісьці. Толька яшчо паўтараю галоўнае: першае - абсалютная вера ў свае сілы, другое - арганізацыя сілаў, трэцяе - шуканьне хаўрусьнікаў і супольныя пляны, а пасьля гэтага ўжо дзейнасьць. Гэта занадта схэматычна, я ведаю, але прашу цябе падумаць. Калі скумекаеш, тады ўвідзіш, як усё гэта проста й правільна. Толька трэба верыць. Але, прабач, браток, можа на адзін раз, - тут Падгайскі ўсьміхнуўся, - замнога надурыў табе галаву. Дык я на гэтым і скончу. Хіба маеш якое пытаньне.

- Проста і ясна, значыцца ў галоўным, - сказаў Янук. - Але, ці можаце мне сказаць, што гэта за арганізацыя, дзе яе знайсьці? І як яна спадзяецца атрымаць помач хаўрусьнікаў з захаду?

- Арганізацыя называецца Беларуская Незалежніцкая Партыя і яна цяпер тайная. Табе кажу гэта, бо маю да цябе поўны давер. Практычна бяручы, ты пра гэта нікому ня будзеш расказваць...

- Ну ясна, - згадзіўся Янук.

- Ты ўжо з арганізацыяй у кантакце, бо я належу да Беларускай Незалежніцкай Партыі. Мы выходзім з палажэньня, што пасьля таго, як разаб'юць Немцаў, захаднія дзяржавы мусяць схапіцца ўдужкі з Масквою. Можа не адразу, але мусяць. Тады яны будуць патрабаваць нашай помачы ня менш, чым мы іхнай. Кантакты й супрацоўніцтва будуць. Гэтага, бадай, і хопіць на сягоньня. Ідзі дамоў, адпачывай. Яшчо пагаворым, будзіць час.

Янук выйшаў ад Падгайскага з поўным жыватом і вельмі перапоўненай галавой. Бурліла там, кіпела, пералівалася, аж перазь берагі хліпала. Хаос. Займе шмат часу яго ўпарадкаваць.

Янук ішоў галоўнай вуліцай Гацяў, але амаль нічога навокал сябе ня бачыў. Увесь паглынуты думкамі, прасякнуты сьвежымі ўражаньнямі пасьля доўгай гутаркі з аграномам Падгайскім, ён амаль мэханічна стаўляў адну нагу перад другой і паволі пасоўваўся наперад. Адно рэзка адчуваў - да адказу наладаваны жывот. Каб хаця страўнік, замораны баландай, справіўся з такім прыбыткам!

36

Родная зямля - крыніца майго натхненьня, нянька, карміцелька, настаўніца, што мяне ўзгадавала і ў сьвет накіравала, - прыймі на ўлоньне сваё зьнядужэлага целам і акрыленага духам сына. Зь вялікага падарожжа, зноў босымі нагамі ступаю па старых, утоптаных і іншых, цяпер пустазельлем зарослых, сьцежках. Зноў і яшчэ раз аглядаю цябе новым зрокам, пільна прыслухоўваюся да тваіх гукаў, чую тваё дыханьне, насалоджваюся вясёлкамі прыроды твае. Як сьмяглы й змучаны падарожнік спыняецца й прагна п'е з аазы ў пустыні, гэтак я, што вандраваў па далёкіх дарогах, вяртаюся ў кут, што даў мне жыцьцё, каб сокамі твайме жыцьцядайнымі набрыняць. Вяртаюся да вытокаў.

Цяпер нанава прыглядаюся табе й прыслухоўваюся да цябе, правяраю твой пульс, мяркую, ці ты тая самая, што ў адлучцы доўга цешыла й прынаджвала мяне. Сумлеву няма, - і ў далёкіх падарожжах ты мне неадступна прысутнічала. Бачыў я цябе ў удушлівай камэры менскай вязьніцы й згадаў цябе на галодны жывот, схіляючы галаву

перад віленскай Войстрай Брамай. Клікала ты мяне перасьпевамі салаўёў і гарэзьліва-заманлівай усьмешкай мілай Дуні, журботным шумам дубровы й маестатам магутнага гіганта Архіпа.

Спавівала ты мяне ў нядолі й быццам мачыха ў сьвет пусьціла. Сама, пагвалчаная, ты ніколі не магла шчодра ўзнагародзіць працы дзяцей сваіх. Твой боль - нашае цярпеньне. Ведаем, што наканавана табе ўзгадоўваць добрых і шчырых, адданых працы людзей. Мо занадта добрых, якія не спанатрылі, што прыяцелем прыкінуўся вораг. Пахрысьціянску, з уроджанай ім гасьцінасьцяй, за стол чужынца пасадзілі й глум на сябе сьцягнулі. А ты, пагвалчаная, абрабаваная, трывала, як магла, даўгімі ліхалецьцямі. Цябе разьдзелі, аплявалі, ганьбавалі, а за крыўды табе ўчыненыя ім свае сьціплыя дары суліла і ўсё далей бяз думкі пра помсту трывала. І плацілі табе злом за тваё дабро, і ўкрыжавалі цябе, і памінкі зрабілі. А ты трывала й жыла. Для дзяцей, для ўнукаў выжыць мусіла. Каб некалі зноў на поўны рост усталі, каб нявольнікамі ў сваей хаце ня былі!

Зноў і зноў сябруеш ты мне ў далёкіх дарогах: зімой у дрывасеках і вясной у квецені й пчаліным гудзе, летам у духмяных красках і вадзяных плёсах, і восеньню ў сьпелых садох і сьціплых ніваў плёнах. Пахнула ты мне ліповым мёдам і пульхнымі аладкамі. Цярпеў я твой боль у зьнядужэлым бацькавым голасе й чуў гімн табе ў мілагучным хоры школьнікаў. Бачыў як таргавалі табой і зьдзекваліся над людзьмі тваімі чужнікі й свае наймiты. І чуў енк хаўтурнага галошаньня, калі народ твой, з крывавячым сэрцам, схіляўся ў сьлёзах над агульнай магілай чужынцам закатаваных нявінных ахвяраў.

Мой кут - пацеха мая й боль мой! Захапляючыся прывабным і непаўторным харaством лясоў тваіх, журчаньнем крыніцаў, пералівам колераў вясёлкі й загартаванай ўстойлівасьцю твайго пярэстага народу. Гімнам жыцьцёвае суцэльнасьці кукавала мне няпрынадная выглядам зязюля ў сьціплых харaством зьзялі ў маіх, дарогамі вандраваньняў змучаных, вачох, мілыя васількі й шыпшыны. Неадлучна спадарожнічала ты мне з грацыйнай плаўнасьцю карагоду дзяўчат на Купальле й адклікалася ў сэрцы маім нямудрымі й журботнымі, або гарэзьліва-жартаўлівымі вясельнымі песьнямі. Іншы раз тузала ты болем сэрца маё непрагляднасьцяй нядолі тваіх працавітых і Богу адданых людзей, або палоніла яго першымі ўзьлётамі каханьня мілае дзяўчыны.

Мой родны кут, як-жа цябе забыцца! Ты - мой боль і радасьць, трывога й спадзяваньне, любоў і нянавісьць, сустрэча й расставаньне. А галоўнае - у цябе маё карэньне. І ведаю, што нікому, ніякаму злыдню ніколі яго не падсеч, ніхто ня мае сілы, каб нас разлучыць. І няхай пасьля кароткіх ці даўгіх расставаньняў, прыходзяць шчасьлівыя сустрэчы. Чым даўжэй я быў ад цябе адлучаны, тым цяплейшыя й больш шчодрыя твае абдымкі.

Зноў і нанава прыходжу да цябе, прыглядаюся, прыслухоўваюся, мяркую, ацэньваю. І турбуюся: а ці так ласкава, як раней, усьміхнешся мне, а ці рассыплецца перад мной сузор'е красак прыроды твае, ці адновіш мае мары, і, самае галоўнае, - ці падмацуеш мяне целам і духам? Каб, калі патрэба прыйдзе, дужым і ўзмужнелым у наступнае падарожжа выправіць... ----------

Бацькава хата цяпер выглядала куды меншай, чымся раней. І скрып дзьвярэй, здавалася, зьмяніўся, а вокны быцца звузіліся й прыжмурыліся. А якой-жа дзіўнай, цяпер малой і запэцканай, даўно нябеленай паказалася ў куце абшарпаная печ. Гэта-ж на ёй некалі давялося вунь колькі часу праводзіць. Менш году ня быў пад роднай страхой Янук, а як усё тут паказалася цяпер нейкім чужым і недаступным. Брат Мікола, як і раней, хадзіў да Піліпа на шаўца вучыцца. Ён ня любіў ні гаршкоў, ні катлоў, ні памяла.

- Ну й што рабіць будзеш цяперака? - пытаўся Янука бацька.

Пракоп Бахмач усё яшчэ бадзёрыўся, перад гадамі не капітуляваў. Пагусьцелі ў яго на лбе барозны й зморшчанымі аздобіліся шчокі й падбародак.

- Ні знаю, тата. Разгледзіцца трэба.

- Хіба-ж у Вільню ні паедзеш?

- Куды тамака... Год прапаў, ні надраблю.

- А вучыць у школе можаш?

Пра гэта Янук ня думаў. Так, памяркаваўшы, уладзіцца ў нейкай пачатковачй школе, навет пры канцы году, не праблема. Але ці было-б гэта сугучна зь Януковымі намерамі? Бяздушная сіла ўзяла яго з арганічнае плыні жыцьця, зьняволіла на чатыры месяцы, а цяпер выплюнула. Дык пра якія намеры гутарка? Гэтта трэба, бязь сьпеху, разгледзецца, разважаць, паветра чыстага поўнымі грудзьмі глынуць, а пасьля ўжо пра нейкі праект мяркаваць. Ад вёскі быццам адарваўся й да гораду ня прыліп. Абставіны змусілі яго горад пакінуць. Вядома,

можна было пачаць ад той пазыцыі, якую некалі тут пакінуў. Вунь як на гаспадарцы рукі патрэбныя былі. Бярыся за плуг, барану, касу, граблі. Як-бы гэта проста й цудоўна было: твой дзед араў, бацька араў і ты ары. Зірні навокал: зямля на дбайлівага гаспадара чакае.

- Што ты, тата, сказаў-бы, каб я хацеў гаспадарку ў свае рукі ўзяць?

Голас гучаў бяз пераканаьня. Бацька ўважна зірнуў на сына. На твары такі самы выраз, як некалі на глыбоцкім рынку, калі да чужога тавару прыцэньваўся. Развага й памяркоўнасьць. Колькі можна даць мінімум і максімум? Ох, як ведў Янук бацькаў твар.

- Ты гэта што, кепікі зь мяне строіш?

Праз бацькаў голас прабівалася крыўда. І запраўды, навошта яго зводзіць?

- Ні табе, сынок, мяне за нос вадзіць.

Старога ліса не падманеш. Ён ужо вунь які багаж гадоў на плечы ўзваліў, але ўсё яшчэ бадзёрыцца, трывае. Яму, пэўне-ж, крыўдна, што сын задумаў у такі спосаб пажартаваць. І адразу Янука прылавіў.

Зьбянтэжаны вайной, ён яшчэ ня страціў балянсу. У Януковай памяці стаіць крыху прыгорбленая фігура на пляцы перад генэральным камісарыятам. Ледзь, здаецца, ступаюць ацяжэлыя ногі. Блуднаму сыну сьціплую падачу прывёз. За дзьвесьце кілямэтраў. Колька гэта яму каштавала? Сямейнага гнязда ахоўнік, ён на сьвет выправіўся, каб падлётка прыгарнуць, ці памагчы яму. А цяпер гэты самы сынок зь яго жартаваць асьмеліўся. Крывавыя мазалі ня могуць быць аб'ектамі жартаў, асабліва з боку жаўтаротага.

І раптам Януку зрабілася да сьлёз шкада бацькі. Каб мог, каб асьмеліўся, кінуўся-б яму на шыю, прыгарнуў, пашкадаваў-бы. Але на іхныя суадносіны паў цень гадоў, а жыцьцёвая жорсткасьць языку замінала. Не за плуг, барану ці касу яму вяртацца. Яшчэ зусім у пер'е не абросшы, пырхнуў з роднага гнязда і ўжо, відаць, не наканавана яму сюды вярнуцца. Вялікая і ім некантраляваная сіла палоніць яго сэрца, цягне й штурхае да сьветлае мары, да ўзвышанага, да таго перад чым схіляюцца ў пашане людзкія галовы. Але...

Адсюль, зь берагу роднага гнязда, відаць адно імглістыя зарысы таго, што дамінавала над прагай жыцьця, каханьнем радні... Дзесьці ўнутры ўтрывалілася стопрацэнтнае пераканаьне, што тыя зарысы стануць некалі перад ім зусім выразнай формай, што, магчыма,

паўстане перад ім у будучыні галава нейкае Мэдузы, якую мо й зьненавідзіць, але ня зможа супрацьстаяць сіле прыцяжэньня яе.

Ці-ж не Падгайскі... Як гэта ён сказаў? «Страшэньцы», значыцца згубныя... На родную зямлю зноў нахлыне зьненавіджаная бальшавіцкая пошасьць. Падгайскі ўжо адкрыў яму крыху заслоны, назваў цяпер тайную арганізацыю, якая, - ужо падсьведама адчуваў гэта Бахмач, - прыцягне яго калісьці і ў моцныя абдымкі возьме. І прадчуваў, што ня будзе яму іншай дарогі.

Як пра гэта сказаць гаротнаму, нямогламу бацьку, каторага на свой лад моцна паважаў і любіў? Божа, чаму не парупіўся Ты перакінуць зручных кладак з аднаго ў другое пакаленьне? Можа некалі ў будучыні давядзецца шкадаваць, што цяпер з бацькам ня зблізіўся, не падыйшоў да яго, не прыгарнуў, не заглянуў зь любоўю ў вочы, не сказаў ласкавага слова. Як-бы было надзвычайна добра, каб цяпер знайшоў зручную фразу, удалы жэст ці паварот, ды сказаў бацьку: - Зірнуі на мяне, тата. Я твой вывадак, цела ад твайго цела. Выслухай мяне. Я ад цябе, але мой сьвет гэта ня твой, бо я іншы. Дзякую табе за ўсё, што ты для мяне зрабі-ў і прабач, калі цябе пакрыўдзіў. Зразумей, што я мушу йсьці сваей дарогай.

І шмат, шмат чаго задушэўнага мог-бы сказаць бацьку. Але ведаў юнак, што не асьмеліцца. Заслона між імі так і застанецца. Бацька, пэўне-ж, думкамі часта вяртаецца ў сваю маладосьць, можа прыраўноўвае яе да Януковай і тое параўнаньне, магчыма, не ў Янукову карысьць.

- У цябе, мусіць, ёсьць вошы? - марудна спытаў Пракоп сына, заўважыўшы як той церабіў плечы.

- Ды ёсьць, каб на іх гаручка.

- Дык от бярыцеся, натапіце лазьню. Ты, Мікола, памажы. Усю вашывую адзежу ськінь, ды выкінь дзесьці на дрывотню. Трэба будзе спаліць. У лазьню возьмеш усё чыстае, там папарышся й пахвошчысься, каб усё турэмнае паскуства прэч. Дык бярыцеся за работу, а гаварыць яшчо будзем посьля.

Выхвастаўшыся добра распараным бярозавым венікам і добра папарыўшыся, у той вечар Янук адчуваў сябе лёгкім і сьвежым, як нованароджаным, быццам у хмарах плаваў. І гэтаму спрыяў яшчо арамат чаю за агульным сталом, дзе ў гутарцы,у прысутнасьці Алеся, Кацярыны й Надзі да познай ночы сядзелі.

І Ўладзік доктараў зусім накшым паказаўся. Ад часу, як Палякі падмялі моладзь сваей мабілізацыяй у армію напярэдадні вайны, у вёсцы падрасла новая чарга моладзі і Ўладзік, бяз сумлеву, мог-бы ўжо, - ня дай, Божа, таго! - стануць у гурце навабранцаў на іншую вайну, для карысьці іншага ворага. Фізычна ён узбуйнеў, насёрбаўся вясковай мудрасьці й ня зьнікла яшчэ ранейшая фанабэрыстасьць. Мо наадварот. Дзяўчат у вёсцы было даволі й можна было, на выбар, добра каля каторай пагрэцца. У такой сытуацыі мог сабе такі дзяцюк, як Уладзік, пазволіць на некаторую пераборлівасьць ці навет капрызы. Калісьці, прыгадваў Янук, гэты самы Зянькевічаў дзяцюк не зьвяртаў на яго часта ўвагі, а цяпер ішоў напярэймы яму, хоць язык доктаравага сына найчасьцей перамельваў вясковыя плёткі.

- Ну а як-жа Дуня Макатунішка? Яна бегае зь кім? - спытаўся Янук такім тонам быццам-бы дзяўчына яго мала цікавіла.

- Так з нашымі, каб зь кім, дык не. Алі-ж ціраз прыяжджаў да яе гэты, як яго, Аблізаны Авечка. Зь ім яна. Яна-ж цяперака вучоная. дык знаеш, сваім да яе ні падступіцца, - закасаў Уладзік вусьніну.

- Як гэта ні падступіцца? Ганаровая, ці што? Танцаваць ня пойдзіць калі папросіш, ці як?

- Як табе сказаць... Ну от вазьмі мяне. Каб я спрабаваў пасесьці да Дуні, дык пра што маю зь ёй гаварыць? Яна-ж учыцелька, начытаная, а я такі сабе просты мужык. Дык яна да такіх, як я, ані ня хінецца. А вічарынаў цяперака ня робім. Неміц кажыць, што ночы няможна, а ўдзень як зробіш? Ну а цяперака вялікодны пост яшчо...

- А гэты самы Аблізаны Авечка доўга ў яе праседжваў?

- Ды чаму-ж не...

- А ў каго яна цяперака жывець?

- У Клавы.

Амаль тое самае, хаця іншымі словамі, расказаў пра Дуню Януку Мікола.

- Алі-ж яна цябе чакаіць. Многа раз прыбягала да нас, пыталася пра цябе.

- А казала, што мяне чакаіць?

- Ага.

На наступны дзень Янук адважыўся адведаць Макатунішку, але ня ў Клавы. Калі пра што шчыра пагаварыць, - а было-ж пара што, - дык лепш бязь сьветак непакліканых. Зазірнуў у школу зараз пасьля таго,як

вучні дамоў пайшлі. Адчыняючы дзьверы чуў, як борздым тэмпам біла ў грудзёх сэрца, але зараз-жа апанаваўся, паспакайнеў. Тут працавала тая, што яго даўно чакала. Ня ўсьпеў навет добра разгледзіцца, адно на франтаваой сьцяне спасьцярог у рамках гэрб пагоні й заўважыў, што побач ня было партрэту Гітлера. Тут-жа яго зрок спыніўся на дзяўчыне, што пры стале нешта запісвала ў школьны дзёньнік заняткаў. Яго каханая. Тая, якой сьветлы вобраз так некалі песьціў ягонае ўяўленьне ў Вільні, ці ў менскай вязьніцы. Хвалістыя буйныя валосы, задуманы падпёрты левай рукой твар. Узор канцэнтрацыі. Янук зьдзеў шапку, спыніўся. Дзяўчына зірнула на яго, на ейным твары зьявілася няўцямнасьць і яна, заміж прывітаньня, пырснула голасным сьмехам.

Гэны гучны сьмех укалоў дзесьці ў незагоеную эмацыянальную рану. Бахмач зьбянтэжыўся й ня ведаў як на гэта рэагаваць. Дуня раптам спыніла сьмех, устала з-за стала й сур'ёзна пазірала на Янукоў твар. Пасінелы, здрабнелы хлапец дзіцячым выглядам скарэй мог-бы нагадваць каторага ейнага вучня, а не паважнага, пэўнага сваіх рухаў і выгляду настаўніка. Ды не. Гэта ня Дунін вучань, а той самы паэт, што сьвет некалі зьбіраўся перабудаваць і да гэнай перабудовы свайго гону ня мог стрымаць. Лятуценьнік і самародак-гэрой, абстрыжаны, худы, аж шэры, ізь сінякамі пад вачмі, у бацькавы абноскі апрануты, у суцэльным выглядзе сваім надта камічны.

Яны стаялі ў адлегласьці крокаў чатырох адзін ад другога, напорыста пазіралі сабе ў вочы. І ўгледзела Дуня ў Януковых вачох раней няпрысутную там цьвёрдасьць і яшчэ нешта. Калісьці дамінаваў там пытальнік, зьдзіўленьне, гаспадарыў шукальнік прыгодаў, а цяпер - нешта наводля апаразы, крыўднае горычы й рашчараваньня. Ранены ідэяліст. За гэтым прыйдзе злосьць, а можа й нянавісьць. Бачыла Дуня нешта падобнае ў вачох сваіх, даверлівых некалі да людзей, сясьцёр і маткі. Між Януковым зрокам і тварам, - добра памятала тое Дуня, - была некалі суцэльная, суладная гармонія выгляду. У вачох гнязьдзілася неўгамонная прага лёту, паэтычная асмугласьць, сьведамасьць знаёмства з адлеглымі гарызонтамі думак і мараў. Яны вечна нечага шукалі, танцавалі жыцьцём, заўсёды яе, Дуню, заманьвалі, да прыгодаў цягнулі й падбадзёрвалі. І добра гарманізавалі з буйнымі валосамі й сьветлым тварам. Цяпер суцэльнасьць страцілася. Калі вочы поўнасьцю не застылі яшчэ цьвёрдасьцю, дык

прынамсі ў іх ужо доўга трывала гартаваньне. Зь нейкай прычыны, - ці гэта адно так Дуні здавалася? - вочы цяпер выглядалі камічна на мізэрненькім, высахлым тварыку. Сама-ж хлапцова поза куды больш увыдатняла тую камічнасьць. Як ні намагалася стрымацца настаўніца, яна зноў пырснула сьмехам.

- Чаго так тагочаш? - шорстка спытаўся ў дзяўчыны Янук.

- Як ні рагатаць? Ха-ха-ха! Ці ты ў люстра глядзеўся? Абстрыжаны, такі сур'ёзна паважны й надзьмуты, як пузыр. Ха-ха-ха!

Янук паволі пачаў аглядаць сваю вопратку, пагладзіў рукой абстрыжанную галаву, камічна прыжмурыў вочы, ужо ўсьведаміўшы як запраўды сьмешным мог паказацца дзяўчыне. Раптам і ён, спачатку павольна, а пасьля жвавей, пачаў рагатаць. І для Янука гэта быў першы й шчыры, побач звонкага Дунінага, рогат ад няпамятных часоў. І сьмяючыся супольна, гэтак сябе заахвочвалі ды дайшлі неўзабаве да тэй мяжы, дзе па інэрцыі рагочаш із свайго-ж рогату. Дыхаць стала цяжка, у Янука набеглі ў вачох сьлёзы. Выцер іх рукою.

Дуня змоўкла. Цяпер уважней прыгледзеўся ёй Янук. У пакоі, перапоўненым двума шэрагамі лавак, запанавала цішыня. Паднечана пажвавелі ў грудзёх маладыя сэрцы й пры сьвятле праменьняў заходзячага сонца, што праз вокны зірнулі, паволі, з прагнасьцю насалоды, прыбліжаліся да сябе дзьве пары вуснаў. Янук узяў дзяўчыну ў вабдымкі раптоўна, парывіста, імпэтна.

- Ты-ж, Янучок... міленькі, ня штурмуй так, памалу, - кволым, ласкавым голасам перасьцярогі спыніла яго дзяўчына.

- Ну не шкадуй, дай-жа ты мне табой нацешыцца! - цьвёрда насядаў Янук, абцалоўваючы ейныя румяныя шчочкі й глыбака, быццам матка, што даўно згубленае дзіця знайшла, заглядаў у шырока адчыненыя, юрлівыя дзяўчыніны вочы.

- Зажурыўся па мне, Янучок?

- Ага, зажурыўся, Дунечка, моцна, моцна. А ты па мне?

- Ага, мусіць і я.

- Якое гэта такое мусіць? Прызнавайся, так ці не?

- Ну ніхай сабе...

- Ніхай сабе што?

- Зажурылася.

- Вось як. Адразу прызналася-б.

Янук зноў і яшчэ больш раптоўна, чымся раней, насеў на Дуніны вусны. Агарнула яго млявасьць, як некалі ў канюшыне ці тады над рэчкай па дарозе з Глыбокага. П'ючы нэктар каханых вуснаў, Янук зусім аслабеў, пачаў дрыжэць, але напятая юрлівасьць усёроўна трымала яго пры Дуніных вуснах. Адчуўшы хлопцавы дрыжыкі, дзяўчына адпіхнула яго.

- Даволі на прывітаньне. Дый пост цяперака.

- А што ў пост няможна?

Разгарачаны, Янук адчуваў сябе як малы хлопчык, што выцягнуў руку па пульхную аладку й атрымаў ложкай па ёй. Неўзабаве, з намаганьнем, успакоіўся, усьміхнуўся.

- Ты можа дамоў ісьці сабіралася? - спытаўся ў Дуні.

- Ды мне не сьпяшыцца. У Клавы бацькоў жыву.

- У іх харчы маеш?

- Ага. Яшчэ да вечара далёка.

Стаялі пры вакне. Сонца вызірнула з-за хмары. Над соснамі на могільніку кружылі круганы й чорнымі, абшырнымі лапікламі чарнела спад сьнегу поле.

- І ня ўгледзіш як жаваранкі зьявяцца, - сказала Макатунішка голасам, які сьветчыў, што думкі яе зусім ня пры жаўранках былі.

- Ну то расказвай што чуваць, - спанукаў Янук.

- Ты з дарогі, ты першы. Я, сам ведаеш, памалу тутака зь дзеткамі. Працы хапае. А ты на шырокім сьвеце пабываў, многа пражыў, дык і мне раскажы.

- Я перш за ўсё хачу цябе пра настаўніцкую працу спытаць, - ня ўступаў Янук. - Многа вучняў маеш?

- Ды хапае. Усяго ў чатырох клясах, мусіць, больш сарака. Было-б і больш, ды некаторыя ня прыходзяць. Знаеш некаторых людзей цямноту...

- І як-жа ты спраўляешся? Вучыш адразу дзьве клясы?

- Першую з трэцяй, а другую з чацьвёртай. Адны маюць ціхія заняткі, а другія голасам. Хіба-ж ты прынцып знаеш. Ну неяк ідзе. Ужо крыху руку набіла. Чаго добрага, а працы хапае.

- А як-жа бацькі да цябе адносяцца?

- Цяпер вельмі добра. Можа паспрыяла таму старая Плясьневічыха, якую зь недахопу кавліфікаваных настаўнікаў былі тут працаваць паставілі. Дык яна як пачала ўсялякую бязглузьдзіцу

ўперамешку з дурніцамі плесьці то ня толькі бацькі затурбаваліся, але навет дзеці пачалі зь яе рагатаць. Яна, - як бы табе сказаць? - як-бы грунт для мяне падрыхтавала. Людзі сказалі, што навет Дуня Макатунішка за яе лепш патрапіць. Праўда, некаторыя гэта так сабе із кпінкамі, ведаеш... Але скора пераканаліся, што я, хоць і «жабоцька нямытая», але настаўніца нядрэнная.

І Янук запраўды пабачыў на Дуніным сьветлым тварыку задавальненьне, што адбіваецца асаблівым колерам у людзей, калі яно ёсьць запраўдным доказам усьведамленьня собскае годнасьці.

- Цікава, якая зь цябе настаўніца, - сказаў, падумаўшы, Янук. - Хацеў-бы я ў цябе на лекцыі пасядзець.

- Хочаш пераканацца, якая зь мяне настаўніца? - з выклікам у вачох спытала Дуня.

- Чаму-ж не...

- Сядайце, Янук Бахмач! - загадала Макатунішка. - Цяпер я ваша настаўніца, а вы, Янук Бахмач, мой вучань. Толькі ўмовімся, што вы будзеце зусім шчыра й бязь ніякіх жартаў на мае пытаньні адказваць. Чаму пытаньні? Калі вы прыгадваеце, - а вы, пэўна-ж, прыгадваеце, Янук Бахмач, бо вашы здольнасьці мне надзвычайна добра ведамыя, - спадар Васько ў Глыбокім вучыў нас з дыдактыкі, што пытаньне часта цяжэй сфармуляваць, чым адказаць на яго. Ці-ж ня так?

- Так, спадарычня настаўніца, - ужо сеўшы, зь вельным сур'ёзным выглядам і скрухай у голасе адказаў Янук.

- Вось так, - пацьвердзіла, усьміхнуўшыся, Дуня. - А калі так, дык выглядае, што настаўніка, ці настаўніцу можна ацаніць паводля іх уменьня ставіць пытаньні.

- Але.

- Такім чынам, Янук Бахмач, я буду ставіць вам пытаньні, а вы на іх будзеце адказваць.

- А на якую тэму?

- На тэму вам наддзвычайна добра ведамую, Янук Бахмач. Цантральнай фігурай ёсьць вы самі, а тэмай - ваша падарожжа ці прыгоды; дэфініцыю можаце даць якую хочаце, - па сьвеце ад таго часу як з родных Літоўцаў у сьвет вас панясло. Згода?

- Згода, спадарычня настаўніца.

Дуня змоўкла, уважна пазірала на свайго «вучня», мусіць мяркуючы зь якога боку гульню слоўную пачаць.

- У сваіх адказах вы, Янук Бахмач, будзеце ашчаднымі ў словах, акдазвайце ляканічна. А пачнем мы з таго, як вы трапілі ў менскую вязьніцу. Дык вось, пытаньне: якім чынам вы, Янук Бахмач, паэт і журналіст, вучань віленскай гімназіі, настаўнік пачатковай школы, чалавек, каторы, як у нас кажуць, із добрай мазгаўніцай на плячох, ды ў вязьніцу трапілі?

- Я-ж не хацеў, спадарычня настаўніца, яй-Богу не...

- Я не пра гэта пытаюся! - адрэзала настаўніца, памахаўшы пальцам. - Які гэта дурань у вязьніцу хоча. Я пытаюся як вы трапілі?

- Вельмі проста: на менскай чыгуначнай станцыі заграблі тры вагоны спэкулянтаў...

- Вы-ж ня спэкулянт, Янук Бахмач, дык чаму й вас заграблі?

- А яны нікога там ня пыталіся. Ланцугом, із зброяй у руках абкружылі вагоны й пагналі.

- Я мяркую, Янук Бахмач, што вы нічога із сваей цёмнай прошласьці ня скрываеце. А калі яно сталася дакладна так, як кажаце, дык чаму тады ўцёк ваш сябра Лявон Загорны?

- Зусім проста: ён у дзьвярох цяплушкі стаяў, а мяне ў самую сярэдзіну ўціснулі. Калі пачаўся гармідар, значыцца Латышы наскочылі, дык ён ім з рук вышмыгнуў, а я ня ўсьпеў.

- Ага. Няхай сабе. І як-жа вам у вязьніцы паводзілася?

Янук на міомант забыўся пра пытаньне, бо быў дзяўчынай захоплены. грабны, гнуткі стан, і пад сінім свэтрам поўныя грудзі. Роўны, плаўны крок і адно ў меру цьвёрды, аўтарытэтны голас. Тут і поза, і стрыманасьць, і поўная кантроля сытуацыі. Так, з Дуні можа быць добрая настаўніца, ня горшая за калішнюю Раманоўскую.

- Вы, Янук Бахмач, не адказваеце. Паўтараю пытаньне яшчэ раз: як вам у вязьніцы паводзілася?

- Пра гэта я мог-бы цэлую кніжку напісаць. Як тут, спадарыня настаўніца, адным словам адказаць? Ці не зашмат жадаеце?

- Пра вашу здольнасьць пісаць, Янук Бахмач, нам сёе-тое ведама, - усьміхнулася Макатунішка. - І кніжкі пісаць у вадказ на гэтае пытаньне ня трэба. Адкажыце коратка.

- Паводзілася дрэнна.

- Вось гэта я й хацела пачуць. І што вы ў вязьніцы найбольш цанілі?

- Хлеб, волю й чыстае паветра.

- Ага, значыцца ўсё тое, чаго не хапала. Хлеб... Ці гэтым вы даеце мне зразумець, што цяпер вы хатні, вясковы, разовы хлеб цэніце больш чымся некалі перад вязьніцай?

- Так, спадарычня настаўніца, запраўды так. Смак хатняга хлеба пазнаеш добра адно тады як добра па сьвеце пагаруеш.

- А што вам, Янук Бахмач, найбольш у вязьніцы дакучала?

Янук падумаў.

- Вошы, - адказаў.

Дуня спынілася перад ім, доўга глядзела яму ў вочы й здалося хлопцу, што па сур'ёзным дзявочым твары сьлізнуў прамень усьмешкі ды з пашкадаваньнем пазіралі на яго вочы-васількі.

- І яшчэ што?

- Ну многа чаго, - сказаў абыякава.

Дуня адыйшлася, спынілася пры вакне й маўчала. Зноў вызірнула недзе з-за хмары сонца і арэолам асьвяціла ейныя пышныя валосы.

- Я ня ведаю, Янук Бахмач, - пачаў салодзенькі, крыху грымасьліва-дакорлівы голас, - чаму вы гаворыце толькі пра фізычныя нявыгады. А што-ж пра вашы духовыя перажыванъні? Паэт! Вы-ж павінны былі глыбока й шмат перажываць і думкі вам дакучалі пэўна ня менш чым недахоп хлеба й чыстага паветра. Пра гэта я хацела пачуць.

Янук зьбянтэжыўся. Як яна зручна падлавіла яго. Сказаць ёй, ці не? Цяпер добры час, але ці мэтазгодна?

Янук устаў.

- Віншую. Маладзец. І добра мяне падлавіла. Калі так дзяцей вучыш, дык настаўніца зь цябе добрая.

- Дзякую, Янук Бахмач, - сур'ёзна ранейшым настаўніцкім тонам прадаўжала Дуня. - Усё-ж... Зможаце, ці будзеце ласкавы мне адказаць на маё апошняе пытаньне?

- Чаму-ж не. Праўда, гэта ня так проста...

- Ну як можаце.

- Духова я найбольш перажываў і многа, надта шмат перадумаў. А аб'ектамі думак найчасьцей былі двое.

Дуня спынілася воддаль, запытальна падняла бровы й ўважна пазірала яму ў вочы. Доўга трывала маўчаньне.

- Мае дзьве любві, - сказаў ціха й скромна Янук.

- О? Якія-ж гэта? - зацікавілася Дуня.

- Мая бацькаўшчына й мая дзяўчына, - упэўнена сказаў Бахмач.

- Я магла дагадацца, - ціха сказала Дуня.

- І гэтыя дзьве любові не даюць мне супакою днямі й начамі.

- Аж гэтак? Чаму?

- Адну трэба бараніць... Чую, што на помач кліча. А за другую таксама, выглядае, трэба заступацца, калі ўжо ня позна.

Цяпер Янук пільна сачыў Макатунішку. Была зусім спакойная.

- Думаю, што бацькаўшчына кліча цябе на помач, каб яе бараніць. Патрыятызм твой ведаю. Ну а дзяўчына? Хто яна такая? Якая-небудзь паненка зь Вільні? Яна што, думаеш, здрадзіла?

Макатунішка гаварыла, адвярнуўшыся тварам да вакна й Янук ня мог разгледзець ейнага аблічча. Усё-ж зьдзівіўся як умела кантраляваць свой голас. Не магла-ж не зразумець яго.

- Ды не, якая там віленская паненка... Свой вясковы васілёк, ды дайшло да мяне, што нейакая там аблізаная авечка да яе дабіралася, дык баяўся, каб ня выскубла.

Дуня крута павярнулася. Румяны твар. Упёк.

- Ты атрымаў маё пісьмо, што бацьку твайго прасіла перадаць.

- Так, атрымаў. Дзякую. Усё-ж...

- Я ведаю, што ты ўчора ўжо вярнуўся, - пачала баржджэй гаварыць Дуня. - Мне казалі. І я ня дзіўлюся, што ўжо маглі наплясьці на мяне... Нейкі там Уладзік ці іншы пляткар. А ты што, ім верыш?

- Як табе сказаць... ні знаю.

- Дык як хочаш. Сам ведаеш, я перад табой ніколі нічога ня скрывала. А што да авечкі... Лепш ня будзем.

- Чаму-ж, раскажы. Прыяжджаў-жа, і ці адзін раз...

- Але, прыяжджаў. І ты добра ведаеш, што ў яго толькі адно ў галаве. Чаму-ж не, магла-б я цябе пазводзіць. Ня бачу патрэбы. Ты можа й падумаў што, хто цябе ведае... Я з такой сям'і... Але, калі ты такое падумаў, дык што я маю табе сказаць? І ці варта? Ты ведаеш мяне. Ня думаю, што мы некалі адно другому прысягалі на вернасьць вечную, але ці нам трэба было? І скажу табе больш, што калі ня бачыш ува мне чалавека, а толькі плоць, дык лепш вочы пратры...

Запанавала доўгае й нязручнае маўчаньне. Янука душыла гарачыня. Загнаў сябе ў тупік. Запраўды, як мог сумлявацца?

- Дуня, - сказаў ціха.

Яна маўчала.

- Дурань я. Ніколі, да гэтага часу ні прасіў цябе прабачэньня. Але цяпер можа прабачыш?

Гордая і румяная, яна стаякла ўпрытык да вакна. На дварэ шарэла. Зірнула на ручны гадзіньнік. І тады Янук наважыўся. Сталася тое так раптоўна, што пасьля, як ні разважай, ня ведаў чаму якраз у гэны момант такая думка яму ў галаве маланкай зазьзяла. П'яны, ці што? Ніколі-ж, запраўды, раней пра гэта ня думаў, Магчыма, што за апошні год дасьпеў больш, чым здавалася.

- Дуня, - прамовіў ціха і ўзяў яе за руку. - Дуня...

Нешта завязла ў роце. Не хацеў варушыцца непаслухмяны язык. А мо каханьне зусім галаву замарочыла?

- Дуня, будзь маей жонкай.

Не сказаў, а шапнуў. Можа не пачула? Шалёна білася сэрца. Цяпер стаяў упрытык да яе, адчуваў ейнае гарачае дыханьне і яшчэ... як пачалі ўсхвалявана варушыцца ейныя грудзі.

- Янучок, а Божа мой, ці ты знаеш, што ты цяпер сказаў?

- Знаю, Дунечка, знаю, - ужо з большым жарам, але крыху апанаваўшыся, сказаў Янук. - Я прашу цябе замуж.

- Во гэткага дык я ўжо ніколі ні спадзявалася, - сказала даволі холадна, як здалося Януку. - Але не, ты саўсім сур'ёзна. Яй-Богу так.

Яна высьлізнула зь ягоных рук, пайшла й села на крэсла за сталом. Доўга маўчалі.

- Але-ж і боцікі хлёсткія маеш, - сказаў Янук, абы што сказаць, абы ня было маўчаньня.

- Твой-жа Мікола адрамантаваў, - адказала Дуня.

З-за сьцен даляталі гукі вёскі, нейкае галёканьне каня з бальшака, а тут, у школьным будынку, панавала поўная ціша; здавалася, што чуваць прыскоранае біцьцё двух юначых сэрцаў. Янук стаяў пры вакне. Дуня раптам устала, падыйшла да крука на сьцябе, узяла кажушок, задуманая, пазірала на Бахмача.

Знаеш, Янучок... Што табе сказаць на гэта? Так неспадзявана...

- Дык што?

Дуня адказала не адразу.

- Падумаю. Сам ведаеш, вайна... Як будзем жыць? Гэта ні так проста.

- Дык абяцаеш падумаць? На днях мне скажаш?

- Ты лепш сам добра перадумай, ці гэта ты сур'ёзна.

- Ясна, што сур'ёзна. Хоць мне раптам...
Дуня закрыла яму рукой рот.
- Ня трэба. Падумай. Нікуды не ўцячэ.
- А ты?
- І я падумаю.

37

- А чаму ты, Антось, у Беларускую Краёвую Абарону не пайшоў? - спытаў Янук Дзеркача, які выгадна выцягнуў ногі на падлозе таварнага вагону, абапершыся плячмі аб сьцяну. Роўнамерна лякаталі колы вагону і ў змроку ледзь відаць было іншых пасажыраў воддаль пры супрацьлеглай сьцяне. Там нейкі дзядзька самагонкай частаваў сваіх спадарожнікаў. Адно праехалі Будслаў і да Маладэчна й перасядкі на Менск было яшчэ далёка.

- Я, братка, пайшоў-бы, але трэба й паліцыю ў нашых руках дзяржаць. А ў армію, калі спатрэбіцца, усьпею. Цяпер во клічуць людзей, а тых, што ўжо набралі, таксама, чую, дзяржаць, няма зброі. А калі й ёсьць, якая, дык ці то бальшавіцкая, ці ніякая... Каб армія была сільная, дык трэба і артылерыя, і танкі, і самалёты. А тутака гэта брыда бальшавіцкая ўжо на нос лезіць. А як такую баявую армію падгатовіш, калі сукіны сыны да гэтага часу нам арганізаваць яе ні пазвалялі? Жарцікі, колька вунь нашых людзей задарма лягло! Ніхай-бы так раней, скажам, у сорак другім падпругу папусьцілі... Тады мы ім, гэтай нячыстай сіле, бальшавіком так паказалі-б, дзе ракі зімуюць, што ім сам барадаты Маркс ні памог-бы. Цьфу!

Янук ведаў, што Антось у дрэнным настроі й пасьля таго «цьфу» ні раскатурхаеш яго да гутаркі. Будзе сядзець, маўчаць, адчэпнага буркне. А колькі яшчэ Янук хацеў яго распытацца. І нагода-ж! Як яно так сталася, што абое яны, як прадстаўнікі ад народу ў Менск на беларускі кангрэс едуць? Праўда, Антось быццам мімаходам згадаў, што ён і на тым кангрэсе будзе сваё адмысловае заданьне мець, адно ня выявіў характару яго. І ведаў Янук, што калі трэба будзе яму дык даведаецца. Антось заўсёды гаварыў яму ўсё, што трэба было ведаць, але мала больш таго. А калі што надта важнае й тайнае, дык яшчэ й

слова зь яго, Янука, браў, абяцаньне такое, што тайніцы нікому ня выдасьць. А пра тое адмысловае заданьне, якое меў Антось на кангрэсе мець, тымчасам не сказаў Януку ні слова.

Кагадзе паклікаў Янука, які амаль цэлую вясну ў яго пры гаспадарцы працаваў, аграном Падгайскі й сказаў:

- Хочаш, Янук, у Менск паехаць? - спытаў.

- Чаго гэта? - зацікавіўся хлапец.

Падгайскі коратка расказаў яму пра кангрэс, які склікае Беларуская Цэнтральная Рада, што маюць там быць прадстаўнікі з усяе Беларусі, у тым ліку й ад Гацкае воласьці. Янук даў аграному яшчэ некалькі пытаньняў.

- А ці я не замалады, каб быць народным прадстаўніком?

- Табе ўжо васемнаццаць мінула, значыцца маеш права й выбіраць, і галасаваць. Дый нам важна, каб на кангрэсе зьявіўся наш перадавы нацыянальны актыў. Кумекаеш?

Янук зразумеў з паўслова. Перш за ўсё гэнае «нам важна» так гучала ў вуснах Падгайскага, быццам ён быў адным з гаспадароў і арганізатараў таго кангрэсу. А яшчэ важней, што й Янук, відаць, згодна Падгайскага й іншых гаспадароў, належаў да «перадавога нацыянальнага актыву». Вось як! Бахмач аж падрос.

- А што будзе на кангрэсе, якая праграма?

- Коратка скажу: будуць гаварыць і раіцца пра цяперашняе й будучае беларускага народу. Гэта нешта падобнае, як кангрэс, што быў у сьнежні 1917 году. Разумееш?

- Але. Толькі мяне цікавіць, што Немцы дазвол далі. Бо калі параўнаць да таго кангрэсу зь сямнаццатага году, дык ён-жа палажыў пачаткі працэсу, што прывёў да абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. А цяперака, што, таксама будзем гаварыць пра незалежнасьць?

- Надзвычайна трапнае пытаньне, - адказаў Падгайскі. - Відаць, што не дарма ў цябе галава на плячох выросла. Дык вось што... Думаю, што пра незалежнасьць там будуць гаварыць, толька ня ведаю ў якой форме й пра незалежнасьць ад каго. Пэўне-ж, заакцэнтуюць, што хочам і маем права, і пастанаўляем быць незалежнымі ад Польшчы й ад Расеі. Гэта ясна. Пра Немцаў можа й памаўчаць, хоць кожнаму будзе зразумела. Дыпляматыя. Кумекаеш? Напэўна выкажуцца, што спадзяюцца ад Немцаў помачы, каб на ногі стануць.

- Ты-ж сам, здаецца, разумееш сытуацыю. Важна, што цяперака гарачы гістарычны момант: бачыш, што Немцы падаюць, а заходнія аліянты даўно высадзіліся ў Нармандыі й Немцы адступаюць у Францыі на цэлым фронце. А тутака бальшавікі ўжо пачынаюць ці скора пачнуць летнюю афэнзыву. Скора зьмятуць зь Беларусі ўсё Гітлерава войска. А мы? Мы мусім прадаўжаць змагацца з маскоўскімі акупантамі, маючы свае базы ў лясох і ўсюды, куды нашы караткаватыя рукі сягнуць могуць. І мы мусім мець нейкую гістарычную й маральную ды легальную аснову, значыцца за намі мусіць стаяць голас народу. Гэта ўсё адно з другім вяжыцца. І хоць за стрэламі гарматаў і ваенным гулам можа нейкія народы й не пачуюць голас беларускага народу, прадстаўнікі якога цяперака зьбяруцца на кангрэс у Менску, важна, што мы, сыны й дочкі гэтага народу пачуем яго й самі выкажымся. А я пэўна, што на кангрэсе наш народ выкажыцца ўва ўсіх прынцыповых пытаньнях, якія адносяццада нашай палітычнай сытуацыі й аформіць нейкую базу, на каторай мы зможам стануць у будучым змаганьні за незалежнасьць Беларусі.

Янук заўважыў, што звычайна спакойны Падгайскі гаварыў хутка, з натхненьнем, як-бы хацеў канчаткова закончыць палітычную адукацыю юнака, што даваў яму, калі меў час, цэлую вясну, калі Янук працаваў у яго.

- Коратка гаворачы, братка, - закончыў аграном, - кангрэс ёсьць афармленьнем думак, імкненьняў, спадзяваньняў і палітычных плянаў беларускага народу, сьцьверджаньнем ягоных адвечных, Богам даных правоў, на самастойнае жыцьцё. Кангрэс склікаюць ня Немцы, Палякі ці Маскалі, а мы самі. На яго паедуць найбольш перадавыя й адданыя народу сыны й дочкі Беларусі й будзь пэўны, што яны парупяцца сказаць і зрабіць тое, што трэба. Калі можа ня скажуць абсалютна ўсяго, што трэба было-б, дык скажуць і зробяць самае галоўнае. А гэта надта важна для нас і яшчэ важней будзе для тых, што пасьля нас прыйдуць. Кумекаіш?

І ў часе таго, як паднечаны такой весткай Янук слухаў агранома, які матываваў патрэбу скліканьня кангрэсу й гаварыў пра яго значэньне, Янук ужо ўяўляў сябе ў Менску. Дзесьці там, у паперах будзе запісаны й ягоны голас як аднаго з прадстаўнікоў ад Гацкае воласьці, які, ведама-ж, выкажа й жаданьні абсалютнае бальшыні жыхароў тае маленькае часткі бацькаўшчыны.

І прыгадаліся яму першыя радкі вершу, якім некалі дэбютаваў як паэт на сьвяце ўгодкаў 25-га Сакавіка ў Гацях:

Сакавік ладзіць слаўнае веча,
а ў тэатры гудзе, бы ў вульлі,
пазьяжджаліся зблізку й з далечы
пасланцы беларускай зямлі.

Цяжка было Януку асвоіцца з думкаю, што і ён возьме ўдзел у такім гістарычным зборы. Прыгадаў, як калісьці зь вялікай цікавасьцю даведаўся ад настаўнікаў пра Першы Ўсебеларускі Кангрэс, як хваляваўся, чуючы, што нарэшце беларускі народ, пасьля пару стагодзьдзяў Гальготы, знайшоў сілы, палітычны розум і мудрасьць, каб паслаць сваіх прадстаўнікоў у Менск, якія ня гледзячы на розную злыбяду з боку ворагаў, на правакацыі, на збройную сілу, пасьля доўгіх разважаньняў пра долю свайго народу, палажылі такія салідныя асновы для свайго вольнага дому, а пасьля й абвесьцілі вольную й незалежную дзяржаву - Беларускую Народную Рэспубліку. І прыгадваў далей Янук як, слухаючы таго-ж настаўніка-патрыёту, - які й сам з дрыжачым ад хваляваньня голасам апавядаў, як наляцела з усіх бакоў нячыстая хэўра, каб раскідаць фундамант пачатага беларускага дому, - балела яму сэрца й сьлёзы залівалі вочы. І вульканам кіпела злосьць. Найбольш нясьцерпным было ўсьведамленьне бясьсільнасьці. Яшчэ поўбяды, каб гэта была бясьсільнасьць адно ягоная, Янукова. Але з гэных лекцыяў гісторыі ясна відаць было, што бясьсільным быў цэлы народ. Якая ў такой сытуацыі цана адно самой дэклярацыі пра незалежнасьць?

Зь лекцыяў гісторыі ў школе й чытаньня мастацкае гістарычнае літаратуры Янук ведаў, што незалежнасьць народу й самастойнасьць дзяржавы здабываецца крывёю, ахвярамі, мукамі, цярпеньнямі. Беларусь мусіла-б мець свакго ваеннага волата нейкага Каліноўскага, што згуртавваў-бы ўсе перадавыя сілы, паставіў-бы на ногі армію ўзброеных і добра кіраваных людзей. Толька тады льга было-б прагнаць Наскалёў і Палякаў у свае загарадкі, ачысьціць родную зямлю ад паразітаў і злыдняў ды аддаць уладу ў рукі разумных і дбайлівых пра дабро народу людзей, каб зазьзяла на пагвалчаных і

прасякнутых прыгонным потам і нявіннай крывёю нівах так жаданая дый ніколі, здавалася, недасяжная вольнасьць.

І далей Янук разважаў параўнаньнямі. Тыя ў сямнаццатым годзе зьехаліся на кангрэс і хаця разагналі іх бальшавіцкія цівуны, пасьля сабраліся ў чыгуначнай майстроўні, выбралі Раду Беларускае Народнае Рэспублікі, што пасьля й абвесьціла незалежную дзяржаву. Езавітаў, як гаварылі на тых самых лекцыях гісторыі, спрабаваў арганізаваць войска, але яму не ўдалося шмат зрабіць, проста часу не хапіла. Усё-ж Беларусы тады змаглі палажыць хоць фармальныя падваліны пад незалежнасьць. А цяпер? Ведаючы азьвярэлых гітлераўцаў, што могуць зрабіць на кангрэсе ў Менску цяперашнія прадстаўнікі, у тым ліку й ён сам? Беларуская Цэнтральная Рада існуе з ласкі Немцаў. Нялюдзкі акупант, каторы агнём і зброяй вынішчыў столькі беларускіх вёсак, жыўцом спаліў так шмат нявінных людзей, ці-ж гэты акупант будзе лічыцца зь нейкай свабодна выказанай народнай воляй?

Чым больш Янук разважаў пра тое катастрафальнае становішча, тым больш турбаваўся. Пабачыўшы многа бяды на кароткім веку сваім, ці ні прызвычаіўся шмат чаго бачыць у чорных колерах. Як-бы добра было параіцца цяпер хаця-б з тым самым настаўнікам Сабалеўскім. Магчыма ён знайшоў-бы нейкі адказ. Можа яму відаць тое ці іншае, чаго ня бачыў Янук? Але побач ня было паважанага настаўніка, а драмаў Антось.

І раптам Януковы думкі перакінуліся на Дзеркача. Што за чалавек! Гэты, мусіць, ніколі ня турбаваўся, а калі часам і здаралася тое, дык прынамся не паказваў хваляваньня. Як ён выдатна сябе кантраляваў. Яшчэ працуючы ў Падгайскага, што добра яму плаціў, Янук часта бачыў Дзекача ў Гацях. Пры нагодах апавядаў яму розныя баявыя прыгоды ў змаганьні з бальшавіцкімі бандамі. Антось быў два разы ранены, раз у лытку, іншы раз у бок. Вылячыўся й выхадзіў тыя раны і, як-бы нічога ніякага, з ранейшай адвагай і вынаходлівасьцю езьдзіў зь сябрамі ў засады на бандытаў, як мог абараняў беларускіх сялян ад Немцаў і Латышоў. Ці адна вакольная вёска пайшла-б яшчэ з дымам, калі-б не гацкая паліцыя, што ачышчала ад бандаў засьмечаныя раёны. І Антось першы зь першых, найбольш руплівы. Дзе хітрасьцю, а дзе сілай. Вось дзе чалавек! І заўсёды спакойны. Што давала яму той спакой?

- Браток, Янук, - ці раз казаў Януку Антось Дзяркач, - кроў за свой народ праліць трэба, але лепі ні сваю, а чужую.

Гэта Антось мог сам выдумаць, або ад некага пачуць.

Або вось такое: - Калі ўжо й галаву злажыць дзе прыдзецца, дык дзякаваць Богу, за сваіх, а ні чужых.

І цяпер Антось Дзяркач ехаў на кангрэс, апрануты ў цывільнае, зь нейкім асаблівым заданьнем. Зь якім? Няцяжка было дагадацца. Нешта даручыла яму Беларуская Незалежніцкая Партыя. Так. Пра тую бээнпэ Яну даведаўся больш. Арганізацыя цалкам тайная ведаў, што зь мясцовых належалі да яе адно Падгайскі й Дзяркач. Было-ж, пэўне, больш сяброў, прыкладна той чалавек, каторага аграном даўно ўмясьціў у гацкую паліцыю, калі была яна яшчэ ў Бжончыкавых-Бронхэравых руках. Свае вочы й вушы. Хто гэта такі? Янук так і ня ведаў. А ці ведаў Антось тую асобу? Янук яго ніколі пра гэта ня пытаўся.

Зразумела, што бээнпэ магла мець больш сяброў у Гацях. Янук мяркаваў, што арганізацыя ня была масавай, бо ў масе расплываецца кансьпірацыя. Гэткая тайная арганізацыя часта стварае хвальшывы фронт, значыцца нейкую іншую арганізацыю, якую выкарыстоўвае як франтавую, каб змыліць праціўнікаў. Бахмач лічыў сябе зялёненькім у нейкай кансьпірацыйнай дзейнасьці. Прыйдзе час і практыка. Абы хапіла сілаў і ахвярнасьці. Абы было далёказорнае кіраўніцтва. Дык няхай цяпер Антось і едзе больш для спэцыяльнага заданьня, чымся проста як народны дэпутат. Кіраўніцтва, пэўне-ж, ведае што робіць. Калі бальшавіцкая навала зноў заліе вынішчаны гаротны край, тады прыйдзе змаганьне на жыцьцё й сьмерць. Дай, Божа, Беларускай Незалежніцкай Партыі і ейным кіраўніком гарту, вытрываласьці ў змаганьні аж да канчальнае перамогі над чужой і дзярлівай нячыстай сілай. А цяпер тымчасам няхай дрэмле, пад рытмічнае лякатаньне чыгуначных колаў, заслужаны змагар Антось Дзяркач.

Зірнеце на гэтага мужчыну: ён не ў кажушку і ня ў сьвітцы, а ў добрым касьцюме, з гальштукам, у прыгожых ботах. На народнае сьвята едзе, няйнакш. І не ляжыць побач неадлучны бярозавы кій. Недзе й капялюш прыдбаў. Цікава, ці паляўнічы нож за пазухай трымае? Напэўна. А можа й наган пры сабе мае? Ён-жа, як-ніяк, паліцыйны чалавек і можа мае права мець кароткую зброю. Як-бы

памацаць, ці мае нож. Зь левага боку грудзей запраўды відаць нейкая прадаўгаватая надзьмутасьць, нешта там падоўжнае пад пінжаком.

Янук пазяхнуў і прыглядаўся людзям у другім куце. Пад гул цягніка да яго вушэй даходзіў роўны гоман. Ён узмоцніўся пад уплывам алькаголю. Янук ведаў, што ён доўга не засьне. Зашмат няперабранага-неўпарадкаванага награмадзілася ў галаве. Хто ведае, калі гэтыя думкі ўдасца належна зарганізаваць. Паднечаньне перашкаджала рацыянальна думаць. Забягаў наперад і стараўся ўжо ўявіць як заўтра будзе. Зьберуцца недзе ў вялізнай залі, магчыма ў тэатры. Асмуьжаныя вятрамі абліччы з усіх кутоў палаючай у вагні бацькаўшчыны, задуманыя твары працоўнай інтэлігенцыі. З натхненьнем слухаюць прамоваў з трыбуны. А Янук, можа наймалодшы з усіх, разглядаецца па залі, у каторай вось адно пачалося гулкае плёсканьне. Між старшых вусатых і барадатых, сям-там відаць і моладзь.

Але гэта будзе заўтра. Тымчасам-жа ён, Янук Бахмач, зь вёскі Літоўцы, настаўнік, студэнт, вязень, сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі, павінен ці раз яшчэ вярнуцца ў мінулае, дапасаваць-прымерыць да вымаганага сабой максімуму: ці так паступіў, ці добра зрабіў, якраз ад яго, вялікага патрыёты, належылася бацькаўшчыне чакаць і вымагаць.

На працягу доўгай і цудоўнай вясны, ад часу вызваленьня зь вязьніцы, запраўды адпачыў і разгледзеўся, дый сямейны вузел завязаў. Праўда, адпачыў мо й малавата. У Падгайскага ўлегцы не хадзіў. Але якраз тая рэгулярная праца ў вагародзе й на полі ды добрыя харчы вярнулі да поўнага росквіту зьняможаны вязьніцай арганізм, праясьнілі галаву й далі некаторую жыцьцёвую пэрспэктыву. Аграном шчодра аплаціў за помач, а гэта выклікала не абы-якое адабрэньне бацькі.

Ужо зусім крытычным вокам, як ніколі раней, прыглядаўся Янук мясцовым людзям, асабліва старэйшым зь Літоўцаў, уважна трымаў руку на пульсе жыцьця. Часта праводзіў гутарку і зь дзедам Якубам, і з Паўлоўскім, і з Уладзімерам Пятухом, і Захаруком, і з Вульлянай, дый ці мала яшчэ зь кім. Уроджаны інтэлект і ўжо немалая жыцьцёвая практыка памагалі разважаць, ацэньваць, на нейкую мерку дапасоўваць. Згодна старое праўды, - хочаш гаварыць, то ўмей слухаць, - Янук уважна слухаў і даваў сялянам розныя пытаньні. І тыя

самыя людзі, што некалі перад ягоным падарожжам у сьвет з роднае хаты выдаваліся яму нехлямяжымі ў думках, нянадта кемлівымі, цяпер, быццам асьвечаныя ягонай, Януковай, празорлівасьцю, зьявіліся перад ім зусім накшымі, - разумнымі, асьцярожнымі, глыбока практычнымі, наскрозь пранітаванымі народнай мудрасьцю.

Праз усе гутаркі пракідваўся чырвонай ніткай вялізны жах перад бальшавіцкай пошасьцю, якая з усходу зноў залівала вайной вынішчаную краіну. Жах выяўляўся дрыжачым голасам, буйной сьлязой па загубленай радні ці блізкіх людзёх, або грубай і няўпрыгожанай лаянкай пад адрасам калгасных цівуноў і самога «айца народаў». Жах падсычваўся безнадзейнасьцю, што вынікала із слабасьці сілаў, каб паўстрымаць пошасьць, што нясла сьмерць спакойнаму й плённаму, з Божай помачай, сялянскаму жыцьцю. І ў збалелых сялянскіх грудзёх заглохлі песьні. Ня маючы ратунку ад чужой пошасьці, Беларус Бога на помач клікаў. Каб уратавацца ад бальшавіцкіх варвараў, Бога клікалі на помач больш як чвэрць стагодзьдзя. А калі натоўп міліёнаў гналі ў шырока адчыненую пропасьць зямнога пекла, Бог, як людзям здавалася, сядзеў недзе як той каменны Сфінкс, на модлы не адказваў.

Жах відаць быў ня толькі на баразнаватых тварах старэйшых, якім ужо недалёкая будучыня калгасны прыгон несла. Трывожыліся й вясковыя дзяцюкі, як кавалёў Лёнька, Уладзік і Стась Зянькевічы, дый больш дзясятка іншых, - усе, што падрасьлі падчас вайны. Падазравалі, што ў недалёкай будучыні кастлявая заграбастая ведзьма можа іх на агнявую лінію паслаць. Думаючы пра нявучаных вясковых дзяцюкоў, шматлікіх сваіх аднагодкаў, Янук параўноўваў іхную сытуацыю із сваей. Яму ясна відаць было тое, чаго яны ня бачылі: патрэба сьведамага й зарганізаванага змаганьня супраць варожай пошасьці. Сьведамага змаганьня за свае й народныя, Богам даныя правы, насамперш за волю, узвышае чалавека, дае яму гонар і годнасьць, прыбліжае яго да самога Тварца, што навучаў сваіх вучняў дабро й любоў пашыраць і із злом змагацца. Нясьведамасьць параліжуе ўсё шляхотнае, забівае чалавечую душу, робіць нявольнікам і ўгнаеньнем для чужых.

Нясьведамыя людзі былі бездапаможнымі не із свае віны. Калі-б яны й пайшлі змагацца, дык пэўне-ж пад нейкім прымусам і хутчэй усяго супраць некага ці нечага, - прыкладна супраць зьненавіджаных

калгасаў, чымся за нешта, як усьведамлёную патрэбу вольнасьці й незалежнасьці народу. І хоць ты залівайся сьлязьмі, а што зробіш? Усе гэтыя дзяцюкі патрэбныя Беларускай Незалежніцкай Партыі для змаганьня з бальшавізмам і ўсімі іншымі ворагамі ідэі незалежнае Беларусі. Ды спрабуй ты ім гэту патрэбу вытлумачыць, або давесьці, што толькі змаганьнем могуць здабыць права жыць і выжыць. Скарэй качаргой месяц дастанеш, чым такое табе ўдасца. Што сказаў-бы на такую патрэбу Стась? Стась, бамбіза эгэ! Вырас вунь які, а ў галаве цьма, ці, - як людзі казалі, - вырас аж пад неба, а дурны як трэба. Янук аж разрагатаўся, падумаўшы што сталася-б, калі-б спрабаваў усьведамляць Стася. Адылі доктаравага бамбізу, ужо бяз бурбалкі пад носам, пагоняць на «даёш Берлін»! А там... круці, ня круці, а трэба памярці. Матка Боская, вось сытуацыя! І Стась, і Ўладзік, і Лёнька, і іншыя, усе яны - «пушечное мясо». Пойдуць у мясарубку адно таму, што ў іхных галовах пуста. А колькі-ж такіх, як яны, у Беларусі? Магчыма, бальшыня.

Пры такіх разважаньнях шчодра пацяклі ў Янука сьлёзы. Бачыш надыходзячую катастрофу й ніяк адхіліць яе ня можаш. У такі момант Янук намагаўся ўявіць адваротнае: калі-б ён ня бачыў усяго, што бачыць, не ўсьведаміў-бы вялікае апокаліптычнае трагэдыі народнай, не балела-бы яму сэрца. Сума сумарум Стасевых цярпеньняў будзе куды меншая, чымся Януковых. Калі пры тым «даёш Берлін» Стась не дабярэцца да райхстагу й загіне, дык што-ж? Чалавеку адно жыцьцё дадзена й можа лепш пражыць яго з найменшым цярпеньням. А яму, Януку, апроч фізычнага трэба будзе пераносіць яшчэ й духовыя мукі, бо ён, як некалі той Міцкевіч казаў, цярпеў за міліёны. Пэўне-ж, у вялікай роспачы сваей спадзяваўся Янук, што такое цярпеньне прыблізіць яго да Бога.

Пад грукат цягніка, упоцемку цяклі па Януковым твары сьлёзы. І прыгадалася яму слабодзкая царкава, побач з Дуняй вялікодная служба. З прычыны ваеннага становішча, пачалася яна на золаку. Ля яго стаяла прыгожа апранутая, мілая дзяўчына. Сярод пярэстых хустак, сьвяточных сьвітак, пры цудоўным сьпеве аж двух, на зьмену, хораў, як ніколі раней адчуваў блізкасьць Дуні. Вязьніца зрабіла сваё. Дуня не адказала яшчэ на тое важнае пытаньне.

У царкву, здавалася, сабралася ўся вялікая ваколіца. Грамада запоўніла ўсе куты прасторнай сьвятыні й вылілася праз галоўныя

дзьверы на двор. Над адтаенымі нівамі, у акампаньямэнт малітвам і сьпевам, гімнам вясьне ўзьнялі сьпеў жаўранкі. Яшчэ пакуль сонца на ўсходзе чырвоным клубком выкацілася з-за грабяня Гаравацкае пушчы, народ у царкве намагаўся даць праход царкоўнай працэсіі, што павольна, із іконамі й харугвамі, і хвалой Новаўскросламу ішла да дзьвярэй. Пад сьпевы хору, за крыжам, харугвамі іконамі й сьвятарамі вылілася з царквы на двор рака людзей. Урачыста весьціў пра вялікае здарэньне гучны звон з шэрай, ужо пешчанай праменьнямі ўзыходзячага сонца, вежы. Некалі руплівыя вернікі схавалаі яго ад бальшавіцкіх бязбожнікаў. І ўжо ня першы раз ад часу аднаўленьня абвяшчаў ён людзям вялікую радасьць:

Хрыстос ізь мёртвых уваскрос,
бім-бам-бом,
сьмерцяю сьмерць паканаў,
бім-бам-бом,
і тым, што ў магілах,
жыцьцё дараваў.

Вялікодны трапар паўтараўся часта падчас сьвятое літургіі. Перад шчодрым золатам полымя нязьлічоных сьвечак маестатычна выглядалі райскія вароты.

Сьмярцяю сьмерць паканаў...

Раптоўна нахлынулі гарачыя сьлёзы, нехта кляшчамі сьціснуў сэрца. Полымя сьвечак то зьлівалася ў суцэльный пажар, то дробнымі іскрамі рассыпалася ў тысячу кірункаў. У гэны момант якраз надта ўзьнёсла й цудоўна сьпяваў хор, асабліва тэнары і, як саказаў-бы нейкі цынік, яшчэ больш раськіс Янук. Левай рукой ён намагаўся выцерці гарачыя сьлёзы. Няёмка перад Дуняй. А зь іншага боку, - калі нельга памаліцца й паплакаць у Доме Божым, дык дзе тады? Дуніна спацеўшая далонь сьціснула Янукову й тады хлопцу здалося, што дзяўчына дрыжэла.

- Янучок, міленькі, пірастань.

Яна сказала выразна, нахіліўшыся да вуха. Павярнуўшы галаву направа, празь сьлёзы Янук спасьцярог журботна-спачувальныя

васількі.

- Сягоньніка вялікая радасьць. Хрыстос уваскрос і трэба цешыцца.

Згода.

Служба зацягнулася масай прычасьнікаў. Калі Янук і Дуня, узяўшы пасьвечаную сьвянцонку, пацалавалі крыж і выйшлі са сьвятыні, ужо даволі паднялося й весела ўсьміхалася вернікам маладое сонца. Па дарозе ехалі каляскі, групамі йшлі людзі. У левай руцэ Янук трымаў вузялок з чыстага, вышыванага яшчэ гаротніцай маткай, ручніка. Сьвянцонка складалася із жменькі надта цэннай цяпер вайной солі й паўтузіна чырвоных, шалупіньнем цыбулі маляваных яек. Дзесьці ўдома бацька й Мікола ўжо даглядалі гаспадарку й будуць чакаць на яго й сьвянцонку. У міску ізь сьцюдзёнай вадой уложыцца адно пасьвечанае яйка, а пасьля ўсе яны памыюцца «у чырвоным яйку», каб румянымі й здаровымі быць. Пахрыстосуюцца, адзін аднаго значыцца ў вабдымкі возьмуць, пацалуюцца. За рознымі прысмакамі застаўлены стол сядуць. Разгаўляцца.

Побач задуманага Янука, пад сымфонію жаўранкаў, шпакоў, адгалоскі сабачага гаўканьня зь вёсак, спакойна тэпала Дуня.

- Янучок.

Сказала ціха, ледзь пачуў. Вочы іх сустрэліся. У Януковай галаве ўсё яшчэ пераліваліся, славілі Хрыста бесканечна мілагучныя царкоўныя мэлёдыі.

- Янучок, - паўтарыла дзяўчына.

- Ага. Што?

- Я думала пра тое.

У голасе ейным адчувалася нешта важнае.

- Пра што? - не адразу дадумаўся Янук.

- Што ты мне ў школе прапанаваў.

Цяпер хлапец усьведаміў вялікую вагу таго, што зараз мела стацца. Ён запаволіў крок, уважна зірнуў на Дунін рапраменены тварык, затрымаўся на памастацку аформленых пунсовых шчоках і поўных вуснах. Вось неўзабаве, - ужо паскорыла ход сэрца, - адчыняцца гэтыя мілыя вусенкі, каб язык мог зрабіць гукі, ад якіх будзе залежыць Янукова будучыня.

- І? - здолеў Янук вымавіць, із стрыманым дыханьнем, адну адзінокую літару.

- Пайду за цябе, Янучок міленькі.

У вачох-васількох жыўчыкі бегалі.

Сытуацыя, у якой апынуўся Бахмач, была ўнікальная. Доўга чакаў адказу. А адказ так, - хто там мог ведаць? - рэдка пачуеш, можа раз у жыцьці. Як-жа на яго рэагаваць?

- Дунечка, мая дарагая!

Янук схапіў яе ў абдымкі. Зірнуў у вочы, дзе знайшоў пацьверджаньне. У сымфоніі раньняй вясны, на вялікоднае раньне, на абочыне гасьцінцу й на вачох вернікаў, што вярталіся з царквы, нараджалася новае жыцьцё. Янук прыліп да поўных пунсовых вуснаў.

- Дарагая мая Дунечка, - шаптаў.

Некаторыя, што ехалі ці йшлі гасьцінцам, пазіралі, як на абочыне, не зважаючы на нікога, зьлілася ў доўгім цалунку маладая пара.

- А гэтым во як прыпёрла. Іш вы, нястыднікі.

Голас з дарогі. Янук ня чуў як упаў зь ягонай рукі вузялок ізь сьвянцонкай. І Дунін кошычак ізь сьвянцоным спакойна чакаў у траве. Хрыстос уваскрос! Нараджаецца жыцьцё, пераможана сьмерць. Два юныя сэрцы, знайшоўшы супольнае шчасьце ў каханьні, перакрочыўшы можа апошні парог да суцэльнага зьліцьця, паскораным тэмпам імкнуліся паяднацца ля слабодзкага гасьцінцу.

Вярнуўшыся дахаты, ізь зьзяючым тварам, Янук ня мог вытлумачыць бацьку галоўнай прычыны, чаму забрудзіў вышываны ручнік і пабіў некаторыя сьвянцоныя яйкі. Калі на другі дзень Вялікадня Янук сказаў бацьку пра намер жаніцца з Дуняй, Пракоп Бахмач задумаўся.

- Сынок, калі ты ўжо на свой хлеб пойдзіш, дык рабі як хочаш.

У цудоўны травеньскі дзень вясельле адбылося ў прасторнай хаце Ніны й Антося Дзеркачоў. Сьціплае, але шумнае. Галоўна дзякуючы Антосю Дзеркачу й аграному Падгайскаму, хапіла для сваіх і гасьцей, пераважна Макатунішынай і Бахмачовай радні, прысмакаў і напіткаў за вясельнымі сталамі. Прыехаў зь Вільні, за дружку, і Лявон Загорны. Вянчаліся ў Слабадзе. Янук наняў музыкаў і хату ў Тодара Кміты, каб патанцавала моладзь.

І адбылося ўсё як найлепш, із традыцыйнымі вясельнымі цырымоніямі, караваем і прынагоднымі песьнямі народнымі. Адно разгуляўшыся, разыходзіцца не хацелася на зьмярканьні.

Ваеннае права.

Пачалося для Янука новае жыццьцё. Цяпер у цягніку, па дарозе ў Менск, на вялікае ўсенароднае веча, Янук думкамі вяртаўся да сьцежак і дарожак, што прывялі яго да супольнага з Дуняй шчасьця й турбаваўся пра будучыню. Неўзабаве прыйдзе вялікая перамена, што дасьць яму й Дуні існаваньне на ўзьмежжы жыцьця й сьмерці.

38

У гэную раніцу, калі пасьля доўгіх пастояў у Маладэчане й Красным, цягнік нарэшце дапоўз да разбуранай сталіцы, горад паказаўся яму зусім іншым чым калісьці, пасьля выхаду зь зялёнае вязьніцы зімой. Напінаючы свае сілы на руінах, шчодрая вясна прыбрала горад зеленьню й кветкамі. Ужо на станцыі Янук і Антось, дэлегаты ад Гацкае воласьці на кнагрэс, адразу трапілі ў апякунчыя рукі людзей, перважна моладзі, што займаліся доглядам дэлегатаў. Іх накіравалі ў сталоўку Беларускае Самапомачы, дзе за невялікую цану маглі купіць скромнае сьнеданьне, а хто ня меў грошы дык мог пасьнедаць і задарма. Янук і Антось із смакам зьелі па некалькі бульбяных аладак. Як няцяжка па смаку дагадацца было, аладкі пякліся на ільняным алеі, бо «шпэку», на які наляталі акупанты, у сталоўцы ня было.

Павесялеўшы, на поўныя жываты, два прадстаўнікі Гацкае воласьці зьявіліся нарэшце перад гарадзкім тэатрам, у якім меўся адбыцца той кангрэс. Паседжаньні меліся распачацца каля восьмай, але ўжо каля тэатру роілася ад людзей як калісьці, прыгадваў Янук, летам ля сука вішні, на якім пчала-матка села. Тэатр, прыбраны сьпераду нацыянальнымі сьцягамі й пагоняй, разьмясьціўся ў сквэрыку, што тануў у зелені.

- Ты, Янук, ідзі ў чаргу й зарэгістрыруйся пры ўваходзе, а на мяне ні глядзі. Я маю работу. Я цябе знайду.

І з такімі словамі, - Янук не пасьпеў навет роту адчыніць, - Антось зручна ўглыбіўся ў натоўп пры дзьвярох і неўзабаве зьнік. Янук пачаў разглядацца. Гэтта-ж на правы бок, ля аграмаднага куста бэзу, перад фасадам тэатру, спасьцярог, - не, ня мог сваім вачам верыць, - Янку Сароку. У Віленскай Гімназіі хлапец вучыўся зь ім у ваднэй клясе.

Вільнянін Сарока жыў на другі бок Кальварыйскай вуліцы, пасуседзтву зь Януком і Загорным. Бываў Янук у яго хаце, сустракаў гасьцінных бацькоў. Бацька працаваў недзе ў гарбарні, а Янка быў адзінокім сынком у сям'і. Жылося яму нядрэнна. Праныра, ён і дзяўчат меў, і грошы, бальшыню віленскіх спэкулянтаў знаў, часам і гарэлачку, нямецкі шнапс, пацягваў. Хлапец з выгляду ніштаваты, войстры на язык, заўсёды з прамяністай усьмешкай, ён належаў да тых, каторых у горадзе называлі «цванякамі», або прайдохамі. Праўда, веруючыя й патрыятычныя, асьвечаныя бацькі выхавалі ў яго пашану да чалавека й любоў да бацькаўшчыны Беларусі. Усё-ж Янук трымаўся ад яго ад яго воддаль. Магчыма, што характарамі ня зыходзіліся. І ніяк Бахмач ня мог уявіць Сароку там, дзе яго цяпер пабачыў ды ў такім выглядзе: перад фронтам будынку гарадзкога тэатру ў Менску, у чорным мундзіры, з пагоняй на пілётцы й перавешанай праз правае плячо стрэльбай. Гэта ўжо занадта. Зьбянтэжаны такой зьявай, Янук спачатку ня ведаў як захавацца. Сарока яго яшчэ ня бачыў, але Бахмач спасьцярог, што воддаль пры высокай рабіне стаяў і другі, такі-ж, у чорным юнак, із стрэльбай на правым плячы. А гэта што? Выпадала падысйьці, тым больш, што й Сарока ўжо яго пабачыў.

- Гэй, а гэта што, Янка? Каго, каго, а цябе сустрэць тутака ды яшчэ із сплювай!?

Вільмяме сплювай стрэльбу называлі.

- Здароў, цёзка! І ты тут? Дык ты мусіў прыехаў радзіць, а я цябе буду бараніць, каб ніхто не напаў. Ха-ха-ха, - разрагатаўся Янка.

Юнакі моцна паціснулі адзін аднаму рукі.

- Дык ты думаеш, што калі на нас тутака нападуць, то ты гэтай качаргой нас абароніш? І хто гэта цябе, такога смаркатага ваяку, сюды прыслаў? Патроны хоць далі? І качарга савецкая... Ха-ха-ха...

- Не, чэрці, ні далі. Стаім во так для паказу, ганаровая варта. Казалі, што нямецкія стрэльбы пасьля дадуць...

- Я ўсё-ж не разумею, што гэта ў цябе за вопратка й калі ты гэту качаргу ў рукі ўзяў?

- Дык ты ня чуў?

- Што чуў?

- Залажылі афіцэрскую школу для Беларускай Краёвай Абароны. А я ахвотнікам прыйшоў. Ну як табе падабаецца?

- Ты на ахвотніка ў войска? У такі час? Цяжка паверыць. А чаму вы чорную, як паліцыя, вопратку носіце?

- Зялёнай няма, пасьля дадуць. Вер ці ня вер, а праўду кажу.

- Знаеш, цёзка, каб хто мне сказаў, што цябе во так тутака пабачу, дык не паверыў-бы, - прадаўжаў Янук.

- А мне, каб хто сказаў, што ты - прадстаўнік ад свайго там вясковага народу, прыедзеш на кангрэс, таксама не паверыў-бы.

- Значыцца, як бачыш... А як доўга ты тут і колькі вас зь Вільні?

- Нас сямёрка зь гімназіі й сэмінарыі. Прыехалі ў канцы траўня.

Сарока назваў прозьвішчы іншых.

- У другой палове траўня да нас у Беларускі Нацыянальны Камітэт прыехалі тры афіцэры з бэкэа, значыцца камісія, ну й давай ім ахвотнікаў у армію. Я сабе падумаў, чорт ведае што рабіць. Час такі, бяз зброі прападзеш. А калі бальшавікі прыйдуць, дык усіх на Бэрлін пагоняць, - гаварыў шпарка Сарока, а Янук аглядаўся ці пакарацеў хвост чаргі ля дзьвярэй тэатру, каб не спазьніцца на паседжаньне. Але з гэтым чалавекам цікава было пагаварыць, распытацца пра Вільню й знаёмых сяброў. Ды той Януку наперад забег:

- Гэта праўда, што ты ў турму папаўся? За што гэта?

- Табе-ж пэўне Загорны апавядаў. Зрабілі аблаву на спэкулянтаў, і я папаўся. Але я мушу йсьці...

- А што Загорны цяпер робіць? Мы яго намаўлялі ў бэкэа, дык дзе там...

- Нічога ён цяпер ня робіць, каля дому ацялюгваецца, дзяўчат мацае... Мусіць спадзяецца, што й на наступны год у Вільню трапіць.

- А ты што думаеш?

- Сказаць табе адкрыта?

Сарока надта пільна пазіраў у Януковы вочы й ён зразумеў, што ў такі час і ў такіх абставінах можна гаварыць праўду, тым больш, што той у войску.

- Кажы, - падахвоціў Янука Сарока.

- На працягу наступнага месяца цэлая Беларусь можа апынуцца ў руках бальшавікоў. Дваццаць трэцяга чэрвеня пачалася афэнзыва на цэлым усходнім фроньце. Немцы ўсюды адступаюць, а бальшавікі абыходзяць Менск з паўдня й поўначы й можа за які тыдзень, а навет раней будуць тутака. На захадзе аліянты таксама Немцаў гоняць.

Сарока пазіраў на Бахмача вельмі ўважна і зараз-жа, як ён прыгожа ўмеў гэта рабіць, працяжна й зьдзіўлена сьвіснуў.

- Адкуль у цябе такія весткі? - спытаў Янука.

- Пазаўчора вечарам слухалі радыё зь Лёндану. Ты толькі нікому не кажы, каб ні было панікі. Наша вярхушка ведае, але аглядаецца пераз плячо, тымчасам трымае твар.

- Ну добра, - насядаў цяпер Сарока, - калі так запраўды, дык што нам рабіць? Зь Немцамі ўцякаць? Што ты будзеш рабіць?

- Калі хочаш, табе параю ісьці зь тымі Беларусамі, што будуць адступаць. Там вайна неўзабаве скончыцца, хаўрусьнікі перамогуць Немцаў і вы трапіце на захад у Эўропу ці ў якую Амэрыку. А ў будучыні Англія ці Амэрыка схопяцца ўдужкі з гэтай брыдой маскоўскай, тады нам трэба будзе помач, каб волю здабыць...

Янук гаварыў зь нейкай фінальнасьцю. Гэта спасьцерагло надта назіральнае Сарокава вока. Ён схапіў Бахмача за руку.

- Чакай. Як гэта ты гаворыш, што вам трэба будзе помач, каб волю здабыць? Дзе ты, ці вы, - колькі вас там, - будзеце?

- Я йду ў лес. Змагацца.

Янукоў адказ на пару часінаў параліжаваў Сароку. Хацеў зноў сьвіснуць, але Янук крутнуўся, сказаўшы:

- Мне трэба на залю. Пабачымся пасьля.

- Чакай, не сьпяшы, - клікнуў той.

Янук адыйшоўся. Ля дзьвярэй было цесна, але хвост куды пакарацеў. Тут-жа юнак з нацыянальнай апаскай на левым рукаве, відаць парадкавы, у дзьвярох голасна сказаў:

- Прашу ўсіх як найскарэй заходзіць, бо зараз пачнецца.

Янука знайшлі на лісьце, праверылі мандат і неўзабаве адвялі яго на месца, што выпала якраз пасярэдзіне, бліжэй заду. Заля й бальконы ўжо запоўніліся. Янук разгледзеўся навокал. Сцэна была ўдэкараваная вялікімі нацыянальнымі сьцягамі, пасярод стаяў доўгі стол, а непадалёк, наперад ад яго - мікрафон.

Направа ад Янука сядзелі дзьве маладыя дзяўчыны. Мяркаваў што яны дваццаткі яшчэ ня пераскочылі. Чарнявая, што сядзела побач, зь цікавасьцю зірнула на хлопца. Апранутая ў танны паўсуконны шэры касьцюмчык, яна мела твар, які часта называюць даверлівым. Распрамянілася ўсьмешкай і сказала:

- Калі мы ўжо суседзі, то давайце будзем знаёміцца. Я называюся Ганна Зорка, а гэта мая сяброўка Ніна Пушчанская.

Другая, бялявая, таксама ўсьміхнулася. Дзяўчаты выцягнулі на прывітаньне рукі.

- А я Янук Бахмач. Вельмі прыемна такіх суседак мець. Адкуль будзеце?

- Із Слуцка. А вы?

- Я з Гацяў.

- Дзе гэта такія Гаці?

- То проста на поўнач ад Менску, ля Глыбокага. Шмат добрага чуў пра ваш Слуцак. Настаўніцы будзеце?

- Ага. А як вы адгадалі?

У гэны момант заля зашумела й пачулася: - Астроўскі!

Людзі ўставалі й плёскалі рукамі. Налева ад Янука стаяў мажны вусаты дзядзька гадоў пяцідзесяці, з аўтарытэтным тварам, магчыма якісьці войт ці солтыс.

І прыгадалася Януку:

... шумнае веча,
а ў тэатры гудзе бы ў вульлі,
пазьяжджаліся зблізку й з далечы
пасланцы беларускай зямлі.

Дык вось як яно выглядае, некалі юнаком зусім накш уяўленае народнае веча. Аб'ектам воплескаў аказаўся сярэдняга росту чарнявы чалавек у акулярах з рагавой аправай. Яго ўжо бачыў Янук у дзень незалежнасьці на Пляцы Волі. Астроўскі й некалькі іншых, відаць важных асобаў з БЦР знаходзіліся з правага боку сцэны ў лёжы, прыгожа прыбранай сьпераду зеленьню, кветкамі й шматлікімі бел-чырвона-белымі сьцяжкамі. Дастойнікам з БЦР людзі плёскалі ў рукі, стоячы. І гэтак хвіліну, дзьве, ці тры. Янук пазіраў то на іх, то на сцэну, дзе перад даўгім прэзыдыяльным сталом, із графінам вады й шклянкамі пры ім, ды нейкімі паперамі. стаяла пакрытая нацыянальным сьцягам трыбуна, пры ёй мікрафон і лямпа.

Гукі аркестры напоўнілі залю. Дэлегаты сядалі, воплескі заціхалі, а прэзыдэнт БЦР зьнік зь лёжы й павольным крокам узыходзіў на сцэну. Спыніўся перад трыбунай, спакойна аглядзеў сабраных.

Аркестра сьціхла.

- Грамадзяне! - пачуўся выразны, нізкі голас. - Другі Ўсебеларускі Народны Кангрэс абвяшчаю адчыненым. Вітаю вас, дэлегаткі й дэлегаты, як прадстаўнікоў беларускага народу, якія сабраліся тут, у сталіцы Беларусі, для вырашэньня важных праблемаў будучыні нашага народу й бацькаўшчыны. Жадаю вам адначасна ад імя Беларускай Цантральнай Рады посьпеху ў вашай працы.

Янук зрокам шукаў Антося Дзеркача. І неўзабаве знайшоў яго ў правым куце, ззаду, пры дзьвярох. Нешта гаварыў з чалавекам у цывільным, якога Янук ніколі не бачыў. Той неўзабаве адыйшоў, а Дзяркач стаяў пры дзьвярох. Ягоныя вочы пільна бегалі па сабраных. Янук спасьцярог на Антосевым твары ўсьмешку, калі той пабачыў яго й памахаў рукою. Коратка, як пробліск праменя. Антось зноў пільна назіраў за прысутнымі ў залі. Янук пабачыў, што й ля іншых дзьвярэй стаялі людзі ў цывільным. Ці гэта былі звычайныя парадкавыя, як у тэатры, ці мелі падобнае, як Антось, «спэцыяльнае заданьне», Бахмач ня ведаў. Няцяжка было дагадацца якое заданьне мог мець Дзяркач.

Праводжаны воплескамі, Астроўскі пакінуў трыбуну, а на яго месца зьявіўся мажны выглядам, новавыбраны прэзыдэнт кангрэсу Яўхім Кіпель, якому ўжо прапануюць цэлы прэзыдыюм.

Зорка й Пушчанская ўважна сачылі за ходам дзеяў і хоць Януку карціла пагаварыць зь імі, на сцэне, як-ніяк, адбуывалася гісторыя. Янук зірнуў у той бок, дзе кагадзе стаяў Антось Дзяркач. Там зьявіўся той дзяцюк, зь якім раней гаварыў Антось, а Дзеркача нідзе ня відаць. На самым фронце, перад трыбунай, сядзелі нямецкія афіцэрскія чыны, побач іх і афіцэры зь Ярылавымі крыжамі. Там-жа сядзелі й сьвятары, адзін зь іх, як здалося Януку, япіскап. Далей разьмясьціліся юнакі й юначкі ў формах Саюзу Беларускае Моладзі, а той шустры з правага боку, - гэта Ганько. Бачыў яго ці раз Бахмач у хранікальных фільмах. З масы людзей, што запоўніла тэатр, - можа каля паўтары тысячы, - Янук мог-бы палічыць на сваіх пальцах тых, каторых знаў.

- ...мы мусім самі ўзяцца за будаўніцтва свае будучыні, - прамаўляў новавыбраны прэзыдэнт кангрэсу Кіпель. - Ад нашага імя дазваляюць сабе гаварыць крамлёўскія заправілы, яны там вызначаюць апякуноў, якія ўжо рыхтуюць шыбеніцы нашаму народу. На нашы землі прэтэндуюць польскія паны. І вось чаму ў гэты час мы павінны голасна сказаць усяму сьвету, хто мы й чаго мы хочам.

Ізноў хлынулі шчодрыя воплескі. Цэладзённыя прамовы толькі пачыналіся й таму дэлегаты заўзята ў далоні плёскалі. Нагода надзвычайная, гістарычная. Як-ніяк, паняволеная й зганьбаваная краіна рэдка калі зьбірала ў Менск цьвет свайго народу, калі не бальшыню дык прынамсі вялікую часьць палітычных мазгоў і моладзі. Адчувалася напружаньне. Яно відаць было, як здалося Януку й на тварах дэлегатаў, і - за вонкавым спакоем, - на тварах сяброў прэзыдыюму кангрэсу. Яго цяжка было скрыць. Другі вораг набліжаўся да сталіцы, а першы ўжо аглядаўся, каб як найскарэй і больш бясьпечна адсюль змыцца. У горадзе-ж, як усім у той час было добра вядома, чакала добра зарганізаванае бальшавіцкае падпольле. Умовы ня вельмі спрыяльныя для доўгіх і дакладных разважаньняў пра лёс і будучыню беларускага народу на вечы. Трэба было мяркаваць, што й бальшыня дэлегатаў, каторыя запраўды складалі асноўны патрыятычны шпень так вынішчанага ды із нацыянальнага кіраўнічага элемэнту выпаласканага народу, ня мела значных сумлеваў адносна запраўднае функцыі кангрэсу. Трэба-ж было быць абсалютна наіўным, каб верыць, што ўдасца зрабіць больш, чымся апрабаваць ужо падрыхтаваныя дэклярацыі й рэзалюцыі. Навет ня было калі. Трэба ўжо было думаць пра эвакуацыю, а некаторыя дэлегаты, каб вярнуцца дадому, мусілі-б ехаць ужо пад бальшавіцкую акупацыю.

Усяночная бяссоньніца ў цягніку падарозе ў Менск цяпер хіліла набок Янукову галаву. Прырода дамагалася свайго й перад ёю мусіла капітуляваць навет надзвычайная Янукова зацікаўленасьць жывой гісторыяй. Калі пасьля ўступнай Кіпеля, запрасілі ў прэзыдыюм удзельнікаў Першага ўсебеларускачга Кангрэсу, Янук здалёку прыглядаўся тым людзям, што занялі, зноў-жа пры агульных воплесках, месца ля стала на сцэне. Сярод усіх увыдатнялася, у Януковых вачох, дамінуючая фігура Кастуся Езавітава.

Зараз пачаў справаздачу прэзыдэнт БЦР Радаслаў Астроўскі. Голас ягоны, гэтым разам скарэй настаўніцкі чымся прэзыдэнцкі, барабаніў манатонна, заглыбляючыся ў гісторыю й статыстыку. Пад гэткі гоман лёгка можна было заснуць. І ледзь Янук задрамаў, як разбудзілі яго воплескі. Няўцямна зірнуў на слуцкіх настаўніц, а нос падказаў яму, што ад іх, асабліва ад Зоркі, нясло танным адэкалёнам. Заля й людзі зноў некуды адплылі...

Гарачае лета. Трэба абавязкова пчол дапільнаваць, каб ня выраіліся, а калі й будзе той, дык каб ня ўцёк. Праўда, учора вечарам падслухоўваў вульлі, ці няма дзе вясельля... Розныя галаскі, - ведаў іх добра Янук, - калі заводзіць матка, а там, між агульнага шуму, можна паслухаць «сватоў» і «свацьцяў». Здавалася, што вясельля ня было. Але, хто іх ведае. Памыляліся-ж і раней. Бывае, што вясельля не падслухаеш, а рой бывае. Гэту трывогу Янукову раптам засланіў курадым.

- Бяры, сынок, куры іх добра дымком, а я буду рамкі выцягваць.

Гэта бацькаў аўтарытэтны голас. Янук не марудзіць, бярэ курадым, цісьне мяшок і нюхае сіняваты дымок, што йдзе з рыльца, ад спарахнелага карча ўсярэдзіне. Бацькавы рукі, жылістыя зьверху й мазолістыя на далонях, адчыняюць вечка вульля, ды намагаюцца за рамку ўзяцца. Але што такое робіцца? Вулей раптам... Ды не гэта ня вулей, а дамавіна... Васкова-жоўты матчын твар. А чаго-ж ён з тым дымам..., чаго Янук з тым дымам у матчыну дамавіну? Гэтта вялікі перапалох сьціснуў Януку грудзі, а раптам аднекуль вялікія гучныя воплескі ці яшчэ нейкі гук...

- Спадар Бахмач!

- Га? Што? - прахапіўся Янук і перад сабой, амаль зусім упрытык убачыў твар случчанкі Зоркі.

- Вы гэта што, спадар Бахмач? Прадстаўнік народу прыехаў на кангрэс спаць?

- Кангрэс? - няўцямна, прыцішаным, спалоханым голасам спытаўся Янук. Перад ім лагодненькая ўсьмешка курносенькай дзяўчыны. Але не пра ейную прыгажосьць цяпер думаў Бахмач. Навокал людзі. Некаторыя глядзяць на яго. А із сцэны манатонны голас чарнявага чалавека ў чорных акулярах.

- Прабачце, задрамаў. Цэлую ноч ня спаў у цягніку.

- ...паўсталі шматлікія батальёны Беларускае Краёвае Абароны, - гаварыў Астроўскі, - якія пакрылі сабою ўсю тэрыторыю наступных акругаў: Менскае, Барысаўскае, Слуцкае, Баранавіцкае, Слонімскае, Навагрудзкае, Вялейскае й Глыбоцкае.

Зноў воплескі. Янук цяпер разглядаўся, сам плёскаў у далоні й намагаўся камтраляваць ацяжэлую галаву.

- Калі рэзультат правядзеньня мабілізацыі быў доказам нацыянальнай сьпеласьці беларускага народу, то постаць нашага

жаўнера, - далей чытаў прэзыдэнт БЦР, - часта голага й босага, па калені ў балоце, на холадзе, моцна трымаючага вінтоўку ў сваіх руках, зьяўляецца доказам яго надзвычайнай сілы й бясконцай адданасьціі сваьму народу й бацькаўшчыне.

І далей: - Найбольшую цяжкасьць мы мелі й маем з камандным складам. Агулам гаворачы, жаўнер беларускі вельмі добры, але камандны склад вымагае яшчэ вялікай апрацоўкі й падрыхтоўкі. За гэты час ужо праведзена двое курсаў перападрыхтоўкі афіцэраў і падафіцэраў, а з пятнаццатага чэрвеня арганізавана афіцэрская школа ў Менску для нашых юнакоў зь сярэдніх і іншых школаў.

«Так, - думаў Янук, - постаць нашага жаўнера, голага й босага, па-калені ў балоце... доказ надзвычайнай сілы... Што той бэцээраўскі прэзыдэнт вярзе? Янка Сарока зь Вільні. Іншыя, зялёненькія гадамі, ганаровую варту трымаюць. Зь пятнаццатага чэрвеня, значыцца два тыдні назад пачалі школу. Жаўтаротыя піскляты... А тут ужо на паляваньне трэба, а гэтыя яшчэ парадкам сабак карміць не ўзяліся...»

І Янукова думка крута ў другі бок павярнула. Вядома-ж, бяз гэтага кангрэсу, бяз гэтых справазачаў і нарадаў нельга. Яны патрэбныя беларускаму народу ў гэты крытычны ў гісторыі момант як рыбе вада. Але, усё-ж... Сёе-тое гаворыцца, абы падгладзіць абы там якія дзіркі заткнуць, паказаць што нешта ёсьць, што вось, маўляў, зірнеце, якія мы малайцы, гаспадары. Арганізаваная афіцэрская школа для юнакоў, такіх, як і сам Янук. Брава! Колькі трэба намаганьняў і сродкаў, а перадусім часу, каб вышкаліць чалавека на афіцэра? А там ужо чатыры дні назад пачалася поўная афэнзыва. Пала Орша, Магілёў, клінамі хваля паўзе пад Бабруйск, Слуцак, Полацак, Барысаў. Ці адзін раз і ці адзін мудры чалавек сказаў пра палітыкаў: сяньня радзяць пра ўчарашняе, а заўтрашніх праблемаў і ня бачаць. Але. Калі-б вораг ня прыбліжаўся з-за Дняпра, можна было-б із кпінамі да сяго-таго, гэтта сказанага, аднесьціся. Ды няма калі кпіць. Тут трэба, як мага сілаў, нешта радыкальнае выдумаць. Ня будзеш падчас таго, як пажар трэба тушыць, разважаць пра рэгулямін пажарнае аховы... А з другога боку, што меў гаварыць Астроўскі? Бэрлінскія вяльможы да апошніх часоў не давалі дазволу на арганізацыю беларускага войска. Навет і цяпер, калі самім вораг на горла лезе, адно батальёны дазволілі, дый тыя пад іх камандай. Можа лепш уважна паслухаць што тут на кангрэсе гаворыцца?

Яшчэ пару разоў засынаў Янук, але суседка, жартуючы, як добрая апякунка, не давала «народнаму прадстаўніку» праспаць так важных гістарычных падзеяў. Бачыў Янук зноў Антося Дзеркача, аднойчы зь левага боку ззаду, іншы раз на першым паверсе на бальконе. Цэлы час гацкі паліцыянт пільна пазіраў ва ўсе бакі. І пераглядаўся зь іншымі, якія, відаць, таксама мелі «спэцыяльнае заданьне».

Пасьля прыняцьця справаздачы Астроўскага, наступілі прывітаньні кангрэсу, насамперш ад фон Готбэрга, на якое прынялі запрапанаваны Астроўскім адказ з падзякай. Пасьля йшлі па чарзе прывітаньні ад Беларускае Карёвае Абароны, жаўнераў парадкавае службы Ўсходняга фронту, ад беларускіх сялянаў, работнікаў і інтэлігенцыі; ад беларускага праваслаўнага духавенства прамаўляў архіяпіскап Філафей. Былі й вітаньні ад эвангелікаў-баптыстаў і ад беларускіх рыма-каталікоў. Найбольш урачыста й прыгожа вітаў кангрэс Саюз Беларускае Моладзі, калі галоўны шэф-праваднік Міхась Ганько, у асысьце кіраўнічкі жаночага адзьдзелу СБМ д-ра Н. Абрамавай, юнакоў і юначак, з трыбуны запэўніў дэлегатаў, што «мы, моладзь, прысягаем перад вамі, рэпрэзэнтантамі волі Беларускага Народу, што будзем з гонарам несьці сьцяг змаганьня за народную волю, што ніколі ня зганьбім і ня здрадзім нашага нацыянальнага ідэалу»

Даклад віцэ-прэзыдэнта БЦР Шкялёнка разглядаў прэтэнзіі й нелегальныя пасягненьні суседзяў, - Польшчы й Расеі ды бальшавіцкае Масквы, - да Беларусі, ды іхныя розныя махінацыі ў навейшыя часы, каб трымаць беларускі народ у няволі.

39

Першае паседжаньне кангрэсу скончылася пад полудзень. На дварэ, як быццам на якім усенародным фэсьце, людзі стаялі групамі перад тэатрам, хадзілі па маленькаму парку, некаторыя раскладалі на траве харчы, каб паабедаць, а іншыя шлі ў сталоўку Беларускае Самапомачы. Усё гэта адбывалася пад ласкавым, пяшчотным чэрвеньскім сонцам. Адно недалёка ад тэатру галоўная вуліца 25-га

Сакавіка стагнала пад цяжарам вайсковых грузавых аўтамашынаў, што пылілі па вакольнай зелені й руінах.

Янук хадзіў між людзей, прыслухоўваўся гутаркам дэлегатаў, што распытваліся адзін аднаго пра навіны ды блізкіх і знаёмых, а некаторыя разважалі пра палітыку й навіны з фронту. Падобна, як на кірмашы, адно тут ня было коней пры каляскаx з падвязанымі да колаў, каб тарчалі ўверх, аглоблямі.

- Ага, во дзе ты, народны прадстаўнік, - усьміхнуўся над вухам, злавіўшы ззаду за руку, Антось Дзяркач. - Знаёмся, братка.

Янук адвярнуўся. Ля Антося стаяў чалавек у шэрым, гадоў больш трыццаці, з шырокім тварам, белабрысы, з лагоднай усьмешкай і пільнымі вачмі.

- Наш мясцовы сябра, Кастуся Падгайскага даўны супрацоўнік, Аўген Князь. А гэта во народны прадстаўнік дык ён той самы ведамы паэт Янук Бахмач, каторага ты, Аўген, пэўне, чытаў.

- Чытаў, чаму-ж не. Крыльлі ён толькі што растапырыў, але надзеі дае, - усьміхнуўся Князь. - Прыемна пазнаёміцца.

- Для мяне вялікая прыемнасьць, - сьціпла сказаў Янук.

Яны прывіталіся рукамі.

- Дык ведаеце што, давайце да мяне. Тут недалёка, але часу няма чаго траціць, бо каля другой назад трэба. Ідзём, - запрасіў Князь.

Зайшоўшы да Князя на кватэру, Янук дзівіўся, як можна ў руінах знайсьці такі куток, фактычна з двух пакояў, абсталяваць яго. У пакоях было ўсё неабходнае, але мелася ўражаньне што кут неабжыты, што чалавек мог усё сваё дабро ў пару валізак запакаваць дый на новы пункт перабірацца. У кухні пры пліце стаяла жанчына, а нос казытала нешта прыемнае.

- Матка! - гукнуў Князь, увайшоўшы. - Вітай гасьцей.

- Госьці ў хату, Бог у хату.

Ласкавы голас. Адразу Януку прыемна зрабілася.

- Сядайце тут ля стала, - запрасіў Князь. - Я зараз-жа з вамі.

Ён пайшоў да жанчыны, а літоўскія прыселі на простай рудой лаве ля стала, пры якім з другога боку стаяла драўлянае простае крэсла. У куце, завешаным саматканым дываном, стаяў ложак. Пры сьцяне разьмясьцілася шырокая, крытая патрэсканай і выседжанай скурай канапа. Стол, відаць зроблены на хуткую руку, памаляваны пакостам.

- Добры дзень, госьцікі, - з усьмешкай на твары жанчына, гадоў звыш пяцідзесяці, з тварам, які, відаць, бачыў шмат нядолі, апранутая ў сьветлую блюзку ў ліловыя красачкі, зялёную саматкаваную спадніцу, старыя чаравікі, ужо зь сівымі пасмамі валасоў, узялася чыстым кужэльным настольнікам засьцілаць стол. - Я тут, калі пазволіце, стол накрыю. Самі-ж, можа, згаладаліся?

- А як-жа, цётачка, - сказаў Антось. - Нешта ў вас добра пахне.

- Булёну наварыла са скваркамі. Даўно елі?

- Я ўжо забыўся калі.

Князь прадставіў гасьцей. Неўзабаве на стале зьявіўся пахучы булён у гліняных місках. Князь прынёс на талерках нарэзанае скрылькамі сала, чорны хлеб, салёныя гуркі, шыткаваную капусту. Побач усяго гэтага зьявілася напалову напоўненая літроўка зь сівой вадкасьцю й тры малыя чаркі.

- Дык гэта ўсё, Аўген?

- Так, дзякую, матка, - адказаў Князь.

- То я тады адлучуся, а ты, сынок, сам знаеш, калі ня хопіць то гасьцям больш булёну падлі.

- Дзякую.

Жанчына выйшла. Князь напоўніў чаркі й сказаў:

- За незалежную і несьмяротную Беларусь!

- Так, няхай будзе, - адказаў Дзяркач.

- Няхай жыве! - падтрымаў Янук.

Выпілі. Самагонка, але чыстая й моцная.

- Бярыце самі, усё на стале ваша, а пасьля будзем гаварыць.

Елі моўчкі. Янук не асьмеліўся нічога гаварыць. Чалавека першы раз у жыцьці бачыў. Хто ён такі? Сябра Падгайскага, гэта ведама, але гэтага мала. Скора таямніца раскрылася.

- Я табе, Янук, мушу сказаць, - тлумачыў Антось, - што Аўген Князь уваходзіць у цантральны камітэт Біларускай Нізалежніцкай Партыі. Мне параіў да яго зьвярнуцца Падгайскі Кастусь і гаспадар раскажыць нам пра тое, што мы маем як дамоў вернемся. Я думаю, што гэтага для знаёмства досіць.

Янук зірнуў на гаспадара, які хутка сёрба-ў булён, быццам Антось не пра яго гаварыў. Дык вось яно. Гэты чалавек, мусіць, з той вярхушкі, ад якое, магчыма будзе й Янукова будучыня залежыць.

- Прашу, бярыце што на стале, а я буду гаварыць, - адазваўся гаспадар. - Часу ў нас мала, а сказаць трэба многа. У нас ёсьць дзьве перашкоды: недахоп часу й пісаных матар'ялаў. Першая гэта з прычыны, што я ня мог запрасіць вас на вечар. Масу людзей мушу сяньня бачыць, таму вас задумаў палагодзіць цяпер. А матар'ялаў з кансьпіратыўных мяркаваньняў мы амаль ня друкуем. Гэтак бясьпечней. Перш дазвольце спытацца вас, Янук Бахмач, як цікавіў вас кангрэс?

- Цікавіць то надта цікавіць, - адразу адказаў Янук. - Для мяне, маладога, разумееце, гонар там быць. Але мне здаецца, што лепш-бы гаварылі пра іншае. Хаця на кангрэсе ці выпадае...

- Пра што гэта? - цікавасьцю зазьзялі блакітныя Князёвы вочы.

- Пра тое, як змагацца будзем. Плянаваць, сілы гуртаваць, - адказаў Янук.

- Чуеш, пра што ён думаіць? - сказаў Князю Дзяркач. - Казаў-жа табе што гэта за падлётак.

- Думае правільна. Але-ж на кангрэсе пра гэта няма як.

- А што вы пра кангрэс думаеце? - спытаў гаспадара Янук.

- Лухта, - махнуў Князь рукой, - але яна патрэбная. Безь яе аніяк, анікуды. А гэта, што вы сказалі, то правільна. Вось мы таму й сустрэліся. Слухайце вельмі ўважна, бо я буду гаварыць зусім коратка й ня буду паўтарацца.

Янук і Антось уважна прыглядаліся гаспадару.

- На фроньце суцэльны прарыў. Немцы адступаюць. З тых вестак, якія мы маем, выглядае, што бальшавіцкія афэнзыва набірае імпэту й Немцы могуць пакаціцца зь Беларусі вельмі хутка. Не далей, як за тыдзень, наша сталіца можа быць у маскальскіх руках.

Гаспадар спыніўся быццам для таго, каб літоўскія дзяцюкі поўнасьцю ўсьведамілі важнасьць сказанага.

- Таму мы з бээнпэ пастанавілі раіць усім нашым людзям яшчэ сяньня, каб найскарэй разьяжджаліся й станавіліся на свае месцы, каб ніхто не завяз па дарозе. Разумееце? Мы можам памыляцца, але трэба прадбачыць найгоршае. Таму раю і вам выяжджаць сяньня вечарам. На чыгунках цяпер будзе цесна, але ты, Антось, чалавек ваенны, будзеш ведаць, што рабіць.

- Ага, вядома.

- Прадставім сабе, што вы прыехалі ў свае родныя Гаці, а тут заўтра-ж іх занімаюць Маскалі. Што канкрэтна вы будзеце рабіць? - зірнуў на Антося Князь.

- Бараніцца? Хіба-ж не...

- Ды не. Дык што?

- Вывесьці людзей і зброю ў лес, - адказаў Антось.

- Я-бы сказаў больш агульна, - заўважыў Князь. - Трэба расставіць людзей па сваіх мясцох, перадусім нам добра ведамых і праверaных людзей, даць ім інструкцыі, парады. Так, ці не?

- Хіба-ж так...

- Ня ўсе ў лес пойдуць. Нашы сілы, паколькі гэта магчыма, мусяць забясьпечыць сабе як найбольш выгадных пазыцыяў. Значыцца, трэба людзей і ў мястэчку пакінуць. Але не забывайцеся пра адно, самае галоўнае.

- А што?

- А тое, што бальшавікі, паколькі нам ведама, усіх мужчын, ад дзяцей аж да старых, як мятлой падмятаюць. Даёш Бярлін! Разумееце? Усіх у войска. Каму дадуць стрэльбу, а каму не, але забудзьцеся як звалі. Дык з гэтага вынікае...

- Што трэба выратаваць як найбольш сваіх людзей? А таму добра падумаць як...

- Зусім слушна, - згадзіўся Князь. - Ясна, што ўсе нашы людзі, якія служылі ў паліцыі, нідзе ня скрыюцца, толькі ў лясох. Да іх далучацца іншыя, навет і Немцы. Мы зробім памылку, калі будзем цяпер намагацца ўсё прадбачыць. Гэта немагчыма. Адно, што галоўнае маем зрабіць, дык гэта трымаць сувязь, арганізаваць акцыі, выбар аб'ектаў. Больш пра такі практычны бок я ня буду вам расказваць. Кастусь пра гэта добра паінфармаваны. Важнае ёсьць пытаньне бясьпекі. Бальшавіцкая разьведка будзе старацца закараніцца ў нашых шэрагах. Таму нагляд за бясьпекай трэба аддаць у рукі надта кемлівых людзей і варта, за ўсякую цану, мець сваіх людзей у бальшавіцкіх так званых ворганах. Разумееце? Падчас змаганьня будуць паўставаць розныя праблемы, каторыя будзем паступова вырашаць. Галоўны націск класьці на адданых ініцыятыўных, ахвярных людзей. Вайна можа працягнуцца яшчэ год, а мы можам і мусім глядзець далей у будучыню. Але я цяпер, з вашым дазволам, зраблю такую цывільную прапанову: давайце вып'ем яшчэ па чарцы. Можаце?

Антось кіўнуў галавой, а Янук сядзеў, задуманы.

- А ты, Янук? - спытаў яго Князь.

- Калі ласка.

Гаспадар наліў. Выпілі й закусвалі.

- Прабач, Янук, - зьвярнуўся да яго Князь, - я ў цябе ні спытаўся, ці ня хочаш пайсьці на захад. Думаў пра гэта?

Янук адказаў не адразу.

- Ня ведаю. Я прыабяцаў жонцы, што-б ні было...

- Ён толькі што ажаніўся, - сказаў Антось.

- Праўда? То віншую, - сказаў Князь.

- Дзякую.

- А хто твая жонка?

- Настаўніца з нашай вёскі.

- Дык добра. Жадаю вам, маладым, шчасьця. А яна палітычна надзейная?

- Так, зусім, - сказаў без запыну Янук, хоць меў адносна Дунінай «палітыкі» пэўныя засьцярогі.

- Добра, я буду прадаўжаць, - гаварыў Князь. - Хоць мы ў асноўным будзем палягаць на свае сілы, усё-ж спадзяёмся, што праз нашых людзей удасца нам навязаць сувязь з заходнімі дзяржавамі й здабыць помач. Яна будзе неабходнай у часе наступнай вайны хаўрусьнікаў із Савецкім Саюзам. Такая вайна, рана ці позна, але будзе. Для нас яна чым раней тым лепш. Мы будзем старацца мець заплечча, сяброў, дапамогу з захаду. Вы самі ведаеце гісторыю першай вайны й яе насьледкі. Польшча здабыла дзяржаву, бо мела помач ад Францыі, а мы й Украінцы, што такой помачы ня мелі, свае дзяржавы страцілі. Цяпер мусім спрычыніцца, каб гэта не паўтарылася. Нашы людзі, што апынуцца на захадзе, навяжуць патрэбныя сувязі. У выпадку вайны заходнія дзяржавы, пэўне-ж, будуць разьлічваць, што паняволеныя народы, у тым ліку й Беларусы, будуць ім памагаць. Мы ім патрэбныя ня менш, чым яны нам, каб Маскву на лапаткі палажыць. Іншыя нашы хаўрусьнікі ў змаганьні, зь якімі будзем мець лучнасьць, - мы яе фактычна ўжо маем, - гэта нашы суседзі, як Украінцы, балтыцкія народы, Палякі, ды, калі будуць, незалежнікі Расейцы, якія, само сабой зразумела, адракуцца ўсялякіх прэтэнзіяў да нашых земляў. Толькі супольнымі сіламі зможам перамагчы. З Палякамі будзе цяжэй, бо я, у прыватнасьці, ня думаю, што яны адракуцца «ўсходніх крэсаў». Як-бы

там ні было, бээнпэ цяпер трымаецца і ў будучыні будзе трымацца такога прынцыпу: не абагульняем усіх Палякаў, а між іх разрозьніваем сваіх ворагаў і прыяцеляў. Разумеем, што яны апынуцца ў такім становішчы, як і мы, дык мусім сабе ўзаемна памагаць. Некалі-ж разам, - помніце? - наш Каліноўскі і ягоныя паўстанцы змагаліся побач з Палякамі супраць агульнага ворага. Мы мусім адрозьніваць людзей, асобныя партыі й групы й ня браць усіх пад агульны назоўнік. Палякі нам вялікую шкоду падчас акупацыі між войнамі й цяпер падчас нямецкае акупацыі зрабілі, але яны будуць лічыцца з намі, калі пабачаць нашу стойкасьць, вытрываласьць, ахвярнасьць, а з гэтага нашага боку хопіць. Дык наша палітыка павінна палягаць ма талеранцыі да суседзяў, зь якімі Бог нас побач разьмясьцію. Зразумела, калі ходзіць пра давер да іх, дык гэта справа іншага характару. У нашым змаганьні вялікую ўвагу будзем даваць прапагандзе, пераважна друкаванай. Гэта для вас, спадзяюся, зусім зразумела. Ты, Антось, прабач, што адразу мне вылецела з памяці: дазволь павіншаваць з тваімі выдатнымі баявымі заслугамі. Многа чаго добрага давялося чуць пра цябе.

Аўген Князь падаў Дзеркачу руку.

- Дзякую, - адказаў Антось.

- Значыцца да гэтага часу, - прадаўжаў Князь, - я ў вельмі агульных словах сказаў пра нашых хаўрусьнікаў; тых, што маем і тых, што мець можам і будзем. Я выразіў надзею, што будзе вайна між захаднім вольным сьветам і Масквою. Гэтага мы можам быць пэўныя. Цяпер пытаньне, магчыма, не апошняй важнасьці: калі яно будзе? Сам Бог ведае. Усё-ж мы перш за ўсё людзі й калі плянуем вялікую дарогу, дык прыблізна аблічаем час калі скончым вандроўку. І тут наш чыста людзкі элемэнт падказвае наступнае пытаньне: а што, калі гэтай вайны, якую мусім выкарыстаць скора ня будзе? Што, калі яна будзе за трыццаць ці сорак гадоў? Што маем рабіць? Складаць зброю? Колькі мы можам, палягаючы галоўна на свае сілы, вытрымаць у няроўным змаганьні? А што яно будзе няроўнае, хіба-ж ясна. На гэта ўсё цяжка адказаць. Цяпер у нас іншага выхаду няма, а час пакажа што маем рабіць, прынамсі тыя з нас, што выжывуць... Я гавару да вас, як бачыце, зусім шчыра, бо ведаю што вы ня лыкам шытыя... Скажу пра нашу цяперашнюю сытуацыю. Сілы ў нас немалыя, арганізацыя

працуе, мэтады й сродкі ворага знаем навылёт. Сувязі з суседзямі маем. Сілы нашы растуць і яшчэ павялічацца ў змаганьні...

Янук глядзеў на белабрысага чалавека, слухаў яго ціхія словы, зьмест якіх здаваўся зусім нярэальным. Гэты-ж чалавек гаварыў пра будучыню, якая вось неўзабаве мае распачацца. У гэтым, хутка адрамантаваным менскім памешканьні Янук сустрэў прадказьніка свайго лёсу. Так, накш быць не магло. Ужо ўсё было пастаноўлена лёсам. Толькі як будзе з Дуняй? Ці яна возьме зброю й пойдзе зь ім у лес? Жончына месца з мужам. Гэта ясна. Але трэба ей усё вытлумачыць. Янук зноў прыслухаўся да Князя.

- ...ён добра ведае. Таму абавязкова спытайцеся Кастуся пра ўсе практычныя рэчы. Думаю, што ты, Антось, маеш больш набітую руку ў змаганьні із зброяй, дык арганізуй лясьнікоў. Я так называю нашых змагароў зь лясоў, якіх будзе шмат зьвёнаў. Я наўмысна ня ўжываю абрыдзелых маскоўскіх тэрмінаў. Кастусь вам падкажа сувязь зь іншымі зьвёнамі. Мы наўмысна трымаем людзей у вузкіх колах знаёмства з бээнпэ, каб забясьпечыцца на выпадак здрады... А здраднікі, бязумоўна, будуць.

- Групу людзей я маю, - сказаў Дзяркач.

- Вось пра гэта я якраз і думаў, - прадаўжаў Князь. - Варта, ды проста неабходна вам будзе прызвычаіцца да новых абставінаў. Галоўнае - сувязь. Усюды, дзе магчыма, мусіце мець свае вочы й вушы. А ў першую чаргу, пакуль маскоўская мятла падмяце нашых мужчын на гарматнае мяса, трэба ўцягнуць да сябе найбольш людзей. Усё-ж галоўнае - мерка. Бяручы на ўвагу галоўнае й першае нашае заданьне, - параліжаваньне бальшавіцкага гаспадарча-адміністрацыйнага апарату, - трэба, каб зьвёны былі рухлівымі, маглі скора перакідацца ў патрэбныя месцы. Не гавару аб спэцыяльных адзінках, якія будуць ліквідаваць прыслужнікаў акупацыйнага апарату. Цівуноў трэба будзе ліквідаваць на іхных пастох, а дзе ўдасца, там забіраць у палон і няхай іх судзіць народ. Трэба будзе пазьбягаць сутычак зь вялікімі карнымі адзьдзеламі праціўніка. Галоўнае, - параліжаваць іхную сувязь ды ліквідаваць людзей, на якіх яны будуць абапіраць сваю прыгонную ўладу. Як бачыце, поле дзейнасьці надзвычайна шырокае. Мяркую, што маеце пытаньні?

- Што рабіць, - пытаўся Янук, - калі яны, прыкладна, даведаюцца што я й мая Дуня будзем у лясьнікох? Пачнуцца рэпрэсіі згодна іхнага

прынцыпу масавае адказнасьці. Калі яны забяруць у арышт майго бацьку бацьку й брата й скажуць, што калі я ня здамся то вышлюць іх на Сібір ці расстраляюць. Тады што рабіць?

Князь адказаў не адразу. Ён доўга і ўважна паглядзеў Януку ў вочы.

- Прынцып агульнай адказнасьці, які Сталін заўсёды ўжываў, астаецца ў іх у сіле. Цяжкая сытуацыя. Мы пра гэта многа думалі. Прыйшлі да выснаву, што яны ніколі ня трымаюць свайго слова. Значыцца, калі-б тваіх родных забралі ды абяцалі, што іх выпусьцяць, як ты зброю зложаш, у такой сытуацыі, - і гэта напэўна, - здаваць зброі і йсьці да іх ня трэба, бо яны ніколі свайго слова не датрымаюць. Ты, Янук, хлапец кемлівы, гэта разумееш.

- Дык што рабіць?

- На гэта пытаньне, Янук, сам знойдзеш адказ.

Бахмач стараўся ўявіць сабе пэўную сытуацыю й жахнуўся. Ці ён ня можа стацца забойцам бацькі й брата? Ці Дуня ня можа спрычыніцца да няшчасьця свае маткі й сястры? Так, Янук ведаў адказ. Іншага выхаду ня было.

- На гэтым, - сказаў Князь, - буду й канчаць. Яшчэ маю да вас пытаньне: ты, Антось, маеш зброю?

- Маю, - усьміхнуўся Дзяркач.

- А ты, Янук?

Януку падабалася гэна «ты». Чалавек гэты, як-бы ён ні называўся, - Князь магло быць кансьпіратыўнай мянушкай, - вельмі яму спадабаўся. Відаць, што добра ведаў сваю справу й калі ў цантральным камітэце Беларускай Незалежніцкай Партыі іншыя сябры падобныя на яго, дык беларуская справа ў добрых руках. Прынамсі так думаў Бахмач.

- Не, я не маю, - адказаў.

- Дык я табе дам вось гэту маленькую цацу на ўсялякі выпадак і няхай яна табе паможа калі трэба будзе.

Князь вынуў зь кішэні й палажыў на стале малы чорны Вальтэр. Янук ня верыў сваім вачом. Мусіць у гэтага чалавека было ўсё прадумана.

- Вазьмі, - сказаў Князь. - Ведаеш, як яго ўжываць?

- Дзякую, спадар Князь. Але як ужываць ня ведаю.

- Антось, пакажы яму.

Дзяркач выняў зь пісталету магазын, а адтуль патроны, нанава заладаваў іх і паказаў Януку як цэліцца.

- Як відзіш, надта проста, - сказаў.

Князь пайшоў за занавеску, дзе стаяла ложка й вярнуўся з каробкай у руцэ.

- Без амуніцыі пісталёт мёртвая рэч. Дык вось тут маеш на запас. Вазьмі, схавай усё гэта ў кішэні, каб ня відаць было. Мог-бы я табе дастаць праз нашу арганізацыю нямецкую пасьветку на права мець зброю, але яна табе скора непатрэбная будзе. Зрэшта, мы прызнаём толькі сваю ўладу, дык я, ад імя гэтае ўлады. перадаў табе, Янук, пісталет. А цяпер жадаю вам посьпехаў у змаганьні.

Янук зноў падзякаваў. Разьвітаўшыся, выйшлі. Ужо на вуліцы Янук спытаў Антося:

- А якую працу мае Князь?

- Працуіць недзе ў гарадзкой управе. Мне Кастусь вельмі хваліў яго. Відаць, што дзела сваё добра знаіць і аграном казаў, што ён з цантральнага камітэту. Падабаўся табе?

- Так, надта разумны чалавек. Зноў будзеш ахоўваць кангрэс?

- Некаму-ж трэба, - усьміхнуўся Дзяркач.

- А каб Немцы прыйшлі каго арыштаваць, тады што?

Антось зірнуў на таварыша, усьміхнуўся.

- Немцы? Мы-б ім паказалі дзе ракі зімуюць!

40

Падгайскі, Янтось і Янук доўга раіліся ў аграномавай хаце. Гаспадар паведаміў, што ён ужо здолеў перадаць у надзейныя рукі бальшыню сваіх харчоў, збожжа, адкуль іх можна будзе забраць пры бальшавіцкай акупацыі. А Антось расказаў, што супольна з Баравіком змог назапасіць зброі й амуніцыі, пераважна ў схованках на Марыліным гарбе й іншых. Пералічыў больш дзесяці чалавек з паліцыі, што маюць зьявіцца ў умоўленае месца, якім зрабілі лясьнічоўку. Галоўнае - падабраць адпаведны момант, перачакаць, пакуль банды павылазяць з пушчы. Летам гэта няцяжка. Пастанавілі перабірацца ў лес парамі й троойкамі.

Вярнуўшыся зь Менску, Янук добра вытлумачыў Дуні ў чым справа.

- Што-ж, дзе ты тамака і я, хоць надта нялёгка гэта, - адказала пасьля шматлікіх пытаньняў жонка.

Пастанавілі бацьком і радні нічога не казаць і выбірацца вечарам, зрабіць часовы прыпынак дзесь у густым збожжы ці зарасьніках, недалёка дарогі, каб асачыць, як пакінуць пушчу банды. Антось, апроч усіх іншых клопатаў, прынагляў і Ніну, каб не марудзіла. Зь імі меў ісьці Баравік.

Радыё трашчала ад бальшавіцкага ўздыму. Немцы, згодна яго, уцякалі на ўсім фроньце, а «народныя мсьціўцы» атакавалі варожыя гарнізоны й памагалі савецкай арміі завязваць мяшкі. На Гаці бальшавіцкія бамбавікі наляцелі перад полуднем, выладавалі некалькі бомбаў і паляцелі назахад, па нейкіх сваіх заданьнях. Ужо ўчора недзе змыўся Левандоўскі, а Антось рыхтаваўся пакідаць Гаці вечарам. Дарогамі з усходу, на калёсах і пеша рухаліся ўцекачы. Зь Літоўцаў рыхтаваўся ў дарогу адзін солтыс Паўлоўскі. Вёска адранцьвела.

Пасьля сьпякотнага дня, сонца чырвонай куляй садзілася за хрыбет ліпавіцкага бору. Над Архіпам кружыў астраб. Усё гэта бачыў праз вакно Янук. Усё было гатовае ў дарогу. Сьціснулася сэрца.

- Янучок, думаеш, што мы калі сюды вернемся? - спыталася, ізь сьлязьмі на вачох, у яго Дуня.

- Ня ведаю, даражэнькая, - адказаў Янук дрыжачым голасам. - Сьвет, які мы зналі, ужо адыходзіць, а настае новы. Давай можа перад дарогай памолімся... І пасьля вазьмі з сабой ікону.

Яны селі пры стале й схілілі перад іконамі галовы. Дзесьці з усходу даляцеў гул артылерыйскай кананады. На зруйнаваную й аголеную зямлю адтуль паўзла шматгаловая хімэра.

Таронта, 1977-1980

Сьпіс некаторых чужых або рэдка ўжываных словаў

Дзярлівы - (бел.) драпежны.

Велькапольска - (польск.) літаральна «Вялікая Польшча».

Жэч Паспаліта - Рэч Паспалітая. Просты беларускі пераклад лацінскага «рэспубліка» (res publica - «рэч публічная», «рэч паспалітая») палякі перайначылі на свой капыл паводля свайго спецыфічнага вымаўленьня (Rzeczpospolita), а ў далейшым называлі й называюць так Польшчу.

Крэсы (Крэсы Всходне) - «усходняе памяжоўе». Так звыклі называць палякі заходнебеларускія землі, дзе польская прапаганда залічвала беларусаў у «расеезаваныя палякі».

Мітычны - міфічны (бел., паходнае ад грэцкага. Падчас савецкае «моўнае рэформы» замененае на «міфічны» паводля расеезаванага вымаўленьня).

Тарэбка - (польск.) торбачка (жаночая).

Элімінацыя - выключэньне (бел., паходнае ад лацінскага).

Жондовы - (польск.) урадавы.

Офяра едэн - (польск.) ах ты недарэка.

Хаме едэн - (польск.) ах ты хам.

Жондова владза - (польск.) урадавая ўлада

Двадзесьця пеньць - (польск.) дваццаць пяць (маецца на ўвазе дваццаць пяць удараў).

Троп - (бел.) сьлед, быць на тропе - злавіць сьлед, ісьці па сьледу.

Ровар - (бел.) веласіпед

Транзакцыя - (бел., паходнае ад лацінскага) зьдзелка.

Ужэнднік - (польск.) чыноўнік.

Мільчэць - (польск.) маўчаць.

Ажэлкі - (польск.) «арляняты» - кукарды на шапках польскіх паліцыянтаў ды жаўнераў.

Залатоўка - (бел., размоўнае) злотая - польская грашовая адзінка.

Родак - (польск.) суайчыньнік.

Гэтта - (бел.) гэтак, гэта значыць, гэтакім чынам, значыцца...

Хварбаваць - (бел.) фарбаваць. Хурманка - (бел.) фурманка. Хутра - (бел.) футра. І г.д. Словы з шэрагу тых шматлікіх, якія праз

савецкую «рэформу правапісу» беларусам было загадана пісаць і вымаўляць... па-польску: «фарбаваць, футра...»

Замэльдаваў - (польск.) даклаў, адрапартаваў.

Дэфэнзыва - польская таемная паліцыя, контрвыведка.

Інвазіі - утаргненьні, напады (бел., паходнае ад лацінскага, ужываецца пераважна йранічна).

Чыньнікаў жандовых - (польск.) дзяржаўных ворганаў.

Пшэклентэ - (польск.) клятыя.

Неўдзенчны - (польск.) няўдзячны (у дадзеным выпадку вымаўлена зь беларускім акцэнтам)

Панствовы пастарунак - (польск.) паліцыйны ўчастак.

Панствовая зьніжка - (польск.) дзяржаўная йльгота, права на навучаньнеся за дзяржаўны кошт.

Гвязды - (польск.) зоркі.

Владза - (польск.) улада.